Присоединяйтесь к нашему чату-сообществу о
Генеалогии Беларуси в телеграме

https://t.me/uezdy

ТАЛАЧЫНСКІ РАЁН

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ХРОНІКА
ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНА

МІНСК

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ» ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

1988

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАМЯЦЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ХРОНІКА
ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНА

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1988

ББК 63.3(2Б)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

І. П. ШАМЯКІН (галоўны рэдактар), Г. К. КІСЯЛЁЎ, Я. В. МАЛАШЭВІЧ (адказны сакратар), А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), М. А. САВЕЛЬЕВА, С. П. САМУЭЛЬ, І. П. ХАЎРАТОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. С. ШЧУРОК.

КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННЮ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

І. С. ШЧУРОК (старшыня камісіі, першы сакратар Талачынскага райкома партыі), А. Д. АРЛОЎСКІ, У. І. АЎСІЕВІЧ, В. М. БІРУКОЎ, Л. У. ГВОЗДЗЕВА, М. Б. ЕРАШОЎ, М. Ф. ЗАВАДСКІ, С. У. КРАЎЧАНКА, Дз. Дз. МАСКАЛЁЎ, А. Р. МАЧАХОЎСКІ, М. А. САВЕЛЬЕВА, С. Р. ТАМАШЭЎСКАЯ, А. Р. УСОЎСКАЯ, В. Дз. ШАРАЙ, А. А. ШНЭЙДАР.

Мастак А. М. ХІЛЬКЕВІЧ

П $\frac{0505040000-012}{\text{М } 318(03)-88}$ 8—88

ISBN 5-85700-007-6

© Выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1988


ГОЛОЧИН



1941
1945

ДЕТСКИЙ САД
СКАЗКА

Рудня, Серкавіца сведчаць, чым яны займаліся; Палюдава, Мураўнічы, Табараўшчына, Гаражоны, Гарадзец (Высокі і Нізкі), Стадоліщча — гэта даўніна, гісторыя; Звянячы, Саколіна, Слаўнае, Яблынька, Любанічы, Любатынь — сам нораў пасялян, што любілі і шанавалі прыгожае. А чаго варта Пярэвалачня — вёска, што стаяла на старажытным волаку на шляху з «варагаў у грэкі» і ў сваёй назве ўвекавечыла, чым займаліся тут людзі больш за тысячагоддзе таму назад.

Ішлі часы, міналі вякі, і зямлю тваю, Талачыншчына, крыж-накрыж з волакам перасек шлях з Вялікага княства Літоўскага ў Маскоўскую дзяржаву. І ездзілі па гэтым шляху купцы-гандляры і іншаземныя госці з таварамі. Пракатваліся па ім вогненнай віхурай і шматлікія войны, знішчаючы ўсё жывое на сваім шляху. І людзей Талачыншчыны раз за разам гуртавала братняя зарука-талака, каб усім мірам адраджаць жыццё нанава.

Бойкія дарогі — гэта неспакойны, а часам трагічны лёс тых, хто жыве на іх скрыжаванні. Талачыншчыне выпаў такі лёс. Тваім адвечным працаўнікам давялося сутыкнуцца з рабаўнікамі Карла XII. Не абмінула цябе і напалеонаўскае нашэсце. Пражорлівай саранчою прапаўзлі па палетках тваіх кайзераўскія грабежнікі. І ва ўсіх гэтых калатнечах талачыпцы не стаялі ўбаку, не гнулі пакорліва шыі перад чужынцамі.

Не былі твае сыны і дочкі, Талачыншчына, пакорлівымі слугамі ў сваіх паноў і падпанкаў. Лепшыя з лепшых былі разам з бальшавікамі ў падполлі, на барыкадах Піцера і Масквы, спасцігалі рэвалюцыйную навуку і за мяжой, і на сібірскай катарзе, і ў турмах, неслі словы ленінскай праўды прыгнечаным землякам, узнімаючы іх на актыўную барацьбу. Кастрычніцкая рэвалюцыя ўзняла на сваіх крылах сотні тваіх сыноў, якім суджана было вызначыцца сілаю волі і духу і ў рэвалюцыі, і ў Грамадзянскай вайне, і ў мірным будаўніцтве.

Нізкі сыноўскі паклон, Талачыншчына, тваім першым рэвалюцыянерам і камунарам, камуністам і камсамольцам, што ўзначалілі перабудову вёскі на новы калгасны лад, юнакам, што добраахвотнікамі папоўнілі ваенна-марскі і паветраны флот Краіны Саветаў.

Непакорная і непакораная, гордая і непахісная Талачыншчына, ты, як і ўся Беларусь-партызанка, у адзіным парыве грудзьмі засланіла сваю зямлю ад чужынцаў у час Вялікай Айчыннай вайны. Тысячы тваіх мужных сыноў і дачок зрабілі свой край непрыступным, партызанскім. У вечнай памяці тваёй, Талачыншчына, тысячы мірных жыхароў — старых і маладых, жанчын і дзяцей,— загубленых акупантамі. Вечная слава партызанам і іх шматлікім памочнікам, што загінулі ў баях, блакадах і фашысцкіх катавальнях.

Вечная слава, Талачыншчына, сынам тваім, што палеглі на франтах Вялікай Айчыннай, вечная слава чырвонаармейцам, людзям розных нацыянальнасцей, вядомым і невядомым байцам, што загінулі пры абароне і вызваленні тваіх вёсак, пасёлкаў.

І зноў, як і ў мінулыя часы, адрадзілася жыццё на зямлі тваёй. Закрасавалі жытнія каласы на палетках, нарадзіліся дзеці, падраслі ўнукі, каб здзейсніць працоўны подзвіг на карысць сваёй маці-Радзімы.

Талачыншчына па праву ганарыцца сёння сваімі героямі-хлебароба-

мі, вядомымі вучонымі, мастакамі, літаратарамі, медыкамі, народнымі настаўнікамі і іншымі самаадданымі сынамі свайго краю.

Няхай жа гістарычная памяць не дае згаснуць славе, гонару і годнасці тваіх мужных сыноў, Талачыншчына! Няхай іх мужнасць і самаахвярнасць будуць тваёй апорай і светлым прыкладам у рабоце за лепшую, шчаслівую долю пад мірным небам і ясным сонцам.

* * *

Дарагія чытачы! Гэта кніга, як і многае на нашай зямлі, рабілася талакою, рабілася сотнямі руплівых людзей, рабілася з добрым сэрцам і ўсведамленнем вялікай вартасці сваёй гісторыі, высокага гонару сваіх продкаў, іх неўміручых спраў і на полі бітвы, і на хлебным полі.

Гісторыка-дакументальная хроніка Талачыншчыны складзена на падставе архіўных дакументаў і матэрыялаў, публікацый у газетах, часопісах, успамінаў удзельнікаў і сведкаў падзей Вялікага Кастрычніка, Грамадзянскай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва, Вялікай Айчыннай вайны, аднаўлення народнай гаспадаркі. У пошуку і зборы матэрыялаў прымалі ўдзел прадстаўнікі грамадскасці Талачынскага раёна, супрацоўнікі архіваў, бібліятэк, музеяў, пісьменнікі і журналісты, рэдактары Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы партархіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР, Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны СССР, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў БССР, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і яго філіяла ў Оршы, Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, музеяў і куткоў народнай і баявой славы калгасаў, прадпрыемстваў і школ Талачынскага раёна.

Выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі вельмі ўдзячна ўстановам, арганізацыям, прыватным асобам, якія аказалі садзеянне ў зборы, падрыхтоўцы і ўдакладненні матэрыялаў кнігі «Памяць».



Талачынскі раён размешчаны на паўднёвым усходзе Віцебскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 1,5 тыс. км². Населеных пунктаў 280 (1986), у тым ліку горад Талачын (цэнтр раёна) і гарадскі пасёлак Коханава. 10 сельсаветаў: Аболецкі, Азерацкі, Алёнавіцкі, Валосаўскі, Воўкавіцкі, Жукнеўскі, Плоскаўскі, Серкавіцкі, Слаўненскі, Талачынскі. Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Аршанскага ўзвышша, 70 % тэрыторыі размешчана на вышыні 200—240 м над узроўнем мора, 20 % — 180—200 м, 9 % — вышэй за 240 м. Карысныя выкапні: торф, пясок, пясчана-гравійны матэрыял, гліна і суглінкі. Сярэдняя тэмпература студзеня —7,6 °С, ліпеня 17,6 °С. Ападкаў 639 мм за год. Вегетацыйны перыяд 182 сутак. Па тэрыторыі раёна праходзіць водападзел паміж рэкамі Балтыйскага і Чорнага мораў — Заходняй Дзвіной і Дняпром. У межах раёна бяруць пачатак рэкі Друць (з прытокам Крывая), Бобр, Усвейка, Абалянка. Найбольшае возера Касмачэўскае. Пад лесам 29 % тэрыторыі раёна, пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 58,9 % (43,2 % ворных зямель, 14,7 % сенажацей і пашаў). Асноўныя землекарыстальнікі — 21 калгас і 5 саўгасаў, якія спецыялізуюцца на льнаводстве і малочна-мясной жывёлагадоўлі, пашыраны пасевы збожжавых і бульбы. Прадпрыемствы лёгкай, паліўнай і харчовай прамысловасці, будматэрыялаў. Тэрыторыю раёна перасякаюць чыгунка і аўтамабільныя дарогі Мінск — Орша і Сянно — Круглае. Выдаецца раённая газета «Сцяг Ільіча».

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Першапачатковае засяленне тэрыторыі Талачынскага раёна адбывалася ў эпоху мезаліту (сярэдні каменны век), які працягваўся з 9-га па 5-е тысячагоддзе да н. э. З заканчэннем ледавіковага перыяду (9-е тысячагоддзе да н. э.) завяршылася фарміраванне рэльефу: рэкі, азёры, раслінны і жывёльны свет набылі рысы, блізкія да сучасных. Рассяленне старажытных людзей па тэрыторыі Талачыншчыны адбывалася з поўдня па Друці, Усвейцы і іншых рэках. Шчыльнасць насельніцтва была нізкай, стаянкі размяшчаліся на краях надпоймавых тэрас, на дзюнах і пясчаных пагорках, на іх ставіліся лёгкія наземныя буданападобныя жытлы з агнішчамі ў цэнтры. Асноўнымі заняткамі людзей было паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. У мезаліце паявілася новая і даволі складаная мікралітычная і ўкладышавая тэхніка вырабу прылад працы. Зробленыя з крэменю дробныя пласціны-мікраліты прамавугольнай, трохвугольнай, сегмента- і трапецападобнай формы дакладна падганяліся адна да адной і смалой змацоўваліся ў выразаных пазах касцяных або рагавых нажоў, клінкоў, наканечнікаў. Важнымі прыладамі палявання, якія паявіліся ў мезаліце, былі лук і стрэлы. З іх дапамогай людзі атрымалі магчымасць паляваць на вандроўных і дробных жывёл, дзікіх птушак (алень, лось, заяц, глушэц, цецярук, курапатка і інш.). Мезалітычныя плямёны, што засялялі поўнач Беларусі, складаліся з некалькіх мацярынскіх абшчын, аб'яднаных паміж сабой кроўнымі сувязямі.

Неаліт (новы каменны век) пачаўся ў 4-м і закончыўся ў пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. У гэты перыяд удасканальваліся спосабы апрацоўкі крэменю, для вытворчасці прылад працы выкарыстоўваліся і іншыя пароды каменю — граніт, сіяніт, сланец, пясчанік. У 2-й палавіне неаліту пашырылася новая тэхніка апрацоўкі каменю — шліфаванне і свідраванне, прычым шліфавалі ўсе пароды, а свідравалі толькі мяккія пароды каменю. Пашырыўся асартымент прылад працы, паявіліся сякеры (у т. л. шліфаваныя), скоблі, долаты, наканечнікі коп'яў і дроцікаў, камбінаваныя прылады працы з двайным або трайным прызначэннем: скрабкі-разцы, нажы-скоблі, скрабкі-скоблі, наканечнікі-свярдзёлкі-нажы і інш. Выраблялiся прылады працы і рэчы ўжытку з рогу, косці і дрэва. Асноўнымі заняткамі насельніцтва па-ранейшаму заставаліся паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва, пад канец эпохі ўзніклі вытворчыя формы гаспадаркі — прымітыўнае земляробства і жывёлагадоўля. Развіваўся прымітыўны абмен крэменем, бурштынам і інш. Найважнейшая рыса неаліту — пачатак керамічнай вытворчасці. Гліняны посуд ляпілі ўручную і абпальвалі на агні. Вынаходства посуду дало магчымасць палепшыць спосабы прыгатавання ежы. З паляпшэннем умоў жыцця павялічылася колькасць насельніцтва і, натуральна, яго шчыльнасць. Узнікаюць часам вялікія групы роднасных па мове і культуры плямён. На базе традыцый папярэдніх пакаленняў фарміруюцца і тэрытарыяльна адасабляюцца неалітычныя археалагічныя культуры. Плямёны, якія жылі ў паўднёвай частцы тэрыторыі Талачынскага раёна, увахо дзілі ў склад верхнедняпроўскай культуры, а якія жылі ў паўночнай яго палавіне — нарвенскай культуры.

Паселішчы верхнедняпроўскай культуры былі пашыраны на вялікай тэрыторыі Беларускага Падняпроўя (басейны рэк Дняпра, Сажа, Друці, Бярэзіны). Яны размяшчаліся на спадзістых узвышэннях у поймах рэк, на першай надпоймавай тэрасе, па берагах азёр — там, дзе былі зручныя мясціны для рыбалоўства, палявання і збіральніцтва. На тэрыторыі Талачынскага р-на паселішчы верхнедняпроўскай культуры пакуль што не выяўлены, але яны вядомы на суседніх тэрыторыях. Неалітычныя паселішчы верхнедняпроўскай культуры выяўлены на левым беразе Друці, за 200 м на поўнач ад в. Арава і ніжэй па цячэнню Друці, на яе левым беразе за 150 м ад в. Лубяны Круглянскага ра-



ёна, каля вёсак Вугалеўшчына, Зарэчча, Прыбар, г. п. Бялынічы Бялыніцкага раёна. Плямёны верхнедняпроўскай культуры жылі ў круглых або авальных у плане жытлах, заглыбленых у зямлю на 0,5—0,9 м, унутры якіх размяшчаліся адкрытыя каменныя агнішчы, выбраляліся шыракагорлыя, пукатабокія таўстасценныя гаршкі з канічным або яйцападобным дном і прамой шыйкай з дамешкай у гліне раслінных рэшткаў, пяску і жарствы. Познія пасудзіны па памерах і форме дна больш разнастайныя (венчык адагнуты, дно больш акруглае), упрыгожаны ўзорамі з адбіткаў грэбеня, разнастайных ямак, лапчастых адбіткаў, насечак. На познім атапе арнаментацыя складалася з узораў звіслых трохвугольнікаў, ромбаў, зігзагаў і інш.

Паселішчы нарвенскай культуры былі пашыраны ў басейне Заходняй Дзвіны. У Талачынскім раёне вядома адно паселішча гэтай культуры, якое знаходзіцца за 3 км на поўнач ад в. Загацце, на краі тарфянога балота, ва ўрочышчы Гасцінец. Выявіў і абследаваў яго ў 1979 г. Э. М. Зайкоўскі. На паселішчы знойдзены абломкі ляпных гліняных пасудзін нарвенскай культуры, крамянёвыя нуклеусы, адшчэпы, пласціны, скрабкі на адшчэпах, разец з рэтушаванай выемкай. На

паселішчах нарвенскай культуры будаваліся наземныя жытлы, каркас якіх складаўся з жэрдак. Перакрыцці накрываліся скурамі жывёл. Унутры жытлаў размяшчаліся каменныя агнішчы. Для нарвенскай культуры характэрна порыстая кераміка з дамешкамі тоўчаных ракавінак у гліне. Шыракагорлыя пасудзіны яйцападобнай формы з вострым дном пакрываліся разрэджаным арнаментам, які складаўся з адбіткаў грэбеня, разнастайных ямак, насечак, наколаў, трапляюцца гладкаспенныя пасудзіны. У больш позніх гаршках край скошаны ўсярэдзіну. Калектыўная праца неалітычных плямён была абумоўлена агульнай уласнасцю на асноўныя сродкі здабычы матэрыяльных каштоўнасцей і суправаджалася калектыўным спажываннем. У канцы неаліту родавая мацярынская абшчына распадалася на асобныя сем'і, якія мелі пэўную эканамічную незалежнасць, але яшчэ былі звязаны паміж сабой кроўнымі сувязямі.

У пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Талачынскага раёна, пачаўся бронзавы век. Аддаленасць ад старажытных цэнтраў металургіі абумовіла тут больш працяглае карыстанне каменнымі прыладамі працы, апрацоўка якіх дасягнула высокай дасканаласці. Шырока выкарыстоўваліся шліфаванне, свідраванне, пілаванне. Асноўным зместам эпохі было далейшае развіццё жывёлагадоўлі і земляробства, пашырэнне абмену, паступовая замена мацярынска-родавых адносін патрыярхальнымі. Старыя галіны гаспадаркі — паляванне і рыбалоўства — адышлі на задні план. Адбыўся першы буйны грамадскі падзел працы. Паміж жывёлаводамі і земляробамі ўстанавіўся рэгулярны абмен. У сувязі з паляшэннем умоў існавання рэзка павялічыўся колькасны склад плямён. У пошуку пашы жывёлагадоўчыя плямёны захоплівалі ўсё новыя і новыя землі, выцясняючы ці асіміліруючы мясцовае познанеалітычнае насельніцтва. У канцы 3-га тысячагоддзя да н. э. з Сярэдняга Падняпроўя на тэрыторыю Беларусі праніклі жывёлагадоўча-земляробчыя плямёны сярэднедняпроўскай культуры. Рухаючыся на поўнач, яны засялілі амаль усё Верхняе Падняпроўе, у тым ліку і басейн Друці. Плямёны сярэднедняпроўскай культуры, як правіла, жылі на старых неалітычных паселішчах, таму там побач з неалітычнымі матэрыяламі трапляюцца знаходкі бронзавага веку (Арава, Бялынічы. Лубяны і інш.). Насельніцтва жыло ў наземных пабудовах слупавой канструкцыі з каменнымі агнішчамі ў цэнтры, выкарыстоўвала крамянёвыя і каменныя прылады працы і зброю (свідраваныя і клінападобныя сякеры, шліфавальныя пліты, наканечнікі стрэл, коп'яў, нажы, скрабкі і інш.), ляпны посад пераважна шарападобнай формы з арнаментам у выглядзе перавітай вяровачкі, лінейнага і зубчастага штампа.

У 1-й палавіне 2-га тысячагоддзя да н. э. на тэрыторыю Талачынскага раёна праніклі плямёны паўночнабеларускай культуры, якая ўзнікла на мясцовай аснове ў выніку змяшэння нарвенскай культуры з культурай плямён, выцесненых сярэднедняпроўскай культурай з тэрыторыі Верхняга Падняпроўя. Пэўную ролю ў яе фарміраванні адыграла і сярэднедняпроўская культура. Паселішчы паўночнабеларускай культуры размяшчаліся ў басейне Заходняй Дзвіны, у Талачынскім раёне вядома пакуль адно паселішча гэтай культуры каля в. Шапалаўка, на правым беразе р. Усвейка (знойдзены абломкі гліняных пасудзін і косці жывёл). Некалькі паселішчаў выяўлена на вялікім тарфяніку, размешчаным у пойме р. Крывінка паміж вёскамі Галоўск Сенненскага раёна і Асавец Бешанковіцкага раёна. Абодва паселішчы маюць два культурныя гарызонты — ніжні, які адносіцца да нарвенскай культуры эпохі неаліту, і верхні — паўночнабеларускай культуры бронзавага веку. Пры раскопках выяўлены рэшткі жытлаў паўночнабеларускай культуры — прамавугольныя з жэрдак пабудовы з двухсхільнай страхой, ніжняя частка якой укопвалася ў зямлю, а верхняя мацавалася на падоўжнай бэльцы, абапёртай на слупы, што стаялі па тарцах жытла. Унутры жытлаў размяшчаліся адкрытыя каменныя агнішчы. Насельніцтва выпрабляла гліняныя з дамешкай тоўчаных ракавінак, пяску і жарствы ляпныя шыракагорлыя гаршкі, міскі, міскападобныя пасудзіны, кубкі з акруглым або вострым, часам з плоскім і вузкім дном. Арнамент размяшчаўся па ўсёй паверхні пасудзін у большасці выпадкаў гарызантальнымі паясамі (зонамі), запоўненымі разнастайнымі ўзорамі з лінейных адбіткаў, насечак, ямак, наколаў. Выяўлена шмат абломкаў, пакрытых штрыхамі. Відаць, яшчэ сырыя пасудзіны абціралі саломай або сухой травой. Трапляюцца гаршкі, падобныя формай на посуд сярэднедняпроўскай культуры, а таксама драўляныя міскі. Плямёны паўночнабеларускай культуры шырока выкарыстоўвалі як сыравіну косці і рогі жывёл: знойдзены касцяныя сякеры, цёслы, долаты, гарпуны, рыбалоўныя кручкі, наканечнікі стрэл, падвескі з зубоў жывёл. На паселішчы Асавец знойдзены прадметы старажытнага мастацтва — драўляныя фігуркі чалавека, звяроў, птушак і абломкі пасудзін з гравіраванымі выявамі людзей, а таксама набор бурштынавых падвесак.

У 8—7 ст. да н. э. ў эканамічным жыцці і ў грамадскіх адносінах плямён адбываліся ка-

рэнныя змены. У аснове іх ляжаў далейшы рост прадукцыйных сіл і, перш за ўсё, у земляробстве і жывёлагадоўлі. З развіццём гэтых галін гаспадаркі з'явіўся прыбавачны прадукт — запасы збожжа, жывёлы, прадметаў хатняга рамяства. А гэта прыводзіла да ўзмацнення супярэчнасцей паміж родамі і плямёнамі і да ваенных сутыкненняў паміж імі. Пераможац захопліваў не толькі матэрыяльныя каштоўнасці, але і людзей, якіх ператвараў у рабоў. Узнікла патрыярхальнае рабства. Ва ўмовах ваеннай небяспекі родавыя абшчыны сяліліся ва ўмацаваных мясцінах і дадаткова ўмацоўвалі свае паселішчы штучна, спачатку драўлянай сцяной, потым земляными валамі і равамі. Так узніклі гарадзішчы. Карэнныя змены адбыліся і ў матэрыяльнай культуры. У той час у басейне Заходняй Дзвіны і ў вярхоўях Дняпра склалася днепра-дзвінская культура, а ў басейне вярхоўяў Нёмана і ў паўночна-заходнім Падняпроўі — культура штрыхаванай керамікі. На тэрыторыі Талачынскага раёна праходзіла мяжа паміж гэтымі культурамі — у заходняй яе частцы жылі плямёны культуры штрыхаванай керамікі, а ва ўсходняй — днепра-дзвінскай культуры. Да нядаўняга часу ў раёне было вядома 7 гарадзішчаў гэтых культур (каля вёсак Высокі Гарадзец, Козкі, Багрынава, Гарадзішча, Саколіна, Клеўка і Кісялі), захаваліся толькі 3 гарадзішчы (каля вёсак Гарадзішча, Кісялі і Козкі), астатнія знішчаны. Гарадзішча каля в. Гарадзішча размешчана на правым беразе ракі Усвейкі, за 150—200 м на захад ад вёскі на высокім (да 10—11 м ад асновы) узгорку, на першай надпоймавай тэрасе. Умацавана 3 валамі і глыбокім ровам. Пры яго абследаванні знойдзены абломкі пасудзін днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур, побач знаходзіцца селішча 7—8 ст. н. э. Сярод мясцовага насельніцтва бытуе легенда, што гарадзішча з'яўлянецца рэшткамі вялікай прыстані, якая існавала калісьці, і што р. Усвейка (у вярхоўі называецца Усвіж-Бук) была паўнаводнай і па ёй хадзілі вялікія для таго часу судны з разнастайнымі таварамі. Гарадзішча ўзнікла не пазней 3—4 ст. н. э. і ніякіх адносін да прыстані не мае. Аднак Усвейка ў старажытнасці сапраўды была значна больш паўнаводнай і ў 10—13 стагоддзях з'яўлялася часткай воднага гандлёвага шляху, які звязваў Прыбалтыку з Паўночным Прычарнамор'ем, праз Заходнюю Дзвіну — Улу — Усвейку — волакам да рэк Крывая — Друць — Дняпро. Назва вёскі Пярэвалачня, якая захавалася да нашага часу на р. Крывой, пацвярджае той факт, што паміж гэтай ракой і Усвейкай сапраўды існаваў волак, па якім па сушы перацягваліся тавары. Не выключана, што на

Курганны могільнік каля вёскі Галошава.

тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца гарадзішча, сапраўды была прыстань, а само гарадзішча магло выкарыстоўвацца для якіх-небудзь мэт. Магчыма, і назва Талачын звязана з тым, што ў час волаку людзі па даўняму звычаю збіраліся на талаку — калектыўны ўдзел у работах, дзе патрабавалася шмат работнікаў і цягла.

Днепра-дзвінская культура і культура штрыхаванай керамікі ў сваіх асноўных рысах (характары пасяленняў, жытлаў, гаспадаркі, прылад працы і інш.) падобны адна на адну, таму што яны былі роднаснымі ў этнічных адносінах з плямёнамі ўсходнебалцкай моўнай групы. Адрозніваюцца яны толькі гліняным посудам. Форма пасудзін днепра-дзвінскай культуры аднастайная — гаршкі з увагнутым горлам, прамой або ледзь адагнутай шыйкай і параўнальна выпуклым тулавам, а таксама слоікавыя пасудзіны з прамымі або злёгку пукатымі сценкамі. Увесь посуд пласкадонны, гладкасценны, арнаментаваных пасудзін мала. Арнамент размяшчаўся па шыйцы да плечука, складаўся з разнастайных ямак і напярочных ліній у выглядзе вуглоў, ромбаў, ламаных ліній, вертыкальных нарэзаў, якія чаргуюцца па 2—3 у кожнай групе, і інш. Посуд культуры штрыхаванай керамікі падзяляецца на ранні (гаршкападобныя і слоікавыя пасудзіны) і позні (рабрыстыя, слоікавыя і слабапрафіляваныя). Усе яны пакрыты штрыхоўкай. Слоікавыя і слабапрафіляваныя пасудзіны амаль не арнаментаваліся. Раннія гаршкі ўпрыгожваліся па шыйцы і плечуку ямкамі, што размяшчаліся па адной у адзін ці ў два рады, у выглядзе трохвугольнікаў у шахматным парадку ці вяршынямі ўніз або

групамі ямак па 2—3—4 у кожнай. Рабрысты посуд арнаментаваўся зашчыпамі, насечкамі, ямкавымі ўдіскненнямі, наразнымі лініямі, якія наносілі па рабры і па шыйцы.

Асноўнымі галінамі гаспадаркі плямён абедзвюх культур былі ляднае земляробства і жывёлагадоўля, другараднае значэнне мелі паляванне і рыбалоўства. Вырошчвалі пшаніцу, проса, гарох, палявыя бабы і віку, гадавалі кароў, свіней, коней, авечак, коз, курэй. Гаспадарка была натуральнай: на гарадзішчах вырабляліся ўсё, што было неабходна ў побыце. Да паяўлення жалеза асноўнымі відамі сыравіны былі дрэва, косць, рогі жывёл, крэмень. З дрэва выраблялі лодкі, дзяржанні сякер, нажоў і сярпоў, стрэлы і коп'і, яго выкарыстоўвалі для будаўніцтва жылых, гаспадарчых і вытворчых пабудоў. З косці і рагоў жывёл рабілі сякеры, долаты, нажы, сярпы, шылы, разнастайныя вастрыі, гарпуны, наканечнікі коп'яў і стрэл, кінжалы, прыстасаванні для пляцення сетак, рыбалоўныя кручкі, шпількі, падвескі і інш. З каменю выраблялі сякеры, зерняцёркі, мялы, з гліны — грузілы для сетак, прасліцы, пацеркі, цацкі.

У 4—3 ст. да н. э. ў плямён культуры штрыхаванай керамікі, а ў 2—1 ст. да н. э. ў плямён днепра-дзвінскай культуры паявілася жалеза. Яго выплаўлялі з балотных руд, у хуткім часе яно стала асноўным і выключна важным відам сыравіны. З жалеза выраблялі сякеры, сярпы, нажы, шылы, зброю (наканечнікі коп'яў, дроцікаў і стрэл), упрыгожанні (шпількі, кольцы, спражкі); з бронзы рабілі ўпрыгожанні: бранзалеты, скроневыя кольцы, пярсцёнкі, бляшкі, падвескі, спіралькі і інш. Выкарыстанне новых, больш дасканалых прылад працы станоўча адбілася на прадукцыйнасці ляднага земляробства, павялічыліся статкі свойскай жывёлы, з'явіліся маёмасныя адрозненні паміж родавымі абшчынамі, унутры іх сталі ўзнікаць больш забяспечаныя ў матэрыяльных адносінах сем'і, якія імкнуліся да адасаблення. Гарадзішчы як самастойныя гаспадарчыя адзінкі ў 4—5 ст. н. э. сталі перашкаджаць эканамічнаму росту абшчын, асваенню новых зямель, тармазілі развіццё абмену, стрымлівалі ініцыятыву найбольш забяспечаных сем'яў. Гэта спрыяла ўзмацненню распаду першабытнаабшчынных адносін. Замест гарадзішчаў паявіліся адкрытыя пасяленні — селішчы. На іх сяліліся члены не толькі аднаго, а некалькіх родаў, кроўна-сваяцкія сувязі страчвалі сваю сілу і саступалі месца суседскім, тэрытарыяльным сувязям. Патрыярхальна-родавая абшчына стала знікаць, замест яе зараджалася сельская абшчына. На змену днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культурам прыйшла банцараўская культура (або культура тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны), якая была пашырана ў Падняпроўі, Падзвінні і Панямонні. Селішчы гэтай культуры размяшчаліся на пакатых узгорках у поймах рэк, на мысападобных выступах першай надпоймавай тэрасы. Часта яны ўзнікалі побач са старажытнымі гарадзішчамі, складаючы з імі адзіны гаспадарчы комплекс. Гарадзішчы часам дадаткова ўмацоўваліся земляными валамі і равамі і выконвалі функцыю сховішчаў на выпадак ваеннай небяспекі, на іх пляцоўках размяшчаліся ямы-пагрэбы, у якіх захоўваліся гаспадарчыя запасы. Жытлы банцараўскай культуры былі двух тыпаў: наземныя дамы і паўзямлянкі слупавой і зрубнай канструкцыі з агнішчамі, пазней з печамі-каменкамі. Насельніцтва займалася лядным (на поўдні тэрыторыі пашырэння гэтай культуры зараджалася ворнае) земляробствам і жывёлагадоўляй, былі развіты здабыча і апрацоўка жалеза, ганчарная, бронзаліцейная і касцярэзная вытворчасць, прадзенне і ткацтва. Жалеза здабывалася і апрацоўвалася на кожным селішчы. Рамеснікі выраблялі жалезныя сякеры, сярпы, нажы, наканечнікі коп'яў і стрэл, шылы, дэталі конскай вупражы (бляшкі, кольцы), спражкі і інш., бронзавыя бранзалеты, пярсцёнкі, бразготкі, званочкі, разнастайныя падвескі, фібулы. Гліняны посуд заставаўся ляпным, але форма яго стала

Курганны могільнік каля вёскі Замошша.

Курган каля вёскі Галошава.

больш разнастайнай: слабапрафіляваныя гаршкі, рабрыстыя і слоікавыя пасудзіны, міскі і міскападобныя гаршкі. Гладкасценны посуд зусім не арнаментаваўся. Выраблялiся гліняныя неарнаментаваныя прасліцы біканічнай формы з адносна вялікім дыяметрам адтуліны ў цэнтры. У Талачынскім раёне вядома некалькі селішчаў банцараўскай культуры: каля в. Гарбачэва (знойдзена ляпная кераміка і жалезны наканечнік стралы), каля в. Гарадзішча (каля асновы старажытнага гарадзішча знойдзена ляпная кераміка), каля в. Друцк (на поўнач ад гарадзішча і на тым месцы, дзе быў горад, знойдзена ляпная кераміка банцараўскай культуры і фібула 5 ст. н. э.). Гарадзішча-сховішча днепра-дзвінскай, банцараўскай культур і перыяду Старажытнай Русі вядома каля в. Кісялі. Сярод знаходак банцараўскай культуры — абломкі гліняных ляпных пасудзін і формачка для адліўкі трохпацеркавага ўпрыгожання. Верагодна, дзесьці каля гарадзішча знаходзіцца адначасовае яму селішча.

Каму належала банцараўская культура, да гэтага часу вучоныя яшчэ не высветлілі. Адны лічаць, што яна належала славянам, другія — балтам (продкам сучасных латышоў і літоўцаў). Бясспрэчна, што паміж банцараўскай культурай і культурай усходнеславянскіх плямён, якія прыйшлі ёй на змену, няма ніякіх генетычных сувязей. Усходнеславянскія плямёны прыйшлі з поўдня і паўднёвага захаду. Сярод мноства славянскіх плямён, якіх называе старажытнарускі летапіс «Аповесць мінулых часоў», на тэрыторыі Беларусі расселяліся крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Плямёны крывічоў насялялі Верхняе і Сярэдняе Падзвінне і Верхняе Падняпроўе, дрыгавічы жылі на поўнач ад Прыпяці, радзімічы — на ўсход ад Дняпра. Граніца паміж крывічамі і дрыгавічамі праходзіла прыблізна на поўдзень ад Оршы, Талачына і ішла далей на Барысаў, Мінск, Заслаўе, Маладзечна. Такім чынам, у 10—13 стагоддзях амаль уся тэрыторыя Талачынскага раёна была заселена крывічамі. Шчыльнасць насельніцтва ў параўнанні з заселенасцю ў папярэднія часы была значна большай. Помнікаў, якія адносяцца да перыяду Старажытнай Русі, на тэрыторыі раёна даволі многа. Гэта неўмацаваныя селішчы і курганныя могільнікі. Селішчы размяшчаліся не толькі па берагах рэк і азёр, але і на водападзелах. Доўгія гады яны разворваліся, таму ў цяперашні час ад іх амаль нічога не засталося. Лепш захаваліся курганныя могільнікі — мясціны, дзе хавалі памерлых, аднак, на жаль, і яны, калі знаходзяцца не ў лесе, а на полі, якое разворваецца, таксама свядома знішчаюцца. Яшчэ не так даўно ў Талачынскім раёне было не менш 40—50 курганных могільнікаў. У цяперашні час іх засталося не больш 20 (каля вёсак Багрынава, Воўкавічы, Галошава, Загараддзе, Замошша, Канапельчыцы, Катужына, Ляўкова, Мураўнічы, Навінка, Скавышкі, Слаўнае, Стары Талачын, Сурнаўка, Узноснае, Яскаўшчына). Раскопкі праводзіліся на курганных могільніках каля вёсак Багрынава, Воўкавічы, Замошша, Латыгаўка, Навінка і Скавышкі (даследавалі ў 1888 г. Е. Р. Раманаў, у 1967, 1969, 1971, 1973 гг. З. М. Сяргеева). Усе ўсходнеславянскія могільнікі (у тым ліку курганы крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў) па знешняму выгляду і ва ўсіх асноўных ры-

сах па зместу аднолькавыя. Адрозніваюцца яны толькі нязначнымі дэталямі пахавальнага абраду і некаторымі відамі ўпрыгожанняў: скроневых кольцаў, тыпамі пацерак і інш. Усе курганы ўяўляюць сабой круглыя ў плане насыпы дыяметрам ад 5—6 м да 10—12 м,



Пахавальны інвентар курганных могільнікаў: *1* — бронзавы бранзалет з завязанымі канцамі; *2—3* — бронзавыя грыўні і бранзалеты; *4* — бронзавыя пярсцёнкі; *5* — бронзавыя падвескі са званочкамі; *6* — бронзавая падковападобная фібула; *7* — гліняныя прасліцы; *8* — пацеркі. *9* — бронзавая спіраль-ка з трапецападобнымі падвескамі, званочкі, бронзавы ланцужок са званочкам; *10* — бронзавая грыў-ня і бранзалет; *11* — бронзавыя лунніцы; *12* — гліняная прасліца; *13* — бронзавая накладка; *14* — брон-завы пярсцёнак; *15* — бронзавая падвеска (в. Навінка).



Пахавальны інвентар курганных могільнікаў: *1* — бронзавая грыўня; *2* — падвескі з сярэбраных арабскіх дырхемаў (в. Багрынава); *3* — пацеркі (в. Воўкавічы); *4* — жалезны нож (в. Навінка); *5* — бронзавыя накладкі (в. Замошша); *6* — бронзавы пярсцёнак; *7* — бронзавая падковападобная фібула (в. Латыгаўка).

вышынёй ад 0,5—0,6 м да 2—2,5 м (у некаторых выпадках дыяметрам 14—15 м, вышынёй 4—5 м). Да 10 — пачатку 11 ст. пахавальны абрад — трупаспаленне ўбаку, у 11—13 стагоддзях панаваў абрад трупапалажэння. Нябожчыкаў хавалі часцей за ўсё на гарызонце, радзей — у насыпе кургана, у больш позні час (сярэдзіна 12—13 ст.) клалі ў ямы, пасля чаго насыпалі курган. Арыенціроўка і становішча нябожчыкаў таксама былі аднолькавыя — на спіне, з выцягнутымі рукамі, галавой на захад. Пахавальны інвентар: спецыфічныя крывіцкія ўпрыгожанні — бронзавыя або сярэбраныя бранзалетападобныя скроневыя кольцы. Галаўны ўбор выраблялся з бярэсты і тканіны. Скроневыя кольцы, па 3 на кожную скроню, мацаваліся да галаўнога ўбору скуранымі раменьчыкамі. Каралі складаліся са звычайных шкляных, пазалочаных і пасярэбраных пацерак, якія асабліва часта трапляюцца ў крывічоў, часам сардалікавых, зрэдку хрусталёвых і бурштынавых пацерак, бронзавых круглых пласціністых або ажурных падвесак, лунніц і крыжыкаў. У якасці нагрудных упрыгожанняў выкарыстоўваліся бронзавыя стылізаваныя фігуркі канькоў,

аздобленых цыркульным арнаментам, трапляюцца таксама бразготкі, лыжачкі і мініяцюрныя грабеньчыкі. Бранзалеты былі вітыя з 3—4—6 дратоў з завязанымі або петлепадобнымі канцамі, таўстадротавыя і пласціністыя. Пярсцёнкі былі драцяныя, вітыя, пласціністыя, шчытковыя. У мужчынскіх пахаваннях трапляюцца спражкі, паясныя кольцы, часам сякеры, падковападобныя фібулы (засцежкі для плашчоў), металічныя грыба- і шарападобныя гузікі, часам нажы, гаршкі. У курганах крывічоў знаходзяць балцкія ўпрыгожанні — грыўні, спіральныя пярсцёнкі, кольцападобныя спражкі, бранзалеты з змеепадобнымі канцамі; вельмі мала прылад працы і зброі — сярпоў, кос, нарогаў, рыбалоўных кручкоў, пешняў, восцяў, долатаў, наканечнікаў коп'яў і стрэл, затое часта трапляюцца калчанападобныя і авальныя крэсівы; у жаночых пахаваннях — шыферныя прасліцы. Крывічы займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, хатнімі промысламі. Пісьмовыя звесткі пра іх ёсць у візантыйскага гісторыка Канстанціна Багранароднага і ў пачатковым летапісе «Аповесці мінулых часоў». У 7—9 стагоддзях у сацыяльных адносінах крывічы — саюз плямён, у рамках якіх фарміраваліся класы, дзяржаўнасць («княжанні»), народнасць. У 10 ст. крывічы ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі, удзельнічалі ў паходах Алега (пачатак 10 ст.) і Ігара (944 г.) супраць Візантыі. Апошні раз упамінаюцца ў летапісе пад 1162 г.

А. Р. Мітрафанаў.



Пахавальны інвентар курганных могільнікаў: *1* — гліняное вядро з вушкам; *2* — гліняны гаршчок (в. Замошша); *3* — гліняны гаршчок; *4* — жалезны наканечнік кап'я (в. Навінка); *5* — жалезны нож; *6* — жалезная сякера; *7* — бронзавая падковападобная фібула (в. Багрынава).

Старонкі мінулага

У 9—10 стагоддзях склалася раннефеадальная дзяржава Кіеўская Русь з цэнтрам у Кіеве. У 1-й чвэрці 11 ст. Ноўгарад, Тураў, Полацк спрабавалі аддзяліцца ад Кіева. Пасля смерці Уладзіміра Манамаха (1125) Кіеўская Русь распалася на самастойныя дзяржаўныя ўтварэнні, у тым ліку аддзялілася і Полацкае княства, у склад якога ўваходзілі землі Талачыншчыны. Яно існавала ў 10—13 стагоддзях у басейне Заходняй Дзвіны, Бярэзіны, Нёмана на тэрыторыях сучасных Віцебскай, паўночнай часткі Мінскай і Магілёўскай абласцей. Найбольшымі гарадамі княства былі Полацк, Віцебск, Мінск, Друцк, Барысаў, Ізяслаўль (Заслаўе), Лагожск (Лагойск). Выгаднае размяшчэнне на водных шляхах (заходне-дзвінскае адгалінаванне шляху «з варагаў у грэкі») садзейнічала яго хуткаму эканамічнаму і культурнаму развіццю. Найбольшага росквіту Полацкае княства дасягнула пры князю Усяславу Брачыславічу, а пасля яго смерці ў 1-й палавіне 12 ст. распалася на некалькі самастойных удзельных княстваў, у тым ліку Мінскае, Віцебскае, Друцкае, Лагожскае, Ізяслаўскае. Сярод іх паступова стала набіраць сілу Друцкае княства з цэнтрам у Друцку (летапісны Друтеск, Друтеск, Друческ). З гэтым княствам непарыўна звязана старажытная гісторыя Талачынскага раёна. З канца 13 ст. тэрыторыя, якую займае сучасны Талачынскі раён, у складзе Вялікага княства Літоўскага. У спісе гарадоў гэтага княства, змешчаным ва Уваскрасенскім летапісе, значыцца і горад «Обльче» (цяпер в. Абольцы Талачынскага раёна). Вядома, што польскі кароль і вялікі князь літоўскі Ягайла ў 1387 г. заснаваў у Абольцах касцёл. Гэту дату можна лічыць пачаткам рымска-каталіцкай экспансіі ў Беларускім краі. У 1-й палавіне 16 ст. Абольцы лічыліся прыватным уладаннем Боны — польскай каралевы і жонкі вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога. У 2-й палавіне 16 ст. яе сын — кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст — аддаў іх разам з мястэчкам Смаляны ўдзякшаму з Расіі князю Андрэю Курбскаму, які пазней перадаў іх князю Сангушку. У 1532 г. ў Аболецкай воласці адбылося антыфеадальнае выступленне — сяляне адмовіліся выконваць дадатковыя павіннасці (глядзі артыкул «Выступленне супраць паншчыны»).

Дакладная дата заснавання Талачына невядома, але ўпершыню ён упамінаецца ў 1433 г. як мястэчка ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Геаграфічнае размяшчэнне яго было вельмі зручным. На той час Талачын уваходзіў у Аршанскі павет Віцебскага ваяводства, праз яго ішоў бойкі гандаль Маскоўскай дзяржавы з гарадамі Вялікага княства Літоўскага і Польшчай. У «Рашэнні сходу купцоў Магілёва аб стварэнні грашовага фонду для аказання дапамогі купцам, пацярпелым ад рабавання» ад 23.3.1623 г. (Беларусь у эпоху феадалізму. Мн., 1959. Т. 1. С. 330—331, на рус. мове) упамінаецца Талачын, які праязджалі купцы па гандлёвым тракце з Магілёва на Барысаў, Мінск і далей. У 1-й палавіне 17 ст. шмат купцоў з Магілёва мелі свае крамы ў Талачыне, тут жа яны гандлявалі на кірмашах і таржках.

Шлях, што пралягаў праз Талачыншчыну з Захаду на Усход, быў не толькі гасцінцам для купцоў і падарожнікаў. У неспакойныя гады міждзяржаўных войнаў і княжацкіх міжусобіц па ім пракатваліся смерць і спустошэнне. У руска-літоўскую вайну 1507—08 гг. праз Талачыншчыну прайшлі рускія войскі, а потым пад націскам большых сіл Вялікага княства Літоўскага яны з баямі пакінулі Барысаў і Талачын і адкаціліся да Оршы. Пасля «вечнага міру» 1508 г. вайна ўспыхнула зноў і з пераменным поспехам бакоў працягвалася з 1512 да 1522 г. Не мінаючы Талачыншчыны, войскі Вялікага княства Літоўскага даходзілі да Оршы, а войскі рускай дзяржавы — да Мінска. У час рускапольскай вайны 1632—34 гг. праз талачынскія землі прайшло да Смаленска 25-тысячнае войска Рэчы Паспалітай. Не абмінула Талачыншчыну і вайна 1654—67 гг. паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай за Беларусь і Украіну. Як ва ўсякіх войнах, сяляне зведалі і мабілізацыі, і паборы, і рабаўніцтва, і пажары, і смерць.

У пачатку 17 ст. Талачын належаў Сапегам — прадстаўнікам аднаго з буйнейшых магнацкіх родаў на Беларусі. У 1604 г. канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега заснаваў тут касцёл, адкрыў школу і бальніцу. У 1621 г. ў Талачыне было 314 дамоў. У час вайны 1654—67 гг. ён быў спалены, асталіся толькі 142 дамы. У 2-й палавіне 17 ст. Талачын паводле духоўнага завяшчання перайшоў ад Сапегаў да Шэміётаў. Па архіўных дакументах 1674 г. і 1676 г. Талачын вядомы як горад Аршанскага павета. У час Паўночнай вайны (1700—21 гг.), якую вяла Расія (у саюзе з Рэччу Паспалітай) супраць Швецыі, праз Талачыншчыну праходзілі рускія, польскія, малараСійскія (украінскія) і шведскія войскі. У час ваенных дзеянняў па шляху з Лукомля ў Магілёў праз Талачын праехаў князь А. Меншыкаў. Мяркуючы, што

Фрагмент карты Вялікага княства Літоўскага. 1613 г. Гравёр Т. Макоўскі.

Карл XII пераправіцца цераз Бярэзіну каля Барысава, Меншыкаў вырашыў даць адпор ворагу, але шведы пераправіліся каля Бярэзіно. Пра ваенную хітрасць ворага Меншыкаў паведаміў Пятру I у пісьме з Талачына ад 16.6.1708 г. Тут ён выказаў свае меркаванні пра мэту далейшага паходу Карла XII у межы Украіны: «а понеже по ведомостям неприятель хочет ниже Быхова Днепр перебираться, то совершенно я чаю что пойдет на Киев или на прочие Малороссийские городы» (Дамбавецкі А. С. Спроба апісання Магілёўскай губерні. Магілёў, 1882. Кн. 1. С. 87, на рус. мове). Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. граніца паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай прайшла па рацэ Друць. Усходняя частка Талачына ўвайшла ў склад Расійскай імперыі і стала называцца Стары ці Рускі Талачын, заходняя (за р. Друць) — Зарэчны ці Новы Талачын — да 1793 г. асталася ў складзе Рэчы Паспалітай. Стары Талачын быў цэнтрам Стараталачынскай воласці Копыскага, з 1861 г. Аршанскага паветаў, а Новы Талачын быў цэнтрам Зарэчнаталачынскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. Два мястэчкі, якія ўваходзілі ў розныя паветы (а на 1772—1793 гг. і ў розныя дзяржавы), былі фактычна адным населеным пунктам. У царскім указе ад 15.2.1782 г. аб умацаванні рубяжоў Магілёўскай губерні Талачын названы горадам, а ва ўказе ад 9.2. 1783 г.— аб утварэнні ў ім таможні — мястэчкам. Так па працягу ўсёй гісторыі Талачын называўся то горадам, то мястэчкам.

У тыя часы галоўным напрамкам на захад быў грунтавы шлях, які вёў з Масквы. Талачын стаяў на гэтым шляху і быў пагранічным пунктам. На ўсход ад яго былі землі, што належалі Расіі, на захад — землі Рэчы Паспалітай. Сюды, у пагранічны Талачын, па дарозе за мяжу прыбыў 23.8.1777 г. Дэ. І. Фанвізін — аўтар шырока вядомых п'ес «Недаросток» і «Брыгадзір». Ён прабыў тут час, неабходны для афармлення дакументаў, і пакінуў Талачын. У той жа дзень яго карэта праехала праз вёску Славені і паштовую станцыю Маляўка.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай епіскап-сутфраган у Абольцах Богуш-Сестранцэвіч звярнуў на сябе ўвагу многіх каранаваных асоб. Гэта быў выхаванец некаль-

кіх універсітэтаў Еўропы, настаўнік Радзівілаў. Імператрыца Екацярына II са згоды рымскага папы даручыла яму кіраванне каталіцкай паствай на Беларусі, аддзеленай ад Віленскай епархіі.

Цікавыя запісы пакінулі некаторыя падарожнікі, шляхі якіх вялі праз Талачын. Так у 1810 г. Бранеўскі і Маяркевіч пісалі, што Орша намнога меншая за Талачын. Англічанін Р. Джонстан сцвярджаў, што Талачын раскіданы па ўзгорках. Французскія падарожнікі А. Фарсья дэ Піль і П. Буажэлен дэ Кердзю пісалі, што Талачын здаўся ім «вялікай вёскай, якую называюць горадам». Браневскі наадварот лічыў, што па плошчы ён «не ўступіць Мінску». Ля Талачына Севяргін бачыў некалькі ставоў для вадзяных млыноў. У запісках падарожнікаў адзначана, што ў Талачыне была калегія на шэсцьдзесят вучняў пры уніяцкім кляштары (Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980. С. 151, 249, 252).

Цяжкім выпрабаваннем для Талачыншчыны была Айчынная вайна 1812 г. Французы нанеслі вялікія страты Талачыну і навакольлям. Разбурэнне краю дасягнула крайняй мяжы. Вёскі Кацэвічы, Гастынічы, Манастыры, Еўлахі, Жукнева, Варанцэвічы, Палачанка, Башарова, Любанічы, Рэчкі, Плоскае, Вялікія Козкі, Малыя Козкі, Красілава, Сані, Валькі, Сакалянка, Пяровалачня, Зарэчча, Марцюхова, Кучына, Астрашапкі і многія іншыя былі разбураны, вёскі Маляўка, Нарцызава, Славені, Курапава, Яблынька, Коханава і іншыя спалены. У Талачыне былі спалены 2 каспёлы, казённы паштовы двор, 30 крам, 56 сялянскіх двароў і інш.

Гнеў і абурэнне выклікала варожае нашэсце ў мясцовага насельніцтва. Вядомы выпадак, калі селянін Ляховіч з вёскі Кацэвічы забіў трох французаў, сяляне з вёскі Маляўка спалілі групу захопнікаў, якія начавалі ў канюшні. Вялікую дапамогу аказвала мясцовае насельніцтва зборам і перадачай звестак пра ворага. «Мы своечасова даведваліся,— пісаў адзін з рускіх афіцэраў,— не толькі аб перамяшчэннях і аб месцах раскватаравання французскіх войск, але нават і аб тых пунктах, дзе Напалеон памячаў пераправы. Так, Барклаю дэ Толі з Полацка 5 ліпеня паведамілі, што ад мясцовага насельніцтва атрыманы звесткі аб тым, што частка французскіх войск рушылася з Барысава да Оршы і што французы ўжо ў Талачыне...» (Карнейчык Я. І. Беларускі народ у Айчыннай вайне 1812 года. Мн., 1962. С. 35, на рус. мове). У час уцёку Напалеона ў лістападзе 1812 г. праз Талачын рускія войскі ўзялі ў палон тут 600 салдат французскай арміі.

За кароткі час пасля напалеонаўскага нашэсця мястэчка было адноўлена. Ужо ў красавіку 1825 г. магілёўскі грамадзянскі губернатар звярнуўся да генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага з прапановай аб пераводзе павятовага кіравання з горада Копыся ў мястэчка Талачын і пераўтварэнні апошняга ў горад, паколькі Талачын стаіць на вялікім тракце і амаль у цэнтры павета, мае зручнае становішча, дастатковую колькасць дамоў для службовых памяшканняў, тры царквы, касцёл і вучылішча пры манастыры. Генерал-губернатар не пярэчыў, аднак параіў звярнуцца да князя Сангушкі, без згоды якога нельга рабіць ніякіх перабудоў. Сангушка адказаў адмоўна, спасылаючыся на тое, што заснаванне горада ў Талачыне «не прынясе яму ніякага прыбытку».

У Талачыне працягваў развівацца гандаль. У справаздачы магілёўскага губернатара аб стане гандлю і суднаходстве ў губерні за 1847 г. адзначаецца, што ў Талачыне былі 3 кірмашы на год: Мікалаеўскі — 9 мая, Ільінскі — 20 ліпеня, Успенскі — 8 верасня. Галоўным прадметам гандлю на кірмашах былі сукно, шаўковыя, баваўняныя, папяровыя вырабы, фаянсавы, хрусталёвы і шкляны посуд, жалеза, чай, цукар, галантарэйныя вырабы, соль, мыла, свечкі, тытунь, рыба і іншыя харчовыя прадукты. Большая частка гэтых рэчаў прывозілася з іншых губерняў. У 1848 г. «Могилевские губернские ведомости» пісалі, што пры мястэчках Друцк і Талачын па р. Друць ішоў сплаў лесу ў Кіеў, Екацярынаслаў, Крамянчуг, Херсон і Рыгу (№ 48, с. 857). З Магілёўскай губерні да Екацярынаслава плыт ішоў каля 2 месяцаў, да Херсона 3—4 месяцы. Таму на плыце ставілі будан («курэнь») — хатку з печкаю, якая служыла плытагонам месцам адпачынку і гатавання ежы. Не менш доўгай была для іх і дарога назад: яны часта былі вымушаны варочацца дамоў пешшу. У дарозе траціліся значная частка зароблены грошай, і ў выніку сялянская гаспадарка, якая адпусціла на ўсё лета свайго асноўнага работніка, амаль нічога не выгадвала.

Да сярэдзіны 19 ст. ва ўмовах крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы сельская гаспадарка прыйшла ў заняпад. Прыгонніцтва, голад і галеча выклікалі рэзкае абвастрэнне класавай барацьбы ў вёсцы. Сялянскі рух у краіне прымаў усё больш вострыя формы, што вымусіла царызм правесці рэформу 1861 г. па адмене прыгоннага права. Рэформа была праведзена ў інтарэсах памешчыкаў-прыгоннікаў і не дала ніякай палёгкі сялянам. Напярэдадні рэформы і пры складанні ўстаўных грамат памешчыкі адабралі ў сялян амаль усе лепшыя землі. У краіне пачаліся сялянскія паўстанні, якія закранулі і Талачыншчыну.

16 мая 1861 г. дваранскі прадвадзіцель даносіў копіскаму спраўніку з вёскі Абольцы, што сяляне памешчыка Іосіфа Заржэцкага адмаўляюцца выконваць павіннасці, агаворваныя ў найвысачэйша зацверджаных «Палажэннях», і гэтым спыняюць палявыя работы. Размова ішла аб сялянах з вёсак Абольцы, Крывыя, Пішчакіна, Кісялёва і іншых. Найбольш ухіляліся ад выканання павіннасцей у Абольцах Юсцін Багун, у Крывых Сцяпан Грамок, у Пішчакіне Сцяпан і Ермалай Ліцвінкі, у Кісялёве — Францыск. Гэтым дружным і смелым выступленнем жыхары названых вёсак дабіліся некаторага паляпшэння свайго становішча. Памешчык Заржэцкі быў вымушаны пайсці на кампраміс і для некаторых сялян адмяніў адзін дзень паншчыны, астатнім паабяцаў зрабіць тое самае, калі яны ў далейшым будуць «паслухмянымі».

Улады жорстка расправаліся з непакорнымі. Паўстанні падаўляліся сілай. Некаторыя беларускія вёскі былі заселены сялянамі з Расіі. Адной з такіх вёсак на Талачыншчыне была в. Загараддзе. Яе карэнныя жыхары, якія не засталіся ў баку ад трывожных падзей 60-х гадоў, былі выселены за межы Беларусі. Сама ж вёска была заселена 15 сялянскімі сем'ямі з Разанскай губерні.

Своеасаблівай формай пратэсту супраць увядзення новых зямельных парадкаў былі скаргі. Так, сяляне в. Нагаўкі Коханаўскай воласці ў 1866 г. скардзіліся магілёўскаму губернатару на памешчыка, які пры ўвядзенні ўстаўной граматы адабраў у іх землі, жыхары в. Таласкаўшчына Зарэчнаталачынскай воласці прасілі старшыню сенненскага і чэрыкаўскага міравых з'ездаў аб пераацэнцы адведзенай ім непрыдатнай зямлі. 35 гадоў разбіралася цяжба сялян в. Пляшыўцы (зараз в. Зялёная) з памешчыкам Славінскім, які ў 1874 г., перабудоўваючы млын, падняў плаціну на р. Друць, у выніку чаго вада затапіла сялянскія сенажаці (больш падрабязна пра гэта глядзі ў артыкуле «Справа, якая цягнулася 35 гадоў»). Сялянскія выступленні і пагроза аграрнай рэвалюцыі прымусілі царскія ўлады пайсці на пэўныя ўступкі: рэформа 1861 г. праводзілася на тэрыторыі Беларусі на больш выгадных для сялянства ўмовах. Аднак становішча яго заставалася цяжкім. Нізкі ўзровень вытворчасці, малазямелле, горшыя зямельныя надзелы, што памешчыкі вылучылі сялянам, былі прычынаю частых неўраджаяў. Сялянам хлеба хапала часам да студзеня — лютага і то пры ўмовах, што ў хлеб дамешвалі мякіну, кветкі канюшыны. Многія з сялянскіх сем'яў пе мелі кароў і іншай жывёлы. У 1900 г. на тэрыторыі сучаснага Талачынскага раёна не было ніводнага ветурача. Сяляне, змучаныя галечай, малазямеллем, голадам, пакідалі родныя мясціны, ехалі ў Сібір, за мяжу. Так, у 1897—1905 гг. з Сенненскага павета ў Заходнюю Сібір перасялілася 288 сялянскіх сем'яў, у тым ліку з Талачына, вёсак Забалацце, Пярэвалачня, Маціёва і інш.

Пасля адмены прыгоннага права развіццё капіталізму па Беларусі паскорылася. Зрухі, якія адбываліся ў эканамічным жыцці краіны, не абмінулі і Талачыншчыну. У 1871 г. быў адкрыты Смаленска-Брэсцкі ўчастак Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. Дарога прайшла ў трох кіламетрах ад Талачына, дзе была пабудавана чыгуначная станцыя. На працягу 1881 г. тут было адпраўлена і прынята адпаведна 161 і 62 тысячы пудоў грузаў. Вывозілі ў асноўным жыта, ячмень, авёс, а таксама льняное і капапляпае семя, лясныя матэрыялы ў Рыгу, Лібаву. У 2-й палавіне 19 ст. на Талачыншчыне працавалі фабрыкі і заводы: крухмальныя ў Юзафполлі і маёнтку Рапава, 3 гарбарныя ў Талачыне, сукнавальныя ў вёсках Крывое. Галошаўка, Пярэвалачня, крупадзёрныя ў Маляўцы, Лемніцы. Галошаўцы, чыгуналіцейны, кафляны і цагельны заводы ў маёнтку Лемніца, цагельня ў в. Мураўнічы. Усе яны былі ва ўладанні мясцовых папоў, мелі нізкі тэхнічны ўзровень. Была пашырана саматужная вытворчасць: кушнерская ў Высокім Гарадцы, Талачыне, Нарцызаве, Запруддзі, Замошшы, Воўкавічах; рымарская ў Загацці, Талачыне і інш.; кравецкая ў Алёнавічах, Жураўлях, Казігорцы. Абольцах, Чыгляях, Марцюхове, Коханаве, Звяначах, Валосаве, Маціёве, Славенях, Табароўшчыне, Талачыне і інш.; шавецкая ў Абольцах, Талачыне, Коханаве, Манастырах, Славенях і інш.; сталярпая ў Талачыне, Коханаве, Галошаўцы; кавальская ў Абольцах, Талачыне. Народная адукацыя і медыцынскае абслугоўванне былі на нізкім узроўні. Сетка навучальных устаноў расла слаба. Першае вучылішча было адкрыта ў Старым Талачыне ў 1863 г. На яго ўтрыманне сялянскае грамадства выдзеліла 200 руб. У 1878—1879 навучальным годзе тут займалася 29 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі. У 1868 г. было адкрыта Коханаўскае, а ў 1869 — Зарэчнаталачынскае народныя вучылішчы. У наваколлях Талачына было некалькі царкоўнапрыходскіх школ, двухгадовыя земскія школы ў вв. Пляшыўцы і Падбярэззі. Паводле перапісу насельніцтва 1897 г. ў Сенненскім павеце, куды ўваходзіла значная частка тэрыторыі сучаснага Талачынскага раёна, пісьменных было 11,9 %.

У 1870 г. ў раёне Талачына ўзнікла эпідэмія халеры. Шмат людзей памерла. Улады вымушаны былі адкрыць у Коханаве бальніцу, а ў Талачыне ў канцы 19 ст. была адкрыта аптэ-

ка. Але гэтыя меры не задаволілі патрэб насельніцтва ў медыцынскім абслугоўванні. На медыцыну казна выдзяляла мізэрныя сродкі, не было кваліфікаваных урачоў (на ўвесь Сенненскі павет у пачатку 20 ст. былі толькі 4 фельчары). Таму сярод працоўных была высокая смяротнасць.

Паводле перапісу 1897 г. ў мястэчку было 2614 жыхароў, у пачатку 20 ст.— 3714 жыхароў, 391 жылы дом, у тым ліку 6 цагляных пабудоў, 2 гарбарныя, цагельны, піваварны заводы, гута, млын, школа, 2 народныя вучылішчы, бясплатная народная чытальня павятовага камітэта апякунства аб народнай цвярозасці, бібліятэка Стараталачынскага мяшчанскага таварыства, паштова-тэлеграфная кантора, якая мела аддзяленні ў Коханаве і Абольцах. *Н. В. Шайрук, А. А. Шнэйдар.*

Горад на Друці

Старажытны Друцк... Кожнаму, хто ведае беларускую гісторыю, гэта назва нагадвае многае. Калісьці князі друцкія і князі мінскія змагаліся за права на полацкі трон. Друцк бачыў пад сваімі сценамі не толькі полацкіх і мінскіх князёў, але і Уладзіміра Манамаха і сына яго Мсціслава Вялікага, нават героя «Слова аб палку Ігаравым» Ігара Святаславіча. Непрыступнай крэпасцю стаяў Друцк у 11—12 ст., а потым некуды «знік», нібы праваліўся, і пра яго забылі...

У 1956 г. археалагічная экспедыцыя АН СССР пачала раскопкі старажытнага Друцка. На высокім правым беразе ракі Друці каля сучаснай в. Друцк Талачынскага раёна перад археолагамі адкрыліся рэшткі старажытнага горада: магутныя валы, на якіх некалі стаялі непрыступныя драўляныя сцены з адной дазорнай і дзвюма праязнымі вежамі, глыбокія равы (відаць, іх запаўнялі вадою). Раскопкі дазволілі даволі поўна ўзнавіць гісторыю горада. Ён быў заснаваны на месцы паселішча 4—5 ст. н. э., аб чым сведчыць знойдзеная ў час раскопак на друцкім дзядзінцы арбалетная фібула 4—5 ст. Летапісы ўпамінаюць Друцк пад 1092 г., аднак, мяркуючы па «Павучанні» Уладзіміра Манамаха (1053—1125), горад існаваў у 1078 г.

Раскопкі шматлікіх курганоў у вярхоўях Друці сведчаць аб распаўсюджанні там пахаванняў па абраду трупаспалення з урнамі, зробленымі на ганчарным крузе. Абрад трупаспалення перастаў існаваць на Русі да 10 ст. (эрэдку трапляўся ў пачатку 11 ст.). Ганчарны круг з'явіўся ў 10 ст. Абломкі посуду, знойдзеныя ў ніжніх слаях друцкага дзядзінца, сведчаць, што ён быў зроблены на ганчарным крузе і па тыпу датуецца 12 ст. Усе старажытныя рэчы, знойдзеныя ў ніжнім культурным слоі Друцка, былі пашыраны на Русі ў 10 — пачатку 11 ст. Гэта дае падставу меркаваць, што Друцк узнік у пачатку 11 ст. ў гушчы старажытнарускіх паселішчаў, якія існавалі ў міжрэччы Дняпра і Усвейкі. Тут праходзіла заходняе адгалінаванне вядомага шляху «з варагаў у грэкі» — сухапутны волак з басейна Заходняй Дзвіны ў басейн Дняпра. Жыць на ім было выгадна — тут сяліліся «ва-

Вал гарадзішча старажытнага Друцка.

Прылады працы і прадметы ўзбраення: *1* — кавальскі молат; *2* — тыгель; *3* — ліцейная форма; *4—6* — наканечнікі стрэл: арбалетны *(4)*, т. зв. «татарскі» *(5)*, вёслападобны *(6)*; *7* — крэсіва 11—12 ст.; *8* — шпора; *9* — крэсіва 13 ст.; *10* — скрэбла; *11* — частка пласціністага даспеха; *12* — наканечнік кап'я.

лачане», якія мелі цяглавую жывёлу, «колы» і іншыя прыстасаванні для транспарціроўкі грузаў па волаку. Волак прыцягнуў увагу феадалаў. Яны збудавалі тут крэпасць. Крэпасць дала пачатак гораду.

Княжацкая частка горада, так званы дзядзінец, займала плошчу ў адзін гектар і была найбольш умацаваная. Нават у час раскопак яе валы дасягалі 10 м у вышыню, а раней яны былі яшчэ вышэй. Глыбіня рова вакол дзядзінца была на поўдні 12 м, на захадзе 6 м.

Друцкі дзядзінец — складаны чатырохслой-

ны помнік. Ніжні слой 11 ст. даволі тонкі і мала выразны, бо жыццё горада ў гэты час было неінтэнсіўнае, ён забудоўваўся мала, хаатычна, рэшткі дамоў амаль не захаваліся. Датаваць самы ранні друцкі культурны слой дапамагаюць знойдзеныя ў ім рэчы. Напрыклад, кубічны замок — адзіны тып замкоў, вядомых у 10—11 стагоддзях. У 12 ст. падобныя замкі ўжо нідзе не сустракаліся. Характэрныя таксама пацеркі «ў вочкі», пацеркі-лімонкі, модныя ў Старажытнай Русі ў 10 і першых дзесяцігоддзях 11 ст., у сярэдзіне 11 ст. яны ўжо не выкарыстоўваліся. З поўначы да дзядзінца прымыкаў вакольны горад, умацаваны сяміметровым валам і глыбокім ровам. Каб трапіць да князя, трэба было праз пад'ёмны мост над ровам праехаць у надбрамную вежу вакольнага горада, потым узняцца на гару дзядзінца і праехаць праз другую надбрамную вежу. Вежы мелі складаную сістэму двайных брам. Увайшоўшаму або ўехаўшаму пад вежу, даводзілася чакаць, пакуль варта, зачыніўшы адну браму, адчыніць другую. Перасцярога была на тыя часы не лішняя: падазронага наведвальніка лёгка можна было абяззброіць у цемры паміж замкнёнымі брамамі.

Аднак межы старажытнага Друцка ішлі далей за дзядзінец і вакольны горад. Культурны пласт на агародах сучаснай вёскі Друцк сведчыць, што пад сценамі ўмацаванага горада быў неўмацаваны пасад рамеснікаў і гарадской беднаты, займаў плошчу большую, чым дзядзінец і вакольны горад. У час аблогі пасадскі люд з набыткам і жывёлаю мог хавацца за гарадскімі сценамі і разам з дружынаю абараняць Друцк. Каля самага пасада, а месцамі і на яго тэрыторыі ўзвышаліся штучныя пагоркі — старажытныя курганы, рэшткі калісьці вялікага курганнага могільніка.

Такім чынам, пры раскопках былі выяўлены ўсе часткі горада Друцка ранняга сярэднявечча: дзядзінец, вакольны горад, пасад і курганны могільнік 12—13 ст. Такога амаль цалкам захаванага комплексу не мае ні адзін старажытны беларускі горад, і Друцк у гэтым сэнсе — класічны помнік.

Археалагічныя раскопкі і летапісы далі магчымасць зазірнуць у гісторыю старажытнага Друцка. Гэта быў буйны цэнтр княства, які вырас па важных гандлёвых шляхах. У ім за магутнымі ўмацаваннямі жыў князь са сваёю дружынай і баярамі: на дзядзінцы — сам князь, ускраіну займалі рамеснікі і князева абслуга. У вакольным горадзе жыла дружына, а вольныя рамеснікі і гарадская беднота — на неўмацаваным пасадзе. Жыццё дзядзінца было цесна звязана з ваенным побытам. Тут знойдзена шмат рэчаў ваеннага ўжытку. Сярод паканечнікаў стрэл трапляюцца наканечнікі ад ранніх утулкавых двухшыпных і бранябойных да параўнальна поз-

Старонкі старажытных летапісаў, у якіх упамінаецца Друцк. Злева направа: Баркулабаўскі летапіс (захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве, л. 164 аб.), Еўраінаўскі летапіс (захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве старажытных актаў у Маскве, л. 446), Летапіс археалагічнага таварыства (захоўваецца ў Рукапісным аддзеле Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе, л. 71 аб.).

Прадметы побыту, упрыгожанні: *1* — бронзавы крыж-энкалпіён; *2* — сярэбраная падвеска; *3* — касцяная шахматная фігурка; *4* — капавушка; *5* — касцяны амулет; *6* — бронзавае пісала; *7* — шыферная прасліца з надпісам «къняжинъ»; *8* — касцяны грэбень; *9* — бронзавая шыйная грыўня; *10* — бронзавая зашчапка ад кнігі; *11* — фрагмент сярэбранага бранзалета са сканню; *12, 13* — бронзавыя чашачкі вагаў ювеліра; *14* — касцяны грэбень; *15* — глінянае прасліца з княжацкім знакам; *16* — свінцовая гірка.

ніх (13—14 ст.) вёслападобных і арбалетных. Да зброі далёкага бою адносяцца накладкі і пятля калчана, а таксама налуччы. Наступальная зброя блізкага бою прадстаўлена наверш мяча, кап'ём і кісцянямі, абарончая — арыгінальнымі пласцінамі ад панцыра, па-мастацку ўпрыгожанымі арнаментамі, і простымі пласцінамі панцыра, фрагментамі

кальчугі. Знойдзены рэчы з рыштунку коннікаў.

У штодзённым побыце жыхары дзядзінца карысталіся шматлікімі дробнымі рэчамі: замкамі, крэсівамі, грабянямі, ручнымі жорнамі, нажамі, гліняными пасудзінамі. Знойдзена нямала жаночых упрыгожанняў: бранзалеты, пярсцёнкі, шпількі, падвескі. Дручане вызначаліся высокай культурай. Пісьменнымі былі не толькі манахі і багатыя людзі, але і некаторыя княжацкія рамеснікі. Так, апрача праселка з надпісам «къняжинъ», знойдзена ў час раскопак некалькі зашчэпак ад кніг, а таксама так званыя пісалы, праселка з імем «Лола». Знойдзена і пяць шахматных фігур з розных камплектаў. Сярод друцкіх рамеснікаў трапляліся добрыя мастакі-каспярэзы. Пра гэта сведчаць некалькі касцяных пласцін з надзвычай тонкім арнаментам, а таксама частка сярэбранага бранзалета са скаванню. Падобныя рэчы на Русі амаль невядомыя (адзіная аналогія бранзалета знойдзена ў Кіеве). Шматлікія рэчы адносяцца да рускага праваслаўнага культу: крыжы-энкалпіёны, нацельныя крыжыкі, вечкі (ад кадзіла?). Вельмі прыгожы адліты ў аднабокай форме невялікі нагрудны крыж з рэльефнымі выявамі тройцы (уверсе), грамніцы (з левага боку), сашэсця ў пекла (з правага боку), распяцця (пасярэдзіне), праабражэння і сашэсця святога духа па анёлаў (ніжняя частка ствала). Падобныя крыжы вядомы сярод старажытнасцей 15—16 ст.

У Лаўрэнцьеўскім спісе, у «Павучанні» Уладзіміра Манамаха запісана, што Уладзімір Манамах праехаў, «воюя», праз Друцк у Чарнігаў (1078). Можна меркаваць, што ў канцы 11 ст. вакол Друцка сфарміравалася Друцкая акруга — воласць — група паселішчаў, ужо даўно звязаных друцкім водным шляхам з горадам. Цалкам трапіўшы пад уладу феадала, гэтыя паселішчы сталі зародкам Друцкага ўдзела, пра які пазней паведамляюць летапісы. Калі меркаваць па курганах, Друцкая воласць займала тэрыторыю ўздоўж рэк Бобр, Усвейка і Абалянка па паўднёвым захадзе і на поўначы, Адроў на ўсходзе, уздоўж Друці на поўдні і да левага берага Бярэзіны на захадзе. «Юрыдычнае» афармленне княжацкія ўдзелы атрымалі пасля смерці полацкага князя Усяслава Брачыславіча (1101). Тады ж сыны Усяслава падзялілі ўладанні: Давыд княжыў у Полацку, Глеб — у Мінску, Барыс — у Друцку. Адсюль пайшлі друцкія князі Барысавічы.

Паводле звестак В. М. Таціпічава, які чытаў летапісы, што не дайшлі да нас, у 1102 г. Барыс хадзіў на яцвягаў і, вяртаючыся, заснаваў горад Барысаў — напэўна, каб умацаваць заходнія граніцы свайго ўдзела.

На пачатку існавання Друцк быў яшчэ слабым горадам. Так, у 1116 г. сын Уладзіміра Манамаха пераяслаўскі князь Яраполк Уладзіміравіч атрымаў перамогу над Друцкам, а дручан выселіў у спецыяльна забудаваны для іх горад Жоўдзень на Украіне. Яраполк жорстка абышоўся з Друцкам: і дзядзінец, і вакольны горад былі цалкам спалены.

Спатрэбілася нямала часу, каб горад узняўся з папялішчаў. Забудова яго цяпер падпарадкоўвалася валу. Асабліва клапаціўся князь Барыс аб умацаванні дзядзінца. Пасля пажару 1116 г. ў цэнтры дзядзінца ўзнікла плошча, на поўдзень ад яе былі пракладзены дзве вузкія крывыя вуліцы: галоўная вяла да ўезду ў горад, а перпендыкулярная да яе ішла ўздоўж паўднёвага вала. Непадалёку знаходзілася студня.

Уздоўж вуліц, сярод шматлікіх платоў, што аддзялялі сядзібы адну ад адной, у паўднёвай частцы дзядзінца археолагамі былі расчышчаны нізкія вянцы дамоў, свірнаў, хлявоў і іншых будынкаў. Рэшткі збудаванняў, шматлікія знаходкі сведчаць, што ў сярэдзіне 12 — пачатку 13 ст. жыццё ў горадзе было вельмі інтэнсіўнае. У паўднёвай частцы дзядзінца жылі рамеснікі: тут выяўлены рэшткі шавецкай (шылы, скураныя абрэзкі), ювелірнай (тыглі, ліцейныя формы і інш.), касцярэзнай (у адным з раскопаў было шмат загатовак і вырабаў з косці), слясарна-кавальскай, пяслярскай, ткацкай, шавецкай, ганчарнай вытворчасці. Знойдзеныя на цэнтральнай гарадской плошчы кавалкі шпораў і страмён паказваюць, што тут збіралася ў паход дружына.

Асаблівую цікавасць мае заходняя частка дзядзінца, абгароджаная высокім валам, а з поўначы, з боку вакольнага горада, умацаваная дадатковым валам. Ні вуліц, ні хат, ні гаспадарчых пабудоў тут няма. На гэтым участку раскапаны рэшткі двух створаных у розны час вялікіх будынкаў з печамі-каменкамі. Вакол іх незабудаваная вялікая пляцоўка, на якой відаць рэшткі драўлянага машчэння. Іншыя тут і знаходкі, больш упрыгожанняў, сярод якіх — шырокі пласціністы сярэбраны бранзалет са скаванню, віты бронзавы бранзалет з лапаткападобнымі канцамі, сярэбраны віты і некалькі бронзавых пярсцёнкаў, дзве залатыя пацеркі. Есць і унікальныя рэчы: сярэбраны пярсцёнак з княжацкім знакам, два шыферныя праселкі — адно з княжацкім знакам, а другое з надпісам «къняжинъ», рэдкі музычны інструмент варган. Відаць, гэта тэрыторыя была блізкай да княжацкіх харомаў або часткай «къняжа двара», які займаў амаль палавіну дзядзінца і быў найбольш умацаваны. Паўднёвая частка дзядзінца была заселена простымі людзь-

мі і вельмі густа забудавана маленькімі хаткамі.

З узнікненнем хрысціянства на Русі ў гарадах Старажытнарускай дзяржавы пачалі будаваць цэрквы. Была царква і ў Друцку. У Друцкім евангеллі 14 ст. запісана: «В лето 6509 (1001-е) створена бысць церкви сия святая Богородица въ граде во Дрютьсце...» Даце 1001 год можна і не даваць веры: адкуль мог пісец 14 ст. ведаць дакладны час пабудовы царквы ў Друцку, але нічога неверагоднага ў ёй таксама няма. Археалагічныя раскопкі паказалі, што царква ў Друцку, несумненна, была. Рэшткі самой пабудовы яшчэ не знойдзены, але выяўлена шмат тыповых для старажытнарускіх цэркваў паліваных плітак, якімі звычайна масцілі падлогу. Усе пліткі моцна абгарэлі, але слядоў вапны на іх няма, відаць, іх клалі насуха. Іншых слядоў пажару не знойдзена. Акрамя плітак знойдзены рэшткі бронзавага хораса (царкоўнай люстры).

Паводле летапісаў у 1128 г. пасля нападу на Полацкае княства паўднёварускіх князёў месца полацкага князя Давыда заняў друцкі князь Барыс Усяславіч. Але ў 1129 г. ён раптоўна памёр. Неўзабаве полацкія князі за непаслушэнства кіеўскаму князю Мсціславу Вялікаму былі высланы ў Візантыю. Мсціслаў пасадзіў у полацкіх гарадах «мужи свои» і пасля вяртання князёў з Візантыі (1146 г.) у Друцку стаў княжыць сын Барыса — Рагвалод Барысавіч. У 1146—1151 гг. ён быў вялікім князем усёй Полацкай зямлі, але ў барацьбе з мінскім князем Расціславам Глебавічам за полацкі трон быў захоплены і ў 1151 г. ў Мінску кінуты ў цямніцу. Расціслаў Глебавіч стаў княжыць у Полацку, а ў Друцку — яго сын Глеб. У 1159 г. Рагвалод Барысавіч уцёк з палону ў родны Друцк. «300 людей дрьючан и полочан» прыязна сустрэлі Рагвалода і пасадзілі яго князем, прагнаўшы Глеба. Друцк стаў цэнтрам апазіцыі мінскім Глебавічам, якія княжылі ў Полацку. Князь Расціслаў выступіў з войскам супраць Рагвалода, але не меў поспеху («Рогволодъ затворился въ Друцке»). Палачане, незадаволеныя сваім князем, наладзілі адносіны з Друцкам і скінулі Расціслава («мнози бо хотяху Рогволода»). Расціслаў уцёк у свой Мінск, а Рагвалод зноў узначаліў Полацкую зямлю. У Друцку княжыў яго сын Глеб Рагвалодавіч. У 1162 г. Рагвалод зноў прайграў барацьбу з мінскімі Глебавічамі за полацкі трон і вымушаны быў шукаць паратунку ў родным Друцку («а Полотьску не смѣ ити, зане множьство погибе полочан»). Імя друцкага князя Рагвалода Барысавіча было выбіта на так званым Рагвалодавым камені — вялікім валуне, які ляжаў за 20—25 км на ўсход ад Друцка каля вёскі Галошава.

Пад 1180 г. у Іпацьеўскім летапісе запісана, што чарнігаўскі князь Яраслаў Усеваладавіч і герой «Слова аб палку Ігаравым» ноўгарад-северскі князь Ігар Святаславіч «сдумали» з дапамогай полаўцаў напасці на Друцк. Было вырашана, што кіеўскі вялікі князь Святаслаў Усеваладавіч, які толькі што ваяваў у Суздальскай зямлі, заедзе з сынам Уладзімірам ненадоўга ў Ноўгарад. Вяртаючыся адтуль, паверне да Друцка і падтрымае іх. Ініцыятары паходу, верагодна, ужо ведалі, што да іх далучацца віцебскі, полацкі, лагойскі, ізяслаўскі князі, некалькі дробных князёў Полацкай зямлі, а таксама «ліб» і «літва». У адпаведнасці з агульным дагаворам гэтыя князі падышлі да Друцка, але з-за затрымкі ў Ноўгарадзе Святаслава абмінулі Друцк і накіраваліся насустрач Святаславу. Тым часам Глеб Рагвалодавіч Друцкі адчыніў вароты свайму саюзніку — смаленскаму князю Давыду, які прыйшоў на падмогу. Высветліўшы сітуацыю і зразумеўшы, што ў іх інтарэсах не даць ворагам аб'яднацца, Давыд тэрмінова адправіўся ў пагоню. Не жадаючы прыняць бітву без Святаслава, Яраслаў і Ігар адступілі за Друць і стаялі «обапол» Друці без бітвы тыдзень, і толькі стральцы Давыда час ад часу прыязджалі і біліся з непрыяцелем. З падыходам Святаслава войскі сталі рыхтавацца да бітвы, але Давыд не рызыкнуў змагацца і, пакінуўшы Друцк, ноччу ўцёк у Смаленск. Святаслаў падпаліў друцкі астрог (частка гарадскога ўмацавання) і адпусціў ноўгарадцаў, што прыехалі з ім. З пераходам Давыда Расціславіча ў Смаленск (1180 г.) Віцебск дастаўся (наўрад ці без удзелу веча) брату полацкага Усяслава Васількавіча — Брачыславу Васількавічу, г. зн. быў вернуты Полацкай зямлі. Падзеі 1180 г. паказваюць, што праціўнік абодвух Васількавічаў Глеб Рагвалодавіч Друцкі быў перацягнуты Давыдам на свой бок і апынуўся пад

Унікальная знаходка: калёсная вось з дубу (даўжыня 1,45 м). 12 ст.

эгідай Смаленска, які кантраляваў ключавыя пазіцыі друцка-ўшацкага волаку. Барацьбой за вяртанне гэтага важнейшага шляху палачанам і тлумачыцца вялікі кааліцыйны паход. Такім чынам, зразумела, чаму аблога Друцка была знята: уцёкі смаленскага Давыда менавіта і вырашалі пытанне ў карысць Полацка.

Археалагічныя раскопкі сведчаць, што найбольшы росквіт Друцка прыпадае на 30—40-я гады 13 ст. У горадзе ішло інтэнсіўнае будаўніцтва, вуліцы масцілі тоўстым бярвеннем.

13 ст. было цяжкім для старажытнарускіх зямель: шмат гарадоў знішчылі орды Батыя. Але гарады, якія абмінула нашэсце, развіваліся і раслі, а некаторыя атрымалі самастойнасць. Сярод апошніх быў і Друцк. Цікавае ў гэтай сувязі паведамленне сустракаецца ў Хроніцы Быхаўца, Румянцаўскім, Еўраінаўскім летапісах, Летапісе Рачынскага і інш. Пасля разгрому Кіева Батыем кіеўскі князь Дзмітрый даведаўся пра зямлю, дзе «мужики мешкают без господаря а зовутся дручане. И он, собравшися людми, и пошол ко Друцку, и землю Друцкую посѣл, и город Друческ зарубил, и назвался великим княземъ друцким» (Поўны збор рускіх летапісаў. Т. 35. М., 1980. С. 194, на рус. мове).

З 13 ст. Друцк, як і іншыя гарады Полаччыны, у складзе Вялікага княства Літоўскага. У час паходу вялікага князя літоўскага Вітаўта на Віцебск у 1396 г. друцкія князі, як паведамляюць летапісы, «стретоша его и оударишя емоу челом оу слоужбоу» (Там жа. Т. 17. Спб., 1907. С. 94).

Мала мы ведаем і пра Друцк 15 ст. Пад 1401 г. Хроніка Быхаўца паведамляе, што кароль польскі і вялікі князь літоўскі Ягайла і князь Вітаўт, якія вярталіся з паходу на Смаленск, прыехалі ў Друцк і былі на абедзе ў князя Сямёна Дзмітрыевіча Друцкага. А ў караля Ягайлы памерла жонка, і ўбачыў ён у князя дзвюх яго прыгожых пляменніц. Далей расказваецца пра сватаўство Ягайлы да малодшай з іх і тыя хітрыкі, на якія пайшоў друцкі князь, каб малодшая пляменніца не была выдадзена замуж раней за старэйшую (Хроніка Быхаўца. М., 1966. С. 75—76, на рус. мове). Усё гэта выглядае даволі легендарна, але князь Сямён Дзмітрыевіч быў на самай справе друцкім князем. У пачатку 15 ст. (1402) упамінаецца князь Андрэй Друцкі, забіты ў бітве на рацэ Ворскла. Есць не вельмі дакладныя звесткі пра друцкага князя Івана Бабу і яго брата Пуцяту. Абодва названы друцкімі князямі, якіх у ліку іншых Вітаўт паслаў на барацьбу супраць татарскіх ханаў (1424 г.)· (Поўны збор рускіх летапісаў. Т. 26, М.; Л., 1959. С. 183, на рус. мове). Пра Івана Бабу напісана ў Маскоўскім летапісным зборы 1479 г., што ён у 1436 г. кінуў свой друцкі ўдзел і перайшоў на бок вялікага князя маскоўскага Васіля Цёмнага (Там жа. Т. 25, М.; Л., 1949. С. 252). Незадоўга да гэтага друцкія князі падзялілі княства на шэраг дробных удзелаў і сталі звацца Друцкія-Сакалінскія, Друцкія-Багрынаўскія, Друцкія-Любецкія, Друцкія-Прыхабскія. У 1508 г. ўсе яны кінулі свае ўдзелы і перайшлі пад уладу Масквы, атрымаўшы новыя паветы. Такім чынам, Друцкае княства паступова прыйшло ў заняпад. З пачатку 16 ст. Друцк вядомы як геаграфічнае паняцце, хоць і пазначаецца на картах аднолькава з суседняй Оршай. Пад 1515 г. летапісы ўпамінаюць толькі «друцкія палі», мабыць, гэта азначае, што крэпасці ў горадзе ўжо не існавала. Некаторы час па традыцыі шлях з Вільні ў Маскву праходзіў праз Друцк. У 2-й палавіне 16 ст. пра Друцк, у якім быў «замак драўляны на гары высокай», пісаў італьянскі падарожнік Аляксандр Гваньіні, што служыў у віцебскім гарнізоне наёмным ротмістрам, а з 1569 па 1587 г.— камендантам Віцебска. У 1698—1699 гг., калі праз Друцк праязджаў сакратар пасольства Свяшчэннай Рымскай імперыі, аўтар «Дзённіка падарожжа ў Масковію» Іаган Георг Корб, тут амаль усюды былі руіны. «Гавораць,— засведчыў аўстрыец, што ў мінулым стагоддзі гэты горад меў сем міляў у акружнасці і славіўся дзвюма сотнямі выдатных храмаў, але ў час жорсткай вайны... быў настолькі спустошаны, што да яго стасуецца плач паэта на развалінах Троі: дзе стаяў Пергам, там цяпер хвалюецца калоссе» (Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980. С. 40). Неўзабаве прамы шлях на Маскву праз Талачын стаў больш папулярным, і старым, праз Друцк, карысталіся толькі купцы-гандляры кантрабаднымі рэчамі.

Праз стагоддзі нясе свае воды старажытная Друць, агінаючы з аднаго боку яшчэ і зараз магутныя і крутыя валы гарадзішча, дзе некалі бурліла жыццё. Знік назаўсёды горад на Друці, але раскопкі не скончаны, можна спадзявацца, што не адну цікавую старонку гісторыі прачытаюць археолагі. *Л. В. Аляксееў.*

Помнік старажытнай пісьменнасці

У 14 ст. ў Друцку быў створаны рукапісны помнік усходне-славянскай пісьменнасці — Друцкае евангелле.Тэкст гэтага кананічнага твора напісаны на царкоўна-славянскай мове ўставам на 376 старонках фарматам «у аркуш», размешчаны ў 2 калонкі па 25—28 радкоў у кожнай. Мастацкае аздабленне евангелля складаецца з застаўкі і 54 ініцыялаў тэраталагічнага характару, выкананых чырвонай фарбай (кіноварам).

Асабліва важнае культурна-гістарычнае значэнне маюць запісы, зробленыя ў канцы рукапісу. У адным з іх гаворыцца аб пабудове ў Друцку 1001 г. першай царквы, што сведчыць аб магчымым існаванні горада ўжо ў 10 ст. Цікавы і запіс друцкага князя Васіля Міхайлавіча, фактычна гэта даравальная грамата царкве Багародзіцы ў Друцку на сяло Мараўінічы (зараз в. Мураўнічы) разам з людзьмі, палямі, лугамі і ўсімі даходамі. Нават даход ключніка, які вёў княжацкую гаспадарку, аддаваўся дзяку, што служыў пры царкве. Турбуючыся пра строгае выкананне сваіх указанняў, князь заняшчаў, каб яны не былі парушаны ні слугамі, ні нават яго дзецьмі. У гэтай грамаце сярод даходаў двойчы ўпамінаецца мядовая даніна, якая ў тыя часы была галоўнай, а мёд лічыўся адным з самых каштоўных тавараў у пераліку пошлін. Тэкст даравальнай граматы дае ўяўленне аб укладзе феадальнай гаспадаркі аднаго з беларускіх князёў таго часу.

Запісы, зробленыя на Друцкім евангеллі ў розныя гады, сведчаць, што спачатку яно належала сабору Багародзіцы ў Друцку, потым віленскаму гараджаніну Конану, поўгарадскаму архіепіскапу Феадосію Яноўскаму, некаторы час зберагалася ў архіве акадэміка

Старонка з Друцкага евангелля

М. М. Ціхамірава, пасля яго смерці перададзена ў бібліятэку Новасібірскага аддзялення АН СССР.

Барысавы камяні

З даўніх часоў увагу вучоных-даследчыкаў манументальных помнікаў матэрыяльнай культуры беларускага народа прыцягвалі велізарныя валуны з высечанымі на іх крыжамі і надпісамі «Господи помози рабу своему Борису». Гэтыя камяні атрымалі назву Барысавых. Вядома 7 такіх помнікаў. 5 у рэчышчы Заходняй Дзвіны (Полацк, Друя, 3 каля Дзісны), 2 на сушы — паміж Оршай і Коханавам, каля вёсак Даятлава Аршанскага і Галошаўка Талачынскага раёнаў, так званы Рагвалодаў камень, і каля в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна.

Да ўвядзення хрысціянства ў 10 ст. камяні былі язычніцкімі фетышамі. Неўраджай і голад у пачатку 12 ст. на Падзвінні прывялі да адыходу ад хрысціянства, вяртанню да язычніцкіх вераванняў і шанаванню камянёў, каля якіх калісьці маліліся аб ураджаі. Каб сінтэзаваць язычніцкія і хрысціянскія вераванні, а таксама ўвекавечыць сваё імя, полацкі князь Барыс Усяславі̆ч, які быў вельмі набожны, загадаў высякаць на камянях крыжы, формай падобныя на крыж з «Галгофай», і хрысціянскія надпісы з імем Барыса. Яго імя выбіта на 6 камянях (лічаць, што надпісы зроблены ў маі 1128 года, у дні Барыса-глебскіх свят).

Рагвалодаў камень. 1171.

Барысаў камень каля в. Высокі Гарадзец у 1888 г. даследаваў беларускі этнограф, фальклярыст, археолаг Е. Р. Раманаў. У зборніку «Старажытнасці: Працы імператарскага Маскоўскага археалагічнага таварыства» (Т. 13, в. 1. М., 1889, на рус. мове) ён пісаў: «Па знешняму выгляду камень уяўляе сабой глыбу чырвонага граніту квадратнай формы ($4^1/_4$ арш.×$4^1/_4$ арш.) з няправільнымі вугламі (паўн. ўсход — паўд. захад $5^1/_4$ арш., паўн. захад — паўд. ўсход $4^3/_4$ арш.); заходні, правы вугал амаль не мае слядоў апрацоўкі. Чатырма бакамі сваімі камень размешчаны да чатырох бакоў свету, і даволі правільна. Цяжарам сваім ён уціснуў зямлю на $^1/_2$ аршына і ўзвышаецца над узроўнем ямы на 1 арш. 2 вяршкі. З бакоў камень даў моцныя расколіны ў гарызантальным напрамку, асабліва ў заходняй частцы. Паверхня гарызантальная і амаль гладкая, але ў некаторых частках укрыта мохам, дзе-нідзе рассыпаецца жарствою, а паўночная частка паверхні сколата, у шырыню, ад краю, на 2—3 чвэрці, у глыбіню на 2—3 вяршкі. Увогуле, паверхня моцна папсавана, між іншым, і ад таго, што начлежнікі, якія пасвяць коней, паляць на камені свае вогнішчы.

Пры ўсім тым, лёгка можна заўважыць, што ва ўсю даўжыню каменя высечаны васьміканцовы крыж. Контур крыжа ў некаторых частках бачны выразна, у іншых ён зусім агладжаны... Вакол крыжа, па краях паверхні каменя, высечаны буйныя (некаторыя да 5 вяршкоў) славянскія літары» (с. 192—193). Е. Р. Раманаў даследаваў надпіс і склаў уцалелыя літары ў тэкст «Господи помози рабу своему Борису». У літаратуру помнік увайшоў пад назвай Высокагародскага каменя. Сярод мясцовага насельніцтва камень быў вядомы як «Кравец» і «Сцяпан», з ім звязана паданне, нібыта ў незапамятныя часы камень валодаў цудоўнай здольнасцю шыць сукенкі. Варта было прынесці вечарам сукно або іншую тканіну і сказаць: «Сцяпан, сшый мне жупан!», і да раніцы адзежына была гатова... Але адна жанчына ўздумала пасмяцца з яго, прынесла сукно і папрасіла камень сшыць «ні тое, ні сёе». Раніцай узяла сукенку, але яна саписавана: адзін рукаў на патрэбным месцы, а другі прышыты да палы ўнізе. З тых часоў «Кравец» перастаў шыць.

У 1898 г. над каменем была пабудавана капліца. У 1936 г. камень узарваны.

На Рагвалодавым камені (мясцовыя назвы Арпанскі, Барысаглебскі, Уладзімірскі) высечана імя Рагвалода Барысавіча: «В лето 6679 (1171) месяца мая в 7 день доспен крест сей. Господи помози рабу своему Василию в крещении именем Рогвалоду сыну Борисову». У 1794 г. пра гэты помнік паведаміў Ц. С. Мальгін у творы «Зярцала расійскіх гасудароў». Захавалася шмат паданняў пра Рагвалодаў камень. Паводле аднаго з іх — гэта акамянелая жывёліна, калісьці камень быў на чатырох нагах і меў галаву. Мясцовы млынар адсек «галаву» і перарабіў на жорны, якія самі змаліліся ў пясок і перамалолі ўсё багацце і сям'ю млынара. Паводле другога падання, пад каменем знаходзілася магіла князя Васіля (Рагвалода), які загінуў тут у бітве. Паводле трэцяга — на гэтым месцы адбылася бітва паміж Рагвалодам і друцкімі князямі. Рагвалод перамог і ў гонар перамогі загадаў высечы на камені крыж з надпісамі. Паводле чацвёртага — Рагвалод, вяртаючыся з паходу, адпачываў тут з дружынай і яму прысніліся бацька-нябожчык Барыс з братам Глебам. У гонар гэтага быў пастаўлены камень-помнік, названы Барысаглебскім.

У 1807 г. над каменем была пабудавана Барысаглебская царква (у 1812 г. знішчана французамі), у 1830 г. ўзведзена капліца. Есць звесткі, што ў 1913 г. камень быў яшчэ на месцы. Далейшы лёс яго невядомы.

Л. У. Дучыц, А. А. Шнайдар.



Рысунак Барысавага каменя каля в. Высокі Гарадзец. З кнігі «Старажытнасці: Працы імператарскага Маскоўскага археалагічнага таварыства».

З архітэктурнага мінулага

На Талачыншчыне захавалася адносна мала помнікаў архітэктуры. Але і яны, як частка матэрыяльнай культуры народа, дапамагаюць пазнаць жыццё ў мінулым, глыбей зразумець духоўную культуру і светаадчуванне нашых продкаў, прыносяць эстэтычнае задавальненне. Акінуўшы поглядам гэту ў некаторым сэнсе бессістэмную, але гістарычна гарманічную разнастайнасць будынкаў, мы ўсведамляем — гэта наша гісторыя, наша культурная спадчына.

З гісторыка-архітэктурнай спадчыны Талачыншчыны найбольш высокамастацкі і каштоўны помнік архітэктуры позняга барока — ансамбль базыльянскага кляштара ў Талачыне па вул. Леніна, які часткова захаваўся. У яго склад уваходзілі касцёл, кляштарны жылы корпус і школа. Касцёл, заснаваны Львом Сапегам у 1604 г., прызначаўся для гараджан і быў агульнадаступным (фарным). У 1769 г. з заснаваннем Сангушкамі базыльянскага манастыра на месцы старога касцёла пастаўлены манументальны будынак у стылі ракако (так званага віленскага барока). Няспынная і вельмі вострая барацьба рэлігій абумовіла ператварэнне касцёла ў 1796 г. ва уніяцкую царкву, а ў 1804 г. ў праваслаўную Пакроўскую царкву.

Базыльянскі касцёл вырашаны паводле найбольш пашыранай манументальнай кананічнай схемы культавага збудавання — у выглядзе трохнефавай двухвежавай базілікі з дзвюма сакрысціямі. Падзелу храма на тры нефы адпавядае і трохчасткавае чляненне галоўнага фасада. Яго скульптурная хвалістая плоскасць даведзена да дасканаласці. Крывалінейныя згібы фасада падбаўляюць канструкцыю адчування архітэктанічнасці. Тонкія, зграбна выцягнутыя ў вышыню пілястры надаюць яму выгляд плаўна выгнутай мембраны. Сцяна фасада завершана пластычна выгнутым тонкапрафіляваным карнізам і філянговым парапетам. Над цэнтральнай часткай фасада ўзвышаецца трох'ярусны пластычнай формы шчыт, флангіраваны па баках двух'ярусными вежамі. Прадстаўнікі архітэктуры ракако абмяжоўвалі мастацкую вобразнасць будынкаў пластыка-дэкаратыўным багаццем галоўнага фасада. Таму і ў талачынскім касцёле бакавыя фасады вырашаны плоскасна, без архітэктурнага дэкору і аб'ёмна-прасторавай актыўнасці. Дэкаратыўна-пластычны акцэнт зроблены на алтарным фасадзе, які завершаны манументальным атыкам. Знешні дэкор мае адметныя рысы ракако: згрупаваныя пілястры, раскрапаваныя слаістыя карнізы, складанага малюнка праёмы і авальныя люкарны, нішы, ліштвы і інш.

Насычаная дынамікай унутраная прастора будынка ад галоўнага нефа пераходзіць у прэсбітэрый, а больш кароткія бакавыя нефы адкрываюцца арачнымі праёмамі. Цэнтральны і бакавыя нефы перакрыты крыжовымі скляпеннямі на падпружных арках, прэсбітэрый — цыліндрычным скляпеннем. У паўночна-ўсходняй частцы будынка размешчаны хоры. Унутраныя апоры афармлены спаранымі пілястрамі з антаблементамі. Алтарная частка адгароджана мураваным іканастасам 18 ст. У канцы 19 — пачатку 20 ст. ён застаўлены драўляным іканастасам. Антаблементы, падпружныя аркі і арачныя праёмы паміж нефамі аздоблены паліхромнай размалёўкай на раслінныя матывы.

Гэты архітэктурны помнік стаіць у адным радзе з такімі шэдэўрамі, як Сафійскі сабор у Полацку, касцёл у Глыбокім, і іншымі творамі мясцовай школы дойлідства віленскага барока.

У 1779 г. побач з касцёлам (з паўднёвага боку) пабудаваны кляштарны жылы корпус.

Галоўны фасад былога касцёла кляштара базыльян (зараз царква).

Будынак былога жылога корпуса кляштара базыльян.

Пабудова прамавугольная ў плане, двухпавярховая. Галоўны і дваровы фасады расчлянёны пілястрамі на высокіх пастаментах і прамавугольнымі вокнамі, якія аформлены плоскімі ліштвамі з валютамі зверху. Тарцовыя сцены завершаны франтонамі. Планіроўка корпуса галерэйнага тыпу. Цэнтральны вузел — уваход і лесвічная клетка. Асноўную масу памяшканняў складалі невялікія тыпавыя келлі манахаў. З буйных памяшканняў выдучаліся трапезная і «цёплая» царква. Простыя па планіроўцы прамавугольныя і невялікія па памерах памяшканні ажыўлены ажурнымі скляпеністымі перакрыццямі.

Архітэктура эклектызму ў Талачыне прадстаўлена каменным касцёлам, пабудаваным у канцы 19 — пачатку 20 ст. амаль насупраць (праз р. Шчань) базыльянскага кляштара.

У той перыяд не прытрымліваліся кананічнага правіла арыентацыі храма алтаром на ўсход. Таму купальнай апсідай ён павернуты на захад. Галоўны фасад пабудовы выходзіць на галоўную гарадскую магістраль, і такім чынам будынак арганічна ўключаны ў яе гарадабудаўнічы ансамбль. Манументальнасць храма ўзмацняецца яго размяшчэннем на прыродным узвышшы. Побач з касцёлам да 1960-х гадоў узвышалася трох'ярусная званіца.

Будынак касцёла мае нескладаную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю і ўяўляе сабой прамавугольны ў плане аб'ём пад двухсхільным дахам. Значны маштаб, буйныя чляненні, аб'ёмная лаканічнасць і моцнае канструкцыйнае вырашэнне, адсутнасць ярка вылучаных акцэнтаў выклікае адчуванне масіўнасці і статычнасці пабудовы. Галоўны ўваход у будынак вырашаны бабінцам, аналагічным па архітэктуры храму, але меншага аб'ёму. Імкненне акцэнтаваць парадны фасад будынка вымусіла архітэктара ўзмацніць яго дэкаратыўную апрацоўку — да стральчатых ніш, высокіх пілястраў прыбавілася суцэльная рустоўка сцен. Алтарны фасад вылучаны моцнай паўкруглай апсідай, завершанай паўсферычным купалам. Бакавыя фасады вырашаны плоскасна і расчлянёны высокімі вузкімі стральчатымі вокнамі і пілястрамі ў праспенках. Па перыметры будынак апяразаны тонка прафіляваным карнізам з дзвюма тонкімі пясамі.

Унутраная прастора касцёла дзвюма парамі моцных слупоў расчлянёна на тры нефы, сярэдні з якіх паглыблены паўкруглай апсідай. Пры ўваходзе вылучаны бакавыя квадратныя ў плане хрысцільні, над якімі размешчана галерэя хораў, адкрытых у зал храма. Зараз будынак рэстаўрыраваны, у ім размесціцца краязнаўчы музей.

У 1850—60-я гады ў архітэктуры Расійскай імперыі, у тым ліку і на Беларусі, аднаўляецца старажытнарускі стыль. У асноўным новая, так званая руска-візантыйская стылявая плынь увасобілася ў культавым дойлідстве. Пачалося масавае будаўніцтва па «ўзорных» праектах. У 2-й палавіне 19 ст. вакол Талачына (у вёсках Манастыр, Новае Сяло, Равуча) узнік шэраг манументальных праваслаўных храмаў, архітэктура якіх выклікае асацыяцыі з формамі старажытнарускіх цэркваў і церамоў.

На ўзвышшы ў цэнтры в. Манастыр у 1890 г. ўзведзены манументальны цагляны будынак Троіцкай царквы. Пабудаваная па капанічнай схеме, яна ўключала званіцу, бабінец, асноўны аб'ём і апсіду з прыдзеламі. У агульнай кампазіцыі будынка пануе шатровая двух'ярусная званіца. У першым, квадратным ў плане ярусе зроблены галоўны ўваход, другі ярус васьмігранны, прарэзаны скразнымі арачнымі праёмамі-галаснікамі. Асноўны кубападобны аб'ём накрыты пакатым чатырохсхільным бляшаным дахам, па вяршыні якога ўзвышаецца цыбулепадобны купалок на васьмігранным драўляным барабане. Старажытнарускі каларыт архітэктуры надае будынку пластычны дэкор: аркатурныя з гіркамі падкарнізныя пасы па перыметры аснoўнага аб'ёму, кілепадобныя броўкі над здвоенымі і адзінарнымі арачнымі вокнамі.

У 1882 г. ў в. Равуча ў руска-візантыйскім стылі была пабудавана фамільная капліца-пахавальня мясцовага памешчыка Хамянтоўскага (захавалася часткова). Капліца мае насычаную пластычную і дэкаратыўную трактоўку, нягледзячы на лаканічнае і спрошчанае прасторавае вырашэнне ў выглядзе прамавугольнага ў плане невысокага аб'ёму. Будынак быў накрыты дахам складанай канфігурацыі — вынік спалучэння двухсхільнага і шатровага накрыцця. У завяршэнні даху цыбулепадобны купал на васьмігранным барабане. Сродкамі цаглянай муроўкі фасады насы-

чаны рустоўкай, прафіляванымі ліштвамі, кілепадобнымі броўкамі над вокнамі, філянговым фрызам, аркатурай. Гэты дэкаратыўны кангламерат ствараў уражанне старажытнасці архітэктуры збудавання. Галоўны фасад у цэнтральнай частцы быў завершаны другім ярусам у выглядзе моцнай аркі-званіцы з кілепадобным абрамленнем. Усе фасады былі падзелены філянговымі лапаткамі на тры часткі, унутраная прастора перакрыта драўляным скляпеннем на ветразях, бакавыя фасады па восі сіметрыі ў цэнтры вылучаны рызалітамі з двухгранным верхам і арачным праёмам у цэнтры. Па баках арачны праём фланкіраваны двума прамавугольнымі вокнамі.

Мастацтва народных дойлідаў адлюстроўвалася і ў вытворчых збудаваннях. Прыклад таму двухпавярховы турбінны вадзяны млын у в. Равуча. Перты паверх для прыёму і назапашвання збожжа, другі — для абсталявання з жорнамі. У гаспадарчых мэтах выкарыстоўваўся і паўвальмавы гонтавы дах.

У канцы 19 ст. на ўзвышшы ў паўднёвай частцы Талачына быў пасаджаны парк пейзажнага тыпу, пераважна з мясцовых парод дрэў: сасны, елкі, ліпы, бэзу, вярбы, таполі. Паркавы ландшафт узбагачаны невялікай сажалкай. З сядзібных пабудоў на ўскраіне парку ўцалеў гаспадарчы цагляны будынак.

У в. Няклюдава зберагліся рэшткі натуральнага сядзібнага парку канца 19 ст.

А. М. Кулагін.

ЗВЕСТКІ ПРА ДРУЦК, ТАЛАЧЫН, АБОЛЬЦЫ, КОХАНАВА З КНІГІ «МАЛЯЎНІЧАЯ РАСІЯ»

В Могилевском же уезде находится другая столица удельного княжества. Это знаменитый летописный Друческ, потом Друцк, на реке Друть и при большом озере, чрез которое Друть проходит. На острове озера видны еще следы вала и рва, окружавшего замок. Летописи упоминают о Друцке под годом 1115, когда Владимир Мономах послал против Друцка сына своего Ярополка, князя смоленского. Друцк принадлежал тогда, вместе с Минском, Глебу Всеславичу, сыну Всеслава полоцкого. Ярополк овладел Друцком, разорил его, жителей переселил в город Зельны, ныне Зеленово, неподалеку от Смоленска. Но город вскоре отстроился и до XVI ст. постоянно был столицею удельного княжества. Посягательства на Друцк со стороны удельных князей были очень часты. В 1151 г. в Друцке княжил Глеб Ростиславич. В 1158 изгнанный из Полоцка князь Рогволод завладел Друцком и потом передал сыну своему Глебу. В 1181 Святослав Всеволодович Черниговский с новгородцами напал на Друцк и опустошил его. Зависимость этого княжества от Полоцкого весьма заметна; с половины же XIII ст. явственно начинает преобладать влияние литовских князей. Во времена Ольгерда в Друцке сидел князь Иоанн; Ольгерд изгнал его и посадил сына своего Димитрия. Но в 1508 г. видим еще владетельных князей Друцких; их склонил на свою сторону известный князь Михаил Глинский, и три брата Друцкие вместе с Глинским передались великому князю московскому. Кажется, с этого времени не было уже удельных Друцких князей. Но род их был многочислен и разделился на несколько ветвей. Известны пять линий этого рода, из коих некоторые еще существуют и ныне: были князья «Друцкие-Любецкие», «Друцкие-Соколинские», «Друцкие-Горские», «Друцкие-Подбергские» и «Друцкие-Озерские». Из этого же рода происходили князья Бокриновские, а также князья Путяты, или Путятычи.

В Соколине, откуда Друцкие-Соколинские получили прозвание, еще недавно существовала часовня, в склепах которой покоились предки князей Соколинских. Один из них, князь Михаил Друцкий-Соколинский, был протестантом и основал кальвинский сбор в Соколине.

На левом берегу р. Друти находится довольно большое местечко Толочин, в XVI ст. принадлежавшее знаменитому канцлеру Льву Сапеге, который в 1604 г. основал здесь костел, школу и больницу. По присоединении Белоруссии в Толочине, как в пограничном пункте, учреждена была таможня.

* * *

Мы уже упомянули об Обольцах, где Ягайло основал первый католический костел в Белоруссии в 1378 г., а при Сигизмунде III назначено благочиние (декапат) на всю Белоруссию, и где потом учреждена суфрагания (викариат) виленского епископства. В летописях Обольцы упоминаются под именем Обльче. Ныне — ничтожное местечко. При р. Смолянке, в 29 верстах от Орши, находится

небольшое местечко Коханово, о котором мы тоже уже упомянули, достопримечательное находящимся близ него большим камнем, называемым Рогволодовым, который мы причисляем к древним дольменам.

Живописная Россия. Т. 3, ч. 1. Спб.; М., 1882. С. 411—412, 416.

Выступленне супраць паншчыны

У 1-м томе кнігі «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі» змешчаны дакумент 1532 г. «Барацьба сялян Аболецкай воласці супраць павелічэння паншчыны». Яго каменціруе доктар гістарычных навук В. І. Малешка.

Аболецкая воласць у той час лічылася дзяржаўным (гаспадарскім) уладаннем, падараваным «на вечныи часы» каралеве Боне, і знаходзілася ў трыманні пана Кірдзея Грычынавіча.

Сяляне гэтай воласці адмовіліся выконваць новаўведзеныя дзяржаўцам адработачныя павіннасці. Калі пра гэта стала вядома каралю Сігізмунду I, ён у 1532 г. накіраваў у Аболецкую воласць службовую асобу, каб высветліць, што за работы выконвалі сяляне на карысць панскага двара ў лік паншчыны, і давесці да ведама сялян, якія віды паншчыны яны абавязаны выконваць.

Прыехаўшы ў Абольцы, дзе знаходзіўся цэнтр воласці і панскі двор, прадстаўнік каралеўскай улады загадаў склікаць сюды ўсіх сялян воласці. Аболецкі дзяржаўца пан Грычынавіч дакладваў даверанай асобе караля, што сяляне воласці 2 дні на тыдзень, у сераду і суботу, у другой палавіне дня адбываюць паншчыну, але калі на гэтыя дні выпадаюць святы, то па работу не выходзяць і адмаўляюцца адпрацоўваць у іншы час. Жыта жнуць і снапы складваюць у копы, а з поля не прыбіраюць і не малоцяць, падвод не даюць, двор не сцерагуць і не жадаюць яго абгароджваць. Усё гэта пацвердзілі аболецкі ўраднік Сямён Чуватаў і іншыя баяры (свабодныя сяляне).

На гэта сяляне адказалі, што ў адпаведнасці з каралеўскімі прывілеямі (граматамі), якія, дарэчы, і былі прад'яўлены, яны не павінны даваць падводы аболецкаму ўрадніку і несці начную варту ў фальварку звыш паншчыны. Што датычыць «стайни оправенья, коней стереженья, сена воженья», то для гэтай мэты ёсць у двары спецыяльныя людзі.

Даверaная асоба караля ўгледзела ў гэтым шкоду для каралевы, таму ад імя гаспадара (караля) патрабавала, каб уся воласць бездакорна адбывала паншчыну 2 разы на тыдзень ва ўстаноўленыя дні і выходзіла на работу ранкам, а канчала яе позна, як і ў іншых гаспадарскіх і панскіх дварах.

У адказ сяляне «з великим криком» заявілі, што так служыць не будуць, нават калі ў іх адбяруць не толькі ўвесь набытак, але і жонак і дзяцей, а будуць працаваць так, як працавалі спакон вякоў іх продкі і бацькі і яны самі раней. І калі дзяржаўца пан Грычынавіч загадаў сялянам выйсці на работу ў сераду і чацвер, яны не выйшлі.

Убачыўшы такое рашучае супраціўленне прыгонных і баючыся, што яны ўцякуць з уладання, прадстаўнік каралеўскай улады параіў дзяржаўцу не гнаць іх на паншчыну, а чакаць далейшых указанняў каралевы.

Французскія марадзёры на Беларусі. Літаграфія мастака Х. В. Фабер дзю Фара. 19 ст.

З ВЕДАМАСЦІ СМАЛЕНСКАГА ГУБЕРНСКАГА ПРАКУРОРА АБ СПАЛЁНЫХ І РАЗРАБАВАНЫХ ВЁСКАХ У КОПЫСКІМ ПАВЕЦЕ Ў ЧАС ВАЙНЫ 1812 Г.[1]

Звание владельцев	Имена деревень	Какие селения от неприятеля сожжены и разорены
Иосифа Багинского	дер. Монастыри	Сия деревня от неприятеля разорена
Адама Борташевича	...дер. Молявка...	Неприятелем сожжены. От неприятеля разорены
Иосифа Василевского	...дер. Жукнин...	Приведены в разорение от неприятеля
Павла Вильчинского	...с. Воронцевичи, дер.	Сия селения от неприятеля частью приведены в разорение
Гвардии конного полка корнета Козьмы Ланевского Волка	Воронцевичи, Полочанки, Башарова	
Шамбеляна Самуйлы Ланевского Волка	с. Воронцевичи, дер. Любиничи...	Оные селения от неприятеля претерпели разорение
Иосифа Василевского	дер. Речки, Кураново	Сии селения вовсе от неприятеля разорены, и дер. Кураново сожжена
Антония Гонипровского	с. Коханово, дер. Богдановка...	Всё от неприятеля сожжено
Адама Гордзялковского	с. Плоское, дер. Большие Коски, Малые Коски, фольварк Гастиничи, Красилово.., Кацевичи	Неприятелем вовсе разорены Сии селения претерпели от нашествия и во время ретирады неприятеля совершенное разорение
Подкомория Гаврилы Гордзялковского	дер. Сани, Вальки.., Соколянка	При бегстве неприятеля в обратный путь сии селения приведены в разорение
Ст. советника Дмитрия Добржевского	дер. Новосёлки	В части от неприятеля разорена
Людвика Дашкевича	с. Подберевье	Разорена большею частью от неприятеля
Фомы Замбжицкого	с. Переволочино, дер. Заречье, Мартюхово, Кучина, Острашавка	Сия селения во время ретирады неприятеля приведены в разорение, в фольварке немалая часть сожжена
Николая Корсака	дер. Яблонка, мест. Яблонка	От неприятеля сожжена Разорено
Подкоморины Елизаветы Корсаковой и подстолины Омульской	дер. Славяни, Нарцызово	Оные деревни от неприятеля сожжены, а остальные крестьянские хаты вовсе разорены, в которых селениях и крестьяне не живут
Стольника Юрия Лускины	...дер. Кувечина, Большой Голошев	Оные селения малое потерпели разорение
Франца Матушевича	дер. Букарево...	Вовсе от неприятеля разорены
Франтишка Позняка	дер. Паньковичи	Сие селение от неприятеля малое претерпело разорение
Бригадирши Агрофены Рибопьеровой	с. Славяни, дер. Заполье, Каменца.., Шапчина	Сии селения приведены через проход неприятеля в совершенное разорение
Игната Слешинского	дер. Холопковичи	
Генерал-лейтенантши кн. Амелии и наследников ее князя и кавалера Карла и внука малолетнего кн. Мечислава Сангушков	с. Оверны, дер. Михайловщина, Заречье, Голынка	Неприятелем сожжены и разорены
	...Заднево, Поречье	Большей частью неприятелем сожжены, а остальные в оных деревнях хаты крайне разорены
	дер. Старый Толочин.., Шупени, Кривая, Чуватово, Углевщина.., Плешивцы...	В оных деревнях по малой части хаты крестьянские и прочие строения сожжены, но оставшиеся находятся в крайнем разорении
Бар. Станислава Унгера	с. Подберевье.., дер. Букарево, Свидерщина, Замошье, Замостье.., ...Хотиничи	Сии селения неприятелем сожжены, а оставшиеся крестьянские хаты вовсе разорены Претерпели от неприятеля разорение
Капитана Черноевича	...с. Голошево, Чиглаи.., Машиева...	Сии селения во время прохода неприятеля приведены в разорение
Ивана Чеховского	дер. Каменка	Неприятелем сожжена вся
Кол. сов. Никиты Черняева	с. Ревучье	От неприятеля также разорена

[1] Рэдакцыяй пакінуты населеныя пункты, якія знаходзяцца на тэрыторыі сучаснага Талачынскага раёна. Назвы вёсак у дакуменце прыведзены ў тагачасным напісанні.

1	2	3
Духовные имения Толочинского базилианского монастыря	дер. ...Монастыри	Оные селения во время прохода неприятеля приведены в разорение
Старосельской плебании Старо-Толочинского римского костёла	дер... Церковицы, Квлахи, мест. Толочин	
Генерал-лейтенантши кн. Анелии и наследников ее князя и кавалера Карла и внука малолетнего кн. Мечислава Сангушков	по Копысскому пов. местечки, а именно мест. Толочин	В Копысском пов. числится по последней ревизии мужского пола душ 6123. Которое имение, по большей части лежащее при больших столбовых дорогах идущих: первая — от Орши и Могилева в Минск, а вторая — от тех же городов через Сенно в Полоцк; прочие же при больших купеческих из тех же мест в Витебск. Во время прохода неприятеля от Минска через оное имение разными таковыми дорогами и останавливающимися с разными большими и малыми воинскими и придворными наполеоновыми обозами и экипажами, равно и в обратный путь преследованного по большой столбовой дороге, а отрядные неприятельские корпусы Виктора и прочие по большим купеческим, от чего в немалое приведено разорение. В мест. Толочин сожжено: католических костелов 2, плебанский двор со всем строением, кроме оставшегося малого домика и амбарчика, прочее все сожжено; унiатских священников со всем строением сожжено домов 2, казенный почтовый дом со всем при оном строении, хотя ветхие, сожжены. Лавок деревянных с разными товарами евреев того же местечка сожжено 30. Большой ратуш, или амбар деревянный, в коем разные товары и напитки складывались, сожжен 1. Домов как крестьянских, так и еврейских в оном местечке до нашествия неприятеля находилось по обеим сторонам р. Друти 287. Из коих сожжено неприятелем 56. Во всех разоренных неприятелем, в которых и хозяева не живут, 39. Оставшиеся 192 дома находятся в крайнем разорении, так что не имеют большею частью окон, печей, сараев и огорода около оных, что все неприятелем сожжено. Гумен крестьянских со всем при оном строением и немолоченным хлебом сожжено 64. Амбаров крестьянских деревянных сожжено 33. Школ еврейских деревянных — летняя большая и зимняя малая, с принадлежащими к ним украшениями и еврейскими книгами, сожжено 2. Школа зимняя большая, с принадлежащим к ней украшением, книгами, паникадилами и божьими заповедьми, ограблена и большею частью внутри строения разорена 1. Школа еврейская малая деревянная, со всем принадлежащим к ней украшением, приведена неприятелем в разорение 1. Катальных бань, большая и малая деревянные, сожжены 2. Рединца деревянная, сожжена 1. Близ оного местечка 2 фольварка господские, называемые Иозефполь и Заречный Толочин, из коих в первом скотный двор большой и при оном конюшня и сарай, сожжены 3. Во втором большой господский дом, вновь построенный, со всеми в оном жилищами и прибором, сожжен 1. Прочие же строения в оных фольварках совсем разорены, а огороды около оных сожжены, хлеб из магазейнов весь забран, немолоченного малая часть оста-

1	2	3
		лась. Плотина при оных фольварках на р. Друти совсем сожжена 1. В 4 верстах от мест. Толочина при большой столбовой дороге фольварк, называемый Озерцы, в коем большой господский дом из 14 комнат со всеми в оном приборами и мебелью, неприятелем сожжен 1. В оном же фольварке пребольшой магазейн деревянный на каменном фундаменте в 2 этажа, в коем находилось до 3000 четвертей разного хлеба, более 500 ведер горячего вина и немалое количество господских хозяйских припасов и разных продуктов, сожжен 1. Прочие же строения разорены, огород сожжен, скота разного около 200 штук забрано, так что ни одной не осталось. Близ оного фольварка церковь униатская, на украшение которой немалую сумму ки. Сангушки употребили, в коей все церковные вещи неприятелем ограблены, украшение в оной и книги сожжены и совсем оная опустошена. Священнический двор разорен, а гуменное строение с хлебом и сеном совсем сожжено. Близ оного фольварка при той же большой столбовой дороге в дер. Голынке, в коей корчма большая с разными при оной строениями, сожжена 1. В той же деревне мельница на 2 колеса и суконвальня на 1 колесо, сожжены 2. Плотина при оных большая и мостов больших 2, сожжены 3. В дер. Ляхах мельница, вновь построенная, на 2 колеса, суконвальня на 1, сожжены 2.

ЦДГА БССР у Мінску. ф. 2001, воп. 1, спр. 24, л. 4—13 аб.

Напалеон уцякаў праз Талачын

Лістапад 1812 года. Напалеон разбіты пад Красным. Кінуўшы з выпадку адлігі сані, ён верхам на кані з рэшткамі арміі ўцёк ад пагоні праз Ляды на Дуброўну ў Оршу, дзе былі вялікія запасы харчавання — да 90 тыс. рацыёнаў. У Талачыне і Барысаве запасы хлеба склалі больш за 200 тыс. рацыёнаў, яны былі гвалтоўна рэквізаваны ў насельніцтва. 21 лістапада Напалеон прыбыў у Оршу. Калі генерал Платаў са сваімі казакамі наблізіўся да Оршы, Напалеон спаліў некаторыя дакументы, 60 пантонаў, частку навозак, нагружаных нарабаваным дабром, падпаліў горад і выступіў з яго. Галоўная напалеонаўская штаб-кватэра знаходзілася ў Камянцы непадалёк ад Коханава. З Коханава ў Талачын Напалеон ішоў пешшу, быў маўклівы і хмуры. Да яго падышоў афіцэр, прысланы маршалам Удзіно.

— Маршал даручыў мне данесці,— сказаў ганец,— што руская армія Чычагава прыйшла да Бярэзіны і заняла ўсе пераправы.

— Няпраўда, гэтага быць не можа! — закрычаў Напалеон.

— Два непрыяцельскія атрады,— працягваў афіцэр,— занялі мост і перайшлі ўжо на левы бераг; на рацэ лёд слабы і пераходзіць па ім немагчыма.

— Няпраўда,— гнеўна крыкнуў імператар,— ён хлусіць.

— Я выканаў толькі даручэнне маршала, які загадаў мне паведаміць гэту вестку,— запярэчыў афіцэр.

Тады, адступіўшы назад і абапёршыся на палку, Напалеон заскрыгатаў зубамі, кінуў гнеўны позірк на неба і, нібы пагражаючы, падняў угору правую руку, сказаў такое жудаснае багахульства, што начальнік штаба, які гэта чуў, не адважыўся перадаць іншым, калі расказваў аб гэтай сцэне; потым, убачыўшы генерала Дода, які прыбыў ад маршала Віктора, Напалеон з жудасным выразам твару і, не слухаючы яго дакладу, адрывіста сказаў яму: «Яны там!» (Дамбавецкі А. С. Спроба апісання Магілёўскай губерні. Магілёў, 1882. Кн. 1. С. 148, на рус. мове).

22 лістапада Напалеон прыбыў у Талачын, дзе спыніўся ў будынку манастыра.

Імператар не спаў амаль усю ноч, пра-

вёў нараду з генералам Додам, які ведаў пячэнне Бярэзіны і раіў ісці на Лепель, Глыбокае, Вільна. У тры гадзіны ночы выклікаў генерала Каленкура, раіўся аб магчымасцях пераправы цераз Бярэзіну па тонкім лёдзе, які ўкрыў раку. Было вырашана спаліць архівы арміі, эмблемы карпусоў, усе, якія засталіся, экіпажы і павозкі з нарабаваным дабром.

23 лістапада Напалеон пакінуў Талачын. Захутаны ў доўгі плашч, з палкай у руцэ, ён ішоў пешшу. За ім пляліся рэшткі пекалі «вялікай арміі». Каля вёскі Славені быў зроблены прывал. Напалеон выступіў з прамовай. Агаліўшы шпагу, ён усклікнуў, звяртаючыся да салдат: «Хто хоча ўбачыць Францыю, павінен перайсці Бярэзіну!». Усе надзеі выратавацца рушыліся. Генерал-фельдмаршал Кутузаў са сваім войскам набліжаўся да Барысаўскага павета, генерал Міларадавіч рухаўся праз Талачын, пачаваў у Бабры, адтуль выступіў у Барысаў, генерал Платаў прайшоў па правым баку пакінутага шляху паблізу Талачына і ўвайшоў у межы Мінскай губерні.

У час праследавання непрыяцеля рускімі войскамі праз Копыскі павет, куды ўваходзіла ў той час значная частка сучаснага Талачынскага раёна, да мяжы Барысаўскага павета «на вялікім шляху ў мястэчках, сялібах і вёсках сабрана было непрыяцельскіх чалавечых мёртвых цел да 13 000, якія былі спалены і закапаны ў зямлю» (Беларусь у эпоху феадалізму. Мн., 1979. Т. 4. С. 53, на рус. мове).

* * *

З успаміпаў Армана дэ Каленкура

Арман дэ Каленкур — выхадзец з радавітага французскага дваранства. Напалеон зрабіў яго обершталмайстрам двара, потым сваім паслом у Расіі, а пазней міністрам замежных спраў. У час паходу на Расію Каленкур увесь час знаходзіўся пры імператару. З дня ў дзень ён вёў дзённік, які стаў асновай яго кнігі «Мемуары». Нягледзячы на суб'ектыўнасць многіх ацэнак Каленкура, асобныя недакладнасці, «Мемуары», змяшчаюць багаты гістарычны матэрыял. Яны каштоўныя тым, што карціны разгрому напалеонаўскай арміі малюе відавочца, чалавек блізкі да Напалеона і цалкам яму адданы.

22-го мы были в Толочине; император остановился в здании, которое было чем-то вроде монастыря. Там, в Толочине, он узнал об эвакуации нашими войсками Минска, который был занят 16-го авангардом адмирала Чичагова под командованием генерала Ламберта. Император, потеряв вместе с Минском все свои склады, все средства, с помощью которых он после Смоленска рассчитывал вновь собрать и реорганизовать армию, на один момент был ошеломлен этим известием. Он не только терял все те ресурсы, на которы возлагал свои надежды, но перед ним еще выяснилась тревожная картина положения: молдавская армия, быть может, уже соединилась с корпусами, находящимися в нашем тылу, а не была подтянута Кутузовым к главным русским силам на нашем фланге, как все время надеялся император.

Император, стальная воля которого лишь еще больше закалялась при виде стольких препятствий и, можно сказать, стольких опасностей, тотчас же решил ускорить свое передвижение, подоспеть, если это окажется возможным, к Березине раньше Кутузова, сражаться и одержать победу над всеми, кто встретится на его пути. Вместе с тем он питал тешившие его и обещавшие выход из положения надежды, лелея мечту, что князь Шварценберг и Рейнье, узнав о потере нами Минска, уже выступили и изменили положение. Во всяком случае он считал, что сосредоточение под Борисовом тех войск, которыми он располагал в этом районе и которые, наверное, в связи с происходящими событиями собрались там вместе, надежным образом обеспечивает отступление армии, которое теперь нельзя прерывать вплоть до Вильно. Он был уверен, что борисовский мост находится под

1812 год. Карціна І. М. Пранішнікава. 1874. Дзяржаўная Траццякоўскан галерэя.

крепкой охраной. Этот мост был важным пунктом. Уже давно император приказал привести его в оборонительное состояние, держал там войска, и, судя по тому, что он соблаговолил говорить мне, а также князю Невшательскому, он думал, что может рассчитывать на этот пункт.

Вечером, когда император лег в постель, он оставил у себя, как это часто бывало, графа Дарю и Дюрока, чтобы поболтать с ними; он задремал, а Дарю и Дюрок стали разговаривать между собой, ожидая, пока император окончательно заснет и можно будет удалиться. Через четверть часа император проснулся и спросил их, о чем они говорят.

— Мы мечтали о воздушном шаре,— ответил Дарю.

— Для чего?

— Чтобы увезти ваше величество.

— Да, положение довольно трудное. Вы, значит, боитесь попасть под замок в качестве военнопленных?

— Нет, не военнопленных, потому что вашему величеству такой хорошей участи не предоставят.

— Положение действительно серьезно. Вопрос осложняется. И все же если начальники подадут пример, то я все еще буду сильнее, чем неприятель. У меня больше, чем нужно, сил, для того чтобы пройти по трупам русских, если единственным препятствием будут их войска.

На следующий день (23 ноября) государственная канцелярия сожгла свои бумаги; Дарю настаивал на этом, начиная с Гжатска, где мы начали уничтожать свои обозы.

В три часа утра император послал за мной и заговорил о полученных им дурных сообщениях:

— Дело становится серьезным,— сказал он.

Затем император спросил меня, достаточно ли крепок мороз для того, чтобы реки и озера замерзали и артиллерия могла бы пройти по льду.

— Думаю, что нет, по крайней мере, что касается рек,— ответил я.

— Вы сами не знаете, что говорите; ведь Ней перешел Днепр по льду без пушек, а тогда было не так холодно, как сегодня. Морозы будут, и мы пройдем через болота Березины. Иначе пришлось бы идти на прорыв и делать большой обход. Сколько дней форсированного марша нужно для того, чтобы дойти до Вилейки или до Глубокого? Положение может сделаться критическим, если Кутузов правильно сманеврирует, а Витгенштейн захочет его поддержать или соединиться с адмиралом. Эти моряки всюду приносят мне несчастье. Что касается Кутузова, то он воевать не умеет. Когда завязывается бой, он дерется с отвагой, но он ничего не понимает в большой войне.

Затем император рассказал мне о разговоре с Дарю и Дюроком.

— Их воздушный шар отнюдь не был бы лишним,— сказал он шутя.— На сей раз спасение только в отваге. Если мы перейдем Березину, то я буду хозяином положения, так как двух свежих корпусов, которые находятся там, и моей гвардии достаточно для того, чтобы побить русских. Если пройти нельзя, то мы выкинем фокус. Обсудите с Дюроком, что можно будет взять с собой, в случае если нам придется прорываться не по дороге, а через поля без всяких повозок. Надо заранее подготовиться на тот случай, если придется уничтожить все, чтобы не оставлять трофеев неприятелю. Я лучше буду до конца кампании есть руками, чем оставлю русским хоть одну вилку с моей монограммой. Условьтесь с Дюроком обо всем, что касается его ведомства, и не проговоритесь никому. Я говорил об этом только с ним и с вами. Надо удостовериться, в хорошем ли состоянии мое и ваше оружие, так как придется драться.

Император коснулся еще многих других вопросов, обсуждая свое положение и проект своего отъезда во Францию.

Я переговорил с Дюроком, который в свою очередь рассказал мне о беседе императора с ним и Дарю. Мы условились, что отныне все столующиеся при императорском дворе будут сами заботиться о своих бокалах, тарелках и остальных предметах столового прибора, если желают пользоваться ими и дальше. В качестве предлога мы решили ссылаться на то, что мулы, перевозившие погребцы со столовыми принадлежностями, ослабели.

Хотя мороз был еще сильный, но небо было покрыто облаками, грозила оттепель, и во всяком случае мог пойти снег. Больные замерзали по ночам возле бивуаков. Так как люди были небрежны, а добывать фураж и воду для лошадей было трудно, то лошадей погибло очень много. Мой адъютант Жиру, который после своего ранения под Красным ехал в моей коляске, умер ночью. Он был без сознания в течение двух дней.

Из Толочина мы переехали в Бобр, куда прибыли 23-го. На дороге попадалось еще больше издохших лошадей, чем при наших прежних переходах. Встречались и человеческие трупы; очень много их мы находили на всех бивуаках; это были трупы людей, задохшихся в дыму костров, так как, продрогшие и почти окончательно замерзшие, они жались слишком близко к кострам. Живые стонали и не могли тащиться дальше, одни — от слабо-

сти, другие — потому что у них были отморожены руки и ноги. Это ужасное зрелище произвело глубокое впечатление на всех. Несчастных окоченевших людей нельзя было убедить в том, что огонь грозит им смертью и что единственное лекарство — это двигаться и растирать конечности чем-нибудь сухим, а еще лучше снегом...

Коленкур А. де. Мемуары: Поход Наполеона в Россию. М., 1943. С. 254—257.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРАДВАДЗІЦЕЛЯ ДВАРАНСТВА КОПЫСКАМУ СПРАЎНІКУ АБ АДМАЎЛЕННІ СЯЛЯН ВЫКОНВАЦЬ ПАВІННАСЦІ ПАМЕШЧЫКУ ЗАРЖЭЦКАМУ

Помещик Иосиф Заржецкий лично жаловался мне, что некоторые из крестьян, водворенных на его земле, отказываются исполнять те повинности, кои в высочайше утвержденных Положениях крестьян означены, что этим останавливают полевые работы; что к таковому неповиновению подстрекает их имения Смолян сенатора Семенова крестьянин деревни Шубочова Данила Кулеш, ложно толкуя им Положения. Он же Данила осмелился советовать свищеннику приходскому Попейко, чтобы тот не увещевал крестьян Заржецкого. Более уклончивым от исполнения повинностей своих оказались следующие крестьяне: м. Обольцов — Юстин Багун, деревни Кривой — Степан Грамок. Деревни Пищакина: Стефан и Ермолай Литвинко, Сурин — Винцес и деревни Киселева Франциc.

Уведомляя о сем ваше высокоблагородие, имею честь покорнейше просить сделать распоряжение о приведении к порядку и должному исполнению своих обязанностей поименованных крестьян, более виновных и упорных из них следует подвергнуть взысканию, а крестьянина Смолянского имения деревни Шубочова Данилу Кулеша, буде действительно он ложно толковал положения и проч. Вы может быть найдете по усмотрению вашему нелишним для примера строго наказать на месте или предать суду.

К сему имею честь присовокупить, что Заржецкий всем крестьянам, кои до сих пор аккуратно исполняли свои повинности, уступил третий день барщины, а с виновных в неисполнении своих обязанностей будет требовать и третий день до тех пор, пока не удостоверится, что они исправились и сделались исполнительными.

Предводитель дворянства (подпись).

Рэзалюцыя спраўніка:

15 мая 1861 года. исп. 16 мая № 655.

Сию же минуту с тем же нарочным дать предписание приставу Ильпичу взять крестьян сенатора Семенова деревни Шубочова — Данилу Кулеша, а равно крестьян м. Обольцов — Юстина Багуна, д. Кривой — Степана Грамока, д. Пищакина — Степана и Ермолая Литвинко, д. Сурин — Винцеся и д. Киселева — Франциса; которых, если я не буду 20 числа в Толочине, немедленно доставить ко мне в Копысь под конвоем полицейских.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1940. С. 433.

Падзеі 1863 года ў народных паданнях

Ва ўмовах рэвалюцыйнай сітуацыі ў Расіі пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863—64 гг. супраць царызму, якое ахапіла Польшчу, Беларусь, Літву і Правабярэжную Украіну. Вялікае значэнне надавалі паўстанцы Магілёўскай губерні, адкуль паўстанцкі рух меркавалі перакінуць у Расію. На дапамогу паўстанцкаму ваеннаму начальніку губерні Л. М. Звяждоўскаму з Пецярбурга і Масквы прыбылі афіцэры І. М. Будзіловіч, К. А. Жаброўскі, А. В. Аляндскі, якія фарміравалі паўстанцкія атрады ў Аршанскім і Сенненскім паветах, куды ўваходзіла ў той час тэрыторыя сучаснага Талачынскага раёна. Большасць сялян Магілёўскай губерні пад уплывам царскай прапаганды ўспрыняла паўстанне як барацьбу памешчыкаў за вяртанне прыгонніцтва, таму ставілася да яго варожа. Аршанскае акруговае таварыства краязнаўства яшчэ ў 1920-я гады збірала запісы паданняў аб паўстанні ў межах Магілёўскай губерні. Праверка вясковых паданняў па архіўных матэрыялах пераканала, што памяць народа даволі ясна захавала ход падзей у межах Талачыншчыны. Напярэдадні і пасля рэформы 1861 г. чуткі аб волі сярод сялян усё пашыраліся. Адначасова з вёскі ў вёску папаўзлі і іншыя чуткі — «аб хуткім

прыходзе палякаў, якія будуць забіраць зямлю і край наш пад сябе» (Васілеўскі Д. Сялянства Віцебскай і Магілёўскай губерань у паўстанні 1863 году. Полымя. 1928. № 6. С. 151). Гэтыя чуткі палохалі сялян, якія марылі аб хуткім скасаванні паншчыны. Ва ўсіх запісаных паданнях зафіксаваны варожыя адносіны паноў і прыгонных. «Кепска адносіліся паны да сялян, і калі парабак не выпаўняў абавязкаў, то катавалі яго розгамі» (Там жа),— адзначаў селянін Нічыпар з в. Вугалеўшчына. У той жа вёсцы другі селянін казаў, што «такія забітыя сяляне жаліліся цару на паноў, а тут паслы Нямеччыны, Аўстрыі і Францыі прыехалі к цару і сказалі, што калі ён не вызваліць сялян ад прыгону, дык яны пойдуць на яго вайной. Цар гэтага спужаўся і аслабадзіў сялян ад крапаснай няволі. Кожнаму селяніну пры гэтым павінна было даць па 6 р. грошы і па 20 дзесяцін зямлі. Паны гэтага не залюбілі, схаяруселіся з палякамі, сталі рыхтавацца да паўстання. Палякаў паны падгаварвалі і казалі, што калі яны памогуць панам, то могуць узяць усю сваю зямлю назад» (Там жа). У гэтых запісах адлюстравана надзея селяніна з Талачыншчыны атрымаць зямлю і грошы праз царскі ўрад, ён ясна ўсведамляе імкненне паноў адабраць зямлю ў сялян. «Свае» паны былі больш знаёмымі, чым невядомыя «палякі», таму прыходу палякаў вельмі баялася вёска. Пры такіх настроях цяжка было разлічваць на дапамогу сялян у паўстанні.

У ноч на 23 красавіка сфарміраваныя ў буйных маёнтках узброеныя паўстанцкія атрады пачалі выступленне. Паўстанне адначасова ахапіла Сенненскі, Аршанскі, Лепельскі, Горацкі і іншыя паветы Магілёўскай губерні. Але яно хутка было задушана. Трохі даўжэй трымаліся атрады, якія дзейнічалі ў Сенненскім і на мяжы Магілёўскага і Аршанскага паветаў. Магілёўскі паўстанцкі атрад пад кіраўніцтвам Антонія Аляндскага павёў моцную агітацыю сярод сялян за падтрымку паўстанцаў. У кожнай вёсцы Аляндскі склікаў сходы сялян і агітаваў іх за паўстанне. Яго прамовы, здаецца, павінны былі сустрэць найвялікшае спачуванне сярод сялянства. Ён абвяшчаў перадачу сялянам у карыстанне ўсёй зямлі, скасаванне прыгону, абавязковай вайсковай павіннасці і інш. Выступаў ён у Друцку і іншых вёсках Талачыншчыны, але спачуванне і дапамогі ад сялян не атрымаў. Тым не менш большая частка паданняў, запісаных аб паўстанні ў межах Талачынскага раёна, расказвае аб прамовах і паводзінах Аляндскага. Пагалоска аб ваенных дзеяннях і перамогах яго атрада, што перадавалася наступным пакаленням, вельмі перабольшвала сапраўдныя сілы атрада, які фактычна налічваў каля 100 чалавек. Так, паводле запісу ў в. Саколіна, яго атрад налічваў 250 чалавек, у Талачыне — 750 чалавек, у в. Вугалеўшчына — 1000 чалавек. Праўда, паданні збыталі імя кіраўніка паўстанцаў з імем паручніка Корсака, які быў у атрадзе. Асабліва яркімі фарбамі малюе паданне апошнюю бітву атрада Аляндскага з царскім войскам каля вёскі Антанова 26 і 27 красавіка. Першая сутычка гэтага атрада з ротай Аляксандраўскага палка скончылася перамогай паўстанцаў. Паданні паведамляюць, «што тысяча паўстанцаў пад кіраўніцтвам пана Корсака разбілі царскі атрад у 260 чалавек, пасеклі салдат на капусту, так што засталося ўсяго 7 чалавек, якія неяк дацягнуліся да Магілёва. Адтуль прыслалі ўжо 5000 салдат. Пасля першай перамогі палякі зрабілі гулянку, накупілі гарэлкі, піва, моцна заснулі ў сваім лагеры ў бары, на гары. Рускія салдаты ...абступілі ноччу лагер, ды чакалі, калі паны паўстаюць. Ужо стала ўсходзіць сонца, паны ўсё спяць. Тады салдаты надумаліся іх разбудзіць, паставілі духавую музыку і зайгралі, як толькі сонца ўзышло. Паўскаквалі палякі, а салдаты давай іх страляць. Ніводнага не выпусцілі жывога, пабілі ўсіх, застаўся толькі ранены кіраўнік «пан Корс», у яго была адсечана рука. Многа труждаўся Корс, але нарэшце памёр, паклаў сваю галаву дарма» (Там жа. С. 157. Запісана ў в. Вугалеўшчына). У афіцыйных дакументах пра гэта значылася, што рота Аляксандраўскага палка дагнала ў лесе каля мястэчка Славені і спаткала ва ўмацаваным лагеры атрад паўстанцаў у 100 чалавек. У бойцы паўстанцы былі разбіты, забіты 21 чалавек, а паранена 2, на месцы ўзята ў палон 19 чалавек, а пасля сяляне вылавілі яшчэ 60 чалавек паўстанцаў. Антонію Аляндскаму ўдалося выратавацца, ён далучыўся да атрада Жаброўскага, але 25.5.1863 г. быў схоплены карнікамі ў Барысаўскім павеце і расстраляны ў Мінску. Паданне, запісанае ў Талачыне, называе паручніка Корсака панам Карскім і даводзіць, што ён меў маёнтак у Манастырах.

Вялікае ўражанне зрабіла на насельніцтва група паўстанцаў, якую вялі праз Талачын пасля разгрому паўстання. Іх зброю вязлі на сямі фурманках, эдзіўленне выклікала драўляная гармата, абабітая жалезнымі абручамі.

Паўстанне было задушана, але над яго ўплывам царскі ўрад адмяніў з сакавіка 1863 г. на тэрыторыі Беларусі і Літвы часова-абавязаныя адносіны сялян да памешчыкаў, паменшыў на 20 % выкупныя плацяжы, вымушаны быў вярнуць сялянам частку зямлі, адабраную да рэформы. *Н. В. Шаўрук.*

ЗВЕСТКІ АБ СТАНЦЫЯХ КОХАНАВА, ТАЛАЧЫН, ВЕСЦЫ ГАЛОШАЎКА, МЯСТЭЧКАХ АБОЛЬЦЫ, ДРУЦК

За Оршей в 22 в[ерстах] железный путь достигает ст. Кохановa, грузящей до 800 тыс. пудов, из них дров и лесных материалов 600 т[ыс.] п[удов]и хлеба 200 т[ыс.] п[удов]. Лежащее тут же одноименное местечко расположено при реч[ке] Соколянке и на почтовом тракте из Орши в Сенно. Коханово имеет около 1200 жит[елей]... Коханово скупает много хлеба и леса, а также ведёт торг предметами первой необходимости.

В 8 вер[стах] к востоку от Коханова у д. Дятловки, расположенной около полотна железной дороги, в стороне от почтовой дороги, в 1792 г. был найден большой камень округлой формы, немного выпуклый, имеющий в длину 4 арш[ина] 8 верш[ков] и в ширину 3 арш[ина] 11 верш[ков]. Во всю длину камня высечен шестиконечный крест и вокруг него крупными славянскими буквами надпись: «В лето 6679 (1171) мая в 7-й день доспен крест сий: Господи! помози рабу своему Василию в крещении, именем Рогволоду, сыну Борисову» (кн. Рогволод некоторое время княжил в Полоцке). Над этим древним памятником в 1803 г. построена крестьянами деревянная церковь во имя св. Бориса и Глеба. К юго-востоку от Коханова вер[стах] в 6 расположена д. Голошевка. Здесь имеется древний каменный крест близ озера и много курганов, в которых находят бронзовые литовские головные уборы.

К северо-западу от Коханова идет почтовый тракт длины верст 40 на г. Сенно. По этому тракту вер[стах] в 15 от Коханова расположено местечко Обольцы при р[ечке] Оболянке, имеющее свыше 700 жителей... По всей вероятности город «Облъче», помещенный в перечне литовских городов в Воскресенской летописи, и есть теперешнее местечко Обольцы. В 1387 г. король Ягайло основал здесь первый в Белоруссии костел; костел этот, перестроенный в 1809 г., существует в настоящее время не в местечке, а в одной версте от него, в с. Старых Обольцах. В 1430 г. Обольцы значились в числе литовских городов. В XVI в. король Сигизмунд-Август дал Обольцы вместе с соседними Смольянами бежавшему из Москвы кн[язю] Андрею Курбскому, который уступил их Сангушке. В Обольцах имеется православная церковь, еврейский молитвенный дом, школа грамоты и почтовое отделение. Местечко ведет по преимуществу мелочную торговлю.

...В 19 в[ерстах от] ст[анции] Коханово Московско-Брестская ж. д. достигает ст[анции] Толочина и затем переходит из Оршанского в Сеннеиский уезд. Станция Толочин грузит до 800 тыс. пуд[ов] лесных материалов и до 200 тыс. пуд[ов] хлебов. Расположенное близ станции местечко Старый или Русский Толочин, имеющее до 1800 жителей... упоминается в 1433 г. В XVII в. Толочин принадлежал Сапегам, от которых перешел к Шемиотам. Лев Сапега в 1604 г. основал здесь костел, школу и больницу для бедных. Во время войны за Малороссию Толочин неоднократно был занимаем русскими войсками. В 1783 г. в нем была учреждена таможня. В 1812 г., при отступлении французов, ген[ерал] Карпов взял здесь 600 человек пленных. Базилиане в начале XIX в. (1804—07 гг.) имели здесь уездное училище, для которого в их монастыре содержалось пять монахов. В местечке есть каменная православная церковь, каменный костел, четыре еврейских молитвенных дома, становая квартира, два волостных правления, два народных училища и почтово-телеграфное отделение. Толочин бойко торгует хлебом и лесом.

Вер[стах] в 7—8 к югу от Толочина расположено в Могилевском у[езде] на правом берегу р. Друти местечко Друцк, имеющее до 300 жителей... Это один из древнейших белорусских городов. В летописи Друцк упоминается с конца XI в., именно в 1092 г., по поводу чудесных явлений в Полоцке: «се же знаменье поча быти отъ Дрьютьска», добавляет летописец. Упоминается он и в поучении Владимира Мономаха. Сначала он принадлежал к Полоцкому княжеству, потом к Минскому, а некоторое время составлял особый удел. Друцк был главным невольничьим рынком в Белоруссии. В 1116 г. сыновья Владимира Мономаха князья Давид и Ярополк разорили Друцк, взяли в плен жителей и поселили их в новопостроенном г. Желни. Но Друцк вскоре оправился. В 1158 г. здесь княжил Глеб Ростиславич, к которому бежал из Полоцка Рогволод Борисович. В 1180 г. город был снова выжжен кн[язем] Святославом Черниговским, которому помогали пов-

городцы. В конце XII в. Друцк, борясь с главными городами земли Полоцкой, подчинился протекторату князей смоленских. В половине XIII в. Друцк был завоеван литовцами; однако в нем были еще и свои князья (напр., в 1340 г. кн[язь] Иван), владевшие Друцком до 1508 г., когда три брата князья Друцкие уехали в Москву. С тех пор княжеский дом разделился на две линии: Друцких-Соколинских (от им[ения] Сокольня, в 20 вер[стах] от Друцка) и Друцких-Любецких (от Любеча Гродненского). Друцк и его окрестности часто были разоряемы, напр., 1509, 1514, 1524, 1535 гг. и пр. В настоящее время это бедное и малолюдное местечко. Следы земляного вала и глубокого рва сохранились до сих пор на острове озера, через которое протекает р. Друть. Здесь же находится величайшее в Белоруссии городище...

К северо-западу от Толочина идет большая дорога в Сенненский уезд. Вер[стах] в 10 от Толочина на этой дороге находится с. Плоское, при котором разрабатываются местные выходы известняков.

Россия: Полное географическое описание нашего отечества. Спб. 1905. Т. 9. С. 397—399.

СКАРГА СЯЛЯН ВЕСКІ НАГАЎКІ КОХАНАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ МАГІЛЕЎСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

При введении в действие уставной грамоты в 1862 г. по нашему селению Нагавки мы крайне обижены бывшим нашим владельцем Ульяном Санковским, определенным нам в то время обрубом земли на выкуп в вечность, причем лишил нас той усадебной, огородной и пашенной полевой земли и ближайших покосов, которыми предки наши и мы пользовались от давних времен, на которых местах устроен им, помещиком Санковским, фольварок, и тем так крайне стеснил нас во всем, что мы принуждены вечно бедствовать, не имея малейшей возможности при четырех душевых наделах земли высшего размера прокормить одну рабочую лошадь без того ближайшего сенокоса, который отобран у нас помещиком Санковским. О чем мы неоднократно жаловались лично г-ну местному мировому посреднику, а также и в Оршанский мировой съезд, но не получили малейшего удовлетворения, а напротив того, в настоящем году [в] первых числах сего октября месяца угодно было г-ну мировому посреднику Хоментовскому вместе с землемером прибыть в наше селение Нагавки, где его шурин Бржезовский арендует или купил устроенный фольварок при нашем селении помещиком Санковским, указал нам и ограничил для нас обруб земли еще более обидным, как мы пользовались по настоящее время, так что отобрал от нас под фольварок часть огородной и полевой земли, а также лишил нас части из последнего пользуемого ближайшего сенокоса и в числе этой земли отобрал от нас под фольварок тот необходимый для нас и для скота нашего водопой, который изобретен предками нашими от давних времен, без которого мы по отдаленности от нашего селения текущей р. Одрови принуждены будем погибнуть. Видя мы пред собою допущенное последнее и крайнее разорение нас на месте г-ном мировым посредником Хоментовским, мы невольно решили высказать г-ну мировому посреднику, что в таких наших крайних обидах принуждены будем искать законной защиты и покровительства у высшего начальства, за что один из нас — старший хозяин Изофат Федоров, кроме различных ему угроз, сделанным г-ном мировым посредником, отправлен им под арест на 6 дней в Оршанское уездное полицейское управление, не упоминая того, что за личную нашу жалобу в Оршанский мировой съезд о земле в прошедшее время также был арестован г-ном мировым посредником безвинный старик Изофат Федоров на 4 дня при том же полицейском управлении, а другие наказаны розгами.

Чувствуя мы такое пагубное на век стеснение и последнее разорение нас с горьким семейством по прописанным обстоятельствам, мы вынуждены обратиться к законной защите и покровительству в. п., покорнейше прося учинить милостивейшее свое начальничье распоряжение о наделении нас обрубом земли на выкуп в вечность по числу ревизских душ в высшем размере надела той земли усадебной и огородной, пашенной полевой и сенокосной, которую предки наши и мы пользовались от давних времен и отобранной от нас в настоящее время.

Просители крестьяне деревни Нагавки: Изофат Федоров, Исидор Максимов, Димитрий Марков, Анисим Никитин и Алексей Иванов, а по неграмотности их, по их личной и рукоданной просьбе расписался оршанский мещанин Ксенофонт Максимович Бригиневич.
ЦДГА БССР у г. Мінску, ф. 2014, воп. 1, с. 132, л.63—64.

ПРАШЭННЕ СЯЛЯН ВЕСКІ ТАЛАСКАЎШЧЫНА ЗАРЭЧНА-ТАЛАЧЫНСКАЙ ВОЛАСЦІ СТАРШЫНІ СЕННЕНСКАГА І ЧЭРЫКАЎСКАГА МІРАВЫХ З'ЕЗДАЎ АБ ПЕРААЦЭНЦЫ АДВЕДЗЕНАЙ ІМ НЯЎДОБНАЙ ЗЯМЛІ

18 снежня 1867 г.

В 1864 г. при проверке уставной грамоты, хотя и наделены мы землею на 25 ревизских душ 25 наделами, в число каковой включена и земля совсем неудобная, и за таковую исчислено ежегодного платежа по 6 р. с надела, тогда как земля наша по весьма дурному качеству своему не приносит нам ни малейшей пользы, сенные же покосы наделены нам в д. Новосёлы Оршанского у., которые отстоят от места жительства нашего в 15-верстном расстоянии, из которых при 2—3 наделах земля невозможно удержать даже одной лошади, а через то и удобрение земли время от времени истощается, и мы по чрезвычайной бедности своей не в состоянии не только исправно уплачивать денежные повинности, но даже не имеем средств пропитывать свои семейства, а потому прибегаем под покровительство в. в. б., осмеливаемся всепокорнейше просить учинить начальничье распоряжение о переоценке нашей земли и тем предоставить нам более средств как к уплате денежных повинностей, так равно к удобрению нашей истощенной земли и пропитанию наших семейств.

Просители крестьяне Гаврила Павлов, Василь Григорьев, Иван Елисеев, Фома Евменов, Василь Герасимов, Андрей Григорьев, Иван Яковлев, Изофат Леонов, а за их неграмотных по их личной просьбе расписался Дмитрий Афанасьевич Трибло.
ЦДГА БССР у г. Мінску, ф. 2014, воп. 1, спр. 391, л. 199—200.

Справа, якая цягнулася 35 гадоў

Есць на беразе ракі Друць в. Ляхі (зараз Лужная). Крыху вышэй па рацэ знаходзілася в. Пляшыўцы (цяпер называецца Зялёная). Абедзве яны, як і дзесяткі іншых, у тым ліку і сам Талачын, у канцы 19 — пачатку 20 ст. належалі памешчыку Славінскаму.

Каля в. Ляхі на Друці стаяў млын Славінскага. А лугі па берагах ракі на працягу 6 вёрст касілі на сена сяляне в. Пляшыўцы. Кожны год яны давалі каля 13 тыс. пудоў сена і больш за 2700 руб. серабра чыстага даходу.

У 1874 г. памешчык перарабіў свой млын, падняў плаціну, і ўзровень вады стаў вышэй на паўметра. У выніку лугі былі затоплены і 65 сялянскіх гаспадарак вёскі страцілі магчымасць касіць тут сена і пасвіць жывёлу. У маі 1882 г. сяляне прад'явілі памешчыку Славінскаму іск, у якім патрабавалі панізіць узровень плаціны. Гэты іск разглядаўся ўрадавым сенатам па судовым дэпартаменце больш за тры гады. Нарэшце жыхары вёскі дачакаліся яго рашэння. Толькі не стала ім лягчэй і пасля гэтага. Млын працаваў па-ранейшаму, сялянскія сенакосы і пашы па-ранейшаму затапляліся вадой. Страты сялян не былі кампенсаваны. Праз год сяляне зноў прад'явілі свайму памешчыку іск, у якім патрабавалі перабудаваць млын і выплаціць ім 17 650 руб. страт. На гэты раз справа разглядалася ў Магілёўскім акруговым судзе. Старажылы кажуць, што Славінскі, пачуўшы аб тым, што на яго падалі ў суд, заспяшаўся ў Магілёў. Кажуць, што ён падкупіў суддзяў. Роўна праз год сялянам аб'явілі, што ў іску ім адмоўлена, а прычыну не называлі. Тады сяляне з сваіх мізэрных запасаў сабралі па 5 руб. і паслалі ў Пецярбург аднавяскоўца Яніна Сушкова, які павёз скаргу ва ўрадавы сенат. Аднак сенат адхіліў гэту скаргу, бо селянін, які яе прывёз, быў непісьменным (?!). Між іншым, пакуль сенат паведаміў аб тым, што скарга пакінута без разгляду, прайшло каля 4 гадоў.

Мінула яшчэ 12 гадоў. Усё заставалася па-ранейшаму: памешчык самаўладнічаў, а сяляне пакутавалі. У поўным адчаі ў 1904 г. напісалі сяляне пісьмо самому цару Мікалаю II. Думалі, дапаможа гасудар, абароніць іх ад памешчыка. Толькі не ведалі сяляне, што

цар — сам першы памешчык у Расіі. Дарэмна яны выказвалі ў пісьме ўсю горыч і крыўду, дарэмна пісалі, што іх страты ўжо склалі звыш 60 000 руб. серабром, што 36 гаспадарак в. Пляшыўцы засталіся без хлеба, жывёла без корму, што яны абавязаны штогод адбываць дарэмна па 340 рабочых дзён на карысць памешчыка Славінскага за дадзены ім дазвол пасвіць жывёлу на яго зямлі. Глухім застаўся цар да іх просьбы. Яго не кранулі нават такія радкі пісьма: «Няшчасце, якое здарылася з намі, канчаткова разбурае гаспадарку нашай вёскі, якая знемагае ад недахопу хлеба, ад адсутнасці неабходнай харчы для жывёлы, якая з-за гэтага часта падае, і мы, сяляне в. Пляшыўцы, аказаліся ў прыгоннай залежнасці ад памешчыка Славінскага, тым больш, што абавязаны яму выплачваць штогод па 10 руб. з кожнага надзелу на кошт яго нейкіх невядомых нам убыткаў». На гэтым пісьме (яно захавалася) ёсць памета ўпраўляючага справамі імператарскай канцылярыі: «Г-н главнокомандующий приказал отклонить». Каментарыі не патрэбны.

У 1914 г. Славінскі прадаў свой млын кулаку Зяньковічу за 4500 руб. Толькі ад гэтага становішча сялян не палепшылася. Старажыл в. Пляшыўцы Сяргей Ігнатавіч Барадаўкін расказваў: «Зяньковіч выкапаў каля плаціны рэйку, на якой меўся знак, што паказваў на дазволены ўзровень вады. Выкапаў, а кляўся, што рэйку вымыла вада. Зрабіў ён гэта, каб паказаць сваё «права» падтрымліваць на рацэ патрэбны яму ўзровень вады».

Справа гэта цягнулася 35 гадоў і не магла быць вырашана просьбамі і скаргамі. Была яна вырашана за адзін год — 1917. Разам з Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй і ў в. Пляшыўцы прыйшло шчасце. Лугі, палі і лясы, якія належалі калісьці памешчыку, сталі народнай уласнасцю. Сваё шчасце сяляне знайшлі ў калгасе, які назвалі «Зара камунізма».

Г. Каралёў.

На шляху да Вялікага Кастрычніка

У пачатку 20 ст. ў Расіі склалася рэвалюцыйная сітуацыя. Прамысловы крызіс 1900—03 гг., руска-японская вайна 1904 г. ўзмацнілі галечу народных мас. Шырыўся рэвалюцыйны рух, які ахапіў і Беларусь. Сярод перадавой часткі рабочых і сялян распаўсюджваліся сацыял-дэмакратычныя ідэі.

У 1902 г. была наладжана паштовая перасылка «Искры» ў Талачын па некалькіх адрасах. Такім чынам, тут пачала складвацца група прыхільнікаў «Искры». Асобы, звязаныя з ёю, займаліся распаўсюджваннем гэтай газеты і іншай рэвалюцыйнай літаратуры. 28.6.1903 г. ў в. Славені былі раскіданы пракламацыі, у сувязі з чым Магілёўскім губернскім жандарскім управленнем было ўзбуджана дазнанне. У 1905 г. прыхільнікамі ленінскай «Искры» была створана Талачынская арганізацыя РСДРП. Яна ўваходзіла ў Палескі камітэт РСДРП, падтрымлівала цесныя сувязі з Магілёўскай, Аршанскай і іншымі партыйнымі арганізацыямі, узначаліла барацьбу працоўных Талачына ў час Рэвалюцыі 1905—07 гг.

Калі па царскаму загаду 9.1.1905 г. ў Пецярбургу войскі расстралялі мірнае шэсце рабочых, пралетарыят адказаў на гэта злачынства масавымі палітычнымі стачкамі і дэманстрацыямі пратэсту. 22 студзеня дэманстрацыя пратэсту адбылася і ў Талачыне. 200—300 чалавек прайшлі па Базарнай вуліцы з воклічамі «Далоў самадзяржаўе!», «Далоў капіталістаў, духавенства!». Былі раскіданы пракламацыі. Рэвалюцыйны рух на Талачыншчыне актывізаваўся вясной і летам 1905 г. Працоўныя вырашылі ўрачыста адзначыць Міжнародны дзень салідарнасці працоўных — 1 Мая. 14 красавіка за 2 вярсты ад Талачына ў лесе памешчыка Славінскага была арганізавана масоўка, у якой прынялі ўдзел 100 чалавек. 18 красавіка ў Талачыне каля 200 чалавек не выйшлі на работу, 30 красавіка адбылася дэманстрацыя, якая прайшла з мястэчка па дарозе на станцыю. Дэманстранты ішлі з чырвоным сцягам, стралялі ў паветра, пелі рэвалюцыйныя песні, чуліся воклічы «Ура!», «Свабода!», «Далоў самадзяржаўе!», «Далоў вайну!». Сцяг нёс Кірыла Качанаў.

25 мая мясцовая група РСДРП выпусціла лістоўку «Да ўсіх сялян» тыражом 600 экземпляраў. У ёй адзначалася, што прычынай гаротнага становішча сялян з'яўляецца засілле памешчыкаў. Лістоўка заклікала сялян падтрымаць барацьбу пралетарыяту супраць царызму і памешчыкаў, бо толькі рабочы клас і яго сацыял-дэмакратычная рабочая партыя з'яўляюцца лепшымі сябрамі сялянства. Лістоўка заклікала да ўзмацнення барацьбы за звяржэнне самадзяржаўя, за сацыялізм.

19 чэрвеня ў Талачыне адбылася дэманстрацыя на ўзор першамайскай, а 29 чэрвеня аб'яўлена ўсеагульная забастоўка. На работу не выйшлі рабочыя майстэрняў, пекары і фурманы, прыказчыкі прыватных крам. 6 ліпеня магілёўскі губернатар даносіў намесніку міністра ўнутраных спраў: «29 чэрвеня ў мяст.

Старым Талачыне Аршанскага п. ў 7 гадзін вечара... сацыял-дэмакраты арганізавалі дэманстрацыю і, праходзячы па вуліцы мястэчка патоўпам да 200 чал., адкрыта мелі ў руках кастэты, бізуны і рэвальверы; у цэнтры патоўпу неслі чырвоны сцяг, гаварылі абуральнага зместу прамовы супраць асобы гасудара імператара, рускага ўрада і вымаўлялі радасныя воклічы з прычыны забойства гр. Шувалава, былі чутны словы «Далоў самадзяржаўе», пасля чаго патоўп крычаў «Ура» і страляў з рэвальвера ў паветра. Дэманстрацыя працягвалася больш за гадзіну...». («Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 3. Мн., 1953. С. 414, на рус. мове.)

6 ліпеня забаставалі рабочыя Серкавіцкага шклозавода. Уладальніку завода Мерлісу былі прад'яўлены патрабаванні (усе пісаліся і літаграфаваліся ў Талачыне) павялічыць зарплату і палепшыць умовы працы і быту. Мерліс быў вымушаны павысіць зарплату на 10 % і палепшыць умовы працы. Адначасова забаставалі талачынскія рабочыя вінакурнага завода Славінскага. Становішча ў Талачыне ў сувязі з дэманстрацыямі і забастоўкамі абвастралася. Для расследавання туды выехаў мясцовы спраўнік з узводам драгун, але кіраўнікам дэманстрацый удалося пазбегнуць пакарання.

Шырыўся сялянскі рух на Талачыншчыне, ён набываў новыя формы: адмаўленне ад працы ў маёнтках, захоп памешчыцкай зямлі, патравы. Так, сяляне памешчыка Бялеўскага з вёскі Заполле яшчэ з вясны пачалі самавольна пасвіць жывёлу на яго палетках. Урадавыя чыноўнікі, якія сачылі за гэтымі падзеямі, адзначалі, што рух пашыраўся, усюды «в изобилии» раскіданы пракламацыі.

Дзейнасць Талачынскай арганізацыі РСДРП пашыралася па Сенненскі павет. У канцы верасня 1905 г. ў сувязі з ганебным паражэннем рускага царызму ў вайне з Японіяй арганізацыя выдала адозву «Сяляне» з заклікамі: «Патрабуйце зямлі!», «Патрабуйце ўсенароднага ўстаноўчага сходу!», «Далоў самадзяржаўе!», «Далоў памешчыкаў!», «Няхай жыве сацыялізм!». 27.11.1905 г. Талачынскія бальшавікі правялі ў мястэчку Бобр сходку, на якой заклікалі працоўных да ўзброенай барацьбы з самадзяржаўем, распаўсюдзілі пракламацыю Магілёўскай арганізацыі РСДРП «Да ўсіх», дзе выкрывалася сутнасць царскага маніфеста ад 17.10.1905 г.

Кульмінацыяй рэвалюцыі з'явілася Снежанскае ўзброенае паўстанне ў Маскве. Яно было падтрымана ў многіх гарадах і мястэчках Беларусі. 30.12.1905 г. ў Коханаве адбылася дэманстрацыя ў падтрымку дзеячаў паўстанцаў. Разрозненыя паўстанні, неаважна абарончага характару, не перараслі ў адзінае ўсерасійскае выступленне пралетарыяту і былі задушаны. Аднак працоўныя працягвалі барацьбу. У 1906 г. першамайскія палітычныя забастоўкі ахапілі 40 гарадоў і мястэчак Беларусі. 18.4(1.5).1906 г. ў Талачыне адбылася першамайская забастоўка.

Толькі ў сярэдзіне 1907 г., калі стала відавочным паражэнне рэвалюцыі, пайшоў на спад рэвалюцыйны рух і на Талачыншчыне. У гады рэакцыі Талачынская арганізацыя РСДРП была разгромлена. Аднак наступленне рэакцыі не прытупіла рэвалюцыйнай свядомасці працоўных. 8.1.1908 г. адбылася новая забастоўка рабочых шклозавода ў в. Серканіцы. Асноўнымі патрабаваннямі былі павышэнне зарплаты, устанаўленне святочных дзён і інш. Класавыя супярэчнасці ў вёсцы абвастраліся. Паводле афіцыйных даных у 1905 г. ў Сенненскім павеце 65 % зямель належала дварапам, цэрквам і купцам, якія складалі каля 20 % насельніцтва павета, 80 % сялян належала толькі 35 % зямель. Больш урадлівыя землі былі ўласнасцю памешчыкаў. Сялянам жа належалі пераважна суглінкі ды балоты. Часта землі аднаго гаспадара былі раскіданы маленькімі кавалкамі на розных месцах. Так, у адпаведнасці з «Засведчальным актам» ад 3.5.1911 г., дадзеным селяніну в. Бяздзелічы Стараталачынскай воласці Лаўрэну Захаравічу Ляховічу, яго надзел агульным памерам 3 дзесяціны 1960 квадратных сажняў складаўся з 13 участкаў, раскіданых у розных месцах. У рапарце Стараталачынскага валаснога праўлення «Аб стане сельскай гаспадаркі воласці» ад 12.4.1916 г. адзначана, што «па ступені ўраджаю 1915 год быў здавальняючым і пасельніцтва воласці будзе забяспечана зернем да будучага ўраджаю. Ураджай азімых вызначыўся сам-5, а яравых — сам-3». Калі такі ўраджай быў атрыманы ў «здавальняючы» год, то можна ўявіць, як жыў селянін у астатнія «звычайныя» гады. Сістэма сялянскага землекарыстання была трохпольнай, травасеянне адсутнічала. У панскіх маёнтках пераважала змешаная сістэма, вольнанаёмная праца тут спалучалася з адработкамі. Так, у маёнтку Талачын рабочая сіла складалася пераважна з гадавых і падзённых рабочых. Усіх гадавых рабочых у маёнтку было 38 чалавек. Тут памешчык меў сельскагаспадарчыя машыны і прыстасаванні. Сістэма гаспадаркі была заводская, бо галоўныя прадукты — жыта і бульба — ішлі на перапрацоўку на вінакурны і крухмальны заводы. Некаторую частку зямлі памешчык здаваў сялянам за адработкі. Цяжкая праца з раніцы да ночы, галеча, голад, бяспраўе былі прычынамі частых сялянскіх бунтаў. Вядомы выпадак, калі ў 1910 г. ў Коханаўскай

водасці батракі забілі свайго гаспадара і спалілі яго хату.

У гады першай сусветнай вайны становішча насельніцтва Талачыншчыны яшчэ пагоршылася. У выніку адпраўкі на фронт больш як палавіны працаздольных мужчын многія гаспадаркі асталіся зусім без работнікаў. Скарачаліся пасевы жыта, пшаніцы, бульбы. Праводзілася масавая рэквізіцыя ў насельніцтва жывёлы, фуражу, харчовых прадуктаў. Бяссэнсавасць імперыялістычнай вайны, пагаршэнне матэрыяльнага становішча, недахоп прадуктаў харчавання, разруха выклікалі незадаволенасць народных мас. У краіне складвалася новая палітычная сітуацыя, узмацняўся рэвалюцыйны рух. Люгаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя паклала канец самаўладдзю, прывяла да стварэння рэспублікі. Аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе хутка стала вядома на Беларусі. У гарадах рабочыя правялі дэманстрацыі, разгаварылі паліцыю і жандараў, вызвалілі палітвязняў, узялі пад кантроль дзяржаўныя ўстановы, скінулі царскую адміністрацыю, паўсюдна ствараліся Саветы, якія ажыццяўлялі дэмакратычныя пераўтварэнні. 25.3.1917 г. арганізаваны заводскі камітэт рабочых дрожджа-вінакурнага завода ў Талачыне, які ўстанавіў рабочы кантроль над вытворчасцю, займаўся нарміраваннем рабочага часу і зарплаты, клапаціўся аб забеспячэнні рабочых харчовымі прадуктамі. Шырыўся сялянскі рух, у сакавіку 1917 г. ў Сенненскім павеце адбыліся рэвалюцыйныя выступленні сялян. Як паведамлялася ў тэлеграме Сенненскага аддзела Магілёўскага саюза зямельных уладальнікаў таварышу міністра ўнутраных спраў вясной 1917 г., сяляне Сенненскага павета пачалі захопліваць пашы прыватных уласнікаў. Летам гэты рух пад кіраўніцтвам зямельных выканкомаў выліўся ў масавы захоп і падзел сенакосаў і пашы. Партыя бальшавікоў на чале з У. І. Леніным разгарнула барацьбу за перарастанне буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную.

Н. В. Шаўрук, А. А. Шнэйдар.

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА УПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ АБ ЗАБАСТОЎЦЫ РАБОЧЫХ ШКЛОЗАВОДА Ў В. СЕРКАВІЦЫ

23 студзеня 1908 г.

Рабочие стеклянного завода в с. Серковище Толочинской вол. Оршанского у., в числе около 400 чел., 8 сего января забастовали, предъявив владельцу завода Мерлису требования: 1) повышение заработной платы, 2) установить праздничные дни и 3) не притеснять рабочих тем, чтобы они обязательно брали продукты в его лавке, в которой существуют на жизненные припасы цены выше, чем в других лавках. Владелец завода Мерлис на требование рабочих не соглашается. Рабочие к работам не приступают и многие из них с семействами остались без средств к существованию.

Означенный завод посещали оршанский исправник и пристав 2 стана Оршанского у., приводили владельца завода Мерлиса с рабочими к соглашению, но рабочие-мастера за прежнюю плату приступить к работе не соглашаются и держат себя спокойно.

Генерал-майор Поляков.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Т. 3. Мн., 1953. С. 676—677.

ТЭЛЕГРАМА СЕННЕНСКАГА АДДЗЕЛА МАГІЛЁЎСКАГА САЮЗА ЗЯМЕЛЬНЫХ УЛАДАЛЬНІКАЎ ТАВАРЫШУ МІНІСТРА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ МАСАВЫМ ЗАХОПЕ І ПАДЗЕЛЕ СЯЛЯНАМІ СЕНАКОСАЎ І ПАШАЎ У ПАВЕЦЕ

17 ліпеня 1917 г.

В Сенненском у. Могилевской губ. весной были самовольно захвачены крестьянами пастбища частных владельцев, в настоящее время происходит массовый захват и раздел покосов и пахотной земли. Все это организуется продовольственными земельными исполкомами. События принимают угрожающий для частновладельческих хозяйств характер. Уборка покосов и хлеба невозможна. Просим немедленно энергичных мер для устранения и наказания виновных восстановления законного порядка.

Совет Сенненского отдела Могилевского союза земельных собственников.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Т. 4. Мн., 1954. С. 123.

За волю, за лепшую долю

Цёплым майскім вечарам з Талачына ў Коханава прыехаў чалавек. Спыніў каня ля дома Жыткевічаў, пастукаў у акно. З хаты выйшаў Аляксандр.

— Думаю от заначаваць,— сказаў незнаёмы.— Да Оршы далёка яшчэ. Ды і конь увагрэўся, наўрад ці дачапае без адпачынку.

Зайшлі ў хату. На стале цьмяна мігцела газнічка.

— Будзь як дома, распранайся,— прапанаваў Аляксандр.

Чалавек з Талачына скінуў суконны пінжак, павесіў яго ля дзвярэй. Прыселі да стала.

— Лістоўкі прывёз? — спытаў нарэшце Аляксандр.

— А то як жа,— адказаў прыезджы.— З-за гэтага і ехаў.

І ён выцягнуў з-за пазухі загорнуты ў анучу скрутак.

— Мала далі,— сказаў Жыткевіч.

— Колькі маглі. Выпусцілі ўсяго шэсцьдзесят штук.

Жыткевіч узяў у руку лістоўку і прачытаў: «Да ўсіх сялян».

Ніжэй ішоў тэкст: «Прычынай гаротнага становішча сялянства з'яўляецца засілле паноў... Падтрымаем барацьбу рабочых супраць царызму, паноў, бо толькі рабочы клас і яго сацыял-дэмакратычная рабочая партыя з'яўляюцца лепшымі сябрамі сялянства. За народную справу рэвалюцыянеры ідуць у турму, на катаргу, на смяротную кару. Узмоцнім барацьбу за звяржэнне царскага самадзяржаўя, за сацыялізм».

Раніцою чалавек з Талачына паехаў у Оршу. Ён зрабіў сваю справу. Цяпер павінны былі дзейнічаць Аляксандр Жыткевіч і яго сябры-аднадумцы.

У адзін з чэрвеньскіх дзён 1905 г. жыхары Коханава і навакольных вёсак выйшлі на дэманстрацыю. Упераднае Аляксандр Жыткевіч з чырвоным палотнішчам, на якім напісана: «Далоў самадзяржаўе! Няхай жыве свабода!».

«Падбухторшчыкаў» — кіраўнікоў дэманстрацыі — арыштавалі. У доме Аляксандра Жыткевіча зрабілі вобыск. Знайшлі чырвоны сцяг, забароненую літаратуру. Першага коханаўскага бунтара саслалі ў Бярдзянск Таўрычаскай губерні. Адтуль удалося ўцячы. Але нядоўга давялося пабыць на волі. За рэвалюцыйную дзейнасць Аляксандра Жыткевіча зноў судзілі: далі 12 гадоў катаржных работ.

Справу, якую пачалі першыя змагары за зямлю і волю, за лепшую долю, прадоўжылі іх браты і сёстры, сыны і дочкі.

Забастоўка ў 1905...

З успамінаў Цімафея Рыгоравіча Гіранка — былога жыхара в. Забалацце Талачынскага раёна

У студзені 1905 г. да нас дайшлі чуткі пра расстрэл рабочых у Пецярбургу і пра масавыя забастоўкі і выступленні ў шэрагу гарадоў Расіі. Пра «дэмакратаў» (сацыял-дэмакратаў) казалі дваяка. Адны хвалілі і падтрымлівалі іх, другія лаялі. У нашых мясцінах лістоўкі распаўсюджвалі Лукашэвіч Ягор з вёскі Дроздава і Чарняк (імя і прозвішча яе невядома). За рэвалюцыйную дзейнасць Ягору Лукашэвічу пагражала ссылка ў Сібір, і ён у 1906 годзе паехаў за мяжу.

Забастоўкі пракаціліся і па Талачыншчыне, пачаўшыся на вінакурным заводзе Славінскага ў Талачыне, лесапільным заводзе ў Азерцах, ахапіўшы вёскі Дроздава і Вугалеўшчына.

Пад кіраўніцтвам сацыял-дэмакратаў забастоўшыя рабочыя здымалі з работы сялян і чыгуначных рабочых і рушылі калонай да вёскі Пярэвалачня, дзе адбыўся мітынг. На мітынгу выступіла з рэвалюцыйнымі заклікамі грамадзянка Чарняк. Разам з ёю былі тры ўзброеныя падпольшчыкі з Магілёва. Забастоўшчыкі патрабавалі, каб кожнаму рабочаму-падзёншчыку плацілі па 40 кап. у дзень замест 15—20 кап., каб кожнаму рабочаму выдавалі паёк: 2,5 пуда аржаной мукі, 0,5 пуда ячнай мукі, 0,5 пуда ячных круп, 5 фунтаў сала, а таксама газу, соль, дровы, плацілі зарплату 12 рублёў замест 6—8 рублёў і інш. Праз нейкі час паліцыя пачала арышты грамадзян, якія прымалі ўдзел у забастоўцы і яе арганізацыі. Былі арыштаваны з в. Азерцы Ляховіч Антон, Кудзінаў Ерамей, Плаксіцкі Якаў, Сушко Васіль, Хруцкі, з в. Рыжычы Чарняўскі Раман, а таксама я. Арыштаваныя сядзелі ў турме больш двух месяцаў. Пасля гэтых падзей, з-за праследавання ўлад, я вымушаны быў пакінуць родныя мясціны і паехаў на работу ў Данбас.

Тут працаваў Якуб Колас

Відаць, мала хто з чытачоў нашай рэспублікі ведае, што ў свой час у нашых мясцінах, у былой Абчугскай воласці, працаваў настаўнікам народны паэт Беларусі Якуб Колас. Чамусьці сталася так, што гэта старонка біяграфіі песняра не прыцягнула пільнай увагі даследчыкаў-коласазнаўцаў. А між тым...

У аўтабіяграфіі, датаванай 1926 годам, Якуб Колас пісаў: «У пачатку 1908 года паехаў у Магілёўшчыну ў адну школу, адкрытую панам Гардзялкоўскім. Матэрыялам для навучання чытанню была «Наша ніва» і невялічкая літаратура, якую можна было дастаць тады».

Гэтыя скупыя радкі зацікавілі ўдзельнікаў літаратурнага гуртка нашай школы і мяне як кіраўніка гуртка і выкладчыка роднай літаратуры. Неўзабаве мы прачыталі артыкул С. Александровіча ў газеце «Літаратура і мастацтва», у якім паведамлялася, што Я. Колас у дарэвалюцыйны час працаваў настаўнікам у былой Абчугскай воласці. Мы выразшылі абавязкова наведаць тыя мясціны, дзе шэсцьдзесят гадоў назад народны пясняр сеяў «разумнае, добрае, вечнае».

Надышло лета. На чале групы вучняў я пайшоў у паход. Мы наведалі вёскі Габрылёва, Папоўку, Плоскае, Сані. Менавіта ў Санях, як паведамляў С. Александровіч, працавала ў 1908 годзе школа з беларускай мовай навучання, у якой настаўнічаў К. М. Міцкевіч. На жаль, звесткі, якія мы сабралі, былі скупыя. Ні ў адной з гэтых вёсак мы не знайшлі былых вучняў Я. Коласа.

Але пошукаў мы не спынілі.

Аднойчы дзесяцікласнік Мікалай Шышко прынёс радасную павіну — знойдзены былы вучань гэтай школы. Мы адразу ж напісалі Фёдару Ларыёнавічу Жураўлёву ў вёску Відзенічы Талачынскага раёна. Неўзабаве прыйшоў адказ. Фёдар Ларыёнавіч паведамляў, што ён сапраўды вучыўся ў Канстанціна Міхайлавіча, што, больш таго, школа месцілася ў хаце ягонага бацькі.

«Была справа так,— пісаў Ф. Жураўлёў.— У 1908 годзе я вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе ў вёсцы Плоскае. Разам са мной у чацвёртым класе вучылася яшчэ хлопчыкаў 10—11. Клас рыхтавалі да экзаменаў. Галоўным кіраўніком школы быў поп. У маёнтку Папоўка жыў пан Гардзялкоўскі, дэмакрат. Ён прыехаў у Сані да майго бацькі і дамовіўся, каб той пусціў у хату школу. Бацька згадзіўся: няхай дзеці вучацца. Гардзялкоўскі зараз жа прыводзіць да нас настаўніка, якога звалі Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Хлопец быў дужа добры, вучыў нас без ніякіх пакаранняў. Ён вырваў нас з рук папа, мы з палёгкай уздыхнулі. Нам стала лягчэй: не вучылі закону боскаму, не вадзілі спяваць у царкву. Настаўнік прыносіў нам беларускія кнігі і газету «Наша ніва». Мы развучвалі вершы, чыталі па-беларуску. Правучыў ён нас да вялікадня і паехаў, больш не вяртаўся. Потым прыязджаў ураднік і распытваў майго бацьку, які ў яго быў настаўнік. Бацька адказваў: «А я не ведаю: пан прывёз, зіму ён правучыў і паехаў». Пасля вялікадня поп сабраў нас і павёў у мястэчка Абчуга на экзамены. За мостам у Абчузе стаяла вялікая старая школа. Там праводзіліся экзамены, якія мы ўсе здалі і атрымалі пасведчанні за подпісамі многіх папоў. З усіх нас, былых вучняў Канстанціна Міхайлавіча, толькі я адзін застаўся жывы. Мне 70 гадоў».

Гэта пісьмо ад Фёдара Ларыёнавіча мы атрымалі ў пачатку 1964 года. Увесь гэты час мы не пакідалі пошукаў. Сёе-тое ўдалося высветліць, у прыватнасці, якім чынам Я. Колас трапіў у нашы мясціны, як ён працаваў, якую памяць пакінуў пасля сябе ў тутэйшых сялян...

Число членов КСМ в уезде и в городе около 90, точно пока нельзя установить, так как еще не поставлен на должную высоту учет членов.

Председатель упарткома [1]
Секретарь Мацкевич

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. Т. 2. Мн., 1971. С. 272—273.

[1] Подпіс адсутнічае.

Рэвалюцыяй прызваныя

У шэрагу выдатных людзей, імёны якіх упісаны ў гісторыю рэвалюцыйнага руху, барацьбы за Савецкую ўладу, нямала ўраджэнцаў Талачыншчыны. Гэта Барыс Брэслаў — слухач партыйнай школы ў Ланжумо, паплечнік У. І. Леніна, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны, Саламон Левіт — важак ніжагародскіх рабочых у час Рэвалюцыі 1905—07 гг. і Кастрычніцкай рэвалюцыі, Іван Батрак (Казлоўскі) — паэт-рэвалюцыянер, Нічыпар Масалкоў — удзельнік рэвалюцыйных падзей у Рязані, старшыня Рязанскага губвыканкома і губсаўнаргаса, Якаў Масалкоў — удзельнік Кранштацкага паўстання салдат і матросаў у кастрычніку 1905 г., удзельнікі Грамадзянскай вайны — авіяканструктар генерал М. М. Сімановіч, чэкіст М. М. Шыліёнаў і іншыя.

Слухач школы ў Ланжумо

У біяграфіі У. І. Леніна расказваецца аб партыйнай школе ў Ланжумо. Сярод слухачоў, якіх рыхтавалі для падпольнай работы ў Расіі, быў Б. Брэслаў.

Барыс Брэслаў нарадзіўся 10 кастрычніка 1882 г. ў в. Мікуліна Талачынскага раёна ў сям'і землякопа. У бацькоў было шмат дзяцей, таму пра адукацыю не прыходзілася і думаць, аб школе ці гімназіі Барыс мог толькі марыць. З малых гадоў ішоў ён складаным шляхам самаадукацыі і таму ў графе пра адукацыю нярэдка пісаў: «самавучка». У вёсцы давялося жыць нядоўга — з пятнаццаці гадоў сам зарабляў сабе на хлеб, спа-

Б. А. Брэслаў.

чатку ў Гарадку, а потым у Віцебску працаваў чаляднікам у шавецкай майстэрні, па 15—17 гадзін у суткі гнуў спіну на гаспадара. У рабочым асяроддзі авалодваў азбукай рэвалюцыйнага мыслення і ў 17 гадоў стаў на шлях класавай барацьбы. Больш за два гады актыўна ўдзельнічаў у сацыял-дэмакратычным руху ў Віцебску і ў 1899 г. стаў членам РСДРП.

Неўзабаве ў Віцебск стала прыходзіць «Искра» з ленінскімі артыкуламі, у якіх навукова абгрунтоўвалася гістарычная місія пралетарыяту, даваўся глыбокі аналіз усіх палітычных партый Расіі. Уплыў ленінскіх ідэй на выхаванне рэвалюцыйнай свядомасці Брэслава стаў вызначальным, а яго жаданне арганізоўваць рабочых было неадольным. Ён дапамагаў рабочым фабрыкі Калбаноўскага памеціць бліжэйшыя задачы, узнімаў іх на барацьбу са штрайкбрэхерамі. Потым арганізаваў палітычную забастоўку рабочых тытунёвай фабрыкі, якая стала прыкметнай падзеяй у горадзе.

Брэславым зацікавілася паліцыя, угледзеўшы ў ім небяспечнага праціўніка царызму. Летам 1901 г. ён быў арыштаваны і зняволены ў віцебскую турму. Там, у адзіночцы, паўгода самастойна авалодваў азбукай і стаў пісьменным чалавекам.

Па дарозе ў ссылку Брэслава змясцілі ў маскоўскую Бутырскую турму, дзе ён прасядзеў больш як год. У лістападзе 1902 г. саслалі на пяць гадоў у Сібір. Пакутліва доўга, па этапах дабіраўся Брэслаў да сяла Бірулькі Іркуцкай губерні. Пасяліўся на кватэры разам са ссыльным Клябанавым, засуджаным па справе гомельскай сацыял-дэмакратыі. Жылі дружна, дапамагалі адзін аднаму як маглі. Там Брэслаў пазнаёміўся з вядомай рэвалюцыянеркай Людмілай Мікалаеўнай Сталь. Яна прыязджала з пасёлка Верхаленск, каб дапамагчы адной ссыльнай жанчыне. Пазней Сталь успамінала: «Мяне прывезлі спачатку на кватэру Клябанава і Брэслава, якія жылі разам. Яны былі добрымі сябрамі і, несумненна, карысталіся ўплывам як сярод ссыльных, так і сярод сялян» (Сталь Л. М. Перад вялікім пятым годам. М.; Л., 1930. С. 34, на рус. мове). Брэслаў быў сярэдняга росту, з адкрытым тварам і прамым поглядам блакітных вачэй; у ім адчувалiся смеласць і пралетарскі парыў.

У сібірскім сяле Брэслаў вывучаў ленінскія працы «Што рабіць?», «Развіццё капіталізму ў Расіі». Перад ім адкрываўся новы свет ідэй, захапляючая перспектыва класавай барацьбы. Яго нястомна цягнула на волю, да людзей, і ён распрацаваў смелы план уцёкаў. «Дзякуючы старой «Искре» і брашурам Леніна, упякаючы з ссылкі ў маі 1903 г.,— успамінаў Брэслаў,— я быў ужо не проста сацыял-дэмакратам, а сацыял-дэмакратам «іскраўцам». І калі ў тую эпоху ў маёй свядомасці побач стаялі Ленін і Пляханаў, то пасля таго, як восенню 1903 г. я даведаўся аб барацьбе, якая адбывалася на 2-м з'ездзе партыі, я стаў цвёрдым ленінцам-бальшавіком» (Брэслаў Б. А. Пра У. І. Леніна: (Беглыя ўспаміны). М., 1934. С. 13, на рус. мове).

Відаць, пад уплывам Клябанава Брэслаў прыехаў у Гомель і, перайшоўшы на нелегальнае становішча, стаў працаваць у мясцовай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі.

У студзені 1904 г. ён паехаў у Пецярбург. Па дарозе, на станцыі Орша, вельмі хацелася завярнуць у роднае Мікуліна, але гэта быў бы рызыкоўны крок. У горадзе на Няве Брэслаў хутка адшукаў явачную кватэру і звязаўся з падпольшчыкамі. Неўзабаве яго выбралі членам Пецярбургскага камітэта РСДРП і адказным арганізатарам Выбаргскага і Маскоўскага раёнаў. Ён стварaў рэвалюцыйныя гурткі на прадпрыемствах, вёў палітычную агітацыю сярод рабочых. Паліцыя натрапіла на след падпольшчыка, і 24 красавіка ён быў арыштаваны і пасаджаны ў турму, дзе і прасядзеў 8 месяцаў. Нагадалі яму і ўцёк з Сібіры. У студзені 1905 г. Брэслава выслалі ў Архангельскую губернію, але па дарозе ён зноў уцёк. У Піцер нельга была вяртацца, і ён пад мянушкай Захар паехаў у Нікалаеў, а потым перабраўся ў Екацярынаслаў (цяпер Днепрапятроўск), дзе паліцыя разграміла сацыял-дэмакратычную арганізацыю. Брэслаў застаўся амаль адзіным членам Екацярынаслаўскага камітэта РСДРП. Ён пасяліўся ў маленькім пакойчыку на Пецярбургскай вуліцы, у якім была абсталявана падпольная лабараторыя па прыгатаванню дынаміту. Падзеямі ў горадзе, асабліва жыццём рабочых, цікавіўся У. І. Ленін, Брэслаў часта пісаў яму ў Жэневу. У пісьме ад 26 ліпеня 1905 г. ён паведамляў аб правакацыйных вылазках па-

громшчыкаў, якіх абаранялі паліцыя і казакі, і аб дзеяннях бальшавікоў супраць пагромшчыкаў. Праз месяц з чарговай партыяй нелегальнай літаратуры з Жэневы прыйшла газета «Пролетарий». На старонцы 30-га нумара цэнтральнага органа партыі Брэслаў убачыў сваё пісьмо да Леніна. А ў артыкуле «Чорныя сотні і арганізацыя паўстання» правадыр партыі аналізаваў дзеянні Екацярынаслаўскай арганізацыі РСДРП, выкарыстоўваючы звесткі Брэслава.

У канцы жніўня 1905 г. Брэслаў быў вымушаны пакінуць Екацярынаслаў і пераехаць у Маскву. Маскоўскі камітэт партыі прызначыў яго начальнікам баявых дружын. Там працаваў з такімі выдатнымі дзеячамі партыі, як Мікалай Баўман, Павел Даўге, Пётр Заломаў, Аляксей Відзернікаў, Людміла Сталь. Аб нарастаючай хвалі рэвалюцыі ў Маскве Брэслаў паведамляў у Жэневу Леніну. У пачатку кастрычніка Уладзімір Ільіч напісаў заўвагу ад рэдакцыі «Пролетария» да пісьма Брэслава: «Гэта цікавае пісьмо паказвае ўвачавідкі, як рэвалюцыйная актыўнасць пралетарыяту на поўначы пераўзышла чаканні многіх сацыял-дэмакратаў» (Ленінскі зборнік. Т. 26. С. 436, на рус. мове).

Першая руская рэвалюцыя набірала сілу. Масква мітынгавала. Выступаючы на мітынгу ў Вышэйшым тэхнічным вучылішчы, Брэслаў выкрываў ашуканства і крывадушнасць царскіх улад. А 11 кастрычніка ён на чале баявой дружыны ўступіў ва ўзброеную сутычку з казакамі, якія спрабавалі разагнаць рабочы мітынг, і быў паранены.

Неўзабаве пасля гэтага Брэслаў перабраўся ў Пецярбург. Працаваў на Васільеўскім востраве ў якасці раённага партыйнага арганізатара. У пачатку лістапада выбраны членам Аб'яднанага Пецярбургскага камітэта РСДРП, у які ўваходзілі ў той час П. І. Галапчокін, М. І. Калінін, П. А. Красікаў, В. П. Нагін, І. А. Тэадаровіч і іншыя бальшавікі. 8 лістапада 1905 г. на расшыраным пасяджэнні Пецярбургскага камітэта, дзе абмяркоўвалася пытанне аб Саветах рабочых дэпутатаў, Барыс Брэслаў упершыню сустрэўся з У. І. Леніным. У час гутаркі Уладзімір Ільіч асабліва цікавіўся пытаннямі ўзбраення рабочых і падрыхтоўкі баявых рабочых дружын.

Асабістыя кантакты з У. І. Леніным узбагацілі Брэслава мудрасцю рэвалюцыйнай тактыкі, заахвочвалі да дзейнасці, да выкарыстання разнастайных сродкаў класавай барацьбы. Разам з Л. М. Сталь і іншымі партыйнымі журналістамі яму ўдалося наладзіць выпуск газеты «Русский набат», якая выходзіла легальна з 6 па 9 чэрвеня 1906 г. ў Пецярбургу. Пасля яе закрыцця выйшла яшчэ пяць нумароў пад назвай «Северная земля».

Партыя паслала Б. Брэслава на Урал правесці арганізацыйную работу ў сувязі з выбарамі дэлегатаў на V з'езд РСДРП. Выбары прайшлі паспяхова, бальшавікі перамаглі. І ён, Брэслаў, быў выбраны дэлегатам на Лонданскі з'езд партыі. Аднак на з'езд яму трапіць не давялося, 4 красавіка 1907 г. паліцыя арыштавала яго трэці раз.

Каля двух гадоў правёў Брэслаў у екацярынбургскай турме, а ў кастрычніку 1908 г. яго выслалі на тры гады ў сяло Абдорск Бярозаўскага павета Табольскай губерні. Але і ў трэці раз ён вырваўся з рук жандараў і дабраўся да Піцера. З вялікімі цяжкасцямі ён прабраўся праз пускую граніцу і пеўзабаве прыехаў у Парыж. Тут была вялікая калонія рускіх палітэмігрантаў і рэвалюцыянераў: Надзея Крупская, Інэса Арманд, Людміла Сталь, Мікалай Сямашка, Сямён Сямкоў, Уладзімір Дзёгаць, Сямён Шварц, Серафіма Гопнер і іншыя.

Неаднароднасць рускай эміграцыі ў Парыжы вяла да жорсткай ідэйнай барацьбы паміж групамі. У гэтым Брэслаў пераканаўся, калі трапіў у рабочы клуб, дзе з лекцыяй выступаў адзін з лідэраў меншавізму П. Б. Аксельрод. Прамоўца нахабна назваў пралетарскую рэвалюцыю «жураўлём у небе». Перакананаму марксісту было цяжка стрымацца, і Брэслаў рэзка выступіў супраць такіх здзекаў з тэорыі навуковага сацыялізма. Людміла Сталь падтрымала свайго паплечніка па барацьбе.

На другі дзень разам з Л. М. Сталь усхваляваны Брэслаў адправіўся на вуліцу Мары-Роз да Леніна. Уладзімір Ільіч уважліва выслухаў яго. Потым растлумачыў, што апартуністы, выкарыстоўваючы часовае паражэнне рабочага класа, стараюцца выбіць з яго рук ідэйную зброю — рэвалюцыйны марксізм, замяніўшы яго лжэнавуковай тэорыяй. Таму буржуазным агентам можна даць рашучы адпор, толькі трывала засвоіўшы філасофію марксізма.

У пачатку 1909 г. У. І. Ленін прапанаваў групе рабочых-бальшавікоў, якія збіраліся вярнуцца з эміграцыі на падпольную работу ў Расію, арганізаваць гурток па вывучэнню марксізма і выказаў згоду кіраваць ім. Б. А. Брэслаў і У. А. Дзёгаць, якія наведвалі гурток, успаміналі, што ў час заняткаў Уладзімір Ільіч часта прыводзіў цытаты з рукапісу сваёй працы «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм», гутарыў аб рэакцыйнасці «богастваральніцтва», тлумачыў рабочым, чаму так важна даць адпор тым, хто падвяргае рэвізіі асновы марксізма. «Гэтыя некалькі заняткаў з Ільічом па філасофіі,— успамінаў Брэслаў,—

былі вельмі дабратворнымі для мяне асабіста... Калі паявілася кніга Ільіча «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» і Багданаў выступаў у Парыжы з дакладамі супраць гэтай кнігі..., я быў адзін з вельмі нямногіх, хто выступіў у меры маіх сіл у абарону гэтай кнігі, у абарону ленінскага пункту гледжання» (Памяці Леніна: Зб. Музея Рэвалюцыі СССР. М., 1934. № 6. С. 80, на рус. мове).

Брэславу пашчасціла авалодаць навукай рэвалюцыі не толькі на ленінскіх працах, але і непасрэдна слухаць яго лекцыі. У Парыжы ён слухаў даклады Уладзіміра Ільіча пра вынікі студзеньскага Пленума ЦК партыі (1910 г.), пра ўнутрыпартыйнае становішча, пра Л. М. Талстога і богашукальніцтва, пра гадавіну Парыжскай камуны і інш.

Вясной 1911 г. Брэслаў стаў слухачом партыйнай школы ў Лонжумо (мястэчка пад Парыжам), створанай бальшавікамі пад кіраўніцтвам Леніна. Слухачамі яе былі Р. К. Арджанікідзе, Я. Д. Зевін, І. Б. Прысягін, І. Д. Чугурын і іншыя. У доме, які наймала Інэса Арманд, пасяліліся Арджанікідзе, Брэслаў і Шварц. Яны жылі ў маленькім пакоі. Гэта было свята для Брэслава. Упершыню ён трапіў у школу, дзе можна вучыцца, і ў якую — вышэйшую школу марксізма, дзе вядучым выкладчыкам быў Ленін! З цікавасцю наведваў заняткі Надзеі Крупскай, Інэсы Арманд, Анатоля Луначарскага, Мікалая Сямашкі. З 147 лекцый, праслуханых у школе за чатыры месяцы, 56 прачытаны Леніным.

Ленін ухваліў рашэнне Сяргo Арджанікідзе, Барыса Брэслава і Сямёна Шварца яшчэ да сканчэння заняткаў у школе паехаць у Расію і неадкладна павесці работу па аднаўленні бальшавіцкіх арганізацый. У пачатку ліпеня 1911 г. Уладзімір Ільіч неаднаразова сустракаўся і гутарыў з імі ў сувязі з іх ад'ездам у Расію для падрыхтоўкі VI (Пражскай) Усерасійскай канферэнцыі РСДРП.

У Пецярбургу Брэславу ўдалося наладзіць сувязі з партыйнымі групамі і арганізацыямі. Яго выбралі дэлегатам маючай адбыцца канферэнцыі. У Маскве становішча аказалася больш складаным. 29 кастрычніка ў шынку Баранава ён сабраў тайную нараду, на якой растлумачваў ленінскую праграму барацьбы з апартуністамі і неабходнасць склікання партканферэнцыі. Непрыкметна ноччу ў шынок прайшла паліцыя, былі арыштаваны Б. А. Брэслаў, І. Б. Прысягін, І. І. Ягораў і іншыя. Царскі суд не паскупіўся — Брэслаў быў прыгавораны да шасці гадоў катаргі, якую адбываў у знаёмай яму Бутырскай турме.

З турмы Брэслава вызваліла Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. У Петраградзе аднаўлялася бальшавіцкая газета «Правда», і Брэслаў быў накіраваны ў яе рэдакцыю загадчыкам аддзела хронікі.

У пачатку красавіка 1917 г. У. І. Ленін вярнуўся з эміграцыі ў Петраград. У ноч на 4 красавіка ў асабняку Кшасінскай, дзе спыніўся Ільіч, сабраліся яго паплечнікі, члены ЦК РСДРП(б), актыўныя дзеячы Петраградскай арганізацыі РСДРП(б). Сярод іх быў і Брэслаў.

Пасля прыезду У. І. Леніна яшчэ большае значэнне набыла газета «Правда». Ленін узяўся за яе рэдагаванне, і адразу акрэсленай стала палітычная лінія газеты, вырас яе аўтарытэт. Штодзень на старонках «Правды» з'яўляліся яркія артыкулы правадыра. У гэты, па словах М. І. Ульянавай, адзін з найбольш бліскучых перыядаў бальшавіцкай газеты Брэславу пашчасціла працаваць у яе рэдакцыі. Ён шмат часу і сіл аддаваў прапагандзе бальшавіцкай тактыкі, вызначанай Леніным у Красавіцкіх тэзісах. Як бальшавіцкі лектар, часта выступаў на масавых мітынгах і сходах, а зборы ішлі ў фонд партыі.

Пасля ліпеньскіх падзей ЦК РСДРП(б) узяў курс на ўзброенае паўстанне. У гэты напружаны час Брэслаў быў накіраваны ў Кранштат, дзе ўзначаліў гарадскі камітэт РСДРП(б) і стаў рэдактарам яго газеты «Голос правды». У перыяд разгулу контррэвалюцыі рэвалюцыйная крэпасць мела для Піцера асабліва вялікае значэнне. Кранштацкія бальшавікі актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх буйнейшых мерапрыемствах партыі, звязаных з падрыхтоўкай узброенага паўстання. На VI з'езд РСДРП(б) яны паслалі сваіх важакоў, сярод якіх быў і Барыс Брэслаў. Ён удзельнічаў у рабоце з'езда Саветаў Паўночнай вобласці, які праходзіў у Петраградзе.

Вечарам 24 кастрычніка 1917 г. ў Смольны прыбыў Ленін, каб асабіста ўзначаліць паўстанне. Ён патрабаваў паскорыць падвод рэвалюцыйных войск да Петраграда. На наступны дзень раніцай па выкліку Петраградскага ваенрэўкома зводны атрад маракоў на чале з камісарам Б. Брэславым выйшаў з Кранштата, 706 узброеных маракоў высадзіліся на станцыі Спасацельнай і пайшлі на Араніенбаўм (цяпер Ламаносаў). Заняўшы вакзал, атрад накіраваўся да афіцэрскай школы, абязброіў афіцэраў, канфіскаваў усю зброю.

Пакінуўшы 100 чалавек у Арыніенбаўме для аховы горада і вакзала, атрад адправіўся далей. Рэвалюцыйныя маракі абязброілі ў Пецяргофе (цяпер Петрадварэц) юнкераў, занялі Балтыйскую чыгунку. Адправіўшы захопленую зброю ў Кранштат, Барыс Брэслаў давёў свой атрад да месца прызначэння і перадаў яго ў распараджэнне Петраградскага ВРК.

Пасля рэвалюцыі партыя накіроўвала сваіх

байцоў туды, дзе яны былі асабліва патрэбны. У канцы лістапада 1917 г. М. І. Падвойскі падпісаў Брэславу пасведчанне аб назначэнні яго камісарам Віцебска. Тут Брэслаў удзельнічаў у падрыхтоўцы І Віцебскага губернскага з'езда Саветаў рабочых, салдацкіх і батрацкіх дэпутатаў, які адкрыўся 11 снежня ў гарадскім тэатры. Паслапец Піцера выступіў з дакладам аб бягучым моманце, развіцці рэвалюцыі і стварэнні народнай улады. Ен быў выбраны членам Віцебскага губвыканкома, загадчыкам секцыі працы і прамысловасці. Ен настойліва ўсталёўваў ленінскія прынцыпы новай улады і дэмакратызм, народную ініцыятыву, недапушчальнасць выкарыстання службовага становішча. Па яго прапанове выканкомам была створана рэвізійная камісія, надзеленая самымі шырокімі паўнамоцтвамі для барацьбы са злоўжываннямі. Дзейнасць Брэслава атрымала прызнанне: ён быў выбраны старшынёй Віцебскага губкома партыі і Віцебскага гарадскога Савета. У пачатку 1918 г. з групай віцебскіх дэлегатаў ён быў у Петраградзе на III Усерасійскім з'ездзе Саветаў, на якім з дакладам аб дзейнасці Саўнаркома выступіў У. І. Ленін.

У ліпені 1918 г. ЦК партыі адклікаў Б. А. Брэслава ў Маскву. Там ён займаў адказныя пасады: член Массавета, старшыня гарадскога камітэта партыі. У Грамадзянскую вайну Брэслаў знаходзіўся на фронце: быў начальнікам асобага аддзела 3-й арміі Усходняга, 12-й арміі Паўднёвага франтоў. Закончыў вайну намеснікам камандуючага войск і начальнікам палітупраўлення Маскоўскай ваеннай акругі.

Брэслаў напісаў цікавыя ўспаміны пра У. І. Леніна, збіраў звесткі пра яго жыццё і дзейнасць. Яго пяру належаць брашуры «Характар і этапы рускай рэвалюцыі», «Тры дні лютага 1917 года», «Напярэдадні Кастрычніка 1917 года». Ен пакінуў артыкулы пра жыццё і дзейнасць рэвалюцыянераў Сярго Арджанікідзе, Рыгора Пятроўскага, Канкордыі Самойлавай, Сямёна Сямкова. Больш за ўсё друкаваўся ў часопісе «Каторга и ссылка». Удзельнічаў у распрацоўцы дакументальнай гісторыі палітычнай турмы, ссылкі і эміграцыі. З 1930 г. працаваў намеснікам паўпрэда ў Францыі.

Б. Брэслаў стаў бязвіннай ахвярай самавольства і беззаконнасці ў гады культу асобы Сталіна, памёр у турме ў 1943 г.

Э. А. Карнілавіч.

Паэт рэвалюцыі

Восень 1915 года. Змрочны і непрыступны Шлісельбург. Востраў у вусці Нявы, каменныя глыбы прысадзістых пабудоў, белыя вежы, залаты ключ, што азяў на высокім шпіцы, азначаў, што выйсця адсюль няма.

Загрукацелі жалезныя дзверы, і стражнік упіхнуў Івана Казлоўскага ў адзіночную камеру. Настала тая няўлоўная пара, калі гадзіннік жыцця спыніўся. Жыццё працягвалася цяпер у развагах, марах, успамінах. Дваццацітрохгадовы Казлоўскі быў повен сілы, здароўя, рэвалюцыйнага парыву. Якім яка ненатуральным і дзікім падалося яму пахаванне зажыва ў гэтым пратухлым каменным мяшку!

У Шлісельбургскай крэпасці пакараны смерцю Аляксандр Ульянаў. Тут пакутавалі легендарная Вера Фігнер, гамяльчанін Пётр Карповіч, які ў 1901 г. забіў міністра асветы Багалепава. Тут памёр ад сухотаў магіляўчанін рэвалюцыянер-народнік Рыгор Ісаеў, засуджаны за неаднаразовыя замахі на цара. Многія адсюль не выйшлі. Няўжо і яму, Івану Казлоўскаму, не выбрацца з гэтай Бастыліі? Сярод змярцвелай цішыні пацягнуліся бясконца доўгія дні, якія палохалі сваёй аднастайнасцю і сумам. Нельга было прывыкнуць да таго, што ён адрэзаны ад людзей, ад усяго жывога. Ніякіх вестак пра родных. І раптам у сярэдзіне дня, калі пайшоў трэці месяц зняволення, у камеры з'яўляецца стражнік.

— Выходзь! Спатканне на пяць мінут. Стой тут, ля гэтага шкла, — загадалі вязню.

Праз хвіліны дзве там, за жоўтым шклом, мільганула знаёмая барадатая постаць.

— Тата? Гэта ты? Добры дзень, родны мой!

— Добры дзень, Іванька! Мне дрэнна бачна, ды па голасу пазнаю цябе.

— Як там мама, сёстры, браты?

— Жывём паціху. Здаровыя. На цябе не злуём. Мацуйся, сынок...

Бацька так і не паспеў сказаць Івану, што толькі дзякуючы ахоўніку, які аказаўся з іх мясцін, удалося прабіцца сюды.

Расхваляваны Іван Казлоўскі прысеў на драўлянай канапе. Яго апанавалі глыбокі роздум і ўспаміны. Ахапіла сыноўняя ўдзячнасць бацьку, з якім некалі нават канфліктаваў...

Іван Казлоўскі нарадзіўся 29 лютага 1892 г. ў в. Малое Гальцэва. У бацькоў тады была толькі дачка Матрона. Пасля яго з'явіліся на свет Лізавета, Ганна, Аксеня, Цімох. Вёска, у якой яны жылі, была, відаць, самая бедная ва ўсёй Коханаўскай воласці. Ваня, хлапчук дапытлівы і жвавы, вельмі хацеў вучыцца.

І. А. Казлоўскі з бацькамі.

Бацька ж, Андрэй Іванавіч, лічыў, што калі сын будзе дапамагаць у гаспадарцы, то ў хаце будзе куды лягчэй з кавалкам хлеба. Хлопчык пайшоў супраць волі бацькі. З дапамогай знаёмых пачаў вучыцца ў Коханаўскім двухгадовым вучылішчы. Ён аказаўся настойлівым і на дзіва здатным вучнем. Разам з набытымі ведамі раслі яго свядомасць і годнасць. Аднойчы, назіраючы, як настаўнік прыніжаў вучняў, Ваня намаляваў на яго карыкатуру. За гэта хлопца выгналі з вучылішча.

У 1908 г. ён паступіў у Аршанскае гарадское вучылішча. Тут, у горадзе рабочых, саматужнікаў, гандляроў і старцаў, ён яшчэ глыбей спазнаў жыццё, яшчэ большай стала яго нянавісць да дзялкоў і таўстасумаў. Паступова ён уцягваецца ў рэвалюцыйную дзейнасць: наведваў загарадныя сходкі рабочых, распаўсюджваў лістоўкі. А аднойчы на маёўцы яму даручылі несці чырвоны сцяг. Потым ён спрытна залез на хвою і замацаваў яго на самай верхавіне. За гэта яго чакала суровая кара, калі б у хуткім часе ён не пакінуў Оршу.

Восенню 1911 г. Іван Казлоўскі прыехаў у Пецярбург. Горад ашаламіў яго строгай прыгажосцю кварталаў, палацаў, мастоў і плошчаў. У захопленні стаяў ён ля Зімняга палаца, узіраўся ў будынкі Неўскага праспекта, не пагаджаючыся ў душы з тым, што і тут, як у Кохапаве ці ў Оршы, могуць ашчэрыцца голад, невуцтва, эксплуатацыя. Варта было Казлоўскаму ўладкавацца чорнарабочым у чыгуначныя майстэрні, як адразу пераканаўся ў наіўнасці сваіх думак. Палацы, мастацтва — тым, у каго тысячы і мільёны, а падняволь ная цяжкая праца з мізэрнай платай — тым, у каго гэтых тысяч няма.

Беларускі хлопец, які ведаў цану кавалку хлеба, не баяўся працы, аптымістычна глядзеў у будучыню. Яго супакойвала тое, што тут тысячы такіх, як ён, і што сярод рабочых расце садружнасць. Ён усёй душой пацягнуўся да людзей, якія верылі ў заўтрашні дзень і гатовы былі змагацца за свабоду і братэрства.

Яшчэ ў дзяцінстве, сярод коханаўскіх краявідаў, запала ў душу хлопца мара: пісаць вершы. Спрабаваў — не выходзіла. І не зусім было ясна, пра што пісаць. Цяпер жа, на другі год жыцця ў Пецярбургу, калі ён стаў усведамляць мэты рабочага класа і адчуваць нарастанне класавых бітваў, у яго нараджаліся паэтычныя радкі. Юнак пачаў пісаць пра тое, чым жыў рабочы калектыў, да чаго імкнуўся і чаго хацеў дамагчыся. Ён рэгулярна чытаў папулярную сярод рабочых газету «Правда» і ведаў, як пра тое пішуць іншыя. І ўсё ж не рызыкнуў спачатку выступіць перад чытачамі з вершамі, а панёс у рэдакцыю сваю першую заметку. Яе, на вялікую радасць, надрукавалі. Добры пачатак натхніў Казлоўскага, і ён ужо не мог не пісаць. У 1923 г. з'явіўся яго першы верш, поўны пафасу чакання рэвалюцыі і юнацкай рамантыкі барацьбы:

Не гавары, што ў родным краі
Нам не асіліць злыбяды.
Мы не за гэта паміраем,
А каб падоўжалі гады.
Не гавары, ажно задушна
Ад глухаты, ад нематы.
Замоўкні лепей, маладушны,
Калі спатраціў веру ты.
Ты паглядзі: пайшлі ўзыходы
На месцы тым, дзе кроў цякла,
Не будзе ганьбы-асалоды,
Над дабрынёй не будзе зла.
І мы не гінулі задарам —
Ірдзее золаку імгла.
Ты паглядзі, якім пажарам
Зара паўнеба абняла!

Падпісацца сваім прозвішчам было небяспечна, трэба было схавацца пад псеўданімам. Родную вёску Малое Гальцэва спакон веку насяляла галыцьба. Голь — сінонім словам «бедны», «галадранец». Таму паставіў праставаты і ёмкі подпіс: Батрак. З гэтым імем ён прыйшоў да шматмільённага чытача і ўвайшоў у гісторыю рускай савецкай літаратуры.

Мажліва таму, што ў жыцці Івану Казлоўскаму лёгка нішто не давалася, або таму, што ён надзелены быў сур'ёзным крытычным складам мыслення, асветленага народным гумарам з першых крокаў сваёй творчасці ён узяўся за байку, адзін з найцяжэйшых жанраў паэзіі. Усё тагачаснае палітычнае жыццё ва ўмовах царскага рэжыму само на сабе штурхала на гэта. Недахоп ведаў, а таксама знясільваючая праца чорнарабочага на Мікалаеўскай чыгунцы не давалі магчымасці сур'ёзна заняцца мастацкай творчасцю. Пасля цяжкага працоўнага дня бог на вячэр-

нія курсы былой графіні Паніпай. З другога боку, даводзілася сур'ёзна займацца рэвалюцыйнай работай. Ён распаўсюджваў газету «Правда», збіраў грошы на яе выпуск, вёў палітычную агітацыю сярод рабочых 1-га Гарадскога раёна і Выбаргскай стараны. У 1914 г. Іван Казлоўскі, актыўны рабкор і выхаванец «Правды», уступіў у партыю бальшавікоў. Неўзабаве яму, ініцыятыўнаму і смеламу рэвалюцыянеру, аказалі яшчэ большы давер: выбралі першым старшынёй нелегальнага райкома партыі 1-га Гарадскога раёна.

З пачаткам першай сусветнай вайны бальшавікі Выбаргскага раёна пачалі прапаганду маніфеста Базельскага канграса II Інтэрнацыянала 1912 г. Яны стварылі рэдакцыйную групу, у якую ўвайшлі Пётр Аляксееў, Іван Казлоўскі, Тарас Кандрацьеў, паэт Аляксей Машыраў і іншыя. У сваёй першай лістоўцы яны растлумачвалі, што рабочы клас Германіі, Англіі, Францыі пратэстуе ўжо супраць кровапралітнай бойні. Настаў час і рускім закляйміць вайну ганьбай. Лістоўка была распаўсюджана ў Лігаўскім народным доме, дзе ішла мабілізацыя моладзі ў армію. Гэта ж група ўзялася за яшчэ больш адказную справу — выпуск часопіса «Рабочий голос». І ў жніўні 1914 г. яна выйшла ў свет на васемнаццаці старонках. Наборшчык А. Я. Ціханаў успамінаў, што Петраградскі камітэт партыі адобрыў ініцыятыву раёна, але прызнаў неабходным выпускаць газету ад імя Петраградскага камітэта і пад назвай «Пролетарский голос». Гэта рашэнне было прынята да выканання, і ў лютым 1915 г. першы нумар «Пролетарского голоса» ўбачыў свет. Другі нумар газеты Івану Казлоўскаму падрыхтаваць не давялося. Яго паплечнік па рэвалюцыйнай барацьбе, член КПСС з 1914 г. В. С. Жыліч успамінаў, што 10 красавіка падпольная арганізацыя вырашыла выпусціць зварот да ўсіх металістаў. Надрукаваць яго павінен быў Казлоўскі. Каб не вельмі загружаць канспіратыўную друкарню, частку шрыфтоў ён перанёс на кватэру рабочага-металіста П. Пятрова, дзе пачаў набіраць тэкст звароту. Раніцай 23 красавіка ў пакой Пятрова нечакана ўварваліся паліцэйскія. Івана схапілі і кінулі ў дом папярэдняга зняволення, дзе трымалі ў камеры-адзіночцы.

У кастрычніку 1915 г. Казлоўскага і Пятрова судзіў ваенна-акруговы суд. За рэвалюцыйную і ваенна-прапагандысцкую дзейнасць Іван Андрэевіч быў прыгавораны да васьмі гадоў катаргі. Яго закавалі ў кайданы і перавялі ў Шлісельбургскую крэпасць. Тут неўзабаве памёр ад сухотаў П. Пятроў. Казлоўскі цяжка перажываў смерць свайго сябра і ў камеры напісаў верш «Памяці тав. П. Пятрова». Нішто не зламала волю мужнага бальшавіка. У змрочнай адзіночцы ён працягваў змагацца, вывучаў французскую і нямецкую мовы, чытаў кнігі, пісаў вершы. У творчай працы ён адчуваў сябе лягчэй. Але ўмовы катаржнай турмы падарвалі яго здароў'е, і ён захварэў на цынгу. Здавалася, яшчэ дзень-другі — і волатаўскі арганізм не вытрымае...

Цяжка сказаць, чым бы скончыўся гэты пакутлівы паядынак чалавека з вынаходлівасцю царскіх катаў, калі б не грымнула рэвалюцыйная бура. У дагэтуль непрыступную Шлісельбургскую крэпасць уварваліся ўзброеныя рабочыя, і хвораму, знясіленаму пазту выдалі дакумент: «Пасведчанне № 101 ад 7 сакавіка 1917 года. Выдадзена грамадзяніну Казлоўскаму Івану Андрэевічу, 25 год, Магілёўскай губерні, Аршанскага павета, у тым, што ён па волі паўстаўшага народа вызвалены з Шлісельбургскай крэпасці». Падпісаў член выканкома пры рэўкоме Шлісельбургскага парахавога завода С. К. Багушэўскі.

Акрыяўшы духам, Іван Казлоўскі вярнуўся да сваіх партыйных сяброў, у 1-ы Гарадскі раён, дзе ўжо дзейнічаў легальны райком партыі. Сакратар райкома Іван Дзмітрыеў дапамог Казлоўскаму паладзіць лячэнне, харчаванне, адпачынак. Іван Андрэевіч зноў апынуўся ў цэнтры важнейшых палітычных падзей. Яго выбралі членам райкома. У сярэдзіне красавіка ў зале Вышэйшых жаночых курсаў на рагу Кузнечнага завулка сабраўся партыйны актыў раёна — разгарэліся гарачыя спрэчкі аб Красавіцкіх тэзісах У. І. Леніна. Сёй-той сумняваўся ў іх правільнасці, камусьці не падабаліся асобныя пункты. Сярод іншых Іван Казлоўскі з уласцівай яму іроніяй і сарказмам развянчаў апартуністычныя домыслы, падтрымаў ленінскія тэзісы, якія нацэльвалі партыю і народ на падрыхтоўку ўзброенага паўстання.

У канцы 1917 г. партыя накіравала Івана Казлоўскага ў Оршу. Яго выбралі старшынёй Аршанскага павятовага камітэта партыі. Тут ён стварыў павятовую газету «Набат» (яе першы нумар выйшаў у 1918 г.) і стаў яе першым рэдактарам. Газета была любімым дзецішчам Івана Андрэевіча. Ен пісаў сур'ёзныя артыкулы на партыйныя, палітычныя і міжнародныя тэмы, фельетоны пра людзей, варожых рэвалюцыі. Шматбаковасць унутранага і міжнароднага жыцця адлюстроўваў у вершах і байках: «Песня-марш», «Чырвопы сцяг», «Меншавікі», «Шакал», «Ліга народаў», «Ліса і воўк» — усе яны ўпершыню надрукаваны ў павятовай газеце.

На IX з'езд РКП(б) аршанская павятовая партканферэнцыя выбрала сваім дэлегатам І. А. Казлоўскага. Неўзабаве пасля вяртання з Масквы Іван Андрэевіч пакінуў Оршу, каб змагацца на франтах Грамадзянскай вайны.

У 1921 г. І. А. Казлоўскі прыехаў у Маскву, дзе пачаў працаваць у газеце «Беднота». Ён далучыўся да грамадска-літаратурнай дзейнасці. У 1924 г. скончыў факультэт грамадскіх навук Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Яго байкі і вершы перыядычна з'яўляліся спачатку ў газеце «Беднота», а потым у часопісах «Земля Советская», «Комсомолия». Ён падпісваўся старым псеўданімам «Іван Батрак», і неўзабаве гэта імя стала шырока вядомым у краіне.

У 1926 г. паэт выпусціў сваю першую кніжку баек «Абручы і клёпкі». І блізкім сябрам стала зразумела, што ў новых умовах і новымі сродкамі Казлоўскі працягвае тую вялікую рэвалюцыйную справу, за якую перанёс столькі пакут. У першым зборніку, які вобразна адлюстраваў барацьбу новага са старым, у жывой форме ён сцвярджаў ідэі пралетарскага светапогляду, неабходнасць дзейсна змагацца за сацыялізм. Байкі Івана Батрака былі скіраваны супраць класавага ворага. У іх ён выкрываў папоў, кулакоў, нэпманаўскіх дзялкоў, бюракратаў і падхалімаў, высмейваў тых, хто не хацеў разумець клопатаў рабочых і сялян. У другой і трэцяй кнігах «Саха і трактар», «Байкі» (абедзве выйшлі ў 1928 г.) ён выкрываў драпежніцкую палітыку міжнароднай буржуазіі. З кожным годам расла вядомасць байкапісца. Літаратурная крытыка таго часу пісала, што рабочы і сялянскі чытач добра ведае і чытае Батрака, што разам з Дз. Бедным ён узнавіў забыты жанр байкі.

Творы Івана Батрака, якія адлюстроўвалі канфлікты рэвалюцыйнай эпохі, набывалі вялікае выхаваўчае значэнне. Ён настойліва шукаў новыя шляхі развіцця жанру, новыя вобразы і сімвалы, якія адпавядалі б духу савецкага часу. З 1931 па 1936 г. выйшла шэсць яго кніг, з іх чатыры зборнікі баек. Сяргей Піліпенка пераклаў яго байкі на ўкраінскую мову і напісаў пра аўтара ўступны артыкул. У рэцэнзіі на ўкраінскае выданне адзначалася, што жыццё Івана Батрака не менш павучальнае, чым яго кніга, што паэт прайшоў вялікую школу рэвалюцыянера-падпольшчыка. Іван Андрэевіч знаходзіўся ў цэнтры важнейшых падзей савецкіх пісьменніцкіх арганізацый. З чэрвеня 1929 г. ў Маскве на Усерасійскім з'ездзе сялянскіх пісьменнікаў быў заслуханы і абмеркаваны яго даклад «Шляхі сялянскай літаратуры». Івана Батрака выбралі адказным сакратаром Усесаюзнага таварыства сялянскіх пісьменнікаў, ён быў членам рэдкалегіі часопіса «Земля Советская» і Цэнтральнага савета літаратурнага аб'яднання пісьменнікаў Чырвонай Арміі і Флоту, у якое ўваходзілі М. Горкі, Э. Багрыцкі, А. Серафімовіч, А. Фадзееў і іншыя. Блізкія адносіны з таленавітымі рускімі пісьменнікамі, дружба са старэйшым балышавіком-ленінцам В. А. Карпінскім садзейнічалі ідэйнаму і мастацкаму росту паэта, дапамагалі яму правільна арыентавацца ў бурным літаратурным руху 30-х гадоў. Іван Андрэевіч часта выступаў з дакладам на пленумах, сходах пісьменнікаў, у якіх адстойваў марксісцка-ленінскае разуменне ролі літаратуры ў перыяд рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Але ў тых літаратурных абставінах, дзе нярэдка праяўляліся суб'ектыўныя меркаванні і групавая зацікаўленасць, І. Батраку давялося перажыць нямала горкіх хвілін. Як член кіраўніцтва масавай пісьменніцкай арганізацыі, ён рэгулярна выступаў з артыкуламі па актуальных праблемах літаратурнага працэсу. Адзін з такіх артыкулаў — «Аб псіхалогіі творчасці», надрукаваны 16 снежня 1929 г. ў «Литературной газете», выклікаў адмоўную рэакцыю старога літаратара В. Палонскага. Незадоўга перад гэтым ён выступіў з нападкамі на паэзію У. Маякоўскага, а дзяпер у рэзкім тоне абрынуўся на І. Батрака. Іван Андрэевіч не мог пагадзіцца з неабгрунтаванай крытыкай Палонскага, які схіляўся да інтуітывізму і перабольшваў ролю падсвядомага ў літаратурнай творчасці. Спасылаючыся на выказванні К. Маркса, У. І. Леніна, Г. В. Пляханава, вядомых псіхолагаў, Іван Батрак разбіў тэорыю «адзінага патоку сялянскай літаратуры», якую навязваў Палонскі, пераканаўча паказаў, што сутнасць палітыкі партыі ў тым, каб правесці класава-размежавальную лінію паміж кулацтвам і працоўнай масай сялянства, пасля ізаляваць кулака і разбіць яго ўшчэнт. Метафізічны ж пункт погляду Палонскага, на яго думку, прыкоўвае савецкага пісьменніка да мінулага, скажае новыя працэсы, што адбываюцца ў псіхіцы сялянства пад уздзеяннем калектывізацыі і партыйнай прапаганды.

Іван Батрак бескампрамісна адстойваў партыйнасць і народнасць у літаратуры, змагаўся за ідэйнае і мастацкае выхаванне сялянскіх пісьменнікаў. Як заўважыў літаратуразнавец М. Рудаў, яго творчасць з'яўляецца звяном паміж байкай 20-х гадоў і бурным росквітам жанру 40 — пачатку 50-х гадоў.

Іван Батрак стаў бязвіннай ахвярай самавольства і беззаконнасці ў гады культу асобы Сталіна, памёр у турме ў 1943 г.

Рэвалюцыянер з Коханава

С. А. Левіт.

У 1902 г. Саламон Левіт ва ўзросце 24 гадоў пакінуў ціхае мястэчка Коханава. Тут ён нарадзіўся ў сям'і ляснога аканома, скончыў школу. Калі падрос, дапамагаў бацьку ў лясной справе. Тут ён бачыў галечу сялян, вучыўся разумець іх сацыяльнае бяспраўе. Жыццё абуджала класавую свядомасць. Незадаволенасць існуючым ладам пацягнула яго з коханаўскай глухамані да грамадскай дзейнасці.

І Левіт паехаў у Рыгу, куды часта бегла моладзь з Беларусі. Але там ён не знайшоў работы, і яму параілі ехаць у Ніжні Ноўгарад, дзе было шмат фабрык і заводаў. Каб прыжыцца ў Ніжнім і мірна разысціся з паліцыяй, юнак паступіў на завод вучнем і ў 1903 г. здаў экзамен на сталярнага чалядніка. «У тым жа годзе,— пісаў вядомы дзеяч партыі М. А. Сямашка,— паступае ў Канавіне... на лесапільны завод і хутка знаёміцца з Я. М. Свярдловым. Малады арганізатар тав. Свярдлоў адразу адзначыў здольнасці маладога рабочага і ўцягвае яго ў с.-д. арганізацыю. Левіт спачатку разносіць і расклейвае нелегальныя лісткі і адозвы, а потым становіцца арганізатарам Канавінскага раёна...» (Известия. 1926. 21 апр.).

На Волзе Левіт прайшоў і жыццёвыя, і рэвалюцыйныя універсітэты. Рабочая слабада Канавіна з яе буйным механічным заводам, паравымі млынамі, чыгуначнымі майстэрнямі, цынкавальным і лесапільным заводамі славілася рэвалюцыйнымі традыцыямі. Сустрэчы і сяброўскія гутаркі з Якавам Свярдловым, Мікалаем Сямашкам, Барысам Позернам вызначылі далейшы лёс Левіта. У 1903 г. С. А. Левіт уступіў у партыю бальшавікоў. На падпольнай рабоце раскрыліся яго здольнасці. Яго кватэра нярэдка служыла яўкай і пунктам сувязі паміж сацыял-дэмакратамі горада і рабочых раёнаў. Энергічны Левіт, вядомы па партыйнай клічцы Шафран, стаў баявым арганізатарам аднаго з падраёнаў Канавіна.

Канавінскія бальшавікі стварылі раённы партыйны камітэт, адным з кіраўнікоў якога быў выбраны Левіт. У гэты напружаны час ён стварыў першы ў горадзе партыйны клуб, які стаў цэнтрам агітацыйна-прапагандысцкай работы. Праз клуб бальшавікі імкнуліся ўплываць не толькі на рабочых, але і на сялян навакольных вёсак.

Летам 1905 г. ніжагародскі пралетарыят ушанаваў памяць барацьбітоў, якія загінулі ў Крывавую нядзелю ў Пецярбургу, арганізавалі мітынг і забастоўку. На разгром рабочых рынуліся чарнасоценцы, казакі, паліцыя: было забіта 15 і параненa 50 чалавек. 29 жніўня 1905 г. ў газеце «Пролетарий» У. І. Ленін пісаў, што ніжагародскае пабоішча звярнула на сябе ўсеагульную ўвагу, і заклікаў: «Няхай жа набліжаецца ўзброенае народнае паўстанне!».

І закіпеў народны гнеў! Першымі ўзняліся канавінскія чыгуначнікі, іх падтрымалі рабочыя Канавіна і Малітоўкі, далучыліся сормаўскія рабочыя. Агульнагарадскую стачку бальшавікі здолелі ператварыць ва ўзброенае паўстанне. Левіт узначальваў канавінскі штаб узброенай дружыны. Мясцовая буржуазія, задушыўшы сормаўскае паўстанне, накіравала ўзброеныя сілы супраць канавінскіх рабочых. 15 снежня 1905 г. ў Канавіна прыбылі казакі, артылерысты прыкаціліся дзве гарматы і адразу адкрылі агонь па апорных пунктах паўстаўшых. Калі барыкады былі разбураны, агонь перанеслі на будынак Маскоўскага чыгуначнага вакзала, у якім абаранялася каля 50 дружыннікаў на чале з С. Левітам і С. Акімавым. Каб вырвацца з акружэння, дружыннікі з боем пракладвалі сабе дарогу, неслі вялікія страты, але ўсім так і не ўдалося прабіцца. Левіт і Акімаў былі арыштаваны і кінуты ў турму. Амаль год ішло следства. Левіта засудзілі на 3 гады турэмнага зняволення. Пасля вызвалення яму нельга было заставацца ў Ніжнім: надта вядомы ён быў паліцыі. Таварышы дапамаглі перабрацца ў Баку, дзе на нелегальным становішчы ён працягваў рэвалюцыйную работу. У 1911 г. Левіт зноў арыштаваны і высланы на радзіму — у Коханава. Ён прыбыў сюды як палітычны выгнаннік, але спакойнае жыццё было яму не па душы. У хуткім часе Левіт тайна вярнуўся ў Ніжні Ноўгарад. Аднавіўшы падпольныя сувязі, ён рабіў усё

магчымае, каб ажывіць партыйную работу: удзельнічаў ва ўстанаўленні кантактаў з замежным ЦК РСДРП, у распаўсюджванні бальшавіцкай газеты «Звезда», у стварэнні легальнай газеты «Поволжская быль», быў членам яе рэдакцыйнай калегіі, пісаў артыкулы. У ахранным аддзяленні С. А. Левіт лічыўся «як найбольш дзейсны член эсдэкаўскай арганізацыі». 14 красавіка 1912 г. яго арыштавалі на нелегальнай кватэры, дзе праходзіў сход прадстаўнікоў бальшавіцкай арганізацыі. Тры месяцы Левіт быў у турме, а потым зноў высланы на тры гады ў Коханава пад нагляд паліцыі.

І на гэты раз ён не застаўся на радзіме, тайна перабраўся ў Германію. У Данцыгу па падложных дакументах ён працаваў на суднабудаўнічай верфі. Хутка ў сувязі з 300-годдзем манархіі Раманавых ён атрымаў амністыю і вярнуўся ў Ніжні Ноўгарад, дзе працягваў рэвалюцыйную дзейнасць. У гады першай сусветнай вайны арганізаваў выданні антываенных пракламацый, удзельнічаў у правядзенні рабочых забастовак, прапагандаваў ленінскія думкі аб адносінах да імперыялістычнай вайны. Горкаўскі гісторык Я. Шчэпетаў у кнізе «Салдаты ленінскай гвардыі» (Горкі, 1974, на рус. мове) пісаў пра Левіта: «Гэта быў усебакова адукаваны чалавек. Не атрымаўшы сістэматычнай адукацыі, ён выдатна разбіраўся ў марксісцкім вучэнні, гісторыі, літаратуры і іншых навуках. Гэтыя веды набываліся ў ходзе рэвалюцыйнай барацьбы, у турмах і ссылцы. Гутаркі і лекцыі Левіта высока ацэньвалі слухачы марксісцкіх гурткоў» (с. 180).

Найбольш поўна раскрыліся арганізацыйныя здольнасці С. А. Левіта ў рэвалюцыйным 1917 г. Пасля выхаду партыі з падполля яго выбралі старшынёй прэзідыума Канавінскага камітэта РСДРП. У сакавіку 1917 г. ён паехаў у Петраград на Усерасійскую нараду партыйных работнікаў, скліканую па ініцыятыве Рускага бюро ЦК РСДРП. Тут ён упершыню ўбачыў членаў ЦК П. А. Залуцкага, А. Д. Стасаву, І. В. Сталіна, сустрэўся з першым сваім настаўнікам Я. М. Свярдловым. У карэспандэнцыі С. А. Левіта, апублікаванай у «Правде» 14 красавіка 1917 г., паведамлялася, што, як толькі весткі пра рэвалюцыю ў Петраградзе дайшлі на Ніжняга Ноўгарада, спыніліся ўсе фабрыкі і заводы, «была грандыёзная дэманстрацыя, якая накіравалася да гарадскога самакіравання, а потым да турмы, адкуль былі вызвалены палітычныя зняволеныя». Левіт расказваў аб актывізацыі дзейнасці Савета рабочых дэпутатаў, усіх слаёў гарадскога насельніцтва, бальшавіцкай рэзалюцыі аб вайне з патрабаваннем неадкладнага міру без анексій і кантрыбуцый, палітычнай свабоды народам. І далей ён паведамляў аб цікавым новаўвядзенні, народжаным рэвалюцыйнай творчасцю мас: «Амаль на ўсіх заводах уведзена міліцыя з рабочых...»

У. І. Ленін, які ўважліва сачыў за развіццём рэвалюцыйнага руху, звярнуў увагу на карэспандэнцыю С. А. Левіта. А праз шэсць дзён у «Правде» з'явіўся артыкул Уладзіміра Ільіча «Аб пралетарскай міліцыі», дзе было адзначана, што прыклад ніжагародскіх рабочых павінен стаць узорам для ўсёй Расіі. Рабочая міліцыя, створаная спачатку ў Канавіне, а потым у іншых раёнах і гарадах, стала зародкам Чырвонай гвардыі.

Самы глыбокі след у сэрцы Левіта пакінула другая паездка ў Петраград — на VII (Красавіцкую) канферэнцыю РСДРП(б), на якую ён быў выбраны дэлегатам з рашаючым голасам. Тут Левіт упершыню ўбачыў Уладзіміра Ільіча Леніна.

Вярнуўшыся з Петраграда, С. Левіт прапагандаваў рашэнні Красавіцкай канферэнцыі, ленінскі курс на далейшае развіццё рэвалюцыі, выступіў з дакладам на сходзе Канавінскай арганізацыі, у якім абгрунтаваў неабходнасць поўнага разрыву з меншавікамі-абаронцамі. Ён разумеў, як цяжка рабочым змагацца без легальнага друкаванага органа і стаў ініцыятарам стварэння бальшавіцкай газеты «Интернационал».

Пасля VI з'езда партыі, які ўзяў курс на ўзброенае паўстанне, Ніжагародскі акругком партыі даў С. А. Левіту адказнае даручэнне — кіраваць стварэннем і ўзбраеннем атрадаў Чырвонай гвардыі.

На І Ніжагародскай губернскай канферэнцыі РСДРП(б) Левіт быў выбраны ў склад губкома партыі. Трэцяя паездка Левіта ў Петраград звязана з падзеямі сусветна-гістарычнай важнасці. Ён стаў дэлегатам II Усерасійскага з'езда Саветаў, які замацаваў перамогу ўзброенага паўстання ў Петраградзе і даў пачатак стварэнню рабоча-сялянскай дзяржавы. Яму пашчасціла зноў бачыць і слухаць У. І. Леніна, які выступіў з дакладам аб міры і аб зямлі. Разам з іншымі дэлегатамі Левіт галасаваў за першыя ленінскія дэкрэты, за новы Савецкі ўрад.

У ноч на 26 кастрычніка С. А. Левіт тэлеграфаваў у Ніжні Ноўгарад аб узяцці Зімняга. 28 кастрычніка пад кіраўніцтвам Ніжагародскага ваенрэўкома ў горадзе была ўстаноўлена Савецкая ўлада. Неўзабаве адбыўся губернскі з'езд Саветаў, на якім С. Левіта выбралі намеснікам старшыні Ніжагародскага губвыканкома. У студзені 1918 г. С. А. Левіт быў дэлегатам III Усерасійскага з'езда Саветаў. Яго выбралі членам Цэнтральнага Вы-

канаўчага Камітэта — вышэйшага органа ўлады Савецкай рэспублікі.

Пасля Грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі С. А. Левіт пераключыўся на гаспадарчую дзейнасць. З 1921 г. ў Маскве на адказнай рабоце ва ўстановах лясной прамысловасці. З юнацкіх гадоў у Коханаве займаўся ён лясной гаспадаркай і скончыў свой шлях намеснікам старшыні ўпраўлення трэста «Волга — Акалес».

Нялёгкае жыццё рэвалюцыянера, арышты, турмы не прайшлі бясследна. 20 красавіка 1926 г., на 48-м годзе жыцця, С. А. Левіт памёр. Развітваючыся са сваім сябрам, М. А. Сямашка пісаў: «Партыя страціла старога, заслужанага бальшавіка. Савецкае будаўніцтва страціла буйнога арганізатара, добрасумленнага, уседлівага работніка. Сябры страцілі выдатнага, чулага, крыштальна чыстага таварыша» (Известия. 1926. 21 апр.). С. А. Левіт пахаваны ў Маскве на Новадзявочых могілках.

Э. А. Карнілавіч.

Матрос з Кранштата

...Усяго толькі год праслужыў Якаў Масалкоў у кранштацкім экіпажы, але столькі зазнаў гора, што і на дзесяць хапіла б. Ён бачыў, як нарастаў народны гнеў. Матросам абрыдлі дэспатычны рэжым, бяспраўе, грубае абыходжанне афіцэраў. Цярпець далей не было сіл. Рэвалюцыйныя хваляванні ўзмацніліся, калі ў казармы зачасцілі бальшавіцкія агітатары. У флоцкіх экіпажах былі сотні незадаволеных, якія адкрыта выказвалі свой пратэст.

Раніцай 26 кастрычніка 1905 г. салдаты 2-га крапаснога пяхотнага батальёна прад'явілі афіцэрам свае патрабаванні, а потым арганізавалі дэманстрацыю. К вечару 52 салдаты былі арыштаваны. Пехацінцы разам з матросамі паспрабавалі вызваліць іх. У сутычцы з канвоем адзін з матросаў быў забіты, некалькі паранена. Вестка аб гэтым абляцела ўвесь гарнізон. З вокнаў казарм пачуліся воклічы:

— Далоў самадзяржаўе! Хопіць цярпець! Ура, свабода!

У марской крэпасці Кранштат побач з расійскай сталіцай стыхійна ўспыхнула ўзброенае паўстанне матросаў і салдат. Якаў Масалкоў схапіў з разбітага цэйхгаўза вінтоўку і разам з іншымі матросамі выбег на вуліцу. А там усё бурліла і клекатала. Паўстанцы захапілі некалькі фортаў, парушылі тэлеграфную сувязь з Пецярбургам, напалі на афіцэраў. У спешным сакрэтным данясенні камандавання паведамлялася: «Частка каманды 7-га экіпажа з вінтоўкамі і патронамі выйшла на вуліцу і адкрыла стральбу... Горад знаходзіцца ў небяспечным становішчы... Патрабуецца дапамога...»

Кранштацкае паўстанне было жорстка задушана. Сотні арыштаваных чакалі ваеннага суда, многім пагражала пакаранне смерцю. 29 кастрычніка арыштаваны і матрос Якаў Масалкоў. Збітага, скрываўленага, яго кінулі на вучэбнае судна «Верны», якое стаяла на рэйдзе. Так пачаўся яго шлях у рэвалюцыю. 30 сутак прасядзеў «дзяржаўны злачынец» у суднавай турме, галодны, чакаючы расстрэлу. Усё перадумаласа за гэтыя пакутлівыя дні, але аб сваіх учынках ён не шкадаваў. Колькі разоў перабраў у памяці сваё кароткае, поўнае цяжкасцей і трывог жыццё...

Якаў Дзмітрыевіч Масалкоў нарадзіўся 23 кастрычніка 1882 г. ў в. Чачанева Коханаўскай воласці Аршанскага павета (зараз в. Чачанева Аболецкага сельсавета Талачынскага раёна) у беднай сялянскай сям'і. Сын батрачкі, ён у сем гадоў стаў пастушком, працаваў на кулакоў і паноў. Пра адукацыю ў школе не прыходзілася нават марыць. Дома па складах навучыўся чытаць і так-сяк выводзіць літары. У службовых дакументах так і пісаў: «самавучка». З маленства праца была яго першым настаўнікам і крыніцай ведаў. У 16 гадоў паступіў на цвіковы завод у Оршы. Авалодаў прафесіяй каваля і зведаў горкую долю падневольнага рабочага. Працаваў па чатырнаццаць гадзін у суткі, а зарабляў пяць рублёў у месяц. Уражлівая натура Якава на кожным кроку адчувала класавую няроўнасць і знявагу. Дапытлівы розум яго шукаў тлумачэння і адказу на пытанні, якія цяжка было асэнсаваць і зразумець аднаму. І малады каваль усёй душой пацягнуўся да рабочых, такіх жа незадаволеных існуючымі парадкамі. Праз іх Масалкоў пазнаёміўся з падпольнай літаратурай, пачуў пра іскраўцаў, усур'ёз заняўся самаадукацыяй. Ён стаў наведваць рабочы гурток, дзе чыталі газету «Искра», вывучалі ленінскія артыкулы. Тут, у Оршы, ён даведаўся пра партыю бальшавікоў, зрабіў першыя крокі ў рэвалюцыю.

У 1904 г. Масалкова прызвалі на ваенную службу і накіравалі ў марскую крэпасць Кранштат, у сёмы флоцкі экіпаж. Служыў ён спраўна, хутка авалодваў баявой справай, і неўзабаве яму было прысвоена воінскае званне матрос другой статці.

На Балтыйскі флот Масалкоў трапіў з пэўным палітычным багажом. Гэта заўважылі члены падпольнай ваеннай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі і даручылі яму распаўсюджваць нелегальную літаратуру, весці рэ-

валюцыйную прапаганду сярод кранштацкіх матросаў і салдат. Не выпадкова ён быў адным з актыўных удзельнікаў паўстання.

Масалкова не расстралялі. Як і іншых зняволеных, яго выратавалі пецярбургскія рабочыя, якія аб'явілі забастоўку пратэсту супраць пакарання смерцю кранштацкіх матросаў. Суд прыгаварыў Я. Д. Масалкова да дванаццаці гадоў катаржных работ. У кранштацкай турме яго закавалі ў кайданы і адправілі па этапах у далёкую Сібір, да месца прызначэння — у Аляксандраўскі цэнтрал.

Катаржная турма знаходзілася за 70 вёрст ад Іркуцка. У пачатку стагоддзя ў ёй сядзеў Ф. Э. Дзяржынскі, які потым быў перапраўлены ў Вілюйск. Спачатку Масалкоў увесь дзень праводзіў у турэмным двары, хадзіў нават без кайданоў. Але потым турэмны рэжым стаў больш жорсткім: у «цэнтралку» вялікімі партыямі хлынулі ўдзельнікі першай расійскай рэвалюцыі.

У красавіку 1907 г. Масалкова адправілі на будаўніцтва Амурскай чыгункі, якую паліткатаржане называлі «калясуха» або «мясарубка». Земляныя катаржныя работы так зняслівалі, што раніцай ён не мог падняцца з дашчаных нар. Апрача таго, даводзілася цярпець голад, холад, здзекі і пабоі. Але ніштo не магло пахіснуць яго волі і палітычных поглядаў. Якаў усё часцей думаў пра ўцёкі, прыглядаўся да катаржан, з кім на гэта можна было б адважыцца. Згаварыліся з маскоўскім салдатам Іванам Цверагоўскім, засуджаным за ўдзел у паўстанні Растоўскага грэнадзёрскага палка. Выбраўшы момант, яны 7 ліпеня 1907 г. абязброілі вартавога і накіраваліся праз тайгу на Хабараўск. Вырваўшыся на волю, яны смяяліся, як дзеці. Але радасць іх была нядоўгай. Пры пераправе цераз раку Цверагоўскі патануў. Гэта адбылося так хутка, што Масалкоў не паспеў нават крыкнуць. Застаўшыся адзін на адзін з неабсяжнай тайгой, ён разгубіўся, не ведаючы, што рабіць, але хутка авалодаў сабой і ўжо па другім баку ракі ў Якава як бы ўліліся новыя сілы. Па некалькі дзён нічога не еў, прысядаў на хвіліну-другую, калі трапляліся пад нагамі чарніцы ці іншыя ягады. І зноў бег, ішоў, поўз. Але праз 18 дзён быў схоплены. Збітага да страты прытомнасці, яго даставілі ў лагер «калясухі». Катаванні паўтараліся штодзённа. Білі прыкладамі, секлі розгамі, на суд прыцягнулі ледзве жывым. За дзёрзкі ўцёк Якаў Масалкоў атрымаў «даважку»: яшчэ тры з паловай гады катаргі. Пад узмоцненым канвоем яго адправілі ў катаржную турму Горнага Зерантуя, адтуль перавялі ў Алгачы. Гэта былі турмы Нерчанскай катаргі, вядомыя невыносным ўмовамі. Тут пакутавалі тысячы зняволеных, сярод якіх былі і землякі Якава.

У Горным Зерантуі ён сустрэў члена РСДРП з 1903 г. Цімафея Паўлавіча Алфера, які нарадзіўся ў в. Кощевічы (зараз у Чашніцкім раёне). Ён быў удзельнікам рэвалюцыйнага руху ў Пецярбургу, ва Уладзівастоку, засуджаны на 8 гадоў катаргі за распаўсюджванне пракламацый Чыцінскага камітэта РСДРП і завочнае зневажанне цара. Там Якаў пазнаёміўся і з магіляўчанінам бальшавіком Іванам Сцяпанавічам Ясенкам, засуджаным за ўдзел ва ўзброеным паўстанні ў Аляксандраўску (зараз Запарожжа) да пакарання смерцю, заменянага бестэрміновай катаргай. Сустрэліся ў выгнанні, а ўсё ж ад сэрца крыху адлягло: прачынаюцца людзі з роднай зямлі.

Разам з землякамі і іншымі палітказжанамі Масалкоў пратэставаў супраць увядзення ў турмах Нерчынскай катаргі ваенных правіл абыходжання са зняволенымі: супраць жорсткага рэжыму, пабояў, масавых катаванняў. Ён удзельнічаў у 15-дзённай галадоўцы, адмаўляўся выконваць распараджэнні турэмнага начальства. За непакорлівасць і пратэсты яго на сто сутак кінулі ў халодны карцэр. І нейкім цудам ён выжыў.

Вытрымала жалезная воля рэвалюцыянера, а арганізм здаўся — Масалкоў моцна захварэў і злёг. У такім становішчы аказаліся сотні зняволеных. Гэта пра іх у лістападзе 1912 г. У. І. Ленін пісаў: «Увесь цывілізаваны свет са страшэнным абурэннем даведваецца аб катаванні і пакутах палітычных асуджаных у Кутомары, Алгачах і інш. турмах, дзе мучаюць лепшых людзей нашай краіны» [Л е н і н У. І. Творы. Т. 18. С. 393 (Полн. собр. соч. Т. 22. С. 203—204)]. У той час наш земляк не ведаў высокай ленінскай ацэнкі алгачскіх вязняў, але на гонар яму, у любых умовах барацьбы ён трымаўся дастойна, як бальшавік.

Нарэшце, ён вырваўся з Алгачаў і ў 1914 г. выпушчаны на пасяленне — жыў у пасёлку Алёкмінску Якуцкай вобласці. Былы марак уладкаваўся на невялічкім параходзе, які курсіраваў па рацэ Лена. На гэтай службе і застала яго Лютаўская рэвалюцыя 1917 г., якая адчыніла дзверы ўсім палітзняволеным і пасяленцам. Зусім хворы, з вялікімі цяжкасцямі дабраўся Якаў Масалкоў да Іркуцка і лёг у бальніцу. Але лячыцца не было часу. Класавая барацьба нарастала з кожным днём, рэвалюцыі патрэбны былі падзейныя і спрактыкаваныя людзі. Масалкоў кінуў лячэнне і паехаў на Чарамхоўскія капальні, разам з шахцёрамі актыўна ўдзельнічаў ва ўстанаўленні Савецкай улады ў рабочым пасёлку. Аднак да поўнай перамогі было яшчэ далёка. На Чарамхова рушылі белагвардзейцы і чэхаславацкія войскі. Масалкоў запісаўся добра-

ахвотнікам чырвонага апалчэння. Ён змагаўся на Усходнім фронце супраць бандаў Калчака. Летам 1919 г., знаходзячыся на падпольнай рабоце ў Іркутску, ён быў арыштаваны калчакоўцамі. І зноў (ужо ў каторы раз!) яго бязлітасна, да паўсмерці збілі шомпаламі і кінулі ў гарадскую турму. У тыя дні, калі вырашаўся лёс рэвалюцыі, яму было асабліва цяжка цярпець ізаляцыю.

У студзені 1920 г. пасля разгрому калчакоўцаў, Якаў Дзмітрыевіч зноў на свабодзе. І хоць здароўе было моцна падарвана, пра адпачынак ён не думаў. Масалкоў актыўна ўзяўся за справу. Ён уступіў у ленінскую партыю бальшавікоў (правільней кажучы, аднавіў сваю прыналежнасць да партыі, з якой страціў сувязь за доўгія гады катаргі). І ён зноў на пярэдняй лініі агню: удзельнічаў у разгроме контррэвалюцыйных сіл генерала Капеля, а ў верасні 1920 г. добраахвотнікам пайшоў на Паўднёвы фронт дабіваць барона Урангеля. Яму даручылі адказную справу — працаваць у армейскім Асобым аддзеле, потым у Адэскай губернскай ЧК. І тут ён не шкадаваў сябе, у адной з буйных ваенных аперацый супраць урангелеўцаў быў цяжка паранены ў галаву. Калі Масалкоў вылечыўся, Грамадзянская вайна ўжо скончылася. Якаў Дзмітрыевіч стаў працаваць у Адэскім губкоме партыі, потым у палітаддзеле 51-й стралковай дывізіі. Потым яго накіроўваюць на палітычную работу ў знаёмыя яму Чарамхоўскія капальні. Працуючы, ён і сам вучыцца ў Іркуцкай партыйнай школе. Скончыўшы вучобу, Масалкоў вярнуўся ў Адэсу, дзе займаўся гаспадарчай і грамадскай работай. У 1926 г. па хадайніцтву Адэскага аддзялення Таварыства паліткатаржан яму назначана персанальная пенсія.

Стаўшы пенсіянерам у 44 гады, ветэран рэвалюцыі працягваў займацца грамадскімі справамі, выхаваннем маладога пакалення. Тысячы рабочых, юнакоў і дзяўчат слухалі яго ўспаміны пра жахі царскай катаргі, пра самаадданую барацьбу людзей розных нацыянальнасцей супраць капіталізму, за свабоднае жыццё.

Матрос-бальшавік Я. Д. Масалкоў да апошняга дыхання цвёрда стаяў сваю вахту, ведаючы, што ўсё вялікае і высакароднае дасягаецца цаной вялікіх намаганняў і непазбежных ахвяр. 5 чэрвеня 1931 г. ён памёр. Адэсіты з усімі ўшанаваннямі праводзілі яго ў апошні шлях. Я. Д. Масалкоў пайшоў з жыцця, а яго палымянасць у барацьбе, рэвалюцыйны аптымізм і акрыленасць засталіся і дапамагаюць нам паспяхова вырашаць новыя задачы.

Э. А. Карніловіч.

Старшыня губсавета

Н. У. Масалкоў. 1920 г.

За шклом кніжнай шафы стаялі побач дзве фотакарткі. Прычэсанага, зграбна апранутага Сяргея Ясеніна пазнаў бы кожны. Маладога чалавека з тонкімі рысамі твару, у кепцы і куртцы я ўбачыў упершыню. Уладзімір Нічыпаравіч Масалкоў, гаспадар кватэры, растлумачыў:

— Гэта мой бацька, Нічыпар Уладзіміравіч Масалкоў, бальшавік.

— А чаму фотакарткі побач? Бацька любіў вершы Ясеніна?

— Зачытваўся імі. Але справа не толькі ў гэтым. Бацька ўстанаўліваў Савецкую ўладу ў Разанскай губерні, на радзіме паэта. Яму даводзілася бываць у Канстанцінаве і ў Спас-Клепіках, дзе Ясенін вучыўся ў школе, толькі ў розны з паэтам час, і настрой у іх быў розны. Ясенін сам-насам у клепікаўскім гаі пісаў вершы, імкнуўся ўсю душу «выплеснуть в слова». А мой бацька, прыехаўшы ў Спас-Клепікі ў 1918, гаварыў там пра неабходнасць рэвалюцыйных пераўтварэнняў...

Н. У. Масалкоў нарадзіўся 20 чэрвеня 1892 г. ў в. Высокае Аршанскага павета (цяпер Малое Высокае Талачынскага раёна) у беднай сялянскай сям'і. У Нічыпара было пяць братоў — Якаў, Барыс, Уладзімір, Іван, Фёдар — і дзве сястры — Насця і Ганна. Усе былі працалюбівыя, цягнуліся да ведаў.

Бацька меў каля сямі дзесяцін зямлі, якіх яўна не хапала, каб пракарміць сям'ю ў 10 чалавек. Разам з ім у полі працавалі і дзеці. Жылі дружна, дапамагалі адзін аднаму. Нічыпар Уладзіміравіч успамінаў, што праца ў полі рабіла іх не па ўзросту сур'ёзнымі, дысцыплінаванымі, выхоўвала пачуццё адказнасці.

Нічыпар не цураўся ніякай працы, але ча-

сам з наіўнай зайздрасцю сачыў за дзецьмі багатых местачкоўдаў, якія падоўгу гулялі і купаліся ў рэчцы. Ужо ў раннім дзяцінстве яго цікавілі пытанні: чаму несправядліва ўладкаваны свет, чаму няма роўнасці паміж дарослымі і нават дзецьмі.

Лягчэй стала, калі старэйшыя браты пайшлі на заробкі і пачалі прыносіць грошы. Асабліва запомнілася Нічыпару першая пакушка брата. «Газавая лямпа,— пісаў ён у сваім дзённіку,— была вялікай падзеяй у сям'і. Адышла ў мінулае лучына з яе курод ымам». Для яго гэта была двайная радасць: відней стала чытаць і пісаць.

У 1900 г. Нічыпар пайшоў у Коханаўскую школу, што знаходзілася за чатыры кіламетры ад дому. Тры гады вучыўся ён тут, а потым брат-тэлеграфіст уладкаваў яго ў 2-класную чыгуначную школу на станцыі Орша. Нічыпар вучыўся старанна. У 1904 г. з пачаткам руска-японскай вайны праз Оршу бясконцым патокам ішлі воінскія эшалоны. Забралі ў армію і яго старэйшага брата Якава. Весткі аб паражэннях рускіх войск, гібель рускага флоту ў Цусіме, падзенне Порт-Артура засмучалі, але і прымушалі Нічыпара ўсё часцей разважаць над тым, з-за чаго пачалася вайна, што стала прычынай паражэння Расіі.

У 1905 г. ён быў сведкаю дэманстрацый і стачак у Оршы, звязаных з падзеямі першай расійскай рэвалюцыі. Асабліва помнілася кастрычніцкая дэманстрацыя.

— У дванаццаць гадзін дня,— успамінаў ён,— калі мы сядзелі на ўроку, пачулася музыка, якая з кожнай мінутай нарастала. Праз акно мы ўбачылі на маставой калону з чырвоным сцягам і аркестрам наперадзе. Яна расцягнулася на паўтара кіламетра. Ад калоны аддзяліліся некалькі чалавек і пачалі карабкацца па даволі высокім адхоне да нашай школы. Яны стукалі ў шыбы, звярталіся да настаўніка, каб ён адпусціў нас з заняткаў.

Так Нічыпар апынуўся ў калоне дэманстрантаў і на мітынгу, які адбыўся на прывакзальнай плошчы з нагоды вымушанай уступкі самадзяржаўя паўстаўшаму народу — маніфеста 17 кастрычніка. Адны прамоўцы выказвалі надзеі на лепшыя перамены, другія заклікалі ўзмацніць барацьбу з самадзяржаўем.

Падзеі Рэвалюцыі 1905—07 гг. сталі першым урокам яго палітычнага выхавання, далі штуршок да разважанняў пра сэнс класавай барацьбы. Таму калі ён паступіў у Смаленскую прыватную гімназію і сустрэўся там з маладымі падпольшчыкамі, то быў падрыхтаваны ўспрыняць рэвалюцыйныя ідэі. Неўзабаве ён далучыўся да вучнёўскай групы, якая вяла палітычную агітацыю, стварыла сваю газету «Искра». З вялікай рызыкай купляў ён паперу і праз даверапых асоб распаўсюджваў газету сярод навучэнцаў і гараджан. У гімназіі Масалкоў пазнаёміўся з «Маніфестам Камуністычнай партыі», з артыкуламі У. І. Леніна. У канцы 1911 г. яму даручылі весці заняткі ў рабочым гуртку па пытаннях бягучай палітыкі. Сувязь Нічыпара з людзьмі працы ўмацавалася, калі ён стаў выкладаць у нядзельнай школе. Ён стараўся зацікавіць рабочых праблемамі грамадскага жыцця. У апошні год вучобы ён удзельнічаў у кампаніі па арганізацыі бальнічных кас на прадпрыемствах горада.

У 1912 г. Н. У. Масалкоў паступіў на медфак Маскоўскага універсітэта. Гэта быў адзін з нямногіх выпадкаў, калі сын бедных сялян трапіў у вышэйшую навучальную ўстанову. Для таго, каб замацавацца тут і паспяхова вучыцца, Нічыпар з раніцы да ночы не выходзіў з аўдыторый і чытальных залаў. Праз год ён наладзіў сувязі з партыйнай арганізацыяй універсітэта і ў кастрычніку 1913 г. стаў членам РСДРП. Яму зноў было даручана весці прапагандысцкую работу ў рабочым асяроддзі.

З пачаткам імперыялістычнай вайны пытанне аб адносінах да яе пралетарыяту стала адным з галоўных у партыйнай прапагандзе. Масалкоў цішком хадзіў на швейную фабрыку і тлумачыў рабочым, хто развязаў гэту разбойніцкую вайну, да чаго могуць давесці краіну гаспадарчая разруха і голад. Яму прыемна было бачыць, як святлелі вочы рабочых, як на стомленых тварах ажывала надзея. Дзеля гэтага варта было рызыкаваць, прабіраючыся на фабрыку праз паліцэйскія кардоны. Да пэўнага часу ўдача спадарожнічала студэнту. Але восенню 1915 г., калі Нічыпар займаўся падрыхтоўкай жаночага з'езда, паліцыя арыштавала яго і пасадзіла ў Таганскую турму. Пры вобыску на кватэры ў яго знайшлі нелегальную літаратуру, дакументы бальшавіцкай партыі па пытаннях вайны. Нічыпар змог даказаць, што не належаў ні да якой рэвалюцыйнай партыі. Праз паўтара месяца паліцыя выслала яго ў распараджэнне разанскага губернатара.

Масалкова і яго таварышаў пасадзілі ў губернскую турму, потым два тыдні трымалі ў турэмнай бальніцы. Нарэшце губернатар распарадзіўся пакінуць іх у Разані пад публічным наглядам паліцыі. Нічыпар пачаў шукаць работу. У сваім дзённіку ён пісаў: «Неяк прачытаў аб'яву ў газеце «Рязанская жизнь», што ёй патрабуецца начны карэктар. Адразу ж адправіўся ў рэдакцыю. Мяне прынялі супрацоўнік газеты Чараў, які азнаёміў з абавязкамі карэктара. З умовамі работы я згадзіўся і ў той жа вечар прыступіў да справы. Спачатку здавалася, што работа ў рэдак-

Пасведчанне, падпісанае старшынёй выканкома Разанскага губсавета Н. У. Масалковым.

цыі нічога акрамя сціплага жалавання не дае. Потым пераканаўся, што яна дае магчымасць ведаць усе апошнія навіны, палітычнае жыццё губерні, сутыкненні розных поглядаў».

Разам з высланымі за рэвалюцыйную дзейнасць С. А. Калеснікавым і Н. Г. Гадуновай ён стварыў падпольны гурток, распаўсюджваў нелегальныя газеты і часопісы. Гэта прыкметна ажывіла работу мясцовых сялян-дэмакратаў і спрыяла рабочаму руху ў губерні.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў пачатку сакавіка 1917 г. Масалкоў арганізоўваў выбары дэпутатаў у Савет, потым яму даручылі падрыхтоўчую работу па арганізацыі Разанскай групы РСДРП(б). Неўзабаве разам з вядомымі дзеячамі сацыял-дэмакратычнага руху ў Разані С. Серадой, Юліяй і Віктарам Шульгінымі, А. Сырамятнікавым, К. Астравухавай і іншымі Масалкоў увайшоў у бальшавіцкае ядро горада.

Бальшавікі горада ведалі, што для поспеху справы перш за ўсё трэба завяваць Савет, зрабіць яго бальшавіцкім. А гэта магчыма было зрабіць толькі пры актыўнай рабоце ў прафсаюзах. Масалкоў, Калеснікаў і іншыя ўсе сілы аддавалі прапагандысцкай рабоце на фабрыках і заводах, выступалі перад рабочымі, стваралі новыя прафсаюзныя арганізацыі. Ні адзін сход, ні адна забастоўка не праходзілі без іх удзелу.

Разумеючы ролю арміі ў рэвалюцыі, ён часта бываў у Пеўчаскіх казармах, дзе выкладаў салдатам праграму бальшавікоў, растлумачваў ім, што вайна вядзецца ў інтарэсах буржуазіі, капіталістаў і памешчыкаў, яна ўзбагачае іх і рабуе народ. Таму трэба тэрмінова пакончыць з вайной.

Акцыі прыслужнікаў буржуазіі падалі. У пачатку мая 1917 г. замест меншавіка Рузанкова, які ўзначальваў Савет, старшынёй Разанскага Савета рабочых дэпутатаў быў выбраны Н. У. Масалкоў.

Новы старшыня часта бываў у паветах, вёсках, бачыў няшчасную долю сялян, слёзы жанчын і дзяцей. Ён дабіваўся правядзення ў жыццё манаполіі на прадукты харчавання, устанаўлення цвёрдых цэн, устанавіў кантроль за дзейнасцю фабрыкантаў. Масалкоў пастаянна выступаў на мітынгах і сходах, растлумачваў рабочым, салдатам, сялянам сэнс двоеўладдзя. Ён меў палітычнае чуццё і імкнуўся перацягнуць на свой бок усіх, хто мог прынесці карысць рэвалюцыі. Леваму эсэру прапаршчыку Рыгору Пятрову ён даверыў арганізаваць народную міліцыю, потым Чырвоную гвардыю ў губерні. Р. К. Пятроў стаў дастойным салдатам Кастрычніка, камандармам, і быў у ліку 26 бакінскіх камісараў, расстраляных інтэрвентамі.

26 кастрычніка 1917 г. ў Разані з'явіўся ленінскі зварот «Да грамадзян Расіі», дзе паведамлялася аб звяржэнні Часовага ўрада і пераходзе ўсёй улады ў рукі Саветаў. У гэты дзень адбыўся сумесны сход рабочых і салдацкіх дэпутатаў з прадстаўнікамі ад часцей гарнізона, на якім быў створаны ваенна-рэвалюцыйны камітэт з васьмі чалавек. У яго ўвайшоў і Н. У. Масалкоў.

Ваенрэўком неадкладна прыступіў да дзеянняў. Ён звярнуўся да працоўнага насельніцтва з заклікам падтрымаць Саветы. Разам з іншымі бальшавікамі Н. У. Масалкоў арганізоўваў захоп тэлеграфа, тэлефоннай станцыі, банкаў. Да 30 кастрычніка ў Разані была ўстаноўлена Савецкая ўлада.

З снежня 1917 г. ў Разані адкрыўся I губернскі з'езд Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. На ім быў выбраны вышэйшы кіруючы орган губернскай улады — Савет Саветаў. Яго старшынёй стаў Н. У. Масалкоў. 23 лютага 1918 г. Н. У. Масалкоў па сумяшчальніцтву выбраны старшынёй экаламічнага савета губвыканкома. Ён быў дэлегатам IX з'езда РКП(б), на якім выступаў У. І. Ленін. Хвалюючае і незабыўнае было гэта імгненне.

У час перапынку Масалкоў нечакана су-

стрэўся з дэлегатам Аршанскай арганізацыі, паэтам Іванам Казлоўскім, з якім быў знаёмы з дзяцінства, жыў пепадалёку, вучыўся ў адной школе.

Вярнуўшыся ў Разань, Масалкоў прапагандаваў рашэнні з'езда, выступаў з дакладамі аб развіцці вытворчасці, спаборніцтва, аб умелым спалучэнні матэрыяльных і маральных стымулаў працы. Ён прыцягваў да работы старых спецыялістаў, займаўся падрыхтоўкай маладых кадраў, вылучаў на кіруючыя пасады перадавых рабочых, дапамагаў людзям стаць гаспадарамі свайго жыцця.

Восенню 1920 г. ЦК РКП(б) накіраваў Масалкова ў Вятку. Тут яго выбралі членам прэзідыума Вяцкага губвыканкома і старшынёй губсаўнаргаса. У 1923 г. ён прыехаў у Мінск для арганізацыі канторы Белпайгандлю ВСНГ Беларусі. З 1925 г. Масалкоў у Маскве, працаваў у ВСНГ, Наркамаце саўгасаў, Міністэрстве лёгкай прамысловасці СССР. Ён падтрымліваў сувязі з Разанскім краязнаўчым музеем, школамі, пісаў успаміны. За заслугі перад Радзімай быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.

Памёр Н. У. Масалкоў 7 кастрычніка 1970 г.

Э. А. Карніловіч.

Як след бліскавіцы

М. М. Сімановіч.

Імя авіяканструктара, генерала Максіма Мікітавіча Сімановіча добра ведаюць у яго роднай вёсцы Варанцэвічы. Тут ён нарадзіўся ў 1895 г. ў вялікай і беднай сям'і. З ранняга дзяцінства вылучаўся дапытлівасцю, цягай да ведаў пра навакольны свет, у пяць гадоў ужо бегла чытаў. Але дзе было ўзяць кнігі? Ды і праца ў сялянскай гаспадарцы адбірала ўвесь вольны час.

У 1911 г. прыехаў на пабыўку яго старэйшы брат, які працаваў у Маскве. Параіліся і вырашылі, што паедзе Максім з ім у Маскву, дзе можа ўдасца ўладкавацца на работу.

З восені 1911 г. Максім стаў кур'ерам бібліятэкі Сяргееўскага народнага дома, а неўзабаве і бібліятэкарам. Заробкі былі мізэрныя, але якое багацце было пад рукой! Чытаў запоем усё, што траплялася на вока. Бібліятэку пакідаў позна ноччу — ішоў пялёгкім шляхам самаадукацыі. Экзамены здаў экстэрнам і атрымаў атэстат аб сярэдняй адукацыі.

У студзені 1914 г. Максіма Сімановіча прызвалі ў армію і як чалавека адукаванага залічылі ў ваенна-санітарную школу. Ён стаў ваенным фельчарам і пазнаў усё ліха вайны. У гэты час ён збліэіўся з бальшавікамі.

Кастрычніцкая рэвалюцыя застала Сімановіча ў Вятцы. Пралетарыі святкавалі перамогу. А ў хуткім часе ўзнялася контррэвалюцыя. Партыя бальшавікоў, У. І. Ленін кінулі кліч: «Сацыялістычная Айчына ў небяспецы!» Салдат і сын патомнага батрака Максім Сімановіч уступіў у партыю бальшавікоў і пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію. Яго залічылі старэйшым урачом 1-га аператыўнага харчовага палка. Ён хутка выявіў свае арганізатарскія здольнасці і быў прызначаны начальнікам санітарнай часці зводных рэвалюцыйных атрадаў Харчова-рэквізіцыйнай арміі, якая забяспечвала хлебную манаполію, падаўляла супраціўленне кулацтва, змагалася са спекуляцыяй. Максім Сімановіч наладжваў ваенна-санітарную вучобу харчармейцаў, камплектаваў санітарныя атрады, удзельнічаў у стварэнні камітэтаў беднаты, вёў агітацыйную работу. У канцы верасня ў жорсткіх баях з белагвардзейцамі і мяцежнікамі чэхаславацкага корпуса за горад Малмыж Вяцкай губерні Максім Мікітавіч трапіў у палон, але ў хуткім часе яму ўдалося уцячы.

У кастрычніку 1918 г. пасля расфарміравання харчатрадаў Сімановіча прызначылі камісарам Ваенна-санітарнага ўпраўлення Уральскай ваеннай акругі. Дзевяць месяцаў быў ён на гэтай клапатлівай пасадзе, займаўся не толькі арганізацыяй медыцынскай дапамогі чырвонаармейцам, але і ваенным усевобучам, транспартам, харчаваннем і інш. У час гераічнай абароны Уральска ён сустракаўся з М. В. Фрунзе, В. І. Чапаевым.

Віхура Грамадзянскай вайны насіла Сімановіча ад горада да горада, ад фронту да фронту. Патрэбы барацьбы з контррэвалюцыяй вызначылі яго абавязкі, якія станавіліся ўсё больш складанымі. 5 ліпеня 1920 г. яго прызначылі начальнікам Пензенскага эвакапункта. Горад быў забіты параненымі і хворымі, лекавыя ўстановы былі ў запушчаным

стане, не хапала санітараў і ўрачоў. Але больш за ўсё яго турбавала нястача медыкаментаў, бальнічных ложкаў, харчавання. У вырашэнні гэтых складаных спраў яму дапамагалі Пензенскі губком партыі, савецкія і гаспадарчыя ўстановы і іх работнікі. У партыйнай характарыстыцы, якая захавалася ў архіве яго сям'і, напісана: «За час работы ў Пензе партячэйцы вядома, што тав. Сімановіч М. М. вылучаўся як адзін з самых дзелавітых, энергічных і палітычна свядомых таварышаў. Дзякуючы яго энергіі і гаспадарчасці яму ўдалося бліскуча наладзіць санітарны стан у пензенскіх лазарэтах».

У сакавіку 1920 г. Сімановіч развітаўся з Пензай і перакінуты ў Растоў-на-Доне. Тут яго прызначылі памочнікам начальніка санчасці Каўказскага фронту, які вёў буйное стратэгічнае наступленне па разгрому дзянікінскіх войск на Доне і Паўночным Каўказе. Заканчваўся апошні этап Паўночна-Каўказскай аперацыі, у выніку якой войскі Чырвонай Арміі занялі Екацярынадар, Армавір, Пяцігорск, Майкоп, вызвалілі дзесяткі станіц. Нямала было параненых чырвонаармейцаў. Максім Сімановіч уладкоўваў іх у шпіталі, арганізоўваў лячэнне. Яго выканаўчая дысцыпліна, аператыўнасць і знаходлівасць здзіўлялі ўсіх. За выключна добрасумленныя адносіны да работы камандаванне Каўказскага фронту ўзнагародзіла яго імянным гадзіннікам з надпісам: «Сумленнаму воіну Чырвонай Арміі тав. Сімановічу ад Рэўваенсавета Рэспублікі. 12 мая 1920 г.».

У жніўні 1920 г. стала вядома, што марскі дэсант урангелеўскіх войск высадзіўся на ўзбярэжжа Азоўскага і Чорнага мораў. Навісла пагроза захопу кубанскіх зямель. М. М. Сімановіч тэрмінова быў камандзіраваны на Таманскі паўвостраў у раён баявых дзеянняў 9-й арміі. На працягу двух тыдняў дні і ночы займаўся Максім Мікітавіч эвакуацыяй санітарных устаноў, параненых і хворых. Выканаўшы заданне, ён вярнуўся ў Растоў-на-Доне, але ў хуткім часе зноў накіраваны ў раён баявых дзеянняў 9-й арміі, дзе арганізоўваў і павялічваў шпітальныя базы, паставляў лекавы інвентар, упарадкоўваў санустановы.

У кастрычніку 1920 г. Сімановіча прызначылі начальнікам санчасці 9-й Кубанскай арміі, якая ў той час дабівала контррэвалюцыйныя банды на Паўночным Каўказе. Загадам па Каўказскім фронце яму была вынесена падзяка.

27 мая 1921 г. К. Я. Варашылаў падпісаў загад аб прызначэнні Максіма Мікітавіча начальнікам Санітарнага ўпраўлення Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі. Камандуючым акругай быў К. Я. Варашылаў, членамі Рэўваенсавета — С. М. Будзённы, А. С. Бубнаў. Жыццё М. М. Сімановіча нечакана пераплялося з дзейнасцю герояў рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Гэта і акрыляла яго і павышала пачуццё адказнасці.

Калі скончылася Грамадзянская вайна, спраў у Сімановіча не паменшала. Войскі акругі ўдзельнічалі ў ліквідацыі бандытызму, таму ўсё яшчэ паступалі параненыя. А потым голад і разруха выклікалі эпідэміі халеры, тыфу. Санітарная служба апынулася ў цяжкім становішчы. Сімановіч выязджаў у вайсковыя часці, гарады і пасёлкі, памагаў практычна перабудаваць работу па ліквідацыі эпідэмій.

Калі ў краіне пачалася барацьба з беспрытульнасцю, Сімановіч, не адрываючыся ад сваёй аспоўнай работы, арганізоўваў дзіцячыя прытулкі, падбіраў і рыхтаваў кадры для іх работы, аддаваў апошнія запасы харчавання і лякарстваў дзецям. У маі 1922 г. яго па сумяшчальніцтву прызначылі ўпаўнаважаным ЦК Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа.

З-за абвастрэння хваробы лёгкіх службу ў арміі прыйшлося пакінуць. У снежні 1923 г. ў воінскім званні камкора (па сучасных рангах генерал-лейтэнант) ён пайшоў у адстаўку. Стаў начальнікам адміністрацыйна-фінансавага ўпраўлення прамбюро Паўднёва-Усходняй Расіі. Ён усё больш разумеў, што для таго, каб добра кіраваць, трэба мець веды. Таму вырашыў вучыцца. Паступіў на факультэт грамадскіх навук Растоўскага універсітэта, займаўся адначасова на двух факультэтах — юрыдычным і эканамічным. Пазней ён гаварыў сваім сябрам:

— Цяпер самая прэстыжная прафесія — эканаміст. У барацьбе двух сістэм вынік, відаць, залежыць ад таго, у каго будзе лепш думаць, аналізаваць, абгрунтоўваць эканамічна. Пераможам мы, навучыўшыся майстэрству дакладнага разліку — ва ўсім эканоміць і з найменшымі затратамі дасягаць найбольшых вынікаў.

У 1925 г. Максім Мікітавіч атрымаў пасведчанне аб заканчэнні юрыдычнага аддзялення, а праз год — эканамічнага. А ў сакавіку 1926 г. паводле рашэння ЦК ВКП(б) М. М. Сімановіча павінны былі адкамандзіраваць на работу ў Вышэйшы савет народнай гаспадаркі. Але склалася інакш. Краявы савет народнай гаспадаркі затрымаў яго для адказнай работы ў Растове-на-Доне. Сімановіч быў прызначаны старшынёй праўлення Паўночна-Каўказскага трэста лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці, які апынуўся ў катастрафічным становішчы. Строгі кантроль, матэрыяльнае і маральнае заахвочанне хутка паднялі

настрой рабочых, аздаравілі калектыў. Пад кіраўніцтвам Сімановіча лясная гаспадарка краю выправілася.

У 1931 г. М. М. Сімановіч стаў слухачом Усесаюзнай ваенна-паветранай акадэміі. Ён з захапленнем авалодваў навукай аб металах, маторах, вывучаў арганізацыю і тэхналогію самалётабудавання. У 1934 г. ён бліскуча скончыў акадэмію і атрымаў спецыяльнасць інжынера-арганізатара-тэхнолага па самалётабудаванню.

Сімановіча накіравалі ў Ленінград дырэктарам авіяцыйнага завода, але яго ўсё больш захапляла інжынерна-тэхнічная работа. Праз два гады яго перавялі ў Маскву, дзе ён узначаліў буйную эксперыментальную лабараторыю авіязавода і адначасова стаў намеснікам начальніка Цэнтральнага аэрагідрадынамічнага інстытута. Ён удзельнічаў у стварэнні новай авіяцыйнай тэхнікі і авіяцыйных матэрыялаў. Яго самаадданая праца была высока ацэнена Савецкай дзяржавай — у студзені 1941 г. Міхаіл Іванавіч Калінін яму ўручыў ордэн «Знак Пашаны».

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, трэба было эвакуіраваць авіязаводы ў тыл краіны. Сімановіч у ліку іншых кіраўнікоў авіяпрамысловасці вылецеў на самалёце «ЛІ-2» для рэкагнасцыроўкі мясцовасці на Урал. Самалёт, трохі не даляцеўшы да месца прызначэння, загарэўся ў паветры...

Э. А. Карміловіч.

Салдат нябачнага фронту

М. М. Шыліёнаў.

...Міхаіла Міхайлавіча Шыліёнава добра ведаюць яго землякі-талачынцы. 31 год праслужыў ён у Чырвонай Арміі і органах ВЧК — АДПУ — МДБ. Многія гады жыцця і дзейнасці Міхаіла Міхайлавіча звязаны з Далёкім Усходам. Гэта кароткі расказ пра баявое юнацтва чэкіста, пра некаторыя эпізоды яго жыццёвага шляху.

— Дык, кажаш, баішся спазніцца, і чорнага барона без цябе скінуць у Чорнае мора? — усміхнуўся ваенком.— Хопіць яшчэ на тваю долю. Хлопец ты малады, дужы, камсамольцы чыгуначных майстэрняў рэкамендуюць цябе. Карацей — у Першую Конную...

Ваенны камісар акуратна запісаў: «Дата ўступлення ў Чырвоную Армію 29 кастрычніка 1920 года».

Міхаілу яшчэ давялося ўдзельнічаць у апошніх баях з Урангелем. А потым 5-я Кубанская брыгада пад камандаваннем К. К. Ракасоўскага, дзе служыў М. Шыліёнаў, была перакінута на Усход, на дапамогу братняму мангольскаму народу, на зямлі якога банды Унгерна ўстанавілі рэжым белагвардзейскага тэрору, пагражалі савецкаму Далёкаму Усходу. Чырвоная Армія дапамагла мангольскім рэвалюцыянерам выкінуць белыя банды са сваёй зямлі.

Унёс свой уклад у разгром белабандытаў і Міхаіл Шыліёнаў. Ён храбра ваяваў, быў паранены і кантужаны. Прымаў актыўны ўдзел у барацьбе працоўных буфернай Далёкаўсходняй Рэспублікі супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў, якія спрабавалі адарваць ад Савецкай Расіі Далёкі Усход. 1 чэрвеня 1922 г. камсамольца Шыліёнава накіравалі на работу ў Асобы аддзел 5-й арміі, якой камандаваў І. Убарэвіч. 20-гадовы чырвонаармеец быў разгублены.

— Нічога,— супакойвалі Міхаіла,— ніхто з нас чэкістам не нарадзіўся, уменне і вопыт прыходзілі ў барацьбе. Адным словам, гэта табе партыйнае даручэнне...

Успрыняў гэта Шыліёнаў як баявы загад рэвалюцыі і звязаў на доўгія гады сваё жыццё з нялёгкай працай чэкіста.

Камсамольскі білет М. М. Шыліёнава

У 1928 г. М. М. Шыліёнаў быў прыняты ў члены партыі.

У Асобым аддзеле 15-й кавалерыйскай дывізіі і Асобай Чырванасцяжнай Далёкаўсходняй арміі Міхаіл Міхайлавіч працаваў да 1934 г. За 12 гадоў аб'ездзіў многія гарады Далёкага Усходу. Быў у яго паўтарагадовы перапынак — вучыўся ў Маскве ў Вышэйшай пагранічнай школе. У 1934 г. лейтэнант Шыліёнаў перайшоў на аператыўную работу ў тэрытарыяльныя органы Наркамата ўнутраных спраў.

Гэта былі нялёгкія гады. Белагвардзейскія недабіткі, якія пацярпелі паражэнне ў адкрытым баі, белакітайскія генералы, японскія самураі — усе яны спрабавалі трываласць нашых граніц, спрабавалі ўзарваць знутры савецкі далёкаўсходні тыл. Граніцу пераходзілі закінутыя з Маньчжурыі тэрарыстычныя банды, варожыя лазутчыкі, дыверсанты, шпіёны і нават цэлыя вайсковыя злучэнні. Бязліч разоў выязджаў на баявыя аперацыі чэкіст Шыліёнаў.

Вось успамін ветэрана пра адну з такіх аперацый:

— 23 жніўня 1936 г. на тэрыторыю Зейскай (Амурскай) вобласці была перакінута белагвардзейская дыверсійна-шпіёнская банда з 32 чалавек. Бандыты прайшлі аднагадовую падрыхтоўку ў японскай разведшколе, былі добра ўзброены — на кожнага прыходзілася па тры ствалы (два рэвальверы і карабін альбо вінтоўка), былі ў іх таксама кулямёты, гранаты і іншая зброя. Мэтамі банды былі падрыў чыгуначнага палатна, тэрарыстычныя акты, збор шпіёнскіх звестак. У навальнічную ноч, з японскага ваеннага манітора, які курсіраваў па Амуры, бандыты былі высаджаны на наш бераг. Праліўны дождж змыў сляды, і банда паглыбілася ў тайгу...

Высачыць яе дапамагла пільнасць простых савецкіх людзей. Баючыся страляць у тайзе, каб не прыцягнуць да сябе ўвагі, і, відаць, засумаваўшы па гарачай страве, бандыты ўкралі карову ў пупявога абходчыка. Абходчык высачыў бандытаў — ён ішоў за імі больш васьмі кіламетраў, аж да іх логава. Вярнуўшыся дамоў, ён неадкладна паведаміў пра банду чэкістам. І ў той жа дзень з групай у 25 чалавек я выехаў на аперацыю. У склад групы ўваходзілі 15 аператыўных работнікаў, паляўнічыя, следапыты-эвенкі і фатограф.

Стаянка банды была акружана. Пасля адмовы здацца мы вымушаны былі адкрыць агонь, было забіта некалькі бандытаў і ў іх ліку верхавод. Потым яшчэ два месяцы вылаўлівалі мы белабандытаў, якія распаўзліся па тайзе. Банда была абясшкоджана.

А колькі іх было такіх небяспечных аперацый, звязаных з рызыкай для жыцця! Колькі паходаў па тайзе, бяссонных начэй! У дні Вялікай Айчыннай вайны Міхаіл Міхайлавіч працаваў у Чыце ў абласным упраўленні НКДБ, у 1945 г. ўдзельнічаў у баях супраць японскіх імперыялістаў. Радзіма высока ацаніла яго заслугі, узнагародзіўшы ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

У 1951 г. па стану здароўя — далі сябе адчуць раны і кантузіі Грамадзянскай вайны — палкоўнік дзяржбяспекі пайшоў у запас. Ён вярнуўся ў родную вёску Ганчароўка на Талачыншчыне, адкуль яго яшчэ малым вывез бацька-чыгуначнік у Маскву... *Б. Фірштэйн.*

ЯНЫ ЗМАГАЛІСЯ ПАД СЦЯГАМ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

(удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны)

АБОЛЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БОХАН Ціхан Карнеевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Замошша. Удзельнік Грамадзянскай вайны, ваяваў у 145-м стралковым палку на тэр. Беларусі (Палескі напрамак) супраць бандаў Булак-Балаховіча. Памёр у 1979.

БОТВІН Фёдар Ціханавіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Данілкава. Удзельнік Грамадзянскай вайны ў 1919—21 на Каўказе. Памёр у 1980.

ВІДМАНТ Іван Антонавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Дабравольск. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

ВІНАГРАДАЎ Кірыла Мікітавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Шупені. У час Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі служыў у Петраградзе. У Грамадзянскую вайну змагаўся супраць бандаў Махно на Украіне. Памёр у 1979.

ГАРАДЗЕЦКІ Сцяпан Іванавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Рэчкі Сенненскага р-на, жыў у в. Чуватава. Удзельнік Грамадзянскай вайны ў 1920. Памёр у 1981.

ЗЯЛЮТКІН Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Абольцы, жыў у в. Зарачча. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1981.

КАБАЧЭЎСКІ Кірыла Асетавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Чачанева. Удзельнічаў у Грамадзянскай вайне ў 1919—20 на тэр. Беларусі, ваяваў супраць войск буржуазнай Польшчы, быў шафёрам 16-й аўтамабільнай роты. Памёр у 1980.

КАНЮШКА Барыс Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Чуватава. Член КПСС з 1930. У 1920—24 чырвонаармеец камендантскай роты 14-га стралковага палка ў г. Мажайску. Памёр у 1974.

КАСЦЯНАЎ Андрэй Сафронавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Замошша. Удзельнік Грамадзянскай вайны ў 1919—22. Ваяваў супраць войск буржуазнай Польшчы на тэр. Беларусі, у 1920—22 супраць бандаў Махно на Украіне. Памёр у 1978.

КРАСОЎСКІ Герасім Іванавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Рай Сенненскага р-на, жыў у в. Мінуліна. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. У 1919—21 служыў у 1-м будаўнічым запасным палку у г. Петраградзе. Памёр у 1983.

ЛЕМНІЦКІ Дзмітрый Данілавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Чачанева. Удзельнік Грамадзянскай вайны ў 1919—21, быў цяжка паранены. Памёр у 1979.

М. І. Зюлюткін.

І. Дз. Палівянок.

К. Я. Шыбека.

П. П. Буевіч.

ПАДАЛІНСКІ Апанас Максімавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Мікуліна. Удзельнічаў у Грамадзянскай вайне ў 1919—21 у складзе кавалерыйскага палка.

ПАЛІВЯНОК Іван Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Шупені. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

ФЯДЗЮК Якаў Фаміч, нарадзіўся ў 1895 у в. Кісялёва. Удзельнік Грамадзянскай вайны ў 1919—21, ваяваў супраць бандаў Махно на Украіне. Памёр у 1984.

ШАВЯЛЁЎ Максім Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Абольцы. Удзельнік Грамадзянскай вайны ў 1919—21. Памёр у 1986.

ШАФРАНСКІ Ягор Фадзеевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Мошава. Удзельнік 1-й сусветнай вайны з 1915 і Грамадзянскай вайны у 1918—21.

ШЫБЕКА Кузьма Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Межыева, жыў у в. Пішчакіна. Удзельнік Грамадзянскай вайны ў 1919—21 у складзе 30-й Іркуцкай дывізіі. Памёр у 1985.

АЗЕРАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУЕВІЧ Палікарп Паўлавіч, нарадзіўся ў 1895. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. У 1917—23 служыў у Чырвонай Арміі ў 150-м стралковым палку 17-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у баях на Заходнім фронце. Арганізатар і першы старшыня калгаса «Волга» (1928) у в. Забалацце. Пасля Вялікай Айчыннай вайны працаваў старшынёй калгаса «Ударнік» у в. Пяровалачня, бухгалтарам у калгасах «Волга» і «Гігант». Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі. Памёр у 1972.

З успамінаў П. П. Буевіча

Гэта было летам 1920 г. пад г. Маладзечна. Летнянеры ўжо каторы раз ішлі ў атаку на пазіцыі нашага палка. На нейкі момант здалося, што яны дамагліся свайго: дзве нашы роты ледзь не трапілі ў акружэнне. Падумалася мне, куляметчыку, што ззаду не проста пазіцыі аднаго палка, а ўся родная Беларусь. Я страляў са свайго «максіма» да таго часу, пакуль легіянеры не адкаціліся назад. Потым з вярсты цягнуў кулямёт на сабе, адыходзячы на новую пазіцыю. Рэўваенсавет 16-й арміі ў верасні 1920 г. ўдастоіў мяне вышэйшай узнагароды Савецкай Рэспублікі — ордэна Чырвонага Сцяга.

БЯЗЗУБІК Рыгор Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Вугалеўшчына. З 1914 г. рабочы Пуцілаўскага завода ў Петраградзе. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. З 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, потым у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у разгроме арміі Юдзеніча і ліквідацыі Краштацкага мяцяжу. З 1921 г. на рабоце ў сельскай гаспадарцы. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941—44 гг. сувязны партызанскай брыгады «Граза». У пасляваенны час працаваў у калгасах Талачыншчыны. Памёр у 1978.

ДУБАВЕЦ Андрэй Яфімавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Дроздава. Член КПСС з 1947. У 1918—22 служыў у Чырвонай Арміі, у 1918 удзельнічаў у баях за Рыгу, потым ваяваў супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў на Заходнім фронце. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». Памёр у 1974.

МАХАНЁК Фёдар Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Міхайлаўшчына. Член КПСС. У час Грамадзянскай вайны служыў у органах ВЧК і НКУС у Кіргізіі. Загінуў у Кіргізіі ў 1920-я гады.

ПАЛЯКОЎ Пётр Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Прудзец. Член КПСС з 1946. У 1920—22 у Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны ў складзе 16-й арміі. У 1931—34 працаваў у калгасе «Пяцігодка ў чатыры гады» Талачынскага р-на, з 1934 старшыня калгаса імя К. Маркса. Памёр у 1985.

РАМАНКЕВІЧ Іван Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Забалацце. Удзельнік штурму Зімняга палаца, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. З 1924 старшыня таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі «VI з'езд Саветаў». Памёр у 1953.

ТАРАСЕВІЧ Захар Мікітавіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Жураўлі. Член КПСС. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, прывёз у в. Жураўлі першыя дэкрэты Савецкай улады. З дапамогай рэвалюцыйна настроеных сялян стварыў у в. Забалацце валасны рэўком і камітэт беднаты пры ім. У 1918 ар-

Р. Я. Бяззубік.

А. Я. Дубавец.

П. С. Палякоў.

І. Ц. Раманкевіч.

А. А. Антановіч.

В. Л. Буднік.

ганізаваў і ўзначаліў першую бальшавіцкую ячэйку ў в. Забалацце. Памёр у 1944.

АЛЕНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЖУРАЎЛЕЎ Пётр Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Сані. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

ЛАЗАРАЎ Якаў Пятровіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Пачынак Смаленскай вобласці, жыў у в. Ржаўка. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1986.

ПАЛІВЯНОК Нічыпар Малахавіч, нарадзіўся ў 1890. У 1917—22 у Чырвонай гвардыі і Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны на тэр. Беларусі.

ПРЫСМАКАЎ Пётр Іванавіч, нарадзіўся ў 1896. У 1917—22 у Чырвонай гвардыі і Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1986.

УСЦІНОВІЧ Севасцьян Іванавіч, нарадзіўся ў 1891. У 1918—20 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

ШУПЕНЯ Васіль Ермалаевіч, нарадзіўся ў 1890. У 1917—19 у Чырвонай гвардыі і Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1987.

ВАЛОСАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНІКОВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Сельцы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

АНІКОВІЧ Рыгор Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Сельцы. У 1917—21 у Чырвонай Арміі, служыў у асобнай сапёрнай роце 27-й стралковай дывізіі 5-й арміі. Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У 1930 арганізатар і першы старшыня калгаса ў в. Сельцы. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» Памёр у 1973.

АНТАНОВІЧ Аляксандр Андрэевіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Запруддзе. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1969.

АНТАНОВІЧ Міхаіл Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Запруддзе. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1972.

БУДНІК Васіль Лук'янавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Петрашы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1974.

БУДНІК Цімафей Пятровіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Петрашы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1968.

БУДНІК Якаў Ігнатавіч, нарадзіўся у 1892 у в. Петрашы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1964.

БУДНІК Яфім Лук'янавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Сельцы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

БУДНЫ Аляксей Васілевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Шашалаўка. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

ГІЛІМОВІЧ Пракоп Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Бутары. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1950.

ГУРЫН Якаў Восіпавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Петрашы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1970.

З. М. Тарасевіч.

Р. Я. Аніковіч.

Ц. П. Буднік.

К. Я. Іўчанка.

ДАШКЕВІЧ Іосіф Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1901 у в. Загацце. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1982.

ДЗЯДЗЕЧКІН Васіль Елісеевіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Лазы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1983.

ДЗЯДЗЕЧКІН Іван Паўлавіч, нарадзіўся ў в. Лазы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

ДЗЯДЗЕЧКІН Рыгор Калінавіч, нарадзіўся ў в. Лазы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1945.

ДОНЮШ Ігнат Сямёнавіч, нарадзіўся ў в. Нізкі Гарадзец. Удзельнік Грамадзянскай вайны, ваяваў супраць войск Калчака і Дзянікіна. Памёр у 1961.

ЖУК Сцяпан Міронавіч, нарадзіўся ў в. Лазы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

ЖУК Тарас Фядосавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Лазы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Загінуў у банх з войскамі буржуазнай Польшчы ў 1920.

ЖУРАЎЛЁЎ Васіль Лукіч, нарадзіўся ў 1880 у в. Валосава. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1976.

ЖУРАЎЛЁЎ Мифодзій Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Галаны. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1951.

ЖУРАЎЛЁЎ Фёдар Лукіч, нарадзіўся ў 1886 у в. Валосава. Удзельнік Грамадзянскай вайны, ваяваў пад Псковам. Памёр у 1951.

ІЎЧАНКА Кірыла Яфрэмавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Рафалова. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. У Чырвонай Арміі з 1918. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1982.

ІЎЧАНКА Якаў Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Валосава. Удзельнік Грамадзянскай вайны, чырвонаармеец Мсціслаўскага 298-га палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памёр у 1983.

КАЗІНЕЦ Андрэй Фядосавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Мяшкова. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

КОЗІК Дзмітрый Раманавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Нізкі Гарадзец. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1970.

КОЗІК Якаў Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Нізкі Гарадзец. У 1918—23 служыў у Чырвонай Арміі. Памёр у 1975.

КУВЕКА Піліп Ігнатавіч, нарадзіўся ў в. Лазы. Загінуў на фронце ў час Грамадзянскай вайны.

КУРЧАЎ Піліп Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1870 у в. Бутары. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1942.

МЯДЗЮК Мітрафан Аксенцьевіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Петрацы. У Чырвонай Арміі ў 1918—21. Памёр у 1970.

МЯСАЕДАЎ Калін Іванавіч, нарадзіўся ў 1886 у в. Бутары. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1974.

М. А. Мядзюк.

С. У. Пажарскі.

Г. В. Парахонька.

Я. І. Сінякоў.

МЯСНІКОЎ Павел Пятровіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Разаны. Удзельнік і інвалід Грамадзянскай вайны. Памёр у 1982.

НАРОЎСКІ Мікіта Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1874 у в. Нізкі Гарадзец. Член КПСС з 1931. Удзельнік Грамадзянскай вайны. У Чырвонай Арміі ў 1920—21, памочнік камандзіра ўзвода. Ваяваў супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Пазней працаваў старшынёй сельсавета, калгаса ў в. Высокі Гарадзец. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». Памёр у 1974.

ПАЖАРСКІ Марк Васілевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Запруддзе. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1975.

ПАЖАРСКІ Сяргей Ульянавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Запруддзе. У 1917—22 у Чырвонай гвардыі і Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1978.

ПАРАХОНЬКА Герасім Васілевіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Нізкі Гарадзец. У 1919—21 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1982.

ПАРАХОНЬКА Кузьма Іванавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Лазы. У 1919—22 у Чырвонай Арміі, чырвонаармеец 20-га Туркестанскага палка. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

ПАРАХОНЬКА Уладзімір Ігнатавіч, нарадзіўся ў в. Лазы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

ПАШКЕВІЧ Кузьма Якаўлевіч, нарадзіўся ў в. Нізкі Гарадзец. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1945.

ПІТКЕВІЧ Сямён Данілавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Нізкі Гарадзец. Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Памёр у 1977.

ПЛЯСКАЧ Фама Андрэевіч, нарадзіўся ў в. Лазы. Член КПСС. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1944.

ПЛЯСКАЧ Ягор Андрэевіч, нарадзіўся ў в. Лазы. Загінуў у час Грамадзянскай вайны.

ПУШКО Архіп Еўдакімавіч, нарадзіўся у 1882 у в. Ліцвякі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. У 1918 быў цяжка паранены. Памёр у 1962.

САЛАЎЁЎ Канстанцін Савельевіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Харлінцы. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, служыў у Краштаце. Памёр.

САЛАЎЁЎ Мацвей Ніканавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Дубровіна. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. У 1918—23 служыў у Першым рэвалюцыйным стралковым палку 25-й дывізіі 5-й арміі. Памёр у 1984.

Я. К. Смык.

Д. М. Сузень.

СІНЯКОЎ Якаў Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1887 у в. Валосава. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1953.

СІНЯЎСКІ Даніла Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Новае Сяло. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

СМЫК Яўмен Кірылавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Ліцвякі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1973.

СПАТКАЙ Рыгор Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1887 у в. Нізкі Гарадзец. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1981.

СПАТКАЙ Яфрэм Алатавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Нізкі Гарадзец. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

СУЗЕНЬ Давыд Майсеевіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Лазы. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

ФАНДО Сямён Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Запруддзе. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1972.

ФАНДО Яўмен Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Ліцвякі. У 1917—20 у Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1975.

ХІРЭВІЧ Рыгор Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Лазы. У 1918—22 у Чырвонай Арміі, ваяваў у складзе 8-й стралковай дывізіі 16-й арміі. Памёр у 1976.

ЦЕНЮШКА Раман Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Сухачэва. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

ШАСТАК Арцём Вікенцьевіч, нарадзіўся ў 1880 у в. Валосава. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1938.

ШАСТАК Аўдзей Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Галаны. Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Памёр у 1971.

ШАСТАК Калін Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Галаны. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1967.

ШАСТАК Сяргей Апанасавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Галаны. Удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Памёр у 1980.

ШАЎКУН Герасім Пракопавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Шашалаўка. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

ШАШЫЛА Максім Сцяпанавіч, нарадзіўся ў в. Лазы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

ШЫБЕКА Піліп Васілевіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Мяшкова. У час Грамадзянскай вайны працаваў у ВЧК у Оршы. З 1920 старшыня Навасельскага сельсавета. Памёр у 1940.

ШЫБЕКА Цярэнцій Васілевіч, нарадзіўся ў 1883 у в. Мяшкова. Член КПСС з 1915. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. У 1918—21 ваяваў на Заходнім фронце. З 1928 першы старшыня калгаса «1 Мая». Памёр у 1938.

ШЫДЛОЎСКІ Іван Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1885 у в. Бутары. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Забіты кулакамі ў час калектывізацыі ў 1932.

ЯЦКЕВІЧ Васіль Аўксенцьевіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Галаны. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1981.

ЯЦКЕВІЧ Фёдар Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1880 у в. Галаны. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1963.

ВОЎКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АБЛАВАЦКІ Сямён Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Воўкавічы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

БАНДАРЭНКА Дзмітрый Парфёнавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Сіўцава. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1978.

БАРАНОЎСКІ Іосіф Фёдаравіч, нарадзіўся у 1882 у в. Прудзец, жыў у в. Крывое. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Памёр у 1978.

ГЕРАСІМАЎ Георгій Васілевіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Варанцэвічы, жыў у в. Крывое. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1981.

ГУРСКІ Фёдар Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Ільінка, жыў у в. Варанцэвічы. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Памёр у Сібіры.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Мікалай Станіслававіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Варанцэвічы. Член КПСС. Удзельнік Грамадзянскай і савецка-фінляндскай войнаў. Працаваў старшынёй калгаса ў в. Лагаўшчына. Памёр у 1980.

ЖДАНОВІЧ Леў Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Зарачча. Член КПСС з 1943. У 1917—24 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай войны, ваяваў супраць замежных інтэрвентаў на Украіне. Удзельнік Вялікай Айчыннай войны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай войны II ступені. Памёр у 1981.

ЖУКОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Багрынава. У 1919—22 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай войны. Памёр у Мінску.

ЗІМНІЦКІ Іван Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Замосце, жыў у в. Сіўцава. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай войны. Памёр у 1974.

КАМІСАРАЎ Міна Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Варанцэвічы. Удзельнік Грамадзянскай войны. Памёр у 1985.

КРЫЖБЕРСКІ Іван Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1885 у в. Поўсціхава. Удзельнік Грамадзянскай войны. Выехаў у Калінінград.

Дз. П. Бандарэнка.

І. Ф. Бараноўскі.

М. М. Камісараў.

М. П. Шарай.

ПЛАКСІЦКІ Максім Мікітавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Крывое. У 1919—22 у Чырвонай Арміі, служыў у 32-й пяхотнай брыгадзе. Удзельнічаў у падаўленні Кранштацкага мяцяжу і ў баях на Заходнім фронце. Памёр у 1970.

ПЛАКСІЦКІ Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Крывое. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1971.

ПРУСКІ Максім Іосіфавіч, нарадзіўся у 1880 у в. Варанцэвічы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1942.

ПРУСКІ Ягор Вавілавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Варанцэвічы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Першы старшыня калгаса «Чырвоны асветнік» у в. Варанцэвічы. Памёр у 1977.

РАБЦАЎ Іван Хрысанавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Чарнічнае Горацкага р-на Магілёўскай вобласці, жыў у в. Воўкавічы. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. У час Грамадзянскай вайны быў паранены. Памёр у 1978.

САМСОНАЎ Фёдар Вавілавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Варанцэвічы. Удзельнік Грамадзянскай вайны, ваяваў з басмачамі ў Сярэдняй Азіі. Памёр у 1979.

ШАРАЙ Мацвей Паўлавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Хаценічы, жыў у в. Крывое. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1985.

ШУМСКІ Васіль Антонавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Варанцэвічы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1979.

ЖУКНЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ДУБОЎСКІ Антон Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1890. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Памёр у 1985.

КАРАНЬКОЎ Антон Тарасавіч, нарадзіўся ў 1891. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

КОХАНАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

АСІПОВІЧ Міхаіл Максімавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Рудня. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1981.

БЛАДЫКА Нічыпар Міхайлавіч, нарадзіўся ў в. Рамашкава. Член КПСС з 1918. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

ВАРАНОВІЧ Фёдар Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Паліжаеўка Круглянскага р-на Магілёўскай вобласці, жыў у г. п. Коханава. Член КПСС з 1931. У 1919—21 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». Памёр у 1979.

ГАНЧАРОЎ Максім Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Пярэвалачня. У 1917—21 у Чырвонай гвардыі і Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1983.

ГАЎРЫЛЕНКА Міхаіл Ціхонавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Рудня. Член КПСС з 1942. У 1917—22 у Чырвонай гвардыі і Чырвонай Арміі, камандзір узвода. Удзельнік Грамадзянскай вайны, у складзе 16-га Смаленскага палка ваяваў супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Памёр у 1970.

ДАВЫДЗЕНКА Ціхан Іванавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Кісялі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

ДЗЕМІШКЕВІЧ Улас Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Белаброддзе. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1986.

КОСІНЕЦ Андрэй Васілевіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Шылаўка. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

ЛАЎРЫНОВІЧ Аляксандр Давыдавіч, нарадзіўся ў 1894 у пас. Чырвоны. У 1918—21 служыў добраахвотнікам у Чырвонай Арміі, камандзір аддзялення 16-га Смаленскага палка. Удзельнічаў у разгроме арміі Калчака і бандаў Пятлюры. Памёр у 1972.

МАЖЭЙКА Сямён Дарафеевіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Шапчына. У 1919—23 служыў у Чырвонай Арміі санітарам, ваяваў на Заходнім фронце. Памёр у 1954.

МАРУСЕВІЧ Аляксандр Васілевіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Рудня. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Ваяваў у экіпажы браняпоезда на Урале супраць войск Калчака. Памёр у 1980.

МАСАЛКОЎ Васіль Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Белаброддзе. Член КПСС з 1926. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

МАСЮЦІН Фёдар Барысавіч, нарадзіўся ў 1890 у г. п. Коханава. Член КПСС з 1924. З снежня 1917 старшыня камітэта беднаты. У 1918—23 у Чырвонай Арміі, памочнік Сенненскага ваенкома і ўпаўнаважаны павятовага рэўкома. У 1923 пасля дамабілізацыі працаваў старшынёй сельсавета, сакратаром партарганізацыі. У 1929—31 памочнік дырэктара саўгаса «Ходцы», з 1931 інструктар сувязі спецаддзела, з 1936 да 1941 начальнік пошты ў Копысі Аршанскага раёна. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызан атрада імя Чапаева партызанскай брыгады Сенненскай. Пасля вайны начальнік аддзялення сувязі ў Талачыне і г. п. Коханава, старшыня Коханаўскага пасялковага Савета. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Памёр у 1973.

РАЖАНСКІ Фама Антонавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Сальнікі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1986.

САЎЧАНКА Мяфодзій Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Старынні. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1976.

Ф. Б. Масюцін.

П. Я. Турок.

СТУДЗЯНЦОЎ Ягор Яфімавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Праровіна. У 1917—21 служыў у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Памёр у 1985.

ТУРОК Пётр Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Харлінцы. Член КПСС з 1937. У Чырвонай Арміі ў 1919—22. Удзельнік Грамадзянскай вайны, старшына роты. Ваяваў супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў на Заходнім фронце. Пасля дэмабілізацыі старшыня камбеда пры Валосаўскім сельсавеце, член гэтага Савета. З 1930 арганізатар калгаса ў в. Харлінцы, старшыня сельскага спажывецкага таварыства, старшыня сельсавета, намеснік старшыні, старшыня райспажыўсаюза. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, партызан атрада імя Чапаева партызанскай брыгады Сенненскай. Пасля вайны на гаспадарчай рабоце ў г. п. Коханава. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Памёр у Мінску.

ФІЛЬМАНОВІЧ Якаў Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Галошава. Удзельнік і інвалід Грамадзянскай вайны. Памёр у 1982.

ХАРАНЖОВІЧ Фёдар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Пярэвалачня. З 1915 у арміі, радавы лейб-гвардыі Валынскага палка. У баях тройчы паранены. Лютаўскую рэвалюцыю сустрэў у Петраградзе. У сакавіку 1917 па стану здароўя дэмабілізаваны. Да сакавіка 1918 жыў у в. Пярэвалачня. Калі немцы акупіравалі тэрыторыю Талачынскага раёна, пайшоў у партызаны і стаў байцом 1-га Невельскага партызанскага атрада. Удзельнічаў у баях з немцамі каля Коханава, потым знаходзіўся ў ахове дэмаркацыйнай лініі паміж Оршай і Коханавам. У жніўні 1918 Ф. М. Харанжовіч — адзін з партызан-добраахвотнікаў Невельскага атрада, накіраваных у Казань для ліквідацыі мяцяжу. Удзельнічаў у баях за Уфу, Омск, разгроме бандаў Махно, ваяваў з дэянікінцамі, у 1920 — супраць войск буржуазнай Польшчы. У 1922 дэмабілізаваны па стану здароўя. Жыў і працаваў у Ленінградзе. Тут яго застала Вялікая Айчынная вайна, перажыў блакаду. Пасля вайны вярнуўся ў родныя мясціны, пасяліўся ў в. Азерцы. Працаваў у калгасе «XVIII партз'езд», потым на будаўніцтве Азерацкага спецаддзялення «Сельгастахнікі». Памёр у 1985.

ХРАБРЫ Рыгор Іванавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Пярэвалачня, жыў у пас. Чырвоны. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1975.

ЦІМАФЕЕЎ Іван Барысавіч, нарадзіўся ў 1896 у пас. Торбінь Ленінградскай вобл., жыў у г. п. Коханава. У 1917—22 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1978.

ШАРАЙ Дзмітрый Купрыянавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Астрашапкі. Служыў на крэйсеры «Алег». Удзельнічаў у сустрэчы У. І. Леніна на Фінляндскім вакзале, штурмаваў Зімні палац, у 1920—21 змагаўся ў складзе роты ваенных маракоў з буржуазна-нацыяналістычнымі бандамі на Украіне. Актыўны ўдзельнік калектывізацыі на Талачыншчыне. У гады Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваў калгасную жывёлу на ўсход, пасля чаго служыў да 1944 г. на Балтыйскім флоце ў Ленінградзе. Пасля вайны актыўна працаваў па адпаўленні народнай гаспадаркі. Памёр у 1965.

Дз. К. Шарай.

Дз. І. Лсінскі.

С. С. Буякоў.

ШАЛАХАНАЎ Аляксандр Андраевіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Звлячы, жыў у г. п. Коханава. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1970.

ШЫПІКАЎ Сцяпан Іванавіч, нарадзіўся ў 1899 у г. п. Коханава. У 1918—22 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1974.

ПЛОСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГУСЕЎ Іван Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Гастынічы. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Памёр у 1986.

КАВАЛЕНКА Сяргей Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Валькі. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны.

КАРТАВІЦКІ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Пячонаўка. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

МАЗУРЫН Марк Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Барсучыны. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1983.

МАЦЫЛЬ Васіль Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Гастынічы. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Памёр у 1978.

ЯСІНСКІ Дзяменцій Іванавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Навінка. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Памёр у 1985.

СЛАЎНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАБКОЎ Макар Макеімавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Ламінштына. З 1917 у Чырвонай гвардыі, потым у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны, змагаўся супраць белаказакаў. У 1920 дэмабілізаваны. У Вялікую Айчынную вайну з 1943 партызанскі сувязны брыгады «Чэкіст». Памёр у 1978.

БУЯКОЎ Станіслаў Станіслававіч, нарадзіўся ў 1888 непадалёку ад г. Беластока. У гады Імперыялістычнай вайны сям'я Буяковых эвакуіравалася пад Смаленск. У 1919 пераехала ў в. Гута. З 1919 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны, змагаўся супраць войск буржуазнай

Б. В. Васілеўскі.

С. П. Васілеўскі.

М. С. Пляскач.

П. Я. Пляскач.

Польшчы, Урангеля. Пасля дэмабілізацыі жыў у в. Гута. Памёр у 1972.

ВАСІЛЕЎСКІ Барыс Васілевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Зарэчча. Удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Адзін з арганізатараў партызанскага атрада, які ў 1918 удзельнічаў у баі з немцамі каля Талачына. Пасля таго, як атрад быў разбіты, Васілеўскі дабраўся да Смаленска, дзе уступіў у 1-ю рэвалюцыйную батарэю, удзельнічаў у баях супраць кулацкіх бандаў у Смаленскай губерні. З восені 1918 да снежня 1919 змагаўся на Паўднёвым фронце. У выніку хваробы дэмабілізаваны. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памер у 1972.

ВАСІЛЕЎСКІ Савелій Пятровіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Зарэчча. У Чырвонай Арміі з 1919. Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Змагаўся з войскамі буржуазнай Польшчы. У 1921 дэмабілізаваны. У Вялікую Айчынную вайну цяжка паранены. Працаваў у калгасе «Гігант». Памёр у 1973.

КУДЗІН Іван Анікеевіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Славені. У Чырвонай Арміі з 1918. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Пасля дэмабілізацыі працаваў у калгасе «Гігант», жыў у Барысаве. Памёр у 1976.

ЛАТУШКІН Пётр Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1887 у в. Зябліца. У 1917 добраахвотнікам уступіў у Чырвоную гвардыю, потым — у Чырвоную Армію. Удзельнік Грамадзянскай вайны ў 1918—21. У складзе 27-й стралковай Омскай дывізіі змагаўся супраць войск Калчака. Дзянікіна, пятлюраўцаў, удзельнічаў у ліквідацыі Кранштацкага мяцяжу 1921, бандаў у Саратаўскай вобласці. Пасля дэмабілізацыі ў верасні 1921 працаваў на радзіме. Памёр у 1983.

ПАСЮЦІН Пётр Ясакавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Славені. Удзельнік 1-й сусветнай і Грамадзянскай войнаў. У 1919 дэмабілізаваны. Адным з першых уступіў у калгас. Памёр у 1973.

ПЛЯСКАЧ Міхаіл Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Славені. З 1917 у Чырвонай гвардыі, потым чырвонаармеец 8-й стралковай дывізіі. Удзельнік Грамадзянскай вайны, змагаўся на Заходнім фронце супраць войск буржуазнай Польшчы. Быў цяжка паранены. Пасля дэмабілізацыі адным з першых уступіў у калгас. Памёр.

ПЛЯСКАЧ Пётр Ягоравіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Славені. Удзельнік Грамадзянскай вайны. У 1919 П. Я. Пляскач добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію. Скончыўшы курсы кулямётчыкаў, трапіў на Паўднёвы фронт у легендарную 24-ю Самара-Сімбірскую Жалезную дывізію. Многіх выдатных дзеячаў партыі,ваеначальнікаў пашчасціла бачыць і чуць Пятру Ягоравічу: М. І. Калініна, С. М. Кірава, К. Я. Варашылава, А. Я. Пархоменку, І. Э. Якіра. Стары салдат успамінае выпадак, калі ў час адной з перапраў цераз раку лёд не вытрымаў і Варашылаў апынуўся ў ледзяной вадзе. Чырвонаармейцы, у тым ліку і Пляскач, кінуліся да яго, дапамаглі выбрацца.

— Хлопцы, у каго ёсць сухая бялізна? — неяк вельмі проста, па-бацькоўску спытаў Варашылаў у байцоў, што стаялі вакол яго. Дзесяткі рук пацягнуліся да рэчавых мяшкоў...

У баі пад Царыцынам П. Я. Пляскач атрымаў шабельнае раненне галавы. Пасля выздараўлення яго накіравалі ў дывізіённую школу, якую выдатна скончыў, і быў пакінуты пры ёй інструктарам. Разам з курсантамі прымаў актыўны ўдзел у разгроме бандаў Махно, Гальчэўскага і іншых контррэвалюцыянераў.

Пасля дэмабілізацыі Пётр Ягоравіч вярнуўся ў родныя мясціны. Адпачываць не прыйшлося, ды і не было дзе: нават хаты сваёй не меў. Па рэкамендацыі васенкамата ён накіраваны на работу старшынёй сялянска-грамадзянскай узаемадапамогі. У 1925 г. яго выбралі старшынёй Славенскага сельскага Савета. Арганізоўваў першыя калгасы, адным з першых уступіў у калгас сам. Потым доўгі час загадваў малочнатаварнай фермай у калгасе імя Фрунзе. У ліку першых на Талачыншчыне П. Я. Пляскач быў удзельнікам Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве.

Калі пачалася Вялікая Айчынная, Пятра Ягоравіча як інваліда Грамадзянскай вайны ў армію

І. А. Кудзін.

П. Ф. Латушкін.

не ўзялі. Але ён разам з іншымі калгаснікамі пагнаў на ўсходнія раёны грамадскую жывёлу. Аднак дайшлі толькі да Смаленска: гітлераўскія танкі ішлі хутчэй, чым гурты кароў. Трапіў у акружэнне. Вярнуўся ў Славені.

З прыходам Савецкай Арміі ў 1944 г. добраахвотнікам пайшоў на фронт. Ваяваў у складзе 3-га Беларускага фронту, забяспечваў боепрыпасамі мінамётную роту. Пад Кёнігсбергам цяжка паранены і дэмабілізаваны. Многа гадоў працаваў калгасным лесніком.

СЕРКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУДНЫ Несцер Лявонавіч, нарадзіўся ў 1881. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Ваяваў у 1-й Коннай арміі. Працаваў старшынёй Раснянскага валвыканкома, брыгадзірам у калгасе. Памёр у 1984.

ДАНІЛАЎ Антон Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1901. Член КПСС з 1939. У 1918—24 у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях супраць контррэвалюцыйных часцей і інтэрвентаў. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі. Памёр у 1969.

ІВАНЮТА Сцяпан Савельевіч, нарадзіўся ў 1900. У 1918—21 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

НАВУМАЎ Дзмітрый Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1896. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Памёр у 1982.

РАК Андрэй Сідаравіч, нарадзіўся ў 1885. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1982.

ТАЛАЧЫН

БАГДАНОЎСКІ Канстанцін Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1900. Член КПСС з 1921. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней. Памёр.

БЯЛЕЎСКІ Ягор Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1897. У 1919—21 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

ВЫРВІЧ Іван Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1898. Член КПСС з 1942. У 1918—22 у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне». Памёр у 1971.

ДЗЯМЕНЦЬЕЎ Севасцьян Пракопавіч, нарадзіўся ў 1896. Член КПСС з 1937. У 1917—26 у Чырвонай Арміі, разведчык 1-га Петраградскага палка, камандзір узвода 13-й кавалерыйскай дывізіі, у 1930-я гады ўдзельнічаў у ліквідацыі бандаў у Сямілалацінскай вобласці. Памёр у 1980.

ДРАЗДОЎ Васіль Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1901. У 1919—25 у Чырвонай Арміі. Памёр.

І. А. Вырвіч.

КАПЫЛОЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Мураўнічы. Член КПСС з 1938. З 1917 у Чырвонай гвардыі, потым да 1921 у Чырвонай Арміі, начальнік сувязі батарэі 44-й стралковай дывізіі. У 1921—22 загадваў валасным ваенным аддзелам у Дуброўне. Памёр у 1986.

КУЛАБУХАЎ Фёдар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1895. Член КПСС з 1942. У 1917—21 у Чырвонай Арміі, камандзір узвода 5-га Курскага стралковага палка. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Памёр у 1980.

КУНЦЭВІЧ Кузьма Майсеевіч, нарадзіўся ў 1895. Член КПСС з 1937. У 1920—21 у Чырвонай Арміі, ваяваў на Заходнім фронце. У 1930—39 працаваў старшынёй калгаса. У 1945—58 старшыня калгаса «Перамога». Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне». Памёр у 1981.

ЛАЗАРЭВІЧ Яўмен Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1899. У 1919—22 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

ЛЕВАНЮК Пётр Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1894. У 1917—20 у Чырвонай Арміі, медыцынскі фельчар. Памёр у 1976.

ЛУГОЎСКІ Яфім Пятровіч, нарадзіўся ў 1892. Член КПСС з 1941. У 1918 член Круглянскага валаснога камітэта беднаты. У 1919—21 у Чырвонай Арміі, тэлефаніст на Заходнім фронце. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Памёр у 1972.

МІГАЛЬ Сяргей Антонавіч, нарадзіўся ў 1898. Член КПСС з 1922. У 1918—22 у Чырвонай Арміі, ваяваў з белагвардзейцамі і інтэрвентамі на Паўднёвым, Паўночным і Заходнім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне».

МІРКІН Ісак Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1887. Член КПСС з 1944. У 1918—19 у Чырвонай Арміі, служыў у 49-м стралковым палку 17-й стралковай дывізіі. З 1919 на гаспадарчай рабоце. Памёр у 1974.

РАКІЦКІ Міхаіл Васілевіч, нарадзіўся ў 1900. Член КПСС з 1941. У 1920—23 служыў у 70-м стралковым палку. З 1924 працаваў у валасным камітэце ўзаемадапамогі. У гады Вялікай Айчыннай вайны палітработнік Чырвонай Арміі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалём «За баявыя заслугі».

РАШЭТНІКАЎ Мікіта Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1898. Член КПСС з 1919. У Чырвонай Арміі ў 1919—21, чырвонаармеец асобнага эскадрона 16-й стралковай дывізіі імя Кіквідзе. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1976. (Больш падрабязна пра М. А. Рашэтнікава гладзі ў артыкуле «Калгасная партячэйка»).

РЭДЬКІН Антон Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1895. Член КПСС з 1944, у 1918—22 у Чырвонай Арміі, камандзір роты 4-га Варшаўскага стралковага палка 16-й арміі. Удзельнічаў у баях супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне». Памёр у 1981.

ХАНКЕВІЧ Аляксандр Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1899. У 1919—22 у Чырвонай Арміі. Памёр у 1982.

ЦІХАНКОЎ Уладзімір Пятровіч, нарадзіўся ў 1893. Член КПСС з 1924. У 1918—22 у Чырвонай Арміі, шафёр штаба 9-й Кубанскай арміі. Удзельнічаў у баях супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў на Паўднёвым фронце. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». Памёр.

ШАПЛОЎ Іван Раманавіч, нарадзіўся ў 1892. У 1919—21 у Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у баях на Заходнім фронце. Памёр у 1970.

ТАЛАЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АБЛЕТНІКАЎ Сямён Мінавіч, нарадзіўся ў 1886 у в. Равуча. У 1905 у Маскве ўдзельнічаў ва ўзброеным паўстанні. Памёр.

АГЕЕНКА Георгій Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Равуча. У 1919—21 у Чырвонай Арміі, у саставе 5-й стралковай дывізіі на Паўднёвым фронце. Прайшоў баявы шлях ад Арла да Перакопа. Памёр.

АНІКОВІЧ Фёдар Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Маціёва. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1982.

ВАСІЛЬЕЎ Пётр Іванавіч, нарадзіўся ў 1896. У 1919—20 у Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны на Паўднёвым фронце, Вялікай Айчыннай вайны. У 1920—40 працаваў на сельскай гаспадарцы. У 1945—61 аграном племзавода «Рэканструктар». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

ЗЯЗЮЛЕВІЧ Міхаіл Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Райцы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1983.

ЗЯЗЮЛЕВІЧ Уладзімір Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Райцы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1984.

КАКОШКА Сцяпан Мінавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Райцы. У 1918—21 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Памёр у 1979.

Лёс Сцяпана Какошкі вызначылі амаль двухметровы рост і моцныя мускулы. Ён стаў матросам вартавога карабля «Алег». Тут ён упершыню ўбачыў людзей, якія выступалі супраць цара, пачуў расказы пра Леніна. Непісьменны сельскі хлопец сярцам адчуў, што ён павінен быць разам з гэтымі людзьмі. Аднойчы афіцэр (з яўным намерам паздзекавацца з маладога матроса) запытаў у Сцяпана:

— А ты — за бальшавікоў ці за камуністаў?

— Я, пан афіцэр, за праўду,— адрапартаваў матрос.

Афіцэр замахнуўся, каб ўдарыць хлопца, ды пабаяўся — не тыя былі ўжо часы.

У пачатку 1917 г. Сцяпана Какошку перавялі ў якасці стралка на легендарны крэйсер «Аўрора». Не думаў ён тады, што яму давядзецца стаць удзельнікам векапомных падзей, калі гістарычны залп «Аўроры» абвясціць усяму свету пра пачатак новай эры. «Памешчыцкая ўласнасць на зямлю адмяняецца неадкладна без усякага выкупу»,— гаварылася ў Дэкрэце аб зямлі. Калі Сцяпан упершыню пачуў гэтыя словы, ён заплакаў ад радасці: не будзе больш ніколі іх памешчыка Славінскага...

— Я ніколі не адчуваў сябе такім шчаслівым,— успамінаў потым Сцяпан Мінавіч.— У тыя мінуты плакаў ад радасці не адзін я, плакалі і мае аднавяскоўцы. Пазней нас перавялі на ахову Смольнага. Аднойчы я ўбачыў Уладзіміра Ільіча Леніна. Ён праходзіў каля мяне. Цяжка перадаць словамі пачуццё, якое ахапіла мяне ў тыя мінуты. Імя гэтага чалавека было святым для кожнага з нас.

У 1921 г. Сцяпан Какошка вярнуўся ў родную вёску. Стаў актыўным будаўніком новага жыцця. Ён скончыў у Мінску курсы трактарыстаў і быў першым механізатарам у акрузе.

Ніколі не забыць яму тую раннюю вясну 1925 г. Толькі што сышоў снег. Усталявалася добрае надвор'е. У адзін з такіх дзён ён прыехаў на першым трактары ў родную вёску. Паглядзець на стальны цуд збегліся ўсе, ад малога да старога. Сцяпан быў шчаслівы. Ён павёў трактар прама ў поле. Людзі беглі следам, спрачаліся, не верылі, што машына будзе араць зямлю. Але вось тры лемяшы легка ўрэзаліся ў зямлю і адвальваліся пласт за пластом свежага ворыва. Людзі стаялі на ўскраіне поля і радаваліся.

М. М. Рашэтнікаў.

І. М. Цітавец.

КРАСОЎСКІ Мін Данілавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Катужына. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1984.

МІРАНОВІЧ Нічыпар Апанасавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Новае Саколіна. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1978.

МІСНІК Ціт Мікітавіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Слабодка. Член КПСС з 1938. У 1918—19 у Чырвонай Арміі, чырвонаармеец Какаўчанскага ваеннага камісарыята. Узнагароджаны медалямі «За працоўную адзнаку», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне». Памёр у 1969.

ПАЛЯКОЎ Ягор Андрэевіч, нарадзіўся ў 1896. З 1917 у Чырвонай гвардыі, потым да 1921 у Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны.

ПАЛЯКОЎ Яфім Паўлавіч, нарадзіўся ў 1892, з 1917 у Чырвонай гвардыі, потым да 1922 у Чырвонай Арміі, служыў у 225-м артылерыйскім палку. Удзельнік Грамадзянскай вайны.

РАМАНОЎСКІ Рыгор Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1898. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1977.

РАШЭТНІКАЎ Мікалай Максімавіч, нарадзіўся ў 1901 у Талачыне. У 1920—23 гг. у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях з войскамі буржуазнай Польшчы. З 1923 працаваў на сельскай гаспадарцы. З 1933 г. старшыня, у 1936—41 загадчык жывёлагадоўчай фермы калгаса імя К. Я. Варашылава. З 1944 у Чырвонай Арміі. Пасля вайны працаваў у калгасе «XII партз'езд».

САБАЛЕЎСКІ Баляслаў Іванавіч, нарадзіўся ў 1899, у 1919—22 у Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны, служыў у 92-м стралковым палку. У 1930—41 і у 1944—55 працаваў у калгасе імя Энгельса.

СУШКОЎ Аляксандр Ермалаевіч, нарадзіўся ў 1891, у Чырвонай Арміі ў 1918—20, удзельнік Грамадзянскай вайны.

ТАЛКАЧОЎ Якаў Авяр'янавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Лужная. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1984.

ТАЛОШКА Данііла Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Райцы. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

ЦІТАВЕЦ Іван Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Жаўна. Удзельнік Грамадзянскай вайны, памочнік камандзіра дывізіі па гаспадарчай частцы. Памёр у 1971.

ШАТКОЎ Мітрафан Васілевіч, нарадзіўся ў 1899. У 1919—22 у Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Памёр.

1921
1941

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

Адстаяўшы ў жорсткай схватцы з ворагамі рэвалюцыі заваёвы Вялікага Кастрычніка, маладая Савецкая рэспубліка прыступіла да аднаўлення разбуранай імперыялістычнай і Грамадзянскай войнамі гаспадаркі і будаўніцтва новага жыцця. Працоўныя Талачыншчыны з энтузіязмам уключыліся ў гэту работу, горача падтрымліваючы мерапрыемствы партыі і ўрада па сацыялістычнаму пераўтварэнню грамадства.

У вёсках ствараліся і дзейнічалі саўгасы, камуны, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, кааператывы. У адпаведнасці з дэкрэтамі Савецкай улады разгортвалася барацьба з непісьменнасцю, адкрываліся школы, хаты-чытальні, клубы, бальніцы. Істотнае значэнне надавалася арганізацыі партыйных і камсамольскіх ячэек на вёсцы, мерапрыемствам, накіраваным на рост сацыяльнай актыўнасці і самасвядомасці насельніцтва. Вялікую шэфскую работу тут праводзілі камуністы і камсамольцы прадпрыемстваў і ўстаноў Талачына, Оршы, у прыватнасці рабочыя Аршанскага чыгуначнага вузла. Камуністы-чыгуначнікі выступалі на сходах сялян, з дакладамі і лекцыямі аб міжнародным становішчы, палітыцы партыі і Савецкай дзяржавы. З дапамогай шэфаў узніклі камсамольскія арганізацыі ў Славенях (1921), у сельскагаспадарчай камуне пры былым маёнтку Багрынава (1923) і інш. Ячэйкі праводзілі масава-палітычную работу сярод сялян, вялі барацьбу з бандытамі, самагоншчыкамі, кулакамі, арганізоўвалі гуртковы лікбез і г. д.

У 1924 г. ў складзе Аршанскай акругі былі створаны раёны Талачынскі і Коханаўскі. У склад Талачынскага раёна ўваходзілі 14 сельсаветаў: Абідаўскі, Азерацкі, Воўкавіцкі, Высока-Гарадзецкі, Еўлахоўскі, Друцкі, Навасельскі, Няклюдаўскі, Плоскаўскі, Сакалянскі, Стуканаўскі, Талачынскі і Ульянаўскі. На тэрыторыі Коханаўскага раёна іх было 12: Аболецкі, Алёнавіцкі, Вялікагальцаўскі, Коханаўскі, Малатнянскі, Новапалюдаўскі, Пярэвалачненскі, Сіманаўскі, Смальянскі, Сялецкі, Тумініцкі, Шыбекаўскі. Праз 7 гадоў, у ліпені 1931 г., Коханаўскі раён быў скасаваны, і да Талачынскага далучаны Аболецкі, Алёнавіцкі, Коханаўскі, Палюдаўскі, Пярэвалачненскі, Сіманаўскі (Замасцянскі) сельсаветы.

Першыя раённыя арганізацыі ў Талачыне ўзначалілі: райком партыі — Будзін, райвыканком — Баяр, райпрафбюро — Кавальчук, райком камсамола — Дзеніскевіч. 2-і надзвычайны з'езд Саветаў Талачынскага раёна (31.3—1.4.1925) да ліку галоўных задач на тым этапе дзейнасці адносіў умацаванне саюзу паміж рабочымі і сялянамі, развіццё і ўмацаванне сельскай гаспадаркі, павышэнне культурнага ўзроўню вёскі, ліквідацыю непісьменнасці, ажыўленне і ўмацаванне работы нізавога савецкага апарата за кошт прыцягнення ва ўсе галіны савецкага і гаспадарчага будаўніцтва перадавога і адданага Савецкай уладзе сялянства. Асаблівая ўвага звярталася на развіццё кааператываў і таварыстваў.

У в. Равуча маладыя энтузіясткі Аляксандра Свянціхоўская, Надзея Бакштаева, Капярына і Хрысціна Лугоўскія вырашылі стварыць ткацкую арцель, каб забяспечваць насельніцтва таварамі першай неабходнасці. Але для гэтага патрэбны былі сродкі. Дзяўчаты ўгаварылі сваіх родных закласці асабістую гаспадарчую маёмасць для атрымання крэдыту. Справа была нялёгкая, але яны свайго дабіліся. Крэдыт быў атрыманы, 7 сакавіка 1927 г. арцель «Ткачыха-сялянка» была створана і ўвайшла ў склад Аршанскага кааператыўнага саюза. На атрыманы крэдыт былі набыты 5 ткацкіх станкоў, сыравіна, за якой бацькам дзяўчат прыходзілася ездзіць на калёсах за 50 км у Оршу. Першая прадукцыя арцелі — шатландка, сарпінка, хусткі і ручнікі з мастацкай аздобай — прыйшлася да спадобы пакупнікам. Амаль два гады працавалі толькі на пагашэнне крэдыту, а ў 1929 пачалі ствараць уласны фонд. У 1931 г. арцель, якой далі назву «Чырвоны тэкстыль-

шчык», была пераведзена ў Талачын. На нарадзе тэкстыльшчыкаў у Маскве вырабы талачынскіх дзяўчат атрымалі высокую ацэнку, і арцель перайшла ў падначаленне мастпрамсавета. Яе калектыву ўрад БССР даручыў зрабіць для павільёна Беларускай ССР на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве дэкаратыўную тканіну, дарожкі, паясы для абвязкі снапоў і іншыя вырабы.

У 1927 г. ў Талачыне пачалася рэканструкцыя завода па вырабу крухмалу. Прадпрыемства было расшырана, пабудаваны новы корпус. Увод Талачынскага крухмальнага завода ў дзеянне супаў з 10-гадовым юбілеем рэспублікі, таму прадпрыемства было названа «Першы дзяржаўны завод імя 10-годдзя БССР». З прамысловых прадпрыемстваў у канцы 20 — пачатку 30-х гадоў на Талачыншчыне функцыяніравалі пладоававінны ў Азерцах, спіртавы ў Гаршчэўшчыне, два цагельныя заводы, райпрамкамбінат. У 1932 г. ўтвораны Талачынскі масласырзавод, дзе быў установлены сепаратар прадукцыйнасцю 1000 літраў за гадзіну і маслапрыгатавальнік ёмістасцю 400 літраў.

У 1929 г. ў раёне разгарнулася калектывізацыя. Істотную ролю ў падрыхтоўцы сялян да пераходу на калектыўныя метады вядзення сельскай гаспадаркі адыгралі камуны. Так, адна з першых у раёне камун, што існавала ў в. Манастыры, у пачатку калектывізацыі ператварылася ў калгас. Камуна ў в. Забайкал з 17 сялянскіх гаспадарак, арганізатарам і нязменным кіраўніком якой на працягу дзесяцігоддзя быў Юльян Летнікаў, у 1929 г. была пераўтворана ў калгас імя В. П. Чкалава. Сярод першых яго арганізатараў быў Ю. Е. Летнікаў. У ліку першых у раёне ўзніклі калгасы «Перамога» (Талачын), «VI з'езд Саветаў» (в. Забалацце), «Зялёныя Дубы» (в. Жураўлі), «Волга» (пас. Забалацце). 80 сем'яў Юзафполля і Зарэчча аб'ядналіся ў калгас «XII з'езд КП(б)Б». Актыўна дзейнічала створаная ў гэтым калгасе партячэйка на чале з дваццаціпяцітысячнікам М. А. Рашэтнікавым. У 1929 г. калгас быў удзельнікам Усебеларускай сельскагаспадарчай выстаўкі, дзе экспанаваліся племянныя жарабцы калгаса, сельгасінвентар, зроблены рукамі калгасных умельцаў, дасягненні ў агародніна-водстве і пчалярстве. Узнагародай за дасягненні былі 5 трактароў «фардзон».

Першыя поспехі калгасаў садзейнічалі прыліву ў іх тых бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарак, што яшчэ вагаліся. У рэзалюцыі пленума Талачынскага райвыканкома, які 4 снежня 1930 г. разглядаў ход калектывізацыі ў раёне, адзначалася, што калгасы «на практыцы сваёй калектыўнай працы паказалі сапраўдную перавагу перад аднаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі, аб чым сведчаць даныя размеркавання ўраджаю і прыбытку ў калгасах, якія значна вышэй чым у аднаасобных... гаспадарках». Пленум адзначаў «вялікія дасягненні ў калгасным будаўніцтве» ў Воўкавіцкім, Азерацкім, Еўлахоўскім сельсаветах, дзе было калектывізавана больш як 20 % бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У перыяд калектывізацыі інтэнсіўна ствараліся калгасныя партыйныя ячэйкі. Ім у дапамогу былі мабілізаваны многія камуністы горада. Вернымі памочнікамі партыі выступалі камсамольцы. У лістападзе 1928 г. рай-

Дэлегаты міжраённай канферэнцыі прафсаюза сельгаслесрабочых Талачынскага і Круглянскага раёнаў. 1928 г.

ком прафсаюза сельгаслесарабочых і райком ЛКСМБ правялі раённую канферэнцыю маладых батракоў і пастухоў, на якой абмеркаваны задачы вясковай моладзі ў правядзенні калектывізацыі. У студзені 1929 г. адбыўся злёт камсамольцаў Талачыншчыны, удзельнікі якога звярнуліся з заклікам да камсамольцаў рэспублікі актыўна ўключыцца ў барацьбу за сацыялістычную перабудову вёскі. Яны пісалі: «Кожная ячэйка — арганізатар калгаса, кожны камсамолец — калгаснік». У в. Варанцэвічы першымі ў калгас уступілі камсамольцы, а па іх прыкладу яшчэ 50 сялян. Калгас назвалі імем газеты «Комсомольская правда».

Газета «Калгаснік Талачыншчыны» 16 мая 1931 г. паведамляла: «Пад пераможны сцяг калектывізацыі ўстаюць новыя калоны аднаасобнікаў, знішчаюцца старыя дзедаўскія межы». У раёне была створана МТС, якая абслугоўвала калгасы 6 сельсаветаў. План сяўбы ў раёне быў перавыкананы, паспяхова праведзена жніво, у асноўным завершаны былі планы збожжанарыхтовак, актыўна ўкаранялася здзельшчына, разгортвалася сацыялістычнае спаборніцтва. Тон задавалі працоўныя першых калектыўных гаспадарак — «Перамога», «XII з'езд КП(б)Б», імя Максіма Горкага (в. Ляхі), «Новы шлях» (в. Канапельчыцы), імя У. І. Леніна (в. Катужына), «Чырвоны пуцілавец» (в. Слабодка). Калгаснікі сельгасарцелі імя Максіма Горкага ў 1931 г. выканалі план збожжанарыхтовак на 169 %.

Адным з галоўных кірункаў сельскагаспадарчай спецыялізацыі раёна было развіццё льнаводства. У 1932 г. ў строй уступіў Талачынскі льнозавод, які працаваў на мясцовай сыравіне. Аналагічнае прадпрыемства будавалася ў Коханаве.

І Усебеларускі з'езд калгаснікаў-ударнікаў, які адбыўся ў сакавіку 1933 г., заклікаў працаўнікоў вёскі арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва на ўсіх участках калгаснага будаўніцтва. Талачынскі раён адзін з першых уключыўся ва Усесаюзнае сацспаборніцтва льнаводаў. У ліпені 1933 г. ўдзельніцы раённага злёту калгасніц-ударніц выступілі са зваротам да ўсіх калгаснікаў аддаць максімум увагі развіццю льнаводства. У паведамленні райкома КП(б)Б і райвыканкома ў рэдакцыі газет «Правда» і «Звязда» (7 ліпеня 1933 г.) аб уключэнні раёна ва Усесаюзнае спаборніцтва на лепшы льнаводчы раён адзначалася, што заклік ільнаводаў Бежацкага раёна Маскоўскай вобласці талачынцы прымаюць і абавязваюцца добра правесці догляд пасеваў і прадаць дзяржаве лён высокай якасці не ніжэй 12-га нумара да 7 лістапада. І слова сваё яны стрымалі. За поспехі ў развіцці льнаводства Талачынскаму раёну як пераможцу ў сацспаборніцтве быў уручаны пераходны Чырвоны Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Цікавую інфармацыю аб эканамічным развіцці Талачыншчыны пачатку 30-х гадоў дае статыстычны даведнік «Усе раёны БССР», выдадзены ў 1933 г. ў Мінску. Насельніцтва раёна складала 89 282 чалавекі. Паводле тытульнага спіса за 1931 год у раёне налічвалася 75 прадпрыемстваў, сярод якіх былі: арцелі смалакурная, дрэваапрацоўчая, ткацкая, сукнавальная і фарбавальная, аўчынная, кравецкія (2), шавецкія (6), тарфяныя (4), кавальскія

Камунары в. Забалацце. На здымку быў надпіс «Сям'я камуны «Волга», сцёрты пад страхам рэпрэсій у гады нямецка-фашысцкай акупацыі.

Будынак чыгуначнай станцыі Талачын. Сярэдзіна 1930-х гадоў.

(4), цагельныя (8); заводы льноапрацоўчыя (3), аўчына-футравы, лесазавод, крухмальны, спіртзавод, пладоавінны; таксама працавалі 12 кузняў, сукнавальня, нафтавы і 10 вадзяных млыноў, хлебапякарня, кандытарская і інш. У 1932 г. на 22 дзяржаўных і 54 кааператыўных прадпрыемствах працавала 1060 чалавек. Спажывецкая кааперацыя раёна мела 23 сельпо, 47 гандлёвых адзінак.

У раёне налічвалася 14 689 гаспадарак, з іх на 1 студзеня 1933 г. калектывізавана 4593, што складала 31,3 %. Было 197 калгасаў. Яны мелі 28 свінагадоўчых ферм, 26 малочных, 29 па вырошчванню маладняка, 2 каняводчыя фермы. Большасць саўгасаў («Райцы», «Лемніца», «Крывое», «Скрынічына», «Рубеж», «Кулікоўка») мелі свінаводчы кірунак. Машынны парк раённай МТС складаў 14 трактароў, 15 складаных малатарняў, 80 ільноцерабілак. Калгасы мелі 95 сенакасілак, 64 конных грабляў, 154 жнеяркі-самаскідкі, 10 снопавязалак. 13 бульбакапалак, 102 радковыя сеялкі, 8 складаных малатарняў, 7 трактароў. Пасяўная плошча ў 1932 г. складала 72 414 га, у тым ліку: збожжавых 63 %, бульбы 16 %, тэхнічных культур 11 %, траў 10 %. Нарыхтоўкі па раёне на 20 лютага 1933 г. склалі (у цэнтнерах): ільновалакна 9504, ільнасемя 6176, пянькі 192.

Сетка навучальных устаноў раёна на 1 студзеня 1933 г.: 145 чатырохгадовых школ, у іх 13 001 вучань, 278 настаўнікаў, 1 ФЗС (163 вучні, 2 настаўнікі), 28 школ сялянскай моладзі (1940 вучняў, 79 настаўнікаў), 1 тэхнікум (сельскагаспадарчы ў Коханаве), у ім 95 студэнтаў, 4 настаўнікі.

Партыйная арганізацыя раёна складалася з 47 ячэек, на ўліку ў якіх было 468 камуністаў; у 78 камсамольскіх ячэйках налічвалася 1216 камсамольцаў. Працаваў палітаддзел, арганізаваны пры саўгасе «Ленінец». З 1931 выдаецца раённая газета «Калгаспік Талачыншчыны».

Арганізацыйна-гаспадарчае станаўленне калгасаў на Талачыншчыне, як і ва ўсёй рэспубліцы, адбывалася ў складаных умовах: культурная і тэхнічная адсталасць, малапісьменнасць, недахоп сродкаў, тэхнікі і кадраў, пралікі ў калектывізацыі і супраціўленне яе праціўнікаў. Некаторыя з іх вялі агітацыю супраць калгасаў, зрывалі сходы, падбухторвалі сяляк на масавы забой жывёлы. Калі ж гэта не дасягала мэты, станавіліся на шлях злачынстваў, тэрору. Так, у ноч на 7 мая 1931 г. ў выніку падпалу будынкаў калгаса «12-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі» былі знішчаны пасяўны матэрыял, сельска-

Урок фізкультуры ў Талачынскай школе сельскай моладзі. Здымак 1930-х гадоў.

Выхаванцы дзіцячага сада калгаса «Змагар за сацыялізм». Здымак 1934 г.

гаспадарчыя машыны і прылады, рабочыя коні. 25 студзеня 1932 г. ў калгасе «Чырвоныя Бутары» забіты старшыня рэвізійнай камісіі калгаса Янка Шыдлоўскі, які вёў рашучую барацьбу са злоўжываннямі старшыні калгаса Мясасадава, былога кулака. 5 красавіка 1934 г. па-зверску быў забіты, а потым утоплены жыхар в. Філістава, сельскі актывіст і народны засядацель Е. І. Пашкевіч. У студзені 1935 г. быў забіты рабселькор Талачынскага раёна, дэлегат Усебеларускага з'езда рабселькораў, удзельнік Грамадзянскай вайны, старшыня калгаса «VI з'езд Саветаў» З. В. Крывіцкі.

Ва ўмовах завяршэння сацыялістычнай рэканструкцыі эканомікі і мер па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў сельскагаспадарчая вытворчасць паступова развівалася, былі дасягнуты поспехі ў тэхнічным пераўзбраенні сельскай гаспадаркі. У 1936 г. па Талачыншчыне дзейнічалі 2 МТС, к 1935 г. з 20 сельсаветаў раёна 12 мелі тэлефонную сувязь. Рост механізацыі калгаснага земляробства пры адсутнасці тэхнікі ў аднаасобнікаў, пэўныя дасягненні калектыўнага гаспадарання і масавае раскулачванне яго працаўнікаў садзейнічалі поўнаму завяршэнню калектывізацыі. Характэрныя таму часу энтузіязм, дух спаборніцтва захапілі і працоўных раёна. Рэгулярнымі на Талачыншчыне сталі злёты перадавікоў-ударнікаў, канферэнцыі па абмену вопытам, пашыраўся селькораўскі рух.

Актыўнай працай вызначалася 65-гадовая Х. А. Купрыянава з калгаса імя В. І. Чапаева. У 1935 г. яе выбралі дэлегатам ад Талачынскага раёна на II Усесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў, які праходзіў у Маскве. Сярод калгаспніц Талачыншчыны было нямала наследуўніц Пашы Ангелінай. У Равяцкай МТС нават была створана брыгада трактарыстак. Ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве ў 1939 г. ад Беларусі ўдзельнічалі 180 калгасаў і 5 раёнаў, у т. л. Талачынскі. У выстаўцы ўдзельнічалі (па выніках 1937—38 гг.) калгасы «Барацьбіт» Рыдамлянскага сельсавета, «Чырвоны пуцілавец» Навасельскага сельсавета, імя К. Е. Варашылава Еўлахоўскага сельсавета, «Перамога» Талачынскага гарпасялковага Савета. Газета «Чырвоны хлебароб» паведамляла 6 чэрвеня 1939 г., што галоўны камітэт выстаўкі зацвердзіў яе ўдзельнікамі з запісеннем у Кнігу гонару 22 перадавікоў з Талачыншчыны.

У 1939 г. ў гонар 20-годдзя Савецкай Беларусі група работнікаў сельскай гаспадаркі раёна за вялікія поспехі ў працы была ўдастоена даяржаўных узнагарод. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга быў узнагароджаны сакратар Талачынскага РК КП(б)Б Ф. А. Пататурка, ордэнам «Знак Пашаны» — былы першы старшыня, а на той час брыгадзір калгаса «Перамога» С. М. Грыгаровіч, звеннявая па льну калгаса «2-я пяцігодка» П. М. Сянчыла, медалём «За працоўную адзнаку» — старшыня калгаса «Перамога» Ф. І. Зайцаў.

Удзельнікі сесіі Коханаўскага пасялковага Савета. 1937 г.

Пасля ўручэння ўзнагарод у Крамлі. Злева ад М. І. Калініна сядзяць сёстры Шостак — Ганна і Лізавета. 1939 г.

старшыня выканкома Навасельскага сельсавета В. Ф. Марковіч, старшыня калгаса «Барацьбіт» Н. А. Дубавец, трактарыст Равяцкай МТС П. Т. Дамініч. У ліку першых у рэспубліцы медалі «За працоўную доблесць» атрымалі льнаводкі сёстры Ганна і Лізавета Шостак з пасёлка Коханава. Узнагароды сёстрам уручыў М. І. Калінін. У снежні 1939 г. Лізавета Шостак прымала ўдзел у нарадзе ЦК КП(б)Б з перадавікамі сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі. Яна расказала аб арганізацыі працы ў сваёй гаспадарцы (калгас імя А. І. Мікаяна), падзялілася вопытам вырошчвання высокіх ураджаяў лёну.

У 1939 г. 2 электрастанцыі ў раёне выпрацавалі 41 тыс. кВт·гадз электраэнергіі. Працавалі 438 прамысловых прадпрыемстваў (2665 рабочых). У структуры раёна былі наступныя галіны прамысловасці: торфаздабыўная (143 прадпрыемствы, 745 рабочых), абутковая (9; 92) швейная (6; 52), металаапрацоўчая (180; 282), дрэваапрацоўчая (23; 103), харчовая (30; 365), лесараспрацоўкі і лесасплаў (7; 742), цагельная (4; 17), паліграфічная (1; 10); працавала 13 механічных млыноў. Удзельная вага прамысловасці раёна ў прамысловасці вобласці за 1939 г. склала: па колькасці прадпрыемстваў 6,4 %, па сярэднегадавой колькасці рабочых 3,6 %, па кошту валавой прадукцыі 1,6 %.

На 1 студзеня 1940 г. ў Талачынскім раёне, які займаў плошчу 1,3 тыс. км², было 18 сельсаветаў: Аболецкі, Азерацкі, Алёнавіцкі, Высока-Гарадзецкі, Валосаўскі, Воўкавіцкі, Друпкі, Еўлахоўскі, Коханаўскі, Навасельскі, Няклюдаўскі, Палюдаўскі, Плоскаўскі, Пярэвалачненскі, Рыдамльскі, Сакалінскі, Славенскі, Сіманаўскі. У раёне налічваліся 201 калгас (было калектывізавана 98,4 % двароў, 99,91 % пасяўной плошчы), 3 МТС, 1 племзавод, 11 125 сялянскіх гаспадарак; 10 947 двароў калгаснікаў.

З устаноў аховы здароўя дзейнічалі 4 бальніцы на 105 ложкаў, 7 амбулаторных паліклінік, 14 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 5 аптэк. Працавала 18 урачоў, 23 фельчары, 38 медсясцёр. Былі 3 дзіцячыя сады па 148 месцаў.

У раёне дзейнічалі 117 школ усіх тыпаў (у іх займаліся 14 424 вучні, працавалі 490 настаўнікаў), 50 клубных устаноў, у т. л. 25 калгасных, 18 хат-чытальняў, 94 бібліятэкі, 4 кінаўстаноўкі, з іх 2 гукавыя.

Такім быў эканамічны стан Талачынскага раёна на пачатак 40-х гадоў.

Г. К. Кісялёў, А. А. Шнэйдар.

ТЭЛЕГРАМА ПРАЦОЎНЫХ КОХАНАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ АРШАНСКАГА ПАВЕТА У. І. ЛЕНІНУ

1 мая 1923 г.

Москва, Кремль, Председателю Совнаркома товарищу Ленину.

В день 1 Мая мы, крестьяне и крестьянки, члены РКП и члены РКСМ, учащиеся 1 и 2 ступени и все профессиональные организации Кохановской вол., Оршанского у., Витебской губ., собравшиеся в этот великий праздник — Международный день трудящихся — на широком торжественном заседании организаций и беспартийной конференции, совместно со своими шефами — коммунистами раб-

фака и уфинотдела гор. Орши, шлем нашему Владимиру Ильичу пожелание скорейшего выздоровления на страх врагов рабочих и крестьян.

Президиум заседания.

Письма трудящихся Белоруссии В. И. Ленину. 1917—1924. 3 изд. Мн., 1980. С. 148.

* * *

З успамінаў Пятра Ягоравіча Казлоўскага, былога члена Коханаўскай камсамольскай ячэйкі

...Я быў актыўным удзельнікам першамайскай дэманстрацыі працоўных Коханаўскай воласці ў 1923 г. На святкаванне прыехалі да нас з Оршы шэфы — загадчык павятовага фінансавага аддзела тав. Студзянцоў Раман Паўлавіч і студэнт рабфака тав. Кавалёў Андрэй Макаравіч. Свята праводзілася ўрачыста. Калоны дэманстрантаў прайшлі па вуліцах мястэчка пад чырвонымі сцягамі, з партрэтамі У. І. Леніна.

Мы, навучэнцы-камсамольцы, узначальвалі школьную калону, неслі вялікі партрэт Ільіча і сцяг школы. Ля нардома адбыўся мітынг, на якім выступіла каля 10 чалавек. Адкрыў урачысты мітынг сакратар валасной партыйнай арганізацыі тав. Алешкін. Потым выступіў сакратар камсамольскай ячэйкі Антон Савіліч. Ен прапанаваў напісаць і паслаць тэлеграму Уладзіміру Ільічу Леніну. Пакуль на мітынгу выступалі дырэктар нашай школы М. Н. Лазарэнка, таварышы Студзянцоў, Кавалёў і іншыя, Савіліч паклікаў загадчыка нардома Чарнова і мяне, і мы напісалі сумесна тэкст тэлеграмы, якая была адпагалосна прынята ўдзельнікамі мітынгу...

Лёгкай долі не шукалі

З успамінаў І. А. Пасюціна

Іван Ануфрыевіч Пасюцін, Член КПСС з 1928 г. З 1922 г. быў сакратаром камсамольскай ячэйкі мястэчка Славені. У 1925 г. камандзіраваны Талачынскім райкомам камсамола на вучобу ў Аршанскі рабфак. З 1928 г. вучыўся ў Маскве. Працаваў галоўным інжынерам на адным з заводаў Маскоўскай вобл., у органах НКУС, дырэктарам аднаго з маскоўскіх заводаў. Працяглы час быў на адказных пасадах у органах Дзяржаўнага кантролю. З 1955 г. працаваў у апараце ЦК КПСС. Персанальны пенсіянер саюзнага значэння. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны», медалямі.

* * *

У 1922 г. ў камсамольскай ячэйцы вёскі Славені не было і дзесяці чалавек. Местачковая і вясковая моладзь не адразу наважвалася далучацца да нас. І на гэта былі свае прычыны. Панавала пасляваенная разруха, кожная сялянская сям'я мела пільную патрэбу ў маладых руках. А камсамольцы часта адрываліся ад гаспадарчых спраў на барацьбу з бандытызмам, самагоншчыкамі, на падрыхтоўку і правядзенне масава-палітычных мерапрыемстваў. Перашкодаю для ўступлення ў камсамол была і рэлігійнасць некаторых бацькоў. Да таго ж, кожны член ячэйкі станавіўся байцом ЧОНа і мы, сумесна з Талачынскай,

Члены бюро камсамольскай арганізацыі в. Славені (злева направа): І. Пасюцін (сакратар), І. Каждан, Ф. Пасюцін. Здымак 1923 г.

а часам і з Аршанскай коннай міліцыяй, удзельнічалі ў блакадах бандыцкіх гнёздаў. Гэта было вельмі небяспечна, кожная сутычка з бандытамі магла стаць апошняй...

І ўсё ж дзякуючы энергічнай масава-палітычнай рабоце, якую мы вялі сярод моладзі, колькасць членаў ячэйкі і несаюзнага актыву няўхільна павялічвалася. Камсамольцамі станавіліся самыя рашучыя і смелыя юнакі і дзяўчаты.

Вельмі востра ў пачатку 1920-х гадоў стаяла праблема барацьбы з самагоншчыкамі. У рэспубліцы, асабліва ў гарадах, не хапала хлеба, галадалі рабочыя сем'і. А некаторыя заможныя сяляне, не зважаючы на закон пра здачу лішкаў хлеба дзяржаве, пераганялі частку ўраджаю на гарэлку і спекулявалі ёй. Трэба было ратаваць хлеб. Калі мы даведваліся, што нехта збіраецца гнаць самагонку, дык неадкладна паведамлялі пра гэта ў Талачынскую міліцыю. Дапамагалі міліцыянерам «накрыць» самагоншчыкаў. Гарэлачная спекуляцыя перастала быць беспакаранай. Многія пуды хлеба збярог тады наш камсамольскі патруль для галодных сем'яў у гарадах.

Асноўным штодзённым абавязкам ячэйкі была масава-палітычная работа сярод моладзі Славеняў і навакольных вёсак. Асаблівай папулярнасцю карысталіся аматарскія спектаклі, якія мы паказвалі на сцэне школы. Часам не хапала месцаў, каб размясціць усіх гледачоў. У драмгурток тады ўваходзілі былыя чырвонаармейцы Канстанцін Пасюцін і Рыгор Пасюцін, дырэктар Славенскай школы Нічыпар Цыбулькін, яго жонка Клаўдзія Галуза і многія іншыя. Некаторыя пастаноўкі былі платныя, а за выручаныя грошы купілялі новыя кнігі для бібліятэкі і перыёдыку.

Бібліятэка і камсамольскі клуб размяшчаліся тады ў доме купца Шлёмкі, які ўцёк ад Савецкай улады. У доме папа, які збег з немцамі, знаходзіўся сельскі Савет і хата-чытальня. Школа, бібліятэка, клуб, хата-чытальня былі фарпостамі масава-палітычнай работы сярод моладзі. Там праходзілі нашы сходы, гутаркі, лекцыі.

Штонядзелю, а таксама на вялікія рэлігійныя святы камсамольцы наладжвалі свае камсамольскія ўрачыстасці з гармонікам, віктарынамі, аматарскімі спектаклямі. Для царквы клуб і бібліятэка сталі небяспечнымі канкурэнтамі, моладзь усё часцей аддавала перавагу камсамольскім сходам і святам, а не набажэнствам.

Багата работы было ў камсамольцаў папярэдні выбараў у сельскі Савет. У кандыдаты заўсёды вылучаліся члены ячэйкі. І, як правіла, нашы кандыдатуры праходзілі амаль аднагалосна. Напрыклад, камсамолец Фёдар Пасюцін з 1922 па 1927 г. быў нязменным сакратаром Славенскага сельскага Савета.

У 1925 годзе я быў камандзіраваны Талачынскім райкомам камсамола на вучобу ў Аршанскі рабфак. За тры гады, пакуль мне давялося ўзначальваць Славенскую камсамольскую ячэйку, яна вырасла амаль у тры разы. Мы, камсамольцы, здолелі здабыць сабе вялікі аўтарытэт і павагу сярод мясцовай інтэлігенцыі.

У выніку вялікай антырэлігійнай прапаганды сярод веруючых і з іх згоды ўдалося закрыць варанцэвіцкую царкву, а дом папа пераабсталяваць пад клуб. Да гэтага збіраліся ў будынку школы, у хатах камсамольцаў Баравіцкіх і Сідарэнкаў, бацькі якіх добразычліва ставіліся да маладзёжных спраў.

Пры клубе была і хата-чытальня, працавалі гурткі па вывучэнню бягучай палітыкі і палітэканоміі, драматычны і харавы. У іх удзельнічалі і камсамольцы, і несаюзная моладзь. Харавым гуртком кіраваў настаўнік

З успамінаў Мікалая Прохаравіча Сідарэнкі, камсамольца 20-х гадоў

У пачатку 1923 г. іры сельскагаспадарчай камуне ў былым маёнтку Багрынава была створана камсамольская ячэйка. Яна ўзнікла па ініцыятыве кіраўніка сельскагаспадарчай камуны старога бальшавіка Зайцава і пры дапамозе шэфаў — камуністаў і камсамольцаў Аршанскага чыгуначнага вузла, якія былі частымі гасцямі ў камуне, чыталі тут даклады і лекцыі, праводзілі гутаркі на палітычныя тэмы. У тым жа годзе створана і Варанцэвіцкая ячэйка, у якую перайшлі камсамольцы з Багрынава. Членамі яе сталі камсамольцы сяла Варанцэвічы, вёсак Варанцэвічы, Новыя Варанцэвічы і інш.

За кіламетр ад сяла Варанцэвічы, у маляўнічым месцы каля старажытнага замчышча над рэчкай Лагаўкай быў вялікі плодавы сад і парк. У цэнтры парку стаяў галоўны будынак камуны, і ў ім быў добра абсталяваны клуб — цэнтр работы камсамольскай ячэйкі. У ліку першых камсамольцаў былі Аляксей Бараноўскі, Мікалай Рак (яны былі і першымі сакратарамі), Іван Ананевіч, Фёдар Жыркоў, Фёдар Ананевіч, Канстанцін Баравіцкі, Аня Баравіцкая, Фядора Лычкоўская, Фёдар Шумскі, Іван Сідарэнка, Вера Сідарэнка, Рыгор Сідарэнка, Матрона Раманкевіч, Іван Кавалеўскі. Камсамольцы пачалі сваю дзейнасць з культурна-масавай работы. Па суботніх і нядзельных вечарах чыталі даклады, лекцыі. Актыўны ўдзел у яе рабоце прымала мясцовая інтэлігенцыя.

Захар Карпавіч Куксаў, драматычным — настаўнікі Іван Іванавіч Зяньковіч і Івашчанка. Пастаноўкі драмгуртка мелі поспех, іх паказвалі ў Варанцэвічах і ў іншых вёсках раёна.

Камсамольцы выступілі ініцыятарамі арганізацыі першага ў раёне піянерскага атрада, арганізаванага ў 1924 г. пры школе ў сяле Варанцэвічы. Піянерскай важатай стала Вера Сідарэнка. Адказным за ліквідацыю непісьменнасці ў Варанцэвіцкім сельсавеце назначылі мяне. Адначасова я быў загадчыкам клуба. На працягу 1923—25 гг. непісьменнасць жыхароў вёскі і сяла Варанцэвічы была ліквідавана. У той час у Варанцэвічах яшчэ не было партыйнай ячэйкі, таму камсамольцы актыўна ўдзельнічалі ў правядзенні ўсіх мерапрыемстваў палітычнага, культурнага і гаспадарчага характару: збіралі падаткі, праводзілі раскулачванне, агітавалі за калгасы, змагаліся супраць бандытызму. Варанцэвіцкая ячэйка лічылася адной з лепшых у раёне. У 1930 г. пры актыўным удзеле моладзі ў вёсцы быў арганізаваны калгас, які назвалі імем газеты «Комсомольская правда». Першым старшынёй калгаса выбралі Прохара Сямёнавіча Сідарэнку. Да самай смерці дзядуля Прохар быў з народам, з моладдзю. У цяжкія гады Айчыннай вайны ён дапамагаў партызанам, быў зняволены ў фашысцкай турме, перанёс катаванні, але застаўся верным нашай вялікай справе. Другім старшынёй калгаса быў выбраны яго сын — Рыгор, член бюро ячэйкі КСМ. Многа часу аддавалі камсамольцы ўмацаванню калгаса. Аднойчы не выйшлі на работу жывёлаводы. Тэрмінова было склікана камсамольскае бюро. Былі прыняты меры — усю жывёлу пачалі даглядаць толькі камсамольцы.

Ішлі гады. Работа, распачатая старэйшымі таварышамі, не слабела.

У час Айчыннай вайны на франтах і ў партызанах камсамольцы Варанцэвіцкай арганізацыі змагаліся за Радзіму. У першыя дні вайны загінуў пагранічнік Брэсцкага гарнізона Міхаіл Адамавіч Сідарэнка. Загінулі камсамольцы Андрэй Стальмахоў, Аляксандра Стальмахова, Іван Дземяшкевіч, Мікалай Гурскі, Пётр Сцяпанаў, Н. Валянтовіч, К. Заржэцкі, І. І. Кавалеўскі. Па-зверску закатаваны фашыстамі камсамольцы-партызаны Вольга Гурынава, Алег Беразнеў, Іван Альшэўскі. Ніколі не забуду свайго баявога таварыша інжынера-караблебудаўніка Фёдара Баравіцкага. Са зброяй у руках абаранялі Радзіму Іван Прохаравіч Сідарэнка, Рыгор Сідарэнка, Аляксей Сідарэнка, Іван Адамавіч Сідарэнка, Сцяпан Каласоўскі, Іван Другакоў, Мікалай Другакоў, Анатоль Беразнеў, Мікалай Шумскі, Пётр Бельчык, Іосіф Альшэўскі. У партызанах былі Валянціна Дубкова, Наста Куксянкова, Іліядар Баркоўскі, Пётр Зайчанка, Мікалай Белановіч. Працавалі для фронту ў савецкім тыле Вера Сідарэнка, Алена Сідарэнка, Надзея Белановіч, Марыя Бельчык. Ленінградскую блакаду вытрымалі Ганна, Кацярына і Вера Баравіцкія.

Як стваралі ячэйку

З успамінаў жыхара в. Новае Сяло, дэпутата Вярхоўнага Савета СССР першага склікання, падпалкоўніка ў адстаўцы В. Ф. Шышкова

26 студзеня 1924 г. на жалобным мітынгу пасля я ўступіў у Камуністычную партыю. Мая служба ў Чырвонай Арміі закончылася ў кастрычніку гэтага года, і я прыехаў у сваё роднае Новае Сяло.

У Талачынскім РК КП(б)Б, дзе я станавіўся на партыйны ўлік, са мной гутарыў сакратар райкома партыі т. Будзін. Ён сказаў, што ім вельмі патрэбны камуністы для арганізацыйнай і культурнай работы ў сельскай мясцовасці, і што ў Новым Сяле многа моладзі і тут патрэбна стварыць камсамольскую ячэйку. Я адказаў, што не толькі ў Новым Сяле, але і ў Навасёлках, Мяшкове, Сухачэве многа моладзі, якая гатова ўступіць у камсамол хоць заўтра. У час нашай гутаркі да Будзіна зайшоў хлопец гадоў 20, з якім ён мяне пазнаёміў. Гэта быў сакратар Талачынскага райкома камсамола М. М. Дзеніскевіч, пазней сакратар Аршанскага акруговага камітэта камсамола, 2-і сакратар ЦК КП(б)Б. У райкоме камсамола з Дзеніскевічам і члепам бюро райкома Сцяпанам Аляксейчыкам мы абмеркавалі план арганізацыі камсамольскай ячэйкі ў Новым Сяле. У вёску я вярнуўся вечарам. Каля хаты-чытальні ўжо сабралася моладзь. Я расказаў пра сваю размову ў райкомах партыі і камсамола, паведаміў, што да нас прыедзе член бюро райкома камсамола ствараць камсамольскую ячэйку. На другі дзень вечарам моладзь зноў сабралася каля хаты-чытальні. Размова была адна — аб камсамольскай ячэйцы. Усіх цікавілі пытанні: каго будуць прымаць у камсамол, задачы камсамольцаў на вёсцы, і іншыя.

І вось настаў доўгачаканы дзень сходу. Зноў сабраліся каля хаты-чытальні. Хутка з'явіўся і Сцяпан Аляксейчык. Ён сказаў мне, што вёска і яе размяшчэнне яму спадабаліся. Я дадаў, што калі спадабалася вёска, то

спадабаецца і моладзь нашага сяла, і не памыліўся. Хутка да хаты-чытальні пачала збірацца вясковая моладзь. Прыйшлі хлопцы і дзяўчаты з хутароў і Навасёлак.

У парадку дня сходу былі 2 пытанні: аб задачах моладзі па рабоце на вёсцы і прыём у камсамол.

Усе ўважліва праслухалі дакладчыка, пасля чаго была прынята кароткая рэзалюцыя: 1) даклад члена бюро райкома камсамола т. Аляксейчыка прыняць да ведама; 2) прыступіць да прыёму ў члены РКСМ; 3) прасіць бюро Талачынскага райкома камсамола зацвердзіць пратакол сходу моладзі пры Навасельскім сельсавеце. На гэтым сходзе ў камсамол было прынята 16 чалавек, у бюро ячэйкі ўвайшлі Аляксей Краўцоў, Іван Сядзельцаў, Ганна Савіцкая, Максім Картавіцкі, Глікерыя Міцкевіч. Адразу правялі першае арганізацыйнае пасяджэнне бюро ячэйкі. Першым сакратаром ячэйкі выбралі Краўцова Аляксея, намеснікам сакратара Сядзельцава Івана. На другі вечар пасля сходу члены бюро сабраліся, каб абмеркаваць некаторыя пытанні і скласці план работы ячэйкі на бліжэйшы час. Работы было многа. Першае пытанне — падрыхтоўка да святкавання 7-й гадавіны Вялікага Кастрычніка і арганізацыя самадзейнасці. Усе пытанні былі размеркаваны паміж членамі бюро. Настаўнік Дз. І. Касінцаў з задавальненнем прыняў прапанову бюро ячэйкі стварыць харавы калектыў.

Сёмую гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі правялі арганізавана. На ўрачысты сход прыйшлі вяскоўцы з Навасёлак і Мяшкова. Хата-чытальня была перапоўнена. Пасля даклада выступіў харавы калектыў, потым была пастаўлена п'еса. Усе былі задаволены мерапрыемствамі і дзякавалі камсамольцам. 9 лістапада адбыўся пленум сельсавета, на якім М. М. Дзеніскевіч уручыў камсамольскія білеты.

Рос аўтарытэт камсамольскай арганізацыі. Людзі ўсё часцей і часцей звярталіся да камсамольцаў за тлумачэннем па розных пытаннях. Гэта патрабавала вялікіх ведаў. Для камсамольцаў была арганізавана двухгадовая палітшкола, у якой вывучалі палітграмату, арыфметыку, гісторыю і геаграфію. Заняткі праходзілі рэгулярна 2 разы на тыдзень, займаліся ўсе камсамольцы вёскі. Тым часам паўстала пытанне аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва. Першымі кіраўнікамі гуртковў лікбеза сталі камсамольцы Г. І. Міцкевіч, Г. Р. Савіцкая і іншыя. Многія аднавяскоўцы навучыліся чытаць і маглі ўжо распісацца, за што былі ўдзячны партыі і камсамолу. Хата-чытальня стала ўжо малой, патрэбна было новае памяшканне. Камсамольцы сталі завадатарамі будаўніцтва клуба, і ў хуткім часе ён быў пабудаваны. У ім стварылі сельскагаспадарчы гурток, у які пайшлі ўсе жадаючыя камсамольцы і нават прыцягнулі сюды сваіх бацькоў. У студзені 1926 г. пры Навасельскім клубе былі арганізаваны сельскагаспадарчыя курсы. У выніку работы гуртка і курсаў вёскі Новае Сяло, Навасёлкі і Мяшкова ў 1926 г. перайшлі з трохполля на тасціполле. У 1925 г. пры Навасельскім сельсавеце была створана партыйная ячэйка, сакратаром якой выбралі мяне. К гэтаму часу ў камсамольскай арганізацыі было больш за 30 чалавек. За сваю работу яна была ўзнагароджана сцягам РК РКСМ.

Ветэраны камсамольскай гвардыі

Камуніст ленінскага прызыву

Скончылася Грамадзянская вайна. У роднае сяло Варанцэвічы вярнуўся малады чырвонаармеец Канстанцін Баравіцкі. Ён па-геройску змагаўся з белапалякамі, бандамі Булак-Балаховіча. Вялікай была радасць дэмабілізаванага байца, калі даведаўся, што ў Багрынаве, Воўкавічах і Варанцэвічах з перадавой моладзі створана камсамольская ячэйка. Неўзабаве ён, сын беднага селяніна, быў прыняты ў камсамол. Усяго сябе аддаваў юнак камсамольскай рабоце. Канстанцін вызначаўся сярод сваіх таварышаў мастацкімі здольнасцямі: за 5—10 мінут на грыфельнай дошцы ці на аркушы паперы з'яўляўся вельмі падобны партрэт юнака або дзяўчыны ці прыгожы малюнак, карыкатура.

Ішлі месяцы. Камсамольская ячэйка расла. У яе рады ўступала моладзь суседніх вёсак. Наспела неабходнасць раздзяліць арганізацыю. У Варанцэвічах была створана самастойная камсамольская ячэйка. Яе сакратаром аднагалосна быў выбраны Канстанцін Баравіцкі.

Студзень 1924 г. Газеты прынеслі сумную, страшэнную вестку: памёр У. І. Ленін. Усе камсамольцы сышліся на жалобны сход. А ў дзень пахавання Леніна ўсе яны, як адзін, пайшлі за 15 кіламетраў у валасны цэнтр Стараселле на жалобны мітынг.

— Трашчаў люты мароз, многія з нас былі ў лапцях, у паношаным адзенні,— успамінаў

Канстанцін Васілевіч,— але мы ішлі, не заўважаючы ні марозу, ні снежных заносаў.

У тым жа 1924 г. Баравіцкі па ленінскаму прызыву ўступіў у бальшавіцкую партыю. Потым былі рабфак, ВНУ. Канстанцін Васілевіч стаў архітэктарам. А калі пачалося будаўніцтва новага горада на Амуры, малады архітэктар па закліку партыі паехаў туды. Па яго праектах узводзіліся будынкі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны К. В. Баравіцкі на адказных пасадах у дзеючай арміі і ў тыле. А пасля вайны шмат гадоў працаваў у праектных арганізацыях Мінска. У сталіцы нашай рэспублікі па яго праектах і праектах калектываў архітэктараў, у якіх працаваў К. В. Баравіцкі, пастаўлена многа цудоўных будынкаў. Памёр К. В. Баравіцкі ў 1988 г.

Застрэльшчыкі барацьбы з кулацтвам

З увядзеннем новай эканамічнай палітыкі разгарнулася жорсткая барацьба вясковай беднаты з кулацтвам. Нярэдка кулакам удавалася працягваць сваіх стаўленікаў у мясцовыя органы Савецкай улады. Менавіта так здарылася ў Воўкавіцкім сельсавеце. Старшыня гэтага Савета яўна патураў сельскім багацеям, зніжаў ім падатак, надзяляў зямлёй з дзяржаўнага фонду, браў хабар і г. д.

Камсамольцы не маглі мірыцца з кулацкім засіллем у Савеце і рашылі выкрыць іх стаўленікаў. Аб «кіраўніцтве» сельсаветам яны паведамілі ў валасны камітэт партыі. Сакратар камітэта т. Маслаў прапанаваў склікаць сельскую сходку.

Клуб у в. Багрынава, дзе праходзіў сход, не мог умясціць усіх прыйшоўшых. Добрая палавіна людзей стаяла на дварэ пад вокнамі. Месцы ў памяшканні бліжэй да прэзідыума сходкі і ў самім прэзідыуме занялі кулакі і падкулачнікі. Прысутнасць на сходзе сакратара валаснога камітэта партыі крыху іх насцярожыла, але трымаліся яны ўпэўнена, у сваіх выступленнях даказвалі, што справы ў сельсавеце ідуць гладка. Калі ж папрасіў слова сакратар камсамольскай арганізацыі Аляксей Бараноўскі і пачаў на канкрэтных фактах выкрываць агідныя дзеянні старшыні сельсавета, кулакі раптоўна загулі, ашалела закрычалі, не далі камсамольскаму важаку дагаварыць. Нехта разбіў лямпу. У цемнаце раздаваліся пагрозы ў адрас актывістаў. Натоўп напіраў на стол прэзідыума, пагражаючы прымяніць фізічную сілу... Беднота гатова была па-свойму расправіцца з кулацкімі элементамі, але Маслаў стрымаў.

— Бойкай справу не вырашыш,— сказаў ён і прапанаваў закрыць фактычна закрыты, а дакладней — сарваны сход. А пасля, калі крыху ўляглося, партыйны сакратар асобна сабраў камсамольцаў і заявіў:

— У бліжэйшы час адбудуцца новыя выбары ў сельскія Саветы. Патрэбна падрыхтавацца так, каб выбраць дастойных людзей.

Пасля гэтага камсамольская ячэйка разгарнула растлумачальную работу сярод насельніцтва. Камсамольцы пераконвалі сялян у правільнасці новай эканамічнай палітыкі, у неабходнасці ўзмацнення барацьбы з кулацкімі элементамі. Свядомасць працоўнага насельніцтва паступова павышалася. На выбарах кулакам не ўдалося працягнуць у Воўкавіцкі Савет «сваіх» людзей. А на пасаду сакратара сельсавета быў выбраны камсамолец Фёдар Жыркоў, сын селяніна-беднякa з вёскі Воўкавічы. Жыркоў меў сямігадовую адукацыю і лічыўся самым пісьменным чалавекам у сваёй вёсцы.

Разам з аднавяскоўцамі Аляксеем Бараноўскім, Мікалаем Ракам і Паўлам Ананевічам ён напісаў заяву ў Аршанскі павятовы камітэт камсамола з просьбай стварыць камсамольскую ячэйку ў сельскім Савеце. І ячэйка была створана. Жыркоў кіраваў гуртком па ліквідацыі непісьменнасці, быў запявалам многіх іншых камсамольскіх спраў.

У сярэдзіне 1920-х г. Ф. Л. Жыркоў быў накіраваны ў ваенную школу, паспяхова скончыў яе і стаў камандзірам Чырвонай Арміі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Фёдар Лук'янавіч мужна абараняў Радзіму. За праяўлены гераізм узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі. З 1964 г. палкоўнік Ф. Л. Жыркоў у адстаўцы. Жыў у Мінску, пасільна ўдзельнічаў у рабоце органаў аховы грамадскага парадку.

І. М. Прусмі.

Першыя прафсаюзныя...

З успамінаў А. І. Белабржэўскага, былога намесніка старшыні Талачынскага райпрафсавета

Аляксандр Іосіфавіч Белабржэўскі нарадзіўся ў 1907 г. ў Смаленску. У 1920—30-я гады і ў пасляваенны час працаваў у Талачынскім раёне. У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1941 па 1945 г. быў на фронце. Жыве ў Талачыне.

Члены прэзідыума Талачынскага райпрафсавета (злева направа): у першым радзе — Караткевіч, Пархоменка, Белабржаўскі, Літвінка; у другім радзе — Андрэеў, Іваška, Каваленка.

Першыя прафсаюзныя арганізацыі на Талачыншчыне пачалі стварацца ў 1918 г. Гэта былі нешматлікія прафгрупы, у якія ўваходзілі работнікі ўстаноў Талачына, супрацоўнікі лясніцтваў, саўгасаў, а таксама тыя, хто працаваў у прыватных прадпрымальнікаў.

З утварэннем раёна ў 1924 г. ўзнікла і прафсаюзная арганізацыя, выбрана раённае бюро прафсаюзаў, пазней ператворанае ў раённы Савет прафсаюзаў. Першым старшынёй райпрафбюро быў выбраны тав. Кавальчук. Раённая прафсаюзная арганізацыя аб'ядноала 14 галіновых прафсаюзаў з агульнай колькасцю 900 членаў прафсаюза. Найбольш шматлікімі прафарганізацыямі былі «Усеработзямлес» (аб'ядноўваў работнікаў саўгасаў, лясніцтваў, сельскай кааперацыі), служачых савецкага гандлю і гарбароў.

Галоўнай задачай прафсаюзаў было ўкараненне ў жыццё Кодэкса законаў аб працы, барацьба з беспрацоўем, ліквідацыя непісьменнасці, асабліва сярод батракоў і пастухоў. На працягу 1928—29 гг. прафсаюзам сельгасрабочых (былы «Усеработзямлес») узбуджаны шэраг судовых спраў супраць кулакоў з вёсак Ляхі, Сторшчына, хутароў Шаванды і іншых за парушэнне заканадаўства аб працы. Вінаватыя пацеслі справядлівую кару.

Прафсаюзы раёна аказвалі істотную дапамогу ва ўмацаванні Савецкай улады, арганізацыі калгасаў, у выкананні планаў збожжанарыхтовак. Прафсаюзныя арганізацыі Азерацкага лесазавода, Талачынскіх крухмальнага і гарбарнага заводаў былі ў раёне ініцыятарамі датэрміновага выканання планаў першай пяцігодкі, сацыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху. На працягу 1933—34 гг. было праведзена больш за 60 масавых нядзельнікаў на будаўніцтве аўтамагістралі Масква — Мінск. Шмат сіл аддавалася таксама развіццю культуры, арганізацыі адпачынку і паляпшэнню дабрабыту працоўных раёна.

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ТАЛАЧЫНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА АБ СТАНЕ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ Ў РАЁНЕ

26 ліпеня 1925 г.

Заслушав доклад заведующего районо, пленум РИКа признает работу района за 1924/25 учебный год удовлетворительной и для осуществления на факте работы по поднятию на должную высоту дела народного образования в районе, пленум РИКа считает:

1) Утвердить постановление президиума РИКа в отношении установления школьной сети по сельсоветам на 1925/26 г.

2) Предложить президиуму РИКа проектируемое увеличение школ в наступа-

ющем учебном году настойчиво защищать при рассмотрении в округе и добиться утверждения данного проекта.

3) Одобрить постановление президиума РИКа в отношении отпуска 800 р. для ремонта сельских школ, но учитывая, что указанной суммы на эти надобности далеко не достаточно, считать необходимым привлечь само население к работе по ремонту школ.

4) Объявить по району 2-недельник по ремонту школ с 15 августа по 1 сентября 1925 г., для чего предложить сельсоветам совместно с заведующими сельских школ провести указанную работу, закончив к 1 сентября сего года, рационально использовать отпущенные для этой цели денежные суммы.

5) Предложить сельсоветам в период проведения 2-недельника заключить договора на арендуемые школьные помещения, руководствуясь инструкцией и указаниями районо.

Учитывая недостаточную активность некоторых школьных работников, предложить районо дать последним соответствующую нагрузку по общественной работе средя широких мас населения (Резолюция принята единогласно).

ДА Віцебскай вобласці, ф. 1779, воп. 1, спр. 36, л. 64—65.

Калгасная партячэйка

З успамінаў М. А. Рашэтнікава

М. А. Рашэтнікаў.

Мікіта Арцёмавіч Рашэтнікаў нарадзіўся ў 1898 г. ў в. Стары Талачын. Член КПСС з 1919 г. З 1911 да 1917 г. працаваў па найму ў памешчыка, потым рабочым на вінакурным заводзе ў Талачыне. У 1919—21 гг. у Чырвонай Арміі, у складзе 16-й стралковай дывізіі імя Кіквідзе ўдзельнічаў у баях на Паўднёвым і Заходнім франтах. Потым узначальваў камітэт вясковай беднаты, а з 1922 да 1929 г. працаваў на крухмальным заводзе ў Талачыне. З 1929 г. намеснік старшыні калгаса «XII з'езд КП(б)Б», дырэктар саўгаса «Райцы», у 1932—37 гг. дырэктар крухмальнага завода ў Плешчаніцах Мінскай вобласці. З 1938 да 1941 г. другі сакратар Мастоўскага, потым Мірскага райкомаў КП(б)Б. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, старшы палітрук артылерыйскага палка. Быў паранены, кантужаны. Пасля вайны другі, першы сакратар Мірскага райкома КП(б)Б, старшыня Суражскага райвыканкома. Калі пайшоў на заслужаны адпачынак, пераехаў на радзіму ў Талачын. Вёў вялікую грамадскую работу — узначальваў партыйную камісію пры Талачынскім РК КПБ. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і 5 медалямі. Памёр у 1977 г.

У пачатку 1929 г. на базе двух таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі ў былых памешчыцкіх маёнтках Юзафполле і Зарэчча быў створаны калгас «XII з'езд КП(б)Б». У сельгасарцель першымі ўступілі працалюбівыя сем'і Васілеўскіх, Баравулевых, Баравоўскіх, Франца і Міхаіла Ярашэвічаў, Кучынскіх, Жванскіх і іншыя.

У 1930 г. для перабудовы сельскай гаспадаркі партыя накіравала ў вёску 25 тысяч прадстаўнікоў рабочага класа. Сакратар Талачынскага РК КП(б)Б Шафранскі выклікаў мяне і камуніста Захара Тарасевіча і паведаміў, што рашэннем Аршанскага павятовага камітэта партыі мы мабілізаваны ў Юзафполле і Зарэчча для правядзення калектывізацыі.

З усведамленнем высокай адказнасці ўзяліся мы за выкананне партыйнага даручэння. У гутарках з сялянамі мы тлумачылі ленінскі кааператыўны план, расказвалі аб перавагах калектыўнага вядзення гаспадаркі. Неўзабаве каля 80 сем'яў з Юзафполля і Зарэчча ўвайшлі ў калгас. Старшынёй праўлення выбралі Захара Тарасевіча, а мяне — намеснікам. Членамі праўлення былі Франц Ярашэвіч, Пётр Зайцаў, Мальвіна Бабіцкая. Неўзабаве ў калгасе «XII з'езд КП(б)Б» была створана партыйная ячэйка, у яе ўвайшлі Т. Пушкін, А. Дальніковіч, І. Свянціцкі, Б. Красніцкі, З. Тарасевіч. Абавязкі сакратара партячэйкі ўсклалі на мяне.

Перад партыйнай арганізацыяй стаяла адказная задача — усімі формамі палітычнай барацьбы забяспечыць арганізацыйнае ўмацаванне арцелі, праводзіць выхаваўчую работу

сярод хлебаробаў у духу калектывізму. Вернымі памочнікамі камуністаў былі М. Бабіцкая, М. Рашэтнікава, П. Зайцаў. Перадавыя, найбольш свядомыя юнакі і дзяўчаты ўступілі ў камсамол, сярод іх Мікалай Ярашэвіч, Яніна Жванская, Цімафей Сафроненка і іншыя. Першым сакратаром камсамольскай ячэйкі быў Станіслаў Кучынскі.

Камуністы і камсамольцы стараліся цікава арганізаваць адпачынак хлебаробаў. У клубе амаль кожны тыдзень чыталіся лекцыі і даклады на палітычныя тэмы, часта давалі канцэрты самадзейныя артысты.

Калгаснікі нават у першы год пасля стварэння сельгасарцелі дабіліся пэўнага поспеху. Быў вырашчаны неблагі ўраджай збожжавых, бульбы, агародніны і садавіны, калгасны пчальнік у трыццаць вулляў даў добры медазбор. А якой радасцю засвяціліся вочы сумленных працаўнікоў, калі на полі з'явіўся трактар «фардзон». Першымі трактарыстамі былі калгаснікі А. Тарасевіч і Е. Шашыла. У 1929 г. калгас «XII з'езд КП(б)Б» быў удзельнікам Усебеларускай сельскагаспадарчай выстаўкі. Жывёлагадоўля яго была прадстаўлена племяннымі жарабцамі, экспанаваліся дасягненні ў вырошчванні агародніны і пчалярстве. Быў прадстаўлены і сельгасінвентар, выраблены ў гаспадарцы. А як узнагароду за сваю працу ў наступным годзе сяляне атрымалі пяць новых трактароў «фардзон». Савецкая ўлада стварыла вялікія магчымасці для шырокага ўдзелу ў кіраванні гаспадаркай, грамадскімі справамі жанчыны-працаўніцы. Членам Талачынскага райвыканкома Саветаў дэпутатаў працоўных выбіралася Мальвіна Бабіцкая, актыўна ўдзельнічалі ў вырашэнні ўсіх спраў Валянціна Янчэўская і Фядосія Цяцеркіна. У калгасе дзейнічалі саюз бязбожнікаў, МОПР, Асаавіяхім і іншыя грамадскія арганізацыі, работу іх накіроўвалі камуністы.

Камсамол Талачыншчыны ў гады першай пяцігодкі

З успамінаў былога сакратара Талачынскага райкома ЛКСМБ, члена КПСС з 1928 г. П. В. Цішурава

Група членаў Талачынскага РК ЛКСМБ. У верхнім радзе трэці злева — першы сакратар райкома камсамола П. Цішураў. Здымак 1930 г.

Што ўяўляў сабой у канцы дваццатых гадоў Талачынскі раён? Гэта быў тыповы сельскагаспадарчы край. У пачатку 1-й пяцігодкі ў вёсцы пераважалі індывідуальныя сялянскія гаспадаркі. Саўгасы «Крывое», «Райцы» і «Скрыншчына» былі маларэнтабельнымі. Праўда, па ўраджайнасці збожжавых, бульбы і асабліва лёну раён у рэспубліцы быў перадавым. Прамысловасць Талачыншчыны ў той перыяд была прадстаўлена крухмальным заводам, Азерацкім лесапільным заводам, некалькімі саматужнымі прамысловымі арцелямі. І хаця прадпрыемствы знаходзіліся ў раённым цэнтры і яго аколіцах, моладзь Талачына пакутавала ад беспрацоўя.

З культурных устаноў у Талачыне былі тры школы (беларуская, польская, яўрэйская), народны дом і бібліятэка. Рэгулярнага кінаабслугоўвання не было. Кінафільмы дэманстраваліся ад выпадку да выпадку адзінай на ўвесь раён кінаперасоўкай.

У канцы 1928 г. раённая камсамольская арганізацыя налічвала каля 600 чалавек, аб'яднаных у 18 камсамольскіх ячэек. У іх ліку былі 2 чыгуначныя, 2 саўгасныя, 12 сельскіх і 2 змешаныя. У самім Талачыне былі 2 ячэйкі — прафсаюзная і сельсавецкая.

Асноўную ўвагу ў сваёй рабоце камсамольскія ячэйкі ўдзялялі палітычнаму выхаванню насельніцтва. У асенне-зімовы перыяд рэгулярна праводзіліся заняткі палітгурткоў і палітшкол. На камсамольскіх сходах абмяркоўваліся агульнапалітычныя пытанні, рашэнні партыі і ўрада. Камсамольцам растлумачвалася контррэвалюцыйная сутнасць троцкізму і правага ўхілу. На канкрэтных фактах класавай барацьбы ў вёсцы камсамольцы выхоўваліся ў духу стойкасці, непрымірымасці да кулацтва і яго прыхвасняў.

У 1928—29 гг. камсамольскія ячэйкі праводзілі адбор камсамольцаў на будаўніцтва Сталінградскага трактарнага завода і «Магнітки». Па пуцёўках ЦК ЛКСМБ туды накіроўваліся лепшыя камсамольцы. Іх кандыдатуры ўсеба-

кова абмяркоўваліся і толькі пасля зацвярджэння райкомам камсамола ім уручаліся пуцёўкі. Вялікую работу праводзілі ячэйкі па збору сродкаў на барацьбу з дзіцячай беспрытульнасцю і для падшэфнага Беларускаму камсамолу лінкора «Парыжская камуна». З гэтай мэтай рэгулярна праводзіліся камсамольскія суботнікі на разгрузцы дроў на чыгуначных станцыях і бульбы для крухмальнага завода. Сельскія камсамольцы збіралі сродкі сярод моладзі і насельніцтва. Зімой 1929 г. за кошт сабраных сродкаў для лінкора «Парыжская камуна» на гэта судна быў камандзіраваны наш прадстаўнік камсамолец Радкевіч, які азнаёміўся з баявой вучобай, бытам і жыццём матросаў лінкора. Вярнуўшыся з паездкі, Радкевіч многа разоў выступаў перад камсамольцамі, дзяліўся сваімі ўражаннямі. Падобнага роду паездкі адыгрывалі вялікую ролю ў ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. Большасць камсамольцаў актыўна ўдзельнічала ў рабоце добраахвотнага таварыства Асаавіяхім.

Бурліла камсамольскае жыццё ў вёсцы. Члены ВЛКСМ аказвалі дзейсную дапамогу сельскім Саветам у зборы падаткаў і страхавых узносаў, збожжанарыхтоўках, распаўсюджванні дзяржаўных пазык і г. д. У 1929—30 гг. шырокі размах атрымала работа груп «лёгкай кавалерыі», дзейнасць якіх у многім была падобна на цяперашні «Камсамольскі пражэктар». Гэтыя групы выкрывалі недахопы і злоўжыванні ў рабоце ўстаноў і арганізацый, паведамлялі пра гэта райкому камсамола. Зімой 1929 г. пяць членаў груп «лёгкай кавалерыі» Талачынскага раёна прымалі ўдзел у рабоце Першага ўсебеларускага злёту «лёгкай кавалерыі».

Многія сем'і камсамольцаў з'яўляліся членамі розных кааператыўных аб'яднанняў — меліярацыйных, машынных, крэдытных і іншых таварыстваў, якія былі важнай ступенькай на шляху да масавай калектывізацыі. Ва ўсіх таварыствах у складзе членаў іх праўленняў былі камсамольцы. Яны многа рабілі для паляпшэння дзейнасці кааператыўных аб'яднанняў.

Калі ў раёне пачалася масавая калектывізацыя, перад камсамоллю паўсталі новыя адказныя задачы. У студзені 1930 г. ва ўсіх камсамольскіх ячэйках былі праведзены сходы, рашэнні якіх абавязвалі камсамольцаў зрабіць усё, каб іх сем'і ўступілі ў калгасы. У лютым 1930 г. райком камсамола правёў раённы злёт камсамольцаў і моладзі, на якім абмяркоўваліся пытанні правядзення калектывізацыі. Асноўным на гэтым злёце быў лозунг «Кожны камсамолец і яго сям'я — члены калгаса». Злёт быў многалюдным і прайшоў з вялікім уздымам. На ім прысутнічала больш як 400 камсамольцаў і несаюзнай моладзі. На гонар сельскім камсамольцам можна сказаць, што пераважная большасць іх разам з сем'ямі да вясны 1930 г. сталі членамі калгасаў. У раёне было нямала выпадкаў, калі камсамольцы пакідалі свае сем'і і ўступалі ў калгасы ў іншых вёсках з-за таго, што іх бацькі адмаўляліся стаць калгаснікамі, і вярталіся дадому пасля таго, як іх сем'і ўступалі ў сельгасарцель. У сувязі з ломкай старога ўкладу жыцця ў сем'ях камсамольцаў былі і іншыя драматычныя выпадкі.

У ходзе калектывізацыі сельскія камсамольцы пастаянна дапамагалі праўленням новых калгасаў абагульняць рабочую жывёлу, сельскагаспадарчыя прылады, збіраць пасенне для правядзення сяўбы. Сумесна з камуністамі камсамольцы растлумачвалі сялянам пастановы ЦК ВКП(б) па пытаннях калектывізацыі і дапушчаных у ходзе яе скажэннях. Вясной 1930 г. ў час сяўбы і летам у перыяд уборкі ўраджаю з вялікім уздымам працавалі камсамольцы на калгасных палях. Яны былі завадатарамі многіх карысных спраў. Па іх ініцыятыве ствараліся звенні і брыгады па ахове пасеваў ад патрай, а ўраджаю — ад пажараў і раскрадання. У Варанцэвіцкай, Навасельскай і іншых камсамольскіх ячэйках праводзіліся маладзёжныя суботнікі па будаўніцтву сіласных ям і траншэй. Нягледзячы на тое, што ў калгасах амаль не было ніякай механізацыі і ўсё рабілася ўручную, асноўныя сельскагаспадарчыя работы выконваліся своечасова, а па якасці значна лепш, чым пры індывідуальным вядзенні гаспадаркі.

Гісторыя аднаго пасведчання

У камсамольца трыццатых гадоў Белабржэўскага як успамін аб далёкіх днях неспакойнага юнацтва захаваўся цікавы дакумент. Пажаўцелы ад часу квадратны аркуш паперы са штэмпелем і з пячаткай. Амаль выцвілы, надрукаваны на машынцы тэкст:

Пасведчанне. Выдадзена дэлегацыі маладых калгаснікаў-ударнікаў Талачынскага раёна (БССР), пасланай Талачынскай МТС і райкомам ЛКСМБ, у тым, што яна накіроўваецца па маршруту Талачын — Севастопаль для экскурсіі і азнаямлення з падшэфным лінкорам «Парыжская камуна».

Адначасова дэлегацыя робіць прыпынкі ў Мінску, Харкаве, а на зваротным шляху на Дняпрагэсе і ў Маскве для азнаямлення з сацыялістычным будаўніцтвам пралетарскіх цэнтраў.

Просьба да ўсіх арганізацый і устаноў аказваць дэлегацыі усямернае садзейнічанне. Склад

Дэлегацыя перадавых калгаснікаў-ударнікаў Талачынскага раёна сярод чырванафлотцаў лінкора «Парыжская камуна».

дэлегацыі 12 чалавек: тт. Мінкіна, Сакалоўскі, Буз, Кудзін, Пашкевіч, Вілячэр, Белаборжаўскі, Міснік, Асіповіч, Кавалеўская, Казіміраў.

Адказны за дэлегацыю т. Сакалоўскі.
Што подпісамі і прыкладаннем пячаткі засведчана.
Начальнік Палітаддзела
Талачынскай МТС Мінкіна
Сакратар Талачынскага РК ЛКСМБ Сакалоўскі

А было гэта так: у пачатку трыццатых гадоў камсамол Беларусі шэфстваваў над лінкорам «Парыжская камуна». Актыўна ўдзельнічалі ў гэтай рабоце камсамольцы Талачынщчыны. Яны перапісваліся з маракамі, дапамагалі ў арганізацыі і рабоце падсобнай гаспадаркі карабля пад Севастопалем. Для гэтай гаспадаркі асобныя камсамольскія ячэйкі вырошчвалі збожжавыя, бульбу. У Севастопаль былі адпраўлены коні, некалькі галоў свіней. Камсамольцы лесазавода ў выхадныя дні падрыхтавалі і адправілі шэфам вагон піламатэрыялаў. За актыўны ўдзел у шэфскай рабоце група перадавікоў і была заахвочана паездкай да ваенных маракоў. *А. А. Шчэйдар.*

ПАСТАНОВА АГУЛЬНАГА СХОДУ ГРАМАДЗЯН ВЕСКІ ВЯЛІКАЕ ГАЛОШАВА КОХАНАЎСКАГА РАЁНА АБ АРГАНІЗАЦЫІ СЕЛЬГАСАРЦЕЛІ

16 лютага 1930 г.

Батраки, бедняки и середняки дер. Большое Голошево Кохановского района добровольно объединяются в сельскохозяйственную артель, чтобы общими средствами производства и общими организованными силами построить крупное коллективное хозяйство и таким образом обеспечить действительную и полную победу над кулаком и над всеми эксплуататорами трудящихся, полную победу над нуждой, темнотой, над отсталостью мелкого единоличного хозяйства, создать высокую производительность труда и товарность коллективного хозяйства. На основании этого и подписываемся: Малашкевич Янка, Мусянкович Никипор, Сивцов Михась, Завацкий Алесь, Шейка Акулина, Дубняга Евгения, Шкрабов Василь. Филиппов Егор, Мусянкович Николай, Мусянкович Фекла, Мусянкович Флор, Мусянкович Семен, Филимонович Николай, Завацкая Евдокия, Тимашков Роман, Пунченко Татьяна, Чапамец Казимир, Касперский Егор, Шашалевич Леон, Шашалевич Николай, Шугалов Максим, Беляков Иван, Беляков Матвей, Малашкевич Татьяна, Филимонович Татьяна.

ДА Віцебскай вобл., ф. 1908, воп. 1, спр. 15, л. 60, Арыгінал. Рукапіс.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ТАЛАЧЫНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА АБ АКАЗАННІ ДАПАМОГІ КАЛГАСУ «12-ГОДДЗЕ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ» ДРУЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

8 мая 1931 г.

Прэзідыум райвыканкома канстатуе, што даякуючы разгорнутай у апошні час масавай працы па падрыхтоўцы да вясенняй пасяўной кампаніі, разгортванню самога севу адбыўся повы масавы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

у калгасы раёна, што выклікала шалёную кулацкую агітацыю супраць калгаснага будаўніцтва і паспяховага правядзення вясенняй сяўбы, перайшоўшую ў агідную вылазку раз'яронага кулацтва, выразіўшуюся ў падпале калгаса «12-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі» ў ноч на 7 мая, у выніку чаго знішчаны абагуленыя будынкі, увесь пасеўматэрыял, сельскагаспадарчыя машыны і прылады, рабочыя коні ў ліку 16 штук і іншая маёмасць калгаса з агульным коштам страт да 20 тыс. руб. Гэтым самым калгас пастаўлен перад фактам зрыву вясенняй сяўбы.

Выходзячы з вышэйадзначанага, прэзідыум РВК даручае райпракурору ў самым тэрміновым парадку ўтварыць следства гэтай справы і вінаўных прыцягнуць да самай стражайшай адказнасці, зрабіўшы працэс у паказальным парадку.

У мэтах аказання патрэбнай дапамогі пагараўшаму калгасу і забеспячэння яго пасеўматэрыялам, сельгасінвентаром, рабочай цяглавай сілай і іншымі сродкамі вытворчасці на падставе тэлеграфнага распараджэння ўпаўнаважанага СНК па пасеўкампаніі выдаць з Саюзхлеба пасеўматэрыялу — аўса 300 п., ячменю 55 п.; з Каапсаюза — ільнасемені 66 п., канапель 7 п., канюшыны 8 п., вікі 72 п., з сельгасінвентару — павозак аднаконных 5, параконных 3, 5 камплектаў вупражы, сеялку; з Спажыўсаюза — 5 камплектаў вупражы; перадаць з быўшага аграпункта плугоў 2, барон 1, даручыўшы Каапсаюзу пры атрыманні ўборачных машын у першую чаргу задаволіць такавымі гэты калгас.

Улічваючы, што ў калгасе згарэла 16 коней і што з цяглавай сілай справа абстаіць вельмі востра, перадаць калгасу па ацэнцы коней: з РВК 1, Белмяса 4, міліцыі 1, Саюзхлеба 1, Спажыўсаюза 1, аддзялення банка 1, з поўнымі камплектамі вупражы. Даручыць райза, Калгассаюзу, Саколінскаму сельсавету правесці рад практычных мерапрыемстваў у гэтым калгасе, забяспечыўшы новы масавы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, правёўшы па-баявому вясенні сеў у калгасе, яшчэ раз даказаўшы моц калгаснага будаўніцтва і пераважнасць калгасаў над аднаасобнай дробнай гаспадаркай.

Прэзідыум РВК зварочвае ўвагу ўсіх сельсаветаў, саўгасаў, калгасаў на гэту агідную вылазку класавага ворага і прапануе зрабіць адпаведны вынік, устанавіць стражайшую ахову маёмасці саўгасаў і калгасаў, наладзіць надзейную рэгулярную варту як па калгасах, саўгасах, так і па населішчах раёна. Адначасова з гэтым разгарнуць масавую кампанію вакол гэтай вылазкі класавага ворага пад знакам яшчэ большага згуртавання шырокіх рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас на паспяховае правядзенне вясенняй сяўбы ў вызначаны тэрмін, арганізуючы новы магутны прыліў у калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і арганізацыю новых калгасаў, ажыццяўляючы лозунг «Суцэльная калектывізацыя і на яе базе ліквідацыя апоры міжнароднага капітала — кулацтва як класа».

Складзены страхінспектарам акт лічыць правідловым, у мэтах хутчэйшага аднаўлення знішчанай маёмасці прасіць НКФ аб тэрміновым зацвярджэнні гэтага акта і выплаціць узнагароду.

Даручыць тав. Геўрасёву і Трыфсіку напісаць па гэтаму пытанню ўсім сельсаветам, саўгасам і калгасам пісьмо, у якім завастрыць увагу ўсіх сельсаветаў, кіраўнікоў саўгасаў і калгасаў і ўсёй савецкай грамадскасці на пільнасць класавай чуткасці, мабілізуючы рабочых, калгаснікаў, бядняцка-серадняцкія масы супраць шкоднай дзейнасці варожага элементу, за лепшае правядзенне вясенняга севу, за магутнае разгортванне ўдарніцтва, спаборніцтва, за адпрацоўку выхадных і прадпічных дзён у карысць папярэдняга калгаса.

Даручыць упаўнаважанаму па вясенняй пасяўной кампаніі тав. Жукоўскаму забяспечыць выкананне гэтай пастановы.

ДА Віцебскай вобл., ф. 1906, воп. 1, спр. 17, л. 66. Заверэная копія.

Шляхі змагання

З артыкула адказнага рэдактара газеты «Калгаснік Талачыншчыны» М. Росіна

Сакавік 1931 года... У гэты перыяд арганізуецца ў раёне шматтыражка пад назвай «Калгаснік Талачыншчыны».

...Рашэнне аб арганізацыі шматтыражкі было прынята на бюро РК КП(б)Б 26 лютага 1931 г. У склад рэдкалегіі ўвайшлі тт. Росін (адказны рэдактар), Піменаў, Аўсеенка, Любчанскі і Кандрацюк.

Матэрыяльную базу падвялі. Хутка створан быў каштарыс (300 руб.), суму размеркавалі паміж усімі «грашовымі» арганізацыямі, набылі паперу ў інваліднай кааперацыі, а шапірографы і рататары ўсіх устаноў райцэнтра былі ў поўным распараджэнні рэдкалегіі.

Некаторым пакажацца дробяззю сам працэс выдання шматтыражкі, але ў гадавіну існавання нашай газеты «К. Т.», калі яна ўжо распаўсюджваецца тыражом у 4000 экз., друкаваная і абрасла двумястамі актыўна ўдзельнічаючых у ёй рабселькораў, не мяшае акунуцца ў мінулае будняў нашай газеты, гэтым паказваючы не толькі сам працэс выдання, але і сам працэс росту, уздыму і развіцця раённага друку.

Уявіце сабе пакой у ніжнім паверсе былога будынка райкома і РКК-РСІ (дзе зараз аддзяленне Дзяржбанка). На сталах раскідана разрэзаная папера, рататары, густа намазаныя чорнай фарбай, падрыхтавана чакаюць «друкавання», побач у другім пакойчыку... рэдагуецца матэрыял для першага нумару газеты, які арганізаваўся самой рэдкалегіяй з завода, допісаў адказных працаўнікоў, а на пішучай машынцы па чарзе «добраахвотнікі» друкуюць перапрацаваныя допісы. Сябры рэдкалегіі хто дыктуе машыністкам, хто разразае паперу, папраўляе допісы, а тав. Бярозкін, адзіны штатны працаўнік шматтыражкі, «друкуе» на рататары насычаныя матэрыялам лісты «К. Т.». Праца напружаная, «пот ліецца градам», а да раніцы 15 сакавіка ў Талачыне выйшаў першы нумар «К. Т.» тыражом у 200 экз., кожны ў колькасці 5 аркушаў (у выглядзе часопіса).

Усе 200 экз. былі дасланы па 1 экз. ў сельсаветы, калгасы і саўгасы раёна. Праз некалькі дзён рэдкалегія атрымала нараду з першымі допісамі рабселькораў і рад «пратэстаў» аб надзвычайна нізкім тыражы газеты...

Такім парадкам быў выдадзены і другі нумар. Але запатрабаванні да друкаванага бальшавіцкага слова раслі, пачалі сыпацца, у натуральным сэнсе гэтага слова, рабселькораўскія допісы з усіх куткоў раёна. Нельга было ўжо абмежавацца тыражом у 200 экз. Раён уступіў у рашаючыя дні севу. Паўстала ва ўпор пытанне аб пераходзе на друкаваную газету. Бюро РК аформіла гэты пераход, паставіўшы пытанне перад ЦК КП(б)Б. 2 красавіка пастановай Сакратарыята ЦК КП(б)Б нашаму раёну дазволілі выданне газеты, прымацаваўшы да Аршанскай друкарні...

Газета «Калгаснік Талачыншчыны», 22 сакавіка 1932 г.

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ТАЛАЧЫНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА АБ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАННІ КАЛГАСАЎ

13 лютага 1932 г.

Заслухаўшы даклад тав. Зянько аб арганізацыйна-гаспадарчым замацаванні калгасаў, пленум райвыканкома канстатуе:

1) Маючыя поспехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі раёна, калектывізавана 72 % бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, ці 77 % да пахаты. Раён дасягнуў суцэльнай калектывізацыі і на гэтай базе ліквідуе кулацтва як клас. Перавод сельскай гаспадаркі на рэйкі буйнога сацыялістычнага земляробства ўжо забяспечыў значныя поспехі ў сельскагаспадарчай вытворчасці, пашырэнне пасяўных плошчаў, пашырэнне плошчаў пад тэхкультуры на 42 % у параўнанні з мінулым годам.

2) Калгасы ў правядзенні вясновай сяўбы, уборачнай кампаніі і асенняй сяўбы паказалі рад далейшых пераваг буйной калектыўнай гаспадаркі над дробнай аднаасобнай гаспадаркай.

3) Аднак пленум РВК з усёй рашучасцю падкрэслівае, што дасягнутыя поспехі ў арганізацыі калгаснай вытворчасці з'яўляюцца толькі яшчэ першапачатковымі. Не выконваюцца тыя магчымасці развіцця высокатаварнай гаспадаркі,

асноўнай задачай з'яўляецца арганізацыйна-гаспадарчае замацаванне калгасаў, умацаванне і авалоданне агратэхнікай, правільнай расстаноўкі працоўнай сілы, пераход па ўсіх галінах на здзельшчыну і ліквідацыя абязлічкі...

4) На ажыццяўленне ўсіх мерапрыемстваў і падрыхтоўку да 2-й балышавіцкай вясны ёсць усе магчымасці, арганізавана МТС, якая абслугоўвае 6 саветаў. МТС іграе велізарнейшую ролю ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі пераходам на важнейшую тэхніку і машынізацыю сельскай гаспадаркі.

5) Пры правядзенні чарговых задач і мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчаму замацаванню калгасаў [...] заможна-кулацкая і варожая частка, пралезшая ў калгасы, вядзе шалёнае супраціўленне гэтым важнейшым мерапрыемствам, пераход на кулацкі тэрор, гэтым прама выяўляючы свой класава-варожы, чужды твар (убійства актыўнага калгасніка — старшыні рэўкамісіі т. Шыдлоўскага Івана, які ўвесь час змагаўся за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў) [...].

Гэты выпадак яшчэ раз кажа аб нашай пільнасці, мабілізацыі калгасна-бядняцка-серадняцкіх мас, і за самаачыстку калгасаў ад кулацка-заможнай чуждай нам часткі.

6) За ўпартую барацьбу [...], за выкарчаванне дробна-буржуазных тэндэнцый і ядоцка-спажывецкіх настрояў, за правільную арганізацыю працы, аснованую на цвёрдых нормах выпрацоўкі, ацэненую ў працаднях, сапраўднае ўкараненне здзельшчыны, разгортванне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, правідловую арганізацыю ўліку працы і размеркаванне даходу выключна па колькасці і якасці працы, максімальнае разгортванне таварных галін гаспадаркі, узняцце ўраджайнасці, максімальны выхад таварнасці, як мінімальнае павышэнне ўраджайнасці па збожжавых культурах на 12 %, травы, тэхнічныя культуры на 15 %, па бульбе на 20 %.

...Правесці масава-растлумачальную працу сярод калгаснікаў аб значэнні калектыўнага вырошчвання (жывёлы) усімі калгасамі...

7) Вопыт работы значнай часткі калгасаў паказаў, што дзе добра і правільна была арганізавана праца, там вышэй прадукцыйнасць працы, своечасова выконваліся вытворчыя заданні, менш было страт, атрыманы большы даход. Прыклад: калгас «Ленінскі шлях» Воўкаўскага сельсавета ў сярэднім падае на гаспадарку жыта і яравых культур 14—15 цэнтнераў, грашыма 170 руб., калгас «Гай» Лясянскага сельсавета 16—17 цэнт.

Побач з гэтым, там, дзе няма здзельшчыны, пануе абязлічка, безгаспадарчасць, калгас «Новы быт» гэтага сельсавета згнаіў аўса. ншаніцы і з размеркаваннем кепскія выпадкі.

8) Пленум райвыканкома прапануе РКС[1] да 25 лютага 1932 г. закончыць канчатковае размеркаванне, засыпку пасенных і страхавых фондаў і ўтварэнне не датычашчыхся кармавых фондаў, да 1 сакавіка 1932 г. закончыць складанне вытворчых планаў, для чаго мабілізаваць усіх спецыялістаў, раённы і сельскі актыў для дапамогі калгасам, з 15 лютага па 24 лютага склікаюць інструкцыйную нараду старшынь і рахункаводаў і загадчыкаў ферм з разліку па 3 сельсаветы ў дзень.

9) Перавесці ўсе калгасы на здзельшчыну па ўсіх галінах, ліквідаваць абязлічку.

10) У мэтах паспяховага выканання ўсіх мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў пленум РВК катэгарычна патрабуе ад РКС і сельсавета пераключэння на аператыўнае кіраўніцтва ў штодзённай сваёй працы.

Старшыня Талачынскага раённага
выканаўчага камітэта Козель
Сакратар Шаршун

ДА Віцебскай вобласці. ф. 1779. воп. 1. спр. 2, л. 26—27. Арыгінал.

[1] Райкалгассаюз.

За газетным радком

Па старонках газеты «Калгаснік Талачыншчыны»

10 жніўня 1931 г.

Камсамольская ячэйка пры калгасе «Чырвоная змена» Друцкага сельсавета падпісалася калектыўна на заём «Трэцяга рашаючага года пяцігодкі» на чатыры ста рублёў і выклікае на спаборніцтва Друцкую ячэйку КСМ.

1 верасня 1931 г.

Агульны сход сялян вёсак Лісоўшчына і Касперава Азерацкага сельсавета пастанавіў арганізаваць калгас «Імя 3-га рашаючага года пяцігодкі» з уцягненнем усіх беднякоў і сераднякоў гэтых вёсак. Сход выклікае вёску Канапельшчына паследаваць нашаму прыкладу.

2 сакавіка 1932 г.

27—28 лютага ў Талачыне адбылася 1-я раённая агразааканферэнцыя. Канферэнцыя прайшла з вялікай актыўнасцю калгасных, бядняцкіх, сераднякіх мас раёна. Канферэнцыя пастанавіла аграпаход працягнуць і пакінуць штаб, якому даручана праверка рэалізацыі канферэнцыі ў сельсаветах і калгасах.

22 сакавіка 1932 г.

Працоўныя раёна адзначылі гадавы юбілей з дня выхаду газеты «Калгаснік Талачыншчыны» (першы нумар выйшаў 15 сакавіка 1931 г.). У юбілейным нумары апублікаваны віншаванні газеце ад райкома КП(б)Б, РВК і райпрафсавета, райкома камсамола, рэдакцыі газет «Калгаснік Беларусі» і «Ленінскі прызыў» (Орша).

У калгасе «Рэспубліка» Палюдаўскага сельсавета арганізавана вытворчая брыгада веснавога севу імя газеты «Калгаснік Талачыншчыны».

12 мая 1933 г.

7 мая ў Высока-Гарадзецкі с. Савет прыехаў старшыня ЦВК СССР і БССР т. Чарвякоў. Т. Чарвякоў правёў гутарку з камуністамі, камсамольцамі, калгаснікамі аб ходзе сяўбы, указаўшы практычныя мерапрыемствы ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў і павышэнне ўраджайнасці. Калгаснікі запэўнілі тав. Чарвякова, што веснавая сяўба будзе праведзена ў самыя ўшчыльненыя тэрміны...

30 жніўня 1933 г.

Для дапамогі ў ліквідацыі прарыву на ўборцы і збожжапастаўках на Талачыншчыну прыехала агітбрыгада ЦК КП(б)Б і выязная рэдакцыя газеты «Рабочий». Агітбрыгада назаўтра ж выехала ў Коханаўскі с. с., дзе зараз выдаецца газета, а ўдзельнікі брыгады разышліся па калгасах. Выехала таксама ў калгасы група кавалёў па рамонту с.-г. інвентару. Робяцца кінасеансы, пастаноўкі. У адзнаку прыезду агітбрыгады калгасы арганізуюць чырвоныя абозы... Перадавыя калгасы раёна «Галадзеда», «Искра» і інш. таксама адзначаюць прыезд у раён агітбрыгады ЦК чырвонымі абозамі са збожжам і льнонасеннем...

ТЭЛЕГРАМА ТАЛАЧЫНСКАГА РК КП(б)Б І РАЙВЫКАНКОМА ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ АБ УКЛЮЧЭННІ РАЁНА У САЦСПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШЫ ЛЬНАВОДЧЫ РАЁН

1933 г.

Абгаварыўшы выклік калгаснікаў, працоўных аднаасобнікаў Бежыцкага раёна Маскоўскай вобласці [аб] спаборніцтве [на] лепшы льнаводчы раён, лепшую, хутчэйшую ўборку, выканання абавязацельстваў перад дзяржавай, калгаснікі, працоўныя аднаасобнікі Талачынскага раёна прынялі выклік Бежыцы, узяў [ва] сябе канкрэтныя абавязацельствы [па] праполцы, апрацоўцы, здачы дзяржаве прадукцыі льну высокай якасці, не ніжэй дванаццатага нумару 7 лістапада. Талачынскі раён [у] мінулай загатоўчай кампаніі быў у глыбокім прарыве, [на] чорнай дошцы. [У] час вясновага севу таксама быў [на] чорнай дошцы, [з] прычыны адсутнасці масавай работы. [У] сучасны момант разгорнута шырокая аргмасавая выхаваўчая работа [пад] лозунгам вывесці раён [з] адстаючых [у] адзін [а] перадавых раёнаў Беларусі, завяваць першынство [ва] усесаюзным спаборніцтве [на] лепшы льнаводчы раён. Другі райзлёт калгаснікаў-ударнікаў, склікаемы 7 ліпеня, праводзім [пад] гэтым лозунгам. Выклікаем усе льнаводчыя раёны Беларусі паследаваць прыкладу талачынскіх калгаснікаў, працоўных аднаасобнікаў уключыцца [ва] усесаюзнае спаборніцтва.

Сакратар РК КП(б)Б Славін
Старшыня райвыканкома Лоцманаў

ДА Віцебскай вобласці, ф. 1779, воп. 1, спр. 6, л. 45—46. Копія.

ІНФАРМАЦЫЯ АБ ВЫНІКАХ СПАБОРНІЦТВА СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ НА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА 1934/35 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

Кастрычнік 1934 г.

У выніку шырока праведзенай арганізацыйна-масавай работы Саветаў, актывізацыі культасветных секцый, дэпутацкіх груп у конкурс па Талачынскаму раёну ўключылася 27 сельсаветаў. На 1 кастрычніка 1934 г. па раёну маецца 27 культасветных секцый, якія аб'ядноўваюць 302 чалавекі, з іх жанчын — 102, што складае 30,8 %.

За час правядзення конкурсу мы маем добрыя прыклады работы секцый, дэпутацкіх груп, якія сваёй сістэматычнай дапамогай, прымацоўваннем членаў секцый да паасобных школ дабіліся скарэйшага і якаснага сканчэння будаўніцтва планавых школ, збору грошай, арганізацыі гарачых снеданняў і іншых. А менавіта:

1. Рамонт 30 школ скончан поўнасцю да 4 верасня 1934 г.

2. Новае пераходнае будаўніцтва 2-х планавых школ (Дарожкаўская 2-камплектовая і Замасцянская) закончана. Слабадская школа, якая па плану павінна закончыцца ў IV квартале, закончылася да 1 кастрычніка 1934 г. Па плану намечана пабудова двух планавых школ (Слаўнае, Талачын), што мяркуецца зрабіць у 1935 г. Непланавае будаўніцтва двух школ закончана. Такім чынам, 5 новабудуемых школ пабудавана.

3. Прыстасавана былых кулацкіх будынкаў пад школы 5 і заканчваюцца да 15 кастрычніка 1934 г. яшчэ 5.

4. Усяго школ па раёну, улічыўшы зноўпабудаваныя і прыстасаваныя з кулацкіх будынкаў — 146, з іх 1-га канцэнтра 116, 2-га — 29.

5. Мэбляй школы забяспечаны поўнасцю, з ліку якіх зроблена ў гэтым годзе: класных дошак 100 штук, стандартных сталоў з лаўкамі 700 штук і засталося зрабіць сталоў з лаўкамі 100 штук і 50 класных дошак, якія будуць зроблены да 15 кастрычніка 1934.

6. Падручнікамі школы забяспечаны такім чынам: выкуплена і размеркавана па школах падручнікаў на 60 тыс. руб., што, вядома, недастаткова, але прадстаўляе магчымасць забяспечыць вучняў больш менш здавальняюча. Пісьмовых прылад завезена і размеркавана па школах 200 тыс. спыткаў і 25 тыс. алоўкаў, а таксама чарніла і інш. прылады.

7. Апал школам завезен к 1 верасня 1934 г. толькі на 70 %, а апошні, які застаўся яшчэ ў лесе, будзе вывезен да 15 кастрычніка 1934 г.

8. Школы ўкамплектаваны вучнямі на 100 %, прычым увесь школьны ўзрост ахоплены поўнасцю.

9. Школы настаўніцтвам укамплектаваны не поўнасцю: патрэбна яшчэ матэматыкаў 3, літаратурных выкладчыкаў 4 і аднаго настаўніка 1 канцэнтра.

10. Культасветныя секцыі за час конкурсу правялі 68 пасяджэнняў і ў аснову сваёй штодзённай працы ўзялі ўмовы конкурсу на лепшую падрыхтоўку да навучальнага года, у выніку чаго работа секцый, іх актыўнасць аказала значную дапамогу ў заканчэнні будаўніцтва школ, як Дарожкаўская, дзе асноўную работу па заканчэнню школы ўзяла і выканала культасветная секцыя (нам. кіраўніка Пунінскі). Асабліва вялікую ўвагу секцыя звярнула на стварэнне матэрыяльнай базы школы (Дарожкаўская школа мае 1 тону збожжа і 2,5 тоны гародніны з школьнага ўчастка).

11. Вынікі конкурсу абгавораны на пасяджэнні конкурснай камісіі пры РВК і на пашыраным пленуме раённага выканаўчага камітэта, дзе за лепшую і своечасовую падрыхтоўку школ да новага навучальнага года, за сістэматычную дапамогу загадчыкам школ у падрыхтоўцы, укамплектаванні школ і забеспячэнні школ мэбляй і інш. прэміраваны старшыні сельсаветаў: Кручанскага — Пучкоў, Скуратаўскага — тав. Драздоў, Аленаўскага — Кароткін, Славенскага — Данілаў, Пярэвалацкага — Машкароў грашовымі ўзнагародамі, пры якіх секцыі добра правялі і выканалі ўзятыя імі абавязацельствы па конкурсу. Таксама прэміраваны грашовымі ўзнагародамі сябры і кіраўнікі культасветных секцый: за ўдарнае правядзенне конкурсу-спаборніцтва тт. Пунінскі, Сяргееў, Малашкевіч і Дубавец. Таксама прэміраваны 26 загадчыкаў школ, дырэктараў НСШ і ПСШ, а

разам з гэтым і настаўнікаў, якія праявілі сябе ў падрыхтоўцы школ к навучальнаму году і ў кіраўніцтве работай секцый. Усяго выдана грашовых прэмій па конкурсу вышэй адзначаным таварышам у суме 4500 рублёў.

Нягледзячы на дасягнутыя значныя поспехі па правядзенню конкурсу ў падрыхтоўцы школ да навучальнага года, маецца цэлы рад упушчаных недахопаў, а менавіта: яшчэ не поўнасцю школы забяспечаны апалам, недахоп настаўніцтва, малое разгортванне работы па распаўсюджванню друку, на што зараз мабілізавана ўся ўвага культсекцыі, культактыву, грамадскіх і прафсаюзных арганізацый на ліквідацыю гэтых недахопаў і завяршэння ўпушчанага ў бліжэйшыя дні.

Старшыня раённай конкурснай камісіі Чарткоў

ДА Віцебскай вобласці, ф. 1779, воп. 1, спр. 29, л. 287—288. Арыгінал.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ТАЛАЧЫНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА АБ АРГАНІЗАЦЫІ РАЁННАЙ КАЛГАСНАЙ ШКОЛЫ

19 лістапада 1934 г.

Прэзідыум Талачынскага райвыканкома пастанаўляе:

1. Раённую калгасную школу арганізаваць з 1 снежня 1934 г.
2. Перадаць пад РКШ і інтэрнат для курсантаў былыя будынкі с.-г. тэхнікума ў м. Коханава.
3. Даручыць т. Буселу прыёмку будынка — афармiць адпаведным актам.
4. Зацвердзіць кантынгент набору ў РКШ — 120 асоб.
5. Загадчыкам РКШ часова прызначыць тав. Князева.
6. Тав. Буселу падабраць выкладчыкаў.
7. Райза неадкладна даць указанне калгасам аб выдзяленні слухачоў у РКШ і прадуктаў харчавання і грашовых сродак з тым, каб заняткі распачаць у вызначаны тэрмін.
8. Утрыманне школы вытварыць згодна існуючага палажэння аб РКШ.
9. Пры разглядзе і зацвярджэнні раённага бюджэта на 1935 г. прадугледзець утрыманне раённай калгаснай школы на мясцовыя сродкі.

Нам. старшыні райвыканкома Чарткоў

Сакратар Васілеўскі

ДА Віцебскай вобласці, ф. 1779, воп. 1, спр. 24, л. 452. Арыгінал.

Памяці селькора Змітра Васілевіча Крывіцкага

Уночы з 6 на 7 студзеня рукой класавага ворага вырваны з нашых радоў лепшы рабселькор-ударнік Талачынскага раёна, дэлегат Усебеларускага з'езда рабселькораў таварыш Зміцер Васілевіч Крывіцкі.

Абнаглелы класавы вораг добра ведаў, на каго падымаў сваю руку. Увесь жыццёвы шлях Змітра Крывіцкага — гэта шлях нястомнай барацьбы... У раёне не знойдзецца ні аднаго селькора, які б не ведаў тав. Крывіцкага. Сотні калгаснікаў ведалі яго і па яго вострых заметках у газеце і па яго практычнай бальшавіцкай рабоце ў калгасе.

Жыццё тав. Крывіцкага — яркі прыклад таго, якім павінен быць селькор, як ён павінен змагацца за лінію партыі. Вось чаму кожны селькор Савецкай Беларусі павінен ведаць, як жыў, змагаўся і загінуў на баявым пасту селькор — камуніст Зміцер Крывіцкі.

Нарадзіўся Змітрок у сям'і спрадвечнага батрака ў маёнтку пана Градзялкоўскага. З малых гадоў Змітрок разам з бацькамі працаваў ад рання да позняй ночы на пана. Бацька Змітра, замораны голадам і нечуваными здзекамі, памёр у час імперыялістычнай вайны. Маці тав. Крывіцкага цяпер мае 68 гадоў, і, нягледзячы на свой узрост, яна з'яўляецца лепшай ударніцай калгаса «Забайкал».

1917 год. Кастрычнік. Былыя батракі сталі гаспадарамі маёнтка Градзялкоўшчыны. Змітру тады толькі што мінула 17 гадоў. Ён з'яўляецца адным з арганізатараў батрацкай камуны ў былым маёнтку. Але Змітру не доўга прыйшлося працаваць над умацаваннем маладой камуны. Белыя банды з усіх бакоў насядалі на маладую Савецкую Рэспубліку. Тав. Крывіцкі пакідае камуну і ідзе з вінтоўкай у руках абараняць заваяванні Кастрычніка.

1919 і 1920 гады. Тав. Крывіцкі ў радах

Чырвонай Арміі змагаецца супроць белапольскіх банд на Заходнім фронце, потым пападае на ліквідацыю бандытызму на Украіне, прымае ўдзел у разгроме контррэвалюцыі на Паўночным Каўказе. У 1923 годзе, калі пасля грамадзянскай вайны краіна прыступіла да гаспадарчага аднаўлення, тав. Крывіцкі вароцаецца ў родную вёску і з новым запалам бярэцца за работу.

Год за годам у жорсткай барацьбе з кулацтвам мацнее камуна. У камуну ўліваюцца бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі наўкольных вёсак. І камуна ператвараецца ў калгас «Забайкал». Старшынёй праўлення калгаса выбіраюць старэйшага камунара, лепшага камуніста — грамадскага работніка Змітра Крывіцкага.

Побач з «Забайкалам» знаходзіцца адзін з буйных калгасаў Пярэвалацкага сельсавета — калгас «6-ы з'езд Саветаў». Гэты калгас быў таксама арганізован пры актыўным удзеле т. Крывіцкага. У 1933 годзе ў гэты калгас пралезлі кулацкія і бандыцкія элементы, якія разбуралі гаспадарку з сярэдзіны. Калгас «6-ы з'езд Саветаў» у выніку кулацкай работы стаў самым адстаючым у сельсавеце.

Раённая партарганізацыя занялася справамі калгаса «6-ы з'езд Саветаў». Каб навесці ў калгасе парадак, рашылі паслаць туды старшынёй т. Крывіцкага. І тав. Крывіцкі ўвесь з галавою ўваходзіць у справу аздараўлення калгаса.

Першае, з чаго пачаў Змітрок сваю работу ў новым калгасе,— гэта выгнанне з калгаса кулакоў, зладзеяў і бандытаў Грышманаў, Раманкевічаў і іншых. Першую перамогу калгаснікі калгаса «6-ы з'езд Саветаў» атрымалі пад кіраўніцтвам тав. Крывіцкага ў веснавую сяўбу 1934 года.

Далей адну за адной калгас пачаў акуратна выконваць усе гаспадарча-палітычныя кампаніі, своечасова спраўляўся з уборкай ураджаю, датэрмінова выконваў дзяржаўныя паставкі і загатоўкі.

Таварыш Крывіцкі працаваў не адзін. Ён згуртоўваў вакол сябе актыў лепшых калгаснікаў. Ён арганізаваў у калгасе прыкладную баявую насценгазету. Насценгазета і селькоры былі ўвесь час лепшымі дапаможнікамі тав. Крывіцкага. Увосень мінулага года пленум РВК прысуджае Пярэвалацкаму сельсавету пераходны Чырвоны Сцяг РК і РВК, а тав. Крывіцкага, як аднаго з больш актыўных членаў прэзідыума сельсавета і як старшыню перадавога ў сельсавеце калгаса, узнагароджвае граматай ударніка і прэміруе гадзіннікам.

Уся работа і барацьба тав. Крывіцкага была цесна звязана з нашым бальшавіцкім друкам. Аб перамогах, недахопах, памылках, аб усіх канкрэтных вінаватых ён безупынна пісаў у насценную, раённую, цэнтральныя газеты. Ён моцна, едка, палітычна завостраны праз друк вытручваў усё нягоднае. Тав. Крывіцкі не толькі пісаў, ён дабіваўся, каб кожная яго заметка зрабіла сваю справу, каб па ёй былі прыняты патрэбныя меры.

6 студзеня 1935 года пад вечар бюро Талачынскага РК КП(б)Б слухала даклад тав. Крывіцкага аб становішчы і развіцці жывёлагадоўлі ў калгасе. Райком прызнаў работу добрай і даў указанні тав. Крывіцкаму, што трэба рабіць, каб к канцу 1935 года мець яшчэ лепшыя вынікі па жывёлагадоўлі.

Гадзін у 10 вечара, атрымаўшы баявую пуцёўку ад партыйнай арганізацыі раёна, тав. Крывіцкі паехаў дамоў. Дарога невялікая. Па шашы ад Талачына да калгаса «6-ы з'езд Саветаў» 12 кіламетраў. За чатыры кіламетры ад мястэчка Змітрок быў забіты, тупой халоднай зброяй па-зверску была раздроблена галава. Маладой, гарачай крывёю нястомнага барацьбіта — бальшавіка-селькора была залі та дарога і белы снег.

У гэту ж ноч, як толькі ў раёне даведаліся аб забойстве, пачалося расследаванне справы. К раніцы 7-га студзеня забойцы былі затрыманы. Аказалася — гэта выradкі разбітага, але недабітага класавага ворага — Раманкевіч Ермалай, Грышман Барыс і Раманкевіч Язэп.

Следства па забойстве Крывіцкага закончана. Віноўнасць Грышмана і двух Раманкевічаў поўнасцю ўстаноўлена. Забойцы знаходзяцца пад вартай.

Амаль ва ўсіх калгасах, саўгасах, на прадпрыемствах раёна адбыліся лятучыя мітынгі. Узмацненнем класавай пільнасці, бязлітаснай барацьбой з ворагамі і іх агентамі, узорнай арганізацыяй падрыхтоўкі да вясны адказалі калгаснікі, рэдкалегіі насценгазет і селькоры на забойства Змітра Крывіцкага.

У адказ на вылазку класавых ворагаў адпаасобнікі ўступілі ў калгасы, у адной толькі суседняй з калгасам «6-ы з'езд Саветаў» вёсцы Любатынь 17 беднякоў і серадняком на мітынгу заявілі аб уступленні ў калгас, а па раёну ў калгасы ўступіла звыш 200 аднаасобнікаў.

Пахавалі тав. Крывіцкага ў раённым цэнтры. На пахаванне сабраліся тысячы працоўных не толькі мястэчка, але і з многіх калгасаў раёна. Сям'і т. Крывіцкага раённыя арганізацыі аказалі дапамогу. Партарганізацыя Пярэвалацкага сельсавета і сельскі Савет узялі на сябе абавязацельства дапамагаць сям'і Крывіцкага выхаваць дзяцей Змітра такімі ж бясстрашнымі байцамі, якім быў іх загінуўшы бацька.

Зверскае забойства тав. Крывіцкага яшчэ і

яшчэ раз паграбуе ад нас, рабселькораў і работнікаў друку, быць больш пільнымі. Ніякай літасці да класавага ворага! Яшчэ лепш завострым наша селькораўскае пяро супраць класавых ворагаў, супраць іх агентаў — жулікаў, лодыраў, разгільдзяяў.

Прашчай, тав. Крывіцкі! Табе не ўдалось прысутнічаць на нашым з'ездзе. Але тысячы рабселькораў Савецкай Беларусі будуць, як ты, бязлітасна змагацца з астаткамі класавага ворага, змагацца за канчатковую перамогу сацыялізма.

Газета «Калгаснік Талачыншчыны», 28 лютага 1935 г.

Рапарт з'езду

З прамовы старшыні Талачынскага райвыканкома Конікава на XII Усебеларускім з'ездзе Саветаў

Талачынскі раён прыйшоў да раённага з'езда Саветаў з вялікімі дасягненнямі. Калгасны лад перамог канчаткова. 10 тысяч сялянскіх двароў аб'ядналы ў 201 калгас. За ўсімі калгасамі зямля замацавана на вечнае карыстанне. У раёне ёсць 2 МТС. На калгасных палях працуе 116 трактароў, якія апрацоўваюць 70 тысяч га з 86 тысяч, замацаваных за калгасамі...

Трактарыст тав. Сарачынскі, які прысутнічае на з'ездзе ў якасці дэлегата, даў 1207 га выпрацоўкі на трактары ХТЗ. За ім ідуць тт. Рабцаў, Салаўёў і дзесяткі іншых трактарыстаў МТС і саўгасаў.

Стаханаўка тав. Палякова Зіна...— удзельніца Усебеларускага злёту стаханаўцаў. Тав. Машкарова Наста. Даярка тав. Блажэвіч Ганна — дабілася ў сярэднім ад кожнай каровы 3,5 тыс. літраў малака і да 5 тыс. літраў на рэкордную карову.

Шматдзетным мацерам у Талачынскім раёне ўжо выдана 236 тыс. руб. дзяржаўнай дапамогі...

Да рэвалюцыі ў Талачынскім раёне было толькі 6 школ... Цяпер ў раёне 106 школ, у якіх вучыцца 14 тыс. дзяцей. 2,5 млн. руб. расходуюцца па раённаму бюджэту на асвету...

Па далёка няпоўнаму падліку наша калгасная вёска Талачынскага раёна дала краіне 37 урачоў.., 250 настаўнікаў, дзесяткі аграномаў і дзесяткі адказных работнікаў. У вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах вучыцца 400 чалавек.

Калі адбываўся XI Усебеларускі з'езд Саветаў, Талачынскі раён быў у ліку адстаючых раёнаў, займаў апошняе месца ў рэспубліцы... Да 4 лістапада раён выканаў план закупак хлеба, да 14 лістапада — выканаў план кантрактацыі льну, лён здан замест № 10 у сярэднім № 11...

Газета «Калгаснік Талачыншчыны», 27 лістапада 1936 г.

За газетным радком

Па старонках газеты «Калгаснік Талачыншчыны» (з 1938 «Чырвоны хлебароб»)

23 лютага 1937 г.

Асаавіяхімаўцы саўгаса «Лемніца» (10 чалавек) зрабілі 30-кіламетровы пераход у процівагазах па маршруту Лемніца — Талачын. Умовы для пераходу былі цяжкія — многа снегу. Але за 6 гадзін асаавіяхімаўцы падышлі да фінішу. Гэта пераход — у гонар XIX гадавіны слаўнай Чырвонай Арміі.

2 красавіка 1937 г.

30 сакавіка 9 лепшых стаханаўцаў сельскай гаспадаркі раёна выехалі ў Мінск на Усебеларускі злёт майстроў сацыялістычнага ўраджаю.

25 жніўня 1937 г.

Машыніст Талачынскай МТС тав. Марчэўскі Міхаіл і трактарыст Калінін Фама ў калгасе «Ударнік» Азерацкага сельсавета за суткі на машыне «БДО-34» намалацілі 28 тон хлеба. Гэта вышэйшы рэкорд у нашым раёне па малацьбе.

25 студзеня 1939 г.

Сёння выходзіць юбілейны — тысячны нумар нашай газеты. Газета друкуе прывітанні райкома КП(б)Б і райвыканкома і развароt з выступленняў селькораў.

18 лютага 1939 г.

У нашым раёне 3 МТС. З іх 2 арганізаваны ў 1937 г. Гэтыя МТС абслугоўваюць усе калгасы. Шмат трактароў навейшых сістэм, 14 камбайнаў, 40 трактарных сеялак, 30 ільнодерабілак, многа малатарняў і іншых машын — вось што накіроўваюць МТС для работы ў калгасах.

* * *

Больш як 900 жанчын працуюць на адказных пастах калгаснай вытворчасці ў раёне.

З іх 880 звеннявых, брыгадзіраў, трактарыстаў, старшынь калгасаў. Ёсць таксама жанчыны-камбайнёркі.

29—30 мая 1940 г.

28 мая стала першым днём масавага выхаду ўсіх калгаснікаў раёна на меліярацыйныя работы. Многія арганізацыі рушылі на работу па асваенню новых зямель, пераўтварэнню балот і хмызнякоў ва ўрадлівыя палі і сенажаці. 26 звенняў з калгасаў «Чырвоны барацьбіт», «XV з'езд КП(б)Б», «XVII з'езд ВКП(б)» і «Ударнік» выйшлі на асушку балотных зямель «Усвіж — Бук».

27 лістапада 1940 г.

Шаматульскі Даніла Васілевіч — звеннявы калгаса «Чырвоная Іскра» Няклюдаўскага сельсавета вось ужо трэці год атрымлівае высокі ўраджай бульбы. У 1938 г. ўраджай у яго звяне атрыман 230 цэнтнераў з гектара, у 1939 г.— 260 цэнтнераў, а ў гэтым годзе — 320 цэнтнераў з гектара. Тав. Шаматульскі выстаўкомам УСГВ прадстаўлен да ўзнагароды.

18 красавіка 1941 г.

Моладзь 1921—1922 гг. нараджэння рыхтуецца да чарговага прызыву ў рады Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Для абучэння дапрызыўнікаў ваеннай справе ў раёне створана шмат каманд. Актыўны ўдзел у абучэнні дапрызыўнікаў прымаюць медработнікі. Яны абучаюць будучых байцоў, як аказаць першую медыцынскую дапамогу, вывучаюць з імі праграму комплексу ГСА.

СПІС ВОІНАЎ-ЗЕМЛЯКОЎ, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ Ў САВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКУЮ ВАЙНУ 1939—40

АБОЛЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУЛЫГІН Герасім Міхайлавіч, нарадзіўся ў в. Кісялева; радавы, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ЯКУШЭВІЧ Фёдар Мікітавіч, нарадзіўся ў 1903 у в. Беліца Сенненскага р-на Віцебскай вобласці, жыў у в. Кісялева; радавы, загінуў у студзені 1940.

АЗЕРАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

РАКАЎ Рыгор Маркавіч, нарадзіўся ў 1909 у в. Скавышкі, ст. сяржант.

АЛЁНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ДУНІН Фёдар Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Засценкі, загінуў у 1940.

МІХНЕВІЧ Дзмітрый Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1920 у в. Казігорка; у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у 1940.

СІЛІВОНЦЬЕЎ Дзмітрый Іванавіч, нарадзіўся ў 1916 у в. Лаўрэнаўка, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ФЕДЗЮКОЎ Васіль Анікеевіч, нарадзіўся ў 1918 у в. Козаўка, прапаў без вестак у лютым 1940.

ШАЎНЯ Якаў Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Вялікае Гальцэва.

ВАЛОСАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАБАРНЕЎ Фёдар Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Харлінцы; прапаў без вестак у лютым 1940.

БУРЫЛІН Павел Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1911 у Днепрапятроўску, да 1939 жыў у в. Нізкі Гарадзец; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 3.3.1940.

ВАРАНОВІЧ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1912 у в. Высокі Гарадзец; у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у сакавіку 1940.

ДЗЯДЗЕЧКІН Ульян Васілевіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Лазы; член КПСС, мал. лейтэнант, загінуў 2.2.1940.

ЖУК Пётр Федасеевіч, нарадзіўся ў 1914, радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

КОЗІК Аляксандр Мікітавіч, нарадзіўся ў в. Нізкі Гарадзец, загінуў у 1940.

КУДЗІН Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў в. Новае Сяло.

ПАРАХОНЬКА Аляксандр Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1913, прапаў без вестак у лютым 1940.

ПЛЯСКАЧ Пётр Фаміч, радавы, загінуў 21.2. 1940.

РЭДЗЬКА Ягор Філімонавіч, нарадзіўся ў 1915 у в. Дубровіна; радавы, прапаў без вестак у 1940.

РЭДЗЬКА Якаў Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1909

П. Ц. Бурылін.

А. А. Парахонька.

В. Ц. Куксянкоў.

В. М. Трыбуль.

С. І. Урублеўскі.

у в. Дубровіна; радавы, прапаў без вестак у 1939—40.

ХІРЭВІЧ Максім Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Лазы, загінуў у 1939.

ЦЕНЮШКА Ніканор Іванавіч, нарадзіўся ў в. Сухачэва; малодшы камандзір, загінуў 29.1.1940.

ШЫНКЕВІЧ Шліп Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1915, радавы, загінуў 7.1.1940.

ЯЦКЕВІЧ Стафан Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1907 у в. Валосава; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у лютым 1940.

ВОЎКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУРСКІ Ягор Маркавіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Варанцэвічы, загінуў у 1940.

ДРАГУНОЎ Андрэй Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Варанцэвічы; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак у студзені 1940.

ДРАГУНОЎ Андрэй Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1911 у Жукнеўскім сельсавеце, жыў у в. Мар'янполе; загінуў у сакавіку 1940.

КУКСЯНКОЎ Васіль Ціханавіч, нарадзіўся ў 1913 у в. Варанцэвічы.

ПАШКЕВІЧ Фёдар Тарасавіч, нарадзіўся ў в. Варанцэвічы.

ПІСАРЭНКА Аляксей Апанасавіч, нарадзіўся ў в. Багрынава; радавы, загінуў у 1939.

РУГАЛЬ Павел Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1918 у в. Сіўцава, член ВЛКСМ, працаваў камбайнерам; у Чырвонай Арміі з 1939, прапаў без вестак.

ТРЫБУЛЬ Васіль Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Воўкавічы; радавы, загінуў 12.2.1940.

УРУБЛЕЎСКІ Станіслаў Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Крывое; у Чырвонай Арміі з 1939, прапаў без вестак у 1940.

ЖУКНЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

РЫМКЕВІЧ Валяр'ян Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1912 у в. Новае Палюдава; у Чырвонай Арміі з жніўня 1939, радавы, памёр ад ран 11.3.1940.

САЯН Іван Маркавіч, нарадзіўся ў в. Хаценічы; лётчык, загінуў у 1939.

ЯСКЕВІЧ Мітрафан Мікітавіч, нарадзіўся ў в. Рэчкі, загінуў у 1940.

КОХАНАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

АЎЛАСЕНКА Сямён Раманавіч, нарадзіўся ў 1905 у в. Марцюхова, памёр ад ран 9.10.1939.

БАБАРЫКА Яваў Іванавіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Шапчына; радавы, загінуў у 1939—40.

БУЛАЎКІН Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1918 у в. Астрашапкі; радавы, загінуў у студзені 1940.

КАЗЛОЎСКІ Іосіф Іванавіч, нарадзіўся ў 1917 у в. Круханавічы; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 18.1.1940.

КАРАНЕЎСКІ Фёдар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Круханавічы; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

ПАЎЛОЎСКІ Сямён Паўлавіч, нарадзіўся ў 1910 у г. п. Коханава, загінуў у 1940.

САНКОЎСКІ Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Багданаўка, радавы.

ТРАЦЦЯКОЎ Макар Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1905; у Чырвонай Арміі з 1940, радавы, прапаў без вестак у 1940.

* * *

АЎЛАСЕНКА Іван Клямянцьевіч, нарадзіўся ў 1915 у в. Марцюхова; прапаў без вестак у кастрычніку 1939 у час вызваленчага паходу ў Заходняй Беларусі.

ШЛОСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АПЕНКІН Сямён Ульянавіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Барсучыны; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

БАКУНОВІЧ Емяльян Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Барсучыны; перад савецка-фінляндскай вайной праходзіў зборы, загінуў на фронце.

БАКУНОВІЧ Усцін Мікітавіч, нарадзіўся ў 1911; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1939.

ДУБКОЎ Пётр Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Латыгаўка; у Чырвонай Арміі з 1939.

ЖЫРКЕВІЧ Пётр Мінавіч, нарадзіўся ў 1903 у в. Прылессе; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 22.2.1940.

ЖУРАЎЛЕЎ Ігнат Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1914 у в. Сані; радавы, прапаў без вестак 7.1.1940.

ЗУБЦОЎ Нічыпар Кірэевіч, нарадзіўся ў 1914 у в. Еўлахі; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у лютым 1940.

КАРОТКІН Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Валькі; радавы, прапаў без вестак у студзені 1940.

МЯХОВІЧ Антон Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Козкі; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

НАРЧУК Міхаіл Сямёнавіч, у Чырвонай Арміі з 1939, радавы.

ПАШКЕВІЧ Станіслаў, нарадзіўся ў в. Сакаляніка, радавы.

ПАШКЕВІЧ Станіслаў Паўлавіч, нарадзіўся ў 1912 у в. Дунавік; радавы, прапаў без вестак у снежні 1939.

СВІТКІН Васіль Лявонавіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Старая Будаўка; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, памёр ад ран 16.2.1940.

СІМАНОВІЧ Яфім Кірылавіч, радавы.

УГЛОЎ Уладзімір Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1912 у в. Еўлахі; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

І. М. Салн.

С. Р. Аўласенка.

УЛІЦІН Пётр Пятровіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Гастынічы; радавы, загінуў 27.1.1940.

ХАЛЕЦКІ Пётр Андрэевіч, нарадзіўся ў 1912 у в. Сакаланка, у Чырвонай Арміі з 1939, радавы.

ЧАПЛЯНОК Васіль Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Латышова; радавы, прапаў без вестак 9.3.1940.

ШАВЛЛЕЎ Ілья Апанасавіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Старая Будаўка; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 11.2.1940.

СЕРКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЗЕЛЮТКОЎ Пётр Яфімавіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Пукалава; радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

ЛАВІЦКІ Дзяніс Мікітавіч, нарадзіўся ў 1909 у в. Прусінічы, радавы.

МЯСНІКОЎ Васіль Пятровіч, нарадзіўся ў в. Прусінічы, радавы.

МЯСНІКОЎ Ягор Пятровіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Прусінічы; у Чырвонай Арміі з 1938, малодшы камандзір, памёр ад ран 4.12.1939.

ПАШКЕВІЧ Леанід Раманавіч, нарадзіўся ў 1920 у в. Раманаўка; у Чырвонай Арміі з 1939, малодшы камандзір, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ПАШКЕВІЧ Фёдар Тарасавіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Заполле, радавы, загінуў 9.2.1940.

ЧАПЛЯНОК Васіль Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Раманаўка; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак 9.3.1940.

СЛАЎНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГУБАРЭВІЧ Іван Пятровіч, нарадзіўся ў 1920 у в. Губарэва, яфрэйтар, прапаў без вестак 20.1. 1940.

ДАВЫДАЎ Васіль Антонавіч, нарадзіўся ў 1913 у в. Трасцянка; у Чырвонай Арміі з 1938, прапаў без вестак у лютым 1940.

ЛАТУШКІН Архіп Фядосавіч, нарадзіўся ў 1907 у в. Зябліца; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у лютым 1940.

ПАЖАРЫЦКІ Іван Стафанавіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Каменка; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 12.2.1940.

* * *

ЖЫТКОЎСКІ Дзмітрый Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1916 у в. Слаўнае; кавалерыст, загінуў у 1938 у баях каля возера Хасан.

ГОРАД ТАЛАЧЫН

ГРЫГАРОВІЧ Фёдар Барысавіч, нарадзіўся ў 1912, радавы, загінуў у лютым 1940.

КАЛІНІН Віктар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1904; у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у снежні 1939.

МАРКІЯНОВІЧ Уладзімір Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1909; у Чырвонай Арміі з верасня 1939, радавы, загінуў 5.2.1940.

ЧУМРАЙ Антон Пілінавіч, нарадзіўся ў 1909; радавы, стралок, прапаў без вестак у студзені 1940.

ЯРОЦКІ Міхаіл Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1904; радавы, стралок, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

* * *

ГАЛУБОЎСКІ Аляксей Пятровіч, нарадзіўся ў 1914; у Чырвонай Арміі з 1938, радавы, загінуў 27.8.1939 у баях у раёне р. Халхін-Гол.

ТАЛАЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНФІЛАЎ Максім Іванавіч, нарадзіўся ў 1914 у в. Друцк; малодшы камандзір, загінуў 5.2.1940.

АЎЧЫНКА Аляксей Карпавіч, нарадзіўся ў 1913 у в. Мураўнічы; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у лютым 1940.

ВАЛЕНТАЎ Рыгор Васілевіч, нарадзіўся ў 1913 у в. Друцк; радавы, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ДАВЫДАЎ Васіль Антонавіч, нарадзіўся ў 1916 у Круглянскім р-не Магілёўскай вобл.; радавы, прапаў без вестак у 1940.

ЗЯЗЮЛЕВІЧ Іван Мікітавіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Райцы; радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

ЛІТВІНКА Аляксей Тарасавіч, нарадзіўся ў 1909 у в. Мураўнічы; радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

ЛЯШНЕЎСКІ Фёдар Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1914 у в. Шмідзельшчына; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у лютым 1940.

МАРКЕВІЧ Мікалай Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Шмідзельшчына; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 20.2.1940.

МАРКІЯНОВІЧ Мікалай Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1907 у в. Стары Талачын; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 12.2.1940.

СУШКОЎ Сяргей Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1914; радавы, разведчык, прапаў без вестак.

СУШКОЎ Уладзімір Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1918; радавы, прапаў без вестак.

СУШКОЎ Ягор Іванавіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Зялёная; радавы, загінуў 23.2.1940.

1941
1945

У ГАДЫ СУРОВЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ

Неадлічонымі матэрыяльнымі стратамі, палаючымі гарадамі і вёскамі, неймавернымі людскімі пакутамі і мільёнамі заўчасна абарваных чалавечых жыццяў увайшла ў нашу гісторыю Вялікая Айчынная вайна. Пачатак яе быў надзвычай цяжкім. Нашы войскі, ведучы цяжкія абарончыя баі, былі вымушаны адступаць пад націскам колькасна пераўзыходзячага і больш вопытнага праціўніка. Савецкая Беларусь з першых гадзін вайны апынулася ў агні пажарышчаў і жорсткіх баёў. Арэнай баявых дзеянняў стала і зямля Талачыншчыны, што ляжала на шляху ворага, які рваўся да Масквы.

Перад часцямі Заходняга фронту стаяла задача затрымаць праціўніка, які наступаў у напрамку Барысаў — Орша. З Падмаскоўя ў раён Барысава была перакінута 1-я Маскоўская пралетарская мотастралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка Я. Р. Крэйзера. Абарончыя баі вялі таксама курсанты Барысаўскага танкавага тэхнічнага вучылішча і зводная дывізія, сфарміраваная з часцей, што адышлі з раёна Мінска. 30 чэрвеня 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія заняла рубеж абароны на ўсходнім беразе Бярэзіны. У яе ўваходзілі 6-ы і 175-ы мотастралковыя, 12-ы танкавы, 13-ы артылерыйскі палкі, 300-ы зенітны і 123-і супрацьтанкавы артылерыйскія дывізіёны, 93-і разведвальны батальён і іншыя спецыяльныя падраздзяленні. Дывізія мела больш за 220 танкаў, у тым ліку 40 Т-34 і КВ (Андрушчанка М. К. На зямлі Беларусі летам 1941 года. Мн., 1985. С. 98). Калі танкі нямецкага генерала Гудэрыяна выйшлі да Бярэзіны, яны сустрэлі ўпартае супраціўленне воінаў-масквічоў. За тры дні жорсткіх баёў на гэтым напрамку вораг страціў каля 70 танкаў і 1,5 тысячы салдат і афіцэраў. Аднак колькасная перавага праціўніка не давала магчымасці дывізіі заняць устойлівую абарону. Каб пазбегнуць акружэння, Я. Р. Крэйзер выкарыстаў тактыку рухомай абароны. Днём савецкія войскі вялі баі, а ноччу адрываліся ад праціўніка на 10—12 кіламетраў і займалі абарону на наступным зручным рубяжы. Гэта прымушала камандаванне ворага мяняць планы, на што ён траціў нямала часу, жывой сілы і тэхнікі. Так на працягу многіх сутак бесперапынных баёў вымотваліся сілы праціўніка, стрымлівалася яго наступленне, выйграваўся час. Гэта садзейнічала своечасоваму разгортванню войск 20-й арміі на рубяжы Орша — Шклоў.

Жорсткія баі разгарэліся за Талачын. Увечары 5 ліпеня вораг захапіў аўтамагістраль Мінск — Масква на участку ад Славеняў да Талачына. Таму часцям 1-й Маскоўскай дывізіі давялося рухацца да новага рубяжа ноччу ўздоўж аўтамагістралі па прасёлачных дарогах. Неабходна было вызваліць горад і зноў завалодаць аўтастрадай. Раніцай 6 ліпеня мотастралковыя палкі падышлі да ракі Друць. Разведчыкі батальёна капітана В. Былінкіна ўбачылі вялікую калону мотапяхоты і адкрылі па ёй агонь. На дапамогу ім падаспеў батальён капітана П. Шурухіна. З поўначы па фашыстах ударыў 175-ы мотастралковы полк. Каля 16 гадзін працягваўся бой за Талачын. Фашысты сцягнулі сюды ўсе наяўныя сілы, што былі ў раёне Барысава. На працягу сутак утрымлівала дывізія горад, нягледзячы на шквал агню і бомбавыя ўдары. 8 і 9 ліпеня ішла ўпартая барацьба за Талачын. Горад двойчы пераходзіў з рук у рукі. Бяспрыкладную стойкасць і мужнасць паказалі ў гэтых баях савецкія воіны. «Пад ударамі контратакаваўшых савецкіх часцей вораг 8 ліпеня пакінуў Талачын. Прычым нашы войскі ўзялі тут у палон каля 800 салдат і афіцэраў праціўніка, захапілі сцяг 47-га Берлінскага танкавага корпуса і ўтрымлівалі горад на працягу сутак. У баях за раённы цэнтр удзельнічалі і воіны 115-га танкавага палка пад ка-

Воіны 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіі ў перапынку паміж баямі. Лета 1941 г.

мандаваннем маёра Сяргеева. Намеснік камандзіра роты лейтэнант М. П. Мітрохін, які ўдзельнічаў у баях на барысаўска-талачынскім напрамку, паказаў высокую баявую вывучку і смеласць. Яго танк знішчыў пекалькі гарматных разлікаў і бронемашын праціўніка. А калі на дарозе Мінск — Масква з'явілася восем фашысцкіх танкаў, лейтэнант М. П. Мітрохін дзёрзкай атакай знішчыў тры гітлераўскія машыны...

Смела дзейнічалі артылерысты 123-га асобнага дывізіёна супрацьтанкавых гармат. Калі выбыў са строю камандзір адной з гармат, радавы В. В. Кочатаў замяніў яго і трапнымі выстрадамі знішчыў міпамётную батарэю ворага» (там жа. С. 109, на рус. мове).

Вечарам 9 ліпеня 1-я мотастралковая дывізія пад націскам ворага вымушана была адступіць на новы рубеж абароны ў раёне Коханава. Дывізія трывала ўтрымлівала заняты рубеж, нярэдка пераходзіла ў контратакі, наносячы па часцях 18-й дывізіі ворага адчувальныя ўдары. На Коханаўскім плацдарме гераічны подзвіг здзейсніў наводчык М. М. Дзмітрыеў (матэрыял пра яго глядзі ў артыкуле «Герой-артылерыст»).

У пачатку ліпеня ў раёне Барысава і Талачына жорсткія баі ішлі і на зямлі, і ў паветры. Дзеянні эскадрылляў 213-га і 214-га бамбардзіровачных авіяпалкоў, якія базіраваліся каля вёскі Зубава непадалёку ад Оршы, прыкрывалі знішчальнікі 401-га знішчальнага авіяпалка, якім камандаваў падпалкоўнік Герой Савецкага Саюза С. П. Супрун. Гэты полк, сфарміраваны ў першыя дні вайны, меў на ўзбраенні павейшыя самалёты ЛаГГ-3 і МіГ-3. Лётчыкі палка рабілі па 5—6 баявых вылетаў у дзень. 4 ліпеня ў небе Талачыншчыны ў няроўным баі з шасцю варожымі самалётамі С. П. Супрун загінуў. Радзіма ў другі раз удастоіла адважнага сокала звання Героя Савецкага Саюза (глядзі артыкул «У імя жыцця»).

Затрыманне перадавых часпей групы армій «Цэнтр» на барысаўска-аршанскім напрамку мела для нашых войск важнае значэнне. Быў выйграны час, падраздзяленні 20-й арміі атрымалі магчымасць стварыць абарону на Дняпры. Паводле прызнання Гудэрыяна, нямецкія танкавыя войскі ў гэтых баях адчулі моц савецкіх танкаў Т-34, перад якімі нямецкая супрацьтанкавая артылерыя аказалася бездапаможнай. Асабліва вызначылася ў гэтых баях 1-я Маскоўская пралетарская мотастралковая дывізія. Яе камандзіру Я. Р. Крэйзеру за ўмелае кіраўніцтва баямі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Больш за 300 воінаў дывізіі былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі, дывізія адна з першых стала гвардзейскай (глядзі артыкул «Гвардзейцы-маскавічы»).

У ліпені 1941 г. ў Талачыне знаходзіліся камандныя пункты Гудэрыяна і камандуючага 4-й арміяй фельдмаршала Клюге. Сімвалічна, што ў 1812 г. тут была штаб-кватэра Напалеона. Вераломныя захопніцкія планы прывялі іх на нашу зямлю, але фінал гэтых паходаў быў адпаловка ганебным.

З першых дзён акупацыі раёна гітлераўцы сталі ўстанаўліваць і тут «новы парадак»: рабавалі матэрыяльныя каштоўнасці, асабістую маёмасць савецкіх людзей, расстрэльвалі камуністаў, савецкіх работнікаў, актывістаў калгаснага руху. Кожнага падазронага адпраўлялі ў турмы, лагеры, адкуль вырвацца жывымі ўдавалася нямногім. У буйных населеных пунктах былі размешчаны вайсковыя гарнізоны, у вёсках прызначаны старасты, у цэнтрах сельсаветаў і раённым цэнтры — бургамістры. Гэтыя ўстановы акупацыйнага рэжыму павінны былі стварыць акупантам спакойнае жыццё ў тыле і бесперабойнае забеспячэнне арміі. Ва ўмовах тэрору акупацыйнай адміністрацыі кожны сумленны чалавек лічыў сваім свяшчэнным абавязкам вытрымаць экзамен на чалавечую годнасць, зрабіць усё магчымае для перамогі над моцным і каварным ворагам.

Вялікую работу правялі чыгуначнікі і іх сем'і. Ва ўмовах абстрэлу і жорсткай бамбар-

дзіроўкі яны рабілі ўсё, каб адправіць паязды са станцый Слаўнае, Талачын, Коханава. Самі ад'язджалі апошнім эшалонам ці разам з адступаючымі войскамі ішлі на ўсход.

Як сапраўдны камуніст дзейнічала стаханоўка-меліяратар Ганна Іванаўна Федзюкова: калі фашысты ўжо ўваходзілі ў вёску Няклюдава, яна схавала ў сваёй хаце сцяг Няклюдаўскага сельскага Савета. За выратаваны сцяг заплацілі жыццём маці і бацька Ганны Іванаўны, сястра Клава была вывезена ў Германію.

Мікалаю Фёдаравічу Валянтовічу, былому старшыні калгаса імя Леніна, фашысты прапанавалі супрацоўнічаць з імі. Камуніст Валянтовіч выбраў смерць, але не здрадзіў Радзіме.

...7 ліпеня акупанты прыйшлі ў вёску Узноснае. На наступны дзень гітлераўцы расстралялі раненага малодшага камандзіра Чырвонай Арміі І. С. Снапкова, які адстаў ад сваёй часці. У той жа дзень у паветраным баі загарэўся над вёскай наш самалёт і ўпаў каля вёскі Пукалава. Самалёт быў акружаны фашыстамі. Раненых абгарэлых лётчыкаў гітлераўцы кінулі ў палаючы самалёт. Праз два дні акупанты схапілі старшыню калгаса «Новы шлях» Дабрынскага. Звязанага, яго прывязалі да падводы і вадзілі па вёсках, потым расстралялі.

Калі заціхлі баі, жыхары бліжэйшых населеных пунктаў цішком выносілі з поля бою параненых байцоў і камандзіраў, аказвалі ім першую дапамогу і хавалі далей ад вачэй акупантаў. Не зважаючы на смяротную небяспеку, давалі воінам прадукты, пераапраналіх іх у цывільнае. Многія з іх заплацілі за гэта сваім жыццём.

Камсамольцы Аркадзь Зелюткоў і Косця Мяснікаў сустрэліся са знясіленымі воінамі на ўскрайку лесу каля вёскі Узноснае. Прынеслі ім адзенне, прадукты, дапамаглі вызначыць дарогу. І тыя даверылі камсамольцам самае дарагое, што было з імі — сцяг іх 56-й Маскоўскай стралковай дывізіі. Маладыя патрыёты выканалі наказ байцоў — выратавалі сцяг, які пазней быў перапраўлены на Вялікую зямлю.

Іван Рыгоравіч Кударэнка, галоўны бухгалтар Талачынскага аддзялення сельгасбанка, перад прыходам акупантаў схаваў у памяшканні банка важныя дакументы і пішучую машынку. Праз пэўны час па просьбе партызан Іван Рыгоравіч, рызыкуючы жыццём, з-пад самага носа гітлераўцаў, якія абсталявалі ў былым банкаўскім будынку гасцініцу, вынес машынку і перадаў праз сувязных у брыгаду М. П. Гудкова. А выратаваныя дакументы вельмі спатрэбіліся пасля вайны.

К канцу 1941 г. ў лясах Талачынскага і сумежных з ім раёнаў з'явілася шмат асобных груп з ваеннаслужачых, якія былі параненыў баях і адсталі ў час выхаду з акружэння ад сваіх часцей, ваеннапалонных, якім удалося вырвацца з лап фашыстаў. Усіх іх аб'яднаўвала нястрымнае жаданне прарвацца на ўсход і хутчэй уступіць у дзеючую армію. Але нямногім чырвонаармейцам, каго выводзілі да лініі фронту мясцовыя жыхары, удавалася прарвацца за яе — варожыя гарнізоны густой сеткай, нібы павуціннем, аблыталі акупіраваную тэрыторыю, пільна ахоўвалі ўсё навакольле. Пасля няўдалых спроб прарвацца за лінію фронту многія воіны вярталіся да знаёмых мясцін і людзей, з якімі паспелі ўстанавіць сувязь. Асенняя непагадзь і ранняя зіма прымусілі байцоў выйсці з лесу і да вясны шукаць прытулку ў навакольных вёсках.

З надыходам вясны 1942 яны зноў пайшлі ў лясы, а разам з імі і частка мясцовай моладзі. За зіму байцы ўстанавілі цесныя сувязі з камуністамі і камсамольцамі, патрыятычна настроенай часткай насельніцтва. Патрыёты дапамагалі выбраць надзейныя месцы ў навакольных лясах і балотах, забяспечвалі чырвонаармейцаў зброяй, адзеннем, харчаваннем.

Так у сакавіку — маі 1942 узніклі партызанскія групы І. Н. Стрэльнікава, С. Ц. Баранава, У. П. Карцава, М. П. Вашкіна, А. Д. Клячына, А. П. Куіна, Р. С. Іванова, Р. М. Севасцьянава, А. Ф. Сімдзянкіна, В. П. Палякова, М. К. Сушкова, Г. М. Каўрыгі, М. П. Гудкова і інш.

Весткі аб разгроме гітлераўскіх войск пад Масквой і пра першыя поспехі лясных салдат сталі сігналам для масавага ўключэння мясцовага насельніцтва ў групы народных мсціўцаў. Групы колькасна выраслі. Для правядзення больш значных аперацый і іх каардынацыі неабходна было аб'яднаць разрозненыя групы ў атрады. Вясной і летам 1942 г. на тэрыторыі раёна з шматлікіх партызанскіх груп былі арганізаваны на поўдні раёна атрад «Чэкіст», у Воўкавіцкім лесе атрады «Гая» і «Перамога», каля в. Узноснае атрад М. П. Гудкова. Атрады больш упэўнена і арганізавана павялі барацьбу з ворагам. На працягу лета 1942 г. дзякуючы паспяховым і рашучым дзеянням партызан тэрыторыя Талачынскага раёна была амаль поўнасцю ачышчана ад варожых фарміраванняў. Засталіся ўзмоцненыя гарнізоны толькі ў пекальких буйных населеных пунктах. Для іх разгрому партызанам яшчэ не хапала ні сіл, ні вопыту.

Так званыя Віцебскія (Суражскія) «вароты», што існавалі ў лютым — верасні 1942 г., садзейнічалі ўстанаўленню сувязей з Вялікай

зямлёй. Праз іх для кіраўніцтва народнай барацьбой у Талачынскі раён прыбылі партыйныя работнікі С. М. Нарчук, М. А. Рашэтнікаў, якія ўзначалілі атрад «Граза». Таксама было заслана каля 10 дыверсійных груп для падрыўной дзейнасці на ўчастках чыгункі і шашэйных дарог Орша — Барысаў.

У жніўні 1942 г. атрад «Граза» быў разгорнуты ў брыгаду «Граза» ў складзе 3 атрадаў. Атрады В. С. Лявонава (арганізаваўся ў Чашніцкім і Сенненскім раёнах) і М. П. Гудкова паводле ўказання Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б аб'ядналіся ў брыгаду, якая атрымала назву па прозвішчу свайго камандзіра — Гудкова. У маі 1942 г. партызанскія атрады, што дзейнічалі на поўдні Талачынскага і на тэрыторыі Шклоўскага раёнаў, арганізаваліся ў брыгаду «Чэкіст». За лета 1942 брыгадамі «Чэкіст», «Граза», Гудкова разам з асобнымі дыверсійнымі групамі на ўчастку Слаўнае — Коханава і Лотва — Шклоў было падарвана каля 60 чыгуначных саставаў. На гэтым жа ўчастку і ў той жа час рабілі дыверсіі і партызаны брыгад 8-й Круглянскай і 1-й К. С. Заслонава.

Буйную і добра арганізаваную аперацыю правялі партызаны 8-й Круглянскай брыгады на чыгуначнай станцыі Слаўнае ў ноч на 28 жніўня 1942 г. У выніку гэтай аперацыі быў разгромлены гарнізон ворага станцыі Слаўнае, узарваны 2 вадакачкі, два саставы. Рух на станцыі быў перапынены на пекалькі сутак. У гэты ж дзень у стаўцы фюрэра стала вядома аб гэтай партызанскай аперацыі. Фашысцкае камандаванне за гэту чыста ваенную акцыю партызан спагнала сваю злосць на ні ў чым не вінаватых мірных жыхарах. Фашысты вывезлі ў Крупкі і расстралялі 100 мірных жыхароў Талачыншчыны, сярод якіх былі дзеці, жанчыны, старыя. Каб запалохаць мясцовае насельніцтва, каты сагналі глядзець на расстрэл жыхароў Крупак і навакольных вёсак.

Баючыся росту партызанскага руху, нямецкае камандаванне кідала буйныя сілы на задушэнне народнага супраціўлення. У Талачынскім раёне карная экспедыцыя пачалася з верасня 1942 г. Першы ўдар на сябе прыняла брыгада «Чэкіст». Потым праціўнік блакіраваў месца базіравання партызан брыгады Гудкова, 7 верасня ўступіла ў бой з атрадамі карнікаў брыгада «Граза». Пасля ўпартых працяглых і няроўных баёў праціўніку ўдалося выцесніць партызан з займаемай імі тэрыторыі. Яшчэ большыя рэпрэсіі і тэрор абрушыліся на мірнае насельніцтва.

Вясной 1943 брыгады зноў занялі раёны сваёй дыслакацыі. За гэты час партызанскія атрады значна выраслі, папоўніліся мясцовымі жыхарамі, у тым ліку вялікай колькасцю моладзі Талачынскага раёна.

У ліпені 1943 г. распачаў работу Талачынскі падпольны райком партыі, які ажыццяўляў арганізацыйнае і палітычнае кіраўніцтва дзейнасцю партызанскіх брыгад «Граза», Гудкова, 2-й Беларускай імя П. К. Панамарэнкі, над яго ўплывам было насельніцтва 14 сельсаветаў паўночнай часткі раёна.

6 сельсаветаў паўднёвай часткі раёна (яе жыхары былі цесна звязаны з партызанскай брыгадай «Чэкіст») знаходзіліся ў зоне дзейнасці Шклоўскага падпольнага райкома партыі, створанага ў чэрвені 1943 г.

Склад Талачынскага падпольнага райкома КП(б)Б: сакратары: Нарчук Сямён Мікалаевіч (з 8.7.1943 па 28.5.1944, памёр), Пахамовіч Аляксей Пятровіч (з мая 1944 па 26.6.1944); члены райкома: Пахамовіч Аляксей Пятровіч (з 8.7.1943 па 5.1944), Ракаў Пётр Сямёнавіч (з 8.7.1943 па 30.5.1944, загінуў), Гудкоў Мікалай Пятровіч (з 7.9.1943 па 26.6.1944), Дзьячкоў Міхаіл Іванавіч (з 30.11.1943 па 26.6. 1944). Падпольны райком партыі выдаваў газету «Чырвоны хлебароб» (рэдактар А. П. Пахамовіч).

У жніўні 1942 г. на тэрыторыю раёна прыбыла ўпаўнаважаная ЦК ЛКСМБ па Талачынскаму раёну і сакратар Талачынскага РК ЛКСМБ Л. М. Міхайлава (з красавіка да жніўня 1942 г. камсамольскай работай у раёне кіраваў Віцебскі абком ЛКСМБ). Да работы ў якасці членаў падпольнага райкома камсамола былі прыцягнуты памочнік камісара па камсамольскай рабоце партызанскага атрада «Спяг» брыгады «Граза» К. В. Блажэвіч і партызан атрада «Граза» А. У. Рак. У гэтым складзе падпольны райком прыступіў да работы ў канцы 1942 г.

Склад Талачынскага падпольнага райкома ЛКСМБ: сакратары: Міхайлава Любоў Міхайлаўна (з

Мемарыяльны знак на месцы размяшчэння партызанскай брыгады Гудкова ва ўрочышчы каля в. Узноснае.

жніўня 1942 па 26.6.1944), Рак Аляксандр Уласавіч (сакратар па прапагандзе з жніўня 1942 па 26.6.1944); члены райкома: Блажэвіч Кацярына Васілеўна (з жніўня 1942 па 26.6.1944), Ворашань Аляксей Дзям'янавіч (з 16.7.1943 па 15.2.1944), Дзямешка Сцяпан Цімафеевіч (з 28.2.1944 па 26.6.1944), Маханёк Вера Іванаўна (з жніўня 1942 па 26.2.1944, загінула), Жураўскі Іван Іосіфавіч (з 1.9.1943 па 26.6.1944), Ільін Уладзімір Пятровіч (з 1.9.1943 па 26.6.1944).

Камсамольцы сталі актыўнымі памочнікамі партыйных органаў у арганізацыі ўсенароднай барацьбы супраць ворага. У пачатку 1943 г. ў брыгаду «Чэкіст» прыбыла група работнікаў ЦК ЛКСМБ па рабоце з моладдзю ў тыле ворага (8 чалавек). Сярод іх былі Марыя Андрэева, Вера Барашкіна, Аня Ракіцянская, Люба Асмалоўская, Марыя Сугака. Яны адразу ж уключыліся ў партызанскае жыццё — хадзілі ў разведку, удзельнічалі ў баявых аперацыях.

Больш як палавіну падрыўных груп партызанскіх атрадаў складалі камсамольцы і моладзь. Пры іх актыўным удзеле ў час аперацыі «Рэйкавая вайна» толькі з жніўня 1943 г. было ўзарвана 550 рэек брыгадай Гудкова, 570 — брыгадай «Граза». Па ініцыятыве камсамольцаў у кожным атрадзе брыгады «Чэкіст» ствараліся Кнігі пашаны партызан, у якія заносілі імёны тых, хто найбольш вызначыўся. Сярод іх — М. Агаценка, старшы падрыўнік групы 1-га атрада (падарваў 17 варожых эшалонаў, загінуў пры выкананні чарговага задання), В. Холабаў з гэтага ж атрада (падарваў 9 эшалонаў). Камсамолец В. Юрчанка з 31-га атрада меў на сваім рахунку 19 пушчаных пад адхон эшалонаў, яго таварышы Н. Скакуноў і І. Савін падарвалі 13. Андрэй Казанцаў з 5-га атрада — 10, камсамолка В. Касталомава з 60-га атрада — 6 эшалонаў. У барацьбе з фашыстамі вызначыліся і камсамольцы 10-га атрада. С. Абухаў удзельнічаў у 29 аперацыях, дыверсійная група Калініна арганізавала 30 дыверсій на шашы.

Па заданню партызанскага камандавання многія мясцовыя патрыёты ўладкаваліся працаваць на прадпрыемствы і ва ўстановы акупацыйных улад, дзе вялі агітацыю, разведку, ажыццяўлялі дыверсіі. Камсамолцы Марыі Пятаповіч удалося распрапагандаваць гарнізон у в. Букарава: у партызаны перайшло 40 «народнікаў». [Так называлі членаў антысавецкага вайсковага фарміравання «Руская нацыянальная народная армія» (РННА) з ліку здраднікаў Радзімы, прымусова мабілізаваных ваеннапалонных, мясцовых жыхароў.] На станцыі Талачын дзейнічала нямала патрыётаў, якія перадавалі каштоўную інфармацыю аб перавозцы грузаў па чыгунцы Мінск — Масква партызанам брыгад «Чэкіст», Гудкова, Лявонава. Камсамолка Рая Стаселька з вёскі Рыжычы ўзарвала кацёл і машыннае аддзяленне вінзавода ў Азерцах. Моладзь вёскі Узноснае зрабіла і перадала партызанам брыгады М. П. Гудкова падрабязны план агнявых кропак гарнізона ў сваёй вёсцы. Пры дапамозе жыхароў вёскі Дроздава быў злоўлены шпіён, якога саколінская паліцыя накіравала для разведвання месца размяшчэння партызан. Многія партызанскія памочнікі былі расстраляны, па-зверску закатаваны. Не дачакаліся дня Перамогі сувязныя — настаўніцы Варанцэвіцкай школы Оля Гурынова, Дзіна Фінагенава, Міхаіл Снапок з вёскі Пісчанка і многія іншы.

У кастрычніку 1943 г. па загаду ЦШПР талачынскія брыгады М. П. Гудкова, «Граза» ўдзельнічалі ў аперацыі па ачышчэнню Сенненскай і Ушацкай партызанскіх зон ад акупантаў, вялі абарончыя баі за мястэчкі Чарэя, Лукамль. На працягу студзеня — красавіка 1944 г. яны разам з іншымі брыгадамі ўтрымлівалі Сенненскую партызанскую зону. У маі — чэрвені 1944 г. ў час карпай экспедыцыі супраць партызан гэтай зоны брыгады трапілі ў блакаду, панеслі вялікія страты. «Граза» выйшла з блакады ў пачатку чэрвеня, брыгада Гудкова пачала выхад з блакады 18 чэрвеня. Выхад абедзвюх брыгад супаў з вызваленнем раёна рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі.

На Талачыншчыне дзейнічалі таксама 1-я брыгада імя К. С. Заслонава, 8-я Круглянская брыгада, Сенненская брыгада В. С. Лявонава, 2-я Беларуская партызанская брыгада імя П. Н. Панамарэнкі. Часам сюды заходзілі 1-я Смалепская партызанская брыгада, Смаленскі партызанскі полк, 5-ы батальён партызанскага палка «Трынаццаць».

23 чэрвеня 1944 г. войскі чатырох савецкіх франтоў распачалі гістарычную Беларускую аперацыю. У выніку яе здзяйснення ўся тэрыторыя Беларусі была ачышчана ад ворага, савецкія войскі разгромілі варожую групу армій «Цэнтр», падышлі да граніц Германіі. Перад пачаткам Беларускай аперацыі на тэрыторыі Віцебскай вобласці лінія фронту праходзіла на ўсход ад Полацка, Віцебска і на захад ад Лёзна. У ходзе аперацыі на багушэўскім напрамку паспяхова дзейнічала паўночная групоўка 3-га Беларускага фронту (камандуючы генерал-палкоўнік І. Д. Чарняхоўскі). Гэта групоўка прарвала абарону праціўніка і перарэзала чыгунку Віцебск — Орша, расшырыла ўчастак прарыву да 50 км. 25 чэрвеня была ўведзена ў прарыў 5-я гвардзейская танкавая армія (камандуючы маршал бранятанкавых войск П. А. Ротмістраў). Яе часці павінны былі выйсці на шашу Масква — Мінск у раёне Талачына і рухацца потым у напрамку Барысава і Мінска. Войскі 11-й гвардзейскай, 31-й армій, 2-га гвардзейскага тан-

кавага корпуса 27 ліпеня 1944 г. вызвалілі Оршу і працягвалі наступленне шырокім фронтам уздоўж чыгункі і аўтамагістралі Масква — Мінск. На працягу 25—29 ліпеня яны ачысцілі ад ворага тэрыторыю Багушэўскага, Сенненскага, Талачынскага, Шклоўскага, Круглянскага раёнаў. На тэрыторыі Талачынскага раёна баі вяліся 26—28 ліпеня.

Вось як апісваюць дзеянні 5-й гвардзейскай танкавай арміі ўдзельнікі гэтых баёў:

«У 4 гадзіны 26 чэрвеня перадавыя атрады карпусоў, прайшоўшы баявыя парадкі 65-га стралковага корпуса 5-й арміі, з ходу атакавалі праціўніка, які абараняўся на рубяжы Гаручка, Хадосы. Падтрыманыя агнём артылерыі 65-га стралковага корпуса, яны зламалі супраціўленне ар'ергардаў 299-й і 256-й пяхотных дывізій праціўніка і выйшлі на аператыўны прастор. Услед за імі ва ўтвораны 8-км калідор накіраваліся галоўныя сілы. Упершыню 5-я гвардзейская танкавая армія ўвайшла ў прарыў без разгортвання галоўных сіл...

Перадавы атрад 29-га танкавага корпуса (узмоцненая 31-я танкавая брыгада), абышоўшы вельмі ўмацаваны пункт Абольцы, працягваў рухацца ў заходнім напрамку...

Адначасова галоўныя сілы корпуса, падышоўшы да Абольцаў, развярнуліся, пасля непрацяглай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі зламалі супраціўленне варожага гарнізона і ў другой палавіне дня авалодалі гэтым населеным пунктам. Пасля гэтага генерал Фаміных, улічваючы цяжкасці з пераадольваннем забалочанай поймы р. Усвейка, адмовіўся ад намеру весці галоўныя сілы па шляху перадавога атрада і накіраваў 32-ю танкавую брыгаду пад камандаваннем падпалкоўніка М. А. Курносава на Сянно, Рыдамлю з тым, каб выйсці да Абчугі з паўночнага ўсходу, а 25-ю танкавую брыгаду, якой камандаваў палкоўнік М. К. Зленка, на Талачын, з тым, каб у далейшым выйсці да Абчугі з паўднёвага ўсходу.

Наступленне 3-га гвардзейскага танкавага корпуса развівалася таксама паспяхова. Упередзе галоўных сіл рухалася 19-я гвардзейская танкавая брыгада — перадавы атрад, якім камандаваў палкоўнік Г. А. Пахадзеў...

Збіўшы ар'ергарды 286-й ахоўнай дывізіі праціўніка, перадавы атрад на плячах ворага ўварваўся ў Смаляны і перарэзаў чыгунку Орша — Лепель. У далейшым яму прыйшлося пераадольваць шмат завалаў, разбураных мастоў, замініраваных участкаў дарог і подступаў да населеных пунктаў. Але гвардзейцы ўпарта прабіваліся ўперад. Ужо апоўдні танкісты, знішчаючы дробныя групы праціўніка, дасягнулі населенага пункта Азерцы — да Талачына заставалася не больш 4 км...» (Шляхамі перамог. М., 1969. С. 226—227, на рус. мове).

Спроба перадавога атрада нашых войск з ходу ўзяць Азерцы і развіць наступленне на Талачын не ўдалася. Камандуючы 3-м гвардзейскім Кацельнікаўскім танкавым корпусам генерал І. А. Воўчанка быў вымушаны ўвесці ў бой галоўныя сілы корпуса. На дапамогу танкістам падаспелі штурмавікі (наступленне наземных войск падтрымлівалі часці 1-й паветранай арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта авіяцыі М. М. Громава). Штурмавыя эскадрыллі па 10—12 самалётаў пачалі паліваць агнём ворага, адначасова ўдарыла артылерыя. І вораг не вытрымаў, яго часці былі выбіты з Азерцаў, а рэшткі паспешліва адышлі да Талачына. У гэты ж час 18-я гвардзейская танкавая брыгада пад камандаваннем падпалкоўніка В. І. Есіпенка перайшла ў наступленне ў напрамку Коханава.

Для далейшага паспяховага наступлення нашым войскам трэба было авалодаць Талачыном. Горад быў моцным апорным пунктам ворага, сюды сыходзілася шмат дарог. У Талачын прыбывалі нямецкія эшалоны з папаўненнем, паступала на рамонт баявая тэхніка, тут знаходзіліся склады з гаручым і прадуктамі.

Упередзе нашых войск, якія гналі ворага ў напрамку Талачына, рухалася 19-я танкавая брыгада. Батальёны пад камандаваннем капітана П. В. Фешчанкі і маёра М. С. Калашнікава першыя выйшлі на подступы да горада, а пасля завязалі вулічныя баі. Танкавы батальён П. В. Фешчанкі адразу авалодаў чыгуначнай станцыяй Талачын, перарэзаў чыгунку Орша — Мінск. За ўмелае кіраўніцтва сваімі падраздзяленнямі, за праяўленыя пры гэтым асабістым мужнасць і гераізм адважным камандзірам было прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза. На подступах да горада здзейсніў гераічны подзвіг экіпаж танка Т-34, якім камандаваў лейтэнант Мікалай Альшэўскі, удастоены за гэты подзвіг звання Героя Савецкага Саюза (глядзі артыкул «Танкавы таран»).

Танкавая рота, якой камандаваў старшы лейтэнант П. І. Дайнекін, зрабіўшы смелы абходны манеўр, першая ўварвалася ў Талачын, разграміла групоўку ворага і адрэзала яму шлях да адступлення. П. І. Дайнекін быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. На вуліцах горада і ў ваколіцах яго, на аўтамагістралі разгарэліся жорсткія баі, вораг упарта супраціўляўся. Пакуль да горада падцягваліся галоўныя сілы 5-й гвардзейскай танкавай арміі, генерал І. А. Воўчанка, выконваючы загад камандуючага фронтам генерал-палкоўніка І. Д. Чарняхоўскага, увёў у дзеянне іншыя эшалоны і рэзервы 3-га

гвардзейскага танкавага корпуса, каб не даць ворагу часу на перагрупоўку і ўвод сваіх сіл. Генералу І. А. Воўчанку ўдалося ажыццявіць манеўр у абход Талачына з поўначы і поўдня, каб не дапусціць падыходу аршанскай групоўкі праціўніка і адрэзаць ворагу шлях на захад. Танкісты, мотастралкі, пехацінцы атрымалі вельмі важкую дапамогу ад авіяцыі. Адважныя лётчыкі 1-й паветранай арміі «трымалі неба ў сваіх руках» і былі гатовы ў любую мінуту прыйсці на выручку наземным войскам. Увесь дзень 26 чэрвеня працягваліся ўпартыя баі, і да 18 гадзін горад быў поўнасцю ачышчаны ад фашыстаў.

У Талачыне нашы войскі захапілі багатыя трафеі. Было забіта і ўзята ў палон каля 600 гітлераўцаў (у т. л. генерал), падбіта 23 танкі, 36 самаходных гармат. Адразу пасля вызвалення Талачына ваенны карэспандэнт корпуснай газеты «Сталинская гвардия» Восіп Колычаў напісаў новую главу сваёй паэмы «Аповесць пра Ваню Самаходава, вясёлага танкіста».

...Ах, Толочин ты, Толочин,
Белорусский городок!
Здесь был немец поколочен,
Растолочен в порошок...

Гэты куплет з паэмы стаў сімвалам тых гарачых чэрвеньскіх дзён 1944 г. «Шырокая і роўная, як струна, шаша была забіта немцамі, якія ўцякалі, аўтамашынамі, павозкамі. Гвардзейцы вогненным ліўнем абрушыліся на ворага, імкліва і мужна ўразаліся ў самую гушчыню яго адступаючых войск. Гарэлі нямецкія танкі і самаходкі, раўлі матарамі кінутыя ворагам цягачы з артылерыяй, шарахаліся коні, велізарныя клубы пары і дыму падымаліся ад падбітых паравозаў на чыгуначнай станцыі. Так гладкая і роўная шаша, на якой у 1941 г. грымелі пераможныя маршы фашыстаў, ператварылася зараз, праз тры гады, у могілкі для многіх з іх. Гэта была работа гвардзейцаў» (У баях за Беларусь. 2 выд. Мн., 1974. С. 374—375, на рус. мове).

Коханава было вызвалена 28 чэрвеня 1944 г. сіламі 18-й танкавай брыгады, якой камандаваў падпалкоўнік В. І. Есіпенка і 2-й мотастралковай брыгады ў складзе двух батальёнаў. «Паспяхова развівала наступленне і 18-я гвардзейская танкавая брыгада. Яе перадавы атрад, які ўзначальваў намеснік камандзіра брыгады маёр Ф. Г. Тарасаў, па-майстэрску манеўруючы, зламаў супраціўленне праціўніка і ўварваўся на чыгуначную станцыю Коханава, дзе захапіў 4 эшалоны з розным ваенным грузам. Такім чынам, шаша Орша — Мінск была перарэзана і ў раёне Коханава.

У другой палавіне дня 18-я гвардзейская танкавая брыгада вяла ўпарты бой з танкамі і пяхотай праціўніка, які адыходзіў з-пад Оршы. Контратакамі з поўдня вораг імкнуўся выбіць падраздзяленні брыгады з Коханава, але ўсе контратакі былі паспяхова адбіты.

У той час, як часці 3-га гвардзейскага танкавага корпуса вялі баі на Мінскай аўтамагістралі, 1-ы асобны гвардзейскі матацыклетны полк пад камандаваннем гвардыі падпалкоўніка Сяргея Ісаевіча Шпольберга прайшоў праз шашу ў раёне Талачына і павярнуўся на поўдзень уздоўж левага берага р. Друць» (Шляхамі перамог. С. 229). Войскі 29-га танкавага корпуса 5-й арміі ўвечары 26 чэрвеня падышлі да р. Усвейка каля Рыдамлі і рухаліся ў напрамку Валосава — Кулакі — Абчуга.

3-я гвардзейская танкавая брыгада рухалася праз Смаляны, Малое Гальцэва да аўтамагістралі Масква — Мінск, каб перарэзаць шлях ворагу, які адступаў з Оршы. 26 чэрвеня яна выйшла на магістраль каля вёскі Марцюхова. Па шашы рухаліся артылерыйскія і мінамётныя часці, бронемашыны, пяхота. Невялікі перадавы атрад нашых воінаў адразу завязаў бой, спыніў рух варожых войск па захад. Танкаў у перадавым атрадзе было няшмат, але адважныя гвардзейцы рашуча ўступілі ў няроўны бой. Па шашы і прасёлачных дарогах увесь час прыбывалі новыя сілы фашыстаў. Камандзір танка лейтэнант П. В. Грамакоў успамінаў пасля, што яму было загадана прарвацца на сваім танку да вёскі Малое Гальцэва за падмацаваннем. Толькі танк выехаў з Марцюхова, як на яго абрушыўся моцны агонь нямецкіх пушак і мінамётаў. Экіпаж танка раздушыў гусеніцамі некалькі машын з фашыстамі, падавіў агнём некалькі бронемашын, але і савецкі танк быў падбіты. Танкістам удалося выбрацца з машыны і схавацца ў жыце, адкуль адстрэльваліся з аўтаматаў і кулямёта. Праз некаторы час на дапамогу перадавому атраду падышлі асноўныя сілы брыгады. Калі позна ўвечары бой сціх, поле каля шашы ўяўляла сабой могілкі варожай баявой тэхнікі. Нашы воіны страцілі ў гэтым баі 5 танкаў і некалькі баявых таварышаў. Іх пахавалі непадалёку ад в. Марцюхова, а ў якасці надмагілляў паставілі каткі ад танкаў.

У вызваленні раёна прымала ўдзел і 11-я гвардзейская армія (камандуючы генерал-лейтэнант К. М. Галіцкі). У складзе яе 11-я гвардзейская стралковая дывізія, 2-і танкавы, 16-ы і 8-ы (5-я, 26-я, 83-я гвардзейскія стралковыя дывізіі) гвардзейскія стралковыя карпусы. 26—27 чэрвеня войскі 11-й арміі наступалі ў раёне Орша — Коханава. К. М. Галіцкі так апісаў дзеянні сваёй арміі ў тыя дні: «Яе войскі поўнасцю выканалі пастаўленую на гэты перыяд задачу, выйшаўшы на рубеж

Абольцы, Пярэвалачня за 6 км на захад ад Коханава...

Камандаванне 3-га Беларускага фронту высока ацэньвала дзеянні войск 11-й гвардзейскай арміі ў гэты перыяд. У адным з справаздачных дакументаў штаба фронту яны былі ахарактарызаваны наступным чынам: «11-я гвардзейская армія, якая несла асноўны цяжар прарыву найбольш трывалай і шчыльна занятай праціўнікам абароны на аршанскім напрамку, своечасова выкарыстала поспех, які абазначыўся на яе правым флангу. Бесперапынна навісаючы з поўначы над аршанскай групоўкай немцаў, яна адкінула рэшткі яе ў лясы на поўдзень ад Оршы і адкрыла для нашых войск асноўны аператыўны напрамак у палосе фронту на Барысаў, Мінск» (Галіцкі К. М. Гады суровых выпрабаванняў, 1941—1944. М., 1973. С. 524, на рус. мове). У складзе 11-й арміі па тэрыторыі раёна прайшла з баямі 1-я гвардзейская Маскоўская мотастралковая дывізія, якая абараняла Талачыншчыну ў 1941 г.

31-я армія (62-я, 88-я, 220-я і іншыя стралковыя дывізіі) пад камандаваннем генерал-лейтэнанта В. В. Глаголева вызваляла паўднёвую частку раёна. У баявых дзеяннях па вызваленню Талачыншчыны прымалі ўдзел часці 3-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса.

Пры вызваленні талачынскай зямлі ад фашыстаў савецкія воіны праявілі масавы гераізм і бясстрашную мужнасць. 26 чэрвеня, калі на подступах да горада разгарнуліся жорсткія танкавыя баі, батальён, у складзе якога ваяваў гвардыі сяржант механік-вадзіцель танка Т-34 Андрэй Холадаў, прарваў моцную абарону ворага і выйшаў на Маскоўскую шашу. Доўга не раздумваючы, адважны танкіст першы вывеў сваю баявую машыну на шашу і гусеніцамі пачаў плюшчыць баявую тэхніку ворага. Гэта атака была кароткай, але ў час яе было знішчана каля 20 аўтамашын з жывой сілай і ваенным грузам, чатыры гарматы і шэсць мінамётаў. А. І. Холадаў быў узнагароджаны за свой подзвіг ордэнам Леніна.

У той жа дзень на ўчастку шашы Талачын — Славені танкісты нанеслі фашыстам магутны ўдар. У баі вызначыўся гвардыі малодшы лейтэнант Рыгор Сяргеевіч Шаршнёў. Ён са сваім экіпажам знішчыў два танкі «пантэра», дзве супрацьтанкавыя гарматы, дзве зенітныя гарматы, падавіў агонь аднаго мінамётнага разліку. Уварваўшыся ў калону адступаючага ворага, раздушыў сваім танкам 45 павозак з ваенным грузам і 30 аўтамашын. Адважны камандзір танка быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

У першых баях на вуліцах горада фашыстам удалося падпаліць танк камандзіра ўзвода гвардыі лейтэнанта Юрава. «Некаторы час ён і яго экіпаж не заўважалі небяспекі і працягвалі «прасаваць» ворага. Снарад трапіў у машыну. Полымя ахапіла танк, але ён працягваў весці бой, пакуль не скончыліся боепрыпасы.

Фашысты вырашылі бліжэй прабрацца да палаючай машыны. У гэты час адчыніўся люк, і адтуль у языках полымя паказаўся афіцэр-танкіст з пісталетам у руках. Ён упаў, скошаны варожай куляй. У гэты час узарваліся бакі танка... Малады камуніст Юраў і яго таварышы да канца выканалі свой абавязак перад Радзімай... Помсцячы за смерць таварышаў, танк камсамольца Баркова ўступіў у няроўны бой адразу з дзвюма самаходкамі ворага, трапна пасылаючы снарады то ў адзін, то ў другі бок. Аташомленыя дзёрзкасцю гвардзейца, гітлераўцы адступілі» (У баях за Беларусь. С. 374).

Пры штурме чыгуначнай станцыі Коханава экіпаж танка Т-34, камандзірам якога быў малодшы лейтэнант масквіч Раман Жолудзеў, уступіў у паядынак з варожай артылерыяй. У танкістаў была перавага ў рухомасці. Яны некалькі разоў заходзілі з розных бакоў для стральбы па фашыстах і знішчылі дзве варожыя гарматы, расчысцілі дарогу іншым танкам. Але тут узмацнілі агонь гітлераўскія мінамётчыкі. Яны стралялі з укрыццяў, адчуваючы сябе ў бяспецы. Аднак і да іх дабраўся экіпаж Т-34. Танкістам удалося абысці праціўніка і атакаваць варожых мінамётчыкаў з тылу. Іх батарэя была знішчана. У ходзе баёў за Коханава экіпаж знішчыў таксама некалькі дзесяткаў гітлераўцаў.

Вадзіцель матацыкла Іван Глотаў, ураджэнец сяла Нова-Мікалаеўка Пачынкаўскага раёна, непадалёку ад Талачына 27 чэрвеня 1944 г. разам з групай таварышаў на вялікай скорасці ўварваўся ў абарону праціўніка. Матацыклісты вялі агонь па ворагу з аўтаматаў. Трашчалі маторы, стракаталі аўтаматы, здавалася, што матацыклісты былі ўсюды. У адным месцы Талачына байцы адрэзалі шлях адступаючаму праціўніку і знішчылі яго. У баях за Талачын і вёску Дзянісавічы Іван Глотаў знішчыў больш як трыццаць гітлераўцаў. За гэтыя баі ён быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Пасля Іван Глотаў стаў поўным кавалерам ордэна Славы трох ступеней (два наступныя ордэны Славы ён атрымаў за вызваленне Літвы і за баі ва Усходняй Прусіі).

Вялікі ўклад у вызваленне Талачыншчыны зрабілі савецкія лётчыкі. Падраздзяленні 1-й паветранай арміі правялі унікальную аперацыю па выратаванню чыгункі на ўчастку Орша — Талачын для забеспячэння паспяхо-

вага руху савецкіх часцей у напрамку Барысава. Дакладнымі ўдарамі храбрыя сокалы выводзілі са строю паравозы, а вагоны з нарабаваным дабром, з людзьмі, якіх фашысты збіраліся вывезці ў Германію, засталіся непашкоджанымі. Было падпалена і выведзена са строю каля 4 тысяч аўтамашын, разбіта каля 500 павозак, 10 паравозаў. За актыўны ўдзел у аперацыі вялікай групе лётчыкаў было прысвоена званне «Ганаровы чыгуначнік», многія былі прадстаўлены да ўрадавых узнагарод (глядзі артыкул «Лётчыкі — ганаровыя чыгуначнікі»). Вадзілі свае самалёты ў небе Талачыншчыны ў тых гарачых баях Героі Савецкага Саюза Б. С. Акрэсцін, Л. І. Бяда, М. Г. Гарэеў, П. М. Жаўтухін, П. К. Лобас, М. І. Марцьянаў, В. Г. Казянкоў і іншыя. Пагеройску загінуў у паветраным баі каля вёскі Аўхуты сын французскага народа, лётчык славутай эскадрыллі «Нармандыя — Нёман» Жак Гастон. (Пра кожнага з іх глядзі асобныя артыкулы ў рубрыцы «Яны вызвалялі Талачыншчыну».) У паветраным баі каля Талачына загінуў Герой Савецкага Саюза лётчык-знішчальнік гвардыі лейтэнант І. А. Арцём'еў.

Ачысціўшы талачынскую зямлю ад фашысцкай навалы, савецкія войскі паспяхова працягвалі наступленне ў напрамку сталіцы Беларусі — Мінска. Ілья Эрэнбург пісаў аб тых днях: «Цяжкімі лясны мі дарожкамі панесліся да Мінска, абганяючы ворага, танкісты-тацынцы... Звыш трох тысяч нямецкіх машын з танкамі і самаходкамі ішлі па дарозе ў 4 рады. Яны не прайшлі: ні танкі, ні машыны, ні салдаты... Яшчэ не паспелі прыбраць каля Талачына мешаніну з жалеза і трупаў, як пачалося новае пабоішча паміж Мінскам і Ракавам» (Эрэнбург І. Летапіс мужнасці. 2 выд. М., 1983. С. 306, на рус. мове).

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў радах Чырвонай Арміі і ў тыле ворага мужна змагаліся тысячы талачынцаў. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў гады вайны, дзесяці ўраджэнцам раёна было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Яго былі ўдастоены: Марыя Барысаўна Осіпава, арганізатар аперацыі па знішчэнню генеральнага камісара Беларусі гаўляйтэра В. Кубэ; камандзір гарматы гвардыі сяржант Фёдар Кузьміч Анташкевіч; партызан Пётр Антонавіч Галецкі, які цаной свайго жыцця падарваў варожы эшалон з гаручым; сакратар Гомельскага падпольнага абкома партыі і партызанскі генерал Ілья Паўлавіч Кожар; бясстрашныя лётчыкі Міхаіл Сцяпанавіч Камельчык і Аляксей Андрэевіч Лузгін; камандзір стралковага палка падпалкоўнік Фёдар Яфрэмавіч Макавецкі; камандзір штурмавога стралковага батальёна капітан Мікалай Пятровіч Лугоўскі; камандзір штурмавога авіяпалка палкоўнік Пётр Фёдаравіч Сычэнка; адважны сувязіст Яўген Міхайлавіч Целешаў.

Легендарная ваенная біяграфія ў Андрэя Міхайлавіча Усава, удзельніка вызвалення Заходняй Беларусі, савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў, адважнага абаронцы Ленінграда (глядзі артыкул «Танкавы паядынак»).

Бяспрыкладную мужнасць і адвагу праявілі ў баях з ворагам лётчыкі — сыны Сцяпана Паўлавіча Пляца з Азерцаў: Іван, Дзмітрый, Леанід і Міхаіл. Жонкі Міхаіла і Леаніда — лётчыцы, Героі Савецкага Саюза Р. Е. Аронава і Р. С. Гашава. За гады вайны «сям'ёй крылатых» здзейснена 2465 баявых вылетаў. Каля 100 ордэнаў і медалёў — такая ўзнагарода Радзімы за ратныя і працоўныя подзвігі сям'і Пляцаў (глядзі артыкул «Арлінае крыніца»).

Артылерыст Міхаіл Сцяпанавіч Бельчык з в. Хаценічы абараняў Маскву, граміў ворага пад Вялікімі Лукамі і Невелем, на тэрыторыі Латвіі і Польшчы, дайшоў да Одэра, Зеелаўскіх вышынь, Берліна. У час вулічных баёў на тэрыторыі Берліна быў цяжка паранены. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі.

Ураджэнец в. Багданаўка, маёр-сувязіст Міхаіл Ягоравіч Лагойскі абараняў Маскву, браў Кёнігсберг, удзельнічаў у вайне з мілітарысцкай Японіяй. 6 ордэнаў і 12 медалёў — так ацаніла Радзіма яго ўклад у Перамогу.

Канстанцін Давыдавіч Сузень з вёскі Лазы — удзельнік абароны Масквы, баёў за Смаленск, Калінін, Вялікія Лукі, Кёнігсберг, вызвалення роднай Віцебшчыны, Польшчы. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Сяргей Іванавіч Француза з в. Замосце абараняў Маскву і Ленінград, браў Варшаву і Берлін. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі.

Нічыпар Кузьміч Козік з в. Хімец удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне, у час Вялікай Айчыннай абараняў Ленінград, Нарву, Ціхвін. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны, медалямі.

Старшы сяржант, камандзір аддзялення танкавай перасоўнай рамонтнай базы Ігнат Пятровіч Крывіцкі з в. Пеніна змагаўся на фронце з 23 чэрвеня 1941 г. да апошняга дня вайны, дайшоў да Берліна. У час Курскай бітвы (у баях пад Прохараўкай) аддзяленне І. П. Крывіцкага за 5 дзён адрамантавала 16 танкаў Т-34. Ігнат Пятровіч узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, двума

ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Абаранялі Ленінград Рыгор Іванавіч Грушэўскі і Васіль Васілевіч Краўцоў, Міхаіл Максімавіч і Кацярына Сямёнаўна Паляковы. Міхаіл Карнеевіч Савік абараняў родную Талачыншчыну, змагаўся з ворагам пад Масквой, на Курскай дузе, браў Берлін. Раман Фёдаравіч Міснік абараняў Каўказ і Крым. Мікалай Сямёнавіч Каравулаў абараняў Сталінград, вызваляў Варшаву, браў Берлін, узнагароджаны ордэнамі Аляксандра Неўскага, Багдана Хмяльніцкага III ступені, Айчыннай вайны II ступені. Ад Варонежа пачаў свой баявы шлях Мікіта Пятровіч Фядосаў, вызначыўся ў баях за балгарскі горад Варна, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, а пасля былі баі за Будапешт, Бялград, Вену. Анатоль Міхайлавіч Хадзянкоў прайшоў з баямі ад Волгі да Эльбы, дзе паціскаў рукі амерыканскім салдатам, браў Будапешт, вызваляў Прагу, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. З 22 чэрвеня 1941 г. да 9 мая 1945 г. змагаўся на фронце Васіль Дзмітрыевіч Сёмачкін, узнагароджаны двума ордэнамі, у складзе 11-й гвардзейскай арміі вызваляў родную Талачыншчыну ў чэрвені 1944 г. Іосіф Мікалаевіч Палатка ў пачатку вайны змагаўся ў складзе артдывізіёна, якім камандаваў капітан Мікалай Васілевіч Чапаеў, сын легендарнага палкаводца. Артылерысты-чапаеўцы адбівалі шалёны націск ворага на шашы Полацк — Невель. А пасля І. М. Палатка ваяваў пад Масквой і Смаленскам, Ржэвам і Вялікімі Лукамі, вызваляў родную Віцебшчыну, штурмаваў Кёнігсберг. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу». Міхаіл Якаўлевіч Баразна з Навасёлак абараняў Сталінград, штурмаваў Берлін, у складзе аўтабатальёна абслугоўваў савецкую ваенную адміністрацыю на Нюрнбергскім працэсе. Медсястра Ніна Маркаўна Звягінцава (Шалупіна) прымала ўдзел у абароне Сталінграда, вызваленні Украіны, Румыніі. Польшчы, у штурме Берліна. Узнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Цяжкімі дарогамі вайны прайшло шмат іншых ураджэнцаў Талачыншчыны, якія зрабілі свой уклад у агульную справу разгрому ворага.

5 ураджэнцаў раёна былі ўдастоены высокага воінскага гонару — быць удзельнікамі параду Перамогі на Краснай плошчы 24 чэрвеня 1945 г. Гэта Міхаіл Сцяпанавіч Камельчык, Георгій Фёдаравіч Шныркевіч, Іван Дзмітрыевіч Ярошкін, Іван Емяльянавіч Даронін, Іван Цітавіч Петракоў.

Гады «гаспадарання» нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі прынеслі незлічоныя беды і страты нашаму народу. У выніку бамбардзіровак, карных аперацый былі знішчаны мірныя жыхары, спалены жылыя дамы. На Талачыншчыне асабліва пацярпелі вёскі Рыдамля, Сіманава, Замошша і іншыя. Усяго ў раёне за гады вайны былі знішчаны 2294 жылыя дамы (амаль кожны пяты двор), 19 391 сельскагаспадарчая машына, 41 813 галоў жывёлы, пасевы на плошчы 33 582 га. Акупанты знішчылі ўсе прамысловыя прадпрыемствы, 9 школ, 19 клубаў, 2 бальніцы, 7 медпунктаў, 5 аптэк, 10 дзіцячых садоў і яслей, 39 магазінаў, 9 прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання. У 60 калгасах раёна грамадская маёмасць была поўнасцю знішчана. Толькі ў племзаводзе «Рэканструктар» было разбурана 19 жывёлагадоўчых памяшканняў, забрана больш чым 2 тыс. галоў жывёлы, знішчаны ўсе трактары і камбайны. У грашовым выражэнні страты раёна склалі больш за 200 млн. руб. (у маштабах цэн тых гадоў).

Але самымі цяжкімі і беззваротнымі былі людскія страты. Да вайны ў раёне пражывала 53 695 чалавек. Нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі ў раёне каля 9 тысяч мірных жыхароў, вывезлі ў фашысцкае рабства 2525 чалавек. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінула больш як 4,3 тысячы ураджэнцаў Талачыншчыны, у партызанскіх атрадах і падполлі — каля 580 чалавек.

Вялікая Айчынная вайна была самым цяжкім выпрабаваннем, якое выпала на долю савецкага народа, праверкай трываласці сацыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу. І савецкі народ з гонарам вытрымаў гэта выпрабаванне. Нягледзячы на вялікія людскія і матэрыяльныя страты, наш народ-пераможца выйшаў з гэтай вайны моцны духам, яшчэ больш згуртаваным, поўным жадання хутчэй узняць з руін сваю любімую Радзіму.

З. І. Каршакова, А. Л. Манавенкаў, А. А. Шнэйдар.

З партыйным архівам — у Маскву

Зайцава Вольга Ігнатаўна да вайны працавала ўчотчыцай у Талачынскім райкоме партыі. У гады Вялікай Айчыннай вайны выратавала архіў раённай партыйнай арганізацыі. У ліпеньскія дні 1941 г., калі Беларусь была ўжо ахоплена полымем вайны, даставіла яна архіў у Маскву. Потым працавала на заводзе ў Першаўральску, пасля служыла ў 36-м палку сувязі, дзе рыхтавалі ваенных тэлеграфістаў, ваявала ў падраздзяленні сувязі, якое абслугоўвала штаб 3-га Беларускага фронту. Мае ўзнагароды. Жыве ў Талачыне.

Доўгім і небяспечным быў шлях В. І. Зайцавай у Маскву. Вось што расказала аб гэтым сама Вольга Ігнатаўна:

У першыя дні вайны многія райкомаўцы пайшлі на фронт. У тым ліку і загадчык сектара ўліку Кудзін. Выклікаў мяне першы сакратар райкома партыі таварыш Саннікаў і кажа: «Прымайце дакументацыю». Прыняла. Разам з памочнікам сакратара Валентавым перабралі архіў. Частку дакументаў знішчылі. Пакінулі самыя важныя. Спяшаліся. Нямецкая авіяцыя бамбіла ўжо шашу Масква — Мінск. Па ёй, здаецца, бясконцым патокам рухаліся адступаючыя часці, бежанцы.

2 ліпеня абарвалася сувязь з Мінскам. Таварыш Саннікаў загадаў мне везці архіў у Віцебск. Там яго неабходна было перадаць абкомаўскім работнікам, атрымаць даведку, а затым вярпуцца назад. У мяне і сэрца пахаладзела ад такіх слоў. Ці жартачкі, у такую часіну — і ў Віцебск. Дома заставаліся састарэлая маці і чатырохгадовы Генечка. Муж быў на фронце. Але перасіліла сябе. Партыйная дысцыпліна — вышэй за ўсё. Іду дадому, зямлі пад нагамі не бачу. Слёзы самі льюцца. З ганку — да маці. Расказала. Матуля супакоіла. На развітанне, між іншым, сказала:

«Калі немцы прыдуць у Талачын раней, чым ты вернешся, едзь да брата ў Чыпінскую вобласць». (Васіль быў кадравым афіцэрам і служыў на Далёкім Усходзе.)

Таропка сабрала чамаданчык. Быццам бы прадчувала: няхутка вярнуся. Тое-сёе з прадуктаў узяла і бягом у райком. Там ужо грузілі архіў у «палутарку». «Ну, у добры шлях»,— узняўся за баранку шафёр Лушчанка. Прымасцілася ля яго. Думкі пра дом не пакідалі. Як яны там без мяне, мае родныя?

У Віцебск трапілі акурат праз суткі. Нацярпеліся страху. Немцы вельмі бамбілі шашу Масква — Мінск. Таму выбіралі больш бяспечныя дарогі. Заблудзіліся. У той дзень немцы ўжо і Віцебск абстрэльвалі. Лушчанка падруліў да абкомаўскага будынка. Подбегам лячу ў прыёмную. Накіравалі да сакратара абкома партыі таварыша Панова.

— Чаму так спазніліся? — сурова запытаў ён. Твар у сакратара быў заклапочаны, нясвежы, напэўна, ад недасыпання і розных турбот.

— Заблудзіліся. Дарога ж няблізкая.— А самую ад стомы ў бакі хістае. Вейкі зліпаюцца.

Таварыш Паноў прайшоўся па кабінеце, рэзка павярнуўся:

— Прыйдзецца вам, таварыш Зайцава, самой архіў у Маскву везці,— і лагодней дадаў: — Спадарожніца добрая — калега ваша з Сянно. Абкомаўскі ж архіў ужо на шляху да сталіцы.

Таварыш Паноў падпісаў камандзіровачнае пасведчанне мне і работніцы Сенненскага райкома партыі Настассі Няфёдавай. Выдалі нам праязныя дакументы і па некалькі металічных скрынак для архіваў. Заказалі і білеты. У чарзе не стаялі. На чыгуначным вакзале панавала неразбярыха, чуўся дзіцячы плач, жаночы лямант...

Паклалі мы скрынкі над лавы ў вагоне. Агледзеліся. Не тое што сесці, павярнуцца было недзе. Людзі ў тамбурах стаялі. Пашанталіся з Насцяй. Рашылі вартаваць дакументы па чарзе. Адна спіць, другая — на пасту.

Да Рудні, што на Смаленшчыне, дабраліся без асаблівых прыгод. Як цяпер памятаю, на невялікай станцыі ўсе пуці былі заняты саставамі. Колькі прастаім, не ведалі. Даймаў голад.

— Ты, Насця,— кажу,— павартуй, а я на станцыю — хлебам можа разжывуся.

— Глядзі, не адстань,— занепакоілася мая спадарожніца.

— Не хвалюйся, лепш за дакументамі сачы,— сказала, а ў самой сэрца не на месцы. Прадчувала благое, але выгляду не паказала. Скокнула з прыступкі — і да вакзальчыка. А там людзей — яблыку няма дзе ўпасці. Толькі перавяла дыханне ля дзвярэй, пачуўся гул самалётаў.

— Немцы, самалёты, бамбяць! — загуў натоўп.

Знячэўку ў мяне і ногі адзервянелі. Стала як слуп — ні туды і ні сюды. Там жа дакументы!

— Чаго стаіш, як варона,— злосна выгукнуў прабягаючы побач мужчына.— Жыць надакучыла?

Схапіў мяне за руку і пацягнуў у нейкі падвал. Там ужо людзей было, як селядцоў у бочцы. Перачакала налёт. Ледзьве аціхла кананада, бягом кінулася на вуліцу. На станцыйных пуцях валяліся абломкі вагонаў. Кінулася да свайго. Дзякуй богу, цэленькі. Забегла ўсярэдзіну, насустрач кінулася Насця. Калоціцца, плача. Не супакоіць. Потым па парадку расказала. Калі ўсчалася бамбёжка, памкнулася Насця вынесці скрынкі. Пад руку падвярнуўся нейкі мужчына. Помачы папрасіла. «Грошы? — грозна засіпеў той.— Ключ давай!» А сам па кішэнях паляпвае. Маўчы, маўляў, а то каюк. «Якія грошы,— дакументы».— спалохана вымавіла Насця. Калі б не чыгуначнік, які па нейкай патрэбе на хвілінку заскочыў у вагон, не ведала, ці жывая была б. А тут непадалёку бомба ўпала. Вагон моцна страсянула. Шкло павылятала з вокнаў. Рабаўнік уцёк. Насця дакументаў не пакінула. Усю бамбёжку пераседзела ў вагоне. Відаць, у сарочцы нарадзілася...

Выручылі нас работнікі Руднянскага райкома партыі: пасадзілі на спадарожны поезд. У вагоне ехалі ваенныя. Абедалі. У нас — ні

расінкі ў роце. Пракаўтнём сліну і ў акно глядзім.

— Што пасы павесілі, прыгажуні? — ветліва звярнуўся да нас адзін з афіцэраў.— Мабыць, есці хочаце?

— Дзякуй, сытыя,— засаромеліся мы.

— Вазьміце тады сухарыкаў, зубкі павастрыце,— пажартаваў нехта з ваенных.

Так і даехалі да Масквы. Здалі архіў па прызначэнню. І першай справай — на тэлеграф.

— Мне б, родненькая, «маланку» адбіць,— не пераводзячы дыхання, выгукнула я.

— Тэрміновыя ад цывільных не прымаем,— растлумачыла тэлеграфістка і больш прыміранча дадала: — А куды тэлеграму даеце?

— У Талачын. Гэта Віцебская вобласць.

Тэлеграфістка вырачыла вочы:

— Куды, куды? Там жа немцы...

Дзе стаяла, там і села. Млосна стала. Дзякуй, добрыя людзі адпаілі, на ногі паставілі...

Расказ запісаў Ул. Шаўчэнка.

Вяртанне ў юнацтва

З успамінаў былога селькора газеты «Чырвоны хлебароб» І. В. Ухваронка

Іван Васілевіч Ухваронак родам з Валосаўскага сельсавета Талачынскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. 35 гадоў праслужыў на Узброеных Сілах СССР, прайшоў шлях ад салдата да палкоўніка, выкладчыка Ваенна-палітычнай акадэміі імя У. І. Леніна ў Маскве. Пасля выхаду ў запас — на інспектарскай рабоце ў Міністэрстве культуры РСФСР.

Лета 1941 г. я сустрэў у роднай вёсцы Высокі Гарадзец. Прыехаў на канікулы (вучыўся ў сярэдняй школе ў Гомелі). Але зусім не так пайшлі канікулы, як планавалася. Хутка мяне тэрмінова выклікаў рэдактар «Чырвонага хлебароба» А. М. Зусін. Прайшло ўжо некалькі дзён вайны. Амаль усе супрацоўнікі рэдакцыі (мужчыны) былі мабілізаваны. Але рэдакцыя і не думала спыняць работу. Паколькі А. М. Зусін ведаў мяне як актыўнага селькора, папрасіў папрацаваць у газеце. А тое, што друкаванае слова тады было неабходна, як ніколі, мы добра ведалі. Фронт няўмольна рухаўся на ўсход. Трэба было даваць адпор усімі сродкамі, а галоўнае — сеяць у душах людзей зерні надзеі на перамогу, узняць іх баявы дух. Ужо з першага дня вайны Беларускае тэлеграфнае агенцтва не перадавала па радыё матэрыялаў для раённых газет. Каб паведаміць чытачам пра становішча на фронце, прыходзілася слухаць паведамленні ТАСС, тут жа запісваць іх, перакладаць на беларускую мову і здаваць у набор. Калі не паспявалі за дыктарам, званілі калегам у Сянно, Оршу або Барысаў. Звяралі тэкст, дапамагалі адзін аднаму. У дні мабілізацыі раёнка друкавала звесткі з калгасаў, сельсаветаў пра абаронную работу, якая праводзілася там.

Праз дзень-другі мне давялося пабываць у Нізкім Гарадцы на прызыўным пункце мясцовага сельскага Савета. Аб патрыятызме землякоў, аб іх жаданні змагацца з ненавісным ворагам расказаў у карэспандэнцыі. На жаль, гэтай газеты я не знайшоў у Цэнтральнай бібліятэцы імя У. І. Леніна. Мабыць, у той трывожнай абстаноўцы не ўсе газеты адсылаліся ў Маскву.

І ўсё ж я знайшоў у бібліятэцы некалькі нумароў «Чырвонага хлебароба» першых дзён вайны — ад 25 чэрвеня, 1 ліпеня. Фармат газеты ўжо быў паменшаны — мы эканомілі паперу. Але і невялікага аркуша хапала, каб паведаміць асноўныя звесткі аб баях.

А фронт няўмольна набліжаўся да Талачына. У зводках ужо з'явіліся мінскі і лепельскі напрамкі. Хутка мы пачулі і першую канаду: баі ішлі пад Барысавам. Мы пачалі рыхтавацца да прыходу ворага. На дварэ рэдакцыі схавалі ў тайніку ў склепе шрыфты, абсталяванне, каб не дасталіся фашыстам, скінулі з моста ў Друць вялікі рулон паперы. У гэты дзень у Талачын прыйшлі нашы салдаты. Горка было бачыць іх, вымушаных аддаваць ворагу родную зямлю.

Так семнаццацігадовым юнаком, камсамольцам, супрацоўнікам раёнкі сустрэў я Вялікую Айчынную вайну. Разам з рэдактарам Зусіным пакідаў родную Талачыншчыну. Сотні кіламетраў прайшлі і праехалі з ім у тыл. Не так было цяжка фізічна, як маральна. Балюча было глядзець на бежанцаў — змораных дзяцей, жанчын, якія не хацелі трапіць у лапы лютага ворага.

Так дайшлі мы да горада Плаўска Тульскай вобласці. Тут рэдактар перадаў супрацоўнікам органаў унутраных спраў круглую пячатку рэдакцыі газеты «Чырвоны хлебароб»... Вось так пачалася і так закончылася мая работа ў рэдакцыі. Вясковаму хлопцу, які марыў аб прафесіі журналіста, прыйшлося стаць салдатам.

Потым былі ваеннае вучылішча, фронт, раненне, шпіталь. Пасля вайны — зноў вучоба, работа на розных вайсковых пасадах. І ўсё ж з журналістыкай я не парваў. Будучы на службе, пісаў у розныя армейскія выданні артыкулы, кароткія карэспандэнцыі.

...Ва ўтульнай цішыні бібліятэчнай залы перабіраю ў памяці мінулае: шмат дзе друкаваўся, а вось гэтыя кароткія карэспандэнцыі ў «Чырвоным хлебаробе» даражэй за ўсе іншыя. Гэтыя старыя падшыўкі не проста дакументы, рэліквіі, яны — памяць, вяртанне ў юнацтва.

Як ратавалі жывёлу

З успамінаў Ганны Якаўлеўны Грыгаровіч

У 16 гадоў я пайшла працаваць даяркай у калгас, у 1936 г. ўступіла ў камсамол. У той год наш калгас «Перамога» за дасягнутыя поспехі стаў удзельнікам сельскагаспадарчай выстаўкі. Мы, даяркі, змагаліся за высокія надоі (даілі, канешне, уручную), калгас набіраў моц. Мы шмат працавалі, але жылі цікава. Усё было цудоўна. Але вайна ўсё перакрэсліла. 3 ліпеня на ферму прыбег старшыня праўлення і сказаў мне:

— Немцы пад Барысавам, хутка будуць тут. Патрэбна ратаваць жывёлу! Пагоніце кароў і авечак па ўсход.

Увечары таго ж дня мы былі ўжо ў дарозе. Акрамя мяне, ратаваць жывёлу было даручана сямі калгаснікам: М. Зезюлевічу, М. Палякову, І. Краснашчокаму, Ф. Міцкевічу, А. Балоціну, Р. Зайцаву, Ф. Шышко. Мы павінны былі даставіць у Оршу сотню кароў і 150 авечак. У Оршы мы трапілі пад страшэнную бамбардзіроўку. Горад і вакзал гарэлі. Але трэба было рухацца наперад, на ўсход, і мы пайшлі, пераадолеўшы гэты вогненны рубеж. Усё абышлося добра. Уцалелі і людзі, і жывёла. Мы ішлі і ў спякоту, і ў дождж, і ў холад, пад бомбамі і кулямі, без хлеба і вады, ішлі і ўдзень, і ўначы. Нават жывёла і тая разумела, што так патрэбна, цярпліва і паслухмяна рухалася далей ад родных мясціп, якія былі ў агні. Мы праходзілі па 100 км за суткі. За першы месяц, з 3 ліпеня да 3 жніўня мы здолелі зайсці ў глыбокі тыл. Але сілы паціху пакідалі нас. Пад канец свайго шляху мы пераадольвалі толькі 30 км за суткі. Нарэшце ў верасні мы прыйшлі ў Чувашскую АССР, пераадолеўшы за 3 месяцы 1700 км. Спыніліся ў вёсцы Кладбішча. Неўзабаве майго мужа, Рыгора Зайцава, і яшчэ двух мужчын — Айзіка Балоціна і Фёдара Шышко — прызвалі ў Чырвоную Армію. На жаль, ім не давялося дажыць да светлага дня Перамогі. Усе яны загінулі на франтах вайны. А мы, пяцёра, што засталіся, працавалі і за іх. Даглядалі жывёлу, сеялі і ўбіралі хлеб. Здаралася, што самі недаядалі, а фронту аддавалі ўсё: мяса, масла, хлеб. Адразу пасля вызвалення Талачыншчыны вярнуліся разам са сваёй жывёлай дадому. Праўда, нашаму калгасу дасталося толькі 25 кароў, астатніх раздалі ў іншыя гаспадаркі. Балюча было бачыць зруйнаваны Талачын, спаленыя ў вёсках хаты. Не хацелася верыць, што больш ніколі не ўбачу мужа, брата, які загінуў у 1942 г., не ведала, ці вернецца назад сястра, вывезеная ў Германію. І зноў праца, цяпер ужо на роднай зямлі — даяркай, звеннявой у паляводстве, свінаркай. За шматгадовую сумленную працу маю шмат узнагарод.

У імя жыцця

Сцяпан Паўлавіч Супрун — двойчы Герой Савецкага Саюза (20.5.1940 г. і 22.7.1941 г.). Нарадзіўся 2.8.1907 г. у с. Рэчкі Белапольскага раёна Сумскай вобласці. Украінец. Член КПСС з 1930 г. Лётчык-выпрабавальнік у НДІ ВПС. У 1939 г. удзельнік баёў супраць японскіх захопнікаў у Кітаі, савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны камандзір сфарміраванага з лётчыкаў-выпрабавальнікаў знішчальнага авіяпалка асобага прызначэння, які змагаўся на тэрыторыі Беларусі. С. П. Супрун у першым жа паветраным баі знішчыў 2 самалёты ворага, лётчыкі палка пад яго камандаваннем толькі 2 і 3 ліпеня 1941 г. збілі 8 самалётаў. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання. Загінуў 4.7.1941 г.

Многа гадоў аставаліся невядомыя абставіны гібелі і месца пахавання С. П. Супруна. Адразу пасля бою пошукі самалёта былі беспаспяховыя, а потым мясцовасць была акупіравана ворагам. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пошукі былі адноўлены. У іх прыняў удзел брат героя падпалкоўнік Ф. П. Супрун. Работа гэта аказалася нялёгкай, таму што трохвугольнік Лепель — Талачын — Барысаў (раён верагоднага падзення самалёта) быў плошчай больш чатырох тысяч квадратных кіламетраў. Пасля пошукаў у цэнтральным архіве Міністэрства абароны было знойдзена данясенне Несцерцава, камандзіра 23-й авіяцыйнай дывізіі, у якую ўваходзіў 401-ы знішчальны полк, начальніку штаба ВПС Заходняга фронту ў сувязі з гібеллю С. П. Супруна, у якім гаварылася, што ў раёне горада Талачына быў выяўлены згарэлы самалёт і труп лётчыка, у абломках самалёта знойдзена Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза.

С. П. Супрун.

Я. Р. Крэйзер.

Імем С. П. Супруна названы вуліцы ў Маскве, Сумах, Талачыне. Устаноўлены помнікі на радзіме героя — у с. Рэчкі, у Сумах, каля месца гібелі — у в. Палявая і на магіле ў Маскве. Жыхары Талачыншчыны свята ўшаноўваюць памяць слаўнага сына Радзімы. Коласаўскай васьмігадовай школе прысвоена імя С. П. Супруна. Піянеры школы збіраюць матэрыялы аб жыцці і баявых справах адважнага лётчыка, перапісваюцца з яго роднымі, у госці да іх прыязджаў брат героя Ф. П. Супрун, дэлегацыя рабочых аднаго з заводаў, на якім працаваў Сцяпан Паўлавіч, юныя следапыты сумскай школы-інтэрната і іншыя. Вобраз адважнага сокала Радзімы назаўжды застанецца ў памяці народнай.

А. А. Шнэйдар.

У 1960 г. ў Талачынскай раённай газеце «Ленінец» было надрукавана пісьмо Ф. П. Супруна, у якім ён прасіў жыхароў паведаміць пра месцы падзення збітых самалётаў на гэтым участку фронту. На другі дзень у рэдакцыю зайшоў адзін з жыхароў вёскі Сурнаўка Талачынскага раёна калгасны каваль Міхаіл Яфімавіч Пакатовіч і расказаў, што 4 ліпеня 1941 г. ён быў байцом паста паветранага назірання ў раёне Друцкага гарадзішча. Тут ён стаў відавочцам паветранага бою савецкага знішчальніка з шасцю фашысцкімі самалётамі. У гэтым няроўным баі савецкі лётчык збіў фашысцкі знішчальнік, але і сам быў падпалены. Праз некалькі мінут камандзір паста і байцы паветранага назірання былі каля месца падзення самалёта. Яны ўбачылі абпалены труп лётчыка, а на адкрытай ране каля сэрца — Залатую Зорку Героя Савецкага Саюза.

5 ліпеня 1941 г., калі немцы былі зусім блізка, мясцовыя жыхары Д. П. Васілеўскі і А. Я. Акуловіч пахавалі лётчыка. Труну зрабілі з металічных шчытоў абгарэлага самалёта. У гады вайны абодва патрыёты загінулі, і ніхто не ведаў месца пахавання лётчыка.

За 19 гадоў месца пахавання, паказанае М. Я. Пакатовічам і іншымі жыхарамі, зарасло хмызняком і маладым лесам. Гэта ўскладніла пошукі. Дапамаглі сапёры адной з частей Беларускай ваеннай акругі пад кіраўніцтвам маёра А. С. Гаўруціна. Астанкі лётчыка-героя, які ляжаў у своеасаблівай труне, былі знойдзены. Удалося выявіць часткі самалёта, на якім ён лятаў. Па гэтых і іншых прыкметах было ўстаноўлена, што недалёка ад вёскі Манастыры (ціпер вёска Палявая) Талачынскага раёна смерцю храбрых у баі з ворагамі загінуў С. П. Супрун. Яго астанкі былі перавезены ў Маскву і там перапахаваны.

Помнік на месцы гібелі С. П. Супруна каля в. Палявая.

Гвардзейцы-масквічы

З успамінаў Я. Р. Крэйзера

Якаў Рыгоравіч Крэйзер — Герой Савецкага Саюза (22.7.1941), генерал арміі (1962). Нарадзіўся 4.11.1905 г. у Варонежы ў сям'і дробнага гандляра. Член КПСС з 1925 г. Скончыў Варонежскую пяхотную школу (1923), курсы «Выстрал» (1931), курсы ўдасканалення вышэйшага начальнага саставу пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1949). У Чырвонай Арміі з 1921 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Бранскім, Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім, Ленінградскім, 1-м, 2-м Прыбалтыйскіх франтах. Камандзір 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіі палкоўнік Я. Р. Крэйзер вызначыўся ў абарончых баях у раёне Барысава, Талачына і Оршы ў ліпені 1941 г. Дывізія пад яго камандаваннем на двое сутак затрымала праціўніка на р. Бярэзіна і на некальні сутак яго наступленне ў напрамку Дняпра. Воіны 1-й Маскоўскай Пралетарскай мотастралковай дывізіі абаранялі Маскву, ваявалі на Арлоўскім плацдарме, на беларускай зямлі і ў Прыбалтыцы. За ўдзел у вызваленні сталіцы Беларусі дывізія атрымала ганаровае найменне «Мінская». У ліпені 1944 г. пад камандаваннем Я. Р. Крэйзера войскі 51-й арміі ўдзельнічалі ў баях у раёне Полацка. Пасля вайны Я. Р. Крэйзер — камандуючы арміяй, войскамі шэрагу ваенных акругоў, начальнік вышэйшых афіцэрскіх курсаў «Выстрал», з 1969 г. ваенны інспектар-саветнік Групы генеральных інспектараў Міністэрства абароны СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 6-га склікання. На XXII з'ездзе КПСС быў выбраны членам Цэнтральнай рэвізійнай камісіі. Памёр 29.11.1969 г.

Першыя месяцы вайны. Чырвоная Армія, вымушаная адступаць пад націскам перавышаючых сіл праціўніка, вяла цяжкія абарончыя баі. У гэтых умовах савецкае камандаванне прыняло тэрміновыя меры, каб падцягнуць з глыбіні краіны на захад вайсковыя часці і злучэнні. 1-я Маскоўская Пралетарская мотастралковая дывізія з Падмаскоўя была перакінута ў раён Барысава. Перад воінамі стаяла задача не дапусціць прарыву варожых войск цераз Бярэзіну ў напрамку Оршы на ўчастку 50 км. Уперадзе дывізіі дзейнічаў разведбатальён пад камандаваннем капітана П. Т. Цыганкова. У першых жа баявых аперацыях батальён дзейнічаў рашуча, смела і даставіў важныя звесткі камандзіру дывізіі. У схватках з ворагам разведчыкі прадэманстравалі высокі гераізм. Так, адзін з браневікоў быў падбіты фашыстамі, механік-вадзіцель загінуў. У нерухомай машыне засталіся двое — малодшы палітрук Андрэй Пачапцоў і радыст Голенаў. Да апошняй магчымасці адбіваліся яны ад насядаючага ворага. Калі скончыліся патроны, яны сталі кідаць у ворага гранатамі праз люк. Але не стала і гранат. Гітлераўцы падпалілі бранявік, білі прыкладамі па палаючай машыне і крычалі: «Рус, здавайся, гарыш!» У адказ разведчыкі заспявалі «Інтэрнацыянал». Яны выбралі пакутлівую смерць замест ганебнага палону. Капітан П. Т. Цыганкоў за смелыя баявыя дзеянні ў ліпені 1941 г. быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

К 12 гадзінам 30 чэрвеня часці дывізіі падышлі да Бярэзіны і з ходу перайшлі да абароны на ўсходнім беразе ракі. Рыхтуючыся да баёў з ворагам, падраздзяленні акапаліся. Настрой ва ўсіх быў адзін — выстаяць. У хуткім часе з'явіліся варожыя бамбардзіроўшчыкі, а ўслед за разрывамі авіябомбаў загаварылі гарматы і мінамёты. Здавалася, нельга выжыць ад гэтага вогненнага смерчу. Але вытрымка і стойкасць воінаў-масквічоў аказаліся мацней. І калі часці фашысцкага генерала Гудэрыяна выйшлі да Бярэзіны, то сустрэлі тут арганізаванае і ўпартае супраціўленне. У выніку кровапралітных баёў у раёне Барысава ворагу былі нанесены значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы (за 3 дні праціўнік страціў да 60—70 танкаў і каля 3 тысяч салдат і афіцэраў). Аднак становішча заставалася напружаным: танкі і мотапяхота 47-га танкавага корпуса праціўніка прасунуліся ўздоўж шашы ў напрамку Лошніцы. Тады было прынята рашэнне сіламі 12-га танкавага і 6-га мотастралковага палкоў контратакаваць у фланг групоўку праціўніка, што прарвалася да Лошніцы. У ходзе контратакі разгарэлася вялікая танкавая бітва, у якой з абодвух бакоў удзельнічала больш за 300 танкаў. Нашы танкі КВ і Т-34 паказалі ўсю моц савецкай брані і значную перавагу над танкамі праціўніка. Вораг панёс значныя страты ў танках і іншай баявой тэхніцы, яго наступленне было прыпынена да 5 ліпеня, а часці нашай дывізіі выйгралі час для заняцця абароны на рубяжы ракі Нача.

Група сапёраў-падрыўнікоў атрымала загад прапусціць па мосце цераз раку Нача ўсе нашы танкі і затым узарваць яго. Сапёры з укрыцця пільна сачылі за дарогай. Ужо прайшлі нашы пехацінцы, паказаліся нашы танкі, а за імі і нямецкія, якія хутка набліжаліся да моста. Калі на мост узышоў першы варожы танк, выбух вялікай сілы падняў яго ў паветра. Сапёры-падрыўнікі Ткач і Бандарэнка ведалі, што не паспеюць схавацца ва ўкрыцце. Яны загінулі як героі і перагарадзілі дарогу фашысцкім танкам. Праціўнік быў вымушаны паводзіць пераправу пад агнём нашых падраздзяленняў.

У далейшым, прымяняючы тактыку рухомай абароны, часці 1-й мотастралковай дывізіі вялі ўпартыя баі з ворагам днём. А ноччу, каб не дапусціць абхвату флангаў дывізіі, непрыкметна адрываліся ад праціўніка на 10—12 км і пераходзілі да абароны на наступным зручным рубяжы. Зранку гітлераўцы працягвалі развіваць наступленне ў баявых парадках, але білі на пустым месцы і толькі апоўдні выходзілі на сутыкненне з час-

цямі нашай дывізіі і сустракалі арганізаваную абарону на новым рубяжы. Так дзень за днём на працягу 11 сутак вымотваліся сілы праціўніка, затрымлівалася яго наступленне, выйграваўся час.

Напружаныя баі з 47-м танкавым корпусам разгарнуліся на рубяжах р. Нача, Крупкі, р. Бобр, Талачын, Коханава, р. Адроў. Асабліва жорсткія баі ішлі за Талачын, дзе 1-я мотастралковая дабілася значнага поспеху. У баях пад Талачыном вызначыліся адвагай у рукапашнай схватцы з праціўнікам батальёны капітанаў В. Былінкіна і П. Шурухіна, якія імкліваў і нечаканай атакай разгромілі калону мотапяхоты, што набліжалася да Талачына. Павел Шурухін быў выключна валявы і смелы камандзір. За час вайны ён стаў генерал-маёрам, здзейсніў не адзін гераічны подзвіг, стаў двойчы Героем Савецкага Саюза.

У выніку цяжкіх баёў праціўнік быў выбіты з Талачына. Пад Талачыном было ўзята ў палон 800 варожых салдат і афіцэраў, 350 аўтамашын, захоплены сцяг 47-га Берлінскага танкавага корпуса. Наша дывізія на працягу сутак утрымлівала горад. Немцы, падцягнуўшы свежыя сілы, абрушылі на нашы часці магутныя ўдары авіяцыі і артылерыі.

На працягу 8 і 9 ліпеня ішла барацьба за Талачын, які двойчы пераходзіў з рук у рукі. К 20 гадзінам 9 ліпеня 1-я мотастралковая дывізія пад націскам ворага вымушана была адысці на наступны рубеж абароны — Коханава. Мы моцна яго ўтрымлівалі і нанеслі значныя страты 18-й танкавай дывізіі праціўніка.

10 ліпеня, абараняючы мост праз р. Друць на шашы Мінск — Масква, здзейсніў свой подзвіг камсамолец Мікалай Дзмітрыеў, наводчык 45-мм супрацьтанкавай гарматы. 31 жніўня 1941 г. яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. 10 ліпеня на рубяжы Коханава праціўнік, пакінуўшы супраць нашай дывізіі сваю 18-ю танкавую дывізію, увёў 29-ю матарызаваную дывізію па дарозе Коханава — Копысь для фарсіравання Дняпра. К гэтаму часу падышлі новыя дывізіі нашай 20-й арміі і занялі абарону на ўсходнім беразе Дняпра. На ўчастку Орша — Копысь абараняліся часці 18-й стралковай дывізіі. 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія вяла баі на рубяжы р. Адроў і атрымала загад камандуючага арміяй: вывесці дывізію ў другі эшалон арміі, на ўсходні бераг Дняпра для даўкамплектавання і прывядзення ў парадак яе часцей пасля бесперапынных 12-сутачных напружаных баёў.

Пасля таго, як дывізія пачала адрывацца ад праціўніка з рубяжа р. Адроў, быў атрыманы новы загад камандарма: пасля пераправы на ўсходні бераг Дняпра паступіць у распараджэнне камандзіра 20-га стралковага корпуса генерал-маёра С. І. Яроміна. Штаб корпуса размяшчаўся ў раёне Бабініч. Аднак праціўнік апярэдзіў нас: ён фарсіраваў Дняпро на ўчастку Бабінічы — Копысь, захапіў плацдарм на ўсходнім беразе, пераправіў туды каля 300 аўтаматчыкаў з пяхотай і каля 60 танкаў. З гэтага плацдарма нямецкія танкі і мотапяхота імкнуліся развіць наступленне на Смаленск. 12 ліпеня было прынята рашэнне размясціць 1-ю мотастралковую дывізію на паўночны ўсход ад Бабініч і ва ўзаемадзеянні з 18-й стралковай дывізіяй нанесці ўдар наперарэз танкам і мотапяхоце праціўніка і адкінуць іх к Дняпру. Каб выйграць час і не даць праціўніку ажыццявіць глыбокі прарыў, нашы палкі, падыходзячы ў раён размяшчэння, з ходу пераходзілі ў контратаку, наносячы адзін за адным фланга-выя ўдары па варожых танках і мотапяхоце.

У гэтым баі 12 ліпеня, знаходзячыся на ўчастку 175-га мотастралковага палка, адкуль кіраваў боем, я быў паранены. Ужо ў медсанбаце атрымаў звесткі аб тым, што часці нашай дывізіі 13 ліпеня працягвалі паспяхова контратакаваць праціўніка, які прарваўся цераз Дняпро, захапілі вялікую колькасць палонных і баявой тэхнікі і на двое сутак затрымалі наступленне праціўніка на Смаленск.

Баі на ўчастку Барысаў — Орша, у якіх праходзілі першае баявое выпрабаванне воіны 1-й мотастралковай дывізіі, мелі вялікае значэнне. Дзякуючы рухомай абароне, дывізія сумела затрымаць войскі праціўніка, што рваўся да Смаленска, вымусіла яго адмовіцца ад «бліцкрыга», забяспечыць спрыяльныя ўмовы войскам 20-й арміі для арганізацыі абароны на ўсходнім беразе Дняпра.

Радзіма высока ацаніла мужнасць воінаў-масквічоў у першых баях паміж Барысавам і Оршай, больш чым трыста салдат і афіцэраў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. 1-я мотастралковая дывізія адной з першых стала гвардзейскай.

* * *

Начальнік штаба 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіі П. Р. Кузняцоў напісаў кнігу «Гвардзейцы-масквічы». Вось як апісвае ён баі за Талачын.

День 6 июля стал одним из выдающихся дней в боевой истории Московской мотострелковой дивизии. В этот день в бою под Толочином дивизия впервые добилась значительной победы.

Накануне вечером автостраду Минск — Москва на 15-километровом участке от Славени до Толочина захватили немцы и всю ночь

хозяйничали на ней. Их передовые подразделения заняли Толочин. Частям Московской дивизии почной марш на новый рубеж пришлось совершать по проселочным дорогам.

Крейзер решил ударом с севера и юга по сходящимся направлениям на Толочин освободить этот населенный пункт и снова прочно оседлать Минское шоссе.

Рано утром, когда первые лучи солнца заиграли на вершинах сосен, мотострелковые полки подходили к реке Друть.

В голове 6-го мотострелкового полка, южнее автострады, шел батальон капитана Василия Былинкина. При подходе к реке батальон обнаружил двигавшуюся по автостраде на Толочин большую немецкую автоколонну с мотопехотой и различными грузами.

Долго не раздумывая, Былинкин открыл по колонне огонь и атаковал ее. (У музеі Варанцэвіцкай школы зберагаецца шабля В. І. Былінкіна.— *Рэд.*). На помощь к нему подошел батальон Павла Шурухина. Вражеская колонна застопорилась, смешалась, пехота, побросав машины, стала разбегаться.

Еще большую сумятицу внес 175-й мотострелковый полк, ударивший по противнику с севера. В коротком, ожесточенном бою, который переходил в рукопашную схватку, дивизия наголову разбила автоколонну противника. Немцы потеряли до 200 человек убитыми. Было взято в плен 800 солдат и офицеров, захвачено 350 исправных автомашин и знамя Берлинского танкового корпуса (так, видимо, назывался 47-й танковый корпус).

С ходу немцы были выбиты из Толочина.

До 16 часов за Толочин шла ожесточенная борьба. Гитлеровцы бросили в этот населенный пункт все свои наличные силы. Местечко дважды переходило из рук в руки.

Група афіцэраў 1-й Маскоўскай пралетарскай мотастралковай дывізіі пасля ўручэння ўзнагарод (справа — капітан В. І. Былінкін). 1941 г.

В военной истории Толочин знаменит еще тем, что в 1812 году в нем была штаб-квартира Наполеона. Лавры французского полководца не давали покоя и Гудериану.

К вечеру Московская дивизия отошла на рубеж Обольцы — Кохановo и прочно там закрепилась. 18-я танковая дивизия немцев четыре дня дралась потом за этот рубеж и так и не смогла преодолеть его.

Друкуецца скарочана па кн.: Кузнецов П. Г. Гвардейцы-москвичи. М., 1962. С. 30—31.

Герой-артылерыст

Мікалай Міхайлавіч Дзмітрыеў — Герой Савецкага Саюза (31.8.1941). Нарадзіўся 19.12.1917 г. ў в. Кумак Наваорскага раёна Аренбургскай вобласці. З сялян. Рускі. Член КПСС з 1943 г. У 1937 г. скончыў Аренбургскі фінансавы тэхнікум. Да вайны працаваў бухгалтарам у г. Фрунзе. У Чырвонай Арміі з 1939 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім фронце. Наводчык гарматы радавы М. М. Дзмітрыеў вызначыўся ў Талачынскім раёне 10.7.1941 г., адбіваючы атакі, знішчыў 3 танкі праціўніка. Быў цяжка паранены, але поля бою не пакінуў. У 1945 г. М. М. Дзмітрыеў скончыў Трэцяе Ленінградскае артылерыйскае вучылішча. Да 1959 г. служыў у Савецкай Арміі, маёр. Потым працаваў інжынерам на заводзе ў Саранску. Памёр 20.12.1981 г.

Калона фашысцкай мотапяхоты з танкамі рухалася па шашы. Нашы воіны запялі абарону па р. Друць. Камандзір дывізіі загадаў падпусціць ворага бліжэй і ўдарыць па ім артылерыйскім і кулямётным агнём. Да гэтага часу ў дывізію ўліўся артполк танкавай дывізіі.

Мост праз р. Друць у Талачыне быў замініраваны. За 500 метраў на ўзгорку знаходзіліся агнявыя пазіцыі. Фашысты пад'ехалі да моста цэлай калонай. Упередзе ішлі танкі, а за імі — не менш чым 200 аўтамашын з варожай пяхотай. Гітлераўцы здагадаліся, што мост замініраваны, спыніліся і сталі яго разглядваць. У гэты час савецкія артылерысты адкрылі ўраганны агонь. Гітлераўцы кінуліся наўцёкі. Нямала іх было знішчана. Нашы воіны сталі праследаваць ворага. Талачын быў ачышчаны ад фашыстаў. Але хутка гітлераўцы зноў перайшлі ў наступленне. За-

М. М. Дзмітрыеў.

вязаўся ўпарты бой. На гэтым участку знаходзілася наша другая супрацьтанкавая батарэя. На правым флангу стаяла гармата камсамольца Мікалая Дзмітрыева. Ён быў выдатным паводчыкам і здзейсніў сапраўды гераічны подзвіг.

Мікалай заўважыў, што на яго рухаюцца фашысцкія танкі. Ён вырашыў падпусціць іх бліжэй і адкрыць агонь. Ад прамога трапляння загарэўся танк, за ім — другі. Фашысты пасылалі па яго гармаце снарад за снарадам. І вось Мікалай ужо застаўся адзін каля гарматы: яго баявыя сябры былі забіты і паранены. Раніла і Дзмітрыева. Чарговым снарадам адбіла правую станіну гарматы. Дзмітрыеў страціў прытомнасць, упаў. Аднак герой-камсамолец знайшоў у сабе сілы падняцца, зарадзіць гармату. Выстрал — і ў варожага танка разбіта гусеніца. Выстралы грымелі адзін за адным. Снарады траплялі ў цэль. Але вось Мікалай зноў упаў. Бой заціхаў. На полі пад Талачыном нерухома стаялі варожыя танкі.

Урачы дасталі з цела Мікалая 17 асколкаў. Герой-артылерыст выжыў, моцны арганізм перамог.

Сказ пра выратаваны сцяг

З успамінаў К. Дз. Мясцікава

Канстанцін Дзмітрыевіч Мясцікаў нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Узноскае Талачынскага раёна. Член КПСС з 1950. У маі 1942 г. устанавіў сувязь з групай чырвонаармейцаў, якія ўцяклі з Азарацкага лагера ваеннапалонных. З снежня 1942 г. ў партызанах, а кастрычніка 1943 г.— намеснік камісара 6-га атрада партызанскай брыгады М.П. Гудкова. У канцы чэрвеня 1944 г. залічаны ў 212-ы армейскі запасны стралковы полк. Пасля стаў сувязістам-тэлефаністам 83-й гвардзейскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава стралковай дывізіі 11-й гвардзейскай арміі 3-га Беларускага фронту. У верасні 1944 г. ў складзе 252-га стралковага палка ўдзельнічаў у прарыве абароны нямецка-фашысцкіх войск на граніцы Усходняй Прусіі. Удзельнічаў ва ўзяцці крэпасці Кёнігсберг, многіх гарадоў Усходняй Прусіі. Дэмабілізаваўся ў снежні 1946 г. Працаваў у Талачынскім леспрамгасе. У 1948—1950 гг. старшыня калгаса «Новы шлях», у 1950—1953 гг. старшыня Няклюдаўскага сельскага Савета. З 1953 г. ў апараце райкома КПБ. У верасні 1957 накіраваны на вучобу ў Магілёўскую савецка-партыйную школу. Пасля яе заканчэння — на савецкай і гаспадарчай рабоце. З 1982 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені.

...Ішоў другі месяц вайны. Не праходзіла і дня, каб падлеткі і мы, выпускнікі Рыдамльскай сярэдняй школы, не пабывалі ў лесе. Бегалі па ягады, а ў тое лета іх было асабліва многа. Але хутка цікавасць да іх прапала. У лесе было шмат зброі. Нас, хлопцаў, якія дагэтуль ніколі і не бачылі яе ў вочы, вельмі захапіў яе пошук. Кожны з нас імкнуўся знайсці што-небудзь такое, чаго нікому не ўдавалася. «Героямі дня» былі тыя, каму пашанцавала знайсці кулямёт. Сабраную зброю хавалі, а для каго — пакуль не ведалі.

30 ліпеня стаяў сонечны спякотны дзень. Са сваім сябрам Аркадзем Зелютковым мы зранку накіраваліся ў лес. Яшчэ не паспелі дайсці да яго, як насустрач выйшлі два чырвонаармейцы. Яны былі абарваныя, змораныя і ў крыві. Знакам паклікалі да сябе. Мы, напалоханыя іх выглядам, асцярожна наблізіліся. Вайскоўцы нейкі час уважліва на нас пазіралі. Потым пачалі распытваць, ці ёсць у нашай вёсцы радыё, якія апошнія паведамленні, дзе фронт? Што ведалі, мы расказалі. Папрасілі нас прынесці што-небудзь з ежы. Мы хуценька пабеглі ў вёску, прынеслі хлеба і малака. У той жа дзень яшчэ раз былі ў лесе — трэба было пераапрануць вайскоўцаў у цывільнае адзенне. Пазнаёміліся бліжэй. Воіны назвалі свае прозвішчы — адзін Кулікоў, другі Максімаў, расказалі, адкуль родам. Мы таксама паведамілі пра сябе, сваіх бацькоў.

— Камсамольцы? — нечакана спытаў Кулікоў.

Мы сцвярджальна кіўнулі.

— Ім можна даверыць,— звярнуўся Кулікоў да свайго спадарожніка.

— З намі сцяг 56-й Маскоўскай стралковай дывізіі. Далей яго несці небяспечна. Мы можам загінуць, але баявы сцяг павінен жыць,— закончыў Максімаў.

К. Дз. Мяснікаў.

А. К. Зелюткоў.

Воіны расказалі нам, што гэты баявы сцяг уручаў дывізіі сам Міхаіл Васілевіч Фрунзе і што на гэты момант у іх няма нічога дарагі за яго. «Сцяг неабходна абавязкова захаваць да прыходу Чырвонай Арміі. Перадайце першай жа перадавой часці, якая прыйдзе ў вёску, і скажыце, што «пам загадалі берагчы сцяг афіцэры Кулікоў і Максімаў».

— Клянёмся захаваць сцяг,— амаль адначасова вырвалася ў нас.

Аркадзь збегаў дамоў, прынёс салдацкую лапатку. Сцяг разгарнулі. Воіны сталі перад ім на калені, пацалавалі яго і... заплакалі. Не ведаю чаго, але мы з Аркадзем таксама заплакалі. Сцяг акуратна склалі ў рэчавы мяшок, знайшлі прыкметную елку і закапалі пад ёй каштоўны для нас чацвярых груз. Кулікоў і Максімаў далі свае хатнія адрасы, узялі нашы. Развіталіся мы з імі, як з роднымі. Воіны пайшлі ў паўночна-ўсходнім напрамку, адкуль данасілася глухая артылерыйская канапада.

Сустрэча з ваеннымі, адказнасць за захаванне сцяга вельмі змянілі нас. Мы пасталелі, сталі больш стрыманымі ў словах, асцярожнымі ў паводзінах. У лес, дзе быў закапаны сцяг, заходзілі цяпер зусім з іншага боку. А каб ён не стаў псавацца ў сырой зямлі, мы яго адкапалі, прасушылі і вырашылі перакласці ў што-небудзь іншае. Перагледзелі некалькі варыянтаў. Урэшце рэшт рызыкнулі пакласці сцяг у скрыню з-пад патронаў для кулямёта «Максім». Скрыню занеслі далей, у самы гушчар, і падвесілі ў густой кроне елкі.

Настала першая ваенная зіма. У лес стала хадзіць складана і небяспечна. Але ўпэўнены, што скрыня застанецца непрыкмечанай, у нас не было. Не цярпелася хоць зрэдку наведаць тое месца. На лыжах праязджалі каля нашай елкі, упэўнімся, што ўсё на месцы — і з палёгкай вяртаемся дамоў. З надыходам вясны сцяг з вершаліны здымалі і перыядычна прасушвалі. А ў снежні 1942 г. мы з Аркадзем сталі партызанамі брыгады Гудкова. Мы па-ранейшаму строга захоўвалі нашу тайну. А калі летам 1943 г. сувязь з Вялікай зямлёй стала пастаяннай, мы далажы-

К. Дз. Мяснікаў (у цэнтры) расказвае піянерам гісторыю выратавання сцяга.

лі пра сцяг 56-й стралковай дывізіі камбрыгу Мікалаю Пятровічу Гудкову.

— Вы сапраўдныя савецкія патрыёты,— падзякаваў нас камбрыг.

Вестка аб выратаваным сцягу па рацыі была перададзена ў Маскву. У адказ прыйшла тэлеграма перапраўіць баявы сцяг у Цэнтральны штаб партызанскага руху. Камандаванне брыгады даручыла выканаць гэта заданне намесніку камісара брыгады Івану Іосіфавічу Жураўскаму. Ен у суправаджэнні двух аўтаматчыкаў даставіў сцяг на Бягомльскі аэрадром. Адтуль сцяг дывізіі ў Маскву павёз Аркадзь Зелюткоў. Я ў гэты час быў на дыверсійным заданні пад Оршай.

Наказ афіцэраў выкананы — святыня іх роднай 56-й стралковай дывізіі была перададзена ў надзейнае месца!

* * *

Аркадзь Карпавіч Зелюткоў нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Узноснае Талачынскага раёна. Член КПСС з 1949 г. У час Вялікай Айчыннай вайны са снежня 1942 г. па снежань 1943 г. у 2-ім атрадзе імя М. А. Шчорса брыгады М. П. Гудкова. З выратаваным сцягам 56-й стралковай дывізіі быў адпраўлены самалётам на Вялікую зямлю. Да лістапада 1944 г. знаходзіўся ў распараджэнні Беларускага штаба партызанскага руху. Са снежня 1944 г. працаваў у Брэсце ў органах МУС — КДБ, удзельнічаў у ліквідацыі нацыяналістычных бандаў. З 1955 г. на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Талачынскім раёне. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За баявыя заслугі» і інш. Памёр у 1970 г.

З пісьма Ф. М. Максімава, былога тэхніка 168-га стралковага палка 56-й Маскоўскай стралковай дывізіі следапытам Варанцэвіцкай сярэдняй школы

Ф. М. Максімаў.

В. В. Кулікоў.

Вялікая Айчынная застала мяне на захадзе Беларусі. Наша 56-я стралковая дывізія толькі перадыслацыравалася на граніцу ў раёне Сапоцкіна Гродзенскай вобласці. Напярэдадні, пасля расфарміравання палкавой школы, якой я камандаваў, мяне перавялі ў штаб дывізіі ў аператыўны аддзел да капітана Кустова. І вось на золку 22 чэрвеня варожы залп абрушыўся на наш лагер. Палкі былі адрэзаны, сувязь са штабам парушана. Мы адступалі з цяжкімі баямі. Праз некалькі дзён адступаць падраздзяленнямі стала немагчыма, разбіліся на невялікія групы. Сітуацыя была крытычнай. Капітан Кустоў даручыў мне несці сцяг дывізіі. Я наматаў яго на цела, надзеў гімнасцёрку. Нашу групу ўзначаліў намеснік камандзіра артпалка маёр Дзюрба. Крыванішыну, палітруку Давыдаву, капітану Кулікову было даручана ахоўваць мяне са сцягам. Неяк пасля доўгіх вандраванняў нарваліся на варожую засаду пры пераходзе праз шашу з аднаго лесу ў другі. Па нас адкрылі моцны агонь з кулямётаў і танка. Уцякаючы, мы з Куліковым адарваліся ад сваіх і апынуліся ў лесе ўдвух. Пачалі шукаць астатніх, але нікога не сустрэлі. Трэба было прабірацца на ўсход. У вёсцы заходзіць было небяспечна — усюды немцы. Харчаваліся ў асноўным толькі ягадамі. Мы вельмі аслабелі. У Кулікова абвастрылася язва, і ён перамагаў страшэнны боль. Самае цяжкае было — пераадоленне рэк: масты і пераправы ахоўваліся, а пераходзіць у брод, калі не ведаеш ракі, было небяспечна. Аднойчы каля невялікай, але глыбокай ракі мы зайшлі на хутар, што стаяў у кіламетры ад вёскі. Нам сказалі, што немцы адтуль выехалі. Калі сталі пераходзіць мост, нас сустрэў мужчына і ўзяўся правесці да вёскі. Там жа нас схапілі і пасадзілі ў свіран (наш праваднік аказаўся нямецкім камендантам). Да дзвярэй паставілі вартавога. Было чутна, як вартавому аддалі нейкі загад. Васіль Васілевіч ведаў нямецкую мову і ўсхвалявана сказаў: «Да вечара нам абавязкова трэба выбрацца адсюль. Калі вернуцца немцы з засад, нас расстраляюць». Пасля нядоўгіх пошукаў я знайшоў у столі дошку, якая лёгка падняласа. змог яшчэ адну выцягнуць. Вырашылі бегчы праз дах. Але калі залез на гарышча, то ўбачыў, што да нашага свірна прымыкае яшчэ два. У адным дзверы былі адчынены. Я выцягнуў на гарышча Кулікова (самастойна ён ужо не мог пераадолець гэты шлях), спусціліся ў суседні свіран і апынуліся ля адчыненых дзвярэй. Насупраць сядзела некалькі вяскоўцаў. Мы ўжо хацелі выбегчы, але адзін з вяскоўцаў пагразіў пальцам. Мы зразумелі, што выбягаць нельга. Калі наш добраахвотны «праваднік» махнуў рукой, маў-

ляў, бяжыце, мы, што ёсць сілы, кінуліся да ракі, у адно імгненне пераадолелі яе і апынуліся ў лесе (адкуль браліся сілы — невядома). А наперадзе была яшчэ адна рачулка.

— Што за рачулка, бацька? — спытаў Кулікоў мясцовага жыхара невядомай нам вёскі.

— Хто Усвейкай заве, хто Усвіж-Букам,— адказаў той.

Вырашылі больш не рызыкаваць і, калі ўдасца, схаваць тут сцяг. Раніцай мы ўбачылі двух хлопцаў. Яны папрасткі шыбавалі як раз на нас. Мы выйшлі насустрач. З выгляду яны нам спадабаліся — стрыманыя, не па ўзросту разважлівыя. Вырашылі даручыць ім захаваць сцяг дывізіі.

Але дабрацца да сваіх было не так проста. Толькі ў 1943 г. перайшлі лінію фронту і далучыліся да нашых, будучы партызанамі 5-й Калінінскай партызанскай брыгады. Я прымаў удзел у штурме Кёнігсберга, быў намеснікам камандзіра батальёна. А пасля заканчэння вайны — намеснікам камандзіра вучэбнага батальёна. У 1948 г. дэмабілізаваўся з радоў Чырвонай Арміі. Стаў працаваць у ДТСААФ трэнерам у сваім родным горадзе Пскове. Мой баявы сябра Васіль Васілевіч Кулікоў прапаў без вестак...

Выбіраю смерць

Мікалай Валянтовіч спыніўся на ўскрайку лесу — удалечыні раскінулася родная вёска Ілынка. Сэрца моцна забілася. Наўкол было ціха, лета буяла яркімі фарбамі. «Як быццам і няма вайны,— горка ўздыхнуў Мікалай.— Пара ўжо звыкнуцца з думкай, а ўсё як у доўгім страшэнным сне».

За трыста кіламетраў дарогі, а мо і болей, па акупіраванай тэрыторыі Валянтовіч пабачыў шмат смерці, крыві, гора. І як усё гэта было непатуральна сярод летняй прыгажосці, ласкавага неба! Валянтовіч зняў з плячэй рэчавы мяшок, прысеў на траву. Выцягнуў з мяшка разабраную вінтоўку, сабраў яе, загарнуў у анучу і схаваў у густым зарасніку, туды ж паклаў дзве гранаты і патроны. Пасталет, партыйны білет, афіцэрскія дакументы ўзяў з сабой. Калі сцямпела, падышоў да вёскі. У Ілынцы жыла яго цешча, цётка Ксеня, а крыху далей, у Варапцэвічах, маці Марыя Фёдараўна, сястра Надзея.

Мікалай асцярожна пастукаў у акно. Праз хвіліну ў ім паказалася цётка Ксеня і адразу ж пабегла да дзвярэй.

— Коля? Жывы? А дзе ж дзеткі, дзе Оля,— занепакоілася жанчына за дачку і ўнукаў.

Мікалай ніколі не лгаў ёй, а тут не насмеў сказаць праўду:

— Яны эвакуіраваны на ўсход. А што ў вас у вёсцы? — былому старшыні калгаса было балюча за сваю гаспадарку, за людзей.

На наступны дзень зранку пакіраваўся да сваёй маці ў Варапцэвічы. Калі падышоў да Лошаўскага лесу, міжволі спыніўся каля дубоў. Да вайны тут стаяў хутар братоў Альшэўскіх, гэтыя музыкі славіліся на ўсю акругу. «Трэба да іх абавязкова зайсці»,— падумаў Валянтовіч.

Маці і сястра сустрэлі Мікалая з радасцю і трывогай. Маці не магла наглядзецца на сына — высокі, прыгожы, разумны. «Толькі жыць ды жыць, а што наперадзе чакае — невядома»,— з болем думала маці, а ўголас прамовіла:

— Баюся я, сынок, каб яны цябе не загубілі.

— Дзе цяпер Альшэўскія, як яны? — спытаў Мікалай Фёдаравіч.

— І Мішка, і дзеці яго, і Іван жывы-здаровы, недалёка ад Падзі жывуць,— расказвала маці.

На зваротным шляху Мікалай наведаў Альшэўскіх. Браты рамантавалі гармонік, другі такі гармонік стаяў каля акна.

— Прывітанне, камандзір! — узрадаваліся Альшэўскія.— Дай рады, як жыць далей, ты заўсёды ведаў, што трэба рабіць.— Міхаіл узяў гармонік, і палілася родная «Кацюша», потым «Орлёнок», «Если завтра война...».

— Нібыта Савецкая ўлада вярнулася,— прамовіў Валянтовіч.

У Ілынку вяртаўся ўжо позна вечарам. «Што рабіць? — успомніў пытанне братоў Мікалай.— Трэба ваяваць, глядзець, як вораг гаспадарыць — болей немагчыма».

Валянтовіч выкапаў у лесе зямлянку, перахаваў туды зброю. Але калі пастала зіма, хадзіць у лес стала небяспечна — сляды наводзілі на зямлянку.

За пяць месяцаў знаходжання ў тыле ворага Мікалай Фёдаравіч стварыў групу з надзейных савецкіх людзей. Збіраліся ў лесе, у сястры Надзеі, у Альшэўскіх, у каго-небудзь з акружэнцаў. Усе рыхтаваліся з надыходам вясны ўключыцца ў барацьбу з ворагам. Самым блізкім сябрам Валянтовіча стаў Іван Альшэўскі.

У пачатку снежня да Надзеі з'явіліся нечаканыя госці — бургамістр воласці Красоўскі і паліцэйскі з Талачына.

— Прыйшлі ўзяць Валянтовіча, на яго ёсць заява,— сказалі яны.

Што было рабіць? Надзея старалася задобрыць непрошаных гасцей, каб адвесці бяду

М. Ф. Валянтовіч.

ад брата: пасадзіла за стол, пачала частаваць. Красоўскі палагоднеў, разгаварыўся. У канцы размовы папярэдзіў:

— Калі будзеш муціць ваду, Валянтовіч, наступны раз цябе нічога не выратуе.

— Хутчэй бы вясна,— думаў Мікалай,— вы б нас нікога тут не знайшлі.

Але вясны ён не дачакаўся... 17 снежня на золку да хаты сястры пад'ехала трое фашыстаў на чале з начальнікам коханаўскай паліцыі.

— Валянтовіч тут? — запытаў начальнік паліцыі.

— Тут,— Мікалай падняўся з ложка.

— Апранайся, пайшлі.

Прывялі Мікалая Валянтовіча ў кабінет былога старшыні сельсавета.

— Мы ведаем, што ты камуніст, камандзір Чырвонай Арміі. Навошта трымаеш зброю? — пачаў начальнік паліцыі.

— Час ваенны, неспакойны, усялякае можа здарыцца,— адказаў Валянтовіч.

— Масква капут, зброя не патрэбна,— умяшаўся нямецкі афіцэр.

— Масква яшчэ трымаецца і невядома, возьмуць яе ці не.

— Нам і такія людзі, як ты, патрэбны,— працягваў паліцай.— Прапануем працаваць разам з намі. Згодны?

— Трэба падумаць.

— Пяць мінут хопіць?

— Мала.

— Тады 10 мінут і — рашай,— афіцэр засек час.

Што думаў Мікалай Фёдаравіч у гэтыя трагічныя мінуты? Магчыма, пра тое, што выбару ў яго не было... Пераступіць мяжу, за якой пачыналася здрадніцтва, ён не мог, за гэтай мяжой жыцця не было.

— Час прайшоў,— парушыў маўчанне нямецкі афіцэр.

— Радзіме здрадзіць не магу,— быў адказ.

— Тады ўперад,— скамандаваў немец.

Мікалай выйшаў на ганак, зрабіў крок на першую прыступку. У гэты момант фашыст выстраліў. Жанчыны і старыя, якія стаялі каля ганка, ускрыкнулі ад жудасці. Гэта было першае ў Варанцэвічах забойства на вачах у людзей.

Праз некаторы час быў схоплены Іван Уладзіміравіч Альшэўскі. Пасля жорсткіх здзекаў расстраляны ў Талачыне.

...У Варанцэвічах над брацкай магілай узвышаецца помнік. Сярод імён людзей, якія аддалі сваё жыццё за шчасце і незалежнасць Радзімы, ёсць і імя Валянтовіча. З Мінска на месца пахавання прыязджае Вольга Паўлаўна Валянтовіч з дзецьмі.

Застаўшыся адна з чатырма маленькімі дзецьмі на ўскрайку Беластока, яна не ведала, выжыве з дзецьмі ці загіне — усё залежала ад людзей, з якімі разам трапіла ў бяду. Вольгу Паўлаўну прытулілі гасцінныя палякі, старыя Ганна і Аляксандр Петрунёк. Іх драўляны двухпавярховы домік, дзе жыла «саветка», хутка стаў вядомы многім.

Дзецям неслі хлеб, малако, адзенне. Асабліва ўпадабала дзяцей суседка Петрунюкоў 17-гадовая гімназістка Часлава Станкевіч. Яна вучыла іх маляваць, чытаць польскія кніжкі.

Вольга Паўлаўна мыла бялізну для вялікай сям'і Ганны Маліноўскай.

— Калі б не яна — не дажыць бы нам да Перамогі,— успамінае Вольга Паўлаўна.— Яна нас карміла, адзявала, арганізоўвала для нас дапамогу. Клапатлівую і сардэчную, я называла яе «мамай».

Фашысты рабілі аблавы, шнарылі па дамах. Але ніхто не выдаў сям'ю савецкага афіцэра. Дастаткова было каму-небудзь прагаварыцца — усім адразу расстрэл. Калі Беласток быў вызвалены, Вольгу Паўлаўну нястрымна пацягнула дамоў. Праводзіць Валянтовіч з дзецьмі прыйшла амаль уся беластоцкая ўкраіна. І ўсе неслі сціплыя падарункі на дарогу. А Часлава Станкевіч увесь час прасіла не ехаць.

У роднай вёсцы Вольга Паўлаўна даведалася пра гібель мужа. Не было мяжы яе гору і пакутам. Але вырашыла: Мікалай не скарыўся — і яна вытрымае. Вольга Паўлаўна паехала з дзецьмі ў Мінск. Шмат працавала сама і дзяцей таксама вучыла працавітасці. Магчыма, за ўсе цяжкасці, якія давялося пераадолець гэтай жанчыне, лёс зрабіў яе шчаслівай маці. Дзеці выраслі, сталі паважанымі, добрасумленнымі людзьмі. Генадзь каля чатырох дзесяткаў гадоў працуе на Мінскім аўтазаводзе, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За доблесную працу». Люся, аператар інфармацыйна-вылічальнага

цэнтра аўтазавода, таксама ветэран, узнагароджана ганаровым знакам «Ветэран аўтамабільнай прамысловасці». Два сыны Вольгі Паўлаўны звязалі сваё жыццё з мастацтвам: Віктар Мікалаевіч працуе мастаком у выдавецтве, узнагароджаны знакам «Выдатнік друку», самы малодшы — Мікалай — таксама мастак, яго месца работы — Мінскі завод медпрэпаратаў.

Усё жыццё гэтых людзей асветлена прыкладам мужнасці, чалавечай годнасці роднага бацькі.

І. М. Прускі.

Фронт у тыле ворага

Ішоў васемнаццаты дзень вайны... Працiўнік рваўся да Масквы. Спроба затрымаць яго на Барысаўскім і Лепельскім напрамках свежымі сіламі 13-й і 20-й армій поспеху не прынесла. Жорсткія абарончыя баі 13-й і контрнаступленне 20-й армій у цэнтры і на поўдзень крыле Заходняга фронту нанеслі ворагу адчувальныя страты: рух войск 2-й і 3-й танкавых груп 4-й палявой нямецкай арміі часова быў затрыманы. Аднак пад іх націскам нашы войскі з цяжкімі стратамі адыходзілі за водныя рубяжы Дзвіны і Дняпра.

9 ліпеня тэрыторыя Талачынскага раёна была захоплена ворагам. Буйныя дарожна-транспартныя артэрыі, што праходзілі праз тэрыторыю раёна, вызначылі яго ваенна-гаспадарчае значэнне. Райцэнтр, чыгуначныя станцыі Талачын, Слаўнае, Коханава, раз'езд Трацылава і іншыя населеныя пункты, што прылягалі да аўтамагістралі і чыгуначнай лініі Масква — Мінск, акупанты ператварылі ў ваенныя гарнізоны з сістэмай акупацыйнай ваеннай адміністрацыі. Акупанты стварылі раённую і валасныя ўправы з паліцэйскімі ўчасткамі, прыцягнуўшы да службы розных антысавецкіх і дэградзіраваных элементаў. Хлусня і грубая сіла вызначылі сутнасць акупацыйнага рэжыму.

У Талачынскім і суседніх з ім раёнах узнікла шмат разрозненых груп чырвонаармейцаў, якія адсталі ў час адступлення ад сваіх часцей, байцоў і камандзіраў, што былі паранены ў баях ці ўцяклі з палону. Летам і восенню 1941 г. гэтыя дробныя групы былі мабільнымі: яны нечакана нападалі на аб'екты працiўніка і непрыкметна знікалі. Жылі байцы ў шалашах, пры сустрэчы з карнікамі здымаліся са сваіх стаянак і пераходзілі ў суседнія лясы ці нават іншыя раёны. Без матэрыяльнай базы, не маючы вопыту партызанскай барацьбы і жыцця, ва ўмовах надыходзячай зімы групы падаваліся на ўсход, спрабуючы прабіцца праз лінію фронту, да сваіх. Пасля доўгіх, найчасцей беспаспяховых і рызыкоўных блуканняў упалелыя байцы вярталіся ў знаёмыя мясціны панейшага базіравання. З надыходам ранняй марознай зімы яны сталі шукаць прытулку ў сялян. Хворыя, параненыя, знясіленыя, у зношаным адзенні выходзілі яны з лесу, асядалі ў вёсках на час зімовых халадоў. Воінаў укрывалі ўсе. Пазней у сваіх успамінах яны з вялікай удзячнасцю і цеплынёй расказвалі пра жыхароў вёсак Варанцэвічы, Любанічы, Гаўэлікі, Мар'янполле, Башарова, Алёнавічы, Няклюдава, Воўкавічы, Высокі і Нізкі Гарадзеп, Забалацце, Анэліна, Лаўрэнавічы. Патрыёты гэтых і шмат іншых вёсак, рызыкуючы сваім жыццём і жыццём блізкіх, укрывалі воінаў у сваіх дамах, кармілі іх, лячылі, нягледзячы на распараджэнні і аб'явы, загады акупантаў, якія забаранялі рабіць гэта пад пагрозай расстрэлу.

З надыходам веснавой адлігі і з'яўленнем «чорнай сцежкі» (так вобразна партызаны называлі першыя праталіны) байцы і камандзіры вярталіся да партызанскіх дзеянняў. 8 лютага 1942 г. з вёскі Лаўрэнавічы выйшла ў лес невялікая група байцоў, якую ўзначаліў радавы М. А. Агапоненка. Зімой у Алёнавічах арганізавалася група лейтэнанта С. Ц. Баранава, якая 10 сакавіка 1942 г. выйшла ў лес і размясцілася непадалёку ад в. Межыёва. Нападаючы на варожых салдат і паліцэйскіх, яна ўзбройвалася трафейнымі вінтоўкамі, разагнала Алёнавіцкую валасную ўправу і паліцэйскі ўчастак, разбіла малочны пункт. У хуткім часе партызаны сталі нападаць на іншыя валасныя ўправы і паліцэйскія ўчасткі, ліквідоўваць падатковыя спісы сялян, абстрэльваць нямецкія гарнізоны. У чэрвені партызаны спалілі будынак лесапільнага завода разам з абсталяваннем. Акупанты вымушаны былі вывезці рабочую каманду і адмовіцца ад яго аднаўлення.

У лютым у Воўкавіцкім лесе пачалі дзейнічаць групы М. У. Дудкевіча, М. К. Сушкова і Г. М. Каўрыгі. 25 сакавіка з вёскі Алёнавічы выйшла другая група ваеннаслужачых, яе ўзначаліў І. М. Стрэльнікаў, удзельнік баёў на Халхін-Голе ў 1939 г. Восенню 1941 г. ён уцёк з палону, на зіму знайшоў прытулак у Алёнавічах. Разам са сваімі таварышамі ён зноў хадзіў на аперацыі, быў двойчы паранены. У Няклюдаўскім сельсавеце пачала складвацца група ваеннаслужачых пад кіраўніцтвам У. П. Карцава і М. П. Вашкіна. Група разагнала Няклюдаўскую, Мяшкоўскую і Саколінскую валасныя ўправы і паліцэйскія

ўчасткі, забіла некалькіх бургамістраў і па ліцэйскіх.

На паўночным усходзе раёна палітрук 24-й стралковай дывізіі А. Д. Клячын разам з капітанам А. П. Куіным стварыў групу, якая ўдзельнічала ў разгроме некалькіх управаў, у тым ліку ў вёсцы Высокі Гарадзец, дзе разграміла валасную ўправу і невялікі гарнізон нямецкіх салдат і паліцэйскіх.

14 мая 1942 г. з камандны палонных, што працавала на лесазаводзе ў Азерцах, уцяклі старшы лейтэнант М. П. Гудкоў, палітрук М. А. Грудзінін, сяржант М. К. Кабанаў, Ф. А. Балыкоў і А. А. Сакалоў, якія асталяваліся ў Букаўскім лесе. Услед за імі сюды прыбыла група моладзі (10 чалавек) з вёскі Азерцы, прыходзілі адзіночкамі і групамі патрыёты вёсак Абольцы, Сялец, Заднева, Замошша, а таксама жыхары Сенненскага і Халопеніцкага раёнаў.

На поўдні раёна ў вёсцы Гарэлікі была створана група ваеннаслужачых, у якую ўвайшлі А. Ф. Сімдзянкін, М. Н. Каянаў, В. П. Каэлоў, П. Я. Булаеў, Г. Калініп. 11 сакавіка яна афармілася ў баявую групу на чале з малодшым лейтэнантам А. Ф. Сімдзянкіным. Адначасова арганізаваліся яшчэ дзве групы з ваеннаслужачых, што жылі ў вёсках Любанічы, Лагаўшчына, Варанцэвічы, Поўсціхава, Мар'янполле, Полюдавічы, Бабравінне. У хуткім часе гэтыя групы далучыліся да групы А. Ф. Сімдзянкіна. Аб'яднаная група адразу пачала актыўна дзейнічаць: разагнала Воўкавіцкую і сумесна з групай Р. М. Севасцьянава (арганізавалася каля в. Башарова) Ліснянскую валасныя ўправы.

Дзейнасць малых баявых адзінак ранняй вясной 1942 г., у перыяд станаўлення партызанскага руху, найлепшым чынам адпавядала ўмовам, у якіх яны параджаліся і дзейнічалі. Не вельмі абцяжарваючы насельніцтва, партызаны маглі забяспечыць сябе харчаваннем: на прасёлачных дарогах яны нападалі на транспарт праціўніка з хлебам і іншымі сельгаспрадуктамі, грамілі малочныя пункты. Насельніцтва забяспечвала партызан звесткамі аб праціўніку, папярэджвала пра аблавы.

Весткі аб разгроме гітлераўскіх войск пад Масквой, актывізацыя барацьбы партызан у тыле ворага выклікалі прыліў патрыятычных пачуццяў у насельніцтва. Пачаўся масавы прыток мясцовых жыхароў у рады партызан. Хуткі рост груп, актывізацыя іх баявых дзеянняў паднялі на якасна новы ўзровень развіцця партызанскага руху. Узмацнілася імкненне да зліцця разрозненых падраздзяленняў у больш буйныя баявыя адзінкі — атрады. Так, у Казённым лесе Круглянскага раёна ў сакавіку — красавіку з груп Г. А. Кірпіча і А. Ф. Сімдзянкіна і інш. быў створаны атрад «Чэкіст». К лету ў раёне на базе асобных груп моладзі М. У. Дудкевіча, М. К. Сушкова і Г. М. Каўрыгі, якія знаходзіліся ў Воўкавіцкім лесе, сфарміраваўся атрад «Гая» (пазней 30-ы атрад 8-й Круглянскай брыгады). Група У. П. Карцава — М. П. Вашкіна пасля разгрому некалькіх валасных управаў і паліцэйскіх участкаў стала хуткa расці з ліку моладзі вёсак Няклюдаўскага сельсавета, а таксама жыхароў Сенненскага раёна і летам 1942 перарасла ў атрад (да лістапада 1942 г. дзейнічаў самастойна, потым у 1-й брыгадзе імя К. С. Заслонава).

І. Дз. Буланаў.

П. А. Галіцын.

Майскімі днямі ў Букаўскім лесе ў групу старшага лейтэнанта М. П. Гудкова адзіночкамі ішло папаўненне з вёсак Сялец, Замошша, Заднева, Абольцы, Прудзец. Моладзь вёскі Азерцы прыбыла арганізавана дзвюма групамі агульнай колькасцю каля 20 чалавек. 25 мая група афармілася ў партызанскі атрад Гудкова. З канца мая да 6 ліпеня партызаны атрада разагналі валасныя управы і паліцэйскія ўчасткі ў вёсках Саколіна, Няклюдава, Алёнавічы, Баброва, Рыдамля. Каля вёскі Рыдамля з засады партызаны разбілі групу гітлераўцаў, на дарозе каля Лаўрэнавіч яны спалілі дзве грузавыя аўтамашыны, забілі і параніл 18 нямецкіх салдат. Група партызан на чале з М. П. Гудковым разагнала ахову нямецкай дзяржаўнай гаспадаркі ў вёсцы Відокі Чашніцкага раёна, захапіла 52 кані, большасць узбраення. Ахова ўлілася ў атрад. 45 партызан у засадным баі на дарозе на ўсход ад вёскі Аўсішча абстралялі калону аўтамашын: забілі 19 фашысцкіх салдат і знішчылі адну машыну. На бальшаку паміж Талачыпом і Валосавам партызаны гэтай групы забілі 5 салдат, а ўзвод байцоў пад камандаваннем Дз. Я. Дзеева выбіў паліцэйскіх з вёскі Узноснае. Да сярэдзіны ліпеня атрад Гудкова папоўніўся баявымі групамі

лейтэнанта А. А. Сяргеева, якая дзейнічала з лета 1941 г., і радавога М. А. Агапоненкі (у іх налічвалася 23 байцы). Да жніўня атрад Гудкова значна вырас, меў на ўзбраенні 18 кулямётаў, 12 аўтаматаў і 52 вінтоўкі.

Партызанскія атрады, узбуйненыя да 2—4 узводаў, сталі больш паспяхова весці барацьбу з пераўзыходзячымі іх колькасна і лепш арганізаванымі сіламі праціўніка. Партызаны нечакана абрушвалі свае ўдары на варожыя гарнізоны, пад прыкрыццём якіх знаходзіліся валасныя ўправы. У выніку перасталі існаваць валасныя ўправы ў Няклюдаве, Алёнавічах, Абольцах, Саколіне, Рыдамлі, Высокім Гарадцы, Воўкавічах, Лісянах, Полюдавічах, Варанцэвічах, Жукневе. Іншыя валасныя ўправы збеглі ў ваенныя гарнізоны пад прыкрыццё сваіх гаспадароў. У той жа час на дарогах каля вёсак Рыдамля, Лаўрэнавічы, Аўсішча, Валосава, Узноснае, Зайкаўшчына партызаны праводзілі паспяховыя баі ў засадах.

Да сярэдзіны лета тэрыторыя раёна была амаль поўнасцюачышчана ад фашысцкіх акупантаў. Удары партызан прымусілі праціўніка адмовіцца ад сістэмы дробных вайсковых гарнізонаў, паліцэйскіх участкаў, валасных управаў. Цяпер у вёсках гаспадарамі сталі партызаны. Мясцовыя жыхары адкрыта, не тоячыся, падтрымлівалі народных мсціўцаў, шматлікімі ўзаемапранікнёнымі сувязямі зліліся з імі.

Партызанскі рух набыў масавы народны характар. Колькасна выраслі і ўзмацнелі ў баявых і арганізацыйных адносінах «старыя» атрады, узніклі новыя, палепшала ўзбраенне. Паміж атрадамі ўсталяваліся цесныя кантакты, якія ў выніку прывялі да аб'яднання іх у брыгады. Так, партызанскія атрады, што дзейнічалі ў Шклоўскім і на поўдні Талачынскага раёнаў, у канцы мая 1942 г. пачалі аб'ядноўвацца ў брыгаду «Чэкіст». 28 мая ў лесе Сосеньеўскай дачы Шклоўскага раёна адбыўся сход каманднага складу атрадаў Г. А. Кірпіча, І. Дз. Буланава, П. А. Красякова і асобных груп Ф. М. Сядлецкага, Р. М. Севасцьянава — П. А. Галіцына. Удзельнікі сходу стварылі штаб «Аб'яднання партызанскіх атрадаў», выбралі камандны склад (23 ліпеня гэта «Аб'яднанне» перайменавана ў брыгаду «Чэкіст»). У яе ўліліся атрады Б. М. Клюшнікава, група М. К. Хадорыка. У працэсе фарміравання брыгады ў чэрвені — ліпені 1942 г. з разбуйненых атрадаў Г. А. Кірпіча, І. Дз. Буланава і П. А. Красякова дадаткова былі створаны атрады А. Ф. Сімдзянкіна, А. С. Дзянісава, І. М. Суворава; сфарміраваны рухомы атрад А. І. Шамарына, вылучаны ініцыятыўныя групы А. І. Зайцава, І. В. Капаныхіна, П. А. Красякова — М. М. Іванова для арганізацыі новых атрадаў у Шклоўскім раёне, у тым ліку і на левым беразе Дняпра. Апрача Талачынскага брыгада дзейнічала ў Аршанскім, Бялыніцкім, Круглянскім, Лепельскім, Шклоўскім раёнах. Яна вылучалася зладжаным, валявым калектывам і ініцыятыўным камандным складам.

Р. М. Севасцьянаў.

КАМАНДНЫ СКЛАД ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЧЭКІСТ»

Камандзір Кірпіч Герасім Аляксеевіч (май 1942 — жнівень 1943); камісары: Сядлецкі Фёдар Міхайлавіч (май — кастрычнік 1942; сакавік — жнівень 1943), Букштынаў Фёдар Іванавіч (кастрычнік 1942 — сакавік 1943); начальнікі штаба: Буланаў Іван Дзмітрыевіч (май — кастрычнік 1942; сакавік — жнівень 1943), Севасцьянаў Рыгор Мікалаевіч (кастрычнік 1942 — сакавік 1943).

У жніўні 1943 г. брыгада (7 атрадаў, больш як 800 партызан) рашэннем Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б і загадам яго ваенна-аператыўнай групы рэарганізавана ў Шклоўскую ваенна-аператыўную групу (ВАГ). Пры гэтым упраўленне брыгады «Чэкіст» скасавана, а яе атрады ўключаны ў ВАГ самастойнымі баявымі адзінкамі.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г. у складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 2617 партызан. З іх членаў ВКП(б) 63, кандыдатаў у члены ВКП(б) 86, членаў ВЛКСМ 335; беспартыйных 2033 (партыйная прыналежнасць 68 партызан не ўстаноўлена).

КІРУЮЧЫ СКЛАД ШКЛОЎСКАЙ ВАГ

Сакратары падпольнага райкома КПБ(б)Б: Букштынаў Фёдар Іванавіч (жнівень 1943 — май 1944), Бай Анісім Уласавіч (май — чэрвень 1944); камандзір ВАГ Кірпіч Герасім Аляксеевіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба Севасцьянаў Рыгор Мікалаевіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

1-ы асобны атрад арганізаваны ў сакавіку-красавіку 1942 г. у Каленным лесе Круглянскага раёна з груп Г. А. Кірпіча, Р. С. Іванова — В. М. Рабіна, А. Ф. Сімдзянкіна і Р. М. Севасцьянава, П. А. Галіцына. У канцы мая 1942 г. увайшоў у брыгаду «Чэкіст». Спачатку называўся па прозвішчу камандзіраў Г. А. Кірпіча і Р. С. Іванова, з красавіка 1943 г.— 1-ы. У жніўні 1943 г. ўключаны ў Шклоўскую ВАГ. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 485 партызан.

Камандзіры атрада: Кірпіч Герасім Аляксеевіч (сакавік 1942 — чэрвень 1943), Іваноў Рыгор Сямёнавіч (чэрвень 1942 — чэрвень 1944); камісары: Счаслаўскі Пётр Ігнатавіч (сакавік 1942 — май 1944, загінуў), Данілаў Мікалай Міхайлавіч (май — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Шамарын Аляксандр Іванавіч (люты — жнівень 1943), Папоў Дзяніс Фёдаравіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

5-ы асобны атрад сфарміраваны ў чэрвені 1942 г. ў Сосеньеўскай дачы Шклоўскага раёна ў брыгадзе «Чэкіст» з асабавага складу, выдзеленага атрадам Р. С. Іванова. У жніўні 1943 г. перададзены Шклоўскай ВАГ. Да красавіка 1943 г. атрад называўся па прозвішчу камандзіра А. Ф. Сімдзянкіна, потым — 5-ы. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 362 партызаны.

Камандзір атрада Сімдзянкін Аляксандр Фёдаравіч (чэрвень 1942 — чэрвень 1944); камісары: Кунгурцаў Ігнат Яўстаф'евіч (чэрвень — ліпень 1942), Елькановіч Самуіл Муліч (ліпень — жнівень 1942, загінуў), Буншпанаў Фёдар Іванавіч (жнівень 1942 — студзень 1943), Кранёў Сяргей Аляксандравіч (студзень — снежань 1943), Саўчанка Стафан Пятровіч (снежань 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба Праканец Давыд Якаўлевіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944).

10-ы асобны атрад створаны ў красавіку 1942 г. ў Сосеньеўскай дачы Шклоўскага раёна, дзейнічаў самастойна. 28 мая 1942 г. ўвайшоў у брыгаду «Чэкіст», у жніўні 1943 г. перададзены Шклоўскай ВАГ. Да красавіка 1943 г. называўся па прозвішчу камандзіраў атрада І. Дз. Буланава, А. С. Дзянісава, П. І. Маркава, М. С. Дзьянкава, потым — 10-ы. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 376 партызан.

Камандзіры атрада: Буланаў Іван Дзмітрыевіч (красавік — чэрвень 1942), Дзянісаў Аляксандр Сямёнавіч (ліпень — верасень 1942, загінуў), Маркаў Пётр Іванавіч (верасень 1942 — сакавік 1943, загінуў), Дзьянкаў Мікалай Сямёнавіч (сакавік 1943 — красавік 1944), Крымцаў Іван Міхайлавіч (красавік — чэрвень 1944, загінуў). Белабрагін Антон Антонавіч (чэрвень 1944); камісары: Праканец Давыд Якаўлевіч (чэрвень — жнівень 1942), Грышанаў Фёдар Адамавіч (жнівень 1942 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Красоўскі Станіслаў Міхайлавіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944), Праказаў Мікалай Аляксандравіч (чэрвень 1944).

20-ы асобны атрад арганізаваны ў чэрвені 1942 г. ў Шклоўскім раёне на базе групы Б. М. Клюшнікава, створаны зімой 1941—1942 гг. у Аршанскім раёне. У чэрвені 1942 г. уключаны ў брыгаду «Чэкіст», у жніўні 1943 г. перададзены Шклоўскай ВАГ. Да красавіка 1943 г. называўся па прозвішчу камандзіраў атрадаў, потым — 20-ы. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 418 партызан.

Камандзіры атрада: Клюшнікаў Барыс Мікалаевіч (чэрвень — кастрычнік 1942, загінуў), Якімаў Сцяпан Мікітавіч (кастрычнік 1942 — чэрвень 1944); камісары: Масюраў Мікалай Іванавіч (ліпень — кастрычнік 1942, загінуў), Сіялка Фёдар Цімафеевіч (кастрычнік 1942 — жнівень 1943), Ігнаценка Рыгор Ісаевіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба Мадюшоўскі Анатоль Іларыёнавіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944).

25-ы асобны атрад створаны ў красавіку 1943 г. ў складзе брыгады «Чэкіст» на базе ўзвода, выдзеленага 10-м атрадам. Спачатку называўся «25 год Кастрычніка», потым — 25-ы. У жніўні 1943 г. уключаны ў Шклоўскую ВАГ. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 152 партызаны.

Камандзір атрада Якушка Ілья Аляксеевіч (красавік 1943 — чэрвень 1944); камісары: Левін Мікалай Фёдаравіч (красавік 1943 — май 1944), Пічугін Міхаіл Паўлавіч (май — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Манееў Ягорый Яўдохавіч (чэрвень 1943 — красавік 1944), Цімашэнка Якаў Ціханавіч (красавік — чэрвень 1944).

60-ы асобны атрад імя Ф. М. Сядлецкага сфарміраваны ў 1943 г. ў складзе Шклоўскай ВАГ на базе партызанскай групы, створанай у жніўні 1943 г. Да лістапада 1943 г. называўся 30-ы, потым — 60-ы, у снежні 1943 г. яму прысвоена імя загінуўшага камандзіра Ф. М. Сядлецкага. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 348 партызан.

Камандзіры атрада: Сядлецкі Фёдар Міхайлавіч (верасень — снежань 1943, загінуў), Кранёў Сяргей Аляксандравіч (снежань 1943 — чэрвень 1944); камісар Букштынаў Павел Іванавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Хадорын Макс Канстанцінавіч (верасень — кастрычнік 1943, загінуў), Жамейка Іван Іосіфавіч (кастрычнік 1943 — сакавік 1944, загінуў), Транін Мікалай Мікалаевіч (сакавік 1943 — чэрвень 1944).

31-ы асобны атрад створаны ў кастрычніку 1943 г. ў складзе Шклоўскай ВАГ. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 378 партызан.

Камандзір атрада Назараў Гаўрыла Андрэевіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); камісар Маляўка Іосіф Шмафеевіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Карпышынка Рыгор Яфрэмавіч (кастрычнік 1943 — май 1944). Качаноўскі Сяргей Гаўрылавіч (май — чэрвень 1944).

Наяўнасць Віцебскіх (Суражскіх) «варот» (разрыў у лініі фронту) дазволіла партызанскаму камандаванню атрадаў раёна выйсці на сувязь з Паўночна-Заходнім аператыўнай групай ЦК КП(б)Б. Віцебскім абкомам партыі, якія базіраваліся ў размяшчэнні 4-й ударнай арміі Калінінскага фронту. Партыйныя органы, якія шукалі сувязі з партызанамі, цяпер атрымалі магчымасць практычна наладзіць кіраўніцтва народнай барацьбой, завяршыць аб'яднанне патрыятычных сіл і накіраваць іх у адзінае рэчышча народнай вайны.

У Рацаўскі лес на паўднёвым усходзе Талачынскага раёна, дзе базіравалася партызанская брыгада «Чэкіст», з савецкага тылу прыбылі прадстаўнік ЦК КП(б)Б маёр І. Я. Канькоў з радыёстанцыяй і шыфравальшчыкам, дыверсійныя групы. У канцы ліпеня ў паўночна-ўсходнюю частку раёна быў прысланы атрад «Граза» (50 чалавек), сфарміраваны ў чэрвені 1942 г. ЦК КП(б)Б у савецкім тыле. Атрад узначалілі М. А. Рашэтнікаў [даваенны сакратар Мядзельскага РК КП(б)Б], С. М. Нарчук [да вайны быў сакратаром па кадрах Талачынскага РК КП(б)Б]. Атрад аб'яднаўся з мясцовай партызанскай групай С. Ц. Баранава (27 чалавек), якая дзейнічала ў раёне.

4 жніўня атрад «Граза» разгорнуты ў брыгаду ў складзе атрадаў 1-га, 2-га, 3-га (у снежні 1943 г. перайменаваны ў атрады «Перамога», «Спяг», імя Аляксандра Неўскага). Пазней у брыгадзе сфарміраваны 4-ы, 5-ы, 6-ы, 7-ы, 8-ы, 9-ы атрады, якія ў канцы 1943 г. адпаведна перайменаваны ў атрады «За Радзіму», імя Р. І. Катоўскага, імя А. В. Суворава, «За Савецкую Беларусь», імя М. В. Фрунзе, імя М. Ф. Гастэлы. Да ліпеня 1943 г. брыгадзе

гада называлася «Даядзькі Колі». Брыгада дзейнічала ў Талачынскім і Чашніцкім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 26 чэрвеня 1944 г. ў складзе 9 атрадаў агульнай колькасцю 673 партызаны. З іх членаў ВКП(б) 22, кандыдатаў у члены ВКП(б) 33, членаў ВЛКСМ 139, беспартыйных 479.

КАМАНДНЫ СКЛАД ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ГРАЗА»

Камандзіры брыгады: Рашэтнікаў Мікалай Арцёмавіч (жнівень 1942 — чэрвень 1943), Нарчук Сямён Мікалаевіч (чэрвень 1943 — май 1944, загінуў), Катлярчук Дзмітрый Міхайлавіч (чэрвень 1944). Ворашань Аляксей Дзям'янавіч (чэрвень 1944, в. а.); камісар Нарчук Сямён Мікалаевіч (жнівень 1942 — чэрвень 1943); начальнікі штаба: Катлярчук Дзмітрый Міхайлавіч (жнівень 1942 — чэрвень 1943, лістапад 1943 — чэрвень 1944), Кіпрыянец Леў Карпавіч (ліпень — лістапад 1943), Аўчыннікаў Рыгор Маркіянавіч (чэрвень 1944).

Атрад «Перамога» арганізаваны ў пачатку жніўня 1942 г. Да снежня 1943 г. называўся 1-ы атрад. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 99 партызан.

Камандзіры атрадаў: Ворашань Аляксей Дзям'янавіч (жнівень 1942 — красавік 1944), Семчанка Цімафей Іларыёнавіч (красавік — чэрвень 1944); камісары: Ліманскі Мікалай Мікалаевіч (кастрычнік 1942 — ліпень 1943), Рак Аляксандр Уласавіч (ліпень — верасень 1943), Сіўковіч Міхаіл Міхайлавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944, загінуў), Церашкоў Сяргей Мацвеевіч (чэрвень 1944); начальнік штаба Ардюшэўскі Іосіф Францавіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944).

Атрад «Сцяг» створаны ў пачатку жніўня 1942 г. Да снежня 1943 г. называўся 2-і атрад. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 109 партызан.

Камандзіры атрада: Калістратаў Мікалай Лаўрэнцьевіч (жнівень 1942 — сакавік 1943), Осіпаў Пётр Андрэевіч (сакавік — верасень 1943, загінуў), Нячаеў Сяргей Апанасавіч (верасень 1943 — люты 1944), Багачоў Рыгор Фёдаравіч (люты — чэрвень 1944); камісары: Мяжэвіч Піліп Мінавіч (верасень — лістапад 1942, загінуў), Дзерваедаў Еўдакім Трафімавіч (кастрычнік 1943), Ліманскі Мікалай Мікалаевіч (лістапад 1943 — май 1944, загінуў). Шавель Мікалай Ягоравіч (чэрвень 1944); начальнікі штаба: Нячаеў Сяргей Апанасавіч (сакавік — верасень 1943), Аляксееў Пётр Рыгоравіч (верасень 1943 — май 1944).

Атрад імя Аляксандра Неўскага створаны ў пачатку жніўня 1942 г. Да снежня 1943 г. называўся 3-і атрад. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 82 партызаны.

Камандзіры атрада: Кіпрыянец Леў Карпавіч (жнівень 1942 — чэрвень 1943, лістапад 1943 — студзень 1944), Бальшоў Міхаіл Фёдаравіч (чэрвень — лістапад 1943), Антонаў Барыс Антонавіч (студзень — чэрвень 1944); камісары: Пахамовіч Аляксей Пятровіч (кастрычнік 1942 — верасень 1943), Пахабаў Інакенцій Георгіевіч (верасень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Бальшоў Міхаіл Фёдаравіч (студзень — май 1943), Аўчыннікаў Рыгор Маркіянавіч (май — чэрвень 1943), Кожын Мікадай Іванавіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

Атрад «За Радзіму» арганізаваны ў жніўні 1942 г. з жыхароў Талачынскага раёна. Да снежня 1943 г. называўся 4-ы атрад.

Камандзіры: Мяжэвіч Яўген Рыгоравіч (жнівень — снежань 1942), Чумакоў Павел Іванавіч (снежань 1942 — верасень 1943), Ракаў Пётр Сямёнавіч (верасень 1943 — май 1944), Хайбулаў Вальіула Арыфулавіч (май 1944 — чэрвень 1944); камісары: Станішэўскі Ігнат Іванавіч (снежань 1942 — чэрвень 1943), Ракаў Пётр Сямёнавіч (чэрвень — верасень 1943), Асіноўскі Аркадзь Сцяпанавіч (май 1944, загінуў), Зялюткін Аляксей Сямёнавіч (чэрвень 1944); начальнікі штаба: Цюкін Аляксандр Піліпавіч (сакавік — жнівень 1943), Кроер Канстанцін Яфімавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

Атрад імя Р. І. Катоўскага створаны ў маі 1943 г. з партызан, выдзеленых атрадам імя Аляксандра Неўскага. Да ліпеня 1943 г. называўся 5-ы атрад. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 82 партызаны.

Камандзіры атрада: Антонаў Барыс Антонавіч (май — жнівень 1943), Агібайлаў Васіль Фёдаравіч (жнівень 1943 — красавік 1944). Касцяеў Павел Іванавіч (красавік — чэрвень 1944); камісары: Багачоў Рыгор Фёдаравіч (чэрвень 1943 — люты 1944), Церашкоў Сяргей Мацвеевіч (красавік — чэрвень 1944), Пашкевіч Нічыпар Еўдакімавіч (чэрвень 1944); начальнікі штаба: Агібайлаў Васіль Фёдаравіч (май — ліпень 1943), Касцяеў Павел Іванавіч (красавік 1944), Васілеўскі Максім Ільіч (красавік — чэрвень 1944).

Атрад імя А. В. Суворава створаны ў ліпені 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы І. Н. Стрэльнікава, выдзеленай атрадам «Перамога». Да снежня 1943 г. называўся 6-ы атрад. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 68 партызан.

Камандзір атрада Стрэльнікаў Іван Нічыпаравіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944); камісары: Шавель Мікалай Ягоравіч (жнівень 1943 — красавік 1944), Каазоўдаў Георгій Сцяпанавіч (красавік — чэрвень 1944); начальнік штаба Іфантопула Мікалай Іванавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944).

Атрад «За Савецкую Беларусь» арганізаваны ў ліпені 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы К. Я. Кроера — Р. М. Аўчыннікава, выдзеленай са складу брыгады. Да студзеня 1944 г. называўся 7-ы атрад. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 62 партызаны.

Камандзіры атрада: Кроер Канстанцін Яфімавіч (ліпень — лістапад 1943), Мяжэвіч Яўген Рыгоравіч (лістапад 1943 — май 1944, загінуў). Нячаеў Сяргей Апанасавіч (чэрвень 1944); камісар Аўчыннікаў Рыгор Маркіянавіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Сівак Сяргей Аляксандравіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944), Шыбека Барыс Максімавіч (чэрвень 1944).

Атрад імя М. В. Фрунзе створаны ў пачатку лістапада 1943 г. з падраздзялення разведкі брыгады. Да снежня 1943 г. называўся 8-ы атрад. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 63 партызаны.

Камандзір атрада Заруба Мікалай Іванавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); камісар Гуляшчаў Мікалай Васілевіч (сакавік — чэрвень 1944); начальнік штаба Раманкевіч Яўген Мікітавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

Атрад імя М. Ф. Гастэлы арганізаваны ў снежні 1943 г. на базе дыверсійнай групы брыгады. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 74 партызаны.

Камандзіры атрада: Бродскі Аляксандр Іванавіч (снежань 1943 — май 1944, загінуў). Папоў Міхаіл Іванавіч (чэрвень 1944); камісары: Сідаранка Барыс Рыгоравіч (снежань 1943 — красавік 1944), Тарарыкаў Віктар Васілевіч (красавік — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Нячаеў Сяргей Апанасавіч (красавік — чэрвень 1944), Кроер Канстанцін Яфімавіч (чэрвень 1944).

16 жніўня 1942 г. паводле рашэння Віцебскага падпольнага абкома партыі сфарміравана брыгада М. П. Гудкова. Яе аснову склалі атрады камісара 294-га палка В. С. Лявонава (1-ы атрад, дзейнічаў у Сенненскім раё-

не) і атрад М. П. Гудкова, які ўвайшоў у брыгаду пад нумарам 2. У канцы жніўня брыгада перадыслацыравалася ў Букаўскі лес на поўначы раёна. Тут яна трапіла ў буйную карную экспедыцыю. Пасля некалькіх паспяховых цяжкіх баёў з ворагам з-за недахопу боепрыпасаў брыгада вымушана была раздзяліцца. Большая частка партызан на чале з камісарам В. С. Лявонавым выйшла ў Чашніцкі раён і прыступіла да арганізацыі Сенненскай брыгады. З астатніх партызан і жыхароў Талачынскага раёна ў лістападзе 1942 г. была адноўлена брыгада М. П. Гудкова. У яе складзе атрады 1-ы імя М. І. Кутузава і 2-і імя М. А. Шчорса. Пазней створаны атрады 3-і «Ураган», 4-ы, 5-ы, 6-ы, 7-ы. Асноўныя раёны дзеяння брыгады: Талачынскі, Сенненскі, Чашніцкі, часткова Лепельскі, Крупскі, Халопеніцкі. Брыгада злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 26 чэрвеня 1944 г. ў складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 632 партызаны. З іх членаў ВКП(б) 20, кандыдатаў у члены ВКП(б) 21, членаў ВЛКСМ 120, беспартыйных 471. Страты брыгады забітымі і без вестак прапаўшымі склалі 228 партызан.

КАМАНДНЫ СКЛАД ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ М. П. ГУДКОВА

Камандзір брыгады Гудкоў Мікалай Пятровіч (жнівень 1942 — чэрвень 1944); камісары: Лявонаў Васіль Сяргеевіч (жнівень — кастрычнік 1942), Фінагееў Ілья Рыгоравіч (люты — чэрвень 1943), Ігнатовіч Фёдар Пятровіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Сыценка Васіль Дзмітрыевіч (жнівень — кастрычнік 1942), Арэшыч Рыгор Сцяпанавіч (ліпень — жнівень 1943, в. а.), Рукаль Якаў Фёдаравіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

Зямлянка партызанскай брыгады Гудкова, адбудаваная студэнтамі будаўнічага атрада Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці.

1-ы атрад імя М. І. Кутузава арганізаваны ў лістападзе 1942 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 130 партызан.

Камандзір атрада Рукаль Якаў Фёдаравіч (люты — жнівень 1943); камісары: Фінагееў Ілья Рыгоравіч (лістапад 1942 — люты 1943), Голікаў Аляксандр Рыгоравіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Кабанаў Мікалай Кузьміч (чэрвень — верасень 1943), Абельчанка Павел Паўлавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944).

2-і атрад імя М. А. Шчорса створаны ў лістападзе 1942 г. з жыхароў вёскі Няклюдава (27 чалавек) і групы партызан, выдзеленай з 1-га атрада імя М. І. Кутузава. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 101 партызана.

Камандзіры атрада: Шныркевіч Пётр Фёдаравіч (лістапад 1942 — верасень 1943), Хвашчэўскі Сяргей Апанасавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944); камісар Караткевіч Міхаіл Дзям'янавіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба Окунеў Уладзімір Іванавіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944).

3-і атрад «Ураган» арганізаваны ў снежні 1942 г. з партызан, выдзеленых брыгадай. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 104 партызаны.

Камандзіры атрада: Дзееў Дзмітрый Якаўлевіч (снежань 1942 — студзень 1944), Арэшыч Рыгор Сцяпанавіч (студзень — чэрвень 1944); камісары: Агееў Міхаіл Георгіевіч (чэрвень 1943 — студзень 1944), Шумілаў Пётр Васілевіч (студзень — люты 1944), Фінагееў Ілья Рыгоравіч (люты — сакавік 1944, в. а.), Камінскі Іван Міхайлавіч (сакавік — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Матачкін Васіль Якаўлевіч (май — верасень 1943), Беражны Андрэй Пятровіч (верасень 1943 — чэрвень 1944).

4-ы атрад створаны ў пачатку верасня 1943 г. з партызан, выдзеленых 3-м атрадам «Ураган». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 103 партызаны.

Камандзіры атрада: Матачкін Васіль Якаўлевіч (верасень (1943 — сакавік 1944), Дзееў Дзмітрый Якаўлевіч (сакавік — чэрвень 1944); камісар Смірноў Канстанцін Васілевіч (верасень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Аліфанаў Васіль Сяргеевіч (верасень — лістапад 1943), Шведка Іван Фёдаравіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

5-ы атрад сфарміраваны ў пачатку 1943 г. як разведвальны. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 71 партызана.

Камандзір атрада Агапоненка Мікалай Аляксеевіч (чэрвень 1944, загінуў); камісары: Ігнатовіч Фёдар Пятровіч (люты — чэрвень 1943), Ільін Уладзімір Пятровіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба Яўсеенка Аляксандр Пракопавіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944).

6-ы атрад арганізаваны ў пачатку кастрычніка 1943 г. з партызан, выдзеленых брыгадай. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 73 партызаны.

Камандзіры атрада: Шведка Іван Фёдаравіч (кастрычнік — лістапад 1943), Аліфанаў Васіль Сяргеевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); камісар Басанскі Міна Мінавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944).

7-ы атрад створаны ў канцы сакавіка 1944 г. з партызан, вылучаных 4-м атрадам. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 18 партызан.

Камандзір атрада Матачкін Васіль Якаўлевіч (сакавік — чэрвень 1944).

Летам 1942 г. крайне абвастрылася ваенна-палітычная сітуацыя на савецка-германскім фронце. Сканцэнтраваўшы буйную групоўку на паўднёва-заходнім напрамку, вораг рушыў да Волгі і Каўказа — жыццёва важных эканамічных раёнаў краіны. У цяжкія для нашай дзяржавы дні ЦК ВКП(б) і Цэнтральны

штаб партызанскага руху (ЦШПР) асаблівую ўвагу звярнулі на актывізацыю народнай барацьбы ў тыле ворага, на перанясенне партызанскіх удараў па расцягнутых транспартных камунікацыях праціўніка. Для дыверсійных дзеянняў на ўчастках чыгункі і шашэйных дарог Орша — Барысаў ЦК КП(б)Б прыслаў з савецкага тылу 4 атрады і каля 10 дыверсійных груп, асабовы склад якіх прайшоў курс навучання ў школе падрыхтоўкі партызанскіх кадраў. Усе дыверсійныя групы дзейнічалі ў цесным кантакце з брыгадамі. Групы падрыўнікоў М. Т. Гарбаценкі (16 чал.), С. П. Саўчанкі, Н. Г. Матраева дзейнічалі сумесна з партызанамі брыгады «Чэкіст» на чыгунцы Талачын — Коханава і Шклоў — Копысь. Група П. А. Шафранскага часова далучылася да брыгады Гудкова, дыверсійная група П. С. Пашкевіча дзейнічала і засталася ў 1-й брыгадзе К. С. Заслонава. 6 чэрвеня 1942 г. штаб Заходняга фронту дэсантаваў у размяшчэнне круглянскіх атрадаў групу з шасці ваеннаслужачых старшага лейтэнанта А. А. Маршчыніна. Група была добра экіпіравана, мела радыёстанцыю і падрыўныя сродкі, разам з атрадамі С. Г. Жуніна, Д. А. Кулікова, Г. С. Місніка (пазней 8-й Круглянскай брыгады) дзейнічала на ўчастку Слаўнае — Талачын — Коханава.

Сканцэнтраваўшы асноўныя намаганні на падрыве транспартных перавозак у Талачынскім і Шклоўскім раёнах, партызаны брыгад «Чэкіст», «Граза», Гудкова і дыверсійныя групы П. А. Шафранскага, М. Т. Гарбаценкі з сярэдзіны ліпеня да 3 верасня 1942 г. на ўчастку чыгункі Слаўнае — Коханава і Лотва — Шклоў падарвалі 57 эшалонаў. З іх 9 эшалонаў пусціла пад адхон дыверсійная група М. Т. Гарбаценкі на ўчастку Талачын — Коханава. Брыгада Гудкова 28 жніўня 1942 г. напала на гарнізон і станцыю Вятна на вузкакалейцы ў Сенненскім раёне. У кароткім баі партызаны разбілі ахову, захапілі і спалілі станцыйныя збудаванні, склады з маёмасцю і сенам. Дыверсійная група П. А. Шафранскага падарвала два эшалоны на лініі Талачын — Коханава. У гэтым жа месцы партызанская група С. Ц. Баранава пусціла пад адхон цягнік з ваеннай тэхнікай. Падрыўнікі Л. Кіпрыянец, Б. Сідорчанка, І. Лавыгін, Ф. Савельеў з брыгады «Граза» 11 жніўня падарвалі ваенны эшалон на лініі паміж вёскамі Букарава і Свідэршчына. Пры крушэнні цягніка быў разбіты паравоз, 10 вагонаў. Непадалёку ад гэтага месца ў хуткім часе быў падарваны яшчэ адзін састаў, гружаны нарабаванай у сялян жывёлай. Шэсць дыверсій паміж ст. Слаўнае — Талачын здзейснілі падрыўнікі на чале з А. Багданавым і Лагуткіным з атрада капітана І. Суворава.

Моцныя ўдары па чыгунцы нанеслі партызаны 8-й Круглянскай брыгады. У ноч на 28 жніўня атрады 36-ы, 8-ы, 24-ы на чале з намеснікам камандзіра брыгады С. Г. Жуніным напалі на чыгуначную станцыю Слаўнае: разбілі варожы гарнізон, забілі 118 гітлераўцаў, знішчылі будынак станцыі, 2 вадакачкі, семафоры, пуцявыя стрэлкі, 6 складоў, 3 казармы, 2 эшалоны, што стаялі на станцыі. У аперацыі прымалі ўдзел мясцовыя жыхары, з іх дапамогай разбураны 3 кіламетры чыгуначных пуцей, 5 кіламетраў тэлеграфна-тэлефоннай лініі сувязі. Каля вёскі Ільяны партызаны падарвалі чыгуначны мост. 20 верасня каля вёскі Антонаўка, на ўсход ад станцыі Слаўнае, атрады 36-ы і 28-ы напалі на эшалон: у баі знішчылі ахову поезда, спалілі 40 вагонаў з боепрыпасамі і паравоз. Па колькасці крушэнняў цягнікоў самай выніковай аказалася брыгада «Чэкіст» — партызаны падарвалі ў другой палавіне лета 1942 г. 48 чыгуначных саставаў.

Дзеянні савецкіх партызан на чыгуначных магістралях праціўніка значна падарвалі яго транспартныя магутнасці, рэзка парушылі планавыя перавозкі ваенных грузаў. Гэта была сур'ёзная дапамога партызан фронту ў крызісныя дні баёў савецкіх войск на Доне, Волзе і Каўказе.

Для барацьбы з партызанамі Беларусі летам і восенню 1942 г. нямецкае камандаванне кінула значныя сілы: 186-ю, 202-ю, 203-ю, 221-ю ахоўныя дывізіі, 1-ю матарызаваную брыгаду СС, палявыя войскі, у тым ліку частку сіл 59-га армейскага корпуса, 7-ю матарызаваную дывізію, часці ваеннай паліцыі і жандармерыі, танкавыя, артылерыйскія, авія-

Варожы эшалон, пушчаны пад адхон дыверсійнай групай П. А. Шафранскага на лініі Талачын — Коханава каля пераезда Пярэвалачня летам 1942 г.

цыйныя, маршавыя падраздзяленні, а таксама палкі 190-й і 191-й вучэбных дывізій.

Баі з карнікамі ў Талачынскім раёне пачаліся 3 верасня 1942 г. Гітлераўцы імкнуліся заблакіраваць Рацаўскі лес, дзе базіраваліся асноўныя сілы брыгады «Чэкіст».

Разгадаўшы намер праціўніка, брыгада адышла да вёскі Альхоўка. Адсюль адна група атрадаў (Р. С. Іванова, А. Ф. Сімдзянкіна, А. С. Дзянісава, А. І. Шамарына) на чале з Г. А. Кірпічам фарсіравала каля станцыі Коханава чыгуначную і шашэйную дарогі, выйшла ў Лепельскі раён, дзе дзейнічала да 10 красавіка 1943 г. Другая група атрадаў (А. С. Нікітчанкі, Б. М. Клюшнікава, І. М. Сувораа, І. М. Кавалёва) на чале з А. С. Нікітчанкам пе змагла перайсці ў вызначанае месца і вяла манеўраныя баі разгрупаванымі атрадамі ў Круглянскім і Крупскім раёнах.

Брыгада Гудкова сустрэла праціўніка рашучым супраціўленнем. 5 верасня ў баі з буйнымі падраздзяленнямі карнікаў каля вёскі Новы Шлях партызаны забілі каля 40 варожых салдат. У другой палавіне дня ў баі на дарозе каля вёскі Рыдамля яны падарвалі мост і пры спробе карнікаў фарсіраваць раку забілі 6 салдат. Праціўнік вымушаны быў адвесці свае падраздзяленні да зыходных рубяжоў. На наступны дзень брыгада вяла бой на ўскрайку лесу каля вёскі Узноснае. І тут гітлераўцы панеслі адчувальныя страты ў жывой сіле, агнём з супрацьтанкавай гарматы партызаны падбілі дзве бронемашыны. У наступныя дні баёў праціўнік адцясніў партызан ад іх базы ў Казёпны лес, да вёскі Бызава. 16 верасня з-за недахопаў боепрыпасаў брыгада выйшла з баявой зоны разгрупаванымі падраздзяленнямі. 1-ы атрад (былы В. С. Лявонава) і частка партызан іншых падраздзяленняў перайшлі ў Чашніцкі раён і там разгарнуліся ў Сенненскую брыгаду. 2-і атрад (былы М. П. Гудкова) колькасцю ў 60 чалавек выйшаў у Прыветненскі лес Сенненскага раёна і таксама прыступіў да ўзнаўлення брыгады.

Брыгада «Граза» сустрэла карнікаў 7 верасня каля вёскі Харлінцы. Пасля некалькіх сутычак з праціўнікам яна са стратамі манеўравала ў Талачынскім, Сенненскім, Лепельскім раёнах.

Выцесніўшы партызан, праціўнік пасля шматразовага прачэсвання тэрыторыі раёна значна ўзмацніў іспуючыя ў раёне гарнізоны, асабліва на станцыях Талачын, Слаўнае, Коханава, у вёсках Азерцы, Міхайлаўшчына і інш. Акупанты ў месцах базіравання брыгад аднавілі раней разгромленыя партызанамі гарнізоны ў вёсках Узноснае, Клебані, Абольцы, Усвіж-Бук, Райцы, Мешкава, Саколіпа. У адноўленых гарнізонах колькасць варожых салдат склала каля 1,4 тысячы. Саколінскі гарнізон, напрыклад, партызаны грамілі ў 1942 г. тройчы. Апошні раз гэты гарнізон (каля 70 чалавек) быў канчаткова ліквідаваны 22 снежня брыгадай Гудкова. Аднак у пачатку вясны 1943 г. акупанты аднавілі яго, падвоіўшы колькасць салдат і паліцэйскіх.

У далейшым колькасць варожых гарнізонаў хутка расла. Дрэнна забяспечаныя боепрыпасамі малаліжія падраздзяленні брыгад ужо не маглі ў такіх умовах утрымліваць ранейшыя пазіцыі ў раёне. Восенню і зімой ім даводзілася манеўраваць у Талачынскім і суседніх з ім раёнах, пазбягаючы зацяжных баёў з ворагам.

Паводле загаду Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) вясной 1943 г. брыгады пачалі зноў займаць свае ранейшыя месцы базіравання. 18 красавіка 1943 г. брыгада «Чэкіст» прыбыла ў Рацаўскі лес. Праз некалькі дзён брыгада «Граза», атрымаўшы з савецкага тылу зброю, боепрыпасы і ўзрыўчатку, таксама вярнулася на свае ранейшыя базы. Амаль адначасова ў Букаўскі лес двума атрадамі выйшла брыгада Гудкова (у маі сюды падцягнуліся астатнія яе падраздзяленні). Летам асабовы склад двух брыгад вырас да 700 партызан. Для ўзмацнення партыйнага кіраўніцтва народнай барацьбой у ліпені 1943 г. створаны Талачынскі падпольны райком КП(б)Б.

У сярэдзіне лета 1943 г. ў гарнізонах праціўніка ў раёне было амаль 3,5 тысячы салдат і афіцэраў, а таксама каля 5 тысяч паграничнага саставу фарміровачнага пункта, які размяшчаўся ў Талачыне і вакол яго.

Не маючы дастатковых сіл і сродкаў барацьбы з буйнымі гарнізонамі, партызаны мянялі тактыку баявых дзеянняў. Напосілі ўдары па чыгуначных магістралях, блакіравалі шашэйныя і прасёлачныя дарогі паміж буйнымі гарнізонамі. Яны арганізоўвалі засады, дыверсіі, нападалі на аўтамабільны і чыгуначны транспарт. Па няпоўных даных на чыгунцы, якая пралягала па тэрыторыі Талачынскага раёна, з мая 1943 г. па чэрвень 1944 г. толькі партызанамі брыгад «Граза», Гудкова і «Чэкіст» было падарвана 179 эшалонаў. З іх з мая па снежань 1943 г. падрыўнікі брыгады «Граза» пусцілі пад адхон 30 паяздоў, у красавіку 1944 г. яны падарвалі 16 эшалонаў. У час «Рэйкавай вайны» ў поч на 3 жніўня 1943 г. 8-я Круглянская (на станцыі Слаўнае — раз'езд Трацылава), Гудкова (паміж вёскамі Азерцы — Міхайлаўшчына), «Граза» (раз'езд Пярэвалачня — станцыя Коханава) штурмам узялі чыгунку і перабілі каля 1,9 тысячы рэек. Дарога поўнасцю была выведзена са строю на 4 сутак.

У далейшым партызаны ўзмоцненымі групамі і ў адзіночку з дапамогай мясцовага насельніцтва пранікалі праз гарнізонную ахову і мінныя загароды да аб'ектаў, рвалі рэйкі, чыгуначныя саставы, разбуралі станцыйнае абсталяванне і дапаможныя аб'екты. 14 жніўня, напрыклад, Ніна Лясковіч, камсамолка з Чырвонай Горкі, па чыгунцы каля моста цераз раку Друць падарвала ваенны эшалон. Адважная разведчыца загінула 8 верасня 1943 г. пры выкананні чарговага баявога задання.

Маладзёжныя падрыўныя групы брыгады «Граза» ў 1943 г. на шашэйнай і грунтавых дарогах правялі больш за 40 засадных баёў, у час якіх знішчылі 120 аўтамашын, 24 фурманкі.

У кастрычніку 1943 г. брыгады Ушацкай (з 1944 г. Полацка-Лепельскай) і Сенненскай партызанскіх зон па загаду ЦШПР удзельнічалі ў аперацыі па ачышчэнню тэрыторыі гэтых зон ад акупантаў, у тым ліку ў ліквідацыі буйных гарнізонаў у Лепелі і Чашніках і інш. Перад талачынскімі брыгадамі Гудкова і «Граза» была пастаўлена задача абараняць у перыяд гэтай аперацыі мястэчка Чарэю, вызваленую раней смаленскім палком І. Ф. Садчыкава, і не прапусціць праціўніка ў глыбіню партызанскіх зон. На працягу 4 дзён (20—23 кастрычніка) праціўнік пры падтрымцы з паветра вёў энергічныя атакі партызанскай абароны вакол Чарэі, але ўсякі раз з вялікімі стратамі адыходзіў на зыходныя пазіцыі (партызаны ўтрымлівалі мястэчка Чарэю да сярэдзіны лістапада 1943 г.).

На працягу студзеня — красавіка 1944 г. па загаду камандзіра Сенненска-Аршанскай зоны В. С. Лявонава брыгады Гудкова і «Граза» разам з іншымі брыгадамі ўтрымлівалі Сенненска-Аршанскую партызанскую зону. У студзені яны вялі абарончыя баі каля Чарэі і Лукамля. У абарончых баях і засадах партызаны знішчылі 72 аўтамашыны, 22 фурманкі, забілі 186 салдат праціўніка. 1-ы атрад Гудкова колькасцю ў 165 партызан разбіў варожы гарнізон у мястэчку Шэйка Крупскага раёна, знішчыў 35 гітлераўцаў, захапіў трафеі. У сакавіку — красавіку 1944 г. дыверсійныя групы брыгады ў раёне станцыі Талачын — Коханава пусцілі пад адхон 6 эшалонаў, падбілі з супрацьтанкавых ружжаў 21 паравоз.

У час прарыву блакады партызанамі Полацка-Лепельскай зоны (пачалася 11 красавіка 1944) брыгады Гудкова і некалькі атрадаў брыгады «Граза» на чале з начальнікам штаба брыгады «Граза» Дз. М. Катлярчуком у пачатку мая па загаду Прадстаўніцтва БШПР пры Ваенным савеце 1-га Прыбалтыйскага фронту арганізавалі адцягвальныя дзеянні на знешнім кальцы акружэння.

18 мая Талачынскі раён быў запоўнены варожымі войскамі. Праціўнік перагрупоўваў іх для правядзення карнай аперацыі супраць партызан Сенненска-Аршанскай і Барысаўска-Бягомльскай зон з мэтай поўнай ліквідацыі партызан у аператыўным тыле 3-й танкавай і 4-й палявой нямецкіх армій. Пачатак гэтай аперацыі пад кодавай назвай «Баклан» быў намечаны на 25 мая 1944 г.

Напярэдадні аперацыі брыгада Гудкова размяшчалася ў вёсках Калодніца, Навазёмкаўка, Балютава, Барсукі, Клішына, Машкоўка. Пры з'яўленні праціўніка каля Лукамля брыгада манеўравала ў лепельскія лясы. 29 мая па загаду камандзіра Сенненска-Аршанскай зоны падпалкоўніка В. С. Лявонава брыгады Гудкова, 2-я імя К. С. Заслонава і імя С. М. Кірава (Мінскай вобласці) занялі абарону ўздоўж бальшака каля вёскі Сівы Камень і ўтрымлівалі яе да 7 чэрвеня. Ноччу партызаны брыгад В. С. Лявонава, 2-й Беларускай імя П. К. Панамарэнкі, імя А. Ф. Данукалава, 2-й імя К. С. Заслонава, 1-й Смаленскай, імя С. М. Кароткіна і Гудкова рашучым штурмам пачалі прарыў блакады каля вёскі Чорныя Лозы, на ўчастку шашэйнай дарогі Сялец — Адамаўка. Штурм не прынёс поспеху, партызаны панеслі вялікія страты. У наступныя два дні праціўніку ўдалося змяць абарону партызан і адцясніць іх да бальшака Бягомль — Сялец у балоцісты раён возера Палік і ракі Бярэзіны.

16 чэрвеня партызаны брыгад Лявонава, Гудкова, 2-й Беларускай імя Панамарэнкі, 1-й Віцебскай зноў пайшлі на штурм бальшака Бягомль — Сялец, на захад ад ракі Гурта. У жорсткім начным баі аспоўныя сілы партызан вырваліся з акружэння. Аднак большая частка асабовага складу брыгады Гудкова засталася ў кальцы. Не маючы ні сіл, ні боепрыпасаў, ні магчымасці схавацца ад авіяцыі, змучаныя доўгімі блакаднымі баямі, партызаны па рашэнню камандавання брыгады 18 чэрвеня групамі пачалі выхад з блакады.

Брыгада «Граза» напярэдадні блакадных баёў у маі 1944 г. размяшчалася на асноўных базах каля вёсак Нізкі і Высокі Градзец, Шашалаўка, Абідаўка, Манголія, Асінаўка, Малая Пярэспа, Хаўча і інш. Талачынскага і Чашніцкага раёнаў. Яе асабовы склад (9 атрадаў агульнай колькасцю 1200 партызан) быў добра ўзброены і экіпіраваны. Брыгада мела надзейную сувязь з Віцебскім падпольным абкомам партыі і Прадстаўніцтвам БШПР на 1-м Прыбалтыйскім фронце. З канца 1943 г., пасля абсталявання пасадачнай

авіяпляцоўкі каля вёскі Барсукі, а потым і каля вёскі Беліца, брыгада рэгулярна атрымлівала з савецкага тылу зброю, боепрыпасы, тол і іншыя ваенныя матэрыялы.

З 14 мая акрамя баявых дзеянняў (баі каля вёсак Шашалаўка, Манголія, засады на дарозе каля Рыдамлі) брыгада выконвала пастанову ЦК КП(б)Б аб веснавой сяўбе. Чатыры атрады дапамагалі сялянам у палявых работах і забяспечвалі іх баявую ахову.

25 мая, у першы дзень карнай экспедыцыі, брыгада «Граза» пакінула свае базы і ўсім складам з абозам і тылавой гаспадаркай перайшла ў Казённы лес Сенненскага раёна. Нечаканы манеўр брыгады не застаўся непрыкметным для праціўніка. Ён адразу пачаў бамбардзіроўку лесу каля вёсак Прусінічы і Няклюдава. Аднак пасля паўторнай бамбардзіроўкі брыгада без страт перайшла да вёскі Лозы Чашніцкага раёна і пасля кароткага начнога адпачынку — да вёскі Падмошша. У лесе на захад ад Падмошша падверглася жорсткай бамбардзіроўцы — 12 самалётаў на нізкай вышыні бамбілі партызан. Тут атрады страцілі 13 байцоў забітымі і 25 параненымі. К вечару 22 мая, калі брыгада рухалася на пераправу каля возера Сялява Халопеніцкага раёна, завязаўся першы бой з праціўнікам, які працягваўся ўсю ноч (карнікі страцілі 15 салдат забітымі, партызаны — 11). На досвітку партызаны занялі абарону каля вёскі Калодніца. Тут яны вымушаны былі пакінуць свае абозы і 23 мая вярнуцца ў балота каля Падмошша. Карнікі акружылі балота. Спроба вырвацца з акружэння ў бок Пасмурскіх лясоў не ўдалася. Начная паветраная бамбардзіроўка метадычна змянялася артабстрэлам. 24 мая зноў пачалася паветраная бамбардзіроўка. Потым пачаўся артабстрэл. Калі пушкі змоўклі, карнікі пайшлі шчыльнымі ланцугамі па балоце, ведучы бесперапынны агонь з усіх відаў аўтаматычнай зброі. Выкарыстаўшы расцягнутасць баявых парадкаў праціўніка, камандаванне брыгады сканцэнтравала атрады ў адным месцы і з боем вырвалася ў бок вёскі Забор'е. У наступныя дні ўсё паўтарылася зноў — самалёты хутка выяўлялі і кантралявалі перамяшчэнне партызан і тут жа навязвалі ім няроўныя баі. 27 мая каля вёскі Харытанцы Халопеніцкага раёна, улічваючы сітуацыю, камандаванне брыгады прыняло рашэнне выходзіць з блакады разгрупаванымі падраздзяленнямі.

Страты брыгады «Граза» ў баях з карнікамі былі цяжкімі — загінулі, прапалі без вестак і трапілі ў палон 343 партызаны. 176 партызан было параненa. 28 мая памёр камандзір брыгады, сакратар падпольнага райкома партыі Сямён Мікалаевіч Нарчук.

У баях з карнікамі народныя мсціўцы знішчылі каля 90 салдат. Да 10 чэрвеня ў Букаўскім лесе непадалёк ад вёскі Дубавое амаль увесь асабовы склад брыгады быў у зборы. З чэрвеня штаб устанавіў радыёсувязь з савецкім тылам. На трэці дзень да партызан прыляцелі першыя два самалёты (да 14 чэрвеня партызаны прынялі 16 самалётаў са зброяй, боепрыпасамі і харчаваннем). У зваротныя рэйсы лётчыкі забіралі параненых байцоў. Брыгада поўнасцю аднавіла баяздольнасць і зноў распачала баявыя дзеянні. Яе дыверсійныя групы падарвалі 3 цягнікі, атрады рабілі завалы, разбуралі масты на шляху адступлення праціўніка. Брыгада «Граза» злучылася з войскамі 11-й гвардзейскай арміі каля вёскі Нізкі Гарадзец 26 чэрвеня 1944 г.

Агульны колькасны склад замацаваных за Талачынскім раёнам брыгад «Граза» і Гудкова — 2171 партызан. За час баявых дзеянняў брыгады страцілі забітымі і без вестак прапаўшымі 770 партызан, паранена было 685 партызан (з іх 64 вывезлі самалётамі ў савецкі тыл).

У атрадах Талачынскага раёна было 115 жанчын, 22 з якіх загінулі смерцю храбрых у баях і засадах, дыверсіях і разведцы. Многія з іх былі ў ліку арганізатараў партызанскіх атрадаў, напрыклад, Алена і Жэня Сушко, Саша, Таня і Жэня Пляцы, Марыя Караткевіч, Л. Яўсеенка.

Урачы, медыцынскія сёстры і санітаркі вынеслі з баёў 685 параненых байцоў. У неверагодных у медыцынскай практыцы ўмовах яны сваімі сіламі вылечылі і вярнулі ў строй каля 550 параненых партызан. Для многіх з іх выратавальнікамі сталі фельчар Вольга Сцяпанаўна Былінская, урач Зінаіда Пятроўна Шынала з брыгады «Граза», санітарка брыгады Гудкова Ганна Кузьмінічна Кунцэвіч (Швайкова). На долю жанчын прыпадаў і неверагодна цяжкі гаспадарчы ўчастак работы. Яны адзявалі, кармілі, абшывалі і абмывалі больш за дзве тысячы байцоў. Ва ўмовах партызанскага жыцця гэта работа ў многа разоў станавілася больш складанай (толькі брыгада «Граза» 81 раз падвяргалася паветранаму налёту праціўніка, 9 разоў вымушана была пакідаць свае асноўныя базы). У небяспечных сітуацыях усе жанчыны знаходзіліся ў баявых разліках, разам з усімі абаранялі свае пазіцыі, ішлі на штурм, калі прарываліся ў час блакад. Нямала сярод народных мсціўцаў было і юных патрыётаў.

Баявыя партызанскія калектывы многімі сваімі гранямі зліваліся з мясцовым насельніцтвам, часам паміж імі існавалі толькі

ўмоўныя межы. Мясцовае насельніцтва складала аснову партызанскага руху: 54 % партызан брыгады «Граза» — жыхары Талачынскага раёна. У час падрыхтоўкі да зімы 1943/44 г. насельніцтва раёна добраахвотна здало партызанам брыгады «Граза» 1034 метры палатна, 39 кілаграмаў воўны, 111 аўчын, 453 пары шкарпэтак і пальчатак.

Пры злучэнні з часцямі Чырвонай Арміі ў рэгулярныя войскі ўлілося 835 партызан. Іх баявы шлях працягваўся...

А. Л. Манаенкаў.

Перад сапраўднай барацьбой

З успамінаў Я. Ф. Рукаля

Я. Ф. Рукаль.

Якаў Фёдаравіч Рукаль нарадзіўся ў 1912 г. ў в. Няклюдава Талачынскага раёна. Член КПСС з 1953 г. З 1930 г. працаваў рабочым на маскоўскім заводзе «Памяці рэвалюцыі 1905 г.», з 1933 г.— на Асінторфе. У Чырвонай Арміі з 1934 г., скончыў палкавую школу малодшых камандзіраў. У 1939 г. ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, у 1940 — у вызваленні Бесарабіі. З першых дзён Айчыннай вайны на фронце. Са снежня 1942 г. ў партызанах, камандзір 1-га атрада імя М. І. Кутузава партызанскай брыгады Гуднова, з жніўня 1943 г.— начальнік штаба брыгады. У жніўні 1944 г. скончыў курсы пры ЦК КПБ. З верасня 1944 г. працаваў у Польшчы. У 1947—72 гг. на гаспадарчай і савецкай рабоце ў Талачынскім раёне. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Жорсткі бой пад г. Лубны Палтаўскай вобласці ў канцы верасня 1941 г. быў для мяне апошнім — раненні ў шыю і ногі не дазволілі ісці разам з палком далей. 6 кастрычніка ўрач перасоўнага медсанбата, куды я трапіў, сказаў нам: «Таварышы, болей нам ехаць няма куды, мы акружаны...» Праз нейкую гадзіну ў сяло, дзе мы знаходзіліся, уварваліся фашысты. Машыны з ранеными яны забралі з сабой. У г. Харол нас размясцілі ў вялізным памяшканні, абнесеным калючым дротам. Сярод раненых прайшла чутка, што хутка будуць адпускаць дамоў тых, каго прызнаюць сваімі роднымі мясцовыя жыхары. У нас з'явілася надзея. І вось такі дзень настаў. Нас пастроілі ў некалькі шарэнгаў. У лагеры амаль не кармілі, таму выстаяць некалькі гадзін запар многія не маглі, траціліся прытомнасць. Вялікі натоўп жанчын з нецярпеннем чакаў сустрэчы. Праз некаторы час нашы шарэнгі пачалі радзець — жанчыны выводзілі родных, блізкіх, проста знаёмых і незнаёмых, якіх выдавалі за «сваіх». Супраць мяне няўпэўнена прыпынілася адна жанчына. Я непрыкметна падаў ёй знак.

— Вось мой брат,— сказала яна.

— Ты? — немец палкай тыцнуў у мяне.

Я сцвярджальна кіўнуў галавой. Так я апынуўся «на свабодзе». Наступалі халады. Я ж быў страшна абарваны, штаны так пасечаны кулямі, што, здавалася, і ног не павінна было быць. Набыў плашч-палатку і пашыў з яе штаны. З коўдры змайстраваў шапку. Цэлы месяц у такім выглядзе дабіраўся да Няклюдава. 4 студзеня 1942 г. стаяў на пароме роднага дома. Параненыя ногі пасінелі і адзервянелі. Маці паклікала мясцовага фельчара Ілью Піфранскага. Той цішком прыходзіў да нас, лячыў, чым мог. К вясне раны пакрысе зажылі, і я стаў выходзіць на вуліцу. У маі 1942 г. з Узноснага прыбег Аркадзь Зелюткоў і перадаў просьбу камандзіра партызанскага атрада М. П. Гудкова сустрэцца са мной. У час сустрэчы Мікалай Пятровіч прама запытаў, што я збіраюся рабіць далей.

— Магу хоць зараз ісці ў атрад,— адказаў я.

— Мець на месцах надзейныя вочы і вушы для нас больш важна цяпер. А пакуль рыхтуй у атрад людзей,— даў заданне камандзір.

Прайшло тыдні два — тры. Неяк вечарам, калі ўжо сцямнела, я, як заўсёды, стаяў і курыў перад сном. На вуліцы паказалася Соф'я Кавалеўская. Не прыпыняючыся і не павярнуўшы галавы ў мой бок, прамовіла: «Яша, немцы ў Няклюдаве!». «Пастка»,— мільганула думка. Менавіта ў гэты вечар павінны былі прыйсці гудкоўцы. Трэба было іх папярэдзіць, але як? Пачуўся скрып веснічак, з цемры выйшлі Гудкоў і яшчэ з дзесятак чалавек.

— Якая абстаноўка? — запытаў Мікалай Пятровіч.

— Незайздросная, немцы ў вёсцы.

— Немцы на гаі, гэта мы ведаем,— пацвердзіў Гудкоў.

Вырашылі праверыць, магчыма, недачакаўшыся партызан, немцы ўжо звялі засаду (партызаны прыйшлі з другога боку). Паклікалі Толю Шафранскага, хлапчука гадоў чатырнаццаці. Ён з аброццю падаўся ў бок могілак, ці гаю, як мы яшчэ называлі тое месца, нібыта шукаць каня. Час цягнуўся доўга, а хлапчука ўсё не было. Нарэшце, прыбег і запэўніў, што ў гаі нікога няма. Мы недаверліва паглядалі на яго. Тады Толя як рэчавы доказ выцягнуў з кішэні некалькі акуркаў ад нямецкіх цыгарэт.

«Значыць, перайшлі да дома старасты»,— вырашылі мы.

Партызаны маглі б непрыкметна выйсці з вёскі, але, параіўшыся, рашылі прыняць бой. Падышлі да дома старасты з боку сажалкі. Падзяліліся на дзве групы і сталі чакаць. У хаце міргаў агеньчык. Гудкоў падпоўз бліжэй. У акне мільганула цень, і нехта выйшаў у сенцы. Гудкоў — туды, а там — фашыст. Мікалай Пятровіч хутка абяззброіў яго і вывеў на ганак. І тут гітлераверец закрычаў, у той жа момант застрачыў кулямёт. Наш кулямётчык прыкмеціў, адкуль б'е вораг, і выпусціў ў яго бок дзве чаргі. Варожы кулямёт змоўк. Першая сутычка з акупантамі ў роднай вёсцы скончылася паспяхова. Партызаны хутка адышлі ў лес, а я падаўся да сваёй хаты... І ледзьве не сутыкнуўся з групай фашыстаў, якія, пачуўшы страляніну, беглі да дома старасты. Пазней стала вядома, што гітлераўцы, не дачакаўшыся партызан ля могілак, аргавізавалі засаду каля дома старасты і каля майго (напэўна, я ўжо быў у іх на падазрэнні), спадзеючыся, што партызаны зойдуць да мяне. І калі мы вакіроўваліся да дома старасты, да маёй хаты ішоў староста з групай фашыстаў. Выратавала нас тое, што ішлі мы рознымі дарогамі.

Дні праз тры надвячоркам у Няклюдава прыбыў батальён карнікаў. Ачапіўшы вёску, яны закрылі ўсе выхады. Раніцай усіх жыхароў выгналі на вуліцу і пастроілі. Афіцэр узяў паперу і пачаў называць прозвішчы. Каго выклікалі, станавіліся на другі бок вуліцы з усімі членамі сям'і. Былі названы прозвішчы 22 гаспадароў. Афіцэр аб'явіў, што за нападзенне партызан названым жыхарам неабходна прывесці ўсю сваю жывёлу.

Калі немцы пакідалі вёску, разам з імі ад'язджаў і староста, пагрузіўшы на дзве фурманкі ўсю сваю маёмасць. У пачатку ліпеня не стала яшчэ аднаго фашысцкага паслугача — Б. Залецкага. Параіўшыся з таварышамі Уладзімірам Калюком, Аляксандрам Будным, Іванам Корневым, вырашылі, што гэту аперацыю можа выканаць бясстрашны семнаццацігадовы юнак з нашай вёскі Аляксандр Цёмны. І не памыліліся. Калі ўсе былі на сенажаці, Аляксандр падпільнаваў здрадніка і адным выстралам расквітаўся з ім. Фашысты збіліся з ног, але вінаватага не знайшлі.

У снежні 1942 г., калі далей заставацца ў вёсцы стала небяспечна, я прывёў у брыгаду 28 хлопцаў прызыўнога ўзросту з нашай вёскі. З намі было 110 вінтовак, ручны кулямёт, 5 ручных гранат. Пачыналася сапраўднае партызанскае жыццё.

З ДАНЯСЕННЯ СУВЯЗНОГА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ДЗЯДЗЬКІ КОЛІ» ГАРБУНОВА БШПР АБ СТАНОВІШЧЫ НА АКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНА Ў ЖНІЎНІ — ВЕРАСНІ 1942 г.

29 верасня 1942 г.

...В Толочинском районе власть фактически находилась в руках партизан, все волости разгромлены и немецкие ставленники частью убиты, частью разбежались и все немецкие и полицейские власти, а также волостные управы находились в районном центре Толочино, Озерцах, где также работает еще Озерецкая волость, ...стоит немецкий гарнизон, ... построены дзоты.

В Волосове стоит немецкий гарнизон и работает Волосовская волость.

...К семьям партизан принимаются самые строгие меры, всех от старого до малого расстреливают или вешают, а имущество разграбляют...

...Одна девушка... уехала в Германию и прислала письмо следующего содержания: «Живу хорошо, лучше не надо, но моя бабушка все же живет лучше, я бы тоже желала жить так, как она, возможно, я к ней скоро приеду в гости...» Но бабушка этой девушки семь лет как умерла, только тогда стало понятно, почему эта девушка хочет к бабушке.

...Уборка хлеба прошла хорошо, урожай весь собран и спрятан в большинстве случаев...

...Немцы жестоко расправляются с семьями партизан, с людьми, сочувствующими партизанам. В деревне Гиримщино Толочинского р-на Друцкого сельсове-

та расстреляно семь семей, в т. ч. дети и старики. В дер. Бияки расстреляно три семьи..., в дер. Гиримщино над гр. Кавриго М. немцы издевались по-зверски, выкололи глаза, а потом расстреляли...

ПАІГП пры ЦК КПБ, ф. 3500, воп. 4, с. 37, лл. 9—12. Арыгінал.

Нараджэнне «Гразы»

З успамінаў Дз. М. Катлярчука

Дз. М. Катлярчук.

Дзмітрый Міхайлавіч Катлярчук нарадзіўся ў 1914 г. ў г. п. Тураў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. З кастрычніка 1939 г. па чэрвень 1941 г.— курсант ваеннага вучылішча Вярхоўнага Савета БССР. У ліпені — верасні 1941 г.— камандзір узвода 16-га стралковага палка ў г. Багульме Татарскай АССР, у верасні — снежні — камандзір 207-га асобага гвардзейскага батальёна ў г. Казані, са снежня 1941 г. па студзень 1942 г.— камандзір роты 207-га асобага лыжнага гвардзейскага батальёна 50-й арміі Цэнтральнага фронту. Удзельнічаў у баях за гарады Алексін, Калуга, Церамышль, Казельск, Сухінічы, Юхноў. Пасля ранення пад г. Юхноў накіраваны ў г. Разань камандзірам узвода 414-га стралковага палка 18-й стралковай дывізіі. У маі — чэрвені 1942 г. знаходзіўся на Асобым Беларускім зборы пад г. Мурамам Уладзімірскай вобласці. Са жніўня 1942 г. па ліпень 1944 г.— начальнік штаба, у чэрвені 1944 г.— камандзір партызанскай брыгады «Граза». З 1944 г. працаваў настаўнікам, дырэктарам школы ў Баранавіцкім і Талачынскім раёнах. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Пенсіянер рэспубліканскага значэння. Жыве ў г. п. Коханава.

У канцы красавіка 1942 г. пад горад Мурам прыбылі з розных вайсковых часцей афіцэры і радавыя Чырвонай Арміі, якія выказалі жаданне змагацца ў тыле ворага. Тут па рашэнню ЦК КП(б)Б быў арганізаваны Асобы Беларускі збор для падрыхтоўкі арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі. Я разам з чырвонаармейцамі нашага палка (усяго 9 чалавек) прыехаў на збор з Разані. Начальнікам збору быў капітан Дзярэвіч, камісарам — П. А. Абрасімаў. За зусім невялікі час было сфарміравана 14 партызанскіх атрадаў і 92 арганізатарскія групы, якія пасля спецыяльнай падрыхтоўкі накіроўваліся ў варожы тыл. Тут быў створаны і наш атрад «Граза» — ядро будучай партызанскай брыгады, які адпраўляўся ў Талачынскі раён. Камандаванне будучай брыгады было зацверджана ЦК КП(б)Б і ЦШПР. Камандзірам назначылі Мікалая Арцёмавіча Рашэтнікава, ураджэнца вёскі Стары Талачын, камісарам — Сямёна Мікалаевіча Нарчука з вёскі Козкі (да вайны абодва працавалі ў Талачынскім раёне), начальнікам штаба брыгады — мяне, намеснікам начальніка штаба — Яўгена Рыгоравіча Мяжовіча з вёскі Жукнева. Парторгам брыгады зацвердзілі Ігната Іванавіча Станішэўскага, камсоргам — Мірона Аляксандравіча Чорнага. Пры падрыхтоўцы шмат увагі ўдзялілі правядзенню дыверсійнай работы, вывучалі устройства мін, узрывальнікаў, вучыліся мініраванню дарог. Асвойвалі нямецкую і чэшскую зброю, спосабы вядзення разведкі праціўніка і контрразведкі, тактыку бою з засады, суствэчных абарончых баёў. У вольны ад заняткаў час перад байцамі і камандзірамі выступалі беларускія артысты, сярод якіх была і Ларыса Пампееўна Александроўская (немцы ж пісалі ў сваіх газетах, што яна перайшла на іх бок). Прырода тых мясцін была здзіўляючай прыгажосці — маляўнічае возера, сасновы лес і бярозавыя гаі — усё напамінала нам блізкія сэрцу пейзажы родных мясцін Беларусі. Усе мы з нецярпеннем чакалі дня адпраўкі ў тыл ворага. Хацелася хутчэй уключыцца ў барацьбу з ненавісным ворагам.

І вось вучоба закончылася. Перад адпраўкай адбыўся мітынг. З цёплымі словамі выступілі сакратары ЦК КП(б)Б П. З. Калінін і У. Г. Ганенка. На станцыю Навашына атрады адпраўляліся пад гукі марша. Шлях ляжаў у Маскву. Размясціліся мы ў Маскве ў другой дыверсійнай школе, дзе знаходзіўся ЦШПР. Тут камандаванне будучай брыгады сустрэлася з сакратаром ЦК КП(б)Б, начальнікам ЦШПР П. К. Панамарэнкам. Нас уразіла інфармаванасць начальніка штаба аб становішчы спраў на акупіраванай тэрыторыі, гарнізонах праціўніка і г. д. На развітанне ён пажадаў нам поспехаў у выкананні адказнага і нялёгкага баявога задання.

У школе наша група папоўнілася вопытнымі падрыўнікамі. Сярод іх былі Аляксандр

Бродскі, Рыгор Савельеў, Вера Арыстархава, Сідарэнка, Круцікаў, Кукобнікаў. У пашу групу былі таксама залічаны 2 радысткі — масквічка Аляксандра Агафонава і Галіна Лылова з горада Іванава. Усяго ў атрадзе перад адпраўкай за лінію фронту было 52 чалавекі. Мы перааапрануліся ў цывільнае, атрымалі пісталеты, ручныя кулямёты, аўтаматы, гранаты, 2 бясшумныя вінтоўкі, кожнаму выдалі плашч-палатку, сухі паёк на 2 тыдні.

20 чэрвеня 1942 г. рушылі ў далёкі шлях. Наш маршрут пралягаў праз Калінін, Таржок, Пялідава, Старую Таропу. Неўзабаве дайшлі да вёскі Шэйна, якая знаходзілася за 4 кіламетры ад фронту. Тут размяшчалася група па наладжванню сувязей з партызанскімі атрадамі і падполлем, у якую ўвайшлі сакратар ЦК КП(б)Б Г. Б. Эйдзінаў, іншыя адказныя работнікі ЦК. Тут мы атрымалі гадзіннікі, карты Віцебскай і Мінскай абласцей, падрабязную карту Талачынскага раёна, компасы. Добра вывучыўшы абарону праціўніка, мы ў суправаджэнні правадпікоў рушылі да лініі фронту, якая праходзіла праз вёску Салонікі, пакінутую яе жыхарамі і зарослую бур'янам. З дапамогай армейскай разведкі было ўстаноўлена, што немцы займаюць абарону на дзвюх вышынях супраць вёскі. Паміж імі быў разрыў у 200—250 метраў, працякала нешырокая рэчка. Тут мы і вырашылі перайсці лінію фронту. Немцы асвятлялі неба ракетамі. Здавалася, што перайсці некалькі метраў гэтай рачулкі проста немагчыма — праз кожнае імгненне станавілася светла, як днём. Мы моцна абняліся і пацалаваліся — ніхто не ведаў, ці будзе ўдача. На шляху пераходу прыйшлося залегчы разоў 12—16, калі загараліся варожыя ракеты. Рабілі ўсё бясшумна без адзінага гуку. І кожны раз чакалі магчымага адкрыцця агню праціўніка. Але перайшлі ўдала, без страт. Да світання паспелі прайсці 12 кіламетраў у глыб акупіраванай тэрыторыі. За нашым атрадам ішлі яшчэ 4: Антоненкі, Тарасава, Сінякова і Цябута. Рухаліся толькі ноччу, а днём забіраліся ў гушчар і адпачывалі. Шашу Смаленск — Віцебск пераходзілі таксама ноччу непадалёк ад станцыі Рудня. Правадпік (прозвішча, на жаль, не памятаю) аказаўся смелым і мужным. Каля пераезда ён бясшумна зняў часавога, у гэты час атрад і- пераскочыў пераезд. Аднак хвіліны праз тры загаварылі варожыя кулямёты. На шчасце, за пераездам ляжалі вялікія камяні-валуны, за якія мы і паспелі схавацца. У гэты час з боку Віцебска пачуўся гул — набліжаўся браняпоезд. Варожыя кулямёты замоўклі. У гэты прамежак зацішша нам удалося адбегчы яшчэ метраў дзвесце. Браняпоезд адкрыў агонь, але мы паспелі ўкрыцца пад разбураны мост невялікай рачулкі. А наперадзе чакалі не менш небяспечныя перашкоды — пераход шашы і чыгункі Віцебск — Орша. Але і яны былі пераадолены. Талачынскі раён быў ужо зусім побач. Рухацца было ўсё больш небяспечна. Немцы стварылі густую сетку нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, асабліва ўздоўж чыгункі і магістралі Мінск — Масква. Мы ўзмацнілі разведку, у вёскі не заходзілі, абмінаючы варожыя гарнізоны. І вось, нарэшце, мы на роднай зямлі! Гэта было 23 ліпеня. Сэрца скалануласа ад болю, калі мы ўбачылі бязлюдныя вёскі. Спыніліся ў Субачэўскім лесе непадалёк ад вёскі Межыёва. Перш-наперш радзіравалі ў Мас-

Мітынг партызан Асобага Беларускага збору перад адпраўкай у тыл ворага. Май 1942 г.

Партызанскія атрады Асобага Беларускага збору на маршы. Горад Мурам. Май 1942 г.

кву аб паспяховым прыбыцці ў вызначаны раён. Хутка прыйшла тэлеграма з ЦШПР за подпісам П. К. Панамарэнкі. Ён віншаваў нас з выкананнем першага этапа пастаўленай перад намі задачы. Але як быць далей? Людзі прайшлі больш 400 кіламетраў па лясах і балотах. Адзенне і абутак парваліся. Прадукты, выдадзеныя ў Маскве, амаль усе расходавалі. Мы былі ў акружэнні варожых гарнізонаў. Нялёгка было ў такіх абставінах пачынаць барацьбу з моцным, спрактыкаваным ворагам. Упэўненасць падаваў настрой людзей, з якімі даводзілася сустракацца, гутарыць на акупіраванай тэрыторыі. Ужо больш года пад імі навісала смерць, расправа. Але людзі не спалохаліся, збіралі зброю, размнажалі і распаўсюджвалі ад рукі напісаныя лістоўкі.

Разведка ўстанавіла, што непадалёку ад нашага лагера знаходзіцца група з акружэнцаў і ваеннапалонных, усяго 27 чалавек. Старшы групы — афіцэр Чырвонай Арміі С. Ц. Баранаў. У канцы ліпеня 1942 г. ў лесе за вёскай Межыёва адбыўся сход каманднага саставу атрада «Граза» і групы Баранава. Вырашылі аб'яднацца. Былі створаны тры партызанскія атрады. Камандзірамі атрадаў сталі А. Дз. Ворашань, Л. К. Кіпрыянец, М. Л. Калістратаў. Першы бой адбыўся на наступны дзень у гарнізоне Абольцы. Партызаны вялі сябе мужна і рашуча ў гэтым баі. Асабліва вызначыўся ўзвод Івана Стрэльнікава з 2-га атрада. Было забіта 12 паліцэйскіх, разгромлены воласць і малочны завод. Першая перамога акрыліла байцоў. Праз некалькі дзён 2-гі атрад на чале з камандзірам Мікалаем Калістратавым на бальшаку Талачын — Валосава каля вёскі Чарнаўцы разбіў 3 аўтамашыны з немцамі. Было забіта і паранена 29 гітлераўцаў.

За першы месяц баявых дзеянняў брыгады было знішчана 4 аўтамашыны, пушчана пад адхон тры варожыя эшалоны. Жыхары вёсак з вялікай надзеяй і прыхільнасцю сустракалі нас, дзяліліся часам апошнім. Успамінаецца 67-гадовая Ксенія Фёдараўна Чумакова з вёскі Чуватава. Яна прынесла ў атрад, дзе змагаўся яе сын Павел, вінтоўку і шмат патронаў. Вораг, якому ўпэўнена гаспадарыць на занятай тэрыторыі перашкаджалі народныя мсціўцы, не мог мірыцца з фактам існавання партызан. І ўжо 5 верасня 1942 г. пачалася блакіроўка Пасмурскага лесу, куды перайшла брыгада. Рэгулярныя войскі з тэхнікай з усіх бакоў пачалі акружаць лес. Але брыгада ўдала зманеўравала, страціўшы забітымі 2 і трапіўшымі ў палон 9 партызан, і выйшла з акружэння.

Так пачыналася баявая біяграфія партызанскай брыгады «Граза», якая неўзабаве сапраўды стала гразой для ворага.

Бой на станцыі Слаўнае

З успамінаў С. Г. Жуніна

Сяргей Георгіевіч Жунін — Герой Савецкага Саюза (15.8.1944). Нарадзіўся 18.8.1906 г. ў в. Мядзведзіцкае Кімрскага раёна Калінінскай вобласці. З сялян. Рускі. Член КПСС з 1943 г. У Чырвонай Арміі з 1928 г. У пачатку вайны на Заходнім фронце — памочнік камандзіра танкавага палка. З ліпеня 1941 г. партызан, камандзір групы, з красавіка 1942 г. камандзір атрада «Сяргея» (пазней 36-ы

атрад). У кастрычніку 1942 г.— жніўні 1943 г. камандзір Круглянскай ваенна-аператыўнай групы. З снежня 1943 г. палкоўнік Жунін — камандзір 8-й партызанскай брыгады, якая зрабіла рэйд у Брэсцкую вобл.

28.8.1942 г. атрады 36-ы, 8-ы і 24-ы пад камандаваннем С. Г. Жуніна разгромілі чыгуначную ст. Слаўнае на лініі Мінск — Орша. У 1944—1950 гг. на савецкай рабоце ў Брэсце і Мінску. Памёр 27.1. 1977 г. Бюст героя ўстаноўлены ў дварэ школы № 100 г. Мінска.

К 1 августа 1942 года в зоне наших действий уже было пять отрядов. Сила немалая. У меня не выходила из головы мысль — как разгромить станцию Славное.

— Проведем собрание командиров, комиссаров и начальников штабов отрядов,— сказал Чигин,— предложим совместно провести операцию.

С этой идеей согласилось командование трех отрядов. В наш штаб прибыли Дмитрий Куликов и Константин Матеж, затем — руководители 24-го отряда Георгий Мисник, Николай Садофьев и Тимофей Лупеко. Со своими боевыми товарищами — комиссаром отряда Василием Петровым и начальником особого отдела Дмитрием Чигиным — я предварительно обсудил план разгрома станции Славное. Что же скажут командиры 8-го и 24-го отрядов?

— Не рискованно ли? — спросил Мисник.

— Вообще-то мысль интересная,— вставил Куликов,— но нужна хорошая подготовка.

— Конечно, еще никого не украшала непосильная ноша,— вступил в разговор Петров.— Но у нас есть время подготовиться.

— Силами трех отрядов,— заявил Дмитрий Чигин,— можно достичь успеха. О противнике мы все знаем. К операции будет привлечено еще около 300 человек гражданского населения.

План приняли. Началась подготовка.

В нашем отряде состоялось партийное собрание. К тому времени у нас было 11 коммунистов и 30 комсомольцев. Кроме того, подали заявление о вступлении в партию 10 человек и 20 — о вступлении в комсомол. Всесторонне обсудили, как лучше выполнить план разгрома станции Славное. Решили и в период подготовки продолжать боевые действия. За первую декаду августа отряд дважды нападал на железную дорогу в районе деревни Каменка. Под водосточную трубу заложили 152-миллиметровый снаряд и взрывом уничтожили большой участок насыпи. Второй раз прямо на переезде взорвали рельсы. Более суток немцы восстанавливали путь.

Во многих деревнях мы начали создавать дружины самообороны и охраны общественного порядка. Вот что сообщил нам старший группы самозащиты из деревни Татарка Александр Кириллович Кухлевский: «Довожу до сведения, что у нас проведено собрание, на котором присутствовал комиссар Петров. Но мы не имеем своего оружия, за исключением двух винтовок. Просим помочь в этом деле». Далее прилагается список лиц, желающих быть в составе дружины самообороны. Всего 22 человека.

Перед нападением на станцию Славное мы решили провести разведку боем. От ее исхода зависело, наступать на Славное или нет.

В 24.00 13 августа группа партизан под

Чыгуначная станцыя Слаўнае.

Мемарыяльная дошка на будынку чыгуначнай станцыі Слаўнае.

командованием Токарева прибыла к реке Ильянка. Группа Симановича вышла в район железнодорожного моста, чтобы снять вражескую охрану, порвать связь, уничтожить водокачку, мост, будку, казарму. Третья группа под командованием Кудрявцева заняла оборону восточнее реки Ильянка, а отделение Смирнова — неподалеку от самой станции.

Действия начались в два часа ночи. Первыми поднялись в наступление Б. Вершинин, И. Петрович, П. Лощаков, П. Иванов, А. Галкин, М. Шерстобитов, Лосяков, Куликовский, Прохоренко, Тульцев. Десять взрывов на «железке» сделали Катко, Сухоницкий, Шеницин, В. Лаппо.

Взорван железнодорожный мост через Ильянку, уничтожена связь, сожжена казарма, захвачено шесть гитлеровцев. Среди трофеев было и оружие.

— Ну как, Сергей? — обратился ко мне Дмитрий Чигин, шедший рядом с Алексеем Симановичем, который сейчас был у нас начальником штаба.— Осталось немного времени.

— И правильно,— ответил Симанович.— Надо громить Славное...

27 августа 1942 года было принято окончательное решение. 24-й отряд наступает на восточную окраину станции. Потом он занимает оборону в направлении деревни Глинники. Исходное положение — 300 метров юго-восточнее Славное. К 1.00 28 августа взвод подрывников под командованием Горбунова взрывает обе колеи железной дороги в районе Славень.

8-му отряду предстояло вести наступление на западную окраину станции, не пропустить свежие силы противника с магистрали Минск — Орша. Исходное положение — 300 метров юго-западнее Славное. Подрывники под командованием Матежа должны взорвать железную дорогу двенадцатью взрывами в районе Красновки к 1.00.

Наш 36-й отряд наступает с южной стороны в направлении водокачки с задачей овладеть зданием станции. Исходное положение — 200 метров южнее Славное. Командиру артиллерийско-минометной группы Порфирию Токареву приказано занять огневые позиции возле деревни Авхуты. Артиллерист Николай Юрин и минометчики должны быть готовы открыть огонь по зданию станции и казарме к 1.30. Подрывные группы Алексея Симановича и Михаила Шерстобитова, а также саперы под командованием Владимира Смирнова и наш резерв — призванное гражданское население, или, как мы тогда называли, «рубаловцы»,— сосредоточились за 36-м отрядом.

Начало наступления было назначено на 2.00 28 августа.

В 24.00 со станции Бобр в Славное прибыл эшелон. Это было для нас неожиданностью. Я приказал выяснить, что в вагонах. Если солдаты, то придется в план штурма внести изменения.

Через некоторое время Чигин доложил:

— В эшелоне оружие и боеприпасы.

Все облегченно вздохнули. В назначенное время послышались взрывы на западе и востоке. Вслед за ними раздались выстрелы из пушек. Первые снаряды попали в здание станции. Противник открыл ответный огонь. События развертывались стремительно. С удивительной энергией и смелостью работали саперы. Вооруженные топорами, лопатами, ломами и гаечными ключами, они разворачивали рельсы, выкапывали шпалы. Около 300 «рубаловцев» также вели себя мужественно.

Партизаны поднялись во весь рост и с криком «ура!» пошли на штурм. Фашисты в панике метались в разные стороны.

В вокзал первыми ворвались Петр Лощаков, Борис Вершинин, Михаил Навоев, Петр Редин, Федор Никулин, Дорофей Бутенко, Михаил Шумейко, Дмитрий Курбатов и Александр Павлюк. Павлюк уничтожил фашистскую огневую точку и захватил вражеский станковый пулемет. Из него открыл огонь по убегающим гитлеровцам.

Евгений Пожарицкий и Валентин Сухоницкий штыками закололи трех вражеских солдат и бросились к водонапорной башне. Здесь уже было несколько партизан. Подрывники тащили на башню четыре тяжелых снаряда. По крутой винтовой лестнице со снарядами поднимаются Алексей Симанович, Михаил Шерстобитов, Иван Прохоренко, Федор Диденко. Вскоре раздались взрывы. Водонапорная башня рассыпалась вдребезги.

Воинский состав, стоявший на запасном пути, уничтожают Ф. Кандыбо, П. Лаппо, А. Галкин, П. Иванов, М. Кулаковский, И. Кулаковский, П. Кудрявцев, П. Мухин, Б. Еркович, А. Протасевич, Лидия Юбко, Надя Василевская, Мария Савина, В. Бельмасов, И. Ирхин, Г. Измайлов, А. Алексеев, Н. Лосяков. К другому эшелону устремились Н. Юрин, Г. Кудин, П. Булыгин, А. Токарев, И. Бежов, С. Чеботарев, И. Гурьянов, Поля Чеботарева, А. Лугаков, И. Пристромов, А. Семенов, С. Мансуров, А. Животков, И. Москалев, П. Ус и Н. Шугалей.

Возле эшелона, прибывшего на станцию перед боем, завязалась рукопашная схватка. Горят склады, казармы и еще два эшелона, стоявшие на запасных путях. Казалось, что наступает целая армия. Кругом

гремело «ура!». Помогло то, что среди партизан было порядком людей, проживавших ранее в этих местах. Они хорошо знали, где расположены укрепления, огневые точки противника. Одними из первых со Славного стали партизанами Михаил, Иван и Анастасия Кулаковские, Александр Яковлев, Петр Иванов, Илья и Владимир Лапоревичи и другие. Они вели за собой товарищей.

Евгений Антонович Жидяев один схватился с группой фашистов, засевших в кювете. Уничтожил четырех, но и сам был сражен вражеской пулей.

За три часа боя на станции Славное мы уничтожили все вражеские укрепления. Продукты, одежду и боеприпасы крестьяне грузили на подводы. Кругом дым. Федор Якулин, Александр Черников, Николай Лосяков, Константин Салоненко добивали фашистов, которые скрылись в ближайших дворах. Они взяли в плен немецкого офицера.

На рассвете мы отошли к деревне Зяблицы, где был назначен сборный пункт. На станции осталось более сотни немецких трупов и груды развалин.

Через день все отряды, принимавшие участие в разгроме станции Славное, снова собрались вместе, чтобы сделать подробный разбор операции. Было признано, что наступление велось организованно...

Как руководитель операции я подробно доложил в оперативный военный центр о разгроме станции Славное и всего гарнизона. В ответ 17 сентября 1942 года пришло письмо, в котором говорилось: «...За разгром станции Славное объявляю благодарность всем вашим партизанам. Представьте мне списки для ходатайства о награждении отличившихся в этой операции. Действуйте смело и энергично, задача — не пропускать ни одного поезда и ни одной машины на участке Борисов — Орша. Рвите мосты и железную дорогу...

Командир оперативной группы полковник *Ничипорович.*

Комиссар оперативной группы *Яковлев.*

Начальник штаба полковник *Айрапетов».*

Такой отзыв был нам очень дорог. Письмо я прочитал перед строем. Многих товарищей решили представить к правительственным наградам.

Ныне на станции Славное установлена мемориальная доска. На ней высечено, что 28 августа 1942 года 8-й, 24-й и 36-й партизанские отряды разгромили здесь крупные силы гитлеровцев и задержали на несколько дней движение вражеских войск к фронту.

Найти сто «подозрительных» человек гитлеровцам ничего не составляло. Каждый советский человек был у фашистов на подозрении. Тем более после разгрома партизанами станции Славное. Людей хватали повсюду. Арестовали киномеханика Романа Гайсенка, железнодорожника Ивана Вараксу, учительницу Валентину Чеснович с ребенком, Фралю Повицкую. Каратели вытащили из дома Тимофея Винникова. Эсэсовец ударил его по голове. Тимофей вырвал у фашиста автомат и дал очередь. Враги натравили на Винникова собак, которые загрызли человека до смерти.

Хватали женщин, детей, стариков. На семи крытых машинах их доставили в городской поселок Крупки. Смотреть на казнь гитлеровцы согнали все мужское население Крупок и ближайших деревень.

Толпу окружил плотный конвой автоматчиков. Людей погнали по старомосковской дороге. Никто не знал, куда и зачем. Видели только, что гнали в сторону кладбища. Многие уже слышали, что ночью там вырыли большую яму. По команде начальника районной полиции Свитковского свидетелей построили в 8 метрах вокруг ямы. Немного в стороне под усиленной охраной стояло семь крытых машин.

На помост поднялся немецкий комендант и объявил:

— За нападение партизан на станцию Славное сейчас будет расстреляно 100 заложников.

Обреченных выводили по 5—6 человек. Заставляли раздеться, а потом ставили у ямы. Очереди следовали одна за другой.

— Дяденька, за что меня? — схватил Свитковского за китель мальчик лет тринадцати.

Но предатель пинком сбросил его в могилу.

К яме подвели двух красивых девушек. Одна из них — Нина Крушинская, комсомолка, бывшая секретарша толочинской комендатуры. Они обнялись и запели.

Полоснула очередь.

Следующей жертвой оказалась учительница Валентина Чеснович с грудным ребенком. Она крепко прижимала малыша к груди, но один из палачей вырвал ребенка и швырнул в яму. Женщина страшно закричала, глаза ее сделались большими-большими. Она бросилась на одного из фашистов и здесь же повалилась на землю. Труп столкнули на живого ребенка. Мертвыми падают в яму Ирина Голубева с сыном, Мошкарева с ребенком...

Так было расстреляно 100 человек. Свидетелей выстроили в колонну и провели вокруг ямы, заставляя смотреть на убитых и раненых. Того, кто отворачивался, били плетьми. А в огромной яме шевелились люди, слыша-

лись их предсмертные стоны. Еще живых начали засыпать землёй...

Оккупанты выполняли свой коварный план массового истребления советских людей. Трагедия в Крупках показала, что фашисты не разбирались, кто прав, кто виноват. Хватали каждого встречного. Даже в грудных детях они видели своих противников.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Жунин С. Г. От Днепра до Буга. Мн., 1974. С. 68—76.

Дакументы і сведкі абвінавачваюць...

ПЕРАПІСКА АПЕРАТЫЎНАГА УПРАЎЛЕННЯ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА СУХАПУТНЫХ ВОЙСК ГІТЛЕРАЎСКАЙ ГЕРМАНІІ З КАМАНДАВАННЕМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» АБ ПРАВЯДЗЕННІ РЭПРЭСІЙ СУПРАЦЬ МІРНЫХ ГРАМАДЗЯН У РАЁНЕ СТ. СЛАЎНАЕ ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

28—31 жніўня 1942 г.

Телеграмма оперативного управления генерального штаба сухопутных войск гитлеровской Германии командованию группы армий «Центр» о необходимости проведения репрессий в связи с нападением партизан на стн. Славное Толочинского района Витебской обл.

28 августа 1942 г.

Совершенно секретно!

Фюрер требует немедленного проведения операции возмездия в связи с нападением на стн. Славное с применением самых жестоких репрессивных мер.

О намеченных мероприятиях доложить.

Оперативное управление (1) генерального штаба сухопутных войск.

Телеграмма командования группы армий «Центр» в оперативное управление генерального штаба сухопутных войск гитлеровской Германии с просьбой разрешить начать репрессии против мирного населения за нападение партизан на стн. Славное Толочинского района Витебской обл.

30 августа 1942 г.

Совершенно секретно.

На основании телеграммы оперативного управления генерального штаба сухопутных войск № 11027/42 от 28.8.42, сов. секретно, сообщается:

Во исполнение приказа о проведении операции возмездия в связи с нападением на стн. Славное предусмотрено следующее: 100 сторонников партизан и членов семей последних в районе Славное, подозреваемых в участии или в содействии нападению, будут расстреляны. Их дома будут сожжены. О принятых мерах будет передано по радио с комментариями. Проведение этих мер подготовлено.

Просьба дать разрешение.

Командование группы армий «Центр», оперативный отдел.

Телеграмма оперативного управления генерального штаба сухопутных войск гитлеровской Германии командованию группы армий «Центр» с разрешением проводить репрессии против мирного населения за нападение партизан на стн. Славное Толочинского района Витебской обл.

31 августа 1942 г.

Секретно.

Основание: Телеграмма группы армий «Центр», оперативный отдел, № 6744/42, от 30.8.

С намеченными мероприятиями согласен. О результатах доложить.

Оперативное управление (1 М) генерального штаба сухопутных войск.

З СТЭНАГРАМЫ СУДОВАГА ПРАЦЭСУ ПА СПРАВЕ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ, УЧЫНЕНЫХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ НА ЧАСОВА АКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БССР У 1941—1944 гг.

15—19 студзеня 1946 г.

Из допроса подсудимого Иогана Рихерта, генерал-лейтенанта, быв. командира 286-й охранной немецкой дивизии, о расстреле гитлеровцами 100 мирных советских граждан в районе стн. Славное в августе 1942 г.

15 января 1946 г.

...Прокурор: Теперь расскажите, что произошло на стн. Славное?

Рихерт: В августе 1942 г. партизанами была уничтожена вся охрана железнодорожной стн. Славное, разрушено здание вокзала и водонапорная башня.

Прокурор: Какие в связи с этим событием вы получили указания от ставки верховного немецкого командования?

Рихерт: На следующий день я был вызван фельдмаршалом фон Клюге, который сказал мне, что он получил строгий приказ от фюрера, в котором говорилось о том, что нужно 100 чел. расстрелять и сжечь все деревни, расположенные в районе железнодорожной стн. Славное.

Прокурор: На каком протяжении было приказано сжечь деревни?

Рихерт: На протяжении от Орши до Борисова. Фельдмаршал Клюге спросил мое мнение насчет сожжения деревень, я отклонил это предложение, заявив, что немецкая армия не будет тогда иметь места для размещения своих частей, а население уйдет на сторону партизан. Население нам нужно было для того, чтобы зимой очищать снег на железной дороге. Фельдмаршал Клюге согласился со мной и убедил высшее командование в том, что эти деревни сжигать не следует. Но 100 чел. было приказано расстрелять, что и было исполнено.

Прокурор: Кого вы расстреляли, лиц, непосредственно напавших на охрану, или людей, совершенно не имевших никакого отношения к этому происшествию?

Рихерт: Так как виновников, которые действительно принимали участие в нападении на железнодорожную станцию, было установлено мало, то в число намеченных к расстрелу были включены лица, которые никакого отношения к этому случаю не имели. Таким образом, было расстреляно 100 чел.

Прокурор: В числе этих 100 чел. старики и дети были?

Рихерт: Это мне неизвестно.

Прокурор: Таким образом, по вашему приказанию было расстреляно 100 чел. Об этом вы расписали в газетах, огласили по радио. А скажите, зачем вы согнали 1500 чел. смотреть, как вы расправляетесь с населением?

Рихерт: Это было сделано для устрашения.

Прокурор: Кто непосредственно выполнял приказ о расстреле 100 чел.?

Рихерт: Батальон моей дивизии.

Прокурор: Как вы, Рихерт, расцениваете расстрел этих 100 чел.?

Рихерт: Как меру против человечности, против интернационального права неприкосновенности мирного населения...

Из показаний свидетеля В. А. Баранчика о расстреле гитлеровскими захватчиками 100 мирных советских граждан в районе Крупок в августе 1942 г.

16 января 1942 г.

...Я расскажу, как в 1942 г., в конце августа или в начале сентября было расстреляно 100 чел. в районе мест. Крупки. Это было в воскресенье утром. Немцы с полицией пришли в дом ко мне и с применением силы предложили выйти на улицу. Всех жителей нашего поселка под конвоем повели с площади в ближайший лес, где было согнано около 5 тыс. чел. из Крупок и окрестных деревень.

В лесу была выкопана яма, и около нее стояли 4 автомашины, крытые брезентом. Когда население было собрано, комендант произнес речь, в которой он заявил, что сейчас на наших глазах будут расстреляны 100 чел. со стн. Славное. Затем выступил начальник крупской полиции. Он также сказал нам, что сейчас будет расстреляно 100 чел. и что каждый стоящий здесь должен запомнить и не думать о связях с партизанами или уходить к партизанам, а тот, кто будет замечен в этом, будет подвергнут смертной казни. После этого по команде коменданта открыли брезент, которым были закрыты машины. Мы увидели, что в машинах сидят наши советские люди. Их начинают по 5 чел. брать из машин, приказывают раздеваться тут же около машины и подводят к могиле, укладывают в нее, а потом расстреливают. В числе 100 чел. были также дети в возрасте от 12 лет и младше. В числе находившихся в машине была женщина с грудным ребенком на руках, которую немцы раздели, ребенка у нее вырвали, ее бросили в яму, а вслед за ней бросили ее ребенка и застрелили обоих.

После казни нас построили и заставили пройти возле могилы...

Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии, 1941—1944. Мн., 1965. С. 38—40, 331—332, 333.

З успамінаў жыхара г. Крупкі Віктара Фаміча Шэршаня, 1910 г. нараджэння

...З пяці валасцей сагнаны народ у г. Крупкі: Ухвалы, Шынкі, станцыя Крупкі, Дзянісавічы — усе. У асноўным выганялі мужчын. Ніхто не знаў, нашто забіраюць. А яны ходзяць па вуліцы, у хаты заходзяць і: «Выхадзі, выхадзі, выхадзі!..» Калі толькі мужчына, значыць «выхадзі». У калону паставілі і ўсіх калопай пагналі да могілак. Гэта немцы тады расстрэльвалі ў паказацельным парадку. Ніхто глядзець не хацеў, дык каб людзі, значыць, не ўцякалі, каб не разбягаліся, кругом былі пастаўлены кулямёты. А потым машыны прыйшлі, на якіх былі заложнікі. З машыны здымаюць і — да ямкі. Верхнюю адзёжку з людзей паздымалі, з машыны далоў, а потым вядуць туды, да ямкі. Па адным, па адным. Тады страляць пачалі. А сагнаных мужчын вакол ямкі абганялі. Па два чалавекі ставілі ў шарэнгу і абганялі. Была там у заложнікаў адна жанчына, дык у яе дзяўчынка была. Ужо з годзік, напэўна, ёй быў, ладненькая такая. Нехта з людзей пытаўся яе ўзяць. Але немец убачыў, адабраў дзіцё і ў яму кінуў. Кожны тады стараўся, каб менеў глядзець. Вочы не падымалі. І я блізка не стаяў, стараўся, каб менеў глядзець. Потым ужо, як пабілі заложнікаў, яны нас яшчэ каля ямкі абагналі, а тады пусцілі...

З успамінаў жыхаркі г. Крупкі Марыі Нікіцічны Буткевіч, 1908 г. нараджэння

...Народу цёмна было. Дужа народу многа. З адной бы Крупкі столькі не было. Яны жанчын не бралі, а мужчын. А ўсе бабы беглі, гвалтавалі. Думалі, што мужчын будуць страляць: так, як яўрэяў, сабралі і пагналі. А я куды пабяжу? Бацька стары, яго ўзялі былі, ды кінулі. Там у нас за хатай лазня была, дык я узлезла на загароду за ёй і глядзела. Гэта цяпер во набудавалі, а тады пуста было, усё відна. Машын многа было. Беглі па вуліцы жанчыны і крычалі. А матка Світкоўскага тады сядзела на ганку і гаварыла: «Не бойцеся, не будуць мужчын страляць, гэта іх пагналі глядзець, як будуць партызан страляць». Казалі, што ў машынах людзей напрывозілі. Дык сама я там не была. А пагаворкі былі. Там яны гэтых заложнікаў клалі ў рады, адзін у адзін, і стралялі. А мужчын абганялі кругом ямкі, каб яны глядзелі. Па два чалавекі ставілі і абганялі. Народу цёмна было. І знаеце, які спуг быў. Ужо забывацца пачала, што куды во палажыла, а гэта помню. Народу аж цёмна было.

З успамінаў жыхаркі в. Слаўнае Ніны Антонаўны Жукоўскай, 1917 г. нараджэння

...Тады ў Крупках мужа майго Рому расстралялі. Са Слаўнага яшчэ Вараксу Івана, Валю Касмовіч з гадавалым дзіцём і Франю Навіцкую, муж яе ў партызанах быў. Але забралі нас трохі раней, як партызаны на гарнізон наляцелі. Пэўна дзён пяць да таго яшчэ было. За сувязь з партызанамі. І сёння думаю, нехта прадаў тады нас. А можа Валю і Франю потым забралі, як бы то паказацельна. Гаварыць не буду, бо не знаю.

Рома да вайны кінамеханікам рабіў, а ў вайну трохі памагаў партызанам, вазіў з Барысава волава, соль, іншае такое, я і не знаю навошта. Ён тады як раз з Барысава прыехаў. Прывёз солі, можа з пуд там усяго было. А ў хаце ў нас такі во сундучок стаяў, дык у ім чыста ўсё і ляжала. Прыйшлі паліцаі, усё забралі, кажухі забралі, якія ха-

рошыя рэчы. Вобыск у нас быў. А тады Рому і мяне забралі і павялі. На станцыю павялі, там сарайчык такі во стаяў. Укінулі ў гэты сарайчык. А ў мяне дзяўчынка была маленькая, Галя. Каб не яна, не было б мяне цяпер. Як ішлі бежанцы, яна прыбілася. Матку бомба забіла, бацька на фронце. Жыла ў мяне за дачку. Гадоў сем ёй было. Дык яна прыйшла пад сарайчык і плача: «Маю цётку забралі... Майго дзядзьку забралі...» Тады пасля начы бургамістр мяне пусціў. Дзяцей ён дужа любіў. Гаворыць: «Ідзі, і во прыпясі свайму адзення, чаго ён голы сядзіць». Я і пайшла. Але сама несці пабаялася, думала другі раз пасадзяць. Дзяўчынка занесла. А тады Рому і Варакса Івана адразу ў Талачын павезлі, у «Пушніну». Яны да расстрэлу яшчэ там трохі сядзелі. А потым нехта бачыў, сказаў мне, што павезлі Рому ў Крупкі, па магістралі павезлі, што ў Крупках расстрэльваюць. Людзі казалі, што ямка там была такая, дык іх каля ямкі ў кружок паставілі і крупчанскіх усіх пазганялі. Каб глядзелі: паказацельны расстрэл... Сама я тады ў людзей хавалася.

* * *

30 студзеня 1946 г. на іпадроме горада Мінска быў прыведзен у выкананне прыгавор Ваеннага трыбунала Мінскай ваеннай акругі над нямецка-фашысцкімі злачынцамі Рыхертам, Герфам, Эрдмансдорфам, Вайсітам і іншымі, засуджанымі за жудасныя злачынствы, зробленыя імі ў Беларускай ССР, да пакарання смерцю праз павешанне.

У пошуках партызан

Зімой 1943 года ў Талачынскую партызанскую брыгаду М. П. Гудкова прыйшла група савецкіх ваеннапалонных, якія ўцяклі з эшалона, што вёз іх у канцлагер. Большасць у групе складалі лётчыкі. Праз пэўны час іх пераправілі самалётам на Вялікую зямлю, а некаторыя з тых уцекачоў засталіся ваяваць у партызанах, у тым ліку і аўтар гэтых успамінаў Уладзімір Пятровіч Ільін, былы камісар атрада № 5 брыгады М. П. Гудкова. У. П. Ільін жыве ў Падмаскоўі, у г. Ягор'еўск.

Наступіў 1943 год. Свой план уцёкаў з лагера ваеннапалонных у Смаленску лётчыкі намецілі ажыццявіць у канцы студзеня. Ці быў гэты план рэальным — цяпер дзяжка сказаць.

Амаль папярэдадні ўцёкаў у наш барак нечакана зайшла група нямецкіх салдат. Пералічылі ўсіх і пад узмоцненай аховай павялі на чыгуначную станцыю. Там нас, 25 чалавек, загналі ў таварны вагон, у якім стаяла толькі буржуйка, а вокны былі аблытаны калючым дротам. Нямецкі афіцэр, спыніўшыся насупраць дзвярэй, звярнуўся да нас на чыстай рускай мове:

— Вы паедзеце ў горад Лодзь і будзеце працаваць там на фабрыках і заводах. Вас там будуць карміць і апранаць у спецвопратку. Не спрабуйце па дарозе уцякаць, бо калі каго зловім, то расстралям. На дарозе я абяцаю добра карміць вас з салдацкай кухні. Калі я прывязу вас у Лодзь, то камандаванне адпусціць мяне ў Берлін. Там жывуць мае сваякі, якіх я яшчэ не бачыў, бо нарадзіўся і жыў у Расіі.

— Куды ўцячэш у такую сцюжу? Паглядзіце, якое ў нас адзенне. Мы замерзнем у снезе. Таму не хвалюйцеся, мы разам з вамі прыедзем у гэты Лодзь,— крыкнуў я з вагона афіцэру.

Той паглядзеў на маю парваную ватоўку і няпэўнай формы па параненай назе самаробны бот са старога шыняля, летнюю кепку і, мусіць, супакоіўся. Ён загадаў стрэлачніцы падаць нам на дровы дошку, што валялася каля вагона. Жанчына прынесла не толькі дошку, але яшчэ трохі дроў і каменнага вугалю.

Гітлераўцы зачынілі дзверы і накінулі на іх завалу. Афіцэр і салдаты, якія суправаджалі нас, селі ў суседні вагон. Калі звечарэла, поезд крануўся і пайшоў на захад, у бок Оршы.

10 ноября [19]43 г. Немцы отравляют колодцы. Отряд «За Советскую Белоруссию» разбил 2 легковые и 2 грузовые автомашины. 9 солдат убито, 2 тяжело ранено. Захвачен пулемет и 1 винтовка.

14 ноября 1943 г. Отделение Писаренко разбило на автомагистрали Минск — Москва 3 автомашины, убито и ранено до 18 гитлеровцев. Партизаны отр[яда] «Знамя» на дороге Обольцы — Коханово обстреляли немецкую колонну. 1 немец убит и 1 ранен. Достали у населения 2 винтовки. Партизаны отр[яда] «Победа» на автомагистрали Минск — Москва разбили 5 автомашин. Убито и ранено 30 гитлеровцев.

28 ноября 1943 г. Отр[яд] «За Советскую Белоруссию» разрушил большак Толочин — Волосово. Уничтожено 3 километра связи. Поврежден телефонный провод фронт — Берлин.

...8 декабря 1943 г. Прилетели советские самолеты. Привезли 17 тыс. патрон.

9 декабря 1943 г. Взвод отряда Суворова под командованием Кузнецова вел открытый бой в д. Михиничи. Убито 2 и ранено 2 немца. Отбито 6 коров, награбленных у крестьян. Храбро дрался и погиб пулеметчик Саманюта. Этим же отрядом на автомагистрали Минск — Москва подбито 3 автомашины. Убито до 36 гитлеровцев.

11 декабря 1943 г. Отряд «Знамя» подорвал 2 автомашины на автомагистрали между Озерцами и Михайловщиной.

17 декабря 1943 г. Отряд им. Г. И. Котовского подбил транспортный самолет противника, который совершил вынужденную посадку в р[айо]не м[естечка] Смольяны. Отряд подорвал груз[овую] автомашину на бол[ьшаке] Обольцы — Смольяны. Убито 4 немца...

...22 декабря 1943 г. Отряд им. Александра Невского на автомагистрали Минск — Москва разбил 1 груз[овую] и 1 легк[овую] автомашины. Убито 6 и ранено 9 гитлер[овцев]. Вторая группа подорвала немецкую автомашину. Убито 6 немцев, 3 ранено.

Группа партизан на ж. д. Минск — Москва спустила эшелон. Разбит паровоз, 7 вагонов с живой силой, 4 вагона с боеприпасами и 11 платформ с автомашинами. Убито и ранено 210 гитлеровцев.

24.12.[19]43 г. При минировании железнодорожного полотна погиб подрывник отр[яда] «За Сов[етскую] Белоруссию» Дубков М. Отряд «За Советскую Белоруссию» через связную Ермакович Ядю сжег склад в Толочино с медикаментами, продуктами, оружием.

...26 декабря [19]43 г. Группа партизан в кол[ичест]ве 25 чел. (ст[арший] Сивкович) подорвала автомашину и военный эшелон. Дан приказ отрядам на блокировку гарнизона Волосово. Отряды заняли деревни вокруг гарнизона.

27 декабря [19]43 г. Противник в 11.30 силой до 45 человек двигался на Толочин. Отряд «Знамя» организовал засаду в д. Рафалово. Ком[андир] взвода Иванов подпустил противника на близкое расстояние и открыл огонь. Убит один офицер, 11 солдат, ранено — 7. Захвачено 11 винтовок, 4 пулемета, 3 автомата, 8 лошадей с продуктами. К исходу боя пр[отивни]к с гарнизона Мешково силой

до 40 чел[овек] прибыл на подкрепление. Его встретил взвод Дивейкиса в д. Черноручье. Убито 7 и ранено 9 фашистов. Убит начальник гарнизона Мешково.

...10 февраля [19]44 г. Группа партизан отряда им. Фрунзе на ж[елезной] д[ороге] Минск — Москва между деревнями Букарево и Михайловщина сбросили эшелон пр[отивни]ка. Разбит паровоз и 28 вагонов с живой силой. Убито и ранено до 400 гитлеровцев (ст[арший] гр[уппы] Илютин).

Группа партизан отряда «Победа» на автомагистрали Минск — Москва подбила 5 автомашин. Убито и ранено до 45 гитлеровцев.

...19 февраля [19]44 г. Блокировка партизанами нем[ецкого] гарнизона Абчуга.

Группа партизан отряда им. М. В. Фрунзе на ж[елезной] д[ороге] Минск — Москва между Букарево и Михайловщиной спустила под откос военный эшелон, следовавший на фронт. Разбит паровоз и 23 вагона с живой силой и 5 вагонов с автомашинами. Убито и ранено до 440 гитлеровцев. Движение по железной дороге приостановлено...

Подрывник Плешаков с группой на ж[елезной] д[ороге] Минск — Москва между ст. Трацилово и Славное спустил эшелон противника. Разбит паровоз и 11 вагонов с различным грузом. Убито 10 и ранено 14 [гитлеровцев].

Взвод отряда «Победа» под командованием комиссара Сивковича совершил нападение на нем[ецкий] гарнизон Озерцы. Убито 11 гитлер[овских] офицеров и 14 солдат, ранено 12. Общежитие забросано гранатами. Захвачено 19 винтовок, 2 пистолета... Отряды вернулись без потерь.

Подрывники отр[яда] «Знамя»... [старший — Гасюта] на ж[елезной] д[ороге] между д. Новая Рудня и Коханово спустили под откос вражеский эшелон. Разбит паровоз, 13 вагонов с техн[икой] и боеприпасами. Убито и ранено до 70 гитлеровцев. Перерезан провод фронт — Берлин. В д. Якубово обстрелян секрет отр[яда] им. Н. Ф. Гастелло. Один партизан убит.

22 февраля [19]44 г. Отр[яд] «За Советскую Белоруссию» на ж[елезной] д[ороге] Минск — Москва спустил эшелон противника между Ломачино — Погост, следовавший с фронта. Разбит паровоз и 13 вагонов (из них 2 — с живой силой), 7 платформ с автомашинами. Убито до 20 гитлер[овцев].

24 апреля [19]44 г. Получена поздравительная радиограмма от Архангельского в честь Дня Красной Армии. Подрывники отряда [имени] Александра Невского (старший Савицкий) подорвали эшелон на ж[елезной] д[ороге] Минск — Москва между ст. Трацилово и Славное. Взорван паровоз, 4 вагона с живой силой и 6 вагонов с лошадьми. Убито и ранено до 100 гитлеровцев. Движение приостановлено на 12 часов...

...28 февраля 1944 г. Налет нем[ецких] самолетов на деревни партиз[анской] зоны. Отправка отряда имени П. Ф. Гастелло и им. М. В. Фрунзе на операцию.

1 марта [19]44 г. ...Отряд «Знамя» вывел из немецкого гарнизона 24 коровы. Подрывники отряда «Победа» (старший Богданский) на железной д[ороге] Толочин — Орша подорвали эшелон, идущий с фронта. Разбит паровоз и 2 вагона с живой силой, 3 вагона с автомашинами и повозками. Убито и ранено до 35 гитлеровцев...

...3 марта [19]44 г. ...Группа партизан отряда [им. М. В.] Фрунзе (старший Илютин Ив.) на ж[елезной] д[ороге] Толочин — Орша взорвала эшелон, идущий на фронт. Разбит паровоз, 9 вагонов с боеприпасами. Убито и ранено до 20 гитлеровцев.

...6 марта [19]44 г. Подрывники отряда «За Родину» взорвали эшелон противника на железной д[ороге] Толочин — Орша. Мина взорвалась во время встречи двух эшелонов. В эшелоне, идущем на фронт, разбит паровоз и 7 вагонов со скотом. Убито и ранено до 20 гитлер[овцев].

7 марта [19]44 г. Подрывники отр[яда] им. А. В. Суворова на ж[елезной] д[ороге] Толочин — Орша взорвали эшелон. Разбит паровоз и 15 вагонов... Убито и ранено до 195 гитлеровцев.

...16 марта [19]44 г. Нем[ецкие] самолеты бомбили партизанские деревни. В Толочинском р[айо]не немцы предприняли экспедицию против партизан в Сковышках, Бушмино, Романовке, Анелино, Дроздово, Поречье, Узгон.

На ж[елезной] д[ороге] Минск — Москва, между Коханово и Оршей группа

партизан отр[яда] «Знамя» сбросила эшелон противника. Разбит паровоз и 11 вагонов. Убито 11 гитлеровцев.

Группа партизан отр[яда] им. Александра Невского между д. Сирицы и Славенями подорвала эшелон противника. Разбит паровоз, 3 платформы с танками, 2 вагона с живой силой и 15 вагонов с различным грузом. Убито и ранено до 80 гитлеровцев.

...17 марта [19]44 г. Группа партизан отряда «Победа» на ж[елезной] д[ороге] Минск — Москва на участке между деревнями Мартюхово и Переволочная сбросила эшелон противника. Разбит паровоз, 6 вагонов с неизвестным грузом и 2 вагона с живой силой. Убито и ранено до 75 гитлеровцев.

Группа партизан отряда им. Н. Ф. Гастелло на железной дороге Минск — Москва между ст. Славное и Малые Славени подорвала эшелон на 571-м километре. Разбит паровоз, 7 вагонов с ранеными. Убито до 150 гитлеровцев.

Группа партизан отряда «За Советскую Белоруссию» во главе с комиссаром Авчинниковым и начальником штаба Сиваком подожгли дом воинской части 32752 в гарнизоне Мотиево, где сгорели: электроагрегат, большое количество запасных частей, 16 электродинам, 3 автомашины, 4 винтовки, 12 гранат, 2 ящика патронов, 18 бочек бензина, 12 бидонов оружейного масла, 15 бидонов спирта.

...28 марта [19]44 г. Немцы (200 человек) при поддержке четырех танков наступали на наши отряды. Убито 4 и ранено 6 немцев. Один партизан убит, 2 ранено.

Подрывная группа отряда им. Александра Невского на ж[елезной] д[ороге] Минск — Москва взорвала эшелон. Разбит паровоз, 3 вагона с живой силой, 7 вагонов с боеприпасами и 4 с вооружением. Убито и ранено до 70 гитлеровцев.

...18 апреля [19]44 г. ...Противник ремонтирует большак Чашники — Бешенковичи. В целях помощи партизанам Ушацкой зоны 2 наших отряда занимают д. Дубровицу, чтобы отвлечь силы противника из Чашник, другие в это время совершают нападения на [нем]ецкие гарнизоны.

Группа партизан отр[яда] им. Александра Невского (старший Доронин) подорвали эшелон между ст. Трацилово и Сырицы. Разбит паровоз, 8 платформ с автомашинами, 15 вагонов с различным грузом. Убито и ранено до 15 гитлеровцев.

Партизан отр[яда] «За Родину» на дороге Кохановo — Обольцы подорвал легковую машину. Убиты офицер и солдат.

Банда... немцев из гарнизона Абчуга выехала грабить и угонять мирное население. Отряд им. Н. Ф. Гастелло (ком[андир] Бродский, комиссар Тарариков) организовал засаду возле д. Хватынка. Убито 12 и ранено 8 гитлеровцев. Остальные, до 100 человек, разогнаны. Освобождено 19 граждан, которых взяли для отправки в Германию.

...24 апреля [19]44 г. Подрывники отр[яда] им. А. В. Суворова (старший Данилов) подорвали эшелон между Кохановo и Мартюхово. Разбит паровоз и 8 вагонов с машинами и техн[икой]. Убито и ранено до 20 гитлеровцев. Нем[ецкие] самолеты бомбили деревни.

Подрывники отр[яда] «За Сов[етскую] Бел[оруссию]» подорвали 2 повозки. Убито 3 и 4 ранено. Эта же группа подорвала легк[овую] машину. Убито 3 и ранено 2.

25 апреля [19]44 г. Отряд «Победа» из засады у д. Поповка убил 3 гитлеровцев и 7 ранил. Захвачено 6 винтовок. Подрывник отр[яда] им. Н. Ф. Гастелло Торганский взорвал эшелон у ст. Славное. Разбито 5 платформ с техникой и 3 вагона с боеприпасами. Убито и ранено до 60 гитлеровцев.

Подрывник Петрашкевич подорвал эшелон ... возле Кохановского переезда. Разбит паровоз, 2 вагона с живой силой, 8 платформ с грузом. Убито и ранено до 20 гитлеровцев.

...28 апреля [19]44 г. ... По всем данным противник готовит крупную экспедицию против партизан в количестве 64 тысяч. Формируется в Борисове, Стайках, Крупках, Орше, Сенно, Богушевске...

...1 мая [19]44 г. По данным разведки в р[айо]не Чашник и Лепеля гарнизоны располагаются на расстоянии от 1 километра до 6 километров, насчитывают от 60 до 250 человек каждый. Все тяжелое вооружение снято и брошено против партизан Ушацкой зоны. Группе отрядов необходимо произвести демонстратив-

ное наступление... с целью отвлечь противника, затем уйти другим маршрутом. ... Бомбардировка советскими самолетами г. Лепеля с целью помощи партизанам.

2 мая [19]44 г. С целью отвлечения противника пущен ложный слух, что движется несколько тысяч партизан для удара противника с тыла. Выход на операцию...

3 мая [19]44 г. Группа отрядов бригады «Гроза» и Гудкова общей численностью до 700 чел[овек] под командованием нач[альника] штаба Котлярчука в районе дер. Боровка Лепельского района обстреляла скопление войск пр[отивни]ка. Противник до 2000 в панике разбежался... Поставленная задача Рыжиковым была выполнена. Совершен марш в 208 километров в трудных условиях. ... Моральное состояние партизан отличное. Командующий зоной тов. Леонов в приказе объявил благодарность начальнику штаба Котлярчуку и всему личному составу партизан.

...10 мая [19]44 г. Высылка разведки на Толочин и Волосово. В Волосове 300 гитлеровцев, которые намереваются грабить население. Отряды вышли на засады. Продолжается сбор средств на оборону страны. Собрано 380 тысяч рублей.

11 мая 1944 г. ... В Толочин прибыло 2000 немцев для борьбы с партизанами. Немцы выбросили листовки, чтобы партизаны сдались до 15 мая.

Усиление разведки.

14 мая [19]44 г. Оказана помощь населению деревни Н[изкий] Городец, В[ысокий] Городец, Шашоловка, Обидовка, Рыдомль в проведении сева.

...18 мая [19]44 г. Противник до 1000 чел[овек] занял деревни Ревятичи, Усвейка Красинская, Зеленовка, Михиничи, Козигорка с целью борьбы с партизанами. Высылка двух отрядов на засаду...

...20 мая [19]44 г. ... Начало пем[ецкой] экспедиции. Бомбардировка самолетами леса. В Прусиничи и Неклюдово приехали немцы. Обстреливали лес. Вторичная бомбардировка леса. Выход бригады в деревню Лозы.

21 мая [19]44 г. 12 самолетов противника бомбили Подмошский лес. 13 партизан убито, 25 ранено.

22 мая [19]44 г. Движение к переправе на оз. Селява Холопеничского района. Бой длился целую ночь. Немцы потеряли до 15 человек. Наши потери — 6 убитых, 5 ранено. Отряды отошли. Заняли оборону около деревни Колодница. Бросили обоз.

23 мая [19]44 г. Выход в подмошское болото. Немцы окружили его. Пытались пройти в пасмурский лес. Не удалось. Ночевка в болоте. Бомбардировка подмошского леса, артиллерийско-минометная подготовка.

24 мая [19]44 г. 12 нем[ецких] самолетов бомбили болото. Немцы пошли цепью по болоту. Мы сманеврировали. Всю ночь лес обстреливался с минометов и артиллерии. Выход с боем на деревню Заборье.

25 мая [19]44 г. Бомбардировка леса с воздуха, немцы пошли в лес. Находимся в болоте голодные. ... Немцы подожгли болото. Облава продолжается.

...27 мая [19]44 г. Выход на деревню Хоританцы. Экспедиция продолжается. Много партизан убито ... Нарчук отдал команду выходить мелкими группами. Силы противника до 75000, поддержанные новейшей военной техникой.

28 мая [19]44 г. Немцы большими силами пошли на столбцовский лес. Построили мост через болото. Грабят людей. Обстрел и бомбардировка столбцовского леса. Умер, находясь в окружении, командир бригады Нарчук, похоронен возле деревни Высокое Холопеничского района.

...30 мая [19]44 г. За период экспедиции немцы потеряли убитыми и ранеными до 90 солдат и офицеров. Наши потери — до 100 человек убитые, 70 человек ранено, 200 попали в плен, 150 пропали без вести. Бригада сохранила свою боеспособность и начала собираться в лесу Бук.

31 мая [19]44 г. Сбор бригады в лесу Бук возле деревни Дубовое. возобновление связи с Большой Землей...

ЦАГД при ЦК КПБ, ф. 3500, воп. 4, с. 37, лл. 379—414.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЧЭКІСТ» МАГІЛЕЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ БШПР АБ РАЗБУРЭННІ ЧЫГУНАЧНАЙ ГАСПАДАРКІ НА ЧЫГУНЦЫ МАСКВА — МІНСК У НОЧ З 19 НА 20 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

28 ліпеня 1944 г.[1]

По получении приказа генерал-лейтенанта Пономаренко о проведении одновременного налета на ж[елезную] д[орогу] с задачей разрушения всего ж.-д. хозяйства — рельсов, водокачек, будок — все отряды приступили к подготовке операции. Отряды были отозваны из Шкловского, Толочинского, Круглянского районов действий. Участок для проведения операции был отведен для бригады на ж. д. Москва — Минск, перегон Славное — Троцилово. Отряды приступили к подготовке всего личного состава по подрывному делу — [обучению] правильному обращению с толом, капсюлями, бикфордовым шнуром и методам взрыва рельсов; каждый отряд получил участок ж[елезной] д[ороги] для проведения операции.

Отряды после этого выслали по отделению для разведки отведенных участков, которым была поставлена задача: разведать систему охраны ж[елезной] д[ороги], расположение бункеров, гарнизонов и их численный состав, тщательно изучить местность и наиболее удобные подходы к ж[елезной] д[ороге]. Для ведения разведки и получения более точных данных были привлечены диверсионные группы, работающие на этом участке...

Ход операции. К 24.00 все подразделения заняли свои исходные положения, не обнаруженные противником. По общему сигналу — 2 красные ракеты — взводы, прикрывавшие фланги, открыли массированный огонь по дзотам про[тивни]ка. Подразделения, имевшие задачу атаковать ж.-д. полотно, начали ползти к ж[елезной] д[ороге], не обращая внимания на огонь про[тивни]ка. Овладев ж.-д. полотном, начали организованно производить взрыв рельсов под руководством ком[андиров] подразделений. Противник вел все время огонь...

В 21.45, перед началом операции, на ст. Троцилово остановился эшелон с живой силой, продвигавшийся от фронта... Эшелон выгрузился, принял боевой порядок и вступил в бой с ротой, прикрывавшей правый фланг 31-го отр[яда]. Рота 31-го отр[яда] вела бой на всем протяжении операции и не дала возможности про[тивни]ку сорвать операцию. С 24.00 до 2.00 продолжалась операция. Отход был организован по сигналу 3-х белых ракет. Несмотря на отчаянное сопротивление пр[отивни]ка, находящегося в дзотах и на ст. Троцилово, Славное, поставленная правительством задача была выполнена.

Взорвано 1520 рельсов, повреждено 2300 м связи, убито более 20 немцев и 1 австриец взят в плен.

Свои потери: убито 8 партизан, ранено 26 партизан.

Операцией руководил командир бригады полковник Кирпич.

Командир п[артизанской] бригады «Чекист» полковник *Кирпич*
Нач. штаба бригады *Севостьянов*

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Т. 3. Мн., 1982. С. 577—579.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ М. П. ГУДКОВА АБ БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАН 24—26 ВЕРАСНЯ 1943 г.

27 жніўня 1944 г.[2]

Обстановка ко дню операции в р[айо]не дислокации бригады была благополучной. В р[айо]не действий нашей группы [обстановка] была напряженной, так как в прилегающих населенных пунктах и в лесу к северо-вост. части Толочино... (дер[евни] Конопельчицы, Лисовщина, Каспарово, ... Узгои, Рыжичи, Уголовщина, Озерды) были заняты тыловыми частями немцев и они свободно разъезжали в зоне своего расположения.

---

[1] Датуецца па часе складання справаздачы.
[2] Датуецца па часе напісання гісторыі брыгады.

24 сент[ября] 1943 г. Игнатович, комиссар бригады, зам. ком[анди]ра по разведке Захаревич, ординарец комиссара бригады Зелютков и разведчик прибыли в зону Толочинского района... Мы имели два автомата, один пулемет и карабин. Вопрос боевой операции в нашу задачу не входил, и к этому мы не готовились... В нашу задачу входил вопрос переговоров (о переходе в партизаны) с полицией Соколинского гарнизона в д. Анелино, с Толочинским и Озерецким гарнизонами в д. Поречье, а также проведение митингов в данных деревнях и на пути нашего следования по материалам новостей с Большой земли и успехах Кр[асной] Армии на фронтах Отечеств[енной] войны; как убрать и сохранить урожай от немцев.

На 26 сентября была намечена д. Поречье, которая находилась на расстоянии двух километров от крупного немецкого гарнизона запасного авиаполка, расположенного в д. Лисовщина и Конопельчицы. ... Прибыли в д. Поречье 26 сент[ября] в двенадцать часов дня. А в 11.45 из Поречья выехал комендант гарнизона Лисовщина и нач[альник] штаба части на двух легковых автомашинах, которые произвели опись домов для расположения вновь прибывших частей. Выбрав помещение для штаба, предупредив население, что через два часа, т. е. в 13.00, в деревню прибывают воинские части. Наш [приезд] в деревню взволновал население деревни, которое, желая сохранить нам жизнь, уговаривало покинуть деревню и выйти в лес. Разговор продолжался несколько минут в юго-западной части деревни. Не успели закончить разговора, как на горизонте по дороге из гарнизона Лисовщина, на расстоянии 600 м показалась первая машина врага. Машина подошла на расстояние 200 м. Игнатович заметил сверху машины радиомачту. [Предположили], что машина штабная, и первых «гостей» решили встретить с боем.

Не теряя времени, мгновенно был занят боевой рубеж в юго-восточ. части д. Поречье на перекрестке дорог. Один-единственный пулемет было решено поставить вдоль дороги, навстречу идущей машине. Игнатович, Захаревич и Зелютков встали за угол дома. ... Машина врага подошла к угловому дому, переключая скорость на развороте, на расстоянии 5 м от Игнатовича и 15 от пулемета остановилась. В это время был открыт огонь по машине. ... В своих предположениях мы не ошиблись. Машина оказалась штабной вместе с восьмью сотрудниками штаба — двумя офицерами и шестью ефрейторами и оберефрейторами. ... Машина, хотя и подбитая, но была на ходу, и для того, чтобы снять ответственность за гибель немцев с населения, было решено машину немедленно выгнать за пределы деревни до выяснения обстановки, что и было сделано.

В 14.30 машина находилась в четырехстах метрах от деревни Поречье и по случаю порчи мотора остановилась. В это время конный разведчик-наблюдатель доложил Игнатовичу, что немцы движутся по дороге с Лисовщины на Поречье.

Было решено ... забрать трофеи: ценные документы штаба, восемь карабинов, один пулемет, ... радиоприемник, санитарную и полевую сумки и много другого обмундирования и вещей, после чего зажгли машину и отошли в лес... В связи с чистотой работы нами и населением был пущен слух, что немцы сами сожгли машину и ушли в партизаны.

Всякие меры немцев и полиции найти виновников гибели штабной машины не увенчались успехом.

ПАГП пры ЦК КПБ, ф. 3500, воп. 4, с. 38, лл. 128—132. Арыгінал.

СА СПРАВАЗДАЧЫ НАЧАЛЬНІКА АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ БШПР НА 3-м БЕЛАРУСКІМ ФРОНЦЕ А. А. АРХАНГЕЛЬСКАГА АБ БАЯВОЙ І ДЫВЕРСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАНСКІХ БРЫГАД, ПАДПАРАДКАВАНЫХ АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЕ, ЗА ПЕРЫЯД З 1 СТУДЗЕНЯ 1944 г. ДА 2 ЛІПЕНЯ 1944 г.

21 верасня 1944 г.

...Крупная операция по разгрому сильно укрепленного гарнизона противника в дер. Подберезье (8 км ю[го]-з[ападнее] Коханово), сковавшего действия диверсионных групп партизан, была проведена 17 марта 1944 г. 5-м батальоном полка «Тринадцать». В результате внезапного и стремительного налета и последующего 3-часового уличного боя батальон полностью разгромил немецкий гарнизон...

Было сожжено 20 мотоциклов, 2 автомастерские, склады с запасными частями, 26 т горючего, склады с боеприпасами, продовольствием и другим воинским имуществом, которые горели в течение 2 суток, сопровождаясь сильными взрывами.

Благодаря хорошей подготовке [к] операции и достигнутой внезапности, батальон партизан в бою с гарнизоном противника имел весьма незначительные потери и только уже к концу ее, в бою с подошедшими на помощь гарнизону бронетанковыми подразделениями противника, понес потери. Всего партизаны потеряли убитыми 18 и ранеными 13 чел...

Нач. оперативной группы БШПД на 3-м Белорусском фронте
подполковник *А. Архангельский*

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Т. 3. Мн., 1982. С. 681—683.

Гарэлі ў агні вёскі...

Колькі іх на нашай роднай Беларусі! Маленькіх і вялікіх, пры дарогах і ў лясных гушчарах, чый лес у ваенную часіну стаў аднолькава трагічны. Усе яны сталі сёстрамі, усіх іх з'яднала адно гора, адна гісторыя.

Вёскі Рыдамля, Сіманава, Замошша, Слабада, Серкавіцы, Бызава, Сухачэва, Высокі Гарадзец, Літвякі, Сельцы, Жураўлі, Лешава, Лаўрэнаўка, Папоўка, Клёнкі, Загацце, Каменка, Галынка, Гута... Усе і не пералічыць. У раёне няма ніводнага сельсавета, населены пункт якога б упалелі ад агню карнікаў. Гарэлі, падпаленыя з самалётаў — былі партызанскімі і акупанты не рызыкавалі заходзіць сюды, распраўляліся з паветра, на адлегласці. Палілі, знянацку падкраўшыся да іх. Палілі, па-здрадніцку ашукваючы жыхароў. На каго ўзнімалася злачынная рука акупантаў? На маленькіх, ні ў чым не вінаватых дзяцей, бездапаможных старых, міласэрных жанчын.

Гарэлі ў агні вёскі... Гарэлі, задыхаліся ў агні людзі... Такое забыць нельга!...

ВЕСКА РЫДАМЛЯ

12 верасня 1943 г. спалена вёска Рыдамля. У агні згарэла 136 двароў. 81 жыхар вёскі загінуў у той вераснёўскі дзень.

Мемарыяльная дошка на будынку школы ў в. Рыдамля.

Да вайны гэта была вёска з палымнеючымі фарбамі астраў і вяргінь. Але асаблівую прыгажосць надавалі ёй дзіўныя яркія кветкі, якія цвілі з вясны да позняй восені і па-мяцоваму называліся неўнікамі.

У вайну кветак не сеялі, яны раслі самі. Кветнікі не палолі. Так, бывала, вырве звычна жаночая рука адну-дзве сцябліны пустазелля і бяссільна апусціцца — вайна ж, кругом смерць... А малыя радаваліся: як добра, татачка вернецца дамоў з вайны, а кругом, як і раней,— кветкі!

Але не многія дзеці дачакаліся сваіх бацькоў. Варожыя кулі не шкадавалі ў той страшны дзень нікога. 81 чалавек быў забіты, 43 паранены...

Да вайны тут гаварылі так: сям'я Мартына Дубаўца, Антона Кацюшына. Калі мужы ваявалі, калі на фронт або ў партызаны праводзілі сыноў, на чале сям'і станавіліся жанчыны. Таму штогод у дзень памяці аб страшнай трагедыі, якая спасцігла жыхароў гэтай вёскі, гучаць словы: «Поўнасцю забіты сем'і Ганны Дубавец, Марфы Кацюшынай, Фядоры Зыдлевай...»

25 сакавіка 1945 г. газета «Чырвоны хлебароб» пісала: «...12 сентября банда карателей ворвалась в деревню. Старики, женщины, дети, не успевшие бежать в лес, попрятались в погребах, ямах, блиндажах, окопах. Началась ужасная расправа. Деревня была подожжена со всех сторон.

Пьяные головорезы отыскивали спрятавшихся и чинили над мирными людьми свою ужасную расправу. Ямы и погреба забрасывались гранатами, обстреливались из пулеметов и автоматов, четверых человек фашисты бросили в огонь живыми.

По-своему зверствовал подлый изменник Родины бургомистр Кувека. Он собственноручно застрелил учительницу Сулимову и бросил в огонь инвалида Гражданской войны Дубовца Мартына.

Дотла уничтожили фашисты красивое село. 136 жилых домов, школа, сельсовет, магазин и много колхозных построек погибли в огне. 81 убитый и 43 раненых жителя стали жертвой кровавого фашистского разгула. Семьи Дубовец Анны и Катюшиной Марфы были уничтожены полностью.

День 12 сентября 1943 останется в истории Рыдомли как самый ужасный за всю жизнь рыдомлян...»

З успамінаў Марыі Васілеўны Кацюшынай, 1920 года нараджэння, жыхаркі в. Рыдамля

...Маці праспла: бяжы, дачка. Я і паслухала матульку. Карнікі вёску не паспелі акружыць, падпалілі з усіх бакоў. Дым, кроў, стогны... На гары, у бліндажы, сабралася чалавек 20. Пацяснуліся, выслабанілі мне месца. Спадзяваліся, што схаваліся і ніхто не знойдзе. А яны як раз у бліндажы і склепы закідвалі гранаты. Памятаю, прыціснулася да людскіх цел, а краем вока бачу, як нялізны фашыст накіроўваецца прама на нас... Вось ужо кулямёт наводзіць... Заслаў мне той кулямёт усё неба. Адна толькі думка мільганула: людзі паспеюць уцячы, лес жа побач. Кінулася на тое чорнае страшыдла, збіла фашыста з ног, а болей і не ведаю, што было... Прыйшла ў прытомнасць, параненая, у лесе. Людзі дзякуюць: маўляў, выратавала. Цэлым ніхто не ўйшоў. І дзеці таксама. Вось Марыя Шыбека. Доўга лячылі яе ад ран у лесе. Або Пеця Рылько. Уся сям'я яго загінула — маці, сястра, нявестка з дзіцем, стрыечным братам. Толькі адзін Пятрок і дачакаўся дзядзьку Васіля Рыгоравіча з фронту...

З успамінаў Марфы Трафімаўны Кацюшынай, 1924 года нараджэння, жыхаркі в. Рыдамля

...Жыла ў нас бежанка з дваімі дзецьмі, з ёй разам і схаваліся ў бліндажы. Ды і суседская Зінка, Антона Іванюты дачка, за намі ўвязалася. Сябравала яна з маім Колем, сыночкам, яго я трымала на руках. Граната неяк бясшумна ўляцела ў бліндаж, пакацілася пад ногі... Выбухам забіла майго сыночка, сваім цельцам засланіў мяне... Як можна такое перажыць?! На маіх вачах загінулі дзеці, настаўніца Віселеўская. Круглымі сіротамі засталіся Дуня і Ларыса Зыдлевы...

ВЕСКА СІМАНАВА

28 мая 1943 г. згарэла ў полымі вёска Сімапава. Было спалена 24 двары. 14 жыхароў, сярод іх трое дзяцей, згарэла ў склепе.

З успамінаў Марыі Іванаўны Шэйка, 1926 года нараджэння, жыхаркі в. Сімапава

Май быў ужо на зыходзе. І так было прыгожа і хораша наўкол — усё зелянела, агароды нашы акуратныя, толькі паспелі адсеяцца.

Спачатку праехалі два верхавыя, партызаны. Потым прайшло многа-многа партызан. Спыніліся, напрасілі вадзіцы. Партызаны папярэдзілі, каб уцякалі. За вёскай пачаўся бой. Частка жанчын і дзяцей пайшлі ў Башароўскі лес, за Любатынь. Засталося ў вёсцы 14 чалавек: сям'я Францзаў была вялікая — Мар'я, дзве дарослыя дачкі, Каця і Пёкла, з дзецьмі, два сыны і сям'я бежанцаў у іх была. Старыя ў дварах пааставаліся.

Прыйшлі карнікі ўжо надвячоркам. Мая маці, 55 гадоў ёй тады было, залезла ў акоп з чатырохгадовым хлапчуком Міцем, там і захлынулася ад дыму.

Вёска факелам успыхнула, гарэла ўсё. Дзе каго бачылі — тых забілі, астатнія ад агню і дыму на той свет пайшлі: сядзелі ж амаль усе ў адным месцы.

Свайго брата Ягорку (13 гадоў) з торбачкай за бульбай паслалі, каб разведаў, хто ў вёсцы ёсць. А так — нікога і нічога. Ляжаў толькі цяжка паранены Міша, брацік Пёклы і Каці Францзаў, і вельмі плакаў.

Засталіся сярод вёскі дзве старыя халупы. Вярнуліся — пахавалі ўсіх. Думалі і будавацца больш тут не будзем. Жылі па пяць сем'яў у тых халупах.

З успамінаў Яўгеніі Рыгораўны Шэйка, 1916 года нараджэння, жыхаркі в. Сімапава

Адны раней з вёскі пайшлі, адразу ж, як пазналі, што паліць будуць. Я — пазней пабегла. Матулечка кажа: «Ты бяжы з дзецьмі, а я тут перабуду». Я падхапіла на рукі дзяўчынку сваю (3 гады), сынка (9 гадоў) за руку і за вёску ў лес. А кулі ўжо па-над намі. Я прысяду, дзяцей да зямлі прыціснў, потым ізпоў бягу. Наста Дранеўская і Васіль Шэйка таксама беглі, дык іх кулі пакасілі. А я бягу і ўсё думаю: ну, вось зараз дагоне, так ужо шмат куль ляцела наўздагон. Хочацца глянуць, ці далёка немцы, а азірнуцца не магу — баюся час патраціць.

Ад куль уратаваліся. Ну, думаю, цяпер і веку нам не будзе — так доўга заживём. Прыйшлі ў вёску — анікога. Матулька Феадосія Сяргееўпа Ярома ў агні задыхнулася.

А сынок пазней памёр. Ад запалення лёгкіх.

ВЁСКА ЗАМОШША СЕРКАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

14 кастрычніка 1943 г. з самалётаў была спалена вёска Замошша Серкавіцкага сельсавета. Згарэла 80 двароў, загінулі два жыхары.

З успамінаў Вольгі Іванаўны Дубавец, 1930 года нараджэння, жыхаркі в. Замошша

Што вёску будуць паліць — мы ведалі. Партызаны папярэдзілі. Да гэтага ўжо Сялец, Лаўрэпаўку палілі з самалётаў. І мы ўвесь час чакалі. Камсамольцы вёскі, чалавек трыццаць, арганізавалі дзяжурствы на гарышчы адной хаты, адкуль былі бачны дарогі на Заполле, Рыдамль, Гай. На балоце былі пабудаваны будкі, каб было дзе схавацца. Некаторыя нават печы парабілі і ямачкі для вады выкапалі.

Было гэта як раз на пакроў. Мы абедалі, маці, брат Пеця (15 гадоў) і я. Бачым у акно — усе па вёсцы бягуць, у бок балота. Партызаны зайшлі ў хату, кажуць: «Што вы тут седзіцё, зараз немцы будуць!» Маці мне гаршкі з ежай у рукі і кажа: нясі на балота. А сама ў хаце засталася. Я з гаршкамі таксама намчала да нашай будкі. Там з самай раніцы сядзелі сястрычка Таня пяці гадоў, брацікі: сямігадовы Лёня і Ваня дзевяці гадоў. Старшы брат Міша быў у партызанах у брыгадзе Сяліцкага (1-я брыгада імя К. С. Заслонава). Толькі да будкі дабегла, як пачуўся гул самалётаў. Прыляцелі першы раз, скінулі бомбы, развярнуліся — і назад. Мы як заплачам — матулечку нашу недзе там забіла. Тут аднекуль брат Міша прыйшоў. Кажа, гараць 4 хаты ў вёсцы. Наша пакуль стаіць. У гэты час прыйшла і маці. Нам адразу ж весялей зрабілася. Тры разы яшчэ прыляталі. І кожны раз скінуць бомбы — і назад. Калі ўсё сціхла, вечарам пайшлі ў вёску. Ад яе засталіся толькі Фёдарава хата, калгасная хамутоўня, школа, Алёнчына хата, Дзядзюліна і Кандратава хаты. Не паспелі збегчы з вёскі двое — жанчына сляпая і яе сын, ужо пажылы чалавек. У самым пекле адзін наш жыхар Іван Антонавіч жаробку вёў у кажусе. Дык яму рукавы ў кажусе кулямі адсекла і вяроўку, за якую вёў жаробку.

Вечарам прыгналі кароў з поля, а вёскі — няма. Як яны пачалі раўці! Вы б толькі чулі! Жывёла і тая бяду адчула. Жанчыны загаласілі. Пайшлі ўсе назад у балота. А праз месяц зайшлі ў нашу будку партызаны. «Маці, вам пісьмо». А гэта ад старшай сястры Надзі, якая калгасных кароў пагнала ў Мардовію.

Так і пражылі ў будках усю зіму. Вясной жа зямлянку пабудавалі, а ў ёй увесь час вада. Вядома ж, балота.

ВЁСКА ЗАМОШША КОХАНАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

У пачатку лістапада 1943 г. карнікі двойчы палілі вёску Замошша Коханаўскага сельсавета. Было знішчана 59 двароў, забіта 19 мірных жыхароў.

Вёска знаходзілася ў двух кіламетрах ад гарнізона карнікаў, які быў размешчаны ў вёсцы Владыкі.

З лістапада трое партызан брыгады «Граза» прыбылі ў Замошша, каб папярэдзіць жыхароў пра аблаву для адпраўкі ў Германію і для работ у прыфрантавую паласу. Не паспелі партызаны выканаць заданне, як на вуліцы з'явілася нямецкая легкавая машына. Фашысты прыкмецілі партызан. Завязалася перастрэлка. Аўтаматнай чаргой партызан Пётр Падаліцкі забіў нямецкага падпалкоўніка і параніў шафёра. Перастрэлку пачулі ў гарнізоне, і карнікі вось-вось павінны былі з'явіцца ў вёсцы. Сілы былі няроўныя, і партызаны адышлі ў лес. З вёскі сталі бегчы і мірныя жыхары.

Праз некалькі хвілін у Замошшы з'явіліся карнікі. Яны заходзілі ў дамы і расстрэльвалі ўсіх, хто не паспеў уцячы. Адначасова палілі хаты. Першай ахвярай стаў дванаццацігадовы Валодзя Плаксіцкі. Калі карнікі ўварваліся ў хату, хлапчук паспрабаваў уцячы. Фашыст застрэліў яго, труп кінуў у падпаленую хату.

Да самага вечара цягнулася расправа. Нагрузіўшы дабро, карнікі пакінулі вёску. Насустрач ім ішоў Вася Альхіменка, які яшчэ не ведаў аб жорсткай расправе ў яго вёсцы. Карнікі запраглі хлопчыка ў драбіны і прымусілі яго разам са сваяком іх пягнуць. У камендатуры хлапчукі прастаялі ўсю ноч ля сцяны з узнятымі рукамі. Раніцай Васю прывялі да месца, дзе быў забіты нямецкі падпалкоўнік і прымусілі збіраць кроў і мазгі забітага. Цудам удалося падлетку пазбегнуць смерці.

На наступны дзень карнікі зноў прыйшлі ў Замошша. Жывых у вёсцы ўжо не было. На вуліцы ляжалі трупы забітых. Уцалела толькі 14 двароў. Карнікі спалілі і апошнія.

З успамінаў Галіны Герасімаўны Казловай, 1938 года нараджэння, ураджэнкі в. Замошша

Вайну помню з таго моманту, калі ў канцы 1941 г. на парозе нашай хаты ўбачыла незнаёмага, страшнага з выгляду чалавека. «Падыдзі, гэта ж твой татачка вярнуўся!» — плакала маці. А я не знаходзіла ў ім ні адной знаёмай рысачкі. «Шкілет гэта, а не тата!» — хацелася мне крыкнуць (мы жылі побач са школай, і шкілет я там бачыла). Я горка заплакала і кінулася наўцёкі. Тады я яшчэ не

Г. Г. Казлова.

ведала, што дзякуючы аршанскім падпольшчыкам бацька быў вызвалены з лагера ваеннапалонных. Потым ён доўга хварэў тыфам, і, калі паправіўся, маці вучыла яго хадзіць. Пазней пайшоў у партызаны.

Помню, што ў нашай вёсцы жылі фашысты. Нам, дзецям, яны здаваліся нават вясёлымі і смешнымі — жартавалі, іншы раз частавалі нас цукеркамі. Потым раптам сабраліся і паехалі ў вёску Рамашкава, дзе стаяў гарнізон эсэсаўцаў. Калі стала дарослай, даведалася, што незадоўга да іх ад'езду жыхары перадалі партызанам 30 кароў. Акупантаў, відаць, гэта занепакоіла.

У вёску сталі часта наведвацца партызаны. Іх кармілі, пяклі хлеб і перапраўлялі ў лес. Колькі гэта працягвалася — не ведаю.

Самае страшнае здарылася ў пачатку лістапада 1943 г., калі гарэла вёска, расстрэльвалі нашых родных і знаёмых.

...Спачатку былі стрэлы, якія хутка заціхлі. Дарослыя і дзеці беглі за вёску, дзе стаяла падбітая легкавая аўтамашына (тады я ўпершыню ў жыцці ўбачыла легкавую машыну). У машыне ляжаў забіты афіцэр, «высокі чын», як потым казалі жыхары. У вёску на танках з аўтаматамі ўехалі карнікі. Замест цукерак частавалі кулямі і агнём. Жыхароў сагналі да сарая. Мы з двухгадовай сястрычкай Валяй былі адны дома (маці пайшла на млын у Галошаўку на сувязь з партызанамі). Усё кругом гарэла — драўляныя дамы, хлявы, скляпы. Мы з сястрычкай кідаліся, крычалі, клікалі на дапамогу. Не ведалі, што рабіць, куды бегчы, дзе схавацца. Было вельмі горача, усё здавалася крывава-чырвоным (доўгі час потым здавалася, што ўсё гэта адбывалася гарачым летам). Не ведаю, як апынуліся ў дзядулевай хаце. Ён ляжаў у лужыне крыві, паранены ў жывот. «Бяжыце, бяжыце ў лес, хавайцеся, а то ўсіх пастраляюць!» — ледзьве прамовіў ён. 15-гадовая цёця Валя, дзядулева дачка, пабегла з намі ў лес. Ногі ад страху не слухаліся, здавалася, мы ледзьве рухаемся. Кулі свісталі над галавой, сястра плакала і ўвесь час прасілася на рукі. Цёця Валя яе несла, але хутка марылася, апускала сястрычку на зямлю, і мы зноў беглі. Некалькі разоў азіраліся на вёску — там усё было ў полымі (пасля вайны мне часта сніўся гэты жудасны сон: мы гарым і зноў кудысьці бяжым). Калі не стала болей сіл ні бегчы, ні нават рухацца, упалі ў нейкую яму і сядзелі там да вечара. Доўга да нас даносіўся брэх сабак, крыкі, плач. Потым, страшэнна змучаныя, заснулі. Разбудзіў нас дваюрадны дзед Тарас, які выпадкова ўбачыў нас у яме. Ён узяў на рукі спячую сястрычку і мы пайшлі ў вёску Шапкава. Там нас прытулілі добрыя людзі.

Маці знайшла нас толькі праз некалькі дзён. Калі яна вярталася з Галошаўкі, нічога не ведаючы, карнікі схапілі яе і прывялі да сарая, куды сагналі жыхароў вёскі. Якім цудам людзі засталіся жывымі — цяжка зразумець. Магчыма, немцаў напалохала тое, што дзень быў на зыходзе, і яны ўсе спешна з'ехалі з вёскі, а людзі разбегліся, хто куды.

...Нашага дзядулю, Мікалая Васілевіча Агеенку, знайшлі мёртвым. Фашысты здзекаваліся над ім, параненым. Потым кінулі замучанага на вуліцы. Тады мне стала зразумела, што такое фашызм. Тады я стала дарослай...

ВЁСКА РАЦАВА

У чэрвені 1944 г., перад самым вызваленнем, з самалётаў спалілі вёску Рацава. Згарэла 38 дамоў.

З успамінаў Браніславы Міхайлаўны Шчэрба. 1902 года нараджэння. жыхаркі в. Рацава

Муж мой памёр у 1933 г., а я засталася з трохгадовым сынком і дачкой, каля годзіка ёй было. Партызанскай была наша вёска. Колькі прайшло партызан праз яе! І ўсе — у Рацаўскі лес. Хлеб пяклі, бялізну мылі партызанам. Жылі ўвесь час у страху. Бывала, гляну ў акенца,— наш партызан стаіць на пасту, значыць, усё ціха, пачынаю рабіць што-небудзь. А няма на пасту нікога — душа не на месцы, чакай ліха. Нас і з самалётаў бамбілі, і ў вёску прыходзілі. Як пачалі з самалётаў паліць летам 1944 г.— палезла з дзецьмі пад печ. А дзеткі з перапуду рвуць на сабе валосікі і так ужо крычаць, здавалася, і ім там чутна было. У Марылі Фікавай чацвёра дзетак ад двух да васьмі гадоў моцна ўсе спалі. Не стала іх трывожыць Марыля. Выйшла ў сенцы, каб паглядзець, што робіцца. А ёй праз сцяну нагу перабіла. Як

упала так і не ўстала — крывёй сышла. Дзеткі прачнуліся — а мамкі няма.

Потым з дамоў выганяць пачалі. Я прыхапіла вузельчык з хлебам, а немец вырваў яго і ў канаву. А кругом усё гарыць, і былыя панскія будынкі ў полымі. Усё згарэла. Пагналі нас да школы. «Не ганіце паліць,— просімся,— тут страляйце». Тады Новікава забілі. У сям'і Шаткавых двое забілі, у Зелянькевічаў аднаго. У Красоўскай Марылі бацьку і маці з-за сына забілі. Майго брата Івана Бабровіча, партызана, забілі, жонку брата Барыса, на фронце ён быў.

Пазней яшчэ прыязджалі. Забілі Любу Кудзеч і Галю Аўдзееву, якая перад вайной на настаўніцу вучылася, усё за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА СЛАБАДА

У чэрвені 1944 г. карнікі спалілі 38 дамоў у вёсцы Слабадзе.

З успамінаў Зінаіды Раманаўны Шэндрыкавай, 1928 года нараджэння, жыхаркі в. Слабада

Спалілі ўжо Хацькова, папярэдні палілі Рацава. Ну, думаем, сёння нас будуць паліць.

І праўда. Было гэта ў самы абед. Ішлі на вёску з двух бакоў. Чалавек з дзесяць паспела збегчы. А фашысты як убачылі, што людзі ў балота бягуць — і давай з двух бакоў па іх з кулямётаў біць. Я таксама бегла. Потым вярнулася, бачу, што заб'юць. А ў хаце маці і дванаццацігадовая сястра Таня. «Немцы, мама, куды дзявацца?» — плачу. «Бяжы ў кусты». Там каля хаты яма была выкапана. А ў яме сядзела ўжо ўся сям'я Верцяхоўскіх. Галаву падніму, бачу ў вёсцы дым. Прыбегла маці з сястрой. «Можа яшчэ хлеба вазьму»,— кажа. І зноў пабегла да хаты. А там ужо немцы. У хату не пусцілі. Вярнулася маці, сядзім. Зусім побач запахла дымам, нават горача стала. Паглядзела — наша хата гарыць, зусім новая, з аднаго сасняку збудаваная. Толькі трэск ідзе. Пагарэлі ўсе хаты. У нас засталося толькі тое, што было надзета. Куды ісці? Пахадзілі-пахадзілі, ды і падаліся ў Свіраны, да бацькавага брата. Хацелі зямлянку пабудаваць і лесу ўжо з мамай нарэзалі — ды дзе ж ты ўдвух збудуеш. Так і застаўся лес ляжаць. Перазімавалі ў чужых. А вясной будку з саломы зрабілі. Да халадоў жылі ў ёй. Потым перавезлі з суседняй вёскі еўню, без падлогі, з адным акенцам. З яе і замуж пайшла ў 1949...

Запісала *Ф. І. Кітаева.*

Тыдзень у «Пушніне»

З успамінаў Уладзіміра Барысавіча Захарэвіча, былога партызана атрада імя М. А. Шчорса партызанскай брыгады М. П. Гудкова

На допыт прыводзілі ў драўляны будынак з высокім ганкам (да вайны і пасля вызвалення тут знаходзілася Талачынская сярэдняя школа № 2).

— Дзе твой вінтоўка,— на ломанай мове запытаў немец у цывільным.

— Ніякай вінтоўкі ў мяне няма... Мы малацілі ячмень на таку.

— А яны сказалі, што ў цябе вінтоўка... У іх вінтоўка і ў цябе...

Я стаяў на сваім: ніякіх вінтовак ні ў іх, ні ў мяне няма. Мы малацілі па таку... Немец зноў, як кажуць, браў пашармака:

— Яны сказалі, што ў партызанах быў...

Допыт цягнуўся мінут пятнаццаць. Я ўсё адмаўляў. Нарэшце, мяне адвялі ў «Пушніну» (будынак знаходзіўся ў самым цэнтры Талачына, на перакрыжаванні сучасных вуліц Энгельса і Леніна, да вайны тут прымалі аўчынкі, шкуркі пушных звяроў). У вайну абсталявалі «Пушніну» пад турму, куды садзілі ўсіх, хто выступаў супраць іхняга «новага парадку».

...У лесе каля нашай вёскі Узноснае з вясны 1942 г. стаяў партызанскі атрад Гудкова. Мы, вясковая моладзь, неаднойчы былі там, перадавалі сабраныя вінтоўкі і патроны. Пасля няўдалай спробы перайсці за лінію фронту ў жніўні атрад, які вырас колькасна, вярнуўся назад. Размясціліся ў вёсцы. У нас жыло шэсць артылерыстаў, сярод іх былі рускія, узбекі, татары. Тут жа каля хаты стаяла гармата-саракапятка. Партызаны прывезлі з сабой газеты «Савецкая Беларусь», плакаты-лістоўкі «Раздавім фашысцкую гадзіну!». Мы літаральна накіпуліся на павіны.

Аднойчы ў вёсцы ўсчалася трывога. Партызаны хутка занялі абарону на ўскрайку лесу. Не засталіся ў вёсцы і жыхары. Ва Узноснае ўехала некалькі нямецкіх браневікоў. Адзін з іх вырваўся наперад і паімчаў да лесу. Але адтуль нечакана грымнулі адзін за адным гарматныя стрэлы. Спарады клаліся блізка ад браневіка. У артылерыстаў не было прыцэлу і яны білі па ворагу прамой наводкай. Браневікі павярнулі назад і пакінулі вёску

(у адной хаце фашысцкі афіцэр з перапуду кінуў нават свой бінокль). Партызаны аставаліся ў лесе.

У жніўні зноў паляцелі немцы. Спачатку пачулі страляніну, а потым убачылі, як па Дуброве (узгорак паміж Манастыром і вёскай Узноснае) ланцужок фашыстаў рухаецца да нашай вёскі. Рашылі, лепш будзе, калі пойдзем «працаваць» на ток. Сабралася нас чалавек восем, цапамі пачалі малаціць ячмень. У варотах тока з'явіліся французы ў фашысцкай форме. Яны крычалі, штыкамі падштурхоўвалі да выхаду. З васьмі чалавек адабралі чацвярых — Сцяпана Захарэвіча, Аркадзя Зелюткова, яго бацьку і мяне (усе мы былі ў гімнасцёрках). Непадалёку ад тока стаяла фурманка, пакінутая партызанамі. Французы, відаць, палічылі, што мы і ёсць якраз тыя, хто ехаў на фурманцы (гімнасцёркі, якія акружэнцы мянялі на наша вясковае адзенне, таксама сыгралі сваю ролю). Мяне пасадзілі на фурманку і загадалі ехаць да Падтраснічча. На фурманцы было мяса, якое не паспелі вывезці партызаны. Ззаду пылала зарыва — французы падпалілі ток. Калі мы перабраліся цераз канавы на балота, нас зноў абшукалі. Мы паказалі свае «аўсвайсы», якія заўсёды насілі з сабой. Аркадзь Зелюткоў быў у камандзірскай гімнасцёрцы з двума аддзяленнямі ў нагрудных кішэнях. Адно аддзяленне француз агледзеў, тым і задаволіўся. А ў другім аддзяленні была лістоўка «Раздавім фашысцкую гадзіну!». Не здабраваць бы нам, каб гэта лістоўка была знойдзена. У вёсцы Разапы, дзе батальён французаў спыніўся на начлег, Аркадзь схаваў лістоўку ў хляве. Ішлі з прывалам, не спяшаліся...

У «Пушніне» нас пасадзілі ў цесную камеру. Настрой быў невясёлы. Як-ніяк, адзін з нас — мой дваюрадны брат Сцяпан Захарэвіч — быў член партыі, да вайны працаваў раённым пракурорам на Смалевічыне. А я і другі мой дваюрадны брат Аркадзь Зелюткоў — камсамольцы. Бацька Аркадзя, дзядзька Карпа, перажываў таксама, але выгляду не падаваў. Вядомы на ўсю ваколіцу знаўца смешных гісторый, прытчаў, ён і тут спрабаваў развесяліць нас.

На другія суткі да нас перавялі бургамістра Азерацкай воласці Савіка (пасадзілі, відаць, за пейкую правіннасць).

— Ведаеце, куды мяне пасадзілі спачатку? — абураўся ён.— Мяне, бургамістра, трымалі ў адной камеры з партызанамі!.. Іх двое. Аднаго завуць Будны Мікола. Часта выклікаюць на допыт, але Будны таварыў: «Нічога я ім не сказаў» (праўда, замест слова «нічога» было больш моцнае рускае слова). Мы добра ведалі Міколу — перад вайной я з Аркадзем хадзіў у сёмы клас Няклюдаўскай школы, а Мікола — у шосты.

Са слоў Савіка мы даведаліся, што і другі партызан трымаў сябе мужна.

Праз некалькі дзён, неяк адвячоркам, да «Пушніны» падышла машына. Сэрца зайшлося ў трывозе — машынай звычайна вывозілі людзей на расстрэл.

— Нарчук Алена! Навіцкая Клаўдзія,— пачулі мы голас немца.

І яшчэ былі названы два прозвішчы. Стукнулі засовы, зарыпелі дзверы. Мы разумелі, куды вядуць гэтых людзей... Мы маўчалі. Магчыма, наступным рэйсам і нас павязуць у тое ж месца...

Праз паўгадзіны машына прыйшла зноў.

— Будны Мікалай.— пачулі той жа голас.

Потым выклікалі і яго таварыша. Шэсць чалавек расстралялі ў той дзень фашысты (на жаль, імёны трох з іх у памяці не захаваліся).

Праз некалькі дзён нас адпусцілі. Магчыма таму, што нічога кампраметуючага ў нас не знайшлі, і на допытах мы ў адзін голас сцвярджалі, што няма ў нас ніякіх вінтовак і дзе партызаны, мы таксама не ведаем. А можа дапамагла папера, якую падпісалі аднавяскоўцы, што мы не звязаны з партызанамі...

Што мы ім зрабілі?

З успамінаў Галіны Рыгораўны Рабцавай, жыхаркі г. Талачына

Да вайны мая сястра Ніна, па мужу Крушынская, жыла з сям'ёй у Заходняй Беларусі. Там іх застала вайна. На другі дзень вайны яны — Ніна, яе муж Аляксандр, дачка Валя і сястра наша Марыя — сабраліся і пайшлі пешшу ў Талачын, дамоў. У Стоўбцах немцы Крушынскага арыштавалі, але Ніна з дачкой і Марыя неяк усё ж дабраліся.

Крушынскі з-пад арышту ўцёк і падаўся ў Смаляны, дзе жыла яго матка. А тады пайшоў у партызаны. Ніна часта насіла яму ў лес ежу, адзенне, валёнкі. Сама не захацела ісці за мужам у лес, баялася, што расстраляюць усю сям'ю. А нас тады ў вайну было дзесяць чалавек. У адзін дзень да нас у хату прыйшлі немцы і некалькі паліцаяў. Абкружылі хату, зайшлі, паставілі нас да сценкі і пачалі вобыск. Адзін з паліцаяў шукаў, нібы

за дваіх, усё чыста ператрасаў. А Ніна ж яго добра ведала, бо ён да вайны рабіў у міліцыі (Мілько яго прозвішча), а яна — сакратаркай у пракуратуры. Дык Ніна і гаворыць да яго, скажы, чаго вы шукаеце? А ён ёй у адказ: «Не тваё дзела!»

Апісалі хату, як ім трэба было, а Ніну і бацьку павялі ў палявую камендатуру. Бацьку хутка адпусцілі, бо ён у нас быў трохі глухаваты. Калі ён адыходзіў, Ніна яму сказала: «Тата, пільнуйце маю Валю».

Яе пасадзілі ў турму. Звалася турма «Пушніна», бо да вайны там прымалі кожачкі. Было ў ёй адно маленькае акно за кратамі. Мама часта насіла Ніне перадачы, але ці пападалі яны ёй, ці не — не ведаю. Аднаго разу я пайшла з мамай. Ніна трымалася за краты і глядзела ў акно, а як нас пабачыла, дык і абарвалася. Мама наша ўвесь час плакала.

І вось аднойчы, памятаю, што было тады жніво, мама сабірала перадачу ў турму несці, а я на двары была і бачу, што едзе машына, у ёй людзей поўна, а з бакоў — немцы з сабакамі. І Ніну нашу вязуць. Яна мяне таксама пабачыла і крыкнула, што вязуць іх на работу, каб я маме пра гэта сказала. Я пабегла ў хату і кажу маме: «Не нясі Ніне есці, іх на работу павезлі». Але мама пра ўсё здагадалася. У слёзы. Гаворыць, што гэта іх страляць павезлі. Мама тады дужа перажывала, захварэла і злегла, не магла ані хадзіць, ані рабіць. Мы бегалі па доктара. Той доктар уначы цішком прыходзіў і лячыў маму.

А Ніну, і яшчэ там многа было людзей, павезлі ў Крупкі. Рабілі там паказацельны расстрэл, сабралі іх сто чалавек, як бы то партызанаў, якія спалілі станцыю Слаўнае. У той час у Крупках быў адзін наш талачынскі жыхар Шашалевіч. Ён бачыў той расстрэл і расказваў маме. Калі Ніну падвялі да ямы, на ёй была чырвоная сукенка ў белыя гарохі і такая самая хусцінка. Яна зняла хусцінку і завязала сабе вочы...

Наша знаёмая, яна таксама сядзела тады ў «Пушніне», гаварыла маме, што калі Ніна прыйшла з допыту ў камеру, дык сказала: «Што ім трэба ад мяне, што мы ім зрабілі?» І больш яна тады нічога не сказала.

Усім смярцям назло

Шмат іх было на нашай зямлі — простых працавітых людзей, адданых свайму дому. Радзіме, чыя душэўная шчодрасць з асаблівай сілай раскрылася ў ліхую гадзіну.

Да вайны ў вёсцы Дроздава жыла сям'я Маханькоў. Нікога не пашкадавала вайна ў гэтай сям'і — ні бацькоў, ні дзяцей. Самая старэйшая з дзяцей, Вера, напярэдадні вайны на выдатна скончыла Магілёўскае педвучылішча, працавала настаўніцай у вёсцы Сідоркава Круглянскага раёна. У жніўні 1942 г. разам са сваёй сяброўкай Аляксандрай Вахарок Вера стала байцом 2-й Беларускай партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Калі ў гэтым жа месяцы арганізаваўся Талачынскі падпольны райком камсамола, Веры даручылі ў ім работу. Да вызвалення Вера Маханёк не дажыла роўна чатыры месяцы — загінула 26 лютага 1944 г.

Веска Дроздава, акружаная з усіх бакоў лясамі, прытуліла многа жыхароў і бежанцаў з іншых раёнаў. Вольга Яфімаўна Маханёк прыняла сям'ю Жачкіных з Бягомля — Кацю і Сеню, іх матулю і бабулю. Жылі цяжка, але чужых не крыўдзілі — дзяліліся ўсім, што было на агародзе і ў доме. Дзеці гулялі разам, пасябравалі. Усё было разам — і гора, і невялікія радасці, на якія быў скупы ваенны час. Праўда, Вольга Яфімаўна спачатку хвалявалася — ці добра гэта, калі даведаюцца Жачкіны, што пасяліліся ў партызанскай сям'і (тады яна яшчэ не ведала, што муж Жачкінай — палітрук Чырвонай Арміі). Каб не здарылася бяды...

А лёс сапраўды аднолькава абышоўся і з бежанцамі, і з мясцовымі жыхарамі. У той страшны снежаньскі дзень 1943 г. хапалі ўсіх. У хату Маханькоў таксама прыйшлі карнікі. Забралі сям'ю Жачкіных (успаміны Каці Жачкінай «Нумар 79645» змешчаны ў кнізе «Ніколі не забудзем»). За падол спадніцы Вольгі Яфімаўны ўчапіліся пяцігадовая Таня, сямігадовая Ліза і самы меншанькі, Віця, якому нядаўна споўніўся год. Дзяўчынак карнікі адцягнулі адразу. Віцю ж адарваць не маглі — маленькія ручкі трымалі намертва. Крык стаяў страшэнны. Тады карнік пачаў біць хлопчыка прыкладам па галоўцы. Заліты крывёй, ён страціў прытомнасць.

Вольгу Яфімаўну Маханёк гналі па вуліцы да свірна. «Будуць паліць»,— рашыла яна. Так яно і было. Тры партызанскія сям'і (сярод іх і В. Я. Маханёк) загналі ў машыну, каб адправіць у талачынскую турму. Астатніх павінен быў знішчыць агонь. Дзякуючы партызанам жыхары Дроздава засталіся жывымі...

Нельга ніякімі словамі выказаць тое, што рабілася ў мацярынскім сэрцы. Зіма. Бацька на фронце, з блізкіх родных у вёсцы — нікога. У халоднай хаце засталося трое маленькіх дзяцей... Ні допыты ў турме, ні доўгія галодныя дні ў перапоўненым цягніку, які імчаў у Германію, не маглі заглушыць пяскерпны

боль маці, тое страшнае расставанне з дзецьмі. Віценька без памяці з прабітай галоўкай. Адзінае гэта заставалася рэальным. Астатняе — як у сне, як не з ёй...

Канцлагер у Равенсбруку. Потым Брандэнбург, праца на ваенным заводзе. Колькі гэта працягвалася — сказаць цяжка, тады здавалася, што бясконца. Толькі сустрэча з масквічкай Норай Аляксандраўнай Смірновай, моцнае сяброўства паміж імі нібыта вярнулі Вольгу Яфімаўну да жыцця. Нора вельмі напамінала ёй старэйшую дачку, Веру, з якой яны былі амаль аднагодкамі. Нора таксама прывязалася да жанчыны. Сэрца дзяўчыны да глыбіні душы кранула гісторыя беларускай сялянкі. Нора імкнулася ўсяляк падтрымаць Вольгу Яфімаўну ў яе горы. На рабоце таксама пры магчымасці дапамагала ёй, была заўсёды разам. «Калі б не Нора — не выжыла б я там»,— успамінае Вольга Яфімаўна.

...Не ведала тады маці, што яшчэ раз у той жахлівы дзень былі на валаску ад смерці яе дзеці. Пад вечар карнікі зноў сталі хадзіць па хатах. Цяпер яны нікога не шкадавалі. Ліза, Таня і Віця сядзелі на печы, якая ледзьве грэла ў выстуджанай хаце. Некалькі фашыстаў агледзелі хату, па цёмную печ, дзе чакалі свайго прысуду маленькія Маханькі, не звярнулі ўвагі.

Усю зіму да вясны дзеці жылі адны. За маці і бацьку была сямігадовая Ліза. Хадзілі па хатах, жылі тым, хто што дасць. І зноў вярталіся ў халодную хату. У Віці пачалі гнаіцца раны на галоўцы, ён перастаў гаварыць, а потым — і хадзіць.

Вясной, у сакавіку, са Скавышак прыехала цётка са сваімі дзецьмі, каб забраць малых да сябе. Калі ехалі назад, адно сваё застудзіла, памерла роднае дзіцятка. Але не разлютавалася сэрца жанчыны, прыняла дзяцей сястры як родных.

«Віцю напаілі казіным малаком і ён заснуў. Увесь час спаў, думалі, што не прачнецца, бо ні на што не рэагаваў, быў як мёртвы»,— успамінае Лізавета Іванаўна.

Пачалі спачатку па лыжачцы ўліваць малачко. На сем разоў па дзень даілі казу. Пачаў ажываць хлопчык, зноў стаў на свае ножкі. Але пядоўга саграваля дзяцей чулае сэрца жанчыны. Як часам бывае, менавіта ў добрых людзей век кароткі. Праз месяц цётка захварэла на тыф. Сталі жыць ва Узгоях, у цёткі па баньковай лініі. Жылі вельмі голадна. Зноў адкрыліся раны на галоўцы хлопчыка. «Бывала, паказвае на цыбулю, маўляў, дай хоць яе...»,— цяжка ўздыхае Лізавета Іванаўна.

У жніўні 1944 г. вярнуўся бацька з фронту пасля цяжкага ранення ў лёгкія. Сам хворы, ледзьве хадзіў. Вярнуліся жыць у родную хату. 1 верасня стала працаваць школа. А хадзіць не было ў чым. Чулая суседка звязала панчохі ледзьве за калені. Пастаўніца Надзея Рыгораўна Сініца вадзіла Лізу да сябе грэцца на печ. У снежні 1944 г. памёр бацька. Зноў засталіся адны.

В. Я. Маханёк (злева) і Н. А. Смірнова.

Невясёлым было ў дзяцей свята 9 Мая. Бацькі не было, старэйшай сястры таксама. Думалі, што і маці няма ў жывых. Усе, хто мог і чым мог, засеялі свае агароды. Ліза таксама б пасадзіла бульбу. Толькі дзе ж яе ўзяць? Не ў адной яе так было. Узпялося пчаўе па агародзе. Тым і жылі.

У канцы ліпеня 1945 г. (упершыню пасля вяртання бацькі!) небывалая радасць прыйшла ў дом разам з пісьмом незлаёмай цёткі Норы. Яна пісала, што маці іх жывая і здарован і хутка вернецца ў родную хату. Дзеці ад радасці крычалі і плакалі. Ліза галасіла, як дарослая. А вечарам села і напісала падзіцячаму горкае пісьмо ў адказ пра ўсё іх цяперашняе жыццё. Нора Аляксандраўна выслала дзецям 900 рублёў... А 22 жніўня вярнулася маці, вельмі пастарэлая (забіралі зусім маладой). Вестку пра смерць дачкі Веры і мужа Вольга Яфімаўна прыняла мужна. Трэба было ставіць на ногі меншых дзяцей. Перш-наперш купілі на прысланыя грошы ячменю, засеялі поле. К зіме атрымалі некалькі пасылак з Масквы. Дзеці радаваліся абноўкам. І ў вёсцы ўсе ведалі, што ў Тані, Лізы і Віці паліто, шапкі і бацінкі маскоўскія.

...З тых ваенных гадоў цягнецца шчырая, бескарыслівая дружба паміж сям'ёй Маханькоў і Норай Аляксандраўнай Смірновай, выкладчыцай Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Можна ўявіць, што азначала гэта знаёмства ў жыцці Маханькоў. Сяброўства, народжанае ў самы цяжкі момант жыцця, стала мацней за самыя блізкія сваяцкія адносіны, звязала гэтых людзей назаўсёды. Бяда ў сям'і Маханькоў заўсёды знаходзіла водгук у сэрцы гэтай незвычайнай жанчыны. Так было і ў 1957 г., калі ў Віці стаў рэзка пагаршацца зрок і пагражала поўная слепата. «Тэрмінова прыязджайце»,— тэлеграфавала Смірнова. Віцю ўладкавалі на кансультацыю да вядомага прафесара Філатава, была зроблена складаная аперацыя. Пагаршэнне зроку было прыпынена. Але як жыць далей? Вайна, той незабыўны снежаньскі дзень 1943 г. паламаў лёс хлапчука. Віця стаў глуханямы. Аднак жыццё не страціла для яго сэнсу. Віця скончыў сем класаў. Мог працаваць, толькі, зразумела, на пэўнай рабоце. І тут, нібы добрая фея з казкі, зноў прыйшла на дапамогу Нора Аляксандраўна. Віцю ўладкавалі на працу ў таварыства сляпых у Віцебску. Прайшоў час і Віця знайшоў тут самае галоўнае для сябе — сям'ю. Дачушка працуе ўжо. Расце сын. Род Маханькоў працягваецца. Насуперак вайне, насуперак усяму... *Ф. І. Кітаева.*

Гавораць вязні Асвенціма

Каля ста талачынцаў прайшлі праз усе жахі і выпрабаванні, якія выпалі на долю вязняў Асвенціма, іншых фашысцкіх канцлагераў. Былі сярод іх дзеці, моладзь і зусім пажылыя людзі. Нямногім суджана было перанесці вытанчаныя здзекі, голад, уратавацца ад вогненных печаў крэматорыяў. Жывымі засталіся цудам. Вярнуліся, адкуль не вяртаюцца.

З успамінаў Зоі Аляксандраўны Картавіцкай, 1926 года нараджэння, жыхаркі в. Сялец

17 студзеня 1944 г. ўсю нашу сям'ю арыштавалі за сувязь з партызанамі. Сядзелі ў талачынскай турме тыдзень сем. З нашай вёскі ў турме знаходзілася трынаццаць сем'яў (усяго 53 чалавекі), якіх забралі разам з намі. З Талачына павезлі ў барысаўскі канцлагер, адтуль праз два тыдні — у мінскі канцлагер. Тут нас трымалі два месяцы. Потым далі па буханцы хлеба, пагрузілі ў вагоны і павезлі на захад. Везлі больш тыдня. Людзі паміралі ад голаду, духаты. Трупы не прыбіралі. Калі поезд спыніўся і нас пачалі выганяць з вагонаў, мы адчулі моцны пах паленага. Адна жанчына заўважыла, што немцы, відаць, курэй смаляць.

Мы былі ў Асвенціме. Усіх, хто мог ісці, адразу пагналі на тэрыторыю лагера. Загадалі стаяць перад вялікай будынінай, у якую заганялі мужчын. Прайшло іх міма нас вельмі многа. Усе ўваходзілі ў дзверы і ніхто не вяртаўся. Мы яшчэ здзіўляліся, дзе яны там памяшчаюцца. Прыйшла і наша чарга. Спачатку загадалі ўсім раздзецца, у другім памяшканні стаяла ванна з нейкай вадкасцю. Нам загадалі мачыць у ёй ногі. Пасля гэтага стаяць на падлозе было нельга, людзі падалі. Падганяючы дубінкамі, пагналі ў наступнае памяшканне. Там нас умясцілася чалавек 700—800. Было тут вельмі горача і вельмі пахла гарам. Раптам падлога пачала падніматца, людзі не маглі ўстаяць і з жудасным крыкам ляцелі ўніз, адкуль шугала полымя. Гэтак жа нечакана падлога пачала выпрамляцца. У гэты момант зайшлі немцы і загадалі ўсім выйсці.

Толькі ў лагеры мы даведаліся, што былі ў крэматорыі. Потым нам стала вядома, што наш вагон трапіў паміж двума вагонамі з яўрэямі, якіх адразу ж адпраўлялі ў крэматорый. У лагеры нам далі паласатае адзенне з чырвоным трохвугольнікам, што азначала — палітычныя. Накалолі нумары. Мой нумар 76769. Усіх разлучылі з бацькамі. Я трапіла ў каранцінны блок са сваёй сястрой. Раніцай давалі адну ваду, вечарам — хлеб з мякінай ці апілкамі. Пасля бруднай вады (лагер стаяў на балоце) галодныя людзі сталі распухаць. Праз два тыдні пагналі працаваць на тэрыторыю лагера — чысцілі канавы, па якіх з крэматорыя цёк попел. Мы яго вычэрпвалі на бераг, а калі падсыхаў — вывозілі тачкамі на палі. Калі не было работы — да абеда прымушалі насіць камяні ў адно месца, а пасля абеда — назад. Праз месяц залічылі ў каманды, па 600—800 чалавек у кожнай. Пад'ём у пяць гадзін, у шэсць строілі на раніцнюю праверку. На работу вялі з аўчаркамі. Людзі галодныя, хто ішоў, а хто поўз, пры гэтым іграў духавы аркестр. Жудасна было бачыць усё гэта. Працавалі па 12—16 гадзін. На поле прывозілі суп з лубінам, хлеб з мякінай. І так кожны дзень. Калі на працягу тыдня хто-небудзь з блока правініўся, у нядзелю усіх жыхароў блока выганялі і прымушалі стаяць на каленях увесь дзень, іншы раз — узняўшы рукі. Стаялі і пад дажджом, і ў сцюжу.

На рабоце капалі канавы і ўкладвалі трубы. Раніцай кожнаму вызначалі норму. Хто быў хворы і не мог выканаць нормы, тут жа жорстка збівалі. Я заўсёды імкнулася быць побач з сястрой. Яна вельмі хварэла, і

я ўвесь час баялася, што яе забяруць ў крэматорый. Выконвала дзве нормы — за яе і за сябе. Як можна было такое вытрымаць — не ведаю.

Калі Чырвоная Армія стала вызваляць Польшчу, нас павезлі ў Германію. Працавала на фабрыцы. Калі нашы ўступілі на тэрыторыю Германіі, нас пагрузілі ў вагоны і цэлы месяц вазілі без ежы і вады. Аднойчы цягнік спыніўся і нас выпусцілі. Мы хадзіць ужо не маглі. Страшэнна галодныя, мы поўзалі каля вагонаў і елі траву. Потым зноў паехалі. Прывезлі ў нейкі кар'ер. Але расстраляць не паспелі — вызвалілі чэшскія партызаны. Нас уладкавалі ў арганізаваныя прытулкі. Там лячылі і кармілі. Праз месяц мы ўжо маглі хадзіць. Былі ў Чэхіі да прыходу Чырвонай Арміі...

З успамінаў Надзеі Фёдараўны Аўчынка, 1920 года нараджэння, жыхаркі в. Дроздава

Наша вёска была партызанскай — кармілі, давалі адзенне, ратавалі параненых. 1 студзеня 1944 г. мяне разам з іншай моладдзю вёскі схапілі і адправілі ў лагер Ісце Аршанскага раёна. Праз два тыдні мне памаглі збегчы аднавяскоўцы Станіслаў Рак і Аркадзь Дубавец, якія таксама былі ў гэтым лагеры. Праз два тыдні карнікі зноў напалі на вёску. Сагналі ўсіх жыхароў у хату, астатніх пагналі ў талачынскую турму. Праз тыдзень перавезлі ў Барысаў. 11 сакавіка прывезлі ў Трасцянец — для «селекцыйнага адбору». Слабейшых адразу знішчалі. Здаровых трымалі на карантыне тры месяцы. За гэты час многія памерлі ад голаду і тыфу. 18 мая — зноў адбор. «Прыгодных» адпраўлялі ў Асвенцім. Калі пад'язджалі да лагера, убачылі вялізную трубу, з якой на метры тры вырывалася полымя і чорны дым. Тады мы яшчэ не ведалі, што гэта за дым. Нас пастрыглі, загадалі зняць адзенне і адправілі ў «лазню», у якой вада не рэгулявалася — ішоў то кіпень, то халодная вада. Мыцца не прыйшлося — нечакана загадалі выйсці. Так мы выратаваліся. Нас загналі ў цэментнае памяшканне, двое сутак сядзелі там голыя. Потым выдалі не па размерах адзенне з крыжам на спіне, па руцэ выкалалі нумар. Мой нумар 79738. Змясцілі ў блокі. Спалі на трох ярусных нарах, мне дасталося месца ў самым нізе на цэментнай падлозе. Разам са мной былі маці Марыя Даянісаўна і малодшая сястрычка Граня. Хутка мама захварэла, яе забралі ў шпіталь, а адтуль у крэматорый. Два дні ўсюды яе шукала, усё не магла паверыць, што яе спасцігла такая жудасная смерць. А было ёй толькі 47 гадоў. Малодшую сястру захавала. Слабенькая, яна ўвесь час была пры мне. Думала, куды яе адправяць, туды і я кінуся, нават у крэматорый.

14 студзеня нас перавезлі ў Германію, дзе бачылі толькі неба і зямлю — лагер быў абнесены высокай цэментнай сцяной. Фронт набліжаўся, і нас перакінулі ў Лейпцыг, потым яшчэ ў нейкі горад. А з 12 па 24 красавіка знаходзіліся ўвесь час у дарозе. Кармілі тым, што дзе знойдзем у час невялікіх стаянак. Апоўдні 24 красавіка 1945 г. ў чарговым канцлагеры мы пачулі выбухі, стрэлы. Памятаю тую хвіліну, калі да агароджы падскочылі кавалерысты з зоркамі на шапках. Спачатку яны разгубіліся і некаторы час стаялі моўчкі па той бок агароджы. Па шчоках цяклі слёзы. Мы таксама плакалі. Ад радасці.

5 кастрычніка 1945 г. былі дома. У вёсцы нас не пазнавалі нават родныя дзеці. Я цягнула рукі да свайго сыночка Ванечкі, а ён плакаў і ўцякаў. Але хутка бегчы не мог, маленькі яшчэ. А я дагнаць не магла. Так і павалілася перад ім. Не хапіла сіл ад радасці.

З успамінаў Уладзіміра Захаравіча Яцкевіча, 1933 года нараджэння, ураджэнца в. Шмідзельшчына

У сям'і нас расло шасцёра дзяцей. Я — самы малодшы. Вёска невялікая, усяго 9 двароў, жылі мы ў сямі кіламетрах ад Талачына ў акружэнні варожых гарнізонаў. Па просьбе бацькі Захара Яфрамавіча, а часцей сястры Любы, якая была сувязной партызанскай брыгады «Граза», часта хадзіў у варожыя гарнізоны, каго́сьці вадзіў у Азярцы і ўладкоўваў у знаёмых, запамінаў размяшчэнне агнявых кропак. Мне падабалася, што дарослыя давяраюць і даюць розныя даручэнні. Для чаго ўсё гэта і якой рызыцы сябе падвяргаў, гэтага не ведаў.

У пачатку 1944 г. бацька сказаў, што хутка пакідаем вёску і ідзем у партызаны. Пачалі збіраць няхітрыя пажыткі. Адзін здраднік заўважыў нашу падрыхтоўку і данёс у воласць. 18 лютага нас схапілі — бацькоў, сястру Любу, 17-гадовага брата Леаніда (сястру Жэню арыштавалі яшчэ ў лістападзе 1943 г.). Нас пасадзілі ў талачынскую турму. Усіх вадзілі на допыт. Я нічога не сказаў, ды і ведаў нямнога. Праз два тыдні перавялі ў мінскі канцлагер. Бацьку і маці расстралялі, а нас траіх у красавіку 1944 г. разам з іншымі павезлі ў таварных вагонах на захад. Праз 6—7 дзён прывезлі ў Асвенцім. Спачатку мы думалі, што нас прывезлі ў раён фабрык і заводаў — вакол узвышаліся вялікія цагляныя будынкі з высокімі трубамі. Любу адправілі ў жаночы лагер (яе я не бачыў, пакуль

У. З. Яцкевіч.

не вярнуўся дамоў). Мне накалолі нумар 188189, брату — 188188. Што засталося ў памяці? Холад, голад, знясільваючая праца і барацьба за жыццё. Задача ва ўсіх была адна — не памерці з голаду і не трапіць у крэматорый. Часта раніцой паднімаюць, а побач — мёртвы чалавек. Кожны абавязаны быў выносіць мёртвага суседа і класці на ваганеткі, якія кожную раніцу падганялі да баракаў.

Месяцы праз два прайшла чутка, што ўсіх непрацаздольных дзяцей і інвалідаў будуць паліць у крэматорыі. Праз некаторы час вязняў дзіцячага блока № 31 пагналі на камісію. Вызначалі рост і стан здароўя. Я трапіў у кантынгэнт для знішчэння — ростам быў менш 140 сантыметраў, а гэтага было дастаткова, каб прызнаць непрыгодным. У той дзень, калі нашу групу, дзяцей 40—50, пастроілі, каб весці ў крэматорый, я ўбачыў свайго Лёню. Ён стаяў у сараі для адпраўкі ў іншы канцлагер. Убачыўшы мяне, брат адпрасіўся, каб развітацца. І ён і я ведалі, што мяне чакае, але пра гэта маўчалі. І толькі ў самым канцы размовы я не вытрымаў і сказаў: «Калі будзеш праязджаць міма лагера і ўбачыш у небе дым, ведай, гэта ўсё, што ад мяне засталося». Мы пачалі плакаць...

Нас падвялі да крэматорыя. Канваір пайшоў дакладваць аб нашым прыбыцці. Невядома чаму, але з прахадной выйшаў другі канваір і скамандаваў: «Усе назад!», і мы з крыкам «Ура!» кінуліся ў свой блок. Але радасць была нядоўгай. Апамятаўшыся, мы зразумелі: калі не спалілі сёння, значыцца — заўтра... Пачалі лічыць дні. Кожны вечар з палёгкай уздыхалі — яшчэ адзін дзень суджана было жыць. А што чакае заўтра? І так да лістапада 1944 г. Потым былі іншыя канцлагеры. І ўсюды — голад, есці хацелася і днём і ноччу. На працягу паўтара года мы не снедалі — у абед 0.7 літра баланды, вечарам — 100 грамаў «хлеба».

Вызвалілі нас 26 красавіка 1945. А 31 мая ў 5 гадзін раніцы я пад'язджаў да станцыі Талачын...

З успамінаў Міхаіла Трафімавіча Колмака, 1930 года нараджэння, ураджэнца в. Няклюдава

Мой бацька Трафім Паўлавіч пайшоў у партызаны да Мікалая Пятровіча Гудкова. Мы з маці і маленькай сястрычкай доўгі час жылі ў лесе, куды схаваліся ад ворага мірныя жыхары і партызанскія сем'і. У пачатку чэрвеня 1944 г. на лагер наляцелі карнікі. Партызаны кінуліся на выручку, многіх адбілі, але дзесяць чалавек, у асноўным падлеткаў, фашысты захапілі з сабой. Спачатку прыгналі ў вёску Рулеўшчына Сенненскага раёна. Там ў памяшканні з забітымі вокнамі ўжо было каля ста чалавек. Потым спешна адправілі ў Сянно, потым — у Багушэўск. Калі поезд ад'язджаў ад станцыі, наша артылерыя ўжо абстрэльвала Багушэўск. Ішоў канец чэрвеня 1944 г. Не дні, а гадзіны заставаліся да доўгачаканага вызвалення. Прыйшло ж яно для мяне толькі праз дзесяць бясконцых месяцаў.

Прывезлі нас у Германію, размясцілі ў канцлагеры за сорак кіламетраў ад Берліна. Потым перагналі на ўсходнюю ўскраіну фашысцкага логава. Жылі ў абнесеных густым калючым дротам бараках, ледзьве прыкрытых саломай. Працавалі многа, расчышчалі руіны дамоў, вуліцы пасля налёту авіяцыі. Многія не вытрымлівалі і паміралі. Кожную раніцу некалькі чалавек не паднімаліся з нар, іх выносілі і складвалі ў штабелі на тэрыторыі лагера. На работу вазілі на машынах, але назад прывозілі таксама не ўсіх. Дзе яны, ніхто не ведаў. Магчыма паміралі, магчыма іх расстрэльвалі. Чакалі бамбёжкі як збаўлення — тады адчувалі сябе вальней, маглі пашукаць штосьці прыгоднае для ежы ў руінах і на сметніку. Аб становішчы на фронце нічога не ведалі. Толькі калі пачулі раскаты артылерыйскай канады з усходу, зразумелі, што вызваленне ўжо блізка.

Была гэта нядзеля, 22 красавіка 1945 г. Плакалі ўсе — і мы, і нашы вызваліцелі. Хтосьці сфатаграфаваў мяне на памяць, каб не толькі гэты час не забываў, але і ўнукі ўнукаў ведалі, што такое фашызм і вайна. Але ці ж можна такое забыць!

Дамоў дабіраўся на дахах вагонаў, на таварняках. 1 Мая сустрэў у Варшаве, аб перамозе даведаўся ў Мінску. Да Талачына ўжо ехаў у вагоне: адзін афіцэр, якому расказаў сваю гісторыю, накарміў мяне, купіў білет на поезд і даў з сабой крыху грошай.

Дома ўсе былі ў вялікім горы: прайшло не-

калькі дзён, як атрымалі вестку аб гібелі бацькі. Пасля вызвалення раёна бацьку пакінулі аднаўляць разбураную гаспадарку. Але праз ваенкамат бацька дабіўся адпраўкі на фронт, каб знайсці мяне. Маці паказала яго пісьмо, у якім бацька пісаў, што вызвалілі шмат канцлагераў, але ні ў адным з іх сына не знайшоў. Загінуў бацька за два тыдні да майго вызвалення — 6 красавіка 1945 г. ва Усходняй Прусіі.

Каб можна было праклясці вайну

З успамінаў Варвары Міхайлаўны Сіняковай,жыхаркі в. Крыніцы

Калі б можна было праклясці вайну так, каб яна больш нідзе і ніколі не ўзнікала, я знайшла б самыя страшныя словы. Яны выпакутаваны. Тры родныя браты мае Васіль, Фёдар, Арсеній прыйшлі з фронту інвалідамі. Чатыры дваюрадныя браты загінулі. А колькі добрых людзей у вёсцы загінула, дык і не палічыць...

Нялёгка, ой нялёгка жылося нам пад акупантамі. Вясна 1942... Жылі мы тады ў Санях. Сястра мая Каця перахварэла тыфам. Нямоглая, яна толькі рабіла першыя крокі па хаце. А ў гэту пару фашысты пачалі ўганяць моладзь у нямеччыну. У той чорны дзень мы з Кацяй заставаліся ў хаце ўдзвюх. Прыкмеціўшы здалёк фашыстаў на вясковай вуліцы, я хуценька апранулася і без памяці кінулася наўцёк — па садзе ды ў бліжэйшы ельнічак. Схавалася і разважаю, не могуць яны ўзяць з ложка Кацярыну, бачна ж, што пасля тыфу. Не ведала я тады, што вылюдкі могуць усё. Вярнулася ў пустую хату. Зайшлася плачам: «І на што я цябе пакінула, сястрыца, лепей бы нам разам загінуць...» Так усё жыццё і не магу сабе дараваць. Нібыта я вінаватая ў тым, што Кацярына зведала нямецкую няволю, канцлагер.

А ў снежні 1943 г. прыйшла і мая чарга. Немцы і паліцаі ўварваліся ў вёску на досвітку, уцячы не змагла. Выпіхнулі з хаты, толькі і паспела надзець бацькавы боты. Сталі мы, юнакі і дзяўчаты, купкай на вуліцы пад прыцэламі аўтаматаў, аглядаем роднае навакольле, развітваемся. Памятаю, падышла цётка Марыя Сцяпанаўна, зняла свае анучы: «Закруці ножкі, пляменніца, каб не памерзлі...» І скібачку хлеба ў кішэню паклала. Сціснулася маё сэрца ў макавае зярнятка ад жалю.

Прывезлі нас у Талачын, і перш-наперш — у засценак, на допыты, каб высветліць, ці не звязаны з партызанамі. Трымалі нас горш за жывёлін. У невялікую камеру сагналі столькі людзей, што ні сесці, ні легчы. Знаходзіліся, лічы, у цемры, толькі невялікае акенца было прарэзана ў дзвярах, ды вечарам на нейкіх адну-дзве гадзіны ўключалі святло. Так у цемры і пракалыхаліся разам з іншымі землякамі тры месяцы.

Цяпер думаю, як вынеслі мы гэтыя пакуты? Стойкасць набывалі ва ўзаемнай падтрымцы. Была ў камеры сярод нас урач Трыбуль. Бывала, знясіленыя, абражаныя, знявечаныя, прыгадаем сваіх родных, пачынаем галасіць. А яна: «Нельга так, жанчыны. Трымацца трэба. А ну, заспявайма...»

І мы спявалі. Натхняла родная песня. Не любілі гэтага фашысты. Як заспяваем — увечары святла не чакай. Але ў нас сваё святло было — святло шчырых чалавечых адносін.

У суседняй камеры сядзелі хлопцы-партызаны. Іх часта вадзілі на допыты, катавалі. Хтосьці знайшоў іржавы цвічок. Пачалі калупаць ім бервяно, каб родную гаворку, голас сваіх пачуць. Зрабілі невялікую адтуліну. Перагаворваліся, хлопцы нам падказвалі, як трымацца на допытах. Шкадавалі мы іх. Апошнім дзяліліся. Адломім скарынку — ды ў адтуліну яе, падмацуйцеся, саколікі.

Колькі гадоў прайшло, а як заплюшчу вочы — бачу твары вязняў той страшнай фашысцкай камеры. Не забыць мне ніколі сям'і Пушкаровых — маці, дзве дачушкі, хлапчанятка. Кучаравенькі, прыгожанькі такі. Ён усім нам, дзяўчатам, любімым сынком быў. І кожная думала: хто ведае, колькі яшчэ жыць, ці давядзецца зведаць шчасце мацярынства. Галубілі, песцілі хлопчыка. Леншы кавалачак (хаця што там лепшага было) — яму, расхінемся, рассцелем гайно якое — паспі. Расстралялі фашысты ўсю сям'ю. Як мы плакалі, як шкадавалі. Бо і ў нас яны светлыя пачуцці расстралялі.

А хутка вызначыўся і мой лёс. Нас, юнакоў і дзяўчат, пад канвоем павялі на станцыю, адпраўляць у праклятую фашысцкую нямеччыну. Як жывёлу загналі ў таварняк. Зачыніліся з грукатам дзверы. І стала невыносна балюча — ці ўбачым яшчэ радзіму. Заплакалі, развіталіся з ёю.

Аказалася, што зарана развіталіся. На дарозе, на павароце разам з некалькімі хлопцамі ўдалося, карыстаючыся няўважлівасцю канваіра, саскочыць з цягніка. Начамі з параненай нагой прабіралася да сваякоў у Райцы. Так я засталася на роднай зямлі. Нарадавацца не маглі, і не думалася, што цераз колькі месяцаў зноў траплю ў лапы гітлераў-

цаў. Але гэта ўжо быў 1944 год. Цяпер нас натхняла артылерыйская канапада, што чулася на ўсходзе. І фрыцы адчувалі хуткі свой канец. Не так пільна ахоўвалі, меней было канваіраў. Словам, і другі раз удалося мне саскочыць з цягніка. Няхай, думаю, буду калекай, знявечанай, але застапуся на сваёй зямлі.

А потым быў радасны і доўгачаканы дзень вызвалення. І адраджэнне разбуранай гаспадаркі. Пачыналі з нуля. Жыццё было цяжкім, нішчымным, але шчаслівым, бо цяпер у нас было галоўнае — незалежнасць, адваяваная бацькаўшчына. Усім мірам аднаўлялі вёскі, рупнай працай адраджалі зямлю. Я тады працаваў сакратаром Плоскаўскага сельсавета. Увесь час была сярод людзей, і адчула як ніколі, у чым сіла нашага грамадства — у калектывізме, узаемадапамозе і згуртаванасці.

У фашысцкай няволі

Во время немецкой оккупации колхоз «12 съезд КП(б)Б» Толочинского горсовета был преобразован немецкими захватчиками в земское хозяйство. Руководить хозяйством фашисты прислали шестидесятилетнего безумца немца Плейтера. Шеф Плейтер во время своего господства безжалостно бил колхозников палкой, за непокорность сажал в подвал, отправлял на каторгу в проклятую Германию. Горю народному не было границ, а гнев народный рос и креп.

30 сентября 1943 г. случилось то, чему обрадовались все жители «12 съезда КП(б)Б». Помощник шефа Чепик Иван, работавший по поручению партизанского отряда, не выдержал и отплатил старому живодеру за все страдания родного народа, за издевательства, насилие, за сиротские и вдовьи слезы. На гумне, где лежал снятый с 50 гектаров урожай и стояло 450 награбленных в окрестных деревнях овец, народный мститель колесным шкворнем убил старого пса, а потом поджег гумно. О смерти шефа сразу же узнали в Толочине. На следующий день полевой комендант с шайкой разбойников ворвался в деревню. На допрос были взяты сторожа и 30 колхозников. Начались пытки. Вот что рассказывает Кокошко Степан, схваченный бандитами: «Нас построили в шеренгу и отвели к лесу. Там выпытывали, кто убил шефа, кто был участником убийства. Мы держались стойко, говорили, что ничего не знаем, хотя многие готовили это убийство. Немцы угрожали нам расстрелом, даже несколько раз давали залпы над головами, но ничего от нас не добились и отпустили домой».

На этом фашисты не остановились. Их звериные души жаждали невинной крови и слез... Они окружили оба поселка, деревни и вокруг поставили пулеметы. Ночью никто не мог выйти даже из дома, потому что по улицам сновала смерть. Утром немцы согнали все население на то место, где был сожжен Плейтер. Все были построены в шеренгу. Комендант, проверив по списку наличие всех колхозников, развязал руки своим шакалам. Каратели, как зверье, набросились на безоружных людей, срывали лучшую одежду, били прикладами безо всякой причины, только бы почесать свои грязные руки, да согнать свою бандитскую охоту. Сопротивляться колхозники не могли, потому что дула пулеметов смотрели на них, готовые в каждую минуту выбросить усмиренье и смерть.

Когда фашисты всласть натешились, ограбленные и измученные колхозники были силой посажены в черные машины с большими закрытыми кузовами и отправлены на железнодорожную станцию, где их погрузили в вагоны.

Поезд пошел на запад. Все догадались, что их везут в проклятую Германию на каторгу, на страшные муки, на издевательства и пытки. Их выгнали из родного гнезда, с родной земли, отняли все, что они добыли в процессе многолетнего труда. И у каждого в голове роились мысли о темном будущем, а в сердце — страх перед тем ужасным положением, которое ждет их на чужбине.

Гражданка Бондаренко, которой удалось вернуться в родной колхоз после освобождения, рассказывала: «Нас посадили в тесные вагоны по 50 человек. В вагонах было грязно и холодно, мы все были почти раздеты и разуты. Мужчины начали осматривать вагон, нельзя ли где сделать дырку, чтобы выскочить из вагона на ходу, но все это оказалось напрасным. Вагоны были сделаны крепко и забиты наглухо. Даже нигде нельзя было отыскать щель, чтобы в последний раз глянуть на родные поля, которые мы покидали навсегда. Так мы ехали три дня. Есть нам не давали. К нам никто не заходил. На четвертый день нам дали по двести граммов хлеба и по кружке кипятка. На пятый день поезд остановился на какой-то станции. С треском открылись двери вагонов, и к нам с криками «партизан! бандит!», держа автоматы наготове, ворвались около тридцати ошалелых гитлеровцев. Грабить у нас не было чего. Начал-

ся разбой. Гитлеровцы теснились, стегали нас ремнями. Потом они изнасиловали нескольких девушек и женщин и вышли, крепко закрыв двери вагона. На седьмые сутки поезд остановился в пограничном городе Граево. Там нас согнали в лагерь и провели медицинскую комиссию. Того, кто физически здоров, отправили в Германию, других отправили на работу на месте. Того же, кто не мог принести пользы, расстреляли. Так погибли многие наши колхозники и многие дети разлучились со своими родителями. Меня оставили в лагере. Сколько горя и мучений я там перенесла, сколько ужасов видела! Нас заедали вши, а еще хуже донимали трижды проклятые гитлеровские шакалы. Ежедневные расстрелы, пытки, голод, холод и тоска по родной Белоруссии, по родной деревне, о прожитой жизни. Я раньше никогда бы не поверила, что сердце мое способно перенести весь этот кошмар.

После десяти суток пребывания в этом лагере смерти нас, 40 человек, перегнали в другой город, где мы жили еще в худших условиях и каждый день под конвоем ходили копать окопы. С каждым днем мы чахли, ожидая своего последнего часа, но в сердце время от времени все же вспыхивал огонек надежды на освобождение. Неужели наши родные сынки не знают, что мы мучаемся в немецкой неволе? Долгожданный день наступил. Наша родная освободительница Красная Армия разорвала колючую проволоку концентрационного лагеря, и мы снова вольны. Я вернулась в свой колхоз, чтобы снова возродить ту жизнь, которая была до войны. Я помню на каждом шагу, что еще много наших соседей мучаются там, в немецкой неволе. Я все свои силы отдала для того, чтобы как можно больше помочь Красной Армии, чтобы как можно скорее она вырвала из оков неволи всех советских граждан и учинила суд и расправу над бешеным фашизмом. Этот день близок!»

Этот день близок! Красная Армия давит фашистских гадов в их собственном логове. Она несет на своих штыках смерть фашистскому господству и свободу всем угнетенным народам. Ее славных воинов зовут в решающий бой слезы и страдание, кровь и смерть советских граждан, томящихся в проклятой Германии. Ей помогает своим честным трудом в тылу весь советский народ. День победы близок!

А. Баранов.

Газета «Чырвоны хлебароб» 24, 29 снежня 1944 г. 4 студзеня 1945 г.

Не дзеля славы

Іван Сяргеевіч Чэпік і яго сястра па маці Надзея Ігнатаўна Палякова — удзельнікі партызанскага руху на Талачыншчыне. Аб іх лёсе паведамілі чытачам на старонках газеты «Сцяг Ільіча» (1987, 15 студз. і 2 крас.) былыя партызаны А. Р. Мачахоўскі і М. А. Сафронаў. На падставе іх матэрыялаў і зроблены гэты нарыс.

Пасажырскі поезд набліжаўся да Беластока. І тут нечакана пачуўся страшэнны гул, які праз імгненне змяшаўся з жудаснымі выбухамі, грукатам, крыкамі. Вагоны захісталіся і спыніліся. Ніхто нічога не разумеў. І толькі, калі навыскоквалі з вагонаў, убачылі, што на поезд зроблены паветраны налёт. Была раніца 22 чэрвеня 1941 года. Так сустрэла вайну Надзея Палякова, якая ехала ў Беласток, дзе вучылася на першым курсе педагагічнага інстытута.

І пачалося яе блуканне па дарогах Беларусі. Да Мінска ішла разам з адступаючымі вайсковымі часцямі, дапамагала параненым. У горад трапіць не ўдалося. Ён ужо быў заняты фашыстамі і гарэў. Далей прабіралася з бежанцамі, бачыла палаючыя гарады і вёскі, тысячы людзей, якія, кінуўшы родныя мясціны, праз лясы і балоты пад пякучым сонцам цягнуліся на ўсход. Надзея імкнулася хутчэй да сваіх, за лінію фронту, хацела дапамагчы Радзіме ў барацьбе з захопнікамі. Вось, нарэшце, і родная Талачыншчына. Тут, у вёсцы Гарбачэва Алёнавіцкага сельсавета, жыла маці. Зайшла праведаць, думала на хвілінку, але затрымалася. Людзі пераканалі, што змагацца з ворагам можна і ў яго тыле. Тры яе браты і муж былі на фронце.

Паступова стала наладжваць сувязі з партызанамі, выконвала іх заданні. Вясной 1943 года ўцёк з фашысцкага палону яе брат Іван Сяргеевіч Чэпік і адразу настойліва стаў дабівацца сустрэчы з партызанамі. Гэта сустрэча адбылася вышадкова, калі брыгада «Чэкіст» вярталася на свае базы з зімоўкі ў лепельскіх лясах. Нечакана для сябе Іван Чэпік у групе партызан убачыў знаёмага па армейскай службе старшага лейтэнанта Д. Я. Пракапца, які быў начальнікам штаба пятага партызанскага атрада.

Сустрэча была кароткай, але канкрэтнай. Іван Чэпік ахвотна ўзяўся выконваць партызанскія даручэнні і неўзабаве па іх заданню ўладкаваўся працаваць у нямецкую земскую гаспадарку ў Зарэччы. Здабываў каштоўныя разведданыя аб праціўніку і праз Надзею Палякову перадаваў іх партызанам. Дзейнічаў смела і рашуча, часам нават дзёра-

І. С. Чэпік.

Н. І. Палякова.

ка. У памяці яшчэ свежыя былі здзекі, што давялося перанесці ў фашысцкім палоне, і лютая нянавісць да рабаўнікоў кіпела ў ім.

Гітлераўцы не маглі не заўважыць гэтага і вельмі хутка западозрылі хлопца ў сувязях з партызанамі, устанавілі сачэнне. Аднойчы затрымалі сястру, але, не знайшоўшы ў яе пры вобыску нічога падазронага, адпусцілі. Чэпік адчуў пагрозу, зразумеў, што не сёння-заўтра будзе арыштаваны, і вырашыў бегчы з Талачына, але не проста бегчы, а знішчыўшы ўраджай збожжа, якое павінны былі адправіць у Германію і расквітаўшыся за здзекі над савецкімі людзьмі з фашысцкім вар'ятам Плейтарам, які кіраваў земскай гаспадаркай. 30 верасня 1943 года, зазваўшы свайго шэфа ў свіран, дзе ляжала сабранае жыта і стаяла 450 адабраных у насельніцтва і падрыхтаваных для адпраўкі ў Германію авечак, ён калёсным шворанам забіў фашыста і падпаліў будынак. Многім талачынцам запомніўся той пажар. Вось што ўспамінае былы жыхар пасёлка Другое Зарэчча Я. Ф. Кухта:

— Добра помню, як гарэў вялізны, метраў на 50 у даўжыню, хлеў. Палаў агромны стог саломы, які стаяў з ім побач. Як ні стараліся немцы, патушыць агонь не змаглі. А было іх многа: у пасёлку знаходзіліся дзве казармы з салдатамі. Спачатку, не знайшоўшы Плейтара і Чэпіка, гітлераўцы рашылі, што яны ўчынілі пажар і збеглі да партызан. Але на другі дзень, калі на папялішчы ўбачылі абгарэлы труп упраўляючага, зразумелі ўсё. Не проста было зрабіць такое аднаму, ды яшчэ днём, калі навокал немцы. Відаць, усё было прадумана загадзя. Полымя ахапіла ўсё імгненна: не інакш як ён абліў унутры бензінам. Згарэла і малатарня, што была побач са свірнам. Паспелі толькі адагнаць трактар. Конь, вылзны цёмна-шэры ў яблыкі жарабец, быў запрэжаны ў рысорку і стаяў непадалёк. На ім, пакуль брала сілу полымя, Чэпік уцёк.

Далейшы лёс І. С. Чэпіка невядомы, па некаторых звестках ён загінуў.

Тым часам Надзея Палякова, раней папярэджаная братам, пакінула дом і пайшла ў партызаны. Яна працавала ў разведвальна-дыверсійнай групе. Гэта была смелая і рашучая разведчыца, з пэўным вопытам работы ў тыле ворага. Яна займалася падборам людзей для разведкі. Наведвалася ў Талачын. Але там яе многія ведалі. Даводзілася маскіравацца. З дакументамі бежанкі, якая шукае родных, яна абходзіла кватэры, сустракалася з патрэбнымі ёй людзьмі, давала заданні, збірала інфармацыю. Нярэдка гэта былі каштоўныя звесткі аб размяшчэнні фашысцкіх часцей і складоў, аб ахове чыгункі, мастоў, замініраваных участках, удакладненыя схемы агнявых кропак ворага, медыкаменты, папера.

У маі 1944 года, спяшаючыся па сустрэчу з сувязным, на лясной паляне непадалёк ад вёскі Зайкаўшчына Надзея нечакана наткнулася на засаду. Гітлераўцаў было больш дзесятка, яны стаялі ў хмызняку і чакалі, пакуль яна падыдзе. Разведчыца міжволі спынілася. Адна за адной мільгалі думкі: што рабіць... Раптам, апусціўшы руку ў сумку, намацала гранату, пра якую ў хвіліну разгубленасці забыла, вызваліла ад засцерагальніка і, імгненна выхапіўшы, кінула ў бок ворагаў. Гітлераўцы пападалі ніц. Раздаўся выбух. А Надзея з усіх ног пабегла назад, да выратавальных дрэў. Ззаду застракаталі аўтаматы, пачуліся крыкі. Але родныя яліны ўжо ўкрывалі яе ад смертаносных куль.

Надзея Ігнатаўна Палякова ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» і іншымі.

У ліпені 1944 года пасля вызвалення Беларусі адважная партызанка вярнулася дадому, у родны калгас яна прыехала на сваім баявым кані. У той час гэта быў адзіны конь у калгасе. Тады яна яшчэ не ведала, што не дачакаецца з вайны мужа і трох братоў. Аўтамат змяніла на падручнікі і сшыткі. Скончыла Аршанскі настаўніцкі інстытут, потым завочна Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага. Вучыла грамаце і дабраце дзяцей. Выгадавала сваіх траіх. Зараз на пенсіі.

Суджана жыць

З успамінаў Марыі Іосіфаўны Бондаравай, былой сувязной брыгады «Граза»

Нас у сям'і было чацвёра — маці, два браты і я. У сям'і панаваў дух патрыятызму. Гэтым мы былі абавязаны сваёй маці, школе і савецкай рэчаіснасці.

Калі летам 1942 г. да вёскі Шыбекі дайшлі чуткі, што непадалёку дзейнічае атрад заслонаўцаў, старэйшы брат Іван з двума акружэнцамі Аляксандрам і Гаўрылам (прозвішчаў іх не памятаю) пайшлі да іх у лес.

Маці, брат Пётр і я жылі дома. Іван час ад часу забягаў дамоў. Прыносіў лістоўкі, якія мы распаўсюджвалі і заўсёды прасіў маці пячы больш хлеба, каб у любы час маглі аддаць партызанам. Пеця збіраў і хаваў зброю, я таксама атрымала заданне: увесь вольны час вязала цёплыя рэчы для партызан, у асноўным пальчаткі і шалікі (маці прала воўну)... У чэрвені да нас прыйшлі дзве дзяўчынкі, двоюрадныя сёстры Таня Хрыпач і Валя Дземяшкевіч. Яны паведамілі, што на поўнач ад вёскі Межыёва дзейнічае атрад С. Ц. Баранава, якому неабходна звязацца з заслонаўцамі. Мы з дзяўчатамі пайшлі ў атрад, дзе сустрэліся з Пятром Андрэевічам Андрэевым. Я дала згоду быць сувязной. Ноччу да нас зайшлі партызаны з атрада К. С. Заслонава, і я перадала просьбу Андрэева. На наступны дзень мы з Таняй пабеглі ў атрад, каб паведаміць месца сустрэчы з заслонаўцамі. Потым яшчэ не раз выконвала заданні партызан.

27 лістапада 1942 г. наш дом быў акружаны смалянскай паліцыяй. У хаце былі толькі мы з маці (Пеця дома рэдка бываў). Яна прала воўну, я вязала. Мне ўдалося схавацца, а маці забралі ў аршанскую турму (зноў мы сустрэліся толькі 23 чэрвеня 1945 г.). Куды было ісці? Партызан знайсці не змагла — брыгады змянілі месца дыслакацыі. Братоў таксама не знайшла ні ў Межыёве, ні ў Вароніне, ні ў Шынкове. Ноччу цішком прабралася ў родную вёску да дзядзькі, які ў той час выконваў абавязкі старасты. Неяк ноччу пастукалі ў дзверы.

— Адчыняй, партызаны!

Дзядзькава жонка ўзрадавалася і прамовіла:

— Як добра! Сястра Бондарава Івана ўжо цэлы месяц шукае сустрэчы з братам.

У дзверы ўварваліся ... фашысты. Гэта было 27 снежня 1942 г.

У Смалянскай камендатуры дапытвалі, дзе знаходзяцца партызаны, хто ім дапамагае. А каб гаварыла, білі палкамі. Нават паміраючы, хацелася адпомсціць ворагам і іх служкам, якіх было трое ў нашай вёсцы і па даносу якіх, відаць, была схоплена маці. Замест сапраўдных прозвішчаў сувязных я назвала імёны паліцэйскіх. Мяне перасталі біць, але праз дні два ўсё высветлілася — фашысцкія паслугачы з'явіліся ў камендатуру... Тады акупанты мне прапанавалі выбіраць — або я «добраахвотна» еду ў Германію, або я і маці будзем расстраляны. Я была ўпэўнена, што абавязкова ўцяку, толькі б вырвацца з камендатуры, і вырашыла ехаць, каб выратаваць маці.

У дарозе ўцячы не ўдалося — як раз у нашым вагоне знаходзілася ахова поезда. Прывезлі ў Лейпцыг на ткацкую фабрыку. Месяц вучыліся ткаць на двух станках. Працаваць я на іх не магла, для мяне было лягчэй памерці. У першы ж дзень самастойнай работы ўстала раней за іншых, тайком прабралася на фабрыку, зламала свае станкі і зноў непрыкметна вярнулася ў інтэрнат, які стаяў на тэрыторыі фабрыкі. Дзень прайшоў спакойна, а позна вечарам за мной прыйшлі тры вялізныя немцы. Збілі мяне і босую павялі праз увесь горад у турму. Кінулі ў адзіночную камеру. Калі дзверы зачыніліся, я запела «Інтэрнацыянал». Мне вельмі хацелася, каб за мной вярнуліся і дабілі. Жыць не хацелася. Не ведаю, колькі прайшло часу, але да мяне ніхто не прыходзіў. Я пачала ламаць халодную печ і кідаць цагліны ў жалезныя дзверы. Моцна крычала, пасылаючы праклёны фашыстам. Потым былі іншыя турмы і адзіночныя камеры. На маё здзіўленне, мяне больш не білі. У хуткім часе (прыкладна ў сакавіку 1943 г.) разам з іншымі прывезлі ў Асвенцім. Спачатку быў каранцін, потым лагерная бальніца (рэвір). Я часта траціла прытомнасць, некалькі разоў мяне адбіралі для адпраўкі ў газавую камеру. Але кожны раз ратавалі маці-патрыёткі, якія хавалі мяне (пра гэта я даведвалася потым, калі прыходзіла ў прытомнасць). Потым яшчэ не аднойчы мы дапамагалі адзін аднаму ў барацьбе за жыццё. Па меры набліжэння Чырвонай Арміі вязняў, хто мог хадзіць, вывозілі ў глыб Германіі. Пасля Асвенціма траціла ў Равенсбрук, потым у Эберсвальд. Этапам ішлі да горада Шчэціна. Тут нас і вызвалілі.

Дамоў вярнулася, калі ўжо не было выстралаў. Людзі хадзілі свабодна, смяяліся, радаваліся мірнаму небу. Я яшчэ доўга не магла прывыкнуць да цішыні, асабліва страшна было ноччу... Даведалася, што 19-гадовы брат Пётр загінуў летам 1943 г. У верасні пайшла

працягваць вучобу ў Смалянскую сярэднюю школу. Потым тры гады вучылася завочна на настаўніцу. Усё сваё жыццё прысвяціла дзецям. Імкнулася выхаваць іх добрымі і самастойнымі, сапраўднымі патрыётамі сваёй Радзімы.

У імя перамогі

З успамінаў Веры Рыгораўны Другаковай (Заржэцкай), сувязной брыгады «Чэкіст»

Перад вайной я выкладала беларускую мову і літаратуру ў Сухачэўскай няпоўнай сярэдняй школе. Калі раён быў акупіраваны, мы, камсамольцы і моладзь навакольных вёсак, уключыліся ў актыўную барацьбу з ненавісным ворагам. Спачатку збіралі ў лесе зброю. Пазней сталі перапісваць і размнажаць лістоўкі. Вясной 1942 г. камсамольцы Іван Альшэўскі, Ілья Баркоўскі, Косця Заржэцкі, Алег Беразнеў пайшлі ў лес да партызан атрада А. Ф. Сімдзянкіна. Оля Гурынова, Оля Разумовіч і я сталі сувязнымі атрада. Пры сустрэчы з А. Ф. Сімдзянкіным паказала яму, дзе схаваны сабраныя летам 1941 г. зброя і боепрыпасы.

Оля Разумовіч уладкавалася на работу да акупантаў: збірала ў насельніцтва малако і рабіла з яго смятану. Частку прадуктаў яна перапраўляла партызанам. Насілі з ёй лістоўкі ў Талачын, Коханава, Круглае, Лотву. Відаць, акупантам стала штосьці вядома — да Олі і мяне некалькі разоў прыходзілі з вобыскам, забіралі ў воласць. Аднак доказаў не было, і мы зноў вярталіся дамоў. Мне ўдалося ўстанавіць сувязь з бургамістрам станцыі Слаўнае Трыбулем і яго жонкай Клавай, урачом. Трыбуль выдаваў партызанам пашпарты і пропускі, а жонка збірала і перадавала медыкаменты. Праз С. П. Саўчанку (пазней камісар 5-га асобнага атрада) усё гэта перадавала ў брыгаду «Чэкіст».

Па заданню камандзіра разведкі 5-га асобнага атрада М. А. Сафронава ўстанавілі сувязь з Воўкавіцкай воласцю, адкуль перадавалі паперу для друкарні, патроны, гранаты, пропускі. У лютым 1944 г. атрымалі новае заданне — уладкавацца на работу ў вайсковую часць. Гурынова, якая ведала нямецкую мову, стала працаваць у пральні, што абслугоўвала прыбыўшыя вайсковыя часці ў Талачыне. Пазней там стала працаваць і наша сяброўка Дзіна Фінагенава, бежанка з Арлоўскай вобласці. Спачатку ўсё ішло добра — хутка завязалі знаёмства з афіцэрамі, у якіх вывуджвалі сакрэтныя звесткі. Аднойчы, здабыўшы дадзеныя аб перадыслакацыі варожых дывізій, Гурынова не дачакалася мяне на станцыі Талачын і сама накіравалася ў атрад. На чыгуначным пераездзе не сталі старанна абшукваць. Нічога не знайшоўшы, паліцай схапіў Олю за касу. На снег упала паперка з нумарамі дывізій... Оля трапіла ў «Пушніну». Аднойчы, калі вязні чысцілі канюшню, дзяўчына паспрабавала ўцячы. Ахова схапіла яе і пачала жорстка збіваць. На допытах таксама білі. Оля стала забывацца, у камеры і на допытах пела, а то пераходзіла ў плач. Праз некалькі дзён схапілі і нас — Олю Разумовіч, Дзіну Фінагенаву, Соню Дзегцярову і мяне. Здарылася гэта 19 лютага 1944 г. Камера была забіта людзьмі. Спалі на нарах, пад нарамі і прама каля прыбіральні, седзячы на кукішках. Вады не было. За ўвесь дзень давалі нейкага варыва без хлеба. Але мы трымаліся. Па вечарах нары служылі сцэнай — пелі песні, чыталі «Узніка» А. С. Пушкіна. Адну песню склалі самі. У гэты час сядзелі ў «Пушніне» Вера Крапопава, сям'я Трыбуляў са Слаўнага, Варвара Латышова, Валя Багданская, тры сястры Савік — Феня, Ліда, Галя — з Азерыцкага сельсавета, Рая Лугаўская з вёскі Равуча, партызан Драніца і іншыя.

8 сакавіка фашысты павезлі на расстрэл 20 мужчын і жанчын. Нас працягвалі мучыць. А 26 красавіка забралі Олю Гурынову і Дзіну Фінагенаву. Іх расстралялі ў Маціеўскім лесе. Соню Дзегцярову адпусцілі дамоў, нас з Разумовіч адправілі ў канцлагер у Германію. Прывезлі ў горад Ульм. Казарма на 60 чалавек, 20 трох'ярусных ложкаў. На кожным замест матрацаў стружка і дзве рагожы. Паднімалі з аўчаркай у пяць гадзін раніцы. Працавалі на аўтазаводзе грузчыкамі. Кармілі тры разы — раніцай кружка несалодкай эрзацкавы і 150 грамаў хлеба з апілкамі, у абед чарпак баланды з сіняй капустай або шпінату, вечарам вінегрэт з буракоў. Ад такой ежы ледзьве перастаўлялі ногі. Аднак духам не падалі, нават складалі вершы. Адзін з іх стаў для нас гімнам. Калі грузілі скрыні з медыкаментамі, адкрывалі іх і знішчалі перавязачны матэрыял. Пазней нас перавялі ў цэх камплектацыі машын. Працавала пад строгім наглядам фашыстаў. Тут таксама шкодзіла — выкідвала гайкі ад бензабакаў, знішчала ключы ад машын. Мяне злавілі і пасадзілі ў карцэр. А праз тры дні наляцелі амерыканскія самалёты і пачалі бамбіць горад. Я паўжывая выпаўзла з падвала разбуранага дома. Горад ляжаў у руінах. Стала выбірацца за горад, там сустрэла шмат збеглых з аўтазавода. Схаваліся ў полі,

дзе ляжалі бурты з бручкай (гэта быў канец сакавіка 1945 г.). Паміж буртамі і жылі. А 26 красавіка 1945 г. нас вызвалілі амерыканскія салдаты. «Усіх рускіх сабраць, апрануць, накарміць і адправіць на радзіму».— быў загад. Нас павезлі ў Польшчу. Там доўга лячылі. А 5 верасня я стаяла на парозе роднага дома. Убачыла хворую і пачарнелую ад гора маці, малодшага брата Валянціна, які стаў інвалідам. Старшы брат Косця загінуў у партызанах, Іосіф пахаваны ў Прусіі. Такой цаной заплаціла наша сям'я за перамогу.

Больш сарака гадоў працавала ў школе. Выхавала траіх дзяцей. Школу не забываю — яна па-ранейшаму мой другі родны дом...

Вытрымалі

З успамінаў Еўдакіі Максімаўны Шумскай, сувязной партызанскай брыгады «Граза»

Е. М. Шумская.

Першы дзень вайны сустрэла ў г. Бяроза Брэсцкай вобласці. У 5 гадзін раніцы мужа паднялі па трывозе. Мы яшчэ не ведалі, што гэта — вайна, думалі, звычайная трывога, да якіх мы, афіцэрскія жонкі, адносіліся як да звычайнай і неад'емнай часткі нашага жыцця. А ў 8 гадзін пачалі бамбіць горад... Апоўдні на хвіліну забег муж. Толькі і паспеў сказаць, што вечарам сем'і ваеннаслужачых эвакуіруюць у лес. І зноў пабег у часць, якая стаяла на абароне горада. На машыне нас давезлі да Пухавіч. У дарозе некалькі разоў бамбілі, вакол было шмат параненых. З Пухавіч ноччу поездам дабраліся да Магілёва, потым да Крычава, адтуль — на Оршу. У Оршы я апынулася толькі 28 чэрвеня. Тут зноў трапілі пад бамбёжку. Сіл больш не было — за тыдзень да вайны захварэла на брушны тыф, а на руках яшчэ трохмесячны сын. Калі б не жанчыны, якія дапамагалі ў дарозе, не ведаю, ці дабралася б да Пярэвалачні, дзе жылі бацькі.

Праз некалькі дзён з Баранавіч да бацькоў прыехала мая сястра Кацярына Максімаўна Нарчук з дваімі дзецьмі. Фронт набліжаўся і да нас, многія жыхары пакідалі вёску. Мы з-за дзяцей і маёй хваробы ехаць нікуды не маглі. Чырвонаармейцы пачалі выкопваць акоп. Баі ішлі ўжо каля вёскі. Ноччу, калі страляніна сціхла, сястра разам з маці перацягнула мяне і дзяцей далей ад вёскі. А калі вярнуліся назад — там ужо былі немцы. Пазней за сястрой прыйшоў яе муж Іван Мікалаевіч Нарчук, і яны ўсе паехалі ў Козкі да яго бацькоў. У кастрычніку 1942 г. Іван Мікалаевіч быў залічаны ў партызанскую брыгаду «Граза». Гэта стала вядома акупантам. Усю сям'ю Нарчукоў, у тым ліку і маю сястру, забралі ў «Пушніну» і расстралялі. Засталіся толькі дзеці Кацярыны. Маці прывяла іх да нас. Хутка ў Пярэвалачні стала вядома, што за сувязь з партызанамі расстралялі нашых сваякоў. Мясцовыя ўлады сталі адносіцца да нашай сям'і падазрона і варожа. Мы з братам Міхаілам, які вярнуўся з палону, паклялiся помсціць ворагу, як толькі зможам. Міша стаў сувязным брыгады «Граза», уладкаваўся працаваць на чыгунку, каб перадаваць партызанам звесткі аб руху цягнікоў. Звесткі гэтыя я насіла ў Козаўку і перадавала праз сувязнога ў брыгаду. Мясцовых жыхароў часта ганялі на чыгунку высякаць хмызняк уздоўж дарогі, а таксама працаваць у сталовую, дзе харчавалася ахова чыгункі. Сярод ахоўнікаў было шмат уласаўцаў. Па заданню С. М. Нарчука, камандзіра брыгады «Граза», пачала асцярожна наладжваць з імі сувязь. Многія з іх хацелі перайсці ў партызаны, але не ведалі, як гэта зрабіць. Праз некаторы час дамовіліся аб сустрэчы з партызанамі за Букаравам. У хуткім часе ў лес перайшло некалькі груп уласаўцаў.

У 1943 г. па загаду С. М. Нарчука мы перабраліся ўсёй сям'ёй у лес. Міцу хутка перавялі ў брыгадную разведку (ён добра ведаў пямецкую мову). Старых, дзяцей і жанчын часова пакінулі ў падрыўнікоў. Калі пачаліся баі і гітлераўцы ўсё глыбей заходзілі ў лес, мы перайшлі ў лепельскія лясы. Там жылі ў зямлянках, даглядалі жывёлу, пяклі хлеб, мылі бялізну. Ахоўвалі збожжа, закапанае ў ямах. У маі 1944 г. пачалася блакада Лепельскай зоны. Харчы былі ўжо зусім блізка, і мы былі вымушаны выйсці з нашага лагера. Сустрэлі партызан брыгады Лявона-

ва і разам з імі падаліся ў балоцісты раён возера Палік. Пачаліся цяжкія дні выпрабаванняў. Днём і ноччу над балотам кружылі варожыя самалёты. Схавацца было немагчыма — усюды нас знаходзілі разведвальныя «рамы», якія суткамі віселі над галавой. Бамбёжкі іх змяніліся артабстрэлам. Дзень пераблытаўся з ноччу. Самае страшнае было тое, што з намі былі дзеці. Яны захлыналіся ў багне, рукі дзервянелі, трымаючы іх увесь час на руках. Амаль месяц жылі без ежы і літаральна ў вадзе. Са мной быў мой трохгадовы сын. Калі не даставалі варожыя кулі, звінчаў голад. Адна была думка — чым накарміць і як іх сагрэць у гэтым пекле. Прайшло ўжо столькі гадоў, а ніяк не забыць таго дзіцячага крыку, іх галодных вачэй, поўных смяротнага страху і надзеі, што маці прыдумае што-небудзь і збавіць іх ад пакут. І ўсётакі нам было суджана выжыць. Калі нечакана стала ціха, падаліся да партызанскага лагера. Выйшла ў той дзень 10 партызан, сям'я Былінскіх і мы. Усё засталося на месцы — карнікі не знайшлі лагер. За многа дзён упершыню елі хлеб. Адпачыўшы, пайшлі ў лагер брыгады Дзьячкова. Партызаны засталіся назіраць за дарогай. Праз некалькі дзён яны прыбеглі і паведамілі, што пашы войскі рухаюцца па дарозе. Сустрэліся з імі ў лесе. Шмат было слёз, радасці. У хуткім часе мы прыехалі дамоў. Сустрэлі нас суседзі Петрашкевічы. Мне паведамілі цяжкую вестку — загінуў брат Міша. Гаспадарка была разбурана. Першы час вельмі дапамагалі суседзі, дзяліліся ўсім, іншы раз апошнім. Я ўладкавалася працаваць у дзіцячым доме, потым да пенсіі працавала ў райваенкамаце.

Подзвігаў ніякіх не здзяйсняла, але імкнулася зрабіць усё, што было ў маіх сілах, каб наблізіць нашу агульную перамогу. У блакадзе, магчыма, і выжылі, што верылі ў яе светлы дзень.

Наш камбрыг

З успамінаў былога сакратара Талачынскага падпольнага райкома партыі Аляксея Пятровіча Пахамовіча

С. М. Нарчук.

Г. А. Кірпіч.

У Плоскаўскім сельсавеце ёсць невялікая вёска Козкі. Тут у беднай сялянскай сям'і Мікалая Нарчука ў 1910 годзе нарадзіўся сын, якога назвалі Сямёнам. Некаторыя з яго аднагодкаў і зараз жывуць у гэтай вёсцы. Памятаюць Сямёна. Ды і як не помніць кемлівага, жвавага Сямёна, завадатара ўсёй дзетвары!

У перыяд калектывізацыі камсамолец Нарчук стаў адным з актыўных арганізатараў пераходу сялян на новы шлях жыцця. У 1932 годзе ён уступіў у рады ВКП(б), працаваў старшынёй сельсавета, яго выбралі сакратаром партыйнай арганізацыі. Упершыню я сустрэўся з Сямёнам у 1936 годзе ў вёсцы Кувечына Полюдаўскага сельсавета, калі там у ганаровай абстаноўцы калгаснікам быў уручаны Акт на вечнае карыстанне зямлёй. Ён, зусім яшчэ малады, сядзеў за вялікім сталом сярод пажылых барадатых сялян і вёў шчырую размову аб праблемах і цяжкасцях перажываемага перыяду. І столькі ў ім было энергіі, упэўненасці, аптымізму, што нават самыя асцярожныя адразу пачыналі верыць маладому старшыні!

У наступным, 1937 годзе Сямёна Мікалаевіча выбралі першым сакратаром райкома камсамола. Як здольнага арганізатара моладзі неўзабаве накіравалі на партыйную работу — сакратаром Талачынскага райкома партыі. Нарчук не ўхіляўся ад вострых пытанняў, умеў выслухаць людзей, параіць. Яго асабістае абаянне, уменне прыцягнуць да сябе любога і пераканаць дапамагалі сакратару ў самых нечаканых сітуацыях.

Перад самай вайной Сямёна Мікалаевіча прызвалі на ваенныя зборы, адкуль ён адразу быў накіраваны ў дзейную армію. А ў маі 1942 года па закліку Кампартыі Беларусі прыбыў на Асобы Беларускі збор, які рыхтаваў кадры для арганізацыі і кіраўніцтва барацьбой партызан у тыле ворага. Тут, пад Мурамам, што на Уладзіміршчыне, ён з вялікай радасню сустрэў сваіх землякоў Мяжэвіча з вёскі Жукнева, Кіпрыянца з Талачына, Рашэтнікава з вёскі Стары Талачын, Ворашня з вёскі Ваўкавічы і іншых. Яны склакі касцяк

партызанскага атрада «Граза», які ў ліпені 1942 года прыбыў у свой родны раён. Нарчук, камісар атрада, а потым брыгады «Граза», стаў адным з выдатных арганізатараў партызанскага руху ў раёне.

Сустрэўся я з Сямёнам Мікалаевічам у Дубаўскім лесе восенню 1942 года, калі мы, гудкоўцы, вярнуліся з працяглага рэйду. Ён прапанаваў мне перайсці ў яго брыгаду. Хутка я стаў камісарам атрада імя Аляксандра Неўскага партызанскай брыгады «Граза». Па абавязку службы часта даводзілася сустракацца з Сямёнам Мікалаевічам. Партызаны любілі яго, верылі свайму камісару. Быў ён чалавекам тактоўным, усёй душой унікаў у цяжкасці і патрэбы людзей. Праяўляў пастаянны клопат аб партызанах: каб былі заўсёды накормлены, мелі адзенне, абутак. Камісар не цярпеў людзей, якія праяўлялі баязлівасць, нерашучасць. Нерашучых пасылаў разам з валявымі камандзірамі на адказныя заданні. І людзі наступова загартоўваліся, больш упэўнена ішлі ў бой. Сямён Мікалаевіч ведаў многіх людзей у раёне, а з тымі, хто застаўся на акупіраванай тэрыторыі, вёў адкрытыя размовы. «Грамадзянін нашай краіны не можа сядзець без справы і чакаць, калі вернецца Савецкая ўлада,— гаварыў ён.— Неабходна змагацца ўсім, усімі сіламі».

З чэрвеня 1943 года С. М. Нарчук — камандзір брыгады «Граза». У гэты час у брыгадзе было ўжо 8 атрадаў — каля тысячы ўзброеных партызан. Ва ўсіх атрадах дзейнічалі пярвічныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі. Брыгада фактычна кантралявала каля 180 населеных пунктаў, падтрымлівала з насельніцтвам цесную сувязь.

У пачатку ліпеня 1943 года пачаў сваю работу падпольны райком партыі, які ўзначаліў Сямён Мікалаевіч Нарчук.

З кожным днём раслі нашы сілы, больш адчувальнымі станавіліся ўдары па ворагу. Набатам прагучаў заклік райкома партыі ўсімі сродкамі дапамагаць Чырвонай Арміі гнаць ворага з роднай зямлі.

Паспяхова была праведзена аперацыя «Рэйкавая вайна»: партызаны вывелі са строю 550 рэек. Пад камандаваннем камбрыга былі ажыццёўлены сотні баявых аперацый па разгрому варожых эшалонаў, гарнізонаў праціўніка і інш.

...Сямён Мікалаевіч вельмі часта каля кастра марыў разам з байцамі аб мірнай працы, аб шчасці пасляваеннага жыцця. Але не давялося камбрыгу ўбачыць мірнае жыццё. У жорсткіх схватках у дні блакады красавіка — мая 1944 года памёр наш любімы камбрыг. А было яму ўсяго 34 гады...

Да перамогі ішлі разам

З успамінаў Г. А. Кірпіча

Герасім Аляксеевіч Кірпіч нарадзіўся 15.1.1909 г. ў сяле Яцкі Васількоўскага раёна Кіеўскай вобласці. Член КПСС з 1937 г. У Чырвонай Арміі з 1931 г. Удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі ў 1939 г. З першых дзён вайны на фронце, удзельнік абарончых баёў пад Ваўкавыскам, Слонімам, Мінскам. У партызанах з жніўня 1941 г.: камандзір разведгрупы, атрада, з мая 1942 г. камандзір партызанскай брыгады «Чэкіст», у жніўні 1943 — чэрвені 1944 г. камандзір Шклоўскай ваенна-аператыўнай групы. Адначасова быў членам Шклоўскага падпольнага РК КП(б)Б. Пасля вызвалення Беларусі — на партыйнай рабоце: інструктар, загадчык сектара ЦК КП(б)Б, у Мінскім абкоме, сакратар Рудзенскага РК КПБ. З 1958 г., пасля заканчэння Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КПСС, працаваў у органах партыйнага кантролю, на савецкай рабоце ў Мінску. З 1968 г. пенсіянер рэспубліканскага значэння. Жыве ў Мінску. Узнагароджаны 4 ордэнамі, медалямі.

Першыя групы і атрады будучай партызанскай брыгады «Чэкіст» зараджаліся на стыку Талачынскага, Аршанскага, Шклоўскага, Круглянскага раёнаў у Рацаўскім лесе.

За першую ваенную зіму, якую нам давялося прабыць у вёсках, былі завязаны знаёмствы з людзьмі, ведалі, да каго і з чым можна звярнуцца. У навакольных жа лясах арыентаваліся яшчэ недастаткова добра. На дапамогу прыйшлі моладзь і нават падлеткі, якія цудоўна ведалі свае родныя мясціны. У многіх выпадках разам з імі выбіралі першыя нашы стаянкі. Перабраўшыся ў лес, мы маглі паспяхова працягваць барацьбу толькі ў цеснай сувязі з насельніцтвам. Сувязныя сталі нашымі вачамі і вушамі на месцах. Каля 40 сувязных брыгады дзейнічала ў Талачынскім раёне. Сярод іх М. П. Сіўцаў з вёскі Сіўцава, які ўключыўся ў барацьбу яшчэ зімой 1941—1942 гг., выконваў складаныя заданні. Вясной 1942 г. хадзіў за лінію фронту для сувязі з партыйнымі органамі. Вольга Чульц з вёскі Свіране адна з першых жанчын стала сувязной, трымала сувязь з Талачыном. У лютым — сакавіку 1942 г. па нашаму заданню звязалася ў Оршы з Максімам Хадорыкам, які працаваў у гарадской управе, наладзіла сувязь з нашай брыгадай. Са студзеня 1942 г. стала пастаянна выконваць нашы заданні К. І. Падабед, з красавіка 1942 г.— Я. В. Баркоўская.

Асабліва значную дапамогу аказвалі нам чыгуначнікі. 30 патрыётаў штодня рызыкавалі жыццём. І. П. Ганчароў працаваў майстрам

на чыгункі, перадаваў удакладненыя графікі руху паяздоў, падкладваў у кантэйнеры вугальныя міны, не адпойчы нашы партызаны перадавалі яму магнітныя міны. Дзякуючы інфармацыі чыгуначнікаў у маі 1943—чэрвені 1944 г. 1-м, 5-м, 15-м, 20-м і 31-м атрадамі на ўчастку Слаўнае — Талачын было пушчана пад адхон больш за 60 варожых эшалонаў. Асабліва спадарожнічала ўдача 20-му і 31-му атрадам, якія адначасна падарвалі 22 і 21 эшалоны.

Дзейсную дапамогу нашым партызанам аказвалі камуністы Е. А. Панчанка (пазней час працаваў дзесятнікам лясгаса), які сістэматычна паведамляў аб выхадзе карнікаў у населеныя пункты, характары і месцы работы ваеннапалонных, іх ахове, Стась Збуржыцкі, майстар Трацылаўскага лесапункта. Сястра і дачка апошняга знаходзіліся ў 31-м атрадзе нашай брыгады. Гэты надзейны сувязны праз сваіх родных перадаваў звесткі аб руху на чыгунцы праз станцыю Слаўнае. У пачатку кастрычніка 1943 г. мы даведаліся ад яго, што 8—9 кастрычніка больш за 100 ваеннапалонных прыгоняць на лесараспрацоўку. Аперацыю па вызваленню нашых ваеннапалонных даручылі 31-му атраду. Рапіцай 9 кастрычніка аперацыя была ўдала праведзена. Па сігналу Стася нашы байцы адкрылі агонь па ахове. Ваеннапалонныя таксама прыйшлі на дапамогу — яны з тапарамі накінуліся на фашыстаў. Праз 10—15 мінут ахова была перабіта. Партызаны і вызваленыя савецкія байцы прынеслі ў атрад 4 трафейныя кулямёты, 5 аўтаматаў, 9 вінтовак.

У кастрычніку дзякуючы нашым сувязным было праведзена некалькі аперацый, у выніку якіх народныя мсціўцы знішчылі 657 фашыстаў і іх памагатых. У атрад прыйшло 300 чалавек, у тым ліку 150 былых паліцаяў са зброяй.

Патрыёты дзейнічалі ўсюды. 30 верасня 1943 г. С. А. Кранёў (са студзеня 1943 г. камісар 5-га атрада) разам з сувязным з Талачына І. С. Чэпікам, які ўладкаваўся працаваць брыгадзірам у Зарэчча, спалілі вялікі зерняскладз у Зарэччы, забілі сельскагаспадарчага камендапта Шлейтара, які ў той момант знаходзіўся на зерняскладзе.

І не пералічыць усіх аперацый, што былі праведзены дзякуючы нашаму партызанскаму тылу — сувязным. Многія з іх самі ўдзельнічалі ў выкананні аперацый. Нямала іх загінула ў фашысцкіх катавальнях.

Партызанскія камандзіры

М. П. Гудкоў.

ВОРАШАНЬ Аляксей Дзям'янавіч нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Ваўкавічы Талачынскага раёна. Член КПСС з 1945 г. Скончыў сельскагаспадарчы тэхнікум (1939), ваеннае вучылішча (1941). У 1942 г. быў на Асобым Беларускім зборы, з чэрвеня 1942 камандзір партызанскага атрада «Перамога», з красавіка 1944 намеснік, в. а. камандзіра брыгады «Граза». Пасля вайны намеснік старшыні райвыканкома, ваенрук у школе, старшыня калгаса, начальнік раённага агенцтва «Саюздрук». Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі. Жыве ў Талачыне.

ГУДКОЎ Мікалай Пятровіч нарадзіўся ў 1912 г. ў г. п. Сокалава-Кундручанскі Растоўскай вобласці. Член КПСС з 1941 г. З 1938 г. на савецкай рабоце. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг., абароны Віцебска ў 1941 г., у партызанах з мая 1942 г., у 1942—1944 гг. камандзір партызанскай брыгады М. П. Гудкова Талачынскага раёна, адначасова член Талачынскага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. на савецкай рабоце ў Мінску, у 1946—1962 на шахтах у Растоўскай вобл. Узнагароджаны ордэнамі, медалямі. Жыве ў г. Навашахцінск Растоўскай вобл.

РАШЭТНІКАЎ Мікалай Арцёмавіч нарадзіўся ў 1902 г. ў в. Стары Талачын Талачынскага раёна. Член КПСС з 1926 г. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1955). З 1924 г. ў Чырвонай Арміі, у 1927—1938 гг. загадчык хаты-чытальні, сакратар парткома саўгаса, намеснік дырэктара МТС. з 1938 другі сакратар Лагойскага РК КП(б)Б, старшыня Грэскага райвыканкома, першы сакратар Мядзельскага, Вілейскага райкомаў КП(б)Б. У гады Вялікай Айчыннай вайны прадстаўнік палітупраўлення Цэнтральнага фронту. З мая 1942 г. ў партызанах, з ліпеня 1942 г. камандзір партызанскага атра-

М. А. Рашэтнікаў.

Ф. М. Сядлецкі.

да «Граза», з жніўня 1942 г. да верасня 1943 г. камандзір партызанскай брыгады «Граза», якая дзейнічала на тэрыторыі Талачынскага р-на. З верасня 1943 г. ў БШПР, з 1944 г. сакратар Глыбоцкага падпольнага райкома КП(б)Б, першы сакратар Глыбоцкага РК КП(б)Б, у 1946—1952 гг. старшыня Пліскага райвыканкома, першы сакратар РК КП(б)Б. з 1956 г. на савецкай і адміністрацыйнай рабоце ў Браслаўскім і Пліскім раёнах. З 1973 г. на пенсіі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1938—1947 гг. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, «Знак Пашаны», медалямі. Памёр у 1982 г.

СЯДЛЕЦКІ Фёдар Міхайлавіч нарадзіўся ў 1906 г. ў в. Староселле Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Член КПСС з 1929 г. З 1935 г. ў Чырвонай Арміі; з 1941 г. на фронце, з красавіка 1942 г. ў партызанах, у 1942—1943 гг. камісар партызанскай брыгады «Чэкіст», з жніўня 1943 г. камандзір атрада; загінуў у баі ў снежні 1943 г., пахаваны на радзіме, на магіле помнік. Узнагароджаны 2 ордэнамі.

Мамадалі Тапівалдыеў — беларускі партызан

Мамадалі Тапівалдыеў (партызанская мянушка Казбек) нарадзіўся 20.9.1919 г. ў кішлаку Пандыган Рыштанскага раёна Ферганскай вобласці. Герой Савецкага Саюза (1944). З сялян. Узбек. Член КПСС з 1945. З 1934 працаваў паштальёнам, трактарыстам. З 1939 г. ў Чырвонай Арміі. На фронце з 1941 г. Удзельнік партызанскага руху на тэр. Віцебскай і Магілёўскай абласцей. З ліпеня 1942 г. камандзір аддзялення разведкі 5-га атрада партызанскай брыгады «Чэкіст». У 1944 г. пры адступленні гітлераўцаў Тапівалдыеў з аддзяленнем мініраваў масты і дарогі, захапіў і абязброіў варожы гарнізон. З 1944 г. старшыня калгаса на радзіме. Памёр 7 мая 1969 г.

Мамадалі Тапівалдыеў, вадзіцель аўтамашыны 130-га артылерыйскага палка, прачнуўся на досвітку ад магутных выбухаў. У першыя хвіліны ніхто не мог зразумець, што здарылася. А праз гадзіну Мамадалі разам з таварышамі адбіваў першыя атакі нямецкіх салдат. Але сілы былі няроўныя. Артылерысты трапілі ў акружэнне. Паспрабавалі прарвацца на ўсход. 8 ліпеня Іван і Мамадалі прыйшлі ў вёску Пасарава, што ў Бялыніцкім раёне, па радзіму армейскага сябра.

— Будзеш пакуль жыць у мяне,— прапанаваў Іван.

Неўзабаве прыйшоў час жніва. Калгаспікі вырашылі хутка сабраць ураджай і раздзяліць на працадні, каб не дастаўся ворагу. Але нось бяда, у вёсцы застаўся толькі адзін трактар, ды і той няспраўны, а адрамантаваць яго няма каму. Іван ведаў, што яго сябар — майстар на ўсе рукі. Але як сказаць, што ў яго хаце хаваецца ўзбек, раптам гэта стане вядома фашыстам. І ўсё ж рызыкнулі. Мамадалі не адыходзіў ад трактара, пакуль яго не адрамантаваў. Хлеб убіралі і ноччу. Абмалацілі ўсё збожжа таксама хутка.

У канцы 1941 г. да вёскі дайшлі чуткі, што ў Рацаўскім лесе з'явіліся партызаны. Хто яны і як звязацца з імі? У снежні Мамадалі Тапівалдыеў і сем жыхароў вёскі пайшлі ў лес. У іх быў кулямёт і некалькі вінтовак. Увесну група ўлілася ў 1-ы асобны атрад Герасіма Аляксеевіча Кірпіча. Смеласцю, кемлівасцю Мамадалі адразу прыцягнуў да сябе ўвагу. Камандаванне прызначыла яго ў разведгрупу.

...Першы бой і першая ўдача — партызаны напалі на гарнізон у вёсцы Жукнева і знішчылі яго. Народным мсціўцам дасталіся багатыя трафеі. Перамога акрыліла партызан. Гэта было ў маі 1942 года. Назаўсёды запомніўся Мамадалі і дзень 28 ліпеня 1942-га. Вяртаючыся з разведкі, у вёсцы Варанцэвічы Мамадалі даведаўся, што за сувязь з партызанамі карнікі збіраюцца спаліць вёску. У бок вёскі ўжо накіраваўся карны атрад. Што рабіць? Ісці ў атрад за дапамогай было позна. І разведчык прымае смелае і рызыкоўнае рашэнне: атакаваць фашыстаў. Ён ніколі не разлучаўся з кулямётам, які зняў з падбітага танка. Разведчык заняў выгадную пазіцыю. Хутка на ўскрайку вёскі паказаліся фашысты. Тапівалдыеў адкрыў трашны агонь. Пятнаццаць мінут партызан стрымліваў роту немцаў. Неўзабаве прыйшла дапамога. Пасля бою каля вёскі засталося ляжаць 19 забітых гітлераўцаў.

Народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка і Мамадалі Тапівалдыеў у дні Дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ва Узбекістане. 1966 г.

У канцы 1942 г. камандаванне брыгады вырашыла паслаць на сувязь з Вялікай зямлёй смелага і рашучага Мамадалі Тапівалдыева. У выбары камандаванне не памылілася: Мамадалі ўдала перайшоў лінію фронту, перасек сотні прасёлачных і шашэйных дарог, перадаў БШПР у Маскве данясенне камандавання брыгады аб баявых дзеяннях партызан. Разведчыка паслалі вучыцца ў школу падрыўнікоў. Тры месяцы вучобы праляцелі хутка. І зноў беларускія лясы, родная брыгада. Мамадалі стаў самым вопытным падрыўніком у брыгадзе. Разведчыку-мінёру ўдалося пусціць пад адхон 4 эшалоны праціўніка і 14 эшалонаў разам з групай падрыўнікоў на ўчастку Орша — Слаўнае.

Адважны разведчык удзельнічаў у многіх аперацыях, і заўсёды яму спадарожнічала ўдача. Каля Талачына, напрыклад, у канцы мая 1944-га ён адзін узяў у палон 27 немцаў. У апошніх баях Мамадалі Тапівалдыеў удзельнічаў у чэрвені 1944-га. Гітлераўцы адступалі. Пеяк група партызан на чале з Мамадалі арганізавала засаду. Усё было зроблена раптоўна і нечакана. У выніку 800 немцаў з 20 падводамі са зброяй вымушаны былі здацца ў палон. Страт сярод партызан не было.

15 жніўня 1944 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Мамадалі Тапівалдыеву за мужнасць, праяўленую ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Усесаюзны староста М. І. Калінін уручыў беларускаму партызану медаль «Залатая Зорка» і ордэн Леніна.

На захадзе яшчэ грымелі жорсткія баі, а Мамадалі ехаў на радзіму. Тут ён узначаліў калгасы імя Варашылава і з 1954 «Камунізм». Мірнае жыццё... Занадта дорага яно даставалася разведчыку і яго таварышам-партызанам. А колькі марылася ў сырых халодных зямлянках аб ім, прыгожым, незвычайным пасляваенным жыцці. І Мамадалі стрымаў слова. Перад самім сабой, перад загінуўшымі братамі-беларусамі — зрабіў усё для таго, каб людзі жылі шчасліва.

Справы партызанскія

З успамінаў Ф. І. Букштынава

Фёдар Іванавіч Букштынаў нарадзіўся 5.1.1904 г. ў вёсцы Слабада Талачынскага раёна. Член КПСС з 1928 г. У 1931 г. працаваў у апараце ЦК ВКП(б), з 1935 г.— у Саўнаркоме СССР. З ліпеня 1941 г. ў народным апалчэнні, удзельнік абароны Масквы. У партызанах з чэрвеня 1942 г., у кастрычніку 1942 — сакавіку 1943 г. камісар партызанскай брыгады «Чэкіст». У чэрвені 1943 — маі 1944 г. сакратар Шклоўскага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. на савецкай і гаспадарчай рабоце. Памёр 28 лютага 1973 г.

15 чэрвеня быў першым днём майго адпачынку. Настрой быў выдатны, напярэдзе чакалі сонечныя бесклапотныя дні. На наступны дзень па пуцёўцы паехаў у Жалезнаводск. А 24 чэрвеня атрымаў тэлеграму кіраўніка спраў Саўнаркома тэрмінова вярнуцца ў Маскву. Станцыя была забіта ад'яджаючымі. У асноўным гэта былі камандзіры Чырвонай Арміі.

У Харкаве, Курску. Туле мы ўбачылі санітарныя паязды з параненымі. 26 чэрвеня я ўжо быў у Маскве. На наступны дзень прыступіў да работы. Становішча на франтах пагаршалася. Вораг ірваўся да сталіцы. У Маскве пачалі фарміраваць дывізіі народнага апалчэння. Я ўступіў у першую дывізію Ленінскага раёна Масквы. 8 ліпеня наша дывізія выступіла з горада і пешым ходам накіравалася па Варшаўскай шашы праз Нара-Фамінск, Малаяраславец, Мядынь, Юхноў, Спас-Дземенск. На прывалах нам выдавалі абмундзіраванне, зброю. Вінтовак усім не хапала. Хутка наша дывізія ўвайшла ў склад 33-й арміі рэгулярных войск Чырвонай Арміі рэзервовага фронту. Па ваеннай спецыяльнасці я пантанёр. У 1926—1927 гг. служыў у 5-м асобным понтонным батальёне. Перападрыхтоўку напярэдадні вайны праходзіў у сапёрных часцях. Таму ў дывізіі народнага апалчэння назначылі камандзірам узвода ў сапёрным батальёне. Хутка стаў сакратаром ротнай партыйнай арганізацыі.

4—5 кастрычніка нямецка-фашысцкія вой-

скі авалодалі раёнамі Спас-Дземенска, Юхнава, падышлі да нас з поўдня. Акружаныя савецкія войскі цэлы тыдзень адбівалі варожыя атакі. Але прарваць акружэнне не ўдалося. У час гэтых баёў я быў цяжка кантужаны, абвастрылася язва страўніка. Я ляжаў у вёсцы Усходы Калужскай вобласці, быў арыштаваны палявой жандармерыяй. Адправілі ў лагер ваеннапалонных у г. Рослаўль, потым у Крычаў і 23 лістапада ў Магілёў. Тут я прабыў 11 дзён, мне ўдалося уцячы. А 12 снежня 1941 г. я быў у роднай вёсцы Слабада, дзе жылі маці з сястрой. Хутка мне стала вядома, што ў суседніх вёсках Лагаўшчына, Любанічы, Башарова, Варандэвічы жывуць чырвонаармейцы, якія трапілі ў акружэнне.

28 сакавіка 1942 г. выпадкова сустрэўся ў лесе з дэсантнікам Віктарам Чысцяковым, які разам з Уладзімірам Рабініным восенню 1941 г. быў закінуты ў Круглянскі раён. Праз некаторы час устанавіў сувязь з ваеннаслужачым Аляксандрам Сімдзянкіным, што жыў у Лагаўшчыне. У сакавіку 1942 г. ён арганізаваў партызанскую групу. Мы з малодшым братам Паўлам здабылі 2 вінтоўкі, 500 патронаў і ў сярэдзіне чэрвеня былі залічаны ў партызанскі атрад Сімдзянкіна, які ўваходзіў у брыгаду «Чэкіст». Мяне прызначылі камандзірам аддзялення. У жніўні 1942 г. пасля гібелі камісара нашага атрада Самуіла Елькановіча мяне прызначаюць камісарам атрада.

Брыгада дыслацыравалася ў Рацаўскім лесе — на мяжы Талачынскага, Шклоўскага і Круглянскага раёнаў. Брыгада хутка расла. Востра паўстала пытанне з харчаваннем. У адну з начэй партызаны адбілі млын у вёсцы Зайкоўшчына. Назначылі ім загадваць Мікалая Конанавіча Апанасенку. Млын працаваў пад аховай партызан. Жыхары навакольных вёсак прывозілі малоць збожжа, а за памол у тым жа памеры, што і да вайны, сяляне аддавалі пэўную колькасць збожжа. З яго і пяклі хлеб партызанам. У раёне акупанты арганізавалі прыёмныя пункты пры камендатурах, куды па загаду нямецкіх улад насельніцтва павінна было прыносіць прадукты харчавання. Мы вялі растлумачальную работу сярод мясцовых жыхароў, заклікалі іх не здаваць прадукты. На дарогах, якія вялі да гэтых пунктаў, збіралі людзей, гутарылі з імі. Помню такую сустрэчу каля вёскі Рэчкі. Сабралася каля двухсот чалавек. Я расказаў аб становішчы на фронце. Амаль у кожнага з прысутных быў хто ў Чырвонай Арміі, хто ў партызанах.

— Давайце разам змагацца з немцамі, толькі тады зможам хутчэй прагнаць іх з нашай зямлі,— закончыў я.

— Даражэнькія, забярыце ў нас усё, каб гэтым вылюдкам нічога не дасталося,— прасіла адна старая жанчына.

К восені 1942 года многія варожыя гарнізоны ў Талачынскім, Шклоўскім, Круглянскім раёнах былі разгромлены. Невялікімі астраўкамі заставаліся гарнізоны ў раённых цэнтрах. У гэты час нямецкае камандаванне арганізавала супраць партызан амаль усіх абласцей рэспублікі карныя экспедыцыі з прымяненнем авіяцыі, артылерыі. Весці працяглыя баі з рэгулярнымі часцямі ворага брыгада яшчэ не магла — недастаткова было зброі. Камандаванне брыгады вырашыла манеўраваць — перайсці чыгунку і аўтамагістраль Мінск — Масква. Падзяліліся на дзве групы. Атрады пад камандаваннем А. С. Нікітчанкі, Б. М. Клюшнікава, І. М. Суворава пераходзілі чыгунку і шашу на ўсход ад Коханава, а атрады Р. С. Іванова, А. Ф. Сімдзянкіна, А. І. Шамарына і П. І. Маркава — на захад ад Коханава. Першай групе атрадаў не ўдалося здзейсніць пераход, і яны падаліся на захад у Крупскія лясы. Другая група атрадаў на чале з камандзірам брыгады Кірпічам паспяхова перайшла чыгунку і шашу, узяла кірунак у паўночна-заходнім напрамку ад Талачына.

Карнікі, прачасаўшы Рацаўскі лес, партызан не знайшлі, тады спалілі вёскі Слабаду, Хацькава, забілі пяць дзяўчат з Рацава.

11 кастрычніка брыгада дасягнула Лепельскага раёна і размясцілася каля вёскі Стайск. Вырашана было за лінію фронту пасласць групу партызан на чале з камісарам брыгады Ф. М. Сядлецкім. Камісарам брыгады прызначылі мяне. Набліжалася зіма. Атрады прыступілі да будаўніцтва ўцепленых зямлянак. Неабходна было таксама стварыць пэўны запас прадуктаў, забяспечыць людзей цёплым адзеннем. Без дапамогі і падтрымкі насельніцтва вёсак Валеўшчына, Гадзіўля, Стайск і іншых мы, безумоўна, гэтыя пытанні вырашыць не змаглі б.

Напярэдадні 25-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі атрады спаборнічалі паміж сабой за дастойную сустрэчу свята. Атрадамі Сімдзянкіна і Іванова быў разгромлены гарнізон праціўніка ў вёсцы Рудня, атрадам Сімдзянкіна — гарнізон у Вялікіх Хальнічах.

Наогул, савецкія людзі, апынуўшыся ў тыле ворага, адзначалі ўсе рэвалюцыйныя святы. Ужо ў 1942 г. да першамайскага свята быў разбіты гарнізон у Жукневе. Напярэдадні 26-й гадавіны Вялікага Кастрычніка начальнік штаба Р. М. Севасцьянаў сумесна з камандзірам 1-га атрада Р. С. Івановым і 5-га атрада А. Ф. Сімдзянкіным распрацавалі план разгрому гарнізона ў вёсцы Прыгань. Аперацыя была праведзена бліскуча. Скрытых падходаў

Ф. І. Букштынаў.

Ф. П. Ігнатовіч.

да вёскі не было, таму нечакана напасці на гарнізон і выбіць немцаў было немагчыма. Днём пад выглядам папаўнення ў гарнізон прыбылі пераапранутыя ў нямецкую форму байцы атрадаў Сімдзянкіна і Іванова. Дзёрзкасць і смеласць нашых таварышаў абумовілі поспех гэтай аперацыі — за лічаныя мінуты быў знішчаны гарнізон, у якім знаходзілася 95 нямецкіх салдат і паліцаяў.

З надыходам вясны 1943 г., пасля паражэння нямецкіх войск пад Сталінградам, пачаўся масавы прыток насельніцтва ў партызаны. Мы не маглі забяспечыць усіх зброяй. Вырашылі паслаць шыфравальную радыёграму тав. Сталіну з просьбай аказаць дапамогу зброяй. Хутка атрымалі адказ з БШПР: «Узбройвацца трэба за кошт ворага». Сталі шукаць выйсце. Камісар 1-га асобнага атрада Пётр Ігнатавіч Счаслаўскі, інжынер па адукацыі, вырашыў арганізаваць майстэрню па вырабу і рамонту зброі. Ад насельніцтва мы даведаліся, што каля вёсак Троўнікі і Дражна спалены склад з авіякулямётамі. Група партызан прынесла шэсць абгарэлых кулямётаў. У навакольных вёсках сабралі ціскі, напільнікі, пажоўкі. З мясцовага насельніцтва былі падабраны добрыя майстры — Аляксандр Сямёнавіч Азаронак, Аляксандр Пракопавіч Азаронак, Іван Дзямко, Іван Жарнасек, Іван Гадуноў. Загадваў майстэрняй Леанід Мікалаеў, былы механік фабрыкі «Саюздзетфільм». Зброевая майстэрня працавала да самага вызвалення і аказвала партызанам вялікую дапамогу.

Прымаючы па рацыі зводкі Саўінфармбюро, камісары, палітработнікі, сакратары партарганізацый шмат часу затрачвалі на размнажэнне вестак з фронту. Востра паўстала патрэба ў друкарні. Хутка Рыгор Мікалаевіч Севасцьянаў устанавіў сувязь з камсамольцамі з Лепеля, якія ў сакавіку 1943 г. дасталі друкарскі шрыфт.

У красавіку мы атрымалі загад БШПР вярнуцца ў раён ранейшай дыслакацыі. Праз двое сутак брыгада паспяхова перайшла аўтамагістраль і чыгунку на ўсход ад Талачына ў раёне Шабалінскага лесу, атрады зноў занялі ўсходнюю частку Талачынскага, заходнюю Шклоўскага і паўднёвую частку Круглянскага раёнаў. На другі дзень быў разгромлены варожы гарнізон у вёсцы Елькаўшчына.

У пачатку чэрвеня 1943 г. ў брыгаду прыбылі член Магілёўскага падпольнага абкома партыі М. І. Кудзін і начальнік штаба ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б С. Г. Сідарэнка-Салдаценка. Быў арганізаваны Шклоўскі падпольны райком партыі, у склад якога ўвайшлі Г. А. Кірпіч, І. С. Шчарбакоў, Ф. Ц. Сіялка, сакратар падпольнага райкома камсамола Міцін. Першым сакратаром Шклоўскага райкома партыі выбралі мяне. Падпольны райком узначаліў палітычную работу сярод насельніцтва. Выключнае значэнне ў рабоце райкома мы надавалі выпуску сваёй газеты. Нам пашчасціла, што сярод партызан знайшоўся кваліфікаваны наборшчык Павел Ільіч Кальчанка. Дзякуючы яго намаганням газета «За Родину» выходзіла рэгулярна. Цяжкасці былі з папярай: газету друкавалі на шпалерах, зводкі Саўінфармбюро на лістах са школьных сшыткаў. Насельніцтва з вялікай цікавасцю і даверам адносілася да друкаванага слова.

Поспехі партызан былі абумоўлены галоўным чынам падтрымкай і дапамогай насельніцтва. Вораг разумеў гэта і прадпрымаў спробы пасварыць насельніцтва з намі, пасеяць недавер і варожасць. Пад выглядам партызан у вёскі засылалі пераапранутых паліцэйскіх. Яны рабавалі людзей, а калі ўдавалася выявіць партызанскія сем'і або жыхароў, звязаных з партызанамі, расстрэльвалі. Помню, у асобны партызанскі атрад № 5 быў прыняты былы паліцэйскі Асокін. У час нясення каравульнай службы ноччу ён пакінуў свой пост, разламаў чужыя вуллі і забраў мёд. Раней я атрымаў скаргу ад свяшчэнніка адной царквы. Ён прасіў прыняць меры да «партызан» (так называлі сябе невядомыя), якія ў час богаслужэння забралі ў прысутных усе прадукты. Пэўны час мы не маглі знайсці вінаватага. І ўсё ж трапілі на след былога паліцэйскага. На допыце ён прызнаўся ва ўсіх сваіх «подзвігах». Перад строем я расказаў пра дзеянні гэтага лжэпартызана. Паводле агульнага рашэння адрадніка і правакатара расстралялі. Камандаванне брыгады вяло рашучую і бязлітасную барацьбу з праявамі марадзёрства асобных «партызан». Толькі сумленныя разумныя адносіны да насельніцтва маглі стварыць абстаноўку ўзаемаразумення і ўзаемадапамогі.

Насустрач сонцу

З успамінаў Ф. П. Ігнатовіча

Фёдар Пятровіч Ігнатовіч нарадзіўся ў 1910 г. ў в. Анэліна Талачынскага раёна. Член КПСС з 1939 г. З 1928 г. працаваў рабочым на прадпрыемствах Масквы. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. У першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны на Заходнім фронце, палітрук. Трапіўшы ў акружэнне, прабраўся на радзіму, у в. Анэліна. З чэрвеня 1942 г. ў партызанах. З лютага 1943 г. камісар партызанскага атрада, а чэрвеня 1943 г. да чэрвеня 1944 г. камісар партызанскай брыгады М. П. Гудкова. У пасляваенны час на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Талачынскім раёне. У сваіх успамінах, надрукаваных у кнізе «У лясах Беларусі» (1977), Ф. П. Ігнатовіч рассказвае пра нямецкага антыфашыста Франца Пітча. Лёс звёў іх у адзін з ліпеньскіх дзён 1943 г. ў вёсцы Вугалеўшчына, што непадалёку ад Талачына. Камісар разам са сваім ардынарцам І. Зелютковым прыехалі сюды, каб паведаміць насельніцтву радасную навіну аб разгроме гітлераўцаў пад Арлом і Белгарадам. Ф. Пітч не ў першы раз наведваўся ў вёску, усё дапытваўся, як знайсці партызан. І вось іх сустрэча адбылася.

Мы обыскали немца, отобрали у него оружие, разрешили сесть за стол. «Язык» оказался весьма разговорчивым, но понять его было очень трудно. С грехом пополам удалось выяснить, что он немецкий коммунист Франц Питч. Призван в армию во время одной из последних мобилизаций. Служит техником на винном заводе в Озерцах и давно пытается установить связь с партизанами. Просит взять его с собой.

— Ну что скажешь на это? — спрашиваю у ординарца.

— А что тут говорить? Все они коммунистами себя называют, когда в руки к нам попадают. Приведешь в лагерь, а через день-другой и след простынет. И жди потом беды. Не раз уже такое случалось.

— Ну, если ты такой бдительный, тогда и охраняй его, а я пока с народом поговорю.

У дома уже толпились женщины, старики, дети. Я стал рассказывать людям о битве под Орлом, о нашей победе на Курской дуге. Ваня не усидел в избе и тоже вместе с немцем вышел во двор.

— Вот и на нашей улице наступает праздник,— заканчивал я свое выступление.— И уже недалек день, когда будет освобождена вся советская земля.

Многие женщины плакали от радости. Франц видел это. Вдруг он вскинул над головой сжатый кулак и громко крикнул:

— Рот фронт! Гут, комиссар!

Как он узнал, что я действительно комиссар, ума не приложу. Знаков различия на мне никаких не было и слова, которые я говорил жителям деревни, были самыми простыми, их мог произнести любой партизан.

Решительный и взволнованный вид Франца обратил на себя внимание местных жителей. Все повернулись к нему.

— Их виль аух ширехен,— подался вперед Франц.

У меня было хорошее настроение и я махнул рукой:

— Давай, Франц, говори!

Франц стал рядом со мной, снял фуражку, провел ладонью по начинающей лысеть голове, чуть приподнялся на носках и как-то очень медленно и плавно протягивая вперед обе руки, тихо, почти шепотом произнес:

— Товарищи!..

Многое из того, что он говорил, понять было трудно: исковерканные русские слова самым необычным образом перемешивались с немецкими. Франц волновался, часто сбивался, но закончил свою речь отчетливо:

— Фашизм капут!

В партизанский лагерь мы возвращались уже втроем.

— Так, так,— хитровато улыбнулся командир бригады, когда я рассказал ему о своем «рейде» по окрестным селам.— Соратника или, точнее, сооратора, говоришь, привел? И что же теперь с ним будешь делать? За ручку водить по партизанским тропкам, а на ночь к себе привязывать. Как узнаешь, что у него на уме?

Вопросы были резонные. Но даже первое знакомство с Францем у меня почему-то вызывало к нему симпатию.

— Поверить трудно, а проверить можно и нужно,— настаивал я, подчеркивая, что в случае удачного исхода мы будем иметь не только хорошего помощника в своей борьбе с оккупантами, но и получим немалый политический выигрыш.

В конце концов командир бригады согласился со мной.

Решили направить Франца в отряд № 5, которым командовал комсомолец Николай Агапоненко — человек большой храбрости и сердечной доброты. Отряд этот был небольшой, всего человек двадцать, но ребята там были как на подбор,— молодые да удалые. Чаще всего им приходилось вести разведку...

Партизаны встретили Франца с некоторой настороженностью, хотя он был направлен туда руководством бригады. Оружие ему пока не дали, определив рабочим на кухне. Франц охотно помогал девушкам-партизанкам, сестрам Нине и Ольге, готовить пищу, накрывать стол, наводить порядок в партизанской столовой, и делал все это с завидной

аккуратностью и проворством. Все обратили внимание также на то, что Франц неизменно был подтянут, опрятно одет, чисто побрит...

Франц не любил сидеть без дела и нередко сам находил себе работу: одному обувь починит, другому поможет коня почистить. И постепенно таял у партизан холодок отчужденности к Францу. Но настоящим уважением и доверием бойцы отряда прониклись к нему после одного случая...

Отряду Николая Агапоненко предстояло занять деревню Лозы. Там же предполагалось разместить и штаб бригады. Но не успел отряд пройти и половины пути, как высланные вперед конные разведчики сообщили, что навстречу движется колонна противника с двумя бронетранспортерами. Поднявшись на высотку, партизаны и сами увидели эту колонну...

По команде Агапоненко отряд развернулся, приготовился к бою. Колонна все ближе, ближе. Партизаны замерли в ожидании жестокой схватки с врагом. В отряде имелась 45-миллиметровая пушка, когда-то снятая с нашего танка. Теперь она была на самодельном лафете и деревянном ходу. Вероятность попадания в цель из нее была очень малой, так как у пушки отсутствовал прицел. И возили ее с собой так, на всякий случай: мол, если не убьем, так напугаем. Но на этот раз о ней почему-то все забыли. Может быть, потому, что у каждого был автомат или пулемет да пара гранат вдобавок. А у Франца в руках никакого оружия. И тогда он, не раздумывая, подскочил к пушке, отцепил ее от передка, развернул в сторону немецкой колонны и, тщательно прицелившись через канал ствола, выстрелил. Снаряд был бронебойным.

Попал он в бронетранспортер или нет, трудно было определить, но все видели, как после выстрела Франца машины развернулись и колонна, не приняв боя, отступила в сторону Волосова.

Партизаны бросились поздравлять Франца.

— Молодец, Франц! Один с целой фашистской колонной сладил.

А Франц стоял у пушки, счастливый и немного растерянный. Командир вручил ему автомат ППШ и сказал:

— Воюй, партизан!

Автомат был старенький, видавший виды, но Франц очень обрадовался: наконец-то русские доверили ему свое оружие!..

Мы стали привлекать его к агитационной работе среди войск противника. Франц сам писал листовки на родном языке, а мы различными способами доставляли их в неприятельские гарнизоны тем немцам, которых лично знал Франц...

Наши подрывники все чаще выходили на «железку». Франц с восхищением слушал их рассказы, если операция проходила успешно. И сам не раз просился пойти вместе с ними. Но командир отряда все откладывал. Не потому, что не доверял ему, а просто жалел: как-никак человеку за пятый десяток перевалило, да и здоровьем он похвастаться не мог. Где же ему угнаться за молодыми? А главное, нам очень хотелось во что бы то ни стало сохранить жизнь Франца. Ведь немецких коммунистов в наших партизанских отрядах тогда было очень мало. А мы нисколько не сомневались, что после нашей победы возникнет новая Германия, в которой такие люди, как Франц, будут очень нужны...

После настойчивых просьб Франца командир отряда все-таки согласился включить его в группу подрывников-диверсантов... И вот наступил день, когда нашему другу-антифашисту доверили самому взорвать железнодорожный путь. Это было накануне 26-й годовщины Октября.

К железной дороге отправились вчетвером: Палаш, Заикин, Карасев и Питч. Долго шли лесом. С низкого серого неба сеялась, медленно оседая, мелкая, как туман, влага. Набрякла одежда, зябли руки, а подрывники радовались: хорошая сегодня будет ночь.

К месту диверсии добрались, когда уже совсем стемнело. На этот раз у подрывников имелись всего одна противотанковая мина и головая шашка. И заложить их предстояло Францу.

— Только не спеши,— наставлял Франца старший группы.— Главное в нашем деле — хладнокровие, осторожность.

По скользкой траве ползли вначале вчетвером, а потом стал приближаться к полотну один Франц. Медленно, с остановками. Он берег силы. И вот уже невысокая насыпь. Взгляд вправо, влево. Никого. Рывок на полотно. Сырой, жесткий щебень кажется сегодня каким-то особенно острым и жгучим. Немеют пальцы. Франц согревает их своим дыханием и снова разгребает ямку. Осторожно опускает в нее мину. Теперь надо вставить в головую шашку капсюль-детонатор. А вдали уже замаячил фонарь патруля. Он все ближе, ближе. Пальцы словно одеревенели, никак не нащупают отверстие для запала. Фонарь высвечивает полы шинели патруля. Капсюль скользит из стороны в сторону по головой шашке. Патруль уже в нескольких метрах. Он заслонил рукавом лицо от встречного ветра.

Это было безрассудно, но Франц приподнял головую шашку. Она глянцевито блеснула в лучах фонарика. Запал плотно осел в круглое отверстие. Патруль прошел почти рядом.

Свое тело казалось Францу чужим, жили только руки. Патруль удалялся. Только бы не обернулся!

Надежно закреплена головая шашка. Тело медленно скользит по откосу насыпи. Пальцы перебирают льняной шнур. Он не очень длинный. А надо еще дать слабину. Все. Конец шнура крепко зажат в руке. Теперь молчи и жди. Снова проходит мимо патруль. Франц уткнулся лицом в мокрый песок. Холодные капли скатываются по лицу. Неприятная сухость во рту. Чуткий слух улавливает отдаленный глухой шум. Он все нарастает, дробится ритмичным перестуком колес. И вот уже желтые лучи прожектора скользят по спине Франца. Паровоз проскочил мину. Она не сработала. Ознобом сковало тело. Франц вначале легонько, а потом сильней потянул за шнур. Сжал плечи, зажмурился...

Товарищи видели, как на дороге полыхнуло пламя. Оглушительный взрыв оборвал гудок паровоза. Дыбились, налезали друг на друга, сваливались под откос вагоны в том месте, где лежал Франц. Подрывники бросились туда. А навстречу им, пошатываясь из стороны в сторону, размахивая автоматом, бежал Франц. Они подхватили его под руки...

Франца очень уважали и любили не только партизаны пятого отряда, где он постоянно находился, но и всей бригады. Знали его и во многих населенных пунктах нашей зоны. Он часто выступал на митингах, разоблачая звериное лицо фашизма, призывая население вести непримиримую борьбу против оккупантов. Многие удивлялись: как это так, немец, а стал партизаном и хорошо воюет с гитлеровцами?

Если нам случалось жить в деревнях, Франц всегда помогал хозяевам. То дров нарубит, то забор починит, то обувь отремонтирует. Была у него и еще одна, как у нас говорили, смежная специальность. В годы войны трудно было с медикаментами. А Франц хорошо знал лекарственные травы. Если случалось застать в каком-нибудь доме больного, он поинтересуется, что за недомогание, достанет из котомки градусник, измерит температуру, осмотрит больного, принесет всегда имевшиеся у него в запасе порошки или таблетки, приготовит по своему способу из лекарственных трав микстуру. Если видит, что больной сомневается, вначале сам попробует или даст кому-нибудь из товарищей. Дескать, ничего страшного нет, посоветует больному применить какой-нибудь домашний способ лечения. Многие поправлялись. Одна из наших связных, Антонина Ивановна Ерома, проживающая ныне в Толочине, до сих пор вспоминает Франца, считая, что именно его лекарства помогли ей тогда подняться на ноги.

Еще в первые дни пребывания Франца в отряде мы предложили ему сменить свое обмундирование на партизанскую одежду. Но Франц отказался. «Я,— говорит,— немец и буду носить военную форму. Пусть все видят и знают, что и немецкие солдаты борются против фашизма». Так и остался в своем мундире...

Против ожидания весна 1944 года принесла нам не облегчение, а неисчислимые беды. Гитлеровцы, чувствуя приближение фронта, решили обезопасить свои тылы. Они повели наступление на партизанский край. Бросили против нас большие силы с танками, артиллерией, самолетами. Начались трудные дни блокады.

С тяжелыми боями отступали мы в лепельские леса и болота...

Командование бригады решило попытаться выйти из окружения через большак Лепель — Борисов. Отряд Николая Агапоненко одним из первых должен был нанести удар на центральном участке прорыва. Трагической оказалась судьба этого отряда. Бойцы наткнулись на минное поле и попали под перекрестный, многослойный огонь противника. Многие погибли. Разрывом снаряда был убит командир отряда. Тяжело ранен начальник штаба. Франц, сам контуженный, вынес его из опасного места. Раненых разместили в партизанском госпитале. Расположен он был на небольшом островке среди топкого болота, окруженного лесной чащей. Мы считали, что гитлеровцы туда не доберутся. Но на другой день ко мне прибежала запыхавшаяся, вся измазанная болотной жижей сестра Нина Петровна. Она ухаживала за больными в госпитале.

— Беда, Федор,— вздрагивая от рыданий, глотая слова, заговорила она.— Фашисты ворвались на остров. Убивают раненых и топят в болоте. А Франца связали. Он отстреливался, но его поймали...

— Много их?

— Человек сорок или пятьдесят.

Я в то время оставался за командира бригады. Мгновенно пришло решение: перехватить карателей. Вместе с начальником штаба бригады Ф. Я. Румским прикинули: до госпиталя — пять или шесть километров. Там у нас, кроме раненых, был и гужевой транспорт, семь-восемь лошадей, несколько коров и неприкосновенный запас продуктов, заготовленных еще зимой. Гитлеровцы, конечно, не премину воспользоваться всем этим. Пока будут запрягать лошадей, грузить продукты, ловить и привязывать к повозкам коров, пройдет какое-то время. Возможно, успеем.

Осуществление этой операции поручили командиру первого отряда Андрею Цымбалу.

Нужно было подобрать полсотни автоматчиков. Но кого взять? Все до предела измучены, еле на ногах держатся. Я обратился к бойцам бригады:

— Товарищи в беде. Нужно выручать... Кто желает...

Изъявили желание все. Цымбал отобрал наиболее выносливых. И едва отряд разместился в засаде, залег в болоте у дороги, как послышался скрип телег и неясный немецкий говор. Схватка была недолгой, но жестокой. На узкой лесной дороге осталось около сорока трупов гитлеровцев. Освобождены несколько наших раненых товарищей из госпиталя. Но Франца среди них не было. Оказывается, его вместе с несколькими медицинскими сестрами гитлеровцы уже отправили в Лепель.

О том, что произошло с Францем, я узнал уже после того, как наша бригада соединилась с частями Красной Армии, от одной девушки, медицинской сестры. Приведя в Лепель захваченных в госпитале, гитлеровцы посадили всех в общую тюремную камеру. Во время допросов сильно били. Особенно жестоко истязали Франца. Но пытки не сломили его боевого духа. Будучи не в силах подняться с нар от побоев, он уговаривал находившихся с ним медицинских сестер:

— Крепко держитесь, девушки!

В Лепеле уже были слышны могучие голоса «катюш». Но Францу не довелось встретить радостный день освобождения Белоруссии. Его и еще одиннадцать партизан фашисты повесили во дворе тюрьмы за день до прихода советских войск.

Так погиб стойкий немецкий коммунист, наш боевой друг Франц Питч, твердо веривший, что и над его родиной взойдет солнце свободы.

Друкуецца з скарачэннямі па кн.: В лесах Белоруссии. Мн., 1977. С. 297—312.

Былінскія. Успаміны праз сорак гадоў

Слова пра бацьку

Гэта была самая вялікая сям'я ў Замосці. Сцяпан Канстанцінавіч і Алена Дзмітрыеўна Былінскія мелі восем дачок і аднаго сына. Радасць у той нялёгкі час прыносіла нараджэнне сыноў, бо з імі звязвалі дапамогу і папаўненне рабочай сілы ў сям'і. Сцяпан Канстанцінавіч, чалавек хоць і строгі, але не без гумару, не журыўся, што ў хаце «бабскае царства», а можа проста ўмеў «знайсціся» на людзях. І калі суседзі пачыналі адзін перад адным выхваляцца ўвішнасцю сваіх сыноў, Былінскі весела зазначаў: «А ў мяне — дзве кадрылі і музыкант!» І ўсе адабральна смяяліся. У вёсцы прыхільна ставіліся да гэтай вялікай сям'і, працавітай, добразычлівай і гасціннай. У іх заўсёды ўсім хапала месца. Калі паўстала пытанне, у каго размясціць школу, Сцяпан Канстанцінавіч адразу прапанаваў сваю хату, адвёўшы для гэтага лепшую палавіну дома. Самі ж, адзінацпаць чалавек, жылі ў «пярэдняй», і ўсім было добра. У 1921 годзе, калі з Паволжа людзі беглі ратавацца ад голаду, шмат сем'яў было і ў Замосці. Былінскі пават і не заікнуўся, што ў саміх няма чаго есці — хлеба хапіла толькі да новага году, карову вясной паднімалі на вяроўках. Карміў, як усе,— па чарзе.

У 1926 годзе старэйшыя з дзяцей Васіль і Ганна сталі камсамольцамі. Для Сцяпана Канстанцінавіча гэта было неабвержным аргументам, каб зняць абразы ў хаце (у бога ніколі не верыў, але ўступаў маці і да пары да часу маўчаў). У сакавіку 1929 г. ў Зарэччы арганізаваўся калгас. Былінскі з усёй сям'ёй пераехаў у Зарэчча. Сцяпана Канстанцінавіча, сумленнага і справядлівага, сяляне выбралі брыгадзірам. Захапіўся пчалярствам і жывёлагадоўляй, стаў выпісваць шмат спецыяльнай літаратуры. Каб паглыбіць свае веды, скончыў курсы пчаловодаў. Сам казаў, што пайшоў не ў свайго бацьку, вядомага ў акрузе будаўніка, рукамі якога было пабудавана шмат хат і будынкаў, школа ў Коханаве (у 1967 годзе адзначылі яе стагоддзе).

Такім няўрымслівым застаўся Сцяпан Канстанцінавіч на ўсё жыццё. Пасля вайны зусім хворы, цудам выратаваны ў блакадзе вясной 1944 г., па-ранейшаму кожны дзень хадзіў у калгас. Не прапускаў ні адной парады, ні аднаго камсамольскага сходу. Па-ранейшаму да яго ішлі людзі за парадай. І не было выпадку, каб каму-небудзь адмовіў стары калгаснік. Бывала і такое: прыедуць за дзедам Былінскім на санках, каб не турбаваць пажылога чалавека хадой па заснежаных вясковых вуліцах, і вязуць да свайго двара. Бо лепшага «спеца» ў час ацёлу жывёлы ў вёсцы не было.

У 75-гадовым узросце, за некалькі месяцаў да канца жыцця, атрымаў атэстат аб заканчэнні трохгадовых агратэхнічных курсаў. Сцяпану Канстанцінавічу было прысвоена званне «Майстар сельскай гаспадаркі 2-га разраду па паляводству». Дастойнымі свайго бацькі — гэтага незвычайнага чалавека — аказаліся і яго дзеці (тыя самыя «дзве кад-

рылі і музыкант») — Ганна, Клава, Ніна, Зіна, Антаніна, сын Васіль, як скорагаворкай пералічала іх маці, малодшыя Оля, Вера, Надзя. У гроѣпы ваенны час старэйшыя і самыя малодшыя сталі на абарону сваей родпай зямлі. Разам з бацькамі ў лес пайшлі сем дачок (адна з іх, Антаніна, ішла з дзецьмі — трохгадовым Толем і сямігадовай Алісай). Не было з імі толькі Ніны, якая з Ленінграда эвакуіравалася па ўсход. Адзіны сын Васіль, кадравы ваенны, змагаўся на фронце.

Партызаны Былінскія

Былі сярод Былінскіх-партызан разведчыца, фельчар, санітаркі, пральі, пекары, повары. Радавыя працаўнікі партызанскай вайны... Іх міласэрнасць і нялёгкая праца ва ўмовах лясного жыцця сагравалі, дапамагалі вытрымаць усе нягоды.

З успамінаў Ганны Сцяпанаўны Былінскай (Гаўрыленка), партызанкі атрада імя Аляксандра Неўскага партызанскай брыгады «Граза»

Першы дзень вайны... Усе пачалі збірацца пад дах роднай хаты. Прыехала са Смаленска Оля, студэнтка 2-га курса стаматалагічнага інстытута, Тоня з дзецьмі, Клава, Зіна з Талачына, я з Мінска. Сабраліся ўсе. Не было толькі Ніны і Васіля. «Наш штаб»,— так звалі мы бацькоўскую хату. Тады не маглі і ўявіць, што менавіта тут, у родным куце давядзецца прайсці праз неймаверныя пяжкасці, зведаць спаўна доўгія блакадныя дні вясны 1944 г., усё ліхалецце вайны.

Спачатку працавалі ў калгасе. Акупантам выгадна было, што захопленыя землі апрацоўвае бясплатная рабочая сіла, і калгасы не распускалі. З лета 1941 г. па 1943 г., пакуль не пайшлі ў партызаны, ніхто за працу нічога не атрымліваў. Тым і жылі, што ў час работы ўдавалася схаваць што-небудзь у кішэню. Сельскагаспадарчы камендант Плейтар папярэдзіў нас, што калі заўважыць у каго-небудзь узятае з поля — прыб'е да паўсмерці. Ніколі не забуду 12-гадовую Лізу Цяцеркіну, якую жорстка збілі за знойдзены ў кішэні ці то гарох, ці то моркву. Плейтар наехаў на дзяўчыну верхам на кані. Ліза месяц не магла размаўляць. Засталася калекай на ўсё жыццё. Але голад быў мацней за страх.

У вёсны было шмат патрыётаў. Ужо ў канцы жніўня 1941 г. да нас першы раз прыйшлі сувязныя Тамара Паўлаўна Бірукова, а з ёй яшчэ двое — адзін быў з Навасёлак, да вайны працаваў у Мінску ў НКУС і добра ведаў Зіну, другі быў у форме паліцэйскага. Яны шукалі сувязі з надзейнымі людзьмі. Тамара Паўлаўна з тае пары стала частым госцем у нас. Звычайна прыносіла лістоўкі, зашытыя ў плечуках. Разносілі іх усе — Надзя, Вера, Оля брала іх з сабой у поле і чытала там жанчынам. Мы жылі метраў за трыста ад чыгункі, аўтастрада Мінск — Масква таксама праходзіла недалёка. Звесткі аб руху варожага транс-

Сям'я Былінскіх.

парту і эшалонаў збірала Зіна і перадавала партызанам праз сувязных.

У канцы лета 1943 года перакладчык з гарнізона, серб па нацыянальнасці, папярэдзіў: «Былінскіх хутка будуць брань, уцякайце». Але лёгка сказаць — уцякайце. Сям'я вялікая, адзінаццаць чалавек і ў Тоні яшчэ двое зусім малых дзяцей. Амаль цэлы атрад, і ўсе — жанчыны. І ўсё ж восенню бацькі, узяўшы з сабою Тоню з дзецьмі, мяне, Надзю, над выглядам перасяду на новае месца жыхарства пакінулі вёску. Дома засталіся толькі Вера, Зіна, Клава і Оля. А праз некаторы час адбылася падзея, пасля якой дома заставацца было смяртэльна небяспечна. 30 верасня Ваня Чэпік, брыгадзір, звязаны з партызанамі, разам з Кранёвым забілі Плейтара і спалілі зерпесклад. Зіна загадала: «Зараз жа ў лес». І вельмі добра, што хутка з'ехалі з вёскі,— на наступны дзень наляцела жандармерыя з Талачына, пачалі хапаць людзей, каго адразу ў Германію, каго ў талачынскую турму. Фашысты ператрэслі ўвесь наш дом, узялі падлогу, шукаючы доказаў нашай сувязі з партызанамі.

Усе мы трапілі ў брыгаду «Граза», за выключэннем Клавы, якая была ў гудкоўцаў. Зіна стала разведчыцай партызанскага атрада імя Гастэлы, узяла да сябе малодшую Веру. Оля засталася ў атрадзе «За Радзіму», была байцом і фельчарам атрада. Бацькоў і Тоню з дзецьмі накіравалі ў гаспадарчы атрад, які знаходзіўся каля хутара Нешкава Лепельскага раёна. Я стала байцом і пекарам аддзялення аховы базы атрада імя Аляксандра Неўскага. Надзю замацавалі поварам на базе атрада імя Катоўскага. Знаходзіліся мы недалёка адзін ад аднаго. Побач размяшчаліся базы лявонаўцаў, гудкоўцаў, дзьячкоўцаў.

У нашым атрадзе было пяць чалавек. Па чарзе ахоўвалі прыпасы, даглядалі жывёлу, пяклі хлеб. Хлебам забяспечваць даводзілася ўсіх — толькі на нашай базе была «пякарня»: укапаная ў зямлю бочка з-пад бензіну служыла нам печчу. Прыносілі муку і лявонаўцы, і гудкоўцы, і нават з 1-й Смаленскай брыгады. Усім патрэбны быў хлеб, таму ні з часам, ні са здароўем не лічылася. Рукі да гэтага ў апаленых метках. «Быць табе, цётка Аня, пасля вайны абавязкова дырэктарам хлебазавода»,— гаварыў мне масквіч Алёша з нашага атрада. Я толькі смяялася з яго прароцтва. Бо да вайны захапляласа жывапісам, маляваннем, цікавілася мастацтвам, незвычайны свет якога дапамог занава адкрыць і зразумець муж, мастак П. Н. Гаўрыленка. Да вайны ўдзельнічала ў гарадскіх і рэспубліканскіх выстаўках самадзейных мастакоў. Цягнулася рука да алоўка і тут, у лесе. Было гэта ўсё так недарэчы, гінулі блізкія, сябры, вакол было столькі гора. Але я ўдзячна таму захапленню, бо са мной засталіся назаўсёды баявыя таварышы Алёша, Саша, дзядзька Спёпа. Тыя ляскыя малюнкі і накіды зімой 1943 г. захавалі іх маладымі назаўсёды.

Шпіталю ў брыгадзе не было, параненых адпраўлялі ў вёску Старышча Ушацкага раёна ў партызанскі шпіталь 2-й партызанскай брыгады імя Заслонава. Тыфозных жа хворых прывозілі да нас. Была ім і санітаркай, і поварам, і ўрачом. Аднойчы па базу даставілі камандзіра нашага атрада Лёву Кіпрыянца. Прывезлі зусім раздзетага з цяжка параненай нагой. У мяне была адзіная змена мужчынскай бялізны, якую нідаўна перадала сястра Клава. Яна як раз падышла Лёве.

Новы 1944 год быў вельмі трывожны. Ужо хадзілі чуткі аб хуткай блакадзе партызанскай зоны. Вера захварэла на тыф, памёр Толік, меншанькі сястры Антаніны. Перапужаны немцамі, ён захварэў яшчэ ў пачатку вайны.

Калі заставацца на базе стала небяспечна, пайшлі ў бок возера Палік. Першы час трымаліся разам, не было з намі толькі Зіны, Олі і Веры. З намі ішла сям'я Шумскіх з Пяровалачні, на руках якіх было трое дзяцей. Было страшэнна холадна, мерзлі і дзеці і дарослыя. Кастры распальваць забаранялася. На ноч рабілі яму, засцілалі дно і садзілі туды дзяцей, а зверху закрывалі коўдрай. Бывала, што і суткамі сядзелі там нашы малыя. Пад кулямі і разрывамі снарадаў пераплылі раку Бярэзіну. Маці плаваць не ўмела, перанесла яе на спіне. Самае жудаснае пачалося на Паліку. Усе астравы гэтых забалочаных мясцін былі нанесены ў ворага па карту. І на які б востраў ні трапілі, нас усюды знаходзілі варожыя самалёты. Гучнагаварыцелі працавалі кругласутачна. Акупанты заклікалі здавацца, абяцалі зямлю, карову, удосталь белага хлеба. Было такое пачуццё, што ўсе мы ў іх, як на далоні. Людзі гінулі ад куль і голаду. Немагчыма было пераносіць пакуты дзяцей. Апошняе аддавалі ім. Блакада — страшнае выпрабаванне і па чалавечнасць. Заставацца духоўна нязломнымі, міласэрнымі апухлым ад голаду, пад кулямі — гэта быў наш людскі абавязак. Дзякуючы гэтаму, думаю, многія і выжылі. І цяпер стаіць перад вачыма тая незабыўная сустрэча з камбрыгам Лявонавым, побач з якім была смяротна знясіленая болем жанчына (у яе пачалася гангрэна ног). Стогны памяраючай жанчыны пельга было пераносіць. Наша маці дала Алісе апошні сухар і сказала: «Мы дапаможам, і нам дапамогуць» і падштурхнула яс да жанчыны. Галоднае дзіця са слязамі на вачах працягнула высушаны хлеб. «Вось яна

трагедыя вайны, мілае дзіця!» — Лявонаў прыгарнуў да сябе Алісу.

Нарэшце трапілі на вялікі востраў, спадзяваліся хоць крыху адпачыць пасля доўгіх дзён у бясконцым балоце. Настала трывожная ноч. Многія паснулі. А раніцой прыляцелі самалёты. На нізкай вышыні яны ва ўпор расстрэльвалі людзей. Усе пачалі бегчы. І раптам знік бацька. Мы яго шукаць, клікаць, крычаць. Бацькі няма. Людскім патокам нас несла ўсё далей ад таго вострава. Тут мы згубіліся. Я апынулася толькі з маці. Пасля вызвалення ўжо даведалася, што здарылася ў той страшны дзень.

Бацька, цяжка хворы, каб не абцяжарваць нас, вырашыў памерці ў адзіноце. Ён запоўз пад карані вывернутага магутнага дрэва, з ім была толькі кружка для вады. Каб не страціць лік дням, адкладваў сухія трэскі (іх потым налічылі 15). Бацьку выпадкова знайшлі нашы воіны, якія дэсантам высадзіліся на Палік. Калі пачалі збіраць сучча для кастра, наткнуліся на бацьку, які ляжаў нерухома. Памацалі рукі — яны цёплыя. Байцы выцягнулі яго са сховішча і на насілках панеслі з Паліка.

Не ведаю, ці засталіся б жывымі і астатнія, каб не наша Надзя, якой ішоў семнаццаты год. Перабраўшыся на другі востраў, наша сям'я, як і большасць людзей, былі ўжо амаль без адзення. Усё, што можна было есці, людзі з'елі. Пачаўся голад. Тоня ўжо не рухалася, Аліса, апухлая, хадзіла хістаючыся. Трымалася толькі Надзя, яна і выратавала ад галоднай смерці. Надзя ўпрасіла двух партызан, якія ішлі на базу, узяць яе з сабой. Паход быў рызыкоўны, шансаў на выратанне было мала — ішлі на занятую карнікамі частку возера, дзе былі закапаны партызанскія прыпасы. 50 метраў аддзяляла іх ад карнікаў, толькі рэдкі чарот прыкрываў партызан, калі пачалі даставаць муку са сховішча. Надзя ўвесь час была з імі. Можна ўявіць, што было на сэрцы маіх родных, калі ўбачылі Надзю з мукой. Яны былі выратаваны ад смерці...

...Вайна ўварвалася ў нашы лёсы нечакана і жорстка. Стала для нас галоўным выпрабаваннем на грамадзянскасць і чалавечнасць.

З успамінаў Вольгі Сцяпанаўны Былінскай, былога фельчара атрада «За Радзіму» партызанскай брыгады «Граза», заслужанага ўрача БССР

...Была гадавіна з дня пачатку вайны. Мы, жанчыны, і моладзь калгаса ў гэты дзень працавалі ў полі. І раптам убачылі наш савецкі самалёт. Колькі было радасці! Вакол вайна, немцы пахваляюцца, што вось-вось пераможа «вялікая Германія». А наш зоркакрылы сокал бясстрашна ляцеў у небе. Мы заварожана глядзелі на яго, і быў гэты самалёт для нас доўгачаканай весткай ад сваіх. Самалёт праляцеў прама над нашым полем і за метраў 100 ад лесу на парашутах упала некалькі грузаў. Кінуліся ўсе да таго месца, бо ведалі, што адразу ж наляцяць фашысты з вёскі. Знайшлі сухары, іншыя прадукты, якія жанчыны пачалі збіраць ў прыпалы. Моладзь жа, убачыўшы зброю, перанасіла яе ў лес і добра замаскіравала. Я адразу прыкмеціла перавязачны матэрыял, тое-сёе з медыкаментаў, знайшла тры скальпелі, якія забрала з сабой, а медыкаменты таксама схавала. Толькі мы паспелі ўсё прыбраць, як прыехалі акупанты. Пачаўся допыт. «Дзе зброя?» — дамагаліся яны. Мы ж яе, зразумела, «не бачылі», паказвалі толькі на прадукты. Тады нас пастроілі ў шарэнгу і папярэдзілі, што будуць лічыць да трох. Калі не скажам — расстраляюць. З шарэнгі выйшла жонка аднаго паліцэйскага і, растлумачыўшы, хто яна, паручылася за ўсіх нас. Акупанты адпусцілі калгасніц, але папярэдзілі, што калі зараз знойдуць зброю ў лесе, усіх расстраляюць тут жа на полі.

Восенню 1943 г. мы ўсёй сям'ёй прыйшлі ў партызаны. Я трапіла ў атрад «За Радзіму» брыгады «Граза». Медперсаналу не хапала, і на мяне, другакурсніцу Смаленскага стаматалагічнага інстытута, глядзелі як на спецыяліста. Я ж шмат чаго яшчэ не ведала, практыкі ніякай не было. Адразу атрымала заданне — везці параненага байца пад вёску Сержаны Ушацкага раёна, дзе знаходзіўся партызанскі аэрадром. У Андрэя Арбузава, так звалі параненага, былі перабіты галёнкі. Перад далёкай дарогай вырашыла зрабіць перавязку. А калі зняла старыя бінты і ўбачыла белыя косці, у якіх было шмат чарвей, страціла прытомнасць (пазней сама пераканалася, што нагнаенне ў ранах знішчаюць як раз гэтыя белыя чэрві, што ў паходных умовах і выратоўвала партызан).

Шлях быў наблізкі, карты з нанесенымі варожымі гарнізонамі ў нас не было. Ехалі на свой страх і рызыку. Бывала, праедзем вёску, спынімся ў наступнай і пытаемся, як далей ехаць. Некалькі разоў было так, што калі скажам, з якога боку едзем, не вераць нам — бо праязджалі праз занятую ворагам вёску. Як нас не схапілі — не ведаю. Начавала пад фурманкай, бо ў хату параненага не перанесілі — аднойчы так ледзь не расквіталіся з жыццём. У адной вёсцы пад раніцу з'явіліся карнікі. Нам бы хутчэй уцякаць, а параненага ніяк не можам выцягнуць з зямлянкі, у якой начавалі. Цудам вырваліся. Пасля таго

сказала сабе: лепш захварэю, але пачаваць будзем толькі на вуліцы. Былі ў нас з сабой два кажухі, з імі прыстасавалася так: адзін нагрэю на печы і нясу накрываць параненага, а другі грэецца ў гэты час, так і мяняла па чарзе. У вёсцы Пастрэжжа сустрэлася з сястрой Клавай, якая знаходзілася на партызанскай базе. К гэтаму часу зусім выбілася з сіл, выглядала вельмі дрэнна. І Клава, як убачыла мяне, катэгарычна заявіла, што далей мяне адну не пусціць. З дазволу камандзіра з гэтай вёскі паехалі разам. Сястра ўзяла з сабой крыху прадуктаў, бо харчаваліся тым, хто што дасць у вёсках.

І вось, нарэшце, прыехалі ў вёску Старышча Ушацкага раёна, дзе знаходзіўся шпіталь 2-й партызанскай брыгады імя Заслонава. Замацавалі за хірургічным аддзяленнем, якое, як і іншыя аддзяленні шпіталя, размяшчалася ў вясковай хаце. Была і фельчарам, і санітаркай, і прачкай. Бінты мыла сама, неяк няёмка было ісці ў вёску і кагосьці прасіць, хоць тутэйшыя жанчыны дапамагалі нам у гэтай справе. Хадзіла ў вёску толькі прасіць для параненых яек, малака, масла, каб падмацаваць іх дадаткова.

Усе з нецярпеннем чакалі самалётаў. Перад блакадай усіх параненых стараліся хутчэй адправіць на Вялікую зямлю. Шпіталь эвакуіраваўся разам з параненымі. Я ж засталася, у партызанах былі мае бацькі, сёстры і пакінуць іх я не магла.

Вярталася ў свой атрад разам з падрыўнікамі брыгады, якія прыязджалі на аэрадром за боепрыпасамі. Залічылі байцом ва ўзвод Лазавога. Хадзіла разам з партызанамі ў засады, была днявальнай, дзяжурнай каля штаба атрада. У атрадзе з жанчын-байцоў была толькі я адна. Партызаны адносіліся да мяне вельмі цёпла, была ў іх за малодшую сястру. Перад самай блакадай нам узвод атрымаў заданне прабрацца пад Талачын і весці разведку. Тыдзень жылі ў лесе, без солі, на сухім пайку. Касцёр распальваць было нельга. Пасля выканання задання вярнуліся ў Шашалаўку. Пачала мыць сваю бялізну. І раптам загад: «У вёсцы фашысты, адступаем!» Што рабіць? У мяне былі новыя ружовыя шарсцяныя кальсоны (падарунак аднаго пажылога партызана яшчэ ў Сержанах у шпіталі) і доўгая вясковая шырокая сукенка (разам з падзякай камандзір атрада ўручыў гэты «падарунак за добрасумленную службу і дастойныя паводзіны»). Я ўсё гэта хуценька надзела, паверх летняе паліто, на галаву нейкую навалку. А на вуліцы ўжо нікога нябачна, здавалася, усе кулі накіраваны толькі на мяне. Стала паўзком прабірацца да рэчкі. Кулі цюкалі паўздагон. Рэчка замерзла не вельмі моцна. Плаваць не ўмела, ды і наогул баялася вады. Скочыла на адну льдзіну, яна тут жа абламалася, я — на наступную. Так перабралася на другі бераг уся мокрая. Люты стаяў ветраны, пакуль дабралася да хаты, дзе спыніўся наш атрад, пакрылася лодзяным панцырам. А партызаны ўжо мяне хапаюць. Столькі было радасці, калі ўбачыліся, сталі яшчэ радней адзін аднаму. Кажуць, знімай боты, а я не магу, бо ведаю, што потым іх не абую. Яны ўзялі мяне за ногі, патрэслі, вада ўся і вылілася. Не прайшло і дзесяці мінут, як зноў загад: адступаем у Толпіна. У вёсцы партызаны напрасілі ў адной хаце, каб мне легчы на печ. Усе моцна заснулі пасля трывожнага дня. Было цёпла і добра. І раптам я прачнулася ад неймавернага болю — пачалі нясцерпна гарэць ногі, рукі. Пакуль магла — цярпела. Потым пачала крычаць. Усе ўсхапіліся. А я ўжо ад болю амаль без прытомнасці. Паглядзелі на ногі (на ботах падэшваў ужо не было, панчохі таксама парваліся), а яны ўсе ў пухірах. Як апынулася ў Нізкім Гарадцы — не памятаю. Потым даведалася, што занеслі да адной жанчыны па прозвішчу Сальнічыха, а тая не хоча мяне браць, аж плача. У партызанах дачка і сын, немцы ж у вёсцы бываюць кожны тыдзень, сама была на валаску ад смерці, у хаце яшчэ дзве бежанкі і дванаццацігадовы сын Валодзька. Але і ў нашых выйсця не было. Першыя дні ляжала без прытомнасці на нарах за печкай. Неяк раніцой апамяталася, і ў той жа дзень у хаце з'явіліся карнікі. Сталі заглядваць ва ўсе куткі. За печ іх Сальнічыха не пусціла, кажа: «Там тыф, паночкі». Яны і выскачылі з хаты. «Больш, Оля, у хаце заставацца нельга»,— узваліла мяне на плечы і панесла да крутога берага за хатай. Выкапала тры замаскіраваныя ямы — пад берагам, па пляжы і ў кустах каля берага. «Калі не будзе сілы, хавайся ў бліжняй, ачуняеш — будзеш да дальняй бегаць». Першы час кожную раніцу насіла да ямы на сабе, а позна вечарам зноў забірала ў хату.

Аднойчы не вытрымала і кажу: больш нікуды не пайду, хай схопяць, але ў яме больш жыць не магу. Менавіта ў той дзень зранку панаехалі акупанты. Я іх як убачыла, не раздумваючы, на пятках пачала ўцякаць да свайго сховішча. За мной адразу ж пабег адзін уласавец. Ён дагнаў мяне каля берага. Пагнаў перад сабой, зганяючы злосць шомпалам. Біў па твары, спіне. Прыгнаў да фурманкі, на якой сядзеў стары немец. Павёз ён мяне ў бок Талачына. Ліхаманкава думала, як уратавацца. Але дзе ж мне ўцячы з такімі нагамі. Вырашыла саскочыць з фурманкі так, каб адразу трапіць пад кола. Думала прыняць смерць адразу, без здзекаў. Конь раптам спыніўся, немец стаў напраўляць

збрую. Я ў гэты момант кінулася пад кола. Ляжу, не ведаю, колькі гэта працягвалася — можа, толькі некалькі секунд, можа, болей. Фурманка стаяла, мяне ніхто не аклікаў. І я папаўзла да бліжэйшай хаты. Запаўзла на ганак і думаю, ну, цяпер у мяне стрэліць. Але ціха. Зайшла ў хату. Каля печы нерухома ляжала жанчына, па ёй поўзала маленькае дзіця і заходзілася ад плачу. Побач валяўся вывернуты кажух. Я яго хуценька надзела на сябе, вымазала сажай твар, схапіла дзіця і залезла на печ. Дзіця супакоілася. А я ноздрыўна глядзела на дзверы — усё не верылася, што за мной ніхто не гоніцца. Раптам жанчына заварушылася, паднялася і спакойна запытала: «Ну што, паехалі ўжо гэтыя пехрысці?» Я і здзівілася і ўзрадавалася, што яна жывая. Раптам у хату заходзіць фашыст і звяртаецца да мяне. «Паненка»,— кажа. Я проста абамлела, значыць, як ні маскіравалася, а ўсё роўна бачна, што не вясковая. У гэты час на вуліцы пачуўся нейкі трэск, хтосьці бег і зычна крычаў: «Партызаны ў вёсцы!». Фашыста адразу не стала ў хаце. Сядзім і не верым, што ўсё абышлося. Гаспадыня выйшла на вуліцу, залезла на гарышча. Нідзе нікога не было. Значыць, хтосьці перахітрыў немцаў, напужаўшы партызанамі. Падзякавала я жанчыну за прытулак і зноў падалася ў Нізкі Гарадзец, бо кругом немцы, пажары ўсюды. Падыходжу да хаты Сальнічыхі, а там плач стаіць — добрая мая гаспадыня па мне галосіць. Больш пападацца ў рукі акупантаў не хацелася, я зноў пайшла да ямы. Неяк аднойчы прыбягае Валодзька і кліча мяне радасна: «Оля, вылазь, нашы прыйшлі». Я не веру, думаю, трэба ж, якія хітрыя, падвучылі хлопчыка. Моцна трымаю за карані дрэва, якім маскіравалася, і плачу. А ён на сябе яго цягне. Так і валтузаемся. «Камандзір у нашай хаце спыніўся, аб усім расказвае. Мы пра цябе паведамілі, хоча на партызана паглядзець, вылазь». Ад гэтых слоў мне ледзьве дрэнна не стала. Па-першае, радасць такая, што, здаецца, сэрца вось-вось выскача. А як падумала, у якім выглядзе перад камандзірам стану — плакаць захацелася. У хату ўсё ж прыйшла. Не ведаю, што яны тады пра мяне падумалі, але ад сябе нікуды не адпускалі.

Дабралася да роднай вёскі, некалькі дзён адпачывала, а потым стала збірацца ў дарогу — на дварэ жнівень, трэба пра вучобу думаць. Разам з Шурай Рашэтнікавай пешшу пайшлі ў Смаленск. З сабой нічога не было. Прывыкла, як у партызанах — заходзіла ў хату, прасіла есці і далей ішлі. Лета, цёпла. Спалі на абочыне дарогі, і страшна не было, і холаду не адчувалі. Праз тыдзень прыйшлі ў разбураны Смаленск. У той жа дзень трапіла ў інстытут. Наш стаматалагічны факультэт яшчэ не вярнуўся з эвакуацыі. На месцы быў толькі лячэбны. Я была згодна працягваць вучобу на гэтым факультэце. Сродкаў для вучобы ў мяне не было ніякіх, адзення, абутку таксама не было, грошай — тым больш. Рэктар паабяцаў дапамогу як былой партызанцы і папрасіў залікоўку. А яна засталася ляжаць у Нізкім Гарадцы. Прыйшлося вяртацца туды, потым зноў ісці ў Смаленск. Калі вярнулася дамоў, сіл больш не было не толькі вучыцца, але і рухацца. Партызаны перадалі шынель, каб пашыла паліто (усе ведалі, што я збіраюся працягваць вучобу). Панесла ў майстэрню перашываць і страціла там прытомнасць. Але першага верасня была ў Смаленску. Час быў вельмі цяжкі. Яшчэ ішла вайна, усё было для фронту. У аўдыторыях стаяў страшэнны холад, вокны былі незашклёныя. І студэнты, і выкладчыкі прыходзілі па заняткі ў верхнім адзенні. Харчаваліся ў сталоўцы толькі гарохам у розных варыянтах. Многія не вытрымлівалі і кідалі інстытут. Было некалькі выпадкаў, што студэнты, знясілепыя за гады вайны, паміралі.

Вайна ў лёсе майго пакалення засталася самай цяжкай і незабыўпай старонкай.

«Музыкант»

Музыкантам, як жартам называў бацька адзінага сына, ён не стаў. Іншы і больш зайздросны лёс напаткаў Васіля.

Як толькі адкрылася пачатковая школа ў вёсцы, Васіль разам са старэйшай сястрой Аняй сеў за парту. Скончыў 4 класы. Адукацыя на гэтым звычайна канчалася — у раёне была толькі адна сямігодка — у Коханаве. Ад Замосця да Коханава кіламетраў восем — дзевяць. Падлеткі ішлі ў гаспадарку, дапамагалі бацькам. Васіля гэты шлях не задавальняў. Пайшоў у Коханава, але школа была перапоўнена — ні ў чацвёрты, ні ў пяты клас не бралі, як ні прасіўся. На наступны год — тое ж самае. Што рабіць? Зноў пачынаў вучобу ў чацвёртым класе ў Замосці. І толькі на трэці раз Васіля і трох хлопцаў з суседняй вёскі прынялі, нарэшце, у Коханаўскую сямігодку. 14-гадовы Васіль пайшоў у... трэці клас, бо чацвёрты і пяты былі па-ранейшаму перапоўнены. Згадзіўся і на гэта. Жылі на прыватнай кватэры неразлучнай чацвёркай, па чарзе рыхтавалі ежу. Сталі камсамольцамі, актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці і школы, і роднай вёскі. У час культурнай рэвалюцыі шмат даводзілася працаваць па ліквідацыі непісьменнасці, весці антырэлігійную прапаганду. Былі замацаваны вёскі, дзе чыталі лекцыі, вялі заняткі.

Калі пачалася масавая арганізацыя калга-

В. С. Былінскі.

саў, Васіль разам з камсамольцамі Зарэчча актыўна ўдзельнічаў у агітацыйнай рабоце, якой кіраваў сакратар партарганізацыі калгаса «XII партз'езд» Мікіта Рашэтнікаў. Выязджалі ў сёлы, горача расказвалі аб жыцці і рабоце ў родным калгасе, запрашалі ўвачавідкі пераканацца ў іх лепшым жыцці, паказвалі мастацкую самадзейнасць. Гэта быў незабыўны час, карысць іх прапагандысцкай работы была відавочнай — фарміраваўся і шырыўся свядомы калектыў людзей, які імкнуўся ў светлую будучыню. Аб поспехах калгаса, дзейнасці камсамола Васіль лічыў сваім абавязкам паведамляць у маладзёжную газету «Чырвоная змена» і ў «Сельскую газету».

Васілю падабалася калгаснае жыццё, праца на роднай зямлі, на якой многаму паспеў ужо навучыцца ад бацькі. Васіль марыў стаць спецыялістам: пасля сямігодкі паступіў у Стара-Барысаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Сталага, з пэўным жыццёвым вопытам навучэнца выбралі камсамольскім важаком тэхнікума. У 1931 годзе прынялі ў партыю. Партарганізацыя тэхнікума, сакратаром якой быў Андрэй Андрэевіч Грамыка і з якім жыў у адным пакоі, даручыла аказваць камуністам падшэфнай вёскі Быча Барысаўскага раёна дапамогу ў арганізацыі калгаса. Акрамя таго, па заданню райкома партыі ў групе з пяці камуністаў тэхнікума на чале з сакратаром партарганізацыі праводзіў работу па збожжанарыхтоўках (у канцы 1931 г.— пачатку 1932 г. яна праходзіла вельмі цяжка). Група была надзелена надзвычайнымі паўнамоцтвамі.

Усе даручэнні, якімі даводзілася займацца ў маладыя гады, былі нялёгкія, вельмі адказныя і важныя. Яны гартавалі волю, выхоўвалі стараннасць, арганізаванасць і самастойнасць.

Вярнуцца да роднай зямлі не прыйшлося. Краіна клапацілася аб умацаванні Чырвонай Арміі маладымі, падрыхтаванымі кадрамі. У 1932 г. быў праведзены спецыяльны набор камуністаў з сярэдняй адукацыяй у ваенныя вучылішчы. Па рашэнню партарганізацыі сельгастэхнікума Барысаўскі гарком партыі накіраваў Васіля Былінскага ў Аб'яднаную Беларускую ваенную школу на артылерыйскае аддзяленне. Вучыліся ўсе старанна і паспяхова. Сярод іх будучы Маршал Савецкага Саюза І. І. Якубоўскі, які знаходзіўся тады ва ўзводзе Васіля Сцяпанавіча, будучы доктар ваенных навук прафесар Т. А. Галінкевіч. Незабыўнай сустрэчай стаў для курсантаў школы прыезд М. І. Калініна. Былінскаму было даручана камандаванне ганаровым узводам, які сустракаў на пероне мінскага вакзала ўсесаюзнага старасту.

У 1934 г. вучоба ў школе была закончана (8 курсантаў, сярод іх і В. С. Былінскі, скончылі яе на выдатна). Партрэты выдатнікаў былі змешчаны ў рэспубліканскай газеце, а таксама выстаўлены ў фае драмтэатра імя Янкі Купалы. Двоіх выпускнікоў накіравалі ў танкавыя войскі, чацвярых — на службу ў авіяцыю. Былінскі трапіў у Харкаўскую школу лётчыкаў-назіральнікаў. Потым — служба ў Омску. У 1938 г. зноў пайшоў вучыцца, у ваенную Акадэмію імя Жукоўскага. З пяці аддзяленняў штурманскага факультэта аддзяленне В. С. Былінскага на працягу ўсёй вучобы было лепшым. У Акадэміі сустрэўся з земляком, Сашам Бычковым з Талачына, які выдатна скончыў Акадэмію (у першыя дні вайны ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, у 1943 г. па-геройску загінуў). Першы выпуск штурманскага факультэта адбыўся датэрмінова ў студзені 1941 г. Гэта былі першыя штурманы з вышэйшай адукацыяй у нашай краіне. Міжнароднае становішча патрабавала хуткай і высокакваліфікаванай падрыхтоўкі ваенных. У тым жа месяцы пачала работу арганізаваная ў Іванаве Вышэйшая школа штурманаў. Васіля Сцяпанавіча накіравалі ў яе на выкладчыцкую работу.

Вайна унесла свае паправаўкі ў далейшы лёс Былінскага. З першых яе дзён у школе была створана баявая група. Былінскі выконваў абавязкі памочніка начальніка штаба групы. Лётныя экіпажы выконвалі палеты днём і ноччу. Бамбілі ворага пад Віцебскам, Смаленскам, Вязьмай, Калінінам. Лёталі без суправаджэння. Баявыя дзеянні група выконвала да 16 кастрычніка 1941 г. У гэты ж дзень школа эвакуіравалася ў Туркменію. У далейшым па загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага школа стала займацца фарсіраванай падрыхтоўкай лётных начных экіпажаў і стала называцца Вышэйшай ваеннай школай начных экіпажаў дальняй авіяцыі. Лётнаі падрыхтоўкай займаліся кругласутачна — фронт тэрмінова патрабаваў папаўнення.

У неба ўзнімаліся цэлыя палкі экіпажаў, створаныя ў школе, іх шлях ляжаў прама на фронт. У пачатку 1944 г. Васіля Сцяпанавіча прызначылі начальнікам штаба бамбардзіровачнага палка.

У пасляваенны час В. С. Былінскі намеснік начальніка авіяцыйнага вучылішча ў Краменчугу. У ім праходзілі першапачатковае навучанне будучыя лётчыкі-касманаўты А. А. Лявонаў. П. І. Клімук.

Службу ў Савецкай Арміі В. С. Былінскі закончыў у званні палкоўніка. Ваеннае вучылішча было расфарміравана, а на яго базе створана вучылішча лётчыкаў грамадзянскага паветранага флоту. Тры гады працаваў тут Былінскі намеснікам начальніка па ваеннай падрыхтоўцы, а ў 1964 г. перабраўся ў Мінск. Больш дваццаці гадоў працуе ён у БДУ імя У. І. Леніна выкладчыкам кафедры грамадзянскай абароны. Сэрца былога ваеннага, як і раней, засталося там, на бацькоўскай сялянскай зямлі...

Запісала Ф. І. Кітаева.

Літасці вораг не ведаў...

«...Тав. Падчуфарава В. І. за перыяд знаходжання ў 36-м партызанскім атрадзе 8-й партызанскай брыгады паказала сябе адданай сваей сацыялістычнай Радзіме.

Будучы падрыўніком атрада, яна ўдзельнічала ў падрыве 20 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага. Асабіста сама пусціла пад адхон 10 эшалонаў. Неаднаразова змагалася ў адкрытых баях з праціўнікам, дзе мужна і смела знішчала агнём ворага...»

(З баявой характарыстыкі В. І. Падчуфаравай)

З успамінаў Валянціны Іванаўны Падчуфаравай (Шэртынай), былой падрыўніцы 36-га атрада 8-й Круглянскай брыгады, жыхаркі Валгаграда

Вайна для нашага пакалення — той сумны рубеж, ад якога пачыналася зусім іншае жыццё, асаблівы псіхалагічны стан душы. У 17 гадоў я і мае равеснікі сталі дарослымі.

Нас, старшакласнікаў тульскіх школ, накіравалі капаць супрацьтанкавыя равы ў Смаленскую вобласць пад горад Дарагабуж. Фронт хутка набліжаўся. Нашы ўмацаванні ўжо абстрэльваў вораг. Не аднойчы траплялі пад бамбёжку. Але мы працягвалі працаваць. Восенню 1941 г. вораг падыходзіў да Тулы, я ў гэты час працавала на рамонтна-механічным заводзе. Мы, камсамольцы, дапамагалі эвакуіраваць станкі, матэрыяльныя каштоўнасці. З апошнім саставам многія ад'язджалі. Я засталася.

У лютым 1942 г. мяне ў ліку іншых камсамольцаў горада выклікалі ў абком камсамола, потым — у абком партыі. Прапанавалі вучыцца ў Маскве ў спецшколе, якая рыхтавала падрыўнікоў для барацьбы ў тыле ворага. Усе з радасцю паехалі ў Маскву. Там адбылася сустрэча з П. К. Панамарэнкам, пасля чаго мяне накіравалі ў спецшколу.

Пачалася вучоба. Знаёміліся і вывучалі падрыўную справу, розныя віды зброі, мін, снарадаў, узрывальнікаў, вывучалі тапаграфію. Прыкладна ў маі накіравалі да лініі фронту — у горад Таранец Калінінскай вобласці. Тут, разбіўшыся на групы, атрымалі канкрэтнае заданне — прабрацца пад Талачын, сустрэцца з мясцовым атрадам і разам працягваць барацьбу. У нашай групе было адзінаццаць чалавек. Камандзір групы — мужчына гадоў 35—40 (яго мы звалі «дзедам»), астатнія — 17—19-гадовыя хлопцы і двое дзяўчат — Валя Каралёва з Падмаскоўя і я.

Пад адцягваючую канаду нашых часцей пераплылі на лодках Заходнюю Дзвіну. Да месца прыбылі без страт. Але тут напаткала нас бяда — пяжка захварэў камандзір. Выратылі несці яго за лінію фронту. Чацвёра байцоў групы на самаробных насілках панеслі яго назад. Мы ж сталі вывучаць мясцовасць, шукаць сувязь з насельніцтвам. Аднойчы не вярнулася з разведкі двое хлопцаў. Нас засталося зусім мала... У канцы ліпеня сустрэліся з групай партызан пад камандаваннем Васіля Рыгоравіча Мацюшэўскага, камандзіра Чырвонай Арміі, якому ўдалося ўцячы з палону, прабрацца ў родныя мясціны. Такім чынам нас стала ў групе чалавек пятнаццаць. Пазней да нас далучыліся Вольга Касталомава і медсястра Ларыса. З гэтага часу пачалі дзейнічаць пад камандаваннем Мацюшэўскага. У лясах пад Талачыном арганізавалі базу — некалькі зямлянак у розных месцах. Большасць партызан нашай групы былі з навакольных вёсак. Дзякуючы гэтаму мы хутка асвоіліся, наладзілі цесную сувязь з насельніцтвам. Людзі дапамагалі нам разведкай, харчаваннем, адзеннем. Шмат было патрыётаў, якія ненавідзелі ворага і рады былі нам дапамагчы, чым маглі (на жаль, запомніла толькі сям'ю настаўніка Харунжага).

Група пачала актыўна дзейнічаць. За жнівень 1942 г. падарвалі больш дзесятка варожых эшалонаў. Дзейнічалі ў асноўным на чыгунцы Мінск — Масква. Былі праведзены дзёрзкія аперацыі на ўсход ад Коханава, каля раз'езда Трацылава, на захад ад Талачына. Узрывы праводзілі «на шомпал» — падрыўнікі сканструявалі мадэрнізаваны спрошчаны ўзрывальнік (МСУ). Паравоз пры

наездзе на зарад звальваў устаўлены у чаку шомпал. Проста, але вельмі небяспечна. Самая нязначная неасцярожнасць магла прывесці да непапраўнага. Акрамя таго, маскіраваць зарад не было часу, бо ставіўся ён пры непасрэдным набліжэнні саставу.

У кастрычніку 1942 г. талачынская паліцыя пачала «паляванне» на нашу групу. У аблавах прымалі ўдзел і нямецкія часці, іншы раз з сабакамі. Не раз даводзілася нам замятаць свае сляды ў гушчарах і балотах. У мясцовай газеце начальнік паліцыі абяцаў вялікую ўзнагароду за хаця б аднаго «маскоўскага бандыта». У лістападзе, калі ляжаў снег, аблавы і засады пачасціліся. Настаў цяжкі для нас час. Аднак дывершіі на чыгунцы працягвалі. З лесу выходзілі на хадулях або замяталі сляды хваёвымі лапкамі. Запасаў харчавання не было ніякіх, затапіць печ у зямлянцы таксама не маглі. У вёсках кругом нашага лесу фашысты арганізоўвалі бясконцыя засады.

Усе разумелі, што зіму перабыць тут не зможам. У канцы лістапада група перайшла ў Круглянскі раён, дзе ўлілася ў 8-ю Круглянскую брыгаду. Прынялі нас цёпла і сардэчна. Выгляд наш быў такі, што і без слоў было зразумела, што нам давялося вынесці за ўсе гэтыя месяцы самастойнай барацьбы.

Сашу Дзянісава, Лёню Прыса, Валю Каралёву і мяне накіравалі ў атрад № 36 да камандзіра ўзвода падрыўнікоў М. І. Шарстабітава, ва ўзводзе якога налічвалася чатыры падраздзяленні падрыўнікоў па 8—12 чалавек. У памяць гераінь фільма «Сяброўкі» мы ўзялі іх імёны. Валя Каралёва стала «Аськай», або «Грузікам», Оля Касталомава — «Зояй», я — «Наткай». Нас усе ведалі ў брыгадзе пад гэтымі імёнамі. Наша падрыўная справа працягвалася. Дзякуючы смелым і знаходлівым дзеянням адважных падрыўнікоў Пятра Лапо, Лёні Хаміцкага, Пятра Глінкі, Емяльяна Гур'ёва, Фёдара Дзідзенкі, Гены Грозберга, Івана Шутава наш баявы рахунак павялічваўся.

7 лістапада 1943 г. стала кандыдатам у члены ВКП(б). У канцы 1943 г. мяне прызначылі камандзірам аддзялення падрыўнікоў. Жыццё наша было суровае і жорсткае. Як і сапёры, мы памыляліся толькі адзін раз. Не паспеў адысці, падарваўся на міне Лёня Прыс. У час бою загінуў Саша Дзянісаў, калі натрапілі на засаду, вяртаючыся з чыгункі. Нямала загінула слаўных падрыўнікоў, якія ценой свайго жыцця выконвалі баявыя заданні.

Былі мы ўсе маладыя, бясстрашныя. Здавалася, што смерць ніколі не возьме нас (гэта ж так ненатуральна гінуць у якія-небудзь 18—20 гадоў). «Толькі б не параніла, а забіць — не страшна»,— часта паўтаралі мы. У маі — чэрвені 1944 г. становішча наша вельмі ўскладнілася — нас цяснілі адступаючыя часці варожых войск. Мы ішлі ўсё далей на захад, наперадзе адступаючых войск. Усё цяжэй станавілася здабываць правіянт, знясільвалі бясконцыя баі з праціўнікам і варожымі гарнізонамі, якія хутка раслі. Не было солі, многія хварэлі на цынгу. Толькі дзякуючы здольнасцям нашага камбрыга Жуніна, «нашага баці», як мы яго любоўна называлі, нам удавалася выходзіць з самых складаных, часам бязвыхадных сітуацый.

4 чэрвеня была паранена, атрымала пералом правага бядра. З партызанскага аэрадрома накіравалі на Вялікую зямлю. У шпіталі была да снежня 1944 г. Там і прачытала ў «Правде» ад 16 жніўня Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні партызан. Знайшла там і сваё імя сярод узнагароджаных ордэнам Леніна...

Лёс

...У студзені 1944 г. ў хату да Віннікавых нечакана ўварваліся з вобыскам фашысты. Маленькі Кастусь туліўся да мамы, хаваўся, але жандар адарваў дзіця ад кабеты і моцна штурхануў у кут. Гаспадароў арыштавалі, бязлітасна збілі і вывелі на вуліцу. Здранцвелы ад жаху Кастусь так і застаўся ляжаць у хаце. Не пабачылі бацькі і дваіх старэйшых дзяцей, якія гасцявалі ў той дзень у сваякоў...

Еўдакія Кузьмінічна Віннікава (дзявочае прозвішча Крапопава) была партызанскай сувязной з 1942 г. Праз Антона Пётуха і Уладзіміра Кармільку, якія жылі ў вёсцы Любішча, яна перадавала звесткі ў брыгаду Жуніна.

Родная сястра Еўдакіі Вера ў той час працавала перакладчыцай у воласці. Праз бургамістра воласці Андрэя Трыбуля дзяўчаты здабывалі патрэбныя бланкі і пячаткі, даведваліся пра магчымыя нямецкія карныя акцыі і папярэджвалі партызанскія сем'і, якім пагражаў вываз у Германію, арышт, расстрэл. У гэтай дзейнасці ім дапамагала жонка бургамістра Клаўдзія Трыбуль. Пісьменная і адукаваная жанчына, яна мела вялікі ўплыў на свайго мужа.

Разам з сяброўкай Аняй Белазоравай сёстры ездзілі ў Барысаў і расклейвалі там лістоўкі, падкладвалі пад эшалоны магнітныя міны, перапраўлялі ў лес савецкіх ваеннапалонных, якія пад прымусам служылі ў паліцыі.

цыі і ўласаўскай арміі. Еўдакія і Вера здабывалі партызанам соль, прадукты, медыкаменты, адзенне (часам нават нямецкія мундзіры!).

Па даносе здрадніка ў пачатку 1944 г. ў Славенях пракацілася хваля арыштаў. Трапілі ў турму муж і жонка Віннікавы, Вера, сям'я Трыбуляў, Анатоль Вуглік, Топя Галкоўская і іншыя патрыёты.

...Зверскія катаванні, допыты, зноў катаванні. Загінулі жонка і муж Трыбулі. Расстралялі Веру, якая вырашыла ўратаваць сям'ю сястры і ўсю віну ўзяла на сябе. Еўдакія і Цімафей Віннікавы дзівам уцалелі, але, як блізкіх сваякоў Веры, фашысты адправілі іх у Германію.

Цягнік ішоў праз Польшчу. Шчаслівы выпадак дапамог уцячы. Разам з дзесяткам іншых уцекачоў Віннікавы доўга блукалі па незнаёмай мясцовасці, пакуль, нарэшце, не знайшлі прытулак у маленькім польскім мястэчку Хелна. Але самымі невыноснымі былі не гэтыя блуканні, а тое, што яны нічога не ведалі пра лёс траіх дзяцей і нічым не маглі ім дапамагчы. Да таго ж Еўдакія была цяжарная ў чацвёрты раз і вось-вось павінна была нарадзіць.

Чырвоная Армія наступала па ўсім фронце. Ужо было вызвалена Хелна, і Віннікавы эбіраліся на Радзіму. Фронт тады стаяў недалёка. У час аднаго з нямецкіх артылерыйскіх палётаў асколкі снарада раздрабілі Еўдакіі нагу і заселі ў спіне. Жанчына страціла прытомнасць. Савецкія салдаты аказалі Віннікавай першую дапамогу і накіравалі яе ў шпіталь.

Параненая, непрытомная, яна нарадзіла ў шпіталі сына. Але пра гэта даведалася толькі праз некалькі дзён, калі крыху апрытомнела. А потым зноў жанчына білася ў гарачцы, трызніла. Яе пераводзілі са шпіталю ў шпіталь амаль без нянкай надзеі на жыццё. Нарэшце адправілі на лячэнне ў Савецкі Саюз.

Каля двух гадоў Еўдакія Віннікава праляжала ў шпіталях. Тым часам яе хлопчыка ўзялі польскія сяляне, а муж Цімафей быў прызваны на фронт. 11 сакавіка 1945 г. ён загінуў.

Еўдакія спрабавала адшукаць сына, але першыя спробы не прынеслі поспеху. Толькі праз 13 гадоў прыйшла доўгачаканая вестка: «Па просьбе Польскага Чырвонага Крыжа паведамляем, што ў дзіцячым прытулку ў Выджна ваяводства Быдгашч знаходзіцца хлопчык пад прозвішчам Віннікаў Стафан...»

Некалькі месяцаў пайшло на ўдакладненне акалічнасцей, якія разлучылі маці і сына. Перапіска, фотаздымкі, чаканне. І нарэшце — сустрэча. У Брэст хлопчыка прывёз работнік дзіцячага дома Станіслаў Наўрат.

Пэўны час Еўдакія Кузьмінічна працавала на метэаралагічнай станцыі ў Лынтупах, а Стафан разам са сваімі аднагодкамі бегаў у Лынтупскую сярэднюю школу. Потым яна з сям'ёй пераехала ў Барнаул. Цяжкі лёс, раненні адбіліся на здароўі жанчыны. У 1985 годзе яна памерла ад сардэчнага прыступу.

Пастка

З успамінаў І. Г. Пахабава

Інакенцій Георгіевіч Пахабаў нарадзіўся ў 1913 г. ў Балахцінскім раёне Краснаярскага краю. Адэін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Талачынскім і Чашніцкім раёнах у Айчынную вайну. Член КПСС з 1944 г. З сялян. Скончыў Краснаярскі педтэхнікум. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У партызанах з мая 1942 г.: кулямётчык, камандзір аддзялення, узвода, намеснік камісара па камсамолу, камісар атрада імя Аляксандра Неўскага партызанскай брыгады «Граза». Пасля вайны на педагагічнай, савецкай і гаспадарчай рабоце. Выбіраўся членам райкома і членам бюро Талачынскага райкома КПБ. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі. Жыве ў Талачыне.

У нашым атрадзе быў баец па прозвішчу Гедуляпаў (на жаль, імя яго ўжо не памятаю). Салідны такі масквіч гадоў 45-ці. Яго часта пасылалі на адказныя дывершіі.

Аднойчы група падрыўнікоў Гедулянаў, Аркадзь Кулік і камсамолец Маркатанаў была паслана на падрыў варожага эшалона. Група выканала загад і вярталася ў атрад. На зваротным шляху, у вёсцы Гаршчэўшчына партызаны сутыкнуліся з немцамі. Іх было шмат, а партызан усяго тры чалавекі. Сапраўдная пастка. І ўсё ж нашы амаль з самых варожых рук, разам з гуртам паналоханых стралянінай кароў, здолелі праскочыць у лес. Але лес яшчэ ўначы быў ачэплены.

Гітлераўцы пачалі працэсванне. Трайныя ланцугі аўтаматчыкаў змыкаліся ўсё шчыльней. Некалькі разоў партызаны спрабавалі выбіцца з пасткі і прарывалі кола, але з самога лесу выскачыць не маглі, бо вакол папагатове стаялі кулямёты. Ведаючы, што партызаны не могуць выйсці з лесу, немцы зноў пачыналі «паляванне». Зноў і зноў пабліжаліся і змыкаліся ланцугі.

У Гедулянава была параніта рука, Кулік таксама быў паранены. Яны зразумелі, што жывымі адтуль не выйсці: раны забяруць апошнія сілы, не хопіць патронаў, а карпікі не адступяцца. Заставалася толькі дорага ад-

даць жыццё, і партызаны вырашылі біцца да апошняга.

Паступова немцы выцеснілі іх на ўзлесак, пад кулямёты. Тады Аркадзь Кулік блізка падпусціў немцаў і падняў рукі ўгору, зрабіўшы выгляд, што здаецца. Калі некалькі немцаў падбеглі да яго, ён узарваў гранату. Загінуў сам і забіў некалькі фашыстаў. Гедулянава і Маркатанава карнікі хацелі ўзяць жывымі. Завязалася рукапашная. Здаровай рукой Гедулянаў выбіў нямецкаму афіцэру сківіцу. І тады карнікі, каб болей не рызыкаваць, застрэлілі партызан у гэтай бойцы.

На геройскім учынку масквіча Гедулянава, беларуса, камуніста з вёскі Засценкі Аркадзя Куліка і зусім маладога хлопца, камсамольца Маркатанава мы выхоўвалі асабовы склад атрада.

«Я з Беларусі. Дудкевіч М. У.»

З успамінаў былога камандзіра партызанскага атрада «Гая» Мікалая Уладзіміравіча Дудкевіча

«Да тых, хто верыць у бога і Савецкую ўладу!»

Тады, у лютым 1942 г., нас было ўсяго восем чалавек. Напярэдадні 23 лютага мы сабраліся ў вёсцы Сенчукі, каб урачыста адзначыць гадавіну Чырвонай Арміі. Здабылі і зачыталі паведамленне Саўінфармбюро і адразу ж размножылі яго ад рукі ў дзесяці экземплярах. На гэтай сходцы мы і пастанавілі стварыць партызанскі атрад. Добра памятаю тых, хто пачынаў гэту справу — камсамольцы Міхаіл Комлеў, Рыгор Лугоўскі, Надзея Тамашэўская (праз некалькі месяцаў яна загінула ў баі) і інш.

Першай нашай аперацыяй стала расклейванне лістовак. Размножанае паведамленне Саўінфармбюро мы вывесілі ў вёсках Талачынскага і Круглянскага раёнаў. Пазней зводкі пра становішча на франтах і партызанскія лістоўкі са зваротамі да насельніцтва часта з'яўляліся ў зоне дзейнасці нашага атрада. Здаралася нават вывешваць лістоўкі на сценах друцкай і воўкавіцкай валасных управаў.

Аднойчы мы склалі зварот «Да тых, хто верыць у бога і Савецкую ўладу!», у якім заклікалі біць акупантаў і здраднікаў, не даваць ім прадуктаў. Зварот быў вывешаны на дзвярах друцкай царквы. Тры дні і верующыя, і няверующыя чыталі яго, пакуль па загаду талачынскай камендатуры друцкі бургамістр не сарваў лістоўку.

Партызанская прысяга

Пад канец вясны 1942 г. ў нашым атрадзе было ўжо каля трыццаці чалавек. Многія добра валодалі зброяй, ведалі тактыку вядзення разведкі, удзельнічалі ў першых сутычках з акупантамі. Такім чынам, атрад зрабіўся баявым падраздзяленнем. Мы вырашылі прыняць прысягу. Тэкст партызанскай прысягі склалі разам з камісарам атрада Мікалаем Сушковым:

«Я, грамадзянін Савецкага Саюза, добраахвотна станаўлюся ў шэрагі народных мсціўцаў-партызан. Перад сваімі таварышамі, Радзімай і партыяй даю ўрачыстую клятву, што буду без боязі і літасці змагацца з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і здраднікамі да той пары, пакуль фашысцкія боты топчуць нашу Савецкую зямлю. Калі я парушу гэту ўрачыстую клятву, няхай напаткаюць мяне суровая партызанская кара і поўнае бясчэсце».

Прысягу прынялі ўсе партызаны і з годнасцю яе трымаліся.

Свежы нумар «Правды»

22 чэрвеня 1942 г. надвячоркам наша партызанская група кіравалася ў вёску Сурнаўка на разведку. Слаўся туман, трохі імжыла. Раптам мы пачулі гудзенне самалёта. З-за туману самалёта не было відаць, а праз 15—20 хвілін сціхла і гудзенне.

Потым высветлілася, што ў гэту ноч савецкі самалёт скінуў у Талачынскім раёне дыверсійную групу з 9 парашутыстаў.

Раніцай у атрад прыбег піянер Косця (прозвішча, на жаль, не памятаю), наш сувязны з вёскі Панькавічы. У руках у яго быў учарашні нумар газеты «Правда». Паведамленне пра дзейнасць Вярхоўнага Савета! Даклад Урада пра знешнюю палітыку СССР! Зводка Саўінфармбюро! Артыкулы, нарысы! Хто ў той час у акупацыі мог разлічваць на такое багацце?

Косця сказаў, што недалёка ад партызанскага лагера прызямліліся парашутысты з Масквы, а «Правду» далі яму як пропуск да партызан. Разам з камісарам і кулямётчыкам Міхаілам Комлевым мы пайшлі за сувязным. Насустрач нам выйшаў хлопец з ордэнам Чырвонай Зоркі, з ім было яшчэ шэсць чалавек. Усе яны яшчэ ўчора былі на Вялікай зямлі...

Мы шмат гаварылі пра Маскву, як яна жыве і працуе. Абмяркоўвалі становішча на франтах — нам вельмі важна было ведаць,

што ўсе савецкія людзі змагаюцца супраць фашызму, каб мацней верыць у перамогу. Потым парашутысты выступілі перад атрадам, а пазней яшчэ неаднойчы расказвалі пра Вялікую зямлю і нам, і насельніцтву акупіраваных вёсак. Гэта таксама было зброяй.

З Масквы іх вылецела 9 чалавек. Да нас у атрад трапіла толькі 7. Самалёт павінен быў скінуць дэсантнікаў у Крупскім раёне, але перашкодзіла надвор'е. Лёс яшчэ двух парашутыстаў быў невядомы. Толькі пазней мы даведаліся, што гэтыя два парашутысты прызямліліся зусім недалёка ад Талачына і адразу трапілі ў рукі гітлераўцаў. На допытах абодва маўчалі і праз нейкі час былі расстраляны.

На наступны дзень пасля далучэння маскоўскіх парашутыстаў да нашага атрада мы сумесна разгромілі воўкавіцкую валасную ўправу, спалілі ў яе памяшканні партрэт Гітлера. Зрэшты, яна толькі звалася воўкавіцкай, а сама знаходзілася ў вёсцы Пляшыўцы, за 4 км ад Талачына, бо бургамістр вельмі баяўся партызан і стараўся трымацца бліжэй да нямецкай улады. Злавілі двух здраднікаў (сам бургамістр звычайна ноччу ў вёсцы не заставаўся, начаваў у Талачыне). На шашы Талачын — Круглае на працягу аднаго кіламетра разбурылі тэлефонную сувязь. Пасля разгрому воласць з Пляшыўцаў перавялі ў Талачын.

У Войску Польскім

Загадам камандавання Чырвонай Арміі ў сакавіку 1944 г. многія савецкія афіцэры і партызанскія камандзіры, у тым ліку і я, былі накіраваны на камандныя пасады ў 1-ю Польскую армію, якая ўваходзіла ў склад 1-га Беларускага фронту. Ганаруся, што ўдзельнічаў у вызваленні Варшавы і штурме Берліна. Як і многія іншыя, я распісаўся на сцяне рэйхстага: «Я з Беларусі. Дудкевіч М. У.»

З беларускіх лясоў да Берліна быў мой шлях.

Імем земляка

Дз. А. Караткевіч.

Адна з вуліц Мінска носіць імя ўраджэнца Талачынскага раёна Дзмітрыя Андрэевіча Караткевіча.

Дз. А. Караткевіч нарадзіўся 16 кастрычніка 1904 г. ў вёсцы Дроздава Аперацкага сельсавета. Нялёгкае дзяцінства выпала на яго долю. З маленства пас жывёлу, сек лес, дапамагаў бацьку па гаспадарцы. Прагна цягнуўся да ведаў. З дзяцінства шмат чытаў.

У 1928 г. стаў членам КПСС, працаваў старшынёй сельсавета, узначальваў раённую прафсаюзную арганізацыю. Пры яго актыўным удзеле былі створаны сельскагаспадарчыя арцелі ў вёсках Рыжычы, Піямонт, Заднева. Пасля заканчэння ў 1937 г. Рэспубліканскай партыйнай школы працаваў першым сакратаром Заслаўскага райкома КП(б)Б, выбіраўся членам ЦК КП(б)Б.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Дз. А. Караткевіч вёў падпольную работу ў Мінску, быў членам Мінскага гарадскога падпольнага камітэта КП(б)Б, кіраваў аддзелам разведкі. Для збору разведданых неабходны былі смелыя, надзейныя людзі. Караткевіч знаходзіў такіх людзей, распрацоўваў планы баявых аперацый, шыфры перадачы атрыманых звестак партызанам, а праз іх — камандаванню Чырвонай Арміі. Падпольшчыкі вялі пастаяннае назіранне за рухам вайсковых эшалонаў ворага, выяўлялі абарончыя збудаванні, склады, вайсковыя часці ў горадзе і наваколлі. Гэта работа патрабавала выключнай асцярожнасці, смеласці і знаходлівасці. Дзмітрый Андрэевіч праявіў сябе сапраўдным разведчыкам, умелым арганізатарам, ініцыятыўным, мужным камандзірам.

У 1942 г. гітлераўцы натрапілі на след партыйнага цэнтра. Караткевіч і многія іншыя падпольшчыкі былі арыштаваны. Ніякімі катаваннямі і здзекамі не змаглі фашысты зламаць волю Дзмітрыя Андрэевіча. Вера ў справядлівасць сваёй справы давала яму сілы ў цяжкія хвіліны. У турме ён падбадзёрваў сваіх таварышаў, яго стойкасць і ўпэўненасць перадаваліся астатнім. Загінуў ён як герой.

Пасмяротна Дз. А. Караткевіч узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

А. А. Шнайдар.

Побач з Мінскам

З успамінаў І. М. Петрашкевіча, былога члена Заслаўскага падпольнага райкома КП(б)Б

Іван Марцінавіч Петрашкевіч нарадзіўся ў 1899 г. ў в. Астрашапкі Талачынскага раёна. Член КПСС з 1930 г. Напярэдадні Айчыннай вайны — работнік Аршанскага раённага аддзялення Дзяржбанка. У жніўні 1942 г. накіраваны за лінію фронту. Быў камандзірам дыверсійнай групы, камісарам атрада імя М. В. Фрунзе. Адначасова з снежнем 1943 г. да ліпеня 1944 г. член Заслаўскага падпольнага райкома партыі. У пасляваенныя гады на гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1983 г.

Свои воспоминания о работе Заславского подпольного райкома партии начну с описания необычной операции, потребовавшей от партизан бригады «Штурмовая» тщательной подготовки, большой смелости, немалого риска, благородного порыва. Хотя она проведена без единого выстрела, народные мстители по праву гордятся ею не меньше, чем успешными боями, и не только наши бойцы, но и многие местные жители, имевшие к ней самое непосредственное отношение. Назвать эту операцию можно емким, звучным словом «Дети».

До войны недалеко от Минска, в деревне Семков Городок, открыли детский дом.

Когда началась война, воспитанников этого детдома не успели эвакуировать на восток. Они остались на месте. Оккупанты назначили директора, подобрали персонал. С каждым днем жизнь сирот становилась все хуже и хуже. Весной 1943 г. здесь появилось 10 фашистов в белых халатах. Разложив медицинские инструменты, они объявили, что будут делать профилактические прививки. На самом же деле затеяли испытание какого-то лекарства, изготовленного в Германии. Как ни уговаривали детей, никто из них добровольно не подошел к немецким врачам. Тогда гитлеровские медики начали применять силу.

Еще большего страха натерпелись дети, когда фашисты приехали брать у них кровь для раненых немецких солдат.

— Не могу больше смотреть на их страдания,— сказал нам один из воспитателей, прибывший в подпольный райком партии.— Ходят слухи, что намерваются всех увезти в Германию.

Медлить нельзя. Надо спасать. А как? Семков Городок находился за пределами партизанской зоны, вблизи крупных вражеских гарнизонов, размещавшихся в Минске, Масюковщине, Заславле, Ратомке.

Решили обсудить предстоящую необычную операцию на заседании подпольного райкома партии.

Пригласили всех командиров и комиссаров отрядов из бригады «Штурмовая».

— Взять штурмом детдом — и никаких гвоздей,— бросил кто-то с ходу.

— Какой штурм? — удивился секретарь райкома Иван Федорович Дубовик.— Это тебе не дзот и не вражеская казарма. Вооруженной охраны там нет. Взять — дело нехитрое. Давайте подумаем, как доставить сюда детей. Если выводить их маленькими группами — операция растянется надолго, да и едва ли завершится благополучно. Фашисты наверняка обнаружат оживление и нагрянут туда. Надо сразу всех забирать.

Сделать это оказалось непросто. После всестороннего обсуждения операции разработали план вывоза детдомовцев. Отрядам дали задание выделить по 10—15 подвод, непременно запастись сеном, одеялами, одеждой. На каждой подводе должен быть вооруженный возница. Командиру роты из отряда имени Г. К. Жукова Ивану Ивановичу Ботяну поручили сопровождать обоз, а отрядам «Штурм», «За Отечество», «Грозный» и имени М. В. Фрунзе — перекрыть засадами дороги, ведущие во вражеские гарнизоны, мимо которых должен проходить обоз.

...Глухая морозная мартовская ночь 1944 года. Монотонный скрип полозьев да редкое пофыркивание заиндевевших лошадей. А дети, зарывшись в сено, молчат. Но не спят. Тревожно и радостно бьются их сердца. Везут к себе партизаны, о которых они слышали. Скорее бы, скорее!..

— Ну, как вы тут? — спросил Ботян, подойдя к одной из подвод.

— Хорошо, дядя,— тихо ответила девочка. И тут же спросила: — А у кого мы жить будем?

— У добрых людей,— ответил Ботян.

Операция прошла успешно. Без потерь. Вызволенных из неволи детей вначале распределили по отрядам, а через несколько дней, когда они немного «оттаяли» душой, устроили под видом племянников и внуков в семьях местных жителей. Мне тоже пришлось «определить на прокорм», как у нас тогда говорили, несколько детдомовцев.

Так удалось устроить всех 274 вывезенных из Семкова Городка детей.

Эта операция стала возможной благодаря тому, что у нас уже имелись немалые партизанские силы, что бойцы проявляли смелость, решительность, умение действовать наверняка...

Друкуецца па кн.: Партийное подполье в Белоруссии, 1941—1944: Страницы воспоминаний. Мин. обл. и Минск. Мн., 1984. С. 345—347.

Юнацтва маё баявое

З успамінаў Любові Міхайлаўны Міхайлавай, былога сакратара Талачынскага падпольнага райкома ЛКСМБ

Май 1941... Працавала ў палітаддзеле Віцебскага аддзялення чыгункі. Мне было даручана арганізаваць піянерскі лагер у Лётцах, што ў дваццаці кіламетрах ад Віцебска. У хуткім часе лагер стаў працаваць, мяне назначылі яго начальнікам. Колькі было радасці і весялосці! Жыццё ў сасновым гаі было цудоўным! Ніхто тады і падумаць не мог, што праз месяц пачнецца самая страшэнная і знішчальная вайна.

У першыя ж дні прынялі неадкладныя меры па эвакуацыі дзяцей. Усіх своечасова адвезлі ў аддаленыя раёны краіны. А мы, камсамольцы і моладзь, аставаліся да апошніх дзён у Віцебску: стваралі ўмацаванні, тушылі пажары. Фронт набліжаўся. 9—10 ліпеня вораг падышоў да ўскраін горада. У блакітным небе віселі варожыя сцярвятнікі, скідалі свой смертаносны груз на прыгожыя вуліцы.

Адыходзіў апошні эшалон... Зразумела, усіх ён забраць не мог. Мы ўсё далей і далей імчаліся на ўсход. Каля станцыі Рудня Смаленскай вобласці наляцелі бамбардзіроўшчыкі. Поезд спыніўся. Далей ішлі пешшу. Прайшло некалькі тыдняў, пакуль мы выйшлі ў глыбокі тыл. Праз некаторы час я разам з іншымі хлопцамі і дзяўчатамі трапіла ў Маскву ў дыверсійную школу. А ў жніўні 1942 г. мяне, упаўнаважанага ЦК ЛКСМБ, накіравалі ў Талачынскі раён для арганізацыі камсамольскай работы. Суправаджала нас група байцоў, а калі перайшлі лінію фронту, то неўзабаве сустрэлі партызан з брыгад Данукалава, Райцава, Дзячкова. З іх дапамогай хутка дабраліся да месца дыслакацыі партызанскай брыгады «Граза». Брыгада толькі сфарміравалася, але пра яе баявыя дзеянні ўжо ведалі ў Маскве ў штабе партызанскага руху. Камісар брыгады С. М. Нарчук пазнаёміў нас з баявымі справамі камсамольцаў, маладымі партызанамі камсамольскага ўзросту. Вось іх імёны: Вася Шчыглоў, Лёва Кіпрыянец, Лёшка Зялюткін, Андрэй Іваюта, Аляксандр Рак, Сцяпан Дзямешка, Вера Маханёк, Стась Падбярэзскі, Косця Хруцкі, Ваня Глекаў. Бора Антонаў. Каця Блажэвіч, Мікалай Іваноў, Аляксандр Голікаў, Іван Жураўскі, Інакенцій Пахабаў, Лёша Ворашань, Галя Лылова, Гепя Шчалканаў і яшчэ многія смелыя, адважныя маладыя байцы. Гэта быў той касцяк, вакол якога складваліся маладыя сілы брыгады. Многія з іх сталі памочнікамі камісараў атрадаў па камсамолу, смелымі разведчыкамі, добрымі арганізатарамі. Уся наша работа праводзілася пад кіраўніцтвам падпольнага райкома партыі. Першыя крокі дзейнасці падпольнага райкома камсамола былі накіраваны на актывізацыю баявых спраў партызан. Былі адкрыты баявыя рахункі лясных байцоў, куды заносілася колькасць узарваных эшалонаў, знішчаных аўтамашын, разгромленых варожых гарнізонаў, забітых акупантаў і здраднікаў. Асаблівую ўвагу звярталі на дыверсійную работу на чыгунцы, аўтамагістралі, у варожых гарнізонах, на прадпрыемствах. Былі створаны спецыяльныя школы па падрыхтоўцы падрыўнікоў. Спецыяліст па гэтай справе Аляксандр Бродскі вучыў, як рабіць толавыя міны, закладваць запалы, як ставіць міны на чыгунцы. Партызаны самі рабілі з дроту «вожыкі» для праколу колаў аўтамашын. Былі адкрыты спецыяльныя майстэрні па вырабу аўтаматаў, рамонту вінтовак і кулямётаў. Працавалі ў майстэрнях і камсамольцы. Добра памятаю Нікіціна, Шчагляка, Пермякова. Яны разам з вопытнымі майстрамі дапамагалі дыверсійным групам ладзіць розныя прыстасаванні і міны для знішчэння слупоў сувязі, невялікіх мастоў, аўтамашын.

У 1943 г. ў брыгады «Граза», Гудкова і Дзячкова, якія знаходзіліся ў зоне дзеяння нашага райкома, прыйшла вялікая колькасць моладзі з вёсак, дзе знаходзіліся нямецкія гарнізоны, у тым ліку маладыя хлопцы, якія па розных прычынах, а часам і не па сваёй волі, трапілі ў паліцыю. Падпольны райком меў у 180 населеных пунктах Талачынскага раёна сваіх сувязных, у 50 вёсках былі створаны патрыятычныя камсамольскія групы. Яны дзейнічалі ў вёсках Шэпетава (у гэту групу ўваходзілі Люба Ярома, Ніна Акаловіч, Тоня Хадневіч і іншыя). У вёсцы Задлева патрыятычнай групай кіравала Надзея Шведка. Дзейнічалі такія групы ў Равяцічах, Анэліне, Азерцах, Валосаве, Плоскім, Еўлахах, Алёнавічах, Гаршчэўшчыне і іншых вёсках. З іх дапамогай была падарвана кацельня на Азерыцкім вінзаводзе, раскрыта шпіёнка, якую вораг хацеў заслаць у брыгаду «Граза». Аднойчы з Талачынскага гарнізона прыгналі 300 кароў у партызанскую зону.

Па заданню РК ЛКСМБ Надзя Шведка і іншыя нашы сувязныя шмат разоў бывалі ў Талачыне, на станцыі, дастаўлялі каштоўныя звесткі аб дыслакацыі нямецкіх злучэнняў. У Азерцах нашы камсамольцы разам са спецгрупай, пакіравапай з савецкага тылу, адкапалі прамы провад, які злучаў стаўку Гітле-

ра з фронтам. Да яго была падключана спецыяльная машына для запісу размоў на плёнку. Гэту плёнку дастаўлялі на наш аэрадром для адпраўкі яе за фронт.

Аб нашых падрыўніках слава застанецца навекі. Вася Шчыглоў быў вельмі вясёлы хлопец. А як цудоўна ён спяваў! Гэта быў вялікі рамантык. Ён марыў аб шчасці, аб радасным жыцці пасля разгрому фашыстаў. А таму так люта ненавідзеў іх. Вася не раз узрываў эшалоны, і яму заўсёды спадарожнічала ўдача. Але падрыўнік памыляецца толькі адзін раз. Ён загінуў ад выпадковага ўзрыву міны. Вера Маханёк, інструктар райкома па падпольнай рабоце, разам з іншымі дзяўчатамі хадзіла на заданні, узрывала масты. Тамара Пляц удзельнічала ў падрыве эшалонаў, першай уварвалася ў нямецкі гарнізон Вятна, які бралі атрады брыгады Гудкова.

Партызаны Лёшка Зялюткін, Стась Падбярэзскі, Ваня Глекаў былі адважнымі кулямётчыкамі. Не раз яны прыкрывалі адыход атрадаў, не раз грамілі гарнізоны, сустракалі ворага меткім агнём з засад. Толькі ў баях пад Узгоямі і Скавышкамі было знішчана пры ўдзеле гэтых кулямётчыкаў сорак пяць гітлераўцаў і паліцэйскіх. Пасля гарачай «лазні» пад Узгоямі пярэвалацкія і забалацкія паліцаі, якія засталіся, усе перайшлі ў партызаны. У Смалянскі гарнізон уварваўся Барыс Антонаў са сваім атрадам і канчаткова знішчыў варожае гняздо.

Пра баявыя дзеянні партызан мы імкнуліся шырока інфармаваць насельніцтва. Перапісвалі ад рукі і распаўсюджвалі ў гарнізонах бюлетэні і пісьмы. А калі пачала выходзіць падпольная газета «Чырвоны хлебароб», камсамольцы Косця Хрупкі, Нічыпар Пашкевіч, Саша Цюкін сталі яе актыўнымі карэспандэнтамі і распаўсюджвальнікамі. Газета дастаўлялася ў кожную вёску.

Вялікую работу праводзіў райком па выратаванню моладзі ад вывазу ў Германію. Мы мелі сувязь з медработнікамі ў Талачыне і яны па нашаму заданню многіх юнакоў і дзяўчат вызвалілі ад вывазу з-за розных «хвароб». А колькі было выратавана дзяцей, якія засталіся без бацькоў. Сірот перадавалі людзям, што жылі ў партызанскай зоне (ад новага Сяла да вёскі Лазы, ад Відок да Асінаўкі і Слідчан фашысты не рызыкавалі наведваць населеныя пункты).

Камсамольцы, маладыя партызаны і партызанкі адчувалі сябе гаспадарамі роднай зямлі. Вясной мы дапамагалі людзям сеяць, а восенню збіраць ураджай. Урачыста адзначалі рэвалюцыйныя святы. Нямала згулялі вясельляў (жыццё працягвалася і ў вайну). Былі і цяжкія дні, калі мы хавалі сваіх герояў.

Так кавалася вялікая перамога. 26 чэрвеня 1944 г. нашы баявыя атрады сустрэліся з перадавымі падраздзяленнямі рэгулярных войск. Але яшчэ да 5 ліпеня дзейнічалі партызанскія атрады — знішчалі нямецкія групоўкі, што імкнуліся вырвацца з акружэння на захад.

Калі атрады былі расфарміраваны, многія камсамольцы у складзе рэгулярных войск пайшлі дабіваць фашысцкага звера. Нямала партызан-камсамольцаў засталося аднаўляць разбураную гаспадарку.

Наша пакаленне — людзі цяпер пажылыя. Нашы дзеці ўжо выйшлі з камсамольскага ўзросту. Няхай жа яны і іх дзеці ведаюць, якія выпрабаванні выпалі на долю іх бацькоў, як гераічна, беззапаветна абаранялі яны сваю Радзіму.

З успамінаў Аляксандра Уласавіча Рака, былога сакратара па прапагандзе Талачынскага падпольнага райкома камсамола

Заклік партыі «Усе на барацьбу з ворагам!» стаў для ўсіх нас, хто застаўся ў тыле ворага, партыйным кіраўніцтвам да актыўных дзеянняў. У барацьбу з ворагам я ўступіў восенню 1941 г. К гэтаму часу ўжо склалася патрыятычная камсамольска-маладзёжная група з былых студэнтаў і вучняў, маладых калгаснікаў, былых ваеннаслужачых, якія пражывалі ў той час у вёсках Узгоі, Бушмін, Рыжычы, Шэпетава. У яе ўвайшлі Сцяпан Дзямешка, Жэня Ярома, Люба Ярома, Міхаіл Ракаў, Антаніна Хадневіч і я, слухач 2-га курса рэспубліканскай палітпрасветшколы. На першым часе мы вялі растлумачальную работу сярод моладзі і насельніцтва пра захопніцкія планы фашыстаў. Заклікалі людзей не выконваць загады і распараджэнні нямецкіх акупацыйных улад аб здачы хлеба, жывёлы, цёплага адзення для акупантаў, распаўсюджвалі лістоўкі і савецкія газеты, якія скідалі з самалётаў нашы лётчыкі. Дапамагалі мы і нашым воінам, што трапілі ў акружэнне і імкнуліся выйсці на ўсход.

Аднойчы днём з дваюрадным братам Міхаілам у лесе за нашай вёскай мы сустрэліся з падраздзяленнем савецкіх ваеннаслужачых. Каля 50 чырвонаармейцаў на чале са старшым лейтэнантам спыніліся там, каб адпачыць, а ноччу зноў ісці далей. Мы вельмі ўзрадаваліся гэтай сустрэчы і адразу ж прапанавалі сваю дапамогу. Вярнуўшыся ў вёску, хутка сабралі для чырвонаармейцаў сёетое з прадуктаў: больш дзесяці боханаў хлеба, кілаграмаў восем сала, бачок малака, яйкі і іншае. Днём разведалі абстаноўку на тым шляху, па якому ноччу пойдуць чырвонаармейцы, а вечарам праводзілі іх патайнымі дарогамі і пералескамі кіламетраў за дзесяць

А. У. Рак.

ад вёскі. Вярнуліся дамоў з пачуццём выкананага абавязку. Уся моладзь пачала актыўна збіраць зброю (за кароткі тэрмін сабралі каля 20 вінтовак, пекалькі пісталетаў, тысячы патронаў, гранаты). Хутка ўся гэта зброя спатрэбілася — у канцы 1941 г. акупанты пачалі адпраўляць у канцлагеры былых ваеннапалонных і чырвонаармейцаў-акружэнцаў. У гэты час мы ўзброілі 18 ваеннаслужачых і накіравалі ў паўночныя раёны вобласці, дзе ўжо пачалі дзейнічаць першыя партызанскія групы. Устанавілі сувязь з патрыятычнымі камсамольска-маладзёжнымі групамі, якія дзейнічалі ў Азерцах, Алёнавічах, Прудцы, Задневе, Анэліне, што дазваляла лепш ведаць абстаноўку, абменьвацца вопытам канспіратыўнай работы, больш эфектыўна выкарыстоўваць агітацыйна-прапагандысцкія матэрыялы. Смела дзейнічала камсамольска-маладзёжная група ў вёсцы Азерцы, дзе размяшчаўся варожы гарнізон. Саша, Тамара і Жэня Пляцы, Лена і Жэня Сушко, Стась Падбярэзскі на чале з камсамольцам Косцем Хрупкім, з вялікімі цяжкасцямі ўстанавіўшы сувязь з аховай Азерацкага лагера ваеннапалонных, дапамаглі арганізаваць уцёкі палонных. Адначасова вялася работа па распрапагандаванню варожага гарнізона. У маі 1942 г. патрыёты гэтай групы прывялі і паказалі надзейнае месца ў лесе збеглым з лагера старшаму лейтэнанту М. П. Гудкову і яшчэ пяці ваеннапалонным. У канцы мая 1942 г. самыя актыўныя члены групы сталі першымі партызанамі атрада, які ўзначаліў М. П. Гудкоў, і мужна змагаліся да самага злучэння з часцямі Чырвонай Арміі.

Члены маладзёжнай патрыятычнай групы в. Заднева Граня Савік (злева) і Ліда Казлоўская.

Смела і актыўна дзейнічалі маладыя патрыёты вёскі Заднева — Ягор і Альберт Баркоўскія, Зіна Казлоўская, Граня Савік, сёстры Ліда і Надзея Казлоўскія. У акружэнні варожых гарнізонаў, пастаянна рызыкуючы жыццём, яны распаўсюджвалі літаратуру, збіралі зброю і боепрыпасы, вялі растлумачальную работу сярод насельніцтва.

У маі 1942 г. пры выкананні адказнага даручэння партызан у вёсцы Міхайлаўшчына была схоплена Ліда Казлоўская. Азвярэлыя фашысты ўварваліся ў Заднева і схапілі ўсіх членаў сям'і Ліды — бацьку, маці, сястру і малалетняга брата, а таксама іх суседзяў Марыну і Наталлю Сяргеевых з грудным дзіцем. Усіх кінулі ў турму ў Талачыне. Фашысты па-зверску расправіліся з усімі, не пашкадавалі нават маленькіх дзяцей. Расправа не запалохала патрыётаў — група працягвала дзейнічаць. Многія жыхары гэтай вёскі пайшлі ў партызаны.

У пачатку чэрвеня 1942 г. ажыццявілася і мая запаветная мара стаць народным мсціўцам. Узброены вінтоўкай, пісталетам і гранатамі прыйшоў я ў атрад Сяргея Цярэнцьевіча Баранава, дзе ўжо былі ваеннаслужачыя Сяргей Нячаеў, Барыс Антонаў, Пётр Осіпаў, Іван Стрэльнікаў, Раман Грыгаровіч, мясцовыя жыхары Косця Валчок з бацькамі, Іван Кожар, Каця Блажэвіч, Генадзь Косінец. Атрад быў невялікі, але яго ўдары вораг хутка адчуў на сабе. Пастаянна манеўруючы, народныя мсціўцы за май — чэрвень разграмілі пекалькі валасных управаў, з засад на шашэйных і грунтавых дарогах забілі не адзін дзесятак гітлераўцаў, знішчалі здраднікаў Радзімы.

У канцы ліпеня ў жыцці нашага атрада адбылася важная падзея — у лесе, на поўначы ад Межыёва, мы сустрэліся з двума атрадамі партызан, якія прыйшлі з-за лініі фронту. Адзін з іх «Граза» — узначальвалі М. А. Рашэтнікаў і С. М. Нарчук, Дз. М. Катлярчук, другі атрад — Ф. М. Тарасава. Шлях гэтага атрада ляжаў у Магілёўскую вобласць. Нарчук даручыў мне правесці атрад Тарасава цераз шашу і чыгунку Мінск — Масква. Для ажыццяўлення задачы папрасілі Кацю Ляховіч з Букарава вывучыць мясцовасць, сістэму

аховы дарогі ў месцы нашага пераходу. Глыбокай жнівеньскай ноччу без адзінага выстралу пераадолелі ўсе перашкоды, і на досвітку атрад Тарасава перайшоў у лес каля вёскі Дуброўскія. Каця Ляховіч не раз выконвала заданні атрада «Граза». Калі ў вёсцы заставацца стала небяспечна, пайшла ў лес, прымала самы актыўны ўдзел у баявых дзеяннях атрада і брыгады (у час дыверсіі на чыгунцы была паранена, пасля папраўкі зноў змагалася з ворагам).

У жніўні 1942 г. для арганізацыі камсамольскай работы прыбыла з тылу ўпаўнаважаная ЦК ЛКСМБ Л. М. Міхайлава. У гэтым жа месяцы быў створаны падпольны райком камсамола. Гэта ўнесла ў наша партызанскае жыццё больш арганізаванасці, дысцыплінавала асабовы склад партызанскіх атрадаў, актывізавала баявую ініцыятыву партызан. Падпольны райком камсамола за кароткі тэрмін арганізаваў дзесяткі камсамольскіх арганізацый у населеных пунктах раёна. Больш як 150 камсамольцаў і моладзі сталі сувязнымі партызанскіх фарміраванняў. У 17 гадоў стала сувязной партызанскай брыгады «Граза» і падпольнага райкома маладая патрыётка з вёскі Папоўка Ніна Валчок. Яна неаднойчы хадзіла ў Оршу, насіла лістоўкі, даставала медыкаменты, вяла назіранне за перамяшчэннем праціўніка па чыгунцы. Разам з сакратаром камсамольскай арганізацыі вёскі Рыжычы Надзеяй Шведка яна правяла вялікую работу па распрапагандаванню букараўскага гарнізона (вясной 1943 г. частка гарнізона была знішчана, астатнія перайшлі на бок партызан).

Пад самым носам у фашыстаў жыла ў вёсцы Райцы выдатная сям'я савецкіх патрыётаў Маскалкоў. За вельмі кароткі час імі была падрыхтавана група моладзі, якая ў сакавіку 1943 г. са зброяй прыйшла ў партызаны (усяго 29 чалавек). Маскалкі таксама ўсе прыйшлі ў лес. Адважнымі партызанамі сталі браты Аляксандр і Дзмітрый Маскалкі (у 1943 Аляксандр пасля ранення памёр). Дзмітрый і яго сястра Галіна закончылі свой баявы шлях у чэрвені 1944 г. Дзмітрый працаваў у органах МУС. Галіна бухгалтарам у саўгасе «Рэканструктар», была сакратаром камсамольскай арганізацыі, дэлегатам XI з'езда ВЛКСМ.

На чыгуначнай станцыі Талачын дзейнічала маладая патрыётка Ліля Гумінская. Дзякуючы ёй, партызаны ведалі дакладны графік паязdоў, іх колькасць, характар грузаў, мелі звесткі аб ахове варожых эшалонаў, патруляванні чыгункі. Гэта дапамагло паспяхова правесці не адну баявую аперацыю.

Восенню 1942 г. брыгада «Граза» разам з іншымі брыгадамі трапіла ў блакаду ў раёне Пасмурскіх лясоў. Камсамольцы Сяргей Уверскі і Міron Чорны знаходзіліся на пасту на ўзлеску каля вёскі Харлінцы. Раніцай яны заўважылі калону фашысцкіх карнікаў. Партызаны адкрылі агонь. Паўгадзіны працягвалася пяроўная схватка. І калі фашысцкая куля смяротна параніла Сяргея і боепрыпасы канчаліся, Міron адышоў у размяшчэнне брыгады. Бой на ўзлеску папярэдзіў байцоў аб набліжэнні фашыстаў.

У лістападзе 1942 г. група маладых партызан на чале з Фёдарам Савельевым («дзядзькам Федзем») вярталася з задання ў базавы лагер за вёскай Узноснае. Каля вёскі Замошша падрыўнікі сутыкнуліся з буйной групай фашыстаў і прынялі пяроўны бой, у якім па-геройску загінулі ўсе 7 партызан. Сярод іх быў і Міron Чорны.

Пасля стварэння ў ліпені 1943 г. падпольнага райкома партыі за невялікі час пад яго кіраўніцтвам з ліку камсамольцаў былі выхаваны смелыя камандзіры атрадаў і ўзводаў, дыверсійных груп, камісары і іх намеснікі, камсамольскія важакі. Праяўляючы баявую ініцыятыву і смеласць, вялі за сабой моладзь Барыс Антонаў, Інакенцій Пахабаў, Іван Жураўскі, Мікалай Заруба, Сяргей Нячаеў, Мікалай Іваноў, Яўген Мяжэвіч, Міхаіл Сіўковіч, Нічыпар Пашкевіч, Уладзімір Ільін і шмат іншых.

З асаблівай цеплынёй успамінаю радыстку Галіну Лылову. Неверагодна цяжкі быў яе шлях з Масквы ў лясы Беларусі з рацыяй за плячыма. На працягу двух гадоў яна забяспечвала бесперабойную сувязь з фронтам і БШПР. У маі 1944 г., калі мы былі акружаны ворагам з усіх бакоў і кальцо блакады ўвесь час сціскалася, камсамолка Лылова праявіла стойкасць і вытрымку, ураставала радыёстанцыю і сілкаванне да яе. Разам з іншымі Галя выйшла з блакады і адразу ж аднавіла сувязь са штабам партызанскага руху. Да нас зноў прыляцелі самалёты, падмацавалі боепрыпасамі, харчаваннем, медыкаментамі.

25 чэрвеня 1944 г. ў раёне вёскі Міхайлаўшчына група партызан разам з сакратаром падпольнага райкома партыі Пахамовічам сустрэлася з перадавымі часцямі войск 3-га Беларускага фронту. А 26 чэрвеня, на золку, мы ўехалі ў Талачын, які ўвесь гарэў. Наступаў новы этап жыцця вялікай і ўпартай барацьбы за аднаўленне разбуранай ворагам народнай гаспадаркі.

Наша Вера

З успамінаў І. Дзямешкі, былога партызана 2-й Беларускай партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі

В. І. Маханёк.

Н. М. Шведка.

Добра памятаю, як у нашу брыгаду прыйшла маладая партызанка, інструктар Талачынскага падпольнага райкома камсамола Вера Маханёк. Ёй мяпе прымалі ў камсамол. І гэты дзень у партызанскім атрадзе запомніўся мне на ўсё жыццё. Я часта бачыў Веру сярод лясных байцоў. Яна была добрым таварышам і смелай дзяўчынай.

Успамінаецца такі выпадак. Адпойчы, гэта было ў 1943 г., наступалі на нямецкі гарнізон. У аперацыі ўдзельнічалі партызаны нашай брыгады, а таксама брыгад Лявонава, Нарчука і Заслонава. З намі была і Вера. Яна кіравала камсамольскай групай па знішчэнню тэлефоннай сувязі праціўніка. У палон тады ўзялі 40 уласаўцаў, захапілі шмат зброі. У баі загінула 10 нашых байцоў і сярод іх — дзяўчына-партызанка з мясцовай вёскі. Па загаду Веры загінуўшую дзяўчыну мы ўзялі з сабой, каб не наклікаць бяды на яе родных, якія жылі тут. Вера Маханёк была выдатным арганізатарам, чулым таварышам. Яна кіравала гуртком мастацкай самадзейнасці. У яе быў добры прыемны голас. На ўсё жыццё запомнілася песня «У зямлянцы» ў яе выкананні. А песні ў той час нас вельмі ўзбадзёрвалі. Малады інструктар камсамола асабістым прыкладам вучыла нас быць смелымі, ніколі не засмучацца.

У пачатку 1944 г. пад націскам ворага наша брыгада з Халопеніцкага раёна перайшла ў Чашніцкі. Штаб брыгады размясціўся ў вёсцы Осва разам са штабам нашага 2-га атрада. У той дзень, 26 лютага, над вёскай з'явіўся нямецкі самалёт. Ён кружыў над хатамі і бесперапынна абстрэльваў з кулямёта ўсе жылыя пабудовы. Я ў той час стаяў на пасту каля штаба і бачыў, як Вера разам са штабнымі работнікамі выйшла ў калідор і ў гэты час варожая куля прабіла дах і трапіла прама ў Веру. Так нечакана, у росквіце гадоў, загінула Вера Маханёк, наш камсамольскі важак, верны таварыш і партызан.

Народ быў упэўнены ў перамозе

З успамінаў Н. М. Шведкі

Надзея Максімаўна Шведка нарадзілася ў 1923 г. ў в. Рыжычы Талачынскага раёна. Член КПСС з 1949 г. Скончыла Магілёўскую савецка-партыйную школу. У 1942—1944 гг. сувязная партызанскай брыгады «Граза», інструктар падпольнага Талачынскага райкома камсамола. Пасля вайны працавала інструктарам райкома ЛКСМБ, рахункаводам Азерацкага сельсавета, загадчыцай жывёлагадоўлі ў калгасе імя Дзімітрава. У пачатку 1960-х гадоў інструктар РК КПБ, намеснік старшыні калгаса «Камсамольская праўда», з 1964 г.— старшыня выканкома Воўкавіцкага сельсавета. Узнагароджана 4 медалямі. Памерла 25.2.1975 г.

Вясной 1942 па вёсках пайшлі чуткі, што ў лясах з'явіліся партызаны. Па пачах з боку чыгункі даносіліся выбухі. Гітлераўцы з гарнізонаў выязджалі толькі вялікімі атрадамі і часта вярталіся назад злыя, прывозячы забітых і параненых сваіх салдат. Потым у нашай вёсцы пабываў сакратар падпольнага райкома камсамола Аляксандр Рак, пагутарыў з моладдзю. Хутка мы стварылі падпольную камсамольскую арганізацыю, устанавілі сувязь з партызанамі. Яе першыя члены — Валянціна Снегірэвіч, Аркадзь Атрошчанка, Іван Ткачэнка, Настасся Баранок, Аляксандр Буранок і іншыя пачалі збіраць зброю. У першыя дні здалі партызанам 7 вінтовак і 2 скрынкі патронаў.

Адной з галоўных нашых задач было распаўсюджванне сярод насельніцтва лістовак, зводак Саўінфармбюро, сатырычнага часопіса «Партызанская дубінка», які выдаваўся ў брыгадзе К. С. Заслонава.

Хутка моладзь, у тым ліку і члены нашай арганізацыі, пайшлі ў партызанскія атрады. Засталіся адны дзяўчаты.

У вёсках Міхайлаўшчына і Букарава гітлераўцы трымалі многа нашых ваеннапалон-

ных. Мы пачалі насіць туды партызанскія лістоўкі. Бачым, воіны хочуць уцячы. Расказалі пра гэта партызанскім камандзірам. І вось вясной 1943 г. 40 чалавек збеглі да партызан.

Аднойчы ў вёсцы Букарава мяне з лістоўкамі затрымалі паліцаі. У аднаго з іх я папрасілася, каб адпусціў вады напіцца. Бачачы, што збегчы мне няма куды, ён дазволіў зайсці ў суседнюю хату. У сенцах я хутка схавала лістоўкі пад дрывамі і спакойна вярнулася. Калі з'явіўся начальнік паліцыі і загадаў зрабіць вобыск, у мяне, зразумела, нічога не знайшлі і адпусцілі. Праз некаторы час я забрала лістоўкі і раздала іх жыхарам вёскі.

Пасля вызвалення нашай мясцовасці Чырвонай Арміяй камсамольцам было загадана вылоўліваць гітлераўцаў, якія групамі бадзяліся па лясах. Адну з такіх груп мы з партызанам Іванам Ілюціным сустрэлі недалёка ад вёскі Азерцы. Гітлераўцы вайваць ужо не хацелі: кідалі зброю і падымалі ўгору рукі. Але не ўсе здаваліся ў палон. Калі праходзілі праз лес, з-за дрэва з'явіўся нямецкі афіцэр. Ён выхапіў пісталет і двойчы выстраліў. Трацячы прытомнасць, я дала чаргу з аўтамата. Афіцэр быў забіты. Мяне прывезлі ў медпункт на перавязку. Рана аказалася не вельмі небяспечнай, і я хутка папраўлялася. У хуткім часе наступіў і радасны дзень Перамогі.

Камсамолка вогненных гадоў

Аня Кунцэвіч, Ніна Літвінава, Таня Якаўлева — сяброўкі-партызанкі. У кожнай з іх была ў брыгадзе Гудкова свая работа. Аня, якая прыпісалася ў атрадзе імя Кутузава, памяняла некалькі ваенных прафесій. Даглядала раненых (карміла, паіла, гатавала ежу, мыла бялізну, бінты), суправаджала іх да самалётаў з Вялікай зямлі. Працавала ў штабе, у майстэрні, дзе выраблялася саматужныя партызанскія аўтаматы, хадзіла ў разведку і на заданні, стаяла ў дазоры. Гэта была звычайная па тым часе работа. Яна выдатна — пе па карце — ведала многія вёскі, лясы, азёры, балоты, урочышчы Талачынскага, Чашніцкага, Лепельскага, Ушацкага раёнаў. Памяць увесь час паслужліва падказвае назвы: Чарэя, Толпіна, Стрыжэвічы...

Да апошняга свайго часу будзе ўспамінаць Ганна Кузьмінічна, як па-бацькоўску адносіліся да яе, бялявай, танюсенькай, нібы маладая бярозка, 17-гадовай дзяўчыны, партызаны. «Дзіця яшчэ, хай паспіць»,— і вусаты дзядзька браў вінтоўку, рашуча крочыў у непраглядную лясную цемру, у дазор. На ласку, дабрату дзявочае сэрца адказвала тым жа. Таму і была яна агульнай любімцай атрада. Таму і прысвячалі ёй свае вершы партызанскія паэты.

Можа таму менавіта на яе і выпаў выбар у памятную блакадную ноч.

— Ты, Анечка, шчаслівая,— сказаў тады камісар.

Прама на голае цела наматалі халаднаватае шаўковае палотнішча сцяга падпольнага райкома партыі. У тым прарыве, на месцы якога зараз мемарыяльны комплекс ва Ушацкім раёне, шмат палягло партызан. Аня выжыла і ўратавала чырвонае палотнішча сцяга.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў многія яе сябры пайшлі з Чырвонай Арміяй далей, на захад. Многія, у тым ліку і сяброўка Таня Якаўлева, дайшлі да Берліна. Аня была вымушана застацца дома: адказалі ногі. Яны першымі адгукнуліся на галодныя і халодныя блакадныя дні, доўгія блуканні ў пошуках сваіх. Потым стала здаваць сэрца. Але трэба жыць. Гэта ж проста несправядліва: перажыць усе жахі вайны, прайсці праз такія выпрабаванні і здацца ў мірны час, калі толькі жыць ды радавацца.

Яна і не здаецца. Працавала адміністратарам у мясцовай гасцініцы, гадуе ўнукаў, сяброуе з добрымі людзьмі — Нінай Міхайлаўнай Літвінавай, Таццянай Іванаўнай Якаўлевай. Калі збіраюцца разам, бывае ўсё: і смех, і слёзы, і доўгія аж да світання размовы. Тады і дастае Ганна Кузьмінічна свае рэліквіі. Сярод урадавых узнагарод, пажоўклых пісьмаў беражліва захоўвае яна камсамольскі білет, які быў уручаны яшчэ да вайны па сходзе моладзі калгаса імя XII парта'езда і які яна пранесла праз вогненныя гады. *А. Цялятка.*

Юныя героі

З уступнага слова Васіля Быкава да кнігі «Юныя героі Віцебшчыны»

Они были разные, эти герои: городские и деревенские, совсем еще ребятишки и чуть постарше. Свое место во всенародной борьбе каждый из них находил сообразно случаю и собственному темпераменту, но всех их объединяла огромная любовь к Родине и жгучая ненависть к ее угнетателям.

Некоторые из них совершили свои не меркнущие в веках подвиги с оружием в руках, будучи партизанами или юными разведчиками, другие — в качестве связных и подпольщиков. Одни, пройдя все испытания, дожили до светлого Дня Победы, но многие погибли, сраженные немецкой пулей в лесах и на дорогах великой войны, зверски растерзанные в застенках гестапо, умерщвленные в газовых камерах концлагерей.

Но подвиги не умирают. Народная память свято хранит каждое доброе дело, имя каждого человека, совершившего подвиг на благо человечества, для Победы...

В этой книге собраны скупые рассказы о подвигах самых юных, жизни или яркие дела которых связаны с Витебщиной. Тут документальная информация о том, что не может и не должно быть забыто, что всегда будет служить примером для новых поколений мальчишек и девчонок, что достойно подражания в веках. *Василь Быков.*

АЛЕКСАНДР ШМАВГОНЕЦ

В 1941 году Саша Шмавгонец окончил шесть классов Молотнянской школы. С первых дней войны он помогал взрослым выслеживать диверсантов, вместе с Геной Фидусовым ходил в лес собирать оружие, патроны. Вскоре гитлеровцы устроили в Коханово лагерь для советских военнопленных. Ребята носили нашим бойцам еду, помогали им бежать из лагеря.

Осенью в деревню, где жил Саша, прибыл комсомолец Николай Курлыпо, до войны служивший в армии. В деревне стали появляться листовки со сводками Совинформбюро. Красноармейским семьям был роздан колхозный хлеб.

Однажды комсомолец Леонид Масолович попросил Сашу достать патронов. Мальчик принес не только патроны, но и ракетницу. С этого времени пионер не раз выполнял поручения комсомольцев, распространял листовки со сводками о положении на фронте. Выполняя эти рискованные задания, Саша не расставался с пионерским галстуком: он носил его под рубашкой.

В марте 1942 года состоялось комсомольское собрание, на котором Сашу приняли в подпольную группу. Он дал клятву хранить тайну организации и всеми силами бить врага.

Юный патриот быстро научился стрелять и бросать гранаты, ходил в разведку, выполнял обязанности связного. Вскоре он получил боевое крещение: участвовал в обстреле немецких автомашин на шоссе Орша — Смольяны, был ранен.

В декабре 1942 года начались аресты среди подпольщиков. Работать стало опасно, и патриоты получили приказ уходить в лес. Сашу приняли в партизанский отряд «Дяди Кости» 1-й имени К. С. Заслонова бригады. Сначала находился в группе подрывников, вместе с ними ходил на боевые задания. Кроме того, вел наблюдение за передвижением вражеских войск по шоссе, участвовал в бою с карателями в районе деревень Дубово и Жерино.

В конце 1943 года Сашу зачислили в разведку. Ему выдали лошадь и немецкий карабин. В особенно трудный период вражеской блокады парнишка в роли связного был направлен в бригаду «Дубова»...

Коммунист Александр Николаевич Шмавгонец работает директором Летчанской средней школы Витебского района.

ВЯЧЕСЛАВ ШАРАЙ

Пионер Слава Шарай из деревни Острошапки Толочинского района с первых дней войны активно помогал взрослым: дежурил в сельсовете, разносил повестки мобилизуемым в армию, вместе с односельчанами рыл противотанковый ров. Позже вместе с другими подростками собирал оружие и прятал его в надежном месте. Весной 1942 года ребята передали партизанам станковый и несколько ручных пулеметов, два десятка винтовок, патроны и гранаты.

Летом 1942 года Слава Шарай по доносу предателя был арестован. Две недели его пытали, били, требовали сознаться в связи с партизанами, но он упорно молчал. Его отпустили только тогда, когда все односельчане подписались под заявлением о том, что Слава не связан с партизанским отрядом.

Пионер не раз еще участвовал в засадах,

В. Дз. Шарай.

А. В. Шафранскі.

диверсиях на железной дороге. В 1943 году он стал бойцом отряда имени А. В. Суворова партизанской бригады «Гроза».

Народным мстителям стало известно, что по дороге Обольцы — Ревятичи должен проехать вражеский обоз с награбленным у населения добром. Взводу, в состав которого входил Слава, было приказано отбить обоз. Организовали засаду у деревни Усвейка. Часа через два послышались пьяные голоса, скрип полозьев. По сигналу командира партизаны открыли огонь. В этом бою Слава, не дожидаясь приказа, заменил раненого пулеметчика. Операция прошла успешно.

Весной 1944 года фашисты блокировали партизанскую зону. Бригада «Гроза» получила приказ отходить в сторону Лепеля, где сосредоточивались силы для отпора врагу. Славе и партизану Киселеву было поручено остаться с тяжелоранеными. Они спрятали раненых в землянках, а когда кончились продукты, переправили на запасную базу. За спасение раненых Слава Шарай был награжден медалью «За боевые заслуги».

После войны Вячеслав Дмитриевич Шарай работал кочегаром на паровозе, помощником машиниста, служил в рядах Советской Армии. Сейчас он является корреспондентом-организатором Толочинского районного радиовещания, выполняет большую общественную работу.

АНАТОЛИЙ ШАФРАНСКИЙ

Навсегда запомнилось Толе Шафранскому 19 мая 1941 года, когда на торжественной линейке его приняли в ряды пионерской организации. Но недолгой была радость. В начале июля фашистские варвары оккупировали Толочинщину, ворвались в деревню Межиево, где жил Толя. Ему пришлось на деле оправдывать звание юного ленинца, подтверждать свою верность пионерской клятве.

Любознательный и находчивый, паренек хорошо знал окрестности, ему была знакома каждая тропинка в лесу, каждый ручей. Вскоре эти знания пригодились: в марте 1942 года Толя Шафранский стал связным и разведчиком сначала группы, а затем партизанского отряда, которым командовал С. Т. Баранов.

...Летом 1942 года группа партизан, возвращаясь с боевого задания, подошла к деревне Горщевщина. Но пройти ее незаметно не удалось. Гитлеровцы обнаружили партизан и, подпустив их ближе, открыли огонь из автоматов и пулеметов. Горстке храбрецов пришлось вступить в неравный бой. С обеих сторон в ход были пущены гранаты. Осколком одной из них тяжело ранило партизана Петра Осипова. Друзья не оставили его на поле боя. Отстреливаясь от наседавшего противника, они на руках вынесли раненого и благополучно добрались до партизанского лагеря. Там выяснилось, что рана у Осипова очень серьезная и нужна срочная операция. Однако врача у партизан не было. Командир отряда С. Т. Баранов поручил Толе Шафранскому связаться с врачом Ольгой Дроздовой, которая жила в деревне Обольцы, и доставить ее к партизанам. В Обольцах находились немецкий и полицейский гарнизоны, и не так-то просто было пробраться туда. Но Толя выполнил поручение и вовремя привез врача. Жизнь раненого была спасена.

Толя еще не раз бывал в Обольцах: доставал через патриотов необходимые лекарства, бинты для партизан. По заданию командования отряда он часто ходил на связь с нужными людьми, собирал разведывательные данные, помогал советским патриотам вступить в ряды народных мстителей.

За мужество, проявленное в борьбе с немецко-фашистскими оккупантами, награжден несколькими боевыми медалями.

Анатолий Викторович Шафранский живет в Орше, работает инженером на тракторе-ремонтном заводе.

Друкуецца па кн.: Юные герои Витебщины. Мн., 1980. С. 3, 107, 108, 112—113.

Дзяцінства незабыўныя імгненні

З успамінаў А. В. Шафранскага, разведчыка-сувязнога партызанскай брыгады «Граза»

9 ліпеня 1941 года стаў для мяне першым днём адліку доўгіх ваенных гадоў. У той дзень на вёску Межыёва пасыпаліся варожыя снарады. Мы жылі каля лесу на хутары Карыцкі, што ў кіламетры ад вёскі. Перапужаліся ўсе страшэнна. У акопе, які бацька выкапаў, у той самы дзень і нарадзілася малодшая сястрычка Надзейка. Радасці не было — на плячах бацькоў ляжаў клопат яшчэ аб траіх дзецях. А тут вайна...

Дні праз два — тры праз наш хутар сталі ісці групы ваеннаслужачых. Многія заходзілі ў хату. У верасні на хутар выйшла пяць байцоў Чырвонай Арміі, з імі быў паранены капітан. Усе яны былі вельмі зморапыя, галодныя, папрасілі дапамагчы з харчаваннем.

— У лесе нашы таварышы, 30 чалавек, прабіваемся да сваіх,— дадаў капітан.

Бацька аддаў авечку, 2 парасят, 4 курыцы, маці спякла пяць боханаў хлеба. Давялі мы іх амаль пад самы Віцебск. А ў канцы кастрычніка з лесу выйшла восем знясіленых савецкіх салдат. Схавалі іх у пуні, дзе ляжаў звязаны ў снапы авёс. Зрабілі ім глыбокую яму на выпадак прыходу немцаў. Я вёў назіранне за падыходам да нашага хутара. І ўсё ж дзён праз пяць-шэсць раптоўна прыйшлі немцы. Яны стралялі і пратыкалі штыкамі салому, але нічога падазронага не знайшлі. На наступны дзень воіны пайшлі ў лес. А ў навакольных вёсках гаспадарылі бургамістры і паліцаі. Насельніцтва запалохвалі, трымалі ў пастаянным страху. Людзі баяліся размаўляць, лішні раз выходзіць з хаты. Час быў цяжкі яшчэ і таму, што ніхто не ведаў, дзе нашы. Немцы ж пахваляліся, што «Масква капут» і яны хутка будуць за Уралам. І цяпер, ужо праз шмат гадоў, не магу без хвалявання ўспамінаць бацькавы словы: «Быць таго не можа! Не перамогуць яны нас!». Ён паўтараў іх горача ў самыя безнадзейныя моманты. Гучалі яны не суцяшальна, а як выклік. Мы, дзеці, адразу яму паверылі. Не ведаю, магчыма, узровень грамадзянскага выхавання, агульная патрыятычная настроенасць людзей у перадваенныя гады былі вытокамі такой перакананасці.

Нояк ранкам, гэта было ў канцы студзеня 1942-га, бацька заўважыў каля хутара лыжныя сляды, якія вялі ў лес. Ён паслаў мяне прабегчы па следу. Вярнуўшыся, расказаў бацьку, што хтосьці шукае добры густы лес. Бацька адказаў, што хутка будуць партызаны. І сапраўды, у канцы лютага, ходзячы па лесе, я заўважыў ледзь прыкметны дымок. Пайшоў на яго і стаў назіраць. Каля вогнішча грэлася шасцёра цёпла апранутых людзей. Каля іх ляжаў кулямёт, вінтоўкі, скрыні з патронамі. Я неўпрыкмет развярнуўся і — дамоў. Не цярпелася расказаць бацьку.

— Ноччу павінны прыйсці, холадна,— разважаў бацька.

Так яно і сталася: гадзін у адзінаццаць вечара пачуўся стук у акно. Бацька адчыніў.

— Чаму не пытаецеся, хто такія, і адразу пускаеце ў дом? — спытаў адзін з начных гасцей.

— А вы нашы суседзі, а іх не палохаюцца,— засмяяўся бацька.

Увайшоўшыя спачатку не паверылі бацьку пра маё «адкрыцё» ў лесе і пачалі распытваць, як гэта мне ўдалося непрыкметна і так блізка падысці да іх.

З той памятнай ночы і завязалася наша моцная дружба і давер з Сяргеем Баранавым, Барысам Антонавым, Іванам Стрэльнікавым, Васілём Філатавым, Сямёнам Нябогіным, Аляксеем (прозвішча не памятаю, жыў у Вольгі Кавальскай). Усе яны былі ваеннаслужачыя, з акружэнцаў, жылі ў Алёнавічах.

Некалькі начэй шасцёра патрыётаў паведваліся да нас. Але гэта было небяспечна. Сяргей Баранаў аднойчы папрасіў бацьку:

— Пасялі нас так, каб ніхто не знайшоў.

— Сын прападае днямі ў лесе і ведае яго лепш за мяне. Завядзе, будзьце спакойны, ні адна душа не даведаецца,— запэўніў бацька.

І сапраўды. Лес я ведаў добра: перад вайной неаднойчы ганяў праз яго калгасных кароў, праходзіў штодня больш за 10 кіламетраў, ведаў усе патаемныя лясныя мясціны і аддаленыя куточкі, дзе што расце і што водзіцца. Таму і абрадаваўся бацькавай прапанове, быў упэўнены, што лепш за мяне ніхто не схавае партызан.

Доўга ішлі па лесе. Раптоўна дарога скончылася і перад намі раскінулася неабсяжная балота. Я завёў іх з другога боку да яго, паказаў перашыек, які знаходзіўся пад вадой, і хутка мы апынуліся ў густым ельніку на балоце. Тут і асталяваліся першыя партызаны нашых мясцін. Умоўны знак, калі я стаў прыходзіць да іх,— тры разы «выў» ваўком, а ўвесну «кукаваў» зязюляй.

У лютым — сакавіку пачалі забіраць у палон ваеннаслужачых. Неабходна было іх звесці з партызанамі. Мясцовыя патрыёты Іван і Алена Кожары, Анатоль Шчарбанок з Алёнавіч, Саша і Галя Косінцы з Прысмакоў, Таня Хрыпач, Марыя і Лёпя Бондаравы з Шыбек, Галя і Іван Валчкі, Валя Дземяшке-

віч. Марыя Макарава з Межыёва сталі першымі сувязнымі. Мяне пасылалі з запіскамі да партызан. У выніку праведзенай работы ў атрад Баранава ў пачатку мая прыйшлі прыпіснікі з Гаршчэўшчыны Пётр Осіпаў, Сяргей Нячаеў, Уладзімір Шахматаў, з Ржоўкі — Мікалай Калістратаў, Павел Сарокін, Макар Лавыгін, з Папоўкі — Генадзь Шчалкапаў і многія іншыя.

За май — чэрвень 1942 года былі разагнаны ўсе паліцэйскія групы, абяскоджаны тайныя агенты. Партызаны зрабілі налёты на паліцэйскія гарнізоны ў Гаршчэўшчыне, Малым Гальцэве, Абольцах, Алёнавічах. Прымусілі адмовіцца ад сваіх «пасад» бургаміст раў з Межыёва і Алёнавіч. У Алёнавічах, напрыклад, бургаміст рам стаў Трафім Косінец, які даставаў з воласці чыстыя бланкі пасведчанняў. Імі карысталіся тады многія партызаны. Баранаў падрабіў пячатку. Мой бацька не хадзіў кожны месяц у волась адзначацца — Баранаў ставіў пячатку і падрабляў подпіс у дакуменце.

У канцы ліпеня, вяртаючыся дамоў ад партызан, я заўважыў людзей у плашч-накідках. Усе незнаёмыя. Вярнуўся ў атрад і далажыў, што ў лесе з'явілася група адноль кава апранутых людзей. Антонаў, Нячаеў і Стрэльнікаў узялі кулямёт і паехалі на сувязь з імі. Быў там і я. Малога росту, шустры, я не прыцягваў увагі немцаў, а іншы раз і сваіх. Але дзіцячая адданасць, усведамленне сваёй неабходнасці навучылі мяне назіральнасці і стрыманасці. Тут першы раз я убачыў і пачуў імёны Нарчука, Рашэтнікава, Ворашня, Катлярчука і іншых. Усе яны былі з Вялікай зямлі, і цікавасць да іх была асаблівая.

У канцы кастрычніка ў брыгаду прыбыў Заслонаў. Шлях ляжаў праз наш хутар. Праваднікам узялі мяне. Камбрыг пасадзіў да сябе ў сядло і мы верхам з пяццю праважатымі, напрамкі, абмінаючы пасты і дазоры, выскачылі як раз на паляну, дзе размяшчалася зямлянка штаба партызанскай брыгады «Граза». Я вельмі ганарыўся, што так хутка даставіў гасцей у штаб, і дапытліва пазіраў на гасцей, ці ўразіла іх мая дасведчанасць. Праўда, потым мне добра ўляцела ад Нарчука, што парушыў партызанскі статут.

Да восені 1943 года адчуваў сябе бяспечна. Але аднойчы да нас зайшлі немцы са спісам і спыталі бацьку, дзе сын Анатоль. Бацька ўважліва паглядзеў на мяне і сказаў: «Падай метрыкі Анатоля». Я дастаў дакументы і працягнуў іх немцу. А бацька загадаў: «Выбежы і пашукай яго». Я зразумеў бацьку і схаваўся ў акопе каля хаты. Было страшна, час цягнуўся бясконца. З тае пары стаў вельмі асцярожны і лішні раз не трапляў немцам на вочы.

Пагроза смерці навісла над нашым домам у студзені 1944-га. Фашысты зрабілі засаду справа ад хаты ў садзе. Калі звечарэла, я ціхенька выпаўз праз патайны ход і па канаве, якая была злева ад хаты, выбраўся ў лес. Партызаны былі папярэджаны. Праз чатыры дні я вярнуўся дамоў. Хата была разрабавана, дзверы адчынены, вокны выбіты, нікога са сваіх не было. Толькі, калі я пачаў звать бацьку і маці, з-пад печы вылезлі напалоханыя куры. У вёсцы я даведаўся, што сям'ю выгналі з хаты і ўсе нашы жывуць у доме Еўдакіі Валчок. З чатырма курамі я і прыйшоў да іх.

Дзень вызвалення сустрэў у Алёнавічах, уехаўшы ў вёску на нашым танку. А было гэта так. У ноч з 25 на 26 ліпеня да нас у хату ўваліліся 20 немцаў і загадалі маці гразь чай. А ў дзесяць гадзін раніцы пачалі ляцець нашы снарады. Я залез па гарышча і ўбачыў мноства немцаў, яны заляглі каля хат, у жыце, каля лесу. І раптам... убачыў нашы танкі! Міжволі пакаціліся з вачэй слёзы. Не помнячы сябе, зляцеў з гарышча і напрасткі паімчаў прама да танкаў. Бег, плачучы, па жыце, а ў ім, нібыта ў здранцвенні, ляжалі немцы і моўчкі, не рухаючыся, глядзелі на мяне. Маглі б, безумоўна, схапіць за нагу і ўціснуць у зямлю, маглі б стрэліць. Але я пра гэта не думаў, перад вачыма стаялі нашы доўгачаканыя танкі. Дабег да бліжэйшага і пачаў штосьці крычаць і махаць рукой. Вадзіцель падхапіў мяне. Так на танку я і ўехаў у Алёнавічы, горды і шчаслівы!

Бясстрашны разведчык

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Благуш працаваў загадчыкам Слаўнепскага клуба і марыў паступіць вучыцца ў ваеннае вучылішча. Калі вайна дакацілася да роднай Талачыншчыны, шаснаццацігадовы юнак вырашыў пайсці з усімі на ўсход. Адпак за лінію фронту прабрацца не ўдалося, і ён застаўся ў Варанцэвічах, дзе жылі яго маці і сястра.

Тры дні міма іх дома бесперапынным патокам рухаліся фашысцкія танкі, гарматы, калоны салдат.

Валодзя спачатку не ведаў, як будзе помсціць ненавіснаму ворагу за тое гора, якое

У. П. Благуш.

В. Стаброўскі.

ён прыпёс на нашу зямлю. А калі даведаўся, што ў рацаўскіх лясах арганізоўваюцца партызанскія атрады, юнак адным з першых жыхароў Варанцэвіч стаў у рады народных мсціўцаў. У хуткім часе Уладзімір Благуш разам з землякамі Анатолем Мачахоўскім, Васілём Вятошкіным, Іванам Каралёвым, Уладзімірам Бельскім былі залічаны ў групу разведчыкаў, якой камандаваў Мікалай Аляксеевіч Сафронаў.

Уладзімір часта наведваўся ў навакольныя вёскі і расказваў людзям аб баявых дзеяннях партызан, аб справах на фронце, жудасных расправах карнікаў над мірным насельніцтвам. Гэтага высокага, бясстрашнага і кемлівага хлопца з блакітнымі вачыма людзі ведалі і заўсёды прымалі са шчырай радасцю.

У вёсцы Прыгані Круглянскага раёна, дзе быў варожы гарнізон, вельмі лютавалі паліцэйскія і іншыя здраднікі. У кастрычніку 1943-га сюды павінны былі прыбыць яшчэ каля ста паліцаяў для барацьбы з партызанамі. Разведчыкі паведамілі пра гэта камандаванню партызанскай брыгады «Чэкіст», якое прыняло рашэнне знішчыць гарнізон.

78 партызан-добраахвотнікаў, сярод іх і Валодзя Благуш, пераапрануўшыся ў нямецкую форму, прыбылі ў гарнізон пад выглядам папаўнення, дзе па ўмоўнаму сігналу пачаўся жорсткі бой. Спачатку былі знішчаны агнявыя кропкі ворага, а потым Уладзімір першым уварваўся ў казарму і аўтаматнай чаргой расстрэльваў фашыстаў і іх паслугачоў.

У сакавіку 1944 года камандзір групы М. Сафронаў накіраваў Уладзіміра Благуша і яшчэ двух партызан з тэрміновым данясеннем у штаб брыгады. Каля вёскі Клімава яны нарваліся на засаду. Завязаўся няроўны бой. Варожая куля цяжка параніла Валодзю ў нагу. Рухацца ён не мог, але працягваў адстрэльвацца. А калі ворагі акружылі героя, апошнюю кулю ён пусціў у сябе.

Яго імем названы...

Да вайны Вася Стаброўскі, ураджэнец вёскі Шэпетава, нічым не адрозніваўся ад сваіх аднагодкаў. Зімой вучыўся ў школе, летам дапамагаў бацькам, працаваў у калгасе або бегаў з сябрамі ў лес, дзе заўсёды бывае весела. Любіў падоўгу слухаць птушыны спеў, майстраваў шпакоўні з аддзелкай. Хлопчык рос шчаслівым, і яму здавалася, што хараство, якое ён бачыў навокал, належыць людзям назаўжды.

Але насталі іншыя дні, калі на родную зямлю прыйшлі фашысты. Вася адразу ўключыўся ў барацьбу. Спачатку дапамагаў партызанам, перадаваў зброю, паказваў дарогу, праводзіў на магістраль падрыўнікоў. У кастрычніку 1942 г. Вася прыйшоў у партызанскі атрад «Дзядзькі Косці» брыгады, якой камандаваў К. С. Заслонаў, стаў удзельнічаць у баявых аперацыях, хадзіў у разведку. Разам са сваімі баявымі сябрамі ён падпаліў мост каля вёскі Жураўлі, узарваў бранявік, эшалон паблізу станцыі Талачын. У партызанскім атрадзе Васю Стаброўскага прынялі ў камсамол. У любую мінуту ён гатовы быў аддаць жыццё, толькі б выканаць заданне. У якую б складаную сітуацыю ні трапляў Вася Стаброўскі, ён ніколі не губляўся. Адкойчы на бальшаку трое партызанскіх разведчыкаў, сярод якіх быў і В. Стаброўскі, сустрэліся з групай паліцэйскіх, якія ехалі на 15 павозках. Завязалася перастрэлка. Стойка і мужна вялі сябе партызаны. Паліцаі не вытрымалі. Пакінуўшы коней, яны пусціліся наўцёкі. Многія былі забіты. А адважныя разведчыкі вярталіся з вялікай здабычай: яны прывялі 15 коней, прывезлі шмат прадуктаў, зброю. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з ворагам, адважны сын Савецкай Радзімы ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Раніцай 25 студзеня 1944 г. на ўскраіне вёскі Кулікі Сенненскага раёна партызаны зрабілі засаду на фашыстаў, аб з'яўленні якіх паведаміла разведка. Але аб колькасці варожых салдат звестак не было. І тут здарылася нечаканае: супраць 21 партызана аказалася 500 да зубоў узброеных фашыстаў. Адступаць не было куды, завязаўся няроўны бой. Невялікая група партызан, сабраўшы апошнія сілы, змагалася з ворагам. Трапныя

Цеплаход «Вася Стаброўскі».

аўтаматныя чэргі прымусілі немцаў залегчы. У разгары бою Вася Стаброўскі нават не заўважыў, што большасць яго сяброў загінула. Тыя, хто застаўся ў жывых, працягвалі вясці няроўны бой. І раптам Вася знясілена апусціўся на зямлю — ногі былі пастрэлены аўтаматнай чаргой. А вораг усё набліжаўся. І тут адважны партызан зразумеў, што застаўся зусім адзін. Фашысты хацелі ўзяць яго ў палон. Трапнымі выстраламі Вася забіў некалькіх ворагаў. Потым аўтамат змоўк. Але заставаўся яшчэ рэвальвер. З якога партызан расстрэльваў фашыстаў ва ўпор. Апошнюю кулю мужны патрыёт пусціў у сябе. Так абарвалася жыццё 19-гадовага партызана-камсамольца В. Стаброўскага. Разам з баявымі сябрамі ён пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Вароніна Сенненскага раёна. Яго імем названы піянерскія атрады, цеплаход на Балтыцы. Вучні школы № 1 г. Талачына завязалі перапіску і пасябравалі з экіпажам цеплахода «Вася Стаброўскі», запрасілі маракоў да сябе на сустрэчу, самі з'ездзілі да іх на Балтыку.

Маленькі патрыёт

Мікалай Сцяпанавіч Цыбульскі нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Багрынава Талачынскага раёна. У ліпені 1942 г. стаў партызанам 5-га атрада брыгады «Чэкіст». Быў разведчыкам, правадніком, прымаў удзел у дыверсіях на чыгунцы, іншых аперацыях. Восенню 1942 г. раз'юшаныя гітлераўцы расстралялі яго маці, бабулю, двух сясцёр, 3-гадовага брата. У 1946—1948 гг. Коля Цыбульскі выхоўваўся ў Перавалачнянскім спецыяльным дзіцячым доме. Скончыў школу ФЗН, працаваў у МТС, у Сенненскім дзіцячым доме, служыў у Савецкай Арміі. З 1956 г. Мікалай Сцяпанавіч працуе трактарыстам у Шчалбоўскім леспрамгасе Віцебскага раёна.

З успамінаў М. С. Цыбульскага

Коля Цыбульскі.

Вясной 1942 г. я даведаўся, што ў нашай вёсцы на канюшні хаваюцца 6 чырвонаармейцаў, якія выйшлі з акружэння. Я пазнаёміўся з імі і мы пасябравалі. Кожны вечар з надыходам цемнаты я ішоў да сваіх сяброў, прыносіў ім прадукты, тытунь, расказваў пра мясцовыя навіны. А яны расказвалі мне пра баі з ворагам, вучылі карыстацца зброяй (вінтоўку я здабыў сам). Да нас даходзілі чуткі, што ў навакольных лясах ствараюцца партызанскія групы. Чырвонаармейцам было небяспечна паказвацца на вёсцы — навокал «гаспадарылі» гітлераўцы і паліцэйскія. Таму мне даручылі разведаць што-небудзь аб партызанах і наладзіць з імі сувязь. Доўга ў мяне нічога не атрымлівалася. І вось аднойчы ў вёсцы спыніліся незнаёмыя коннікі. Я падышоў да іх, стаў прыслухоўвацца да гаворкі і зразумеў, што на могілках у засадзе знаходзіцца партызанскі камандзір з часткай атрада (яны рыхтавалі «сустрэчу» карнікам, якія павінны былі рухацца па дарозе ў бок Варанцэвіч). Я пайшоў на могілкі, знайшоў партызан і іх камандзіра. Доўга круціўся, пакуль адважыўся расказаць, што 6 чырвонаармейцаў хочуць прыйсці да партызан. Страшна было мне за сваіх сяброў. Камандзір сказаў: «Што ж, няхай прыходзяць. А шукаць нас трэба ў Рацаўскім лесе». Лёгка сказаць «шукаць у Рацаўскім лесе»! А як, калі мае сябры — хто ленінградзец, хто сібірак? Я і сам ні разу ў тым лесе не быў. І ўсё ж мы вырашылі, што пайду шукаць я. У дрэнным адзенні, невялікага росту, я не прыцягваў пільнай увагі. Некалькі дзён хадзіў па вёсках, а пасля і па лесе, ужо стаў выбівацца з сіл, пакуль не натрапіў на партызанскі дазор. На ўсе пытанні вартавых я не адказваў, патрабаваў адвесці мяне да камандзіра. Прый-

шлося правесці цэлую ноч разам з дазорнымі. А калі раніцай прыйшла іх змена, мяне адвялі да камандзіра, таго самага, з якім я пазнаёміўся на могілках (гэта быў А. Ф. Сімдзянкін). Ён пазнаў мяне, і мы дамовіліся, што я прыведу сваіх сяброў у атрад. Неўзабаве мы былі ў атрадзе. Залічылі і мяне, адзінаццацігадовага, хоць і не хацелі. Вельмі ж горача я прасіўся, і зброя ў мяне была, і бацька мой ваяваў на фронце, і чырвонаармейцы «мае» за мяне прасілі. А маці доўга не ведала, куды я знік (дазволу ў яе не спытаў, бо не пусціла б). Настала ноч, першая мая партызанская ноч. Зямлянак тады яшчэ не будавалі, было пару «збудаванняў» накшталт шалаша, а большасць партызан уладкоўвалася на начлег проста на зямлі, падаслаўшы пад бок некалькі галін. Усё сціхла, толькі хвоі злавесна шумяць у небе, у лесе чорная цемра. Я сумна сядзеў пад дрэвам. «Дзе там мая мамка? А брацік і сёстры спяць недзе ўжо ў цёплай пасцелі»,— думаў я. Паклаўшы на зямлю некалькі галін, лёг. Але сон не ішоў. Баючыся, што заплачу, зацягнуў песню. З шалаша камандзіра раздаўся голас: «Хто гэта людзям спаць не дае?» Я сціх. Над раніцу сон змарыў мяне. І пайшлі партызанскія дні і ночы, запоўненыя трывогамі, баямі, паходамі. Восенню 1942 г. паша брыгада трапіла ў варожую блакаду. Ніколі не забыць тыя цяжкія дні нашага выхаду з яе. Усе, хто выйшаў, накіраваліся ў лепельскія лясы. Мяне пакінулі, каб я ўсё перадаў сувязным. Я прыйшоў дадому, у Багрынава, стомлены, галодны, валіўся з ног. Лёг і заснуў як забіты. А тым часам у вёску наехалі гітлераўцы. Відаць, нехта ім паведаміў, што ў нашай хаце партызан. Мае родныя не ведалі, што рабіць. Бабуля моўчкі стаяла каля мяне соннага і, кідаючы позірк то на мяне, то ў акно, плакала. Яе слёзы ўпалі мне на твар, я прахапіўся. Кінуўся да акна і ўбачыў, як шчыльны ланцужок гітлераўцаў з аўтаматамі напагатове акружыў нашу хату. Я некалькі секунд раздумваў, а пасля схапіў бязмен, што вісеў на сцяне, і кінуўся ў дзверы. Гітлераўцу, які спыніў мяне, стаў тлумачыць, што я не з гэтай хаты, вось прыйшоў, маўляў, папрасіць бязмен і бягу дадому. Ён і пусціў мяне. Непадалёку стаяў ток. Стары Сідар Чмурак веяў там якраз зерне. У таку была ёўня для прасушвання снапоў, у ёй — маленькае акенца. Ускочыўшы туды, я праз акенца вылез на бульбяное поле, дзе быў ужо нябачны фашыстам. Схаваўся на сене ў Чмуракоў і праз шчыліну ў сцяне стаў сачыць за нашай хатай. А фашыстам ужо нехта сказаў, што я і быў той самы партызан. Азвярэлыя гітлераўцы ўварваліся на ток і сталі пытаць старога, куды ён мяне схаваў. Дзед сцвярджаў, што не бачыў мяне. Збіўшы яго да паўсмерці, фашысты вярнуліся ў наш дом. Мне было відаць, як вывелі яны на двор маці, бабулю, сясцёр, меншага браціка. Мама рванулся бегчы, яе тут жа скасіла аўтаматная чарга. Закамянела ў мяне сэрца, хацелася закрычаць на ўвесь белы свет. Доўга шныралі ворагі навокал, але так і не знайшлі мяне. Праз некалькі гадзін, забраўшы з сабой бабулю і дзяцей, гітлераўцы ад'ехалі ў напрамку Талачына. Больш маіх родных ніхто не бачыў. Людзі кажуць, што, патрымаўшы іх у талачынскай турме, бабулю і дзяўчат расстралялі, а маленькага браціка фашыст нераламаў цераз калена. А я жыў, жыў і змагаўся, насуперак праклятым ворагам, помсціў ім за смерць родных, за гора, якое прынеслі на нашу зямлю. Памятаю, у складзе групы падрыўнікоў на чале з Волкавым хадзіў падрываць эшалон на ўчастку чыгункі паміж Талачыном і Коханавам. Фашысты к таму часу навучыліся высвятляць паяўнасць мін на палатне — перад тым, як пройдзе поезд, пускалі платформу з пяском. Таму мы, прыладзіўшы міну на рэйку з боку, прывязвалі да яе доўгі шнурок і чакалі з'яўлення цягніка, каб пацягнуць за шнурок пасля таго, як праедзе платформа з пяском. Паколькі мяне малога заўважыць было цяжэй, я ляжаў бліжэй за ўсіх да чыгуначнага палатна і трымаў у руках тоўстую прадзеную нітку, што была прыладжана да міны. З'явіўся цягнік, я рвануў нітку на сябе, раздаўся выбух. Кінуўся ўцякаць, але мяне дагнала тоўстая драўляная палка, якая ўзляцела ў паветра. Я ўпаў, аглушаны. Вяртацца за мной астатнім партызанам было ўжо позна. Суткі праляжаў непрытомны. Калі ачуняў, бачу вакол хмызняк, зусім побач чуецца нямецкая мова. Нейкі момант, нічога не разумеў, дзе я і чаму. Пасля ўспомніў. Нейкім цудам застаўся незаўважаным пад самым носам у фашыстаў. Калі сцямнела, прабраўся ў атрад. Колькі радасці было! Усе ўжо лічылі мяне загінуўшым.

У жніўні ці то верасні 1943 г. ўдзельнічаў у дыверсіі на ўчастку чыгункі Талачын — Трацылава. Быў цяжка паранены ў левую нагу (сляды да гэтага часу засталіся). Тыдзень праляжаў у бліжэйшай вёсцы (у атрадзе зноў лічылі, што я загінуў). Перавезлі мяне ў атрад, калі сувязныя з вёскі паведамілі, дзе я. Наш доктар Таццяна Якаўлеўна Крывіцкая паставіла мяне зноў на ногі.

У незабыўныя дні вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мы базіраваліся на тэрыторыі Шклоўскага раёна. У адзін з летніх дзён да нас у лес нечакана прыехала амерыканская машына. Мы ўсе

схапіліся за аўтаматы. Калі машына спынілася, з яе выйшлі чырвонаармейцы. Мы вачам сваім не верылі, думалі, можа, гэта перапранутыя ворагі. А гэта былі разведчыкі нашай роднай Чырвонай Арміі.

З успамінаў М. А. Сафронава, былога начальніка разведкі 5-га партызанскага атрада брыгады «Чэкіст»

Маленькі партызан Коля Цыбульскі прабыў у нашым атрадзе з лета 1942 г. да лета 1944 г. Хадзіў у разведку, з падрыўнікамі на чыгунку, быў добрым правадніком. Неацэнную паслугу зрабіў ён атраду як разведчык.

Аднойчы партызанскі атрад пайшоў на некалькі дзён на заданне. У лесе застаўся толькі партызанскі шпіталь з хворымі і параненымі, некалькі партызан для аховы, санітары і ўрач Т. Я. Крывіцкая. Усё было ціха і спакойна. Але нечакана на базу атрада прыскакаў на кані Коля і паведаміў, што ў бок шпіталя рухаецца атрад карнікаў. Неабходна было тэрмінова эвакуіравацца. Коля ўзяў карабін, гранаты і паспяшаўся насустрач ворагу. Ён сустрэўся з карнікамі недалёка ад шпіталя. Падпусціўшы фашыстаў бліжэй, кінуў пару гранат і стаў страляць з карабіна, перабягаючы ад аднаго дрэва да другога. Пасля некаторай разгубленасці немцы адкрылі агонь і сталі праследаваць партызана. Адвёўшы фашыстаў далёка ўбок, Коля без перашкод дабраўся да шпіталя. Толькі праз гадзіну ўварваліся фашысты на апусцелую базу. Усе, каму Коля выратаваў жыццё, шчыра дзякавалі.

Наш маленькі патрыёт зрабіў вельмі многа для атрада, за што ў 14-гадовым узросце быў узнагароджаны медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені.

Разведчык Алег Беразнеў

Чэрвень... Ён кожны год прыходзіць да нас багаццем фарбаў і кветак. Чэрвень — заўсёды асаблівы для дзесяцікласнікаў.

Такім ён быў і ў сорак першым. Алег Беразнеў разам са сваімі аднакласнікамі развітваўся на выпускным вечары з роднай школай. Быў гэты вечар і сумным і радасным. Заўтрашні дзень павінен быў стаць пачаткам новага самастойнага жыцця. Планы ва ўсіх былі розныя, а значыць розныя і шляхі-дарогі. Але страшная вестка аб вайне раптам разам разбурыла ўсё. Мара стаць урачом, як бацька, здавалася цяпер такой далёкай.

З першых дзён учарашнія дзесяцікласнікі разам з дарослымі працавалі на збудаванні ваенных умацаванняў на подступах да Талачына. Дарослыя неяк адразу пастарэлі, дзеці — пасталелі.

Калі ў Варанцэвічы прыйшлі фашысты, Алег ведаў, што трэба дзейнічаць. Але што рабіць, з чаго пачынаць, зразумела, ніхто не ведаў. Аднойчы Алег прапанаваў узяць пад сваю апеку жанчыну з дзіцём, якія ўцяклі з нямецкага гета. Юныя патрыёты хавалі іх, па чарзе прыносілі яду. Па ініцыятыве Беразнева моладзь агітавала жыхароў роднай вёскі не здаваць акупантам прадукты, цёплае адзенне, абутак.

Ішоў час. У вёсках пачалі гаварыць аб партызанах. Цяпер паўставала пытанне, як ім дапамагчы. Камсамольцы Беразнеў, В. Благуш, І. Альшэўскі і А. Мачахоўскі сталі здабываць зброю, да іх далучыліся Н. Гурская, Н. Дземяшкевіч, А. Прускі. Да вясны сорак другога ў кожнага з іх было па 2—3 вінтоўкі. Усе пайшлі ў партызаны. Алег стаў разведчыкам атрада А. Ф. Сімдзянкіна брыгады «Чэкіст». Яму даручалі самыя цяжкія і небяспечныя заданні. І ён ні разу не падвёў камандаванне. Аб смелых дзеяннях маладога разведчыка і яго таварышаў стала вядома немцам. У жніўні 1942 года ў якасці заложнікаў былі схоплены бацькі Алега, а чатырохгадовая сястрычка засталася ў суседзяў. Было аб'яўлена, калі здасца, то бацьку і маці адпусцяць.

У пачатку 1943 года Алег пайшоў праведаць сястрычку. А ў гэты час у яго вёсцы гаспадарылі немцы. Алега схапілі. Раздзетага, прывязанага да саней, яго вялі да Талачына па трыццаціградусным марозе. У фашысцкім засценку Алег перанёс страшэнныя пакуты, але таварышаў не выдаў. Калі яго везлі на расстрэл, ён выскачыў з машыны і паспрабаваў уцячы. Але куля дагнала партызана. На стала нашага любімага бясстрашнага Алега Беразнева.

Праз усе выпрабаванні

З успамінаў Іосіфа Іванавіча Мацюшэўскага, былога партызана брыгады «Чэкіст»

І. І. Мацюшэўскі.

Было мне амаль семнаццаць гадоў, калі пачалася вайна. Працаваў я тады рабочым у Аршанскім паравозным дэпо. Разам з сябрам Васілём Болдаравым пайшлі ў Аршанскі райваенкамат. Мяне на фронт не ўзялі — не хапала некалькіх месяцаў. Вярнуўся на работу. Трое сутак ніхто з нас не выходзіў з дэпо і не спаў — трэба было тэрмінова выпусціць з кансервацыі ўсе паравозы, некалькі паравозаў было на рамонце. Пасля пагрузкі станкоў і абсталявання ў дэпо станцыі Усходняя перайшлі ў дэпо станцыі Цэнтральная ў распараджэнне К. С. Заслонава. Ён папярэдзіў, што мы выедзем з Оршы апошнім эшалонам. Я расказаў Заслонаву пра свайго бацьку — інваліда. Той параіў завезці яго да родных у вёску і адпусціў мяне. Калі я прывёз бацьку ў Полюдава да яго сястры, там ужо былі немцы. Я зноў падаўся ў Оршу. Ішоў разам з немцамі, у пасёлку Барань абагнаў іх. У Оршы ў гэты час нашых ужо не было. Ішлі баі на подступах да горада. Успомніў, што ў ленінскім кутку аховы чыгуначных стрэлак быў радыёпрыёмнік. Забег туды. Прыёмнік быў на месцы, ляжала шмат новых кажухоў для вартаўнікоў. У адзін з іх я загарнуў прыёмнік і занёс дамоў. На другі дзень падгаварыў свайго сябра Стася Пераплыць на другі бок Дняпра, адкуль страляюць па горадзе нашы. Каля ракі нас злавіў п'яны фашыст, Стася адпусціў, а за мяне ўчапіўся, паўтараючы адно і тое ж слова «юда» (што яно азначала, я тады не ведаў). Моцна трымаючы за каўнер, загадаў мне зняць штаны і чаравікі. Я зразумеў, што зараз адбудзецца штосьці страшнае і з усяе сілы стукнуў фашыста па галаве. Ён не ўтрымаўся і ўпаў, а я па яры кінуўся наўцёкі. Заставацца ў Оршы было небяспечна. Узяўшы сёе-тое з пажыткаў, радыёпрыёмнік, паехаў да цёткі ў вёску Любатынь. Тут знайшлі сабе прытулак шмат ваеннаслужачых, якія не змаглі выйсці з акружэння (каля дваццаці чалавек). З адным з іх, Васілём Мальцавым з Ленінграда, я пасябраваў. Збіраліся разам з іншымі ваеннаслужачымі ў доме маёй цёткі Туманскай. Прыёмнік уключалі на кароткі час — бераглі батарэйкі. У канцы лістапада мяне папярэдзілі, што староста ведае пра радыёпрыёмнік і нашы зборы. Літаральна на наступны дзень староста аб'явіў, што ўсе ваеннаслужачыя, у тым ліку і я, павінны з'явіцца ў Коханава для рэгістрацыі. Я, прыхапіўшы прыёмнік, у той жа дзень непрыкметна пайшоў у вёску Філатава Круглянскага раёна, куды перабраліся бацькі. Жылі ў будынку школы, прыёмнік знаходзіўся на гарышчы. У красавіку 1942 г. староста вёскі Станіслаў Бабровіч, наш сваяк, папярэдзіў, што я занесены ў спіс для адпраўкі ў Германію (уцякаць не было сэнсу — за «дэзерцірства» расстрэльвалі ўсіх членаў сям'і). «На гэтыя дні я цябе адпраўлю ў Азерыцкі лагер ваеннапалонных і пры першай магчымасці прышлю замену»,— параіў Бабровіч. У той час на работу ў лагеры часова забіралі мясцовых жыхароў. Разам са мной пайшло пяць хлопцаў прызыўнога ўзросту. У лагеры аб'явілі, што за спробу збегчы будуць расстраляны нашы родныя, і зачыталі, дзе яны жывуць. Калі ваеннапалонныя чым-небудзь правініліся, камендант лагера асабіста расстрэльваў кожнага пятага ў страі. Аднойчы пятым у шарэнзе быў я, ён ужо схапіў мяне за грудзі, як яго позірк спыніўся на высокім прыгожым хлопцу з Мінска, які стаяў побач са мной. Камендант замест мяне вывеў з шарэнгі Валодзю. Ён пры ўсіх развітаўся са мной і з песняй падаўся наперад, а потым нечакана моцна ўдарыў каменданта (той, як сноп, паваліўся на зямлю) і пачаў уцякаць. Але куля дагнала смельчака.

У чэрвені 1942 г. мне перадалі, што ў Філатаве за сувязь з партызанамі расстралялі чатырох жыхароў вёскі, спалілі некалькі хат. Пачалі з будынка школы. Не адышлі ад яе, пакуль поўнасцю не згарэла. На пажарышчы застаўся абгарэлы прыёмнік... Схапілі маіх бацьку і маці і таксама павялі расстрэльваць. Але ўсе жыхары вёскі заступіліся за іх — пераканалі карнікаў, што прыёмнік школьны і бацькі нічога не ведалі пра яго (хоць усім было вядома, што прыёмніка ў школе ніко-

лі не было). Так засталіся жывымі мае бацькі.

Мне ўдалося вырвацца з лагера толькі ў жніўні 1942 г. Разам з Іванам Жукоўскім і Васілём Яцэвічам хаваліся ў хлявах у вёсцы Любішча, куды пераехалі бацькі. Адной-чы ноччу да нас у хлеў зайшлі партызаны. Іх было пяць чалавек. Камандаваў імі Г. М. Каўрыга (начальнік штаба 30-га асобнага атрада 8-й Круглянскай брыгады, да кастрычніка 1942 г. называўся атрад «Антона».— Рэд.). Я расказаў пра сябе, стаў прасіцца ў партызаны. «Вазьму, але пазней»,— паабяцаў Каўрыга і папрасіў мяне правесці іх да чыгункі. З нас траіх падыходы да не я ведаў горш, але не прызнаўся — вельмі ўжо не хацелася ўпускаць магчымасці.

Міну падкладваў сам Каўрыга. Поезд і большая частка эшалонаў пайшла пад адхон (я ўпершыню бачыў гэта сваімі вачамі).

Перад самай зімой, як раз выпаў першы снег, да мяне зайшоў Каўрыга і сказаў, што трэба ехаць у Оршу да сястры, якая працавала ў чыгуначнай сталоўцы, каб яна дапамагла мне ўладкавацца на работу ў дэпо: «Пастарайся трапіць па чыгунку. Сувязь будзеш трымаць з Іванам Левановічам». Івана я ведаў, бо да вайны працаваў з ім у дэпо (у вайну Левановіч жыў у Жукневе).

У Оршы я ўладкаваўся на станцыю Усходняя, разносіў вугаль па кватэрах немцам. Пазнаёміўся з Барысам Міхневічам, Анатолем Левановічам (сынам Івана Левановіча), Васілём Федчанкам. Апошні працаваў на станцыі перапісчыкам вагонаў, быў адукаваны і фашысты яму давяралі. Гэты журнал ён трымаў дома і перадаваў звесткі партызанам. У час чарговай сустрэчы з сувязным мы вельмі прасілі Левановіча даць хоць адну магнітную міну, але іх пакуль у атрадзе не было.

...У канцы жніўня прыехаў Іван Левановіч і прывёз першую магнітную міну. Дні праз тры Вася перадаў, што на станцыю Цэнтральная прыбыў састаў з наліўным бензінам.

— Давай міну ці сам хутчэй бяжы — восьвось ён адпраўляецца,— падганяў сябар.

Пад выглядам, што баляць зубы, я адпрасіўся ў шэфа і за дваццаць хвілін дабег да станцыі. Міну падлажыў пад першы вагон.

Узрыў адбыўся каля станцыі Краснае, але не вельмі ўдала — згарэла толькі чатыры цыстэрны.

У верасні раптоўна арыштавалі Міхневіча і Левановіча. А вечарам да мяне прыйшоў познаёмы мужчына, які вельмі прасіў звязаць яго з партызанамі. Ён мне здаўся падазроным, і я адказаў, што калі б у мяне была зброя, то здаў бы яго куды трэба.

Праз некалькі дзён мяне папярэдзілі, што за мной сочаць і трэба неадкладна пакідаць горад, маўляў, заўтра будзе позна. У той жа дзень даехаў на таварняку да Коханава, на хаду саскочыў з поезда і пайшоў да Левановіча ў Жукнева. Там мяне сустрэлі... Бора і Анатоль, якім выпадкова ўдалося вырвацца з турмы. Разам з Барысам Міхневічам пайшлі ў лес, каб пра ўсё далажыць Севасцьянаву. Там і засталіся.

У кастрычніку 1943 г. па загаду начальніка штаба Р. М. Севасцьянава я разам з Н. Фаміной і В. Гарбацэвіч атрымаў першае важнае заданне — перасекчы падземную сувязь Берлін — фронт. Трэба было перайсці чыгунку Мінск — Масква (кабель праходзіў каля аўтамагістралі Мінск — Масква). Прыпыніліся ў вёсцы Пагрэбішча, непадалёку ад станцыі Слаўнае. У вёсцы Губарэва зайшоў за знаёмым хлопцам Валодзем Акалакулаком (з лістапада 1943 г. стаў партызанам 20-га атрада брыгады «Чэкіст»), які дапамог днём перайсці чыгунку. Кабель перасякалі ноччу, а на наступны дзень зноў непрыкметна перайшлі чыгунку. Як доказ аб выкананні задання прыхапілі з сабой кавалак выразанага кабеля.

Да студзеня 1944 г. не раз са сваімі баявымі сябрамі Мішам Агатчанкам, Анатолем Пратасевічам, Фёдарам Белавусавым выконвалі рызыкоўныя заданні па падрыву эшалонаў, удзельнічалі ў адкрытых і засадных баях. 21 студзеня пры ўзяцці гарнізона ў Карзунах, што каля Шклова, я атрымаў цяжкае раненне ў ніжнюю сківіцу. Да сакавіка са мной, як з малым дзіцем, няньчыліся партызанскія ўрачы (асаблівую чуласць і дабрыню праяўляла ўрач Ганна Іванаўна Кокіна). А 8 сакавіка мяне пераправілі на самалёце ў шпіталь.

У жніўні 1944 г. адразу пасля шпіталю прыехаў я ў Оршу і перш-наперш зайшоў да маці Васі Федчанкі. Тут і даведаўся пра страшную вестку: у канцы лютага 1944 г. фашысты схапілі Васю пры спробе пераправі ць у лес фурманку са зброяй. Яго доўга і страшэнна катавалі. У канцы красавіка, калі маці Васі прыйшла з перадачай, ёй аддалі акрываўленае адзенне сына...

Міша Агатчанка, смелы партызан, сапраўдны герой, на рахунку якога каля дзесяці падарваных эшалонаў, таксама загінуў пры выкананні баявога задання...

Браты Мачахоўскія

У Фёклы Майсеевны Мачахоўскай з вёскі Багрынава раслі трое сыноў. Старэйшы, Анатоль, скончыў 7 класаў, памагаў маці па гаспадарцы. Марыў стаць пагранічнікам, да прызыву ў армію заставалася некалькі месяцаў. Малодшаму, Івану, ішоў дванаццаты год, калі пачалася вайна...

А. Р. Мачахоўскі.

І. Р. Мачахоўскі.

Няўлоўны

У пачатку лета 1942 г. ў партызанскі атрад А. Ф. Сімдзянкіна прынялі камсамольца Анатоля Мачахоўскага. Юнака ўжо многія ведалі ў атрадзе, некаторыя партызаны не раз бывалі ў яго дома.

Былы камандзір атрада Сімдзянкін успамінае: «Памятаю, як зашчымела сэрца, калі ўбачыў Анатоля ў страі партызан. Нізенькі, вінтоўка намнога вышэй галавы. Ці зможа ён хадзіць у далёкія паходы, выконваць рызыкоўныя заданні — прызнацца, не быў упэўнены».

Але Анатоль выдатна зарэкамендаваў сябе на першым жа заданні. Юнак лепш за сваіх равеснікаў ведаў навакольныя лясы і вёскі. Гэта вельмі дапамагала партызанам. Ды і ў атрад ён прыйшоў не з пустымі рукамі — яшчэ восенню 1941 г. натрапіў у лесе на дзве вінтоўкі і прыхаваў іх. А неўзабаве знайшоў у мурашніку вінтовачны абрэз і наган з патронамі. Усё гэта прынёс дамоў, закапаў на агародзе.

Пра тое, што Анатоль у партызанах, у хуткім часе даведаліся немцы, нечакана наляцелі ў вёску. Шукалі маці Анатоля і яго малодшага брата. Але добрыя людзі надзейна схавалі іх. У той прыезд немцы папярэдзілі суседзяў Мачахоўскіх, што, калі Анатоль не вернецца з лесу, яго маці і брата расстраляюць. Потым зноў наведаліся. На шчасце, маці з сынам паспелі ўцячы. Карнікі спалілі хату Мачахоўскіх, разрабавалі гаспадарку. Да канца вайны пажылой жанчыне прыйшлося хавацца ў чужых людзей. Іван пайшоў да брата ў партызаны. Анатоль у гэты час ужо быў залічаны ў разведку.

Начальнік разведкі атрада М. А. Сафронаў успамінае: «Ён быў верным сябрам, надзейным таварышам у любым паходзе. Кемлівы, знаходлівы і бясстрашны. З такімі якасцямі Толя мог стаць сапраўдным разведчыкам, і я з радасцю ўзяў Мачахоўскага да сябе ў разведку».

28 жніўня 1942 г. карнікі пачалі блакаду Рацаўскага лесу. Суткі вяла брыгада «Чэкіст» няроўны бой. Становішча было цяжкім — стала вядома аб падрыхтоўцы фашыстамі поўнага акружэння брыгады. Камандаванне прыняло рашэнне перайсці цераз балота ў лясны масіў каля вёскі Любатынь.

Камандзір атрада Сімдзянкін загадаў разведчыкам Анатолю Мачахоўскаму і Пятру Страздзіну праверыць, ці ёсць у прылеглых да Любатыні вёсках немцы. У Любатыні іх не аказалася, не было і ў вёсцы Дуброўскія. Разведчыкі падышлі да Поўсціхава. Было ціха і спакойна. Зайшлі ў вёску. І тут на другім яе канцы пачуўся гул матораў — у вёску ўязджалі варожыя бронемашыны і грузавікі з салдатамі. Назад ісці было нельга, хоць шлях да лесу свабодны: немцы абавязкова заўважаць партызан. Схаваўшы зброю пад вопратку, разведчыкі схапілі першае, што трапіла пад рукі ў сялянскім дварэ — вілы і граблі, і агародамі накіраваліся за вёску, дзе ў полі працавалі людзі. Калі да лесу было рукой падаць, з вёскі вылецеў бранявік і, страляючы, паімчаў наўздагон. Анатоль і Пётр схаваліся ў кустах. Ноччу дабраліся да Любатынскага лесу, але брыгады ўжо не было. Населеныя пункты вакол Рацаўскага лесу былі літаральна забіты немцамі. Раніцай разведчыкі заўважылі, што ў іх бок ад вёскі Лагаўшчына рухаюцца ланцугі карнікаў, не менеў двухсот чалавек. Прачасаўшы аўтаматнымі чэргамі ўзлесак, фашысты ўключылі гучнагаварыцелі. Страляніна заціхала. Хвілін праз пятнаццаць гітлераўцы зноў, паліваючы зараснікі свінцом, рушылі ў глыбіню лесу. Партызанскія разведчыкі затаіліся ў лясным гушчары і, на шчасце, іх не заўважылі. Пашанцавала, што карнікі былі без сабак. Услед за варожым ланцугом падаліся наперад і разведчыкі. Ноччу перасеклі чыгунку, аўтамагістраль Мінск — Масква і праз некалькі дзён дагналі брыгаду каля Лукомльскага возера.

Зімой 1943 г. брыгада дыслацыравалася на Бярэзіне. У раёне Талачына, Оршы, Шклова

знаходзіліся на заданні асобныя партызанскія групы. У надзвычай цяжкіх умовах дзейнічалі партызаны і разведчыкі зімой і вясной 1944 г. Фашысты люта абараняліся. Імкнучыся любой цаной стрымаць наступленне Чырвонай Арміі, будавалі ўкрыцці, абарончыя збудаванні, умацоўвалі існуючую абарону, актывізавалі барацьбу супраць партызан. На лясных дарогах, пры ўездах у вёскі стварылі назіральныя пасты, сакрэты. У любы час і ў любым месцы разведчыкі маглі сутыкнуцца з нямецкімі салдатамі.

У сакавіку 1944 г. М. А. Сафронаў атрымаў заданне нанесці на схему-карту абарончага рубяжа фашыстаў на лініі Талачын — Коханава ўсе варожыя агнявыя кропкі, мінныя палі, супрацьтанкавыя рубяжы, склады з боепрыпасамі, а таксама сабраць звесткі аб руху вайсковых часцей і тэхнікі па чыгунцы Мінск — Масква. Сафронаў узяў з сабой Анатоля Мачахоўскага, Васіля Вятошкіна, Пятра Страздзіна, Валодзю Благуша і яшчэ траіх маладых адважных партызан. Было ім крыху больш за дваццаць, а некаторым і менш. Вясёлыя, бясстрашныя, няўрымслівыя, яны сябравалі, добра разумелі адзін аднаго, стараліся па магчымасці разам хадзіць па заданні. Нельга не назваць і яшчэ аднаго іх сябра — Мамадалі Тапівалдыева. У брыгадзе гэту групу ведалі ўсе і вельмі любілі. Часцей за ўсё Анатоль хадзіў на заданні з Мамадалі. Пра смельчакоў складалі легенды. Маладосць, бясстрашша і ўдаласць, кемлівасць і рызыка дапамагалі ім у самых складаных сітуацыях.

У сакавіку 1944 г. акупанты, пачынаючы ад Дняпра, разгарнулі карныя экспедыцыі. Вораг шырокім фронтам рухаўся ўздоўж чыгункі Коханава — Талачын — Слаўпас. Данясенне ў штаб брыгады аб пачатку карнай аперацыі разведчыкі даставіць не маглі — група не здолела прабіцца праз нямецкі заслон: у раёне Рацаўскага лесу наткнулася на варожую засаду. У няроўным баі па-геройску загінуў Валодзя Благуш. Астатнія вярнуліся назад да Талачына. Яшчэ раз паспрабавалі перайсці чыгунку паміж Талачыном і Коханавам, але зноў няўдача. Вырашылі ўкрыцца ў вёсцы Замошша. Зайшлі да аднаго знаёмага старога, схаваліся ў саломе. Стары пайшоў у бліжэйшую вёску па разведку. Вестка была трывожнай — немцы ад Замошша знаходзіліся ў пяці кіламетрах, праглядаюць і прастрэльваюць усе пабудовы. Прайсці праз варожае ачапленне было амаль немагчыма — ноччу паміж вёскамі арганізоўваліся засады і сакрэты. У Анатоля была з сабой форма нямецкага паліцэйскага, якой ён карыстаўся ў пэўных сітуацыях. Вырашылі пайсці на хітрасць. Ноччу выйшлі на ўзлессе каля вёскі Дуброўскія. Раніцай 22 сакавіка размясціліся па тры чалавекі на заходнім і ўсходнім украйках лесу. Раніцай немцы выйшлі з займаемых вёсак і накіраваліся ў бок чыгункі, а частка іх з вёскі Дуброўскія пайшла полем ў Замошша. Лес, у якім знаходзіліся разведчыкі, стаяў на іх шляху. Партызаны на ўсходнім ускрайку лесу былі заўважаны. Ім прыйшлося адступаць уздоўж лесу да ракі Крывая, якую ўдала перайшлі і зніклі ў балоце каля самай чыгункі. Другой групе адыходзіць не было куды. Тады Анатоль пераапрануўся ў нямецкую форму. Узяў «пад ружжо» Вятошкіна і Сафронава і павёў насустрач немцам. Але сустрэча з імі ў лесе была небяспечнай, таму разведчыкі хутчэй выбраліся з лесу і полем накіраваліся ў бок вёскі Дуброўскія, з якой толькі што выехаў атрад немцаў. Камсамолец Мачахоўскі, перавесіўшы аўтаматы сяброў цераз плячо, павёў «арыштаваных» па полі. Толькі паспелі адысці ад лесу метраў пяцьдзесят, як убачылі нямецкі абоз з 20 падвод. Немцы заўважылі ішоўшых, спыніліся і пачалі назіраць. Было бачна, што яны вагаюцца і не ведаюць, страляць ім ці не. Тады Анатоль, не спыняючыся, замахаў фашыстам рукой, маўляў, усё ў парадку, працягвайце свой шлях. Ішоў і махаў рукой... Немцы, пастаяўшы на дарозе, відаць, вырашылі, што паліцэйскі вядзе арыштаваных у вёску і паехалі далей. А разведчыкі пад канвоем свайго сябра ўдачна прайшлі вёску Дуброўскія і пайшлі ў процілеглы лес.

...Шмат было баёў, дыверсій і засад, у якіх удзельнічаў партызанскі разведчык Анатоль Рамапавіч Мачахоўскі. Колькі разоў быў на валаску ад смерці, але пашчасціла застацца жывым. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і ордэнам Славы III ступені, трыма медалямі «За баявыя заслугі».

У пасляваенны час больш дваццаці гадоў працаваў у органах МУС Казахстана, у іншых месцах краіны, у апараце Талачынскага райвыканкома. З такой жа няўрымсліваcцю і неспакоем былы разведчык працягваў працу ў мірны час.

Баявое партызанскае брацтва, народжанае ў ліхую часіну, працягвае жыць. І не мае значэння, што яго сябар Мікалай Аляксеевіч Сафронаў жыве ў горадзе Йашкар-Ала. Мамадалі Тапівалдыеў жыў у Фергане. Часта бываў у іх, прыязджалі да дарагіх мясцін сваёй маладосці і яны. Гэта стала патрэбай...

Малыш

Сярод партызан худзенькі непрыкметны Іван Мачахоўскі быў, бадай, самым юным.

Любоўна, па-бацькоўску адносіліся да яго дарослыя і называлі Малыш.

Упершыню пагроза смерці навісла над яго сям'ёй вясной 1942 г.

— Да нас зайшлі сябры брата Анатоля. Сярод іх былі акружэнцы і мясцовая моладзь,— успамінае Іван Раманавіч,— хлопцы чысцілі вінтоўкі. У гэты момант забегла маці і толькі змагла прамовіць: «Немцы! Ратуйцеся, дзеткі, спаляць!» Зброю паклалі пад сяннік. Мне загадалі класціся ў ложак. Матуля загаласіла, кінулася насустрач гітлераўцам: «Паночкі, ці ёсць у вас доктар? Сынок на тыф захварэў». Немцы, пачуўшы слова «тыф», замахалі рукамі і хутка падаліся са двара.

Першае баявое хрышчэнне ў якасці «тыфознага» Іван Раманавіч запомніў на ўсё жыццё.

Брат Анатоль дамоў наведваўся рэдка і толькі ўначы. Прыходзіў звычайна з Пятром Страздзіным. Калі спалілі родную хату, маці з Іванам перабралася ў Варанцэвічы да знаёмых. Але ў кастрычніку 1942 г. нечакана і на гэту вёску наляцелі карнікі. Хапалі ўсіх без разбору. Ваню таксама злавілі. Але ён добра парумзаў перад афіцэрам і яго адпусцілі. На ўскрайку ж вёскі яго зноў схапілі. «Куды, даражэнькі! Няхай цяпер браток-партызан цябе выручае»,— кінуў у твар паліцэйскі. Хлопчыка ўпіхнулі ў адну з трох крытых брызентам машын, перапоўненых людзьмі. Ніхто не ведаў, куды іх вязуць. У вёсцы Зайкаўшчына калона спынілася. Частка гітлераўцаў падалася ў хату каля дарогі. Калі галасы немцаў, якія ахоўвалі машыны, аддаліліся, чыйсьці мужчынскі голас у машыне сказаў: «Пашчасціла табе, хлопец, ратуйся!» Ваню ціхенька спусцілі з кузава на зямлю. Ён яшчаркай шмыгнуў пад мост. І ў гэты ж момант пачалася страляніна. «Мусіць, яшчэ нехта ўцёк»,— падумаў хлопчык. Некалькі чэргаў канваіры выпусцілі пад мост. Потым стала ціха. Ваня асцярожна вылез на дарогу. Толькі цяпер адчуў боль у руцэ і назе. Ад страху дрыжыкі праціналі цела. Куды было ісці? Зарыентаваўшыся, пайшоў у бок Воўкавіч. Ціхенька падышоў да хаты партызанскага сувязнога, якога ведаў як Каваля. Той агледзеў хлопца, суцешыў: «Нічога страшнага — скуру толькі падрапала». Тут Іван і запачаваў. Раніцай Каваль папрасіў:

— Вёску пакінуць не магу — сочаць. Прыйдзецца табе збірацца ў дарогу, хлопча. Перадай нашым, што на млыне ў Зайкоўшчыне немцы падрыхтавалі да адпраўкі муку, збожжа. Ахова невялікая...

Апрануўшыся пад жабрака, Малыш накіраваўся ў лес. Даручэнне сувязнога было выканана. А неўзабаве партызаны адбілі ў немцаў млын, які стаў працаваць пад аховай партызан.

У лютым 1944 г. Ваню залічылі ў дыверсійную групу Андрэя Якаўлевіча Казанцава з партызанскага атрада № 5. Камандзір атрада Сімдзянкін лічыў, што, калі браты будуць разам, Ваню будзе лягчэй перапосіць усе нягоды ляснога жыцця. Юны падрыўнік удзельнічаў у аперацыі «Рэйкавая вайна» ў чэрвені 1944 г.

Але не толькі падрыўная справа стала асноўным заняткам Вані Мачахоўскага. Ён удзельнічаў у многіх баявых аперацыях, выконваў небяспечныя даручэнні.

— У вёсцы Крывое,— успамінае Іван Раманавіч,— стаяў невялікі гарнізон. Вораг меў каля дваццаці добрых коней, якія вельмі былі патрэбны брыгадзе. Мне і яшчэ двум партызанам было загадана «рэквізаваць гужавы транспарт».

...Па пыльнай вясковай дарозе адзінока маячыла худзенькая постаць Малыша. У руцэ ён трымаў кошык, у ім ляжалі яйкі, самагонка. Паліцэйскі, які ў гэты дзень пасвіў коней, здалёк угледзеў хлопчыка.

— Куды ідзеш? — спытаў паліцэйскі.

— На станцыю Талачын, даядзечка,— маці загадала абмяняць вось гэта на соль. Паліцэйскі «клюнуў» на прынаду. І калі ён дапіваў бутэльку самагонкі, за яго спіной нечакана раздалося: «Рукі ў гору! Не варушыцца!».

...Коней распуталі і пагналі лесам у партызанскі лагер...

Надышло доўгачаканае вызваленне. Юны партызан з медалём «За адвагу» на грудзях пайшоў працягваць вучобу. Ваеннае дзяцінства загартавала былога партызана, стаў ён не па гадах сур'ёзным і ўдумлівым. Зусім маладога яго выбралі старшынёй Алёнавіцкага, потым Азерацкага сельскіх Саветаў. Ён — аграном стаў старшынёй калгаса «Радзіма».

У. У. Шаўчэнка, А. А. Шнэйдар.

Біяграфія пачыналася з вайны

З успамінаў Веры Паўлаўны Каралёвай (Благуш), былой разведчыцы 5-га асобнага атрада партызанскай брыгады «Чэкіст»

В. П. Каралёва (Благуш).

Перад вайной я скончыла 9 класаў Варанцэвіцкай сярэдняй школы, была сакратаром камсамольскай арганізацыі школы. Вестка пра вайну літаральна ашаламіла нас. «Трэба ратаваць кнігі»,— першае, што прыйшло ў галаву. Разам з Алегам Беразневым, Валяй Каралёвай, Іванам Каралёвым і малодшым братам Уладзімірам частку кніг школьнай бібліятэкі закапалі, астатнія раздалі камсамольцам на захаванне.

6 ліпеня немцы былі ў Талачыне. Трое сутак няспынным патокам рухаліся яны праз нашу вёску. З закамянелымі сэрцамі назіралі за імі з гарышча. Не хацелася жыць, ад гора не ведалі, што рабіць.

К восені ў Варанцэвічах стала працаваць валасная ўправа. Па загаду каменданта для нямецкай арміі трэба было здаваць хлеб, мяса, малако, сена, цёплае адзенне. Мы, камсамольцы, не маглі сцярпець, каб за кошт нашых людзей адзяваўся і карміўся вораг. Але што мы ў той час маглі зрабіць? І ўсё ж стала на сэрцы крыху лягчэй, калі тайком вывесілі лістоўку на будынку валасной управы. Лістоўку пісалі вялікімі друкаванымі літарамі, каб з дарогі быў бачны яе тэкст. Заклікалі аднавяскоўцаў хаваць хлеб, ігнараваць нямецкія пастаўкі. Усе наступныя дні прыслухоўваліся, што гавораць людзі. Вельмі хацелася, каб наш заклік усхваляваў людзей. Прайшоў нейкі час, усё менш і менш людзей выконвала нямецкі загад. Толькі некаторыя здавалі на арганізаваны ў Варанцэвічах малочны пункт яйкі і малако. Не хачу сказаць, што нейкую ролю тут адыграла і наша лістоўка. Людзі самі бачылі, што такое фашызм.

У нашым доме часта збіраліся Алег Беразневу, мой брат Валодзя Благуш, пазней да нас далучыліся студэнты кансерваторыі Міша Сырадоеў і Іван Альшэўскі. Міша і Ваня былі старэйшымі за нас, і мы сталі адчуваць сябе больш упэўнена. Усе гарэлі жаданнем дзейнічаць. Ідэя збіраць зброю была адобрана, к вясне 1942 г. ў кожнага з нас было па 2—3 вінтоўкі, запас патронаў, гранат. Узнік новы план — спаліць малочны пункт у Варанцэвічах. Праўда, ажыццявіць яго не ўдалося — у красавіку 1942 г. партызаны 1-га асобнага атрада будучай брыгады «Чэкіст» разграмілі малочны пункт і валасную ўправу. У той жа вечар у партызаны пайшоў Алег Беразневу, а праз два тыдні — мой брат Валодзя. У маі — чэрвені ў брыгаду «Чэкіст» улілася ўсе камсамольцы Варанцэвіцкай школы: Толя Мачахоўскі, Антон Хайнацкі, Васіль Вятошкін, Мікалай Баразна, Пётр Ляховіч, Федзя Бараноўскі, Аркадзь Пляханаў, Дуся Сычэнка, Оля Левановіч, Шура Чмародзька, Ліда Дземяшкевіч, Ніна Гурская, Міша Сырадоеў, Ваня Альшэўскі, Ваня Каралёў, пазней — Ігнат Дзядкоў, Ігар Шостак, Косця Заржэцкі і іншыя. Многія з іх загінулі геройскай смерцю. Дачакаліся канца вайны толькі Вася Вятошкін, Толя Мачахоўскі, Федзя Бараноўскі, Оля Левановіч, Шура Чмародзька, Ліда Дземяшкевіч, Ніна Гурская, Ваня Каралёў.

Да мая 1943 г. я жыла дома — дапамагала брату ў зборы разведданых, выконвала даручэнні Мамадалі Тапівалдыева: хадзіла ў Коханава і Талачын, даставала партызанам соль, папяросы, сахарын. Аднойчы, было гэта ў маі 1943, да нас зайшлі шэсць партызан-падрыўнікоў. На дварэ сядзеў Мамадалі, даваў чарговае заданне сувязным з нашай вёскі. Пакарміўшы іх, я пабегла на невялікі ўзгорак збіраць шчаўе. І тут заўважыла, што да нашай вёскі, прыгнуўшыся да зямлі, бягуць немцы, акружаючы яе з усіх бакоў. Я, колькі было сіл, паімчала ў свой двор. Мамадалі яшчэ не паспеў выехаць. «Немцы!» — крыкнула я. Мамадалі разам з падрыўнікамі кінуліся са двара. Завязаўся няроўны бой: сем партызан супраць 50—60 немцаў. Нашы адступалі да лесу. Аднаго партызана параніла ў нагу. Але таварышы не пакінулі яго і паспелі дабрацца да выратавальнага лесу. Карнікі прыйшлі ў наш двор, разрабавалі гаспадарку, забралі раненую карову (маці збілі плёткамі за тое, што прасіла пакінуць карову). Тое, што мы звязаны з партызанамі, карнікам яшчэ не было вядома. Па дарозе ў гарнізон ім хтосьці данёс, што мы — партызанская

сям'я. Назаўтра немцы зноў акружылі вёску. На шчасце, я была на вуліцы і ўбачыла ракеты, якія яны пускалі ў час акружэння. Кінулася за мамай. Мы паспелі адбегчы далей ад хаты і схаваліся на чужым агародзе ў бульбянішчы. Перш-наперш карнікі накіраваліся на наш двор. Нікога не знайшоўшы, пачалі рабаваць вёску. А праз тыдзень Талачынская паліцыя разам з немцамі прыехала на золку рабіць аблаву на моладзь. Мяне таксама схапілі. Ужо і не спадзявалася ўбачыць калі-небудзь родную вёску. Але мне пашанцавала: выпадкова ўдалося ўцячы з цягніка. І адразу пайшла ў партызаны. Прынялі мяне ў 5-ы асобны атрад пад камандаваннем А. Ф. Сімдзянкіна. Спачатку дапамагала гатаваць ежу для партызан, мыла бялізну, хадзіла на заслон, бралі мяне і ў засады. А з студзеня 1944 г. залічылі ў разведгрупу. Вяла разведку ў гарнізоне Машчаніцы. У вёсцы Малыя Машчаніцы былі нашы сувязныя, якія ў выпадку небяспекі знімалі з хаты шпакоўню. Аднойчы мы смела ўвайшлі ў вёску, а хвілін пяць таму назад туды ўехалі нямецкія разведчыкі. Умоўны знак падаць не паспелі, і мы апынуліся ў вельмі складаным становішчы. Убачыўшы нас, немцы схаваліся за дамы. Калі да іх заставалася метраў пяцьдзесят, я раптам заўважыла гітлераўцаў: адзін з іх пачаў паўзці ад хлява да дарогі. «Немцы!» У той самы момант Віктар Пшонка пачаў страляць па фашысту. Адразу ж двое выскачылі з-за бліжэйшых дамоў і адкрылі агонь па нас. Адстрэльваючыся, мы беглі ўніз да ракі, дзе пачыналіся кусты. Да нямецкіх разведчыкаў падаспеў паліцэйскі атрад з Машчаніц. Яны беглі за намі, штосьці крычалі і стралялі. Шансаў уратавацца ад пагоні ў нас не было. Я ўжо бачыла, як вораг забягае з бакоў, здаецца, яшчэ хвіліна — другая і мы акружаны. Да лесу заставалася кіламетры два... Віктара параніла ў нагу. Я схапіла яго сумку з патронамі, наколькі магла, дапамагала бегчы. На вялікае шчасце, страляніну пачулі нашы разведчыкі і кінуліся на выратаванне. Нечаканы агонь, адкрыты нашымі разведчыкамі, спыніў фашыстаў. І тут з'явілася надзея на выратаванне...

Немцы былі раз'юшаны, што з-пад самага носа ўцяклі «бандыты». Прылеглыя да Машчаніц лясы яны ўзялі пад асаблівую ўвагу: спадзяваліся ўсё ж такі нас схапіць. Аднойчы ў пачатку мая 1944 г. яшчэ на досвітку гітлераўцы арганізавалі засаду ў лесе, з якога мы звычайна выходзілі на заданне. Але ў той дзень наша разведка выйшла на заданне пазней звычайнага. Немцы ў гэты час патрулявалі ўсе лясныя дарогі, дзе маглі праходзіць партызаны. Пакінуўшы вёску Эйсманы, мы заўважылі на ўскрайку лесу двух коннікаў. Хто яны — цяжка было разгледзець, аднак гэта нас насцярожыла, бо акрамя нас у лесе нікога не павінна быць. Вырашылі абысці гэты лес кіламетраў за 8—10. Сабраўшы звесткі ў тыле ворага, мы вярнуліся на стаянку разведчыкаў, зноў абышоўшы той лес. А ўвечары да нас прыбегла жанчына з вёскі Эйсманы і расказала, што калі сёння яна ішла са сваім сынам у Малыя Машчаніцы, у лесе яе затрымалі немцы і не адпускалі дамоў да самага вечара, пакуль самі не пакінулі лес. Жанчыне пад пагрозай смерці загадалі маўчаць. Такім чынам, і на гэты раз разведчыкі пазбеглі смерці.

У апошняй буйной аперацыі ўдзельнічала 20 чэрвеня 1944 г. Нашаму атраду быў адведзены ўчастак чыгункі паміж Слаўным і Трацылавам. Кожны з нас атрымаў па чатыры шашкі толу, бікфордаў шнур, запалкі. Ішлі ланцугом, у пяці метрах адзін ад аднаго ў поўнай цішыні. Каля самай чыгункі па камандзе «Уперад!» кінуліся на чыгуначнае палатно...

А 1 жніўня 1944 г. я ўжо працавала ў дзіцячым садзе. Сад быў створаны літаральна на пустым месцы. Ад нямецкіх баракаў засталіся сталы «на казлах» ды лаўкі. Посуд збіралі па хатах. Дзеці спалі на падлозе. Харчаванне выдавалася строга па норме. Было яно першы час аднастайным і вельмі сціплым (яшчэ ж ішла вайна...). Але ўсе нашы дзеткі выжылі. Мы, яшчэ зусім маладыя выхавацелі, нянечкі, так насумаваліся за гады вайны па дзіцячых галасах, іх смеху, што не маглі нацешыцца на нашых выхаванцаў. Усе яны былі родныя для нас. Імкнуліся цеплынёй і ласкай замяніць дзецям у той цяжкі час многае з таго, чаго не маглі ім даць.

У той час рана сталелі дзеці...

Беражна захоўвае жыхар вёскі Гаршчэўшчына У. І. Чумакоў пасведчанне за нумарам 260210 аб тым, што ён з 1 жніўня 1942 да 26 чэрвеня 1944 года ўдзельнічаў у партызанскім руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Спачатку сувязным, а потым байцом атрада імя М. В. Фрунзе партызанскай брыгады «Граза».

Для Уладзіміра Іванавіча гэты дакумент — памяць аб незабыўным часе суровага дзяцін-

ства, апаленага полымем вайны. Ужо ў дванаццаць гадоў Валодзя Чумакоў стаў паўнапраўным членам партызанскага атрада. У той час рана сталелі дзеці. Яны дзялілі з дарослымі нягоды і выпрабаванні.

Працяглыя пераходы, начлег у лесе, голад і холад — усё гэта хлапчук лічыў не самым горшым у нялёгкай справе сувязнога. Невыносным было для яго чуць гаворку чужаземцаў у роднай вёсцы, бачыць здзекі акупантаў над мірнымі людзьмі. Апрануты пад жабрака, ён хадзіў па вёсках нібыта ў пошуках прадуктаў. Для збору звестак, неабходных партызанам, даводзілася бываць у населеных пунктах Талачынскага, Крупскага, Сенненскага і Чашніцкага раёнаў. Двойчы трапляў у рукі паліцэйскіх і двойчы яму ўдавалася ўцячы. Не раз жыццё маленькага разведчыка вісела на валаску. Аднойчы за ім кінуліся ў пагоню некалькі фашыстаў з аўчаркамі. Ужо на зыходзе сіл Чумакоў дасягнуў выратавальнага лесу. Прабег яшчэ некалькі дзесяткаў метраў і ў знямозе ўпаў на зямлю, чакаючы немінучай расправы. Але вакол было ціха. Напэўна, ворагі пабаяліся сунуцца ў лес, каб не трапіць на партызанскую засаду...

Смелы хлопчык выконваў і іншыя заданні: збіраў пакінутую на месцах баёў зброю, абразаў правады нямецкай тэлефоннай сувязі, хадзіў на чыгунку назіраць за перыядычнасцю праходжання саставаў, зменай нямецкіх вартавых. Пасля звесткі аналізаваліся, і камандаванне атрада прымала рашэнне аб правядзенні чарговай аперацыі.

...Фашысты арыштавалі маці Валодзі. Даведаўшыся аб гэтым, ён выпрасіў у камандзіра атрада дазволу, каб пайсці ў Талачын, перадаць ёй ежу. І вось раніцай разам з сястрой пакіраваліся да турмы. Але на дарозе напаткалі паліцаяў, якія ведалі Валодзю як сувязнога. Цудам удалося яму знікнуць, сястру схапілі. Пазней даведаўся, што па дарозе ў нямеччыну ёй удалося саскочыць з поезда, знайсці партызан... А маці і бабулю Валодзі фашысты расстралялі. Яшчэ большай нянавісцю да фашыстаў напоўнілася дзіцячае сэрца. Хацелася помсціць за родных, не раз прасіўся на баявыя заданні. Але камандзір атрада М. І. Заруба па-бацькоўску браў яго за плечы, гаварыў:

— За табой, тваімі равеснікамі — будучыня. Рызыкаваць жыццём дзіцячым мы не маем права...

У 1943 г. ў час блакады было вырашана пераправіць юнага мсціўца на самалёце за лінію фронту. Два тыдні знаходзіўся ён на партызанскім аэрадроме, дапамагаў грузіць параненых. Сам усё ж застаўся ў атрадзе і да прыходу Чырвонай Арміі змагаўся ў радах беларускіх партызан.

У. Філіпчык.

У шпіталі — хірургі з Оршы

К. Краўчанка.

Баі з акупантамі не абыходзіліся для партызан без ахвяр. Колькасць параненых расла. Самалёты з Вялікай зямлі яшчэ не прыляталі, і эвакуіраваць параненых не было магчымасці. У брыгадным шпіталі было каля дзесятка ўрачоў і ніводнага ўрача-хірурга. Дзе ўзяць хірурга? Гэта пытанне хвалявала многіх. Стала вядома, што ў Оршы ў адным са шпіталяў працуюць савецкія хірургі Віктэнцій Міхайлавіч Валчок і Канстанцін Яўграфавіч Чэхаў, якія трапілі ў акружэнне ў першыя дні вайны. Прывезці хоць бы аднаго з іх у брыгаду «Чэкіст» узялася камсамолка Кацярына Краўчанка.

Васемнаццацігадовая партызанка ведала, як распраўляюцца фашысты з трапіўшымі ў іх рукі партызанамі. У яе быў дакумент, які пацвярджаў, што Каця Краўчанка — жыхарка вёскі Дымава. Усё астатняе трэба было прыдумаць і, чаго б гэта ні каштавала, выканаць заданне. Да Оршы 30 кіламетраў. Каця разумела, што хірург у Дымава не паедзе. Дзяўчына вырашыла прадставіцца дачкой старасты вёскі Панізоўе, што ў дванаццаці кіламетрах ад горада.

3 ліпеня 1942 г. на лёгкай павозцы Каця выехала з Рацаўскага лесу. У Панізоўі ў сваякоў запачавала і раніцай наступнага дня была ў Оршы.

На прыём да хірурга трапіла не адразу. Нарэшце зайшла да ўрача.

— Я дачка старасты з Панізоўя,— растлумачыла Каця.— Учора мужчыны касілі луг і трапілі па міну. Двое былі забіты, а мой баць-

ка цяжка паранены. Асколкі ў нагах. Вельмі прашу паехаць, каб выратаваць бацьку.

— А чаму не прывезлі хворага сюды? — спытаў урач.

— Мясцовы фельчар забараніў везці, таму што небяспечна для жыцця.

Каця плакала, абяцала добра заплаціць.

— Закончым работу, і, калі ў камендатуры дадуць пропуск,— паедзем,— адказаў хірург.

...З камендатуры выйшлі двое — Валчок і Чэхаў. Пры іх былі неабходныя інструменты, медыкаменты, халаты.

Па дарозе маглі не раз праверыць дакументы, асабліва калі праязджалі каля аэрадрома. Але дакументы правяралі толькі ў медыкаў.

— А партызаны ў вашай вёсцы бываюць? — спытаў адзін з хірургаў.

— У нас не бываюць, дзесьці далей, кажуць, ёсць,— адказала Каця.

У лесе каля Панізоўя Кацю чакала конная разведка партызан.

— Рукі ўверх! — загадаў адзін з іх.

У хірургаў акрамя інструментаў і медыкаментаў нічога не аказалася.

— Куды вы нас вязеце? — спытаў у дзяўчыны хірург.

— Едзем да параненых байцоў, ім вельмі патрэбна ваша дапамога. Другога выйсця ў нас не было,— сказала Каця.

...Хірургі Валчок і Чэхаў засталіся ў брыгадзе. Да канца вайны яны самааддана змагаліся за жыццё параненых партызан. Абодва адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі.

Камсамолка Каця Краўчанка да самага вызвалення раёна была ў атрадзе, выконвала складаныя, адказныя заданні. У адным з баёў на Лепельшчыне адважная партызанка была цяжка паранена. Вылечылі Кацю ўрачы, дастаўленыя ёю ў атрад. *І. М. Прускі.*

Адважная чацвёрка

Віктар Валаткевіч, Іван Храмцоў, Антон Багданскі, Аляксандр Каліноўскі... Гэта пра іх, адважных камандзіраў, у партызанскай брыгадзе «Граза» хадзілі легенды, расказвалі розныя выпадкі і гісторыі, дзе неверагоднае перапляталася са звычайным і трагічным. Дарэчы, і шлях хлопцаў у партызаны быў няпросты, трагічны для іх бацькоў і блізкіх...

...Канец лютага 1943 года. Валаткевіча, Храмцова, Багданскага і Каліноўскага выклікалі ў талачынскую камендатуру. Хлопцаў паставілі перад выбарам: або Германія, або служба ў паліцыі. Параіцца не дазволілі, і яны далі згоду служыць у паліцыі. Пачалося новае і няпростае жыццё. Вакол былі свае, знаёмыя. Як ім было глядзець у вочы? Аднак растлумачыць, што тут яны часова і задумалі такое, пасля чаго і самі ці застануцца жывыя, не маглі. Каля месяца «праслужылі» хлопцы ў Свідэршчыне. У гэты час у брыгадзе «Граза» ведалі кожны крок ворага. Ні адна засада на партызан не ўдалася, ніводная падвода з нарабаваным не дасягнула гарнізона. Паводзілі сябе хлопцы незалежна і адчайна.

...Аперацыю прызначылі на 30 сакавіка — па наступны дзень, як паведамілі сувязныя з талачынскай паліцыі, іх павінны былі схапіць (нейкім чынам усё ж выдалі сябе). Добра пачаставаўшы на развітанне сваіх «калег» па службе, хлопцы аблілі дзвюма каністрамі бензіну будынак, дзе ўладкоўваліся на начлег паліцэйскія, і падпалілі яго. На чацвярых было 16 гранат і 2 кулямёты. Адважная чацвёрка падрыхтавалася да бою. Ашалелых ад падману і злосці паліцэйскіх сустрэў дружны агонь.

...Адыходзілі па мокрым цяжкім снезе, які быў па калена. У брыгадзе іх, цяжка стомленых ад дарогі і перажытага, чакала горкая вестка — за «здрадніцтва» забілі бацьку Багданскага, адправілі ў «Пушніну» маці і сястру (далейшы іх лёс невядомы), заплаціла сваім жыццём жонка Валаткевіча Марыя (пазней мнагадзетная сям'я Валаткевічаў з Пярэвалачні вырвалася ў партызаны)...

Хлопцы засталіся ў А. Дз. Ворашня, камандзіра 1-га атрада, з якім яны трымалі сувязь (Віктар Валаткевіч выконваў заданні і камбрыга Кірпіча, у тым ліку ўдзельнічаў у спробе перайсці лінію фронту). Камандзірам узвода стаў Валаткевіч. Багданскі, Храмцоў і Каліноўскі — камандзірамі аддзяленняў у яго ўзводзе. З таго часу чацвёрка была неразлучнай. Разам хадзілі на чыгунку, міны падкладвалі толькі пры непасрэдным набліжэнні эшалона. Вельмі небяспечна для таго, хто закладвае яе перад самым паравозам (трэба паспець адбегчы да таго моманту, як таварыш рване шнур), затое надзейна. Не кожны мог выканаць такое заданне. Узвод Валаткевіча гэта заданне заўсёды выконваў. І ляцелі цягнікі паміж Пярэвалачняй і Свідэршчынай, хадзілі хлопцы ўзрываць цягнікі і пад Оршу. Па 80 кіламетраў праходзілі ў два бакі. Здаралася, у атрад вярталіся толькі ў халявах (падэшвы ботаў не вытрымлівалі), за дарогу так распухалі ногі, што і халявы даводзілася разразаць. Аднак не толькі ў падрыўной справе лічыліся яны «спецамі». І цяпер помняць старажылы вёскі Букарава, як пасля неадна-

разовага налёту на гарнізон у іх вёсцы і ўпартага аднаўлення яго ворагам, букараўскі гарнізон восенню 1943 г. нарэшце перастаў існаваць. Недабітыя фашысты і паліцэйскія збеглі ў Талачын. 2 кулямёты, каля 20 вінтовак забралі тады партызаны, 10 паліцэйскіх пайшлі ў лес. У гэтай аперацыі 1-га атрада самымі ініцыятыўнымі і смелымі былі байцы Валаткевіча. Былі хлопцы лепшымі ў атрадзе і на падрыву варожых машын. Цяпер і сказаць дакладна немагчыма, колькі іх узляцела ў паветра дзякуючы гэтым партызанам. Паляваліся яны за начальнікам коханаўскай паліцыі Мачульскім, але таму некалькі разоў удавалася пазбегнуць народнай расплаты, і замест начальніка паліцыі знаходзілі свой бясслаўны канец яго хаўруснікі. Дарэчы, знайшоў сваю ганебную смерць і Мачульскі, толькі ад рукі іншых народных мсціўцаў.

Напярэдадні 26-й гадавіны Кастрычніка адважная чацвёрка падарвала за Марцюховам легкавушку. Сярод трафеяў было і радыё. Партызаны ўстанавілі яго ў Козаўцы. Людзі прыходзілі з Зелянькоў, Жураўлёў, Міхініч, Гарбачэва, каб паслухаць Маскву. Мітынг, прысвечаны вялікаму свяце, закончыўся паведамленнем па радыё аб стаповішчы на фронце.

...У канцы 1943 г. для барацьбы з партызанамі ў Забалацце прыбыла красінская паліцыя. Шлях партызанам быў адрэзаны не толькі ў навакольныя вёскі, але і ў штаб брыгады. Заставалася адно — знішчыць узмоцнены гарнізон. Сілы былі няроўныя. Толькі нечаканасць магла выклікаць разгубленасць ворага і збіць яго з панталыку. Некалькі разоў партызаны 1-га атрада рабілі засады каля в. Жураўлі. Аднак вораг нібыта прадчуваў штосьці няладнае і ў вёску — ні нагою. Заставалася адно — перахітрыць яго і заманіць у пастку. Распрацавалі наступны план: з вечара падпалілі два старыя таксі ў Жураўлях, каб пажар быў бачны на ўсё навакольле. У гарнізоне павінны былі звярнуць увагу па здарэнне і, як у такіх выпадках бывала, для яго высвятлення прыехаць на месца. Менавіта так і сталася — раніцай наступнага дня ў бок вёскі пацягнуліся каля двухсот падвод. Партызанская засада пры ўездзе ў вёску прапусціла разведку, а хутка пад'ехалі і першыя падводы. У гэты час узвод Валаткевіча, разгрупаваны на гарышчах першых хат, ударыў з кулямётаў і вінтовак. Вораг, адстрэльваючыся, стаў паварочваць назад. Аднак з вёскі выехаць не мог — з засады загаварылі партызанскія кулямёты аддзялення Багданскага. Пачалася паніка. Апошнія падводы, пачуўшы стральніну, з усіх сіл паімчалі ў вёску, а насустрач ім ужо беглі напалоханыя фашысты і паліцэйскія. Атрымаўся затор. Пакідаўшы зброю, немцы і паліцаі пачалі адпаўзаць на глыбокім снезе далей ад гэтага месца. Болей ніхто з іх у Забалацце не вярнуўся. Партызаны, падабраўшы 8 кулямётаў, каля 30 вінтовак, накіраваліся ў брыгаду. Але адысці паспелі толькі да Шэпетава, а там іх сустрэў карны атрад. Завязаўся няроўны бой. Ворагу ўдалося акружыць партызан. У нейкі момант сітуацыя была крытычнай. І ўсё ж лясным мсціўцам удалося прарваць кальцо карнікаў. Яны ж працягвалі расправу — на наступную раніцу, 13 студзеня 1944 г. ў белых халатах непрыкметна акружылі Жураўлі. Кожнага, хто выходзіў са двара, зноў загналі ў хаты. А потым з усіх бакоў запалілі вёску... Трашчаў у агні сасняк, з якога напярэдадні вайны былі пастаўлены многія хаты. Растоплены ад агню снег бег ручаямі, нібы ў весну... Людзі, вырваўшыся з агню, беглі да лесу... «Ну і злыя ж мы тады былі на тых хлопцаў! З-за іх жа нас палілі. А цяпер як падумаеш, ды разважыш — не ў агні, дык у крэматорыі б згарэлі,— успамінае 73-гадовая жыхарка вёскі Жураўлі А. М. Сухадольская,— усё роўна да нас дабраліся б. А так 14 загінула, астатнія ўсё ж уратаваліся. А партызанства сваю справу зрабіла. І хлопцаў жа таксама білі, з жывых, калі патрапляліся, скуру знімалі... Вайна яна і ёсць вайна. Тут хто каго...».

Ф. І. Кітаева.

З успамінаў разведчыка

Аўтар успамінаў — Мікалай Аляксеевіч Сафронаў. Ён нарадзіўся ў 1915 г. У Чырвонай Арміі з 1939 г. З мая 1942 г. ў партызанах, начальнік разведкі 5-га асобнага партызанскага атрада брыгады «Чэкіст». Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Жыве ў г. Йошкар-Ала.

Партызанскі важак

У ліпені 1941 Аляксандр Фёдаравіч Сімдзянкін, мардвін па нацыянальнасці, разам са сваімі аднапалчанамі Апанасенкам, Патапавым, Клімушкіным, Каянавым удзельнічалі ў жорсткіх баях паміж Барысавам і Оршай. Сувязь з камандаваннем палка была страчана. Сабраўшы байцоў з розных падраздзяленняў, Сімдзянкін прыняў камандаванне жменькай байцоў на сябе.

Хутка стала вядома, што фашысты занялі Оршу, Шклоў. Група Сімдзянкіна аказалася ў тыле ворага. Вырашылі рухацца да лініі фронту. Да Дняпра дабраліся без перашкод. Некалькі разоў спрабавалі пераправіцца це-

раз раку, але дарэмна: вораг добра ўмацаваў усе пераправы. Вярнуліся ў Рацаўскі лес. «Якое становішча на фронце, ці надоўга вайна?» — гэтыя і шмат іншых пытанняў хвалявалі акружэнцаў. Думалі разам, як быць далей. Вырашылі добра вывучыць абстаноўку, а вясной зноў паспрабаваць прарвацца да сваіх. На зіму размясціліся ў бліжэйшых вёсках, а ў сакавіку Сімдзянкін са сваёй групай ідзе за вёску Лагаўшчына ў Рацаўскі лес. Група была нядрэнна ўзброена і магла выйсці на баявую аперацыю. Красавіцкай ноччу група нечакана ўварвалася ў Варанцэвічы і разграміла нямецкую ўправу. Уражанне было вялікае: па-першае, партызаны станавіліся рэальнай сілай, з якой трэба было лічыцца. У сваю чаргу дзеянні партызан паднялі настрой насельніцтва. «Хто гэтыя смельчакі? Як да іх далучыцца?» — гэтыя пытанні хвалявалі ўсіх, каму пагражала небяспека.

Адначасова з групай Сімдзянкіна з'явіліся групы з акружэнцаў Р. М. Севасцьянава, Г. А. Кірпіча, Р. С. Іванова. У інтарэсах справы групы аб'ядналіся. Так пачынала нараджацца партызанская брыгада «Чэкіст». А ў маі А. Ф. Сімдзянкін з групай сваіх байцоў правёў першую дыверсію на чыгунцы. Узрыўчаткі яшчэ не было, партызаны раздабылі інструменты і ноччу разабралі чыгунку непадалёк ад г. п. Коханава.

У хуткім часе прылеглыя да Рацаўскага лесу вёскі былі поўнасцю ачышчаны ад нямецкіх упраў. Праўда, у вёсцы Жукнева заставаўся яшчэ гарнізон, які ахоўваў на вялікім участку чыгуначную магістраль Мінск — Масква і вельмі перашкаджаў нашым падрыўнікам. Начальнік штаба Р. М. Севасцьянаў склікаў на сход камандзіраў атрадаў А. Ф. Сімдзянкіна і Р. С. Іванова. Камандзіры прыкідвалі і так і гэтак, аднак кожны новы план пасля ўважлівага абмеркавання адхіляўся. Нарэшце прыйшлі да адзінага меркавання — неабходна выманіць якімсьці чынам фашыстаў з іх умацаванняў і знішчыць.

— Ты, Аляксандр Фёдаравіч, праявіў ініцыятыву ў рашэнні задачы, табе яе і ажыццяўляць,— заключыў Севасцьянаў.

На наступны дзень у вёсцы Максімкава, размешчанай побач з варожым гарнізонам, з'явіліся трое партызан — разведчыкі Рабінін, Каянаў, Яськоў. Паводзілі яны сябе бесклапотна: жартавалі з дзяўчатамі, прайшліся перад вокнамі старасты. Праз некалькі хвілін ад дома старасты паскакаў конны веставы ў бок Жукнева. Адтуль група немцаў адразу ж рушыла да Максімкава. Пакуль усё ішло па плану. І толькі немцы ўглыбіліся ў лес, як іх сустрэла агнём партызанская засада — гэта былі дзве групы байцоў Сімдзянкіна і Іванова. Перастрэлку пачулі ў гарнізоне. І адразу з Жукнева на падмогу выйшла калона немцаў.

М. А. Сафронаў.

А. Ф. Сімдзянкін.

— Нарэшце! — з палёгкай уздыхнуў Аляксандр Фёдаравіч, які назіраў за вёскай у бінокль.

А немцы амаль беглі да месца перастрэлкі. «Без каманды не страляць»,— яшчэ раз папярэдзіў Сімдзянкін. Хутка шэра-зялёная калона параўнялася з засадай. Каманда «агонь!» — і затрашчалі кулямёты і аўтаматы астатніх партызан. Такая нечаканая сустрэча ашаламіла фашыстаў. Нямногія апамяталіся і пачалі адстрэльвацца. Большасць была перабіта, засталася ляжаць у лагчыне паміж дзвюма вёскамі. Уцалелыя гітлераўцы перабраліся ў Коханава.

У пачатку чэрвеня 1942 г. разведка далажыла, што з Талачына выступае карны атрад для расправы з сем'ямі партызан. Сімдзянкін са сваімі байцамі наладзіў засаду паблізу вёсак Ганчаноўка і Крывыя. Вось на дарозе паказалася грузавая машына. Грымнуў залп, за ім другі. Камандзір кінуў у машыну звязку гранат. Машына спынілася. Бой працягваўся некалькі хвілін. Было знішчана 27 фашыстаў. Сабраўшы трафеі, партызаны вярнуліся ў лагер. Карная экспедыцыя правалілася.

Баявыя дзеянні партызан выклікалі вялікі прыток насельніцтва ў партызаны. У чэрвені атрад Сімдзянкіна налічваў ужо 114 байцоў. 22 чэрвеня, у гадавіну з дня нападу фашысцкай Германіі, атрад Сімдзянкіна разам з іншымі ўступіў у бой з гітлераўцамі. «Тады нам удалося заманіць фашыстаў паміж вёскамі Дымава і Хацькава. Разам з іншымі атрадамі ўзялі іх у вогненнае паўкальцо. Адчуваючы бяссэнсавасць супраціўлення, фашысты ў беспарадку адступілі»,— успамінае Аляксандр Фёдаравіч.

Пасля ўстанаўлення вакол Рацаўскага лесу партызанскай зоны галоўная ўвага атрадаў была сканцэнтравана на арганізацыі ды-

версій на чыгункі і аўтамагістралях. У атрадзе Сімдзянкіна было створана 7 груп падрыўнікоў, у кожную з іх уваходзіла па пяць партызан. Наладзілі выплаўку ўзрыўчаткі з бомбаў і снарадаў. У зборы іх прыняло актыўны ўдзел мясцовае насельніцтва. Справа пайшла на лад. Сам камандзір у дасканаласці валодаў падрыўной справай. Вучыў гэтай нялёгкай і небяспечнай аперацыі сваіх байцоў. У яго атрадзе выраслі сапраўдныя майстры-падрыўнікі Антон Хайпацкі, Вася Вятошкін, Дзіма Шахмарбараў, Мікалай Апанасенка, Аляксандр Казанцаў, Іван Савін, Аляксандр Наталевіч.

11 ліпеня 1942 г. А. Ф. Сімдзянкін з групай падрыўнікоў адправіўся на ўчастак чыгункі Орша — Коханава. Камандзір прапанаваў здзейсніць дыверсію днём, калі ахова менш за ўсё чакала партызан. У вёсцы Полюдава ўзялі правадніком былога старшыню сельсавета Жукоўскага. З яго дапамогай хутка дабраліся да месца. Вывучылі падыходы да палатна, месцазнаходжанне аховы. Раніцай наступнага дня наблізіліся да чыгуначнага палатна. Адразу ж прыняліся за справу. Але нечакана з-за павароту выйшаў патруль. Партызаны літаральна скаціліся з палатна і старанна замаскіраваліся ў хмызняку. Немцы, захопленыя размовай, нічога не заўважылі. Работа зноў закіпела. Партызаны ледзь паспелі ўстанавіць міну, як пачуўся гул цягніка. Трэба было ўцякаць, каб не трапіць пад абломкі вагонаў...

Летам 1943 па ўказанню ЦШПР падрыўнікі атрада Сімдзянкіна разам з іншымі атрадамі брыгады арганізавалі масавыя дыверсіі на чыгункі на тэрыторыі Талачынскага раёна. 18 мая, напрыклад, быў падарваны варожы эшалон на перагоне Слаўнае — Трацылава, 19 мая пушчаны пад адхон састаў з жывой сілай на ўчастку Бобр — Слаўнае. Буйная дыверсія на перагоне Бобр — Слаўнае была праведзена 8 ліпеня. Паспяхова прайшлі і іншыя аперацыі. У выніку прапускная здольнасць чыгункі рэзка скарацілася.

Пра поспехі атрада Сімдзянкіна шклоўская газета «За Родину» 6 лістапада 1943 г. пісала: «...Подготовку к октябрьским праздникам отряд С. отмечает следующим: взорвано 11 вражеских поездов, разбито 11 паровозов, 30 вагонов с техникой и боеприпасами, 27 вагонов с живой силой. Уничтожены с экипажем бронемашина и 10 автомашин. На шоссейных и грунтовых дорогах взорвано и сожжено 9 мостов...».

Але камандзір актыўна ўдзельнічаў не толькі ў дыверсіях на чыгункі (па яго словах, менавіта дыверсійныя аперацыі былі ўлюбёнай справай). 5-ы асобны атрад разам са сваім камандзірам ажыццявіў не адну аперацыю. 5 лістапада 1943 г. атрад Сімдзянкіна разам з 1-м асобным атрадам бліскуча правёў аперацыю па разгрому варожага гарнізона ў вёсцы Прыгані.

Вёска стаяла ўдалечыні ад лясоў, таму скрытна падысці да яе было немагчыма. Вырашылі дзейнічаць днём. На золку пад камандаваннем лейтэнанта Карпушанкі, які добра валодаў нямецкай мовай, пераапранутыя ў трафейнае абмундзіраванне партызаны строем накіраваліся па дарозе ў бок вёскі. Без перашкод увайшлі ў вёску, падышлі да будынка школы, да дамоў, дзе размясціліся немцы. Карпушанка аддаў загад спыніцца пакурыць. Партызаны разышліся. А праз хвіліну ў вокны нямецкіх казарм паляцелі гранаты. Гітлераўцы спачатку нічога не зразумелі і ў паніцы пачалі выбягаць на вуліцу, народныя мсціўцы расстрэльвалі ворага ва ўпор, кароткімі чэргамі. Усё гэта працягвалася не болей 10—15 хвілін. Гарнізон перастаў існаваць. Праз паўгадзіны партызаны на павозках павезлі трафеі — зброю, боепрыпасы, прадукты.

Шмат яшчэ аперацый, буйных і менш значных правялі сімдзянкінцы за доўгія гады вайны. І ў кожнай з іх душой і натхняльнікам быў сам камандзір. За смеласць, удаласць і любілі партызаны свайго камандзіра. Быў ён прыкладам не толькі ў баі, але і ў нялёгкім партызанскім жыцці. Бескампраміснасць і чуласць, патрабавальнасць і пластата — вось што вабіла ў гэтым чалавеку. Таму і цягнуліся да яго людзі, побач з ім станавіліся лепей і смялей.

Яго меліся расстраляць

Валодзя Бельскі абавязкова хацеў быць танкістам. Хацеў паступаць у танкавае вучылішча.

Вайна і акупацыя перакрэслілі яго планы. Прызвалі ў армію старэйшага брата Аляксандра, пайшлі ваяваць сябры і знаёмыя. На Беларусі штыком і куляй насаджаўся «повы» парадак. Трэба было змагацца, але як?

Адвойчы Валодзя праходзіў каля нафтабазы, дзе нямецкія салдаты залівалі ў бакі аўтамабіляў паліва. «А што, калі падпаліць нафтабазу? Хоць на нейкі час фашысцкія машыны застануцца без паліва»,— падумаў Валодзя.

Уначы Валодзя разам са сваім сябрам Сяргеем Сушко прабраўся на тэрыторыю аўтабазы, выпусцілі на зямлю паліва з адной цыстэрны і падпалілі. База запалала.

Фашысты зразумелі, што дыверсія на нафтабазе праведзена савецкімі патрыётамі. Яны арыштавалі некалькі чалавек, у тым ліку і Валодзю Бельскага. Два тыдні арыштаваных

дапытвалі, пагражамі ім, але за адсутнасцю доказаў мусілі выпусціць. Тады Бельскі зразумеў, што змагацца з ворагам аднаму ці нават удвух цяжка і небяспечна.

Бельскі ўладкаваўся на Талачынскі шпалазавод машыністам дызеля. Ён гарэў жаданнем найхутчэй звязацца з іншымі патрыётамі — ён не сумняваўся, што на заводзе такія людзі ёсць.

Неяк, нібы выпадкова, дырэктар шпалазавода І. Прыгода запытаўся ў хлопца, ці змог бы ён сапсаваць дызель, на якім працуе. «Нарэшце,— усхваляваўся Валодзя.— Сапсаваць можна, паспрабую». За кожным яго рухам на рабоце ўважліва сачыў пажылы немец. Валодзя непрыкметна пачаў падсыпаць у змазку для дызеля наждаковы пыл, які набіраў з пілаточнага станка. Гэтай сумессю ён заліваў падшыпнікі машыны. Неўзабаве дызель спыніўся, завод не працаваў два месяцы.

Трохі пазней Валодзя звязаўся з партызанамі, прыцягнуў да патрыятычнай работы сяброў Ігната Бабровіча, Мікалая Цімаховіча і Сяргея Казырыцкага. За кароткі тэрмін яны перадалі партызанам 8 вінтовак, аўтамат, некалькі скрынак з патронамі, сухое сілкаванне (усё гэта знаходзілі на месцах былых баёў).

Выведзеная са строю трансмісія... Узарваны магнітнай мінай з дадатковым зарадам узрыўчаткі будынак чыгуначнай управы, які фашысты ператварылі ў казармы для салдат... Сапсаваны танк Т-34 (гітлераўцы хацелі выкарыстаць яго ў барацьбе з партызанамі)... Спалены шпалазавод... Такі рахунак дыверсійнай дзейнасці савецкіх патрыётаў. Валодзя Бельскі перадаў партызанам брыгады «Чэкіст» падрыхтаваную ім схему агнявых кропак, умацаванняў і мінных палёў уздоўж чыгункі і ў раёне станцыі Талачын, устанавіў месца размяшчэння вялікага склада з боепрыпасамі ў раёне вёскі Азерцы. ад работніка чыгункі І. П. Ганчарова атрымліваў і перадаваў партызанам інфармацыю пра варожыя эшалоны.

З'яўленне ў горадзе і на чыгуначнай станцыі Талачын партызанскіх лістовак і частыя дыверсіі занепакоілі фашыстаў. Яны пачалі праводзіць масавыя аблавы і арышты савецкіх людзей. Былі арыштаваны дырэктар лястаса Я. Фралоў, дырэктар шпалазавода І. Прыгода з жонкай і іншыя актывісты. Іх расстралялі.

Арыштавалі і Валодзю. Яго катавалі, не давалі есці і спаць, дамагаючыся прызнання пра сувязі з партызанамі. Але хлопец упарта маўчаў.

Бацька Валодзі Лаўрэнцій Пракопавіч, даведаўшыся пра арышт сына, прынёс яму ў

Камсамольскі білет У. Бельскага.

Талачынскую турму перадачу. Але фашысты схапілі бацьку Валодзі, жорстка збілі і выкінулі праз акно з другога паверха. Жонка завезла яго па кані дадому, дзе ён хутка і памёр...

Цэлы месяц сядзеў Валодзя ў турме, мужна церпячы ўсе катаванні. Ён не разлічваў, што выйдзе жывым. Яго перавялі ў асобную камеру, з якой для вязняў дарога была толькі адна. У гэтай камеры смяротнікаў ужо сядзеў адзін хлопец. Назваўся, што алтаец, быў партызанам, але якой брыгады і атрада не сказаў. Раніцай немцы меліся весці іх на расстрэл. А хлопцам так не хацелася паміраць. У галовах віхурыліся тысячы думак, пракручваліся сотні варыянтаў уцёкаў. Нарэшце спыніліся на адным...

Пад вечар яны пачалі грукаць у дзверы і патрабаваць, каб з камеры вынеслі вядро з адкідамі. Вартавы паліцэйскі загадаў узяць вядро і самім выносіць яго. Яны параўняліся з вартавым і імгненна перакулілі вядро на галаву паліцэйскаму. Аглушаны, той так і паваліўся з вядром на галаве. Валодзя з сябрам куляй вылецелі на вуліцу.

Сібірак кінуўся па вул. Дзяржынскага, у бок вёскі Слабодка, а Валодзя — па вул. Пушкіна, на могілкі, перайшоў Друць і зараснікамі падаўся ў лес каля вёскі Маціёва...

Да верасня 1943 года ён знаходзіўся на нелегальным становішчы, а потым з усёй сям'ёй пайшоў у партызаны. Але сувязь са станцыяй Талачын для Валодзі не перапынялася. З яго дапамогай знялі ўласаўскую форму і са зброяй перайшлі да партызан 27 былых «народнікаў».

Шмат разоў удзельнічаў партызан Валодзя Бельскі ў аперацыях па разгрому варожых

гарнізонаў, сустракаў фашыстаў у засадах, хадзіў у разведку, падтрымліваў сувязь з патрыётамі. Калі Чырвоная Армія вызваліла Талачынскі раён, Валодзя Бельскі пайшоў на фронт, стаў байцом і з баямі дайшоў да Кёнігсберга.

Дадому ён вярнуўся з некалькімі баявымі ўзнагародамі.

Рукамі партызанскіх умельцаў

А. М. Лапянок.

З першых дзён фашысцкай акупацыі многія з тых, хто па розных прычынах не трапіў у дзеючую армію, ішлі ў лес, аб'ядноўваліся ў партызанскія атрады. Партызаны карысталіся пераважна трафейнай зброяй, але яе не заўсёды хапала, і яна часам патрабавала рамонту. У лясах пачалі дзейнічаць партызанскія майстэрні, многія з якіх наладзілі выпуск агнястрэльнай зброі.

Аляксей Мацвеевіч Лапянок да вайны займаўся слясарнай справай, і таму партызанскае камандаванне даручыла яму рамантаваць баявую тэхніку. А пайшоў А. М. Лапянок у партызаны ў жніўні 1943 г. з в. Скавышкі. Першы кулямёт ён адрамантаваў партызану С. А. Ракаву з брыгады Нарчука. Для партызан гэтай брыгады было падрыхтавана некалькі самаробных мін.

...Партызанская разведка данесла, што з Талачына ў Саколіна пакіроўваецца гітлераўскае падраздзяленне. Да Лапянка прыйшлі партызаны з просьбай тэрмінова зрабіць міну. З толавых шашак такая міна была хутка зроблена і выкарыстана: 5 гітлераўцаў разам з павозкай узляцелі ў паветра. Гэта здарылася летам 1942 г. на ўчастку дарогі Талачын — Саколіна. Пазней была наладжана цесная сувязь з брыгадай Дзьячкова праз Івана Сямёнавіча Ракава, якому Аляксей Мацвеевіч перадаваў звесткі пра дыслакацыю нямецкіх гарнізонаў. Партызанскі рух шырыўся з кожным днём. Ворагі ўзмацнялі і без таго жорсткія рэпрэсіі супраць мірных жыхароў. Раманціваць зброю дома было небяспечна, і тады А. М. Лапянок вырашыў арганізаваць майстэрню ў брыгадзе Дзьячкова. Спачатку прыйшлося напрацаваць у майстэрні брыгады Нарчука ў Відоках, дзе рабілі аўтаматы. Узначальваў майстэрню ўжо тады вядомы зброевы майстар — былы інжынер мінскага вагавага завода «Ударнік» Далганаў са сваімі калегамі

В. Ц. Баразда ў музеі Вялікай Айчыннай вайны каля стэнда з самаробнай зброяй (яго аўтамат — ніжні).

Ігнатавым і Цераховічам. Лапянок стаў працаваць разам з Аляксандрам Васіцінскім.

Аляксей Мацвеевіч успамінае: «Першы аўтамат тыпу ППД рабілі доўга, каля дзесяці дзён. Яго старанна выпрабоўвалі, у выпрабаванні прымаў удзел сам камандзір Дзьячкоў. Аўтамат быў ухвалены партызанскім камандаваннем і атрымаў новую марку — ПКЛ (пісталет-кулямёт Лапянка)».

Пазней у брыгадзе Дзьячкова пачала дзейнічаць свая зброевая майстэрня, узначаліць якую даверылі Лапянку. Разам з ім працавалі слесар Васіль Цярэнцьевіч Баразда, Вацярпоў, Васіцінскі і іншыя. Майстрам прыходзілася працаваць у цяжкіх умовах. Не хапала неабходных інструментаў, матэрыялаў. Усё рабілі ўручную. З адной вінтоўкі атрымліваліся два аўтаматныя ствалы. Для кажуха выкарыстоўвалі водаправодныя трубы неабходнага дыяметра, затворы рабілі з валоў розных сельскагаспадарчых машын, спружыны для затвораў — са стальнога троса. Ішла ў ход нават патэфонная спружына. Самай цяжкай аперацыяй быў выраб патронніка і затвора, ад якасці якога залежала ўся работа аўтамата. Спачатку гэту аперацыю выконваў толькі Аляксей Мацвеевіч, а потым і В. Ц. Баразда. Работа была падзелена на аперацыі. Гэта давала магчымасць больш кваліфікавана рабіць кожны вузел аўтамата, значна павялічыць прадукцыйнасць працы. Зборку, падгонку, праверку ўзаемадзеяння вузлоў і прыстрэлку выконваў загадчык майстэрні. Спачатку на прыстрэлку траціліся да 12 патронаў, а з цягам часу гэты лік давялі да трох. Майстэрні часта прыходзілася мяняць свой адрас. У розны час яна знаходзілася ў вёсках Дзедава, Слідчаны, Старыя Лаўкі і іншых, а часта — проста на лясной паляне, дзе слясарным сталом служыў вялізны пень.

Аўтаматы, зробленыя рукамі лясных эбройнікаў, карысталіся вялікай папулярнасцю ў партызан. Яны доўгі час не расставаліся з імі нават пасля таго, як партызанскія атрады злучыліся з войскамі Чырвонай Арміі. Не адзін фашыст знайшоў сабе магілу на пашай зямлі ад зброі, зробленай у беларускіх лясах залатымі рукамі народных умельцаў.

А. А. Шкэйдар.

Самалёты з Вялікай зямлі

З успамінаў Дз. М. Катлярчука, былога начальніка штаба партызанскай брыгады «Граза»

Наша брыгада мела трывалую сувязь з Вялікай зямлёй. У Маскве, перад адпраўкай у тыл, мы атрымалі радыёстанцыю. Праз лінію фронту пасылаліся сувязныя. Але найбольш эфектыўнай была паветраная сувязь.

Савецкі самалёт з-за фронту чакалі ўсе. Зімою лётчыкі рабілі пасадку на замерзлых азёрах ля вёсак Барсукі, Чарэя, Белая Царква Чашніцкага раёна. Летам прызямляліся ў раёне вёсак Рыдамля Талачынскага, Цярэшкі Крупскага раёнаў, у мястэчку Бягомль Мінскай вобласці. Часта лётчыкі скідалі боепрыпасы і зброю на парашутах.

Папярэдне па радыё мы паведамлялі каардынаты пляцоўкі і ўмоўныя сігналы для пасадкі. Месцы для скідання грузаў на парашутах высвечваліся сігнальнымі ракетамі. Па гудзенні рухавікоў партызаны беспамылкова вызначалі: савецкія ці фашысцкія самалёты з'явіліся ў небе.

Лётчыкі дастаўлялі ў атрады зброю, міны, бікфордаў шнур, медыкаменты, агітацыйныя лістоўкі, паведамленні Саюзфармбюро, газеты, лісты ад родных, соль. Карацей, самыя неабходныя для вядзення партызанскай і дыверсійнай барацьбы грузы.

З брыгады на самалётах вывозіліся цяжка параненыя і хворыя, партызанскія сем'і, якім пагражала фашысцкая расправа за бацьку, сына ці брата.

Лётчыкі перадавалі камандаванню Чырвонай Арміі разведданыя пра дыслакацыю і рух нямецкіх войск, іншыя важныя звесткі, якія здабывалі партызанскія сувязныя і падпольшчыкі. У тыл адпраўляліся палонныя фашысты, што маглі даць каштоўную інфармацыю савецкаму камандаванню.

На самалётах на Вялікую зямлю былі адасланы 2 мільёны 800 тысяч рублёў грошай, нелегальна сабраных на акупіраванай тэрыторыі на пабудову танкавай калоны «Савецкая Беларусь».

У брыгаду звычайна прыляталі лётчыкі з 15-га Чырванасцяжнага ордэна Аляксандра Неўскага авіяпалка начных бамбардзіроўшчыкаў 213-й авіядывізіі. Сярод іх У. Пацёмкін, І. Філатаў, С. Кавярынскі, Н. Ураваты, Б. Мельнікаў, П. Галяшынскі, Д. Крумяльніцкі, О. Крумяльніцкі, Н. Крылоў, В. Біркін, Б. Бурпоўскі і іншыя. Хоць самі партызаны жылі небагата, але лётчыкаў прымалі як маглі: частавалі, абавязкова дарылі што-небудзь на памяць. Кожны прылёт самалёта ў брыгаду абнадзейваў нас. Гэта было вельмі важна — медь такую дапамогу і ведаць, што змаганне ідзе паўсюдна.

З успамінаў былога лётчыка С. Кавярынскага

Дастаўляць партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, агітацыйную літаратуру, вывозіць з атрадаў параненых было вельмі няпроста. Непрыкметна прамінуць лінію фронту і прызямліцца на непадрыхтаванай пляцоўцы — гэта толькі палова справы. Трэба было яшчэ хутка, па сутнасці без аніякага зенітнага прыкрыцця разгрузіць самалёт, узляцець і перахітрыць фашысцкіх лётчыкаў, якія ўвесь час патрулявалі неба, насядалі на партызанскія аэрадромы і палявалі на нашы ціхаходныя машыны.

...У 1944 годзе, у сакавіку мы атрымалі загад даставіць партызанскай брыгадзе боепрыпасы. Я вылецеў першым, каб арганізаваць хуткую прыёмку і разгрузку самалётаў, бо над палянай, дзе мы меліся рабіць пасадку, у любы момант маглі з'явіцца фашысцкія самалёты.

Я прыняў усе самалёты, пракантраляваў іх разгрузку і зваротны вылет. Сам узляцеў апошнім. Усё гэта адбывалася ўначы. У раёне вёскі Янава мяне атакаваў нямецкі знішчальнік і разбіў у майго самалёта рухавік. Я вымушаны быў прызямліцца на лясной прасецы недалёка ад вёскі Янава. Машына палала. Я выбраўся з кабіны і кінуўся ў лес, далей ад вёскі, бо ў ёй знаходзіўся нямецкі гарнізон.

Восем сутак давялося прабірацца да вёскі Купаваць Сенненскага раёна. Там мяне і кулямётчыка вельмі добра сустрэлі, дапамаглі звязацца з партызанамі і даставілі нас у брыгаду.

Адтуль нашы палкавыя лётчыкі вывезлі нас на Вялікую зямлю. Я атрымаў новы самалёт, і мы зноў працягвалі сваю работу.

Малака мы тады так і не напіліся...

З успамінаў В. І. Шафранскага

Віктар Ільіч Шафранскі нарадзіўся ў 1926 г. ў в. Ніклюдава Талачынскага раёна. З 1942 г. ў партызанах. З 1944 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік штурму Берліна. Узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Жыве ў Мінску.

У канцы лютага 1944 г. наша падрыўная група атрымала заданне ўзарваць у раёне станцый Трацылава — Слаўнае — Бобр варожы эшалон, які ішоў на фронт.

На нашым шляху знаходзілася густая сетка варожых гарнізонаў, якія прыкрывалі падыходы да чыгункі. Аўтамагістраль Мінск — Масква тады ахоўвалася толькі патрульнымі машынамі, і мы яе хутка прамінулі. Далей жа ісці было небяспечна.

Яшчэ ў канцы 1942 г. фашысты зрабілі шэраг захадаў для ўзмацнення аховы асноўных чыгунак. Уздоўж чыгуначнага палатна лясы высеклі і стварылі мінныя палосы. На адлегласці прамой бачнасці былі выстаўлены вартавыя пасты. Уздоўж усёй чыгункі былі зроблены бліндажы, устаноўлены кулямётныя блок-пасты. У месцах найбольш зручнага падыходу былі пракладзены сігнальныя драцяныя сістэмы, звязаныя з памяшканнямі аховы, паблізу чыгунак расстаўлены замаскіраваныя пасты-сакроты з некалькіх аўтаматчыкаў. Уначы перыядычна пускаліся асвятляльныя ракеты, хадзілі начныя патрулі.

Мы прайшлі большую частку з гэтых перашкод, наблізіліся да дарогі і заляглі метрах у пяці ад чыгуначнага насыпу. Спачатку трэба было прапусціць патруль і толькі тады падняцца на чыгунку. Ноч была цёмная, чакалі доўга.

Але вось і яны. Двое. Ціха падышлі, спыніліся каля нас, углядаюцца ў цемру. Мы былі ў маскхалатах. Адзін зняў аўтамат і пачаў прыцэльвацца. «Няўжо ўбачыў?» — прамільгнула думка. Нервы напружаны да апошняга. Адзін неасцярожны рух, клацанне затвора ў начной цішы — і ўсё было б скончана. Мы, натуральна, маглі б «зняць» іх, але загад тады застаўся б нявыкананым. Трэба было цярпліва ляжаць пад прыцэлам варожага аўтамата.

Яны пагаварылі паміж сабою пра штосьці і рушылі далей. Пазней мы даведаліся: наведзены аўтамат быў іхнім псіхалагічным прыёмам, але тады мы гэтага яшчэ не ведалі. Мы паставілі міну, спусціліся з насыпу і пачалі адыходзіць. Але далёка адысці не паспелі. Прагучаў выбух — і ўсё асвяцілася полымем вагонаў, ракетамі. Мы паваліліся на зямлю. Бесперапынная страляніна з аўтаматаў і кулямётаў не давала магчымасці падняцца. Часам здавалася, што фашысты заўважылі нас і страляюць прыцэльна. Кулі дзынькалі вакол, усё бліжэй і бліжэй, сыпаліся пырскі зямлі і снегу. Рэзкія, як ад свярдзёлка, гукі стрэлаў рабіліся выразнымі і звонкімі, жудаснымі. На імгненне агонь пераносіўся ў іншым кірунку, і мы адпаўзалі далей.

Наперадзе аўтамагістраль, трэба пераскочыць праз яе, чаго б гэта ні каштавала.

А там — ратунак. Але адыход ужо адрэзаны машынамі. Шаша асветлена фарамі. Нас зноў абстралялі. Я быў лёгка паранены. Бяжым уздоўж магістралі. Бліжэй пад гарнізоны, туды, дзе не чакаюць, дзе няма святла і ракет. Нарэшце, магістраль мы прамінулі. За ёй — Усвіж-Бук, самае бяспечнае, як нам тады здавалася, месца ў свеце. І хоць мы адышлі ўжо даволі далёка ад чыгункі, радавацца было рана. Каб трохі зняць з сябе нервовае напружанне і стому, мы зайшлі ў хату на ўскраіне вёскі Рыдамля. Гаспадар пачаў гасцінна частаваць нас малаком. Але малака мы тады так і не напіліся. На двары пачуўся тупат ног і сабачы брэх. Фашысты ішлі па следу.

З трэскам расчыніліся дзверы: «Хэндэ...» — болей фашысты сказаць не паспелі. Мы ўжо ляжалі на падлозе і стралялі. Лямпа зляцела са стала. Газа гарэла каля ўваходу. Немцы былі асветлены і, відаць, шкіраваны такім павarотам справы. Ім давялося адступіць, але адзін так і застаўся ляжаць каля дзвярэй.

Скарыстаўшы замяшанне ворага, мы выскачылі з хаты і пабеглі агародамі. Усё навакольле зноў асвяцілася ракетамі. Мы адыходзілі, прыкрываючы адзін аднаго бесперапыннымі чэргамі, каб не даць фашыстам падняць галаву і страляць па нас прыцэльна. Адначасова засыпалі зямлёй і снегам ракеты (яны стралялі па нас з ракетніц). Нарэшце мы дабеглі да ўскрайку лесу. Тут быў ратунак. Упачы ў лес ісці фашысты не рызыкнулі. Але стралялі ў цемру бяссэнсна і доўга, як бы кампенсуючы гэтым сваю бяссільную пянавісць.

Цяпер нават не верыцца

З успамінаў былога партызанскага ўрача атрада № 5 брыгады «Чэкіст» Таццяны Якаўлеўны Крывіцкай

Пасля заканчэння Мінскага медыцынскага інстытута ў ліпені 1940 г. мяне накіравалі ў Талачынскі раён. Першыя два месяцы працавала ў Коханаве, пазней — у Воўкавічах, загадчыцай медыцынскага ўчастка.

На другі ж дзень вайны я атрымала позву з'явіцца ў Талачынскі райваенкамат для ўдзелу ў мабілізацыйнай камісіі. У камісіі працавала амаль двое сутак. Потым мяне накіравалі ў Талачынскі шпіталь, куды пачалі прыбываць параненыя з фронту. У горадзе было трывожна. Хадзілі чуткі пра нямецкіх парашутыстаў...

Да апошняга дня я працавала ў Талачынскім шпіталі і таму не паспела вывезці сям'ю, якая жыла ў Варанцэвічах. 9 ліпеня там былі немцы. Надзея на эвакуацыю знікла зусім.

На доктарскую дапамогу да мяне прыходзілі многія вяскоўцы. У Варанцэвічах і навакольлі засталося тады многа акружэнцаў. Яны таксама часам звярталіся да мяне. Напішаш такому ў даведцы «тыфус» і немцы яго не чапаюць. У сакавіку 1942 г. акружэнцам загадалі з'явіцца на рэгістрацыю ў камендатуру. Па дарозе ў Талачын яны разбегліся. Многія пайшлі ў партызаны. Потым да мяне некалькі разоў прыходзілі па медыкаменты партызанскія разведчыкі.

Летам 1942 г. ў Талачынскім раёне пачалася адпраўка моладзі ў Германію. Мне гэта таксама пагражала. Мы параіліся з мамай і вырашылі, што мне лепш пакінуць вёску і ісці да партызан (іх лагер знаходзіўся тады ў Рацаўскім лесе). Ішла без ваганняў, бо ведала аднаго з партызанскіх камандзіраў —

Т. Я. Крывіцкая.

Аляксандра Сімдзянкіна. Так і сказала ў лесе патрульным: «Іду да Сімдзянкіна ў атрад».

З пачуццём глыбокай удзячнасці я ўспамінаю жыхароў вёскі Варанцэвічы. Гэта яны

два гады чым маглі дапамагалі маёй сям'і, дзяліліся з мамай і сынам кавалкам хлеба. Не выдалі іх немцам, хоць многія ведалі, што я пайшла ў партызаны. Вялікі ім дзякуй!

У атрадзе мяне прызначылі начальнікам санітарнай службы. Фельчаркай у нас была Ліда Дземяшкевіч, была яшчэ адна медсястра. Разам з партызанамі мы хадзілі ў засады, на баявыя аперацыі. Самой ваяваць не давялося. На пачатку ў мяне не было нават і зброі, калі не лічыць маленькага бельгійскага пісталета, які партызаны жартам называлі мухабойкай. Толькі потым, калі атрад перайшоў на Лепельшчыну, атрымала я вінтоўку. Але часцей даводзілася хадзіць з санітарнай сумкай на плячы...

Больш за ўсё мне запомніўся разгром паліцэйскага гарнізона ў вёсцы Прыгань, на дарозе Талачын — Круглае. У нашу брыгаду са зброяй у руках і ў нямецкай форме перайшоў узвод паліцэйскіх — узбекаў і казахаў. Прымаючы іх у атрад, наша камандаванне паставіла ўмову: трэба даказаць сваю адданасць народу ў баі. Быў распрацаваны план разгрому гарнізона.

Па дарозе калонай рушыў атрад «паліцэйскіх». У форме і са зброяй яны не выклікалі ніякіх падазрэнняў. Уся брыгада цішком па лясах аблажыла вёску. Узвод увайшоў у Прыгань, паблізіўся да аховы, бункераў і дотаў і спыніўся на адпачынак. «Паліцэйскія» пачалі расцякацца па вёсцы, заводзілі гутаркі з аховай, курылі. Па камандзе яны накінуліся на ахову, пачалася страляніна. Гэта было так нечакана, што гарнізон не здолеў наладзіць арганізаванага супраціўлення. Пачуўшы стрэлы, нашы атрады полем — да вёскі было каля кіламетра — кінуліся на дапамогу. Бегла і я з санітарнай сумкай. Каб бегчы хутчэй, партызаны на хаду скідалі з сябе кажухі і шынялі, усё поле было ўсеяна адзеннем. Гарнізон разбілі, але параненых было многа. Усю ноч лесам, без дарогі везлі іх у лагер брыгады. Пазней цяжкапараненых адправілі самалётам на Вялікую зямлю, астатніх лячылі ў атрадах.

Да 1944 г. ў нас не было шпіталяў. Партызаны амаль не хварэлі. За два гады не было аніводнага выпадку пнеўманіі, грыпу, сур'ёзных інфекцыйных хвароб, хоць умоў для ўзнікнення гэтых захворванняў хапала: былі і холад, і голад. Параненых лячылі ў атрадах. Вельмі цяжка без умоў, без медыкаментаў было хірургам, але яны рабілі ўсё, што маглі. Летам 1943 г. разведчыку Генадзю Клундуку ў баі адарвала руку. Патрабавалася тэрміновая аперацыя. Пры святле газпіцы, без паркатычных сродкаў, звычайнай пілой партызанскі хірург Віктар Ваўчок і я зрабілі разведчыку аперацыю. Ён выжыў.

Замест медыкаментаў часта выкарыстоўвалі ўсялякія заменнікі: мох замест ваты, настой дубовай кары і чарніц замест вяжучых сродкаў і г. д. Увесну 1944 г., калі фронт наблізіўся да Беларусі і ў брыгаду пачаўся масавы наплыў насельніцтва, у атрадах з'явіўся тыф. Давялося адкрываць шпіталі — вялікія зрубленыя буданы ў лесе. Хоць тыф — цяжкая хвароба, але пераносілі яе партызаны адносна лёгка.

Цяпер, калі я ўспамінаю тыя дні, мне нават не верыцца, што гэта магло быць. Думаеш, як можна было ўсё гэта перанесці, адкуль браліся сілы?

Сустрэліся на вайне

Есць каля вёскі Замошша магіла. Тут пахаваны сакратар камсамольскай арганізацыі партызанскай брыгады «Граза» Мірон Чорны. Кожны год у маі моладзь вёскі прыносіць на магілу першыя ландышы — даніна памяці іх загінуўшаму аднагодку. У Дзень Перамогі тут збіраюцца партызаны. Але часцей за ўсё прыходзяць сюды двое, мужчына і жанчына. У глыбокім жалю схіляюцца яны над магілай маладога героя. Успамінаюць мінулае, сваю мужную і шчаслівую маладосць.

Галіна Іванаўна Лылова і Аляксей Дзям'янавіч Ворашань разам з 1942-га. Сустрэліся яны ў Маскве ў Цэнтральным штабе партызанскага руху. Аляксей, прызначаны камандзірам атрада будучай брыгады «Граза», разам са сваімі землякамі Рашэтнікавым, Нарчуком, Мяжэвічам, Кіпрыянцам накіроўваліся ў родны Талачынскі раён для актывізацыі партызанскага руху. Галіна Лылова з Іванава і масквічка Аляксандра Агафонава былі накіраваны ў брыгаду радысткамі. З Масквы і пачынаўся іх сумесны паход праз лінію фронту ў тыл ворага.

Пра брыгаду «Граза» хутка сталі хадзіць легенды. Камандзір атрада «Перамога» (да снежня 1943 г. называўся 1-ы атрад) Аляксей Ворашань і радыстка Галя Лылова на баявых заданнях, у засадах, у час блакады імкнуліся быць разам. Яны прывыклі адзін да аднаго, а потым і пакахалі. Тады, у грозны час, кожны марыў аб мірным жыцці. Галя тайна марыла аб мацярынстве, дзецях. «Яны будуць абавязкова такімі ж смелымі, сапраўднымі людзьмі, як іх бацька».— думала яна.

І вось скончылася вайна. Сумеснае жыццё

Галіна Іванаўна і Аляксей Дзям'янавіч пачыналі, што называецца, з нуля. Пудам застаўшыся жывымі ў майскую блакаду 1944 года, у родную вёску Аляксея Ваўкавічы яны прыйшлі змучаныя і абарваныя. Але якое гэта было шчасце — займацца мірнымі клопатамі! Былі пераадолены ўсе цяжкасці. Нарадзіліся сыны Жэнька і Коля. Старэйшы, Коля, скончыў на «выдатна» Вільнюскае ваеннае вучылішча, потым — Ваенную камандную акадэмію войск ППА. За асаблівыя заслугі перад Радзімай узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Дачка Лена працуе тэхнолагам на Мінскім швейным аб'яднанні «Камсамолка».

У спадчыну дзецям дасталіся высакародныя і палымяныя сэрцы бацькоў, якія аддалі ў пасляваенныя гады ўсе свае сілы на патрыятычнае выхаванне маладых людзей. Заслужаны настаўнік БССР Галіна Іванаўна шмат гадоў працавала ў талачынскай сярэдняй школе № 1. Яна ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Узначальваў групу народнага кантролю раённага вузла сувязі Аляксей Дзям'янавіч. Мірнае жыццё для іх — шчаслівае жыццё.

А. Дз. Ворашань.

Г. І. Лылова.

Радасць прыйшла

З успамінаў А. Пахамовіча, былога сакратара Талачынскага падпольнага РК КПБ

...Чэрвень 1944 года. Гарыць вялікае зарыва на ўсходзе. Дзень і ноч грыміць артылерыйская кананада. Усё часцей над нашай, яшчэ акупіраванай мясцовасцю паяўляюцца самалёты з чырвонымі зоркамі. Па аўтамагістралі Масква — Мінск і па чыгункі на Оршу і назад ідуць калоны аўтамашын, паўзуць доўгія чыгуначныя саставы. Гітлераўцы каціліся пад нястрымным напорам нашых войск на захад. Мы ў гэтыя дні ўзмацнілі дыверсіі на чыгункі і аўтамагістралі. З дня на дзень чакалі прарыву фронту на Віцебскім напрамку. Раніцай 25 чэрвеня наш радыст Генадзь Шчалканаў прыняў зводку Саюзінфармбюро, у якой паведамлялася, што нашы перадавыя злучэнні на Віцебскім напрамку прарвалі ўмацаванні немцаў і прасунуліся наперад на 20—30 кіламетраў. Ад фронту ў гэтыя дні мы былі ў 60—70 кіламетрах. Талачынскі падпольны райком КПБ і баявы атрад № 8 брыгады «Граза» пад камандаваннем старшага лейтэнанта Мікалая Зарубы знаходзіліся ў раёне Саколіна — Бушмін. Тэрмінова было склікана пасяджэнне РК КПБ сумесна з камандаваннем атрада. Наша задача заключалася ў тым, каб не даць фашыстам знішчыць яшчэ ўцалелыя вёскі, вывезці ў фашысцкі палон нашых людзей. У дзесятках экземпляраў работнікі РК КПБ, РК ЛКСМБ перапісвалі зводку, прынятую радыстам. У бліжэйшыя да магістралі вёскі, у тым ліку і тыя, дзе яшчэ знаходзіліся гарнізоны, накіравалі надзейных людзей, каб яны папярэдзілі жыхароў. Мы з сакратаром падпольнага райкома камсамола Аляксандрам Ракам накіраваліся пад Азерцы, бліжэй да магістралі і чыгункі. Некалькі падрыўных груп былі адпраўлены на чыгунку пад Коханава і Талачын. Вечарам 25 чэрвеня мы прыйшлі ў вёску Прудзец, размясціліся ў сувязной П. Казакевіч і правялі мітынг. Сабралася многа хлопцаў, дзяўчат, жанчын. Усе выйшлі на вуліцу і ўважліва ўглядаліся на ўсход.

...Раніца 26 чэрвеня. Мы стаялі на Маскоўскай горцы (так называлася пануючая вышыня каля вёскі Бушмін), вакол якой расцілаўся малады лес. Як вестуны шчасця праляцелі нізка над намі савецкія знішчальнікі. Гулкім рэхам усё мацней кацілася хваля гарматных выбухаў, чулася гудзенне танкаў.

— Эй, хлопцы,— усхвалявана сказаў. пад'ехаўшы да нас, разведчык Ігнатовіч,— цэлую калону немцаў мы затрымалі каля Яскаўшчыны. Нашы хлопцы вядуць сюды фрыцаў, вось убачыце гэтых ваяк...

Усіх людзей атрада мы разаслалі па дарогах магчымага руху нямецкіх салдат. Прайшло дзве — тры гадзіны. У наш лагер прывялі каля сотні палонных немцаў, але нам было невядома, дзе перадавыя часці Чырвонай Арміі. Нарэшце, на гарызонце паказаўся коннік. Галопам прыскакала на добрым рысаку наша сувязная камсамолка Надзея Шведка.

— Што вы тут седзіцё? Давайце хутчэй на Міхайлаўшчыну, там поўна нашых танкаў,— адным духам выпаліла яна.

Цяжка выказаць пачуцці, якія ахапілі ўсіх, хто тут знаходзіўся. Усё, што лічылася вельмі неабходным, цяпер стала зусім непатрэбным. Людзі кідалі свае бедныя пажыткі і з радасцю беглі да сваіх воінаў. Хвалюючая сустрэча партызан і насельніцтва навакольных вёсак з воінамі Чырвонай Арміі адбылася ў вёсцы Міхайлаўшчына. Людзі абдымаліся, цалаваліся, плакалі ад радасці. У лепшых уборах выйшлі на вуліцу дзяўчаты, усе напярэдадні запрашалі ў хаты, частавалі. У вёсцы размясціўся баявы партызанскі атрад М. Зарубы, ён узяў на сябе функцыі тылавога падраздзялення, а танкі пайшлі далей на Талачын, Крупкі, Барысаў...

У доме Домны Савік мы размясцілі райком партыі. Было вельмі многа спраў. Адразу ж з рознымі пытаннямі сюды пачалі звяртацца людзі, усім хацелася хутчэй уладкавацца, пачаць мірнае жыццё. 27 чэрвеня мы ўвайшлі ў Талачын. З гэтага дня пастала мірнае, поўнае радасці, хоць і напружанае яшчэ, жыццё нашых людзей.

Пакет асаблівай важнасці

«...Праз некалькі дзён абвергрупу падняла трывога: тэрміновая перадслакацыя. Хутка ўсіх пагрузілі ў машыны, і калона ўзяла курс на Мінск. У Талачыне зрабілі невялічкі прыпынак.

Непадалёк ад таго месца, дзе спынілася іх машына, сталу пажылы чалавек. Ён назіраў за тым, як адступаюць гітлераўцы. Рашэнне, як гэта іншы раз бывае ў разведчыкаў, прыйшло імгненна. Не, гэты не прадасць.

Алена забегла ў двор, а потым, як бы між іншым, падышла да мужчыны. Стоячы спіной да машыны, сказала:

— Вазьміце гэту запіску і перадайце першаму савецкаму афіцэру. Я вас прашу.

Той не паспеў апамятацца, як дзяўчына ўжо сядзела ў машыне.

А назаўтра ў Талачыне ўжо была Савецкая Армія. Сакрэтнае паведамленне Алены вельмі дапамагло тады нашым чэкістам».

Гэтыя радкі ўзяты з нарыса У. Фаміна «Скачок у цемру», надрукаванага ў «Настаўніцкай газеце» 21 лютага 1970 г., і адлюстроўваюць падзею, якая мела месца ў Талачыне перад вызваленнем яго войскамі Чырвонай Арміі. Адважная дзяўчына-патрыётка Алена Іосіфаўна Мамчыц, рызыкуючы ўласным жыццём, пранікла ў органы гітлераўскай ваеннай разведкі ў Оршы. Патрыётка здолела пранікнуць у школу, дзе рыхтавалі шпіёнаў і дыверсантаў для закідкі іх у савецкі тыл. Рыхтавалі для гэтага і Алену. Яна склала спіс шпіёнаў і дыверсантаў, якіх рыхтавалі ў аршанскай школе абвера, перанесла гэты спіс на паперу і зашыфравала. Калі ў чэрвені 1944 г. пад ударамі Чырвонай Арміі гітлераўцы пачалі адступаць з Оршы, разам з сабой яны забралі і А. І. Мамчыц. У гэты час і адбыўся апісаны вышэй выпадак. Разведчыца вымушана была пайсці на рызыку дзеля таго, каб спіс фашысцкіх шпіёнаў і дыверсантаў трапіў у рукі нашых контрразведчыкаў.

Інтуіцыя не падвяла патрыётку. Чалавек, якому яна даверылася, перадаў шыфроўку нашаму камандаванню. Хто ж быў гэты чалавек, які дапамог выкапаць важнае заданне, абяссшкодзіць варожых лазутчыкаў? Шмат гадоў гэта было невядома. Зараз імя патрыёта ўстаноўлена. Важную паслугу нашай контрразведцы зрабіў Андрыян Карнеевіч Галех. Гэта ён перадаў нашаму камандаванню пакет асаблівай важнасці. У 1944 г. Андрыяну Карнеевічу было 57 гадоў. Сам ён ураджэнец мястэчка Дуброўна Віцебскай вобласці. З 1921 г. А. К. Галех жыў у Талачыне.

А. Р. Мачахоўскі.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 26 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

На Оршанском направлении наши войска с боями продвигались вперед и овладели районными центрами Витебской области — городом Дубровно, городом и крупной железнодорожной станцией Толочин, а также заняли более 400 других населенных пунктов, в том числе Стайки, Смоляны, Обольцы, Пищалова (3 километра севернее Орши), Соловьи, Карабановичи, Сватошица, Цыбульская и железнодорожные станции Стайки, Юрцево, Смоляны, Лемница. Наши войска перерезали шоссейную и железную дороги Орша — Борисов и железную дорогу Орша — Лепель.

* * *

...Наши войска, стремительно продвигаясь вперед, обошли Оршу с севера и заняли более 400 населенных пунктов, в том числе узлы грунтовых дорог Обольцы и Смоляны. Противник пытается задержать советские войска на промежуточных рубежах. Наши подвижные части умелыми обходными маневрами прорываются в тылы противника, истребляют его живую силу, уничтожают и захватывают технику и вооружение. На ряде участков немцы беспорядочно отходят, бросая снаряжение,

боеприпасы и военное имущество. В одном селении наши бойцы захватили 300 автомашин, 3 склада с боеприпасами и свыше 30 тяжелых орудий. В селении Обольцы советские конные отряды стремительной атакой разгромили вражеский гарнизон, захватили 30 автомашин и взяли в плен 100 немцев. На другом участке советские подразделения окружили и уничтожили крупный немецкий отряд и захватили в плен 400 немецких солдат и офицеров. За день боев наши части захватили 14 танков и самоходных орудий, свыше 90 орудий разного калибра, 212 пулеметов, 246 автомашин, 500 лошадей и другие трофеи.

Сообщения Советского Информбюро. Т. 7. М., 1945. С. 10—11.

Подзвіг гвардзейцаў

У ходзе Беларускай наступальнай аперацыі ў вызваленні Талачыншчыны ўдзельнічалі 1-я і 5-я гвардзейскія стралковыя дывізіі 11-й гвардзейскай арміі. Воіны-гвардзейцы прадэманстравалі на талачынскай зямлі сапраўдныя ўзоры масавай мужнасці і гераізму. Аб гэтым сведчаць матэрыялы ЦА Міністэрства абароны СССР. Вось некаторыя эпізоды.

Тэлефаніст 10-га артдывізіёна 5-й гвардзейскай стралковай дывізіі сяржант Герасіменка Васіль Сяргеевіч да гэтых баёў быў двойчы ранены, меў медаль «За адвагу». У баях за вёску Малое Гальцэва разам з асабовым саставам другой батарэі прымаў удзел у адбіцці контратакі фашыстаў і асабіста знішчыў двух гітлераўцаў. У час праследавання ворага добра падтрымліваў сувязь з палком. За гэта ўдастоены новай урадавай узнагароды.

Гвардыі радавы механік-вадзіцель самаходнай артустаноўкі 10-га гвардзейскага самаходнага артдывізіёна Белік Аляксей Сцяпанавіч пры адбіцці контратакі ў раёне пасёлка Выдрыца 24 чэрвеня 1944 г., маневруючы на САУ-76, даў магчымасць экіпажу расстраляць каля 30 варожых салдат. У баях пры вызваленні вёскі Малое Гальцэва 26 чэрвеня і вёскі Латышова 28 чэрвеня Белік даў магчымасць знішчыць дзве грузавыя аўтамашыны праціўніка, у тым ліку адну штабную. Уварваўшыся ў вёску Латышова, гусеніцамі сваёй машыны раздушыў каля 10 гітлераўцаў. Узнагароджаны медалём «За адвагу».

Гвардыі лейтэнант Байдзін Максім Давыдавіч, камандзір стралковай роты 171-га гвардзейскага стралковага палка, у баі за вёску Дроздава 26 чэрвеня 1944 г. ўмела камандаваў ротай. Ён з байцамі адным з першых уварваўся ў вёску, дзе знішчыў да двух узводаў варожай пяхоты. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Гвардыі радавая, санінструктар 167-га гвардзейскага стралковага палка 1-й гвардзейскай стралковай дывізіі Гагіна Аляксандра Мацвееўна за перыяд баявых дзеянняў з 23 па 28 чэрвеня ў Аршанскім і Талачынскім раёнах пад магутным агнём праціўніка аказвала медыцынскую дапамогу раненым, выносіла іх з поля бою. Удзельнічала ва ўстаноўцы гарматы на адкрытую пазіцыю і падносіла боеприпасы. 28 чэрвеня на маршы пры нападзе праціўніка разам з разлікам гарматы прывадзіла апошнюю ў баявы стан. Была знішчана варожая самаходка. А. М. Гагіна была паранена, але поле бою не пакінула. Узнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі.

У баях на Аршаншчыне і Талачыншчыне ў перыяд з 23 па 27 чэрвеня 1944 г. вызначыўся таксама гвардыі лейтэнант, камандзір узвода 167-га гвардзейскага стралковага палка Маслак Уладзімір Максевіч. Да гэтага ён меў тры раненні, быў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі. Яго ўзвод знішчыў каля дзесяці агнявых кропак праціўніка, адбіў атаку самаходнай гарматы «фердынанд», знішчыў 18 нямецкіх аўтаматчыкаў і самаходную гармату ворага. Прамой наводкай узвод вёў агонь па адступаючай нямецкай пяхоце, знішчыў каля 40 гітлераўцаў і 5 узяў у палон. На грудзях адважнага афіцэра з'явіўся трэці ордэн — Чырвонай Зоркі.

28 чэрвеня напружаныя баі ішлі каля станцыі Слаўнае. Храбра змагаліся тут з ворагам гвардзейцы-артылерысты. 300 нямецкіх аўтаматчыкаў атакавалі 2-гі дывізіён 187-га гвардзейскага артылерыйскага палка. Артылерысты пад камандаваннем гвардыі лейтэнанта Кашарнова Мікалая Андрэевіча ўступілі ў паядынак з фашыстамі і вялі агонь прамой наводкай. Яны знішчылі каля 20 гітлераўцаў, падбілі 6 аўтамашын, на якіх немцы падвозілі аўтаматчыкаў. А калі праціўніку ўдалося наблізіцца да артдывізіёна да 20—30 метраў, Кашарноў М. А. павёў байцоў у атаку. Пры гэтым асабіста сам з аўтамата знішчыў 7 фашыстаў. Атака праціўніка была адбіта. За адвагу і мужнасць, праяўленыя ў гэтым баі, гвардыі лейтэнант Кашарноў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

У той жа дзень у адбіцці атакі варожых аўтаматчыкаў у раёне станцыі Слаўнае прымала ўдзел і батарэя гвардыі капітана Лапаціна Сцяпана Сямёнавіча. Артылерысты гэтай батарэі знішчылі больш за 60 фашысцкіх салдат і афіцэраў. А крыху раней, 23 чэрвеня,

цры прарыве магутнай абароны праціўніка ў раёне вёскі Ласыршчына на Дубровеншчыне батарэя С. С. Лапаціна знішчыла 3 кулямётныя кропкі і каля ўзвода гітлераўцаў. Пасля гэтых дзвюх аперацый адважны камбат Лапацін стаў кавалерам ордэнаў Айчыннай вайны I і II ступеней. Урадавых узнагарод удастоены і многія іншыя артылерысты гэтага падраздзялення.

У баях за Слаўнае па-геройску змагаўся гвардыі радавы 187-га гвардзейскага артпалка беларус з калгаса «Новы шлях» Брагінскага раёна Гарнаўскі Барыс. Калі 28 чэрвеня 2-гі дывізіён сустрэўся з аўтакалонай фашыстаў і тыя, разгарнуўшыся ланцугом, пайшлі ў атаку, артылерысты занялі абарону. Гарнаўскі падпусціў акупантаў на 200—250 метраў, адкрыў агонь з гарматы прамой наводкай. А калі гітлераўцы падышлі да гарматы ўшчыльную, разам з іншымі байцамі пайшоў у атаку, асабіста знішчыў з аўтамата 10 гітлераўцаў. За праяўлены ў гэтым баі гераізм узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Гвардыі сяржант Паланаў Павел Апанасавіч у 187-м гвардзейскім артылерыйскім палку служыў радыстам. Родам з Іванаўскай вобласці. У аперацыі па знішчэнню нямецкай аўтакалоны ў раёне Слаўнага Паланаў замяніў параненага артылерыста, вёў агонь па ворагу прамой наводкай. Падбіў цягач, аўтамашыну, знішчыў каля 20 гітлераўцаў. Быў паранены, але поля бою не пакінуў, хадзіў у контратаку. Мужны воін-сувязіст, які ў патрэбны момант стаў артылерыстам, быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Б. Шалуха.

Воіны-кацельнікаўцы

З успамінаў В. П. Багачова, кандыдата ваенных навук, палкоўніка запасу, былога начальніка разведкі 3-га гвардзейскага Кацельнікаўскага танкавага корпуса

26 чэрвеня 1944 г. савецкія танкісты ўварваліся ў Талачын, як гром з яснага неба. Нас тут фашысты ніяк не чакалі, яны адчувалі сябе ў поўнай бяспецы. У паніцы гітлераўцы спрабавалі вырвацца з горада і прарвацца на захад. Але ім гэта не ўдалося. У горадзе іх знішчалі танкісты батальёна капітана Фешчанкі, а дарогу для адступлення адрэзалі іншыя падраздзяленні — батальён аўтаматчыкаў маёра Калашнікава, артбатарэя капітана Шмялёва і самаходчыкі капітана Шышкіна. Агнём і гусеніцамі гвардзейцы знішчалі фашысцкіх захопнікаў, падаўлялі іх агнявыя кропкі. На станцыю тым часам прарываліся наступаючыя гітлераўскія эшалоны з войскамі і баявой тэхнікай, і танкістам брыгады Пахадзеева прыйшлося наладзіць ім «прыём». Мы, кацельнікаўцы, на ўсё жыццё запомнілі вершы нашага франтавога паэта О. Колычава, прысвечаныя баям за Талачын. Такія дасціпныя і трапныя тыя радкі, такі знаёмы і блізкі вобраз Вані Самаходава, «вясёлага танкіста», што міжволі зноў і зноў нагадваюцца тыя вершы:

...Мы нагрянули внезапно,
Словно на голову гром.
Не успели фрицы драпнуть
С наворованным добром.
Им казалось будто очень,
Очень укреплен Толочин,
Утопающий в лесу,
И опасность — под вопросом...
Оказалось: фронт — под носом,
Даже больше, на носу!...
Все гвардейцы знают: сколько
Нарубили мы дел.
На шоссе взгляните только,
Говорит оно без слов!
«Бенцы», «Оппели» развеяв,
Выбив «Тигров» и «Пантер»,
Здесь промчался Походеев,
Наш отважный офицер.
На восток враги хотели,
Что ж, пробил желанный срок!
И легли на самом деле
Головами на восток...

І на самай справе: на шашы было сапраўднае пабоішча. Сотні забітых, горы пакарабачанай тэхнікі, зброі, тысячы фашысцкіх ваяк, якія здаваліся ў палон.

У выніку ўзгодненых і рашучых дзеянняў перадавога атрада і галоўных сіл корпуса вялікая групоўка праціўніка ў раёне Оршы была адрэзана ад сваіх войск. Гэта значна аблягчала наступленне войск 2-га гвардзейскага танкавага корпуса генерала Бурдзейнага і 11-й гвардзейскай арміі ў цэлым. Мы зайшлі ў глыбокі тыл фашыстаў.

Апалелы вораг адчайна спрабаваў прарвацца ўздоўж Маскоўскай аўтамагістралі на захад у раёне станцыі Коханава. Фашысты падцягнулі сюды рэшткі часцей 256-й і 299-й пяхотных дывізій з танкамі і гарматамі. Выкарыстоўваючы складкі мясцовасці, кусты, канавы, групы фашыстаў па 150—200 чалавек пачалі абыходзіць батальёны 19-й гвардзейскай танкавай брыгады, прасочваюцца праз баявыя парадкі нашых войск. Адна з такіх груп, абышоўшы 1-ы батальён 18-й гвардзейскай танкавай брыгады, атакавала яе штаб. Воіны 18-й брыгады (штаб і рота кіравання) пры падтрымцы двух танкаў камандавання

адбілі ўсе атакі і нанеслі ворагу вялікія страты. Але фашысты не супакойваліся. У 21 гадзіну 26 чэрвеня яны зноў паспрабавалі атакаваць і прарвацца. Варожая пяхота, абышоўшы баявыя парадкі 18-й і 19-й гвардзейскіх танкавых брыгад, выйшла на левы фланг 3-й гвардзейскай танкавай брыгады і перарэзала шашу з Марцюхова на Коханава. Сувязь з тылам брыгады была перарвана. Аднак нашы воіны цвёрда ўтрымлівалі заняты рубеж, наносячы ворагу значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы. Усю ноч працягваўся жорсткі бой, а да раніцы 27 чэрвеня ўся групоўка фашыстаў была разгромлена. Камандзір корпуса генерал І. А. Воўчанка дакладваў камандуючаму 5-й гвардзейскай танкавай арміяй маршалу бранятанкавых войск П. А. Ротмістраву, што ўся магістраль ад Коханава да Талачына і на поўдзень ад горада завалена трупамі забітых салдат і афіцэраў праціўніка, разбітымі аўтамашынамі і бронетранспарцёрамі, пушкамі, павозкамі, кінутай ваеннай маёмасцю і нарабаваным дабром, што патрэбна некалькі сапёрных батальёнаў і трактароў для ачысткі дарогі.

П. А. Ротмістраў і камандуючы 3-м Беларускім фронтам генерал-палкоўнік І. Д. Чарняхоўскі аб'явілі падзяку воінам 3-га гвардзейскага Кацельнікаўскага танкавага корпуса за паспяховыя дзеянні па разгрому ворага і вызваленню Талачына.

Выхад часцей нашага корпуса ў глыбокі тыл аршанска-багушэўскай групоўкі праціўніка пераблытаў усе карты гітлераўскага камандавання. Адступаючы з-пад Оршы, фашысцкія часці абавязкова траплялі пад агонь нашых танкаў, артылерыі, аўтаматчыкаў. Вечарам 26 чэрвеня ў перадавы атрад корпуса была выдзелена 3-я гвардзейская танкавая брыгада пад камандаваннем палкоўніка К. А. Грыцэнкі. Яна пачала імклівае наступленне ўздоўж аўтамагістралі Масква — Мінск. Увечары 27 чэрвеня, разграміўшы ворага ў раёне Славеняў, мы выйшлі да ракі Бобр.

З дзённікавых запісаў старшага тэхніка-лейтэнанта І. А. Вайнштэйна

26-га чэрвеня 1944 года. Наш шлях пралягаў праз Смаляны. Талачын. Бобр, Крупкі. Рухаліся даволі хутка, нам дапамагалі самалёты, якія ўвесь час віселі ў паветры. У населеных пунктах жыхары сустракаюць нас, плачучы ад радасці. Старая па-свойму нас вітае: плача каля свайго разбуранага дома, недалёка ад дарогі, нізка кланяецца кожнай нашай машыне і двойчы яе хрысціць. Дзяўчаты ўсміхаюцца нам, махаюць хусцінкамі. Хлапчукі бягуць за машынамі і крычаць: «Слава нашым героям!». Старыя чынна прыкладваюць рукі да картузаў. У адказ мы ўсім махаем рукамі. У адной вёсцы машына засела ў гразі. Салдаты саскочылі і сталі яе выпіхваць. Купка жанчын, убачыўшы гэта, падбегла да нас і стала дапамагаць. Яны прасілі нас хутчэй біць фашыстаў, бо там далей чакаюць нас з такім жа нецярпеннем, як чакалі яны. Спяшаемся да Талачына. Недалёка ад горада трапілі пад артабстрэл. Прапускаючы ўперад танкі, рухаемся далёка ад дарогі. І раптам каманда: выехаць на аўтамагістраль. Не верым сваім вачам — мы ўклініліся ў сярэдзіну калоны праціўніка, які адступаў. Нашы танкі ішлі ўздоўж аўтамагістралі і грамілі ворага. Па праціўніку вяла агонь пават зенітная артылерыя. Раптам мы ўбачылі поезд, які імчаўся на ўсіх парах на захад. Танкісты таксама яго заўважылі і з першага ж стрэлу пацэлілі ў паравоз. Ён спыніўся і зашыпеў, а з вагонаў, як з мурашніка, сталі выскокваць гітлераўцы і ўцякаць у лес.

Рухацца далей па магістралі стала немагчыма. У 16.00 мы ўжо разам з танкамі шукаем праход сярод пакінутых ворагам бронетранспарцёраў, машын, павозак... Але расчысціць дарогу неабходна, і наш танк ідзе па магістралі, разварочваецца то ўправа, то ўлева, скідае на абочыну нямецкае «дабро». Не верылася, што могуць быць такія багатыя могілкі — з машын, павозак, баявой тэхнікі, боепрыпасаў, фуражу.

Камбат удакладніў, што мы перарэзалі аўтамагістраль за 1 км на ўсход ад чыгуначнай станцыі Талачын і раздзяліў батальён на тры часткі. Адна засталася на месцы на той выпадак, калі тут паспрабуюць прайсці часці праціўніка з-пад Оршы. Другая частка павінна была імкліва наступаць на горад, каб зламаць супраціўленне фашыстаў, якія заселі на гарышчах і ў падвалах (гэта група гнала потым з горада шматлікіх палонных). Трэцяя група збірала трафеі — папаўняла нашы запасы.

«Талачын гатоў да прыёму эшалонаў!»

Танки лейтенанта Пасечникова и младшего лейтенанта Лошкарева, перевалив через шоссе, первыми вышли к станции Толочин. После короткого боя они истребили два взвода гитлеровцев и подожгли два железнодорожных эшелона...

Как только Пасечников и Лошкарев ворвались на станцию Толочин, командир роты приказал открыть огонь по вражеским эшелонам, стоявшим на путях, и живым взять дежурного по станции, не нарушая связи с Оршей.

Этот приказ был выполнен. Первым разговор с немецким диспетчером станции Орша вел сам лейтенант Пасечников. Орша запросила: «Готов ли Толочин к приему эшелонов?». В это время грянул выстрел из танка Лошкарева по немецкому эшелону. Фашисты бросились врассыпную, загорелись вагоны.

Пасечников приказал радисту своего танка сесть за аппарат в комнате дежурного по станции и ответить Орше, что к приему эшелонов Толочин готов, уже один эшелон приняли. А сам вернулся в свою боевую машину, чтобы огнем поддержать начатый Лошкаревым бой.

Когда к вокзалу один за другим стали подходить танки из батальонов Фещенко и Самусенко, из-за поворота выскочила немецкая легковая машина. Она остановилась неподалеку от вокзала. Из машины вышел немецкий генерал. Навстречу ему бежали гитлеровцы. Генерал попытался их остановить. Вдруг к нему стал приближаться один из наших танков. Фашист попятился к своей машине, а затем пустился наутек. Но ему не удалось уйти.

На телеграфе продолжал работать радист Пасечникова. С ним говорил сам гитлеровский комендант оршанского узла. Советский радист обещал ему «теплую встречу», подобную той, которую получили эшелоны прибывшего в Толочин немецкого генерала.

В течение целого дня советские воины очищали московское шоссе от разбитой техники, чтобы обеспечить беспрепятственное продвижение наших войск, наступающих за танками. «Как под Сталинградом!» — говорили участники сражения, окидывая взором поле битвы под Толочином...

Друкуецца па кн.: В боях за Белоруссию. 2 изд. Мн., 1974. С. 374—375.

З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 3-Й ГВАРДЗЕЙСКАЙ ТАНКАВАЙ МІНСКАЙ ЧЫРВАНАСЦЯЖНАЙ БРЫГАДЫ

...В связи с плохой переправой в районе Алеповичи в район Мартюхово к 20.30 26.06.44 г. вышел только головной отряд, остальные части задержались на переправе и сумели выйти на шоссе м. Обольцы, Кохапово только к 21.30 26.06.44 г.

Достигнув Мартюхово, головной отряд оседлал магистраль Москва — Минск, имея задачей не допустить отхода частей противника из Орши на Борисов, одновременно помочь 18-й гвардейской танковой бригаде, так как последняя занимала и удерживала рубеж на широком фронте.

Противник, разбитый нашими частями, пытался большими группами прорваться в западном направлении.

В 21.15 256-я пехотная дивизия противника, кавалерия, артиллерия, обозы при поддержке 7—10 тяжелых танков были замечены нашей разведкой в лесу 1 км сев.-зап. Мартюхово. Было установлено, что эта группа имеет задачу прорваться на запад через Мартюхово.

В течение всего вечера 26.06.44 г. и ночи 27.06.44 г. головной отряд четыре раза отбивал контратаки противника, пытавшегося прорваться через боевые порядки батальона, который ввиду отсутствия пехоты не в состоянии был уничтожать и задерживать мелкие группы противника.

К 21.45 26.06.44 г. остальные части бригады вышли в район леса, что 800 м юго-зап. Острошапки, где были встречены этим же противником, с которым вел бой 1-й танковый батальон.

Прикрыв шоссе несколькими танками и тяжелыми орудиями, противник не давал остальным частям бригады подойти к 1-му танковому батальону, который продолжал бой с противником.

С выходом наших танков, противник сразу поджег 3 головных танка и ранил командира 2-го танкового батальона гвардии майора Сюсюкина.

Развернувшись по обе стороны шоссе, 2-й, 3-й танковые батальоны и моторизованный батальон автоматчиков в течение двух часов вели бой, в основном с живой силой противника. Пехота противника большими группами из Малого Гальцево стремилась прорваться на Запад, несмотря на ураганный огонь наших танков и автоматчиков, противник, большинство пьяные, прорывался прямо через боевые порядки танков, оставляя сотни трупов на своем пути. В 22.45 остатки

противника, рассеянного огнем наших танков и автоматчиков, мелкими группами ушли лесами на запад.

В результате этих боев противник понес следующий урон в живой силе и технике:

уничтожено более 2000 солдат и офицеров,
взято в плен более 700 солдат и офицеров.
В технике:
сожжено танков типа «Пантера» 4,
подбито танков типа «Пантера» 1,
уничтожено автомашин с грузами 25,
уничтожено лошадей до 250.
уничтожено орудий разного калибра 5.
Бригада в этих боях понесла следующие потери:
сгорело танков Т-34 4,
подбито танков Т-34 3,
убито 12 человек,
ранено 17 человек...

ЦАМА СССР, ф. 3067, воп. 1, спр. 10, л. 154—156.

Атака з ходу

З успамінаў Героя Савецкага Саюза Івана Аляксеевіча Сарокіна, былога камандзіра разведвальнага батальёна 3-га гв. танкавага корпуса

...Наш батальён разведку вёў у большасці выпадкаў боем. Мы былі добра забяспечаны баявой тэхнікай, асабовы склад быў надзейны, афіцэры добра падрыхтаваныя. Я як камандзір ганарыўся сваёй часцю, верыў у яе магчымасці.

Наш батальён атрымаў задачу: выйсці да Талачына і авалодаць ім, перарэзаць аўтамагістраль Смаленск — Барысаў і чыгунку, не дапусціць адыходу войск праціўніка і руху яго цягнікоў у заходнім напрамку. Атрымаўшы загад камандзіра корпуса, батальён стаў імкліва рухацца ў напрамку Талачына, знішчаючы ворага на сваім шляху. Калі мы падышлі да рэчкі, што працякала на поўдзень ад вёскі Парэчча, выявілася, што мост, па якім павінны рухацца, разбураны. А берагі рэчкі крутыя, і спатрэбіцца шмат часу на пераправу. Таму было вырашана пайсці на ўсход і выйсці на аўтамагістраль у раёне вёскі Азерцы. Я рухаўся на чале батальёна. З невялікай вышыні на поўнач ад вёскі добра было відаць, як па аўтамагістралі ў напрамку Талачына рухаецца вялікая колькасць баявой тэхнікі ворага. Гітлераўцы рухаліся і па дарозе, і побач з ёю. Праціўнік спяшаўся адвесці частку сваіх войск на захад. Аб'ект для нападу быў вартым. Марудзіць было нельга, мы даражылі кожнай мінутай. Было вырашана разгарнуць батальён, прыкрыўшыся вёскай Азерцы, і з ходу атакаваць праціўніка. Батальён хутка разгарнуўся ў баявы парадак і імклівай атакай, ведучы агонь з усіх відаў зброі, хутка змяў ворага, выйшаў на аўтамагістраль і пачаў імклівае наступленне. Атака батальёна была поўнай нечаканасцю для праціўніка, і гэта вырашыла ход бою. Як толькі мы выйшлі на шашу і разгарнулі наступленне, як па заказу, у небе з'явіліся чатыры нашы штурмавікі і, пікіруючы, сталі абстрэльваць ворага. Налёт нашай авіяцыі значна аблегчыў задачу батальёна і ўнёс у стан ворага яшчэ болей панікі. Батальён імкліва рухаўся ўперад па абодва бакі ад шашы, дзе была асноўная групоўка ворага. Ураганным агнём і атакамі мы ўвесь час прыціскалі праціўніка да дарогі, чым моцна скоўвалі яго манеўр. Гітлераўцы паспрабавалі перайсці ў контратаку, але мы яе хутка адбілі, нанёсшы ворагу вялікія страты. Праўда, на вялікі жаль, пры адбіцці гэтай контратакі загінуў сакратар камсамольскай арганізацыі батальёна. Так нечаканасць пашага ўдару, імклівыя дзеянні ўсіх падраздзяленняў батальёна, рашучасць і ініцыятыва нашых салдат вызначылі вынік гэтага наступлення. І да поўнага разгрому ворага ў раёне Талачына і авалодання горадам у стане гітлераўцаў была разгубленасць, яны так і не змаглі адбіць удар батальёна.

За ўдзел у гэтай баявой аперацыі многія нашы салдаты і афіцэры былі прадстаўлены да ўрадавых узнагарод. Я быў адзначаны ордэнам Леніна.

Лётчыкі — ганаровыя чыгуначнікі

26 июня дивизия получила задачу не дать уйти на запад ни одному железнодорожному эшелону противника, застопорить движение их на участке Орша — Борисов.

Сначала на разведку боем вылетели группы штурмовиков старших лейтенантов Б. С. Окрестина и Л. И. Беды. Окрестину предстояло найти головные эшелоны и остановить их. Его группа летела чуть правее железной дороги, по обеим колеям которой поезда длинной, почти беспрерывной лентой шли лишь в одном направлении — на запад, к Борисову. Много эшелонов стояло на станциях.

У станции Толочин цепочка эшелонов обрывалась, западнее поездов не было. Ведущий развернул группу и повел ее на головные эшелоны. Прицелившись, Окрестин сбросил две бомбы на паровоз. Удар был на редкость метким, одна попала в цель. Бомбы Г. П. Викторова и И. П. Фонарева разорвались в середине эшелона.

Вслед за первым столь же успешной атаке подвергся и второй эшелон, что шел по второму пути. Паровоз расстрелял Окрестин. Ведомые били по вагонам... Тем временем группа старшего лейтенанта Л. И. Беды атаковала замыкающий эшелон.

Звено во главе со старшим лейтенантом Н. И. Семейко действовало иначе. Летчики старались так атаковать железнодорожный эшелон, чтобы он не падал под откос, а оставался на путях и закупоривал движение...

Эскадрилья капитана В. Ф. Анисова атаковала железнодорожный эшелон на участке Кохапово — Толочин. По приказу ведущего летчики били только по паровозу и железнодорожному полотну. Аналогично действовали и другие группы.

Подчиненные старшего лейтенанта В. В. Гамзина штурмовали станцию Троцилово, где под парами стояло несколько эшелонов, подготовленных к отправлению. Несмотря на сильный зенитный огонь, ведущий после удара по паровозу перестроил группу в «круг» и сделал три захода на цель...

26 июня полки дивизии произвели 234 самолето-вылета, в том числе 138 на штурмовку эшелонов противника. В результате было подожжено 15 эшелонов и разбито 10 паровозов. Кроме того, штурмовики не дали фашистам угнать 25 эшелонов, парализовали движение на участке железной дороги Орша — Толочин. Разбитые эшелоны, закупорившие пути, достались советским войскам как трофеи.

В тот же день на шоссе Орша — Борисов соединениями 1-й воздушной армии, в том числе и 1-й гвардейской штурмовой авиадивизией, было сожжено и выведено из строя около 4 тыс. автомашин, уничтожено не менее 500 повозок противника.

В районе станции Толочин вплоть до ее освобождения постоянно дежурили штурмовики дивизии. Сменяя друг друга в воздухе, «ильюшины» ждали: не появятся ли здесь немецкие путеразрушители. И дождались. Группы, которые вели старший лейтенант Л. И. Беда и лейтенант А. Я. Брандыс, обнаружили сразу две такие машины. Обе они были уничтожены.

Гвардейцы достойно справились с поставленной задачей...

Гвардейцы не дали врагу вывести из строя железную дорогу от Орши до Борисова, сохранили более 150 км пути для обеспечения действий советских войск, стремительно наступавших в Белоруссии.

Экипажи, отличившиеся в «железнодорожной операции», были награждены орденами и медалями, а также нагрудным знаком «Почетный железнодорожник». Этой чести удостоились капитаны М. Г. Гареев, Д. В. Каприн, А. К. Недбайло, М. Т. Путилин, старшие лейтенанты Л. И. Беда, Ф. С. Бойцов, И. А. Воробьев, В. В. Гамзин, И. И. Лысенко, К. В. Макаров, Б. С. Окрестин, лейтенанты А. Я. Брандыс, А. Ф. Коломоец.

Начальник Белорусской железной дороги за умелые боевые действия по защите Оршанского железнодорожного узла и прилегающих к нему перегонов от разрушения фашистскими захватчиками наградил отличившихся летчиков Почетной грамотой и форменными железнодорожными фуражками.

Друкуецца з скарачэннямі па кн.: Королев В. О. Гвардейцы первой штурмовой. М., 1980. С. 86—88.

Вуліца імя лётчыка-героя

«Пахадзееўскі мяшок», як трапна назвалі нашы воіны акружэнне і разгром гітлераўцаў пад Талачыном, выліўся ў сапраўднае пабоішча.

Неўзабаве пасля вызвалення Талачына ў горадзе пабываў карэспандэнт газеты ваенна-паветраных сіл «Сталинский сокол» Г. Эль-Рэгістан. На старонках газеты ён апісаў подзвігі нашых лётчыкаў-штурмавікоў у небе Беларусі і іх удзел у разгроме ворага. Апісаў ён і цікавы эпізод, пра які яму расказалі мясцовыя жыхары.

Адступаючы пад ударамі нашых войск, гітлераўцы захапілі з сабой 450 чалавек — групу жыхароў саўгаса «Райцы» Талачынскага раёна. Калону нявольнікаў заўважылі лётчыкі Першай гвардзейскай штурмавой авіядывізіі. На брыючым палёце яны абстралялі фашысцкія машыны і канвой. Гітлераўцы ў паніцы разбегліся. Мірныя савецкія людзі былі выратаваны. Жыхары папрасілі ваеннага карэспандэнта знайсці лётчыкаў, якія ўдзельнічалі ў гэтай аперацыі, і Г. Эль-Рэгістан выканаў іх просьбу. Ад фашысцкай няволі жыхароў саўгаса «Райцы» вызвалілі лётчыкі эскадрыллі, якой камандаваў ураджэнец горада Куйбышава гвардыі капітан Пётр Мікалаевіч Жаўтухін. Слаўны сокал і яго баявыя сябры разам з гвардзейцамі-кацельнікаўцамі ў раёне вёскі Азерцы (за чатыры кіламетры ад Талачына па шашы Масква — Мінск) удзельнічалі ў знішчэнні жывой сілы і тэхнікі гітлераўцаў. Гэта яны разбамбілі варожыя эшалоны на ўчастку Орша — Барысаў, не далі гітлераўцам прарвацца, уцячы за Бярэзіну. Жаўтухін, а таксама гвардыі маёры Кандакоў і Герасімаў, гвардыі лейтэнанты Казянкоў і Асадчых з той жа Першай гвардзейскай штурмавой авіядывізіі, бадай, першымі ў нашай ваеннай авіяцыі былі прадстаўлены да значкоў «Ганаровы чыгуначнік»!

Хто ж ён капітан Жаўтухін, як склаўся яго далейшы лёс, ці дачакаўся Перамогі? Пётр Мікалаевіч Жаўтухін — ураджэнец горада Куйбышава. І першае сваё пісьмо аўтар гэтых радкоў адрасаваў у Куйбышаўскі аблваенкамат.

Вось адказ за подпісам куйбышаўскага аблваенкома. «На Ваша пісьмо паведамляю, што Герой Савецкага Саюза падпалкоўнік у адстаўцы Пётр Мікалаевіч Жаўтухін, 1916 года нараджэння, памёр 23 сакавіка 1971 года. Яго жонка Жаўтухіна Марыя Цімафееўна жыве ў горадзе Куйбышаве». Горкая вестка. Жыццё героя абарвалася ва ўзросце 55 гадоў. Падумалася, хто ведае, мо і тут зноў нагадала пра сябе вайна...

Пісьмы ад Марыі Цімафееўны Жаўтухінай пацвердзілі гэта. Расказала яна і пра жыццёвы шлях мужа, яго ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. У 1937 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію. Скончыў Тодкую ваенную авіяцыйную школу пілотаў, быў інструктарам у званні старшага сяржанта. З верасня 1941 года на фронце, спачатку ў разведвальнай авіяцыі, потым у штурмавой, радавы лётчык, камандзір звяна, камандзір эскадрыллі.

П. М. Жаўтухін.

Паўднёвы фронт, баі за Крым і Данбас, вызваленне Беларусі, Літвы, штурмоўка і бамбёжка ворага ва Усходняй Прусіі. За гады вайны зрабіў 337 баявых вылетаў, збіў некалькі самалётаў гітлераўпаў, быў неаднаразова паранены. Вырас ад радавога лётчыка да маёра, штурмана палка. У партыю ўступіў у 1941 годзе, званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 10 лютага 1945 года. Узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі. Сама Марыя Цімафееўна была разам з мужам на фронце.

Пасля дэмабілізацыі Пётр Мікалаевіч да апошніх дзён свайго жыцця працаваў на куйбышаўскім заводзе «Строммашына».

Хто можа дапамагчы ў пошуках? Можа, аўтар артыкула пра подзвігі нашых сокалаў у дні вызвалення Беларусі Г. Эль-Рэгістан — вядомы савецкі паэт, адзін з аўтараў тэксту Дзяржаўнага гімна СССР.

Званок у Маскву. Гарольд Эль-Рэгістан слухае. Не, карэспандэнтам газеты нашых ваенна-паветраных сіл быў не ён, а яго бацька Габрыель Эль-Рэгістан. Ен жа Гарольд Габрыелевіч, таксама быў у дні Вялікай Айчыннай ваенным карэспандэнтам, але на іншым участку фронту. Бацькі ж даўно няма.

Час няўмольны. Радзеюць і радзеюць рады ветэранаў... Пасля вайны ў Новасібірску памёр камандзір авіяпалка, дзе служыў Жаўтухін, В. Д. Жыхараў. Не адказалі аўтару гэтых радкоў і некаторыя іншыя героі векапомных дзён вызвалення Беларусі — напэўна, іх таксама няма ўжо сярод нас...

Рашэннем выканкома Талачынскага гарадскога Савета народных дэпутатаў адна з вуліц горада Талачына названа імем Героя Савецкага Саюза Пятра Мікалаевіча Жаўтухіна.

Б. Раманаў.

Яны вызвалялі Талачыншчыну...

Б. С. Акрэсцін.

М. М. Альшэўскі.

АКРЭСЦІН Барыс Сямёнавіч. Герой Савецкага Саюза (13.4.1944). Нарадзіўся 18.2.1923 г. ў Маскве. З рабочых. Рускі. Член КПСС з 1943 г. З верасня 1942 г. на Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім і 3-м Беларускім франтах. Намеснік камандзіра эскадрыллі штурмавога авіяпалка гвардыі ст. лейтэнант Б. С. Акрэсцін з верасня 1942 г. да снежня 1943 г. здзейсніў 381 баявы вылет на штурмоўку жывой сілы і баявой тэхнікі праціўніка. Удзельнічаў у вызваленні Талачына — штурмаваў варожыя эшалоны на ўчастку чыгункі Орша — Талачын. 6.7.1944 г. ў час баёў па ліквідацыі нямецкай групоўкі, якая прарывалася з мінскага «катла», яго самалёт быў падбіты. Ахопленую агнём машыну лётчык накіраваў на варожую калону, знішчыў шмат гітлераўцаў. Б. С. Акрэсцін пахаваны ў Мінску, дзе яго імем названы вуліца, завулак, 65-я сярэдняя школа, на тэрыторыі якой устаноўлены помнік.

АЛЬШЭЎСКІ Мікалай Міхайлавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 27.1.1919 г. ў г. Сквіра Кіеўскай вобласці. Украінец. Член ВЛКСМ. З 1941 г. на Заходнім, Ленінградскім і 3-м Беларускім франтах. Камандзір танка малодшы лейтэнант М. М. Альшэўскі вызначыўся пры вызваленні Віцебскай і Мінскай абласцей. 26.6.1944 г. ў баі каля в. Кісялі Талачынскага раёна экіпаж пад яго камандаваннем знішчыў танк «тыгр», 4 гарматы і 8 аўтамашын з пяхотай праціўніка, на станцыі Коханава Талачынскага раёна вызваліў больш за 150 савецкіх грамадзян ад вывазу ў Германію. У ліпені 1944 г. пры ліквідацыі варожай групоўкі ў мінскім «катле» экіпаж на чале з М. М. Альшэўскім знішчыў 2 танкі, 20 аўтамашын з ваенным грузам, 70 гітлераўцаў і ўзяў у палон больш за 200 салдат і афіцэраў праціўніка. М. М. Альшэўскі загінуў у баі 22.8.1944 г. Пахаваны ў Вільнюсе. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

26 чэрвеня 1944 г. танкавы батальён, у складзе якога дзейнічаў экіпаж Альшэўскага, атрымаў загад перарэзаць чыгунку Орша — Ленель. Калі пачаўся бой, танк Альшэўскага ў ліку першых прарваўся праз варожыя заслоны, але каля в. Кісялі Талачынскага раёна быў спынены агнём праціўніка. Камандзір батальёна па радыё загадаў Альшэўскаму разведкай боем высветліць абстаноўку. Праціўнік, які займаў абарону ў гатым раёне, шалёна супраціўляўся. Ён увесь час падкідваў рэзервы, пераходзіў у контратакі. Малодшы лейтэнант Альшэўскі непрыкметна вывеў свой Т-34 да дарогі і ўбачыў, што па ёй у напрамку пераднягі краю рухаюцца грузавікі з варожымі салдатамі.

— Уперад! — загадаў Мікалай.

Танк вырваўся з хмызняку і, ведучы на хаду агонь, урэзаўся ў аўтакалону, перакуліў і раздушыў некалькі аўтамашын, на вялікай скорасці стаў прасаваць поле, па якім разбегліся гітлераўцы. Многа іх тут палягло. Прарваліся ў глыб варожай абароны і іншыя нашы танкі. Гітлераўскае камандаванне кінула супраць іх «тыграў». Экіпажу Мікалая Альшэўскага да гэтага часу не даводзілася сустракацца з хваленымі фашысцкімі машынамі, але ніхто з нашых танкістаў не пахіснуўся. Альшэўскі ўмела манеўраваў на полі бою і першым падпаліў варожы танк.

Неўзабаве Альшэўскі вызначыўся ў баі на станцыі Коханава. Танк пад яго камандаваннем уварваўся на пазіцыю ворага, раздушыў гусеніцамі два станковыя кулямёты, вывеў са строю паравоз, які быў падрыхтаваны цягнуць вагоны з савецкімі грамадзянамі на катаржныя работы ў Германію.

За подзвігі, здзейсненыя на беларускай зямлі, Альшэўскі быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза. На жаль адважны танкіст не пачуў атрымаць высокую ўзнагароду. У адным з баёў пры вызваленні Літоўскай ССР ён загінуў смерцю храбрых.

БЯДА Леанід Ігнатавіч. Двойчы Герой Савецкага Саюза (26.10.1944 і 29.6.1945). Генерал-лейтэнант авіяцыі (1972). Заслужаны ваенны лётчык СССР (1971). Нарадзіўся 16.8.1920 г. ў сяле Новапакроўка Урыцкага раёна Кустанайскай вобласці. З сялян. Украінец. Член КПСС з 1942 г. Скончыў Арэнбургскую авіяцыйную школу пілотаў (1942), ваенна-паветраную акадэмію (1950), Ваенную акадэмію Генштаба (1957). У Чырвонай Арміі з 1940 г. Са жніўня 1942 г. на Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім, 3-м Беларускім франтах — пілот, старшы пілот, намеснік камандзіра і камандзір эскадрыллі, памочнік камандзіра 75-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка. Удзельнік Сталінградскай бітвы, вызвалення Украіны, Крыма, Беларусі (у тым ліку Талачыншчыны), Літвы, наступальных аперацый ва Усходняй Прусіі і Польшчы. Здзейсніў 214 баявых вылетаў. Пасля вайны камандаваў авіяцыйным палком, дывізіяй, авіяцыяй Беларускай ваеннай акругі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 5-га скліканння. Трагічна загінуў 26.12.1976 г. Пахаваны ў Мінску, дзе яго імем названа ву

ліца. Бюст Л. І. Бяды ўстаноўлены ў Кустанаі.

ГАРЭЕЎ Муса Гайсінавіч. Двойчы Герой Савецкага Саюза (23.2 і 19.4.1945). Нарадзіўся 9.7.1922 г. ў в. Ілякшыдзе Ілішэўскага раёна Башкірскай АССР. З сялян. Башкір. Член КПСС з 1944 г. Скончыў ваенна-авіяцыйную школу (1942), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1951), Ваенную акадэмію Генштаба (1959). У Чырвонай Арміі з 1940 г. На фронце з верасня 1942 г.— пілот, камандзір звяна, эскадрыллі, штурман 76-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка. Удзельнік баёў пад Сталінградам, у Дапбасе, Крыме, Беларусі, Польшчы, Германіі. Удзельнік вызвалення Барысава, Віцебска, Оршы, Талачына, Мінска, Гродна. Здзейсніў 250 баявых вылетаў. Да 1964 г. М. Г. Гарэеў знаходзіўся на адказных камандных пасадах у Савецкай Арміі, палкоўнік. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 2—4-га скліканняў. Жыве ў Уфе, дзе да 1977 г. працаваў старшынёй абласнога камітэта ДТСААФ Башкірскай АССР. Бюст героя ўстаноўлены ў Уфе.

З успамінаў Б. Карнілава, афіцэра запасу ВПС, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

«Чорнай смерцю» празвалі гітлераўцы зоркакрылыя самалёты-штурмавікі Іл-2. Добра абсталяваныя рознымі відамі навейшай для таго часу зброі, яны наводзілі жах на праціўніка. Авіятары іх называлі лятучымі танкамі.

Па-майстэрску вадзіў свой «Іл» двойчы Герой Савецкага Саюза, слаўны сын башкірскага народа Муса Гарэеў. Энергічны і валявы, смелы і рашучы ён асабістым прыкладам натхняў лётчыкаў-штурмавікоў, сваіх вядзёных. Разам са сваімі баявымі сябрамі ён бамбіў і штурмаваў варожыя эшалоны, аэрадромы, абарончыя ўмацаванні, чыгуначныя вузлы і станцыі, артылерыйскія пазіцыі, жывую сілу ворага ў час Беларускай аперацыі. Удзельнічаў і ў вызваленні Талачына.

І вось атрыманы чарговы загад камандавання. «Ілы» ўамываюць у неба. Баявым строем «Правы пеленг» у выглядзе лесвічкі яны ляцяць у напрамку Талачына. Лётчыкі спачатку абходзяць горад з боку, уздоўж аўтамагістралі, што вядзе на Мінск, потым, рэзка зніжаючыся і робячы разварот, накіроўваюцца да станцыі Талачын, забітай варожымі эшалонамі.

— Біць перш за ўсё па паравозах,— камандуе Муса Гарэеў сваім вядзёным.

Серыі фугасных авіябомбаў, нібы шчупакі, ляцяць на паравозы. Вогненныя шапкі выбухаў скаланулі зямлю і павятра. Некалькі паравозаў спрабуюць манеўраваць, але хутка і яны знікаюць за белай заслонай пары, спыняюцца. Яшчэ некалькі захадаў і цэль накрыта. Баявым строем «Фронт» Муса вядзе «Ілы» на свой аэрадром. Баявое заданне выканана. За тое, што лётчыкі не нанеслі вялікіх страт станцыйным будынкам і эшалонам, нагружаным награбленым народным дабром (яно дасталося пасля яго гаспадарам), лётчыкі атрымалі падзяку камандавання. Многія з іх, у тым ліку і Муса Гарэеў, былі удастоены звання «Гаварова чыгуначніка».

У адным экіпажы з М. Гарэевым вызваляў Талачыншчыну і кавалер ордэна Славы трох

Л. І. Бяда.

М. Г. Гарэеў.

ступеняў Аляксандр Іванавіч Кір'янаў. А. І. Кір'янаў нарадзіўся ў сяле Нікіціна Курганскай вобласці. У Чырвоную Армію яго прызвалі папярэдняе Вялікай Айчыннай вайны. Быў майстрам па авіяўзбраенні. У сорак трэцім скончыў курсы паветраных стралкоўрадыстаў і ў тым жа годзе прыбыў на фронт. Яго прызначылі ў экіпаж камандзіра эскадрыллі гвардыі старшага лейтэнанта Мусы Гарэева. Праз месяц ён быў удастоены першай узнагароды — медаля «За адвагу». Ваявалі на поўдні. У пачатку сорак чацвёртага за актыўныя дзеянні на знішчэнню варожай пераправы на Дняпры Аляксандр Кір'янаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Пасля вызвалення Крыма авіяцыйнае злучэнне, у якім служылі Кір'янаў і Гарэеў, увайшло ў састаў 3-га Беларускага фронту. Яны служылі ў праслаўленай Першай гвардзейскай штурмавой авіядывізіі і прымалі ўдзел у вызваленні ад акупантаў Талачына і Талачынскага раёна. Некалькі разоў адважныя авіятары рабілі палёты на чыгуначную станцыю Талачын. У небе Беларусі паветраны стралок разам з камэскам зрабілі 36 баявых вылетаў, знішчылі шмат ваеннай тэхнікі і жывой сілы праціўніка. У Беларусі яго ўзнагародзілі ордэнам Славы III ступені. Салдацкі ордэн Славы II ступені яму быў уручаны за ратныя подзвігі ў Літве, а ордэн Славы I ступені і ордэн Айчыннай вайны I ступені ён атрымаў ва Усходняй Прусіі.

Пасля вайны Аляксандр Іванавіч Кір'янаў скончыў інстытут і працаваў старшым экаламістам Кубанскага навукова-даследчага інстытута трактароў і сельгасмашын, жыў у горадзе Новакубанску. Памёр у 1972 годзе.

ДАЙПЕКІП Павел Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 18.12. 1918 г. на хутары Папаснае Калачэеўскага раёна Варонежскай вобласці. З сялян. Рускі. Кандыдат у члены КПСС. У Чырвонай Арміі

П. І. Дайнекін.

В. Г. Казянкоў.

М. С. Калашнікаў.

М. І. Марцьянаў.

з 1941 г. З ліпеня 1943 г. на Варонежскім і 3-м Беларускім франтах. Вызначыўся пры вызваленні Талачына, Барысава і Мінска. 26.6.1944 г. танкавая рота пад камандаваннем гвардыі лейтэнанта П. І. Дайнекіна абходным манеўрам перарэзала шашу Орша — Мінск, першая ўварвалася ў Талачын, разграміла групоўку праціўніка і адрэзала яму шлях да адступлення. У баях за Барысаў, Мінск і Вільнюс знішчыла 9 танкаў, 21 самаходную пушку і 29 палявых гармат, 60 мінамётаў, 62 бронетранспарцёры, 234 аўтамашыны і каля 400 гітлераўцаў. П. І. Дайнекін загінуў 22.3.1945 г. ў баі за г. Сопат (Польшча). Імем героя названа школа па радзіме.

З узнагароднага ліста П. І. Дайнекіна

...Тов. Дейнекин в боях на 3-м Белорусском фронте с 26.6 по 9.7.44 года в районах: Селец — Толочин — Борисов — Минск — Вильно проявил мужество и геройство.

Смело и дерзко водил в атаки на врага свою танковую роту. 26.6.44 года совершил смелый обходной маневр в районе шоссейной дороги Орша — Минск, его рота первая ворвалась в город Толочин, разгромила группировку противника и отрезала путь отхода противнику на город Минск.

В последующих боях за город Борисов, Минск, Вильно рота тов. Дейнекина продолжала стремительно продвигаться вперёд, нанося огромные потери противнику в живой силе и технике...

Командир 1 танкового батальона
19 гв. танковой бригады гвардии
капитан — Фещенко.

КАЗЯНКОЎ Васіль Георгіевіч. Герой Савецкага Саюза (19.4.1945). Нарадзіўся 17.2.1923 г. ў г. Кувандык Арэнбургскай вобласці. З рабочых. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Скончыў Акцюбінскую авіяцыйную школу (1942). На фронце з 1942 г. Удзельнік баёў пад Сталінградам, вызвалення Украіны, Беларусі. За гады вайны здзейсніў 308 баявых вылетаў. Камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка гвардыі старшы лейтэнант В. Г. Казянкоў пры вызваленні Віцебскай вобласці 26.6.1944 г. двойчы штурмаваў эшалоны праціўніка, што ішлі ад станцыі Орша; разбіў эшалон на перагоне Трацылава — Талачын, у выніку былі знішчаны паравоз, 15 вагонаў і платформ з танкамі і іншай тэхнікай праціўніка. За ўдзел у вызваленні Талачына В. Г. Казянкоў быў узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага. Усяго за Вялікую Айчынную вайну атрымаў 8 ордэнаў: Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, чатыры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Леніна. Загінуў В. Г. Казянкоў пры штурме Кёнігсберга (накіраваў свой палаючы самалёт на скопішча баявой тэхнікі ворага). Імем героя названы траўлер Калінінградскага тралавага флоту, вуліца і васьмігадовая школа № 22 у Акцюбінску, дзе ён вучыўся, на школе ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

КАЛАШНІКАЎ Мікалай Сямёнавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 18.12.1913 г. ў г. Фрунзе. З сялян. Рускі. Член КПСС з 1941 г. Скончыў сельскагаспадарчы тэхнікум (1934), Ташкенцкае ваенна-пяхотнае вучылішча імя Леніна (1938), паскораны курс Ваеннай акадэміі імя Фрунзе (1942). У Чырвонай Арміі з 1935 г. На фронце з мая 1942 г.

У баях за вызваленне Талачыншчыны асабліва вызначыліся воіны 19-й гвардзейскай танкавай арміі. Летам 1944 г. ваяваў у складзе гэтай арміі і гвардыі маёр Мікалай Калашнікаў. Праўда, танкістам ён не быў, а ўзначальваў батальён аўтаматчыкаў, які ўваходзіў у склад адной з танкавых брыгад. У час прарываў аўтаматчыкі ішлі ў бой на танках або непасрэдна за танкамі, атакуючы ворага.

26.6.1944 г. батальён М. С. Калашнікава сумесна з танкамі адрэзаў праціўніку шлях да адступлення па шашы Орша — Мінск каля г. п. Талачын. Аўтаматчыкі батальёна і танкісты толькі за 4 дні наступлення знішчылі 2 чыгуначныя эшалоны, 190 аўтамашын, 5

П. В. Фешчанка.

танкаў, 35 бронетранспарцёраў, каля 2 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка. М. С. Калашнікаў загінуў 14.8.1944 г. ў баі на тэрыторыі Літоўскай ССР. Пахаваны на вайсковых могілках у Каўнасе. На магіле пастаўлены помнік. Імя героя ўвекавечана на мемарыяльных дошках у школе г. Фрунзе, дзе ён вучыўся, і ў Ташкенцкім ваенным вучылішчы.

МАРЦЬЯНАЎ Мікалай Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (19.4.1945). Нарадзіўся 15.12.1923 г. ў г. Макушына Курганскай вобласці. З рабочых. Рускі. Член КПСС з 1946 г. Скончыў ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1943), Ваенна-паветраную акадэмію (1952). У Чырвонай Арміі з сакавіка 1941 г. З ліпеня 1943 г. на Паўднёвым, 4-м Украінскім, 3-м Беларускім франтах — лётчык, камандзір звяна, потым эскадрыллі штурмавога авіяпалка. Удзельнік баёў у Данбасе, Таўрыі, пад Севастопалем, на Беларусі, у Літве, Польшчы, Усходняй Прусіі. Здзейсніў 175 баявых вылетаў. У чэрвені — ліпені 1944 г. гвардыі капітан М. І. Марцьянаў штурмаваў пазіцыі ворага ў раёне Оршы, Віцебска, бамбіў ваенныя эшалоны праціўніка на чыгунцы Орша — Мінск. Удзельнік вызвалення Талачына. Вызваляў Мінск, удзельнічаў у ліквідацыі варожай групоўкі на паўднёвы ўсход ад горада. Да 1971 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Працуе выкладчыкам у Ульянаўску.

ФЕШЧАНКА Пётр Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Генерал-маёр (1965). Нарадзіўся 3.7.1922 г. ў сяле Прышыб Крамянчугскага раёна Палтаўскай вобласці. З сялян. Украінец. Член КПСС з 1942 г. Скончыў 2-е Саратаўскае танкавае вучылішча (1941), Харкаўскі педагагічны інстытут (1950), Харкаўскую партыйную школу (1951). У Чырвонай Арміі з 1940 г. На фронце са жніўня 1941 г. Гвардыі капітан П. В. Фешчанка вызначыўся ў баях за вызваленне Віцебскай вобл. Танкавы батальён пад яго камандаваннем 25—27.6.1944 г. адбіваў контратакі каля в. Смаляны Аршанскага р-на і станцыі Талачын, у тыле аршанскай групоўкі ворага перарэзаў гітлераўцам шлях да адступлення па шашы і чыгунцы Орша — Мінск, захапіў 7 эшалонаў з грузам, 15 самаходных гармат, 3 супрацьтанкавыя батарэі, 40 бронетранспарцёраў праціўніка, што садзейнічала паспяховаму наступленню танкавай брыгады. У 1947—1961 гг. на партыйнай рабоце, з 1961 г. ў органах КДБ і МУС. Жыве ў Харкаве.

АБЕСАЛОМ СЦЯПАНАВІЧ АДАМІДЗЕ

Старшы лейтэнант А. С. Адамідзе не вярнуўся ў родны Тбілісі. Ён загінуў пры вызваленні літоўскага горада Каўнаса, там і пахаваны. Але жыве памяць аб храбрым камандзіры танкавай роты. Адважна ваяваў Адамідзе. Яшчэ да пачатку наступлення Чырвонай Арміі ў Беларусі летам 1944 г. ён быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі.

Найбольш вызначыўся ён пры вызваленні Талачынскага раёна. Наступленне нашых войск было ў разгары. Танкістаў кінулі на прарыў і яны імкліва наступалі на захад. Рота лейтэнанта Адамідзе ішла на чале танкавай брыгады. У жорсткім баі 26 чэрвеня 1944 г. каля Талачына яна знішчыла 5 варожых танкаў (2 з іх падбіла машына Адамідзе), 4 супрацьтанкавыя гарматы, 30 конных павозак гітлераўцаў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 красавіка 1945 г. за подзвігі, здзейсненыя ў раёне Талачына, гвардыі старшы лейтэнант А. С. Адамідзе ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

ІВАН ЦІМАФЕЕВІЧ АРЦЁМ'ЕЎ

Нарадзіўся Арцём'еў у 1917 годзе ў сяле Азоўка Баброўскага раёна Варонежскай вобласці ў сям'і селяніна-бедняка. У сваёй роднай вёсцы скончыў няпоўную сярэднюю школу. Любіў многа чытаць, быў чулым таварышам. Захапляўся тэхнікай. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Э. Тэльмана. У 1938 годзе Івана Цімафеевіча прызвалі ў рады Чырвонай Арміі. Ён сумленна выконваў свой воінскі абавязак. Удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гадоў. 12 сакавіка 1940 года на востраве Муста-Саары падраздзяленнем 69-га стралковага палка 97-й дывізіі была занята абарона. Фіны ўсю ноч пераходзілі ў контратаку. Але радавы Арцём'еў трапным кулямётным агнём умела адбіваў націск ворага. Лазутчыкі праціўніка

І. Ц. Арцём'еў.

Жак Гастон.

спрабавалі знішчыць разлік смельчака. А калі скончыліся патроны, Арцём'еў падпусціў ворага на 20 метраў і знішчыў яго гранатамі. У той жа дзень, знаходзячыся за 30—40 метраў ад праціўніка, Арцём'еў паліваў яго свінцовым градам і закідваў гранатамі. За гэты подзвіг Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 7 красавіка 1940 года радавому І. Ц. Арцём'еву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У 1940 годзе Іван Цімафеевіч паступіў у авіяцыйнае вучылішча і паспяхова яго скончыў. Далейшы баявы шлях героя працягваўся ў 115-м гвардзейскім авіяпалку 7-й авіядывізіі. Будучы намеснікам камандзіра эскадрыллі, разам са сваімі баявымі сябрамі ён граміў нямецкіх акупантаў у небе пад Масквой і над Беларуссю. На рахунку лётчыка-знішчальніка камуніста Арцём'ева дзесяткі баявых вылетаў. Не было выпадку, каб ён не выканаў заданне камандавання.

26 чэрвеня 1944 года пры вызваленні Талачыншчыны, праявіўшы мужнасць і гераізм, Іван Цімафеевіч Арцём'еў загінуў у паветраным баі над вёскай Славені. Апошні бой савецкага сокала добра памятаюць мясцовыя жыхары. Сама смерць бясстрашнага лётчыка з'яўляецца сапраўдным подзвігам. У апошнія хвіліны свайго жыцця ён думаў не аб сабе. Ён думаў аб людзях унізе, якім прынёс вызваленне. Цяжка паранены, ён нейкім цудам у апошнія секунды адвёў палаючы самалёт ад вёскі і пакіраваў яго ў рэчку паміж Славенямі і Зарэччам. Пахаваны І. Ц. Арцём'еў у брацкай магіле ў в. Славені.

У тым баі разам з І. Ц. Арцём'евым змагаўся і ўраджэнец Талачыншчыны, выпускнік Славенскай сярэдняй школы, гвардыі лейтэнант Уладзімір Антонавіч Пасюцін.

С. Благуш.

ЖАК ГАСТОН

Імя французскага лётчыка з праслаўленай эскадрыллі «Нармандыя — Нёман» Жака Гастона навечна ўпісана ў летапіс інтэрнацыянальнага брацтва барацьбітоў супраць фашызму. Адважны сын Францыі загінуў смерцю героя ў небе Беларусі, змагаючыся за свабоду французскага і савецкага народаў.

Унечары 25 чэрвеня 1944 года дзве групы знішчальнікаў атрымалі заданне прыкрыць з паветра нашы пазіцыі ў раёне Барысава. Самалёты праціўніка патрулявалі над Беразіной. Тут і завязаўся бой. Сямі самалётаў не далічыліся ў той дзень гітлераўцы. Але ў гэты дзень не вярнуўся з бою і любімец часці Жак Гастон. Яго самалёт, падбіты пад в. Славені Талачынскага раёна, упаў недалёка ад вёскі Аўхуты. Жак Гастон пасмяротна быў удастоены вышэйшых ваенных узнагарод сваёй Радзімы, а ў кастрычніку 1945 года ў савецкім пасольстве ў Парыжы яго бацьку доктару Эдгару Гастону была ўручана савецкая баявая ўзнагарода сыпа — ордэн Айчыннай вайны II ступені. Астанкі слаўнага французскага лётчыка спачатку былі пахаваны ў вёсцы Ільяне, а напярэдадні 25-годдзя Перамогі над фашысцкай Германіяй перапахаваны ў брацкую магілу воінаў і партызан у вёсцы Славені каля аўтамагістралі Масква — Мінск. На святкаванне 25-годдзя Перамогі ў Савецкі Саюз прыязджала маці Жака Гастона — Александрына Гастон. 10 мая 1970 г. яна наведала магілу сына ў Славенях, дзе не чакала гасцінная, хвалюючая сустрэча.

Матэрыялы пра Жака Гастона і яго подзвіг у небе Беларусі (рэшткі самалёта, парашута і інш.) зберагаюцца ў Барысаўскім краязнаўчым музеі. Яго імя носіць сярэдняя школа № 9 горада Барысава і піянерская дружына гэтай школы.

* * *

З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 1-ГА АСОБНАГА ЗНІШЧАЛЬНАГА АВІЯПАЛКА «НАРМАНДЫЯ» ЗА ЧЭРВЕНЬ МЕСЯЦ 1944 ГОДА

26 чэрвеня 1944 года

...Над пунктом Славени (12 км ю-з Толочин) два замыкающих группы мл. лейтенанты Гастон и Лемар были внезапно атакованы 2 ФВ-190, в результате их атаки летчик Гастон был сбит, а самолет летчика Лемар был подбит и он с боль-

шими трудностями дотянул до своего аэродрома, где благополучно произвел посадку. Для отражения атаки этих ФВ-190 от группы откололись ст. лейтенант Муанэ и мл. лейтенант Табурэ. На высоте 2300 м зашли им в хвост, атаковали их, в результате чего ст. лейтенант Муанэ с первой же атаки поджег одного ФВ-190, который загорелся и упал у деревни Печеновка (10 км с-з Толочин), мл. лейтенант Табурэ с первой атаки подбил второй ФВ-190, который начал уходить пикированием, но Табурэ нагнал его пикированием и сбил...

ЦАМА СССР, ф. 20265, воп. 1, спр. 33, л. 398.

СЯРГЕЙ ДЗМІТРЫЕВІЧ ГЕРАСІМАЎ

С. Дз. Герасімаў нарадзіўся ў 1925 годзе ў вёсцы Чыжова Собінскага раёна Уладзімірскай вобласці. Скончыў ваеннае вучылішча. У 1939 г. ваяваў з японцамі і быў узнагароджаны медалём «За адвагу». У гады Вялікай Айчыннай вайны па-геройску змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, удзельнічаў у вызваленні ад ворага Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай абласцей. Многа разоў штурмаваў войскі праціўніка, акружанага пад Мінскам.

26 чэрвеня, у дзень вызвалення Талачына, гвардыі маёр Герасімаў вадзіў сваю эскадрыллю на знішчэнне варожых чыгуначных эшалонаў па ўчастку Орша — Талачын. За два баявыя вылеты яго групай самалётаў былі знішчаны 1 паравоз, 16 вагонаў, разбіты 6 платформаў з танкамі і аўтамашынамі і іншыя аб'екты. За час, што прабыў на фронце Сяргей Дзмітрыевіч, ён быў узнагароджаны пяццю ордэнамі і Залатой Зоркай Героя Савецкага Саюза.

10 жніўня 1944 г. ён, камандзір эскадрыллі, павёў сваё падраздзяленне штурмавікоў Іл-2 на баявое заданне. Трэба было разбамбіць эшалон з гаручым і баявую тэхніку, якія знаходзіліся на станцыі Альвітас. Пасля таго, як былі зроблены два баявыя заходы, у самалёт траціў снарад. Штурмавік загарэўся.

— Паранены... Іду на таран...

Гэтыя апошнія словы былі сказаны па рацыі. Камандзір знайшоў у сабе сілы, каб загадаць паветранаму стралку пакінуць самалёт на парашуце. А сам накіраваў свой самалёт на чыгуначны састаў. Адбыўся моцны выбух. Праз некалькі дзён гвардыі маёру Герасімаву С. Дз. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

ЦІХАН ЯФРЭМАВІЧ КАРТАШОЎ

Ц. Я. Карташоў нарадзіўся ў Карачаўскім раёне Бранскай вобласці ў сям'і селяніна. Перад Вялікай Айчыннай вайной лейтэнант Карташоў служыў у г. Брады на Львоўшчыне. Батарэя пад яго камандаваннем знаходзілася непадалёку ад граніцы, і ў першыя ж гадзіны нападу непрыяцеля артылерысты ўступілі ў бой. Потым двойчы Карташоў трапляў у акружэнне. Выходзіў з яго і зноў працягваў ваяваць.

1944 год... 376-ы гвардзейскі цяжкі самаходны артылерыйскі полк пад камандаваннем Карташова наступае на галоўным напрамку. Артылерысты грамілі праціўніка і каля Талачына, дзе скапілася многа варожых войск. Цяжкія снарады з самаходак пасеялі гітлераўцам значны ўрон. Ад Талачына наступалі на Барысаў і Мінск, далей — на Вільнюс. Тут палку была прысвоена ганаровая назва «Вільнюскі». Закончыў ваяваць гвардыі палкоўнік Ц. Я. Карташоў па тэрыторыі Польшчы, каля Гданьска. Быў узнагароджаны шасцю ордэнамі.

Пасля вайны Ціхан Яфрэмавіч Карташоў шмат гадоў служыў у арміі. Дэмабілізаваўшыся, пасяліўся ў Бранску, працаваў у аўтагаспадарцы.

ГЕОРГІЙ МІКАЛАЕВІЧ НЯФЕДАЎ

Сяржант Г. М. Няфёдаў быў паветраным стралком-радыстам 74-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка. За мужнасць, адвагу ў барацьбе з ворагам Георгій Мікалаевіч узнагароджаны ордэнамі, сярод якіх 3 ордэны Славы. Ордэн Славы III ступені атрымаў за актыўны ўдзел у вызваленні Талачына і Лагойска.

26 чэрвеня 1944 года ў складзе шасцёркі Іл-2 гвардыі сяржант Г. М. Няфёдаў удзельнічаў у налёце на варожыя войскі ў Талачыне. У гэты час у небе з'явіліся варожыя знішчальнікі. Няфёдаву ўдалося адбіць дзве атакі супраць свайго самалёта. Праціўніку былі нанесены вялікія страты і ў гэтым значная заслуга стралкоў-радыстаў. У той жа дзень, у час другога вылету на Талачын, Г. М. Няфёдаў знішчыў дзве аўтамашыны праціўніка. Самым складаным быў трэці вылет. На гэты раз яго правядзенню спрабавалі перашкодзіць дванаццаць гітлераўскіх знішчальнікаў. Пяць атак адбіў Георгій Мікалаевіч. У гэтым баі пашы штурмавікі знішчылі адзін самалёт праціўніка. 29 чэрвеня захопнікі не далічыліся яшчэ аднаго самалёта.

Вайну Няфёдаў скончыў афіцэрам. Вярнуўся дадому, у горад Андрэапаль Калінінскай вобл. Скончыў тэхнікум і стаў працаваць у

лясной прамысловасці. Як і баявое майстэрства, старанная праца Георгія Мікалаевіча ў мірныя дні высока ацэнена — да яго баявых узнагарод дабавіўся ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

П. Максімаў.

РЫГОР ПАЛУЯНАЎ

Лётчыку 136-га авіяпалка 1-й штурмавой авіядывізіі камсамольцу Рыгору Палуянаву давялося ўдзельнічаць у паветраных баях на Украіне, пры разгроме гітлераўцаў у Крыме, Беларусі, Прыбалтыцы, Усходняй Прусіі. Толькі за адзін год вайны ён зрабіў 110 баявых вылетаў, правёў 15 паветраных баёў і ва ўсіх атрымаў перамогу. Ён асабіста знішчыў 38 танкаў, 7 самалётаў, больш за 100 гармат, каля 4 тысяч варожых салдат і афіцэраў, спаліў 4 эшалоны з танкамі і гаручым, разбіў 150 аўтамашын з жывой сілай і тэхнікай, патапіў у моры 2 буйныя транспарты з фашыстамі.

У паветраных баях за вызваленне Талачыншчыны Палуянаў лятаў у групе маёра Герасімава.

— Захаваць дарогу! Не даць варожым эшалонам прайсці на захад! — такі быў загад камандуючага паветранай арміяй.

На заданне вылецеў увесь полк — 4 васьмёркі штурмавікоў. Герасімаўцам трэба было разбіць галаўныя эшалоны на станцыі Коханава і закрыць дарогу астатнім. Другім групам даручалася знішчыць замыкаючыя эшалоны і, галоўнае, пуцеразбуральнікі, прымацаваныя да хваставых вагонаў.

Вылецелі на досвітку. Перасеклі лінію фронту і ўпэўнена ўзялі курс на захад. Неўзабаве сярод лесу і балот бліснулі серабрыстыя стужкі рэек. Па іх цягнуўся доўгі ланцуг варожых эшалонаў. Вось і станцыя Коханава. Праціўнік, пэўна ж, заўважыў савецкія штурмавікі, маўчаў. Маўчалі і штурмавікі. Быццам не заўважаючы эшалонаў, яны прайшлі бокам і зніклі. Зайшоўшы з тылу, рэзка развярнуліся і паімчаліся да цэлі. Вядучы ўвёў сваю машыну ў піке і скінуў некалькі бомбаў. Прамым трапленнем быў разбіты паравоз. Услед за Герасімавым пачалі пікіраваць і астатнія. Эшалоны патанулі ў полымі і чорных клубах дыму.

Вяртаючыся да Ліцюля, Палуянаў выявіў добра замаскіраваны варожы аэрадром. Ён перадаў аб гэтым па радыё вядучаму. Герасімаўцы выпусцілі апошнія снарады па нямецкіх машынах.

У гэты дзень Рыгор Палуянаў яшчэ двойчы вылятаў на Трацылава і Талачын — разбіў паравоз і спаліў тры вагоны. А праз некалькі дзён Р. Палуянаў разам са сваімі аднапалчанамі — удзельнікамі «бітвы на рэйках» быў удастоены звання «Гвардыі чыгуначнік». За смеласць і тактычную вынаходлівасць генерал Хрукін аб'явіў яму падзяку, а праз два дні аднапалчане павіншавалі Рыгора з другім ордэнам Чырвонага Сцяга.

18 сакавіка 1945 года ў час выканання баявога задання ва Усходняй Прусіі самалёт Палуянава быў падбіты, паранены лётчык траціў у лапы фашыстаў. Нягледзячы на здзекі і катаванні, адважны камсамолец не выдаў гітлераўцам ваенных тайны. Раз'юшаныя фашысты забілі савецкага лётчыка. Слаўнаму сокалу было ў той час толькі 22 гады.

Радзіма высока ацаніла подзвігі свайго вернага сына, пасмяротна прысвоіла яму званне Героя Савецкага Саюза.

АНДРЭЙ ІВАНАВІЧ ХОЛАДАЎ

Вялікі ўклад у разгром гітлераўцаў на Беларусі летам 1944 г. зрабілі танкісты. У іх ліку быў і механік-вадзіцель «трыццацьчацвёркі» А. І. Холадаў, ураджэнец сяла Высокае Хваставіцкага раёна Калужскай вобласці.

Шлях танкістаў ляжаў на Талачын. Гітлераўцы ў паніцы адступалі. І вось кіламетры за тры ад Талачына нашы танкісты дагналі вялікую калону фашыстаў, што рухаліся па аўтамагістралі Масква — Мінск. Гэта было 26 чэрвеня...

Гвардыі сяржант Холадаў вывеў сваю грозную машыну на шашу і яна па поўным ходу ўрэзалася ў калону гітлераўцаў, раздавіла і скінула ў кювет 20 аўтамашын і 50 павозак ворага, знішчыла 4 супрацьтанкавыя гарматы і 6 мінамётаў. Танкісты экіпажа без промаху стралялі з гарматы і кулямёта. На падыходзе да горада савецкую машыну сустрэў нямецкі танк — разрэкламаваны гітлераўцамі «тыгр». Але нервы ў фашыстаў не вытрымалі. Яны кінулі спраўную машыну і ганебна ўцяклі... Танк Холадава ўварваўся ў Талачын у ліку першых.

За подзвігі, здзейсненыя пры вызваленні Талачына, А. І. Холадаў адзначаны вышэйшай узнагародай Радзімы — ордэнам Леніна. У 1954 г. А. І. Холадаў памёр — вынік раненняў, атрыманых у гады вайны.

АЛЯКСАНДР ДЗМІТРЫЕВІЧ ШАХОНІН

У 1983 г. яму было б 60. Ён загінуў у кастрычніку 1944 г. каля Гумбінена (зараз Гусеў Калінінградскай вобл.). Старшы лейтэнант А. Шахонін — ураджэнец вёскі Лойма Прылузскага раёна Комі АССР. Марыў стаць настаўнікам. Паступіў на рабфак пры

педінстытуце ў Сыктыўкары. Але пачалася вайна з Фінляндыяй. І Аляксандр вырашыў стаць ваенным, паступіў у танкавае вучылішча. Летам 1944 г. старшы лейтэнант А. Шахонін быў камандзірам танкавага ўзвода. Перад адным з наступленняў адбыўся партыйны сход, на якім Аляксандра прынялі кандыдатам у члены партыі.

І вось пачалося наступленне ў Беларусі. Танкісты часці, у якой служыў Шахонін, з баямі прайшлі па Аршанскім раёне і ўступілі на тэрыторыю Талачыншчыны. Праціўнік аказваў упартае супраціўленне, асабліва на рубяжы ракі Адроў. У прадстаўленні да ўзнагароды гаворыцца, што ўзвод А. Шахоніна, абышоўшы вёску Засеклі, знішчыў дзве варожыя самаходныя гарматы, батарэю супрацьтанкавых гармат і больш чым пяцьдзесят салдат і афіцэраў праціўніка. Праследуючы адступаючых гітлераўцаў, танкісты дзейнічалі ў напрамку станцыі Коханава. У гэтай аперацыі ўдзельнічала шмат савецкіх танкаў. Аднак і варожай тэхнікі і жывой сілы было нямала. Гітлераўцы імкнуліся ўцячы, хто на машынах, хто на цягніках. У ліку першых на станцыю Коханава ўварваўся ўзвод старшага лейтэнанта Шахоніна. Трапным выстралам у паравоз Аляксандр вывеў яго са строю і тым самым не даў магчымасці адправіцца са станцыі варожаму эшалону з боепрыпасамі.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР гвардыі старшы лейтэнант А. Д. Шахонін, які бясстрашна граміў ворага на беларускай зямлі, быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

П. Фралоў.

За мужнасць і гераізм

Дзесяці ўраджэнцам Талачынскага раёна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Трое з іх атрымалі яго змагаючыся ў тыле ворага ў радах партызан і падпольшчыкаў, астатнія — на франтах Вялікай Айчыннай. Ніхто не падлічваў, колькі іх, адважных сыноў і дачок Талачыншчыны, чыя цяжкая ратная праца адзначана ўзнагародамі Радзімы. Іх шмат. І наш расказ пра некаторых э іх — толькі малая доля той удзячнасці, якую выказваюць усім ім землякі за выратаваную будучыню.

Цаной жыцця

П. А. Галецкі.

Пётр Антонавіч Галецкі — Герой Савецкага Саюза (8.5.1965). Нарадзіўся ў маі 1919 г. ў в. Майдан Талачынскага раёна. З сялян. Беларус. Член ВЛКСМ.Працаваў брыгадзірам у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з чэрвеня 1941 г. У канцы 1941 г. як падрыўнік накіраваны ў тыл ворага ў партызанскі атрад «Перамога», які дзейнічаў на Смаленшчыне і Віцебшчыне. 21.10.1942 г. а узрыўчаткай кінуўся пад варожы эшалон з гарючым і цаной свайго жыцця знішчыў яго. Імя П. А. Галецкага прысвоена Славенскай школе ў Талачынскім раёне.

Пеця Галецкі самы звычайны, крыху сарамлівы, такі ж, як і яго сябры, як Толік Шульгевіч, як Ваня Мацюшэўскі, як Стасік Галецкі, як Толік Галецкі... Вось такім і запомнілі Пецю жыхары вёскі Майдан Славенскага сельсавета. На іх вачах рос, набіраўся сіл просты сялянскі хлапчук. Аднавяскоўцы любілі і паважалі Пятра, ды і як яго было не любіць — за што ні возьмецца хлопец, любая работа ладзіцца ў яго руках. Таму і даверылі яму, такому маладому, пост калгаснага брыгадзіра.

...Іграў гармонік, развітальныя песні спявалі майданаўскія хлопцы і дзяўчаты. Сабралася амаль уся вёска. Пётр Галецкі ішоў служыць у Чырвоную Армію. Гэта было 27 кастрычніка 1939 г.

18 чэрвеня 1941 года, вяртаючыся з камандзіроўкі ў часць, Пётр Галецкі заехаў дадому. Рукі засумавалі па мірнай працы, браліся за ўсё, што здавалася недаробленым, нясканчаным. Памог напілаваць дроў, нанасіць вады. Але хіба шмат паспееш, калі заўтра ад'язджаць? Прайшоў Пятро па вёсцы, якая здавалася цяпер асабліва роднай і блізкай, акінуў яе вачыма і запытаў:

— А дзе маё сябры?

— Усе ў арміі.

Не ведаў тады Пётр, што ніколі больш не ўбачыць ёп Івана Мацюшэўскага, Станіслава

і Анатоля Галецкіх, што зложаць яны свае галовы, абараняючы родныя прасторы ад праклятай фашысцкай нечысці. Не ведаў Пётр, што Анатоль Шульгевіч пройдзе скрозь агонь вайны, але вернецца ў родны калгас інвалідам і праз многа гадоў зменіць яго на пасту брыгадзіра.

Праз тры дні грымнула вайна. У Майдан паштальён не прынёс ніводнага пісьма, ні тэлеграмы.

...Родную беларускую зямлю зноў убачыў Пётр у канцы 1941 года. Глыбокія раны былі на яе целе. Зямля цяжка стагнала і звала адпомсціць праклятым нелюдзям за гора і пакуты. Кроў забітых жанчын і дзяцей, попел спаленых гарадоў і вёсак улівалі ў сэрца партызана лютую нянавісць да ворага, волю да перамогі.

...Загады камандзіра Пётр Галецкі заўсёды выконваў дакладна і ў тэрмін. Любой цаной павінна быць выканана і гэта заданне. А яно не з лёгкіх. А хіба на вайне бывае лёгка? Ноччу патрэбна падарваць варожы эшалон і сабраць звесткі пра аэрадром каля Віцебска. Цяжкія кастрычніцкія хмары нізка плылі над зямлёй. Холадна. Але ў партызан, покуль яны дабраліся да чыгункі, спіны сталі мокрымі. Спыніліся ў маладым хвойніку, сталі сачыць за дарогай. Нямецкія патрулі снавалі бесперапынна. Вельмі маленькія прамежкі часу былі паміж праходамі. Толькі ў такі прамежак і можна было паставіць міну. Пётр наблізіўся да чыгуначнага палатна. Сябры, замаскіраваўшыся ў хвойніку, трымалі пад прыцэлам вартавыя вежы. Здалёк чуўся нарастаючы шум поезда, што ішоў з боку Віцебска на Смаленск і вёз смертаносны груз. Гул цягніка нарастаў. Мінуты здаваліся гадзінамі. Салёны пот каціўся з ілба, засцілаў вочы. Яшчэ шчыльней прытуліўшыся да зямлі, Галецкі поўз да насыпу. На нейкі момант пражэктар выхапіў з цемнаты яго адзінокую постаць. «Не паспее Пятро, не паспее»,— з горыччу думаў, сочачы за ім, старшы групы Давыдоўскі. Вельмі ж высокі і круты быў насып, ды і дваццацікілаграмовая міна перашкаджала Галецкаму ўскочыць на чыгуначнае палатно. У той момант, калі да паравоза было літаральна некалькі крокаў, Пётр, сабраўшы апошнія сілы, спрытна, нібы леў, скочыў уперад і кінуўся на рэйкі, прама пад колы паравоза. Раздаўся магутны выбух, задрыжэла, як у ліхаманцы, зямля. Жывыя бачылі, як стаў на дыбы паравоз, як, набягаючы адна на адну, перавароч валіся платформы, і з стаячых на іх сарака цыстэрнаў ліўнем ударыў на рэйкі бензін. Мора агню разлівалася ўсё шырэй і шырэй, дрыжэлі зямля і паветра. Гэта быў развітальны салют доблесці партызана, моцнаму духу і бяспрыкладнаму подзвігу, велічы душы і высакародству савецкага характару. Пад гэты салют скончылася жыццё 23-гадовага Пятра Галецкага і пачалося яго бяссмерце.

Г. Каралёў.

ПІСЬМЫ П. ГАЛЕЦКАГА РОДНЫМ

Добры дзень, мае родныя!

...Пісаў вам часта і многа, так што цяпер і не ведаю, аб чым паведаміць. Аднак, мусіць, у далейшым пісьмы ад мяне будзеце атрымліваць радзей — вайна ж.

Вораг лепш узброены, ён напаў знянацку, і, вядома, на першым этапе перавага будзе на яго баку. Але гэта — часова. Перамога будзе за намі. Абавязкова будзе.

Вы не бойцеся за мяне, не перажывайце. Пакуль што ў адкрыты бой з ворагам наш полк не ўступаў, але кожны баец, кожны камандзір ірвецца на паядынак: наша маці-Радзіма ў небяспецы...

Палявая пошта, 30 чэрвеня 1941 г.

* * *

Добры дзень, дарагія тата і мама!

Пішу вам з новага месца, з роднай Беларусі. Не ведаю, атрымаеце пісьмо ці не, але ўсё ж напішу...

Нам прадстаіць не менш работы, чым раней. Мы будзем агітаваць, узнімаць народ на барацьбу з лютым ворагам. Дыверсійная работа, налёты на гарнізоны захопнікаў, збор даных пра ворага — усё гэта так важна і неабходна.

...Тры гады назад у гэты час мы збіралі ўраджай. Памятаеце, як радаваліся калгаснікі новаму хлебу?! А цяпер, мусіць, і збіраць няма чаго. Усё знішчаюць праклятыя фашысты. Але гэта ненадоўга. У нашай Радзімы дастаткова сіл і ўзбраення, каб перамагчы лютага ворага, вызваліць ад яго родныя гарады і вёскі. Я разам з некалькімі сябрамі атрымаў важнае і адказнае даручэнне. Перапраўляць пісьмы вам ужо не будзе магчымасці. А калі з'явіцца такая магчымасць — абавязкова напішу. Таму не турбуйцеся — усё будзе добра...

Верасень, 1942 года.

На жаль, гэты ліст бацька і маці П. Галецкага не атрымалі своечасова. Усю вайну захоўваў яго ў сваёй палявой сумцы камандзір партызанскага атрада «Перамога» Кірыла Іванавіч Новікаў. Адразу ж пасля сканчэння Вялікай Айчыннай вайны ён перадаў пісьмо бацьку героя — Антону Фёдаравічу Галецкаму. Пісьмо, напісанае за два тыдні да геранічнай гібелі Пятра...

Партызанскі генерал

І. П. Кожар.

Ілья Паўлавіч Кожар нарадзіўся 3.8.1902 г. ў в. Малое Гальцэва Талачынскага раёна. Савецкі партыйны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі. Герой Савецкага Саюза (1.1.1944), генерал-маёр (1943). Член КПСС з 1926 г. Скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б) у 1949 г. З 1924 г. на савецкай і партыйнай рабоце. З 1940 г. рэдактар газеты «Гомельская праўда», сакратар Гомельскага абкома КП(б)Б. З жніўня 1941 г. да лістапада 1943 г. сакратар Гомельскага падпольнага абкома КП(б)Б, адначасова з лістапада 1942 г. камандзір Гомельскага партызанскага злучэння. З 1943 г. сакратар Гомельскага абкома КП(б)Б, у апараце ЦК КП(б)Б, у 1947—1963 гг. дырэктар Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ (з 1956 г. рэктар Мінскай ВПШ). Член ЦК КПБ у 1952—1961 гг. З 1961 г. член, у 1963—1966 гг. старшыня Рэвізійнай камісіі КПБ. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1963 гг., 1967 г. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі. Памёр І. П. Кожар 13.10. 1967 г.

— Паедзеш у Смаляны, Ілья. Там вельмі патрэбен загадчык хаты-чытальні і сакратар ячэйкі. Гэта табе камсамольскае даручэнне.

Трэба — значыць трэба. Вераснёўскі дзень 1924 года яшчэ не скончыўся, калі Ілья Кожар прыехаў у Смаляны.

Памяшканне някепскае, адзначыў пра сябе новы загадчык хаты-чытальні, але вось бібліятэка... Бібліятэка была бедная. Будуць у клубе пастаноўкі, спектаклі! Але ж моладзі і чытаць трэба, вунь як людзі зараз цягнуцца да кніг, да свята... Багатая бібліятэка засталася ў былым маёнтку пана Хамянтоўскага, нават кнігі на французскай і нямецкай мовах. У пакінутым маёнтку аказалася і піяніна. Ілья умеў іграць на гэтым інструменце. «Што іграў на ім пан,— пра сябе ўсміхаўся Ілья.— «Чыжыка-пыжыка» ці якія вальсы? Зараз мы будзем іграць вось гэта». Ён звыклымі рухамі паціснуў на клавішы і ў пакоі ўрачыста палілася палымяная мелодыя «Інтэрнацыянала»...

Моладзь Смалян упадабала новага камсамольскага важака. На сцэне хаты-чытальні камсамольцы ставілі аднаактовыя п'есы на надзённыя тэмы, паладжвалі канцэрты. Ілья Кожар быў яшчэ і палітруком вучэбнага пункта, дзе моладзь праходзіла пачатковае ваеннае навучанне. Быў Ілья простым, свойскім хлопцам, з той жа, што і ва ўсіх, простай біяграфіяй. Усе ведалі, што ён родам з Малога Гальцэва, што ля Коханава, што яму 22 гады і паходзіць з бядняцкай сям'і. Бацька Ілья Павел Арцёмавіч быў старшынёй камбеда, членам Коханаўскага райвыканкома. А камсамолец Ілья жыў разам з бацькамі, скончыў у Коханаве адзінаю працоўную школу другой ступені, пасля чаго працаваў тэхсакратаром у валасным камітэце партыі.

Камсамольцы былі запяваламі многіх пачынанняў у вёсцы — ліквідацыя непісьменнасці, прапаганда атэістычных ведаў. У вялікай пашане былі сельскія карэспандэнты, званне «селькор» было сапраўды ганаровым. Актыўным карэспандэнтам газеты «Беднота» яшчэ з 1922 года быў і Ілья Кожар. У першай сваёй заметцы «Тоже дело» малады селькор крытыкаваў работнікаў Коханаўскай міліцыі за недастатковую барацьбу з самагоншчыкамі. Пісаў Ілья і ў камсамольскую газету «Юный творец» (пазней яна называлася «Юный ленинец»), якая выходзіла ў Віцебску, аб падзеях камсамольскага жыцця ў вёсцы, аб справах моладзі.

У Смалянах Кожар працаваў да сакавіка 1925 года. Потым яго перавялі ў Коханава загадчыкам нардома, а ў кастрычніку — загадчыкам аддзела палітасветработы райкома камсамола. У 1926 годзе ў жыцці маладога камсамольскага работніка адбылася важная падзея — яго прынялі ў рады ВКП(б). А ў чэрвені 1926 года камуніста Ілью Кожара на раённым з'ездзе Саветаў выбралі сакратаром Коханаўскага райвыканкома. На гэтай пасадзе Ілья Паўлавіч прабыў да лютага 1927, потым быў пераведзены загадчыкам Коханаўскага раённага аддзела народнай асветы. Увосень 1927 года Кожар паехаў па вучобу — спачатку ў Віцебск, потым у Гомель.

У чэрвені 1929 года Ілья Паўлавіч скончыў Гомельскую савецка-партыйную школу. Пачаліся гады партыйнай работы: працаваў раённым прапагандыстам у Расне, у Круглянскім і Брагінскім райкомах КПБ, першым сакратаром Веткаўскага, а потым Лоеўскага райкомаў. У жніўні 1940 года назначаны рэдактарам абласной газеты «Гомельская праўда».

У студзені 1941 года Ілья Паўлавіч быў выбраны сакратаром Гомельскага абкома

партыі па прапагандзе. На гэтай пасадзе яго і застала вайна.

— У той такі сонечны і такі трагічны дзень 22 чэрвеня 1941 года я з сям'ёй быў на дачы ў Церахоўскім раёне,— успамінаў Ілья Паўлавіч.— Раптам пачаліся бесперапынныя тэлефонныя званкі, членаў абкома — а многія з нашых работнікаў выехалі ў нядзельны дзень падыхаць чыстым сасновым паветрам за горад — пачалі выклікаць у Гомель. Спачатку ўсё гэта здавалася неверагодным — вайна! І хто з нас ведаў тады, што родны беларускі лес для многіх надоўга стане домам. Мне даручылі напісаць перадавы артыкул аб вайне экстранага выпуску газеты, якая неўзабаве выйшла на дзвюх палосах. Гаворкі аб падполлі, аб партызанскай барацьбе яшчэ не было — не верылася, што да Гомеля дойдзе вораг. Але падзеі разгортваліся з маланкавай хуткасцю.

— Мне ўсё часцей і часцей думалася аб магчымасці партызанскай барацьбы ў тыле ворага,— расказваў Ілья Паўлавіч.— Аб сваіх меркаваннях гаварыў таварышам па рабоце, ды, прызнацца, не ўсе гэта падтрымлівалі. Падполле, партызанская барацьба здаваліся далёкай гісторыяй, нейкім анахранізмам у наш час. Але вось 29 чэрвеня мы атрымалі з Масквы тэлеграму ЦК з дырэктывамі аб разгортванні партызанскай барацьбы ў тыле ворага на выпадак часовай акупацыі. Асноўныя палажэнні гэтай тэлеграмы — важнага ўказання партыі — былі паўторапы ў вядомым выступленні Сталіна па радыё 3 ліпеня 1941 года. Фронт набліжаўся. І я звярнуўся да першага сакратара нашага абкома тав. Жыжанкова з просьбай дазволіць мне выехаць у раёны. Неабходна было падрыхтаваць людзей для падпольнай работы ў тыле ворага...

Ілья Паўлавіч пабываў у многіх раёнах Гомельшчыны — у Чачэрску, Рагачове, Жлобіне, Лоеве, Добрушы, Карме, Свяцілавічах, Журавічах. Людзі, якія заставаліся ў тыле ворага, павінны былі добра ведаць і ўсведамляць, на што яны ідуць. Небяспечная справа патрабавала добраахвотных, свядомых змагароў, бясстрашных і самаадданых.

— У Журавічах,— прыгадваў Ілья Паўлавіч,— адзін з работнікаў райкома раптам сказаў мне: «Вам добра агітаваць. Вы ж самі ў тыле ворага не застанецеся». Нібы апяклі мяне тыя словы! Паўстала пытанне, пытанне майго партыйнага сумлення: калі агітуеш іншых, заставайся і сам.

Рашэнне было прынята. І. П. Кожар быў зацверджаны адным з кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху на Гомельшчыне. Ліпень і пачатак жніўня 1941 года прайшлі ў падрыхтоўцы да партызанскай барацьбы. Нашы войскі пакінулі Гомель. У ліку апошніх пакідаў горад і сакратар абкома — цяпер ужо абкома падпольнага — І. П. Кожар. Ён ішоў з невялікім атрадам у 45 чалавек — сакратароў гаркомаў, райкомаў, актывістаў, ішоў у бок Чарнігаўскай шашы да так званай Шчокатаўскай дачы — ляснога масіву пад Гомелем. Разам з Кожарам у тыле ворага застаўся і сакратар абкома па кадрах А. А. Куцак.

— Ідзём мы з ім і размаўляем аб тым, які цяжкі выпаў для Радзімы час, і аб тым, што вопыту ваеннага ў нас — аніякага. У партызанскіх атрадах не хапае зброі, узрыўчаткі, няма рацый, мала адзення. І аб тым, што ніхто з нас партызанскіх акадэмій не заканчваў, вучыцца партызанскай стратэгіі і тактыцы прыйдзецца ў ходзе падзей. А яшчэ гаварылі аб тым, што для партызанскай барацьбы ў тыле ворага засталіся людзі надзейныя, людзі, якія беззапаветна любяць сваю Радзіму, у імя якой пойдуць на бой, на самыя цяжкія выпрабаванні, на смерць...

У лесе кожны з партызанскіх камандзіраў накіраваўся па свайму маршруту. І. П. Кожар пераправіўся цераз Сож і выйшаў у зону Гомельскага сельскага партызанскага атрада, а потым прыйшоў у Лоеўскі партызанскі атрад «За Радзіму», дзе аставалася частка кіраўніцтва Гомельскага падпольнага абкома партыі. Атрад «За Радзіму» пачаў сваю баявую дзейнасць адразу, як толькі ў раён уступілі акупанты. Народныя мсціўцы знішчылі 2 варожыя самалёты і спалілі некалькі мастоў. А потым пачалася паласа няўдач. Многія ў атрадзе засумавалі. Каб узняць настрой у партызан, І. П. Кожар сам узначаліў адну з аперацый. Узяўшы з сабой 12 байцоў, Кожар і сакратар Лоеўскага райкома партыі Р. І. Сінякоў выйшлі да шашэйнай дарогі Гомель — Чарнігаў і зрабілі засаду. Хутка на дарозе паказалася нямецкая легкавая аўтамашына. Вось яна ўжо побач з засадай, бачны гітлераўскія афіцэры, якіх партызаны, за выключэннем Мікалая Шакарашвілі, які прыйшоў у атрад з акружэння, бачылі ўпершыню. Мікалай адкрыў агонь з кулямёта. Машына спынілася. З яе пачалі выскокваць гітлераўцы, на якіх партызаны абрушылі агонь з вінтовак і аўтаматаў...

Гэты поспех, хоць і невялікі, узняў баявы дух атрада. Неўзабаве група партызан пад камандай Сінякова знішчыла грузавую аўтамашыну з акупантамі. Яшчэ адна машына з салдатамі ворага наскочыла на партызанскую міну паміж Лоевам і Рэчыцай.

І. П. Кожар, які ўзначаліў партыйнае кіраўніцтва партызанскім рухам у паўднёвых раёнах Гомельшчыны, пэўны час знаходзіўся ў Лоеўскім атрадзе «За Радзіму», потым у

Гомельскім «Бальшавік». У лістападзе 1942 пры падпольным абкоме партыі быў створаны штаб, які аб'яднаў атрады і дыверсійныя групы, што дзейнічалі ў паўднёвых раёнах вобласці, а з сакавіка — красавіка 1943 гэты штаб прыняў на сябе камандаванне ўсімі партызанскімі атрадамі вобласці. Такім чынам, было створана адзінае партызанскае злучэнне Гомельскай вобласці, камандзірам якога стаў І. П. Кожар. Многа цяжкіх баёў давялося весці партызанам. Народныя мсціўцы Гомельшчыны ўпісалі яркія старонкі ў летапіс партызанскай барацьбы на Беларусі. Ілья Паўлавіч Кожар стаў дасведчаным камандзірам. У верасні 1943 года яму было прысвоена воінскае званне генерал-маёра. За гераізм, адвагу і мужнасць 1 студзеня 1944 года, у дзень 25-годдзя БССР, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў групе беларускіх партызан і ў іх ліку І. П. Кожару высокія званні Герояў Савецкага Саюза.

26 лістапада 1943 года войскі 1-га Беларускага фронту вызвалілі Гомель ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Многія народныя мсціўцы ўліліся ў армію і ў яе радах пайшлі адабываць канчатковую перамогу над ворагам. І. П. Кожар быў прызначаны другім сакратаром абкома партыі і прыняў актыўны ўдзел у аднаўленні разбуранай вайной і акупацыяй народнай гаспадаркі краю.

І на франтах мірнага будаўніцтва І. П. Кожар паказаў сябе ініцыятыўным работнікам, верным салдатам партыі. Некаторы час Ілья Паўлавіч кіраваў лектарскай групай ЦК КПБ, а ў чэрвені 1947 года быў зацверджаны дырэктарам Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ. На гэтай пасадзе І. П. Кожар прабыў амаль 15 гадоў — да свайго ўходу на пенсію ў студзені 1963 года. Але і пенсіянерам Ілья Паўлавіч працягваў актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, партыйнай рабоце. Працаваў дацэнтам кафедры гісторыі КПСС БДУ імя У. І. Леніна, узначальваў Рэвізійную камісію КПБ. І. П. Кожар быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР трох скліканняў у 1951—1963 гг. Талачыншчына ганарыцца сваім слаўным земляком. Усё жыццё І. П. Кожара, яго баявая і працоўная дзейнасць былі выдатным прыкладам служэння свайму народу, сваёй партыі. Яго імем названы вуліца ў Гомелі, Коханаўская школа ў Талачынскім раёне; на будынку Мінскай ВПШ устаноўлена мемарыяльная дошка.

Б. Р. Фірштэйн.

Бацькаўшчыны светлы парог

З успамінаў М. Б. Осіпавай

М. Б. Осіпава.

Марыя Барысаўна Осіпава — Герой Савецкага Саюза (29.10.1943), удзельніца Мінскага камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Айчынную вайну. Нарадзілася 27.12. 1908 г. ў в. Серкавіца Талачынскага раёна. З рабочых. Член КПСС з 1928 г. Скончыла Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі (1935), Мінскі юрыдычны інстытут (1940). З 1926 г. на савецкай і партыйнай рабоце. У ліпені 1941 г. арганізавала падпольную групу ў Мінску. Сувязная партызанскіх атрадаў «Дзіма», «Мясцовыя» і партызанскай брыгады «Дзядзькі Колі». Арганізатар падрыхтоўкі знішчэння ката беларускага народа В. Кубэ. У 1945—1959 гг. на савецкай рабоце. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1963 гг. Заслужаны работнік культуры (1980). Ганаровая грамадзянка Мінска, г. Нурэк Таджыкскай ССР.

...Чым больш чалавек жыве на свеце, тым часцей вяртаецца ён у думках да дзяцінства, да свайго роднага дому. Што гэта? Патрэба душы ці ўласцівасць чалавечай памяці — ўвасабляць самае дарагое і светлае?

Вытокі... Да іх мы вяртаемся заўжды, незалежна ад таго, як склалася наша жыццё — гераічна ці проста, няўдала альбо шчасліва. Сэрца наша застаецца там, за бацькоўскім парогам, адтуль пачынаецца чалавек як асоба.

Людзі майго пакалення сталелі, набіралі сілу і мужнелі разам з маладой дзяржавай. У бацькоў, патомных шкловыдзімальшчыкаў, нас было сямёра — браты Аляксей, Яфрэм (загінуў у імперыялістычную), Мікалай, Федзя, Ваня (самы малодшы), сястра Таня і я, перадапошняя ў сям'і. Наша хата стаяла на ўзгорку, каля самага лесу. Жылі і раслі мы сярод лясоў і балот. Шклозавод, які стаяў амаль што ў цэнтры Серкавіц, быў нашым карміцелем. Ад яго мы залежалі, ён быў адзіным сродкам існавання жыхароў пасёлка,

патомных шкловыдзімальшчыкаў. Таму і лёс дзяцей быў аднолькавы. Нікога з нас не абмінала работа на шклозаводзе — прафесію бацькоў спасцігалі з малых гадоў. З зімы да вясны вучыліся ў школе. А з надыходам цёплых дзён меншыя пасвілі кароў, большыя, дзесяці — адзінаццацігадовыя хлапчукі, ішлі на завод. Гаспадарыў на шклозаводзе Каган, яго памочнікам быў прыказчык па прозвішчу Тэвель.

Мае старэйшыя браты Алёша і Федзя таксама з дзесяці гадоў ужо былі на заводзе. Алёша, невысокага росту, дробненькі, не мог дацягнуцца да шкляных палымнеючых бутляў (халяў), якія трэба было пераносіць у другі цэх. На дапамогу яму прыходзіла маці, уставала і ў начы, калі Алёша працаваў у начную змену, каб дапамагчы перанесці гэтыя бутлі. Працавалі дзеці па восем гадзін, плацілі ж ім напалову менш, чым дарослым. А дзяцей у пасёлку было шмат: у некаторых сем'ях выхоўвалася па 15—17 дзяцей. Жылі бедна, але вельмі дружна, адной вялікай сям'ёй. Зайздрасці не было. Асаблівым клопатам акружаліся састарэлыя. Нас, дзяцей, ніхто не вучыў, а мы самі, па ўласнай ініцыятыве размяркоўвалі паміж сабой абавязкі: хлопчыкі пасілі ваду, складалі дровы, а мы па чарзе мылі падлогу.

Цудоўная пара дзяцінства, дадзеная чалавеку аднойчы, была па-дзіцячаму бесклапотнай. У вольны час мы да знясілення гулялі ў лапту. Я, колькі памятаю сябе, заўсёды вадзілася з хлапчукамі. Хутчэй за іх узбіралася на дрэвы, трапна падавала мячык (дарэчы, сшыты з абрэзкаў). Наша суседка Домна Будкевічыха, так яе ўсе звалі, гаварыла маці:

— Іванаўна, яна ж разбойнік, толькі што ў спадніцы. Ей бы штаны сшыць, верхалазу гэткаму!

У нас у двары стаяў вялізны разлапісты дуб. Дык мы на яго не проста ўзбіраліся, а ўзляталі па дзесятку разоў на дзень. А з яго адкрываліся неабсяжныя далі, бясконцыя лясы. І так добра марылася тут, на вышыні. А іншы раз адчувалі сябе маленькімі, бездапаможнымі істотамі ў гэтай бясконцасці, што раптам прыціхалі і доўга маўчалі.

Я прыйшла на завод пры Савецкай уладзе, калі мне споўнілася 13 гадоў. Дзецям дазвалялі працаваць толькі па чатыры гадзіны. Тры разы ў год нас вадзілі на прафагляд. Калі неабходна было — абавязкова лячылі. Атрымлівала я тады каля 10 рублёў у месяц. Як і мае браты, працавала спачатку на прыёмцы халяў. Пераход да новага жыцця вельмі змяніў людзей. Настрой ва ўсіх быў прыўзняты. Змяніліся, пасвятлелі твары, сталі іншымі адносіны да працы, да свайго жыцця. Роўнасць аб'ядноўвала людзей. Часта нас, маладых дзяўчат, рабочыя прасілі пець песні. А мы і рады былі. Бывала, пакуль працуем, перапяем усё — і беларускія народныя, і абрадавыя, і рэвалюцыйныя песні. За спевамі і час ляцеў непрыкметна.

Бацькі іншы раз расказвалі нам, малодшым, пра нялёгкія дарэвалюцыйныя гады. У памяці застаўся расказ аб падзеях 1905 года. На тэрыторыі шклозавода быў выкапаны ставок (штучная капава), у яго зімой і ўлетку акуналіся майстры, каб змыць соль, якая выступала ад гарачыні ў цэхах. У адзін з дзён рабочыя пасадзілі на тачку прыказчыка і спусцілі ў гэты ставок. Так вось рабочыя выказалі свой пратэст супраць існуючых парадкаў на шклозаводзе. Кіраваў гэтым выступленнем вельмі сумленны і справядлівы, па словах бацькі, рабочы (у памяці засталося толькі яго імя — Іван). Ён карыстаўся вялікай павагай на заводзе. І людзі яго яшчэ вельмі доўга ўспаміналі.

— Дзеці, цяпер усё паша, усё народнае. Са сваім рабіце, што хочаце, а дзяржаўнае — беражыце,— вучыла маці, Агаф'я Іванаўна.

А бацька дадаваў:

— Не руш нічога і не бойся нікога. Чужое ніколі не грэе.

Людзі яны былі неінсьменныя, простыя. Але колькі жыццёвай мудрасці, глыбіні было ў іх словах! Помніцца, збярэ нас маці, і малых і большых, і пачне спакойна разважаць:

— Жывіце так: глядзіце заўсёды прама, уперад,— казала маці.— Калі будзеце глядзець уніз — спатыкнецеся, нос разаб'еце. Будзеце глядзець уверх — можаце запарушыць вочы, а калі навучыцеся паглядаць уперад — вам будзе заўсёды добра ў жыцці.

Не ўсё я тады разумела і ўспрымала. Спатрэбіліся гады, каб да канца спасцігнуць сэнс матчыных слоў.

Настаў студзень 1924. Добра памятаю, як аднойчы маці ўсхваляваная прыбегла з лаўкі. Яна па-вясковаму загаласіла і мы не адразу разабралі яе словы. А яна абняла нас і праз слёзы вымавіла:

— Мілыя дзеткі, у нас вялікае гора: пяма нашага цара савецкага. Што ж цяпер з намі будзе?

Савецкім царом у пасёлку называлі Леніна. Мы выйшлі з хаты. А рабочыя з усіх канцоў пасёлка ішлі да завода. Сабраліся ўсе стыхійна. Жанчыны плакалі, мужчыны стаялі моўчкі. «Як жа будзем жыць далей? Хто аб нас будзе клапаціцца?»,—пыталіся людзі.

У канцы лютага з Талачына прыехалі прадстаўнікі райкома партыі. На Ленінскі прызыў у партыю рабочыя завода адгукнуліся горача. Жадаючых прымалі ў рады камуністаў на агульным сходзе. Тады ж уступіў у партыю і мой брат Мікалай. А тыдні праз два адбыўся

агульны сход моладзі завода. Прымалі ў камсамол. Кожную кандыдатуру вылучалі ўсім сходам і падыходзілі да абмеркавання вельмі строга. Некалькі кандыдатур агульны сход «зарэзаў». У той дзень я і мой брат Федзя сталі камсамольцамі. Акрамя таго, мяне выбралі арганізатарам вясковых жанчын (сельжаноргам). Не паспелі мы прыйсці з братам дамоў, як цікаўная Домна Будкевічыха паспела далажыць маці:

— Іванаўна, ну твой жа разбойнік у спадніцы ўжо ў бязбожнікі паступіў!

— Маці, не ўмешвайся,— казаў бацька,— мы шмат чаго не разумеем. Яны граматныя і ведаюць, што трэба рабіць і куды ісці.

Але самае страшнае для нас было ў іншым. Мы, камсамольцы, не маглі мірыцца з абразамі, якія віселі ў хаце. Доўга не адважваліся загаварыць пра гэта з маці. Але, нарэшце, рашыліся. На наша здзіўленне, маці даволі спакойна ўспрыняла нашу прапанову. Доўга маўчала, а потым прамовіла задуменна: «За жыццё Яфрэма я малілася ўдзень і ўначы. Але бог не пачуў мае малітвы. Сын загінуў. Цяпер не ведаю, ці ёсць бог».

Маці папрасіла загарнуць абразы ў чыстыя анучы і занесці на гарышча.

У хуткім часе з раёна прыехала жанорг па прозвішчу Валеніс. Яна прывезла газеты, часопіс «Крестьянка», якія я павінна была чытаць у навакольных вёсках. За мной замацавалі вёскі Новае і Старое Саколіна, Гарпавішчанне. А абуць на ногі не было чаго. Бацька зрабіў штосьці накшталт пантофляў — драўляныя дошчачкі-падэшвы з гумавай палоскай зверху. У іх я і хадзіла ў вызначаныя вёскі. Помніцца, у Новым Саколіне ў той час жыло шмат стараверaў, маскалёў, як мы іх яшчэ звалі. Сабраць тут слухачоў, а тым больш жанчын, была зусім няпростая справа. І вось аднойчы я дайшла ўжо да сярэдзіны вёскі, як насустрач мне паказаўся высокі магутны дзяцюк з доўгай рыжай барадой, а побач з ім дзве здаровыя аўчаркі. Быў канец лістапада, дарога патанала ў гразі, і гэты рыжы нацкоўвае на мяне сабак. Думаць не было часу. Я, як стаяла, так і села ў гразь. А яны падскочылі да мяне, гаўкаюць, аж пена ляціць, але сядзячую не чапаюць. Не ведаю, колькі б я так прасядзела, але, на маё шчасце, з хаты насупраць выйшла жанчына (была дэпутатам сельсавета, як потым высветлілася). «Ах, ты, антыхрыст рыжы,— накінулася яна на барадатага,— хіба ж можна на чалавека сабак напускаць? Яна ж вучыць нас прыйшла!» — І замахнулася палкай на сабак. Дапамагла мне вылезці з гразі, завяла ў хату.

— Здымай сукенку, абмывайся і лезь сушыцца на печ, а я пабягу жанчын збіраць.

Не высахла яшчэ як след сукенка над печчу, а ў хату ўжо пачалі збірацца жанчыны. Большасць з іх былі зусім непісьменныя. І цяга да ведаў у той час была незвычайная. Жанчын цікавіла літаральна ўсё. Мяне здзіўляла сацыяльная неабыякавасць гэтых простых вясковых працаўніц. Яны не адпускалі мяне, пакуль не прачытаю ўвесь часопіс «Крестьянка», газеты, якія былі з сабой. Прыносіла ім алоўкі, буквар. Вучыла чытаць і пісаць. «Наша настаўніца» — так называлі мяне (настаўніцы ж самой было толькі пятнаццаць гадоў).

У канцы 1924 г. шклозавод у Серкавіцах закрылі. Большая частка моладзі раз'ехалася. У Серкавіцах засталося толькі дванаццаць камсамольцаў. Нас далучылі да камсамольскай ячэйкі саўгаса «Скрыншчына». Сакратаром выбралі Івана Лучыну, я ўвайшла ў бюро камсамольскай ячэйкі. Пасяджэнні бюро былі кожны тыдзень. І кожны раз абавязкова некалькі хлопцаў ці дзяўчат хадзілі са мной да Скрыншчыны, праводзілі на бюро. Наша ячэйка лічылася перадавой у раёне. Мы стварылі агітбрыгаду, арганізоўвалі масавыя вечары. Выязджалі, а дакладней — хадзілі пешшу, з канцэртамі, драматычнымі пастаноўкамі ў навакольныя вёскі. Наш прыход быў заўсёды падзеяй, успрымалі нас як сапраўдных артыстаў. Наш драматычны гурток паставіў «Пінскую шляхту» Дуніна-Марцінкевіча. Я выконвала ролю шляхціца. І калі ў канцы спектакля мы, пераапранутыя, выходзілі на сцэну, з мяне заўсёды смяяліся — было дзіўна, што дзяўчына выконвае мужчынскую ролю.

У канцы 1924 года я скончыла яшчэ і курсы піянерважатых, арганізаваныя ў райцэнтры. І гэта мне вельмі спатрэбілася, калі ў 1925 годзе пераехала на працу на шклозавод «Труд» Расонскага раёна. Там мяне прызначылі старшай піянерважатай атрада. А праз некаторы час атрымала яшчэ адно грамадскае даручэнне — ад моладзі выбралі народным засядацелем.

У 1926 годзе ў Дзень Міжнароднага свята жанчын нас, чатырох дзяўчат, рэкамендавалі кандыдатамі ў члены ВКП(б)Б. Праз некаторы час выклікалі ў райком партыі. Ад шклозавода да раёна было трыццаць вёрст. Папрасілі майстра паставіць нас працаваць у начную змену. А раніцай, адразу ж пасля работы, пайшлі ў райком. Настрой быў прыўзняты, на вуліцы хораша! Прайшлі, як праляцелі, гэтую адлегласць. У райкоме партыі нас прынялі вельмі цёпла. Сакратар РК КП(б)Б тав. Пугачоў уважліва перагледзеў нашы справы. Перапытаў мой год нараджэння, а потым, памаўчаўшы, прамовіў: «З табой, Марылька, прыйдзецца сустрэцца пазней, калі споўніцца васемнаццаць гадоў». Я — адра-

зу ў плач. А сакратар стаў цярпліва растлумачваць мне, што ў партыю прымаюць толькі ў паўналетнім узросце. І ён не можа парушыць статут партыі. Я ж усё не супакоілася. Тады ён дастаў цукеркі, «Ракавыя шыйкі», як цяпер помню. Я яшчэ болей разраўлася — выходзіць, мяне зусім за немаўля прымаюць, калі спадзяюцца суцешыць цукеркамі.

Дзесьці з кіламетр праводзіў нас Пугачоў у зваротны шлях, і ўсю дарогу падбадзёрваў мяне. Прымалі мяне ў партыю ў Полацку, куды накіравалі працаваць мужа (пазнаёміліся з ім на шостым з'ездзе ЛКСМБ). Быў агульнагарадскі сход. Дакладваў сакратар партыйнай арганізацыі друкарні «Чырвоная Полаччына» Сітнікаў, дзе я ў той час працавала. Прынялі аднагалосна.

У той час партыйныя і савецкія работнікі больш года на адным месцы не затрымліваліся. Вось і аб'ездзілі мы з мужам амаль усю Беларусь. У 1933 годзе накіравалі ў Мінск. Тут мы і сустрэлі першы дзень вайны. Напярэдадні сына адправілі з дзіцячым садам на дачу, у суботу вечарам дачка паехала да цёткі ў Асіповіцкі раён. Увесь горад з нецярпеннем чакаў нядзелі — у дванаццаць гадзін было намечана адкрыццё Камсамольскага возера. Свята было агульным — рабочыя, вучоныя, студэнты, пенсіянеры, хатнія гаспадыні — словам, літаральна ўсе жыхары сталіцы прынялі ўдзел у яго будаўніцтве. Але ў пяцелю ў адзінаццаць гадзін раніцы па радыё мы пачулі страшнае паведамленне — вайна. Не хацелася верыць. А вечарам дваццаць шостага чэрвеня я пакідала Мінск. Цэнтр горада ў гэты дзень амаль увесь згарэў. Зарыва ад пажару было відаць кіламетраў за шэсцьдзесят. Я разам са сваімі суседкамі па дому ішла ў бок Асіповіч. Пачавалі ў вёсцы Забалацце. На золку я выйшла з хаты, на душы было неспакойна. Убачыла чырвонаармейца з катушкай тэлефоннага праводу. Я так узрадавалася: думаю, вось і вайне канец. А хвілін праз пяць чую нямецкую мову, і раптам бачу некалькі немцаў. Ногі так і падкасіліся. Я, як стаяла, так і чмякнулася на пясок. З хаты выскачылі жанчыны. «Падымайся»,— кажуць. А я не магу. Ледзьве ўцягнулі мяне ў хату. Хвілін праз колькі паляцелі самалёты. Жанчыны з хаты ўцякаюць. А я не магу падняцца — пейкае здранцвенне найшло. Потым міна з сірэнай як завые пранізліва прама над хатай, мяне нібы знесла з месца. Я не толькі дагнала сваіх спадарожніц, але і перагнала. Ніхто з нас і думаць тады не мог, што вайна расцягнецца на доўгія амаль што чатыры гады. Мы былі ўпэўнены, што самае большае — два — тры тыдні — і вайне канец.

Пра гады ваеннага ліхалецця запісана нямала маіх успамінаў. Адзін з іх — у кнізе «Скрозь агонь і смерць», складальнік якой У. Карпаў.

Лицом к лицу...

Более подробно хочется рассказать, как был приведен в исполнение народный приговор над злейшим врагом трудящихся Белоруссии Вильгельмом фон Кубе. Прежде всего скажу, что это был тиран, изверг, убийца. Это по его указке в Минске были уничтожены десятки тысяч невинных людей. Могилы их сейчас находятся в Масюковщине, Малом Тростенце, на улице Толбухина. В братской могиле возле Малого Тростенца покоится больше двухсот тысяч человек. И в гибели их также виноват Кубе.

Уничтожить жестокого палача, ставленника Гитлера в оккупированной Белоруссии, требовала сама обстановка. Это надо было сделать, ибо палач разрабатывал план новой, еще более жестокой и массовой карательной экспедиции. Убить Кубе — значило предотвратить гибель десятков тысяч советских граждан.

На эту операцию было брошено много боевых групп. Моя группа тоже получила аналогичное задание.

Разведчики из спецотряда Градова, которые были связаны со мной (братья Володя и Костя Сенько, Миша Иванов), получили от меня номер машины, на которой ездил Кубе. Они вышли на окраину города и несколько дней просидели в засаде на шоссе Минск — Лошица, которое вело в загородную резиденцию палача. План их был напасть на машину гауляйтера и уничтожить его днем, на глазах у всех. Дежурили они и по другим улицам города, надеясь раздавить его машиной. Но из этого ничего не получилось. Фашисты, охранявшие гауляйтера, принимали свои меры предосторожности.

Значит, самый верный и надежный план — это найти человека, который имел бы доступ в его дом. Со слов Франи Злоткиной я узнала, что у Кубе работает горничной бывшая официантка столовой ЦК КП(б)Б Елена Мазаник. С ее помощью палача можно было уничтожить в его же логове. Для этого нужна только мина с часовым механизмом. Я стала искать связи с Мазаник. Жорж Куликов, работавший в то время музыкантом в оркестре драмтеатра Я. Купалы, при встрече со мной сообщил, что Николай Похлебаев, некогда освобожденный нашими людьми из лагеря военнопленных, знаком с сестрой Мазаник — Валентиной, которая, кстати, живет с ней. Через несколько дней у меня состоялась встреча с Похлебаевым (подпольная кличка «Чиль»). Я ему рассказала о наших замыслах и попро-

сила организовать встречу с Еленой Мазаник...

Мы медленно шли по улице и разговаривали почти шепотом. Я чувствовала — Мазаник не верит мне, и поэтому прямо спросила, что надо сделать, чтобы она поверила.

— Хочу встретиться с кем-нибудь из командования,— сказала Мазаник.

— Но оно в лесу.

— Тогда пусть в лес идет с вами сестра.

Назавтра я повела Валю в лес — в бригаду «Дяди Димы». По дороге договорилась, что она скажет своим родным, живущим в Масюковщине, пусть те на всякий случай пустят слух, что им дают квартиру в Минске и скоро перевезут туда.

При новой встрече с Еленой я объяснила ей, что есть небольшие магнитные мины замедленного действия, и такую мину она сможет пронести в маленькой дамской сумочке. Когда она согласилась, я посоветовала ей уже теперь притвориться, что у нее болят зубы. Это для того, чтобы в нужный момент легче было получить разрешение хозяйки уйти из дому.

На следующий день утром я снова направилась в бригаду «Дяди Димы». Со мной пошла и Мария Грибовская. В бригаду мы пришли, когда уже стемнело. Встретилась с заместителем командира бригады Н. П. Федоровым. Поговорила с ним. Он сказал, что завтра мины с нужным часовым механизмом будут.

В деревне Янушковичи, где мы должны были переночевать, я встретила Яню Дрозд. В тот день она насобирала целую корзину брусники. Увидев меня, девушка обрадовалась и попросила, чтобы я отнесла немного ягод отцу и матери в Минск. Посмотрела я на ее корзину и решила: отличная маскировка для мин.

Рано утром партизан Петя Трашков привез мне две мины и часовые механизмы к ним. Но когда он стал объяснять, как пользоваться ими, зашел Федоров, и они с Трашковым обнаружили, что часовой механизм не суточного завода, а трехчасового. Трашкову пришлось поехать в деревню Слижино, где стояла московская спецгруппа Кузьмича.

Мины уложила на дно корзины, сверху насыпала багряную бруснику. Кроме того, партизаны дали мне несколько десятков яиц и пару стаканов крупы. Все это богатство я тоже уложила в корзину и сердечно распрощалась со своими друзьями.

Дороги вокруг столицы тщательно охранялись эсэсовцами и полицаями.

Узкая речушка Вяча, ныне одно из излюбленных мест минских рыбаков, в ту пору как бы служила негласной границей партизанской зоны. С болью в сердце я со своей спутницей Марией Григорьевной перебралась через Вячу. До Минска оставалось километров двадцать. Но каких километров! Впереди два гарнизона. Бесконечные засады, обыски и проверка документов.

Вышли на вяченское поле. Тут мы посоветовались, как нам лучше пройти. У Вишневки будет засада. Нас могут задержать. Не будем признаваться, что знаем друг друга.

Стали подходить к дороге. Вдруг из-за кустов появились четыре полицая. Мария Григорьевна подошла к ним первая и, низко кланяясь, поздоровалась: «День добрый, паночки». Ее тщательно обыскали, проверили документы.

— Можешь идти,— бросил ей полицай-верзила, который обыскивал ее, и повернулся ко мне: — Теперь ты показывай, что несешь, да побыстрее. Чего остановилась?

Меня уже до этого неустанно преследовала мысль: что делать, что предпринять? Если мины найдут, то конец не только задуманной операции, но и мне. Что же делать?

Полицейский закурил, потом о чем-то переговорил со стоявшими рядом постовыми и резко повторил:

— Показывай, что в корзине?

У меня похолодели ноги. Чувствую, сердце бьется с перебоями, но делать нечего. Присела над корзиной, а сама решаю, что предпринять, чтобы не смотрели корзину. Моя медлительность вывела из терпения полицая.

— Слышишь, быстрее! — крикнул он.— Не то как дам по корзине, все побью и подавлю.

— Зачем это делать,— как можно спокойнее сказала я.— Вы мне только убыток нанесете, а для себя никакой выгоды не получите.

Он сразу понял, к чему я клоню. Ведь это были продажные души. И я с ним сторговалась: 25 марок и полдесятка яиц.

Перед Минском, около небольшого деревянного домика, снова проверка. Пришлось соврать, что мы с Марией Григорьевной ходили покупать лошадь в деревню Паперню, но не сошлись ценой и возвращаемся домой, где нас ждут дети.

Теперь оставалось встретиться с Еленой и вывести из Масюковщины родных Валентины. Это была довольно опасная операция: в Масюковщине находился лагерь военнопленных и стоял гарнизон. Когда две партизанские подводы, нагруженные вещами, отъехали от деревни несколько километров, от воза оторвалась корова и побежала обратно в Масюковщину. Это могло навести немецкую агентуру на подозрение, необходимо было действовать немедленно...

Я всю ночь не могла уснуть. Думала о своих детях, живы ли они, что с ними. Может быть, никогда больше их не увижу. И как

завтра все сложится? К утру многое прояснилось, на сердце стало спокойнее. Мысли собрались воедино, стали ясными, четкими. Я знала, что и как мне делать.

Днем встретилась с Николаем Фурцом — шофером, тоже когда-то освобожденным подпольщиком из лагеря, договорилась, что он оформит документы на право выезда за город за гравием и будет завтра с машиной в девять утра у драматического театра. Потом встретилась с Валентиной, которая повела меня к себе на квартиру как спекулянтку, продающую туфли. Елене передала одну мину, а другую оставила в резерве, на случай, если по каким-либо причинам ей не удастся подложить в кровать Кубе заряженную мину, и она ее выбросит в реку. Договорились и обо всем последующем.

К назначенному времени я пришла в Центральный сквер. Приехал на грузовике и Фурц. Поднял капот и начал копаться в моторе.

Чтобы не привлекать к себе внимания, я остановилась возле дерева и начала медленно снимать туфлю, посматривать по сторонам. Вижу, наконец,— Елена. Перебежала дорогу, зашла в скверик, приблизилась к условленной скамейке и что-то стала искать. Я немедленно надела туфлю на ногу, вышла из-за дерева. Елена заметила и, взволнованная, подошла ко мне.

— Подложила? — спросила я. Елена кивнула головой.

В это время появилась и Валентина. Я направила их к оперному театру, а сама подошла к Николаю Фурцу и села в кабину грузовика. Вскоре мы нагнали Елену и Валентину, и Фурц нажал на акселератор. За Лапёрней дальше мы пошли пешком. В ночь с 21 на 22 сентября 1943 года палач белорусского народа взлетел на воздух.

Друкуецца па кн.: Сквозь огонь и смерть. Мн., 1970. С. 245—250.

Подзвіг артылерыста

Ф. К. Анташкевіч.

М. С. Камельчык.

Фёдар Кузьміч Анташкевіч — Герой Савецкага Саюза (10.4.1945). Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Казігорка Талачынскага раёна. Жыў у Цюменскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1941 г. Член КПСС з 1942 г. Камандзір гарматы старшы сяржант Ф. К. Анташкевіч вызначыўся ў баях за г. Губен (Германія). З 27 лютага да 4 сакавіка 1945 г. разлік гарматы пад яго камандаваннем адбіў некалькі контратак пяхоты, танкаў і артылерыі праціўніка, нанёс ворагу вялікія страты. Ф. К. Анташкевіч загінуў у баі 4.3.1945 г. Пахаваны ў г. Вільгельм-Пік-штат-Губен.

Вучыцца салдацкай справе Фёдару Анташкевічу давялося зусім мала — ішоў кастрычнік 1941 г., і фронт патрабаваў новых байцоў, свежых дывізій. У складзе адной з такіх часцей, перакінутай з Сібіры на фронт, і прыняў баявое хрышчэнне Фёдар Анташкевіч. Накіравалі яго ў 296-ы артылерыйскі полк, дзе ў нялёгкіх умовах, у пастаянных баях маладому байцу прыйшлося авалодваць усімі прамудрасцямі артылерыйскай справы. Аб тым, наколькі паспяхова ён справіўся са сваёй задачай, сведчыла тое, што к пачатку 1945 г. Фёдар быў ужо старшым сяржантам, камандзірам гарматнага разліку і грудзі яго ўпрыгожвалі ордэн Чырвонай Зоркі і два медалі «За адвагу». 27 лютага 1945 г. падраздзяленні 296-га гвардзейскага Чырванасцяжнага артылерыйскага палка завязалі баі на подступах да горада Губен. Артылерысты сумелі выбіць ворага з яго пазіцый. У канцы дня 28 лютага баі ўжо вяліся на бліжніх подступах да горада. Асабліва ўдала і смела дзейнічала гармата Ф. К. Анташкевіча. Вораг упарта супраціўляўся, чапляючыся за кожныя ўзгорак і ўпадзіну, за кожную будыніну. Ператварыўшы на подступах да горада ўсе каменныя пабудовы ва ўмацаваныя агнявыя кропкі, гітлераўцы разлічвалі затрымаць тут нашы часці. Савецкая пяхота пайшла ў атаку. Падтрымліваючы яе, гармата Анташкевіча адкрыла моцны агонь. Вораг пусціў у ход пяжкія мінамёты. Міны ўзрывалі зямлю вакол пазіцый гарматы, засыпалі зямлёй артылерыстаў. Пад прыкрыццём мінамётна-артылерыйскага агню наперад пайшлі варожыя самаходныя гарматы. За імі рушыла ў контратаку пяхота. Па самаходках, што наступалі ў цэнтры, білі іншыя гарматы батарэі, а разлік Анташкевіча вёў прыцэльны агонь па варожай пяхоце. Снарады клаліся дакладна, праціўнік панёс немалыя страты. Але далейшы ход бою прыняў непажаданы для разліку гарматы аба-

рот — вялікая група фашыстаў сумела наблізіцца да пазіцыі савецкіх воінаў. Становішча абвастрылася. Анташкевіч не разгубіўся і пайшоў на рызыку, бо разумеў, што толькі ў гэтым выратаванне для ўсяго разліку. У самы напружаны момант бою, калі, здавалася, гітлераўцы вось-вось прарвуцца да гарматы, камандзір загадаў:

— Яльцоў, застанешся з зараджаючым. Астатнія — за мной! У атаку!

Варожыя салдаты, якія знаходзіліся ў некалькіх метрах ад пазіцыі артылерыстаў, бачылі, што агонь вядзе адна гармата, і з'яўленне атакуючых савецкіх салдат было для іх поўнай нечаканасцю. На гэта і разлічваў Анташкевіч. З некалькімі артылерыстамі ён адкінуў фашыстаў, не даў ім замацавацца на дасягнутым рубяжы. Больш таго, жменька савецкіх воінаў адагнала немцаў настолькі, што змагла заняць варожыя пазіцыі на вышэйшых, якія кантралявалі падыходы да горада Губен. Раніцай 2 сакавіка бой аднавіўся з новай сілай. Шмат разоў падымаліся за дзень гітлераўцы ў контратаку, але выбіць разлік Анташкевіча з яго пазіцый так і не змаглі. Калі ў час адной з контратак ворагу ўсё ж удалося пераадолець паласу разрываў, Анташкевіч падпусціў гітлераўцаў на блізкую адлегласць і пачаў расстрэльваць ва ўпор. Тыя заляглі. Але небяспека не мінула — варта фашыстам было зрабіць адзін-два кідкі і яны будуць ля гарматы. Камандзір разліку зноў падняў байцоў у атаку і кінуўся з імі ў рукапашную схватку. Савецкія воіны ўдарылі па гітлераўцах з аўтаматаў, пусцілі ў ход гранаты. Знішчыўшы 15 фашысцкіх вояк, артылерысты прымусілі ўдалечыні гітлераўцаў адступіць. Атрыманая перадышка была кароткай. Праціўнік зноў падняўся ў атаку, але зноў яму прыйшлося адступіць: ён не здолеў узяць рубеж, які абараняў са сваімі байцамі Ф. К. Анташкевіч. Так паўтаралася некалькі разоў, і старшаму сяржанту прыйшлося яшчэ раз паднімаць людзей у рукапашную.

Раніцай 4 сакавіка варожая пяхота аднавіла свае атакі. Фашысты рашылі выкарыстаць імглісты туман, які ахутаў усё навакольле, і выбіць артылерыстаў з іх пазіцый. Разліку было цяжка: пяхоты паблізу не было, і артылерысты, ведучы бесперапынны агонь з гарматы, адбіваліся з апошніх сіл, імкнучыся як мага даўжэй стрымліваць націск ворага. Пасля чарговай няўдалай атакі вораг атрымаў падмацаванне. Фашысты падышлі амаль ушчыльную і сталі закідваць смельчакоў гранатамі. У гэты момант пазваніў камандзір батарэі і загадаў падтрымаць атаку нашай пяхоты. Фёдар Анташкевіч прыняў адзіна правільнае на той момант рашэнне: па яго сігналу артылерысты зноў (каторы ўжо раз!) падняліся ў атаку, у рукапашную схватку. Немцы вымушаны былі зноў адступіць. Пяглядзячы на няквальны кулямётны агонь, які абрушыўся на пазіцыю гарматы, камандзір здолеў прабрацца да пушкі і адкрыць стральбу, падтрымліваючы наступленне пяхоты. У адказ ударыла варожая артылерыя. Снарады клаліся ўсё бліжэй і бліжэй. Але Анташкевіч вёў агонь да апошняй мінуты, пакуль адзін з варожых снарадаў не трапіў у яго гармату. Здарылася гэта днём 4 сакавіка 1945 г. пад горадам Губен. У гэтым горадзе баявыя таварышы і пахавалі свайго храбрага аднапалчанiна.

М. Салаўёў.

Крылатае жыццё

Камельчык Міхаіл Сцяпанавіч — Герой Савецкага Саюза (15.5.1946). Нарадзіўся 8.6.1921 г. ў в. Бушмін Талачынскага раёна. З сялян. Беларус. Член КПСС з 1944 г. Скончыў Аршанскі аэраклуб, Адэскую авіяшколу пілотаў (1941), Смаленскі педінстытут (1967). У Чырвонай Арміі з 1940 г. З 1941 г. на Паўночна-Заходнім, 1-м Беларускім франтах. Удзельнік вызвалення Ноўгарада, Пскова, Пінска, Люблінa, Варшавы, Познані, баёў на Одэры, штурму Берліна. Камандзір звяна гвардзейскага штурмавога авіяпалка гвардыі старшы лейтэнант М. С. Камельчык ажыццявіў 170 баявых вылетаў, з іх 100 — на штурмавіку Іл-2, правёў 10 групавых паветраных баёў, знішчыў 84 варожыя аўтамашыны, 57 павозак, 39 гармат, 5 танкаў, 3 блiндажы, бронетранспарцёр. Удзельнік Парада Перамогі 24 чэрвеня 1945 г. Да 1958 г. служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Пасля працаваў у школе, з 1967 г.— у Смаленскім медінстытуце, з 1970 г. выкладае гісторыю КПСС. Жыве ў Смаленску. Заслужаны работнік культуры РСФСР (1983). Ганаровы грамадзянін г. Познань і Лодзінскага ваяводства ПНР. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Счастливая встреча

Сорок лет назад, в последние дни Берлинской операции на фронтовой аэродром 33-го гвардейского Краснознаменного Воронежского штурмового авиационного полка возвращалась с боевого вылета группа самолетов. Один из них шел на посадку, как раненая птица, с трудом удерживаясь в горизонтальном положении, и, едва успев приземлиться, остановился, не отрулив от полосы. Это была моя машина, ее «одолжил» на один вылет заместитель командира эскадрильи старший лейтенант Михаил Камельчик, самолет которого был поврежден.

Бежим к самолету, к нему уже мчится са-

нитарная машина. Вскакиваю на плоскость и вижу в разбитой кабине потерявшего сознание друга, лицо сплошь залито кровью... Осторожно вынимаем Михаила из кабины, его тут же подхватывают медики, а я отруливаю покалеченный, исковерканный внутри пролетевшим снарядом самолет на стоянку...

Так героически закончил войну замечательный, мужественный воин, сражавшийся с врагом с 23 июня 1941 года, сделавший 175 боевых вылетов!

С тех пор прошло сорок лет. Мы потеряли друг друга и «нашлись» совсем недавно...

...Врачи не только поставили Камельчика на ноги, но так восстановили здоровье, удалив множество осколков, что он смог еще больше десяти лет охранять наше мирное небо...

Юрий Гальперин

Газета «Вечерняя Москва», 7 мая 1985 г.

З успамінаў Героя Савецкага Саюза М. С. Камельчыка

...У перадваенныя гады кожны юнак рыхтаваў сябе і да стваральнай працы, і да абароны Радзімы. Я вучыўся ў чыгуначным тэхнікуме ў Оршы і адначасова займаўся ў аэраклубе. У сарокавым мяне і некалькіх маіх сяброў накіравалі ў Адэскую ваенную школу пілотаў, якую мы скончылі ў студзені сорак першага.

Лятаць давялося на знішчальніках І-1 біс. На іх і ўступілі ў паветраныя схваткі з ворагам над Беларуссю. Свой першы баявы вылет я ажыццявіў 23 чэрвеня 1941 г. Хутка мяне з сяржантам Барысам Цыбульскім накіравалі перавучвацца на новы самалёт Іл-2. Курс навучання не скончылі. Сэрца рвалася ў бой, і мы з Барысам падалі камандуючаму авіяцыяй рапарты з просьбай вярнуць нас на фронт. Калі прыйшла ў адказ тэлеграма, камісар нашага запаснога палка строга адчытаў нас перад строем («Вучыцца патрэбна!»), а сам адвёў у скрытае месца і расцалаваў: «Для навічкоў сказана, а вы ж — франтавікі. Ляціце, біце ворага!»

Праз тры дні мы былі на Паўночна-Заходнім фронце — у 33-м гвардзейскім Чырванасцяжным Варонежскім штурмавым авіяпалку. У гэтым палку і ішла мая баявая работа да самага светлага дня Перамогі. Самалётаў-знішчальнікаў для прыкрыцця штурмавікоў у тыл дні не хапала. Таму было прапанавана са сваёй групы выдзеліць два экіпажы, найбольш «злятаных», і ўскласці на іх задачу прыкрыцця ўсёй групы. Так я, малодшы лейтэнант, трапіў вядзёным у пару прыкрыцця (вядучы — лейтэнант Удачын, які таксама стаў Героем Савецкага Саюза). Пасля ўзлёту групы мы выходзілі ўперад на 1—1.5 км. З ходу атакавалі цэль і, набраўшы вышыню, ішлі насустрач групе для яе прыкрыцця. Нас першых абстрэльвалі зенітныя батарэі і атакавалі варожыя знішчальнікі. Такім чынам пара прыкрыцця забяспечвала баявыя дзеянні ўсёй групе. Аб нашым вопыце быў надрукаваны артыкул у франтавой газеце, які называўся «Слаўная пара прыкрыцця».

Аб нашых легендарных штурмавіках, лепшых самалётах другой сусветнай вайны, напісана шмат. Але мне здаецца, сказана яшчэ не ўсё. Аднойчы наш экіпаж штурмаваў варожую калону ў раёне Вялікіх Лукаў. На другім заходзе адчулі моцны ўдар ў машыну. Пазней, ужо на аэрадроме, прыйшлі да вываду: я зачапіў крылом тэлеграфны слуп — штурмавалі з вельмі малой вышыні. Пры ўдары адляцела частка плоскасці. Самалёт увесь час хацеў перавярнуцца. З вялікім намаганнем я прыпадняў яго над зямлёй. Прапанаваў паветранаму стралку сяржанту Рыгору Сталінскаму скакаць з парашутам. А ён у адказ: «Сядзем, камандзір!» У нашу размову ўмяшаўся лётчык знішчальніка, які нас суправаджаў: «Цягні, гарбаты,— нас так часта вялічалі. Правяду да аэрадрома». Селі. Сабраліся ўсе інжынеры і тэхнікі і аднадушна заключылі: самалёт з такімі пашкоджаннямі трымацца ў паветры не павінен.

Крыху пазней, пад Ковелем, правёўшы паспяхова разведку ў нялётны дзень, мы расходавалі ўсё гаручае і былі вымушаны садзіцца прама перад сабой, на поле. Селі. Над Берлінам, у апошні мой вылет на штурмавіку, у кабіне самалёта разарваўся снарад. Я амаль страціў зрок і павёў машыну на пасадку ўсляпую. Мяне суправаджалі штурмавік і знішчальнік, даючы напрамак і парады. Селі.

Кажуць, Іл-2 акупляў сябе двума-трыма вылетамі. Наш экіпаж здзейсніў сто. Вось некаторыя з іх.

У адным з вылетаў у перыяд вызвалення г. Ковель шасцёрка самалётаў Іл-2 (вядучы — гвардыі капітан Мікалай Бялавін), выканаўшы заданне, сабралася ў групу, каб ляцець на свой аэрадром. Раптам мы пачулі каманду вядучага: «Увага!» У гэты час з захаду ў напрамку фронту ляцела група нямецкіх самалётаў Ю-87. У лабавой атацы мы адразу збілі 2 варожыя самалёты, а астатнія скінулі свае бомбы дакладна на цэль, па якой стралялі мы — на нямецкія войскі.

---

[1] Ю. М. Гальперын — аднапалчанін М. С. Камельчыка, вядомы радыё- і тэлежурналіст, член Саюза пісьменнікаў СССР, заслужаны работнік культуры РСФСР, адзін з першых савецкіх тэлекаментатараў, лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР. У час Вялікай Айчыннай вайны разам з жонкай, франтавым урачом, аддаў свае абаражэнні на будаўніцтва самалёта.

29 красавіка 1944 г. група з 6 самалётаў Іл-2 (я — вядучы) нанесла ўдар па вялікай колькасці танкаў і аўтамашын праціўніка ў раёне населенага пункта Сялец. Нягледзячы на ўраганны агонь варожай зенітнай артылерыі, група зрабіла два заходы на цэль і знішчыла 4 танкі, 8 аўтамашын, выклікала 6 ачагоў пажару. 4 выбухі вялікай сілы, з якіх, мы думаем, узарваны 2 склады з боепрыпасамі і 2 склады з гаручым, падаўлены агонь двух зенітных гармат.

У маі 1944 г. наш полк прыняў актыўны ўдзел у масіраваным удары па варожым аэрадроме ў Пінску. Па даных разведкі праціўніку былі нанесены вельмі вялікія страты.

У гэты ж перыяд я ў пары з гвардыі лейтэнантам Лукаўкіным вылецеў на разведку ў раён Пінск — Мінск. На брыючым палёце на станцыі Пінск мы выявілі два чыгуначныя саставы з танкамі. Паравозы запраўляліся вадой каля воданапорнай вежы. Разбіўшы бомбамі чыгуначнае палатно спераду і ззаду ад эшалонаў, мы расстралялі снарадамі паравозы, прачасалі з пушак чыгуначны эшалон і перадалі на камандны пункт палка па радыё, што намі выяўлены эшалоны. Калі мы ўжо адыходзілі ад цэлі на свой аэрадром, нам насустрач ішла шасцёрка «Ілаў», каб дакончыць нашу работу разведчыкаў.

Праз некаторы час мы з Лукаўкіным атрымалі заданне правесці разведку руху паяздоў на ўчастку чыгункі Луніпец — Кобрын. Узлёт ажыццявілі перад усходам сонца. Лінію фронту перасеклі на вышыні 10—15 метраў. Праз некалькі мінут я заўважыў наперадзе ў лесе дым. На ўсякі выпадак даў каманду вядзёнаму падрыхтавацца да атакі, а сам, набіраючы вышыню, стаў набліжацца да лесу.

У лесе, на невялікай станцыі стаялі два эшалоны, адзін з танкамі, другі з рознай іншай тэхнікай. Накіроўваліся яны да лініі фронту. Атакаваўшы цэль з ходу, мы зрабілі другі заход. Паветраны стралок Грыша Сталінскі далажыў, што бомба трапіла ў тэндэр паравоза і ўзарвалася. Другі паравоз быў расстраляны з пушак, але з бліжняй дыстанцыі. На двух платформах стаялі зенітныя ўстаноўкі, на трэцім заходзе мы іх атакавалі з пушак і кулямётаў. Фашысты, хто ў чым, пачалі выскакваць з вагонаў і хавацца ў канаве і за воданапорнай вежай. Каб удар па ворагу быў больш эфектыўным, мы атакавалі цэль на сустрэчных курсах. Падлятаючы да аэрадрома, я перадаў па радыё аб тым, што выяўлены два эшалоны. І тут жа вылецела шасцёрка «Ілаў», каб дакончыць нашу работу. Аб нашым вылеце на разведку франтавая газета змясціла артыкул «Партызанскі ўдар».

4 чэрвеня 1944 г. два самалёты (я — вядучы) па прынцыпе «свабоднага палявання» вялі разведку чыгуначнага ўчастка Янаў — Кобрын — Спітава. Выявілі на станцыі Спітава два эшалоны, пачалі іх штурмаваць. Вывелі са строю 2 паравозы і некалькі вагонаў. Разведка была праведзена выдатна.

26 жніўня 1944 г. шэсць самалётаў Іл-2 (я — вядучы) бамбардзіравалі і штурмавалі артылерыйскія і мінамётныя пазіцыі праціў-

У час мерапрыемстваў па адкрыццю помніка савецкаму салдату - вызваліцелю ў Трэптаў-парку ў Берліне. 1949 г. У першым радзе: чацвёрты справа — В. Ульбрыхт, другі справа — скульптар Я. В. Вучэціч, першы злева — М. С. Камельчык.

ніка і вялікую колькасць аўтамашын у раёне Курашуб — Піскуроў. Нягледзячы на моцны агонь праціўніка, група зрабіла 4 заходы на цэль і, не маючы пашкоджанняў сваіх самалётаў, знішчыла 15 аўтамашын, батарэю палявой артылерыі, каля ўзвода пяхоты, выклікала да 10 ачагоў пажару.

Іншы раз нам даводзілася бываць на авіяцыйных заводах (ляталі за папаўненнем). Сэрца сціскалася ад жалю, калі бачылі, як на падстаўках каля станкоў стаялі худзенькія падлеткі. Рукі іх выглядалі танчэйшымі, чым ручкі малаткоў, якімі яны працавалі. Мы аддавалі ім свой паёк, расказвалі аб справах на фронце. І яшчэ мацнейшым станавілася жаданне адпомсціць лютаму ворагу за ўсе пакуты, прынесеныя нашаму народу, адстаяць светлую будучыню нашых дзяцей.

У мяне часта пытаюцца аб самым моцным уражанні франтавога часу, і я расказваю не пра баі. Мне давялося пабываць у толькі што вызваленым нашымі войскамі Майданаку. Тое, што ўбачыў там, не забыць ніколі. Тады я зразумеў, што мы зрабілі болей, чым адстаялі сваю Радзіму, сацыялізм. Мы выратавалі чалавечую цывілізацыю, не дазволілі спыніць гісторыю. Моўчкі выходзілі мы з тэрыторыі Майданака, не ў сілах размаўляць ад хвалявання і нянавісці да ворага. Вярнуліся на свой аэрадром. Сонца было амаль на захадзе. І тут паступіла каманда, што на станцыі Варка, недалёка ад Варшавы, сабралася каля 40 эшалонаў, і іх патрэбна разбамбіць. З такой злосцю і нянавісцю атакавалі мы ў той вечар цэль, што, вяртаючыся на свой аэрадром, за 40—50 км усё яшчэ бачылі палаючае зарыва.

Баі на тэрыторыі Германіі. Незабыўныя дні Берлінскай аперацыі. Пры фарсіраванні Одэра мы, лётчыкі, аказвалі дапамогу наземным войскам у расшырэнні плацдарма на заходнім беразе ракі ў раёне Зеелаўскіх вышынь. Нашай эскадрыллі было дадзена ганаровае даручэнне: скінуць ключы ад варот Берліна ў размяшчэнне наземных войск, якія штурмавалі Зеелаўскія вышыні. Штурм Берліна, мой 100-ы вылет на Іл-2, які ледзь не стаў апошнім у жыцці. І наша вернае баявое братэрства, франтавая дружба і ўзаемавыручка, якіх ніколі не забыць.

Наша 1-я авіяэскадрылля (камандзір М. І. Бялавін, намеснік М. С. Камельчык) вылецела на штурмоўку аэрадрома на ўскраіне Берліна. Нас сустрэў моцны зенітны агонь. Калі рабілі другі заход, у кабіну майго самалёта трапіў зенітны снарад. Я на нейкі момант страціў зрок. Даў каманду свайму намесніку Лукаўкіну ўзначаліць групу, а паветранаму стралку Сталінскаму — скакаць з парашутам. Ні адзін з іх мяне не пачуў. А пачуў мяне мой баявы сябра і камандзір Мікалай Бялавін, а таксама вядучы групы прыкрыцця (знішчальнікаў) Барбаценка. Бялавін вывеў мяне з зоны зенітнага агню і правёў на пасадку. Над аэрадромам, пры самым падыходзе да зямлі сілы ўсё ж пакінулі мяне. Самалёт амаль упаў. У прытомнасць я прыйшоў на аперацыйным стале. А мае аднапалчане ў гэты час ужо ляталі над цэнтрам Берліна.

Са шпіталя вярнуўся ў полк у самы разгар падрыхтоўкі да Парада Перамогі на Краснай плошчы. 24 дні падрыхтоўкі ў начной Маскве, расквечанай чэрвенем і людскімі ўсмешкамі. І нарэшце сам дзень парада — усенароднае

М. С. Камельчык (трэці злева) сярод удзельнікаў парада, прысвечанага 40-годдзю Перамогі. Масква, 9 мая 1985 г.

шчасце, абдымкі знаёмых і незнаёмых людзей, смех і слёзы заадно, старэнькі Калінін на трыбуне, зрынутыя фашысцкія сцягі.

Пасля Перамогі зноў лятаў, пакуль дазваляла здароўе. Асвойваў нашы рэактыўныя першынцы МіГ-15. Служыў у Групе савецкіх войск у Германіі, потым у Прыкарпацкай ваеннай акрузе.

Адважны камандзір

М. П. Лугоўскі.

Мікалай Пятровіч Лугоўскі — Герой Савецкага Саюза (22.7.1944). Нарадзіўся 14.12.1911 г. ў в. Равуча Талачынскага раёна. З сялян. Беларус. Член КПСС з 1942 г. Працаваў на будоўлях Сібіры. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з 1941 г. Камандзір стралковага батальёна капітан М. П. Лугоўскі вызначыўся ў баях на 1-м Прыбалтыйскім фронце пры вызваленні Віцебскай вобласці. 23.6.1944 г. батальён пад яго камандаваннем прарваў варожую абарону на тэрыторыі Сіроцінскага раёна, вызваліў вёскі Гуркі, Ермакі і выйшаў у тыл праціўніка, на працягу дня адбіў 9 контратак, вызваліў вёскі Крупчына і Засіннікі. 24.6.1944 г. фарсіраваў Заходнюю Дзвіну каля в. Грынёва, захапіў плацдарм, выйшаў на шашу Віцебск — Бешанковічы, дзе злучыўся з войскамі 3-га Беларускага фронту, замкнуўшы акружэнне віцебскай групоўкі праціўніка. М. П. Лугоўскі загінуў у баі 25.6.1944 г. Пахаваны у г. п. Бешанковічы Віцебскай вобласці. Яго імем названы вуліца ў Бешанковічах, Друцкая васьмігадовая школа Талачынскага раёна, піянерская дружына васьмігадовай школы № 3 г. Талачына, дзе ён вучыўся.

Адной з цяжкіх задач у Беларускай аперацыі было фарсіраванне Заходняй Дзвіны. Падыход да ракі суправаджаўся жорсткімі баямі. Дарогі раскіслі ад дажджу, сталі амаль непраходнымі для танкаў, самаходных гармат і іншай тэхнікі. Для фарсіравання спачатку давялося карыстацца толькі падручнымі сродкамі. Некаторыя нашы воіны з ходу кідаліся ў ваду, пераплывалі на процілеглы бераг і тут жа ўступалі ў бой з ворагам. Фашысты абрушылі на смельчакоў усю моц свайго агню — артылерыю, танкі, пават авіяцыю. У нашых воінаў былі толькі вінтоўкі, аўтаматы, кулямёты, супрацьтанкавыя ружжы, гранаты, а падтрымкі яны пакуль што не мелі.

У гэтых цяжкіх умовах камандзір штурмавога стралковага батальёна гвардыі капітан М. П. Лугоўскі праявіў смеласць, гераізм і знаходлівасць. Ён прадумаў усё да дробязей. Ноч была выкарыстана для падрыхтоўкі з падручных матэрыялаў прасцейшых плыну-

Мемарыяльная дошка М. П. Лугоўскаму на будынку Друцкай 8-гадовай школы.

Помнік на брацкай магіле ў Бешанковічах, дзе пахаваны М. П. Лугоўскі.

ных сродкаў. Разведка далажыла, што на беразе, занятым ворагам, замаскіраваныя кулямёты, гарматы, на дрэвах і ў траншэях варожыя снайперы і аўтаматчыкі. Толькі рашучасць, хуткасць і нечакапасць маглі забяспечыць поспех справы. Вопытны камандзір М. П. Лугоўскі прыняў рашэнне фарсіраваць водны рубеж усім батальёнам адразу шырокім фронтам пад прыкрыццём нашай артылерыі, якая павінна была граміць ворага прамой наводкай.

Ледзь пачало світаць, капітан Лугоўскі ўстанавіў на плыт тэлефонны апарат, тут жа размясціўся сам з двума аўтаматчыкамі. Па ўмоўнаму сігналу пачалося імклівае фарсіраванне. Да сярэдзіны ракі воіны дабраліся незаўважанымі. Але пасля адкрыла агонь варожая артылерыя, страчылі фашысцкія кулямёты. Узрывы снарадаў і мін падымалі ў неба вадзяныя слупы, пераварочвалі плыты. Аднак савецкія воіны, падтрыманыя артылерыяй, упарта ішлі наперад. Фашысты не вытрымалі іх атакі і былі адкінуты ад берага. Захапіўшы плацдарм, батальён выйшаў на шашу Віцебск — Бешанковічы і злучыўся з часцямі 39-й арміі 3-га Беларускага фронту.

Нашы наступаючыя часці адбілі некалькі контратак праціўніка. Выбраўшы вольную хвіліну, Мікалай Пятровіч напісаў кароценькую запіску жонцы: «Аня, вызваляю радзіму бацькі, заўтра буду дома». Але яго абяцанне не збылося. У час апошняй контратакі гітлераўцаў адважны камандзір М. П. Лугоўскі загінуў смерцю храбрых. Здарылася гэта якраз у той момант, калі часці Чырвонай Арміі, ведучы жорсткія баі з праціўнікам, завяршылі акружэнне варожай групоўкі ў віцебскім «катле».

З вялікай сям'і Лугоўскіх, на чале якой быў стары салдат, удзельнік Грамадзянскай вайны Пётр Дзмітрыевіч Лугоўскі, не вярнуўся з вайны і другі сын — Віктар, які загінуў у баях за Радзіму. Аднак баявая эстафета патрыётаў Лугоўскіх працягваецца. На варце Радзімы стаіць малодшы брат героя. На слядах бацькі, Мікалая Пятровіча Лугоўскага, пайшоў яго старэйшы сын Валерый, афіцэр Савецкай Арміі. Другі сын скончыў Саратаўскі політэхнічны інстытут, працуе інжынерам на заводзе. Жонка героя Анна Іванаўна Лугоўская нярэдка з сынамі і ўнукамі прыязджае ў Талачынскі раён, вёску Равуча. Бываюць яны і ў Бешанковічах, дзе змагаўся і загінуў смерцю героя Мікалай Пятровіч.

Дзесяты з сям'і Лузгіных

Аляксей Андрэевіч Лузгін — Герой Савецкага Саюза (15.5.1946). Нарадзіўся 1.2.1920 г. ў в. Загараддзе Талачынскага раёна. Член КПСС з 1943 г. Скончыў аэраклуб у Маскве (1939), Тамбоўскую авіяцыйную школу пілотаў (1941). У 1937—1939 гг. працаваў у 1-м Маскоўскім пасажырскім аддзяленні Ленінградскай чыгункі. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У перыяд Айчыннай вайны з 1943 г. на Цэнтральным, 1-м Украінскім франтах. Камандзір звяна разведвальнага авіяпалка лейтэнант А. А. Лузгін зрабіў 116 баявых вылетаў, правёў 32 паветраныя баі. Па даных яго разведкі савецкая бамбардзіровачная авіяцыя знішчыла на аэрадроме ў Палтаве і на палявых пляцоўках 329 варожых самалётаў. Да 1960 г. А. А. Лузгін служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Памёр 10.1.1977 г.

Перасяленцы

У сярэдзіне мінулага стагоддзя пасялілiся на Талачыншчыне разанскія сяляне. Але і на новым месцы шчасце ўсё неяк абыходзіла бокам і Лузгіных, і Зотавых. Выбіваючыся з апошніх сіл, яны ад цямна да цямна раскарчоўвалі лясную дзялянку, сякерамі высякалі

пні — хацелі зрабіць урадлівым свой «пятачок» зямлі. Увосень на былой дзяляны пасеялі жыта, да зімы неяк зляпілі хатку. А праз год побач з ёй выросла яшчэ адна хатка, потым — трэцяя,чацвёртая. Так сярод лесу ўзнікла вёска Загараддзе.

Як рыба аб лёд, біўся дзень і ноч Фёдар Лузгін, але так і не разбагацеў, не стаў на ногі. Памяркаваўшы, ён паклікаў да сябе дзяцей і сказаў ім:

— Як бы цяжка вам ні было, не ездзіце, як я, па свеце, жывіце тут. Усюды яна аднолькавая — наша доля мужыцкая. А на адным месцы і пень мохам абрастае...

Пахавалі бацьку, і стаў гаспадаром у хаце яго сын Андрэй. Нялёгкі лёс выпаў і на яго долю, бо не вельмі разгонішся на бацькоўскай спадычыне — вузенькай палосцы неўрадлівай зямлі. А тут дзеці пасыпаліся, як боб. «Якая доля чакае іх? — часта думаў Андрэй, ідучы за сахою.— Будуць, напэўна, як і я, перабівацца з хлеба на квас, паліваць потам зямельку». Так бы яно і было, калі б не грымнулі ў 1917 легендарныя залпы «Аўроры». Звонкім рэхам дакаціліся яны і да беларускай вёскі Загараддзе. Сяляне часта збіраліся разам, абмяркоўвалі сваё жыццё-быццё.

Да самай ночы не тушылі ў тыя дні святло ў хатах, густым воблакам вісеў пад столлю махорачны дым. Людзі верылі, сэрцам адчувалі, што ў ціхую затоку іх жыцця ўрываецца шторм. У адзін з такіх трывожных дзён у хаце Андрэя Лузгіна раздаўся крык дзіцяці — нарадзіўся сын. Андрэй не ведаў тады, радавацца ці сумаваць. «І так поўная хата едакоў,— думаў ён,— а хлеб зарабляць аднаму прыходзіцца. Добра, калі дадуць зямлю, а можа дулю з маслам пакажуць. Не такія дурныя паны, каб добраахвотна мужыкам падзелы наразаць». Думкі Андрэя перарваў настойлівы крык дзіцяці. Ён падышоў да сына, паглядзеў на яго маленькі чырвоны тварык, і сэрца сціснулася ад болю. «І чаго я расплакаўся, разгараваўся,— падумаў Андрэй.— Дзевяць дзяцей выхоўваю — як-небудзь і дзесятага пракармлю. Хай расце на здароўе». Ён хутка выйшаў з хаты, паззваў суседа.

— Ідзі, браток, да мяне: пасядзім, пагутарым, па чарцы вып'ем. У мяне ж сын нарадзіўся...

У той дзень Андрэй, вядома, не мог нават і падумаць, што яго малодшы сын праславіць не толькі род Лузгіных, але і маленькую вёсачку Загараддзе, і Талачыншчыну, і нават усю Беларусь.

Просіцца сэрца у палёт

Лёшка рос шустрым, свавольным хлопчыкам. І хоць часу для дзіцячых забаў было малавата, ён разам з сябрамі-аднагодкамі лазіў па дрэвах, гуляў «у вайну», атрымліваў ад бацькі на «арэхі» за суседскія яблыкі.

— Вось расце непаслушнік.— не раз гаварыла маці.— І ў каго ён толькі ўдаўся. Не паспяваеш штаны яму латаць, дзіркі зашываць.

— Хай гоніць пасля абеду гусей пасвіць,— устаўляў слова бацька.— А то б'е лынды, носіцца па вуліцы, аж зямля дрыжыць.

Лёшка выганяў на луг гусей і абавязкова браў з сабой кніжку. Прымасціўшыся дзе-небудзь пад лазовым кустом, хлопчык забываў пра усё. Ён быў цяпер там, разам з Робін Гудам, дзяліў з ім радасці і нягоды... Кнігі прыносіў старэйшы брат Сцяпан, камсамолец.

— Будзеш вучыцца — чалавекам станеш,— не раз гаварыў ён Лёшку.— Не ўсё ж жыццё за гусямі а пугай бегаць.

Сцяпан для Лёшкі быў самым аўтарытэтным чалавекам. Ён наладжваў у вёсцы вясёлыя спектаклі, і, гаворыць, нават складаў прыпеўкі пра папа, якія распявала кожны вечар сельская моладзь. Потым Сцяпан паехаў у Маскву вучыцца і дамоў прыязджаў вельмі рэдка.

У1931 годзе памёр бацька. Жыць стала значна цяжэй: не так проста было адной маці пракарміць такую сям'ю. «Хай прыязджае да мяне Аляксей,— пісаў з Масквы Сцяпан.— Будзем як-небудзь удваіх перабівацца». Заплакала маці, адпраўляючы адзінаццацігадовага хлопчыка ў далёкую дарогу. У Маскве Аляксей скончыў восем класаў, паступіў у аэраклуб. Потым — лётнае вучылішча. Цяпер ужо ніякая сіла не магла спыніць яго імкненне. «Толькі лётаць! І лётаць так, як Чкалаў!».

Пашліце мяне на фронт

Выпускнікі лётнага вучылішча яшчэ не паспелі атрымаць пакіраванні ў вайсковыя часці, як радыё прынесла страшную вестку: вайна. Маладыя лётчыкі не маглі дачакацца таго дня, калі ім дадуць самалёты, каб паляцець туды, дзе не на жыццё, а на смерць змагаюцца з ворагам савецкія воіны. Учарашнія курсанты рваліся ў бой.

І раптам як снег на галаву: «Таварыш Лузгін, па загаду начальніка вучылішча вы застаецеся тут. Будзеце працаваць інструктарам». З такім назначэннем пяжка было змірыцца. Яго сябры, яго равеснікі ідуць на смерць, каб абараняць нашы гарады і сёлы, нашых бацькоў і сяспёр ад фашысцкай навалы, а цябе пакідаюць у глыбокім тыле інструктарам лётнага вучылішча.

— Вы, магчыма, думаеце, што я не умею ваяваць, не апраўдаю вашых надзей,— не гаварыў, а крычаў Аляксей Лузгін.— Тады глы-

А. А. Лузгін.

Ф. Я. Макавецкі.

бока памыляецеся! Дайце мне баявы самалёт — і я дакажу, што не ў тыле маё месца, а там, на фронце.

— Супакойцеся, таварыш Лузгін,— голас начальніка вучылішча цёплы, бацькоўскі.— Мы назначаем вас інструктарам таму, што вы тут больш патрэбны, чым там. А паваяваць яшчэ паспееце, будзьце ўпэўнены.

Прайшоў месяц, другі, трэці... І ўвесь гэты час Аляксей думаў аб адным і тым жа: трэба вырвацца на фронт. І хоць ён разумеў важнасць сваёй службы, ведаў, што краіне патрэбны лётчыкі, якіх рыхтавала іх вучылішча, але сэрцам не мог змірыцца з тым, што яго сябры, яго аднагодкі глядзяць смерці ў твар, ідуць на таран, накіроўваюць свае палаючыя машыны на скопішчы ворага, а ты, «тылавы пацук», зрабіўся інструктарам, змірыўся са спакойным жыццём, і цябе не турбуюць ні асколкі, ні снарады, ні бомбы. Аляксей Лузгін ніша спачатку адзін рапарт, потым — другі. Просьба ўсё тая ж: «Пашліце на фронт». Але інструктара лётнага вучылішча чамусьці не спяшаліся адпраўляць у баявую часць. Толькі праз год ён трапіў на фронт, у полк далёкіх разведчыкаў рэзерву Галоўнага камандавання. Пачаліся суровыя будні — амаль штодзённыя палёты на самалётах Пе-2 і Пе-3 над тэрыторыяй, занятай ворагам: савецкім часцям былі вельмі патрэбны дакладныя звесткі аб дыслакацыі сіл праціўніка. Па фотаплёнках, знятых з самалётаў-разведчыкаў, можна было вызначыць, дзе размяшчаюцца асноўныя варожыя камунікацыі, на якім участку рыхтуецца наступленне. Такія звесткі мелі вялікую каштоўнасць для нашага камандавання.

«Не вярнуліся з баявога задання...»

7 сакавіка 1944 года лётчыкі Аляксей Лузгін і штурман Мікалай Кавальчук вылецелі на чарговае баявое заданне. Надвор'е было неспрыяльным. З-за густых воблакаў, якія віселі нізка над зямлёю, нічога не было відаць. Раптам самалёт уздрыгнуў і рэзка пайшоў на зніжэнне. «Выведзены са строю матор»,— мільганула думка. Аляксей імгненна прымае рашэнне: па брыючым палёце пасадзіць машыну на зямлю... А праз некалькі хвілін лётчыкі спешна адыходзілі ад самалёта: тэрыторыя была занята фашыстамі, і ў любы момант яны маглі з'явіцца тут. Начавалі ў рове недалёка ад хутара Бандарка. У патайным месцы закапалі дакументы: трэба было пераходзіць лінію фронту, і ўсялякае магло здарыцца. Але прабрацца да сваіх было не проста. Мясцовасць незнаёмая, куды ні кінь вокам, бясконцая раўніна — ні куста, ні дрэўца. Да ўсяго на гэтым участку фронту была сканцэнтравана вялікая колькасць жывой сілы і тэхнікі праціўніка. Некалькі разоў спрабавалі прайсці наперад да перадавой — і ўсё няўдала. А потым здарылася непапраўнае: некалькі фашыстаў нечакана напалі на Лузгіна і Кавальчука і ўзялі іх у палон. Баявыя сябры трапілі за калючы дрот. «Цяпер усё скончана,— думаў Аляксей,— даваяваўся. Не ўбачыць табе франтавых сяброў, не пачуць іх вясёлых жартаў у хвіліны кароткага адпачынку». У першую ж ноч знаходжання ў лагеры ўдалося пераапрануцца.

— Трэба, Мікалай, вырвацца з гэтага пекла. І чым хутчэй — тым лепш. Інакш — капцы,— гаварыў Лузгін штурману.

Некалькі дзён вывучалі месцазнаходжанне лагера, прыкідвалі, дзе можна абысці ахову. І вось першая спроба. Але не паспелі лётчыкі і кіламетра адысці ад калючай агароджы, як ззаду пачуліся стрэлы, брэх аўчарак. Не ўдалося ўцячы і ў другі раз. Але фашысты не расстралялі лётчыкаў, як гэта яны рабілі ў пачатку вайны (відаць, ім вельмі патрэбна была рабочая сіла), а толькі перавялі А. А. Лузгіна ў другі лагер. І ўсё ж думка аб свабодзе не пакідала Аляксея. У трэці раз ён усё ж вырваўся з фашысцкіх кіпцюроў, і пасля доўгіх і пакутлівых вандраванняў дабраўся, нарэшце, да сваіх. Малады лейтэнант (відаць, толькі з вучылішча) расказ А. А. Лузгіна ўспрыняў даволі скептычна.

— Ведаем мы такіх лётчыкаў без дакументаў. Давай ідзі ў гэту кампанію, а потым разбяромся, хто ты і адкуль.

— А што гэта за кампанія?

— Паліцаі. Хіба не бачыш?

— Не, дарагі таварыш,— са злосцю сказаў Лузгін,— з гітлераўскімі служакамі я ў адну кампанію не пайду, што хочаш рабі.

Падышоў капітан. Даведаўшыся, у чым справа, ён параіў А. А. Лузгіну дабрацца да хутара Бандарка і забраць дакументы (тая

мясцовасць ужо была ачышчана ад фашыстаў).

— Іпакш цябе па кожным кроку будуць спыняць. І чым ты дакажаш, што не лысы... А з дакументамі лягчэй будзе і полк шукаць.

Больш чым праз месяц, пасля таго няўдалага вылету сустрэўся Аляксей Андрэевіч з сябрамі-аднапалчанамі. «А мы ўжо думалі — у жывых няма,— трос руку Аляксея камандзір палка.— Так і напісалі пра вас: «Не вярнуліся з баявога задання».

Прайшло некалькі тыдняў. Трохі адпачыўшы пасля цяжкіх дарог і хваляванняў, Лузгін стаў зноў прасіцца на самалёт. «Пачакай,— гаварылі яму,— паспееш яшчэ».

«Нешта нядобрае робіцца,— думаў ён.— Відаць, не вераць мне, думаюць, што выдумаў я ўсю гэту гісторыю». Падставы для такіх разважанняў былі. А. А. Лузгіна некалькі разоў выклікалі ў асобы аддзел, падрабязна пра ўсё распытвалі, узялі пісьмовае тлумачэнне. Потым паслалі на спецыяльную праверку ў Маскву, якая працягвалася больш двух тыдняў. Аляксея Андрэевіча здзівіла, што ў яго дабіваюцца пейкіх новых паказанняў, размаўляюць, як з чалавекам, які моцна запляміў сваю рэпутацыю. Нялёгка было ўвесь час адчуваць, што табе не вераць, на цябе не спадзяюцца. Нарэшце, праверка скончылася. А. А. Лузгіну аддалі дакументы і загадалі вярнуцца ў свой полк. І зноў — баявыя заданні, палёты над варожай тэрыторыяй, радасці і горыч франтавога жыцця. І так да апошняга дня вайны, да Дня Перамогі. За гады вайны А. А. Лузгін зрабіў 116 баявых вылетаў. Ад камандзіра звяна ён вырас да намесніка камандзіра палка па лётнай падрыхтоўцы. За ратныя подзвігі камуніст А. А. Лузгін узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, многімі медалямі. У 1946 годзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля вайны А. А. Лузгін лятаў на рэактыўных самалётах, вучыў лётпаму майстэрству савецкіх сокалаў. У 1960 г. ў званні палкоўніка выйшаў у адстаўку, жыў у Маскве. Часта прыязджаў на Талачыншчыну, наведваў сваю родную вёску Загараддзе, дзе прайшлі гады яго дзяцінства, адкуль пачаў свой слаўны жыццёвы шлях. Былы лётчык актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, часта выступаў на піянерскіх зборах, школьных вечарах, расказваў навучэнцам пра подзвігі савецкіх лётчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Ён узначальваў адну з пярвічных партыйных арганізацый г. Масквы. Шчырым, прынцыповым, жыццярадасным, энергічным — такім ведалі А. А. Лузгіна яго баявыя таварышы, суседзі, зямлякі.

С. Азёрны.

Дваццаць восем баявых гадоў

Фёдар Яфрэмавіч Макавецкі — Герой Савецкага Саюза (17.10.1943). Нарадзіўся 25.2.1899 г. ў в. Багданаўка Талачынскага раёна. З сялян. Беларус. У Чырвонай Арміі з 1919 г. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Змагаўся супраць войск Дзянікіна, Юдзеніча, Урангеля, басмачоў. У час Вялікай Айчыннай вайны са студзеня 1942 г. на Паўднёва-Заходнім, Варонежскім, Сталінградскім, Данскім, Цэнтральным, Беларускім, 1-м і 4-м Украінскіх франтах: удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і Дняпра па поўнач ад Кіева. Стралковы полк пад камандаваннем падпалкоўніка Ф. Я. Макавецкага 21 верасня 1943 г. пераправіўся цераз Дняпро, умацаваўся на заходнім беразе і забяспечыў пераправу часцей дывізіі; 24 верасня 1943 г. на падручных сродках фарсіраваў Дняпро і замацаваўся на плацдарме. Ф. Я. Макавецкі да 1947 г. служыў у Савецкай Арміі. Памёр 7.5.1974 г.

1917 год, Масква, Фанагарыйскія казармы. Тут, каля Лефортава, размяшчаўся літарны батальён самакатчыкаў. Салдацкі сход-мітынг, які адбыўся ўвечары, вырашыў шмат пытанняў, апошнім было пытанне аб залічэнні добраахвотніка Фёдара Макавецкага ў самакатны батальён. Так пачаліся дні вайсковай вучобы і рэвалюцыйнай загартоўкі для сялянскага хлопца з Талачыншчыны. Салдаты, разбуджаныя лютаўскай рэвалюцыяй, прагна цягнуліся да палітыкі. Фёдар уважліва слухаў на мітынгах шматлікіх прамоўцаў, спрабуючы разабрацца ў характары імклівых падзей. На выбарах у салдацкі Савет ён галасаваў за бальшавікоў. У кастрычніцкія дні самакатчыкі, у тым ліку Ф. Макавецкі, былі па баку рэвалюцыі. Яны штурмавалі былое Аляксееўскае ваеннае вучылішча, выбівалі юнкераў з гасцініцы «Метраполь».

У 2-й палавіне снежня 1917 года літарную роту накіравалі ў Петраград на папаўненне першага баявога батальёна. Гэта быў той самы батальён, аб якім пісаў Джон Рыд у сваёй кнізе «Дзесяць дзён, якія скалапулі свет». Батальён дыслацыраваўся ў Петрапаўлаўскай крэпасці — змрочным засценку царызму, дзе пакутавалі многія рэвалюцыянеры. Цяпер тут сядзелі некаторыя з міністраў скінутага рэвалюцыяй буржуазнага Часовага ўрада. Самакатчыкі неслі таксама каоавульную службу ў штабе рэвалюцыі Смольным. Нярэдка ў каравул заступаў і Фёдар.

У лютым 1918 года Ф. Макавецкі вярнуўся ў родную вёску, дзе прабыў да сакавіка 1919 года.

Падзеі 1918 года многаму навучылі Фёдара. Ён зразумеў, што барацьба за ўладу народа яшчэ ў поўным разгары і будзе яна жорсткай. Крывёю заваяваныя зямлю і волю трэба было бараніць ад шматлікіх ворагаў, якія з усіх бакоў насядалі на Рэспубліку Саветаў. У сакавіку 1919 года Ф. Макавецкі стаў курсантам Першых Маскоўскіх пяхотных камандных курсаў. Курсантам неаднаразова прыходзілася перапыняць вучобу і выязджаць на франты Грамадзянскай вайны. На ўліку быў кожны салдат рэвалюцыі, яе абаронца. Палітычную і ваенную адукацыю даводзілася набываць пад агнём.

Вясной 1919 года курсанты выязджалі на Дон для ўдзелу ў падаўленні контррэвалюцыйнага паўстання (яно апісана Міхаілам Шолахавым у яго рамане-эпапеі «Ціхі Дон»). Спяваючы «Інтэрнацыянал», ішлі яны ў атаку на пазіцыі белаказакаў каля хутара Сітракоў Вёшанскай станіцы.

У маі — жніўні 1919 года курсанты ўдзельнічалі ў цяжкіх баях супраць дзянікінцаў на Паўднёвым фронце, у кастрычніку — лістападзе супраць Юдзеніча пад Петраградам.

Незабыўнае ўражанне ў сэрцы курсанта Макавецкага пакінулі дні вучобы ў Маскве, сустрэчы з дзеячамі рэвалюцыі, сустрэчы з У. І. Леніным.

— Уладзіміра Ільіча мне пашчасціла ўбачыць некалькі разоў,— успамінаў Фёдар Яфрэмавіч.— Першы раз гэта было ў сакавіку 1919 года. Ільіч рабіў на нашых курсах даклад аб міжнародным становішчы. Гаварыў ён проста, даходліва і разам з тым яркa і пераканаўча. Што і казаць, нялёгкі быў той час для краіны, але словы Леніна дыхалі такой верай ў перамогу рэвалюцыі, што гэта вера перадавалася ўсім нам, чырвоным курсантам. Мы слухалі Ільіча, баючыся прапусціць хоць адно слова. У наступны раз я ўбачыў Уладзіміра Ільіча 1 мая 1919 года. На Краснай плошчы меў адбыцца парад чырвонаармейскіх часцей. Я быў прызначаны ў ахову. Мітынг пачаўся з выступлення Леніна. Уражанне ад яго слоў было велізарнае. Цікава, што з гэтым памятным днём мне давялося сустрэцца зноў... праз 37 гадоў. У 1956 годзе выпадкова трапіў мне на вочы альбом, прысвечаны Леніну. На адным са здымкаў, зробленым паводле подпісаў 1 мая 1919 года, Ільіч вітаецца з адным з членаў ЦК. А крыху воддаль — група ваенных. У чырвонаармейцы ў салдацкім шынялі і з вінтоўкай я пазнаў самога сябе...

У пачатку 1920 года пасля заканчэння курсаў Макавецкага прызначылі камандзірам чырвонаармейскай роты. У маі — чэрвені 1920 года яго рота ўдзельнічала ў баях пад Мелітопалем супраць войск чорнага барона Урангеля. У жніўні 1920 года роту перакінулі на Заходні фронт. Камандзір вадзіў сваіх байцоў у атаку на белапольскія легіёны. Двойчы за час Грамадзянскай вайны Макавецкі быў паранены — у нагу і ў галаву, але ні разу не пакідаў поля бою і сваіх байцоў. Хутка ў жыцці і ў службе камандзіра Макавецкага наступіў новы перыяд — ён стаў пагранічні-

Ф. Я. Макавецкі (трэці злева ў другім радзе) сярод байцоў у час Грамадзянскай вайны.

кам. Атрымаўшы спецыяльную падрыхтоўку, Ф. Я. Макавецкі ў 1926 годзе прызначаны памочнікам начальніка пагранічнай заставы Батумскага пагранічнага атрада. 12 гадоў праслужыў Фёдар Яфрэмавіч на граніцы, вырас за гэты час ад памочніка начальніка пагранзаставы да памочніка начальніка пагранічнага атрада. З Батумі ў 1932 годзе ён быў накіраваны ў Нахічэвань, потым — у Баку. У 1937 годзе Ф. Макавецкі скончыў Завочную Вышэйшую пагранічную школу. У 1938 годзе капітана Макавецкага накіравалі выкладчыкам тактыкі і тапаграфіі ў Саратаўскую пагранічную школу. Тут яго і застала Вялікая Айчынная вайна.

Трапіць на фронт удалося не адразу. Першы час яго рапарты аб пасылцы на фронт камандаванне пакідала без разгляду. Нарэшце, у студзені 1942 года Макавецкі быў пасланы ў Варонеж, дзе з войск НКУС фарміравалася 13-я мотастралковая дывізія. Фёдар Яфрэмавіч быў прызначаны начальнікам аператыўнага аддзела штаба. Дывізія была накіравана на ахову тылу Паўднёва-Заходняга фронту на ўчастку Валчанск — Харкаў — Лазавая — Барвенкава. У чэрвені 1942 года яна абараняла Варонеж.

Да 6 ліпеня 1942 года фашысты здолелі захапіць плацдарм на левым беразе Дона на захад ад Варонежа. Неўзабаве гітлераўцы ўварваліся ў горад. Перад дывізіяй НКУС была пастаўлена задача затрымаць наступленне ворага, выйграць час да падыходу нашых рэзерваў. Маёр Макавецкі атрымаў загад сіламі двух палкоў арганізаваць абарону горада. Выканаць загад значыла навязаць немцам бой, выгнаць іх з захопленай часткі горада. У трывожную ліпеньскую ноч, на ўсходнім беразе ракі — якраз насупраць цэнтральнай часткі горада, якая была захоплена гітлераўцамі,— палкі занялі зыходныя рубяжы для атакі. Перад світаннем без артпадрыхтоўкі камандзіры правялі сваіх байцоў праз рачныя броды. Атакавалі ворага знянацку, уварваліся на цэнтральныя вуліцы горада. Загад быў выкананы, час выйграны.

...К сярэдзіне верасня 1942 года цяжкія баі разгарнуліся ў раёне Сталінграда. Цераз Волгу сюды была перапраўлена 95-я стралковая дывізія. Камандзір 161-га палка Макавецкі атрымаў загад камандавання да пяці гадзін раніцы фарсіраваць Волгу і да дванаццаці гадзін дня атакаваць праціўніка на Мамаевым кургане. Полк выканаў загад. Днём 19 верасня ён дасягнуў вяршыні Мамаева кургана і ўступіў у сустрэчны бой з атакуючай пяхотай і танкамі праціўніка, гітлераўцы былі адбіты. 20 верасня атакі свежых сіл фашыстаў зноў былі адбіты. Мамаеў курган заставаўся ў руках палка. А 21 верасня полк Макавецкага не толькі адбіў усе атакі немцаў, але і сам здолеў прасунуцца наперад. Але замацавацца нашым воінам не ўдалося. Гітлераўцы кінулі на Мамаеў курган новыя сілы, якія значна пераўзыходзілі сілы нашых байцоў. Атакі ворага не спыняліся. Полк быў выбіты з займаемага ім рубяжа і заняў абарону на паўднёва-заходніх схілах кургана. Жорсткія баі працягваліся 23 і 24 верасня. Часта яны пераходзілі ў рукапашныя схваткі. Барацьба ішла за кожны метр, за кожную пядзю. Макавецкі атрымаў загад камдыва: на схілах Мамаева кургана ўмацаваць апорны пункт і ўтрымліваць яго любой цаной. Значэнне гэтага загада стала ясным ужо 26 верасня. У гэты дзень гітлераўцы выйшлі да Волгі на левым флангу 62-й арміі і вызваленыя сілы сталі перакідваць да Мамаева кургана. Варожая артылерыя і авіяцыя дашчэнту разбілі апорны пункт. Полк панёс вялікія страты і быў адцеснены на паўночна-ўсходнія схілы кургана. Але ворагі рана святкавалі перамогу. 28 верасня рэшткі палка пайшлі ў адчайную контратаку і занялі частку вышыні, але авалодаць вяршыняй, дзе знаходзілася воданапорная вежа, сіл ужо не хапіла. Вежа заставалася ў нейтральнай зоне. Гітлераўцы былі пазбаўлены магчымасці весці назіранне за поймай Волгі. Гэта было вельмі важна для нашых войск.

У пачатку кастрычніка ў саставе дывізіі полк быў перакінуты ў раён трактарнага завода. Гэта сюды праціўнік наносіў свой галоўны ўдар. Безліч атак было адбіта палком. Калі ж цаной велізарных страт трактарны завод быў узяты ворагам, полк Макавецкага працягваў упартыя баі на Трамвайнай і Скульптурнай вуліцах. Тут фашыстам не ўдалося прасунуцца ад трактарнага завода на поўдзень уздоўж Волгі. Усе іх атакі былі адбіты.

Раніцай 17 кастрычніка з рэшткаў дывізіі Макавецкі сабраў зводны полк і вывеў яго з паўакружэння да Волгі. Меркавалася, што полк зойме абарону ў другім эшалоне. Але аказалася, што на захад ад завода «Барыкады» ніякага першага эшалона не было. Байцы Макавецкага прынялі на сябе шалёны націск ворага. Вось што ўспамінаў аб гэтым сам Фёдар Яфрэмавіч:

— Пад жудаснай бамбёжкай полк пад абрывамі крутога берага Волгі рушыў на поўдзень — на новы ўчастак. Байцы і камандзіры ішлі брудныя, аброслыя, у парваных і абпаленых гімнасцёрках, з сухімі ад бяссонніцы вачыма, стомленыя бясконцымі баямі, якія не сціхалі ні на мінуту. Але ні ў кога не было пачуцця страху. Знікла гэта пачуццё, нашы сэрцы быццам скамянелі. Мы рухаліся пад жудаснае завыванне варожых пі-

кіроўшчыкаў, свіст падаючых бомбаў. Я са сваім ардынарцам Федзем Усавым ішоў у галаве калоны, камандзіры і палітрукі іншлі сярод байцоў. Думка ва ўсіх была адна: хутчэй у бой, хутчэй за новы ўчастак. 26 кастрычніка, з наступленнем ночы, дзесяткі два салдат — усё, што засталося ад нашага палка,— занялі абарону вакол штаба, які размясціўся ў адным з дамоў інжынерна-тэхнічных работнікаў. Дзверы і частка акон былі закладзены мяшкамі і скрынкамі з пяском. На ўваходах стаялі вартавыя з аўтаматамі і гранатамі напагатове. Раптам каля дзвярэй, на лесвіцы, узрывы гранат, крыкі і стогны. Выбягаю. Камендант штаба лейтэнант Пазнякоў (уся шчака ў крыві) дакладвае: «Фрыцы закідалі гранатамі і пабеглі ўздоўж будынка, некалькі з іх забіты». Справа ясная. У цемрадзі і мітусні пад выглядам «сваіх» прабраліся нямецкія аўтаматчыкі. А наступны под'езд дома, дзе знаходзіўся штаб 685-га палка закідалі бутэлькамі з гаручай сумессю. Будынак у агні, з усіх бакоў атакуюць немцы. Штабы на чале з камандзірамі часцей прарваліся, а дакладней выпаўзлі з акружэння. На світанні 27 кастрычніка сумеснымі сіламі арганізавалі абарону школы паміж заводамі «Барыкады» і «Чырвоны Кастрычнік», усяго за 400 м ад Волгі. Стралкоў ні ў мяне, ні ў камандзіра 685-га палка падпалкоўніка Драгайцава ўжо не было. Абарону трымалі мае мінамётчыкі, якія сталі ў яры за школай, і штабы палкоў. Усе мы думалі, што гэты бой будзе для нас апошнім. Школа была адзіным будынкам, які закрываў подступы да Волгі, ніякіх падмацаванняў у той дзень не чакалі. З дамоў, толькі што пакінутых намі, былі чутны словы нямецкай каманды і плач жанчын і дзяцей, якіх фашысты выганялі з падвалаў. Каля дамоў раўлі танкі: вораг збіраў сілы для атакі. Нечакана перад світаннем усё сціхла. У горадзе агню, стогнаў і няспыннага бою цішыня здавалася асабліва злавеснай. І раптам задрыжэла неба, скалануласа зямля. Гітлераўцы пайшлі на штурм. Пасля бамбёжкі да школы амаль ушчыльную падышлі фашысцкія танкі і адкрылі агонь па сценах, вокнах, дзвярах. А ў нас, як на тое — ніводнай супрацьтанкавай гарматы. Наша артылерыя была за Волгай і адтуль перыядычна абстрэльвала ворага (мы выклікалі яе па рацыі). Але ж толькі прамой наводкай можна было б паспяхова змагацца з варожымі танкамі. Ды абаронцы школы і ў такім няроўным баі не пахіснуліся, сталі насмерць. Мой ад'ютант прамым трападаннем варожага снарада быў разарваны напалам. Тыя, што яшчэ трымаліся на нагах і вялі бой, былі ў крыві і ранах. Фашысцкія аўтаматчыкі ўзялі ў вогненнае кальцо будынак школы, ім удалося ўварвацца ў яе і захапіць асобныя пакоі. Прымаем рашэнне: прарывацца з будынка да мінамётнай роты нашага палка, якая займае баявыя пазіцыі ў яры метраў за 150—200 ад школы... А раніцай 28 кастрычніка, ледзь толькі бліснулі першыя промні сонца, мы ўбачылі бясконцую стужку нашых салдат, якія бадзёра крочылі пад абрывамі волжскага берага. Яны толькі што пераправіліся цераз Волгу, каб дапамагчы нам. Становішча было выратавана...

За выключную стойкасць і гераізм палку Ф. Я. Макавецкага было прысвоена званне гвардзейскага. А сам адважны камандзір быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, яму было прысвоена таксама нечарговае воінскае званне падпалкоўнік.

Летам 1943 года 231-ы гвардзейскі полк, якім камандаваў Ф. Макавецкі (новы нумар полк атрымаў разам з гвардзейскім званнем), у складзе 75-й гвардзейскай дывізіі змагаўся на Курскай дузе. У першы ж дзень жорсткіх баёў полк Макавецкага адбіў чатыры атакі фашыстаў, знішчыў 35 танкаў і каля двух батальёнаў пяхоты. Да 10 ліпеня гітлераўцы прасунуліся толькі на 10 кіламетраў, прарваўшы першую паласу нашай абароны. Гэты нязначны поспех толькі на ўчастку палка Макавецкага каштаваў ворагу 4 тысячы забітых і параненых салдат і афіцэраў, 81 знішчаны танк, 9 гармат, 4 мінамётныя батарэі, 2 самалёты Ю-88. Адзінаццаць шалёных атак гітлераўцаў адбіў полк. За гераізм, праяўлены на вогненнай дузе, многія салдаты і афіцэры былі прадстаўлены да ўзнагарод. Макавецкі быў узнагароджаны яшчэ адным ордэнам Чырвонага Сцяга.

Пасля Курскай дугі Ф. Я. Макавецкі са сваімі байцамі наступаў у напрамку Бахмач — Кіеў. Полк вызваляў Глухаў, Канатоп, Нежын. Да сярэдзіны верасня 1943 года, прайшоўшы з баямі больш чым 180 кіламетраў, полк Макавецкага разам з іншымі часцямі выйшаў да Дзясны і першым фарсіраваў яе ў ноч на 22 верасня. За 2 дні полк прасунуўся да Дзясны на 40 кіламетраў. 23 верасня каля вёскі Тарасевічы байцы ўбачылі хвалі Дняпра, і ў гэты дзень полк Макавецкага атрымаў загад фарсіраваць Дняпро. Бой за вялікую раку прадстаяў нялёгкі.

Дняпро прыйшлося фарсіраваць на падручных сродках. На плытах, лодках, а часам і проста ўплаў пераправяляліся воіны. Большасць байцоў палка і гарматы былі пераправлены на баржах і лодках, якія даставілі воінам-вызваліцелям мясцовыя жыхары. Да раніцы 25 верасня полк закончыў пераправу і на правым беразе Дняпра, каля сяла Яснагародкі, захапіў невялікі плацдарм. Гітлераў-

цы ў шалёнай злосці безліч разоў атакавалі яго, імкнучыся скінуць байцоў Макавецкага ў Дняпро. Але плацдарм стаяў. Стаяў непахісна. Вось дзе спатрэбіліся вопыт сталінградскіх баёў, набытая там вытрымка і загартоўка. І ўсюды — у акопах, пад бамбёжкамі і абстрэламі быў са сваімі байцамі і афіцэрамі Фёдар Яфрэмавіч. Прыкладам для падначаленых служылі яго асабістая мужнасць і вялікае баявое майстэрства. Вось што пісала камандаванне, прадстаўляючы Фёдара Яфрэмавіча да звання Героя Савецкага Саюза: «Паспяхова праследуючы праціўніка, знішчаючы яго ар'ергардныя часці і авалодаўшы населеным пунктам Еўмінкі, размешчаным на рацэ Дзясна, падпалкоўнік Макавецкі абходным рухам з фланга выйшаў на ўсходні бераг р. Дзясна. Не зважаючы па бамбардзіроўку з паветра, выкарыстоўваючы падручныя сродкі пераправы, 21.9.1943 г. фарсіраваў р. Дзясну. Выйшаўшы на яе заходні бераг, замацаваўся, чым забяспечыў пераправу ўсіх часцей дывізіі.

24.9.1943 г. на падручных сродках пад прыкрыццём 212-га і 241-га стралковых палкоў фарсіраваў р. Днепр.

Пры правядзенні гэтых аперацый падпалкоўнік Макавецкі праявіў ініцыятыву, мужнасць і ўменне пераадольваць водныя рубяжы». Заключэнне на рэляцыі «Дастойны звання Героя Савецкага Саюза» падпісаў той, хто добра ведаў цану сапраўднай мужнасці і воінскаму ўменню — камандзір 60-й арміі І. Д. Чарняхоўскі.

Пасля вызвалення Кіева гвардзейская дывізія, у якой служыў Макавецкі, пайшла на папаўненне, а Фёдар Яфрэмавіч застаўся ў штабе 60-й арміі на пасадзе начальніка створанага аддзялення па вывучэнню і абагульненню вопыту Вялікай Айчыннай вайны, адначасова ён быў намеснікам начальніка аператыўнага аддзела штаба арміі.

Пасля таго, як гітлераўцам часова ўдалося адбіць Жытомір, у раёне гэтага горада разгарэліся жорсткія баі з фашысцкай танкавай арміяй. Больш як 10 сутак Макавецкі выконваў асабістыя заданні камандарма, быў на самых цяжкіх участках. У снежні 1943 года ў час аднаго з баёў Ф. Я. Макавецкі выратаваў жыццё І. Д. Чарняхоўскаму, прыкрыўшы яго ад асколкаў варожага снарада.

Макавецкі прывык дзейнічаць на пярэдняй лініі агню. Таму пасля баёў за Шапятоўку і Цярнопаль ён звярнуўся да камандавання з просьбай зноў накіраваць яго ў дзеючыя часці. У чэрвені 1944 г. ён прыняў 825-ы Цярнопальскі стралковы полк 302-й Цярнопальскай стралковай дывізіі. Полк пад яго камандаваннем прымаў удзел у Львоўскай, Дэмбіцкай, Сандамірскай, Кракаўскай і

Ф. Я. Макавецкі ў шпіталі ў Львове. Красавік 1945 г.

Одэрскай аперацыях, быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Суворава III ступені. А за поспехі палка камандзір быў адзначаны яшчэ двума ордэнамі Чырвонага Сцяга — у верасні і лістападзе 1944 года.

Амаль да самых апошніх дзён цяжкай вайны прайшоў са сваім палком воін-камандзір, і кожны гэты дзень быў поўны напружанай баявой работы. 18 красавіка 1945 года полк Макавецкага вёў жорсткі бой за горад Трапаў. Камандны пункт палка знаходзіўся ў двухпавярховым будынку ў пасёлку Пуста-Якарціца. Раптам сюды прарваліся фашысцкія танкі і аўтаматчыкі. Асколкамі снарада Фёдар Яфрэмавіч быў цяжка паранены ў правую нагу. Гітлераўцы ўзялі будынак у кальцо.

— Агонь на мяне! — аддаў апошні загад сваім артылерыстам камандзір.

Трапны агонь нашай артылерыі змёў нападаючых фашыстаў. Пад яго прыкрыццём байцы прарваліся да будынка. Там яны знайшлі свайго камандзіра. У непрытомным стане ён ляжаў сярод забітых і параненых. Камандзіра даставілі ў франтавы шпіталь. Вялікая страта крыві і працяглае знаходжанне ў баі параненым без медыцынскай дапамогі сур'ёзна ўскладнілі лячэнне. Фёдар Яфрэмавіч так і не змог болей стаць у строй. Два доўгія гады ляжаў ён ў шпіталях, але захаваць параненую нагу не ўдалося, яе прыйшлося ампутаваць.

У жніўні 1947 года гвардыі падпалкоўнік Ф. Я. Макавецкі выйшаў у адстаўку. Баявы камандзір, ён аддаў вайсковай службе 28 гадоў свайго жыцця і да канца выканаў свой грамадзянскі і воінскі абавязак. Апошні дзесятак гадоў Фёдар Яфрэмавіч жыў у Віцебску.

Б. Р. Фірштэйн.

Разгневанае неба

З успамінаў П. Ф. Сычэнкі

П. Ф. Сычэнка.

Я. М. Целешаў.

Пётр Фёдаравіч Сычэнка — Герой Савецкага Саюза (14.2.1943). Нарадзіўся 6.6.1911 г. ў в. Новае Заазер'е Талачынскага раёна. Член КПСС з 1940 г. У 1932 г. скончыў Ваенна-авіяцыйную школу тэхнікаў, у 1939 г.— ваенную школу лётчыкаў. З 1931 г. ў Чырвонай Арміі. З 1941 г. на Цэнтральным, Паўднёвым, Бранскім, Варонежскім, Паўночна-Заходнім, Сталінградскім, 1-м Украінскім франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, Курскам, Львоўскай і Сілезскай аперацый. Камандзір штурмавой эскадрыллі капітан П. Ф. Сычэнка да 1943 г. здзейсніў 42 баявыя вылеты, знішчыў 6 танкаў, 3 зенітныя батарэі, 25 матацыклаў і больш за 700 гітлераўцаў. Актыўна ўдзельнічаў у разгроме мотамехдывізіі гітлераўцаў, якая ішла ў напрамку гарадоў Міхайлаў — Венеў — Горлава — Скопін. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, ордэнамі «Чэхаславацкі крыж 1939 г.» і дзевяццю медалямі. Да 1956 г. служыў у Савецкай Арміі. Памёр 25.6. 1969 г.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны я лятаў па самалётах-бамбардзіроўшчыках тыпу Іл-4 у складзе 220-га бамбардзіровачнага авіяпалка. Днём і ноччу мы наносілі ўдары па аэрадромах і воінскіх эшалонах праціўніка, жывой сіле і тэхніцы гітлераўцаў на водных пераправах. Асноўныя баі вялі на Маскоўскім і Кіеўскім напрамках. І хоць яўна заўважалася перавага ворага ў тэхніцы, нашы сокалы ведалі, за што змагаюцца, ведалі, якая небяспека пагражае Радзіме, і таму ваявалі з выключнай адвагай і мужнасцю. Хутка нам на ўзбраенне сталі паступаць новыя тыпы самалётаў, створаныя айчыннымі авіяканструктарамі. У баях пад Масквой я ўжо камандаваў эскадрылляй 241-га штурмавога авіяпалка, на ўзбраенні якога былі самалёты Іл-2. Полк дзейнічаў на ўчастку фронту ад Тулы да Яльца. На Тульска-Кашырскім напрамку мы ўзаемадзейнічалі са знішчальным палком. Калі Чырвоная Армія перайшла ў контрнаступленне пад Масквой, удары нашага авіяпалка абрушыліся на варожую групоўку, якая спрабавала абысці Маскву з поўдня. Па дарогах цягнуліся доўгія калоны разбітых часцей 2-й танкавай арміі гітлераўцаў. Захутаныя ў жаночыя хусткі і рваныя коўдры, фашысцкія ваякі ганебна ўцякалі. Тыя ж каму ўдалося адарвацца ад нашай пяхоты, траплялі пад агонь кулямётаў, бомбаў і рэактыўных снарадаў. Часам мы атакавалі варожыя калоны, зніжаючыся да 20—50 метраў. На сваёй скуры вораг зведаў сілу нашага штурмавіка! Немцы называлі яго чорнай смерцю. У залежнасці ад даўжыні калоны мы рабілі іншы раз па два-тры заходы. Пасля штурмоўкі на дарогах заставалася шмат варожых трупаў і разбітай тэхнікі. Мы падтрымвалі таксама нашы наступаючыя войскі, падаўлялі агонь варожых артылерыйскіх гармат, наносілі ўдары па аэрадромах праціўніка, увесь час вялі паветраную разведку. Абстаноўка ж як у час абарончых, так і ў час наступальных баёў пад Масквой была для нашых лётчыкаў па-ранейшаму цяжкай. Вораг гаспадарыў у паветры, у яго яшчэ было больш самалётаў. Вось адзін з баявых эпізодаў таго часу.

На Ялецкім напрамку 9 ці 10 снежня 1941 года са старшым лейтэнантам Цамаевым мы вялі паветраную разведку. На захад ад Яльца выявілі адступаючыя калоны войск і тэхнікі ворага. Атакаваўшы гэту калону, мы страцілі амаль увесь боезапас. Гітлераўцам былі нанесены вялікія страты. Аднак на выхадзе на нас напалі шэсць нямецкіх знішчальнікаў Ме-110. Увайсці ў воблакі мы не паспелі. Фашысты атакавалі нас адначасова. Сілы былі няроўныя. Моцны ўдар быў нанесены па кабіне майго самалёта і яго правым крыле. Асколкі фашысцкіх снарадаў выбілі абедзве фортачкі кабіны. Адзін асколак трапіў мне ў жывот, два другія — у твар. Дым ахутаў усю кабіну. Я, як кажуць у лётчыкаў, страціў зямлю. Інстынктыўна «аддаў», я ручку ад сябе для стварэння пікіруючага моманту. Імгненнае нарастанне скорасці пры выбітых фортачках выцягнула дым з кабіны, і я ўбачыў зямлю, пікіруючы пад вуглом 60 градусаў. Дакучалі раны: агнём пякло жывот, кроў залівала твар. У той жа момант я ўбачыў самалёт свайго напарніка. Ён падаў на зямлю. Збіўшы Цамаева, фашысцкія знішчальнікі пераключыліся на мяне. Адзін, паранены, на падбітым самалёце, я вымушаны быў змагацца супраць шасці варожых знішчальнікаў. Перайшоўшы на брыючы палёт,

я ўвесь час «адцягваў» праціўніка на сваю тэрыторыю. Праз 20—25 мінут, перакапаўшыся ў безвыніковасці сваіх атак, абстраляныя нашай зенітнай артылерыяй, фашысцкія самалёты павярнулі назад. А я ўзяў курс на бліжэйшы аэрадром, дзе пасля пасадкі мне была аказана медыцынская дапамога. Збітага фашыстамі Цамаева савецкія людзі выратавалі. Праз некалькі дзён ён выйшаў да сваіх і вярнуўся ў часць.

Вельмі часта нашым лётчыкам даводзілася выконваць баявыя заданні ва ўмовах, здавалася б, зусім немагчымых, і яны дэманстравалі высокае ўменне і майстэрства. Памятаю, 23 лютага 1942 года мы атрымалі загад нанесці ўдар па аэрадроме праціўніка ў горадзе Арле. Я быў прызначаны вядучым групы, у якой былі штурмавікі і знішчальнікі. Свой удар мы вырашылі нанесці пры вячэрнім змроку. Вельмі часта ваенная неабходнасць ламала ўстаноўленыя нормы, магчымасці. Пры перасячэнні лініі фронту нас атакавала група фашысцкіх знішчальнікаў Хе-113. Нашы знішчальнікі завязалі з імі паветраны бой. А шасцёркі штурмавікоў працягвалі выконваць баявое заданне. Было ўжо цёмна, калі мы атакавалі варожы аэрадром. Праціўніка засталі знянацку. Толькі пасля выхаду нашых самалётаў з атакі гітлераўцы адкрылі агонь з зенітных гармат. Другі заход нашы штурмавікі і знішчальнікі рабілі сярод бясконцых разрываў зенітных снарадаў. Заданне было выканана: мы падпалілі 6 нямецкіх самалётаў і склад з гаручым. На сваю базу вярталіся без страт.

Рост магутнасці савецкай авіяцыі, павышэнне майстэрства нашых лётчыкаў у значнай ступені садзейнічалі перамозе нашых армій, умацаванню баявога духу наземных войск. Успамінаецца адзін з эпізодаў на Бранскім фронце. Я вёў групу з сямі самалётаў Іл-2 для нанясення баявога ўдару па артылерыйскіх пазіцыях гітлераўцаў на заходнім беразе ракі Зуша. Пры падыходзе да лініі фронту мы заўважылі па курсу спераду 8 фашысцкіх знішчальнікаў Ме-110, якія штурмавалі пераправу нашых войск. Паветраны бой быў непазбежны. Нашага падыходу гітлераўскія лётчыкі спачатку не заўважылі, і гэта патрэбна было скарыстаць. Я папярэдзіў групу, і яна хутка разгарнулася ў баявы парадак. У атаку рынуліся ўсе нашы самалёты. Ужо на выхадзе з атакі мне ўдалося збіць варожы самалёт. Ахоплены полымем, ён упаў на зямлю. Праз некалькі мінут лейтэнант Гайшун таксама збіў фашысцкі знішчальнік, але і сам быў збіты. Шэсць «ілаў» вялі бой супраць шасці «месершмітаў». Мы змагаліся з выключнай энергіяй. Настроіліся ланцужком: пасля кожнага «месера» ішоў наш штурмавік. Мы змаглі навязаць праціўніку свой манеўр і план бою. Фашысты не вытрымалі і кінуліся наўцёк. Заўважу, што пасля гэтага «месершміты» вельмі неахвотна ўступалі ў бой з нашымі штурмавікамі. Застаецца дадаць, што гэта схватка праходзіла на вачах у нашых пехацінцаў, артылерыстаў, танкістаў, якіх мы выратавалі ад нападзення варожых знішчальнікаў. Ваенны савет арміі знайшоў нас, і на маё імя было выслана віншаванне ўсім лётчыкам групы.

Герой Дняпра

Яўген Міхайлавіч Целешаў — Герой Савецкага Саюза (23.10.1943). Нарадзіўся 19.4.1923 г. ў пасёлку Забайкал Талачынскага раёна. З сялян. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Скончыў Кіеўскае ваеннае вучылішча сувязі (1947). На фронце з 1942 г. Камандзір стралковага аддзялення сяржант Я. М. Целешаў вызначыўся ў верасні 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра на поўдзень ад Кіева. На чале групы байцоў пераправіўся цераз раку, захапіў плацдарм і ўтрымліваў яго да падыходу падмацавання. У баях на плацдарме ўдзельнічаў у адбіцці 10 варожых контратак. Да 1960 г. Я. М. Целешаў служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Жыве ў Мінску.

Строгі, падцягнуты, з бездакорнай ваеннай выпраўкай заходзіць ён у клас. Гледзячы на свайго настаўніка, вучні зайздросцяць яму, імкнуцца быць падобнымі на яго. А ён быў тады, у снежні 1941, калі прызвала Радзіма абараняць яе, амаль такім жа, як яны, васемнаццацігадовым. Перад вайной працаваў у калгасе «Працоўны селянін» Бялоўскага раёна на Кемераўшчыне, узначальваў камсамольскую арганізацыю калгаса (у Сібір сям'я выехала у 1926 г., калі яму было тры гады). Выпала маладому салдату стаць сувязістам. У чэрвені 1942 г. ён быў залічаны ва ўзвод сувязі 835-га стралковага палка 237-й стралковай дывізіі, якая фарміравалася ў Кузбасе. Баявое хрышчэнне полк прыняў на данской зямлі, пад Варонежам. І пайшоў з баямі па роднай зямлі, вымяраючы яе сталёвымі ніткамі тэлефонных правадоў, сувязіст, сціплы чорнарабочы вайны з катушкай кабелю і аўтаматам за плячыма. Восенню 1942 г. яму было прысвоена званне сяржанта. Храбры і кемлівы, ён невыпадкова першым з палка ў тую ж восень атрымаў медаль «За адвагу». Яго батальёну было загадана заняць важную вышыню, і, калі ворага выбілі з яе, цягнулі сувязісты катушку кабеля ад КП палка да камбата. А ноччу разведка праціўніка перарвала сувязь. Насланы разам з бай-

Я. М. Целешаў на занятках па агнявой падрыхтоўцы. Фотаздымак з вокладкі часопіса «Военные знания».

цамі аднавіць яе, сяржант Целешаў у цемрадзі наткнуўся на фашыстаў, уступіў з імі ў бой. Чацвёра гітлераўцаў былі забіты. А ў наступную ноч пайшлі сувязісты за варожым языком... Варонежскі фронт, Арлоўска-Курская дуга, 1-ы Украінскі. Сяржант Я. М. Целешаў — камандзір аддзялення сувязі, стралок. Не злічыць тых выпадкаў, калі сувязісту патрэбна было браць у рукі аўтамат. Яўген Міхайлавіч успамінае выпадак, які здарыўся летам 1943 г. каля вёскі Капусніцы. Камандзір роты паслаў яго з двума салдатамі цягнуць сувязь, а тут раптам фашысты наскочылі. Так і ўстанаўлівалі сувязь — з боем. Страляў сяржант з аўтамата, забіў у гэтым баі нямала фашыстаў. І новыя ўзнагароды заззялі на яго грудзях.

Яўгену Міхайлавічу давялося адчуць і горыч адступлення і асалоду такога хвалюючага слова «наперад!». Наступаў фронт, рушыў да Дняпра. Наша камандаванне загадала фарсіраваць Дняпро з ходу, 835-ы стралковы полк падышоў да ракі 23 верасня 1943 г. ў раёне сяла Гусеніцы, кіламетраў за пяцьдзесят на поўдзень ад Кіева. Шырыня Дняпра ў гэтых мясцінах да 600 м і болей. Яўген Міхайлавіч успамінае, як яго тэрмінова выклікалі ў блíндаж камандзіра палка.

— Вам, сяржант Целешаў,— сказаў падпалкоўнік,— важнае заданне. Загадваю сёння ноччу на чале групы разведчыкаў і сувязістаў пераправіцца на заходні бераг Дняпра. Пралажыць тэлефонна-кабельную лінію сувязі, захапіць плацдарм і ўтрымаць яго да падыходу асноўных сіл.

Яны старанна падрыхтаваліся. Дасканала праверылі зброю, тэлефонныя апараты. Кабель вырашылі ўзяць нямецкі, трафейны, воданепранікальны з хлорвінілавай аплёткай. Пагрузілі ўсё ў лодку, селі самі (акрамя Целешава на заданне ішлі яшчэ два сувязісты і два разведчыкі). На развітанне камандзір сказаў:

— Таварышы! Любой цаной патрэбны плацдарм і надзейная сувязь!

Пад покрывам ночы лодка рушыла на процілеглы бераг. Старанна працавалі весляры, сувязісты бясшумна разматвалі кабель. Начную цемру рвалі ракеты праціўніка. І вось фашысты заўважылі лодку і адкрылі па ёй шалёны агонь. Забіты адзін разведчык, параніла ў руку сувязіста. Прабітая кулямі і асколкамі лодка паволі напаўнялася вадой. Апошнія метры прыйшлося пераплываць, штурхаючы лодку перад сабой. Але вось і жаданы заходні бераг. Высокія тут дняпроўскія кручы, а над імі — лясок. Месца зручнае. Кабель паслухмяна кладзецца на дно. Вось падключаны ўжо тэлефонны апарат. З нашага берага прыняты загад: «Выбірайце месца, акопвайцеся. Дапамога прыйдзе».

Першымі малепькі плацдарм атакавалі фашысцкія самалёты. А на світанні з'явіліся варожыя бронетранспарцёры з пяхотай. Падтрыманыя артылерыйскім агнём з нашага берага, гераічна адбівалі бясконцыя атакі гітлераўцаў абаронцы плацдарма. Сюды на падручных сродках перапраўляліся нашы байцы. І ўсё ж ужо да вечара 24 верасня на плацдарме засталося толькі 7 абаронцаў. Сяржант Целешаў быў сярод тых, хто мужна адбіваў націск гітлераўцаў. А ноччу зноў прыбыло падмацаванне. 12 доўгіх сутак утрымлівалі нашы воіны плацдарм на Дняпры. За гэты час усе часці дывізіі здолелі фарсіраваць раку. Радзіма высока ацаніла подзвіг воінаў у бітве за Дняпро. У ліку адзначаных урадавымі ўзнагародамі быў і Я. М. Целешаў. Яму прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. А пасля былі яшчэ Вінніца і Жытомір, новыя баі і паходы. У красавіку 1944 г. Яўгена Міхайлавіча накіравалі на вучобу ў Кіеўскае вучылішча сувязі. А потым была служба ў Савецкай Арміі ў Адэскай ваеннай акрузе, у Ленінградзе. Калі прыйшоў

тэрмін дэмабілізацыі, вярнуўся ў родную Беларусь, пасяліўся ў Мінску. Працаваў тэхнікам сувязі на станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, зараз працуе выкладчыкам пачатковай ваеннай падрыхтоўкі ў сярэдняй школе № 82 г. Мінска.

Танкавы паядынак

Андрэй Міхайлавіч Усаў нарадзіўся ў 1917 г. ў в. Барсукі Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. З сялян. Член КПСС з 1941 г. Перад Вялікай Айчыннай вайной працаваў трактарыстам на Беларускай ДРЭС у г. п. Аранжэрэйск Аршанскага раёна. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З чэрвеня 1941 г. на Ленінградскім фронце — старшы сяржант, камандзір гарматы танка КВ. Вызначыўся пры абароне Ленінграда 19 жніўня 1941 г. Экіпаж танка, членам якога быў А. М. Усаў, знішчыў у гэтым баі 22 варожыя танкі і 200 салдат праціўніка. 98 выстралаў за гадзіну бою зрабіў са сваёй гарматы А. М. Усаў. Ордэнам Леніна адзначыла Радзіма яго ратны подзвіг. Аб гэтым небывалым танкавым паядынку пісалі ў тыя дні ўсе армейскія газеты. Расказваецца аб ім і ў кнігах «Танкі на вайне» маршала бранятанкавых войск П. А. Ротмістрава, «Танкісты ў баях за Радзіму» пад рэдакцыяй генерал-маёра М. Л. Дударэнкі і інш. Пасля Вялікай Айчыннай вайны служыў А. М. Усаў у Групе савецкіх войск у Германіі. У 1947 г. дэмабілізаваўся ў чыне маёра, працаваў у Дубровенскім раёне — выкладчыкам у школе, на партыйнай рабоце. У 1952 г. скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. У 1952—1960 гг. на партыйнай рабоце ў Талачыне. У 1960—1978 гг.— дырэктар Талачынскай нафтабазы. Узнагароджаны чатырма ордэнамі, медалямі. Ганаровы грамадзянін г. Ленінграда. Памёр 18.11.1986 г., пахаваны ў Талачыне.

Гэта было над Ленінградам у жніўні першага года вайны. Праціўнік у той час часта рабіў танкавыя рэйды ў глыбіню нашай абароны. Разведка паведаміла: такі рэйд вораг задумаў правесці і каля Краснагвардзейска (зараз Гатчына). Рота лейтэнанта З. Г. Калабанава (пяць цяжкіх танкаў КВ) атрымала загад любой цаной затрымаць фашысцкую калону. КВ былі на вагу золата. На фронт яны ішлі адразу з канвеера славутага Кіраўскага завода. Тут жа, на заводскім двары, камплектаваліся экіпажы — і ў бой. Беларуса Андрэя Усава прызначылі камандзірам гарматы на танк Калабанава.

Іх танк заняў баявую пазіцыю на невысокім укрытым густым алешнікам узгорку. З яго выдатна была відаць дарога, а справа і злева ад яго было топкае тарфяное балота. Выкапалі сховішча, надзейна замаскіравалі гармату. Прайшлі амаль чатыры цяжкія, поўныя напружання гадзіны. І вось на дарозе паказаліся матацыклісты. А за імі ўдалечыні слуп пылу — тая самая танкавая калона, якую яны чакалі. Варожыя танкі ішлі як пераможцы. На поўнай скорасці, люкі адчынены, на вежах расселіся салдаты.

Камандзір КВ нібы прырос да перыскопа. «Да бою»,— скамандаваў ён. Усаў быў гатовы. Загад «Агонь!» — і стрэл. Крыжасты танк нібыта спатыкнуўся, пайшоў бокам, спыніўся. Пачаўся бой, які потым стане яркай старонкай у гісторыі савецкіх бранятанкавых войск.

Пакуль немцы не апамяталіся, Андрэй з таварышамі падбілі другі танк і канчаткова спынілі рух калоны. А потым ўсё пайшло па загадзя прадуманым плане. Дакладны прыцэл, стрэл — і гарыць танк у сярэдзіне калоны, потым — другі. Зноў паварочваецца вежа КВ. Стрэл — і загараўся яшчэ адзін. Так частка танкаў аказалася адрэзанай. Астатнія павярнулі назад і трапілі пад агонь іншых экіпажаў.

Фашысцкія танкісты, якія апынуліся ў пастцы, паспрабавалі выбрацца з яе ў аб'езд. Але варта было ім звярнуць з дарогі, як гусеніцы правальваліся ў глыбокую твань. А тут і Усаў паспяваў за імі, страляў хутка, дакладна... І вось ужо полымем ахоплены шосты, сёмы крыжасты танк... На вежу КВ навялі свае гарматы фашысты. Некалькі снарадаў ужо трапілі ў яе. Але надзейная браня выратавала. Спрабавалі закідаць гранатамі і варожыя пехацінцы, але кулямёт Кісялькова касіў і касіў фашыстаў. А Усаў тым часам знішчаў іх танкі. Ужо больш дзесяці. Часцей пачалі трапляць і варожыя снарады ў вежу КВ. Адным з пападанняў выбіла камандзірскі перыскоп, другім — заклініла вежу. Стала немагчыма павесці на цэль гармату.

Калабанаў загадаў пакінуць сховішча. Як толькі яны выехалі, зноў з'явілася магчымасць навесці гармату. «Пяць градусаў управа... Дзесяць метраў наперад..» — загадаў Андрэй Усаў. І зноў гарэлі фашысцкія танкі. Усе снарады расстраляў старшы сяржант Усаў. Было загадана вярнуцца на зыходныя пазіцыі.

Танк спыніўся на лузе. Яны адкрылі люк — і ўбачылі неба. Счарнелыя і ачмуралыя ад парахавога дыму, варожых удараў па брані, пападалі на траву. Ляжалі амаль паўгадзіны перухома. А пасля з дапамогай аднапалчан адрамантавалі пашкоджаную вежу, атрымалі тры боханы хлеба — і зноў на перадавую, зноў у бой. Шмат было іх яшчэ ў танкіста А. Усава. Ен удзельнічаў у прарыве блакады Ленінграда, вызваляў Выбарг, Пскоў, Нарву, Тарту, Рыгу, браў Гданьск, Кёнігсберг, Расток... У цяжкія хвіліны дапамагала салдату думка аб тым, што ёсць і другі «Андрэй Усаў» — танк КВ, той самы камандзір-

А. М. Усаў. 1945 г.

скі, названы так у яго гонар. Так і дайшлі яны ўдвух да Перамогі.

З успамінаў А. М. Усава

Страшная вестка аб тым, што фашысты рушылі на нашу Радзіму, застала мяне на курсах камандзіраў цяжкіх танкаў у Ленінградзе. Аб далейшай вучобе, вядома, не магло быць і гаворкі. Усе слухачы, у аспоўным маладыя хлопцы, ірваліся ў бой.

І вось, нарэшце, атрымана накіраванне на фронт. Першы бой, памятаю, адбыўся 7 ліпеня 1941 г. На нас рушыла шэсць нямецкіх танкаў з дэсантам пяхоты. Вядома, мы хваляваліся, але страху не адчувалі: вельмі ж вялікая была наша нянавісць да ворага. Бой працягваўся пядоўга. На ржышчы, нібы факелы, палалі два нямецкія танкі, а астатнія павярнулі назад. Мы ж сталі распраўляцца з пяхотай, якая ў паніцы спрабавала схавацца ў жыце. Але нашы кулі даганялі ворага ўсюды.

Радасць першай перамогі акрыліла байцоў. А потым пайшлі дні, напоўненыя баямі, дні, калі траціцца ўяўленне аб часе. Вораг ірваўся да Ленінграда. Ужо даўно прайшлі апошнія тэрміны, якімі вызначала захоп і знішчэнне горада Леніна фашысцкае камандаванне. Ужо не адна дывізія знайшла магілу на подступах да горада, якому было суджана стаць горадам-героем. А ён усё жыў, жыў і змагаўся. Вось у гэтыя дні і адбыўся незабыўны бой, за ўдзел у якім я быў узнагароджаны ордэнам Леніна. У той душны і сняготны жнівеньскі дзень наш экіпаж уступіў у паядынак з танкавай калонай ворага. Сорак тры танкі налічыў у той калоне наш камандзір Калабанаў. У яго ўзнік вельмі смелы і адзіна правільны план: прарваць частку машын, потым запаліць першую і апошнюю і тым самым адрэзаць ворагу шлях да адступлення. План удаўся як нельга лепш.

Фашысты апынуліся ў «мяшку». Кожны наш снарад трапляў у цэль. Снарады праціўніка гулка бухалі па нашай брані, дробныя кавалачкі металу ўпіваліся ў рукі, твар. Гарачыня ў танку была страшэнная, пот засцілаў вочы. Але на ўсё гэта мы не звярталі ўвагі. У галаве было адно: не даць прайсці калоне, знішчыць як мага болей фашыстаў і іх танкаў. І мы выкапалі эагад. Яркімі факеламі палалі больш дваццаці варожых танкаў. 135 пападанняў было налічана ў нашым танку пасля гэтага паядынку. Але ў брані не было ні адной прабоіны — і людзі, і машына былі эроблены з такога трывалага матэрыялу, які быў фашыстам не па зубах.

А праз пекалькі дзён нас выклікалі ў штаб фронту, дзе і ўручылі ўзнагароды: камандзіру танка і старшаму механіку-вадзіцелю — ордэны Чырвонага Сцяга, малодшаму механіку і радысту — ордэны Чырвонай Зоркі, а мне — ордэн Леніна. Усе мы былі прыняты ў рады КПСС і працягвалі біць фашыстаў.

Арліная крыніца

Я многімі ў свеце паблукаў шляхамі,
А мейсца такога не бачыў нідзе —
Завуць тую месціну ўсе азярцамі,
Відаць, там праэрыстыя сэрцы ў людзей.

Працуюць, як пчолы мядовай парою,
Збіраюць здабыткі з калгасных палёў,
А колькі з іх выйшла сапраўдных герояў,
Праслаўленых сёння, маіх землякоў.

Сасновая, смольная, ціхая хата,
Пад вокнамі яблыні. Просты штакет.
А колькі з яе — узляцела крылатых,
Падумаеш, дзіўнае дзіва на свет,

Каб так у нябёсы імкнулі аддана,
Свае даганяючы мары і сны...

Сыноў, аж шасцёра — у Пляца Сцяпана,
З іх лётчыкаў храбрых — чатыры сыны.

Яны пакаралі прасторы ўладарна
І далей і вышэй узносіў іх час —
Кружылі над горамі льдоў Запаляр'я,
Адведвалі полюс паўночны не раз.

Іх бачылі ўсюды — па-над гарадамі,
Над буйнымі нівамі роднай зямлі,
А вораг ударыў — узляцелі арламі
І ворага нішчылі ўсе, як арлы.

Змагаліся мужна і катаў скарылі,
Не зналі спакою па днях і начах,
І, як галубы, сунімаючы крылы,
Пад родны, бацькоўскі, вярнуліся дах.

Віталі бацькі іх вясёлую вестку,
Што скончылі дзеці з праклятай вайной,
А двое прывезлі — дзвёх лётчыц-нявестак,
І кожная з зоркай, ды з залатой.

А сёння — шляхоў у герояў багата,
Хацеў бы, каб слова маё іх знайшло,
І, можа быць, вырастуць з іх касманаўты,
Ну, што ж, пажадаем, каб гэта было.

Сусвет раскрываецца ў далях прад імі —
У безлічы новых, міжзорных шляхоў,
Шчаслівы бацькі і шчаслівa Радзіма,
Што гэтакіх маюць дачок і сыноў.

1964 г. *Пятрусь Броўка.*

Сямёра дзяцей выхавалі ў сваёй дружнай сям'і калгаснікі з Азерцаў Наталля Майсееўна і Сцяпан Паўлавіч Пляцы. Чацвёра з іх, сыны Дзмітрый, Леанід, Іван і Міхаіл, сталі авіятарамі. У гады Вялікай Айчыннай вайны разам з Міхаілам і Леанідам змагаліся з ворагам і іх жонкі, лётчыцы, Героі Савецкага Саюза Руфіна Гашава і Раіса Аронава.

Нялёгкае і цікавае жыццё пражыў Сцяпан Паўлавіч Пляц, змагар, сапраўдны патрыёт сваёй Радзімы. «Бунтаўшчык» у 1905, абаронца маладой Рэспублікі Саветаў у гады Грамадзянскай вайны (на далёкім Урале са зброяй у руках змагаўся беларускі селянін супраць бандаў Калчака), адзін з першых членаў камуны «Набат», што была створана ў родных Азерцах. Потым разарваў межы ў першым азерацкім калгасе. Калі насталі суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны, Сцяпан Паўлавіч памагаў савецкім воінам чым мог. У Азерцах, на лесапільным заводзе, недалёка ад дома Пляцаў фашысты арганізавалі лагер для ваеннапалонных. Апошнім кавалачкам хлеба, апошняй бульбінай дзяліліся з вязнямі Сцяпан Паўлавіч і Наталля Майсееўна. Патрыёты выратавалі жыццё не аднаму ваеннапалоннаму. Потым Сцяпан Паўлавіч зрабіў злепак з ключа, якім адчыняліся адны з дзвярэй лагера. Па гэтым злепку ён зрабіў ключы і перадаў іх ваеннапалон-

Наталля Майсееўна і Сцяпан Паўлавіч Пляцы.

Сям'я Пляцаў. Стаяць злева направа: Леанід, Міхаіл, Анатоль. Сядзяць: Ніна і Іван.

ным. Другім бацькам стаў Сцяпан Паўлавіч для Льва Сямёнавіча Касенкі, ваеннага лётчыка, збітага фашыстамі ў 1941 г. і траіўшага ў палон. С. П. Пляц не толькі выратаваў яму жыццё, але і дапамог знайсці партызан. Перапраўляючы савецкіх салдат у партызанскія лясы, Сцяпан Паўлавіч наказваў: «Біце, мальцы, фашысцкіх гадаў, як мае сынкі!».

Сынкі... Першым з іх сям'і адкрыў «авіяцыйную лінію» Дзмітрый. У 1927 г. пакінуў ён родную вёску і паехаў вучыцца на лётчыка. З вядомымі савецкімі лётчыкамі Уладзімірам Какінакі, Ільёй Мазуруком і Валерыем Чкалавым рабіў ён першыя выпрабавальныя палёты на новых самалётах, служыў у далёкіх раёнах Сібіры, Забайкалля, Далёкага Усходу. Некалькі тысяч палётаў зрабіў Дзмітрый Пляц, пакрыўшы адлегласць больш як 2 мільёны кіламетраў.

Авіяцыя захапіла і другога брата, Леаніда. Яго настаўнікам стаў старэйшы брат. Вучань паказаў цудоўныя здольнасці. 1 жніўня 1933 г. ён здзейсніў першы самастойны палёт. У той дзень яму споўнілася 17 гадоў. На многіх тыпах самалётаў прыйшлося лятаць Леаніду Сцяпанавічу за 27 гадоў службы ў авіяцыі. Больш як 6 тысяч гадзін правёў ён у паветры, навучыў лётнай справе звыш 800 чалавек.

Авіяцыйнае вучылішча Грамадзянскага паветранага флоту, у якім у розны час вучыліся Дзмітрый і Леанід, скончыў і трэці брат, Іван. У 1935 г., развітаўшыся з сябрамі па Азерацкім лесазаводзе, паехаў ён асвойваць новую спецыяльнасць і за кароткі тэрмін стаў адным з лепшых авіяцыйных тэхнікаў у сваім падраздзяленні.

Вабіла прафесія братоў і чацвёртага — Міхаіла. Ён таксама паступіў у лётнае вучылішча і марыў трапіць у экіпаж да аднаго з братоў. Але яго мара не збылася. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. А на вайне ў кожнага з іх была свая лінія агню.

Дзмітрый сустрэў вайну на далёкім аэрадроме. Тут разам з Ільёй Мазуруком ён павінен быў працаваць на вялікай паветранай трасе, якая мела выключна важлае значэнне для забеспячэння фронту.

Сталінград, Курская дуга, Сандамірскі плацдарм — «зона дзеяння» Леаніда. І яшчэ — падрыхтоўка лётных кадраў для авіячасцей. Сотням юнакоў даў ён пуцёўку ў неба, храбра змагаліся з ворагам яго выхаванцы.

У лёгкім бамбардзіровачным палку служыў Міхаіл. 636 вылетаў зрабіў ён за час вайны. Вадзіў свой бамбардзіроўшчык над горнымі хрыбтамі Паўночнага Каўказа, граміў ворага ў Крыме, вызваляў родную Беларусь. Знішчыў 23 склады ворага, 30 аўтамашын, 2 пераправы, баржу з войскамі, шмат гармат, мінамётаў, пекалькі чыгуначных эшалонаў і тысячы гітлераўцаў.

На Волхаўскім фронце ваяваў тэхнік-лейтэнант Іван Пляц. Удзень і ўначы, у спякоту і ў стужу рыхтаваў ён баявыя машыны да палётаў. Абслужыў больш як тры тысячы баявых вылетаў. Лятаў на партызанскія аэрадромы рамантаваць самалёты, пашкоджаныя ў час палёту праз лінію фронту. Пад Ноўгарадам зрабіў 21 баявы вылет як штурман экіпажа.

За час вайны чатыры лётчыкі-браты зрабілі 2465 баявых вылетаў.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрый працягваў работу лётчыка-выпрабавальніка. Памёр у 1958 г. Леанід служыў у палярнай авіяцыі. Памёр ў 1981 г. Міхаіл скончыў Ваенна-паветраную акадэмію, працаваў у адным з штабоў ВПС. Памёр у 1979 г. У грамадзянскай авіяцыі ў Мінскім аэрапорце працаваў тэхнікам Іван Сцяпанавіч Пляц. Памёр у 1987 г.

Жонка Леаніда Пляца — Герой Савецкага Саюза Раіса Ермалаеўна Аронава. У гады Вялікай Айчыннай вайны на фронце з мая 1942 г. Лейтэнант, штурман, лётчык 46-га гвардзейскага Таманскага начнога лёгкабамбардзіровачнага жаночага авіяпалка. Здзейсніла 960 баявых вылетаў, скінула на ворага 120 тон бомбаў, выклікала 183 узрывы і 165 пажараў, знішчыла 2 склады з боепрыпасамі, 8 аўтамашын, 3 пражэктары, пашкодзіла 3 пераправы, падавіла агонь 4 артбатарэй, раскідала над тэрыторыяй праціўніка 500 тысяч лістовак. Ваявала на Паўночным Каўказе, Кубані, Тамані, у Крыме, Беларусі, Польшчы, Германіі. Да 1961 г. служыла ў Савецкай Арміі, маёр. Член Саюза журналістаў СССР (1979). Памерла 20.12. 1982 г.

Жонка Міхаіла Пляца — Герой Савецкага Саюза Руфіна Сяргееўна Гашава. У час Вялікай Айчыннай вайны з мая 1942 г. на Паўднёвым, Паўночна-Каўказскім франтах, у Асобнай Прыморскай арміі і на 2-м Беларускім фронце. Удзельніца вызвалення Паўночнага Каўказа, Кубані, Тамані, Крыма, Беларусі, Польшчы, баёў у Германіі. Штурман эскадрыллі 46-га гвардзейскага Таманскага начнога лёгкабамбардзіровачнага жаночага авіяпалка старшы лейтэнант Р. С. Гашава за час вайны здзейсніла 848 баявых вылетаў, скінула больш чым 123 тоны баявога грузу, знішчыла 6 артылерыйскіх і 2 кулямётныя кропкі, 11 аўтамашын з боепрыпасамі, склад з гаручым і склад з боепрыпасамі, пражэктар; падрыхтавала 15 маладых штурманаў. Пасля вайны да 1971 г. маёр Р. С. Гашава — старшы выкладчык Ваеннай акадэміі бранятанкавых войск імя Маліноўскага, старшы рэдактар Выдавецтва ваенна-тэхнічнай літаратуры. Жыве ў Маскве.

Васіны журналіст Сувораў пісаў: «Мы ведаем панфілаўцаў, краснадонцаў, Зою Касмадзям'янскую, Віктара Талаліхіна... І сярод тых, аб кім варта помніць,— Пляцы. Яны ішлі шэрымі, дымнымі, куранымі дарогамі вайны, трымаючы раўненне адзін на аднаго. Ішлі ўпэўнена, дзелавіта, не адбіваючы ўрачыстага шагу, і дайшлі да Берліна» (Старшина-сержант. 1966. № 8. С. 3).

З успамінаў Ніны Сцяпанаўны Бойка (Пляц)

Дружна жыла наша сям'я да вайны. Шмат працавалі, вучыліся, дапамагалі адзін аднаму ва ўсім. Моцная дружба і ўзаемавыручка, якая звязвала маіх братоў у дзяцінстве і юнацтве, надавала ім сілы і ў цяжкія мінуты і ў здзяйсненні вялікіх спраў. Да мяне, як адзінай у сям'і сястрычкі, у братоў былі асабліва пяшчотныя адносіны. А для мяне яны былі ўвасабленнем мужнасці і адвагі. Я заўсёды ганарылася імі, ды і ўся наша вёска імі ганарылася. Памятаю, як прыходзілі да нас усе аднавяскоўцы, ад малога да старога, калі прыязджаў дадому Дзмітрый, які першы ў нашай сям'і стаў лётчыкам яшчэ ў трыццатыя гады. Яго прыклад захапіў і астатніх братоў, яшчэ трое «захварэлі» авіяцыяй. І тут вайна!.. Перад вайной я працавала настаўніцай у Талачынскім раёне. Калі мой муж пайшоў на фронт, я з дваімі маленькімі дзецьмі пераехала да бацькоў. Колькі слёз выплакала мама, колькі бяссонных начэй правялі мае бацькі ў трывозе за сваіх сокалаў! Жылі мы каля самай шашы, па якой штодня рухаліся ў глыб нашай краіны бяда і смерць у злавесным абліччы фашыстаў. А тут яшчэ гітлераўцы пабудавалі побач з нашым домам лагер для ваеннапалонных. Тату прымусілі працаваць разам з вязнямі на лагерным заводзе. З болем і жалем расказваў ён дома пра здзекі гітлераўцаў над змарнелымі і змучанымі ваеннапалоннымі. Асабліва запаў яму ў душу адзін лётчык, Леў Касенка. Доўга выношваў тата план вызвалення. І вось ён даведаўся, што гітлераўскі атрад аховы збіраецца адзначыць нейкую ўрачыстасць. Па ўсёй вёсцы збіралі тады курэй для іх застолля. Дачакаўшыся, калі падагрэтыя «шнапсам» фашысты зацягнулі песню, тата пайшоў да лагерных варот. Цёмная, ветраная ноч была яго памочніцай. 28 чалавек, у тым ліку лётчыка Касенку, вызваліў тады бацька. Ды і ўся наша сям'я чым магла набліжала дзень Перамогі. Мы верылі, што яна прыйдзе, стараліся ўнушыць гэту веру астатнім. Мае браты-лётчыкі нічога не ведалі пра нас. І вось здзейснілася — нас вызваліла Чырвоная Армія. Аднойчы ў канцы лета 1944 г.

Дз. С. Пляц.

Я. Дз. Баркоўскі.

мы працавалі на калгасным полі. Раптам у небе з'явіўся самалёт. «Фашыст!» — жахліва закрычалі жанчыны і пачалі хавацца. А ў мяне сэрца радасна забілася,— а раптам гэта нехта з маіх братоў? Я разумела, што фронт адкаціўся ад нас на захад і гэты самалёт не мог быць фашысцкім. А лётчык усё кружыў і кружыў над вёскай, а пасля скінуў нейкі скрутачак акурат над нашым агародам і паляцеў. Кінулася я дадому. У скрутку паперы бала запіска, абкручаная вакол каменя: «Хто застаўся ў жывых, прашу паведаміць пра маіх бацькоў. У 4 гадзіны вярнуся з камандзіроўкі. Дзіма». У 4 гадзіны ён прызямліўся на аэрадроме ў Маціёве, у 5 гадзін быў дома. Колькі было радасці! Яму не верылася, што мы засталіся жывымі. Як не верылася і Міхаілу, які праз нейкі час прызямліўся на аэрадроме ў Болбасаве і дабраўся на машынах у Азерцы. Ведаючы, якія страшэнныя злачынствы тварылі ворагі на Беларускай зямлі, браты баяліся, што іх бацькі могуць заплаціць жыццём за тое, што далі сваёй краіне чатырох абаронцаў-лётчыкаў. А мы расказалі, колькі разоў за гэтыя гады смяротная небяспека кружыла над нашымі галовамі, колькі страху і здзекаў мы нацярпеліся. Яны слухалі нас і смяяліся, і плакалі. Плакалі ад болю за страту блізкіх, ад шчасця, што ўсе мы жывыя, а жудасная вайна канчаецца.

Слова пра сям'ю

Аляксандра Іосіфаўна Савік нарадзілася ў 1901 г. у в. Заднева Талачынскага раёна. У 1929 г. стала адным з першых членаў калгаса «Змагар за сацыялізм». Была лепшай звеніявой па вырошчванню льну, даяркай, брыгадзірам. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызанка брыгады М. П. Гудкова. Пасля вызвалення Талачыншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала першым паслява-енным старшынёй у сваім калгасе. У 1946 г. Аляксандра Іосіфаўна была выбрана дэпутатам у Вярхоўны Савет СССР 2-га склікання па Аршанскай выбарчай акрузе. Памерла А. І. Савік у 1981 г.

Аляксандра Іосіфаўна выхавала пяцёра дзяцей. Трое не сыноў — Браніслаў, Ягор і Альберт Баркоўскія — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, маюць узнагароды.

Браніслаў Даям'янавіч Баркоўскі нарадзіўся ў

А. Дз. Баркоўскі.

Б. Дз. Баркоўскі.

1920 г. Да вайны скончыў тэхнікум народна-гаспадарчага ўліку ў Мінску, Харкаўскае авіяцыйнае вучылішча штурманаў (1940). У званні малодшага лейтэнанта служыў штурманам на скарасным бамбардзіроўшчыку. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, вайсковая часць, у якой служыў Б. Баркоўскі дыслацыравалася ў Беларусі. Экіпажы скарасных бамбардзіроўшчыкаў у ліку першых уступілі ў бой з фашыстамі. Ляталі на бамбардзіроўку сколішчаў варожых войск і тэхнікі. З 1943 г. Браніслаў Дзям'янавіч служыў у звышчальнай авіяцыі. Баркоўскі абараняў неба Каўказа і нафтавыя промыслы ад налётаў варожай авіяцыі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны камандзіраваны ў Народную Рэспубліку Балгарыю ў якасці ваеннага саветніка ВПС. Пасля вяртання ўзначальваў штаб авіяпалка, быў аператыўным работнікам штаба дывізіі. Дэмабілізаваўся ў 1961 г. ў званні падпалкоўніка. Жыў і працаваў у Мінску. Памёр у 1986 г.

Ягор Дзям'янавіч Баркоўскі нарадзіўся ў 1922 г. Да вайны вучыўся ў школе, працаваў сакратаром Талачынскага народнага суда, скончыў спецыяльную школу пры Аршанскім аэраклубе. Але па стану здароўя лятаць не змог. У Вялікую Айчынную вайну быў партызанскім сувязным, потым партызанам брыгады Гудкова. Хадзіў у разведку, удзельнічаў у дыверсіях на чыгунцы. У 1943 г. ў Чырвонай Арміі на Калінінскім фронце ва ўзводзе палкавой разведкі. У лістападзе 1943 г. стаў членам КПСС, камсоргам стралковага батальёна. Прымаў удзел у вызваленні роднай Віцебшчыны, Прыбалтыкі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, медалём «За адвагу» і інш. У 1947 г. скончыў Смаленскае ваенна-палітычнае вучылішча. У 1956 г.— Ваенна-юрыдычную акадэмію. Амаль 30 гадоў аддаў службе ў Савецкай Арміі. Зараз Ягор Дзям'янавіч — палкоўнік запасу. Працуе выкладчыкам у сярэдняй школе № 14 г. Севастопаля.

Альберт Дзям'янавіч Баркоўскі нарадзіўся ў 1925 г. Яму ішоў шаснаццаты год, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Аднак ён нароўні з дарослымі прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху, стаўшы партызанам брыгады Гудкова. Быў разведчыкам, падрыўніком, удзельнічаў у разгроме варожых гарнізонаў на тэрыторыі Талачынскага, Лепельскага, Сенненскага раёнаў. Пасля вайны жыў і працаваў у Магілёве. Памёр у 1977 г.

З успамінаў Ягора Дзям'янавіча Баркоўскага

Нялёгкае дзяцінства выпала нам, траім братам. Бацька наш памёр ва ўзросце 27 гадоў. Нашай маме, Аляксандры Іосіфаўне, даводзілася і араць, і касіць, і жаць, быць лесарубам, і столярам, ды яшчэ і малых дзяцей выхоўваць. Бачачы яе гора, аднавяскоўцы стараліся хоць чым-небудзь дапамагчы, але зводзіць канцы з канцамі было цяжка. То не хапала хлеба, то бульба не радзіла. Таму калі ў 1929 г. па сходзе сялян нашай вёскі зайшла размова пра калгас, наша мама першая запісалася ў яго. «Змагар за сацыялізм» называўся наш калгас, з ім аднавяскоўцы звязвалі свае надзеі на лепшае жыццё. Мы, хлапчукі, працавалі ў калгасе з першых дзён — пасвілі кароў і авечак, вазілі вазы з сенам, ільном, збіралі яблыкі, старэйшыя аралі поле. Вялікую палёгку і радасць прынёс у нашу сям'ю новы тата — Савік Леў Васілевіч. Старэйшы сябра і дарадчык нам, надзейны памочнік маме, майстар на ўсе рукі — ён стаў для нас сапраўдным бацькам. А якія ланці ён майстраваў! Мы ганарыліся ім, хацелі быць падобным на яго ва ўсім. Наша сям'я павялічылася яшчэ на два чалавекі — нарадзіліся сястрычкі Валя і Нэля. Мы раслі, вучыліся, працавалі, «станавіліся на ногі». Сельская дзетвара рана становіцца дарослай. У камсамол мы ўступалі ў 14 гадоў. Мары ў нас былі смелыя і дзёрзкія. Але пачалася вайна. Уся наша шматлікая сям'я, нават самыя малыя, пайшла ў партызаны. Бацька, Леў Васілевіч, праявіў выдатныя адольнасці разведчыка і быў прызначаны начальнікам разведкі ў брыгадзе Гудкова. Не суджана было яму дажыць да Перамогі, Леў Васілевіч загінуў у цяжкім баі з гітлераўцамі ў лепельскіх лясах у 1944 г. Мама была поварам у адным з атрадаў, даглядала хворых і параненых, дзяцей, выконвала шмат іншых даручэнняў. Малодшы брат Альберт узрываў масты і чыгункі, хадзіў у разведку.

А маю ваенную біяграфію можна раздзяліць на партызанскую і франтавую. У 1943 г. пераадольваючы вогненныя заслоны ворага, мы пераходзілі лінію фронту. Не абышлося без цяжкасцей: я атрымаў раненне ў нагу. З дапамогай таварышаў падлячыўся, на самалёце быў адпраўлены ў тыл. Пасля кароткага знаходжання ў штабе партызанскага руху разам з вялікай групай партызан быў накіраваны ў дзеючую армію. З сябрам-аднавяскоўцам Ягорам Савікам мы трапілі ў адну з часцей Калінінскага фронту.

Памяць назаўсёды захавала тыя незабыўныя партызанскія дні і ночы. Асабліва запомнілася, як мы сустракалі Новы 1943 год. Цяжкае было тады становішча на фронце. Беларускі штаб партызанскага руху пасылаў адну за адной шматлікія рухомыя групы ў тыл ворага. У складзе адной з такіх груп былі я, Ягор Сцяпанавіч Савік і Аляксандр Гал-

кін (камандзір). У канцы лістапада 1942 г. мы прыбылі ў раён Гарадка Віцебскай вобласці. Вялі разведку, узрывалі машыны на дарогах, знішчалі сувязь, перадавалі важныя звесткі ў штаб. У апошнія дні снежня ўпартыя баі ішлі ў раёне Вялікіх Лук. Эшалон за эшалонам пасылалі туды гітлераўцы танкі, артылерыю, боепрыпасы. Чыгунка пільна ахоўвалася, на шляху партызан стаялі мінныя і драцяныя загароды, фашысцкія аўтаматчыкі, кулямёты, мінамёты. Шмат варыянтаў перабіралі мы ў тыя дні. Нарэшце вырашылі замініраваць чыгунку за 300 метраў ад бліндажа, у якім знаходзілася падраздзяленне аховы. Рызыка была вялікая, але снег, мароз, вецер, завіруха і лютая нянавісць да ворага былі нашымі саюзнікамі. Выйшаўшы пад вечар з вёскі Пальмінка, дзе знаходзіўся партызанскі атрад, наша група за 6 гадзін пераадолела шлях у 20 кіламетраў і выйшла да чыгункі. Мы паставілі пад палатно магутны фугас акурат у той час, калі гітлераўцы селі за стол, каб сустрэць новы, 1943 год. Мы залеглі ў полі метраў за 200 ад чыгункі і чакалі поезда. Паказаліся вартавыя, прыпынілі якраз насупраць міны. Нашы сэрцы скалануліся. А цягніка, як на бяду, усё не было. Добра, што завіруха хутка замяла нашы сляды, і гітлераўцы не маглі і падумаць, што каля самага іх логава партызаны сабраліся ўзарваць эшалон. Доўга праляжалі мы ў тую ноч на снезе, ад холаду не слухаліся рукі, не варушыліся пальцы на нагах, абутых у салдацкія бацінкі. І толькі перад самым досвіткам паказаўся парэшце цягнік. Я пацягнуў за шнур. Велізарнай сілы выбух асляпіў нас. Раздаўся лязг і стук металу. Хоць ногі дрэнна нас слухаліся, усё ж мы паспелі праскочыць пастрэльваемае месца. Ззаду застрачылі кулямётныя і аўтаматныя чэргі, сталі рвацца міны. К вечару 1 студзеня разведка далажыла, што наш фугас узарваў эшалон з танкамі. 46 танкаў было выведзена са строю, знішчаны адзін паравоз, другі пашкоджаны (фашысты выкарыстоўвалі двайную цягу для перавозкі цяжкага саставу). На некалькі сутак быў закрыты рух на чыгунцы Віцебск — Гарадок. Гітлераўскае падманаванне так і не трапіла на Велікалуцкі напрамак.

А хіба можна забыць тыя жнівеньскія дні 1942 г., калі я ў ліку іншых партызан суправаджаў групу жанчын, старых і дзяцей, якія па распараджэнню штаба партызанскага руху адпраўляліся за лінію фронту! Амаль сто чалавек рушылі ў дарогу праз лясы і балоты. Не магу без хвалявання ўспамінаць тыя тыдні нашага шляху. Нам прыходзілася прабівацца праз участкі чыгуначных і шашэйных дарог, якія ахоўваліся гітлераўцамі, пераадольваць водныя і іншыя перашкоды. Мы мянялі напрамкі руху, манеўравалі ў лесе, стараючыся адарвацца ад ворага. Не хапала верхняга адзення, абутку (многія пайшлі ў партызаны, у чым стаялі). Ногі стылі ў ледзяной балотнай вадзе. На прывалах саграваліся, прыціскаючыся адзін да аднаго. Спалі па 2—3 гадзіны ў суткі. І так на працягу цэлага месяца. На зыходзе чацвёртага тыдня мы выйшлі ноччу на пазіцыі Чырвонай Арміі. 300-кіламетровы шлях пераадолелі разам з намі пяцігадовая Валя, якую часта прыходзілася несці на сабе, і трынаццацігадовая Нэля. Усе партызанскія сем'і, што перайшлі лінію фронту, былі эвакуіраваны на Урал. Мама працавала ў Пермскай вобласці на заводзе. У родныя мясціны вярнулася адразу ж пасля вызвалення Беларусі летам 1944 г. Талачынскі райком партыі рэкамендаваў яе старшынёй калгаса. Да гэтай пары не перастаю адзіўляцца энергіі, вынослівасці, той жыццёвай сіле, сялянскай мудрасці, якімі валодала мама. Невялікага росту, кволага, на першы погляд, складу гэта жанчына здолела столькі вынесці, перажыць, столькі перарабіць сваімі рукамі, што хапіла б не на адно жыццё. Пасля вызвалення ад фашыстаў нашай зямлі ў калгасе ніякай маёмасці не засталося. Не хапала людзей. Дзесяткі жыхароў не вярнуліся ў вёску з вайны. У адну толькі вялікую сям'ю Савікаў акрамя нашага бацькі не вярнуліся яшчэ чатыры браты — Ануфрый, Іван, Лявон, Стас. У гітлераўскім засценку за сувязь з партызанамі загінулі брат мамы Ануфрый, яго жонка Еўдакія, іх дзеці Надзея, Ліда і Дарвін Казлоўскія. А тыя, хто выжыў, працавалі з усіх сіл. Патрэбны былі хлеб, мяса, малако, ды і засумавалі людзі па зямлі, па мірнай працы. Даяржава дапамагла калгасу

А. І. Савік з сынам Я. Дз. Баркоўскім і ўнукам Дзмітрыем. Здымак 1964 г.

насеннем, машынамі, і пайшла памалу гаспадарка на ўздым. І вось ужо на першых пасляваенных выбарах 1946 г. ў Вярхоўны Савет СССР галасуюць землякі за старшыню калгаса «Змагар за сацыялізм» Аляксандру Іосіфаўну Савік. І давялося маме вырашаць не толькі калгасныя, а і дзяржаўныя справы.

Калгас імя Дзімітрава, цэнтральная сядзіба якога размясцілася на месцы былога калгаса «Змагар за сацыялізм», аб'яднаў некалькі дробных гаспадарак. Магутная тэхніка працуе на яго палях, заможна жывуць калгаснікі, па сёлах праляглі асфальтаваныя дарогі, ганарацца вяскоўцы сваім Палацам культуры. Гледзячы на ўсё гэта, хочацца сказаць: «Не, не дарма столькі перажыта, столькі зроблена, столькі аддадзена маладых жыццяў за тваё шчасце, мая родная вёска Заднева!»

З плеяды адважных

П. С. Малашкевіч.

В. І. Сойка.

Пётр Сцяпанавіч Малашкевіч нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Забалацце Талачынскага раёна. Працаваў настаўнікам у в. Рыжычы. З 1940 г. курсант ваенна-інжынернага вучылішча. З восені 1941 г. на фронце, ад'ютант 559-га асобнага сапёрнага батальёна 299-й стралковай дывізіі 50-й арміі, потым начальнік штаба, камандзір 212-га асобнага сапёрнага батальёна. Пасля вайны падпалкоўнік запасу П. С. Малашкевіч працаваў старшынёй калгаса ў в. Забалацце, дырэктарам нарыхтоўчай канторы, старшынёй выканкома Пяровалачнянскага сельсавета. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і 6 медалямі. Цяпер на пенсіі, жыве ў г. п. Багушэўск Віцебскай вобл.

Положение 50-й армии становилось все сложнее. Когда вторая танковая группа фашистов захватила Орел, повернув левое свое крыло к Брянску, а их четвертая полевая армия, двигавшаяся со стороны Рославля, направила один из ударов на Болхов, над нашими частями и соединениями, сражавшимися на Брянском фронте, нависла угроза рассечения и окружения. Но, несмотря на смертельную угрозу с тыла, дивизии 50-й армии сдерживали вражеские атаки на Десне вплоть до получения приказа об отходе на восток.

И вот снова Десна. Только теперь мы не врываемся с боем на западный берег, а покидаем его. Ворвавшись первыми, покидаем последними. Вот прошел по мосту на восток замыкающий. Проверены заряды в фермах и опорах моста, вставлены взрыватели. Еще раз осмотрен каждый метр электрических проводов, тянущихся под мостом к берегу, где в кустарнике отрыт окопчик для подрывной станции, охраняемый двумя часовыми.

Собственно, можно взорвать мост и сейчас. Но нет, напоследок мы еще «угостим» фашистов! Мы лежим втроем: адъютант батальона Петя Малашкевич, старший лейтенант Николай Николаев и я. А где-то за рекой притаились гитлеровцы... Кругом такая тишина, словно нет никакой войны и Малашкевич учится на агронома, чтобы сделать плодородными не щедрые, но такие родные земли Белоруссии, а Николаев, тульский лесничий, планирует новые посадки, а я... Нет! Война здесь, рядом. И нет ни лесничего, ни агронома, ни инженера. Есть три солдата, которые сейчас взорвут красавец мост, чтобы отправить на дно Десны чужих солдат — насильников и грабителей.

Туман над Десной еще не поднялся, как из-за леса послышался рокот моторов. У моста мотоциклисты остановились, дали несколько автоматных очередей вдоль пролетов и по нашему берегу; не получив ответа, они на предельной скорости проскочили мост. Двое, не задерживаясь, устремились к Жуковке, а один, уже спокойно проехав по мосту в обратном направлении, прибавил газ лишь на берегу.

Малашкевич сорвал с груди автомат.

— Ты что?! — крепкая рука Николая стиснула локоть адъютанта.— Он спешит предупредить своих, что дорога свободна!

Тот действительно спешил. Все они спешили, потому что уже через десять минут к мосту приблизилась колонна танков и бронемашин. Восседавшие на броне солдаты радостно гоготали, указывая на уцелевший мост: видно, правда красным совсем капут, раз даже мосты оставляют.

А когда весь мост, от берега до берега словно застонал под тяжестью вражеской колонны, мощные взрывы подняли в воздух фермы куски опор, целые танки и танки с сорванны-

ми гусеницами, чтобы похоронить все это в водах Десны.

И хотя сами же мы условились, что без единого выстрела отойдем в лес, как только выполним приказ о взрыве,— не выдержали. Мы поливали свинцом тех, кто пытался выбраться, и добивали этих барахтавшихся в воде солдат — нет, не солдат, фашистов,— пока в дисках не осталось ни одного патрона.

Прощай, Десна! Прости, что уходим. Прости, что осквернили воды твои этой падалью. Так было нужно. Для того, чтоб мы скорей вернулись.

Друкуецца па кн.: Максимцов М. Д. Дорогами мужества. Тула, 1966. С. 28—30.

Суровы і светлы лёс

Ён толькі на год маладзей Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як і яго суседзі, працаваў на розных работах у калгасе. Затым стаў брыгадзірам. У верасні 1938 года Васіль Ільіч Сойка быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. І не гадаў, не думаў юнак, што дадому, у родныя Ільяне, давядзецца яму вярнуцца толькі праз сем доўгіх гадоў, прайшоўшы праз пекла самай жудаснай за ўвесь перыяд існавання чалавецтва вайны, якая навек накладзе на яго свой адбітак.

Халодны Петсама (зараз Печанга Мурманскай вобласці), побач — граніца з Нарвегіяй. Сюды быў накіраваны пасля кароткай вучобы памочнікам камандзіра стралковага ўзвода Васіль Сойка. Тут яго і застала вайна. Ужо 22 чэрвеня 1941 года ўзвод, у якім служыў Сойка, прыняў бой з гітлераўцамі. Потым адступленне, доўгая і ўпартая абарона. Праз чатыры месяцы Васіль Сойка атрымаў званне малодшага лейтэнанта, потым лейтэнанта, стаў камандзірам роты аўтаматчыкаў.

Бясконцыя, цяжкія франтавыя дарогі, баі, у якіх гінулі таварышы, лютая нянавісць да азвярэлага ворага кідала лейтэнанта Сойку ў самае пекла вайны. Сваю першую баявую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі — бясстрашны камандзір аўтаматчыкаў атрымаў за ўзяцце «языка», які даў каштоўныя звесткі. Ордэн Чырвонага Сцяга атрымаў за тое, што вынес з акружэння і збярог баявы сцяг палка. Гэты ордэн Васіль Сойка атрымаў у горадзе Рыбінску Яраслаўскай вобласці непасрэдна з рук Маршала Савецкага Саюза К. А. Мерацкова. За ўзяцце горада Кіркенеса ў Паўночнай Нарвегіі лейтэнант Сойка быў удастоены ордэна Айчыннай вайны I ступені.

Кожная аперацыя, кожны бой даваліся яму нялёгкай цаной, нярэдка са смяртэльнай рызыкай для жыцця, хоць на фронце смерць пастаянна кружыла над кожным байцом. Чаплялі кулі, асколкі мін, снарадаў і Васіля Сойку. Шэсць разоў быў паранены, але падлечваўся і зноў вяртаўся ў строй, да сваіх баявых таварышаў. Карэльскі, 2-і Беларускі франты. Сотні кіламетраў пройдзеных франтавых дарог і пастаянная небяспека. Калі грамілі праціўніка ў Памераніі, Васіль Сойка быў цяжка паранены ў апошні, сёмы, раз, у выніку чаго страціў руку. Гэты бой для яго асабліва памятны.

...Вакол грымела ад няспынных кулямётных чэргаў, да якіх неўзабаве далучыліся і выбухі варожых мін. Батальён прыпаў да зямлі. Калі асцярожна ўзняць галаву, можна было ўбачыць за векавымі дрэвамі пустынную раўніну, воддаль, ледзь прыкметны воку, ляжаў польскі горад Данцыг. Яго і трэба было ўзяць. А тут перашкады прыпынак з-за шчыльнага агню праціўніка.

Камбат, які ляжаў побач, працягнуў лейтэнанту Сойку бінокль.

— Бачыш дот? Падымі аўтаматчыкаў, каб гэты агнявы пункт больш не перашкаджаў нам.

— Слухаюся,— толькі сказаў Сойка.

І вось група аўтаматчыкаў на чале з лейтэнантам стала асцярожна прабірацца да жалезабетоннага дота, які паліваў свінцом нашых байцоў. Падаўзлі непрыкметна і, калі да дота заставалася некалькі дзесяткаў метраў, закідалі яго процітанкавымі гранатамі. Дот змоўк.

Кароткімі перабежкамі вярталіся да сваіх. І тут нібы звар'яцелі варожыя мінамётчыкі, засыпаючы ўсё вакол мінамі. Тут жа з цяжкім грукатам разарваўся артылерыйскі снарад. Лейтэнант Сойка быў кінуты на зямлю гарачым струменем паветра, нібы паляцеў у бяздонне.

Калі Сойка апрытомнеў, то адчуў няцерпімы боль у правым плячы. Паглядзеў — рукі няма. З найвялікшымі пакутамі, стрымліваючы крык, гатовы вырвацца ад пякучага болю, метр за метрам пераадольваў ён, дабіраючыся да ўкрыцця...

На гэтым вайна для Васіля Ільіча Сойкі скончылася. Доўга лячыўся ў шпіталі і дадому вярнуўся толькі напярэдадні Дня Перамогі.

У вёсцы Ільяне быў адноўлены калгас, і В. І. Сойка стаў яго першым старшынёй. Нялёгка было, зразумела, але так прагла сэрца зноў убачыць свой родны край квітнеючым. І Васіль Ільіч працаваў, не ведаючы стомы. Аднаўляўся, мацнеў калгас, які тады назы-

наўся «VII з'езд Саветаў». Ужо сталі больш калгаснікі атрымліваць на працадзень, загучалі песні ў вясковых хатах.

Толькі ж нядоўга давялося Васілю Ільічу быць старшынёй. Запылі раны, і ён вымушаны быў зноў класціся ў шпіталь, лячыцца. Пасля пайшоў працаваць у лясгас. Спачатку быў лесніком, потым скончыў лясны тэхнікум у Барысаве і стаў тэхнікам-лесаводам.

У святочныя дні, асабліва такія, як Дзень Перамогі, прымацоўвае В. І. Сойка да піджака свае ўзнагароды: тры баявыя ордэны, а таксама ордэны Кастрычніцкай Рэвалюцыі і «Знак Пашаны», якія атрымаў ужо ў мірны час. У лесе, абаронцам і сябрам якога стаў Васіль Ільіч, добра думаецца пад аднастайны пошум хвой, нагадваецца многае з перажытага. Пад наглядам і кіраўніцтвам В. І. Сойкі пасаджаны сотні гектараў новых лясоў. Шумяць яны, нібы спяваюць гімн руплівым рукам чалавека, воіна і працаўніка.

С. Драгоўскі.

На баявым посту

З успамінаў М. С. Яскевіч

М. С. Яскевіч.

І. І. Цюніс.

Марыя Сцяпанаўна Яскевіч нарадзілася ў 1919 г. ў в. Бушмін Талачынскага раёна. Сястра Героя Савецкага Саюза М. С. Камельчыка. Скончыла Аршанскі чыгуначны тэхнікум у 1940 г. З 1942 г. на Сталінградскім, Данскім франтах, з 1943 г. на Заходнім, пазней на Першым Беларускім фронце, ст. сяржант, начальнік поста паветранага назірання, апавяшчэння і сувязі 103-га асобнага батальёна. Скончыла вайну ў Германіі. З 1945 г. працавала ў Кунцаве Маскоўскай вобл., потым у Смаленску. Цяпер на пенсіі. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За перамогу над Германіяй», «Ветэран працы» і інш. Жыве ў Смаленску.

Пасля сканчэння чыгуначнага тэхнікума ў Оршы ў 1940 г. я была накіравана на работу на Львоўскую чыгунку, дзе працавала на станцыі Львоў-Галоўны. У першыя дні вайны нам, камсамольцам, выдалі зброю і мы ахоўвалі паваротны круг, каб забяспечыць рух воінскіх эшалонаў. Калі ў горад уварваліся нямецка-фашысцкія захопнікі, мы разам з савецкімі войскамі пакінулі горад і пайшлі да станцыі Цярнопаль. Тут мы селі ў цягнік, каб даехаць да Кіева і знайсці сваё ўпраўленне дарогі. У гэты час у вагон увайшлі ваенныя і спыталі: «Хто мае права быць дзяжурным на станцыі? Трэба на станцыі Цярнопаль адпраўляць цягнікі». Я і яшчэ двое засталіся ў горадзе і працавалі да таго часу, пакуль у горадзе не паявіліся нямецкія танкі. Мы павінны былі пайсці да Кіева. Аднак нам паведамілі, што ўпраўленне знаходзіцца ў Харкаве, мы селі ў эшалон і прыбылі туды. З Харкава нас эвакуіравалі ў Расію, дзе працавалі на станцыі Нікель Арэнбургскай чыгункі. Праз нейкі час я падала ў Орскі гарваенкамат заяву з просьбай адправіць мяне на фронт. Мне сказалі, што трэба пачакаць. Я працавала па сваім месцы, а пасля дзяжурства ішла ў шпіталь і там дапамагала выносіць з эшалонаў параненых савецкіх воінаў. У красавіку 1942 г. ў другі раз напісала заяву ў ваенкамат з аналагічнай просьбай. На гэты раз заяву маю разгледзелі, і я была залічана ў вучэбную роту ў г. Камышын Сталінградскай вобл. Пасля вучобы нас накіравалі на посты паветранага назірання, апавяшчэння і сувязі ў 103-і асобны батальён. Неўзабаве мяне прызначылі начальнікам поста. На Сталінград-

Дзяўчаты-зенітчыцы перад адпраўкай на Радзіму летам 1945 г. Горад Шнайдэмюль, Германія.

скім фронце знаходзілася да кастрычніка 1942 г., потым наш батальён перадыслацыравалі на Данскі фронт, дзе я была да сакавіка 1943 г.

Прыгадваецца выпадак з маёй баявой службы пад Сталінградам. Наш пост назірання, апавяшчэння і сувязі пастаянна сачыў за самалётамі, і пра любое іх паяўленне адразу паведамляў камандаванню. Аднойчы ў паветры з'явіліся нашы самалёты ЛІ-2, але ляцелі яны не так, як звычайна. Па палёце самалётаў мы зразумелі, што вядуць іх не савецкія лётчыкі. Перадалі свае назіранні камандаванню. У гэты час самалёты пайшлі на зніжэнне і пачалі бамбіць пазіцыі савецкіх войск. Па нашаму данясенню зенітчыкі адкрылі агонь, самалёты былі збіты. Высветлілася, што ў іх ляцелі нямецкія экіпажы. Пасля бою ўсім нам камандаванне аб'явіла падзяку. Кемлівасць на фронце даводзілася праяўляць шмат разоў. Такая ў нас была служба. Мы добра ведалі ўсе тыпы самалётаў, якія ўдзельнічалі ў баях. Наш камандзір роты гаварыў, што добры наглядальнік па выгляду аднаго крыла, хваставога апярэння ці шасі павінен вызначыць, які гэта самалёт. Прыходзілася вучыцца самой і вучыць сваіх падначаленых. У сакавіку 1943 г. наш батальён быў пераведзены на Заходні фронт (пазней увайшоў у састаў 1-га Беларускага фронту). Мне давялося ўдзельнічаць у вызваленні роднай Беларусі. Закончыла вайну ў Германіі ў 1945 г.

Сваю задачу мы выканалі

З успамінаў І. І. Цюніса

Іван Ісакавіч Цюніс нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Пярэвалачня Талачынскага раёна. У 1941 г. скончыў ваеннае вучылішча зенітнай артылерыі. У званні лейтэнанта быў накіраваны ў Ленінградскую ваенную акругу ў асобны зенітна-артылерыйскі дывізіён камандзірам узвода разведкі і кіравання батарэі. Тут яго і застала Вялікая Айчынная вайна. Скончыў курсы камандзіраў дывізіёнаў пры Ваеннай артылерыйскай акадэміі і Артылерыйскую акадэмію (1947). Да 1964 г. на камандных пасадах у Далёкаўсходняй і Беларускай ваеннай акругах. Зараз падпалкоўнік запасу І. І. Цюніс жыве і працуе ў Віцебску. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

16 чэрвеня 1941 г. наша батарэя ў раёне Ладажскага возера выконвала баявыя стрэльбы па паветраных цэлях. 22 чэрвеня быў выхадны дзень, мы адпачывалі, праводзілі спаборніцтвы па стральбе, здавалі нормы на значок ГПА. У 12 гадзін у лагеры завыла сірэна, была аб'яўлена баявая трывога. На кароткім мітынгу мы даведаліся, што пачалася вайна. Нам было загадана зняцца з пазіцый і адправіцца ў размяшчэнне сваіх часцей. Над баявымі парадкамі нашых войск сталі лятаць самалёты праціўніка, яны вялі разведку, штурмавалі і наносілі бомбавыя ўдары. Наша батарэя пры ўзаемадзеянні са знішчальнай авіяцыяй вяла агонь па фашысцкіх самалётах і днём, і ноччу. На трэці дзень вайны мы мелі на сваім рахунку збітыя варожыя самалёты. Нас ставілі ў прыклад. На батарэю прыязджаў нават карэспандэнт газеты «Правда» Руднеў. Ён быў відавочцам таго, як мы выявілі ў небе варожы самалёт, як адкрылі па ім агонь і чацвёртым залпам збілі. Аб гэтым Руднеў напісаў заметку «На зенітнай батарэі» (Правда. 1941. 7 ліп.). У сярэдзіне ліпеня на батарэю прыбыў кінарэпарцёр, каб зняць момант збіцця самалёта праціўніка. Ён днём і ноччу дзяжурыў з намі. І вось разведчык далажыў, што з боку Выбарга ляцяць тры Ю-87. Як толькі яны паказаліся з-за лесу, нашы гарматныя разлікі адкрылі агонь. Каля аднаго самалёта разарваўся снарад, самалёт загарэўся. Гэты снарад быў выпушчаны разлікам старшага сяржанта Капранава, за што яго ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга, а кінарэпарцёр зняў жаданы момант на плёнку.

Пасля цяжкіх абарончых баёў наша дывізія вымушана была адступіць. У верасні атрымалі загад прыкрываць адыход нашых войск. Гэта быў самы цяжкі перыяд — мы не заўсёды мелі надзейную сувязь, не ведалі часам, хто у нас справа, хто злева. У апошнія дні верасня 1941 г. батарэя выйшла ў раён Сестрарэцка, дзе нас сустрэў камандзір і начальнік штаба дывізіёна. Колькі было радасці! Нас, аказваецца, лічылі загінуўшымі. Батарэя атрымала новае заданне: прыкрываць штаб дывізіі, аэрадром і войскі ўмацаванага раёна. Пачаліся цяжкія дні — мы апынуліся ў зоне блакады Ленінграда. У снежні 1941 г. наш дывізіён быў перакінуты ў раён Ціхвіна, 150 км рухаліся сваім ходам, па моцным марозе, прыйшлося пераадолець адзін з маршрутаў «дарогі жыцця» праз Ладажскае возера. У назначаным месцы наша батарэя прыкрывала станцыю забеспячэння 4-й арміі. Тут акрамя вядзення стральбы па самалётах праціўніка нам прыйшлося ноччу змагацца з асвятляльнымі бомбамі. Сваю задачу мы выканалі — нягледзячы на ўсе намаганні, праціўнік не здолеў вывесці са строю дзеючых станцыю забеспячэння.

Камандзірская сям'я

Ф. І. Макаранка.

П. І. Макаранка.

Мікалай Іванавіч Макаранка.

Міхаіл Іванавіч Макаранка.

У Івана Мацвеевіча і Серафімы Аляксееўны Макаранкаў было сямёра дзяцей: чатыры сыны і тры дачкі. У цяжкі час раслі яны ўсе. Як ні стараліся бацькі, а з беднасці было не вырвацца. У канцы 1920-х гадоў, калі пачалі арганізоўваць першы ў вёсцы Байкал калгас «Энергія», засвяціла надзея на лепшае жыццё. Шэсць сямей беднякоў з Пярэвалачні, у т. л. Макаранкі, пайшлі ў суседнюю вёску з занвамі, каб і іх далучылі да калектыўнага гаспадарання. Працавалі з энтузіязмам, радасна. А калі арганізаваўся калгас у Пярэвалачні, Іван Мацвеевіч перайшоў сюды, у родную вёску. Падраслі дзеці. Дочкі дапамагалі маці па гаспадарцы, старэйшая — Аня — пайшла ў калгас даяркай. Усё жыццё на ферме і працавала. Сыны ж, як большасць хлопцаў перадваеннага пакалення, марылі быць ваеннымі, абараняць Радзіму.

Сыны

Фёдар і Міхаіл у Чырвоную Армію пайшлі разам, у 1934 годзе. У іх былі розныя гады нараджэння: у Фёдара 1912, у Міхаіла — 1915. Але Міхаілу ніяк не хацелася адставаць ад брата і ён таксама пайшоў у ваенкамат. А каб не адмовілі, падаў дакументы на вызначэнне узросту (метрыкі, як растлумачыў, «згубіў»). Хлопец ён быў высокі, ладны, і яму вызначылі той жа год нараджэння, што і ў Фёдара — 1912. Вось так яны сталі «блізнятамі». Служылі на Далёкім Усходзе.

Перад вайной Міхаіла перавялі ў Беласток. Тэхнік-інтэндант 2-га рангу Міхаіл Іванавіч Макаранка быў прызначаны камандзірам роты 265-й стралковай дывізіі. У чэрвені 1941 г. Міхаіл апошні раз пабываў у родным доме. Вайна перапыніла адпачынак... Макаранка адразу ж паехаў у часць. Шлях яго быў цяжкім і складаным — камандзір ехаў насустрач акупантам. Пасля доўгіх блуканняў сваю родную часць усё ж знайшоў. Далейшы шлях ляжаў на Ленінградскі фронт. 23 снежня 1941 г. Міхаіл Іванавіч Макаранка па-геройску загінуў каля вёскі Малое Мапушкіна Ленінградскай вобласці...

Фёдар у 1935 г. скончыў радыётэлеграфную школу ў Хабараўску. Быў пачальнікам радыёстанцыі на Камчатцы. Старшына Ф. І. Макаранка — удзельнік вызвалення Курыльскіх астравоў. Да 1952 г. знаходзіўся на службе ў арміі. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі. Памёр 9 мая 1968 г.

* * *

...Самы старэйшы з сыноў, Піліп, нарадзіўся ў 1906 г. У Чырвонай Арміі з 1928 г. У 1933 г. скончыў артылерыйскае вучылішча. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг.

Айчынная вайна застала П. І. Макаранку на Карэльскім фронце. З красавіка 1942 г. па ліпень 1943 г. ён — намеснік камандзіра, камандзір асобнага зенітнага артдывізіёна. Яго дывізіён прыкрываў чыгуначную станцыю Надвойцы і адзін з шлюзаў Беламорканала. Пашкоджанне шлюза прывяло б да размыву чыгуначнага палатна, і выгрузка нашых войск на станцыі была б пад пагрозай. Таму так пільна сцераглі неба зенітчыкі. Толькі за адзін дзень яны збілі 3 варожыя самалёты.

П. І. Макаранка — удзельнік Курскай бітвы. За ўдзел у ёй быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Потым П. І. Макаранка ваяваў на 3-м Украінскім фронце, быў намеснікам камандзіра зенітна-артылерыйскага палка. Удзельнік Яска-Кішынёўскай аперацыі. Пры наступленні полк прыкрываў танкавую брыгаду і вёў баі ў раёне г. Чадыр. Прамой наводкай была знішчана вялікая колькасць варожых танкаў, гармат і пяхоты. За умелыя баявыя дзеянні па знішчэн-

ню працiўніка Макаранку было прысвоена званне падпалкоўніка.

Са снежня 1944 г. П. І. Макаранка ўзначаліў разведку 3-й Нікапальскай зенітна-артылерыйскай дывізіі, якая ўдзельнічала ў вызваленні Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Венгрыі, вяла цяжкія баі за вызваленне Будапешта.

Дэмабілізаваўся П. І. Макаранка ў 1946 г., пэўны час працаваў на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Кіеўскай вобласці і Мінску. З 1952 г. працягваў службу ў Беларускай ваеннай акрузе. У 1955 г. выйшаў у адстаўку. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў Мінску.

* * *

...Мікалай Іванавіч Макаранка нарадзіўся ў 1918 г. Перад вайной скончыў артылерыйскае вучылішча. З жніўня 1941 г. на Волхаўскім фронце. У раёне г. Чудава Наўгародскай вобласці камандзір узвода М. І. Макаранка атрымаў раненне. Пасля шпіталю ў студзені 1942 г. Мікалай Іванавіч зноў на Волхаўскім фронце.

З сакавіка 1943 г. старшы лейтэнант М. І. Макаранка ў складзе 1476-га гаўбічнага артпалка 14-й артдывізіі ўдзельнічаў у баях на Заходнім фронце ў раёне Юхнава і Масальска. У жніўні 1943 г. ў званні капітана прыбыў у 1179-ы знішчальны супрацьтанкавы артполк рэзерву галоўнакамандавання 11-й арміі. У жніўні 1943 — сакавіку 1944 г. ўдзельнічаў у вызваленні Бранскай і Гомельскай абласцей.

Цяжкія кровапралітныя баі вёў полк у верасні 1944 г. пры вызваленні Латвійскай ССР. У раёне г. Добеле стварылася пагроза выхаду працiўніка ў тыл нашай 6-й гвардзейскай арміі. 17 верасня 1179-ы полк заняў абарону па адной з вышынь. Становішча было надзвычай складанае. Без падтрымкі пяхоты, пагарджаючы смерць, артылерысты ва ўпор расстрэльвалі насядаючыя на батарэі танкі і пяхоту працiўніка. Гэта былі страшныя і жорсткія баі. Ранілі камандзіра палка Юсупава, яго намесніка капітана Старадубцава. Быў забіты камандзір 4-й батарэі капітан Кулікоў. Афіцэры і салдаты палка змагаліся да апошняга снарада, патрона, гранаты. 20 верасня М. І. Макаранка быў цяжка паранены.

Вайна для яго скончылася. Далей былі шпіталі, інваліднасць. У пасляваенны час (да 1959 г.) М. І. Макаранка працаваў на гаспадарчай і партыйна-савецкай рабоце ў Талачынскім раёне. У 1965—1966 гг. на гаспадарчай рабоце ў Мінскім АК КПБ. з 1968 да 1981 — рэдактар выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Жыве ў Мінску.

З загада 6-й гвардзейскай арміі № 070/Н

ад 8 кастрычніка 1944 г.

Капитан Макаренко Николай Иванович, будучи начальником разведки полка в бою за высоту 91.7 17—20.9.1944 проявил себя смелым, решительным, отважным офицером. Под сильным огнем танков и артиллерии противника умело лично организовал оборону артиллеристов. Вдохновляя бойцов на подвиги, личным примером отваги руководил бойцами в бою с яростными атаками пехоты и танков противника. Все атаки противника были отбиты.

До получения тяжелого ранения, не щадя жизни, под сильным огнем противника помогал активно руководить обороной, в результате чего удержана высота, господствующая над всей местностью...

Командир 1179 истребительно-противотанкового артиллерийского Гомельского полка РГК подполковник *Юсупов*.

Бой на Нэйсе

З успамінаў Аркадзя Іларыёнавіча Разанцава, жыхара г. Талачына

Летам 1943 года я быў цяжка паранены. Восем месяцаў правёў у шпіталях, яшчэ тры ў рэзерве і толькі ў жніўні 1944 года быў адкамандзіраваны ў распараджэнне галоўнакамандуючага Войска Польскага маршала М. Жымерскага. Мяне прызначылі камандзірам батарэі 3-га армейскага мінамётнага палка 2-й Польскай арміі.

У першай дэкадзе красавіка 1945 года польская армія на 40-кіламетровым фронце на р. Нэйсе змяніла савецкія войскі, якія часова трымалі абарону. Наш дывізіён размясціўся насупраць г. Ротэнбург на стыку 2-й Польскай і 52-й армій 1-га Украінскага фронту. Немцы заўважылі змену. Яны ведалі, што польская армія мае невялікі вопыт вайны, таму вырашылі ноччу атакаваць нашы пазіцыі. Паколькі рыхтавалася агульнае наступленне ад Балтыкі да Карпат, была дадзена каманда пры выяўленні руху з боку немцаў агонь не адкрываць. Нашы пазіцыяльнікі заўважылі нейкую мітусню каля ракі, але думалі, што гэта нашы разведчыкі-танкісты, што прыбылі ў размяшчэнне дывізіёна напярэдадні, шукаюць брод для танкаў. А гэта былі немцы. Яны закідалі нашы пазіцыі гра-

А. І. Разанцаў (у цэнтры) з баявымі сябрамі.

натамі і ўварваліся ў адну з траншэй. Каб адсекчы падыходзячыя варожыя рэзервы, я выклікаў агонь на сябе. У кароткай схватцы знішчылі гітлераўцаў, якія прарваліся ў траншэю. Праз паўгадзіны атака ворага паўтарылася. У тую ноч немцы пяць разоў атакавалі траншэю, дзе былі два камандна-назіральныя пункты мінамётных батарэй і рота пехацінцаў, тройчы даводзілася выклікаць агонь на сябе...

Раніцай быў моцны туман, бачнасць не болей 20 метраў. У час шостай, апошняй, атакі гітлераўцаў туман пачаў падымацца і ногі наступаючых былі відаць за 80—100 метраў. Фашысты не здагадваліся, што мы добра бачым іх ногі, і ішлі ва ўвесь рост. Гэта была самая шалёная і самая пагібельная для ворага атака. Прыцэльным агнём з аўтаматаў і кулямёта мы касілі іх, як траву. Мінамётным агнём адрэзалі ім адыход. За Нэйсе вырваліся нямногія. Раніцай да нас прыехалі карэспандэнты газет браць інтэрв'ю. А 16 красавіка пачалося агульнае наступленне...

Салдат двух войнаў

М. В. Ракіцкі.

Ракіцкі Міхаіл Васілевіч нарадзіўся ў 1900 г. ў вёсцы Пярэвалачня Талачынскага раёна. Член КПСС з 1941 г. Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У 1920—1923 гг. служыў у 70-м стралковым палку. З 1924 г. працаваў у валасным камітэце ўзаемадапамогі, пасля ў Тураве дырэктарам хімлеспрамгаса. У 1932 г. скончыў Кіеўскі лесатэхнічны інстытут, быў накіраваны на работу ў Пінск, па пасаду дырэктара міжабласной канторы трэста «Белхімлес». У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце з чэрвеня 1941 г. За ўзрыў моста цераз Пціч разам з варожай аўтамашынай з салдатамі быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». У верасні 1941 г. ў час баёў пад Брансқам атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі (замяніў у баі загінуўшага камандзіра ўзвода). За ўмелае правядзенне баявой аперацыі паблізу вёскі Сабакіна, што на Арлоўшчыне, палітрук роты М. В. Ракіцкі быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені. У кровапралітных напружаных баях пад

Арлом Міхаіл Васілевіч быў цяжка кантужаны. Побач з траншэяй узарваўся снарад. Палітрука засыпала зямлёй. Аднапалчане знайшлі яго, адкапалі. Пяцёра сутак ляжаў ён у шпіталі ў непрытомнасці. І ўсё ж перамог смерць, выжыў, толькі часткова страціў слых. Стаўшы на ногі, падоўгу гутарыў з параненымі салдатамі, памагаў пісаць пісьмы цяжкапараненым, выконваў шматлікія даручэнні камісара шпіталя Бахолдзіна. Апошні цяжка хварэў і атрымаў накіраванне на аперацыю ў іншы шпіталь. Камісарам стаў М. В. Ракіцкі. На пасадзе памесніка начальніка шпіталя па палітчастцы і сустрэў ён доўгачаканую Перамогу. Дэмабілізаваўся ў 1947 г. ў званні маёра. Працаваў на кіруючых пасадах у сістэме «Белхімлесу», старшынёй калгаса «Савецкая Беларусь» Талачынскага раёна. Жыве ў Талачыне.

У. У. Шаўчэнка.

Удзельнікі парада Перамогі

Г. Ф. Шныркевіч.

І. Е. Даронін.

Апрача Героя Савецкага Саюза М. С. Камельчыка яшчэ 4 талачынцы былі ўдастоены высокага гонару ўдзельнічаць у Парадзе Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве 24 чэрвеня 1945 г. Гэта Г. Ф. Шныркевіч, І. Е. Даронін, І. Ц. Петракоў, І. Дз. Ярошкін.

Шныркевіч Георгій Фёдаравіч нарадзіўся ў 1913 годзе ў в. Усвейка Талачынскага раёна ў вялікай сялянскай сям'і. Пасля скончання сямігодкі з 1931 да 1936 года працаваў калгаспікам, рахункаводам, бухгалтарам у розных сельгасарцелях Талачыншчыны. У 1936—1937 гадах служыў у Чырвонай Арміі, пасля дэмабілізацыі працаваў бухгалтарам саўгаса на Гомельшчыне. У 1939 годзе скончыў курсы малодшых камандзіраў пры артвучылішчы ў Смаленску. У лютым 1941 года малодшы лейтэнант запасу Г. Ф. Шныркевіч быў прызваны на перападрыхтоўку ў раён Беластока. Вярнуўся дадому 18 чэрвеня, а праз 5 дзён па мабілізацыі быў накіраваны ў г. Бранск у запасны полк бронепаяздоў на пасаду камандзіра бронепляцоўкі. На фронце з красавіка 1942 года. Намеснік камандзіра браняпоезда па страявой частцы, старшы памочнік начальніка штаба па артылерыі 29-га танкавага корпуса 5-й гвардзейскай танкавай арміі, начальнік штаба, намеснік камандзіра 1446-га самаходнага артпалка таго ж корпуса. У 1942 годзе стаў членам ВКП(б). Прымаў удзел у гістарычнай танкавай бітве над Прохараўкай на Курскай дузе, у баях за вызваленне Украіны, Малдавіі, Беларусі (вызваляў родны Талачын), Румыніі, Польшчы, Прыбалтыйскіх рэспублік, у разгроме варожых груповак ва Усходняй Прусіі і інш.

Баявыя заслугі Г. Ф. Шныркевіча адзначаны ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі. 24 чэрвеня 1945 года гвардыі маёр Г. Ф. Шныркевіч удзельнічаў у Парадзе Перамогі на Краснай плошчы. Пасля дэмабілізацыі (у канцы 1946 года) знаходзіўся на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Талачынскім раёне, выбіраўся членам райкома, бюро РК КПБ, дэпутатам раённага і пасялковага Саветаў. З 1947 года на пенсіі. Праводзіў вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі, за што адзначаўся Савецкім камітэтам ветэранаў вайны, ЦК ДТСААФ, Савецкім фондам міру і інш. Памёр ў 1981 годзе.

З узнагароднага ліста Г.Ф. Шныркевіча

21 ліпеня 1944 г.

...Участвуя в боях в районе Поповка, Умань, Дубосары, Малоешти и под Минском не раз высэжал с батареями для разгрома и преследования противника, при этом действовал смело и решительно. В бою за г. Умань две батареи под командованием Шныркевича первыми ворвались в город. При этом уничтожено до роты вражеских автоматчиков, сожжено до 50 автомашин и 3 средних танка противника. Тов. Шныркевич оказывал большую помощь и. о. командира полка в руководстве полком, т. к. отсутствовал командир полка и заместитель по строевой части. За последние бои полком уничтожено: танков — 13, автомашин — 30, бронетранспортеров — 4, бронепоезд подбит — 1, ПТО — 5, пехоты — 200 чел., взято в плен — 80 чел.

Полк прошел большой боевой путь, в ре-

І. Ц. Петракоў.

І. Дз. Ярошкін.

зультате полк получил наименование «Знаменского», награжден орденом «Красного знамени»...

Командир 1446-го САЗКП
майор Лыков

* * *

Івана Емяльянавіча Дароніна вайна застала ў прыгранічным горадзе Уладзіміры-Валынскім. Адсюль і прайшоў ён цяжкімі дарогамі вайны ад першага да апошняга дня. Абараняў Кіеў, Данбас, Сталінград, змагаўся на Курскай дузе, фарсіраваў Дняпро, вызваляў родную Беларусь, Польшчу, штурмаваў Берлін. Быў артылерыстам, мінёрам. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Зараз капітан запасу І. Е. Дароніп працуе выкладчыкам пачатковай ваеннай падрыхтоўкі ў Валосаўскай сярэдняй школе.

Іван Цітавіч Петракоў ваяваў на Калінінскім фронце — сяржант, камандзір аддзялення. Пасля сканчэння 2-га Саратаўскага танкавага вучылішча — малодшы лейтэнант, камісар самаходнай артылерыйскай установкі. У складзе 1048-га самаходнага артылерыйскага палка 5-й гвардзейскай арміі прымаў удзел у вызваленні Латвіі, у ліквідацыі Курляндскай групоўкі ворага, падбіў 2 варожыя танкі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны Іван Цітавіч працаваў на гаспадарчай і партыйнай рабоце ў Талачынскім раёне. Зараз на пенсіі, і працуе ў калгасе «XVIII партз'езд».

Храбра змагаўся з ворагам мінамётчык Іван Дзмітрыевіч Ярошкін. У чэрвені 1943 г. ён скончыў курсы мінамётчыкаў 7-га запаснога палка ў Горкім і быў прызначаны камандзірам мінамёта 3-й гвардзейскай паветранай дэсантнай дывізіі 1-га Украінскага фронту. 3 мая 1944 г. ён камандзір мінамёта, потым гаўбіцы 492-га асобнага армейскага мінамётнага палка 27-й арміі 2-га Украінскага фронту. Удзельнічаў у бітве пад Сталінградам. Быў двойчы паранены. Ад трапнага агню мінамётнага разліку Ярошкіна знайшлі сабе смерць сотні гітлераўцаў. За мужнасць і адвагу Іван Дзмітрыевіч узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, трыма медалямі «За адвагу», двума — «За баявыя заслугі». Пасля Вялікай Айчыннай вайны да снежня 1955 г. служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у Талачынскім раёне старшынёй раённага камітэта ДТСААФ, старшынёй Слаўнаўскага сельсавета, інструктарам Талачынскага райкома партыі, намеснікам начальніка райаддзела ўнутраных спраў па палітчастцы. Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу ў органах унутраных спраў» III, II і I ступеней, знакам «Выдатнік міліцыі». Памёр у 1976 г.

А. А. Шнэйдар.

І вера, і вернасць

Н. Е. Пашкевіч: некалькі згадак і думак пра дні ліхалецця

За смугою часу зніклі-растварыліся многія істотныя тады для напага ўзросту клопаты і трывогі. Але добра помніцца наш незвычайны, узбуджаны настрой на самым беражку лета сорак першага года, выкліканы адной важнай задумай,— можна сказаць, справа ішла аб нашым далейшым лёсе. Мы, некалькі сяброў-другакурснікаў педвучылішча, вырашылі, што, бадай, хопіць з нас і двух гадоў студэнцкага жыцця, час ісці на самастойны хлеб, астатняе дацягнем і завочна. Гэта дазвалялася, бо настаўнікаў не хапала, асабліва ў нядаўна далучаных раёнах Заходняй Беларусі. Нашы эмоцыі падагравалі выпускнікі-трэцякурснікі. Ішло размеркаванне, і ледзьве не ўсе размовы ў іх былі аб тым, куды хто паедзе працаваць, як першую ж зарплату (гэта — хлопцы) абавязкова пусціць на сапраўдны касцюм... «Самаразмяркоўваліся» і мы, прыкідваючы, куды прасіцца, і таксама песцячы думку пра адзежыну, «набытую без бацькі...»

Але, як аказалася, мы былі ўжо размеркаваны па іншаму «ведамству». Усе. І выпускнікі. І першакурснікі. І ўсе жыхары Мінска. І ўвесь народ.

У д'ябальскай канцылярыі — галоўным управўленні імперскай бяспекі «трэцяга рэйха» нас старанна падлічылі, выразілі ў працэнтах і, што датычыць беларускага народа, падзялілі на дзве няроўныя часткі. 75 працэнтаў беларусаў было намечана да «выселення», што ў перакладзе з мовы камуфляжу на мову сапраўдных намераў гітлераўцаў азначала вынішчэнне, а 25 — да «германізацыі», што азначала ператварэнне людзей у рабочае быдла нямецкіх прамыслоўцаў і баўэраў. У спадзяванні на імгненную перамогу над нашай краінай гітлераўскія заправілы дзелавіта распрацоўвалі свой маніякальны план «Ост», паводле якога на ўгнаенне магутнасці іх «тысячагадовага рэйха» ахвяраваліся цэлыя народы.

Калі грымнула вайна і цэнтральныя вуліцы Мінска над градам фашысцкіх бомбаў да выходу 24 чэрвеня ператварыліся ў руіны або былі ахоплены полымем, мы ў патоках бежанцаў, якія запаланілі ўсе дарогі, рушылі па сваіх вёсках: наш узрост у армію не браліі — маладыя. Але вось шматзначная дэталь. Перад адыходам мы яшчэ змаглі сабрацца ў педвучылішчы, і нас забяспечылі дакументамі аб адукацыі — трэцякурснікі атрымалі дыпломы, астатнія — даведкі, хто колькі курсаў скончыў.

У маім дзённіку, які захаваўся з таго часу, запісана развітальная прамова нашага дырэктара Сігналава. «Дакументы гэтыя вам яшчэ спатрэбяцца,— сказаў ён.— Калі міне гэта страшэнная навала, на руінах гарадоў і вёсак вы яшчэ будзеце будаваць шчаслівае жыццё». Успамінаю той драматычны момант і думаю: а, між іншым, тое, што мы ў тым неапісальным чекле не смяяліся ў адчаі над пейкімі паперкамі аб адукацыі, не камячылі іх грэбліва, а, наадварот, беражліва хавалі побач з камсамольскімі білетамі, было ўжо пачаткам і нашага асабістага адказу на вар'яцкі план «Ост», аб якім тады мы яшчэ, канешне, не чулі. Што нас чакае, мы ўжо добра ведалі і бачылі па першых трох днях вайны, усе ўчарашнія ілюзіі ўжо як рукой зняло. Аднак мы ведалі і тое, што гэта вайна ўжо названа Айчыннай і свяшчэннай, а ў такіх войнах агрэсар абавязкова бывае біты.

Падзеі мінулай вайны ўвогуле ўжо добра асэнсаваны, здаецца, усё ясна. Але надыходзіць час, і хочацца зноў пакапацца ва ўласнай памяці, у розных гітлераўскіх дакументах і падшыўках газет. На што ўсё ж, думаецца пры гэтым, яны спадзяваліся, пайшоўшы на такую нечуваную авантуру?

Безумоўна, галоўная надзея гітлераўцаў была на сілу, і яна напачатку спяшіла ім шчаслівай зоркай. Але, акрамя сілы, была ў іх яшчэ цэлая сістэма разлікаў іншага — сацыяльнага, ідэалагічнага і псіхалагічнага парадку. Разграміўшы ў «бліцкрызе» нашу армію, ім трэба было завалодаць душой савецкіх народаў, і насілле ішло ў іх непадуладным звычайнай логіцы перапляценні з «мірнай» апрацоўкай свядомасці людзей.

Назаўсёды, як насланнё, урэзаўся ў памяць метровы паясны партрэт «фюрэра» ў карычневай нацысцкай форме з надпісам на ніжнім канце «Гітлер-асвабадзіцель», які гітлераўцы развешвалі ў гарадах і вёсках на самых людных месцах. Так, яны ішлі да нас з цэлай праграмай «вызвалення». Савецкія людзі вызваляліся ад Савецкай улады, ад «дыктатуры Сталіна», ад «жыдоў» і камісараў, ад «ненавісных» калгасаў і саўгасаў, ад «рабскай працы». Украінскі, беларускі, прыбалтыйскія і іншыя народы вызваляліся ад «прыгнёту Расіі». Беларусь, каб нават у самой яе назве не было ніякага намёку на кроўнае сваяцтва з Расіяй, была перайменавана ў «Беларутэнію». І яшчэ — яна «вызвалялася» ад нармальнай бытавой і літаратурнай мовы, замест яе кучка некалі выгнаных народам нацыяналістаў, якія цяпер вярнуліся ў абозе гітлераўскіх войск, навязвала людзям нейкую штучную страсянку, у якой без перакладчыка і разабрацца было немагчыма...

Я не стану ўслед за бадзёра-легкадумпай публіцыстыкай паўтараць, быццам усе, хто апынуўся на акупіраванай тэрыторыі, дружна, як адзін, ад малога да старога адразу зразумелі каварныя задумы ворага і грудзьмі сталі на абарону Савецкай улады, заваёў Вялікага Кастрычніка. Усё было, на жаль, куды больш складана. Былі, былі і хлеб-соль «вызваліцелям», і ўдзячнасць за незнаёмы яшчэ «новы парадак», і абуджаная даўняя азлобленасць на Савецкую ўладу, якая зараз «святкавала» свой час, і нечаканае перараджэнне некаторых учарашніх нашых актывістаў, і аднаклетачнае прыслужніцтва тых, хто прагнуў любой цаной «узяць ад жыцця сваё», і праслаўтая пазіцыя «ні вашым, ні нашым», і многае іншае, што магла спарадзіць сітуацыя, калі чалавек застаецца адзін на адзін са сваім сумленнем, сваім ідэйным і маральным патэнцыялам.

Але гэта я аб некаторых людзях, колькі б іх ні аб'явілася. А гітлераўцы ж мыслілі маштабамі народа, ім патрэбен быў для іх апэрацый па «перабудове» свету ўвесь народ. Ды вось тут якраз іх калымага надзей і «вызваленчых» абяцанак забуксавала адразу.

Прыпамінаю самыя першыя тыдні і месяцы акупацыі. Партызанская і падпольная барацьбе ўспыхвала яшчэ толькі асобнымі ачагамі, у гэтым сэнсе яшчэ, калі гаварыць па вялікім рахунку, народ «безмолствовал». Але ён «безмолствовал» і ў іншым сэнсе — у ад-

каз на спадзяванні і заклікі гітлераўцаў. Нешта не чуваць было, каб дзе-небудзь узнікла дэманстрацыя або маніфестацыя з лозунгамі «Няхай жыве «новы парадак!». Каб дзе-небудзь усёй грамадой грамілі «ненавісныя» калгасы і саўгасы і расхоплівалі зямлю. Каб пакорліва расчынялі перад гітлераўскімі нарыхтоўшчыкамі свае засекі і хлявы. Каб спяшаліся спраўна выконваць падатковыя і розныя іншыя заданні. Каб вясковы «жаночы парламент» зайздросціў той маці, у якой сын надзеў павязку паліцэйскага (што называецца, выбіўся ў людзі). Каб перш чым накарміць чырвонаармейца, які ўцёк з лагера ваеннапалонных, вясковая бабуля пытала: «А якой ты, дзетка, нацыянальнасці? Чаго добрага, ці не рускі часам?» Або: «...А ці не пераадзеты ты, дзетка, камісар?»

Пра Сталіна гаварылі многа. Толькі, за выключэннем асобных зласлівых выпадаў, зусім не ў тым духу, на які спадзяваліся гітлераўцы. Самым характэрным пачуццём было горкае расчараванне ў яго ўсемагутнасці ды пяўцямнае пытанне: што ж ён, чаму пускае іх так далёка ў глыб краіны? Як, напэўна, і ўсюды, у нашай вёсцы аб'явілася нямала «стратэгаў» з мужыкоў ужо неваеннаабавязанага ўзросту ды нас, дапрызыўнікоў. Наш «генштаб» па завядзёнцы звычайна збіраўся ў калгасным клубе і старанна пераварваў усе чуткі і здагадкі, якімі атмасфера была насычана да крайнасці. Найбольш актыўным і задзірыстым «стратэгам», памятаю, быў у нас Пятрок Данільчык (Данільчык — гэта не прозвішча, а былое імя па бацьку — Данілавіч, «адрэдагаванае» так вяскоўцамі адпаведна шчупламу выгляду мужыка). Дык вось Данільчык, захапіўшы ініцыятыву, звычайна ўскрыкваў сваім пракураным тэнарком: «Не разумею, чаму ён там так доўга думае? Я б на яго месцы сабраў усё войска ў адзін кулак ды як ударыў...» — і для ілюстрацыі рашуча біў кулаком правай рукі ў далонь левай. А калі больш разважлівыя «стратэгі» задавалі пытанне: «А па якім напрамку б ударыў? — ён не мог стрымаць абурэнне: «Як — на якім? На нашым! Прама па мінскай магістралі! Нас вызваляць ад гэтай набрыдзі!»

Пятрок Данілавіч Кірыкоўскі, па шчасце, дажыў да вызвалення, якое, як вядома, прыйшло пасля паражэнняў і перамог нашай Арміі на шматлікіх напрамках. У апошнія свае гады, ужо ў старым узросце, ён вазіў на нарыхтоўчы пункт малако, якое здавалі калгаснікі ад асабістых кароў. Сустракаючыся з ім, мы часам успаміналі аб яго «эгаістычнай стратэгіі» і ад душы смяяліся.

І яшчэ штрых. Хоць наша вёска стаіць у якіх-небудзь пасці кіламетрах ад магістралі Масква — Мінск, па якой і ўздоўж якой немцы перлі на Маскву лавінай, наш калгасны клуб цудам уцалеў у сваім даваенным выглядзе — з партрэтамі Леніна, Сталіна. Молатава па сценах ды яшчэ... з батарэйным радыёпрыёмнікам у шафе калгаснага рахункавода (так што мы, ужо «акупіраваныя», мелі магчымасць слухаць родную Маскву). Захоўваўся ён тыдні тры, пакуль аднойчы не наляцеў атрад палявой жандармерыі — некалькі бамбізаў з шырокімі, паўпадковай бляшанкамі-падвескамі на грудзях. Памятаю, мой сусед, сівы дзед Пракоп, які ведаў немцаў па той, васемнаццатага года акупацыі, падышоў да аднаго з гэтых бамбізаў, калі той выцягваў радыёпрыёмнік з шафы, і пачаў прасіць яго пакінуць гэта нам, бо «як жа мы, паночку, будзем жыць без радыё...» Грэх насміхацца над наіўнасцю старога чалавека (ды я і гавару гэта з горыччу), але жандарм сваім праслаўтым каваным ботам імгненна растлумачыў дзеду розніцу паміж немцам-кайзераўцам і немцам-гітлераўцам. (Прыйшло гэта на памяць, магчыма, таму, што зноў падумалася пра ілюзіі наконт чалавечага аблічча акупантаў, якія напачатку жылі ў свядомасці таго-сяго.)

А тым часам мы, у асноўным моладзь і «акружэнцы», якім далі прытулак нашы вёскі, займаліся не толькі клубнай «стратэгіяй». На шляху фашыстаў да Оршы ішлі жорсткія баі. У лясах, у балотных зараснікаў, на палях каласістага жыта (яно ўрадзіла ў той год як ніколі — сцяной стаяла) засталося шмат рознай зброі, боепрыпасаў, узрыўчаткі. Усё гэта трэба было прыбраць да рук. З'явіліся тайнікі — і калектыўныя, і ў кожнага свой...

Было тое лета адметнае і такімі нашымі, здавалася б, на той час зусім недарэчнымі захапленнямі, як... бясконцыя, ледзьве не кожны дзень, вечарынкі — то ў адной вёсцы, то ў другой. Ногі маладыя, няцяжка было выправіцца і за дзесяць вёрст. Бабы, гледзячы на нас, ківалі галовамі: «Разгуляліся, як перад канцом свету!» А самі пабіваліся ў хату — павярнуцца не было дзе: гора не любіць адзіноты. Нямецкія ж улады глядзелі чамусьці на нашы зборышчы праз пальцы, а можа і з адабрэннем: хай, маўляў, покуль гуляюць, абы не займаліся нічым шкодным для Вялікай Германіі. А між тым па вечарынках сама сабой адбывалася немалаважная справа: людзі знаёміліся або пачынавалі адзін аднаго. У гэтай абстаноўцы раскаванасці лёгка было ўведаць, хто чым дыхае. Бо кожнаму з нас было ясна, што неўзабаве давядзецца ўсур'ёз падумаць пра свой самы галоўны ў гэты час абавязак і выбіраць кампанію не па кадрыль ці кракавяк...

Прыгадваю першыя тыдні і месяцы акупацыі і думаю: не, народ і ў той час ўжо не «безмолствовал». Хіба мала азначала для пачатку, што людзі не парадавалі ворага шокавым станам, якога той чакаў? Што глядзелі на гітлераўцаў як на чужынцаў? Што з радасцю лавілі чутку-надзею адтуль, з фронту, дзе амаль у кожнага быў хтосьці з родных ці блізкіх? Што, адрэзаныя ад усёй краіны вогненнай паласой фронту, жылі з ёю аднымі думкамі і спадзяваннямі?

Не, народ не маўчаў. Тым больш, што і летапіс партызанскай барацьбы, летапіс актыўнага супраціўлення ворагу пачынаецца з самых першых дзён акупацыі. Авангард народа — камуністы і беспартыйныя патрыёты, якія былі пакінуты па заданню ў тыле ворага, сотні і тысячы савецкіх людзей, што ўключыліся ў барацьбу па ўласнай ініцыятыве, адразу паказалі прыклад, што трэба рабіць у такіх абставінах. А весткі пра гэта даходзілі ўсё часцей і часцей. Улетку сорак першага года мне даводзілася неаднойчы бываць у акупіраваным Мінску. Горад рабіў жахлівае ўражанне не толькі сваімі руінамі, а і нязвычным малалюддзем. А яшчэ больш жах браў ад расклееных на кожным кроку загадаў, распараджэнняў і паведамленняў нямецкіх улад. У адну з паездак на Савецкай вуліцы, на слупе паблізу дома, дзе ў свой час адбыўся першы з'езд РСДРП, кінулася ў вочы надрукаваная буйным шрыфтам «Абвестка»: «З прычыны шматразовых актаў сабатажу з боку цывільнага жыхарства супроць нямецкае вайсковае ўлады (пашкоджаньне кабэляў) расстраляны 100 асоб мужчын. За кожны выпадак сабатажу ў далейшым, калі злачынец не будзе злоўлены, будзе расстраляна па 50 мужчын». Забароны, пагрозы, расстрэлы, вісельні — гэта было самым галоўным зместам «афармлення» гітлераўскага акупацыйнага рэжыму ў горадзе. Але з яго трагічнага кантэксту можна было здабыць і хвалюючую інфармацыю: горад не скарыўся, горад жыве і змагаецца.

Захапіўшы беларускую зямлю, гітлераўцы разгарнулі густую сетку адміністрацыйна-гаспадарчых органаў і ўстаноў, якія павінны былі забяспечыць планамернае ограбленне рэспублікі і ўкараненне «новага парадку». Але, думаецца, ім адразу стала ясна, што іх ранейшыя ўяўленні аб тым, як усё будзе адбывацца, аказаліся вельмі далёкімі ад рэальнасці. «Новы парадак» сваім ходам ніяк не ішоў, і прыйшлося несці яго на штыках, прабіваць яму дарогу гумавымі палкамі і аўтаматамі, а ў далейшым і гарматамі, і танкамі, і самалётамі.

Наша, усходняя паласа Беларусі, у адрозненне ад іншых рэгіёнаў рэспублікі, дзе былі створаны «генеральная» акруга і проста «акругі» пад шыльдамі цывільнай улады, атрымала «статус» тылавога раёна групы армій «Цэнтр». Дык вось у распараджэнні начальніка гэтага тылавога раёна, які займаўся справамі «новага парадку», як потым выявілася, у снежні сорак першага года былі 4 ахоўныя дывізіі, 2 брыгады СС, 229 пяхотных рот, 12 танкавішчальных рот, 9 рот з цяжкай пяхотнай зброяй, 11 артылерыйскіх батарэй. А ўсяго, каб утрымліваць захопленую тэрыторыю Беларусі, праводзіць свае грабежніцкія аперацыі і карныя акцыі, ахоўваць свае гнёзды, гітлераўцам спатрэбіліся ў сорак першым і сорак другім гадах «штатныя» ваенна-паліцэйскія сілы колькасцю каля 160 тысяч чалавек! Гэта без уліку дадатковых, франтавых часцей, якія перыядычна прыцягваліся да правядзення буйных карных экспедыцый супраць партызан і мірнага насельніцтва.

Можна сабе ўявіць, чаго каштавала народу, каб у гэтых умовах не толькі захаваць прысутнасць духу, але і разгарнуць актыўнае супраціўленне ворагу. Бо гэтая велізарная машына запалохвання і падаўлення не гуляла, не прастойвала. У першыя ж месяцы акупацыі ў цэнтр, у Берлін, ішлі шматлікія справаздачы ваенна-паліцэйскай адміністрацыі, усялякіх спецыяльных «каманд», начальнікаў канцлагераў і турмаў аб масавым знішчэнні савецкіх людзей. Палітыка генацыду ўступіла ў сілу адразу ж.

Свае крывавыя справы гітлераўцы на першым часе спрабавалі прыкрыць «высакародпай» мэтай ачышчэння гарадоў і вёсак ад камуністаў і савецкіх актывістаў, відаць, спадзеючыся, што народ павінен ім дзякаваць за знішчэнне яго лепшых сыноў і дачок. У іншых жа выпадках (як з той акцыяй расстрэлу «100 асоб мужчын») выкарыстоўваліся аргументы «вымушанай абароны». Але ўсё гэта магло пераканаць хіба што надта прастадушных і даверлівых людзей. У кожнага ж звычайнага чалавека міжволі ўзнікала простае пытанне: а за што ж караюць невінаватых? Значыцца, гітлераўцам, трэба думаць, нават выгадныя гэтыя «акты сабатажу»? Пазней, калі пачалася паласа масавых Хатыняў, паласа ператварэння беларускай зямлі ў «зону пустыні», усім, нават самым прастадушным, стала ясна, што справа не ў пейкіх мерах «вымушанай абароны», што фашысты для таго і прыйшлі на нашу зямлю, каб знішчыць тут былое жыццё і ў самым корані падсекчы жыватворныя сілы народа.

Раз'юшаны тэрор, грабяжы, вываз людзей, асабліва моладзі на катаргу ў Германію — усё гэта выклікала ў народзе пачуццё гневу і помсты ворагу. Як пелася ў нашай любімай

партызанскай песні: «Крушите смертным боем насильников-зверей за дикие разбои, за слёзы матерей!» Дарога ў партызанскі атрад стала самай праведнай дарогай чалавека.

Аднак далёкія ад поўнай праўды тыя буржуазныя гісторыкі, у галовах якіх ужо ў час вайны нарадзілася «тэорыя», што, дарэчы, жыве і сёння, быццам бы партызанская барацьба на акупіраванай гітлераўцамі савецкай тэрыторыі ўзнікла з-за жорсткага абыходжання нямецкіх улад з насельніцтвам, іх «няправільнай» акупацыйнай палітыкі і г. д.

У мяне не забілі нікога — ні маці, ні жонкі, ні брата.

Я не плакаў бяссоннаю ноччу ад горкае страты.

Ад чаго ж тады сэрца так хоча, так прагне расплаты? — так пачынаў свой верш-клятву беларускі паэт-воін Пімен Панчанка і ўсёй сутнасцю наступных радкоў адказваў: парушанае гітлераўцамі шчаслівае жыццё, зняважаная Радзіма — вось што кліча на смяротны бой, вось у чым сутнасць нашага пачуцця асабістай «кроўнай помсты» ворагу. Ва ўмовах акупацыі асабліва многа і светла думалася аб даваенным жыцці, аб тым, што мы можам страціць назаўсёды,— запытайце кожнага, хто перажыў тыя выпрабаванні, і ён пацвердзіць. І калі ўжо развіваць пачатую тэму, то патрэбна асабліва падкрэсліць, што партызанскі рух з'явіўся натуральнай арганічнай часткай смяротнай схваткі з фашызмам усяго савецкага народа, які адстойваў заваёвы Вялікага Кастрычніка. Набіралася сілы і вопыту ў барацьбе з ворагам уся краіна — набіраўся сілы і партызанскі рух.

Зліваючы свае сілы з велізарнай дапамогай Вялікай Зямлі, ужо летам сорак другога года беларускі народ паставіў ворага перад фактам масавага партызанскага руху, а к лету наступнага года рэспубліка знаходзілася, па сутнасці, у стане ўсенароднай вайны.

Ратныя справы беларускіх партызан вядомы ўсяму свету. І за імі стаяць бязмежны патрыятызм і высокая арганізаванасць арміі народных мсціўцаў. У свой «класічны» перыяд адначасова з традыцыйнымі, лакальнымі баямі і дыверсіямі (у маштабах атрада, брыгады, злучэння) яна пад адзіным кіраўніцтвам Цэнтральнага або Беларускага штабоў партызанскага руху ўсё часцей аб'ядноўвала свае сілы для шырокамаштабных удараў па ворагу. Успомнім хоць бы «рэйкавую вайну», якая трыма магутнымі хвалямі пракацілася па камунікацыях ворага.

...Баі і паходы, засады і дыверсіі. Здавалася б, з гэтага і складаецца галоўны занятак партызана.

Але гэтая наша партызанская вайна, калі ледзь не ўся рэспубліка ператварылася ў адзіны паўстанцкі лагер, запатрабавала шмат большага. Калі ўявіць сабе абагульнены вобраз партызана, то ён павінен быў умець хадзіць за плугам, сеяць хлеб, садзіць бульбу, круціць жорны, даіць карову, шыць адзенне, падкоўваць каня, майстраваць калёсы і сані, капаць зямлянку, склюдаваць хату, рамантаваць зброю, канструяваць аўтаматы (два з аднаго вінтовачнага ствала!), гнаць сямідзесяціградусную самагонку (хай гэта вас не бянтэжыць, акрамя расходаў на медыцынскія патрэбы, яе ў сумесі з бензінам залівалі ў бакі трафейных машын — цягнула!), іграць на гармоніку, праводзіць у вёсках ці цывільных лясных лагерах сходы, весяліць сяброў на прывале, круціць «польку» на танцах (якія пры наяўнасці хоць бы двух-трох дзяўчат абавязкова ўзнікалі), пісаць вершы, супакойваць галоднае дзіця...— усё, без чаго было не абысціся ў нашай шматгаліновай, амаль агульнай з насельніцтвам гаспадарцы, якая жыла на «самаакупнасці» і «гаспадарчым разліку», у нашым незвычайным партызанскім быце.

І асабліва важным фронтам партызанскай арміі, партыйных і камсамольскіх камітэтаў і арганізацый быў фронт духоўны, ідэалагічны. Пачынаўся ён, скажам умоўна, з маральна-палітычнага выхавання асабовага саставу атрадаў і брыгад і заканчваўся недзе ў сферы вострых схватак з гітлераўскай прапагандысцкай сістэмай. Трэба было паралізаваць спробы ворага забрацца ў душу народа і перавярнуць яе на свой лад. Гітлераўцы не грэбавалі нічым. Палітычныя правакацыі, грубая дэзінфармацыя аб становішчы на франтах, усялякія байкі аб развіцці народнага «самакіравання», беспардоннае ўсхваленне «германскага раю», куды яны заманьвалі моладзь у дадатак да тых, што вывозілі сілай, пры дапамозе аблаў, ігра на самых нізкіх інстынктах чалавека — усё бралася імі на ўзбраенне, каб збіць народ з толку, дэмаралізаваць яго, пасварыць насельніцтва з партызанамі. Слова бальшавіцкай праўды неабходна было ў гэтых умовах як хлеб, як паветра. І яно гучала — вуснае і друкаванае — не толькі ў партызанскіх зонах, але і ў самых, здавалася б, недаступных населеных пунктах, дзе асталёўваліся варожыя гарнізоны.

Вялікая Зямля рэгулярна і немалымі тыражамі прысылала нам «Правду», «Известия», «Комсомольскую правду», «Красную Звезду», «Савецкую Беларусь», газету-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну», мноства брашур і лістовак. Але ўсё роўна гэта была кропля ў моры нашых патрэб. Ды і слова, народжанае і надрукаванае тут, пад носам у ворага (мы гэта добра разумелі) будзе мець асаблівую сілу і ўладу. Таму развіццё падпольнага і

партызанскага друку стала найпершым клопатам партыйных камітэтаў. Прычым у большасці выпадку імепна аднаўляўся выхад даваенных выданняў. І ў гэтым меўся вялікі сэнс: «вяртанне» да людзей іх роднай газеты — хіба гэта было не сведчанне трываласці савецкага жыцця, непарушнасці нашых традыцый.

Наша талачынская раёнка, у выпуску якой мпе як члену яе рэдкалегіі давялося ўдзельнічаць, так па-даваеннаму і называлася — «Чырвоны хлебароб». На радасць людзям і на зло ворагу мы стараліся гэтым падкрэсліць, што галоўная наша справа і прызнанне — сеяць хлеб на калгасных палях — жыве ў нашай душы і заўтра абавязкова возьме верх. Перакавалі, калі спатрэбілася, аралы на мячы, а потым перакуём і зноў!

Многа можна было б гаварыць пра тое, як цягнуліся людзі да нашага друкаванага слова. Ды скажу толькі, дзеля жарту, што гэта была вельмі выгадная справа — ідучы на баявое заданне, прыхапіць з сабой газету або лістоўку: у самай галоднай вёсцы цябе знойдуць чым накарміць ды яшчэ старыя не пашкадуюць моцнага тытуню-самасаду, што ўжо лічылася арыстакратычным шыкам, таму што ў той час мы курылі ўсялякую муру.

Як ні старалася, як ні намагалася гітлераўска-гебельсаўская прапаганда, ёй не ўдалося пасеяць у народнай душы чартапалох антысаветчыны і адшчапенства. Тут, безумоўна, дзейнічалі розныя сілы, і перш за ўсё рэвалюцыйны гістарычны вопыт народа, зрошчанасць людзей з савецкім ладам жыцця. Але нельга прымяншаць і велізарнае значэнне таго, што ў самы цяжкі час народны розум быў надзейна засцярожаны словам партыйнай праўды, якое дапамагала людзям без лішніх эмпірычных пошукаў дабірацца да сутнасці самых каварных намераў гітлераўцаў і іх паслугачоў.

...Радуючыся і перажываючы гордасць за тое, што бачыш наўкол, праязджаючы сёння па дарогах беларускай зямлі, з кожным разам усё глыбей і глыбей разумееш сэнс і значэнне нашай барацьбы ў гады гітлераўскага нашэсця.

У адну з такіх паездак па родным краі пацягнула на «свае» партызанскія мясціны, пацягнула асабліва моцна, можа таму, што быў май, Дзень Перамогі, асабліпае наша свята, калі жыццё гарадоў і вёсак да краю напаўняецца памяццю вайны. Некаторыя партызанскія мясціны мне не даводзілася пасля вайны наведаць ні разу, яны заставаліся ў запаветным куточку душы. І вось адно з іх. Тут наш атрад зрабіў засаду на калону гітлераўцаў. Мы залягліі па ўскрайку лесу, упрытык да самай дарогі, па якой рухаліся яны. Як цяпер памятаю, бой быў такі азартны, што мы, не стрымаўшыся, забыўшыся пра маскіроўку, паўскоквалі з месцаў і білі па ворагах стоячы, цераз верхавінкі маладзенькага хвойніку-падлеску.

Дзіўны бывае часам стан душы. Я ехаў на сустрэчу... з тым маладзенькім хвойнікам, ён чамусьці ўрэзаўся ў памяць болей, чым што іншае з абставін той засады. Але што ж гэта? З-за ўзгорка насустрач машыне выступіў раптам сцяной шумлівы бор, які прымусіў потым, калі спыніліся, рэзка закінуць галаву, каб дацягнуцца — толькі позіркам — да тых «нашых» верхавінак.

І тут я па-сапраўднаму, «прадметна» адчуў хаду часу. Як даўно, аказваецца, усё гэта было!

Так, час няўмольны і ўссмагутны. Пройдуць гады, і гэты бор, магчыма, знікне з твару зямлі... Але ёсць рэчы, над якімі ён, час, не мае, не павінен мець улады. Назаўсёды павінны застацца з людзьмі, пераходзячы ад пакалення ў пакаленне, тыя старонкі гісторыі, калі вырашаўся лёс народаў, калі справа ішла аб тым, быць ці не быць на зямлі, у чалавечай мове такім паняццям, як свабода, незалежнасць, брацтва, годнасць асобы.



„Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.

Вы не скарыліся лютым забойцам
у чорныя дні фашысцкай навалы
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да Савецкай Радзімы навек незгасальна.

Памяць пра Вас у нас назаўсёды,
як неўміруча наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю".

ЗАГІНУЎШЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ КАМУНІСТЫЧНАГА ПАДПОЛЛЯ, ПАРТЫЗАНЫ, АСОБЫ, ЯКІЯ АКТЫЎНА САДЗЕЙНІЧАЛІ ПАРТЫЗАНСКАМУ РУХУ І КАМУНІСТЫЧНАМУ ПАДПОЛЛЮ, ЧЛЕНЫ ІХ СЕМ'ЯЎ, ЖЫХАРЫ ПАРТЫЗАНСКІХ ЗОН І РАЁНАЎ, ШТО ПАДВЕРГЛІСЯ ФАШЫСЦКАМУ ТЭРОРУ

АБОЛЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АБОЛЬЦЫ

ЗЯЛЮТКІНА Кацярына Канстанцінаўна, нарадзілася ў 1895, расстраляна ў студзені 1943 у в. Клябань за сувязь з партызанамі.

ЗЯЛЮТКІНА Настасся Іванаўна, нарадзілася ў 1905, расстраляна ў студзені 1943 у в. Клябань за сувязь з партызанамі.

ЗЯЛЮТКІН Сямён Кузьміч, нарадзіўся ў 1900, расстраляны ў студзені 1943 у в. Клябань за сувязь з партызанамі.

РАКОВІЧ Віктар Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1910.

РАКОВІЧ Ефрасіння Сцяпанаўна, яго жонка, нарадзілася ў 1913, расстраляны ў чэрвені 1942.

ВЁСКА ДАБРАВОЛЬСК

КОНЮШКА Еўдакія Андрэеўна, нарадзілася ў 1910.

ВЁСКА ДАНІЛКАВА

БОТВІН Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан брыгады «Граза», прапаў без вестак 30.5. 1944.

ВЁСКА ЖАКІ

САЛАЎЁЎ Сямён Пятровіч, з 7.11.1941 у партызанах, загінуў у ліпені 1942 пры выкананні баявога задання.

ВЁСКА ЗААЗЕР'Е

БУЙНЕВІЧ Аляксей Васілевіч, нарадзіўся ў 1925, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

ВЁСКА ЗАМОШША

КАСТАЯНАЎ Павел Моцвеевіч, нарадзіўся ў 1912, партызан атрада «Перамога» 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1942.

ЧЭМІШ Фёдар Мікласвіч, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1942.

ВЁСКА КІСЯЛЁВА

СІЛІВОНЧЫК Фёдар Пятровіч, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

ЯКІМОВІЧ Іван Фёдаравіч, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

ВЁСКА КЛЯБАНЬ

СІНЕЛЬНІК Лідаія Ануфрыеўна, нарадзілася ў 1914 у в. Узносная, жыла ў в. Клябань, расстраляна ў 1942 за сувязь з партызанамі.

КАЗАКЕВІЧ...

ВЁСКА КРЫВЫЯ

ВАВУЛЬСКАЯ Феадосія Ягораўна, нарадзілася ў 1908, партызанская сувязная, памерла ў 1942 пры доглядзе тыфозных партызан.

ВАВУЛЬСКІ Барыс Мікалаевіч, яе муж, нарадзіўся ў 1905, да вайны на гаспадарчай рабоце; з 1942 у 1-й партызанскай брыгадзе імя К. С. Засло-

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у вёсцы Абольцы.

В. К. Бутовіч.

М. В. Шафранскі.

П. П. Голяс.

М. М. Палівянок.

нава, закатаваны ў талачынскай турме вясной 1944.

Зімой 1944 г. Б. М. Вавульскі зайшоў у родную в. Крывыя. Вельмі хацелася пабачыць дачок, дзевяцігадовую Кацю і шасцігадовую Ніну, якія жылі ў хаце адны (калі хавалі маці, дзеці ляжалі хворыя, толькі і запомнілі пачуты партызанскі залп на вясковых могілках у час пахавання). Жыхарам было забаронена пускаць малых да сябе ў двор, дапамагаць ім. Харчаваліся тым, што дадуць ціхком ці перакінуць цераз плот. Іншы раз ноччу заязджалі партызаны і пакідалі што-небудзь з ежы. Пасля іх ад'езду дзяўчынкі ялінкамі замяталі сляды каля хаты.

Бацька, убачыўшы галодных дзяцей, пайшоў да іх бабулі, якая жыла на другім канцы вёскі, за хлебам. Ужо ў яе дварэ ўбачыў, што з боку Аболец едуць фашысты і рэзка павярнуў да сваей хаты. А гітлераўцы ўсё бліжэй і бліжэй... Толькі і паспеў сказаць на парозе: «Не плачце, не засмучайцеся», як у хату ўварваліся ворагі. На вачах у дзяцей яго раздзелі, адсеклі пальцы, збілі нос. Потым, прывязанага да саней, пагналі ў талачынскую турму. Старэйшая дачка Зіна, якая хавалася ў лесе, хадзіла на сустрэчу з бацькам. Аднак пасля перанесеных ім катаванняў не пазнала яго. Голас таксама быў чужы. Бацька прасіў прынесці нож... На сямейным савеце бабуля і дзеці пакутліва шукалі рашэнне. Нарэшце, бабуля разважыла: «Калі прасіў, значыць трэба несці». Аднак нож не спатрэбіўся — у турме дзяўчыне сказалі: «Такога ў нас няма»...

КОНЮШКА Лідзія Венідзіктаўна, нарадзілася ў 1910, сувязная 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, расстраляна ў 1943.

КОНЮШКА Сяргей Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1916, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

КОНЮШКА Фёдар Венідзіктавіч, нарадзіўся ў 1912, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 25.5.1944.

КОНЮШКА Ціхан Васілевіч, нарадзіўся ў 1922, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1944.

МАРГАЙ Іван Міхайлавіч.

ПАЛІВЯНОК Фёдар Фёдаравіч, забіты ў 1943 за сувязь з партызанамі.

СТАНЦЫЯ ЛЕМНІЦА

БЕЛЯКОВА Варвара Дзянісаўна, нарадзілася ў 1918.

ПАСЁЛАК ЛУКІ

МАРГАЙ Дзям'ян Пятровіч, нарадзіўся ў 1908, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак 25.4.1944.

ВЁСКА МІКУЛІНА

БЕГУНОЎ Еўдакім Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1914, з 3.12.1942 у партызанскім атрадзе «Перамога» 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 24.3.1943, пахаваны ў в. Бызава.

БУТОВІЧ Васіль Кузьміч, нарадзіўся ў 1926, з 3.12.1942 у партызанскім атрадзе «Перамога» 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 24.3.1943, пахаваны ў в. Бызава.

ДЗЕВЯТКІН Антон Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1918, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

ДЗЕВЯТКІНА (СКРОБА) Зінаіда Міхайлаўна, нарадзілася ў 1916, партызанка 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінула 24.3.1943, пахавана ў Мікуліне.

ЗАМАСТОЦКІ Стафан Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1917, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 5.2.1944.

ПАДАЛІНСКІ Аляксандр Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1922, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 24.3.1943, пахаваны ў в. Бызава.

ПІСАРЭНКА Ірына Станіславаўна, нарадзілася ў 1894, расстраляна ў 1943 як член партызанскай сям'і.

ВЁСКА МОШАВА

ШАФРАНСКІ Міхаіл Васілевіч, нарадзіўся ў 1923, з 29.7.1943 партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 26.1.1944, пахаваны ў в. Вароніна Сенненскага р-на.

ПАЛІВЯНОК Фёдар, нарадзіўся ў 1910.

ВЁСКА ПШЧАКІНА

ГОЛЯС Павел Пятровіч, нарадзіўся ў 1913, да пачатку вайны працаваў у г. Гжацк, партызан брыгады «Граза», загінуў у 1942, пахаваны ў в. Козкі.

КІРЫК Сілівестр Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1905, партызан брыгады «Граза», загінуў 1.5.1944.

ПАЛІВЯНОК Міхаіл Малахавіч, нарадзіўся ў 1904, партызан брыгады «Граза», загінуў 23.2.1944.

ПУХ Пелагея Маркіянаўна, нарадзілася ў 1888,

расстраляна ў сакавіку 1944 як член партызанскай сям'і.

ВЁСКА ЧАЧАНЁВА

КОЛМАК Аляксей Міхайлавіч, з 3.12.1942 у партызанскім атрадзе «Перамога» 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 21.3.1943.

КОЛМАК Мікалай Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1922, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 25.5.1944, пахаваны ў Чашніцкім р-не.

КОЛМАК Хрысціна Фёдараўна, нарадзілася ў 1873, забіта 7.1.1943.

КОНЮШКА Васіль Ягоравіч, нарадзіўся ў 1923, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 24.3.1943, пахаваны ў в. Бызава.

КОРАНЬ Уладзімір Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1922, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 24.3.1943, пахаваны ў в. Бызава.

ЛЯМНІЦКАЯ Ульяна Сямёнаўна, расстраляна ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ЛЯМНІЦКІ Васіль Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1926, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1944.

ПАДАЛІНСКІ Аркадзь Данілавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 24.3.1943, пахаваны ў в. Бызава.

ПОСТРАШ Аляксей Васілевіч, нарадзіўся ў 1923, расстраляны 23.5.1944.

СІВУХА Аркадзь Тарасавіч, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1944.

ТРЫБУЛЬ Фёдар Карнеевіч, нарадзіўся ў 1924, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 12.4.1943.

ВЁСКА ЧУВАТАВА

ГАЕЎСКІ Мікалай Раманавіч, з 14.2.1942 у партызанскай брыгадзе «Граза», загінуў 14.3.1944.

ПАЛІВЯНОК Міхаіл Максімавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан атрада «За Радзіму» брыгады «Граза», прапаў без вестак 25.5.1944.

ПАЛІВЯНОК Уладзімір Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1925, загінуў у партызанах.

СЕЛІХАНОВІЧ Парфен Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1923, партызан брыгады «Граза».

ЧУМАКОВА Ксенія Іванаўна, нарадзілася ў 1908, забіта ў 1944 за сувязь з партызанамі.

ЧУМАКОВА Праскоўя Андрэеўна, нарадзілася ў 1878, забіта ў 1944 за сувязь з партызанамі.

ЧУМАКОЎ Павел Іванавіч, загінуў у партызанах.

ВЁСКА ШУПЕНІ

ВЯРБІЦКІ Нічыпар, расстраляны ў 1943.

КАМЯКОВА Марыя Якаўлеўна, нарадзілася ў 1920.

КАМЯКОЎ Сцяпан Пятровіч, загінуў у партызанах.

КАМЯКОЎ Яфім Аўрамавіч, нарадзіўся ў 1901, расстраляны ў 1944.

КУЛЕШ Артур Раманавіч, спалены фашыстамі ў 1944 у в. Алёнавічы.

ЛУЦАПКОВІЧ Васіль Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1916, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ЛУЦАПКОВІЧ Васіль Захаравіч, партызан, загінуў 14.2.1943, пахаваны ў в. Абольцы.

ПАЛІВЯНОК Лукаш Давыдавіч, нарадзіўся ў 1878, расстраляны ў 1944 за сувязь з партызанамі.

ПАЛІВЯНОК Лукаш Пракопавіч, нарадзіўся ў 1912.

ПАЛІВЯНОК Міхаіл Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1928.

ПАРАНОК Марыя Якаўлеўна, нарадзілася ў 1918, расстраляна ў 1944 за сувязь з партызанамі.

ШАЎРОЎ Дзмітрый Яфімавіч, партызан, загінуў у 1942.

К. І. Чумакова.

П. І. Чумакоў.

ШАЎРОЎ Іван Паўлавіч, нарадзіўся ў 1928, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ШУПЕНЬКА Аляксей Азаравіч, спалены фашыстамі ў 1944 у в. Алёнавічы.

АЗЕРАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЗЕРЦЫ

АНГЯЛЁНАК Генадзь Пятровіч, нарадзіўся ў 1926, з 1942 партызан брыгады М. П. Гудкова, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

БЕЛЬСКАЯ Ева Іванаўна, нарадзілася ў 1922, вывезена гітлераўцамі на катаржныя работы ў Германію, назад не вярнулася.

БУБЯНОК Леанід Тарасавіч, нарадзіўся ў 1913, у 1942—44 сувязны партызанскай брыгады М. П. Гудкова, расстраляны ў 1944 у Барысаве.

БЯЗЗУБІК Аланас Іванавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў у красавіку 1944, пахаваны ў Чашніцкім р-не.

ВЕРЦЯХОЎСКАЯ Людміла Іванаўна, нарадзілася ў 1925, расстраляна ў студзені 1944 у в. Азерцы за сувязь з партызанамі.

МІЦКЕВІЧ Аркадзь Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1926, партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў 8.6.1944.

МІЦКЕВІЧ Іосіф Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1911, жыў у Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл., працаваў дырэктарам школы, расстраляны фашыстамі разам з сям'ёй у 1942 у в. Курганок Клічаўскага р-на.

ПАДАЛІНСКІ Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1922, партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў 12.6.1944, пахаваны ў Лепельскім р-не.

У. А. Корань.

А. І. Яўсееў.

С. І. Яўсееў.

ПЛАКСІЦКІ Аляксандр Пракопавіч, нарадзіўся у 1905, працаваў дырэктарам тэкстыльнай фабрыкі ў Аршанскім р-не; у час вайны жыў у в. Варанцэвічы, расстраляны ў Талачыне за сувязь з партызанамі.

ПЛІЦ Аляксандра Пятроўна, нарадзілася ў 1924, партызанка брыгады М. П. Гудкова, загінула 8.6. 1944.

САВІЦКІ Анатоль Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1923, забіты пры спробе пайсці ў партызаны ў лютым 1943.

САВІЦКАЯ Марыя Мартынаўна, расстраляна ў лютым 1943 у Талачыне за сувязь з партызанамі.

СІРГЕЕЎ Аляксандр Фёдаравіч, партызан, памёр ад ран 19.1.1944, пахаваны каля в. Вялікая Бярэзіна Руднянскага р-на Смаленскай вобл.

ЦЯРКОЎ Уладзімір Антонавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў 14.1.1944, пахаваны ў Чашніцкім р-не.

Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Жураўлі.

ЯЎСЕЕЎ Андрэй Ісакавіч, нарадзіўся ў 1921, партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў 17.6. 1944.

ЯЎСЕЕЎ Станіслаў Ісакавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан брыгады М. П. Гудкова, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

ВЕСКА ВУГАЛЕЎШЧЫНА

ГАЛАВАЧ Іосіф Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1910, расстраляны ў 1944 у Барысаве за сувязь з партызанамі.

ГЛЯК Дзям'ян, жыў на хутары Каспарава, расстраляны ў сакавіку 1942 за сувязь з партызанамі.

КАРОТКАЯ Кацярына Андрэеўна, нарадзілася ў 1922, член КПСС, медсястра, загінула ў партызанах пад Ленінградам.

ВЕСКА ГАЛЬІНКА

ПЛІСКО Віктар Васілевіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў 10.3.1943, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Жукнева.

ШАТКОВА Алена Іосіфаўна, нарадзілася ў 1925, член ВЛКСМ, забіта 9.2.1944 у Рацаўскім лесе, дзе хавалася ад фашыстаў.

ШАТКОЎ Палікарп Васілевіч, нарадзіўся ў 1879, **ШАТКОВА Ефрасіння**, нарадзілася ў 1880, яго жонка, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА ЛЮБАТЫНЬ

МАЦЮШЭЎСКАЯ Вольга Ягораўна, нарадзілася ў 1909, расстраляна 15.12.1943 за сувязь з партызанамі.

МАЦЮШЭЎСКАЯ Наталля Андрэеўна, нарадзілася ў 1881, расстраляна 15.12.1943 за сувязь з партызанамі.

Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Сіманава.

МАЦЮШЭЎСКІ Віктар Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў у баі ў чэрвені 1943.

МАЦЮШЭЎСКІ Уладзімір Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў 15.6.1943.

МАЦЮШЭЎСКІ Ягор Фаміч, нарадзіўся ў 1881, расстраляны 15.12.1943 за сувязь з партызанамі.

САКОМСКАЯ Ганна Іванаўна, нарадзілася ў 1922, расстраляна ў 1943 у Оршы за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА МАКСІМКАВА

МАЦУЛЕВІЧ Уладзімір Вікенцьевіч, нарадзіўся ў 1888, партызанскі сувязны, загінуў 7.9.1943, пахаваны ў Оршы.

ВЁСКА НОВАЕ ЗААЗЕР'Е

ЖУКОЎСКІ Сцяпан Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1911, да вайны працаваў дырэктарам школы; партызан, загінуў 9.4.1944.

ВЁСКА ПАЛЮДАВА

ЖУКОЎСКІ Аляксей Іванавіч, нарадзіўся ў 1903, загінуў 2.9.1942, пахаваны на могілках у Палюдаве.

КУКСЕВІЧ Яўген Ягоравіч, нарадзіўся ў 1925 у Оршы, партызан, прапаў без вестак у студзені 1944.

СЫРАДОЕЎ Міхаіл Піліпавіч, нарадзіўся ў 1918, удзельнік партызанскага руху з сакавіка 1943 да лістапада 1944, загінуў у 1944 у Пінскім р-не.

ВЁСКА РАЦАВА

АНТАШКЕВІЧ Ганна Дзянісаўна, расстраляна ў Шклове за сувязь з партызанамі.

АНТАШКЕВІЧ Яўгенія Дзянісаўна, расстраляна ў Шклове за сувязь з партызанамі.

АЎДЗЕЕВА Галіна Міронаўна, нарадзілася ў 1922, расстраляна ў Шклове за сувязь з партызанамі.

БАБРОВІЧ Барыс Міхайлавіч, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ДЗЯНІСАЎ Аляксандр Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1922, камандзір аддзялення партызанскага атрада, загінуў 10.8.1943 у г. п. Коханава.

ЗЕЛЯНКЕВІЧ Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1912, загінуў 5.1.1943 у Крупскім р-не.

КУДЗЯН Любоў Фёдараўна, нарадзілася ў в. Дуброўскія, жыла ў Рацаве, расстраляна за сувязь з партызанамі.

МАЦЮШЭЎСКАЯ Вера Ігнатаўна, расстраляна ў Шклове за сувязь з партызанамі.

МАЦЮШЭЎСКАЯ Любоў, расстраляна за сувязь з партызанамі.

МАЦЮШЭЎСКАЯ Яўгенія, загінула ў час варожай бамбардзіроўкі в. Рацава.

МІРОНАВА Галіна Аўдзеёўна, расстраляна за сувязь з партызанамі.

НОВІКАЎ Барыс Нічыпаравіч, загінуў у 1943.

НОВІКАЎ Нічыпар, нарадзіўся ў 1892, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ФІКАВА Марыя, загінула ў час варожай бамбардзіроўкі в. Рацава.

ШАТКОЎ Пётр, нарадзіўся ў 1923, да вайны працаваў участковым міліцыянерам; загінуў 5.6.1943 у в. Клімава.

ВЁСКА РЦІШЧАВА

РАЖАНСКІ Апанас Емяльянавіч, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА РЭЧКІ

ЖУРАЎСКІ Антон Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1907, фашысты прымусова пагналі ў абоз, загінуў каля г. Ельня.

ВЁСКА СВІРАНІ

ЛУКАШЭВІЧ Альберт Браніслававіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў 8.3.1944.

ВЁСКА СІМАНАВА

ЖДАНОВІЧ Дамітрый В., нарадзіўся ў 1908, закатаваны фашыстамі.

ЖДАНОВІЧ Фядосся С., нарадзілася ў 1878, закатавана фашыстамі.

КУРАКОЎ Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1909, у пачатку вайны трапіў у палон, у верасні 1941 родныя забралі дамоў з Коханаўскага лагера ваеннапалонных. 18.2.1944 фашысты прымусова пагналі ў абоз, прапаў без вестак.

Мірныя жыхары в. Сіманава, забітыя ў час карнай экспедыцыі 28.5.1944:

ДРАНЕЎСКАЯ Настасся П., нарадзілася ў 1891;
ЖДАНОВІЧ Фёкла Сідараўна, нарадзілася ў 1917, яе дзеці **ЖДАНОВІЧ Віталь Дамітрыевіч** (7 гадоў), **ЖДАНОВІЧ Людміла Дамітрыеўна** (5 гадоў), **ЖДАНОВІЧ Валя** (нарадзіўся ў 1944);
ПРАМУЗА Марыя Фёдараўна, нарадзілася ў 1875;
СІВІРСКАЯ Кацярына Сідараўна, яе дзеці **СІВІРСКАЯ Эмілія** (8 гадоў), **СІВІРСКАЯ Інэса** (6 гадоў);
ШЭЙКА Васіль Герасімавіч, нарадзіўся ў 1881;
ШЭЙКА (ЯРЭМА) Фядосся Сяргееўна, нарадзілася ў 1893.

ВЁСКА СЛАБАДА

АЛЕКСЯЕВІЧ Іван Самуілавіч, партызан, загінуў 9.3.1944, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Галошава.

АЛЕКСЯЕВІЧ Сцяпан Яфімавіч, партызан, загінуў 9.3.1944, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Галошава.

БУКШТЫНАВА Марыя Андрэеўна, БУКШТЫНАЎ Фёдар Кандратавіч, вясной 1944 фашысты схапілі іх за сувязь з партызанамі і павезлі ў Барысаў, дзе і загінулі.

ДАРАФЕЕНКА Парфен Цітавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, прапаў без вестак.

ЖЫЛДЗІН Іван Пятровіч, нарадзіўся ў 1913, партызан, загінуў 9.3.1944, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Галошава.

МАНГАЛЕЎ Рыгор Васілевіч, нарадзіўся ў 1912, да вайны працаваў загадчыкам Дрыбінскага райана; загінуў 10.6.1944, пахаваны ў в. Заазер'е Бялыніцкага р-на.

ФЕДАРЭНКА Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1921, партызан, загінуў 9.3.1944, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Галошава.

ЧАРТАРЫЦКАЯ Галіна Антонаўна (12 гадоў), загінула ў 1944.

ЧУБАКОЎ Васіль Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1921, партызан, загінуў 9.3.1944, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Галошава.

КОХАНАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА АСТРАШАПКІ

У кастрычніку 1943 г. на бальшаку Абольцы — Коханава, непадалёку ад в. Астрашапкі, падарвалася на партызанскай міне аўтамашына з двума афіцэрамі. 7.10.1943, калі многія жыхары Астрашапак капалі бульбу на сваіх агародах, гітлераўцы акружылі вёску, прымусілі ўсіх сялян распрэгчы коней, кінуць плугі і прычапіць бароны. Усіх людзей сагналі ў цэнтр вёскі, мужчыны з коньмі ішлі наперадзе, за імі шчыльным натоўпам ішлі жанчыны з дзецьмі, па баках — гітлераўцы з аўтаматамі, а ззаду ехаў танк, на якім быў устаноўлены кулямёт. Калі падышлі да месца ўзрыву, фашысты разагналі коней, а людзей пагналі далей, і тут жа раздаўся выбух. Жыхары гавораць, што ён быў вельмі моцны. На абочыне дарогі стаяў падбіты савецкі танк, дык узрыўной хваляй на яго закінула трох жанчын. Яны як ішлі, цесна прыціснуўшыся адна да адной, так і загінулі разам. Гэта былі Петрашкевіч Ліда, Зося і Дар'я. Была паранена дзяўчына Валя (11—12 гадоў), яе завезлі ў Талачынскую бальніцу, яна там памерла ад ран. Пасля выбуху людзі спрабавалі выратавацца ўцёкамі, аднак гітлераўцы пачалі страляць па іх з аўтаматаў. Фашысты сабралі ўсіх, хто застаўся жывы, і прымусілі іх прайсці ўвесь бальшак да в. Марцюхова. Петрашкевіч Любоў Цімафееўна памятае тое страшэннае відовішча і кажа, што забыць яго нельга. Яна была на гэтай дарозе з трохгадовай дачкой Нілай, дзяўчынцы асколкам параніла руку і застаўся знак. Уцячы яны не паспелі і прыйшлося ісці з параненай дзяўчынкай да Марцюхова і назад.

Карашкевіч Зоя Іванаўна (ёй у час вайны было 15 гадоў) прыгадвае, як яе з маці і аднавяскоўцамі гналі па дарозе. Калі міна ўзарвалася, маці забіла адразу, а ёй удалося ўцячы, яна дабралася да сваякоў у суседнюю вёску і не бачыла, калі хавалі яе маці. На месцы ўзрыву яшчэ доўга стаяў чорны дым, людзі потым сабралі астанкі нявінных ахвяр і пахавалі.

Так загінулі 12 мірных жыхароў вёскі:

АНТАНЕВІЧ Васіль Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1882;
АНТАНЕВІЧ Ульяна Пятроўна, нарадзілася ў 1902;
БУЛАЎКІНА Ганна Ларыёнаўна, нарадзілася ў 1902;
ЛАЎРЫНОВІЧ Валянціна Дамітрыеўна (10 гадоў);
ЛАЎРЫНОВІЧ Наталля Емяльянаўна, нарадзілася ў 1885;
ЛЯШКОЎ Андрэй Лук'янавіч, нарадзіўся ў 1910;
ПЕТРАШКЕВІЧ Ганна Ульянаўна, нарадзілася ў 1922;
ПЕТРАШКЕВІЧ Дар'я Ягораўна, нарадзілася ў 1905;
ПЕТРАШКЕВІЧ Зося Ігнацьеўна, нарадзілася ў 1875;
ПЕТРАШКЕВІЧ Лідзія Яфімаўна, нарадзілася ў 1914;
ПЕТРАШКЕВІЧ Лукер'я Цімафееўна, нарадзілася ў 1913;
СЛІЖАНКОВА Марыя Купрыянаўна, нарадзілася ў 1885.

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у вёсцы Галошава.

М. М. Ганкевіч.

В. Н. Ражанскі.

З. У. Дземяшкевіч.

П. Д. Кудраўцаў.

ВЁСКА ГАЛОШАВА

АНІКЕЕВА Лідзія Васілеўна, нарадзілася ў 1918, працавала настаўніцай у в. Галошава; схоплена фашыстамі і адпраўлена ў Талачын, загінула ў 1943.

БУБКОВА Еўдакія Цітаўна, нарадзілася ў 1914 у в. Малое Гальцава, працавала ў школьнай сталовай у в. Галошава; сувязная партызанскага атрада, загінула ў 1943.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Зінаіда Уладзіміраўна, нарадзілася ў 1914, партызанская сувязная, загінула ў снежні 1943.

ДОДРЫНА Марыя, нарадзілася ў 1912, расстраляна разам з чацвярымі дзецьмі.

ЗАВАДСКАЯ Настасся Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1920.

КАТЛОЎСКАЯ Марыя Іванаўна, нарадзілася ў 1911, працавала ў г. п. Коханава, загінула ў 1943.

ПАНОЎ Барыс Ягоравіч, нарадзіўся ў 1912, ваеннапалонны, у перыяд фашысцкай акупацыі жыў у в. Галошава, загінуў у снежні 1943.

ВЁСКА ГАЛОШАЎКА

АРЦЮШКЕВІЧ Варвара, жонка партызана.

АРЦЮШКЕВІЧ Фёдар Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў у 1943.

ГАНКЕВІЧ Мікалай, лейтэнант, партызан, расстраляны ў 1943.

ДЗЕМБАВЕЦКІ Адам Пятровіч, нарадзіўся ў 1924, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

КУДРАЎЦАЎ Павел Данілавіч, нарадзіўся ў 1919, расстраляны ў лютым 1943 за сувязь з партызанамі.

МАСАЛКОЎ Антон Ясонавіч, нарадзіўся ў 1901, член КПСС, расстраляны 9.7.1941.

РАЖАНСКІ Васіль Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1923, член ВЛКСМ, расстраляны ў лютым 1943 за сувязь з партызанамі.

ХОДАС Пётр Данілавіч, нарадзіўся ў 1923, расстраляны як падпольшчык у Талачыне ў 1943.

ВЁСКА ЗААЗЕР'Е

ПАУЛОЎСКІ Андрай, нарадзіўся ў 1902, расстраляны ў Барысаве.

ВЁСКА ЗАБАЙКАЛ

ШВЕДКА Сцяпан Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1900, член КПСС, першы старшыня калгаса «Энергія», працаваў старшынёй Пярэвалачнянскага сельсавета; пакінуты для эвакуацыі маёмасці калгасаў, па даносу былога кулака схоплены гітлераўцамі і расстраляны 5.11.1941 у лесе каля Коханава, пазней перапахаваны ў в. Пярэвалачня.

ВЁСКА ЗАМОШША

АГЕЕНКА Марыя Сямёнаўна, нарадзілася ў 1927, расстраляна фашыстамі ў лесе каля дарогі Орша — Лепель.

АГЕЕНКА Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1890, у час карнай экспедыцыі 2.11.1943 схоплены фашыстамі і па-зверску закатаваны.

БАТУРЫН Уладзімір Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1918, працаваў на партызанскім мыне, загінуў у 1943.

ДАНІЛАВА Лідзія Міронаўна, нарадзілася ў 1924, у час карнай экспедыцыі фашыстаў у лістападзе 1943 была цяжка паранена, згарэла ў час пажару ў вёсцы.

ДАНІЛАЎ Мірон Пракопавіч, нарадзіўся ў 1889, расстраляны ў час карнай экспедыцыі 2.11.1943.

ІВАНОЎ Віктар (7 гадоў), загінуў у час карнай экспедыцыі 2.11.1943 у лесе каля в. Замошша.

КАВАЛЕВА Ганна Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1880, расстраляна ў час карнай экспедыцыі 2.11.1943 і спалена ў сваім доме.

КРЫВІЦКІ Фама Лукіч, нарадзіўся ў 1880, расстраляны ў час карнай экспедыцыі 2.11.1943.

КРЫВІЦКІ Яфім Лукіч, нарадзіўся ў 1892, расстраляны ў час карнай экспедыцыі 2.11.1943.

МАРУСЕВІЧ Марыя Іванаўна, нарадзілася ў 1900, расстраляна ў час карнай экспедыцыі 2.11.1943 у сваім доме.

ПАДАЛІЦКІ Іван Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1916, вывезены фашыстамі ў 1943 на катаванне акопаў у Дубровенскі раён, там і расстраляны.

ПЛАКСІЦКІ Уладзімір Андрэевіч, нарадзіўся ў 1936, расстраляны ў час карнай экспедыцыі 2.11.1943 у сваім доме.

САВІНІЧ Мікалай, нарадзіўся ў 1901, у час карнай экспедыцыі 2.11.1943 забіты і згарэў у доме разам з маці, жонкай, сынам; **САВІНІЧ Н. Т.**, нарадзілася ў 1870; **САВІНІЧ Таццяна Мікітаўна**, нарадзілася ў 1907; **САВІНІЧ Пётр Мікалаевіч**, грудное дзіця; разам з імі згарэлі двое бежанцаў — стары і хлопчык.

САЗОНАЎ Павел Паўлавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Смаляны Аршанскага р-на, жыў у в. Замошша, схоплены фашыстамі, адпраўлены ў Оршу і там расстраляны.

ШАЎНЯ Якаў І., нарадзіўся ў 1903.

ВЁСКА ЗВЯНЯЧЫ

АРЦЮШКЕВІЧ Фёдар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1928, загінуў у партызанах на тэрыторыі Талачынскага р-на.

Ф. С. Кудзян.

Г. А. Савініч.

А. П. Пруткова.

М. П. Сухадольская.

КАРМАЗІНАВА Еўдакія Кандрацьеўна, нарадзілася ў 1910, член КПСС, працавала настаўніцай; у 1944 схоплена фашыстамі за сувязь з партызанамі і адпраўлена ў Барысаў, дзе і расстраляна.
КУДЗЯН Міхаіл Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1906, партызанскі сувязны.
КУДЗЯН Фёдар Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1915, член КПСС, партызан.
МІХАЙЛАЎ Якаў, нарадзіўся ў 1900.
САВІНІЧ Ганна Арцёмаўна, нарадзілася ў 1911, працавала аграномам у Сенненскім р-не, партызанка.

ВЁСКА КІСЯЛІ

САЎЧАНКА Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1919, член КПСС, партызан-падрыўнік, расстраляны ў Талачыне.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК КОХАНАВА

БУРВІНА Іина, нарадзілася ў 1939.
ЗЯЦЕЎ Аляксандр Данілавіч, нарадзіўся ў 1903.
КАТКОЎ Арцём, расстраляны ў 1942 разам з сям'ёй (5 чалавек).
ЛЕПЯШЫНСКІ Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1893, расстраляны 27.7.1941 у г. п. Кохановa.

СТАНЦЫЯ КОХАНАВА

БАРЫСАЎ Іван Пятровіч, нарадзіўся ў 1915, партызан, загінуў 30.5.1943.

ВЕСКА КРУГІ

ЗЯЦЕЎ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1920, расстраляны за сувязь з партызанамі ў жніўні 1942.

ВЕСКА КУВЕЧЫНА

КАЗЛОЎСКАЯ Настасся Ягораўна, нарадзілася ў 1918, расстраляна за сувязь з партызанамі.
ПРУТКОВА Аляксандра Пятроўна, нарадзілася ў 1921, партызанка, загінула 25.12.1943.
ПУНЧАЙКА Іосіф Піліпавіч, нарадзіўся ў 1915, расстраляны за сувязь з партызанамі ў г. п. Кохановa.

ВЕСКА КУЧЫНА

ЛЯВУРДА Аляксей Паўлавіч, схоплены фашыстамі за сувязь з партызанамі.

ВЕСКА ЛІПНІКІ

БАБАРЫКА Віталь, нарадзіўся ў 1918.

ВЕСКА ЛЯЎКОВА

КАНАПЛЕЎ Віктар, нарадзіўся ў 1895.

ВЕСКА МАЛОЕ ГАЛЬЦЭВА

БАНДАРЭВІЧ Цімафей, нарадзіўся ў 1919.
ГАМБАЛЕЎСКІ Барыс, нарадзіўся ў 1921.
КОЖАР Варфаламей, нарадзіўся ў 1923.
МІЦКЕВІЧ Уладзімір Ягоравіч, партызан, загінуў у маі 1944, пахаваны ў в. Анэліна.
СУХАДОЛЬСКАЯ Марыя Пятроўна, нарадзілася ў 1911, працавала старшынёй калгаса ў в. Лявонькава; партызанка, загінула летам 1944 у в. Паршні Сенненскага р-на, пахавана ў в. Масюкі Аршанскага р-на.

ВЕСКА МАРЦЮХОВА

ВІНАГРАДАЎ Міхаіл Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1913, з 1941 у партызанах, сувязны, расстраляны гітлераўцамі ў 1944, пахаваны ў в. Кучына.
КАЗЛОЎСКІ Мікалай Аляксеевіч, партызан, загінуў 13.11.1942, пахаваны ў в. Слабада Смалявіцкага р-на.
КАЛІНОЎСКІ Андрэй Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1930.

І. Н. Каліноўскі.

А. М. Горскі.

Ц. Р. Мусянкоў.

М. М. Шумскі.

Л. І. Петрашкевіч.

Л. Дз. Цюніс.

КАЛІШОЎСКІ Іван Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1922. Калі гітлераўцы забралі яго ў паліцыю, ён падарваў будынак паліцыі і пайшоў у партызаны разам з братам Андрэем. Абодва загінулі ў баі ў 1943, падарваўшы сябе гранатай, калі іх акружылі фашысты.

КАЛІШОЎСКІ Нічыпар Іванавіч, нарадзіўся ў 1895, расстраляны як бацька партызан у 1943.

НЯХАЕЎ Аркадзь Цімафеевіч, у 1943 падарваўся на міне ў в. Астрашанкі.

РУБАНОВІЧ Канстанцін Іванавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан.

ТРАЦЭЎСКАЯ Валянціна Маркаўна, нарадзілася ў 1922, забіта 8.5.1944.

ВЁСКА НАГАЎКІ

ГАЕЎСКІ Мікалай Макаравіч, нарадзіўся ў 1935, падарваўся на міне ў 1946.

КАМАРОЎСКІ Уладзімір Максімавіч, нарадзіўся ў 1920, член КПСС, працаваў настаўнікам у Нясвіжы; загінуў у 1944, калі нямецкі самалёт разбамбіў школу.

ШАЦКІ Аркадзь Каліставіч, нарадзіўся ў 1925.

ШАЦКІ Міхаіл Каліставіч, нарадзіўся ў 1918, расстраляны ў 1944 за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА ПУСЬКІ

ГОРСКАЯ Валянціна Ніканаўна, працавала настаўніцай, партызанка.

ГОРСКІ Аляксей Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1923, партызан.

МУСЯНКОЎ Цімафей Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1911.

САНКОЎСКІ Яўген Паўлавіч, нарадзіўся ў 1923, студэнт.

ЧАПЕЛАЎ Даяніс Іванавіч, нарадзіўся ў 1913.

ВЁСКА ПЯРЭВАЛАЧЧЯ

АЎЛАСЕНКА Марыя Ягораўна, нарадзілася ў 1918, член КПСС, працавала настаўніцай; партызанская сувязная, расстраляна 30.3.1943, пахавана ў в. Пярэвалачча.

КАТУЖАНЕЦ Ягор Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1903, расстраляны ў сваім доме 20.5.1943.

НАРЧУК Кацярына Максімаўна, нарадзілася ў 1916, расстраляна ў 1942 каля в. Усвіж-Бук за сувязь з партызанамі.

ПЕТРАШКЕВІЧ Лявон Іванавіч, нарадзіўся ў 1902, з 1941 у Чырвонай Арміі, пасля фашысцкага палону вярнуўся дадому; па даносу здрадніка схоплены гітлераўцамі, загінуў у лістападзе 1941 у канцлагеры ў Барысаве.

ЦЮНІС Іван Ільіч, у 1943 памёр ад ран.

ЦЮНІС Лідзія Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1913, член КПСС, працавала настаўніцай ва Ушацкім р-не; загінула ў 1944 у канцлагеры Дахаў.

ШУМСКІ Міхаіл Максімавіч, нарадзіўся ў 1918 г., да вайны служыў у Чырвонай Арміі, сяржант, камандзір аддзялення; у час вайны сувязны, з кастрычніка 1943 г. партызан атрада «Перамога», пазней разведчык брыгаднай разведкі партызанскай брыгады «Граза», па-геройску загінуў 24.6.1944 у няроўным баі ў в. Чараёўка Крупскага р-на.

...Карнікі акружылі хату. Трое партызан, якія вымушаны былі прыняць у ёй няроўны бой, мужна і адчайна імкнуліся вырвацца з кальца. Аднак сілы былі няроўнымі. Загінулі таварышы. Усё радзей і радзей адказваў ворагу кулямёт Мішы Шумскага, а потым і зусім змоўк. «Здавайся»,— крычалі фашысты. У адказ гарышча, а потым і хата ўспыхнула полымем. Разведчык Шумскі не захацеў здацца ворагу жывым...

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у вёсцы Рамашкава.

Ф. З. Бладыка.

П. Д. Кляўзо.

У. Ф. Косінец.

І. Е. Шаўня.

ВЕСКА РАМАШКАВА

АГЕЕНКА Пелагея, у чэрвені 1944 у час баявых дзеянняў згарэла ў хляве.

АЛЕЙНІКАЎ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1919 у в. Лявонькава, жыў у в. Рамашкава, член КПСС, працаваў сакратаром Гальдаўскага сельсавета; прапаў без вестак у 1941 у час адступлення савецкіх войск.

БЛАДЫКА Фёдар Захаравіч, нарадзіўся ў 1923, член ВЛКСМ, працаваў настаўнікам у Дуброўне; з 1942 партызан брыгады «Граза», загінуў 8.12. 1943 пры спробе захапіць у палон бургамістра, пахаваны ў в. Галошаўка.

ВАСІЛЕНАК Сямён Аляксандравіч, працаваў вагаўшчыком у калгасе «Шлях да сацыялізму»; прапаў без вестак у 1941 у час адступлення савецкіх войск.

КОСІНЕЦ Уладзімір Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1916, ст. лейтэнант, танкіст, удзельнік баёў на Халхін-Голе ў 1939; у 1941 трапіў у фашысцкі палон, уцёк і ў 1942 вярнуўся дадому, па заданню партызан працаваў бургамістрам у в. Рамашкава, потым пайшоў у партызаны ў брыгаду «Граза», загінуў у час блакады ў 1944.

ЛЯХНОВІЧ Пелагея Гаўрылаўна, нарадзілася ў 1900, закатавана фашыстамі ў сваім доме.

ШАЎНЯ Іван Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1922, працаваў у калгасе «Шлях да сацыялізму», з 1943 партызан брыгады «Граза», загінуў у 1944 у час блакады.

ЯРОМА Пётр Харытонавіч, у час баявых дзеянняў у чэрвені 1944 быў забіты асколкам снарада, пахаваны ў в. Рамашкава.

ВЕСКА САЛЬНІКІ

РАЖАНСКІ Дзям'ян Іванавіч, нарадзіўся ў 1915, працаваў у калгасе «Маяк камуны»; расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі, пахаваны ў в. Сальнікі.

РАЖАНСКІ Уладзімір Сідаравіч, нарадзіўся ў 1924, член ВЛКСМ, з 1942 у партызанах, загінуў у 1944 у в. Мошава, пахаваны ў в. Галошаўка.

ВЕСКА СТАРЫНКІ

ГАЕЎСКІ Мікалай Прохаравіч, нарадзіўся ў 1931, 28.8.1945 падарваўся на міне.

ВЕСКА ШАПЧЫНА

ЖЫТКЕВІЧ Ірына Якаўлеўна, нарадзілася ў 1898, расстраляна ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ЖЫТКЕВІЧ Марыя Фёдараўна, нарадзілася ў 1910, расстраляна ў 1943 у Оршы за сувязь з партызанамі.

КЛЯЎЗО Паліна Данілаўна, нарадзілася ў 1912, працавала настаўніцай у Мінскай вобл.; сувязная партызанскага атрада «Чэкіст», 29.7.1943 схоплена фашыстамі і 17.8.1943 расстраляна ў Оршы.

КУКАЛЬ Сямён Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1921.

МУСІЯНКОЎ Цімафей Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1916, працаваў майстрам на чыгунцы ў Мінску; расстраляны 21.1.1943 за сувязь з партызанамі.

ХАДОРЫК Максім Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1908 у Оршы, жыў у в. Шапчына; камандзір партызанскага атрада, расстраляны ў 1943 у Рацаўскім лесе.

ХАДОРЫК Павел Канстанцінавіч, нарадзіўся ў Оршы, жыў у в. Шапчына; партызан.

ХАДОРЫК Уладзімір Максімавіч, 2 гады, сын камандзіра партызанскага атрада, расстраляны фашыстамі.

ЧАРКАСАВА Рэа, нарадзілася ў 1915.

ЧАРКАСАЎ Барыс, нарадзіўся ў 1937.

ЧАРКАСАЎ Уладзімір, нарадзіўся ў 1939.

ВЕСКА ШЫЛАЎКА

МАСАЛКОЎ Парфён, нарадзіўся ў 1909.

І. Я. Жыткевіч (злева) і М. Ф. Жыткевіч.

С. М. Гарміновіч.

Н. М. Токарава.

Я. К. Мацыль.

Ф. А. Кармалькоў.

ПЛОСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА БАРСУЧЫНЫ

ГАРМІНОВІЧ Ганна Цімафееўна, нарадзілася ў 1912.

ВЕСКА БУКАВІНА

РУБАНАЎ Аляксандр Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, прапаў без вестак 3.5.1944.

ШМІГЕЛЬСКІ Эдуард Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1925, да вайны працаваў у саўгасе «Навінка»; партызан брыгады «Граза», загінуў 19.2.1944.

ВЕСКА ВАЛЬКІ

МЯСАЕДАВА Васіліса, расстраляна ў 1944.

ХАЛЕЦКАЯ Алена Якаўлеўна, забіта фашыстамі.

ХАЛЕЦКІ Яфім Самуілавіч, партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў у 1943.

ВЕСКА ВЯЛІКІЯ БАРСУЧЫНЫ

ГАРМІНОВІЧ Сямён Малахавіч, расстраляны фашыстамі за сувязь з партызанамі.

ГАРНАСТАЕЎ Іван Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны працаваў у калгасе; партызан, памёр ад хваробы ў маі 1944.

ЧАЦВЯРЭНЬКА Мікалай Майсеевіч, партызан, загінуў у маі 1944, пахаваны ў в. Гара Чашніцкага р-на.

ЧАЦВЯРЭНЬКА Міхаіл Майсеевіч, нарадзіўся ў 1930, у 1944 падарваўся разам з траімі іншымі дзецьмі на фашысцкай міне.

ВЕСКА ГАСТЫНІЧЫ

ВЫРВІЧ Ніна Сямёнаўна, нарадзілася ў 1919, забіта ў 1943 за сувязь з партызанамі.

МАЦЫЛЬ Яўген Кандратавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан атрада «За Савецкую Беларусь» брыгады «Граза», загінуў 25.5.1944.

ВЕСКА ДУНАВІК

ВЯРХОЎСКІ Цімафей Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1924, з 1941 у Чырвонай Арміі, у 1943 з Масквы заслан ў партызанскую брыгаду «Граза», загінуў у 1943.

ВЕСКА ЕЛЬНІК

НЯХАЕЎ Мін Дамітрыевіч, нарадзіўся ў 1896, расстраляны 12.5.1942 за сувязь з партызанамі.

ВЕСКА ЕЎЛАХІ

ВУГЛОЎ Іван Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1923, партызан 4-га атрада брыгады М. П. Гудкова, загінуў каля Барысава ў час прарыву з акружэння.

ЗУБЦОЎ Іван Данілавіч, нарадзіўся ў 1911, з лютага 1943 сувязны партызанскага атрада імя Аляксандра Неўскага брыгады «Граза», расстраляны ў лютым 1943.

ТОКАРАВА Настасся Майсеєўна, нарадзілася ў 1916, партызанка, была захоплена ў палон і расстраляна каля в. Маціёва.

ВЕСКА КАЛЮГІ

ГАЛУЗА Іван Пракопавіч, нарадзіўся ў 1925, з 1942 партызан брыгады «Граза».

ДЗІВАКОЎ Іван Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1926, схоплены паліцаямі і расстраляны.

ДЗІВАКОЎ Уладзімір Аляксандравіч, падарваўся на міне.

ЛУКАШЭВІЧ Баляслаў Адольфавіч, нарадзіўся ў 1928, партызанскі сувязны. Схоплены ў лесе, калі нёс гранаты. Каб не трапіць у рукі ворагу, падарваў гранатай сябе і фашыстаў.

ВЕСКА КЛЯНКІ

АНУФРЫЕЎ Уладзімір Максімавіч, нарадзіўся ў 1938, загінуў у 1943 у час варожай бамбёжкі.

ЖУРАЎЛЁВА Праскоўя, нарадзілася ў 1903, загінула ў 1943 у час варожай бамбёжкі.

МЯСАЕДАЎ Антон Андрэевіч, нарадзіўся ў 1910, загінуў у 1943 у час варожай бамбёжкі.

ЧАЧОТКІН Дамітрый Іванавіч, загінуў у 1943 у час варожай бамбёжкі.

ВЕСКА КРАСІЛАВА

УЛІЦІН Аляксандр, расстраляны за сувязь з партызанамі.

УЛІЦІН Павел, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ВЕСКА КРЫНІЦЫ

НЯЧАЕЎ Фёдар Раманавіч, нарадзіўся ў 1923 у в. Навінка, партызан атрада імя Аляксандра Неўскага брыгады «Граза», прапаў без вестак 23.5.1944.

ВЕСКА ЛАТЫГАЎКА

ДУБКОЎ Міхаіл Іосіфавіч, з 6.9.1942 у партызанскай брыгадзе «Граза», падрыўнік атрада імя Аляксандра Неўскага, загінуў 23.12.1943 пры ўзрыве варожага эшалона.

З успамінаў былога камандзіра атрада імя Аляксандра Неўскага партызанскай брыгады «Граза» Б. А. Антонава

Летам 1942 года на ўскрайку лесу партызанскія разведчыкі сустрэлі маладога хлопца, які папрасіў правесці яго ў штаб атрада. Камандаванне атрада пагутарыла з ім. Юнак прасіўся ў партызаны, даваў клятву добрасумленна ставіцца да сваіх абавязкаў і біць ворага без літасці. Прыняўшы партызанскую прысягу, Міхаіл Дубкоў, так звалі юнака, быў накіраваны ў дыверсійную групу атрада імя Аляксандра Неўскага. Малады партызан з першых дзён паказаў сябе смелым, патрабавальным да сябе байцом, выконваў усе заданні, якімі б цяжкімі яны ні былі.

Да канца 1942 года на асабістым рахунку Дубкова ўжо былі два варожыя эшалоны з жывой сілай і тэхнікай, некалькі аўтамашын, узарваных на аўтамагістралі Мінск — Масква.

У 1943 годзе Дубкоў пусціў пад адхон яшчэ некалькі цягнікоў, што ішлі на фронт. Позняй восенню 1943 года Міхась атрымаў чарговае заданне падарваць нямецкі эшалон у раёне станцыі Слаўнае. Падрыўнік выбраў удала месца, паставіў міну надзейнага дзеяння, але, адыходзячы ва ўкрыццё, выпадкова зачапіў нагой шнур, і міна ўзарвалася. М. Дубкоў загінуў. Мясцовыя жыхары пахавалі яго каля чыгуначнага палатна.

* * *

Доўгі час заставалася невядомай магіла М. І. Дубкова. Людзі памяталі выпадак гібелі партызана і, шануючы яго памяць, паставілі яму невялічкі абеліск з пліцаванай зоркай. Але хто ляжыць пад гэтым абеліскам, не ведалі. Групе чырвоных следапытаў Славенскай СШ пад кіраўніцтвам Я. А. Пасюціна ўдалося адшукаць людзей, якія ведалі загінуўшага партызана. Дапамог ім разгадаць тайну магілы і былы камандзір атрада Б. А. Антонаў, жыхар г. Дзімітраўград Ульянаўскай вобл.

ДУБКОЎ Тамаш Мікітавіч, у Чырвоную Армію прызываўся з Смаргоні, трацій у палон, уцёк, пасля партызаніў. расстраляны фашыстамі.

СІНЯКОЎ Іван, партызан.

СІНЯКОЎ Яўген Іванавіч, партызан, загінуў каля г.п. Крупкі ў час акружэння.

ВЕСКА ЛАТЫШОВА

ЛЕМЕШАЎ Сцяпан, нарадзіўся ў 1918.

СІНЯКОЎ Яўген Іванавіч, нарадзіўся ў 1926, партызан 4-га атрада брыгады М. П. Гудкова, прапаў без вестак 7.6.1944.

ВЕСКА НАВІНКА

АНУФРЫЕЎ Кузьма Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1892, меў сувязь з партызанамі, загінуў у 1942.

БЯДРЫЦКІ Міна Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1906 у в. Язы Крупскага р-на, да вайны працаваў у саўгасе «Навінка»; меў сувязь з партызанамі, загінуў у чэрвені 1944.

ГОЛІКАЎ Мікалай, партызан.

ДУБКОЎ Іосіф, нарадзіўся ў 1886.

ДУБКОЎ Фама Мікітавіч, нарадзіўся ў 1912.

ЖУРАЎСКАЯ Браніслава Іванаўна, нарадзілася ў 1926 у в. Букавіна, партызанка, загінула ў баі.

КАМІНСКІ Сцяпан, нарадзіўся ў 1908.

КАРМАЛЬКОЎ Фёдар Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1916, партызан, загінуў 12.4.1944.

НАРЧУК Іван Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1914.

НАРЧУК Ілья Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1927.

НАРЧУК Кацярына Максімаўна, нарадзілася ў 1916.

НАРЧУК Мікалай, нарадзіўся ў 1884.

САЛАЎЕВА Ганна Іванаўна, нарадзілася ў 1920 у в. Ротань Крупскага р-на, да вайны жыла ў в. Навінка, партызанка.

ВЕСКА ПЛОСКАЕ

ЖУРАЎЛЁЎ Раман Піліпавіч, партызан, расстраляны фашыстамі.

ВЕСКА ПРЫЛЕССЕ

БУГЛІК Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан 4-га атрада брыгады М. П. Гудкова, загінуў у лютым 1943 у час варожай бамбёжкі, пахаваны ў в. Слідчаны Чашніцкага р-на.

БУГЛІК Феня Кандратаўна, партызанка, расстраляна ў Талачыне.

КАРОЛЬКА Яфім Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1926, дапамагаў партызанам, загінуў у 1944.

КАРТАВІЦКІ Уладзімір Анісімавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў 13.1.1944, пахаваны ў в. Чарэя Чашніцкага р-на.

ЛЫСЕНКАЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1925, з 4.10.1943 у 4-м партызанскім атрадзе брыгады М. П. Гудкова.

ВЕСКА РАМАНАЎКА

ДАЛГАДЗЕЛІН Сяргей Іванавіч, нарадзіўся ў 1916, да вайны служыў у Чырвонай Арміі, з 1942 партызан брыгады «Граза», загінуў 23.6.1943, пахаваны ў Талачыне.

КАРТАВІЦКАЯ Лідзія Сафронаўна, памерла ў партызанскім атрадзе ад тыфу.

ВЕСКА САКАЛЯНКА

ЖУРАЎЛЁВА Любоў Сідараўна, нарадзілася ў 1926, да вайны працавала ў калгасе; забіта карнікамі, калі працавала на сваім агародзе.

ВЕСКА СТАРАЯ БУДАЎКА

ЛЕЎШУНОЎ Алег Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1932, забіты фашыстамі, калі ішоў у лес па дровы.

МАКІЕНАК Пётр Іванавіч, партызанскі сувязны, забіты, калі ішоў на сувязь.

МАКІЕНАК Сцяпан Астахавіч, расстраляны ў 1942 у Талачыне за сувязь з партызанамі.

СЕРКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА АНЕЛІНА

АНІКОВІЧ Леанід Дамітрыевіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, загінуў у 1943.

БАРАВУЛЯ Васіль Адамавіч, нарадзіўся ў 1923, са снежня 1943 партызан атрада імя М. В. Фрунзе брыгады «Граза», загінуў 12.12.1943.

БАРАВУЛЯ Захар Адамавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, загінуў 20.5.1944.

ГАРО Вікенцій Іванавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан атрада імя Аляксандра Неўскага брыгады «Граза», загінуў 10.12.1944, пахаваны ў в. Цяленкі Лепельскага р-на.

ГАРО Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў у 1943.

ГРАМАКОЎСКІ Іван Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1916, партызан брыгады Гудкова, загінуў у 1944, пахаваны ў в. Анеліна.

ІГНАТОВІЧ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1925, партызан атрада імя Аляксандра Неўскага брыгады «Граза», загінуў у 1944.

ІГНАТОВІЧ Іван Данілавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў у 1944.

КАСАЧ Васіль Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў у 1944.

МІРОНАЎ Віктар Пятровіч, нарадзіўся ў 1922, партызан атрада імя М. Ф. Гастэлы брыгады «Граза», загінуў 25.7.1943.

ПОЎКАЎ Аляксандр Мікалаевіч, партызан атрада імя М. Ф. Гастэлы брыгады «Граза», прапаў без вестак.

ТРЫБЕНДЗІС Станіслаў Францавіч, нарадзіўся ў 1923, член ВЛКСМ, партызан, загінуў 25.7.1943, пахаваны ў Талачыне.

З успамінаў Я. Ф. Сырыцынай, сястры С. Ф. Трыбендзіса, жыхаркі Талачына

...Калі брат адыходзіў у партызаны, ён сказаў: «Мамачка, не плач. Я буду біць ворага бязлітасна, не шкадуючы жыцця». Так яно і было. Аддаў жыццё за нас, за нашу светлую будучыню. Але на сэрцы заўсёды горка, бо яго няма з намі.

Быў ён у партызанскім атрадзе брыгады Гудкова. Дадому заязджаў рэдка. Калі прыедзе, хутка пераапранаўся, еў і зноў у дарогу. Аднойчы прыехаў ноччу верхам на чорным кані. У яго былі парваныя штаны, мама іх яму залатала, ён паеў і паехаў на заданне. Заданне было такое: спіляваць тэлефонныя слупы ад в. Равяцічы да в. Аболь-цы і ўзарваць мост ці то перад Трацылавам, ці то за ім. Было іх трое. У першую ноч яны зрэзалі слупы, але не ўсе. Паехалі на другую ноч, а там іх заўважылі паліцаі і пачалі страляць. Двое партызан уцяклі, а брата паліцаі схапілі... Яго адвезлі ў Талачын, у «Пушніну», дзе яго катавалі. Што нам было рабіць? Нас шукалі, а мы хаваліся па чужых хатах, хлявах. Больш за ўсё хаваліся ў дзеда Калусевіча, яго хата была ў пачатку вёскі, калі ехаць з Саколіна.

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у вёсцы Рыдамля.

25 ліпеня 1944 г. мы атрымалі на імя мамы паведамленне, што партызан Трыбендзіс Станіслаў Францавіч прапаў без вестак. Якое гэта было страшна-горкае паведамленне. І як яго можна было перажыць нашай маме, і нам, мне і брату Мечыку, хоць мы і былі тады малымі. Не стала ў мамы сына, а ў нас брата. А колькі такіх мам засталося? Няхай такія страшэнныя і горкія паведамленні ніколі не паўторацца! Каб такіх жахаў не ведалі ні дзеці нашы, ні ўнукі, ні праўнукі. Няхай заўсёды будзе мір і чыстае неба!

ХВАШЧЭЎСКІ Мікалай Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1927, партызан-падрыўнік брыгады імя М. П. Гудкова, загінуў 8.6.1944, пахаваны ў Талачыне.

З успамінаў Надзеі Сяргееўны Хвашчэўскай, бібліятэкара Апелінскай школы

...Калі ў нас у вёсцы даведаліся аб тым, што ў навакольных лясах арганізоўваюцца партызанскія атрады, больш чым 30 чалавек пайшло ў партызаны. Восенню 1941 г. наладзіў сувязь з партызанамі і мой бацька. Мне ў той час было 10 гадоў, а ўсіх нас, дзяцей, было чацвёра. І вось адзін з мясцовых паліцаяў данёс, што ў нашай хаце збіраюцца партызаны. Наехалі карнікі. Бацькі паспелі схавацца. Нфрэм Кавалёў дапамог ім. Уварваўшыся ў хату, раз'юшаныя ворагі сталі дапытвацца ў нас, дзе бацькі, хто да нас ходзіць. Мы адказвалі, што нічога не ведаем. Тады яны сталі біць самага меншага, Жору, які нарадзіўся ў 1938 годзе. Мы плакалі ад болю, нянавісці, страху, а азвярэлыя гітлераўцы пераварочвалі ўсё ў хаце ўверх дном. Нарэшце яны паехалі. Той жа ноччу бацька і старэйшы брат Коля пайшлі ў партызаны. Мікалай удзельнічаў у розных баявых аперацыях, хадзіў у разведку. Выконваючы заданне на тэрыторыі Крупскага раёна, ён трапіў у лапы гітлераўцаў, але тады яму удалося ўцячы. Загінуў ён пазней, у час блакады, якую арганізавалі гітлераўцы супраць партызан. А бацька дажыў да Перамогі, пражыў пасля яе яшчэ 4 гады...

ВЁСКА БУДЗЬКІ

ДЗЕГАЛЕВІЧ Наталля, нарадзілася ў 1892.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Рыгор Мікалаевіч, расстраляны за сувязь з партызанамі.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Уладзімір Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1919, з 16.1.1944 партызан атрада «За Радзіму» брыгады «Граза», загінуў 30.5.1944.

ПАШКЕВІЧ Міхаіл Аўдзеевіч, нарадзіўся ў 1896, расстраляны 2.2.1943 за сувязь з партызанамі, пахаваны ў в. Раманоўка.

ПАШКЕВІЧ Пётр Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан брыгады «Граза», загінуў у чэрвені 1943.

ВЁСКА БУШМІН

ЗАРУБА Марына Іванаўна, нарадзілася ў 1927, партызанка атрада імя М. В. Фрунзе брыгады «Граза», расстраляна 31.3.1944 каля в. Маціёва.

ЗАРУБА Марфа Васілеўна, нарадзілася ў 1901, партызанка, расстраляна ў жніўні 1943 каля в. Маціёва.

НАЛБОД Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1907, да вайны працаваў механікам, партызан, загінуў 6.4.1944 у в. Козаўка.

КАМЕЛЬЧЫК Пастасся Уладзіміравіч.

КАМЕЛЬЧЫК Сцяпан Ягоравіч.

ВЁСКА БЫЗАВА

ВАСІЛЕЎСКІ Фёдар Пятровіч, нарадзіўся ў 1903, расстраляны за сувязь з партызанамі.

І. Д. Ігнатовіч.

В. П. Міронаў.

П. М. Пашкевіч.

М. У. Дзярбенка.

МАЦЮШЭЎСКІ Віктар Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1924, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ШПІЛЕЎСКІ Мікалай Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў 8.4.1944.

ВЕСКА ДУБАВОЕ

У чэрвені 1944 г. ў лесе каля вёскі пры адступленні фашыстамі загублены мірныя жыхары:

ДУБАВЕЦ Акуліна Іосіфаўна, нарадзілася ў 1901;

ДУБАВЕЦ Ганна Карпаўна, нарадзілася ў 1928;

ДУБАВЕЦ Іван Піліпавіч, нарадзіўся ў 1900;

ДУБАВЕЦ Карп Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1885;

НАВУМАВА Агаф'я Васілеўна, нарадзілася ў 1902;

НАВУМАЎ Васіль Раманавіч, нарадзіўся ў 1928.

ВЕСКА ЗАМОШША

ПАЛУБІНСКАЯ Ганна Васілеўна, нарадзілася ў 1923, партызанка, загінула ў 1944.

ПАЛУБІНСКІ Васіль Пракопавіч, нарадзіўся ў 1926, са снежня 1942 у партызанах, памёр ад ран 16.8.1943.

ПАЛУБІНСКІ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1925, партызан 4-га атрада 2-й Беларускай партызанскай брыгады імя Панамарова, загінуў 14.1.1944 у разведцы.

ПАШКЕВІЧ Васіль Паўлавіч, нарадзіўся ў 1895; у 1941 пагнаў жывёлу на Усход, прапаў без вестак.

ПАШКЕВІЧ Емяльян Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан.

ПАШКЕВІЧ Марыя Паўлаўна, нарадзілася ў 1885.

ПАШКЕВІЧ Яфім Паўлавіч, нарадзіўся ў 1880.

ВЕСКА ЗЫБАЛЫ

БУЛЫГІН Віктар Стафанавіч, нарадзіўся ў 1923, да вайны працаваў у калгасе, партызан, загінуў 23.1.1944.

СМУТЫ Васіль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1882.

ВЕСКА ЛАЎРЭНАВІЧЫ

ДЗЕМІДЗЕНКА Вольга Іванаўна, нарадзілася ў 1926, у 1943 у час блакады партызанскай зоны схоплена і вывезена ў Германію, дзе загінула 22.4.1945.

ЖОГЛА Аляксандр Максімавіч, нарадзіўся ў 1918.

ЖОГЛА Ніна Максімаўна, нарадзілася ў 1923.

ІВАНЮТА Васіль Трафімавіч, нарадзіўся ў 1912, расстраляны ў Талачыне за сувязь з партызанамі.

ІВАНЮТА Захар Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1900.

ІВАНЮТА Іван Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1905.

ІВАНЮТА Кузьма Трафімавіч, нарадзіўся ў 1915, удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940; расстраляны ў Талачыне за сувязь з партызанамі.

ІВАНЮТА Пётр Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1885, расстраляны фашыстамі каля в. Маціёва за сувязь з партызанамі.

ІВАНЮТА Рыгор Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1897, партызан, загінуў у Літве ў час выканання задання.

КАВАЛЕЎСКІ Аляксей Паўлавіч, нарадзіўся ў 1924, расстраляны каля в. Маціёва.

РАДЗІВОНАВА Марыя Пятроўна, нарадзілася ў 1887; схоплена фашыстамі за сувязь з партызанамі, памерла ў турме ў Талачыне; **РАДЗІВОНАВА Ева Кузьмінічна**, яе дачка, нарадзілася ў 1920, разам з маці схоплена фашыстамі ў 1943 за сувязь з партызанамі і кінута ў турму ў Талачыне, расстраляна 30.3.1943 каля в. Маціёва.

РАДЗІВОНАВА Ніна Кузьмінічна, нарадзілася ў 1925, партызанка, загінула 8.6.1944.

РЫБАКОЎ Дзмітрый Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1921, загінуў у 1942.

СТАРАВОЙТАЎ Барыс Дзям'янавіч, нарадзіўся ў 1925, расстраляны фашыстамі каля в. Маціёва за сувязь з партызанамі.

СТАРАВОЙТАЎ Дзям'ян Мікітавіч, нарадзіўся ў 1885.

ВЕСКА МАНАСТЫР

КРЫВУШЭНКА Дзмітрый Іванавіч, нарадзіўся ў 1910, партызан, загінуў 9.4.1944, пахаваны ў в. Рыдамля.

КУРЧАЎ Сцяпан Пятровіч, нарадзіўся ў 1897.

СНАПКОЎ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1911.

СНАПКОЎ Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1921, камандзір партызанскага атрада «Перамога» 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 24.9.1943.

ВЕСКА НЯКЛЮДАВА

АНАНЕВІЧ Мікалай Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1922, з 24.12.1942 у партызанскім атрадзе імя Кутузава брыгады М. П. Гудкова, загінуў 26.6.1944.

БУДНЫ Васіль Лукіч, нарадзіўся ў 1923, з лютага 1942 партызанскі сувязны, загінуў у ліпені 1942.

ДЗЯРБЕНКА Мікалай Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1913, да вайны працаваў у калгасе, з 24.12.1942 партызан атрада № 3 «Ураган» брыгады М. П. Гудкова, загінуў 20.1.1943.

КОЛМАК Рыгор Маркіянавіч, нарадзіўся ў 1875.

КОЛМАК Сафія Іванаўна, нарадзілася ў 1878.

КОРНЕВА Ганна Іванаўна, нарадзілася ў 1886.

А. Г. Караткевіч.

Н. К. Храновіч.

КОРНЕЎ Захар Лук'янавіч, нарадзіўся ў 1887.
ФРАЛОЎ Аляксей Ларывонавіч, нарадзіўся ў 1922, з 24.12.1942 партызан атрада імя М. І. Кутузава брыгады М. П. Гудкова, загінуў у ліпені 1944 у Лепельскім р-не ў акружэнні.
ФРАЛОЎ Віктар Данілавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, памёр ад ран 1.10.1943, пахаваны ў в. Тоўпіна Чашніцкага р-на.
ЦЁМНАЯ Клаўдзія Карпаўна, нарадзілася ў 1915.
ЦЁМНАЯ Таццяна Мацвееўна, маці А. П. Цёмнага, расстраляна ў 1943.
ЦЁМНЫ Аляксандр Пятровіч, нарадзіўся ў 1926, партызан атрада № 3 «Ураган» брыгады М. П. Гудкова, загінуў 13.1.1944, пахаваны ў в. Чарэя Чашніцкага р-на.

З успамінаў В. І. Шафранскага, партызана атрада № 3 «Ураган» брыгады М. П. Гудкова

13 студзеня 1944 года праціўнік напаў на в. Лукомль, дзе размяшчаліся атрады брыгады М. П. Гудкова. Вораг ішоў ланцугом. Па загаду камбрыга занялі абарону і ўступілі ў бой. 2-і ўзвод вашага атрада (камандзір Л. Пахомаў) прыбыў з Чарэі і з ходу ўрэзаўся ў варожы ланцуг. Завязалася бязлітасная схватка. У няроўнай барацьбе людзі праяўлялі высокую мужнасць і адвагу. Аляксандр Пятровіч Цёмны страляў з кулямёта кароткімі чэргамі. Калі пасля двух раненняў куля прабіла дыск яго ручнога кулямёта. Цёмны пайшоў на ворага з гранатай у поўны рост, насустрач смерці... і бессмяротнасці. Далёка кінуць гранату ён ужо не мог, і быў скошаны аўтаматнай чаргой. Гітлераўцаў, якія наблізіліся да яго, адкінула ўзрыўной хваляй.

У Лукомлі фашысты далей будынка былой школы не прайшлі і вымушаны былі змяніць напрамак, забраўшы з сабой забітых і параненых. У гэтым баі мы страцілі 5 сваіх таварышаў: А. П. Цёмнага, Я. Ф. Глаткова, У. А. Картавіцкага, М. В. Куляшова і Ф. П. Маслакова. Яны змагаліся з выключнай упартасцю, да апошняга патрона. Былі ўсе неаднаразова паранены, а потым зверску забіты фашыстамі.

ЦЁМНЫ Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1916.
ЦЁМНЫ Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, прапаў без вестак 9.6.1944.
ЧЭПІК Настасся Пракопаўна, нарадзілася ў 1930.
ЧЭПІК Фёкла Фёдараўна, нарадзілася ў 1905.

ВЁСКА ПАЗНЯКІ

БЛІНОЎ Іван Абрамавіч, нарадзіўся ў 1921, з снежня 1942 партызан атрада № 3 «Ураган» брыгады М. П. Гудкова, загінуў у студзені 1943 у баі каля в. Саколіна.
ДЗЕВЯТКІН Антон Мікітавіч, нарадзіўся ў 1913 у в. Мікуліна, да вайны працаваў у Талачынскай МТС; партызан, загінуў 7.9.1943, пахаваны ў в. Мікуліна.
ІВАНЮТА Адам Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1922, са снежня 1942 партызан атрада «Перамога» 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 26.3.1944.
МАСАЛКОЎ Фёдар Піліпавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў 13.1.1944.
СТАНОВІЧ Аляксандр Уласавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, прапаў без вестак.
ШАРАЙ Аляксей Кандратавіч, нарадзіўся ў 1923, з 28.12.1942 партызан атрада «Перамога» 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 24.3.1943 у в. Бызава.

ВЁСКА ПРУСІНІЧЫ

БЯЛЯЕЎ Давыд Парфёнавіч, нарадзіўся ў 1896, партызанскі сувязны, загінуў 6.3.1944.
КАВАЛЁЎСКІ Нічыпар Максімавіч, нарадзіўся ў 1908, з лютага 1942 сувязны Сенненскай партызанскай брыгады, расстраляны ў снежні 1942.
МЯСНІКАВА Аляксандра Юстынаўна, нарадзілася ў 1912, забіта ў жніўні 1943.
МЯСНІКАЎ Платон Іванавіч, нарадзіўся ў 1903, партызанскі сувязны, расстраляны 6.3.1944.
МЯСНІКАЎ Тарас Пятровіч, нарадзіўся ў 1902, забіты ў жніўні 1943.

ВЁСКА ПУКАЛАВА

БУДНЫ Іван Раманавіч, нарадзіўся ў 1923, расстраляны 9.6.1944 у Лепельскім р-не ў час блакады.
ВАСІЛЁЎСКІ Марк Андрэевіч, нарадзіўся ў 1881.
ЧЭПІК Аркадзь Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1909, з 5.12.1942 партызан Сенненскай брыгады, загінуў у маі 1944.

ВЁСКА РАВЯЦІЧЫ

АНКУТОВІЧ Міхаіл Давыдавіч, з мая 1943 у партызанскім атрадзе № 4 брыгады М. П. Гудкова, загінуў у красавіку 1944.
БАКЛАЕЎ Уладзімір Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1906, з 5.10.1942 у партызанскім атрадзе № 2 імя М. А. Шчорса брыгады М. П. Гудкова, загінуў 5.11.1943.
КАРАТКЕВІЧ Аляксей Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1922, з 21.11.1942 у партызанах, загінуў 25.5.1943.
КАРАТКЕВІЧ Арсен Міхайлавіч, партызан, загінуў 28.6.1944, пахаваны ў в. Анеліна.
КАРАТКЕВІЧ Арсен Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1914, камандзір узвода партызанскага атрада № 2 імя М. А. Шчорса брыгады М. П. Гудкова, загінуў 28.4.1944, пахаваны ў Равяцічах.
КАРАТКЕВІЧ Васіль Ільіч, нарадзіўся ў 1915, партызан атрада № 2 імя М. А. Шчорса брыгады М. П. Гудкова, загінуў 20.4.1943 у Лепельскім р-не.
КАРАТКЕВІЧ Захар Кузьміч, нарадзіўся ў 1927, расстраляны 18.3.1944 у в. Старое Саколіна.
КАРАТКЕВІЧ Іван Кузьміч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў 24.3.1944, пахаваны ў в. Бызава.
КАРАТКЕВІЧ Мікалай Сафонавіч, нарадзіўся ў 1919, партызан атрада № 4 брыгады М. П. Гудкова, загінуў у ліпені 1944.
КАРАТКЕВІЧ Сямён Піліпавіч, нарадзіўся ў 1921, партызан, загінуў у 1944.
МІХЕЕЎ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1917, партызан, загінуў 22.12.1942, пахаваны ў Равяцічах.
МУХІН Арцём Васілевіч, нарадзіўся ў 1894, да вайны працаваў у Равяціцкай МТС, расстраляны 15.3.1943 каля пас. Усвіж-Бук за сувязь з партызанамі.

МУХІН Уладзімір Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў у маі 1943.

ПАЛУБІНСКІ Уладзімір Стафанавіч, нарадзіўся ў 1908, в 10.9.1943 у партызанскім атрадзе № 2 імя М. А. Шчорса брыгады М. П. Гудкова, памёр 25.12.1943 ад тыфу.

ХРАНОВІЧ Ніна Купрыянаўна, расстраляна за сувязь з партызанамі.

ШЫДЛОЎСКАЯ Антаніна Паўлаўна, нарадзілася ў 1910, расстраляна ў кастрычніку 1943 каля пас. Усвіж-Бук.

ВЕСКА РАМАНОЎКА

АНТАШКЕВІЧ Яўгенія Сцяпанаўна, нарадзілася ў 1916, расстраляна 2.2.1943 за сувязь з партызанамі.

ВЯТОШКІН Мікалай Анісімавіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны працаваў у калгасе; з снежня 1942 у партызанскім атрадзе імя Аляксандра Неўскага брыгады «Граза», прапаў без вестак 25.5.1944.

ДАЛГАНЮК Сяргей Іванавіч, нарадзіўся ў 1916 у Чырвонаармейскім р-не Данецкай вобл., да вайны жыў у в. Раманоўка; загінуў 23.6.1943, пахаваны ў Талачыне.

ВЕСКА РЫДАМЛЯ

БУДНІК Уладзімір Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1925, у 1943 паларваўся на міне каля школы, пахаваны ў в. Лаўранавічы.

ДВОРНІКАЎ Пётр Іванавіч, нарадзіўся ў 1918 у 1942 па заданню партызан уступіў у Рыдамлянскую валасную паліцыю, у 1943 фашысты павесілі ў Талачыне за сувязь з партызанамі.

КАЗАКОЎ Ілья Кузьміч, нарадзіўся ў 1921, партызан, памёр ад ран 20.1.1943, пахаваны ў в. Рыдамля.

КАЗАКОЎ Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1925, загінуў у 1943.

КАЦЮШЫН Іван Лаўрынавіч, нарадзіўся ў 1900, вясной 1943 арыштаваны, прапаў без вестак.

КАЦЮШЫН Іосіф Андрэевіч, нарадзіўся ў 1916, забіты 14.10.1943.

КАЦЮШЫН Мікалай Антонавіч, нарадзіўся ў 1924, падарваўся на міне ў 1943.

КАЦЮШЫНА Праскоўя Яфімаўна, нарадзілася ў 1882, паларвалася на міне ў 1943.

НОВІКАВА Кацярына Аляксееўна, нарадзілася ў 1927.

ПАРАХОНЬКА Сяргей Пятровіч, нарадзіўся ў 1922, загінуў у 1944 каля в. Саколіна.

РЫЛЬКО, нарадзіўся ў 1942.

РЫЛЬКО Любоў Сцяпанаўна, нарадзілася ў 1921.

РЫЛЬКО Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1919, загінуў у 1943 ва Ушацкім р-не.

12 верасня 1943 года ў в. Рыдамля ў час карнай аперацыі загінулі мірныя жыхары:

БАЛАШОВА Хадора Карпаўна, нарадзілася ў 1912, яе сын, нарадзіўся ў 1938;

ВАСІЛЬЕЎ Васіль, нарадзіўся ў 1888;

ДАВАТАР Валянціна, нарадзілася ў 1930;

ДАВАТАР Вольга Л., нарадзілася ў 1911;

ДАВАТАР Леанід Іванавіч, нарадзіўся ў 1877, забіты, згарэў у доме;

ДАВАТАР Хрысціна, нарадзілася ў 1880, забіта, згарэла ў доме;

ДУБАВЕЦ Ганна Іванаўна, нарадзілася ў 1907;

ДУБАВЕЦ Марыя Піліпаўна, яе дачка, нарадзілася ў 1937;

ДУБАВЕЦ Мікалай Піліпавіч, яе сын, нарадзіўся ў 1942.

ДУБАВЕЦ Марцін Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1898, забіты, а пасля кінуты ў агонь;

ЗЫДЛЕЎ Міхаіл Данілавіч, нарадзіўся ў 1910;

ЗЫДЛЕВА Фядора Якаўлеўна, нарадзілася ў 1905;

ЗЫДЛЕВА..., маленькая дачушка Зыдлевых, згарэла разам з маці;

ІВАНЮТА Зінаіда Антонаўна, нарадзілася ў 1937;

КАЗАКОВА Вольга Уласаўна, нарадзілася ў 1883;

КАЗАКОВА Дар'я, нарадзілася ў 1903;

КАЗАКОВА Дар'я Іванаўна, нарадзілася ў 1932;

КАЗАКОВА Марыя Емяльянаўна, нарадзілася ў 1921;

КАЗАКОВА Ніна, нарадзілася ў 1935;

КАЗАКОЎ Аркадзь, нарадзіўся ў 1937;

КАЦЮШЫНА Вольга, нарадзілася ў 1929;

КАЦЮШЫНА Марыля Карпаўна, нарадзілася ў 1874;

КАЦЮШЫНА Марыя Савельеўна, нарадзілася ў 1910;

КАЦЮШЫН Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1936;

КАЦЮШЫНА Надзея Іванаўна, нарадзілася ў 1939;

КАЦЮШЫН ..., дзеці **КАЦЮШЫНАЙ М. С.**;

КАЦЮШЫНА Надзея Андрэеўна, нарадзілася ў 1928;

КАЦЮШЫНА Таццяна Ал., нарадзілася ў 1928;

КАЦЮШЫН Андрэй Уласавіч, нарадзіўся ў 1890;

КАЦЮШЫН Антон Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1870;

КАЦЮШЫН Іван Антонавіч, нарадзіўся ў 1908;

КАЦЮШЫН Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1940;

КАЦЮШЫН Фёдар Андрэевіч, нарадзіўся ў 1920, памёр ад ран праз тыдзень пасля злачынства карнікаў.

МАРКІЯНАВА Ганна Якаўлеўна, нарадзілася ў 1898;

ОСІПАЎ Макар Андрэевіч; **ОСІПАВА Домна Ягораўна**, нарадзілася ў 1898; **ОСІПАВА Ксенія Макараўна**, нарадзілася ў 1932; **ОСІПАВА Марыя Макараўна**, нарадзілася ў 1934, памерла ад нервовага ўзрушэння ў хуткім часе пасля злачынстваў карнікаў;

РАЧОНАК Тэкля Васілеўна, нарадзілася ў 1916;

РЫЛЬКО Агаф'я Кір., нарадзілася ў 1880;

РЫЛЬКО Агаф'я Пракопаўна, нарадзілася ў 1898;

РЫЛЬКО Лідзія Піліпаўна, нарадзілася ў 1934;

РЫЛЬКО (Сулымава) Люся Уласаўна, нарадзілася ў 1919, да вайны працавала настаўніцай у Рыдамлі; у перыяд акупацыі распаўсюджвала лістоўкі, у час карнай аперацыі прыкрыла сабою сына і выратавала яму жыццё.

РЫЛЬКО Максім Стафанавіч, нарадзіўся каля 1880;

РЫЛЬКО Надзея Васілеўна, нарадзілася ў 1942;

РЫЛЬКО Хадосся Раманаўна, нарадзілася у 1916;

ХРАНСКАЯ Ганна Аляксееўна, нарадзілася ў 1928;

ХРАНСКАЯ Марыя Савічна, нарадзілася ў 1907;

ШАСТАК Таццяна, нарадзілася ў 1873, выйшла насустрач карнікам з абразом, спадзеючыся прадухіліць злачынства;

ШЫБЕКА Аркадзь Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1937, згарэў;

ШЫБЕКА Любоў Міхайлаўна, нарадзілася ў 1929.

У гэты дзень было забіта яшчэ каля 25 мірных жыхароў, бежанцаў з іншых раёнаў.

ВЕСКА СЕРКАВІЦЫ

ПАЛАТКІНА Вольга Мікітаўна, сувязная партызанскай брыгады «Граза», расстраляна фашыстамі 15.3.1943 у Талачыне.

ПРЫЖЫТОМСКІ Іван М., нарадзіўся ў 1893, расстраляны 15.3.1943 каля пас. Усвіж-Бук.

ВЕСКА УЗГОІ

ЗАРУБА Аляксандр Піліпавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў 27.5.1944, пахаваны ў в. Чарэя Чашніцкага р-на.

С. І. Далганюк.

В. М. Палаткіна.

А. М. Казакевіч.

А. Ф. Царэў.

РАК Аляксей Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1923, з 1.1.1943 у партызанскім атрадзе «Перамога» брыгады «Граза», прапаў без вестак 24.5.1944.

РАК Улас Сідаравіч, нарадзіўся ў 1896, старшыня калгаса «Шлях да сацыялізма» з першых дзён яго ўтварэння, бацька сакратара Талачынскага падпольнага РК ЛКСМБ А. У. Рака; схоплены ў кастрычніку 1943 каля в. Дубы, калі ішоў на сувязь з сынам, вывезены ў Германію ў канцлагер, загінуў у 1945.

ВЁСКА УЗНОСНАЕ

БУЛЫГА Ягор Іванавіч, нарадзіўся ў 1887.

ГУТАРОВІЧ Павел Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1927, партызан брыгады М. П. Гудкова, прапаў без вестак у маі 1944 каля в. Чарэн Чашніцкага р-на.

УСЦІНОВІЧ Ефрасіння Дзянісаўна, расстраляна ў в. Высокі Гарадзец.

ВЁСКА УСВЕЙКА КУРЧОЎСКАЯ

ШАРШУН Марыя Паўлаўна, нарадзілася ў 1923; сувязная брыгады М. П. Гудкова, загінула ў 1944.

ШАРШУН Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1922, камандзір партызанскіх атрадаў «Камсамолец» (кастрычнік — сакавік 1944) і імя І. В. Сталіна (красавік — чэрвень 1944), загінуў у 1944.

ШАСТАКОЎ Аўрам Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1910, забіты ў сакавіку 1944.

ШНЫРКЕВІЧ Матрона І., нарадзілася ў 1883, забіта ў сакавіку 1944.

ВЁСКА УСВЕЙКА

АНТАШКЕВІЧ Міхаіл Андрэевіч, нарадзіўся ў 1911, з лістапада 1943 у партызанскай брыгадзе «Граза», прапаў без вестак 30.5.1944.

АНТАШКЕВІЧ Уладзімір Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1905, партызан брыгады «Граза», прапаў без вестак 30.5.1944.

ВАСІЛЬЕЎ Канстанцін Васілевіч, нарадзіўся ў 1908, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 25.12.1942 пры разгроме варожага гарнізона.

ДЗЕГАЛЕВІЧ Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў у ліпені 1943, пахаваны ў в. Узноснае.

КАПЛЕЎСКІ Ігнат Фядотавіч, нарадзіўся ў 1904, партызан, загінуў у 1944.

ШАРШУН Антон Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1916, партызан брыгады М. П. Гудкова, прапаў без вестак.

ШАРШУН Ніна Паўлаўна, нарадзілася ў 1921, партызанка брыгады М. П. Гудкова, прапала без вестак у 1944.

ШЫБЕКА Пётр Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў у 1944.

ВЁСКА ШЭПЕТАВА

АНТАШКЕВІЧ Уладзімір Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў у баі 11.6.1943.

СТАБРОЎСКІ Васіль Данілавіч, нарадзіўся ў 1922, з 20.10.1942 да 25.1.1944 партызан атрада «Дзядзькі Косці» 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у баі.

СТАБРОЎСКІ Лука Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў у 1944.

ХАДНЕВІЧ Сяргей Іванавіч, нарадзіўся ў 1914, партызан, загінуў у 1944.

ЯРОМА Яўген Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1920, партызан-падрыўнік брыгады «Граза», загінуў у 1943 пры выкананні баявога задання.

ВЁСКА ЯНАВА

АНАНЕВІЧ Пётр Іванавіч, восенню 1942 выкліканы ў нямецкую камендатуру, прапаў без вестак.

ЖУРАЎСКІ Піліп Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1908, забіты восенню 1943 у час карнай аперацыі за сувязь з партызанамі.

КАЗАКЕВІЧ Арсен Міронавіч, нарадзіўся ў 1924, да вайны працаваў у калгасе, партызан, загінуў 27.3.1944, пахаваны ў Янаве.

КАЗАКЕВІЧ Віктар Міронавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў у 1944.

СМАЛЯК Варвара Васілеўна, нарадзілася ў 1904, расстраляна восенню 1942 за сувязь з партызанамі.

СМАЛЯК Парфен Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1889, расстраляны восенню 1942 за сувязь з партызанамі.

ЦАРОЎ Анатоль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1922, з лістапада 1942 у партызанскім атрадзе № 2 імя М. А. Шчорса брыгады М. П. Гудкова, загінуў у чэрвені 1944.

СЛАЎНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АНТОНАВА

ВЯРХОЎСКІ Яўген Максімавіч, нарадзіўся ў 1924, да вайны працаваў у калгасе імя У. І. Леніна; у 1943 вывезены ў Германію, загінуў у 1944.

ДЗЕМІДОВІЧ Іосіф Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1910 у Слуцку, да вайны жыў у в. Антонава, працаваў настаўнікам у в. Славені, расстраляны фа-

М. Я. Латушкін.

Г. П. Зайцаў.

С. І. Жураўлёў.

М. П. Латушкін.

шыстамі 7.4.1942 каля в. Маціёва за сувязь з партызанамі.

ЛАТУШКІНА Раіса, нарадзілася ў 1918.

САЧЫЎКА Дзмітрый, нарадзіўся ў 1900.

САЧЫЎКА Марыя Савельеўна, нарадзілася ў 1923, схоплена за сувязь з партызанамі і кінута ў турму ў Талачыне, пасля ў Мінску, дзе захварэла тыфам, спалена жывой разам з маленькай дачушкай Зінай.

ТУЗІКАЎ Іосіф Фадзеевіч, нарадзіўся ў 1894, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ХОЛЕСАВА Сіма, нарадзілася ў 1915.

ВЁСКА АЎХУТЫ

ЛАТУШКІН Максім Елісеевіч.

ВЁСКА ГАРАЖОНЬІ

НАСОВІЧ Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1902, да вайны працаваў старшынёй калгаса, расстраляны фашыстамі ў Барысаве за сувязь з партызанамі.

НАСОВІЧ Уладзімір Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1922, фашысты павесілі ў Оршы за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА ГЛІННІКІ

ЛАТУШКІН Мікалай Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1908, да вайны працаваў у пажарнай ахове г. п. Лёзна, у пачатку вайны пакінуты для арганізацыі партызанскага атрада, трапіў у палон, уцёк, памёр ад ран.

ЛАТУШКІН Міхаіл Андрэевіч, нарадзіўся ў 1920, расстраляны ў 1943.

ЛАТУШКІН Ягор Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1890, у гады вайны працаваў на чыгунцы, расстраляны пасля ўзрыву партызанамі нямецкага эшалона.

СОЙКА Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1908 у в. Ільяне, жыў у Глінніках, інвалід, расстраляны ў 1944 у Барысаве за сувязь з партызанамі.

СЦЯПАНАЎ Пётр Ягоравіч, нарадзіўся ў 1918, да вайны працаваў у міліцыі.

ЧУМАКОЎ Даніла Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1894, у 1941 падарваўся на міне.

ВЁСКА ГУТА

КАЗЛОЎСКІ Пётр Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1897, схоплены за сувязь з партызанамі і кінуты ў турму ў Талачыне, пасля ў Барысаве, дзе расстраляны за 2 дні да вызвалення горада, пахаваны ў брацкай магіле ў Барысаве.

ВЁСКА ЗАЛАЗЗЕ

ЛАТУШКІН Ягор Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1930, расстраляны ў 1942.

ПАЖАРЫЦКІ Аўрам..., расстраляны ў в. Скакоўка Крупскага р-на за сувязь з партызанамі, там і пахаваны.

ВЁСКА ЗАРЭЧЧА

ГАЙСЁНАК Аляксей Прохаравіч, нарадзіўся ў 1913, в 1942 партызан 1-й Беларускай партызанскай брыгады, загінуў у 1943 у час бою.

ЗАЙЦАЎ Георгій Пятровіч, нарадзіўся ў 1922, з 1942 разам з бацькам і маці ў партызанах брыгады М. П. Гудкова, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Славені.

ПЯТРУШЫН Уладзімір Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1924 у в. Ламіншчына, у пачатку вайны ў ліку камсамольцаў-добраахвотнікаў патнаў на ўсход калгасную тэхніку, прапаў без вестак.

ШАРКЕВІЧ Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1908; **ШАРКЕВІЧ Таісія**, яго жонка, жылі ў в. Ламіншчына, пасля ў в. Каменка, з 1943 у партызанскай брыгадзе М. П. Гудкова, загінулі ў 1944.

ВЁСКА ЗЯБЛІЦА

ЛАТУШКІН Уладзімір Архіпавіч, нарадзіўся ў 1932, расстраляны ў 1944.

ВЁСКА ІЛЬЯНЕ

ФІЛІМОНАЎ Фёдар Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1912 у в. Зелянкова Круглянскага р-на, член КПСС, да вайны жыў у в. Ільяне, адкуль прызваны ў Чырвоную Армію; у Бранску трапіў у палон, уцёк да партызан, загінуў у 1942 у в. Слаўнае пры выкананні задання.

ВЁСКА КУРЧЫ

ЖУРАЎЛЁЎ Сяргей Іванавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан.

ЛАТУШКІН Мікалай Пракопавіч, нарадзіўся ў 1902, партызанскі сувязны, загінуў у 1944 у Талачыне.

МАШКОВІЧ Барыс Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1916, з 1941 партызан брыгады «Чэкіст», разведчык, загінуў у 1944.

З успамінаў Л. Б. Пунтус, дачкі Б. А. Машковіча

Мой бацька быў разведчыкам у партызанскім атрадзе, часта наведваўся дадому, бо на станцыі

Б. А. Машковіч.

В. К. Краполава.

В. М. Мілюціч.

А. М. Іваноў.

Слаўнае працаваў пуцявым абходчыкам яго айчым, Машковіч Іван, які прыносіў карысныя звесткі пра немцаў, даставаў медыкаменты і перадаваў іх праз Барыса ў атрад. Іван Машковіч быў расстраляны немцамі незадоўга да гібелі бацькі. У апошні раз бацька прыходзіў да нас зімой 1944, я гэта добра памятаю! Ен тады зайшоў са сваімі баявымі сябрамі-разведчыкамі, памятаю іх імёны — Міця і Мікалай. Ноччу яны пайшлі ў разведку ў вёскі Любішча і Цімохаўка. У вёсцы Цімохаўка і сустрэліся нашы разведчыкі з немцамі. Бой быў няроўны. Тут і загінуў мой бацька Барыс Машковіч. Яго цела мы прывезлі праз 18 месяцаў з вёскі Цімохаўкі ў родную вёску Курчы і перапахавалі на мясцовых могілках у адной магіле з яго сынам, які памёр у 1941 годзе, на шостым месяцы жыцця...

СЦЯПАНАЎ Пётр Ягоравіч, нарадзіўся ў 1928 у в. Гліннікі, да вайны працаваў у 2-м аддзяленні міліцыі г. Мінска; расстраляны ў 1941, пахаваны ў в. Гліннікі.

ВЕСКА ЛАМІНІЧЫНА

БУРЭЦ Настасся..., з 2.12.1943 у партызанскай брыгадзе М. П. Гудкова, памерла 16.6.1944.

ПАСЮЦІНА Лідзія Ігнацьеўна, нарадзілася ў 1898.

ТАБЕРКА Іван Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, загінуў у 1944.

ШНЫРКЕВІЧ Міхаіл Паўлавіч, з 2.12.1943 у партызанскай брыгадзе М. П. Гудкова, памёр 16.6. 1944.

ВЕСКА МАЙДАН

ГАЛЕЦКІ Пётр Антонавіч, нарадзіўся ў 1919, працаваў брыгадзірам у калгасе, з 1939 у Чырвонай Арміі; у верасні 1941 падрыўніком заслан ў тыл ворага ў партызанскі атрад «Перамога», які дзейнічаў на Смаленшчыне і ў Віцебскай вобл., загінуў 21.10.1942 пры выкананні баявога задання. 8.5.1965 яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (глядзі артыкул «Цаной жыцця»).

ВЕСКА МАЛЯЎКА

ФЕДАРЦОЎ Іван Дамітрыевіч, нарадзіўся ў 1922, партызан брыгады «Чэкіст», працаў без вестак.

ВЕСКА СЛАЎНАЕ

БОТУК Васіль, нарадзіўся ў 1881.

БОТУК Міхаіл Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1914, партызан, загінуў 7.1.1944, пахаваны ў в. Цімохаўка Круглянскага р-на.

БУГЛІК Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1887, да вайны працаваў кандуктарам; загінуў у 1942 на станцыі Слаўнае.

КАТОВІЧ Галіна..., нарадзілася ў 1922, да вайны вучылася ў Оршы ў тэхнікуме; сувязная 8-й Круглянскай брыгады, расстраляна ў 1943.

КРАПОПАВА Вера Кузьмінічна, нарадзілася ў 1924 у в. Ільяне, да вайны скончыла 10 класаў Слаўненскай школы, член ВЛКСМ, добра ведала нямецкую мову; у вайну працавала ў воласці, сувязная партызанскай брыгады «Чэкіст», расстраляна ў 1943 у Талачыне.

ЛАТУШКІН Антон Пятровіч, нарадзіўся ў 1925, у вайну партызан-разведчык, загінуў 22.2.1944, пахаваны ў в. Каскевічы Круглянскага р-на.

ЛАТУШКІН Іван Архіпавіч, нарадзіўся ў 1928.

ЛАТУШКІН Міхаіл Васілевіч, нарадзіўся ў 1910, у вайну збіраў і перадаваў партызанам зброю, схоплены і расстраляны 1.1.1942.

ЛАТУШКІН Міхаіл Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1919, да вайны працаваў слесарам на Барысаўскім участку Беларускай чыгункі; партызан, загінуў 18.9. 1943, пахаваны ў в. Гута.

ЛАТУШКІН Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1926, партызан-разведчык, загінуў 22.2.1944, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Славені.

ЛАТУШКІН Рыгор Васілевіч, нарадзіўся ў 1907, працаваў на смаляным заводзе, перад вайной быў у камандзіроўцы ў г. Ломжа Беластоцкай вобл. (цяпер ПНР), дзе і загінуў у 1941.

ЛАТУШКІН Стэфан, нарадзіўся ў 1870.

МАШКОВІЧ Васіль Аляксандравіч, партызан, загінуў каля Талачына.

МАШКОВІЧ Іван..., расстраляны ў канцы 1943 за сувязь з партызанамі.

МІЛЮЦІН Віктар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1925 у в. Бурая Дубровенскага р-на, партызан, загінуў 20.6.1944, пахаваны ў в. Славені ў брацкай магіле.

Калі пачалася вайна, пятнаццацігадовы Віця Мілюціч разам з бацькамі эвакуіраваўся на ўсход, але каля Смаленска шлях бежанцам перарэзалі гітлераўцы, і яны вымушаны былі вярнуцца назад у Слаўнае. У канцы лета 1942 г. ўся сям'я пайшла ў лес, бо пасля разгрому станцыі партызанамі-жэлезнічнікамі акупанты спаганялі сваю алобсць на мірным насельніцтве, дом Мілюціных быў спалены. Віця стаў падрыўніком у атрадзе С. Г. Жуніна. У канцы 1942 г. быў паранены ў нагу. Хацелі адправіць на Вялікую зямлю, але адмовіўся і паправіўся ў атрадзе. У 1943 Віктара неаднойчы пасылалі з заданнямі ў Оршу, у чэрвені яго схапілі гітлераўцы. Пратрымалі месяц ў турме, а потым разам з іншымі юнакамі і дзяўчатамі адпра-

вілі ў Германію. Але яму ўдалося ўцячы і вярнуцца ў лес. Віктар стаў падрыўніком восьмага атрада, якім камандаваў І. Г. Ільін. Зноў заданні, падарваныя варожыя эшалоны. 20 чэрвеня, у час рэйкавай вайны, Віктар Мілюцін загінуў. Яго жыццё абарвала кулямётная чарга з варожага дота ў той час, калі Віктар шпурнуў у чорную амбразуру зваляку гранат...

ПАЖАРЫЦКІ Аўрам, нарадзіўся ў 1891.

ПАЗНЯКОЎ Леанід Іванавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан брыгады «Чэкіст», загінуў 28.8.1943, пахаваны ў в. Лагаўчына.

РУПЕЦ Яўген Ціханавіч, нарадзіўся ў 1933, расстраляны ў 1942.

САВАСЦЬЯНАЎ Фёдар, нарадзіўся ў 1895.

ШЫШКО Міхалай Аніслімавіч, нарадзіўся ў 1914, в 1942 у партызанах, кулямётчык, загінуў у баі 20.6.1944.

ВЕСКА ТРАСЦЯНКА

ІВАНОЎ Андрэй Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1922, загінуў 6.7.1941.

ГОРАД ТАЛАЧЫН

БУЕВІЧ Войцех Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1913, працаваў трактарыстам Талачынскай МТС; партызан, загінуў 24.3.1943, пахаваны ў в. Узноснае.

БЯЛЬКОЎ Віктар Піліпавіч, нарадзіўся ў 1913, партызанскі сувязны з чэрвеня 1942, загінуў 29.9. 1942.

ВАЛЧОК Дамітрый Цітавіч, нарадзіўся ў 1923, партызанскі сувязны, загінуў 15.5.1944.

ГРЫГАРОВІЧ Мікалай Ніканавіч, нарадзіўся ў 1910, у час вайны працаваў на чыг. ст. Талачын, расстраляны 27.10.1943 за сувязь з партызанамі.

ГРЫГАРОВІЧ Рыгор Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1922, быў арыштаваны гітлераўцамі як сын камуніста.

ГУБАРЭВІЧ Юзэфа Аляксандраўна, нарадзілася ў 1905.

ДАЛЬНІКОВІЧ Таццяна Максімаўна, нарадзілася ў 1913.

ДЗЕМЯНКОЎ Дзмітрый Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1914, камандзір аддзялення партызанскага атрада, загінуў 20.1.1944 каля ст. Зябкі Глыбоцкага р-на.

ЗАЙЦАВА Агрыпіна, нарадзілася ў 1901.

ЗАЙЦАЎ Рыгор Пятровіч, нарадзіўся ў 1922, загінуў 27.9.1943, пахаваны ў в. Прылессе.

ЗАЙЦАЎ Рыгор Ф., нарадзіўся ў 1923.

ЗЕЛЮТКОЎ Іван Мікітавіч, нарадзіўся ў 1919, працаваў трактарыстам; партызан, загінуў у чэрвені 1944 у Лепельскім р-не.

ІВАНОЎ Аляксандр Трафімавіч, начальнік штаба атрада 5-й партызанскай брыгады, загінуў у маі 1944.

КАЗІМІРОНЕЦ Аляксандр Станіслававіч, нарадзіўся ў 1929, загінуў у маі 1943 пры ўзрыве міны, якую сам устанавіў у кінатэатры Талачына.

КІРАЕВА, нарадзілася ў 1894.

КРЫВУШЭНКА Дамітрый Іванавіч, нарадзіўся ў 1910, партызан атрада «Перамога» 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 9.4. 1944, пахаваны ў в. Новы шлях.

КРЫЖАНЕЎСКАЯ Сцепаніда, нарадзілася ў 1912, забіта разам з дваімі дзецьмі.

КУДЗІН Леанід Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1937.

КУДЗІН Уладзімір Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1940.

КУДРАЎЦАЎ Віктар Раманавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан атрада імя В. І. Чапаева Сенненскай брыгады в 22.11.1942, загінуў 22.9.1944.

Т. А. Нарчук.

КУЛІК Міхаіл Дамітрыевіч, сувязны атрада імя Ф. Л. Фядосава 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава, працаў без вестак у красавіку 1944.

КУЛЯШОЎ Міхаіл Васілевіч, нарадзіўся ў 1923, загінуў 13.1.1944 у в. Чарэя Чашніцкага р-на.

КУМІНСКАЯ Ніна Рыгораўна, нарадзілася ў 1919.

КУРЧАЎ Васіль Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1920, да вайны працаваў у Равяніцкай МТС, партызан, загінуў 6.1.1943, пахаваны ў в. Дольдзева Сенненскага р-на.

ЛІСОЎСКАЯ Браніслава, нарадзілася ў 1902.

ЛІСОЎСКІ Леанід, нарадзіўся ў 1924.

ЛІТВІНАЎ Яўген Міхайлавіч, партызан атрада № 3 «Ураган» партызанскай брыгады М. П. Гудкова з 1.8.1943, загінуў 19.11.1943 у в. Драздова.

МАСЮЦІН Аркадзь Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1913, партызан атрада імя В. І. Чапаева Сенненскай брыгады, прапаў без вестак у маі — чэрвені 1943.

МАТРОСАЎ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1901, да вайны працаваў у Талачыне тэхнікам-будаўніком, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

МАЦЮШЭЎСКАЯ Настасся Іванаўна, нарадзілася ў 1910, арыштавана фашыстамі за сувязь з партызанамі і расстраляна ў Барысаве.

МАШКАРОВА Фядора Сцяпанаўна, нарадзілася ў 1900, забіта разам з дзецьмі.

МІКУЛЬЧЫК Пётр, нарадзіўся ў 1918.

МІКУЛЬЧЫК Тарас, нарадзіўся ў 1894, забіты разам з дваімі дзецьмі.

НАРЧУК Таццяна Андрэеўна, нарадзілася ў 1914 у в. Казяны Шумілінскага р-на, да вайны жыла ў Талачыне, схоплена ў жніўні 1942, расстраляна ў верасні 1942 у г. п. Крупкі ў ліку 100 заложнікаў за нападзенне партызан на ст. Слаўнае 28.8.1942.

ПАЎЛІНСКАЯ Агафія Кірылаўна, нарадзілася ў 1893, расстраляна ў 1944 у в. Малянкоўка Чашніцкага р-на.

ПАЎЛІНСКІ Ціт Усцінавіч, нарадзіўся ў 1887, партызан 1-га атрада брыгады М. П. Гудкова, прапаў без вестак у чэрвені 1944 у час блакады.

ПУШКІНА Ганна Тарасаўна, удзельніца Барысаўскага падполля, загінула ў канцлагеры пад Баранавічамі.

Нязломныя

У Талачыне, на ўскраіне парку, над самым абрывам каля ракі Друць стаяў вялікі драўляны дом. У ім жыла сям'я Тараса Іванавіча Пушкіна — старога члена партыі, партызана Грамадзянскай вайны, актыўнага ўдзельніка калектывізацыі. Сям'я была немалая, але на час вайны з бацькамі жылі

Я. П. Чачоткін.

А. М. Каўрыга.

Н. Ф. Тамашэўская.

А. П. Каранькоў.

толькі двое дзяцей — семнаццацігадовая дачка Рая і самы малодшы сын Аляксей. Дзве старэйшыя дачкі — Таццяна і Ганна — працавалі ў Барысаве. Сын Дзмітрый быў у арміі.

Чырвонаармейцы, якія адышлі на ўсход, пакінулі ў Талачыне ў парку шмат рознай зброі. Тарас Іванавіч уважліва агледзеў кінутыя вінтоўкі, кулямёты, скрынкі з боепрыпасамі. А ўвечары разам з Раяй і Алёшам сабраў зброю і да позняй ночы хаваў яе. Частку закапалі ў зямлю, частку кінулі ў рэчку. Пазней усё гэта было перададзена партызанам. Нехта з фашысцкіх паслугачоў данёс нямецкім уладам на Тараса Пушкіна. Над старым навісла небяспека. Каб выратаваць бацьку, Рая ўпотай адправіла яго да сястры ў Барысаў. А сама з братам устанавілі сувязь з партызанамі, сталі працаваць сувязнымі.

Не скарыліся ворагу і старэйшыя дочкі Тараса Іванавіча (сталі падпольшчыцамі). Таццяна мела ў Барысаве добрую кватэру. Разам з ею жыла і Ганна. Адзін з пакоў займала бухгалтар райфінаддзела Юлія Іванаўна Лукомская, таксама з Талачыншчыны. Падпольную работу дзяўчаты пачалі з таго, што хавалі чырвонаармейцаў, якія выйшлі з акружэння, дапамагалі ўцякаць з лагера ваеннапалонным. Многім савецкім байцам выратавалі патрыёткі жыццё, нярэдка самі былі на валаску ад смерці. Кола дзейнасці групы паступова пашырялася, наладзілася сувязь з падпольным цэнтрам. Па яго заданню Ганна і Юлія ўладкаваліся на работу. Ганна стала працаваць у санэпідэмстанцыі, дзе была лабаранткай яшчэ да вайны (дзякуючы тут знаходзіўся падпольны цэнтр). Юлія Лукомская ўладкавалася ў аддзел сацыяльнага забеспячэння ўправы. Гэта дазволіла ім атрымліваць розныя важныя звесткі, якія неадкладна перадаваліся партызанам. Так, праз Ганну і яе сяброў партызаны даведаліся пра карныя экспедыцыі, якія рыхтаваліся фашыстамі, пра час і месца іх правядзення, аб колькасці ворагаў. У выніку планы гітлераўцаў правальваліся, а нярэдка карнікі самі траплялі на партызанскія засады. На сваёй рабоце Лукомская даставала і перадавала падпольшчыкам копіі нямецкіх загадаў і распараджэнняў, дапамагала сваім сябрам здабываць са складоў адзенне і абутак. Усё гэта перапраўлялася народным мсціўцам.

У кватэры дзяўчат знаходзіліся пішучая машынка і радыёпрыёмнік. Падпольшчыцы атрымлівалі з Вялікай зямлі зводкі Саўінфармбюро, размнажалі іх на машынцы. Нярэдка яны самі выпускалі лістоўкі, якія заклікалі насельніцтва смялей і актыўней узнімацца на барацьбу з ворагам. Ноччу расклейвалі іх у горадзе. Адважныя патрыёткі ўмудраліся вывешваць іх нават пад самым носам у фашыстаў — на камендатуры, управе, у самых нечаканых месцах. І ўсё ж гітлераўцам удалося высачыць падпольшчыц. Першую схапілі Лукомскую, прама з лістоўкамі, якія яна не паспела расклеіць. Разам з Юляй была і Ганна, але ёй удалося ўцячы. Доўга дапытвалі каты падпольшчыцу, не скупіліся на здзекі, стараючыся выцягнуць прызнанне. Але ні слова не сказала яна. Нічога не дабіўшыся, фашысты расстралялі Юлію Лукомскую. На расстрэл яе везлі ў легкавой машыне праз увесь горад. Калі праязджалі па многалюдных вуліцах, Юлія крычала ў адчыненае акно машыны: «Смерць праклятым фашыстам! Перамога будзе за намі! Савецкі народ непераможны!»

Удалося фашыстам арыштаваць і Ганну. Але ніякіх доказаў у іх не было, Юлія яе не выдала. І Ганну адпусцілі. Яна зноў уключылася ў работу. Аднак свабода была нядоўгай. Неўзабаве фашысты ўзялі аднаго з сувязных — маладога хлопца. Ён не вытрымаў катаванняў і назваў многіх падпольшчыкаў. Пасля працяглых катаванняў Ганна і яе сябры былі адпраўлены ў канцэнтрацыйны лагер пад Баранавічамі. І там адважныя патрыёты не скарыліся. У Пушкінай былі дзве залатыя дзесяткі. Іх перадала сястра Таццяна, зашыўшы ў адзенне. Выратавалі падкупіць паліцэйскага, які стаяў на варце. Дамовіліся, што ён дапаможа арганізаваць уцёкі з лагера некалькім чалавекам, у тым ліку і Ганне. Аднак, калі людзі былі ўжо амаль на волі, паліцэйскі адкрыў па іх агонь. Пачаліся пагоні. Некаторым удалося ўцячы, але большасць назаўсёды засталіся ляжаць на балоце, праз якое хацелі вырвацца на свабоду. Разам з імі загінула і Ганна Пушкіна — бясстрашная патрыётка-падпольшчыца.

А. Арлоўскі.

РАДЗЮКОЎ Васіль Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў 17.5.1942.

САЛАЎЁЎ Лаўрэн Патапавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан атрада імя М. І. Кутузава брыгады «Смерць фашызму» з кастрычніка 1943, прапаў без вестак у ліпені 1944.

САЎЧАНКА Віктар Іванавіч, нарадзіўся ў 1926, вывезены ў Германію.

СІНЯКОЎ Іван Фёдаравіч, партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў 27.4.1944.

ТРЫБЕНДЗІС Ядвіга Браніслававна, нарадзілася ў 1926, партызанка атрада «Перамога» брыгады «Граза», прапала без вестак 24.5.1944.

ФРАЛОЎ Якаў Іларыёнавіч, да вайны працаваў дырэктарам Талачынскага лясгаса; сувязны 5-га атрада партызанскай брыгады «Чэкіст». Зімой

Міліцэйскае пасведчанне Я. М. Каўрыгі.

1943—44 быў арыштаваны фашыстамі, адпраўлены ў Барысаў, дзе пазней быў расстраляны.

ЧАЧОТКІН Ягор Пракопавіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны працаваў натарыусам, партызан 1-й Смаленскай брыгады са жніўня 1943, загінуў 8.6.1944.

ЭРДМАН Елізавета Андрэеўна, нарадзілася ў 1910 у в. Казяны Шумілінскага р-на, да вайны жыла ў Талачыне, схоплена ў жніўні 1942, расстраляна ў верасні 1942 у г. п. Крупкі ў ліку 100 заложнікаў за нападзенне партызан на ст. Слаўнае 28.8.1942.

ТАЛАЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАНЧАРОЎКА

КАМОШКА Васіль Кірылавіч, нарадзіўся ў 1908, расстраляны ў 1943 у в. Ганчароўка за сувязь з партызанамі.

САВІЧ Вольга Юльянаўна, нарадзілася ў 1925, вывезена фашыстамі ў 1944 у Германію і там расстраляна.

ШАЛЯНОК Настасся, нарадзілася ў 1895 у в. Лясныя Круглянскага р-на, жыла ў в. Ганчароўка, у 1943 расстраляна за сына-партызана каля в. Маціёва.

ШАЛЯНОК Уладзімір Антонавіч, нарадзіўся ў 1918, сувязны 8-й Круглянскай партызанскай брыгады, у 1944 арыштаваны фашыстамі і расстраляны каля в. Маціёва.

ВЁСКА ГІРЫМШЧЫНА

КАЎРЫГА Аляксей Максімавіч, партызан, камандзір узвода 30-га атрада 8-й Круглянскай партызанскай брыгады, загінуў 31.7.1943 пры разгроме фашысцкага гарнізона ў в. Дубовае Крупскага р-на.

КАЎРЫГА Кацярына Іванаўна, нарадзілася ў 1890, расстраляна за сына-партызана.

КАЎРЫГА Максім, закатаваны за дзяцей-партызан.

КАЎРЫГА Пётр Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, загінуў у баі 1942 каля в. Ганчароўка.

КАЎРЫГА Ягор Максімавіч, нарадзіўся ў 1917, партызан, камандзір разведкі 30-га атрада 8-й Круглянскай партызанскай брыгады, загінуў 31.7.1943 пры разгроме фашысцкага гарнізона ў в. Дубовае Крупскага р-на.

КУЛІК Таццяна, нарадзілася ў 1875, расстраляна за ўнука-партызана.

МАКАРЭВІЧ Анатоль Барысавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў у баі ў 1942 каля в. Ганчароўка.

МАКАРЭВІЧ Еўдакія Фёдараўна, нарадзілася ў 1918, расстраляна за мужа-партызана.

МАКАРЭВІЧ Міхаіл Барысавіч, нарадзіўся ў 1919, працаваў старшынёй калгаса; партызан, загінуў 31.7.1943 у в. Дубовае Крупскага р-на.

МАКАРЭВІЧ Феадосія Якаўлеўна, нарадзілася ў 1865, расстраляна за сына-партызана.

ЯКУБОВІЧ Іван Харламавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў у баі ў 1942, каля в. Ганчароўка.

ЯКУБОВІЧ Паланея, нарадзілася ў 1893, расстраляна за сына-партызана.

ЯКУБОВІЧ Харлам Ісакавіч, нарадзіўся ў 1890, расстраляны за сына-партызана.

ВЁСКА ДРУЦК

КАРЧАКОВА Матрона Пракопаўна, нарадзілася ў 1895, забіта ў 1943.

ВЁСКА ЖАЎНА

ШЭЛЕПЕНЬ Антон Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1920, працаваў у леспрамгасе, партызан брыгады «Граза», загінуў 25.5.1944, пахаваны ў Чашніцкім р-не.

ВЁСКА ЗЯЛЁНАЯ

АНТАНЕВІЧ Мікалай Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1908, працаваў на чыгунцы ў Оршы, схоплены фашыстамі ў 1941 і закатаваны ў канцлагеры.

ВЁСКА КАНАПЕЛЬЧЫЦЫ

ГРУШЭЎСКІ Віктар Іванавіч, нарадзіўся ў 1912, партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў у 1944.

МАШЭЎСКІ Навум Паўлавіч, МАШЭЎСКАЯ, яго жонка, расстраляны ў 1943.

РАБЦАЎ Станіслаў Іванавіч, нарадзіўся ў 1922, член ВЛКСМ, расстраляны ў 1943 каля в. Маціёва.

РАБЦАЎ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў 1922, член ВЛКСМ, расстраляны ў 1943 каля в. Маціёва.

ВЁСКА КАЦЭВІЧЫ

РАДЗІВІЛАЎ Мікалай Емяльянавіч, партызан, загінуў пры пераправе цераз раку каля Барысава.

ВЁСКА КРЫВОЕ

ЛАНКОЎСКІ Дарафей, нарадзіўся ў 1884.

ТАМАШЭЎСКАЯ Надзея Фёдараўна, нарадзілася ў 1918, медсястра партызанскага атрада, загінула 14.6.1942.

ВЁСКА ЛІСОЎШЧЫНА

ЛІСОЎСКІ Уладзімір Паўлавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, загінуў у лютым 1944, пахаваны ў в. Слабада Крупскага р-на.

І. Ю. Савіч.

ВЕСКА МАЦІЕВА

КАРАНЬКОЎ Аляксей Пракопавіч, партызан, загінуў 29.1.1944.

МАСЛОЎСКІ Мікалай Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1917, арыштаваны фашыстамі за захоўванне зброі і расстраляны ў 1942 каля в. Маціёва.

СОКАЛ Барыс Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, загінуў 17.4.1944, пахаваны ў г. п. Коханава.

ШЫШКО Емяльян Фаміч, нарадзіўся ў 1901.

ВЕСКА МУРАЎНІЧЫ

АЎЧЫНКА Вітольд Антонавіч, партызан, загінуў у 1942.

АЎЧЫНКА Дзмітрый Антонавіч, нарадзіўся ў 1915, лейтэнант, партызан, загінуў у 1943.

АЎЧЫНКА Мікалай Карпавіч, нарадзіўся ў 1903, закатаваны фашыстамі.

ЗАПЦАЎ Уладзімір Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1919.

ЛІТВІНКА Анатоль Данілавіч, нарадзіўся ў 1926, закатаваны фашыстамі.

ЛІТВІНКА Мікалай Ісакавіч, нарадзіўся ў 1926, партызан, загінуў у 1944 на тэр. Талачынскага р-на.

ЛІТВІНКА Міхаіл Данілавіч, нарадзіўся ў 1916, партызан.

ТАЛКАЧОЎ Андрэй Лук'янавіч, нарадзіўся ў 1910.

ТАЛКАЧОЎ Сцяпан Лук'янавіч, нарадзіўся ў 1910, партызан.

ШАПАЛЕВІЧ Пётр Васілевіч, нарадзіўся ў 1922, закатаваны фашыстамі.

ВЕСКА НОВАЕ САКОЛІНА

БАЛАШОВА Хрысціна Якаўлеўна, БАЛАШОВА Вольга, БАЛАШОЎ Коля, 4 гады, **БАЛАШОЎ Лёня**, 2 гады, расстраляны гітлераўцамі ў в. Рыдамля.

БЕЛЯКОЎ Тамаш Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1892, у пачатку вайны пагнаў жывёлу на Усход, прапаў без вестак.

БУРЦАЎ Сяргей Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1886, расстраляны ў 1942 каля в. Маціёва, перапахаваны ў брацкай магіле каля в. Саколіна.

КНЫШ Вера Лаўрэнцьеўна, нарадзілася ў 1924, партызанка.

КНЫШ Іван Пракопавіч, нарадзіўся ў 1889, расстраляны гітлераўцамі ў 1942 каля в. Маціёва, перапахаваны ў брацкай магіле ў в. Саколіна.

Помнік на магіле ахвяр фашызму ў вёсцы Райцы.

КНЫШ Міхаіл Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1926, партызан.

ЛАМАН Іван Савельевіч, нарадзіўся ў 1912, працаваў у калгасе «17 год Кастрычніка», загінуў у 1944 у канцлагеры.

НОСАЎ Уладзімір Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1904, загінуў у 1944 у канцлагеры.

ПЧЭЛЬНІКАЎ Пётр, ПЧЭЛЬНІКАВА Марыя Пракопаўна, расстраляны ў Талачыне за сувязь з партызанамі.

СВІРЫДАЎ Міхаіл, у пачатку вайны пагнаў жывёлу на Усход, прапаў без вестак.

ВЕСКА ПАЛЯВАЯ (БЫЛАЯ МАНАСТЫРЫ)

ГАЛУШКА Фёдар Карнеевіч, нарадзіўся ў 1910 у Кобрынскім р-не, жыў у в. Манастыры, працаваў на чыгунцы; расстраляны ў 1942 каля в. Маціёва.

КАЗЫРЭВІЧ Анатоль Паўлавіч, нарадзіўся ў 1927 у в. Фёдараўскае Смаленскай вобл., жыў у в. Манастыры; з 1943 партызан Круглянскай ваенна-аператыўнай групы, загінуў каля в. Шчыток Круглянскага р-на.

МЯСНІКАЎ Апанас Іванавіч, нарадзіўся ў 1923, памёр ад ран 1.4.1944, пахаваны ў г. Кроменец Цярнопальскай вобл.

МЯСНІКАЎ Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1917.

МЯСНІКАЎ Іосіф Іванавіч, нарадзіўся ў 1919.

МЯЦЕЛІЦА Рыгор Агафонавіч, нарадзіўся ў 1914, працаваў настаўнікам у в. Антонава Слаўненскага сельсавета; расстраляны ў 1942 каля в. Маціёва.

НАВІЦКАЯ Ганна Іосіфаўна, партызанка, памёрла ад ран 17.6.1944, пахавана ў Смаленску.

РАКУШАЎ Іван Дзмітрыевіч, партызан, загінуў 25.12.1943, пахаваны ў в. Каскевічы Круглянскага р-на.

ШАРШУН Аляксандр Пятровіч, нарадзіўся ў 1915, партызан 2-й брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак 3.5.1944.

ВЕСКА ПАНЬКАВІЧЫ

БЯЛОВА Ганна Якаўлеўна, нарадзілася ў 1906.

КАВАЛЕЎСКІ Якаў Васіленіч, нарадзіўся ў 1875.

КАЗАКЕВІЧ (ШЫДЛОЎСКАЯ) Вольга Васілеўна, нарадзілася ў 1910, з 1942 у партызанах, у 1943 у час блакады трапіла ў фашысцкі палон і закатавана.

КУЛЯШЫНСКАЯ Віктарыя Палікарпаўна, нарадзілася ў 1899, расстраляна як маці партызана.

РАДЗІВІЛАЎ Стэфан Мікалаевіч, нарадзіўся ў 18[illegible].

ШЫДЛОЎСКАЯ Вера Васілеўна, нарадзілася ў 1923, член ВЛКСМ, з 1942 у партызанах, у час блакады ў 1943 трапіла ў фашысцкі палон, расстраляна каля в. Маціёва.

ШЫДЛОЎСКАЯ Яўгенія Іосіфаўна, нарадзілася ў 1916.

ШЫДЛОЎСКІ Аляксей Васілевіч, нарадзіўся ў 1908, з 1942 у партызанах, у час блакады трапіў у фашысцкі палон і расстраляны каля в. Маціёва.

ШЭЛЕГАЎ Сцяпан Пятровіч, партызан, прапаў без вестак 5.2.1942.

ВЕСКА ПРУДЗЕЦ

ДУБАВЕЦ Яфім Пракопавіч, нарадзіўся ў 1912, з 7.1.1944 партызан брыгады «Граза», загінуў 25.5.1944.

ВЕСКА ПРУДЦЫ

БЕЛАХВОСЦІК Мікалай Трафімавіч, нарадзіўся ў 1926 у в. Лужная, партызан, загінуў 15.3.1944, пахаваны каля станцыі Лоўша. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БЕЛАХВОСЦІК Мікалай Трафімавіч, партызан-

М. Л. Кныш.

Павел Васілевіч Матлох.

Л. С. Аблётнікаў.

М. П. Пякарскі.

падрыўнік, загінуў пры выкананні баявога задання.

БЕЛАХВОСЦІК Трафім Паўлавіч, нарадзіўся ў 1885, расстраляны ў 1942 за сувязь з партызанамі.

КАПІЧ Мікалай Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў 15.6.1943 у в. Палессе Круглянскага р-на.

КАПІЧ Надзея Пракопаўна, нарадзілася ў 1906, партызанская сувязная, загінула ў 1942.

ВЕСКА РАВУЧА

АБЛЕТНІКАЎ Леанід Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў 15.10.1942 у в. Баўсевічы Круглянскага р-на.

ЛУГОЎСКІ Віктар Пятровіч, нарадзіўся ў 1924, вывезены фашыстамі ў Германію ў 1944, забіты пры спробе ўцячы.

ВЕСКА РАЙЦЫ

АБЛАВАЦКАЯ Надзея Андрэеўна, нарадзілася ў 1905 у в. Казяны Шумілінскага р-на, да вайны працавала ў саўгасе «Рэканструктар», схоплена ў жніўні 1942, расстраляна ў верасні 1942 у г. п. Крупкі ў ліку 100 заложнікаў за нападзенне партызан на ст. Слаўнае 28.8.1942.

БУЧКО Марыя Т., нарадзілася ў 1929.

ГІЛІМОВІЧ Наталля, нарадзілася ў 1918.

ПЯКАРСКАЯ Вера Іванаўна, нарадзілася ў 1887.

ПЯКАРСКІ Міхаіл Платонавіч, нарадзіўся ў 1921, партызан, камандзір аддзялення, загінуў 8.7.1944, пахаваны ў в. Латыгаўка Мінскага р-на.

ШВЕДКА Віктар З., нарадзіўся ў 1933.

ШВЕДКА Віктар Ф., нарадзіўся ў 1933.

ШНУРКО Марыя, нарадзілася ў 1915.

ВЕСКА СЕНЧУКІ

КУЗЬМІНА Надзея Міхайлаўна, нарадзілася ў 1910, медсястра.

ЛУГОЎСКАЯ Надзея Міхайлаўна, нарадзілася ў 1910, расстраляна ў 1943 у Талачыне за сувязь з партызанамі.

ВЕСКА СЛАБОДКА

ВАЛЧОК Мікалай Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1912, партызан Сенненскай брыгады, загінуў 5.6.1944, пахаваны ў в. Слабодка.

ВАЛЧОК Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1903, партызан брыгады «Граза», прапаў без вестак у час блакады 30.5.1944.

КАВАЛЁЎ Іван Абрамавіч, нарадзіўся ў 1923, партызан, памёр ад хваробы 24.3.1943, пахаваны ў в. Рыжанкі Чашніцкага р-на.

КАРОЛЬКА Фёдар Фролавіч, нарадзіўся ў 1903; партызан, прапаў без вестак 30.5.1944.

КУЛІК Максім Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1906, партызан, прапаў без вестак 30.5.1944.

ТАЛОШКА Мікалай Паўлавіч, нарадзіўся ў 1925, член ВЛКСМ, партызан, загінуў у час блакады пад Лепелем у лютым 1944.

ВЕСКА СТАРОЕ САКОЛІНА

КАМПІСКІ Іван Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1918, ваенфельчар, быў санінструктарам 239-га стралковага палка, партызан, загінуў 7.6.1944.

КРАЎЧАНКА Сяргей Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1922 у в. Яскаўшчына, з 1942 партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў у час прарыву блакады ў 1944.

МАТЛОХ Павел Васілевіч, нарадзіўся ў 1909, з 1942 партызанскі сувязны, расстраляны 27.8.1943.

МАТЛОХ Паліна Васілеўна, нарадзілася ў 1883, забіта ў верасні 1941.

МАТЛОХ Пімен Васілевіч, нарадзіўся ў 1890, меў сувязь з партызанамі брыгады М. П. Гудкова, расстраляны 27.8.1943 за сувязь з партызанамі.

ХАДНЕВІЧ Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1926, 30.3.1944 падарваўся на міне.

ЯРОЦКІ Міхаіл Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1922, з 1943 у партызанах, загінуў 17.3.1944 у Смаленскай вобл.

ВЕСКА СТАРЫ ТАЛАЧЫН

РАШЭТНІКАЎ Пётр Фядосавіч, нарадзіўся ў 1923.

ВЕСКА СТАРЫНКА

КАСТНЯКОВА Хадосся Іванаўна, нарадзілася ў в. Лаўрэнаўка, загінула ў 1942 у Ленінградзе.

ВЕСКА СУРНАЎКА

КАВАЛЕЎСКІ Аляксей Іванавіч, нарадзіўся ў 1878.

МЯДЗВЕДСКАЯ Вольга Аляксееўна, нарадзілася ў 1912.

СТАХНО Сяргей Ігнатавіч, з 1942 у партызанах, загінуў 26.10.1943.

ВЕСКА СЯЛЕЦ

АНУФРЫЕВА Марыя Пятроўна, схоплена фашыстамі ў студзені 1944 і адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе і загінула.

БАРЫСЕНКА Пелагея Паўлаўна, нарадзілася ў 1909, забіта ў чэрвені 1942.

БАРЫСЕНКА Раман, нарадзіўся ў 1905, забіты ў чэрвені 1942.

ГРУШЭЎСКАЯ Аляксандра, нарадзілася ў 1896, у 1944 схоплена фашыстамі за сувязь з партызанамі, сядзела ў турмах у Талачыне, Барысаве, Мінску, потым разам з 10-гадовым сынам адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе і загінула.

ЗАБЕЛА Марыя Лявонаўна, нарадзілася ў 1923, у студзені 1944 схоплена гітлераўцамі за сувязь з партызанамі і з дваімі дзецьмі адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе і загінула.

КАРТАВІЦКІ Фёдар Васілевіч, нарадзіўся ў 1901, забіты ў чэрвені 1942.

КІРЫЧЭНКА Праскоўя, у 1944 арыштавана гітлераўцамі за сувязь з партызанамі і разам з дваімі дзецьмі адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе і загінула.

КУЗЬМІН Фёдар Ільіч, КУЗЬМІНА Пелагея, у 1944 схоплены фашыстамі і закатаваны ў лагеры смерці Трасцянец.

ЛАШКЕВІЧ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1915, забіты ў чэрвені 1942.

ЛАШКЕВІЧ Соф'я Парфёнаўна, нарадзілася ў 1916, у студзені 1944 схоплена гітлераўцамі за сувязь з партызанамі і разам з чацвярымі дзецьмі адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе ўсе загінулі.

ЛУГОЎСКАЯ Вольга Аксёнаўна, нарадзілася ў 1880, забіта ў чэрвені 1942.

ЛУГОЎСКАЯ Лізавета Канстанцінаўна, у студзені 1944 схоплена фашыстамі за сувязь з партызанамі і разам з сынам адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе ўсе і загінулі.

РАБЧЭЎСКАЯ Агаф'я Максімаўна, нарадзілася ў 1901, у студзені 1944 схоплена гітлераўцамі і разам з дваімі дзецьмі адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе ўсе і загінулі.

ТРЫПУЦІНА Ганна Іванаўна, нарадзілася ў 1910, у студзені 1944 схоплена фашыстамі за сувязь з партызанамі і разам з пецярымі дзецьмі адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе ўсе і загінулі.

ЯСТРАБАВА Марыя Фёдараўна, у студзені 1944 была схоплена фашыстамі і разам з чацвярымі дзецьмі адпраўлена ў лагер смерці Трасцянец, дзе ўсе і загінулі.

ВЕСКА ТАЛАСКАЎШЧЫНА

КАЗЫРЭВІЧ Іван Паўлавіч, нарадзіўся ў 1919 у в. Кармянава Смаленскай вобл., жыў у в. Таласкаўшчына, працаваў на чыгунцы; з 1943 партызан Кругляпскай ваенна-аператыўнай групы.

КАЗЫРЭВІЧ Марыя, расстраляна як маці партызана.

ВЕСКА ШМІДЗЕЛЬШЧЫНА

СІДЛЯРОВІЧ Антон Вендаіктавіч, нарадзіўся ў 1912, загінуў у 1942 каля в. Шмідзельшчына, пахаваны ў в. Саколіна.

ЯЦКЕВІЧ Захар Ифрэмавіч.

ЯЦКЕВІЧ Ірына Захараўна.

ВЁСКА ЯСКАЎШЧЫНА

КРАЎЧАНКА Сяргей Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1924, з студзеня 1944 партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў 20.5.1944.

ЦАПКОЎ Андрэй Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1918, з студзеня 1944 партызан брыгады М. П. Гудкова, прапаў без вестак 10.6.1944 у Лепельскім р-не.

ЧАЧОТКІНА Соф'я Апанасаўна, нарадзілася ў 1909, забіта ў сакавіку 1944.

* * *

Жыхары былога Палюдаўскага сельсавета, прыналежнасць якіх да сучасных вёсак устанавіць не ўдалося:

БАГДАНОВІЧ Уладзімір, нарадзіўся ў 1922; **БАРКОЎСКІ Баляслаў**, нарадзіўся ў 1914; **БОНДАР Васіль**, нарадзіўся ў 1864; **БЯРНІЦКІ Аляксандр**, нарадзіўся ў 1889; **ГАЛЫНЕЦ Казімір А.**, нарадзіўся ў 1917; **ГРЫЯМАВА Марыя Т.**, нарадзілася ў 1930; **ГРЫЯМАЎ Міхаіл Т.**, нарадзіўся ў 1927; **КАРАЛЁЎ Пётр Іванавіч**, нарадзіўся ў 1888; **КАРАНЬКОВА Настасся**, нарадзілася ў 1904; **ЛІТВІНКА Аляксандр Аляксандравіч**, нарадзіўся ў 1915; **МАНУТА Максім Д.**, нарадзіўся ў 1903; **МАРОЗАЎ Максім Ягоравіч**, нарадзіўся ў 1864; **ПУНЧАНКА Іосіф Ф.**, нарадзіўся ў 1914; **СІДАРЭНКА Аляксандр**, нарадзіўся ў 1942; **УСАЎ Мікалай М., ЮРЧАНКА Павел Іванавіч**, нарадзіўся ў 1864.

ПАРТЫЗАНЫ — УРАДЖЭНЦЫ ІНШЫХ РАЁНАЎ І АБЛАСЦЕЙ, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ І ПАХАВАНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНА

ВЕСКА АЛЁНАВІЧЫ

БАРАНОЎСКІ Мікалай Мікітавіч, нарадзіўся ў 1925 у в. Смаляны Аршанскага р-на, загінуў 16.6.1943.

КОЖЫНАЎ Васіль Рыгоравіч, нарадзіўся на станцыі Цюрлема Казлоўскага р-на Чувашскай АССР.

КРЫШТАЛЕНКА Дзмітрый Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1923 у в. Забор'е Сенненскага р-на, загінуў 20.8.1943.

ВЁСКА АНЕЛІНА

БЕЛЯКОЎ Сяргей Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1919 у в. Віслаўка Краснаярскага р-на Куйбышаўскай вобл., загінуў 12.3.1944.

КАРАБАНЬ Прохар Раманавіч, нарадзіўся ў 1921 у в. Свядзіца Лепельскага р-на, загінуў 12.3.1944.

ЛЕНЦНЕР Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў 1923 у г. Крывы Рог Днепрапятроўскай вобл., загінуў 12.10.1943.

СІЛАЧОЎ Дзмітрый Гаўрылавіч, нарадзіўся ў в. Дубкі Смаленскай вобл., загінуў 13.2.1943.

ЯРОМА Яўген Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1920, загінуў у маі 1944.

ВЕСКА ВАРАНІЦЭВІЧЫ

ВОЛКАЎ Пётр Фядосавіч, нарадзіўся ў 1924 у в. Рамшына Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., загінуў 7.6.1944.

ДЗМІТРАЧОНАК Іван Рыгоравіч, нарадзіўся ў Лепельскім р-не, загінуў 29.7.1943.

КАВАЛЬ Міхаіл Аронавіч, нарадзіўся ў в. Лінь Асіповіцкага р-на, загінуў 24.1.1944.

КАСЦЮК Васіль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1917 у в. Сямёнаўка Брацкага р-на Нікалаеўскай вобл., загінуў 28.12.1942.

КАЯНАЎ Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1922 у в. Навяты Пільнінскага р-на Горкаўскай вобл., загінуў у 1944.

ЛУЧКОЎ Якаў Фёдаравіч, нарадзіўся ў в. Садоўна Новахапёрскага р-на Варонежскай вобл., загінуў 28.12.1942.

СКВАРЦОЎ Іван Рыгоравіч, нарадзіўся ў в. Вышкава Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., загінуў 16.1.1943.

ФЕДАРАЎ Мікалай Іосіфавіч, нарадзіўся ў Ленінградзе, былы афіцэр-далітрук; загінуў 17.1.1944.
ЮХНОЎСКІ Віктар Сяргеевіч, нарадзіўся ў Лепельскім р-не, загінуў 6.9.1943.

ВЕСКА ГАЛОШАВА

АЛЕКСІЕВІЧ Іван Самуілавіч, нарадзіўся ў в. Сомры Крупскага р-на Мінскай вобл., загінуў 9.3.1944.
АЛЕКСІЕВІЧ Сцяпан Яфімавіч, нарадзіўся ў в. Сомры Крупскага р-на Мінскай вобл., загінуў 9.3.1944.
ЖЫЛІЗІН Іван Пятровіч, нарадзіўся ў Іркуцкай вобл., загінуў 9.3.1944.
КЛАПОЦКІ Гаўрыла Пятровіч, нарадзіўся ў 1914 у в. Майск Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл., загінуў 9.3.1944.
МІЛАШКІН Васіль Васілевіч, нарадзіўся ў 1907 у в. Цурупы Васкрасенскага р-на Маскоўскай вобл., загінуў 5.6.1943.
ПАНЧАШКА Васіль Ігнатавіч, нарадзіўся ў Казахстане, загінуў 9.3.1944.
ФЕДАРЭНКА Мікалай Уласавіч, нарадзіўся ў 1926 у Невельскім р-не Пскоўскай вобл., загінуў 9.3.1944.
ЧУБАКОЎ Васіль Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1921 у Бялыніцкім р-не Магілёўскай вобл., загінуў 9.3. 1944.
ШЧАСЛАЎСКІ Пётр, загінуў 16.5.1943.

ВЕСКА ЕЎЛАХІ

ТАМАШЭВІЧ Валянцін Мікалаевіч, нарадзіўся ў в. Мёрч Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., загінуў 20.5.1944.

ВЕСКА ЖУКНЕВА

ПЛІСКО Віктар Васілевіч, нарадзіўся ў 1923 у в. Кавалевічы Лепельскага р-на Віцебскай вобл., загінуў 10.8.1943.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК КОХАНАВА

БЯЗЛЮДАЎ Станіслаў Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1926 у г. п. Барань Аршанскага р-на, загінуў 21.1. 1944.
ЗАБАДАЛАЎ Валянцін, разведчык 5-га атрада брыгады «Чэкіст», у студзені 1944 цяжка параненым трапіў у палон, закатаваны гітлераўцамі.
КАБАНАЎ Васіль Кірылавіч, нарадзіўся ў 1916 у г. Балахна Горкаўскай вобл., загінуў 21.1.1944.
ЯКІМЕЦ А., загінуў 21.1.1944.

ВЕСКА ЛАГАЎШЧЫНА

ПАНІН Васіль, партызан 5-га атрада брыгады «Чэкіст», загінуў у баі 19.5.1944 у в. Падбярэззе.
За зіму 1943—1944 гг. фашысты з гарнізона в. Падбярэззе нарабавалі ў насельніцтва, сем'яў партызан шмат коней і кароў. У пачатку мая паліцаі пачалі пасвіць жывёлу непадалёку ад вёскі. Камандаванне пятага атрада партызанскай брыгады «Чэкіст» распрацавала і ўдала ажыццявіла аперацыю па адабранню гэтай жывёлы. Група партызан, пераапранутых у жаночае адзенне, з вёдрамі накіравалася да статка. «Даяркі» з пісталетамі ў руках, акружыўшы пастухоў, загадалі ім гнаць статак да лесу. Але ў гарнізоне хутка зразумелі ў чым справа. Завязаўся бой. У ім загінулі маладыя партызаны сібірак Васіль Панін і наш зямляк Яўген Лазоўскі. Прыкрываючы агнём адыход сваіх таварышаў, абодва яны былі адрэзаны ворагамі. Расказваюць, што Яўген Лазоўскі, расстраляўшы ўсе патроны, апошнюю кулю пусціў у сябе, крыкнуўшы: «Партызаны ў палон не здаюцца!»
Васіля Паніна пахавалі на могілках у вёсцы Лагаўшчына. Яўгена Лазоўскага бацькі пахавалі ў Варанцэвічах.

П. Ф. Лучнік.

ВЕСКА ПАДБЯРЭЗЗЕ

У сакавіку 1944 г. тут адбыўся начны бой. Раніцай наступнага дня немцы і паліцаі сцягнулі ў адно месца загінуўшых партызан. Акупанты і іх памагатыя здзіраліся з мёртвых белыя кажухі, боты. Усё гэта бачылі жыхары вёскі: старыя, дзеці, што назіралі здалёк за пахаваннем. Вяскоўцы казалі, што забітых партызан было 14. Доўгі час іх імёны заставаліся невядомымі. Намаганнямі мясцовых школьнікаў-краязнаўцаў у сярэдзіне 1960-х гадоў было ўстаноўлена, хто вёў гэты бой і для каго з лясных салдат ён стаў апошнім.

У начной аперацыі ўдзельнічалі байцы 5-га батальёна партызанскага палка «Трынаццаць». Загінулі ў баі **АНДРОЕЎ Арцём Макаравіч, ВАРАНЦОЎ Васіль Іванавіч, ДЭМБІЦКІ Уладзімір Мікалаевіч, КАРЖЭЎСКІ Рыгор Васілевіч, КОПЕЎ Іван Пятровіч, ЛЬВОЎ Мікалай Міхайлавіч, МЕЛЬНІКАЎ Сяргей Іванавіч, ПАЎЛАЎ Апанас Капітонавіч, ПЛЯТНЁЎ Іван Аляксандравіч, ШАЛЮПА Сцяпан Фёдаравіч, ШАРСТНЁЎ Іван Ціхонавіч, ШАТОХІН Андрэй Сцяпанавіч, ШЧЭРБА Іван Мацвеевіч.** Імя аднаго партызана не ўстаноўлена.

З успамінаў Г. Е. Барысава, былога сакратара камсамольскай арганізацыі 8-га атрада злучэння «Трынаццаць»

У вёсцы Падбярэззе сталў варожы гарнізон, вакол яе — доты. Нам трэба было непрыкметна прабрацца ў вёску і раптоўным ударам знішчыць акупантаў, спаліць гаражы, узарваць склады з палівам і хутка адысці.

Асцярожна рухаемся ланцугом да пабудоў. «Толькі б не заўважылі»,— свідруе мозг трывожная думка. А тут, як на зло, сціхла завіруха, з-за разарванай хмары выкаціўся поўны месяц. Стала відна. Але вёска маўчыць. Рывок — і мы заляглі за хлявамі. На сэрцы стала лягчэй: усё ж не голае поле. Яшчэ кідок — і мы ў вёсцы. У вокны паляцелі гранаты, на ворага абрушыўся свінцовы ліверь.

Агонь, што ахапіў некаторыя хаты, асвяціў вясковую вуліцу, цалкам забітую аўтамашынамі. Аказалася, пакуль батальён быў на маршы, у вёсцы на дарозе на фронт спыніўся на адпачынак буйная вайсковая часць. Адубелыя на марозе немцы ўваліліся ў хаты і паснулі. Наша атака была для іх нечаканай. Многія з акупантаў, так і не паспеўшы схапіць зброю, былі агорнуты гранатнымі выбухамі, пасечаны кулямётнымі і аўтаматнымі чэргамі. Толькі там, дзе яр аддзяляў крайнія хаты ад гаражоў, майстэрняў, складскіх пабудоў, немцы

А. М. Андрэеў.

Р. В. Каржаўскі.

арганізавалі супраціўленне. З вуглавой хаты яркасна ўдарылі па партызанскім ланцугу скарастрэльныя кулямёты. Нельга было марудзіць ні хвіліны. Наперад рвануўся камандзір аддзялення Паўлаў з гранатай у руцэ — і асеў у снег. З яго рукі граната выхапіў Самойленка і кінуў яе ў дом. Не даляцеўшы крыху да сцяны, граната ўзарвалася. На нейкі момант кулямёты змоўклі. Гэтага было дастаткова. Захаранка хутка перабег адкрытае месца і шпурнуў у немцаў другую гранату. Выбухамі разварнула сцяну хаты, кулямёты змоўклі.

— Самойленка, сюды! — паклікаў таварыша.

Але той не адгукнуўся. Шырока раскінуўшы рукі, ён ляжаў, заліты крывёю. З яра асцярожна выглянулі Міша Герасімаў і Арцём Андрэеў і хутка папаўзлі да гаражоў. Успыхнулі агеньчыкі і тэрмітныя шашкі паляцелі на страху, аб сцены бразнулі бутэлькі з гаручай сумессю. Зашугала полымя, у неба ўзняўся сноп іскраў. Склад узарваў Андрэеў, але сам застаўся ляжаць каля яго. Калі

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у вёсцы Падбярэзае.

пачало світаць, батальён пакінуў Падбярэзае. На вуліцах і ў гаражах гарэлі аўтамашыны, склады, майстэрня. Для многіх гітлераўцаў гэта сакавіцкая ноч стала апошняй. Заданне было выканана.

ВЕСКА РЫДАМЛЯ

БАНЧЫКАЎ Барыс Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1925 у Крычаве Магілёўскай вобл., загінуў 4.5.1944.

ДАМАРАЦКІ Антон Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1916, загінуў 5.5.1944.

ЛЯХОВІЧ Пётр Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1923 у Куйбышаве, загінуў 25.11.1942.

ВЕСКА СЛАВЕНІ

БАЧАРОЎ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Васільеўка Егарлыкскага р-на Растоўскай вобл., загінуў 16.6.1944.

ДУНАЕЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў в. Купцы Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл., загінуў 28.6. 1944.

МАЛАХАЎ Пётр Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1912 г. ў в. Балтай Саратаўскай вобл., перад вайной скончыў ваеннае вучылішча, мал. лейтэнант, авіядэсантнік, ваяваў у партызанах і загінуў у час выканання баявога задання каля в. Латыгаўка ў 1944 г.

Пра апошні бой партызана расказалі чырвоным следапытам Славенскай сярэдняй школы жыхары навакольных вёсак. Акрамя прозвішча і імя, ніхто нічога не ведаў. Чатыры гады школьнікі збіралі звесткі. Знайшліся родныя партызана. На фатаграфіі, якую прыслалі школьнікам, старажылы Латыгаўкі пазналі загінуўшага разведчыка. У 1974 годзе астанкі П. Ф. Малахава былі перапахаваны ў брацкую магілу ў Славенях.

З ПІСЬМА Г. П. МАЛАХАВАЙ НАСТАЎНІКУ СЛАВЕНСКАЙ СШ. КІРАЎНІКУ КРАЯЗНАЎЧАГА ГУРТКА Я. А. ПАСЮЦІНУ

11.5.1974.

...О таком я читала только в книгах, видела много раз в кино. О своем отце помню и горжусь им всегда!..

Но рассказам мамы, бабушек, моих родных... я знала о нём много. Это был очень волевой, целеустремлённый человек, любящий жизнь, свою Родину. При жизни любил детей, старался сделать для них всё, что от него зависело; был находчивый, весёлый (играл на гитаре, пел). С самых юношеских лет принимал активное участие во всех мероприятиях...

Мог бы быть добрым и ласковым отцом. Война прервала всё... Но в наших сердцах и сердцах его родных и близких всегда жива светлая память о нём. Будь то праздник или семейное торжество, всегда и в первую очередь мы вспоминаем тех, кто погиб, защищая нас. Кроме отца, погибли ещё два его младших брата — Василий и Александр. Саша был совсем мальчик. Очень трудно писать такое...

МУХІН Павел Васілевіч, нарадзіўся ў 1918 у Цейкаўскім р-не Іванаўскай вобл., загінуў 3.8.1943.

ВЕСКА УЗНОСНАЕ

ЧЫРКІН Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў г. Вятлуга Горкаўскай вобл., загінуў 24.3.1943.

ТАЛАЧЫН
(пахаванне ў парку калгаса імя Леніна)

ГАЛАЎКОЎ Рыгор Васілевіч, нарадзіўся ў 1918 у г. Барвенкава Харкаўскай вобл., загінуў 4.4.1944.

КАЛІСТРАТАЎ Мікалай Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1913 у Омску, загінуў 7.6.1943.

ПАСЁЛАК УСВІЖ-БУК

БЕЛІКАЎ Іван Амвросіевіч, ДЗЯРБЕНКА Мікалай Васільевіч, нарадзіўся ў 1913, **ШАНО Мікалай**, партызаны 5-га атрада брыгады М. П. Гудкова, загінулі 20.1.1943, пахаваны ў брацкай магіле на ўскрайку лесу за кіламетр ад пасёлка.

* * *

АЛЯКСАНДРАЎ Васіль, партызан брыгады «Чэкіст», загінуў у верасні 1942 каля в. Гарэлікі.

АРХІПАЎ Сяргей, БЯЗЛЮДАЎ Андрэй, САФОНАЎ Аляксандр, партызаны брыгады «Чэкіст», загінулі ў баі з карнікамі каля в. Рэчкі.

ДЗЕНІСЕНКА і СЯРОЎ, партызаны брыгады «Чэкіст», загінулі калі в. Максімкава ў красавіку 1942.

ЛАСКЕВІЧ Ніна, разведчыца партызанскай брыгады «Чэкіст», у лістападзе 1943 затрымана на ст. Талачын, калі перавозіла міну, і расстраляна.

НАТАЛЕВІЧ Аляксандр, партызан брыгады «Чэкіст», загінуў у пачатку 1944 каля в. Максімкава.

ПЕСТУНОЎ Мікалай, партызан брыгады «Чэкіст», у маі 1942 памёр ад ран, пахаваны ў Рацаўскім лесе.

НІКІЦІН Мікалай, нарадзіўся ў 1917 у Іванаўскай вобл.; мал. камандзір, восенню 1941 уцёк з

П. Ф. Малахаў.

варожага палону, з лютага 1942 партызан атрада Гая; загінуў 7.11.1942 разам з таварышам па імені **Леанід** (прозвішча невядома), нарваўшыся на засаду карнікаў каля в. Дубавое.

ВОІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ ПРЫ АБАРОНЕ І ВЫЗВАЛЕННІ ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНА І ПАХАВАНЫ НА ЯГО ТЭРЫТОРЫІ

ВОІНЫ 1-й МАСКОЎСКАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ МОТАСТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

АБАРОЖНЫ Дзмітрый Іванавіч, нарадзіўся ў 1921 у Палтаве; радавы, тэлефаніст, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

АРЦЁМАЎ Сяргей Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1911 у Маскве; радавы, сапёр, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

АХРАМЕЕЎ Ілья Трафімавіч, нарадзіўся ў 1910 у Маскве; радавы, сапёр, прапаў без вестак 7.7.1941.

БАРАДЗІН Іван Іванавіч, капітан, камандзір батальёна 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

БАРЛАНІЦКІ Іван Андрэевіч, нарадзіўся ў с. Літка Броварскага р-на Кіеўскай вобл.; радавы, тэлефаніст, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

БАРЫШ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў с. Краснае Чарнігаўскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

БУДНІК М. В., радавы, наводчык гарматы, загінуў 15.7.1941 на 557-м км Мінскай шашы.

ВАЛАКІТА Андрэй Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1921 у с. Нізы Крамянчугскага р-на Палтаўскай вобл.; прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

ВОЛКАЎ Міхаіл Ільіч, нарадзіўся ў 1910 у Маскве; радавы, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

ГЕРАЛЮК Мікалай Апанасавіч, нарадзіўся ў Ленінградзе; мал. сяржант, тэлефаніст, прапаў без вестак 6.7.1941.

ГЛЫБОКАЎ Іван Федасеевіч, нарадзіўся ў 1912 у Маскве; радавы, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

ГОЛУБЕЎ Міхаіл Іванавіч, лейтэнант 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

ДЗМІТРЫЕЎ Ягор Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1910 у Маскве; радавы, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

ДЗЯНІСАЎ Новум Сямёнавіч, нарадзіўся ў Маскве; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

ЕРМАЛАЕЎ Рыгор Барысавіч, нарадзіўся ў Смаленскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 5.7.1941 у раёне Талачына.

КАРАТУШЧЫК, камандзір узвода 175-га мотастралковага палка, загінуў у ліпені 1941 у раёне г. п. Коханава.

КАРТАЎЦАЎ Пётр Міхайлавіч, нарадзіўся ў Маскве; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

КАРЭЛІН Віктар Мікітавіч, нарадзіўся ў Маскве; радавы, тэлефаніст, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

КАЧАНАЎ, лейтэнант, камандзір кулямётнага ўзвода 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7. 1941 у раёне г. п. Коханава.

КУЗНЯЦОЎ Іван, мал. сяржант, камандзір гарматы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

КУЗНЯЦОЎ Павел Мацвеевіч, палітрук роты 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

ЛАГОША Уладзімір Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1921 у Сумскай вобл.; радавы, разведчык, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

ЛАМАКАЎ Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў г. Талды-Курган Талды-Курганскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

МАРТЫНЧЫК Георгій Іванавіч, нарадзіўся ў 1919 у г. Шостка Сумскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

МАЦЕЦКІ Павел Пятровіч, нарадзіўся ў 1921 у в. Боркавічы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.; радавы, загінуў 6.7.1941 у раёне Талачына.

МІКАЛАЕЎ, лейтэнант 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

МІНАКАЎ Фёдар Фёдаравіч, нарадзіўся ў Крамянчугскім р-не Палтаўскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

НАВУМАЎ Валянцін Аляксеевіч, нарадзіўся ў Данецку; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

НИКІТАЎ Аляксей Іванавіч, нарадзіўся ў Арлоўскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

ПАДСЫТНЫХ, мал. лейтэнант, камандзір узвода 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

ПАНАМАРОЎ Пётр Пятровіч, нарадзіўся ў 1921 у с. Палавенкі Старабельскага р-на Варашылаўградскай вобл.; прапаў без вестак 7.7.1941.

ПЕДЗІК Вячаслаў Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1920 у г. Крамянчуг Палтаўскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

ПРЫХОДА Барыс Георгіевіч, нарадзіўся ў 1921 у г. Палтаве; радавы, разведчык, прапаў без вестак 7.7.1941.

САВАСЦЬЯНАЎ Фёдар Пятровіч, нарадзіўся ў с. Луначарскае Мядынскага р-на Калужскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

САЛОШЧАНКА Іван Гаўрылавіч, нарадзіўся ў Харкаўскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

СІДАРЭНКА Пётр Іванавіч, нарадзіўся ў 1921 у Чарнігаўскай вобл.; прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

СІКАЛАЎ Міхаіл Леанідавіч, нарадзіўся ў 1917 у Маскве; радавы, сапёр, прапаў без вестак 7.7.1941

СІМЯНКОЎ, палітрук 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

СІТДАТУЛІН Гатаўла Сібхатулавіч, лейтэнант, камандзір узвода 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

СКАЦІНЦОЎ Мітрафан Пятровіч, нарадзіўся ў 1910 у Маскве; радавы, сапёр, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

СМІРНОЎ Канстанцін Дамітрыевіч, нарадзіўся ў 1908 у Маскве; радавы, сапёр, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

СУВОРАЎ, мал. лейтэнант, камандзір узвода 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

СУДНЕЎ Міхаіл Яфімавіч, нарадзіўся ў Маскве; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у пёсцы Забалацце.

СЯРГЕЕЎ Ягор Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1910 у Маскве; радавы, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

ТАЛКАЧОЎ Іван Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1914 у Маскве; радавы, прапаў без вестак 7.7.1941.

ТКАЧЭНКА, камандзір артылерыйскага ўзвода 175-га мотастралковага палка, загінуў у ліпені 1941 у раёне г. п. Коханава.

ХАМЁНКА Рыгор Майсеевіч, нарадзіўся ў 1918 у Палтаўскай вобл.; мал. сяржант, камандзір аддзялення сувязі, прапаў без вестак 7.7.1941 у раёне Талачына.

ХАРЛАМАЎ Ігнат Іванавіч, нарадзіўся ў Маскве; радавы, шафёр, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

ЦАРУЧЭНКА Сямён Максімавіч, нарадзіўся ў Мікалаеўскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

ЧУЧЫН Андрэй Андрэевіч, нарадзіўся ў Пяцігорску; радавы, прапаў без вестак 6.7.1941 у раёне Талачына.

ЯЦЎЦЭНКА, ст. лейтэнант 175-га мотастралковага палка, загінуў 15.7.1941 у раёне г. п. Коханава.

АБОЛЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАХАВАННЕ ў в. АБОЛЬЦЫ

МАЛЮЖЭНКА Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў Краснадарскім краі; радавы 17-га кавалерыйскага палка 5-й гв. кавалерыйскай дывізіі, загінуў 26.6.1944 у раёне в. Абольцы.

САМАДУРАЎ Сцяпан Сцяпанавіч, нарадзіўся ў г. Парафіянск Маскоўскай вобл.; ст. сяржант, камандзір аддзялення 17-га гв. кавалерыйскага палка 5-й гв. кавалерыйскай дывізіі, загінуў 26.6.1944 у разведцы.

22 ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ 17-га гв. кавалерыйскага палка 5-й гв. кавалерыйскай дывізіі 3-га гв. кавалерыйскага корпуса і 33-га гв. стралковага палка 11-й гв. стралковай дывізіі, прозвішчы якіх не ўстаноўлены, загінулі ў 1944.

АЗЕРАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАХАВАННЕ ў в. ЖУРАЎЛІ

АНДЖКАЎ Ахмет, нарадзіўся ў 1909 у Лягуэскім р-не Сяміпалацінскай вобл.; радавы, кулямётчык 3-й гв. танкавай брыгады, загінуў 7.7.1944 у в. Жураўлі.

КІТАЕЎ Фёдар Рамановіч, нарадзіўся ў 1896 у Сасноўскім р-не Тамбоўскай вобл.; старшы сяржант, санінструктар 3-й гв. танкавай брыгады, член КПСС, загінуў 7.7.1944 у в. Жураўлі.

ПАХАВАННЕ ў в. ЗАБАЛАЦЦЕ

БУБЕРТАЎ Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1908 у Сонкаўскім р-не Калінінскай вобл.; радавы 38-га аўтамабільнага палка, загінуў 12.6.1944.

ДУБАВЕЦ Арцём Андрэевіч, афіцэр, загінуў 26.4.1944.

КІЯЗЕЎ Канстанцін Ільіч, нарадзіўся ў Няўшскім р-не Свярдлоўскай вобл.; радавы, загінуў 28.5.1944.

ЮРКЕВІЧ Пётр Апанасавіч, нарадзіўся ў 1908; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ВЁСКА ЗАГОР'Е

КЛЕШЧАНОК Іван Майсеевіч, нарадзіўся ў 1917, ураджэнец Крупскага р-на, да вайны жыў у в. Загор'е; прапаў без вестак у верасні 1944.

КОЗІК Мікіта Яўціхіевіч, радавы, быў цяжка паранены, памёр ад ран 24.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

КУЛІК Аляксей Іосіфавіч, радавы; загінуў 20.7.1944 пры вызваленні Літвы, пахаваны каля в. Палагадзе Алітускага р-на.

КУЛІК Іван Ягоравіч, радавы, загінуў 10.9.1944 пры вызваленні Польшчы, пахаваны каля в. Дамбек Беластоцкага ваяводства.

КУЛІК Мікалай Ягоравіч, радавы, загінуў 24.8.1944 пры вызваленні Беластоцкай вобласці.

ПРАТАСЕВІЧ Іван Сяргеевіч, мал. лейтэнант, загінуў 1.2.1944 у баях пад Ленінградам, пахаваны ў в. Сеўрынава Ленінградскай вобласці.

САНОТ Апанас Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1906; радавы, загінуў у 1944 пры фарсіраванні р. Нёман.

САНОТ Мікалай Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1916; загінуў 17.7.1944 пры вызваленні Літвы, пахаваны каля в. Папагадзе Алітускага р-на.

СЕВАСЦЬЯНАЎ Валянцін Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся у 1920; у Чырвонай Арміі з 1940, сяржант, камандзір аддзялення, прапаў без вестак у 1941.

ТКАЧОЎ Васіль Фёдаравіч, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВЁСКА ЗАЛАЗЗЕ

КАНДРАТАЎ Мікалай Фёдаравіч, загінуў у 1944.

КОЗІК Васіль Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

МАШКОВІЧ Данііл Трафімавіч, нарадзіўся ў 1944; радавы, загінуў 29.7.1942, пахаваны каля в. Галавенчыцы Беластоцкага ваяводства.

МАШКОВІЧ Ігнат Паўлавіч, нарадзіўся ў 1920; загінуў у 1941 каля г. Шапятоўка Хмяльніцкай вобл.

МАШКОВІЧ Макар Антонавіч, нарадзіўся ў 1910; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, памёр у палоне 15.1.1942.

МАШКОВІЧ Нічыпар Трафімавіч, нарадзіўся ў 1906; радавы, служыў у сапёрным батальёне, загінуў 20.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

В. Ф. Ткачоў.

М. Ф. Кандратаў.

С. П. Гайсёнак.

У. С. Гайсёнак.

МАШКОВІЧ Пётр Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1923; радавы, загінуў 21.4.1945 у Германіі.

МАШКОВІЧ Пракоп Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, загінуў 23.1.1945.

МАШКОВІЧ Сяргей Гаўрылавіч, у Чырвонай Арміі з 1944, радавы, прапаў без вестак 7.8.1944 каля г. Сувалкі пры вызваленні Польшчы.

ВЕСКА ЗАРЭЧЧА

АФОНІН Аляксандр Аляксеевіч, мал. лейтэнант, прапаў без вестак у 1941.

ВАСІЛЕЎСКІ Іван Фядосавіч, нарадзіўся ў 1906; радавы, загінуў 23.1.1942, пахаваны ў в. Грэднева Ленінградскай вобл.

ВАСІЛЕЎСКІ Ільля Паўлавіч, у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

ВАСІЛЕЎСКІ Міхалай Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1911; радавы, загінуў 21.3.1942 пры абароне Ленінграда, пахаваны на Піскароўскіх могілках.

ВАСІЛЕЎСКІ Фёдар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1909; капітан.

ГАЙСЁНАК Аляксей Сымёнавіч, нарадзіўся ў 1922; у Чырвонай Арміі з 1939, сяржант, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ГАЙСЁНАК Ананас Прохаравіч, радавы, памёр ад ран 21.6.1944 пры вызваленні Літвы.

ГАЙСЁНАК Марк Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1907; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, загінуў у верасні 1944 пры вызваленні Прыбалтыкі.

М. Г. Галубкоў.

І. М. Міхайлаў.

ГАЙСЁНАК Прохар Філімонавіч, камандзір аддзялення, быў цяжка паранены пры вызваленні Літоўскай ССР, памёр ад ран 20.7.1944, пахаваны ў Малецкім р-не Літоўскай ССР.

ГАЙСЁНАК Сямён Прохаравіч, нарадзіўся ў 1901; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1942 у баях за Маскву.

ГАЙСЁНАК Уладзімір Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1922 у г. Орша, да вайны жыў у в. Зарэчча; у Чырвонай Арміі з 1942, скончыў ваеннае вучылішча, афіцэр, загінуў у 1943 у баях пад Растовам, пахаваны на ст. Крымская Краснадарскага краю.

ГАЙСЁНАК Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1898; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ГАЙСЁНАК Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1923; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1942 пад Масквой.

ЖУЛЕВІЧАнуфрый Майсеевіч, нарадзіўся ў 1916; ст. сяржант, памочнік камандзіра ўзвода, загінуў 23.10.1942, пахаваны ў с. Анастасіеўка Туапсінскага р-на Краснадарскага краю.

КОТАЎ Іван Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1902; ст. сяржант, прапаў без вестак у чэрвені 1942.

ЛЫСЯНКОЎ Піліп Лявонавіч, нарадзіўся ў 1910; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, загінуў 21.10. 1944 ва Усходняй Прусіі.

ЛЯЎКОВІЧ Іван Фёдаравіч, загінуў 27.3.1945, пахаваны ў Барысаве.

ЛЯЎКОВІЧ Маркіян Дамітрыевіч, нарадзіўся ў 1909; радавы.

НАРЧУК Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1893; радавы, прапаў без вестак у красавіку 1945.

САНОТ Аркадзь Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1906; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, радавы, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

СЕРАДА Фёдар Піліпавіч, нарадзіўся ў 1905; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, загінуў ва Усходняй Прусіі.

ВЕСКА ЗЯБЛІЦА

ІВАНОЎ Астап Антонавіч, нарадзіўся ў 1907; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЛАТУШКІН Васіль Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1918; радавы, стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЛАТУШКІН Герасім Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1914; у Чырвонай Арміі з 1936, старшына, прапаў без вестак 6.7.1942.

ВЕСКА ІЛЬЯНЕ

БАБЧОНАК Дамітрый Максімовіч, нарадзіўся ў 1911; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

БАРКОЎ Міхаіл Севасцьянавіч, нарадзіўся ў 1918; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

П. Л. Лысянкоў.

М. І. Нарчук.

Дз. М. Бабчонак.

Ф. І. Сойка.

ВАСКОЎСКІ Сямён Паўлавіч, нарадзіўся ў 1911; радавы, прапаў без вестак у снежні 1944.

КАМЛЮК Сяргей Іванавіч, нарадзіўся ў 1909; радавы 1374-га стралковага Чырванасцяжнага палка, загінуў 11.3.1945, пахаваны калля г. Кюстрын.

КЛЯШЧОНАК Ягор Васілевіч, нарадзіўся ў 1915 у Крупскім р-не, да вайны жыў у в. Ільяне; радавы 46-га стралковага палка, загінуў 22.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

КОЗІК Максім Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1913; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

КОЗІК Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў 1914; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

КУДЗІН Міхаіл Іванавіч, радавы, загінуў 17.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

КУЛІК Максім Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1904; радавы, прапаў без вестак у лістападае 1944.

КУЛІК Міхаіл Дамітрыевіч, нарадзіўся ў 1918; загінуў 20.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў г. Алітус.

КУЛІК Парфен Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1909; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

МАШКОВІЧ Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1909; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1943.

МІКУЛЬЧЫК Аляксей Іванавіч, загінуў 23.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

МІКУЛЬЧЫК Дзмітрый Пятровіч, нарадзіўся ў 1914; радавы, загінуў у 1944.

МІКУЛЬЧЫК Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1913; у Чырвонай Арміі з 1942, прапаў без вестак у жніўні 1944.

СОЙКА Фядос Іванавіч, радавы, быў цяжка паранены пры вызваленні Літоўскай ССР, памёр 1.8.1944, пахаваны ў Алітускім р-не.

СУРДА Васіль Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1917; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, радавы, прапаў без вестак у снежні 1944.

ЧЫРЫК Кузьма Васілевіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВЕСКА КАМЕНКА

ВЯРХОЎСКІ Леанід Пятровіч, радавы, загінуў 21.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

ВЯРХОЎСКІ Павел Рыгоравіч, радавы, загінуў 27.7.1944.

ВЯРХОЎСКІ Пётр Гаўрылавіч, у Чырвонай Арміі з 1940. гв. радавы, загінуў 28.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

ГАЛУБКОЎ Канстанцін Парфенавіч, нарадзіўся ў 1898; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ГАЛУБКОЎ Мікалай Герасімавіч, радавы, загінуў 25.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

ГАЛУБКОЎ Рыгор Герасімавіч, нарадзіўся ў 1918; радавы, загінуў 27.3.1944 пры вызваленні Адаскай вобл., пахаваны ў в. Андрэеўшчына Адаскай вобл.

ГУБАРОВІЧ Павел Станіслававіч, нарадзіўся ў 1904; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ЖОЛУДЗЬ Канстанцін Макаравіч, радавы, прапаў без вестак каля в. Краснае Смаленскай вобл.

МІХАЙЛАЎ Іван Максімавіч, радавы, сапёр, загінуў 4.2.1945 ва Усходняй Прусіі.

МАРКІЯНОВІЧ Мікалай Аляксеевіч, у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1941.

ПАЛОЦІН Іван, нарадзіўся ў 1912; у Чырвонай Арміі з 1941.

РАБАЎ Фёдар Рамапавіч, нарадзіўся ў 1909; прапаў без вестак у верасні 1944.

ШАЛАПУХА Ягор Ісакавіч, сяржант, камандзір стралковага аддзялення, загінуў 30.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ШКІПІДЗЕРАЎ Якаў Іванавіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ЯНКОЎСКІ Аркадзь Уцінавіч, нарадзіўся ў 1909; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВЕСКА КАМЯНІЦА

БЯРОЗКА Дзмітрый Мікітавіч, нарадзіўся ў 1922; у Чырвонай Арміі з 1943, загінуў 11.6.1944

Ф. Р. Рабаў.

А. К. Машковіч.

І. В. Машковіч.

А. А. Шчэрба.

М. Г. Кузьміцкі.

П. Я. Лукашэвіч.

пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

БЯРОЗКА Сяргей Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1923; у Чырвонай Арміі з 1941, ваяваў на Заходнім фронце, загінуў у 1942.

ВАСЬКОЎСКІ Антон Канстанцінавіч, мал. сяржант; загінуў 16.1.1945 пры вызваленні Польшчы.

КУЗНЯЦОЎ Яўген Васілевіч, нарадзіўся ў 1914 у в. Красілава Талачынскага р-на, да вайны жыў у в. Камяніца; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, прапаў без вестак у 1941.

ПАСЮЦІН Іван Іосіфавіч, радавы, загінуў 21.4.1945 пры вызваленні Чэхаславакіі, пахаваны ў в. Хабічаў.

ПЯТРОЎ Савелій Афіцагенавіч, нарадзіўся ў 1920; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1941.

ШУЛЬГЕВІЧ Максім Данілавіч, нарадзіўся ў 1906; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1941.

ВЕСКА КУРЧЫ

БЫКАЎ Аляксандр Васілевіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Шкорнеўка Смародзінскага сельсавета, да вайны жыў у в. Курчы; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, радавы, стралок, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

БЫКАЎ Фёдар Якаўлевіч, радавы, загінуў пры вызваленні г. Рэчыца Гомельскай вобл., там і пахаваны.

ЗЯЦЕЎ Васіль Савельевіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, прапаў без вестак у студзені 1945.

МАШКОВІЧ Амос Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1908; радавы, памёр ад ран ў жніўні 1944 пры вызваленні Вільнюса, там і пахаваны.

МАШКОВІЧ Анатоль Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1915; сяржант, загінуў у 1943 пры вызваленні Смаленска, дзе і пахаваны.

МАШКОВІЧ Антон Сямёнавіч, да вайны працаваў у Маскве; у Чырвонай Арміі з 1941, пахаваны ў в. Мамантаўка Маскоўскай вобл.

МАШКОВІЧ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1890; у Чырвонай Арміі з 1914, прапаў без вестак.

МАРАЗЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч, радавы, загінуў 4.9.1944 пры вызваленні Польшчы, пахаваны каля в. Кулешка Беластоцкага ваяводства.

МІКУЛЬЧЫК Ігнат Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1911; старшына, загінуў 9.11.1943, пахаваны ў Калінінскай вобл.

ПАРАХНЕВІЧ Вячаслаў Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1916; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, радавы, прапаў без вестак у ліпені 1944.

СУРДА Васіль, у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944.

ТКАЧОЎ Васіль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1910; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ТКАЧОЎ Якаў Пятровіч, нарадзіўся ў 1895; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, загінуў 21.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ШЧЭРБА Адам Адамавіч, нарадзіўся ў 1919; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВЕСКА ЛАМІНІЧЫНА

ГРАМЫКА Іосіф Іванавіч, нарадзіўся ў 1911; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

КУЗЬМІЦКІ Мікалай Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1920; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, лейтэнант, загінуў 14.10.1944 пры вызваленні Польшчы.

ЛУКАШЭВІЧ Пётр Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1913; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, быў цяжка паранены пры вызваленні Польшчы, памёр у 1945 у г. Уфа.

МАЦЫЛЬ Уладзімір Васілевіч, нарадзіўся ў 1923 у в. Гастынічы, да вайны жыў у в. Ламініцкіна; гв. радавы, загінуў 17.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў в. Папагадзе Алітускага р-на.

ПАСЮЦІН Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1911; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, ваяваў на 4-м Беларускім фронце, загінуў у 1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

ПАСЮЦІН Іван Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1921; у Чырвонай Арміі з 1940, сяржант, камандзір аддзялення, прапаў без вестак 22.12.1941.

ПАСЮЦІН Ігнат Іванавіч, радавы, тэлеграфіст, загінуў 6.8.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны каля г. Калварыя Капсускага р-на.

ПАСЮЦІН Ігнат Іванавіч, нарадзіўся ў 1908; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, загінуў у 1945 ва Усходняй Прусіі.

ПАСЮЦІН Міхаіл Максімавіч, нарадзіўся ў 1911; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак.

ПАСЮЦІН Міхаіл Максімавіч, нарадзіўся ў 1918; лейтэнант, лётчык-выпрабавальнік, загінуў у 1942.

ПАСЮЦІН Рыгор Пятровіч, нарадзіўся ў 1914; у Чырвонай Арміі з 1941.

ПАСЮЦІН Уладзімір Пятровіч, нарадзіўся ў 1922; радавы, прапаў без вестак у снежні 1944.

ПАСЮЦІН Фёдар Піліпавіч, нарадзіўся ў 1905; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1941.

ПАСЮЦІН Фёдар Пятровіч, нарадзіўся ў 1917; старшына, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ПАСЮЦІН Якаў Пятровіч, нарадзіўся ў 1910; у Чырвонай Арміі з 1941, ваяваў на Заходнім фронце.

ПАСЮЦІН Яфім Іванавіч, нарадзіўся ў 1900; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, загінуў 17.7.1944

Я. П. Пасюцін.

Я. І. Пасюцін.

І. С. Пляскач.

І. М. Мацюшэўскі.

пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў в. Папагадзе Алітускага р-на.

ПЛЯСКАЧ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1896; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЧАКУЛАЙ Марк Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1911; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ШАРКЕВІЧ Васіль Паўлавіч, нарадзіўся ў 1911; член КПСС, прапаў без вестак 13.12.1944.

ЯРОМЕНКА Рыгор Кірылавіч, нарадзіўся ў 1914; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, кадравы афіцэр, ваяваў на Заходнім фронце, прапаў без вестак у 1941.

ВЁСКА МАЙДАН

ГАЛЕЦКІ Анатоль Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1917; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак у 1942.

ГАЛЕЦКІ Станіслаў Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1920; у Чырвонай Арміі з 1940, прапаў без вестак у верасні 1944.

МАЦЮШЭЎСКІ Іван Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1921; у Чырвонай Арміі з 1938, ваяваў на Заходнім фронце, прапаў без вестак у верасні 1944.

ВЁСКА МАЛЯЎКА

БУРАКОЎ Марк Філімонавіч, гв. радавы, загінуў 16.10.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

ДРАЗДОЎСКІ Фёдар Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1905; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ДРАЧУК Фёдар Несцеравіч, нарадзіўся ў 1911 у Адэскай вобл., да вайны жыў у в. Маляўка; у Чырвонай Арміі з 1940, радавы, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ЕРМАКОЎ Уладзімір Андрэевіч, нарадзіўся ў 1918, кадравы афіцэр.

ЕРМАКОЎ Яфім Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1918; радавы, памёр ад ран 22.1.1942.

КОПІКАЎ Яфім Яфрэмавіч, радавы, загінуў 4.11.1944 ва Усходняй Прусіі.

КУДЗІНАЎ Міхаіл Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1919; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 25.12.1942.

ЛЕПА Карл Мартынавіч, радавы, цяжка паранены пры вызваленні Літоўскай ССР, памёр ад ран 20.6.1944.

ПАЛУБІНСКІ Васіль Фёдаравіч, афіцэр.

ФЕДАРЦОЎ Аляксандр Пракопавіч, нарадзіўся ў 1921; радавы, прапаў без вестак у верасні 1942.

ФЕДАРЦОЎ Аляксей Пракопавіч, нарадзіўся ў 1924; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ФЕДАРЦОЎ Андрэй Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1906; у Чырвонай Арміі з 1941.

ФЁДАРЦОЎ Фёдар Навумавіч, нарадзіўся ў 1909; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЧЫРЫКАЎ Пётр Карпавіч, нарадзіўся ў 1921; у Чырвонай Арміі з 1944, радавы, загінуў 23.1.1945.

ЯРМОЛЕНКА Пётр Іванавіч, нарадзіўся ў 1898; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, радавы, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ВЁСКА НАРЦЫЗАВА

АГЕЕНКА Іван Ніканавіч, нарадзіўся ў 1908; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1941.

БЛАГУШ Пётр Паўлавіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Старая Будаўка, да вайны жыў у в. Нарцызава; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1944.

МУЛЕЎ Ягор Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1919; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак у чэрвені 1941.

ПАЛІТЫКА Герасім Васілевіч, нарадзіўся ў 1907; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ПАЛІТЫКА Сцяпан Васілевіч, нарадзіўся ў 1909; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, загінуў 2.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ПАСЮЦІН Анатоль Пятровіч, нарадзіўся ў 1923; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, гв. радавы, загінуў 29.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

ПАСЮЦІН Пётр Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1897; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, загінуў 9.12.1944 пры вызваленні Латвійскай ССР.

Ф. Н. Драчук.

В. Ф. Палубінскі.

У. А. Пасюцін.

І. М. Ніковіч.

І. І. Пагарэльскі.

Т. Р. Сакалоўскі.

ПАСЮЦІН Сцяпан Даям'янавіч, радавы, загінуў 29.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

ПАСЮЦІН Сямён Дзянісавіч, нарадзіўся ў 1914; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, прапаў без вестак.

ПАСЮЦІН Уладзімір Антонавіч, нарадзіўся ў 1920, у 1939 паступіў у авіяцыйнае вучылішча; у Чырвонай Арміі з 1943, гв. мал. лейтэнант 115-та гв. знішчальнага авіяцыйнага Аршанскага палка, удзельнік вызвалення Талачынскага р-на ад нямецка-фаш. захопнікаў, загінуў 2.8.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

З успамінаў удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Я. А. Пасюціна, брата У. А. Пасюціна

З ранняга дзяцінства Валодзя марыў стаць лётчыкам-знішчальнікам і рыхтаваўся да ажыццяўлення сваёй мары: старанна вучыўся, загартоўваўся фізічна. У 1937 г. Уладзімір паступіў вучыцца ў школу ФЗН пры Аршанскім мясакамбінаце. Праз год ён стаў кваліфікаваным рабочым і без адрыву ад вытворчасці займаўся ў Аршанскім аэраклубе. Хутка рос яго асабісты рахунак вучэбных палётаў, скачкоў з парашутнай вышкі. Маці чамусьці баялася будучай прафесіі сына, лічыла, што быць лётчыкам вельмі небяспечна і, натуральна, не дазваляла яму вучыцца на лётчыка. Але братавы пісьмы маці чытаў я і, аразумела, даваў на іх адказы, таму да маці не даходзіла тое, што пужала яе. У 1939 г. Уладзімір скончыў групу пілотаў пры аэраклубе і быў накіраваны на вучобу ў авіяцыйнае вучылішча. Пачаліся гады вучобы, трэніровак. Аб гэтым сцісла пісаў у рэдкіх лістах дадому. Апошняе пісьмо брата мы атрымалі за некалькі дзён да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

На другі дзень вайны я быў залічаны ў камсамольска-маладзёжны атрад па барацьбе з фашысцкімі дэсантнікамі. 8 ліпеня 1941 г. фашысцкія самалёты бамбілі нашу вёску і прамым трапленнем бомбы знішчылі ўсё наша жыллё. Пачаліся цяжкія гады акупацыі. Ніякай сувязі з Уладзімірам у гэты час не было. Пазней мы даведаліся, што брат свой баявы шлях пачынаў ад сцен Сталінграда. Іх лётная часць пад Сталінградам трапляла нават у акружэнне. Ён ваяваў у 115-м авіяцыйным знішчальным гвардзейскім палку 7-й гвардзейскай авіяцыйнай знішчальнай дывізіі 2-й гвардзейскай авіянанішчальнай арміі. Іх полк пазней атрымаў найменне «Аршанскі». Уладзімір многа разоў прыкрываў бамбардзіроўшчыкі, якія ляталі бамбіць глыбокія тылы праціўніка, пралятаючы часам праз родныя мясціны ўначы; меў шмат баявых вылетаў, правёў нямала паветраных баёў. 26 чэрвеня 1944 г. ў час вызвалення Талачыншчыны Уладзімір удзельнічаў у цяжкіх паветраных баях, якія вяліся ў раёне в. Славені. У гэты дзень з яго эскадрыллі над вёскай загінулі Герой Савецкага Саюза І. Т. Арцём'еў і малодшы лейтэнант Пятроў. Брат на другі дзень, 27 чэрвеня 1944 г., прыехаў на месца гібелі баявых сяброў, знайшоў людзей, якія захавалі дакументы загінуўшых лётчыкаў і адаслаў іх сваякам. У гэты дзень Уладзімір апошні раз наведаў маці і паабяцаў прыехаць зноў праз 10 дзён (іх полк у гэты час дыслацыраваўся каля Крупак, што за 30 кіламетраў ад Славеняў). Але праз 10 дзён ён ваяваў ужо ў небе Літвы і ў адным з баёў загінуў. У пахавальнай было сказана, што Пасюцін Уладзімір Антонавіч загінуў смерцю храбрых у час паветранага бою ў раёне в. Вербалішкі Літоўскай ССР. Аднак толькі праз 33 гады пасля доўгіх пошукаў стала вядома пра гэты яго апошні бой. А было гэта так. Нашы самалёты атрымалі заданне скоўваць дзеянні фашысцкай авіяцыі, каб дапамагчы наземным войскам весці наступленне. Чатыры савецкія знішчальнікі ішлі насустрач чатыром фашысцкім. Брат у чацвёрцы быў крайнім. На момант сонца асляпіла вочы Уладзіміру, а лёс вырашалі хвіліны. Траса снарадаў, выпушчаных фашысцкім сцярвятнікам, прашыла самалёт брата. Знішчальнік пачаў падаць і адыходзіць у бок нямецкага аэрадрома Эдкувен. Тут ён і ўпаў. Вось чаму доўгі час пасля гэтага нельга было знайсці астанкаў лётчыка і рашткаў самалёта. Так загінуў мой брат Уладзімір. Цяпер яго імя занесена ў кнігу вызваліцеляў Вілкавішкскага р-на Літоўскай ССР, яго прозвішча выбіта на адным з абеліскаў на вайсковых могілках у г. Кібартай Літоўскай ССР. За апошні бой У. А. Пасюцін быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Мне так і не ўдалося даведацца, якія яшчэ ўзнагароды былі ў брата, колькі зрабіў баявых вылетаў, правёў паветраных баёў, збіў фашысцкіх самалётаў.

ЯСТРАБАЎ Іван Піліпавіч, нарадзіўся ў 1911; у Чырвонай Арміі з красавіка 1941, радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ВЕСКА НОВАЯ ЯБЛЫНЬКА

ГАДАВІКОЎ Аляксандр Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1914; радавы, прапаў без вестак 14.1.1944.

ГАЙСЁНАК Фама Харытонавіч, нарадзіўся ў 1912; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, радавы, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

ЛІКОВІЧ Іван Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1915; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ПАЖАРЫЦКІ Якаў Сямёнавіч, радавы, загінуў 21.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ПАЛІТЫКА Герасім Васілевіч, нарадзіўся ў 1907; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

СЯРГЕЕЎ Барыс Васілевіч, радавы, быў цяжка

В. Ф. Шпанюк.

У. І. Асіноўскі.

А. А. Варановіч.

Н. С. Дамарацкі.

паранены пры вызваленні Літоўскай ССР, памёр ад ран 23.8.1944, пахаваны ў Каўнасе.

ШКУРАЦЕНКА Іосіф Антонавіч, нарадзіўся ў 1903 у Гродзенскай вобл., да вайны жыў у в. Новая Яблынька, член КПСС з 1939, быў на савецкай і партыйнай рабоце; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, капітан.

ВЁСКА СЛАВЕШ

БАРАВІК Ягор Яфімавіч, нарадзіўся ў 1908; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

БАЛАЎСКІ Антон Дзяменцьевіч, гв. мал. сяржант, камандзір аддзялення, загінуў 23.8.1942.

ГАЙДУКОЎ Павел Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1907; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ГАРНІСТАЎ Іван Трафімавіч, радавы, загінуў 27.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

ДЗЯДЗЕНКА Мікіта Данілавіч, нарадзіўся ў 1923; радавы, загінуў 7.8.1944.

ЖДАНОВІЧ Станіслаў Вікенцьевіч, радавы, загінуў у лютым 1945 пад Берлінам.

ЖУЛЕВІЧ Клім Ерафеевіч, нарадзіўся ў 1919; у Чырвонай Арміі з 1939, сяржант, камандзір аддзялення, прапаў без вестак у 1944.

ІВАНОЎ Аляксей Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1910; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, ваяваў на 3-м Беларускім фронце, загінуў 19.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

КАРАЛЁЎ Аляксей Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1905; ст. сяржант, камандзір аддзялення, загінуў 15.4.1943, пахаваны ў в. Касьянава Арлоўскай вобл.

КОЗІК Пётр Васілевіч, радавы, загінуў 22 чэрвеня 1941.

КУЗНЯЦОЎ Яўген Харытонавіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ЛАЎРЫНОВІЧ Фёдар Васілевіч, нарадзіўся ў 1904; радавы, загінуў 10.4.1942.

МАСЛАЎ Фёдар Васілевіч, нарадзіўся ў 1906; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у жніўні 1944.

ПАГАРЭЛЬСКІ Іосіф Іванавіч, нарадзіўся ў 1905; радавы, прапаў без вестак у лютым 1945.

ПАСЮЦІН Іван Васілевіч, гв. радавы 243-га стралковага палка, прапаў без вестак 22.10.1944.

ПАСЮЦІН Фёдар Піліпавіч, нарадзіўся ў 1906; радавы, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ПАСЮЦІН Якаў Пятровіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

САКАЛОЎСКІ Тамаш Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1917; ваяваў у складзе Войска Польскага, падпаручнік, загінуў 11.9.1944.

САС Сцяпан Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1901; быў дважды паранены, памёр ад ран 5.9.1942, пахаваны ў Равані.

СТАДНІК Васіль Антонавіч, нарадзіўся ў 1912; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

СТАДНІК Васіль Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1912; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

СЯМЁНАЎ Цімафей Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1921; сяржант, загінуў каля г. Феадосія.

ЧЭКУЛАЙ Марк Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1911; сяржант, прапаў без вестак у верасні 1944.

ШПАНЮК Васіль Фаміч, нарадзіўся ў 1902; у Чырвонай Арміі з ліпеня 1941, радавы, прапаў без вестак у снежні 1944.

ЯШКІН Сцяпан Анікеевіч, радавы, загінуў 23.7. 1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

ВЁСКА СЛАЎНАЕ

АНДРЭЕЎ Пётр Анціпавіч, нарадзіўся ў 1909; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, раданы, прапаў без вестак у верасні 1944.

АНДРЭЕЎ Цімафей Антонавіч, нарадзіўся ў 1901; радавы, прапаў без вестак у снежні 1941.

АРЦЮШЭЎСКІ Іван Віктаравіч, нарадзіўся ў 1921; у Чырвонай Арміі з сакавіка 1941, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

АСІНОЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, лейтэнант, загінуў 7.12.1942.

БАБРОВІЧ Эдуард Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1917 у Краматорску, да вайны жыў у в. Слаўнае; ст. сяржант, паветраны стралок-радыст, загінуў 9.8. 1943 каля в. Крукава Курскай вобл.

БАРАДА Абрам Пейсахавіч, мал. сяржант, загінуў 4.4.1943, пахаваны ў г. Колпіна.

БАТУК Антон Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1917; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

БЕЛЯКОЎ Андрэй Палікарпавіч, нарадзіўся ў 1905; ст. лейтэнант, загінуў у 1943 у г. Волхаў Ленінградскай вобл.

БУКЛАНАЎ Уладзімір Фёдаравіч, загінуў 14.9. 1944.

ВАЛЬКЕВІЧ Уладзімір Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1919 у Бягомльскім р-не, да вайны жыў у в. Слаўнае; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў 2.9.1941.

ВАРАНОВІЧ Андрэй Адамавіч, нарадзіўся ў 1897; радавы, загінуў 27.9.1944 пры вызваленні Польшчы каля г. Сувалкі.

ВІННІКАЎ Цімафей Карпавіч, нарадзіўся ў 1908; загінуў у 1945 пад Берлінам.

ВЫГОЎСКІ Васіль Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1906 у в. Вугляны, да вайны жыў у в. Слаўнае; прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ГАРНАСТАЕЎ Лука Сільвестравіч, нарадзіўся ў 1915; раданы, памёр ад ран 2.1.1943.

ДАМАРАЦКІ Нічыпар Севасцьянавіч, нарадзіўся

І. Я. Заржэўскі.

В. П. Зуброў.

М. І. Шчарбакоў.

П. В. Васілеўскі.

ў 1921; памёр ад ран 15.12.1943, пахаваны ў пас. Канеўскі Запарожскай вобл.

ЖОЛУДЗЬ Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1927; загінуў 24.4.1945 пры вызваленні Германіі.

ЗАРЖЭЎСКІ Іван Яфімавіч, нарадзіўся ў 1908; знаходзіўся ў партызанах, у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, загінуў 15.2.1945, пахаваны ў пас. Тургенева Палескага р-на Калінінградскай вобл.

ЗУБРОЎ Васіль Пятровіч, нарадзіўся ў 1904; радавы, загінуў 15.8.1944 пры вызваленні Польшчы каля г. Сувалкі.

ЗУЕЎ Акім Іванавіч, нарадзіўся ў 1919; сяржант, прапаў без вестак 1.9.1944.

ЗУЕЎ Іосіф Рыгоравіч, радавы, загінуў у 1944 ва Усходняй Прусіі.

ІВАНОЎ Мікалай Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Маляўка, да вайны жыў у в. Слаўнае; ст. тэхнік-лейтэнант, загінуў у жніўні 1944.

КАВАЛЕЎСКІ Аляксей Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1917; старшына, загінуў 20.3.1945 пры вызваленні Венгрыі.

КАЖАМЯКА Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1915; удзельнік абароны Ленінграда, загінуў 27.8.1944 пад Варшавай.

КАНДРАЦЬЕЎ Міхаіл Фёдаравіч, радавы, загінуў 20.10.1944 ва Усходняй Прусіі, пахаваны ў Гусеўскім р-не Калінінградскай вобл.

КЛЯШЧОНАК Аляксей Васілевіч, нарадзіўся ў 1917 у в. Шынкі Крупскага р-на, да вайны жыў у в. Слаўнае; радавы, загінуў 1.2.1944 пры абароне Ленінграда, пахаваны на Піскароўскіх могілках.

КОЗІК Антон Іванавіч, нарадзіўся ў 1912 у в. Загор'е, да вайны жыў у в. Слаўнае; загінуў у 1945.

КОПІКАЎ Яфім Яфрэмавіч, радавы, загінуў 4.11.1944 ва Усходняй Прусіі.

ЛАПО Яўген Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1922; гв. малодшы лейтэнант, камандзір узвода, загінуў 12.10.1944 пры вызваленні Варшавы, пахаваны каля ст. Дамкавіяна Варшаўскага ваяводства.

ЛАТУШКІН Іван Яфімавіч, нарадзіўся ў 1911 у в. Галіннікі, да вайны жыў у в. Слаўнае; у Чырвонай Арміі з 1944, загінуў 4.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

МАРОЗАЎ Пётр Дарафеевіч, нарадзіўся ў 1914; радавы, прапаў без вестак у лістападзе 1941.

МІКУЛЬЧЫК Пётр Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1919; гв. старшына, загінуў 28.1.1944 пры вызваленні Крыма каля в. Ската Керчанскага р-на.

ОСІПАЎ Антон Уласавіч, радавы, быў цяжка паранены пры вызваленні Польшчы, памёр ад ран 30.10.1944, пахаваны ў в. Паддубаўск каля г. Сувалкі.

ПАСЮЦІН Васіль Максімавіч, нарадзіўся ў 1912; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ПРУДНІКАЎ Віктар Карпавіч, нарадзіўся ў 1920; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

РАЗУМАЎ Антон Андрэевіч, нарадзіўся ў 1911 у Крупскім р-не, да вайны жыў у в. Слаўнае; прапаў без вестак у лістападзе 1944.

СЕВАСЦЬЯНАЎ Валянцін Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1920; у Чырвонай Арміі з 1940, сяржант, камандзір аддзялення, прапаў без вестак у ліпені 1941.

СЯРГЕЕЎ Нічыпар Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1895; радавы, загінуў 15.8.1944 пры вызваленні Польшчы каля г. Сувалкі.

ТАМКОВІЧ Уладзімір Фабіянавіч, нарадзіўся ў 1912; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ТРУБА Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1901; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак.

ФЕДАРЦОЎ Лаўрэнцій Сцяпанавіч, радавы, загінуў 21.1.1945 пры вызваленні Польшчы каля г. Сувалкі.

ЦЫБУЛЬКІН Васіль Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1920; курсант Тамбоўскага ваеннага вучылішча, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ЦЫШІН Яфім Давыдавіч, мал. сяржант, загінуў 29.2.1944 пры вызваленні Ленінградскай вобл., пахаваны каля г. Сланцы.

ШАВЯЛЕЎ Іван Пятровіч, нарадзіўся ў 1915 у в. Трасцянка, да вайны жыў у в. Слаўнае; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, загінуў у 1945.

ШАСТАКОЎ Фёдар, радавы, загінуў 20.8.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

ШКАРУБА Барыс Данілавіч, нарадзіўся ў 1911; сяржант, памёр 8.7.1943 у г. Аткарску Саратаўскай вобл.

ЯРАЎ Пётр Ігнатавіч, гв. радавы 14-га асобнага танкавага палка; загінуў 22.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ВЁСКА СЫРЫЦЫ

ПРЫСТАЎКА Канстанцін Іванавіч, у Чырвонай Арміі з 1944, гв. радавы, прапаў без вестак 16.8.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

ШЧАРБАКОЎ Міхаіл Ісакавіч, нарадзіўся ў 1907; у Чырвонай Арміі з 1944, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШЧЭРБА Браніслаў Францавіч, нарадзіўся ў 1911; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВЁСКА ТРАСЦЯНКА

БЕЛЯКОЎ Мікалай Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1920; у Чырвонай Арміі з 1939, прапаў без вестак.

БЕЛЯКОЎ Парфен Лаўрэнцьевіч.

ВАСІЛЕЎСКІ Павел Васілевіч, нарадзіўся ў 1922; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВАРАШКОЎ Аляксей Захаравіч, нарадзіўся ў

А. З. Варашкоў.

А. А. Галаўкоў.

Дз. Ф. Зуеў.

П. Ф. Зуеў.

1915; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ГАЛАЎКОЎ Адам Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1906; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1942 у в. Белая Бяроза Смаленскай вобл.

ЗУЕЎ Дзмітрый Фядосавіч, нарадзіўся ў 1904; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, радавы, прапаў без вестак у красавіку 1945.

ЗУЕЎ Пракоп Фядосавіч, нарадзіўся ў 1897; у Чырвонай Арміі з 1944, загінуў 12.2.1945 ва Усходняй Прусіі.

ЗУЕЎ Сямён Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ЗУЕЎ Уладзімір Васілевіч, нарадзіўся ў 1918; прапаў без вестак 7.7.1943.

ІГНАЦЬЕЎ Фёдар Сідаравіч, нарадзіўся ў 1913; у Чырвонай Арміі з 1940, загінуў у 1943.

ІГНАЦЬЕЎ Ягор Антонавіч, радавы 46-га гв. стралковага палка, прапаў без вестак 19.7.1944.

КАВАЛЁЎ Еўдакім Восіпавіч, нарадзіўся ў 1909; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

КЛЯШЧОНАК Павел Лявонцьевіч, яфрэйтар, загінуў 3.2.1945 пры вызваленні Польшчы.

ЛАТЫГОПАЎ Якаў Іванавіч, нарадзіўся ў 1911; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак у ліпені 1944.

МАЗУРЭНКА Уладзімір Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1912 у в. Ласка Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл., да вайны жыў у в. Трасцянка; загінуў 21.12. 1942, пахаваны ў в. Булаўка Варонежскай вобл.

МАКАРЭВІЧ Аляксандр Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1923; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ПАЖАРЫЦКІ Мікалай Пятровіч, нарадзіўся ў 1921; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ПЯТРУШЫН Мікіта Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1913; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ФЕДАРЦОЎ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1895; гв. радавы, загінуў 31.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

ФЕДАРЦОЎ Сямён Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1898; гв. радавы загінуў 28.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

ФЕДАРЦОЎ Тарас Герасімавіч, нарадзіўся ў 1911; мал. лейтэнант, загінуў у 1941.

ФЕДАРЦОЎ Фёдар Герасімавіч, нарадзіўся ў 1902; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ФЕДАСЕЕЎ Лявон Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1899; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ФРАНЦКЕВІЧ Эдуард Браніслававіч, нарадзіўся ў 1926; у Чырвонай Арміі з 1944, прапаў без вестак у верасні 1944.

ШАВЛЛЁЎ Іван Пятровіч, нарадзіўся ў 1915; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, радавы, памёр у палоне 15.10.1941.

ШАМАШОЎ Васіль Лявонцьевіч, нарадзіўся ў 1922; у Чырвонай Арміі з 1944, загінуў у 1945 пры штурме г. Кёнігсберг.

ШАМАШОЎ Мікалай Іванавіч, радавы, загінуў 9.8.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Капсукскім р-не.

ШАМАШОЎ Павел Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1910; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у снежні 1943.

ШАМАШОЎ Рыгор Лявонавіч, нарадзіўся ў 1920; у Чырвонай Арміі з 1939, ст. лейтэнант, прапаў без вестак.

ШАМАШОЎ Трафім Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1906; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы 664-га стралковага палка 130-й стралковай дывізіі, загінуў 12.1. 1944 пры вызваленні Запарожжа.

ШАМАШОЎ Ягор Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1913; радавы, прапаў без вестак у лютым 1945.

ШАЎЧЭНКА Лук'ян Аляксандравіч, радавы, тэлефаніст, загінуў 16.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

ВЁСКА ХІМЕЦ

БУЛАЎКІН Іван Сафронавіч, радавы, загінуў 30.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

КОЗІК Міхаіл Андрэевіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, загінуў у ліпені 1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

КОЗІК Пётр Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1906; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

МАТОРНЫ Іван Мітрафанавіч, ураджэнец Круглянскага р-на; радавы, загінуў 29.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

НЯХАЕЎ Пётр Паўлавіч, нарадзіўся ў 1911; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у ліпені 1944.

НЯХАЕЎ Яфім Самуілавіч, нарадзіўся ў 1900; радавы, загінуў у палоне 15.9.1944.

ПАСЮЦІН Сямён Дзянісавіч, нарадзіўся ў 1914; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ФЕДАРЦОЎ Апанас Пракопавіч, нарадзіўся ў 1915; радавы, загінуў 10.11.1944 пры вызваленні Польшчы каля г. Сувалкі.

ЧЫРЫКАЎ Іван Пракопавіч, нарадзіўся ў 1915; радавы, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ШАВЯЛЁЎ Ігнат Кірылавіч, нарадзіўся ў 1907; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1944, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ШАВЯЛЁЎ Мікалай Кірылавіч, нарадзіўся ў 1916; радавы, загінуў 22.10.1944.

ВЁСКА ЯБЛЫНЬКА

АСТРОЎСКІ Аляксей Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1916 у Смаленскай вобл., да вайны жыў у в. Яб-

У. В. Зуеў.

Я. І. Латыгонаў.

М. Дз. Пятрушын.

С. С. Федарцоў.

Т. Г. Федарцоў.

Ф. Г. Федарцоў.

М. І. Шамашоў.

П. Ф. Шамашоў.

Л. А. Шаўчэнка.

М. А. Козік.

П. К. Козік.

І. К. Шавялёў.

М. В. Васілеўскі.

С. В. Ждановіч.

М. І. Пажарыцкі.

У. Я. Пляскач.

А. Л. Бельскі.

В. Т. Бычкоў.

С. В. Бяззубік.

А. М. Ганевіч.

В. І. Дуняк.

Р. І. Жванскі.

М. І. Закрэўскі.

М. Г. Іганаў.

лынька; радавы, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ВАСІЛЕЎСКІ Еўдакім Васілевіч, у Чырвонай Арміі з 1939, прапаў без вестак.

ВАСІЛЕЎСКІ Мікалай Васілевіч, нарадзіўся ў 1922; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВАСІЛЕЎСКІ Павел Васілевіч, нарадзіўся ў 1922; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЖДАНОВІЧ Станіслаў Вікенцьевіч, нарадзіўся ў 1915; радавы, прапаў без вестак.

ЗУЕЎ Елісей Васілевіч, у Чырвонай Арміі з 1941 гв. радавы, быў цяжка паранены пры вызваленні Літоўскай ССР, памёр ад ран 17.10.1944, пахаваны ў Кансукскім р-не.

ІЗОТАЎ Лазар Андрэевіч, нарадзіўся ў 1908; радавы, памёр у палоне 19.4.1942.

КАРАНЬКОЎ Уладзімір Андрэевіч, радавы, загінуў 22.12.1943 пры вызваленні Запарожжа.

КАТОВІЧ Георгій Парфёнавіч, радавы, загінуў 24.1.1945 ва Усходняй Прусіі, пахаваны ў Чарняхоўскім р-не Калінінградскай вобл.

ПАЖАРЫЦКІ Міхаіл Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1909; радавы, стралок, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ПЛЯСКАЧ Васіль Рыгоравіч, радавы, быў цяжка паранены пры вызваленні Жытомірскай вобл., памёр ад ран 10.4.1944, пахаваны ў г. Оўруч.

ПЛЯСКАЧ Павел Рыгоравіч, у Чырвонай Арміі з 1941, лётчык, загінуў у 1941.

ПЛЯСКАЧ Уладзімір Ягоравіч, нарадзіўся ў 1906; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

РАДЗЕЦКІ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1921; радавы, прапаў без вестак у снежні 1944.

РАДЗІВІЛАЎ Васіль Захаравіч, нарадзіўся ў 1907; радавы, загінуў 1.5.1944 пры вызваленні Полацка.

ГОРАД ТАЛАЧЫН

АКАЛОВІЧ Іван Васілевіч, радавы, загінуў 2.8.1944.

АНОШКА Адольф Станіслававіч, нарадзіўся ў 1917 у Магілёўскай вобл.; радавы, прапаў без вестак у верасні 1941.

АКШЭЎСКІ Браніслаў Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1913; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

АЛЯКСАНДРАЎ Сяргей Аляксандравіч, радавы.

АЛЯКСЕЕЎ Канстанцін Захаравіч, мал. лейтэнант, прапаў без вестак у жніўні 1941.

АНТАШКЕВІЧ Фёдар Герасімавіч, нарадзіўся ў 1917; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

АНТОНАЎ Пётр Дамітрыевіч, нарадзіўся ў 1924; радавы, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

АСІПОЎСКІ Даніла Ермалаевіч, радавы, прапаў без вестак.

АТРОШЧАНКА Аляксандр Мікалаевіч, радавы, прапаў без вестак у Смаленскай вобл.

АЎСЕЕНКА Іван Мартынавіч, нарадзіўся ў 1914; сяржант, загінуў 20.7.1943.

АЎСІЕВІЧ Васіль Платонавіч, радавы, загінуў 18.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

БАБІЦКІ Іван Апалінаравіч, нарадзіўся ў 1915; радавы, загінуў 23.3.1944 пры вызваленні Украінскай ССР, пахаваны ў Цярнопальскай вобл.

БАБУСЕНКА Пётр Андрэевіч, нарадзіўся ў 1913 у г. Варонеж, да вайны жыў у Талачыне; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

БАЛОЦІН Аркадзь Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1904; у Чырвоную Армію прызываўся 8.4.1942 з Чувашскай АССР, загінуў у жніўні 1942 у раёне г. Ціхвін Ленінградскай вобл.

БАЛОЦІН Сямён Аркадзевіч, нарадзіўся ў 1925; у Чырвонай Арміі з 1943, прапаў без вестак.

БАРАВУЛЯ Аляксандр Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1924; у Чырвоную Армію прызваны Ленінградскім РВК, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

БАРАВУЛЯ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1916; скончыў ваеннае вучылішча, афіцэр, загінуў у 1945 у бітве за Берлін.

БАРАДА Зысколь Ідаловіч, нарадзіўся ў 1898; у Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

БАРАДА Мір Іаіайлевіч, радавы, прапаў без вестак каля г. Вязьма.

БАРАДА Рува Чэхіневіч, нарадзіўся ў 1924; радавы, загінуў 27.11.1942 у Калінінскай вобл.

БАРАЗНА Анатоль Ціханавіч, капітан, загінуў у 1945.

БАРАЗНА Валянціи Якаўлевіч, радавы, загінуў 31.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

БАРАЗНА Уладзімір Іванавіч, радавы, загінуў 18.8.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

БАРАЎЦОЎ Фёдар Андрэевіч, нарадзіўся ў 1910, у Чырвонай Арміі з 1941, радавы 574-га стралковага палка 121-й стралковай дывізіі, прапаў без вестак у снежні 1941.

БАРКЕВІЧ Станіслаў Іванавіч, нарадзіўся ў 1923; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

БАРЫСЕНКА Сцяпан Апанасавіч, нарадзіўся ў 1907; прапаў без вестак 22.10.1944.

БОТВІН Апанас Ціханавіч, радавы, загінуў 28.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

БЕЛЬСКІ Аляксандр Лаўрынавіч, нарадзіўся ў 1920; у Чырвонай Арміі з верасня 1939, член ВЛКСМ, радавы, радыёмеханік, прапаў без вестак у маі 1944.

БІРУКОЎ Дзям'ян Піліпавіч, нарадзіўся ў 1896; радавы, прапаў без вестак у красавіку 1945.

БОНДАРАЎ Сямён Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1923; радавы, прапаў без вестак у сакавіку 1944.

БУРАНЮК Мікалай Іванавіч, радавы, загінуў 18.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

БУРГАНАЎ Міхаіл Ларывонавіч, нарадзіўся ў 1899 у Дубровенскім р-не, да вайны жыў у Талачыне; радавы, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

БУРМАК Сцяпан Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1906; радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

БУРЫ Фёдар Іванавіч, радавы, прапаў без вестак у г. Полацк.

БУХАНАЎ Арсенцій Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1914; у Чырвонай Арміі з 1941, ст. сяржант, прапаў без вестак у чэрвені 1941.

БЫЧКОЎ Васіль Іосіфавіч, лейтэнант, загінуў у студзені 1945.

БЫЧКОЎ Васіль Трафімавіч, нарадзіўся ў 1908, удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак 6.10.1944.

БЫЧКОЎ Іван Трафімавіч, нарадзіўся ў 1905; ст. сяржант, загінуў 24.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

БЫЧКОЎ Рыгор Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1925; радавы, сувязіст, загінуў 19.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

БЯЗЗУБІК Іван Яфімавіч, нарадзіўся ў 1924; у Чырвонай Арміі з 1944, радавы, загінуў пры вызваленні Літоўскай ССР у г. Алітус.

БЯЗЗУБІК Сяргей Васілевіч, радавы, загінуў 19.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, перапахаваны ў г. Алітус.

БЯЗЗУБІК Яфім Васілевіч, радавы, загінуў 19.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Міраслаўскім р-не.

ВАЛОДЧАНКА Мітрафан Дамітрыевіч, нарадзіўся ў 1910; мал. сяржант, загінуў 28.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ВАЛЧОК Аляксандр Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1911; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВАЛЧОК Аляксандр Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1921; у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ВАЛЧОК Аркадзь Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1924; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак у 1941.

ВАЛЧОК Іван Іванавіч, загінуў у красавіку 1944.

ВАЛЧОК Іван Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1919; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ВАЛЧОК Мікіта..., у Чырвонай Арміі з 1944, радавы.

ВАЛЧОК Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1915; член КПСС, радавы, загінуў 17.7.1944.

ВАЛЧОК Пётр Максімавіч, нарадзіўся ў 1902; у Чырвонай Арміі з 1944, радавы, загінуў 20.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

ВАЛЧОК Рыгор Пятровіч, нарадзіўся ў 1919; мал. сяржант, загінуў 26.11.1944, пахаваны ў Калінінградскай вобл.

ВАЛЧОК Уладзімір Іванавіч, загінуў 22.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

ВАЛЧОК Фёдар Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1898; радавы, загінуў у 1944 пры вызваленні Літоўскай ССР у г. Алітус.

ВАРАНОВІЧ Міхаіл Канстанцінавіч, палітрук, прапаў без вестак у жніўні 1941.

ВАСІЛЕЎСКІ Аркадзь Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1922.

ВАСІЛЕЎСКІ Уладзімір Гаўрылавіч.

ВАЯВОДАЎ Сяргей Паўлавіч, нарадзіўся ў 1918; лётчык, загінуў у жніўні 1944 ва Усходняй Прусіі.

ВІДАМУК Зіновій Апсёнавіч, радавы, загінуў 19.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

ВІНАГРАДАЎ Якаў Ягоравіч, мал. лейтэнант, член КПСС, парторг батальёна, загінуў 26.8.1944.

ВІСЛАВУХ Баляслаў Антонавіч, радавы, загінуў 22.10.1944 ва Усходняй Прусіі.

ВІСЛАВУХАЎ Уладаіслаў Антонавіч, нарадзіўся ў 1922; у Чырвонай Арміі з 1944, загінуў у 1944 ва Усходняй Прусіі.

ГАВЕНДА Іосіф Іванавіч, прапаў без вестак 6.12. 1941.

ГАЙДУРАЎ Фёдар Яфімавіч, палітрук, загінуў у 1945.

ГАЙНАКАЎ Фанад Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1915 у г. Казань; радавы, прапаў без вестак у снежні 1944.

ГАНЕВІЧ Андрэй Мінавіч, нарадзіўся ў 1919; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у маі 1944.

ГАНСЫЦКІ Пётр Яфімавіч, загінуў 27.2.1944 пры вызваленні Украінскай ССР, пахаваны ў Крыварожскім р-не.

ГАНЧАРОЎ Васіль Андрэевіч, нарадзіўся ў 1921; курсант, загінуў у лістападзе 1941.

ГАРО Прохар Фёдаравіч, ст. лейтэнант 490-га стралковага палка, загінуў у красавіку 1945.

ГАРПЕРЫН Рыгор Ісакавіч, гв. радавы, прапаў без вестак 17.7.1943 у Харкаўскай вобл.

ГЕНЗЕР Давыд Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1926; радавы, прапаў без вестак у сакавіку 1945.

ГІЛЬМАН Аляксандр Майсеевіч, нарадзіўся ў ў 1921; член ВЛКСМ, у Чырвоную Армію прызваны з артылерыйскага вучылішча, лейтэнант, загінуў у 1941.

ГІЛЬМАН Лазар Себелевіч, прапаў без вестак 6.12.1942.

ГЛЯК Адам Барысавіч, нарадзіўся ў 1921; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ГНІДА Пётр Іванавіч, радавы, загінуў 30.7.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Алітускім р-не.

ГОЛУБЕЎ Аляксей Аляксеевіч, мал. лейтэнант, загінуў у красавіку 1945.

ГОЛУБЕЎ Іван Васілевіч, мал. лейтэнант, загінуў 10.3.1945.

ГОЛЬДЗІН Барыс Рыгоравіч, палкоўнік, загінуў у верасні 1944.

ГРАМАКОЎСКІ Вячаслаў Іванавіч, нарадзіўся ў 1914; нам. палітрука роты, загінуў 7.11.1941, пахаваны ў Калінінскай вобл.

ГРЫГАРОВІЧ Міхаіл Барысавіч, нарадзіўся ў 1908; прапаў без вестак у студзені 1944.

ГРЫГАРОВІЧ Сяргей Іканавіч, нарадзіўся ў 1900; член КПСС, да вайны працаваў старшынёй калгаса «Перамога», у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1941 у г. Ярцава Смаленскай вобл., дзе і пахаваны ў брацкай магіле.

А. М. Гільман.

ГУСАКОЎ Фрол Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1905 у Смаленскай вобл.; радавы, загінуў 5.2.1945 пры вызваленні Польшчы.

ДАЛЬНІКОВІЧ Аляксандр Іванавіч, нарадзіўся ў 1919, на фронт прызваны з лётнага вучылішча, лейтэнант.

ДАНАЎ Леў Майсеевіч, нарадзіўся ў 1910; радавы, загінуў 23.2.1943, пахаваны ў Арлоўскай вобл.

ДАШКЕВІЧ Адам Аўрамавіч, загінуў 1.8.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Лаздзійскім р-не.

ДАШКЕВІЧ Іван Аўрамавіч, нарадзіўся ў 1903; у Чырвонай Арміі з 1944, радавы, загінуў у 1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў брацкай магіле ў г. Лаздзіяй.

ДАШКЕВІЧ Мікалай Данілавіч, нарадзіўся ў 1921.

ДЗЕГЦЯРОЎ Яўген Пятровіч, нарадзіўся ў 1926; у Чырвоную Армію прызываўся 22.6.1941 Краснагвардзейскім РВК г. Ленінграда, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ДЗІЧЭНКА Іван Кузьміч, нарадзіўся ў 1920; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ДЗЮЖЫН Пётр Іосіфавіч, прапаў без вестак 30.7.1944.

ДЗЯНІСАЎ Мікалай Мікітавіч, радавы, памёр ад ран 16.10.1944, пахаваны каля г. Вілкавішкіс Літоўскай ССР.

ДЗЯТЛАЎ Мацвей Яфрэмавіч, нарадзіўся ў 1920; сяржант, нам. камандзіра аддзялення, загінуў 29.1.1944, пахаваны ў Ленінградскай вобл.

ДОГІЛЕЎ Канстанцін Лук'янавіч, мал. лейтэнант, памёр ад ран 15.3.1945, пахаваны ў ВНР.

ДРАЗДОЎ Андрэй Аляксандравіч, ст. лейтэнант, загінуў 22.3.1945.

ДРОЗД Ягор Францавіч, гв. радавы, загінуў 16.8. 1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Капсускім р-не.

ДРУЦЬКО Міхаіл Савельевіч, нарадзіўся ў 1925; у Чырвонай Арміі з 1944, радавы, памёр ад ран 3.8.1944, пахаваны ў Алітускім р-не Літоўскай ССР.

ДУДКЕВІЧ Уладзімір Яфімавіч, у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак.

ДУНДАРЭВІЧ Парфен Андрэевіч, радавы, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ДУНЕЦ Гелярый Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1908; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, загінуў у 1944 пры вызваленні Літоўскай ССР.

ДУНЯК Вікенцій Іосіфавіч, падпалкоўнік, загінуў 19.9.1944 пры вызваленні Латвійскай ССР.

ДЫБАЛЕЎ Аляксей Максімавіч, нарадзіўся ў 1915; прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

Дз. А. Касянікаў.

З. Я. Клябанаў.

В. Б. Кузняцоў.

М. Е. Кузняцоў.

ДЫБІЛЬ Аляксей Максімавіч, нарадзіўся ў 1915; у Чырвоную Армію прызываўся Копыльскім РВК, загінуў у кастрычніку 1943.

ДЫБУН Вікенцій Паўлавіч, нарадзіўся ў 1902; радавы, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ЕМЕЛЬЯНОВІЧ Павел Пятровіч, нарадзіўся ў 1924; радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЕРМАЛОВІЧ Станіслаў Станіслававіч, нарадзіўся ў 1905 у Крупскім р-не Мінскай вобл.; радавы, загінуў 17.3.1943 у Смаленскай вобл.

ЖАБІЦКІ Рыгор Васільевіч, нарадзіўся ў 1913; радавы, прапаў без вестак у студзені 1942.

ЖВАНСКІ Раман Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1921; у Чырвонай Арміі з 1940, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЖУРАЎЛЁЎ Рыгор Ільіч, начальнік дывізійнай хлебапякарні.

ЖУЧКОЎ Андрэй Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1911; загінуў у 1944.

ЖЫГУНОЎ Андрэй Мікалаевіч, радавы, прапаў без вестак у г. Смаленск.

ЗАБЕЛКІН Сяргей Аляксеевіч, лейтэнант, прапаў без вестак у 1941.

ЗАЗЫБА Мікалай Раманавіч, нарадзіўся ў 1911; у Чырвонай Арміі з 1941, прапаў без вестак.

ЗАЙЦАЎ Рыгор Пятровіч, нарадзіўся 1922; у Чырвонай Арміі з 1941, ст. сяржант, загінуў 14.3.1943, пахаваны ў Ленінградскай вобл.

ЗАКРЭЎСКІ Аляксей Апанасавіч, нарадзіўся ў 1919; радавы, загінуў 21.1.1942.

ЗАКРЭЎСКІ Маўр Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1911; радавы, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ЗЯМНІЦКІ Іван Мікітавіч, нарадзіўся ў 1900; у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў 4.8.1944 пры вызваленні Польшчы.

ЗЯМІЦКІ Леанід Іванавіч, нарадзіўся ў 1922; загінуў 4.8.1944 пры вызваленні Польшчы.

ЗЯНЬКОВІЧ Вітольд Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1906; радавы, загінуў у 1943.

ЗЯНЬКОЎ Ларывон Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1898; радавы, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ЗЯНЬКОЎ Якаў Дапілавіч, прапаў без вестак.

ІВАНЮТА Сяргей Ігнатавіч, памёр 12.3.1943 ад хваробы.

ІГАНАЎ Мікалай Герасімавіч, нарадзіўся ў 1921; да вайны скончыў ваеннае вучылішча сувязі, лейтэнант, загінуў у 1941 у Літоўскай ССР.

ІГАНАЎ Станіслаў Герасімавіч, нарадзіўся ў 1915; у Чырвоную Армію прызваны з Масквы, сяржант, камандзір аддзялення, загінуў 18.8.1942 у Ленінградскай вобл.

ІЛЬЮШЫН Васіль Пятровіч, нарадзіўся ў 1909; прапаў без вестак у верасні 1944.

КАВАЛЁЎСКІ Фёдар Пракопавіч, радавы 1158-га стралковага палка, памёр ад ран 11.11.1944 пры вызваленні Польшчы.

КАЗІМІРОПЕЦ Андрэй Станіслававіч, нарадзіўся ў 1921; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, трапіў у палон, уцёк, партызаніў, з 1944 зноў у Чырвонай Арміі, загінуў 27.3.1945 у Германіі.

КАЗІМІРСКІ Станіслаў Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1910; памёр 31.5.1942 у нямецкім палоне.

КАЗЫРЫЦКІ Пётр Барысавіч, радавы, загінуў 15.11.1944 ва Усходняй Прусіі.

КАКОШКА Павел Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1927; у Чырвоную Армію прызываўся з Германіі, радавы, прапаў без вестак у красавіку 1945.

КАЛКОЎСКІ Іпаліт Антонавіч, нарадзіўся ў 1921; сяржант, памёр 27.12.1941 у нямецкім палоне.

КАМІЦКІ Аляксей Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1916; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1941.

КАМІНСКІ Барыс Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1920; радавы, прапаў без вестак у снежні 1944.

КАМІНСКІ Васіль Фёдаравіч, гв. радавы, загінуў 3.8.1944 пры вызваленні Літоўскай ССР, пахаваны ў Лаздзійскім р-не.

КАМЛАН Зіма Майсеевіч, радавы, загінуў 13.9.1944.

КАНДРАЦЬЕЎ Дзям'ян Анісімавіч, нарадзіўся ў 1907; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

КАРАТКЕВІЧ Васіль Ільіч, нарадзіўся ў 1912; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

КАРАТКЕВІЧ Уладзімір Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1913; у Чырвонай Арміі з 22.5.1941, загінуў пад Сталінградам.

КАРОЛЬКА ІванАнуфрыевіч, нарадзіўся ў 1917; радавы, прапаў без вестак у ліпені 1941.

С. Г. Іганаў.

І. Л. Купрыянец.

К. Т. Купрыянец.

І. С. Лісоўскі.

Е. А. Магілявец.

КАСПЯРОВІЧ Іосіф Пятровіч, нарадзіўся ў 1905; у Чырвонай Арміі з 1940, лейтэнант, загінуў 10.7. 1941.

КАСЯНІКАЎ Дзям'ян Агеевіч, нарадзіўся ў 1914 у Гомельскай вобл., да вайны працаваў у Талачынскім леспрамгасе; у Чырвонай Арміі з 1941, радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

КАСЯНІКАЎ Якаў Агеевіч, нарадзіўся ў 1906 у Гомельскай вобл.; у Чырвоную Армію прызываўся ў 1941 Талачынскім РВК, радавы, прапаў без вестак у верасні 1944.

КІСЯЛЁЎ Іван Агеевіч, нарадзіўся ў 1896 у Смаленскай вобл.; радавы, прапаў без вестак 6.8.1944.

КЛЯБАНАЎ Захар Яфімавіч, нарадзіўся ў 1920, чырванафлоцец.

КОТАЎ Аляксей Паўлавіч, лейтэнант, загінуў 10.12.1941.

КОШКІН Віктар Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1914, памёр ад ран 6.2.1945.

КРАСОЎСКІ Іван Андрэевіч, нарадзіўся ў 1912; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

КРАСОЎСКІ Яўген Арсеньевіч, нарадзіўся ў 1917; загінуў 7.12.1941 у Ленінградскай вобл.

КРОЕР Іван Піліпавіч, капітан, загінуў 25.12. 1942.

КРЫВІЦКІ Павел Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1920 у Чашніцкім р-не; радавы, прапаў без вестак у жніўні 1944.

Новых вышынь дасягнуў раён у 11-й пяцігодцы. Больш за 1,5 тысячы рабочых і калгаснікаў датэрмінова выканалі сацыялістычныя абавязацельствы. Прамысловасць раёна за 11-ю пяцігодку выпусціла прадукцыі на 16 млн. 58 тыс. рублёў больш, чым у папярэдняй. За кошт росту прадукцыйнасці працы выпушчана звышпланавай прадукцыі на 2363 тыс. рублёў, павялічаны выпуск тавараў народнага спажывання. Машынна-трактарны парк гаспадарак раёна ў 1986 г. налічваў 1216 трактароў, 158 бульбаўборачных і 362 збожжаўборачныя камбайны, 105 ільнокамбайнаў, 104 бульбасаджалкі, 476 грузавых аўтамабіляў, 38 зернесушыльных комплексаў, 110 самаходных кормаўборачных комплексаў і шмат іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. Многа зроблена ў 11-й пяцігодцы для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў і саўгасаў. Капітальныя ўкладанні ў сельскую гаспадарку раёна склалі 95 млн. рублёў, што на 52 % больш, чым у 10-й пяцігодцы. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых дасягнула 21,3 цэнтнера з гектара, звыш плана прададзена дзяржаве 1260 тон збожжа. Значна выраслa культура земляробства.

Высокія ўраджаі бульбы стабільна атрымліваюць перадавыя гаспадаркі раёна. У калгасах імя Энгельса і імя Дзімітрава ў 1984—1988 гадах з гектара збіралі ў сярэднім па 260—284 цэнтнеры клубняў. За дасягнутыя поспехі звенняві М. П. Пятроўскі з калгаса імя Дзімітрава і В. А. Валчок з калгаса імя Энгельса ў 1987 г. ўзнагароджаны дыпломамі ВДНГ СССР і прэміраваны аўтамабілямі «Масквіч-412». Дыпломамі ВДНГ СССР і прэміямі па выніках 1986 г. адзначаны льнаводчыя звенні з калгасаў «XVIII партз'езд» і імя Заслонава. У 1986 г. ў калгасах і саўгасах раёна працавала 768 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

За апошнія гады змяніў сваё аблічча і горад Талачын. Выраслі новыя жылыя дамы, вытворчыя карпусы, а па заходняй ускраіне ўзнік мікрараён, забудаваны добраўпарадкаванымі жылымі дамамі. З невялікага мястэчка, якім быў дарэвалюцыйны Талачын, ён ператварыўся ў сучасны горад, звязаны чыгуначнымі і аўтамабільнымі маршрутамі з Віцебскам, Оршай, Магілёвам, Мінскам. Шырокая сетка дарог і блізкасць да буйных прамысловых і культурных цэнтраў дабратворна ўплывае на эканамічнае, індустрыяльнае і культурнае развіццё горада і раёна. Калі да рэвалюцыі ў Талачыне было некалькі прыватных заводзікаў, па якіх працавала крыху больш як сто чалавек, то сёння тут 13 прамысловых прадпрыемстваў, з іх — 2 ільназаводы, крухмальны, масласырзавод, плодавінзавод (у 1986 г. рэканструяваны і пераведзены на выпуск розных сокаў). Акрамя таго, працуюць Талачынскі філіял Віцебскага тэкстыльна-вытворчага аб'яднання, торфабрыкетны завод, Коханаўскі камбінат будіндустрыі, прадпрыемствы РАПА, лясгас, жвірова-пясчаны кар'ер, асфальтавы завод. На іх працуе больш за 2,5 тысячы чалавек. Прамысловыя прадпрыемствы горада выпускаюць каля 50 відаў асноўных вырабаў, многія з якіх вядомы ў рэспубліцы і за яе межамі. Прадукцыю Талачынскага крухмальнага завода ведаюць у Мінску, Маскве, Алма-Аце, Мурманску, Іркуцку, Тбілісі, Чэлябінску і іншых гарадах краіны. Сухі бульбяны крухмал пастаўляецца ва ўсе саюзныя рэспублікі. Талачынскі масласырзавод спецыялізуецца на вырабе масла, сыру, смятаны, тварагу і іншай прадукцыі. Прыёмка малака на заводзе поўнасцю механізавана. На прадпрыемстве ўкаранёна брыгадная форма працы.

Нарыхтоўка сіласу ў калгасе імя Леніна.

Уборка бульбы ў калгасе імя Энгельса.

На Талачынскім масласырзаводзе.

Адным з буйнейшых прадпрыемстваў Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР з'яўляецца Коханаўскі камбінат будаўнічай індустрыі. За гады 10-й і 11-ю пяцігодкі камбінат рэалізаваў прадукцыі больш чым на 66 млн. рублёў. Адпраўлена на будоўлі каля 700 тыс. кубаметраў зборнага жалезабетону, адрамантавана больш за тысячу экскаватараў. Камбінат асвоіў выпуск дажджавальных апаратаў, касілак, агрэгатаў для догляду меліярацыйных сістэм. У СССР толькі Коханаўскі камбінат выпускае напорныя трубы. Гэтыя вырабы дэманстраваліся на ВДНГ СССР, ім прысвоены дзяржаўны Знак якасці. Прадукцыя прадпрыемства забяспечвае патрэбы меліяратараў Беларусі і Нечарназёмнай зоны РСФСР. База камбіната з кожным годам пашыраецца. Уведзена ў дзеянне першая чарга завода «Рамбудгідрамаш». Тут добра наладжана рацыяналізатарская работа. За мінулае дзесяцігоддзе рацыяналізатары ўнеслі 450 прапаноў, эканамічны эфект ад укаранення якіх склаў каля 800 тыс. рублёў. Рацыяналізатары камбіната 4 разы выходзілі пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве ў рэспубліцы і адзін раз у краіне. Практычна вырашана жыллёвае пытанне: на 1230 працуючых ёсць 1200 кватэр, неабходная колькасць дзіцячых дашкольных устаноў і інш.

З 1961 г. ў раёне працуе торфабрыкетны завод, які выпускае торфабрыкет на паліва і нарыхтоўвае торф на ўгнаенне для Талачынскага, Аршанскага, Круглянскага, Сенненскага і іншых раёнаў. Яго праектная магутнасць 70 тыс. тон брыкету за год. У 1978 г. тут укаранёна новая тэхналогія, якая дала магчымасць перакрыць магутнасць. Калектыў торфпрадпрыемства неаднаразова быў удзельнікам ВДНГ СССР.

За дасягненне высокіх выпікаў ва ўсесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, за датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана 1975 г. і паспяховае завяршэнне 9-й пяцігодкі завод узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, СМ СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

У Талачыне працуе льнозавод з высокім узроўнем механізацыі асноўнай вытворчасці. За год ён перапрацоўвае трасты больш як 5 тыс. тон.

У 1987 г. адно з старэйшых прадпрыемстваў горада — Талачынскі філіял Віцебскага тэкстыльнага вытворчага аб'яднання — адзначыла 60 гадоў з дня свайго заснавання. Яго прадукцыя вядома далёка за межамі рэспублікі і карыстаецца вялікім попытам у пакупнікоў, пастаўляецца ў Маскву, Ленінград, Смаленск, Грузінскую, Казахскую, Літоўскую і іншыя саюзныя рэспублікі. На прадпрыемстве шмат увагі аддаецца пытанням тэхнічнага пераўзбраення, укаранення і асваення новай тэхнікі. За 11-ю пяцігодку ўкаранёны 104 адзінкі новага высокапрадукцыйнага абсталявання, зніжана доля ручной працы. З 1986 г. прадпрыемства перайшло на новыя метады гаспадарання.

Будаўнічыя работы ў раёне ў асноўным выконваюць перасоўныя механізаваныя калоны (ПМК). Першая ў раёне МПМК № 37 аблміжкалгасбуда была створана ў 1958 г. За гады існавання МПМК № 37 выканала вялікі аб'ём работ: у сельскай мясцовасці пабудаваны сотні кватэр, школы, клубы, дзіцячыя сады, збожжасховішчы, жывёлагадоўчыя комплексы, у тым ліку «Нарцызава» — комплекс па адкорму свіней на 27 тыс. галоў. Для гэтага комплексу будаўнікі ствараюць жылы пасёлак з гандлёвым цэнтрам, клубам, стадыёнам, лазняй-пральняй. У 1986 г. МПМК № 37 і Талачынская ПМК № 99 аб'яднаны ў адну буйную арганізацыю — МПМК № 65 трэста «Віцебскаблсельбуд», у тым жа годзе ў Талачыне створана спецыялізаваная ПМК № 23 для сантэхнічных работ. Яе аб'екты на тэрыторыі Талачынскага, Аршанскага і Дубровенскага раёнаў.

З 1936 г. існуе Талачынскі лясгас. Яго агульная плошча складае 44,4 тыс. га. У лясгасе 5 лясніцтваў. Штогод лясгас нарыхтоўвае значную колькасць насення дрэвавых і кустовых парод, якія выкарыстоўваюцца для пасеваў у гадавальніках, адпраўкі ў іншыя лясгасы рэспублікі і на экспарт. У 1972 г. ЦК КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, Савет Міністраў СССР, ВЦСПС за дасягненне высокіх паказчыкаў ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ў гонар

50-годдзя ўтварэння СССР узнагародзіў калектыў Талачынскага лясгаса юбілейным Ганаровым знакам.

Патрэбы раёна ў пасажырскіх перавозках і дастаўцы розных народнагаспадарчых грузаў забяспечвае аўтапрадпрыемства № 7. За апошнія гады значна абнавіўся і папоўніўся яго рухомы састаў. Тут налічваецца звыш 30 аўтобусаў, каля 60 грузавых аўтамашын. Аўтапрадпрыемства абслугоўвае 4 гарадскія, 14 прыгарадных і 1 міжгародні маршрут.

Памочнікам хлебаробаў з'яўляецца Талачынская райаграпрамтэхніка, якая мае спецыялізаваную рамонтную майстэрню, разлічаную на рамонт 500 трактароў за год, станцыю тэхабслугоўвання на 400 аўтамабіляў, базу матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Функцыяніруюць службы мантажу і тэхнічнага абслугоўвання жывёлагадоўчых ферм, машынна-трактарнага парка калгасаў і саўгасаў раёна. Аб'ём рэалізацыі па ўсіх відах вытворчасці аграпрамтэхнікі склаў 2500 тыс. рублёў за год. Райаграпрамтэхніка пастаянна ўкараняе перадавыя тэхналогіі апрацоўкі глебы, барыхтоўкі кармоў, паляпшэння абслугоўвання жывёлагадоўчых ферм. Вядзецца комплексная механізацыя ферм буйной рагатай жывёлы, будаўніцтва кармацэхаў, зернетакоў. Значная частка сельскагаспадарчых грузаў перавозіцца аўтатранспартам аграпрамтэхнікі. Тут паспяхова вырашаюцца задачы сацыяльна-культурнага развіцця калектыву: пабудаваны жылы пасёлак на 200 добраўпарадкаваных кватэр, дзіцячы сад на 100 месцаў, інтэрнат на 195 чалавек, магазін, сталовая і іншыя аб'екты.

Дапамогу ў паляпшэнні зямель калгасам і саўгасам раёна аказвала Талачынская ПМК-40. Праводзяцца мерапрыемствы па перабудове і добраўпарадкаванню населеных пунктаў, шмат будуецца аб'ектаў вытворча-жыллёвага і культурна-бытавога прызначэння. У кожным калгасе, саўгасе вызначана перспектыва развіцця населеных пунктаў, распрацаваны генеральныя планы забудоў. Узнікаюць пасёлкі гарадскога тыпу з поўным інжынерным забеспячэннем і камунальна-бытавымі выгодамі: з гандлёвымі цэнтрамі ці магазінамі, установамі культуры, сталовымі, дзіцячымі яслямі, Дамамі быту або комплекснымі пунктамі. Сёння не пазнаць многіх вёсак раёна. Калгас імя Дзімітрава, вёскі Міхайлаўшчына, Заднева, Жураўлі, Забалацце... Тут створаны ўсе ўмовы для культурнага адпачынку калгаснікаў. У Палацы культуры ёсць глядзельная і спартыўная залы, бібліятэка, калгасны музей. Працуюць музычна-мастацкі салон, танцавальны калектыў, клуб дашкольнікаў «Васілёк», дзіцячая секцыя прыдухавым аркестры. У калгасе функцыяніруе гандлёвы цэнтр, камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва, сталовая на 75 месцаў, гасцініца. У памяшканні школы ёсць спартыўная зала, бібліятэка, хімічны, фізічны і іншыя кабінеты, майстэрня, сталовая. Сельскім дзецям створаны добрыя ўмовы для вучобы і здаровага адпачынку. Комплексная праграма перабудовы матэрыяльна-тэхнічнай базы калгаса ажыццяўляецца на прынцыпова новай аснове з выкарыстаннем прамысловай тэхналогіі ў асноўных галінах вытворчасці, робіцца ўсё магчымае, каб аблегчыць працу людзей, зрабіць яе больш прывабнай, прадукцыйнай. На прамысловую аснову паставлена ў калгасе вытворчасць ільнопрадукцыі, насення збожжавых культур і шматга-

Мост цераз раку Друць у Талачыне.

довых траў, бульбы. Хлебаробы калгаса атрымліваюць па 35—40 цэнтнераў збожжа, 250—300 цэнтнераў бульбы з гектара. У калгасе 43 трактары, 30 камбайнаў, больш за 20 аўтамашын. Калгаснай вытворчасцю кіруюць 34 спецыялісты сельскай гаспадаркі з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Вялікі клопат аб працаўніках палёў і ферм праяўляюць у калгасах «Гігант», імя Свярдлова, саўгасе «Іскра» і іншых гаспадарках.

Пастаянна расце рознічны тавараабарот і аб'ём рэалізацыі бытавых паслуг насельніцтву. У раёне 127 магазінаў перайшлі на метад самаабслугоўвання.

З медыцынскіх устаноў у раёне дзейнічаюць цэнтральная раённая бальніца на 125 ложкаў (у Талачыне), Коханаўская раённая бальніца на 150 ложкаў, 5 участковых бальніц, 22 фельчарска-акушэрскія пункты і 2 пункты аховы здароўя на прамысловых прадпрыемствах. Кваліфікаваную медыцынскую дапамогу насельніцтву аказваюць 57 урачоў з вышэйшай і 272 медработнікі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. У паліклініках вядзецца прыём па 17 спецыяльнасцях. Ажыццяўляецца штогодняя дыспансерызацыя насельніцтва. У раёне арганізаваны 3 кругласутачныя брыгады хуткай медыцынскай дапамогі. У Талачыне працуюць 3 заслужаныя ўрачы БССР: М. А. Чыгір, які больш за 20 гадоў узначальваў ахову здароўя раёна, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны (цяпер урач-хірург цэнтральнай райбальніцы), урач-педыятр Л. С. Пінчук, галоўурач Коханаўскай раённай бальніцы Л. П. Сцяпанаў.

Да паслуг працоўных Талачыншчыны 42 клубныя ўстановы, у тым ліку раённы, Коханаўскі гарадскі і 11 сельскіх Дамоў культуры. Раённая бібліятэка мае 49 філіялаў у вёсках, чытачамі якіх з'яўляюцца 27 тыс. чалавек. Дзейнічае 51 кінаўстаноўка, у тым ліку 36 стацыянарных. Жыхары раёна выпісваюць каля 55 тыс. экземпляраў газет і часопісаў, іх штодзень дастаўляюць у населеныя пункты больш як 100 паштальёнаў. Кожны дзесяты жыхар раёна — удзельнік мастацкай самадзейнасці. Каля 4,5 тыс. самадзейных артыстаў аб'яднаны ў 309 калектывах. Толькі ў раённым Доме культуры 26 самадзейных калектываў і аб'яднанняў, у якіх займаецца больш за тысячу чалавек. Чатыром калектывам раённага Дома культуры прысвоена ганаровае званне «народны»: тэатру, агітбрыгадзе «Лянок», кінастудыі «Летапіс» і жаночаму вакальнаму ансамблю РДК. Званняў «народны» ўдастоены Навасельскі хор, музей і хор калгаса імя Дзімітрава.

Ганарацца жыхары раёна сваімі славутымі землякамі, а іх Талачыншчына дала нямала: партыйныя і дзяржаўныя дзеячы, перадавікі вытворчасці, пісьменнікі, паэты, мастакі, артысты, работнікі навукі і культуры, аховы здароўя, ваеннаслужачыя і інш. Вядомым партыйным і дзяржаўным дзеячам БССР стаў ураджэнец в. Рацава, член КПСС з 1917 г. І. І. Рыжыкаў; членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР з 1967 г. па 1985 г. быў К. В. Мацюшэўскі, які нарадзіўся ў в. Новае Палюдава. Шлях ад старшыні выканкома сельскага Савета да намесніка міністра прайшоў І. І. Кардовіч з Друцка. У в. Лагаўшчына нарадзіўся Я. І. Клімчанка, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік прамысловасці БССР, заслужаны настаўнік рабочай моладзі, член ЦК КПСС, слесар-інструментальшчык Мінскага трактарнага завода. За выдатныя поспехі ў сельскагаспадарчай вытворчасці высокага звання Герояў Сацыялістычнай Працы былі ўдастоены брыгадзір трактарна-палаводчай брыгады калгаса «XVIII партз'езд» І. М. Барадаўка, аператар машыннага даення племзавода «Рэканструктар» В. С. Галубцова, звеннявая калгаса імя Леніна Г. Л. Іванюта, звеннявая калгаса «XVIII партз'езд» В. П. Кароткая, звеннявы калгаса імя Энгельса В. С. Кудзін, брыгадзір комплекснай брыгады № 2 калгаса імя Дзімітрава Э. Я. Ляшнеўскі, аператар машыннага даення племзавода «Рэканструктар» А. Я. Марозава, старшыня калгаса імя Леніна Л. А. Навумава, аператар па адкорму парасят племзавода «Рэканструктар» В. А. Пятрушына, старшыня калгаса імя Дзімітрава Л. Е. Сіроткіна, былы старшыня калгаса імя Дзімітрава К. В. Смірноў. У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны змагаўся з ненавісным ворагам малады партызан Аркадзь Жураўскі з вёскі Янава. Прайшлі гады. Сёння ў краіне добра вядома імя вучонага А. І. Жураўскага, аўтара многіх навуковых прац, доктара філалагічных навук, члена-карэспандэнта АН БССР, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР, дырэктара Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР. Былы галоўны ўрач Талачынскай раённай бальніцы У. В. Гарбачоў стаў доктарам медыцынскіх навук, прафесарам, працуе загадчыкам кафедры кардыялогіі ў Беларускім дзяржаўным інстытуце ўдасканалення ўрачоў. Кандыдатамі навук сталі браты Эдуард Аляксандравіч і Рыгор Аляксандравіч Карніловічы з в. Любанічы. Э. А. Карніловіч, дацэнт Беларускага інстытута народнай гаспадаркі, з'яўляецца аўтарам кніг «Платон Галавач — публіцыст» (разам з Р. В. Булацкім), «Рэвалюцыяй прызваныя», «Людзі рэвалюцыйнага подзвігу», многіх артыкулаў на гісторыка-рэвалюцыйныя тэмы. У Мінскай вышэйшай партыйнай школе выкладаюць кандыдаты навук, дацэнты В. Я. Кожар (родам з в. Малое Гальцэва) і В. А. Ляховіч, які

нарадзіўся ў в. Старая Будаўка. Выпускнік Талачынскай сярэдняй школы № 2 І. П. Хаўратовіч стаў кандыдатам гістарычных навук, працаваў у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Зараз І. П. Хаўратовіч лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужаны работнік культуры рэспублікі, намеснік галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Шчодрая талачынская зямля і на творчыя таленты. Імя беларускага савецкага жывапісца, народнага мастака СССР і БССР М. А. Савіцкага добра вядома не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. М. А. Савіцкі — лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, Міжнароднай выстаўкі рэалістычнага жывапісу ў Сафіі, правадзейны член-карэспандэнт Акадэміі мастацтваў СССР. В. В. Галубовіч (нарадзіўся ў г. п. Коханава) стаў савецкім тэатральным мастаком, заслужаным дзеячам мастацтваў Казахскай ССР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР.

Паэтам рэвалюцыі стаў Іван Батрак (Іван Андрэевіч Казлоўскі), які родам з в. Малое Гальцэва. У в. Высокі Гарадзец нарадзіўся вядомы беларускі пісьменнік Міхась Зарэцкі (Касянкоў Міхаіл Яфімавіч), аўтар многіх аповесцей, раманаў, расказаў і п'ес. Многа гадоў пазней маладая дзяўчына з гэтай жа вёскі надрукавала свой першы верш. Гэта стала пачаткам літаратурнай дзейнасці Веры Вярбы (Сакаловай Гертруды Пятроўны), цяпер вядомай беларускай паэтэсы. Дзіцячыя гады паэта І. І. Васілеўскага прайшлі ў в. Букарава. У в. Рыдамля нарадзіўся беларускі савецкі пісьменнік Алесь (Аляксей Іванавіч) Рылько, у в. Пярэвалачня — А. Л. Петрашкевіч, вядомы савецкі драматург, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужаны работнік культуры рэспублікі, кандыдат гістарычных навук. Літаратурную дзейнасць ён паспяхова спалучае з навуковай і выдавецкай, з'яўляецца намеснікам галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Беларускі крытык і літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук, заслужаны работнік культуры БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа, галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм» Н. Е. Пашкевіч нарадзіўся ў в. Фелістава.

Нямала дала Талачынічына таленавітых спартсменаў: больш за 30 выхадцаў з раёна маюць званне «Майстар спорту СССР». Сярод іх — члены зборнай каманды СССР па лёгкай атлетыцы неаднаразовы пераможца чэмпіянатаў СССР і розных міжнародных спаборніцтваў па спартыўнай хадзьбе, пераможца матча СССР — ЗША (1978 г.), майстар спорту СССР міжнароднага класа Аляксандр Паташоў, чэмпіёнка СССР у бегу на 100 метраў Ірына Савік, пераможца рэспубліканскіх спаборніцтваў па веснавому лёгкаатлетычнаму кросу на прыз газеты «Правда» Святлана Валчок, член зборнай каманды сельскіх ДСТ БССР, шматразовы прызёр абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў па біятлону Аляксандр Какошка, пераможца першынства БССР сярод сельскіх спартсменаў па веласпорту Тамара Зайцава, у нацыянальную зборную каманду СССР па футболу ўваходзіў Георгій Кандрацьеў, ігрок мінскага «Дынама» і г. д. Усё часцей Талачын становіцца месцам правядзення абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў. За апошнія гады тут праведзена 6 абласных спаборніцтваў і 2 чэмпіянаты рэспублікі па біятлону, спаборніцтвы па веласпорту ЦС ДСТ «Ураджай». У раёне працуюць 2 дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Ніва». З 1974 г. пры Талачынскім раённым Доме культуры дзейнічае сельскі шахматна-шашачны клуб, які праводзіць вялікую работу па прапагандзе і развіццю шахмат у раёне. Клуб неаднаразова быў арганізатарам міжраённых спаборніцтваў, сеансаў адначасовай гульні з майстрамі спорту. У Талачыне праводзіліся абласныя і рэспубліканскія спаборніцтвы па шахматах і шашках. Зборныя каманды раёна неаднойчы займалі ў гэтых спаборніцтвах прызавыя месцы.

Працоўныя раёна свята захоўваюць памяць аб тых, хто аддаў сваё жыццё за ўстанаўленне і абарону Савецкай улады, за свабоду, незалежнасць і шчасце роднай зямлі. Вядзецца вялікая пошукавая работа. Сярод энтузіястаў гэтай высакароднай справы А. Р. Мачахоўскі, Я. А. Пасюцін, І. М. Прускі, Л. У. Гвоздзева і іншыя. Яны шмат чаго расказалі аб загінуўшых земляках, правялі і вядуць перапіску з роднымі і блізкімі былых воінаў, партызан і падпольшчыкаў, сабралі пра іх багаты фактычны і ілюстрацыйны матэрыял. Юныя следапыты многіх школ раёна ўдзельнічаюць у аперацыі «Пошук», адкрываюць новыя імёны герояў, збіраюць дакументы, фотаздымкі, успамінаў ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ствараюць фанатэкі з запісамі іх успамінаў, у іх гонар названы вуліцы, школы, піянерскія дружыны, іх імёны занесены ў Кнігу народнай славы раёна. 38 помнікаў, абеліскаў, мемарыяльных дошак і іншых знакаў народнай памяці сведчаць аб ратных подзвігах загінуўшых. У 1964 г. ў в. Славені ў адну брацкую магілу перапахаваны астанкі воінаў і партызан, якія былі пахаваны ў адзіночных магілах уздоўж чыгункі і аўтамагістралі, каля навакольных вёсак. Чырвоныя следапыты мясцовай школы на чале з былым партызанам Я. А. Пасюціным адшукалі яшчэ 9 невядомых магіл і высветлілі, хто ў іх пахаваны.

У дні святкавання 40-годдзя Вялікай Перамогі ў Талачыне. На здымку (злева направа): былы партызан В. Да. Шарай, Герої Савецкага Саюза М. С. Камельчык, М. Б. Осіпава, Я. М. Целешаў.

Астанкі герояў таксама перанесены ў брацкую магілу. У Славенях пахаваны Герой Савецкага Саюза І. Ц. Арцём'еў, французскі лётчык з палка «Нармандыя — Нёман» Жак Гастон. У маі 1970 г. сюды прыязджала маці Гастона. Школьнікі аддалі ёй на памяць шкатулку з зямлёй з магілы сына і гадзіннік з надпісам «Няхай стук гэтага гадзінніка нагамінае Вам стук сэрца Вашага сына, якое перастала біцца летам 1944 года». На мітынгу мадам Гастон сказала, што калі б нават і была магчымасць перанесці астанкі сына ў Францыю, яна ніколі б не зрабіла гэтага, бо Савецкая краіна стала для Жака другой Радзімай...

Штогод у дзень Перамогі праводзяцца мітынгі, ускладаюцца кветкі да помніка ахвярам фашызму, што стаіць каля аўтамагістралі Мінск — Масква непадалёку ад в. Маціёва. У гады вайны ўрочышча Доўгава Балота паблізу ад гэтай вёскі было ператворана фашыстамі ў месца масавай загубы савецкіх людзей. Пахаванні ахвяр гітлераўскіх злачынцаў былі раскіданы па ўсім лесе. У 1963 г. іх астанкі былі перапахаваны ў адно месца, на якім у 1967 г. была ўстаноўлена стэла, у 1986 г. помнік рэканструяваны.

У Талачынскім гарадскім парку знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Тут пахаваны адзін з арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі раёна, сакратар Талачынскага падпольнага РК КП(б)Б С. М. Нарчук. На магіле пастаўлены помнік, на белых мармуровых плітах імёны 66 воінаў і 6 партызан, побач — Курган Памяці. Чырвоныя следапыты адшукалі шмат родных і блізкіх загінуўшых, вядуць перапіску. Амаль кожны год сюды прыязджаюць людзі з розных куткоў краіны, каб пакланіцца святому для іх месцу.

Як сімвал нязгаснай памяці, глыбокай павагі да тых, хто здзейсніў бяспрыкладны подзвіг, абараняючы нашу Радзіму ад фашысцкай навалы, 5 ліпеня 1969 г. пры ўездзе ў Талачын быў насыпаны Курган вечнай Славы. Памяці загінуўшых у вогненнай віхуры вайны землякоў і воінаў-вызваліцеляў будзе прысвечана значная частка экспазіцыі мясцовага музея, стварэнне якога распачата ў 1987 г.

Героі не паміраюць. Яны жывуць у нашых сэрцах, у штодзённых справах і здзяйсненнях жывых, у імкненні захаваць мір і шчасце на зямлі.

А. А. Шнэйдар.

На вызваленай зямлі

Па старонках раённай газеты

ЗЯБЬ ПОДНИМАЮТ ВРУЧНУЮ

В колхозе «Победа» Аленовичского сельсовета имеется 7 пригодных к работе лошадей. Конечно, с таким наличием тягловой силы совсем трудно справиться с выполнением сельхозработ. Несмотря на это, председатель колхоза, инвалид Отечественной войны Цибульский Яков А., сумел организовать дело так, что колхоз вместе с окончанием работ по уборке урожая справляется с выполнением плана подъема зяби. Колхозники поняли важность этой задачи и используют на подъеме зяби имеющиеся в колхозе 3 коровы. На коровах уже поднято 4 гектара. Кроме того, в колхозе налажен подъем зяби вручную. Еже-

дневно на работу выходят до 16 человек. Они уже подняли под зябь 2 гектара.

Работающее на подъеме зяби лошадьми молодежное звено хозяйским уходом за лошадьми, рациональным использованием времени добивается ежедневно выполнения и перевыполнения норм. Нередко молодые колхозники Свирко Игнат, Семенник Сергей, Алховик Николай, Шибеко Янек работают до поздней ночи.

К. Кветка.

ЮНЫЙ ПАХАРЬ

Пятнадцатилетний колхозник Кирик Павла из колхоза «15 съезд КП(б)Б» Аленовичского сельсовета ежедневно работает на подъеме зяби. Юный пахарь старательно ухаживает за закрепленной за ним парой лошадей, что дает ему возможность ежедневно вспахивать по 0,90—0,96 гектара, вместо нормы 0,60 гектара.

Н. Соболев.

Газета «Чырвоны хлебароб», 19 кастрычніка 1944 г.

РЕШЕНО — СДЕЛАНО

Успешно выполнив обязательства хлебопоставок перед государством, колхозники колхозов Евлаховского сельсовета единодушно решили сдать в фонд помощи Красной Армии 1500 пудов хлеба, 2100 пудов картофеля. Все колхозники горят единым желанием чем только возможно помочь нашим доблестным воинам героической Красной Армии.

Решено — сделано. 22 октября организованным порядком обоз из 60 подвод с красными флагами, с песнями двинулся на сдаточный пункт. Как результат, колхозы в один день сдали 1260 пудов хлеба. Обоз возглавлял председатель сельсовета тов. Труханенок, сопровождали обоз лучшие люди колхозов — стахановцы и стахановки.

Один только этот факт говорит о высоком патриотическом чувстве наших колхозников.

Н. Мазурин.

780 ПУДОВ ХЛЕБА — ФРОНТУ

Многолюдное собрание состоялось в колхозе «Перамога» Толочинского горсовета. На повестке дня — вопрос об оказании помощи Красной Армии... Колхозники единодушно решили внести в фонд помощи Красной Армии 780 пудов хлеба и 900 пудов картофеля. Сразу же снарядили обоз из 10 подвод. Нагруженные хлебом повозки, пестреющие ярко-красными флагами и лозунгами, двигались на пункт заготзерно. В первый день колхоз сдал 490 пудов хлеба.

К. Кветка.

Газета «Чырвоны хлебароб», 25 кастрычніка 1944 г.

ЖЕНЩИНЫ-СТАХАНОВКИ

Друцк (по телефону). По-стахановски работают на поднятии зяби колхозницы колхоза «Правда». Так, Покатовская Лиза на паре лошадей вспахивает за день по 0,97 га при плане 0,55 га. Жена фронтовика Полякова Зина ежедневно вспахивает по 0,89 га. Правление колхоза «Чырвоная змена» решило премировать колхозника-инвалида Грушевского Даниила деньгами в сумме 300 руб. за хорошие показатели работы на поднятии зяби. Ежедневно на паре лошадей он вспахивает по 0,96—0,99 га.

Е. Шитиков.

ПОТОК ХЛЕБА В ФОНД КРАСНОЙ АРМИИ

Отвечая на блестящие победы Красной Армии на фронтах Отечественной войны, колхозники района усиливают помощь фронту. С каждым днем поток хлеба в фонд Красной Армии увеличивается. На 27 октября сдано 21 600 пудов хлеба и 18 120 пудов картофеля.

А. Выскубов.

Газета «Чырвоны хлебароб», 29 кастрычніка 1944 г.

ДЛЯ ПОБЕДЫ НАД ВРАГОМ

Как и все трудящиеся нашей страны, единым желанием горят члены сельхозартели «2-я Пятилетка» Волковичского с/с быстрее приблизить час расплаты над кровавым врагом.

Колхозники знают, что своим честным трудом в тылу они окажут активную помощь доблестным воинам, сражающимся на фронтах Отечественной войны... Они решили и сдали сверх плана госпоставок в фонд Красной Армии 180 пудов хлеба, 240 пудов картофеля и 24 пуда овощей. С восторгом была встречена колхозниками реализация билетов 4-й денежно-вещевой лотереи.

— Я хочу, чтобы мой сын быстрее с победой возвратился домой,— сказал в своем выступлении отец фронтовика Лисовский Яков,— и знаю, что мои рубли помогут сбыться моему желанию. Подписываюсь на 200 рублей.

На 200 рублей подписалась жена фронтовика, мать пятерых детей Шарай Нина. Всего в первый день сумма подписки по колхозу составила 4000 рублей. Активное участие в реализации билетов лотереи приняли комсомольцы и несоюзная молодежь колхоза.

Б. Клусевич.

Газета «Чырвоны хлебароб», 2 лістапада 1944 г.

ВОССТАНОВЛЕНИЕ СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА

Немецко-фашистские изверги за время трехлетней оккупации разрушили, уничтожили и увезли колоссальные ценности сельского хо-

зяйства нашего района. Разрушено, уничтожено и сожжено 168 конюшен, 200 скотных дворов, 299 амбаров, 367 объектов других животноводческих построек, 142 тока, 130 колхозных клубов, 127 кузниц, 2275 домов колхозников.

Колоссальные разрушения произвели захватчики в МТС. Уничтожено и вывезено из трех МТС 110 тракторов, 18 комбайнов, 30 сложных молотилок и т. д. Посевная площадь района сокращена на 56 процентов.

С первого дня освобождения района от немецко-фашистских захватчиков колхозное крестьянство мужественно взялось за восстановление сельского хозяйства. На сегодняшний день полностью восстановлен 201 колхоз, построено и отремонтировано 194 объекта животноводческих ферм, заново отстроено 129 домов колхозникам, заработали 50 кузниц.

Возобновили свою деятельность 3 МТС с парком 20 тракторов. МТС имеет 3 комбайна, 5 сложных молотилок и другой сельскохозяйственный инвентарь.

В колхозах района вновь организованы 192 фермы крупного рогатого скота, 72 овцеводческие, 2 свиноводческие и 7 птицеферм.

Колхозное крестьянство честным и упорным трудом в ближайшие годы залечит раны, нанесенные сельскому хозяйству фашистскими извергами. *А. В. Ходневич.*

Газета «Чырвоны хлебароб», 7 лістапада 1944 г.

КЛОПАТ АБ ВОІНАХ І ІХ СЕМ'ЯХ

...Вялікая дапамога дэмабілізаваным воінам, інвалідам Айчыннай вайны і сем'ям ваеннаслужачых аказана арганізацыямі нашага раёна. Для іх пабудаваны 203 новыя дамы, адрамантавана 178 кватэр. Для індывідуальнага будаўніцтва адпушчана 4085 кубаметраў лесаматэрыялаў, выдана доўгатэрміновага крэдыту на пабудову дамоў 613 500 руб., аднаразовай дапамогі — 772 640 руб. і г. д.

Дэмабілізаваным воінам, інвалідам Айчыннай вайны і сем'ям загінуўшых воінаў аказана вялікая дапамога прадуктамі харчавання і адзеннем.

Газета «Сталінскі прызыў», 3 лютага 1947 г.

З ЗЯМЛЯНАК — У НОВЫЯ ДАМЫ

За час гаспадарання нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі нашага раёна было спалена і разбурана 1136 жылых дамоў і 1030 іншых будынкаў (школ, хат-чытальняў, калгасных клубаў).

...Адразу пасля вызвалення ад акупантаў пачаліся аднаўленчыя работы.

Вялікі клопат партыі і Савецкага ўрада аб прадастаўленні крэдыту і лесаматэрыялаў далі магчымасць правесці каласальную работу па аднаўленню разбураных будынкаў і перасяліць усіх калгаснікаў з зямлянак у новыя дамы. За прайшоўшыя чатыры гады праведзена вялікая аднаўленчая работа. За гэты час пабудавана 1066 дамоў для сямей, якія пражываюць у зямлянках, 252 дамы пабудаваны для сямей, якія пражывалі ў старых дамах. З агульнай колькасці новых дамоў пабудавана сем'ям загінуўшых воінаў Айчыннай вайны — 304, сем'ям інвалідаў Айчыннай вайны — 146, сем'ям ваеннаслужачых — 205.

Зараз у раёне не пражывае ў зямлянках ні адна сям'я. Засталіся толькі 72 сям'і, якія пражываюць на падсяленні, з іх 60 забяспечаны новымі зрубамі, 12 — лесаматэрыялам. У хуткім часе гэтыя сем'і пераселяцца ў новыя светлыя дамы.

Газета «Сталінскі прызыў», 16 верасня 1948 г.

ПОЎНАСЦЮ АДНОЎЛЕНА ДАВАЕННАЯ ШКОЛЬНАЯ СЕТКА

Нямецка-фашысцкія акупанты за час свайго гаспадарання разрабавалі і знішчылі ўсе школы раёна. За прайшоўшыя пяць гадоў пасля вызвалення поўнасцю адноўлена даваенная школьная сетка.

Зараз у раёне працуюць 42 пачатковыя, 11 сямігадовых і 2 сярэднія школы з колькасцю вучняў 8091 чалавек. За 5 гадоў 120 выпускнікоў з 10-х класаў атрымалі вышэйшую адукацыю і 2500 вучняў з сёмых класаў — сярэднюю спецыяльную адукацыю.

У раёне адноўлена школа глуханямых дзяцей і 2 дзіцячыя дамы.

Газета «Сталінскі прызыў», 3 ліпеня 1949 г.

Выратаванае дзяцінства

Дзеці-сіроты, дзеці-ахвяры, дзеці-калекі... Гэтыя страшныя па свайму сэнсу паняцці — тое трагічнае, што пакінула нам вайна. Нямала іх, бяздомных, асірацелых, знявечаных духоўна ад перажытага і убачанага, блукала па ваенных дарогах. Многія з іх ведалі, памяталі бацькоў і, самае страшнае, на вачах дзяцей іх расстрэльвалі, паверску забівалі. Даць прытулак, адагрэць, вярнуць дзецям дзяцінства — стала свяшчэнным абавязкам тых, хто застаўся жыць.

Адразу пасля вызвалення раёна зноў пачаў працаваць Коханаўскі дзіцячы дом (у 1946 годзе пераведзены ў Славені). У пачатку мая 1945 года адкрыўся Перавалачнянскі спецыяльны дзіцячы дом для сірот, чые бацькі загінулі ў партызанскай вайне, на франтах Вялікай Айчыннай, былі спалены, вывезены ў Германію. Першы кавалак хлеба дзецям — гэта стала законам для ўсіх.

З успамінаў П. Ю. Інсарава, настаўніка Падбярэзскай васьмігадовай школы, былога выхаванца Коханаўскага дзіцячага дома

Наш дзіцячы дом адкрыўся ў 1932 годзе. Гаспадыняй яго была Марыя Іванаўна Грышына, чалавек душэўны, шчодры, добры (і цяпер памятаю, як за свае грошы Марыя Іванаўна купляла нам ласункі). Сагравалі сваёй цеплынёй і чуласцю выхавацелі Надзея Дзмітрыеўна Пакіш, Таццяна Рыгораўна Бляхман, настаўнікі Лізавета Аляксандраўна Лепяшынская, Шчурава (на жаль, не памятаю яе імя). Жылі дружна, усяго нам хапала і здавалася, што пічога ў свеце не можа парушыць наш спакой. Але вераломная вайна неяравярнула ўсё. Мы яшчэ не да канца ўсведамлялі ўсё тое, што здарылася. Больш за ўсё нас уразіла, як змяніліся, пасуравелі дарослыя.

Калі акупанты падыходзілі да Коханава, мы ўсе рэчы пагрузілі на падводы, а самі пешшу падаліся на станцыю. Там ужо стаяў эшалон, у якім знаходзіліся дзеці з іншых дзіцячых дамоў. Нас павезлі ў бок Оршы. Перад Оршай эшалон пачалі бамбіць. Шмат дзяцей загінула, многія, у тым ліку і я былі паранены. Частка дзяцей вярнулася назад, у Коханава. А мы праз некаторы час, калі падалі другі паравоз, паехалі далей. У Оршы да нас далучыліся выхаванцы Лепельскага і іншых дзіцячых дамоў. Шлях ляжаў на Смаленск. Паміж Віцебскам і Смаленскам поезд спынілі людзі ў чырвонаармейскай форме, якія раптам пачалі ў нас страляць (гэта быў варожы дэсант). Машыніст не разгубіўся і адразу ж крануў цягнік. Мы былі выратаваны. У дарозе да нас далучалі ўсё больш дзяцей, дзялілі на групы. З коханаўскімі выхаванцамі ехала тэхнічка, у якой была з сабой пячатка. Гэта нас выратоўвала — на станцыях па паперцы, заверанай пячаткай, нам адразу ж, без затрымкі выдавалі хлеб, іншыя прадукты. Дзякуючы такой прадбачлівасці простай жанчыны, мы ў дарозе не галадалі. Так мы прыехалі ў г. Вольск Саратаўскай вобласці, потым у Качаліна Сталінградскай вобласці. Пачалі жыць у былым доме адпачынку. Жылося нам тут добра, пасябравалі з выхаванцамі дзіцячых дамоў Украіны. Але не затрымаліся доўга і тут. Па Волзе нас павезлі ў Астрахань, адтуль на нафтаналіўной баржы паплылі па Каспійскім моры ў г. Гур'еў. Фашысцкія самалёты часта рабілі палёты. Самым страшным быў першы налёт. Мы безабаронныя стаялі на палубе, прыціснуўшыся адзін да аднаго, і чакалі свайго лёсу. Лётчыкі праляталі так нізка, што мы баяліся не куль, а самалёта, які, здавалася, расплюшчыць нас сваёй масай.

Так мы прыехалі ў Гур'еў, далей ехалі поездам да станцыі Байтак Андзіжанскай вобласці. У сяле Пайтуг і жылі да канца вайны. Многіх дзяцей забіралі да сябе на выхаванне мясцовыя жыхары. Вучоба ў школе працягвалася. Летам працавалі на бавоўняных палях. Людзі жылі вельмі бедна, харчаваліся дрэнна — усё было для Чырвонай Арміі. Летам, калі ўдосталь агародніны, пракарміцца было лягчэй. Для слабых, самых меншых і дзяўчынак дужэйшыя бегалі па дварах, прасілі лянёшкі. Хоць і сорамна ўспамінаць, але калі гаварыць шчыра, дык і лазілі па садах, падкормлівалі такім чынам зусім аслабленых. Час быў цяжкі. Галоўнае было выжыць, не памерці з голаду. А вучыліся і працавалі добра. Хоць і некага нам было чакаць пасля вайны, але рабілі, як вясковыя дзеці,— стараліся мець у дзённіку толькі добрыя адзнакі, каб паказаць іх пасля Перамогі... але каму? І ўсё ж так устроена дзіцячая псіхалогія, што неабходна было абавязкова кагосьці чакаць...

Пасля вайны вярнуліся ў наш родны Коханаўскі дзіцячы дом. Тут мы даведаліся, што здарылася з нашымі таварышамі, якія вярнуліся сюды пасля бамбёжкі. З прыходам акупантаў зноў стаў працаваць дзіцячы дом. Дзяцей, якія вярнуліся, і іншых сірот яны выкарыстоўвалі ў якасці донараў, іх кармілі і бралі, бралі кроў. Хто застаўся жывы, адпраўлялі ў Германію. Некаторым удалося вярнуцца назад. Сустрэчы з гэтымі дзецьмі былі асаблівыя. Як не было цяжка нам, але перажытае імі было ў шмат разоў цяжэй...

З успамінаў В. А. Волчака, былога дырэктара Перавалачнянскага спецыяльнага дзіцячага дома

5 мая 1945 года... Яшчэ ніхто не ведаў, што да Перамогі засталося ўсяго чатыры дні... У той памятны для мяпе дзень і быў арганізаваны наш спецыяльны дзіцячы дом. А літаральна за тыдзень да гэтага атрымаў загад аб яго арганізацыі.

— Ніякіх фондаў няма, усё неабходна рабіць сваімі рукамі. Цяжка, неверагодна цяжка, сам ведаю. Але дзяцей павінны выратаваць,— сказаў у размове загадчык райана Пахабаў.

З чаго было пачынаць? Разам з загадчыкам гаспадаркі, якой яшчэ не было, П. І. Снапковым знайшлі сталяра. Грамадой разабралі ўзарваную плаціну на рацэ Крывая. Змайстравалі з дошак прасцепькія ложкі, сталы, лаўкі. Месца выбралі прыгожае — у старым парку каля вёскі Забайкал. У час акупацыі там знаходзіўся нямецкі штаб. Пры адступленні ўсё,

Выхаванцы Перавалачнянскага дзіцячага дома. Першыя пасляваенныя гады.

што можна было, фашысты разбурылі ў ім. Зрабілі рамонт будынка. Раённы аддзел народнай асветы дапамог падабраць выхавацеляў. Яны разам з нянечкамі хадзілі па вёсках, збіралі рэчы, уцалелую бялізну, палатно, коўдры, падушкі. Словам, у каго што засталося пасля вайны. Сшылі сеннікі, набілі іх саломай, адзін будынак адвялі пад пральню.

Пачалі паступаць дзеці. Брудныя, у парваным адзенні, галодныя, худыя, многія хворыя. Сэрца сціскалася ад болю. Хацелася ўсё зрабіць для гэтых няшчасных хлопчыкаў і дзяўчынак. Абмылі іх, пераапранулі ў тое, што сабралі ў насельніцтва і атрымалі па лініі Чырвонага Крыжа, паклалі ў чыстыя ложкі. Як ні цяжка было, а кармілі выхаванцаў чатыры разы ў дзень. Дзеці былі ў асноўным з Талачынскага раёна, шмат хлопчыкаў і дзяўчынак паступала сем'ямі. З Полюдаўскага сельсавета я прывёз брата і сястру Бараўцовых, бацькі якіх былі расстраляны за сувязь з партызанамі, браты Балашовы са спаленай вёскі Рыдамля, тры браты і сястра Мяснікавы са Шмідэльшчыны, дзве сястры і брат Козаравы, Леакадзія Шнырко з сястрой і братам з Палюдава, брат і сястра Машкаровы са Слабады, бацька якіх, старшыня калгаса, быў расстраляны фашыстамі. Бацькі Альберта і Светы Нарчукоў з Козак закатаваны ў талачынскай камендатуры, прывяла пляменнікаў Дуся Шумская і засталася працаваць медсястрой. Міша і Міра Кузьмянковы прыйшлі з Коханаўскага сельсавета, аднаго хлопчыка прывезлі з Аршанскага прыёмніка, які не ведаў ні свайго імя, ні бацькоў. Мы яму далі прозвішча Аршанскі. «Сплавілі» нам вельмі гарэзлівага непаседу і ўцекача, бывалага і многа бачыўшага хлопчыка з Лётцаў па прозвішчу Бабаед (пры ўцёку з месца расстрэлу бацькоў куля адсекла яму вуха). Па накіраванню Талачынскага райана прыехаў да нас 15-гадовы партызан Коля Цыбульскі з брыгады «Чэкіст», маці і сястру якога па-зверску закатавалі фашысты. На яго грудзях быў медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» (некалькі разоў уцякаў, хацеў трапіць у дзеючую армію). Прывялі братоў Ваню і Колю Івановых. 12-гадовы Ваня прайшоў не адзін канцлагер у Германіі, дзе бралі кроў у дзяцей, арганізатар дзіцячага бунту перад вызваленнем (на жаль, ён быў хворы на лёгкія, пасля заканчэння вучылішча ў Клайпедзе памёр). Потым да

нас прыбіліся Каця і Ніна Вавульскія. Усё гэта нашы першыя дзеці, каго я памятаю, якія паступілі да нас у самы цяжкі перыяд.

За май 1945 г. наш спецдом быў поўнасцю ўкамплектаваны — 120 дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту, якія знайшлі тут свой другі дом. Скончылася вайна, вярталіся дамоў салдаты, чыесьці бацькі, браты. Пачалася хваля пошуку. Многія браты і сёстры былі раз'яднаны, некаторыя трапілі да нас з суседніх раёнаў. Хлопчыкі пачалі ўцякаць, шукаць родных, прабіраліся бліжэй да родных месцаў. Уцекачоў вярталі, за некаторымі ездзілі самі.

1 чэрвеня пачалася вучоба ў школе. Спачатку дзеці пачатковых класаў займаліся непасрэдна ў дзіцячым доме, пазней адзін з будынкаў на тэрыторыі дзіцячага дома быў адведзены пад пачатковую школу. Вучні старэйшых класаў хадзілі ў Забалацкую васьмігадовую школу. У канцы 1945 г. забеспячэнне прадуктамі харчавання, адзеннем, абуткам стала цэнтралізаваным. Помню, як са Снапковым прывезлі першую партыю адзення. Калі пасля лазні пастроілі дзяцей, абутых і адзетых ва ўсё новае, яны самі сябе не пазнавалі. Твары дзяцей свяціліся шчасцем, мы радаваліся разам з імі. Паступова кожны выхаванец атрымаў новы касцюм, чаравікі, кашулю, дзяўчынкі — сукенкі. Нашы дзеці ў той час былі адзетыя лепш за вясковых. І тыя вельмі зайздросцілі дзетдомаўцам, бо хадзілі абарваныя, у лапцях, галодныя. Нашы ж харчаваліся першы час хоць і аднастайна, але рэгулярна. А к зіме 1945 г. пры дзіцячым доме была арганізавана падсобная гаспадарка. У нас было 6 кароў, райвыканком выдзеліў 3 кані, 1,5 гектара зямлі. Пачалі вырошчваць бульбу, агародніну. Кароў старэйшыя дзеці пасвілі на чарзе. Паступова змяняўся выгляд жылых пакояў. Былі абсталяваны спальні, пакоі для адпачынку, Ленінскі куток. Шмат сіл, фантазіі, я б сказаў, вынаходніцтва праявілі нашы нянечкі, каб зрабіць больш утульным пакоі. Іх стараннe не магло застацца не заўважаным. Дзеці як да родных адносіліся да нянечак Ніны Трыбуль, Ніны Целешавай, Любы Гляк, Олі Зянькевіч, Тамары Міронавай, Олі Пляскач. Дзяцей аб'ядноўвалі па ўзросту і адукацыі, у кожнай групе была свая выхавацельніца. Шмат цярпення і спагадлівасці праяўлялі нашы выхавацелі. Верай у светлы лес нашых дзяцей былі прасякнуты адносіны да іх. У многіх з іх за плячыма былі гады барацьбы ў партызанскіх атрадах. Перажытыя імі вы-

Выхаванцы Перавалачнянскага дзіцячага дома. У другім радзе трэці злева В. А. Волчак. 1951 г.

прабаванні збліжалі дзяцей і дарослых, дапамагалі зразумець учынкі і паводзіны выхаванцаў. Шмат душэўных сіл, свайго вольнага часу, здароўя аддалі дзецям выхавацельніцы былыя партызанкі Таццяна Спосабава, Еўдакія Савіцкая, завуч Ніна Тарасаўна Комлева, а таксама Варвара Анташкевіч, Галіна Капіч, Ларыса Самсонава, Марыя Міхалап, Таццяна Бляхман і іншыя. Рознымі шляхамі прыходзілі ў наш дзіцячы дом настаўнікі, выхавацелі, піянерважатыя. Адны працавалі па накіраванню, а з другімі зводзіў выпадак. Вось адзін такі прыклад. Ехаў аднойчы ў Коханава на санях, абагнаў хлопца. Бачу, у школу спяшаецца, стаміўся (у той час дзеці недаядалі, адкуль было дастатку брацца?). Садзіся, кажу, падвязу. Як завуць? «Аляксандр». Слова за слова — разгаварыліся. Бацька ў яго загінуў, маці адна на ногі дзяцей паднімала. «Апошні раз іду ў школу — грошай няма за вучобу плаціць. Пайду слесарам на трактарны...»,— кажа. Пашкадаваў хлапчыну. Навошта, раю, вучобу кідаць, ідзі да нас, піянерважаты патрэбны дзецям. Адначасова і ў школе давучышся. Аляксандр узрадаваўся, адразу даў згоду. І я не памыліўся ў ім. Упарты быў хлопец: і вучыўся і працаваў выдатна. У дзіцячым доме прынялі яго кандыдатам у члены КПСС. Пасля дзесяцігодкі скончыў інстытут, пайшоў далей. Стаў наш выхаванец і выхавацель Алесь Петрашкевіч пісьменнікам, драматургам, заслужаным работнікам культуры, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР.

Раслі нашы дзеці працавітымі, беражлівымі. Мы імкнуліся навучыць іх многаму з таго, што спатрэбіцца потым у жыцці. Пры дзіцячым доме былі арганізаваны розныя гурткі. Дзяўчынкі вучыліся кроіць, шыць, вышываць. Многія з іх гэтай справай авалодалі дасканала. Самі шылі летнюю бялізну, сукенкі, кашулі сабе і меншым дзецям. Хлопчыкі хадзілі ў сталярны гурток і гурток кінамеханікаў. Была добрая мастацкая самадзейнасць, з якой выязджалі ў суседнія калгасы. Заўсёды адзначалі дні нараджэння нашых выхаванцаў. Нашы повары абавязкова рыхтавалі пачастункі. Дзецям уручаліся падарункі, адзначалі разам з выхавацелем усёй групай, якая рыхтавала да дня нараджэння сваю самадзейнасць. На вялікія святы запрашалі старэйшых братоў і сясцёр, якія ўжо пакінулі наш дом і вучыліся далей або працавалі. Былыя выхаванцы прыязджалі да нас на канікулы, для іх быў спецыяльна адведзены пакой. Многія з вучылішчаў прыязджалі на выхадныя. Мы ім мянялі бялізну, мылі іх. Для нас яны па-ранейшаму былі свае, родныя.

11 гадоў працаваў наш дзіцячы дом. За гэты час многіх накіравалі на вучобу ў тэхнікумы, вучылішчы, ФЗН, адправілі ў армію. 12 нашых выхаванцаў сталі музыкантамі музычнага ўзвода ў арміі. Скончыўшы медыцынскае вучылішча, прадоўжылі вучобу і сталі ўрачамі Галя Бараўцова, Каця Вавульская. Гродзенскае музычнае вучылішча скончыла Ніна Вавульская. Ваню Карэова накіравалі ў Гомельскае чыгуначнае вучылішча (праз многа гадоў ён сустрэўся з роднай сястрой Верай, аб якой нічога не ведаў з ваенных часоў). Ліда Козырава, Лена Родзікава і яшчэ многія выхаванцы паехалі ў Мінск; Тоня Пляскач і Валя Кароткіна — у Віцебск. Гаўрык Кароткін стаў шахцёрам, працаваў у Данбасе. Пайшлі працаваць па Аршанскі завод «Чырвоны Кастрычнік» Света Нарчук (яе брат паехаў у Калінінград у ваеннае вучылішча), Люба Рабцава, Рая Кульган, Ваня Барышнікаў, Толя Другакоў. Многія нашы дзеці сталі вучыцца ў рамесных вучылішчах Рыгі, Клайпеды, Елгавы. Хацелася б ведаць, дзе цяпер Дуся Гарбылёва, Пеця Бадрушоў, Вася Кузьмін, Алік Кузьміп, Надзя Дубавец, Міра і Геня Злотнікавы, Нэля Курыкоўская і іншыя нашы выхаванцы. Раз'ехаліся нашы дзеці. І мы нібыта самі асірацелі. І ўсё ж успаміны пра іх — шчымлівае шчасце...

З успамінаў С. І. Нарчук (Вардамацкай), рабочай Аршанскага завода «Чырвоны Кастрычнік», былой выхаванкі Перавалачнянскага спецыяльнага дзіцячага дома

Мне было чатыры гады, а браціку Аліку — пяць, калі позняй восенню 1942 г. сярод ночы забралі бацьку, маці, дзядулю. Маці плакала, збіраючы нас, і ад хвалявання ніяк не магла знайсці адзін мой валёнак. Тады паліцэйскі ў нецярпенні адпіхнуў нас. Так мы не трапілі ў талачынскую камендатуру, дзе закатавалі нашых родных. Восенню 1943 г. разам з дзядулем Максімам, бабуляй Фросяй і цёцяй Дусяй Шумскімі пайшлі ў партызаны. Трапілі і перажылі блакаду зімой — вясной 1944 г. Калі пасля вызвалення вярнуліся ў Пярэвалачню, хата стаяла пустая, адны сцены. Каб не памерлі з голаду, нас з Алікам уладкавалі ў Коханаўскі дзіцячы дом, які вярнуўся з эвакуацыі.

Першы час елі з кансервавых бляшанак. Давалі бляшанку ежы на дваіх. І калі хтонебудзь сварыўся з пары паміж сабой, адзін абавязкова гаварыў: «Я цябе сёння аб'ем», гэта значыць з'ем болей. Помню сустрэчу Новага 1945 года. З мэблі, посуду, адзення яшчэ амаль нічога не было, але ёлку паставілі прыгожую. З паперы рабілі цацкі, выхавацелі прыносілі з дому яйкі, пракалоўшы з двух бакоў, выдзімалі іх, потым размалёўва-

лі. Так нарабілі шмат рознакаляровых шарыкаў. Для нас гэта было першае свята за ўсе ваенныя гады. Аднойчы раніцай выхавацельніца зайшла ў спальню і ўсхвалявана-радасна падняла нас: «Дзеці, хуценька паднімайцеся, сёння Дзень Перамогі!». Мы нічога не зразумелі, пачалі абурацца, чаму толькі сёння? Ужо ж даўно няма фашыстаў! Потым пачалі хадзіць да шашы. Мы маглі бясконца глядзець на змораныя запыленыя твары салдат. Усе яцы вярталіся ў бок Масквы, дамоў. У кожнага з нас жыла надзея: а раптам убачым там каго-небудзь з родных (у глыбіні душы спадзяваліся на цуд, кожны чакаў свайго бацьку). Чырвонаармейцы спыняліся, называючы свае прозвішчы, пыталіся, ці ёсць сярод нас такі. І абавязкова частавалі чым-небудзь.

У маі ж 1945 года нас з Алікам перавялі ў Перавалачнянскі спецыяльны дзіцячы дом, дзе выхоўваліся дзеці-сіроты загінуўшых у вайну бацькоў. Трэба сказаць, мы не адчувалі сябе ў чымсьці абдзеленымі. Усе былі ў роўных умовах. Міпулае ў кожнага з нас таксама было аднолькавым. Гібель бацькоў за перамогу надавала нейкі асаблівы сэнс нашаму жыццю, учынкам. Самым жорсткім і крыўдным было, калі хто-небудзь называў цябе здраднікам. Гэта слова ўжывалі ў крайніх выпадках, загадзя ўсведамляючы, чым гэта пагражае ад пакрыўджанага. Класныя кіраўнікі ў школе бралі з ахвотай групы з дзіцячага дома. Мы былі больш развітымі, больш чыталі, ведалі. У вёсцы ў той час яшчэ не круцілі фільмы, а да нас прывозілі кожны тыдзень. І ў перапоўненую залу вясковых дзяцей не пускалі. «Максім Горкі» — першы фільм, які мы паглядзелі. Потым паказвалі кінафільмы «Зоя Касмадзям'янская», «Жылабыла дзяўчынка», «Слон і вяровачка». Кожны фільм горача абмяркоўвалі ў групе разам з выхавацелем. Я плакала, тры дні нічога не магла рабіць пасля фільма «Маладая гвардыя». Мы ўсе былі ўлюбёныя ў маладагвардзейцаў, імкнуліся быць падобнымі на іх на ўсім. Вывучылі біяграфіі многіх Герояў Савецкага Саюза. Шмат чыталі. Дарэчы, у дзіцячым доме была багатая бібліятэка дзякуючы нашым піянерважатым, якія ездзілі ў Мінск і праз бібкалектар адбіралі самыя-самыя цікавыя кнігі.

Не помню такіх дзяцей, каб іх нічога не цікавіла, каб яны нічым не захапляліся. Алік, мой брат, вельмі любіў маляваць. Навучыўся іграць на акардыёне. Алоўкаў не было, паперы таксама. Старэйшыя хлопчыкі, ведаючы яго захапленне, пры разгрузцы прадуктаў здымалі наклейкі з кансервавых слоікаў і «прадавалі» яму. Калі Алік казаў мне, што «сёння буду есці разам з табой», я ведала — свой абед аддаў за гэтыя наклейкі, на якіх потым маляваў. На дні параджэння яму заўсёды дарылі алоўкі і паперу. Многія дзяўчынкі дзякуючы Ядвізе Іосіфаўне Глушчэні захапіліся мастацкім рукадзеллем, навучыліся шыць, кроіць, цыраваць. Дзяўчынкі старшай групы цыравалі панчохі ўсяму дзіцячаму дому. Працавалі драматычны, харавы, музычны гурткі (Ніна Лявонцьеўна вучыла іграць на піяніна). Асабліва здольнай была Ніна Вавульская, якая потым паступіла ў Гродзенскі музычны тэхнікум.

С. І. Нарчук.

Вера Іванаўна Цэльмер, Марыя Сямёнаўна Міхалап, Ніна Аляксандраўна Комлева, Ада Мікалаеўна Палаткіна, Таццяна Рыгораўна Бляхман былі для нас прыкладам ва ўсім. Назіраючы за імі, як яны размаўляюць, адзяваюцца, трымаюцца, мы самі вучыліся гэтаму. Яны вялі з намі размовы на самыя далікатныя тэмы, рыхтавалі ў самастойнае жыццё. Дзякуючы ім у нас было выхавана пачуццё гонару, уласнай годнасці, усведамленне свайго прызначэння. Рыхтуючы ў самастойнае жыццё, яны нас навучылі літаральна ўсяму. Адзілае, да чаго не былі падрыхтаваны не толькі я, а і большасць нашых выхаванцаў,— мы не ўмелі абыходзіцца з грашыма, не ведалі, як іх размяркоўваць. Практычнасці тут абсалютна не было. Але само жыццё навучыла і выправіла гэты недахоп.

Дванаццаць гадоў пражыла я ў дзіцячых дамах. І самы дарагі перыяд у жыцці — гады, праведзеныя ў Перавалачнянскім дзетдоме. Тут мы адчувалі сапраўдны клопат і цеплыню. Хоць дырэктар дзіцячага дома быў вельмі строгі і мы яго баяліся, аднак дзякуючы яго настойлівасці і мэтанакіраванасці ў нас была дысцыпліна і парадак ва ўсім. Шмат было зроблена па ўладкаванню дзіцячага дома. І дзеці і дарослыя захапіліся развядзеннем кветак, зрабілі аранжарэю (будынак патанаў у кветках). Нам вельмі падабалася наша сталовая. У ёй стаяў сапраўдны камін, а

насупраць віселі вялікае люстэрка, гадзіннік. Тут мы асабліва любілі бываць. З пачаткам лета наш дзіцячы дом ператвараўся ў піянерскі лагер. У пачатку чэрвеня мы адкрывалі яго вельмі ўрачыста. Запальвалі касцёр, паказвалі мастацкую самадзейнасць. Да нас збягаліся дзеці з усіх навакольных вёсак. Яны таксама адчувалі свята і зайздросцілі нашай арганізаванасці, весялосці. На канікулы да нас пачыналі з'язджацца былыя выхаванцы. Сустракалі іх усім домам. Колькі было радасці! Іншы раз хадзілі сустракаць на станцыю. Яны не толькі адпачывалі ў нас, але і аказвалі вялікую дапамогу ў нарыхтоўцы дроў на зіму, у рамонце памяшканняў. Разам з намі хадзілі ў начлег.

Усю паўнату таго, што мелі і страцілі, мы да канца зразумелі, калі ў 1953 годзе згарэў ад няшчаснага выпадку наш дом. Мы ўсе горка плакалі. Дзяцей майго ўзросту перавялі ў Смальянскі дзіцячы дом. Помню першую раніцу ў новым дзіцячым доме. Аб'явілі пад'ём. Хлопчыкі і дзяўчынкі нашай групы адразу ж, не прыбіраючы ложкаў, выскачылі ў двор і на чале фізорга групы (у нас у кожнай з трох груп быў свой фізорг) без усялякай каманды пачалі рабіць ранішнюю зарадку. Гэта настолькі ўразіла ўсіх, што яны моўчкі стаялі і глядзелі на нас.

Мы вельмі сумавалі па родным дзіцячым доме. Браты і сёстры былі раз'яднаны (нас развезлі вучэбнымі групамі). Пачалі пісаць пісьмы ў розныя інстанцыі, прасілі зноў адкрыць Перавалачнянскі дзіцячы дом, прапаноўвалі сваю дапамогу ў яго адбудове. Пад Новы, 1954 год за намі прыехала машына і нас, каля 25 чалавек, адвезлі ў Пярэвалачню. Новы год правялі ў працы — чысцілі памяшканні, прыводзілі ў парадак адбудаваныя пакоі, а потым Т. Р. Бляхман чытала нам «Вія» Гогаля. Усё рабілі з вялікім уздымам і радасцю. Дзякуючы дзецям, нашым былым выхаванцам, якія таксама адгукнуліся на наша гора, многія работы па аднаўленню былі хутка завершаны. Дзіцячы дом зноў сабраў пад свой дах выхаванцаў.

...Прайшло шмат часу з тае пары, а для мяне па-ранейшаму ўсё, што звязана з гэтым дзіцячым домам,— самае светлае і дарагое...

Школа жыцця

З успамінаў В. Я. Кожара

В. Я. Кожар.

Валерый Якаўлевіч Кожар нарадзіўся ў 1934 г. ў в. Малое Гальцэва Талачынскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1955 г. Скончыў Мінскую ВПШ, аспірантуру пры кафедры палітэканоміі Беларускага політэхнічнага інстытута. Кандыдат эканамічных навук, дацэнт. Выкладчык, дэкан Мінскай ВПШ. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Жыве ў Мінску.

Напярэдадні вайны наша сям'я жыла ў Мядзелі, дзе працаваў бацька. Калі яго прызвалі ў Чырвоную Армію, маці з дзецьмі паехала на радзіму, у Малое Гальцэва. Вайна застала нас у дарозе. Некалькі разоў траплялі пад бамбёжку. З вялікімі цяжкасцямі, пагубляўшы ўсё рэчы, дабраліся да вёскі. Праз некалькі дзён а'явіліся акупанты. Яны шныралі па хатах і хлявах, цягалі курэй, свіней, тут жа іх рэзалі і варылі прама на вуліцы. Зімой прыйшоў бацька, які ўцёк з лагера ваеннапалонных. Некалькі месяцаў ён не ўставаў з пасцелі, быў такі слабы, што не мог рухацца. Калі ачуняў, пачаў збіраць зброю (яе было нямала ў навакольных лясах) і перадаваць партызанам. Збіраўся і сам ісці ў партызаны, але не паспеў — быў арыштаваны. Некалькі разоў уцякаў, яго зноў лавілі. Апошнія ўдалыя ўцёкі з лагера былі каля Варшавы. Пасля доўгага блукання па лясах сустрэў партызан. Па шчаслівай выпадковасці гэта быў дывэрсійны атрад з Гомельскага партызанскага злучэння, якім камандаваў брат бацькі І. П. Кожар. У гэтым атрадзе бацька заяваў да злучэння з часцямі Чырвонай Арміі.

Мы з маці і бабуляй жылі ў сваёй вёсцы. Амаль увесь час у ёй стаялі гітлераўцы. Баючыся партызанскіх мін, акупанты штодзень застаўлялі аднавяскоўцаў баранаваць дарогу ад вёскі да шашы. Некалькі разоў гэта даводзілася рабіць і мне. Коні цягнулі бароны, а я кіраваў імі з дапамогай лейцаў. Паводдаль ішоў немец з вінтоўкай. Абышлося без выбухаў. У суседняй вёсцы на выяўленую мі-

ну гітлераўцы сагналі ўсіх жыхароў, ад узрыву многія з іх загінулі.

Летам 1944 года наступаючыя часці Чырвонай Арміі вызвалілі нашу вёску. Адыходзячы, фашысты падпалілі некалькі дамоў. Сяляне, нягледзячы на снарады і кулі, выратавалі вёску ад агню, згарэлі толькі дзве хаты.

Грамадская гаспадарка была поўнасцю разбурана і разрабавана. Фермы і канюшні акупанты разабралі і спалілі на дровы, жывёлу вывезлі. Усё трэба было пачынаць спачатку. Помню, як маці і іншыя жанчыны пешшу за 20 кіламетраў хадзілі па насенне. Не было коней, таму жанчыны па 6—8 чалавек упрагаліся ў плуг, за якім ішлі падлеткі. Так аралі агароды. Наш сусед пасля доўгіх пакут абучыў цягаць плуг сваю карову. Іншыя, колькі ні стараліся, навучыць кароў араць зямлю не змаглі. Зямлю ўскопвалі рыдлёўкамі. Пры такой арацоўцы ўраджай быў мізэрным. Было голадна. Паступова паляпшаліся справы ў калгасе. Вельмі дапамагала гаспадарцы Коханаўская МТС. Трактар у тыя часы працаваў кругласутачна. Раслі ўраджаі. Больш важкім стаў працадзень. Не толькі збожжа і бульбу выдавалі на яго, калгас прывозіў тканіну, цукар — усё гэта размяркоўвалася на працадні. Многія дзеці ўпершыню бачылі цукар, спрабавалі яго на смак. Нягледзячы на цяжкасці, людзі працавалі ад цямна да цямна з вялікім энтузіязмам.

Колькі радасці і надзей было, калі калгас набыў першы грузавік. На яго глядзелі, як на цуда. Намнога аблегчылася праца па вывазцы ўгнаенняў, будаўнічых матэрыялаў.

Мяне выбралі сакратаром камсамольскай арганізацыі калгаса, у якой былі 24 камсамольцы. Моладзь не толькі добра працавала, але і актыўна ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці. Выступалі ў памяшканні школы ці ў чыёй-небудзь прасторнай хаце ў вёсцы. На канцэрты прыходзіла многа людзей не толькі з нашага калгаса, але і з суседніх. Наша камсамольская арганізацыя лічылася адной з лепшых у Коханаўскім раёне.

Напярэдадні прызыву ў армію мяне прынялі кандыдатам у члены КПСС. Сакратар райкома М. А. Дойлін, уручаючы кандыдацкую картку, сказаў, каб адразу пасля дэмабілізацыі прыбыў у райком. «Рыхтуй сябе да будучай работы ў апараце райкома партыі»,— сказаў ён. Так яно і атрымалася. Праз два гады ўвосень 1956 года я быў зацверджаны інструктарам райкома па зоне Коханаўскай МТС. Вопыту партыйнай работы не было, ведаў таксама нямнога. З чаго пачынаць сваю работу? Пачаў са знаёмства з партыйнымі арганізацыямі, якія былі вельмі малалікімі, па 3—7 чалавек. Маладых людзей у іх амаль не было, і істотнага ўплыву на калгасныя справы яны не рабілі. Трэба было ўзнімаць ролю партыйнай арганізацыі, расціць партыйныя кадры не толькі колькасна, але і якасна, пацаўняць яе рады лепшымі людзьмі. У тыя часы інструктар райкома КПБ амаль увесь час быў у калгасах. Я і кватараваў у калгасе імя Валадарскага. У райком ездзілі на пленумы, нарады, на бюро — калі было пытанне па маёй зоне. Але гэта было не так часта. Не абцяжараны быў тады інструктар пісанінай шматлікіх даведак і справаздач. Гэта дазваляла яму добра ведаць становішча ў гаспадарцы, асабістыя і дзелавыя якасці не толькі камуністаў, але і многіх калгаснікаў, прымаць самы непасрэдны ўдзел у рашэнні кадравых пытанняў. З думкай інструктара райкома лічыліся, і калгаснікі часта звярталіся да яго па самых розных пытаннях. Такое давер'е радавала і да многага абавязвала.

У канцы 1955 года Коханаўскі раён быў расфарміраваны, і калгасы нашай зоны адышлі да Талачынскага раёна. Узначаліў тады Талачынскую раённую партыйную арганізацыю М. І. Пагарскі. Знешне гэта быў суровы і немпагаслоўны чалавек. Але ён быў заўсёды ўважлівы і чулы да людзей, валодаў вялікім жыццёвым вопытам, добра ведаў людзей і карыстаўся вялікім аўтарытэтам. Пад яго кіраўніцтвам апарат райкома працаваў дружна і зладжана. Не магу не ўспомніць добрым словам другога сакратара райкома І. В. Самуйлава. Ен быў інвалідам вайны, але працаваў не менш за іншых. Да яго заўсёды можна было зайсці ў кабінет, абмеркаваць хвалюючую праблему, параіцца па любому пытанню. Гэта быў душэўны чалавек, з добрымі аратарскімі здольнасцямі.

Я з вялікім задавальненнем успамінаю час работы ў Талачынскім райкоме партыі, дзе прайшоў добрую жыццёвую школу, патрабавальную і строгую.

На шляху да ведаў

Паводле перапісу 1897 г., у Сенненскім павеце, куды ўваходзіла значная частка тэрыторыі сучаснага Талачынскага раёна, пісьменных было толькі 11,9 %. Першая школа ў Талачыне заснавана Львом Сапегам у 1604 г., займаліся ў ёй дзеці заможных грамадзян. Пазней адкрыта некалькі школ граматы з тэрмінам навучання 1—2 гады для дзяцей

беднякоў, у асноўным хлопчыкаў. Першае аднакласнае народнае вучылішча пачало працаваць ў 1863 г. ў Старым Талачыне, сялянскае таварыства выдзеліла на яго ўтрыманне 200 рублёў. У 1878/79 навучальным годзе тут вучылася 29 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі. У 1869 г. адкрыта Зарэчна-Талачынскае народнае вучылішча, на яго патрэбы мясцовае сялянскае таварыства выдзяляла ў год усяго 55 рублёў. У Талачыне і навакольных мястэчках было некалькі царкоўна-прыходскіх школ, хедараў, двухгадовыя земскія школы ў Плящыўцах (цяпер в. Зялёная) і Падбярэзі. У 1889 г. «Могилёвские епархиальные ведомости» паведамлялі, што ў Навасельскім прыходзе колькасць душ 1670, навучэнцаў 15 на 111 чалавек. У в. Прудзец заняткі з вучнямі праводзяцца ў хатах іх бацькоў па чарзе, настаўнікам працуе адстаўны радавы Стафан Бярнадскі, атрымлівае па 50 капеек у месяц, стол ад бацькоў навучэнцаў; вучняў 4 хлопчыкі, колькасць душ у прыходзе — 2101, 1 навучэнец на 116 чалавек.

У 1896 г. на Талачыншчыне на 100 дзяцей школьнага ўзросту прыпадала 12 вучняў, у 1897 г. было 31,6 % пісьменных мужчын і 3 % жанчын, сярод мужчын 3,5 % мелі адукацыю вышэй пачатковай, сяляне складалі 19 % ад усіх пісьменных. На патрэбы адукацыі царская казна вылучала мізэрныя сродкі, не хапала падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, навучанне было платнае. У 1896 г. на ўтрыманне настаўнікаў, вучэбныя дапаможнікі, гаспадарчыя патрэбы ў Старым Талачыне было выдзелена ўсяго 226 рублёў. Большасць школ знаходзілася на ўтрыманні сялянскіх абшчын, з-за недахопу сродкаў многія закрываліся. Узровень ведаў, якія давала дарэвалюцыйная школа, быў вельмі нізкі. Тут вывучалі гісторыю Старога і Новага запаветаў, катэхізіс, царкоўныя спевы, часаслоў, царкоўна-славянскую, рускую мовы, азы арыфметыкі. Часам настаўнікамі працавалі валасныя пісары, паўпісьменныя адстаўныя салдаты. Але былі выключныя выпадкі. 25 гадоў службы настаўнікам у Коханаве Іван Рыгоравіч Антонаў. Перадавы чалавек свайго часу, пераканаўны атэіст, педагог, ён усё рабіў, каб яго вучні авалодвалі ведамі. Дзякуючы яму Коханаўскае двухкласнае народнае вучылішча стала адным з лепшых сярод падобных навучальных устаноў Магілёўскай губерні. 16 студзеня 1911 г. Антонаў прысутнічаў на сходзе прыхаджан, дзе абмяркоўвалі пытанне аб зборы сродкаў для расшырэння храма. Ён выступіў і сказаў, што духавенства бярэ сродкі толькі з прыхаджан, хоць у Сінода на будаўніцтва цэркваў ёсць дзесяткі мільёнаў рублёў. Пасля гэтага сяляне адмовіліся даваць грошы. Іван Рыгоравіч ніяк не садзейнічаў мясцоваму свяшчэнніку ў школьных справах. Вучні не без уплыву Антонава ўхіляліся ад наведвання ўрокаў закона божага і царквы. Мясцовыя ўлады былі незадаволены яго дзейнасцю і перавялі ў Руднянскае двухкласнае вучылішча. Коханаўскія сяляне выступілі ў абарону настаўніка. У пісьме ў Магілёўскі вучылішчны савет яны прасілі вярнуць яго ў Коханава, бо Іван Рыгоравіч за час службы ў Коханаўскім вучылішчы навучыў дзяцей агародніцтву, садоўніцтву, адкрыў пры вучылішчы два рамесныя класы — сталярны і слясарны, не ведаюць яны, хто з настаўнікаў працаваў бы для народа так добрасумленна, як Іван Рыгоравіч Антонаў. Пад пісьмом стаяла 312 подпісаў. Гэты выпадак як нельга лепш сведчыць аб імкненні людзей працы да адукацыі, аб тым, якім цяжкім быў шлях простага чалавека да ведаў.

Вялікія змены ў развіцці народнай адукацыі адбыліся на Талачыншчыне за гады Савецкай улады. У 1987 г. ў раёне было 9 пачатковых, 11 васьмігадовых, 14 сярэдніх школ, у якіх займалася 5,5 тыс. вучняў, з іх 2,5 тыс. ў сельскай мясцовасці. Створана 56 груп падоўжанага дня, іх наведвае больш за 1,7 тыс. дзяцей, каля 400 вучняў жывуць у 14 прышкольных інтэрнатах. Працуе 550 настаўнікаў, 8 % маюць вышэйшую педагагічную адукацыю. Праца многіх з іх высока адзначана дзяржавай. 17 работнікаў асветы ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР, 19 — Граматамі Вярхоўнага Савета БССР, 15 прысвоена ганаровае званне заслужанага настаўніка БССР: Р. Г. Бейненсону — дырэктару Славенскай сярэдняй школы, С. П. Драгоўскаму — былому дырэктару Слаўненскай сярэдняй школы, І. І. Жураўскаму — былому дырэктару Талачынскай СШ № 1, В. Ф. Альшэўскай, М. І. Жураўскай, Т. М. Краўцовай, К. М. Пятровіч, Н. І. Сінскай, А. Л. Шатраўко — былым настаўніцам Талачынскай сярэдняй школы № 1, В. І. Клімовічу — настаўніку Коханаўскай сярэдняй школы, Г. І. Лыловай — былой настаўніцы Талачынскай сярэдняй школы № 2, М. Я. Мікульчык — настаўніцы Талачынскай сярэдняй школы № 2, В. Д. Сёмачкіну — загадчыку фільматэкі Талачынскага аддзела народнай асветы, 5 узнагароджаны значком «Выдатнік асветы СССР», 64 — «Выдатнік народнай асветы».

На прыкладах некаторых школ прасочваецца стан адукацыі ў раёне.

Талачынская сярэдняя школа № 1 заснавана ў 1935 г. Сучасны будынак пастаўлены ў 1957 г. Мае інтэрнат на 40 месцаў для вучняў з навакольных вёсак, гурткі па інтарэсах: тэхнічнай творчасці, ваенна-прыкладны, спорту, турысцкі, вязання, харавы, фотасправы і

іншыя, клуб інтэрнацыянальнай дружбы «Глобус».

Працуе 45 настаўнікаў і выхавацеляў. Апорная школа раёна па некалькіх кірунках вучэбна-выхаваўчай работы. У 1945—1976 гг. дырэктарам школы працаваў заслужаны настаўнік БССР І. І. Жураўскі. У розныя гады школу скончылі Л. А. Навумава — Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня калгаса імя У. І. Леніна Талачынскага раёна, І. І. Аскерка — галоўны металург аднаго з заводаў у Маскве, узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, А. Л. Рымкевіч — інструктар ЦК КПСС, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, кандыдат тэхнічных навук Я. І. Сакалоўскі, вядомы хірург, намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскай бальніцы 4-га Галоўнага ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя БССР В. А. Ржэуцкі і інш.

Коханаўская сярэдняя школа існуе з 1868 г. Адкрыта ў доме валаснога праўлення як аднакласнае народнае вучылішча. Спецыяльны будынак пастаўлены арцеллю дойлідаў на чале з Канстанцінам Васілевічам Былінскім. На 1.1.1869 г. тут вучылася 29 хлопчыкаў, у 1876 г.— 37 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі, у 1898—1899 гг.— 124 хлопчыкі і 22 дзяўчынкі. З 1900 г. двухкласнае народнае вучылішча, мела кавальскую, сталярную і слясарную майстэрні. Пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі называлася школай 1-й, 2-й ступеней, з 1928 г.— сямігадовая, з 1932 г.— сярэдняя. У 1925—1927 гг. пабудаваны 2-павярховы будынак школы. У Вялікую Айчынную вайну разбурана, адноўлена ў 1950-я гады. У 1971 г. пастаўлены сучасны шматпавярховы будынак. Мае вучэбныя кабінеты, спартыўную, актавую залы, планетарый, музей, дзе сабраны матэрыялы, прысвечаныя жыццю і дзейнасці У. І. Леніна, выпускнікам школы паэту І. Батраку, Героям Савецкага Саюза І. П. Кожару, Ф. Я. Макавецкаму, П. Ф. Сычэнку, Я. М. Целешаву, воінам Чырвонай Арміі і партызанам, якія вызвалялі Талачыншчыну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У розныя гады школу скончылі Н. У. Масалкоў — старшыня Разанскага губвыканкома і губсаўнаргаса, народны мастак СССР М. А. Савіцкі, беларускі савецкі драматург, заслужаны работнік культуры БССР А. Л. Петрашкевіч, кандыдаты навук В. Я. Кожар, І. С. Рымкевіч і іншыя.

Адна са старэйшых школ раёна — Варанцэвіцкая. Навучанне пісьменнасці ў Варанцэвічах пачалося ў 1876 г., калі настаўнік па прозвішчу Козел вучыў дзяцей на прыватных кватэрах. У 1884 г. адкрыта 3-класная царкоўна-прыходская школа пры Петрапаўлаўскай царкве, з 1900 г. школа размяшчалася ў асобным будынку. Тут вучыліся дзеці з вёсак Багрынава, Дуброўскія, Жукнева, Максімкава і іншых, усяго 40—50 чалавек, настаўнікам быў Фёдар Тарасавіч Чахоўскі. У 1907 г. ў Варанцэвічах пабудаваны спецыяльны тыпавы будынак 4-класнай школы з кватэрай для настаўніка. З 1939 г. школа стала васьмігадовай, з 1948 г.— дзесяцігадовай. Вядзецца мэтанакіраваная работа па падрыхтоўцы вучняў для паступлення ў педагагічныя вучылішчы і інстытуты. Пры школе створаны ансамбль народных інструментаў, агітбрыгада, гісторыка-краязнаўчы музей, у якім сабраны матэрыялы па раскопках старажытнага Друцка, мінуламу і сучаснаму калгаса «Камсамольская праўда», па Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Талачынскага раёна, гісторыі школы і інш. Працуюць 19 настаўнікаў.

У розныя гады школу скончылі авіяканструктар генерал М. М. Сімановіч, доктар медыцынскіх навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР М. Д. Князеў, кандыдаты навук Д. П. Бельчык, Р. А. Карніловіч, Э. А. Карніловіч і іншыя.

Добрай славай карыстаецца Валосаўская сярэдняя школа, заснаваная ў 1876 г. Некалькі разоў перабудоўвалася, у 1985 г. пастаўлены сучасны будынак. Мае радыёвузел, 12 вучэбных кабінетаў, спартыўную, актавую, танцавальную залы, бібліятэку, сталовую, вучэбна-доследны ўчастак, цяпліцу, парнікі, зімовы сад. У вучэбна-выхаваўчай рабоце шырока выкарыстоўваюцца дыяпраектары, кінааппараты, магнітафоны, відэамагнітафон, тэлевізары. Круглы год працуе вучнёўская вытворчая брыгада, у спецыяльна абсталяваным кабінеце вядуцца заняткі па асновах агратэхнікі, на плошчы 65,5 га вырошчваюцца бульба, лён, агародніна, па заданнях аграномічнай службы калгаса імя Мічурына вядзецца доследная работа, вынікі доследаў укараняюцца ў сельскагаспадарчую вытворчасць. На базе вучнёўскай вытворчай брыгады ў летні час працуе лагер працы і адпачынку «Юнацтва». У 1975 г. заснавана школьнае лясніцтва, якое праводзіць доследы па заданню вучоных Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі, Цэнтральнага батанічнага саду і Інстытута эксперыментальнай батанікі АН БССР па тэме «Вывучэнне раслінных згуртаванняў». Шмат выдумкі і намаганняў прыклалі вучні і педагагічны калектыў школы, каб стварыць прыгожы казачны гарадок у двары школы. Дзейнічаюць турысцкі клуб «Ветразь», шматлікія гурткі па інтарэсах, танцавальная студыя «Рытм», секцыі класічнай барацьбы, картынга, валейбола, аэробікі. Працуюць 17 настаўнікаў. Сярод былых выпускнікоў школы 8 кандыдатаў

навук, 34 афіцэры Савецкай Арміі, 68 настаўнікаў.

Педагогі і выхавацелі школ упаўнена ажыццяўляюць палітыку КПСС па навучанню і камуністычнаму выхаванню падрастаючага пакалення, фарміруюць актыўную жыццёвую пазіцыю, рыхтуюць юнакоў і дзяўчат да самастойнага жыцця і працы. *А. А. Шнэйдар.*

Жураўскія: патрыёты і працаўнікі

І. Г. Жураўскі.

Я. І. Жураўская.

Усе яны з вёскі Янава, нарадзіліся на зямлі талачынскай — шэсць братоў: Канстанцін, Мікалай, Казімір, Аркадзь, Іван, Васіль. Іх бацькі — Яфімія Іванаўна і Іосіф Герасімавіч Жураўскія. Кожны з іх пакінуў свой след на роднай зямлі. У гады ліхалецця і ў мірную часіну. Вяртацца ў родны дом, як бы ні раскідаў лёс, стала патрэбай. Бо тут карані іх бацькоў, адсюль узляталі яны самі, набіралі вышыню на ўзмужнелых крылах.

«ВУЧЫЦЕСЯ, ДЗЕТКІ!»

Увайшоўшы ў хату, Іван зняў зрэбную сумку з кніжкамі і адразу пайшоў да стала, на якім стаяла міска з гарачым бульбяным супам, забеленым малаком. Праўда, Іван трохі перакусіў, калі ішоў у школу, а цяпер вось зноў есці захацелася. Хлопчык прымасціўся побач з малодшым братам. Пачаў есці — і адразу пацяплела. Холадна на дварэ, зіма выдалася завірушная. Не дайшлі яны, вучні, сёння да Няклюдава. Выйшлі за вёску, а там дарога занесена, завіруха гуляе, вецер шалее. На дарозе — ані следу. Парашылі: не пойдзем. Вярнуліся дадому.

Бацька моўчкі паглядаў на сына, пакуль той не скончыў снедаць. Іван адчуваў на сабе яго погляд і баязліва прамовіў:

— Дарогу замяло. Усе не пайшлі... І я таксама...

— Зараз жа ў школу! Каб праз пяць хвілін я цябе тут не бачыў!

— Дык я ўжо спазніўся на першы ўрок,— прасіўся Іван.

— На другі прыйдзеш!

Тон бацькі не дапускаў пярэчання.

— Апраніся цяплей, сынок,— уставіла сваё слова маці.

У гэты дзень Іван адзін з янаўцаў быў на занятках.

...У бацькі Іосіфа Жураўскага — Герасіма, акрамя дачок, былі чатыры сыны, а зямлі — небагата. А падзялі яшчэ на чатырох — колькі яе будзе! І рашыў вучыць малодшага, Іосіфа. Можа, якім іншым шляхам хлеб здабываць ён будзе. Але нялёгкая была гэта справа. Не было яшчэ такога, каб дзяцей вучыць грамаце, школы толькі адкрываліся.

У «Могилёвских епархиальных ведомостях» за 1888 год паведамляецца, напрыклад, што ў Няклюдаўскім прыходзе ў вёсцы Янава працуе «школа пісьменнасці», «размяшчаецца яна ў наёмным памяшканні, настаўнікам з'яўляецца селянін Іван Хлусевіч, атрымлівае па 3 рублі 50 капеек у месяц і стол ад бацькоў вучняў, навучаецца 8 хлопчыкаў. Колькасць душ у прыходзе — 1502; адзін вучань на 187 чалавек». Пазней была адкрыта царкоўна-прыходская школа ў Няклюдаве, куды тры зімы і хадзіў Іосіф Жураўскі. Пасля гады два вучыўся ў Расне. Меў ахвоту да вучобы, але болей вучыцца не давялося. Павёз бацька яго ў Бобр, дзе было вучылішча, што рыхтавала настаўнікаў пачатковай школы. Прыйшоў туды Іосіф у лапцях. З ім нават размаўляць не сталі, аддалі дакументы назад, маўляў, лапцюжнікаў ім не трэба...

Але працу нейкую знайсці трэба было. І паехаў Іосіф у Піцер. Розную работу давялося рабіць: развозіў сыры ў купца, быў дворнікам. Абрыдла ўніжацца, плюнуў на такую працу і вярнуўся ў родную вёску. Працаваў на гаспадарцы, потым у салдаты забралі. Руска-японская вайна. Раненне, з год пракачаўся ў шпіталі. Дэмабілізаваўся. Неўзабаве ажаніўся. А там зноў вайна, акопы, смерць. Потым рэвалюцыя, Грамадзянская вайна. Калі Іосіф вярнуўся з фронту, яшчэ жылі аднаасобна. Сям'я вялікая — шэсць сыноў. Зямлі ўсяго чатыры з паловай дзесяціны. Паспрабуй пракарміць восем едакоў. Але Іосіф рашыў вучыць сыноў. Не давялося самому здабыць большай навукі, можа, дзецям пашчасціць. Ды і новая ўлада клапацілася, каб даць магчымасць далучыцца да ведаў. І Іосіф рабіў усё, каб сыны выйшлі ў людзі. Таму і не мог дапусціць бацька, каб Іван хоць адзін раз не пайшоў у школу.

— Вучыцеся, дзеткі! — заўсёды паўтараў Іосіф Герасімавіч. І гэту запаведзь бацькі нікто не смеў парушыць.

У сям'і не было дзяўчат (нараджаліся, але былі недаўгавечныя, «бог забіраў»). Таму ўсю «жаночую работу» навучыліся рабіць хлопцы. Яны і мужчынскую таксама рабілі спраўна: трэба што па сталярству, калі ласка — такую раму, такія дзверы зробяць, адна любата. Цэбрык ці начоўкі, што выходзілі з-пад рук братоў,— акуратныя, прыгожыя.

І вучыліся сыны добра. Старэйшы, Косця, скончыў у Талачыне школу калгаснай моладзі, потым Барысаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Працаваў у райза, а пасля арміі, перад вайной, узначальваў Лепельскую школу калгасных кадраў і выкладаў там заатэхнію. Тут, на Лепельшчыне, перад вайной працаваў і Іван Іосіфавіч пасля заканчэння Магілёўскага педінстытута. Пазней перавялі яго ў вёску Камень, і ён да сябе забраў малодшых братоў Васіля, Мікалая, а пазней — Аркадзя і Казіміра. Яны вучыліся тут, жылі ў старэйшага брата. Усё бацькам лягчэй было.

Ішлі гады. Васіль таксама пайшоў на свой хлеб, працаваў землеўпарадчыкам. Радаснай чакалася будучыня ў сям'і Жураўскіх. Ужо трое сыноў моцна сталі на ногі. І грошай часам прыплюнь, і малодшых братоў падтрымліваюць. Летам, калі збяруцца, бывала, у час канікул, не змаўкаюць у хаце Жураўскіх смех, жарты, грае патэфон. Міжволі прыпыніцца каля іх хаты, пазайздросціш гэтай вялікай дружнай сям'і. А якія хлопцы павырасталі!

У ЛІХУЮ ГАДЗІНУ

Нахлынула бяда — пачалася вайна. Цяжкае, горкае адступленне. Здавалася, усё рушылася. Стомленыя, запыленыя адыходзілі на ўсход байцы. Часам заходзілі ў хаты, прасілі есці. Балюча было глядзець на ўсё гэта. У адзін такі ліпеньскі дзень заскочыў дамоў старэйшы сын Канстанцін. Пераначаваў і адправіўся ў далёкую дарогу. На развітанне бацькам сказаў: «Пабачыце — мы пераможам!».

А ў вёску хутка прыйшлі немцы. Бацькі бедавалі — дзе Іван, Васіль, якія служылі перад вайной у арміі. Але неўзабаве прыйшлі яны дамоў. Іван з'явіўся схуднелы, зарослы, з параненай нагой. Маці нават адразу не пазнала яго. Пазней прыйшоў Васіль. Хлопцы захавалі ўласны прыёмнік і слухалі Маскву, запісвалі зводкі Саўінфармбюро і перадавалі надзейным людзям. Збіралі па лясах зброю, ведалі — спатрэбіцца. У іх было 2 кулямёты, 12 вінтовак, дзве скрыні гранат. Па іх прыкладу дасведчала і вясковая моладзь. Вясной 1942 г., калі паявіліся партызанскія групы, Жураўскія наладзілі сувязь з гудкоўцамі, што стаялі паміж Япавам і Узносным. Перадалі ім кулямёт, частку вінтовак, скрынку гранат, патроны, рыхтавалі моладзь да адыходу ў лес. І вось у пачатку лістапада пяць братоў Жураўскіх сталі партызанамі і прывялі з сабой у атрад яшчэ шэсць аднавяскоўцаў. Ва ўсіх была зброя. Ужо на трэці дзень свайго партызанскага жыцця адзін з Жураўскіх, Васіль, у групе падрыўнікоў на чале з камісарам 1-га атрада Фінагеевым адправіўся на дыверсію. Недалёка ад станцыі Відэршчына народныя мсціўцы пусцілі пад адхон варожы эшалон, які ішоў па ўсход. Брыгада расла. Услед за янаўцамі прыйшлі дзевяць чалавек з Равяціч, восем — з Узноснага. Каля трыццаці хлопцаў і мужчын прывёў у брыгаду Якаў Фёдаравіч Рукаль з Няклюдава. Раней да партызан далучыліся Аляксандр Яўсеенка, Стась Падбярэзскі, Іра Янкоўская. Пётр Шныркевіч, тры браты Падаляцкія, два браты і сястра Дунаевы. Усе яны былі з навакольных вёсак. Не хапала зброі, узрыўчаткі, толу. Частку моладзі паслалі за фронт здабываць усё гэта. Сярод іх было чацвёра Жураўскіх. Але лінію фронту перайсці не ўдалося — Віцебскія «вароты» былі закрыты. Група вярнулася ў брыгаду.

...«Толькі б паспець!» — думаў Іван Жураўскі, прабіраючыся з кулямётам па ўскрайку лесу. Побач, правальваючыся ў снег, беглі яго таварышы. Яны былі ў Няклюдаве. Хацелі вярнуцца ў лагер, як раптам прыбег чалавек з суседняй вёскі Мікуліна і паведаміў, што там гаспадараць фашысты. Рашэнне было адно: напасці на рабаўнікоў. Засаду зрабілі ў ляску паміж Мікулінам і Жакамі.

Калі партызаны выбеглі на ўскраек лесу, то ўбачылі, як па дарозе фурманкі ўсё больш аддаляліся ад іх. На санках сядзела па дватры фашысты. Спазніліся... Што рабіць? Рашылі ўдарыць наўздагон. Грымнулі залпы, загрукатаў кулямёт. У абозе пачалася паніка. Напалоханыя коні рванулісяў бакі і панесліся па снежным полі. Партызаны адбілі абоз. Асабліва смела дзейнічаў кулямётчык Іван Жураўскі.

У баі каля Гарадзішча, калі 2-гі атрад нарваўся на нямецкую засаду, выключную вытрымку і мужнасць паказаў Васіль Жураўскі. Фашысты — іх было каля паўтары сотні — сустрэлі партызан лоб у лоб. Яны займалі больш выгадную пазіцыю. Васіль доўгай кулямётнай чаргой адцягнуў увагу на сябе і даў магчымасць адысці атраду, а потым, праявіўшы хітрасць, адышоў і сам.

Люта змагаліся браты Жураўскія з ворагам. Іван спачатку камандаваў узводам, потым стаў намеснікам камісара брыгады па

К. І. Жураўскі.

камсамолу. Васіль — кулямётчык, потым яго перавялі ў атрадную разведку. Мікалай, намеснік камісара атрада па камсамолу, і Аркадзь займаліся падрыўной справай. Падрыўнікі выкарыстоўвалі любую магчымасць, каб паднесці «пачастунак» фашыстам. Аднойчы ў лесе каля Янава выпадкова спаткаліся браты Мікалай і Аркадзь — падрыўнікі дзвюх самастойных груп. Хлопцы даведаліся: праз Янава толькі што праехалі немцы. Будуць вяртацца назад. Рашылі паміж Янавам і Манастыром паставіць міну. Але зрабіць гэта было не проста: немцы баранавалі дарогу, прастуквалі яе спецыяльнымі качулкамі. Акуратна выразаўшы след ад нямецкага чаравіка, побач з вялікай лужынай хлопцы выбралі зямлю і паставілі міну. Зверху паклалі слой зямлі са следам. Хітрасць удалася — адзін фашыст быў забіты, двое паранены.

Так, смерць падсцерагала захопнікаў на кожным кроку. І ў гэтай суровай схватцы не раз удзельнічалі браты Жураўскія. Аднаму з іх, Казіміру, ітоў толькі пятнаццаты год...

КАМУНІСТЫ

«...Сяргей! Што будзе са мной далей, не ведаю, але запэўніваю цябе, як брата і друга, што пакуль буду жывы, буду няшчадна граміць і знішчаць праклятую немчуру, буду помсціць за нашу Беларусь, за сваю сям'ю, за любімую жонку, за пралітую кроў. Літасці гадам ад мяне не будзе ніколі. Прашу пісаць мне часцей пра ўсё-ўсё падрабязна. Я буду адказваць па магчымасці, бо тут не заўсёды можна адказаць... Жадаю ўсяго найлепшага.

З прывітаннем

твой брат Косця».

Гэта пісьмо Канстанцін Жураўскі напісаў свайму дваюраднаму брату Сяргею Ананевічу. Далей скупыя радкі паведамляюць, што 20 верасня 1942 года Канстанцін закончыў сваю вучобу ў вайсковым вучылішчы, «атрымаў прызначэнне і ваюе па новай спецыяльнасці». Быў паранены асколкам у галаву і не пакінуў поля бою. Камуніст Канстанцін Жураўскі не дайшоў да роднай Беларусі — у 1943 годзе загінуў на Калінінскім фронце. Аднак моцна трымалі зброю ў руках яго браты-партызаны. І сімвалічна, што ў год геройскай гібелі брата ў рады камуністаў уступіў Іван. А ў пасляваенны час камуністамі сталі Аркадзь, Казімір, а потым і Васіль.

Дарагой цаной заплаціла за свабоду сваёй радзімы сям'я Жураўскіх — старэйшы з братоў Канстанцін загінуў на фронце, Іван, Мікалай, Аркадзь былі паранены. У 1945 годзе не стала Іосіфа Герасімавіча: далі адчуць сябе перажыванні, пястача, блуканне па лясах — фашысты люта праследавалі партызанскія сем'і.

Цяжкімі былі першыя пасляваенныя гады. Руіны, папялішчы... Было і голадна, і холадна. Але гора не скарыла людзей. Прагна хапелася мірнага жыцця. Пачалося аднаўленне. Іван Іосіфавіч узначаліў сярэднюю школу ў Талачыне, выкладаў гісторыю. Васіль стаў працаваць у меліярацыі. Мікалай, Аркадзь і Казімір вучыліся ў Мінску.

Прайшлі гады вучобы, і вось ужо малодшыя Жураўскія ўліліся ў шарэнгі працаўнікоў. Стаў педагогам Мікалай, будаўніком Казімір.

...Пяцёра братоў. Пяцёра дружных працавітых людзей, паважаных і вядомых на сваёй роднай зямлі. Іван Іосіфавіч быў членам савета райана, кіраваў секцыяй дырэктараў школ раёна, вёў семінар прапагандыстаў па гісторыі КПСС пры райкоме партыі. Доўгі час быў намеснікам старшыні праўлення таварыства «Веды», дэпутатам гарсавета.

Імем камуніста Васіля Іосіфавіча Жураўскага, інжынера меліярацыйна-эксплуатацыйнага ўчастка, што абслугоўвае Талачынскі раён, адкрываецца Кніга гонару Заходнедзвінскага міжраённага ўпраўлення асушальных сістэм.

Самы малодшы, Казімір Іосіфавіч, працаваў у Карэлічах будаўніком (на вялікі жаль, рана абарвалася яго жыццё). І, нарэшце, Аркадзь Іосіфавіч — вучоны.

ПУЦЯВІНАМІ НАВУКІ

Калі чалавек недасведчаны пазнаёміцца з дзейнасцю Аркадзя Іосіфавіча, можа падумаць, што Жураўскі нарадзіўся, як кажуць, «у кашулі». Ва ўсім яму шанцуе, усё яму даецца лёгка. Сапраўды, у 1950 годзе пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта накіравалі ў аспірантуру пры Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР. Праз

тры гады ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1968 — доктарскую. У 1970 ён — прафесар, у 1978 прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі БССР. У 1980 годзе выбраны членам-карэспандэнтам АН БССР.

З 1960 года і да апошняга часу Жураўскі загадвае сектарам гісторыі беларускай мовы. У 1974 годзе прызначаны намеснікам дырэктара па навуковай рабоце, а з 1983 — дырэктарам Інстытута мовазнаўства АН БССР. Не простым быў гэты шлях. За ім — напружаная карпатлівая, мэтанакіраваная, сістэматычная праца.

Каму даводзілася бываць на кватэры ў Аркадзя Іосіфавіча, той не мог не заўважыць, што гаспадар пастаянна за працай, кожны дзень. Выхадных дзён у яго проста няма...

Выключная працавітасць, мэтанакіраванасць, эрудыцыя, дасведчанасць, высокая адказнасць за напісанае і сказанае — адметныя рысы вучонага Жураўскага.

Пайпоў чацвёрты дзесятак гадоў, як А. І. Жураўскі працуе на ніве беларускага мовазнаўства. Ён аўтар ці сааўтар больш як 160 навуковых прац. Удзельнічаў у напісанні такіх капітальных прац, як «Нарысы па гісторыі беларускай мовы», «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Марфалогія» (абедзве 1957), «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» (ч. 1—2, 1961—62), «Руска-беларускі слоўнік грамадска-палітычнай тэрміналогіі» (1970). Пад кіраўніцтвам А. І. Жураўскага і пры яго ўдзеле напісаны і выйшлі з друку «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы» (т. 1—2, 1967—68), «Гістарычная лексікалогія беларускай мовы» (1970), «Гістарычная марфалогія беларускай мовы» (1979) і шэраг іншых. А. І. Жураўскі — рэдактар больш як 20 буйных навуковых прац.

Гісторыя беларускай літаратурнай мовы, сучасная беларуская літаратурная мова, гістарычная граматыка, лексікалогія і лексікаграфія, сувязь беларускай мовы з іншымі славянскімі мовамі, гісторыя беларускага мовазнаўства — вось асноўныя кірункі навуковых даследаванняў вучонага. Дыяпазон яго навуковых пошукаў шырокі. І ўсё ж асноўная ўвага вучонага сканцэнтравана на вывучэнні гісторыі роднай мовы. Ён прасачыў станаўленне яе жанрава-стылявых разнавіднасцей, на канкрэтным матэрыяле прааналізаваў мову Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага і іншых дзеячаў культуры мінулага.

А. І. Жураўскі — галоўны рэдактар «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» (выйшла ў свет ужо 8 выпускаў, мяркуецца выдаць каля 30), першага слоўніка роднай мовы такога тыпу. Ён задумаў яго, распрацаваў прынцыпы падрыхтоўкі, выпісаў са старажытных помнікаў для картатэкі слоўніка больш за 140 тысяч картак.

Як кожны сапраўдны вучоны, ён клапоціцца пра змену, пра тых, хто нанясе эстафету навуковых дасягненняў далей. Пад кіраўніцтвам Жураўскага дванаццаць аспірантаў і саіскальнікаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Чытаў ён лекцыі ў шэрагу ВНУ рэспублікі, а ў 1959—60 гг. працаваў на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, дзе чытаў асноўны цыкл дысцыплін па беларускаму мовазнаўству.

З 1971 г. Аркадзь Іосіфавіч Жураўскі — член Міжнароднай камісіі па славянскіх літаратурных мовах, актыўна ўдзельнічае ў яе пасяджэннях. Не раз выступаў з дакладамі на міжнародных з'ездах славістаў. З 1986 г. Беларускі камітэт славістаў працуе пад яго старшынствам.

Браты Жураўскія (злева направа): Міхалай, Казімір, Аркадзь, Іван, Васіль.

Ён — старшыня навуковага савета Акадэміі навук БССР па праблемах мовазнаўства, старшыня спецыялізаванага савета па абароне доктарскіх дысертацый па беларускаму і славянскаму мовазнаўству, старшыня тэрміналагічнай камісіі пры Аддзяленні грамадскіх навук АН БССР, адказны рэдактар штогодніка «Беларуская лінгвістыка» (з 1984). Жураўскі усё, за што ён бярэцца, робіць добрасумленна і сур'ёзна. Гэтак жа сур'ёзна адносіцца вучоны і да грамадскай работы. Ён — член партбюро інстытута, старшыня савета ветэранаў вайны Акадэміі навук, старшыня секцыі ваенна-шэфскай камісіі пры аддзяленні грамадскіх навук. Часта Аркадзь Іосіфавіч выступае перад моладдзю з успамінамі пра гады змагання з фашысцкімі захопнікамі, напісаў кнігу партызанскіх успамінаў «За родныя хаты» (1974).

Нараджаюцца новыя планы, задумы... Ад іх з'яўлення да ўвасаблення ў жыццё шлях бывае нялёгкі. Але гэта не палохае даследчыка: працавітасці і мэтанакіраванасці ў яго хапае...

У. Б. Захарэвіч.

Бацька паэта

Е. А. Панчанка.

І. М. Барадаўка.

Емяльян Арцёмавіч Панчанка нарадзіўся ў 1888 г. у в. Гідэйкі Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці ў беднай сялянскай сям'і. Член КПСС з 1918 г. Жыў на станцыі Талачын. Удзельнік 1-й сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У 1942—1944 гг. сувязны партызанскага атрада брыгады «Чэкіст» па гораду і станцыі Талачын. Пасля вайны працаваў у лясгасе. З 1950 г. на пенсіі. Памёр у 1975 г. Нарыс аб ім напісаны журналістам Б. Фірштэйнам у 1968 годзе.

...Людзі клапатліва збіраюць кожнае новае сведчанне аб выдатных прадстаўніках народа, а вядома, што блізкія ім асобы ведалі і ведаюць аб сваіх славутых родзічах сапраўды нямала. Менавіта гэта цікавасць кіравала мною, калі я даведаўся, што на станцыі Талачын жыве Емяльян Панчанка — бацька вядомага беларускага савецкага паэта Пімена Панчанкі.

Першае ўражанне, калі мы сустрэліся, да чаго ж падобны! І другое: дзе той васьмідзесяцігадовы стары, якога я меўся ўбачыць? Каржакаваты, рухавы, з выразнымі жывымі вачыма, ён здаваўся мне чалавекам пажылым, але ніяк не тым старым, якіх мы звычайна ўяўляем у такім узросце.

На яго долю не выпала гучнай славы, але бацька паэта пражыў жыццё вялікае, яркае, надзвычай павучальнае і цікавае. Расказ ветэрана быў цікавейшым за самыя што ні ёсць прыгодніцкія аповесці — бясхітрасны расказ сведкі і ўдзельніка многіх і многіх падзей у жыцці свайго народа.

— Як і ўсе сялянскія сем'і,— прыгадвае Емяльян Арцёмавіч,— наша сям'я была мнагадзетнай — восем душ, ні больш, ні менш. Так што працаваць давялося ісці рана. Ужо ў 12 гадоў пайшоў, як тады казалі, у заработкі...

А 12 гадоў споўнілася Емяльяну Арцёмавічу якраз у 1900 годзе, калі пачынаўся наш такі бурны і такі багаты на падзеі век. Бядняцкі сын капаў канавы ў панскіх маёнтках, будаваў мост у Вільні, нямала іншых паспытаў работ. А ў 1910 годзе прызвалі на службу ў царскую армію. Тры гады «адбарабаніў» у артылерыі, заслужыў тры «лычкі» на пагоны і безліч зубатычын. А пасля заканчэння службы — зноў пралетарый, зноў блуканні па Расіі ў пошуках работы і шчасця. У 1913 годзе пераехаў у прамысловы Рэвель (зараз Талін), дзе тады будаваўся новы порт. Малады рабочы паступіў на суднабудаўнічы завод і стаў свідравальшчыкам. Але праз некалькі гадоў Е. А. Панчанка быў зноў прызваны ў армію — у самым разгары была першая сусветная вайна.

Але прыйшоў векапомны 1917 год, і грымнуў вялікі гром над царскім самаўладдзем! Вярнуўся дадому артылерыст Емяльян Панчанка. Тут, у Рэвелі, у жніўні 1917 года ў яго нарадзіўся сын, якому далі імя Пімен. Ў гэтым жа годзе сям'я Панчанкі пераехала ў Барысаў.

Адна за адной адбываліся падзеі, вялікія і хвалюючыя. Кастрычнік 1917 года. У Петраградзе — рэвалюцыя! Е. А. Панчанка без ваганняў прыняў яе. Уласна гэта была яго рэвалюцыя, рэвалюцыя мільёнаў і мільёнаў рабочых, такіх, як ён, сялян і салдат Расіі. Таму, калі ў пачатку 1918 года над рэвалюцыяй працоўных і маладой Рэспублікай Саветаў навісла смяротная небяспека, Емяль-

ян Панчанка прыехаў у Маскву і ўступіў добраахвотнікам у рады Чырвонай Арміі.

— Артылерысты ды яшчэ кадравыя, заўсёды патрэбны былі ў арміі,— усміхаецца Емяльян Арцёмавіч.— Памятаю адзін з баявых эпізодаў 1918 года. Наша батарэя тады стаяла на Хадынскім полі. І вось неяк ліпеньскім днём паднялі нас па трывозе. Левыя эсэры, кажуць, узнялі мяцеж супраць Савецкай улады, спрабуюць захапіць Крэмль, арыштаваць Савецкі ўрад. Эсэраўскія авантурысты адважыліся на мяцеж, ды толькі ніхто іх не падтрымаў. І не адно важкае слова сказалі нашы гарматы. Усышалі мы гэтым эсэрам так, што яны, пэўна, пераблыталі, дзе лева, дзе права...

Не адзін раз Емяльян Арцёмавіч бачыў і чуў правадыра рэвалюцыі У. І. Леніна. Давялося паваяваць — выганяў з Казані белачэхаў. А ў жніўні 1918 года Е. А. Панчанка ў складзе 32-й дывізіі адбыў на новы фронт — над Баранавічы. Ворагаў тады ў маладой Рэспублікі Саветаў было нямала. Цяпер ёй сталі пагражаць яшчэ і панская Польшча разам з бандытамі-балахоўцамі.

— 1918 год асабліва памятны мне і яшчэ таму,— расказвае Емяльян Арцёмавіч,— што ў гэтым годзе мяне, малодшага камандзіра 2-й артылерыйскай батарэі другога артдывізіёна (афіцэрскіх званняў тады ў Чырвонай Арміі не было), прынялі ў рады партыі камуністаў-ленінцаў.

І быў яшчэ 1919 год, баі з Дзянікіным і разгром конніцы Шкуро, пераможны 1920 год, «Гнілое мора» — Сіваш і чырвоны сцяг над гарой Мітрыдат... У Крыме сек Емяльян Панчанка махноўцаў, якія зноў паднялі чорны сцяг мяцяжу супраць Савецкай улады... А неўзабаве дэмабілізацыя. Вельмі патрэбны былі людзі для аднаўлення і развіцця разбуранай дзвюма войнамі народнай гаспадаркі. Камуніста Е. А. Панчанку накіравалі ў Барысаў, а потым упаўнаважаным па парыхтоўках у Бягомль. З атрадам ЧАН (часцей асобага назначэння) давялося ганяцца за белабандытамі. Пасля — многія гады работы ў лясной гаспадарцы, працаваў дзесятнікам у леспрамгасе, начальнікам лесапункта, ляснічым. У 1937 годзе Емяльян Арцёмавіч быў пераведзены ў Талачын, дзе працаваў у падсобнай гаспадарцы лясгаса.

І вось зноў суровае выпрабаванне — Вялікая Айчынная вайна. Сын Пімен, які быў ужо вядомы як таленавіты паэт і меў за плячыма гады настаўніцкай і літаратурнай работы, знаходзіўся ў арміі, сям'я эвакуіравалася ў савецкі тыл. А 53-гадовы Емяльян Арцёмавіч быў у знішчальным батальёне.

Жнівень 1941 г., Гомель. Фронт хутка набліжаўся. ЦК Кампартыі рэспублікі даў многім камуністам баявое заданне: арганізоўваць партызанскі рух у тыле ворага. З гэтым заданнем Е. А. Панчанка перайшоў лінію фронту і вярнуўся ў Талачын, уладкаваўся рабочым лесагадавальніка. Пасада была непрыкметнай, ды месца зручнае: паблізу праходзіла чыгунка. І ўсе звесткі аб перамяшчэннях акупантаў, спісы асоб, якія супрацоўнічалі з гітлераўцамі, перадаваліся народным мсціўцам. Нямала зрабіў Е. А. Панчанка па заданні разведчыкаў пятага атрада партызанскай брыгады «Чэкіст». Пазней за актыўны ўдзел у партызанскім руху Е. А. Панчанка быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

...Я чытаю напамяць знаёмыя радкі паэта, і Емяльян Арцёмавіч лагодна ўсміхаецца:

— Як жа, пазнаю. Піменавы радкі. Бяру я ў нашай бібліятэцы сынавы кніжкі, чытаю іх і часта думаю: сам я малапісьменны быў, ды ўлада наша родная адкрыла мне шляхі ў жыццё. А сын, бач ты яго, паэт! Дачка Дуся скончыла педагагічны інстытут, сын Арсень працуе на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава. Адкрыты былі ўсе шляхі і дачцы Насці. Так, недарэмна пралівалі мы кроў за сваю ўладу.

Гэта і сапраўды так. Емяльян Арцёмавіч яшчэ ў Грамадзянскую вайну быў тройчы паранены і кантужаны... Вялікае і слаўнае жыццё прайшоў камуніст, змагар, бацька паэта.

Б. Р. Фірштайн.

ОДА ТАЛАЧЫНУ

Талачынцы — не злачынцы,
Добрых спраў яны зачынцы:
Ад гаралкі не шалеюць,
Сеюць лён,
Жывуць з алеем.
А дзяўчыначкі-талачынкі,
Як вясновыя хусцінкі —
Кветкамі прыбраныя,
Вечна закаханыя;
То ў цябе, то ў мяне —
Шчасце даецца не міне
Каб сустрэцца з нашай любкай,
Не ў Бабры ты алаць,
Не ў Крупках,
Трэба ў Коханаве злезці —
Спадабаешся нявесце,
А далей — пяшэчкам
З ільняным мяшэчкам:
Не шануем важны чын,
А шануем Талачын.

Пімен Панчанка.

На роднай зямлі

Іван Міхайлавіч Барадаўка нарадзіўся ў 1925 г. ў в. Зялёная Талачынскага р-на. Герой Сацыялістычнай Працы (1958). З сялян. Член КПСС з 1956 г. З 1940 г. трактарыст, з 1945 г. брыгадзір трактарнай брыгады Талачынскай МТС. З 1949 г. ў калгасе «XVIII партз'езд» — брыгадзір трактарнай

брыгады, загадчык складам запчастак. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1958 г. за дасягненні ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. На пенсіі. Жыве ў в. Азерцы Талачынскага раёна.

...Ён, сялянскі хлапчук, з дзяцінства палюбіў поле. Перад самай вайной дзядзька Тамаш, іх сусед, узяў пятнаццацігадовага кемлівага падлетка да сябе на трактар, і за адзін сезон Іван навучыўся араць і сеяць.

У 1944 годзе, пасля выгнання гітлераўскіх акупантаў, Іван Барадаўка зноў вярнуўся да хлебаробскіх клопатаў. Яго роднае поле, як і людскі лёс, было знявечана вайною. У язвах акопаў і павуціне калючага дроту яно здавалася дзікім і непрыветлівым. А каму вярнуць яго да жыцця? У вёсцы засталіся жанчыны, старыя і падлеткі. Івану не было 19, а ў МТС яго лічылі амаль што самым вопытным і ўмелым трактарыстам. Ён браў настойлівасцю, працавітасцю. За які месяц І. М. Барадаўка літаральна па гаечцы, па вінціку сабраў сабе трактар, абкатаў яго. Сёетое падабраў у паўразбурапай майстэрні ад разукамплектаванага немцамі «Універсала», частку дэталей раздабыў па шашы каля машын, пакінутых гітлераўцамі пры адступленні, асобныя запчасткі, спісаныя ў артылерыйскім дывізіёне, трактарысту падаравалі чырвонаармейцы. На такім «Універсале» і прыехаў Барадаўка ў Азерцы, каб узараць поле пад азімыя. Хутка паставілі яго брыгадзірам трактарнай брыгады. Зямлі шмат, тэхніка ў асноўным дабітая, а механізатараў па пальцах пералічыць можна.

І. М. Барадаўка заўсёды быў у ліку тых, хто шукаў, эксперыментаваў. І ў тым, што з часам ў калгас «XVIII партз'езд» сталі прыязджаць з суседніх гаспадарак і нават з іншых раёнаў, каб паглядзець, як тут дабіваюцца высокіх ураджаяў, ёсць і яго немалая заслуга як брыгадзіра трактарнай брыгады.

Няўрымслівасць, творчы пошук гэтага чалавека адчуваюцца ва ўсім. Трэба было расшырыць пасяўныя плошчы пад кармавыя культуры і лён — аб гэтым пачалі клапаціцца калгасныя механізатары на чале з І. М. Барадаўкай. За кароткі час у вёсцы Парэчча яны адваявалі ў балот 70 гектараў зямлі, на якой раслі толькі лаза ды асака, а цяпер там лугавыя травы, цімафееўка. Па 2—3 укосы за лета — вось якая аддача!

Чатыры дзесяцігоддзі аддаў І. М. Барадаўка нялёгкай працы на роднай зямлі. Песціў, упрыгожваў яе ды і клопаты заўтрашнія, паслязаўтрашнія ў яго таксама пра яе. Клопаты хлебаробскія ён нібы па спадчыне перадаў сваім дзецям, якія па прыкладу бацькі звязалі свой лёс з сельскагаспадарчай вытворчасцю. Сёння сваю любоў да зямлі Іван Міхайлавіч перадае сваім унукам. *Л. М. Сузін.*

Акрыленая працай

В. С. Галубцова.

Г. Л. Іванюта.

Вольга Сямёнаўна Галубцова нарадзілася ў 1903 г. ў в. Свіслачаны на Гродзеншчыне. Герой Сацыялістычнай Працы (1958). Працоўную дзейнасць пачала ў 1915 г. ў Петраградзе. У 1926—1961 гг. даяркa саўгаса «Райцы» (з 1965 г. племзавод «Рэканструктар») Талачынскага р-на. За высокія дасягненні ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджана ордэнамі Леніна. Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За працоўную адзнаку». Памерла ў 1974 г.

Вялікі Кастрычнік яна сустрэла ў Петраградзе. Там яна працавала спачатку на цэментным заводзе, потым на Балтыйскай чыгунцы. Неўзабаве пераехала на Беларусь і пасялілася ў в. Райцы Талачынскага р-на. Калі ж арганізаваўся саўгас, В. С. Галубцова пайшла працаваць даяркай. Гэта цяжкая ў той час работа прыцягвала нямногіх. Вольга Сямёнаўна выращыла нізашто не пакідаць ферму. Гэта была яе пазіцыя да новага ладу, які яна прыняла адразу і безагаворачна. Былі засмучэнні, былі няўдачы, нават хвіліны адчаю, калі хацелася махнуць на ўсё рукой і перайсці на больш спакойную і лёгкую работу. Але ледзь толькі закрадвалася такая думка, жанчына гнала яе: «Добра, пакіну ферму, пойдуць, гледзячы на мяне, іншыя жанчыны, хто ж тут будзе працаваць?..» Вольга Сямёнаўна, пераадольваючы цяжкасці, з цвёрдай упартасцю працягвала працаваць даяркай на ферме. З году ў год паслядоўна ўдасканальвала сваё майстэрства, настойліва вучылася перадавым прыёмам працы. Паступова выраслa ў сапраўднага майстра сваёй справы. З яе бралі прыклад, да яе думкі прыслухоўваліся. Па працы прыйшлі і заслугі,

прызнанне. У 1949 г. В. С. Галубцову ўзнагародзілі медалём «За працоўную адзнаку», а ў наступным годзе — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. З часу адкрыцця Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве яна была нязменным яе ўдзельнікам.

У снежні 1958 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў указ «Аб прысваенні звання Героя Сацыялістычнай Працы перадавікам сельскай гаспадаркі Беларусі», і ў ліку ўзнагароджаных была даярка саўгаса «Рэканструктар» В. С. Галубцова. Спецыялісты падлічылі, што да часу ўзнагароды, за 35 гадоў работы, яна надаіла больш за 1,5 мільёна кілаграмаў малака. Гэта быў поспех, дасягнуты самаадданай працай і адзначаны, як і належыць у сацыялістычным грамадстве, у поўную меру. Прыняўшы віншаванні з нагоды высокай узнагароды, Вольга Сямёнаўна перагледзела раней прынятае рашэнне пайсці на пенсію. У снежні 1958 г. яна пісала ў раённую газету «Чырвоны хлебароб»: «Прызваюся, я думала ў хуткім часе пайсці на заслужаны адпачынак. Цяпер не. Сіл у мяне яшчэ многа, буду, як і раней, працаваць даяркай...» Кажуць, утрымаць вышыню больш цяжка, чым яе ўзяць. У 1958 г. В. С. Галубцова надаіла ад кожнай з 11 кароў па 4278 кілаграмаў малака. Даярак, якія выйшлі на такія рубяжы, можна было пералічыць на пальцах не толькі ў Віцебскай вобласці, але і ў рэспубліцы. Тым не менш Герой Сацыялістычнай Працы В. С. Галубцова паставіла перад сабой задачу ў наступным годзе атрымаць ад кожнай каровы па 5 тысяч кілаграмаў малака. Падлічыла свае магчымасці, і з першых дзён актыўна ўключылася ў сацыялістычнае спаборніцтва за павышэнне прадукцыйнасці жывёлы, узяла на ўзбраенне ўсё новае, перадавое, што стварала навука і практыка. Дзень за днём, месяц за месяцам настойліва ішла Вольга Сямёнаўна да запаветнай мэты. За яе поспехамі ў рабоце ўважліва сачылі ў раёне, аднавяскоўцы выбралі яе дэпутатам раённага Савета. І хоць спраў у яе як дэпутата прыбавілася, В. С. Галубцова сваё абавязацельства выканала з гонарам: атрымала па 5010 кілаграмаў малака ад кожнай з 9 замацаваных кароў. У віншаванні абласнога камітэта КПБ гаварылася: «За 38 год работы на сціплым і высакародным пасту Вы праявілі сябе выдатнай працаўніцай, якая ўмее выкарыстоўваць дасягненні навукі і перадавога вопыту... Ваш працоўны подзвіг яшчэ раз сведчыць аб тым, што рэзервы павышэння прадукцыйнасці жывёлагадоўлі неабмежаваныя, а творчасць савецкіх людзей бязмежная».

Вольга Сямёнаўна, сціплая і простая працаўніца, ніколі не лічыла сваё жыццё подзвігам і была перакананна, што кожны чалавек, што б ён ні рабіў, абавязаны аддаваць рабоце ўсе свае сілы, веды, майстэрства і вопыт. Толькі ў такім выпадку яму будуць спадарожнічаць поспех і прызнанне. Верная гэтаму прынцыпу, В. С. Галубцова разам з даяркамі сваёй гаспадаркі Дуран, Хадневіч, Шкроба, Кашэрыпай і Дзятковай 27 студзеня 1960 г. звярнулася з адкрытым пісьмом да ўсіх даярак раёна з заклікам даць Радзіме як мага больш малака, дзяліцца вопытам сваёй работы. У тым жа годзе В. С. Галубцова, цяпер ужо з групай перадавых даярак раёна, падпісала пісьмо да ўсіх работнікаў малочнатаварных ферм, калгаснікаў і калгасніц, рабочых саўгасаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі Талачыншчыны за атрыманне ад каровы ў суткі па пуду малака. Адзначалася, што рашаючай умовай забеспячэння высокай прадукцыйнасці жывёлы разам з добрымі ўмовамі ўтрымання і кармлення яе, з'яўляецца высокае пачуццё адказнасці жывёлаводаў за даручаны ўчастак работы. Гэта высокае пачуццё асабістай адказнасці В. С. Галубцова захавала на ўсё жыццё.

М. А. Крыжаноўскі.

Трывалае валакно

Ганна Логвінаўна Іванюта нарадзілася ў 1929 г. ў в. Вялікія Фамёнкі Холм-Жыркоўскага раёна Смаленскай вобласці. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). З сялян. Член КПСС з 1965 г. З 1944 г. паляводз. з 1954 г. звеннявая льнаводчага, звяна калгаса «Расія» (з 1970 г. калгас імя Леніна) Талачынскага раёна. Званне Герою Сацыялістычнай Працы прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак лёну. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі. Аўтар кнігі «Гаспадары льняных палёў» (1965). На пенсіі. Жыве ў Талачыне.

СІНІЧЭНКА Вера Цімафееўна, нарадзілася ў 1926 г. ў в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна. З рабочых. З 1944 г. ў калгасе «Высокі Гарадзец», з 1960 г. даглядчыца жывёлы саўгаса «Рыдамльскі», з 1963 г. аператар па дарошчванні цялят саўгаса «Іскра». За высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджана ордэнам Леніна. На пенсіі. Жыве ў в. Высокі Гарадзец.

СУШЧЫ Васіль Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Ільінка Талачынскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1960 г. У 1941—1946 гг. у Чырвонай Арміі. Пасля вайны памочнік брыгадзіра трактарна-паляводчай брыгады, брыгадзір калгаса імя Леніна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. На пенсіі. Жыве ў в. Ільінка.

ТКАЧЭНКА Міхаіл Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Замошша Талачынскага раёна. З рабочых. Механізатар саўгаса «Рыдамльскі». За высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Замошша.

ФЕДАРОВІЧ Віктар Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1903 г. ў в. Дунавік Талачынскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1957 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, сувязны партызанскай брыгады «Граза». У 1944—1945 гг. у Чырвонай Арміі. З 1945 г. калгаснік, з 1947 г. старшыня калгаса «XVIII партз'езд». У 1961—1964 гг. старшыня калгаса «Рассвет». Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, у 1959—1967 гг. дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. З 1979 г. на пенсіі. Жыве ў Мінску.

ХАМЯК Аляксандр Платонавіч, нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. З сялян. Член КПСС з 1944 г. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў 1952 г. Заслужаны аграном БССР (1966). У 1941—1946 гг. у Чырвонай Арміі. У 1954—1982 гг. галоўны аграном калгаса імя Дзімітрава. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. На пенсіі. Жыве ў в. Забалацце Талачынскага раёна.

ЧАРНЯЎСКАЯ Надзея Яфімаўна, нарадзілася ў 1932 г. ў в. Серадзінка Талачынскага раёна. З сялян. Член КПСС. Свінарка племзавода «Рэканструктар». За высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Райцы Талачынскага раёна.

ШАТКОЎ Мікалай Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1927 г. ў в. Сялец Талачынскага раёна.

А. П. Хамяк.

З сялян. Член КПСС з 1963 г. З 1954 г. працаваў трактарыстам у Талачынскай МТС, потым у калгасе «Праўда», з 1974 г. майстар-наладчык у калгасе «Праўда». За высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Сялец.

ШАФРАНСКАЯ Юлія Якаўлеўна, нарадзілася ў 1915 г. ў в. Мошава Талачынскага раё-

М. М. Шаткоў.

П. І. Шахманава.

Л. М. Шульц.

Я. К. Шацкі.

на. З сялян. Член КПСС. Працавала ў сельскай гаспадарцы, аператар па адкорму свіней племзавода «Рэканструктар». За высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджана ордэнам Леніна. Памерла ў 1986 г.

ШАХМАНАВА Праскоўя Іванаўна, нарадзілася ў 1925 г. ў в. Карагод Чарнобыльскага раёна Кіеўскай вобл. З сялян. Калгасніца, звеннявая па вырошчванні лёну калгаса імя XX з'езда КПСС. За высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджана ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалём «Ветэран працы». Выбіралася дэпутатам Віцебскага абласнога Савета народных дэпутатаў. На пенсіі. Жыве ў в. Шылаўка Талачынскага раёна.

А. А. Шэйка.

ШАЦКІ Ягор Кузьміч, нарадзіўся ў 1925 г. ў в. Старынкі (былая в. Каліцкі) Талачынскага раёна. З сялян. Заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі Беларусі. У 1950—1958 гг. механік-камбайнер Смалявіцкай МТС, з 1960 г. ў калгасе імя XXI з'езда КПСС, з 1968 г. слесар-камбайнер, з 1977 г. слесар-газавік-камбайнер. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1987 г.

ШУЛЬЦ Леанід Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Азерцы Талачынскага раёна. З рабочых. Член КПСС з 1956 г. Механізатар калгаса «XVIII партз'езд», звеннявы па вырошчванні бульбы. За высокія дасягненні ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Азерцы.

ШЭЙКА Антаніна Андрэеўна, нарадзілася ў 1942 г. ў в. Кругі Талачынскага раёна. Член КПСС. Аператар машыннага даення кароў калгаса «Кастрычнік». Дэлегат XXIX і XXX з'ездаў КПБ. За высокія дасягненні ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў. Жыве ў в. Кругі.

* * *

У 1988 г. перадавікі сельскагаспадарчай вытворчасці Талачыншчыны А. С. Валянтовіч, трактарыст калгаса імя Леніна, і М. Ф. Гардзееў, звеннявы таго ж калгаса, былі ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Ёсць такая прафесія

Для многіх талачынцаў служба ва Узброеных Сілах СССР стала прыкладам выканання высокага абавязку перад Радзімай — яе абароны. Генерал-лейтэнант Ф. Н. Шульгоўскі пачынаў служыць яшчэ ў царскай арміі, а пасля рэвалюцыі на ўсё жыццё звязаў свой лёс з Чырвонай Арміяй, у Грамадзянскую вайну змагаўся на Паўднёвым фронце супраць Дзянікіна. Ваенная біяграфія генералаў Я. Ф. Бакштаева, П. І. Бяляева, палкоўніка М. П. Плаксіцкага, маёра М. В. Шабекі — баі супраць японскіх захопнікаў на возеры Хасан і рацэ Халхін-Гол у 1938 г., баявы шлях у Вялікую Айчынную вайну. У бітвах за Маскву і Сталінград удзельнічаў палкоўнік А. Н. Маліноўскі, яго брат В. Н. Маліноўскі таксама ўдзельнік абароны Масквы. У час Вялікай Айчыннай вайны ў дзеючай арміі змагаўся палкоўнік І. К. Кабачэўскі. Сотні камандзіраў і тысячы радавых байцоў абаранялі свабоду і незалежнасць сацыялістычнай Айчыны. Усе яны — гордасць і слава зямлі Талачынскай, яе вечная памяць.

Я. Ф. Бакштаеў.

Б. І. Бяляеў.

БАКШТАЕЎ Яўген Фёдаравіч, нарадзіўся 23.10.1911 г. ў в. Равуча ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1931, генерал-маёр у адстаўцы. Працоўную дзейнасць пачаў у 1928 г. ў Маскве. Неўзабаве па камсамольскай пуцёўцы паехаў на будаўніцтва Беразнікоўскага хімкамбіната ў Пермскай вобласці. З 1931 г. сакратар камітэта камсамола 1-га калійнага камбіната ў г. Салікамск.

У верасні 1933 г. прызваны ў Чырвоную Армію, служыў на Далёкім Усходзе. Сакратар камітэта камсамола, палітрук роты хім. батальёна, з 1937 г. інструктар палітаддзела 32-й стралковай дывізіі. У жніўні 1938 г. ў складзе 32-й стралковай дывізіі ўдзельнічаў у баях з японскімі захопнікамі на возеры Хасан, быў паранены. За выкананне баявых заданняў на воз. Хасан узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У 1938—1941 гг. па палітрабоце ў Прыморскім краі і Уральскай вобл.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. на Заходнім фронце, у жніўні 1941 г. каля пас. Шумячы Смаленскай вобласці быў паранены, пасля выздараўлення ваенком 1162-га стралковага палка 352-й стралковай дывізіі, у складзе якой прымаў удзел у бітве за Маскву. У снежні 1941 г. зноў паранены, з сакавіка 1942 г. начальнік аддзела кадраў палітаддзела 61-й арміі, удзельнічаў у баях на Арлоўска-Курскай дузе, у вызваленні Бранска, Калінкавіч, Мазыра. Вайну закончыў у Берліне.

З мая 1944 г. інструктар Галоўнага палітупраўлення Чырвонай Арміі па заходнім напрамку. У 1950—1971 гг. на розных пасадах у Палітупраўленні Маскоўскай ваеннай акругі, у Групе савецкіх войск у Германіі, у Галоўным палітычным управленні Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, у Ваеннай Акадэміі хімічнай аховы. У 1971 г. звольнены ў запас, вядзе грамадскую работу, член парткамісіі Масквар эцкага райкома КПСС Масквы, неаднаразова выбіраўся дэпутатам Маскоўскага гарадскога Савета народных дэпутатаў. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, 3 ордэнамі Чырвонай Зоркі, венгерскім ордэнам «Брацтва па зброі», медалямі.

БЯЛЯЕЎ Барыс Іванавіч, нарадзіўся 31.10.1901 г. ў с. Алені Тамбоўскай вобласці, жыў у Коханаве. Генерал-маёр артылерыі. Член КПСС з 1925 г. Скончыў 8 класаў Коханаўскай школы 2-й ступені (1920). Удзельнік 1-га Аршанскага павятовага з'езда камсамола (1919). У Чырвонай Арміі з 1920 г. Скончыў 1-ю Ленінградскую артылерыйскую школу (1923), Вышэйшыя акадэмічныя артылерыйскія курсы (1948). У 1923—1941 гг. на розных камандных пасадах. Удзельнік баёў супраць японскіх захопнікаў на воз. Хасан (1938). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 25 чэрвеня 1941 г. па май 1945 г. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах: старшы памочнік начальніка аператыўнага аддзела штаба артылерыі 20-й арміі, начальнік артылерыі 30-й гвардзейскай стралковай дывізіі, начальнік штаба артылерыі 11-й гвардзейскай арміі. У 1949—1955 гг. начальнік штаба артылерыі Маскоўскай, Прыволжскай, Адэскай ваенных акруг. Узнагароджаны ордэнам Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Суворава II ступені, ордэнам Аляксандра Неўскага, медалямі. Памёр у 1978.

КАБАЧЭЎСКІ Іван Канстанцінавіч, нарадзіўся 15.9.1921 г. ў в. Пярэвалачня ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1942 г., палкоўнік. У 1939—1941 гг. вучыўся ў Горкаўскім вучы-

І. К. Кабачэўскі.

А. Н. Маліноўскі.

М. В. Шабека.

М. Я. Шумскі.

лішчы зенітнай артылерыі, у 1950 г. скончыў Артылерыйскую акадэмію імя Дзяржынскага. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. На службе ў Савецкай Арміі быў камандзірам узвода, батарэі, дывізіёна і палка, начальнікам курса, выкладчыкам Артылерыйскай акадэміі імя Дзяржынскага, старшым афіцэрам Управлення процівапаветранай абароны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1968 г.

МАЛІНОЎСКІ Аляксандр Нічыпаравіч, нарадзіўся 23.6.1906 г. ў в. Пярэвалачня, палкоўнік. Член КПСС з 1930 г. Працаваў на металургічным заводзе, на шахце «Сафія» ў г. Макееўка. У Чырвонай Арміі з 1928 г. Скончыў Ваенную школу лётчыкаў у Адэсе (1931). У 1931—1941 гг. лётчык-інструктар, камандзір звяна ў школе марскіх лётчыкаў у Севастопалі, Ейску, у ВПС Сібірскай, Харкаўскай ваенных акруг, начальнік авіяшколы ў г. Валчанск Харкаўскай вобласці, камандзір авіяпалка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1941—1942 гг. камандзір 677-га авіяпалка, ваяваў пад Масквой, на Паўночна-Заходнім, Заходнім франтах, пад Сталінградам. У 1943—1958 гадах працягваў службу ў ВПС Харкаўскай, Кіеўскай, Прыкарпацкай ваенных акруг. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I і II ступеней, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1986 г.

МАЛІНОЎСКІ Васіль Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1908 г. ў в. Пярэвалачня. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, кадравы ваенны. Член КПСС з 1931 г. У Чырвонай Арміі з 1931 г. Удзельнік ваеннага парада 7 лістапада 1941 г. ў Маскве, ваяваў на Паўночна-Заходнім, Волхаўскім франтах, абараняў Маскву. У 1946 г. інструктар Віцебскага абкома КПБ, у 1947—1949 гг. сакратар Суражскага райкома КПБ, у 1949—1954 гг.— нам. старшыні Сенненскага райвыканкома, у 1954—1975 гг. на гаспадарчай рабоце ў Сенненскім раёне. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, медалямі. Персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння. Жыве ў Сянно.

ПЛАКСІЦКІ Міхаіл Паўлавіч, нарадзіўся 15.8.1906 г. ў в. Багрынава, палкоўнік. Член КПСС з 1930 г. Пасля заканчэння школы працаваў на адной з шахтаў Данбаса. У Чырвонай Арміі з 1930 г. Скончыў Кіеўскае артылерыйскае вучылішча (1932). Удзельнік баёў супраць японскіх захопнікаў на р. Халхін-Гол (1938), Вялікай Айчыннай вайны. У баях за Тулу ў 1941 г. камандаваў артылерыйскім дывізіёнам, абараняў Мурманск, Кандалакшу, камандзір палка ППА. Пасля вайны да 1950 г. служыў у войсках ППА на Беларусі, у 1950—1955 гг. ваенны саветнік у Румыніі. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1975 г.

ТАЛКАЧОЎ Іван Авяр'янавіч, нарадзіўся 12.9.1899 г. ў в. Лугавая. Удзельнік 1-й сусветнай, Грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў, палкоўнік медыцынскай службы. Член КПСС з 1919 г. У 1914 г. скончыў земскую школу ў Кранштаце, у 1928 г. медыцынскі інстытут. У 1917 — пачатку 1918 г. лекарскі памочнік на пасыльным судне «Крэчат» Балтыйскага флоту. У кастрычніку 1917 г. ўдзельнічаў у Маанзундскай аперацыі. У маі 1918 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію: начальнік лятучага санітарнага атрада, начальнік дэзінфекцыйнага атрада 1-й Магілёўскай дывізіі. З восені 1918 г. на Усходнім фронце: ваенны камісар брыгаднаперавязачнага атрада 20-й Пензенскай стралковай дывізіі, 24-й Сімбірскай Жалезнай стралковай дывізіі. З лістапада 1919 г. загад-

чык агітаддзела 72-й брыгады 24-й дывізіі, камісар санчасці брыгады, дывізіі. З жніўня 1921 г. на Балтыйскім флоце — старшы лекпом лінкора «Парыжская камуна». З 1929 г. ўрач брыгады эсмінцаў флоту, старшы ўрач Ваенна-марскога ўпраўлення імя Ф. Э. Дзяржынскага, лінкора «Парыжская камуна». У 1935—1938 гг.— памочнік начальніка санаддзела Чарнаморскага флоту. У 1939—1946 гг. начальнік медыка-санітарнага ўпраўлення Паўночнага флоту, пасля гэтага ў 1946—1957 гг.— начальнік ваенна-марскога шпіталя г. Кранштат, начальнік медслужбы Ваенна-медыцынскай акадэміі імя С. М. Кірава ў Ленінградзе. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, 11 медалямі. Памёр у 1985 г.

ШАБЕКА Мікалай Васілевіч, нарадзіўся 7.11.1907 г. ў в. Мяшкова. Член КПСС з 1930 г. З 1921 г. працаваў лесарубам у Талачыне, потым рабочым на Азерацкім лесапільным заводзе. У 1924 г. паехаў у Данбас, працаваў у г. Макееўка на шахце, потым на металургічным заводзе. У 1926 г. паступіў на 3-і курс Макееўскага вячэрняга рабфака. У 1929 г. прызваны ў Чырвоную Армію, вучыўся ў школе ваенных зносін у Ленінградзе, пасля накіраваны ў Асобную Далёкаўсходнюю армію ў Хабараўск. У 1938 г. змагаўся супраць японскіх захопнікаў на воз. Хасан. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ваяваў на Брацкім і Прыбалтыйскім франтах, у 1944 г. быў цяжка паранены, вайну закончыў ва Усходняй Прусіі. У 1955 г. дэмабілізаваны. Вярнуўся ў Талачын, працаваў у лясгасе, быў намеснікам сакратара партарганізацыі лясгаса, членам парткамісіі Талачынскага РК КПБ. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і ордэнам Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі. Жыве ў Талачыне.

М. В. Шабека — нашчадак ваеннай дынастыі: дзед — пушкар, удзельнік руска-турэцкай вайны 1877—1878 гг., браў Плеўну, дапамагаў братам-балгарам, меў баявыя ўзнагароды; бацька служыў у Екацярынаслаўскім Кіеўскім гвардзейскім палку; старэйшы брат Цярэнцій Васілевіч у першую сусветную вайну трапіў у палон, немцы распялі яго на крыжы, але яму ўдалося выратавацца і ўцячы ў Францыю, а потым вярнуцца на радзіму, ваяваў на Заходнім фронце, быў узнагароджаны сярэбранай шабляй.

ШУЛЬГОЎСКІ Фёдар Несцеравіч, нарадзіўся 22.4.1893 г. ў г. п. Коханава, генерал-лейтэнант інжынерна-тэхнічнай службы (з 1943). Член КПСС з 1920 г. Скончыў Маскоўскі авіяцыйны інстытут (1934). У арміі з 1914 г., у Чырвонай Арміі з 1918. Удзельнік Грамадзянскай вайны на Паўднёвым фронце. У 1938—1942 гг. у Ваенна-паветранай акадэміі: старшы выкладчык, начальнік кафедры, факультэта. З 1942 г. начальнік Упраўлення ў цэнтральным апараце ВПС, у 1946—1947 гг. начальнік Ленінградскай ваенна-паветранай акадэміі. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі Суворава і Кутузава I і II ступеней. Памёр Ф. Н. Шульгоўскі 21.1.1968 г.

М. П. Плаксіцкі.

ШУМСКІ Мікалай Яфімавіч, нарадзіўся 5.5.1916 г. ў в. Пярэвалачня Талачынскага раёна, падпалкоўнік у адстаўцы. Член КПСС з 1942 г. У 1933 г. скончыў Коханаўскую сямігадовую школу, у 1937 г.— Віцебскі сельскагаспадарчы тэхнікум аграхіміі і аховы раслін, у 1956 г.— Ваенную акадэмію імя Фрунзе ў Маскве, у 1967 г.— юрыдычны факультэт Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Франко. У Чырвонай Арміі з 1938 г., служыў у Беларускай, Закаўказскай ваенных акругах, удзельнік вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну ў 1939 г., Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. да мая 1945 г. У складзе 17-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі ваяваў на Заходнім фронце, абараняў Маскву ў 1941 г., камандзір эскадрона, памочнік начальніка штаба 50-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса 13-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі, ваяваў на Заходнім, Сцяпным, 2-м Украінскім франтах. Удзельнік аперацый па вызваленні горада і станцыі Уразава, г. Валуйкі Белгародскай вобл., гарадоў Луцк і Роўна, а таксама Венгрыі, Чэхаславакіі і інш. Пасля Вялікай Айчыннай вайны да звальнення ў запас у 1962 г. на розных пасадах у Групе савецкіх войск у Германіі, у Прыкарпацкай ваеннай акрузе.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, 3 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Жыве і працуе ў Львове.

На ахове грамадскага парадку

П. М. Хілянкоў.

Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх акупантаў талачынцы пачалі аднаўляць разбураную гаспадарку, наводзіць парадак у раёне. Вярнуліся з фронту і сталі працаваць у органах міліцыі ўчастковымі ўпаўнаважанымі С. С. Белановіч, І. І. Казлоў, І. Ф. Мяснікоў, М. М. Палякоў, С. М. Пляскач. Аднак кадраў не хапала, а работы было многа. У лясах яшчэ хаваліся былыя паліцэйскія, рэшткі разгромленых нямецкіх часцей і ўласаўцаў, з'явіліся бандыцкія групы, якія тэрарызавалі насельніцтва, займаліся грабяжамі. Пры вялікіх намаганнях работнікаў міліцыі і дапамозе грамадскасці ўсе гэтыя банды ў хуткім часе былі разгромлены міліцыяй. У раёне стала спакойна. У канцы 1940 і пачатку 1950 года раённы аддзел міліцыі папоўніўся дэмабілізаванымі франтавікамі і былымі партызанамі. Сярод іх У. П. Ермашкевіч, А. Ф. Ермакоў, М. В. Грыгаровіч, Р. Ф. Галімовіч, А. П. Красоўскі, М. В. Мяснікоў, І. Д. Смарчкоў і іншыя. Многія супрацоўнікі міліцыі адначасова працавалі і вучыліся ў школе рабочай моладзі. Вучыцца было нялёгка. Часам даводзілася перапыняць заняткі і выязджаць на здарэнні, а давучвацца па начах. Але цяжкасцей не баяліся. Былі і страты — загінуў пры выкананні службовых абавязкаў дзяржаўтаінспектар Віктар Прысмакаў. У 1950—1954 гг. начальнікам Талачынскай раённай міліцыі працаваў І. Г. Шыхаў, член КПСС, былы франтавік, у органах МУС працаваў з 1934 г., капітан міліцыі, узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР. У 1954—1955 гг. начальнікам міліцыі працаваў В. М. Кісялёў, член КПСС з 1926 г., падпалкоўнік унутранай службы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Памёр у 1955 г. З 1956 да 1967 г. Талачынскую міліцыю ўзначальваў П. М. Хілянкоў, член КПСС з 1945 г., падпалкоўнік міліцыі. Ён — удзельнік вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь, савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У 1942 быў цяжка паранены. Пасля вызвалення Оршы працаваў у Аршанскім нараддзеле міліцыі, потым быў прызначаны начальнікам Талачынскай міліцыі. Гэта быў строгі і прынцыповы работнік. Сам дысцыплінаваны, ён патрабаваў дысцыпліны і ад падначаленых. Карыстаўся заслужаным аўтарытэтам і павагай сярод супрацоўнікаў райаддзела і насельніцтва, выбіраўся членам бюро РК КПБ і дэпутатам раённага Савета народных дэпутатаў.

Талачынская міліцыя мае багаты вопыт, значна ўмацаваліся яе сувязі з грамадскасцю, вырас аўтарытэт. Яе штат папоўніўся дасведчанымі, кваліфікаванымі кадрамі. 20 з іх сёння з'яўляюцца выдатнікамі міліцыі.

На ахове правапарадку ў Мінску доўгія гады працаваў ураджэнец в. Рыжычы Талачынскага раёна палкоўнік міліцыі А. Ф. Атрошчанка. У апараце МУС БССР працуе удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, палкоўнік міліцыі С. І. Шумскі з в. Парэчча. Выкладчыкам у Мінскай школе міліцыі працуе палкоўнік М. П. Шыпалоў з в. Грачыхі — першы паслявае нны ўчастковы Талачынскага райаддзела міліцыі.

А. Р. Мачахоўскі.

Сталелі рана...

Альберт Фёдаравіч Атрошчанка нарадзіўся 10.2.1929 г. ў в. Рыжычы Талачынскага раёна ў многадзетнай сям'і. Член КПСС з 1953 г. У час вайны быў сувязным атрада імя Фрунзе партызанскай брыгады «Граза». У 1946 г. штатны інструктар Талачынскага РК ЛКСМБ. Праз год па пуцёўцы камсамола накіраваны на ўмацаванне органаў МУС у Мінск. Пасля заканчэння ў 1953 г. Саратаўскай сярэдняй спецшколы начсаставу міліцыі працаваў у крымінальным вышуку г. Мінска. З 1956 г. ў Маскоўскай вышэйшай школе МУС СССР. Пасля вучобы вярнуўся ў Мінск на пасаду намесніка начальніка крымінальнага вышуку. У 1962 г. пераведзены ў апарат МУС БССР. З 1975 г. ў званні палкоўніка выйшаў у адстаўку па стану здароўя.

Падлеткі ваенных гадоў.., На іх худзенькіх, паўгалодных нараўне з дарослымі лёг увесь цяжар ліхалецця вераломнай вайны. Працавалі замест бацькоў на ваенных заводах, аралі, касілі, будавалі, ішлі ў партызаны. Гора, голад, страх пазбавілі іх шмат з таго, што маюць сённяшнія равеснікі. Ранняе сталенне і жыццёвая загартоўка выводзілі, апераджаючы іх узрост, на самую адказную і ня-

лёгкую працу пасля вайны. З іх выйшла пакаленне вельмі самастойных, мэтанакіраваных і неспакойных будаўнікоў мірнага жыцця.

...Калі Алік Атрошчанка ўбачыў аднойчы свайго цёзку і аднагодка Аліка Чарняўскага з аўтаматам сярод партызан, яго ўласная годнасць была моцна закранута, зайздрасць не давала спакою. Гэтыя пачуцці «падагрэў» Косця Раковіч, сказаўшы: «А чым мы горшыя за яго?». У запале двое юных патрыётаў ноччу пайшлі да в. Свідэршчына, заляглі каля шашы з гранатай, якую Алік дастаў у партызан. План быў просты: узарваць варожы матацыкл, забраць зброю і махнуць у партызаны. «Калі будзем са зброяй — не змогуць адмовіць»,— думалі хлапчукі.

Па шашы ішлі і ішлі варожыя калоны і ніводнага матацыкліста. У нейкі момант зусім побач, метрах у 20—30, хлапчукі пачулі рогат і нямецкую мову. Значыць, упякло іх залегчы каля самага варожага «сакрэту». Яны цішком адпаўзлі ад таго месца і вырашылі на наступную ноч зноў ісці «на паляванне». І таксама не пашанцавала — іх напаткалі партызаны, якія ішлі на заданне. Пасмяяліся спачатку з хлапчукоў, а потым сур'ёзна паўшчувалі, што з адной гранатай супраць ворага не ходзяць. А фашыстаў біць і без іх ёсць каму. Так да канца вайны і застаўся Алік сувязным атрада імя Фрунзе партызанскай брыгады «Граза». Рыжычы былі партызанскай вёскай. Народныя мсціўцы размяшчаліся прама ў вёсцы. У хаце Атрошчанкаў было пяць партызан. З імі Алік хадзіў у разведку, быў іх правадніком на чыгунку. Летам 1942 г. ўдзельнічаў у аперацыі па разгроме Азерацкага лесапільнага завода. Дапамагаў і бацьку, сувязному паміж брыгадамі «Граза» і «Чэкіст», выконваць розныя даручэнні. Зімой 1942 г. пасля разведкі хлопчыкам падыходаў да чыгункі паміж Міхайлаўшчынай і Свідэршчынай група партызан брыгады «Чэкіст» ішла ўзрываць цягнік. Вёў іх Алік Атрошчанка. Перад адыходам маці дастала з шафы белы абрус і, прыхаваўшы яго спераду ніткамі, зрабіла сыну маскхалат.

Летам 1943 г. рыхтавалася вызваленне ваеннапалонных каля вёскі Міхайлаўшчына. Юны сувязны перадаваў звесткі ад партызан у лагер ваеннапалонным. У дзень аперацыі Алік са сваімі аднагодкамі Косцем Раковічам, Толікам Снегірэвічам, Генам Ляховічам, Стасем Шведкай таксама атрымалі заданне — вывозіць на конях параненых і аслабелых ваеннапалонных. У той аперацыі Алік выратаваў жыццё ваеннапалоннаму Івану Паддубнаму.

У камсамол Аліка прымалі разам з Косцем Раковічам, Толем Снегірэвічам у сакавіку 1944 г. Сабраліся ноччу на могілках каля роднай вёскі. Рэкамендавалі Аліка Саша Савіцкі і Іван Малашкевіч (загінулі ў блакаду 1944). Варожая страляніна прымусіла спыніць пасяджэнне. Да вызвалення заставаліся лічаныя месяцы. Аднак як цяжка даліся яны — Алік трапіў у блакаду партызанскай зоны. Прасядзеўшы некалькі дзён на балоце ў сцюдзёнай сакавіцкай вадзе, ён захварэў на запаленне. Не ведаў ні вёскі, ні якім чынам апынуўся ў адной бабулі, якая і выхадзіла яго казіным малаком.

25 чэрвеня 1944 года. У гэты апошні перад вызваленнем дзень Алік разам з іншымі хлопцамі атрымаў заданне — не прапусціць у вёску ні аднаго адступаючага фашыста. Партызаны далі падлетку нямецкі кулямёт, другім нумарам быў яго аднагодак Мінька Марцінкевіч. Такога адказнага задання не выпадала за ўсю вайну. Па сутнасці яны ўдвух засталіся абаронцамі роднай вёскі. Гітлераўцы выйшлі на вёску з лесу. Хлапчукі, часта мяняючы пазіцыі, у апошні раз білі па ворагу. Гітлераўцы зноў павярнулі ў лес. Алік прынёс аўтамат забітага фашыста. У сярэдзіне дня хлапчукі ўпершыню за тры гады зноў убачылі савецкія самалёты. Баі ішлі ў паветры і на магістралі. Калі сцішылася, хлапчукі рванулі да шашы. Страшную карціну ўбачылі яны там — усюды ляжалі забітыя і параненыя, уздоўж дарогі стаяла падбітая ваенная тэхніка, невыносна ржалі параненыя коні. У гэты момант на шашы спыніўся савецкі танк. З яго вылез капітан. Перад ім стаяў босы абарваны хлапчук з аўтаматам цераз плячо. «Партызан?» — спытаў капітан. «Як бачыце»,— адказаў Алік. «А чаму босы, вунь колькі варожых ботаў валяецца». «Чужога не трэба»,— быў адказ падлетка. Капітан зняў свае хромавыя боты, працягнуў іх хлапчуку.

У тыя дні Алік з сябрамі па ўласнай ініцыятыве прывялі з шашы 38 коней, сярод іх было дзесяць параненых, якіх яны потым вылечылі. Коней на першым часе схавалі, каб ніхто не забраў — трэба ж было сеяць, а ў вёсцы ніводнай каровы і нават пеўня не было. Ноччу Алік і Мінька пабеглі ў Міхайлаўшчыну, дзе стаяў атрад імя Гастэлы. Партызаны даручылі ім адвесці ў сваю вёску кароў тым, у каго сыны ваявалі на фронце. На наступны вечар уся вёска сабралася ў вялікай хаце бацькі Аліка, Фёдара Сцяпанавіча. Сабраліся, каб адзначыць разам вялікую радасць. Многія бралі слова, але прамоў не атрымалася, усе плакалі. Тады ж выбралі без раённага начальства даваеннага старшыню Ф. С. Атрошчанку ўзнімаць родны калгас «Камінтэрн». Алік замест дзевятага класа пайшоў у пяты. Дзеці хадзілі ў школу гуртам, з ракетніцай, Алік насіў і абрэз — у ля-

сах блукалі аўчаркі, хаваліся паліцэйскія і гітлераўцы. А пасля заняткаў даглядаў коней, іх бераглі асабліва, бо былі яны галоўнай надзеяй на вясну 1945 г. Самі ж і сеялі, прыпыніўшы заняткі ў школе, гэтыя заўчасна пасталелыя хлапчукі, галоўная мужчынская сіла ў вёсцы. А ўначы рабілі ў вёсцы засады — час быў яшчэ ваенны і неспакойны.

У 1946 г., пасля сямі класаў, Алік стаў працаваць няштатным інструктарам Талачынскага райкома камсамола, замацавалі яго за Плоскаўскім сельсаветам. 17-гадовы інструктар рыхтаваў моладзь да ўступлення ў рады ВЛКСМ, дапамагаў стварацъ камсамольскія арганізацыі. Здараліся ў рабоце і кур'ёзныя вышадкі. Як, напрыклад, яго паход у вёску Сакалянку. У вёсцы было шмат моладзі і сярод яе толькі адзін камсамолец, з яго дапамогай і неабходна было стварыць камсамольскую арганізацыю. Па дарозе ў вёску Аліка сустрэлі ваўкі, і інструктару нічога не заставалася, як залезці на дрэва. Колькі б ён там сядзеў — невядома, калі б не ехала ў бок Сакалянкі выселле — жаніўся той самы камсамолец. Хлопцы і знялі інструктара з дрэва. Алік разумеў, што прыход яго ў вёску быў зусім не да часу, заданне райкома зрывалася. Інструктар вырашыў выкарыстаць сітуацыю, каб выканаць даручаную справу. На вясельнай вечарынцы ён расказваў, якім цікавым жыццём жыве камсамольская арганізацыя, што ў Талачыне адбудоўваецца клуб для адпачынку моладзі, ствараюцца розныя гурткі мастацкай самадзейнасці. Назаўтра старшыня калгаса даў каня і Атрошчанка павёз моладзь у райком камсамола. У Талачын дабраліся вечарам, і райком быў ужо зачынены. Інструктар пайшоў па кватэрах, сабраў членаў бюро і сакратароў райкома. Пасля прыёму, у дванаццаць гадзін ночы былі вышсаны камсамольскія білеты сакалянскай моладзі.

Праз год па закліку камсамола Атрошчанка паехаў у Мінск. Вельмі хацелася быць чэкістам, як дваюрадны брат Стась, які быў для яго прыкладам. І быў нямала расчараваны, калі замест формы чэкіста надзеў міліцэйскую. «Калі не чэкіст — тады лётчык!» — рашыў хлопец. Праз тры месяцы ён тайком здаў уступныя экзамены ў Арзамаскую школу грамадзянскай авіяцыі, у аэрапорце атрымаў білет і «пад'ёмныя». Заставалася самае галоўнае — разлічыцца на службе. Праз знаёмую забраў у камендатуры дакументы, павесіў у пакоі мундзір і пакінуў запіску: «Дзякуй за службу. Еду ў Арзамас — краіне таксама патрэбны лётчыкі!». І паехаў у Рыжычы развітацца з бацькамі. У разгар развітальнага застолля пад вокны хаты пад'ехала «Пабеда». З машыны выйшаў дваюрадны брат Стась. «Вось табе мой тост і загад: зараз жа збірайся. За тое, што збег з паста, будзе судзіць трыбунал»,— папярэдзіў Стась.

Так Алік Атрошчанка не стаў лётчыкам. Да трыбунала справа таксама не дайшла, адбылася сур'ёзная размова з В. І. Казловым. Васіль Іванавіч зразумеў няўрымслівы парыў душы былога партызана. «Хочаш вучыцца, быць афіцэрам?» — пытаннем закончыў размову Казлоў. Алік Атрошчанка трапіў у Саратаўскую двухгадовую аператыўную школу МУС. Але вучыцца давялося толькі год — быў адазваны на абавязковую службу ў арміі. Вучоба адкладвалася на цэлыя тры гады, і Атрошчанка напісаў Сталіну аб сваім нецярпенні «хутчэй пачаць змагацца за лепшае жыццё». Адказ быў станоўчы.

1953 год. Восем гадоў людзі жылі і працавалі ў мірнай цішыні, а вайна напамінала аб сабе многім. Яна пакінула разбуральны след не толькі ў народнай гаспадарцы, пакалечыла многія лёсы дарослых і дзяцей. У Мінску перапоўнены дзіцячы прыёмнік-размеркавальнік не паспяваў накіроўваць беспрытульных дзяцей у дзіцячыя дамы і калоніі. На гарышчах, у падвалах дамоў знаходзілі часовы прытулак малалетнія злачынцы, якія сваім уплывам на такіх жа дзяцей-сірот павялічвалі армію злодзеяў, кішэннікаў і г. д. У гэты складаны час Альберт Фёдаравіч вярнуўся ў Мінск, працаваў у групе па барацьбе з непаўналетнімі злачынцамі. Быў ён малады, поўны высакароднага імкнення дапамагчы беспрытульным дзецям знайсці сваё месца ў жыцці, назаўсёды адмовіцца ад былога занятку. Разам са сваімі таварышамі-аднадумцамі працавалі нястомна, з невычэрпнай энергіяй. Праз нейкі час малады работнік міліцыі Атрошчанка перайшоў старшым упаўнаважаным крымінальнага вышуку па барацьбе з цяжкімі злачынствамі, дзе авалодаў майстэрствам аператыўнай работы сярод злачыннага свету. У хуткім часе яго прызначылі начальнікам аддзялення па барацьбе з кішэннымі крадзяжамі і махлярствам гарадскога ўпраўлення міліцыі. 18 яго падначаленых амаль круглыя суткі манеўравалі ў самых людных месцах горада. За адзін год было злоўлена і абясшкоджана больш як 200 злодзеяў. Дзякуючы намаганням міліцыі ў горадзе стала спакойна. За добрасумленную працу ў органах МУС А. Ф. Атрошчанка атрымаў ад міністра ўнутраных спраў імянны гадзіннік.

І зноў вучоба, у Вышэйшай школе МУС СССР. Вярнуўся Альберт Фёдаравіч намеснікам начальніка крымінальнага вышуку. Пасада высокая, аднак за яе не трымаўся. Калі спатрэбілася, пайшоў на меншую і больш цяжкую. У крымінальным вышуку Кастрыч-

ніцкага раёна сталіцы было самае складанае становішча, шмат заблытаных і нераскрытых спраў, самы высокі працэнт злачыннасці. Не мірыцца з такой сітуацыяй на справе для камуніста Атрошчанкі значыла — ісці на гэты ўчастак работы і выправіць становішча. Працавалі кругласутачна, без выхадных. Такога нечалавечага напружання арганізм не вытрымаў. Трапіў у шпіталь. А потым зноў работа. Становішча ў раёне паступова мяняецца.

...У роднай вёсцы Рыжычы і сёння памятаюць сына арганізатара і першага старшыні калгаса — маленькага партызана, бескампраміснага камсамольскага важака, камуніста, жыццё і лёс якога — гэта лёс пэлага пакалення дзяцей вайны.

Ф. І. Кітаева.

Родам з Талачыншчыны

Сярод вядомых землякоў, кім па праву ганарацца талачынцы, партыйныя і савецкія работнікі, праслаўленыя рабочыя, урачы, вучоныя, людзі творчых прафесій — мастакі, паэты, пісьменнікі і журналісты. На зямлі талачынскай яны раслі, убіралі ў сябе ўсё лепшае. Многія з іх у ваенныя ліхалецце яшчэ зусім юнымі сталі на абарону роднай зямлі. У партызанскіх атрадах, на фронце, у тыле крывёю сваёй адстойвалі свабоду вялікай Радзімы.

Пасталеўшы, расправілі свае крылы, высока ўзляцелі над роднай бацькаўшчынай. Праславіўшы родны кут свой высакароднымі справамі і здзяйсненнямі, кожны з іх стаў незабыўным у сэрцы і памяці землякоў.

На быстрыні жыцця

І. І. Рыжыкаў.

Іосіф Іванавіч Рыжыкаў нарадзіўся ў 1893 г. ў в. Рацава Талачынскага раёна.

— У маіх бацькоў,— успамінаў Іосіф Іванавіч,— было 10 дзяцей. Жылі мы ў невялікай прыбудове да панскага хлява, у вечнай нястачы. Калі падрос, стаў пасвіць панскую жывёлу, а потым кулацкіх кароў у Дымаве. Харчаваўся ў іх і мяшок жыта давалі,— вось і ўся плата. Пачатак жыцця нічога добрага не абяцаў. Вельмі ўдзячны я бацьку, які, нягледзячы на беднасць, усё ж паслаў мяне вучыцца ў земскае чатырохгадовае вучылішча. Яно знаходзілася ў Барках, за тры кіламетры ад мястэчка Старасселле. Скончыўшы школу, я зноў парабкаваў. Каля 5 гадоў амаль задарма працаваў на кулака і пана. Бясконца цягнуліся шэрыя дні ў полі, на сенажаці, і яны былі такімі ўшчыльненымі, што нават у чыстае неба паглядзець не было часу. Кінуў я ўсё, развітаўся з роднымі і пайшоў на станцыю Коханава, а потым трапіў у Рыгу.

Там Іосіф Рыжыкаў доўга шукаў работу. Нарэшце ўладкаваўся на Руска-балтыйскі гарбарны завод, потым перайшоў на дрэваапрацоўчы завод «Патэмпа». Тут актыўна дзейнічала бальшавіцкая група. Рыжыкаў выконваў даручэнні падпольшчыкаў, дзень за днём усё больш актыўна ўваходзіў у рэвалюцыйныя справы. Неўзабаве «бунтаўшчыка» звольнілі з работы. Чатыры месяцы перабіваўся Іосіф Іванавіч часовымі заробкамі, хадзіў на разгрузку вугалю, дроў, цэглы.

У 1914 г. Рыжыкава прызвалі ў царскую армію. У Петраградзе яго залічылі курсантам ваеннай школы аўтамабілістаў. А потым упершыню давялося «нюхаць» порах, ваяваць за цара на Заходнім фронце. І. І. Рыжыкаў удзельнічаў у баях пад Перамышлем, Варшавай, Люблінам, Баранавічамі. Каля вёскі Паланечка быў паранены і адпраўлены ў мінскі шпіталь. Тут, у Мінску, сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю.

Пасля шпіталя Іосіф Рыжыкаў падаўся ў Петраград, да стрыечнага брата. У той час горад жыў хвалюючай падзеяй: сюды з эміграцыі вяртаўся У. І. Ленін.

— Трапіць на Фінляндскі вакзал мне не давялося,— успамінаў І. І. Рыжыкаў.— Але двойчы пашчасціла бачыць і слухаць Ільіча. Было гэта, калі ён выступаў на мітынгу ў Ізмайлаўскім палку, і на мітынгу салдат бра-

нявога дывізіёна на Міхайлаўскім манежы. Ніколі не забуду гэтых мінут.

Тады Рыжыкаў, як ніколі раней, адчуў, што не хапае яму палітычных ведаў. І ён прагна чытаў партыйныя газеты, артыкулы Леніна. Стрыечны брат пазнаёміў яго з петраградскімі бальшавікамі, якія дапамагалі яму зразумець сутнасць класавай барацьбы, двоеўладдзя, пераходнага моманту ў развіцці рэвалюцыі. Словы правадыра, бальшавікоў канчаткова вызначылі кірунак думак і дзеянняў І. І. Рыжыкава.

Вярнуўшыся ў сваю часць, якая ў гэты час стаяла ў Смаленску, Іосіф Іванавіч уключыўся ў актыўную прапагандысцкую работу, выступаў на масавых мітынгах супраць вайны, супраць палітыкі Часовага ўрада. 2 жніўня 1917 г. І. І. Рыжыкаву ўручылі партыйны білет. Пасля перамогі Кастрычніка Іосіф Рыжыкаў доўга яшчэ не выпускаў з рук зброі: актыўна змагаўся з контррэвалюцыяй, бандытызмам, спекуляцыяй. Камісар ЧК, начальнік пагранзаставы, старшыня валвыканкома — Рыжыкаў усюды, дзе патрабуецца смеласць, кемлівасць, выключная адданасць рэвалюцыі.

Іосіф Іванавіч заўсёды жыў інтарэсамі і справамі рэспублікі, і партыя клапатліва расціла яго, даверваючы самыя адказныя даручэнні і пасады. У 1920-я гады ён плённа працаваў у партыйных арганізацыях Барысаўскага лесапільнага завода, запалкавай фабрыкі «Бярэзіна», прайшоў шлях ад сакратара партчэйкі завода да сакратара Барысаўскага гаркома партыі. У 1934—1937 гг. ён — член Парткалегіі Камісіі партыйнага кантролю пры ЦК ВКП(б) па БССР, з 1937 г. нарком лясной прамысловасці БССР. З 1939 г. першы сакратар Гродзенскага РК КП(б)Б, нарком прамысловасці будматэрыялаў БССР. Займаючы адказныя пасады ў гэты перыяд, І. І. Рыжыкаў адыграў вялікую ролю ў аднаўленні і развіцці народнай гаспадаркі рэспублікі, у барацьбе за генеральную лінію партыі, за сацыялізм. Ён стойка змагаўся супраць трацкісцка-зіноўеўскага ўхілу, супраць ўсіх, хто перашкаджаў будаўніцтву новага жыцця.

Перад вайной І. І. Рыжыкава выбралі сакратаром ЦК КП(б)Б. Усе сілы і багаты вопыт ён аддаваў эканамічнаму ўмацаванню рэспублікі.

Чэрвеньскім ранкам 1941 г. гітлераўскае нашэсце парушыла вялікія планы мірнага будаўніцтва нашай краіны. Знаходзячыся ў Маскве, І. І. Рыжыкаў узначальваў Заходнюю аператыўную групу ЦК КП(б)Б і актыўна садзейнічаў развіццю партызанскага руху. Калі разгаралася гістарычная бітва на Волзе, ён стаў прадстаўніком Цэнтральнага штаба партызанскага руху на Сталінградскім фронце. У сакавіку 1943 г. І. І. Рыжыкаў прызначаны намеснікам начальніка Беларускага штаба партызанскага руху і членам Ваеннага савета Калінінскага, 1-га Прыбалтыйскага франтоў. Усе, хто сустракаўся з І. І. Рыжыкавым у тыя грозныя дні, запомнілі яго як чалавека ўдумлівага, дзейнага, мужнага, як мудрага партызанскага кіраўніка, якога цікавіла ўсё — ад тэмпературы ў партызанскіх зямлянках да становішча на франтах. І. І. Рыжыкаў у цяжкія для партызанскай зоны дні блакады вялікую ўвагу аддаваў каардынацыі дзеянняў брыгад, вызначаўся настойлівасцю ў правядзенні аператыўных мераприемстваў, рабіў усё для таго, каб узмацніць удары па ворагу.

Пасля вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў І. І. Рыжыкаў быў прызначаны міністрам жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва БССР. Толькі той, хто бачыў, што ўяўлялі сабой Мінск, Віцебск, Магілёў і Бабруйск, дзесяткі іншых беларускіх гарадоў і пасёлкаў пасля выгнання акупантаў, можа зразумець, якія сілы і здольнасці патрабаваліся ад першага арганізатара аднаўленчых работ. І ў тым, як хутка аднаўляўся жыллёвы фонд і якімі за пасляваенныя гады сталі нашы гарады, ёсць і яго вялікая заслуга. З 1953 г. І. І. Рыжыкаў — першы намеснік міністра жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва БССР, у 1958—1959 гг. намеснік міністра будаўніцтва БССР. І. І. Рыжыкаў выбіраўся кандыдатам у члены ЦК КПБ у 1932—1934 гг., 1954—1960 гг., членам ЦК КПБ у 1929—1930 гг., 1934—1938 гг., 1952—1954 гг., членам Рэвізійнай камісіі КП(б)Б у 1949—1952 гг., членам ЦВК БССР у 1931—1935 гг. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1959 гг.

Партыя і Савецкі ўрад высока ацанілі заслугі І. І. Рыжыкава, узнагародзіўшы яго 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 3 іншымі ордэнамі і медалямі. Памёр І. І. Рыжыкаў у 1979 г. Ён быў чалавекам крыштальнай чысціні, усё жыццё якога было звязана з партыяй і народам.

Э. А. Карнілovіч.

Якасць сэрца чалавечага

Яўген Іванавіч Клімчанка нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Лагаўшчына Талачынскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1966), заслужаны работнік прамысловасці БССР (1974), заслужаны настаўнік рабочай моладзі (1978). Член КПСС з 1944 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1949 г. сле-

сар-інструментальшчык на Мінскім трактарным заводзе. Член ЦК КПСС з 1976. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1970—1974 гг.

У кожным вялікім калектыве ёсць людзі, якія найбольш поўна ўвабралі ў сябе моц і мудрасць народа, якія ўсебакова раскрылі свой талент працаўніка і грамадзяніна і выклікаюць у кожнага пачуццё глыбокай павагі і ўдзячнасці. Сярод мінскіх трактарабудаўнікоў такім з'яўляецца наватар вытворчасці слесар-інструментальшчык Яўген Іванавіч Клімчанка.

Я. І. Клімчанка.

Сям'я Клімчанкаў была многадзетная. Бацька Іван Данілавіч памёр рана. Лёс трох сыноў і чатырох дачок цяпер цалкам залежаў ад маці і ад іх саміх. Мара аб ведах, якая перадалася ад бацькі і якая магла здзейсніцца, падбадзёрвала, прымушала старацца. Яўген пайшоў у школу за 3 кіламетры, у Зубава. Пасля заняткаў, падрыхтаваўшы ўрокі, дапамагаў дома па гаспадарцы. Маці, руплівая гаспадыня, знаходзіла справу кожнаму. Большыя з раніцы ішлі на калгасную працу, а меншым хапала спраў дома. Жэню маці даручала насекчы дроў, прынесці вады, накапаць бульбы. І нярэдка здаралася, што яго пасылалі ў лес назбіраць суніц, малін ці грыбоў, якія павінны былі папоўніць сціплыя запасы ежы. Лес вабіў Яўгена таямнічасцю і харавством. Сядзе, бывала, па пянёк і прыслухоўваецца, як звонка пяюць лясныя птахі. Прыемны ўспамін аб лесе, школе застаўся на ўсё жыццё. Але больш за ўсё Яўген Іванавіч удзячны бацькам за тое, што яны з маленства прывучылі яго да фізічнай працы, якая стала моцнай асновай яго духоўнага і палітычнага ўзмужнення. Калі праца не прымус, а душэўная патрэбнасць, тады працуецца весела, лёгка, творча. І толькі такая праца ўсебакова раскрывае прыродныя здольнасці і маральныя якасці чалавека. Гэта Яўген Клімчанка яшчэ больш зразумеў, калі ў 1949 годзе прыйшоў на трактарны завод, які яшчэ будаваўся. І армейская служба, і школа ФЗН, і нялёгкае дзяцінства выхавалі працавітасць і ўпартасць, але ўсяго гэтага было недастаткова, калі юнак трапіў у новы інструментальны цэх. Завод рыхтаваўся выпусціць першы «КД-35», і Клімчанку было даручана рыхтаваць інструмент для выпуску будучага трактара. Трэба было хутчэй авалодаць тонкай, даволі рэдкай на той час спецыяльнасцю слесара-інструментальшчыка ды так, каб выканаць заданне любой складанасці, каб пад любую інжынерную канструкцыю падрыхтаваць новы інструмент. Гэтага патрабавалі аб'ектыўныя неабходнасці прадпрыемства, якое толькі нараджалася, гэтага чакалі людзі, якія не маглі працаваць без прыстасаванняў. Я. І. Клімчанка, забыўшы пра час і змарнасць, вучыўся і працаваў, працаваў і вучыўся. Ад простых шаблонаў і прэс-форм ён паступова пераходзіў да больш складаных вымяральных інструментаў. А пошук канструктарскай думкі быў бясконцым. Інжынеры шукалі новыя рашэнні, штосьці мянялі, дапрацоўвалі, удасканальвалі. Пройдзены доўгі і цяжкі шлях ад пачаткоўца да «МТЗ-80». Гэта мадэль прызнана лепшым трактарам 1975 года. У Амерыцы, на Брытанскіх астравах мінскі трактар стаў сапраўднай сенсацыяй. Яго ахвотна купляюць зараз замежныя фірмы і фермеры 70 краін свету.

Нялёгкімі шляхамі творчага пошуку ішоў Яўген Іванавіч, кваліфікацыя якога дасягнула ўзроўню інжынера. У працы яшчэ больш загартаваліся яго характар і воля, упартасць і вытрымка. У працы выяўляліся і ўзбагачаліся яго творчыя здольнасці, расло майстэрства, прафесійная культура.

Усе ведаюць, якія б інструменты ні зрабіў Клімчанка, яны будуць найвышэйшай якасці і надзейнасці, а некаторыя — арыгінальныя ў тэхналагічным вырашэнні. Вось чаму яго прадукцыя неаднаразова экспанавалася на Усесаюзнай ВДНГ, а за асобныя інструменты ён узнагароджаны сярэбраным і бронзавым медалямі ВДНГ. Яму пад сілу адшліфаваць дэталь з дакладнасцю да мікрона. Ён змог арганізаваць на сваім заводзе службу наладкі прыбораў, якая раней выконвалася ленінградскімі і маскоўскімі спецыялістамі, выправіў непаладкі універсальнага оптыка-механічнага прыбора замежнай фірмы. Словам, Я. І. Клімчанка — гэта цэлая школа прафесійнага майстэрства, яркі прыклад працоўнай доблесці і ўсебаковага творчага развіцця асобы. Але ён разумее, што, якіх бы поспехаў ні дасягнуў чалавек, гэта яшчэ не ўсё. Уздзеянне на людзей, узбагачэнне іх перадавым вопытам — вось аснова поспеху. Я. І. Клімчанка падрыхтаваў больш за 40 вучняў, якія пра-

цуюць зараз у розных калектывах (у Гомелі, Віцебску, Жодзіне, Паўладары і іншых гарадах краіны), з'яўляецца намеснікам старшыні рэспубліканскага савета настаўнікаў. Увесь сэнс яго жыцця — дзеянне, актыўнае, мэтанакіраванае, высакароднае: бездакорна творча працаваць, удасканальваць вытворчы працэс, вучыць маладых, рабіць людзям дабро, не спыняцца на дасягнутым. Як дэпутат Мінскага гарсавета, Яўген Іванавіч, вывучыўшы прапановы выбаршчыкаў, абгрунтаваў і даказаў плануючым органам, што Заводскаму раёну Мінска не хапае магазінаў. У хуткім часе быў пабудаваны універмаг «Беларусь». Як члену парткома завода яму стала вядома, што многія рабочыя скардзяцца на дрэнную арганізацыю адпачынку. І Клімчанка дамогся выдзялення плошчы для новай зоны адпачынку...

Я. І. Клімчанка ўдумліва асэнсоўвае партыйныя рашэнні і тыя задачы, якія намеціла партыя па сацыяльна-эканамічнаму пераўтварэнню ў нашай краіне.

— Зараз, калі ідзе карэнная перабудова ва ўсіх сферах жыцця,— дзеліцца думкамі Яўген Іванавіч,— непамерна павялічваецца роля кожнага чалавека ў стваральнай працы, у выкрыцці недахопаў і маральным выхаванні. На першым плане стаяць такія паняцці, як чалавечы фактар, узбагачэнне ведамі, рабочае сумленне. Калі чалавек сумленна працуе, то і яго прадукцыя будзе самай высокай якасці, яго праца будзе выяўленнем уласнай душэўнай прыгажосці... *Э. А. Карніловіч.*

Высокі талент

М. А. Савіцкі.

Міхаіл Андрэевіч Савіцкі нарадзіўся 18.2.1922 г. ў в. Звянячы Талачынскага р-на. Беларускі савецкі жывапісец, народны мастак СССР (1978), народны мастак БССР (1972), правадзейны член АМ СССР (1983). Скончыў мастацкі інстытут імя В. І. Сурыкава ў Маскве (1957). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працуе ў станковым і манументальным жывапісе. У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1957 г. Дзяржаўная прэмія СССР 1973, Дзяржаўныя прэміі БССР 1970 і 1980 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1975 г. Ганаровы член Саюза мастакоў ГДР (1973). Пра М. А. Савіцкага створаны дакументальны фільм «Апаленая памяць» («Беларусьфільм», 1974, сцэнарый Г. Бураўкіна, рэжысёр А. Канеўскі).

Імклівы, трывожны і велічны бег часу. За мноствам падзей, штодзённых напружаных клопатаў не заўсёды відаць вялікая бітва за захаванне памяці пра мінулае, за абуджэнне таго сапраўды чалавечага, чым узнагародзіла нас прырода — здольнасці любіць і суперажываць, за мудрасць сумлення, якое аб'ядноўваючы сэрца і розум, вызначае наша жыццёвае крэда. Мы павінны ведаць тых, хто сваім высокім талентам адкрывае крыніцы сапраўды чалавечага, дорыць нам адчуванне велічы і непераможнасці жыцця. Міхаіл Андрэевіч Савіцкі — адзін з такіх людзей, мастак вялікага таленту, незвычайны чалавек нашага часу. У яго творах адлюстраваны гісторыя, кожны крок якой даваўся напружаннем сіл і самаахвярнасцю, 20 ст. з яго неверагоднай жорсткасцю і мужнасцю, праца простых і сумленных людзей.

У 1960-я гады адной з тэндэнцый развіцця савецкага жывапісу было дасягненне выразнасці вобраза не выяўленчым пераказам сюжэтаў, а з дапамогай спецыфічных сродкаў самога жывапісу (колер, сілуэт, рытм, пластыка, прастора). Творчы почырк М. А. Савіцкага фарміраваўся на хвалі гэтага наватарскага руху.

Пасля першых карцін «Песня» (1957) і «Гонар абавязку» (1958) мастак даследаваў выразныя магчымасці рытму і сілуэта, пластыкі і колеру, прынцыпы кампазіцыйнай арганізацыі палатна дзеля найбольш дакладнага ўвасаблення мастацкай задумы. Гэта выявілася ў карцінах «Абавязацельства» (1960), «Ільнаводы», «Сцелюць лён», «На бульбяным полі» (усе 1962).

У пачатку 1960-х гадоў М. А. Савіцкі пачаў працаваць над асабліва блізкай беларускаму народу тэмай гераічнай партызанскай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Цыкл, які ўключае палотны «Партызаны» (1963), «Віцебскія вароты», «Аршанскія партызаны», «Партызаны. Блакада» (усе 1967), «Пакаранне смерцю» (1968), «Клятва» (1969), «Камсамольцы» (1970), «Дзеці вайны», «Бежанцы», «Маці партызана», «Забойства сям'і партызана» (усе 1972), «Поле» і «Плач па загінуўшых героях» (1974) і інш.— яркі летапіс гераічных здзяйсненняў і траге-

дый часу. За вобразамі асобных людзей і іх дзеяннямі паўстае вялікі і няскораны народ. Асобныя палотны гэтага цыкла гранічна выяўляюць трагічнае. У карціне «Партызаны. Блакада» мастак ставіць герояў у адно з самых жорсткіх становішчаў — партызаны хаваюць дзяцей, апускаюць у магілу лялечна зацвярдзелыя спавітыя ў белае фігуркі... Так было на Беларусі, у блакадным Ленінградзе. Мастак нібыта ўтрымлівае на палатне невыносную тэмпературу чалавечага болю. І ў паказе гэтай здольнасці чалавека вынесці найвялікшыя пакуты заключаны гуманістычны сэнс карціны. Гэтыя творы — рэквіем загінуўшым героям і адначасова гімн патрыятызму савецкіх людзей — сапраўды гераічны эпас беларускага народа. Арганічны яго працяг — палотны «Памяці камуністаў-падпольшчыкаў», «Ідзе ў ноч» (абодва 1980), «Клятва севастопальцаў» (1985).

Асобнае месца ў творчасці Савіцкага займае вобраз «партызанскай мадонны» — сімвалічная персаніфікацыя вобраза рэспублікі-партызанкі і разам з тым узвасабленне ідэі вечнасці жыцця на зямлі [карціны «Партызанская мадонна», 1967 і «Партызанская мадонна (Мінская)», 1978]. У іх створаны вобраз маладой маці, поўны надзеі, спачування, цярплівасці. Карціны розныя па фармату, кампазіцыі, па эмацыянальнаму стану. Першая мадонна зачароўвае стрыманасцю пачуццяў, выражэннем мужнага смутку, другая — незвычайнай адкрытасцю, у якой адчуваецца радасць. У кожным палатне свой ідэал, сімвал дудоўнага і добрага мастак сцвярджае з такой эстэтычнай актыўнасцю, што ён набывае значэнне безумоўнага патрабавання да ўсіх нас — мець менавіта такой вышыні ідэал, такой дасканаласці ўзор. Узвасабленне ў вобразах жанчын тэмы вечнасці прыроды, прадаўжэння жыцця, мудрасці чалавечага быцця развіваецца ў палатне «Куст руж» (1974).

Важнае месца ў творчасці Савіцкага займае тэма працы, непарыўна звязаная з ваеннай тэмай значнасцю і ёмістасцю вобразаў — рабочых і працаўнікоў вёскі, людзей моцных духам, гордых і мужных. Глыбокая, сардэчная прыхільнасць у Міхаіла Андрэевіча да простых і сумленных людзей, у іх — і яго сумленне. Іх сціплую годнасць, усведамленне якой робіць чалавека велічным і значным, мастак больш за ўсё цэніць у чалавеку. Таму будзённыя сцэны ў карцінах Савіцкага не здаюцца бытавымі. Глыбіня вобразнай думкі ўзнімае іх над штодзённасцю, робіць мудрымі і паэтычнымі. Асаблівы сэнс у творах мае для Савіцкага вобраз Зямлі-Маці, карміцелькі. Аб ёй нагадвае і аблічча персанажаў у карцінах «Ураджай» (1966), «Хлябы» і «Рабочыя» (1968), «У полі» (1972), «Збожжа» (1975), «Хлеб новага ўраджаю» (1979), «Сказ пра хлеб» (1980) — іх навярэджаныя рукі, сялянскія загарэлыя твары, моцны склад. Ралля, хлебныя вівы або восеньскі ржэўнік часцей за ўсё напісаны цёплымі, сонечна-залацістымі колерамі. Зямля — гэта ўвасабленне асноў народнага жыцця, дабра, якое даражэй за золата. Звычайна і герояў сваіх мастак таксама піша фарбамі, блізкімі да зямных,— адценнямі таго ж золата. Сімвалам працы і народнай этыкі, якая дыктуе самыя ашчадныя і клапатлівыя да яго адносіны, глядзіцца хлеб у карцінах Савіцкага. Ад выпечаных боханаў, намаляваных на многіх палотнах жывапісца, быццам зыходзіць благаслаўленне матчыных рук, якія вырасцілі яго і падарылі кожнаму.

Па-свойму пераасэнсаваны Савіцкім прынцыпы стварэння гісторыка-рэвалюцыйнай карціны. Палотны «30 жніўня 1918 года» (1972), «Першыя дэкрэты» (1977), «Ваенна-рэвалюцыйны партыйны цэнтр» (1980) — прыклад гістарычна дакладнай і разам з тым эмацыянальнай трактоўкі рэвалюцыйных падзей. Асабліва яркай сімволікай вылучаецца карціна «Аднадушнасць» (1970). Сюжэт карціны — палымяннае выступленне У. І. Леніна перад народам пасля падпісання першых дэкрэтаў Савецкай улады. Уладзімір Ільіч паказаны аратарам, увасабленнем рэвалюцыйнай думкі. Вакол яго — лес рук. Змарнаваныя найной, галечай, голадам і рабствам людзі ўсёй істотай галасуюць за мір, за народную ўладу. Гэты ўмоўны прыём дае нагляднасць успрыняцця думкі аб вялікай моцы ленінскіх ідэй. Актыўнасць чырвонага, сіняга, карычневага і белага колераў, экспрэсіўная дынаміка рухаў — усе выяўленчыя сродкі накіраваны на паказ згуртаванасці людзей у нястрымным, як прыродная стыхія, парыве. Мова карціны сімвалічная. Чырвоны сцяг рэвалюцыі вянчае фігуру Леніна. Узнятая ў закліку рука Ільіча пададзена на фоне ўзыходзячага над старым светам сонца. Мастак выкарыстоўвае прыёмы мантажнай пабудовы, якія парушаюць акадэмічныя прынцыпы лінейнай і паветранай перспектывы, але расшыраюць сэнс і значэнне падзеі да велізарных маштабаў. Выявы ў фоне сімвалізуюць тры асноўныя гістарычныя сілы рэвалюцыі: зняволены ў турму капіталізму пралетарыят (стары завод у цэнтры), паўстаўшае сялянства (фігура злева), а таксама салдаты царскай арміі, якія кідаюць зброю і пераходзяць на бок працоўнага народа. Калі ўважліва прыгледзецца да кожнага персанажа карціны, можна ўбачыць, што натоўп шматаблічны. У агульнай псіхалагічнай экспрэсіі мноства адценняў: павольнае разважанне і суровая замкнёнасць, і гнеўны

смутак, і мужная рашучасць, і надзея... Гэтыя творы, а таксама серыя партрэтаў У. І. Леніна (1972—76) — значны ўклад М. А. Савіцкага ў беларускую мастацкую Ленініяну.

Тэму рэвалюцыйнай гісторыі і станаўлення беларускай нацыянальнай культуры, пачатую палотнамі «Сейбіты» (1972) і «Віленскія сустрэчы» (1976), развівае цыкл карцін для Літаратурнага музея Янкі Купалы ў Мінску («Янка Купала», «Беларусы», «Камунары», «Партызаны», «Мужыкі», «Жніво», «На пакосе» і інш., 1979—81). Жывапіснае ўвасабленне паэзіі Купалы гучыць гімнам беларускаму народу. Творы гэтага цыкла адметныя актыўным разгортваннем прасторы ўглыбіню, свабоднай пластычнасцю фігур персанажаў.

Мудрасць майстэрства — галоўнае ў творчым абліччы Міхаіла Андрэевіча Савіцкага. Гэта мудрасць і гэта майстэрства не маглі, безумоўна, прыйсці адразу. Яны — вынік пройдзенага жыццёвага шляху. І шлях да мастацтва пралёг праз вялікія выпрабаванні. А пачынаўся ён, як і ў кожнага — з дзяцінства.

Паглыбляючыся ў свае ўспаміны, мастак гаворыць палымяна і проста, нетаропка і дакладна падбіраючы словы. Характар яго гаворкі заўсёды падкрэслівае каштоўнасць сказанага.

— Гавораць, мой прадзед жыў у цёмным лесе. Таму яго называлі Савой. А ўсе яго патомкі зваліся Савінічамі. Так, пэўна, з гэтага і пайшло маё прозвішча. Дзед 25 гадоў адслужыў у салдатах. Быў удзельнікам рускатурэцкай вайны і баёў на Шыпцы. Бацька з малых год працаваў рамонтнікам па чыгунцы. Калі ажаніўся, купіў дом у Звянячах. Маленькая гэта была вёсачка. Уся ў садах. На вечарах — з канца ў канец гуляянне. Дома ніхто не сядзеў. Галасістыя ўсе. Вёска звінела песнямі. Таму, відаць, і Звянячы.

Бацьку, Андрэя Пятровіча, у вёсцы паважалі як чалавека майстравога. І я, колькі сябе памятаю, заўсёды быў пры бацьку. Вельмі любіў пах свежых стружак. Сядзіш, бывала, у кучы стружак — толькі галава тырчыць. Крыху падрос — бацька і мне пачаў даручаць розную работу. Суровы быў. Позірк горды і нейкая сіла ў ім адчувалася. У карціне «Пакаранне» ёсць сівавалосы стары. Бацька — яго прататып. А партрэты бацькі і маці, як уяўляюцца яны мне цяпер, я напісаў не так даўно.

Маці, Ганна Канстанцінаўна, цудоўная была майстрыха. Прала і ткала, была вялікай выдумшчыцай на арнаменты. А шыла задарма — абы заказвалі. Вясной, як усе жанчыны ў вёсцы, маці выходзіла адбельваць палатно. Як зараз бачу — зялёны яркі лужок, увесь засцелены льняными дарожкамі. А я бегаю прыскокам па гэтых дарожках. Нечуваная радасць ахоплівала мяне. І я шмат маляваў карцінак, як беляць лён. Ды вось і цяпер напісаў «Адбельванне лёну». Усё гэта памяць дзяцінства. Памяць аб той радасці.

Добра памятаю бабку сваю па бацьку. Яе ў вёсцы пабойваліся. Такая была, што магла зняшчыць словам. Высокая, хударлявая, вочы чорныя — на цыганку падобная. У карціне «Хлябы» старая з боханам хлеба — гэта яна і ёсць.

Я заўсёды марыў стаць мастаком, хоць выразна ўяўляў гэту прафесію. Кніг па мастацтве ў вёсцы тады не мелі. Ды й мастакоў ніхто не бачыў. Вось толькі калі гаварыць пра народную творчасць, дык сярод яе я і вырас. Ад яе ўзніклі мае першыя эстэтычныя ўяўленні.

Калгас у нас арганізавалі ў 1929 годзе. Уся вёска адразу ўступіла. Класавых ворагаў не знайшлося. І зажылі ўсе па-новаму. Дзейнічала камсамольская ячэйка. Іван, Аляксей, Уладзімір — мае старэйшыя браты — з галавой акунуліся ў камсамольскую работу. Хлопцы асабліва захапляліся стральбой і радыёсправай.

У нашым доме знаходзілася праўленне калгаса. Я з маленства прымаў удзел у агульных справах. У пяць гадоў ужо добра чытаў, з сямі рысаваў у насценнай газеце. І выявілася, што памяць мела нейкую асаблівую ўласцівасць: прачытаю старонку любога тэксту — і адразу магу паўтарыць напамяць. Вочы нібыта фатаграфавалі старонку. Гэта здольнасць, безумоўна, вельмі спатрэбілася. На калгасных сходах пераказваў артыкулы з газет. Іншы раз чытаў Пушкіна або Коласа. Ніхто не перапыняў — дэкламаваў, колькі часу хапала. Шмат пазней зразумеў, наколькі важная зрокавая памяць для мастака. Хоць пасля вайны яна ўжо не была такой фенаменальнай, але вельмі дапамагла вучыцца і ў мастацкім вучылішчы, і ў інстытуце. І да гэтай пары я не пішу з натуры, бо гляджу і запамінаю ўсё, што мне трэба.

Я любіў фізіку, матэматыку і ўсякае вынаходніцтва. Больш за ўсё любіў рабіць патрэбныя рэчы. Напрыклад, сцізорыкі са старых сярпоў. Але ўсё ж марыў паступіць у мастацкую вышэйшую навучальную ўстанову. Аднак жыццё распарадзілася па-свойму. У верасні 1940 года выклікалі ў ваенкамат. Выехаў у той жа дзень. Сябар мой, Іван Савініч, таксама ішоў у армію. Пасядзелі мы з ім на развітанне і так ужо болей і не сустрэліся. Ён загінуў 9 мая 1945 г. ў Берліне. Старэйшых братоў маіх таксама вайна забрала. Вельмі многа моладзі з нашай вёскі не вярнулася з вайны.

Але тады будучыня бачылася мне ў свет-

лых тонах. І я не ведаў, што ў дзень ад'езду ў армію пазаўсёды зачыніліся дзверы майго шчаслівага дзяцінства. Скончылася спакойнае жыццё нашай вёскі і нашай вялікай сям'і. Усё змяла вайна. У нашых краях было спалена, закатавана каля тысячы чалавек. І свая Хатынь вядома ў Талачынскім раёне — вёска Рыдамля. І голад, і блакаду перажылі мае аднавяскоўцы. Але была ў нас партызанская зона і адзін з ачагоў рэйкавай вайны. Тут жа нашы войскі акружылі і ўзялі ў палон значную варожую групоўку.

Усё гэта мне стала вядома пасля вайны. Я ўбачыў на тварах людзей яе жорсткі адбітак. І зразумеў, што калі накапавана мне стаць мастаком, мой абавязак сказаць пра гэтых людзей, пра свой народ. Так і атрымалася. І вобразы, і тыпажы карцін да мяне прыходзяць з тых мясцін, дзе я вырас, дзе ўвабраў у сябе першыя паняцці аб добрым, светлым, праўдзівым. І яны захаваліся на ўсё жыццё.

Гэтыя светлыя вобразы ў маёй свядомасці ўмацавала баявое брацтва севастопальцаў, праверанае за 250 дзён і начэй абароны. Камуніст Калепцьеў з Астрахані, Жданаў з Куйбышава — ім і ўсім тады загінуўшым прысвечана карціна «Клятва севастопальцаў».

...Калі фашысты прарваліся ў горад, каля тысячы салдат адышлі на ўскраіну, да херсанескага маяка і там пратрымаліся яшчэ чацвёра сутак. Калі патроны скончыліся, хто застаўся ў жывых, трапіў у палон. Сімферопальская турма, Нікалаеў... Спрабаваў уцячы. Першы раз мяне схапілі ў той жа дзень, другі — прайшоў кіламетраў дваццаць, але нарваўся на паліцаяў.

Эшалон з палоннымі прыбыў у Германію, «Шталаг-326» — так значыўся гэты лагер. Яго рэжым не ўступаў тым лагерам смерці, у якіх мне неўзабаве давялося быць. З гэтага шталагу я трапіў у Дзюсельдорф на вагонабудаўнічы завод. Там паступова арганізавалася антыфашысцкая група. Арганізатарам дыверсійнай работы стаў Георгій Іванавіч Карнілаў. Перакананы камуніст, з 1920 года ў партыі, ён карыстаўся вялікім аўтарытэтам як чалавек смелы, гатовы пайсці на рызыку. Дарэчы, Карнілаў — адзін з герояў аповесці Льва Касіля «Вуліца малодшага сына». Ён быў камісарам атрада, што дзейнічаў у керчанскіх катакомбах. У канцлагеры я стаў яго першым памочнікам. Працуючы пасля нядоўгага абучэння ў брыгадзе электразваршчыкаў, рабіў зварку пепадзейнай, петрывалай. Такія вагоны не вытрымлівалі звычайна і аднаго перагону. Доўга працягвацца гэта не магло. Нас высачылі. І выйсце ў нас было адно — уцякаць. Абставіны спачатку складваліся ўдала. Дабраліся да гарадка Гільдэн, а потым вырашылі паспрабаваць шчасця — пераправіцца ў Францыю. Вельмі дапамагла нам тады адна полька. Яна хавала нас у сваім доме, дастала недзе для нас адзенне. Мы дасягнулі Бельгіі, калі нечым прыцягнулі ўвагу ваеннага патруля. Нас схапілі. Пасля ночы, праведзенай у турэмным склепе сярод знясіленых і хворых людзей, нам удалося зноў уцячы, разабраўшы цэглу, якой было замуравана акно. Ведаючы, што нас шукаюць, павярнулі на ўсход, да Гільдэна, спадзяваліся, што ў гэтым напрамку патрулі не настолькі пільныя. Але гестапаўцы з'явіліся ў Гільдэн рапей за нас...

У Дзюсельдорфскай турме дапытвалі па-гестапаўску. Надзелі «бранзалеты» і адправілі ў камеру смертнікаў. Потым — Бухенвальд.

Гэта цэлая сістэма лагераў. Упамінанне пра адзін з іх прыводзіла зняволеных у жах. Яго называлі «Крывінкі». Мяне, прызначанага да пажыццёвага ўтрымання на катаржных работах, адправілі туды. Там перш за ўсё кінулася ў вочы велізарная колькасць крыважэрных сабак. Разарванне людзей сабакамі — а такое пакаранне адбывалася тут шмат разоў за дзень — страшэнна дзейнічала на псіхіку. Лагер налічваў 10—15 тысяч чалавек. А смяротнасць была рэкордная. У каменяломнях спецыяльна не ставілася мацаванняў. Штодзённыя абвалы засыпалі цэлыя змены. У пачатку 1945 года «Крывінкі» ліквідавалі, а вязняў, што засталіся ў жывых — каля тысячы чалавек — загналі ў адзін барак.

Спаў я на чацвёртым ярусе нар, ля акенца пад дахам. Звычайна, калі ўрываліся эсэсаўцы і збівалі дубінкамі людзей (гэта было аагадам выходзіць і строіцца), каля ўваходу ў барак узнікала таўкатня. Мне прыходзілася вылазіць на дах і адтуль падаць на зямлю. У той дзень, прадчуваючы расправу, хацеў схавацца. Але наш барак акружыла канцлагерная паліцыя. Прарвацца не ўдалося. І стала ясна — кальцавы марш у крэматорскі двор. Гэты двор квадратны, невялікі. Апошніх туды літаральна заціснулі брамай.

...Я прысеў. Адчуванне рэальнасці таго, што адбывалася, знікла. І ва ўяўленні маім узнікла пранізліва яркая карціна: пакаты схіл поля насупраць нашай хаты, сонейка яшчэ не ўзышло. Прабіваюцца з-за пагорка толькі першыя яго промні. У гэты час маці будзіла, каб пасвіць кароў. І вось я на схіле ў кажушку да калень. Апякаючы холад раніцяй расы. Цягнуцца дзве ярка-зялёныя паласы — след мой і каровы...

Ачуняў я ад гэтага дзіўнага здранцвення ўжо за агароджай. Эсэсаўцы адлічылі чалавек сто вязняў і далучылі іх да вялікай калоны. Пачалася эвакуацыя. І каго не паспелі зні-

шчыць тут, адпраўлялі ў Дахаў. Аднак пераезд падаваў надзею...

Я неяк выменяў на пайку хлеба ножык з пілкай замест ляза. Ведаючы канструкцыю вагона, лежачы прапілоўваў адтуліну. Гэта заняло амаль двое сутак. Уцякаць вырашылі па жэрабю. На хаду, ноччу. З сарака чалавек, якія знаходзіліся ў нашым адсеку вагона, удалося спусціць у гэту адтуліну дваццаць два. Мне жэрабя не выпала.

Раніцай, на стаянцы, калі ўсё выявілася, нас збівалі камянямі. Потым змясцілі ў вагон-кардар над сетку з калючага дроту. Без вады і ежы. А цягнуўся гэты этап 21 суткі...

Як прыбылі ў Дахаў, нас згрузілі ў тыфозны барак канцлагернага «лазарэта», дзе нішто не замінала нам паміраць.

Але раптам з'явіліся людзі ў незнаёмай ваеннай форме, карэспандэнты. Ззялі ўспышкі бліцаў, шчоўкалі фотаапараты. Кадры, зазнятыя тады ў Дахаў або падобныя на іх, мы і бачым зараз у дакументальных стужках, якія асуджаюць фашызм. Я ляжаў у непрытомнасці і не змог есці свіную тушонку, якую расставілі паміж ляжачымі. Гэта мяне выратавала. Ачнуўся ад страшэннага крыку. Вакол курчыліся людзі-шкілеты. Такім было маё вызваленне...

Карнілава адправілі ў Дахаў другім эшалонам. Яму ўдалося выскачыць у акно на хаду поезда. Яго падабралі і выратавалі чэхі. Стараўся яго адшукаць. А ў 1974 годзе ён мяне знайшоў — прыслаў пісьмо на Саюз мастакоў. Часта, маўляў, бачу рэпрадукцыі з карцін Савіцкага. Падумаў, ці не той гэта Савіцкі. Я ездзіў да Георгія Іванавіча ў Туапсе.

...Мне часта задаюць пытанне аб самаадчуванні чалавека ў неверагодных умовах канцлагера. Тым, хто не перажыў гэтага, неверагодна і ўявіць сабе гэты вынаходліва прадуманы і добра адладжаны механізм па знішчэнні людзей. Стан быў вельмі дзіўны. Пачуццё небяспекі абвострана гранічна. Увесь арганізм быў у напружанні, напагатове.

Ва мне з дзяцінства закладзены запас трываласці, вынослівасць. Але ведаю дакладна: я не выжыў бы без веры. Без найглыбейшай упэўненасці ў справядлівасць нашай справы. Нішто не магло пераканаць нас, што фашызм раптам запануе на зямлі.

Я быў у масе людзей. Быў адзін з гэтай масы ў неверагоднай канцэнтрацыі розных нацыянальнасцей, лёсаў, характараў... І ў гэтай масе, перад наяўнасцю смерці, як ніколі ярка высвецілася ўся шкала чалавечых паводзін — ад здрадніцтва да самаахвяравання. У нас існаваў няпісаны закон — думай не пра тое, як выратавацца самому, а як выратаваць таварыша. І гэты закон дапамагаў не звар'яцець, не «пайсці на дрот», захаваць у сабе чалавечае...

Чалавек заўсёды хоча прыйсці да вывадаў, заснаваных на ўласным вопыце. І я зрабіў гэты вывад. Знішчаючы людзей фізічна, нацысты хацелі даказаць, што чалавек — гэта нікчэмнасць, цвіль, поскудзь. Але ж існуе непадуладная ні цемрашальству, ні самой смерці — чалавечая годнасць, сіла духу. І я зразумеў, якая ж гэта вялікая сіла, калі нават пякельная машына фашызму не здолела раструшчыць яе!

Вось чаму я веру ў перамогу добрага на нашай планеце. Веру, таму што крайнія, абсалютныя па трагізму і жорсткасці калізіі пераканалі мяне ў каштоўнасці чалавека, у высакароднасці яго душы і розуму. Можа, нехта скажа, што фашызм — гісторыя. І ці трэба напамінаць аб ёй? Але і зараз імперыялізм выкормлівае чалавеканенавісніцкую ідэалогію ў розных варыянтах і відах. Як іржа яна паражае свядомасць, перш за ўсё моладзі. Сама атмасфера нашага часу выклікае вялікую трывогу. Мне давялося быць сведкам жудасных злачынстваў супраць чалавецтва. І гаварыць пра іх не толькі не позна, але неабходна і цяпер. Таму я напісаў серыю карцін, каб у абагульненых вобразах паказаць тое, што цяжка пачэрпнуць з дакументаў або слоўных апісанняў...

Толькі праз тры дзесяткі гадоў уваскрэсла перажытае ў мастацкіх вобразах. Цыкл з 13 палотнаў «Лічбы на сэрцы» (1974—80) напісаны ўпэўненай рукой майстра. Час выклікаў духоўную гатоўнасць, якая сплавіла страшэнную праўду з надзіва дакладнай мовай метафары і сімвалу.

Асаблівасць цыкла перш за ўсё ў метадзе адлюстравання аўтарам гуманістычнай канцэпцыі, ідэі цудоўнага. Ахвяры, закатаваныя, забітыя, паводле звычайнай логікі не могуць быць аб'ектамі цудоўнага. Але яны сталі такімі ў адпаведнасці з логікай ісціны, закладзенай у творчай задуме. Ісціна мастака ў тым, што зло заўсёды можна адрозніць ад дабра, а чалавек прыгожы, калі ён процістаіць злу. І ахвяры процістаяць катам той ідэальнай асляпляльнай прыгажосцю, з якой адлюстраваў іх мастак.

Пранізлівасць кантрастаў — галоўная заканамернасць вобразнага прачытання кожнай карціны. Спальванне камуністаў становіцца апафеозам мужнасці, наперакор фізічнаму бяссіллю закатаванага мы адчуваем узыходжанне яго духу. Сімвал трагедыі «Мадонна Біркенаў» гучыць разам з тым прасветлена, рэквіемна. Вельмі горда, быццам пранізваючы сілай позірку адлегласць і час, глядзіць «Вязень 32815». І беднае адзенне зняволенага

не змяншае яго годнасці, толькі падкрэслівае яе. У абліччы вязня кожны пазнае Міхаіла Савіцкага.

«Лічбы на сэрцы» — не толькі нумар на грудзях зняволенага. 11 мільёнаў знішчаных і 18 мільёнаў пакутнікаў канцлагераў, 20 мільёнаў савецкіх людзей, што загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне, 50 мільёнаў ахвяр усёй другой сусветнай вайны, неазлічоныя, ходзь і нікім не падлічаныя, злачынствы супраць чалавецтва ў цяперашнім свеце — вось лічбы, якія вялікім цяжарам кладуцца на сэрца... Іншага прыкладу такой маштабнай і актуальнай, публіцыстычна палымянай і памастацку арыгінальнай серыі палотнаў на гэту тэму мы не знойдзем у гісторыі савецкага мастацтва.

Міхаіл Андрэевіч ніколі не клапаціўся аб сваёй славе. Ён толькі працаваў. І працуе. Як заўсёды, шмат, да педантызму жорстка рэгламентуючы распарадак кожнага дня. Такі лад жыцця — не ад суровасці характару. Каму давялося сустракацца з Міхаілам Андрэевічам, ведаюць, што характар у яго вясёлы і добразычлівы, што гумар і жарт упрыгожваюць, а іншы раз і трашна завастраюць тую выказаную думку, тыя або іншыя жыццёвыя сітуацыі. Стыль жыцця выпрацаваны ім па неабходнасці — каб паспець зрабіць задуманае за адмераны тэрмін.

— Мая справа — маляваць,— не аднойчы жартаўліва зазначаў мастак, падкрэсліваючы тым, што ў пэндзлі ягоным — у тым, што змажа ён — галоўны сэнс і ход яго жыцця, простая ісціна для мастака па прызванню.

А слава прыйшла да яго, павяла па ўзыходзячых прыступках сваёй лесвіцы. Год за годам Савіцкі ўдастойваецца ганаровых званняў, прэмій, узнагарод, яго мастацтва становіцца вядомым зарубежнаму гледачу.

Талент і перакананні мастака — непадзельны сплаў. І народ ацаніў не толькі яго талент, але і даверыў яму рашэнне пытанняў самога жыцця. Савіцкі — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. І, скажам шчыра, зусім нялёгкая для мастака гэта місія, якая кідае яго ў кругаварот многіх клопатаў не ад мастацтва. А Міхаілу Андрэевічу да ўсяго ёсць справа — да аховы помнікаў і гарадской планіроўкі, да выкладання ў сярэдняй школе і функцыянірання паркаў і ўстаноў культуры, да выхавання моладзі і быту мастакоў. Расходуюцца душэўныя сілы. У дэпутацкай сваёй місіі Савіцкі выступае як рыцар дабра. Ён не шкадуе сябе. Але яго не шкадуюць і іншыя.

На працягу першых дзесяці гадоў творчага шляху чыноўнікамі ад мастацтва не набываліся яго творы. І гэтым наносіўся матэрыяльны і маральны ўрон. Сябры памятаюць цяжкі перыяд хваробы, калі само жыццё мастака было ў небяспецы, а ён гаварыў: «Не баюся смерці, баюся даўгоў — хто ж аддасць»?. Яго не шкадавалі і не шкадуюць іншыя калегі-мастакі, не грэбуючы ні выдумкамі, ні паклёпам, ні нават злоснымі выпадамі...

Савіцкі ніколі не заводзіў выгадных знаёмстваў, не стараўся прыцягнуць да сябе як мага больш сяброў. Даволі рэзкі характар яго, прынцыповасць, якая даходзіць да катэгарычнасці,— яны ніколі не былі залогам усеагульнай добразычлівасці. Праяўленні ж прамой варожасці прымушаюць успомніць словы драматурга А. Сафронава: «Няма нічога больш бязлітаснага, чым вайна пасрэднасці супраць таленту».

Савіцкі і сам свядома ідзе іншы раз на канфліктныя сітуацыі, якія ўзнікаюць ад жадання дабра і праўды ўсюды, дзе ёсць тыя, хто гэтай праўдзе процідзейнічае. Ён заўсёды прад'яўляе сваім апанентам не асабістую зацікаўленасць у нечым, а зацікаўленасць аб'ектыўную грамадзянскую. Тут ён часам ідзе насуперак многім устойлівым або тым, што ўваходзяць ва ўжытак, уяўленням.

Напрыклад, погляды Міхаіла Андрэевіча на эстэтычнае выхаванне зусім не выклікаюць захаплення ў большасці з тых, хто мае дачыненне да гэтага толькі фармальна або па пасадзе.

— Эстэтычнае выхаванне ў нас вельмі недаацэньваецца. Думаюць, што яно накшталт даважкі да ўсяго астатняга. А яно цяпер — галоўнае. Гэта не даважка. Чаму? Таму што яно мае на ўвазе работу з канкрэтным чалавекам. З яго індывідуальнасцю, яго пачуццямі, душэўным светам. Раней гэтым займаліся папы. Цяпер — ніхто. Атрымаўся вакуум...

Пры адсутнасці рэлігіі мастацтва — адзінае, што можа аказваць магутны ўплыў на духоўнае жыццё людзей. Але мы чамусьці вырашылі, што новага чалавека — чалавека камуністычнага грамадства — могуць зрабіць навука і сацыялістычныя вытворчыя адносіны. Але аказалася, што і для навукі, і для вытворчых адносін чалавек павінен быць сфарміраваны ў сваіх пачуццях, маральных уяўленнях. Мастацтва, творчасць, уменне перажываць прыгожае — гэтыя сферы, звернутыя да душы чалавека, могуць сфарміраваць высокія маральныя якасці.

Валодаючы імі, чалавек становіцца грамадзянінам, зацікаўленым у грамадскіх справах. Інакш ён часцей за ўсё заклапочаны эгаістычным спажываннем. Адбываецца дэфармацыя каштоўнасцей, утвараецца занядбанасць у маральным развіцці.

Чалавек не можа жыць толькі адным паўшар'ем мозгу! (Як вядома, левае адказвае за

інтэлект, правае — за эмоцыі.) Мы абсалютызуем інтэлект. Але ён становіцца бездапаможным без развітай сферы чалавечых пачуццяў, без выхаваных імі сумлення, сардэчнай высакароднасці. Без гэтага ж развіваецца тое, што я назваў бы неабарачальнай прыдуркаватасцю.

Зараз модны выраз «дэмакратызацыя мастацтва». Што гэта такое?! Выходзіць, мастацтва павінна відазмяніцца так, каб дагаджаць усякаму, у тым ліку і чалавеку эстэтычна неразвітаму? Гэта шлях да прымітыўнасці, да дэградацыі — да ўсяго таго, што і характарызуе «масавую культуру». І яе рысы ўжо пазнаюцца ў прымітыўных і аднастайных рытмах музычных падробак.

Магчыма, як некаторыя заяўляюць, зараз настаў час антымастацтва? Але гэта пазіцыя многіх заходніх ідэолагаў. І то не ўсіх. Але чаму ж мы, хто валодае зусім іншай ідэалогіяй, звяртаемся да таго, што ёй чужое? Так ніколі не бывала і не бывае, каб ідэалогія зацвярджалася адна, а мастацтва — узятае напракат з ідэалогіі чужой! Грамадскае ўсведамленне, ідэі грамадства нараджаюць тое мастацтва, якое здольна іх адлюстраваць.

У нас атрымліваецца яўная няўвязка. І калі пагадзіцца з такім становішчам спраў, што ж адбудзецца? З дапамогай прымітыўнага антымастацтва праз дэградацыю маральную можна прыйсці да дэградацыі ідэалагічнай. Гэта прамы шлях.

Выявіліся вельмі небяспечныя прабелы маральнага выхавання. Чамусьці само слова «мараль» набыло адзіны і толькі негатыўны сэнс. А лепшая мараль, гэта значыць павучанне — гэта і ёсць сфера прыгожага, мастацтва. Я тут не арыгінальны. Гэта сцвярджалі мудрацы ўсіх часоў і народаў, калі гаварылі, што прыгажосць выратуе свет.

Дар Міхаіла Андрэевіча ва ўменні паставіць праблему, высвеціць яе так, што яна выглядае выпукла, рэзка. І пры такой рэзкасці асвятлення вельмі ясна відаць і вяршыні, і цёмныя цясніны нашага ўсведамлення. У меркаваннях Савіцкага праўда дакладна аддзяляецца ад зла, ад няпраўды. Тое самае і ў карцінах. І хоць з меркаваннямі мастака многія не згаджаюцца, аўтарытэт яго надзвычай высокі.

Якое ж самаадчуванне мастака ў перыяд жыцця, які спакон веку называецца праходжаннем праз «медныя трубы» фанфар славутасці і пашаны? Псіхалагі адзначаюць, што падобныя абставіны часцей за ўсё неспрыяльныя для творчасці. Для многіх настае самаспакаенне. Ухвала абарочваецца калыскай. Але калі ўглядаешся ў новыя работы Савіцкага, становіцца відавочным, што дадзена яму прайсці цалюткім не толькі «агні і воды».

Ён працягвае пісаць пра подзвіг. Але новае палатно 1986 года «41-ы дзень Перамогі» зусім не гераічнае, а будзённае, лірычнае. У ім паказаны двое любячых. Ён — стары чалавек у ваеннай гімнасцёрцы, надзетай з нагоды свята, з захутанымі пледам каленямі. На грудзях — баявая ўзнагарода. І яна — старая ўжо жанчына. Уладкаваўшыся ля ног мужчыны, яна прытулілася шчакой да яго рукі. Ён выцвілымі, але пільнымі вачамі глядзіць на нас з нейкім напружаннем, насцярожана. Яна глядзіць некуды ў мінулае. А твар яе свеціцца шчасцем. Гэта шчасце ўсё яшчэ цудоўнага імгнення жыцця — яно адзначана стрэлкамі старых ходзікаў. Імгненне, якое перадае бясконцасць любові, непадуладнай часу. Гэта шчасце пройдзеных разам многіх гадоў. Шчасце вернасці. Шчасце, што лёс злітаваўся, не разлучыў.. Урачыста палымнее букет чырвоных цюльпанаў у паўзмроку пакоя. І побач — нікога. Карціна раніць болем судачынення. І ўзвышае прасветленасцю.

Іншыя новыя палотны таксама нечакана прадаўжаюць тэмы, якія мастак распрацоўвае пастаянна. Яны пераклікаюцца адно з адным, вядуць нячутныя дыялогі. Ужо далёкая карціна «Песня» — спяваюць, вяртаючыся з поля, дзяўчаты-льнаводы. У палатне «Вяртанне» (1986) сюжэт амаль той жа. Але якія розныя карціны! У першай — успамін пра бестурботнае юнацтва. Звонкае, як песня, але і прасякнутае ледзь улоўным прадчуваннем бяды і развітання з краінай дзяцінства. Тут вячэрні пазтычны стан прыроды быў жывапісцу неабходны. У другой карціне пейзаж толькі фон, суровае сіне-халоднае асяроддзе. Уся ўвага засяроджана на дзяўчатах. Ідуць бадзёра, ступаючы босымі нагамі на светлыя плямкі кветак. Твары характарныя, сельскія. Гэта тыя, што засталіся на зямлі, у талачынскіх краях, на вёсцы, яшчэ не ўладкаванай па гарадскому тыпу. І песня іх — працоўная песня, сціплы фальклор — патрэбна для пераадолення не толькі нягод, але, магчыма, і самі сябе.

Мастак звяртаецца і да неўласцівага для яго апавядальнага жанру. «Ўзнагароджанне граматай» (1986) — грунтоўны і верагодны расказ. Дзяўчаты-льнаводы засаромлены словамі афіцыйных пахвал. Крыху гратэскава выглядае сельскі бюракрат, які чытае іх. Розныя людзі, маладыя і старыя, стомленыя і бадзёрыя, сабраліся ў звычайным пакоі з пафарбаванымі сценамі. І адчуваеш, што падзея адзначаецца фармальна, не так, як працаўніцы таго заслугоўваюць. А заслугоўваюць яны песеннага велічання, пазтычнага праніканення. І яно прагучала ў карціне «Лён цвіце» (1986). Тры дзяўчыны стаяць перад гледачом. У адной валасы сонечна залацяцца, у

другой — чысты лён, і вочы зіхацяць блакітам. А сяброўка ў цёмнай хусцінцы глядзіць вачамі мадонны. Прыгажуні! Жывапісец разгледзеў, ачысціў прыгажосць ад штодзённасці. Такіх ільнаводаў можна параўнаць з вобразамі ранніх карцін — «Сцелюць лён», «На бульбяных палетках». І тады стане відавочным, што пройдзена велізарная дыстанцыя ў пазнанні жыцця. Пазіцыя мастака стала больш завостранай сацыяльна, больш блізкай да канкрэтнага чалавека.

Тэма фашызму прадоўжана публіцыстычна гучным трыпціхам «Агрэсія» (1984). Гэта наша сучаснасць, папярэджанне аб апошнім шансе... І ўсё ж, што было б, разважае мастак, калі б у нейкім гарачым пункце планеты з'явіўся праведнік-прарок. Чаму б не сам Ісус з Назарэта, які жыве па сённяшні дзень ва ўсведамленні народаў або ў якасці міфа, або як рэальнасць мінулага? Яго б, вяшчальніка ідэй дабра і справядлівасці (а менавіта такія пастулаты ранняга хрысціянства), напэўна ўзялі б пад варту ципарашнія каты. Але чаму «калі б»? Даўнейшы міф — ёсць жорсткая рэальнасць для тых, хто пакутуе ў засценках, каго збіваюць, катуюць, забіваюць і, калі не распінаюць, дык толькі таму, што ўстарэў той спосаб пакарання. Іменна хрэстаматыйна знаёмым увасабленнем лёсу змагара за справядлівасць і мір узнік у карціне «XX век. 80-я гады» (1986) гэты вобраз. Як дзве тысячы гадоў назад, яго бяруць пад варту. Але тут дзейнічаюць безаблічныя чорныя фігуры. Яны прыйшлі з канцлагернага змроку ў абліччы фашысцкіх забойцаў. Карціна своеасаблівая. Яна спалучае міфалагічнасць вобраза з плакатнай публіцыстыкай. Як у палотнах серыі «Лічбы на сэрцы», тут процістаянне маральнай сілы сіле фізічнай, злоснай, агрэсіўнай. І ясна прачытваецца трагічны аптымізм такога процістаяння. Можна забіць, пасадзіць чалавека ў турму, але нельга знішчыць ідэю, якой жывуць мільёны.

Творчасць Савіцкага за апошнія гады нібы раздалася ўшырыню ў імкненні ахапіць жыццёва важныя, глабальныя праблемы века. Яны не могуць не хваляваць мастака, калі яго мастацтва нараджаецца «пры святле сумлення».

Мы прывыклі лічыць, што Савіцкі не пейзажыст. Ён і не стаў ім. Хоць у шэрагу карцін — «Сказ пра хлеб», цыкл палотнаў, прысвечаных паэзіі Янкі Купалы,— пейзаж стаў адыгрываць значную ролю. Але ў апошніх работах ён сказаў аб прыродзе трывожнае слова. Мастак уводзіць вобраз касца — чалавека, які робячы сваю справу, разважае ад імя ўсіх, хто заклапочаны лёсам жывога. У карціне «Вечар» (1986) перададзены стан бурнай, пратэстуючай прыроды. Цяжка задумаўся чалавек з касой. Гэта роздум аб нашай бязлітаснасці, аб насіллі, якое здзяйсняецца ад неразумення. Колькі ўжо лекавых траў занесена ў Чырвоную кнігу! Сціплую жоўтую кветку купальніка паказвае нам касец з другога, не менш трывожнага палатна. Глядзіць сурова, з перасцярогай. Калі будзе так і далей, дык і нас саміх давядзецца заносіць у тую ж кнігу...

Доўгі час не лічылі Савіцкага і партрэтыстам. Але апошнія гады ён асабліва многа працуе над партрэтам. З'явіўся тэмпераментны — і гэтак жа тэмпераментна напісаны — Міхаіл Ульянаў (1985), валявы, як сыграны ім вобраз Маршала Савецкага Саюза Г. К. Жукава. У залежнасці ад характару вобраза, які адлюстроўваецца, мастак выбірае тую або іншую манеру выканання. Карэктна, выразна напісаны Пімен Панчанка (1986). Героі Савіцкага не пазіруюць. Яны знаходзяцца ў натуральным для іх стане. Партрэт Янкі Купалы раскрывае яшчэ нікім так ясна не выяўленыя рысы яго характару. У яго абліччы — раскаванасць, летуценнасць, ледзь прыкметная стомленасць. Тут не сімвал, а партрэт індывідуальнасці, тонкай, шматгранай. І Колас на партрэце — таксама крыху нязвыклы. Гэта чалавек, які мысліць дакладна, канкрэтна, важка. Такое ўражанне стварае даволі жорсткая канструктыўнасць рашэння. І позірк. Вочы ў карцінах Савіцкага выкананы з найвялікшай беражлівасцю. Майстар дасягае ў кожнага свайго героя позірку сапраўды чалавечага. Быццам ідуць за гледачом выразы гэтых позіркаў — праніклівыя, дакорлівыя, насцярожаныя, сумныя, наіўна бясхітрасныя, прастадушныя, суровыя, ласкава спакойныя... У Коласа вочы маладыя, мудрыя, пільныя.

Створанае Савіцкім адкрывае новыя і новыя грані зменлівага і неспакойнага свету і адлюстроўваючы гэты свет, узвялічвае прыгожае ў ім. Так складаецца бясконцая аповесць аб мужнасці і подзвігах, аб любві і веры, аб дабраце і адданасці — аб тым, што спрадвеку і заўжды неабходна нам і ўсяму жывому. Пакуль жыве яно на гэтай зямлі.

Апошнія гады Савіцкі — кіраўнік маладзёжнай творчай майстэрні. За яго вучнямі сочаць уважліва, заўважаюць, што на першым часе яны ў многім стараюцца быць падобнымі на свайго настаўніка. Але мінае год, два, тры — і гэта адыходзіць. Вучні майстэрні Савіцкага пазнаюцца моцнасцю майстэрства, здольнасцю мысліць значнымі, «карціннымі» вобразамі. Міхаіл Андрэевіч выхоўвае ўпартасць і самакрытычнасць, перадае вучням сваю працаздольнасць, сваімі паводзінамі ў разважаннях, часам у палеміцы

Л. Ц. Баразна.

В. Д. Анісенка.

фарміруе іх маральныя рысы, філасофскія пазіцыі. У мікрасвеце майстэрні настаўнік імкнецца ўвасобіць ідэальную мадэль творчага жыцця. І гэта патрабуе немалых затрат. Гэта небяспечна і памылкамі ў ацэнцы неразгаданых характараў, і няўдзячнасцю падапечных, з якіх часам вырастаюць не саюзнікі, а апаненты. І ўсё ж — у іх яго падзея. Надзея не на аддзяку сабе асабіста, а на агульную карысць, на будучыню беларускага мастацтва.

Азіраючыся ў мінулае і з'яўляючыся сведкам сучаснага, мы не памылімся, калі скажам, што цяжкі лёс Міхаіла Андрэевіча. Але хіба можа ён быць лёгкім у тых, хто ідзе наперадзе прагрэсу? Васіль Быкаў, Дзмітрый Ліхачоў, Валянцін Распуцін — «атлеты духу» — іншага лёсу не шукаюць. На складаным шляху яны знаходзяць сваё шчасце. І Міхаіл Савіцкі знайшоў яго ў самаахвярнасці, самаддачы, творчым удасканаленні. Як вялікія прадстаўнікі нашай айчыннай культуры, ён кліча нас да вяршынь пачуццяў і думак. Увышыню... Глядзі ўклейку на с. 640—641.)

Э. М. Пугачова.

ВАЛЕРЫЙ ДАНІЛАВІЧ АНІСЕНКА

Беларускі савецкі акцёр і рэжысёр. Нарадзіўся 5.6.1944 г. ў Талачыне. Яшчэ ў школьныя гады захапляўся тэатральнай дзейнасцю, быў акцёрам Талачынскага народнага тэатра. У 1965 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (курс прафесара Дз. Арлова). Працаваў акцёрам у Віцебску ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа, а 1969 г. ў Мінску — акцёр Беларускага тэатра імя Я. Купалы, адначасова выкладаў у тэатральна-мастацкім інстытуце. У 1977—1978 гг. вучыўся на Вышэйшых рэжысёрскіх курсах пры Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва ў Маскве. У 1979—1980 гг. галоўны рэжысёр Беларускага тэатра юнага гледача, паставіў там спектакль «Спытай сябе» па п'есе М. Саенка. З 1979 г. займаўся арганізацыяй тэатра-студыі кінаакцёра ў Мінску, паставіў у гэты час у Доме кіно спектакль «Паляванне на качак» А. Вампілава. З 1980 г. галоўны рэжысёр гэтага тэатра (тэатр адкрыўся 30.3.1982 г. спектаклем «Усё яго жыццё» паводле кінааповесці Я. Габрыловіча «Камуніст»). У 1979—1982 гг. кіраваў студэнцкім тэатрам БДУ імя У. І. Леніна, паставіў там спектаклі «Дзве стралы» А. Валодзіна (1980) і «Адпачынак па раненні» У. Кандрацьева (1981). З 1982 г. галоўны рэжысёр Беларускага радыё. Паставіў спектаклі: «Чорны замак Альшанскі» (1984), «Нельга забыць» (1985), «Каласы пад сярпом тваім» (1986, усе тры паводле У. Караткевіча), «Гаспадар» А. Дзялендзіка (1983), «Расплата» Ю. Цендракова (1985), «Мой друг, вялікі Чалавек» А. Петрашкевіча (1986) і іншыя. Паставіў 2 тэлефільмы: «Крык чайкі» паводле А. Асіпенкі (1984, кароткаметражны) і «Паляванне на апошняга жураўля» А. Жука (1986, 2-серыйны, мастацкі). Лаўрэат рэспубліканскіх конкурсаў артыстаў эстрады (мастацкае чытанне, спевы), 5-га Еўрапейскага фестывалю «Прыморско-85» (НРБ). Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР за выканальніцкую дзейнасць (1976).

ЛЯВОН ЦІМАФЕЕВІЧ БАРАЗНА

Беларускі савецкі мастак. Нарадзіўся 4.2.1929 г. ў в. Новае Сяло Талачынскага раёна. У 1935 г. сям'я пераехала на станцыю Талачын. Тут ён спазнаў першыя радасці жыцця, тут сутыкнуўся і з горам, якое прынеслі на родную зямлю фашысты. Чатырнаццацігадовым хлапчуком ён стаў партызанскім сувязным. Выконваў розныя даручэнні народных мсціўцаў, маляваў для іх карты і планы. Зведаў зняволенне ў Талачынскай турме, шырока вядомай пад назвай «Пушніна», катаванні і радасць вызвалення. Здольнасці да малявання праявіліся рана. Школьнікам-падлеткам ён не разлучаўся з эцюднікам і папкай для малявання. На абшарпаным трафейным веласіпедзе ён аб'ездзіў усё талачынскае наваколле і ўсюды пісаў алеем эцюды, рабіў накіды і замалёўкі алоўкам ці акварэльнымі фарбамі.

У 1947—1955 гг. Лявон Баразна вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы. Тут у яго выпрацаваўся добры густ, тонкае пачуццё колеру. Скончыўшы вучылішча, працаваў мастаком у Белпрамсавеце. У 1950-я гады стварыў шмат пейзажаў, партрэтаў, эцюдаў. Умеў ён шчодра перадаць у колеры трапяткі стан, тонкі настрой і гукі роднай зямлі, вячэрняй

пары і абуджаную веснавым подыхам прыроду («Ваколіца», «Шэры дзень», «Вясна», «Надвячорак», «На Сажы», «Май», «Цішыня»). Яго алейныя партрэты адметныя выяўленчай прастатой і цеплынёй у адлюстраванні ўнутранага свету чалавека: «Партрэт маці» (1955), «Аўтапартрэт» (1956) і інш. Свае веды ён узбагачаў, звяртаючыся да вытокаў нацыянальнага мастацтва, да традыцый народнай творчасці. Яго раннія этнаграфічныя замалёўкі «Дзяўчына з-пад Клецка», «Маладая ў вясельным уборы», «Гаспадар», «Бабуля ў кашуры» (усе 1957), «Сялянка ў чырвонай кофце» (1958) вызначаюцца рэалістычнасцю пісьма. Найчасцей гэта былі акварэлі на мелаванай паперы.

Спасцігаючы глыбіню народнай творчасці, мастак стаў вандраваць па вёсках і мястэчках Беларусі з мэтай збору і вывучэння скарбаў народнага мастацтва і перш за ўсё адзення, вышывак і ткацтва. Свае вандроўкі ён спалучаў з актыўнымі пошукамі ў архівах і бібліятэках. Вынікам паездак і паходаў сталі тры аб'ёмістыя, падрыхтаваныя да друку альбомы малюнкаў: «Беларускі народны арнамент Палесся» (1957), «Беларуская народная вопратка» (1958), «Арнамент Гродзеншчыны» (1960). Асабліва вялікую навукова-мастацкую каштоўнасць мае альбом «Беларуская народная вопратка». Упершыню ў савецкім мастацтве беларускае народнае адзенне было сабрана і паказана ва ўсім яго багацці, выяўлены яго тыпы і строі, рэгіянальныя асаблівасці.

На пачатку 1960-х гадоў, апіраючыся на веды і вопыт народнага мастацтва, Баразна паставіў перад сабой мэту стварыць беларускі сцэнічны касцюм, адпаведны патрабаванням часу і гістарычным традыцыям народнай культуры. З 1963 г. па 1972 г. мастак стварыў касцюмы і «апрануў» больш за 15 самадзейных калектываў рэспублікі. Валодаючы выключнымі чуйнасцю і талентам, Л. Баразна зрабіў сапраўдны пераварот у мастацтве сцэнічнага касцюма. Яго касцюмы вылучаюцца высокай культурай мадэліроўкі, выразнай і яснай кампазіцыяй, гарманічнасцю колераў і ўмелым іх спалучэннем з матэрыялам. У 1968 г. Лявон Цімафеевіч скончыў аддзяленне прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, стаў членам Саюза мастакоў. У 1966—1969 гг. ён працаваў галоўным мастаком Мастацкага фонду рэспублікі, шмат часу і энергіі аддаваў грамадскай дзейнасці, займаўся мастацтвазнаўчай працай. Сабраўшы і сістэматызаваўшы ўсе вядомыя гравюры Ф. Скарыны, ён зрабіў іх мастацтвазнаўчы аналіз і падрыхтаваў да друку манаграфію «Гравюры Францыска Скарыны» (1972).

У мастацкай і мастацтвазнаўчай спадчыне Л. Баразны акрамя створаных ім сучасных беларускіх касцюмаў — алейны жывапіс і акварэлі, вітражы і эскізы тканін, дываноў, накіды і замалёўкі з натуры, шматлікі этнаграфічны матэрыял, сабраны і замаляваны ў гады вандраванняў, беларускае народнае адзенне, арнамент і ткацтва. У яго жывапісных работах пазнейшага часу — «Натуршчыца» (1971), «Партрэт старой кабеты» (1972), «Вясковая дзяўчына» (1972) і інш.— адчуваецца сталы майстар, які дэманструе сапраўдны артыстызм, тонкі густ, разуменне матэрыялу, выяўленчых сродкаў і тэхнікі. Яго работы напоўнены любоўю да чалавека, да свайго народа, да Бацькаўшчыны.

Л. Ц. Баразна трагічна загінуў 15.8.1972 г.

Зянон Пазняк.

НІЧЫПАР МІХАЙЛАВІЧ БЛАДЫКА

Нарадзіўся 15.6.1899 г. ў в. Рамашкава Талачынскага раёна. Член КПСС з 1918 г. Працоўную дзейнасць пачаў з 15 гадоў. У лістападзе 1917 г. ўступіў у чырвонагвардзейскі атрад пры Аршанскім рэўкоме, удзельнічаў у баях з белаказакамі, потым з войскамі кай-

Л. Баразна. Партрэт маці.

Н. М. Бладыка.

В. П. Буевіч.

І. І. Васілеўскі.

Вера Вярба.

зераўскай Германіі, быў агентам па правядзенні харчразвёрстак, у войсках ВЧК. У канцы 1919 г. пайшоў на фронт — сувязіст, кулямётчык на тачанцы ў 1-й Коннай арміі пад камандаваннем С. М. Будзённага. Ваяваў супраць белагвардзейцаў пад Растовам, белапалякаў пад Львовам, урангелеўцаў і бандаў Махно. Прайшоў з баямі больш за 3 тысячы кіламетраў. У 1922 г. ў ліку 600 будзёнаўцаў накіраваны на вучобу. Скончыў рабфак у Оршы, пасля Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію імя Ціміразева (1929). Працаваў на кіруючых пасадах у сельскагаспадарчых арганізацыях. У 1933 г. скончыў аспірантуру Акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна. Працаваў выкладчыкам Вышэйшай партыйнай школы ў Мінску, вучоным сакратаром Прэзідыума Акадэміі навук БССР. У часы культу асобы Сталіна быў рэпрэсіраваны. Пасля 8-гадовага зняволення жыў і працаваў аграномам у Астрахані. У сярэдзіне 1950-х гадоў рэабілітаваны і адноўлены ў партыі. Працаваў выкладчыкам у партыйнай школе ў Астрахані. Зараз на пенсіі, вядзе актыўную грамадскую работу. 20 гадоў кіруе Н. М. Бладыка саветам ветэранаў рэвалюцыі, вайны і працы пры Астраханскім гаркоме КПСС, выбіраўся дэпутатам Астраханскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, членам гаркома КПСС.

ВІТОЛЬД ПАЛІКАРПАВІЧ БУЕВІЧ

Нарадзіўся 1 мая 1933 г. ў вёсцы Забалацце Талачынскага раёна. Вучыўся ў Забалацкай сямігодцы, потым у Коханаўскай сярэдняй школе. У 1957 г. скончыў з адзнакай Мінскі медыцынскі інстытут (занесены ў Кнігу гонару інстытута) і накіраваны ў Шклоўскі раён Магілёўскай вобласці. Працаваў галоўным урачом Чарнаруцкай участковай бальніцы, з 1959 г. ў Шклоўскай раённай бальніцы: урач акушэр-гінеколаг, намеснік галоўурача. З мая 1965 г. В. П. Буевіч — галоўны ўрач Шклоўскай раённай бальніцы, адначасова і галоўны ўрач Шклоўскага раёна.

Вялікую работу праводзіць Вітольд Палікарпавіч па паляпшэнню санітарна-эпідэміялагічнага стану раёна, па ўмацаванню матэрыяльнай базы аховы здароўя. Калектыў, які ўзначальвае В. П. Буевіч, няраз выходзіў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве медыкаў вобласці, двойчы — у рэспубліцы. Сам Вітольд Палікарпавіч высокакваліфікаваны, вопытны і ўважлівы ўрач, авалодаў шэрагам складаных акушэрска-гінекалагічных і хірургічных аперацый. Атэставаны на вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю ўрача акушэра-гінеколага. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За доблесную працу», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, нагрудным знакам М. І. Пірагова і Дыпломам Саюза таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР.

З 1963 г. выбіраецца дэпутатам Шклоўскага раённага Савета народных дэпутатаў, членам раённага камітэта КПБ.

ІОСІФ ІОСІФАВІЧ ВАСІЛЕЎСКІ

Рускі савецкі паэт. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1957 г. Член КПСС з 1959 г. Нарадзіўся 25.11(8.12).1911 г. ў Дапецку. У хуткім часе бацькі пераехалі на радзіму, у Талачынскі раён. Дзяцінства паэта прайшло ў в. Букарава. У 1928—1930 гг. І. І. Васілеўскі вучыўся на педагагічных курсах у Оршы, у 1932 г. скончыў тэатральна-драматычныя курсы ў Мінску. Працаваў акцёрам у Беларускім драматычным тэатры ў Віцебску (БДТ-2), у тэатрах Смаленска, Жытоміра, Днепрадзяржынска, Разані, Іжэўска, Калугі і інш. З 1967 г. жыве ў Мінску. Друкуецца з 1931 г.

Спачатку пісаў на беларускай мове. Першая кніга вершаў «У добры час» выйшла ў 1954 г. Значнае месца ў яго творчасці займае пейзажная і любоўная лірыка. Піша вершы для дзяцей. Пераклаў на рускую мову зборнікі паэзіі М. Хведаровіча «Кляновы сок» (1972), казку А. Якімовіча «Каваль Вярнідуб» (1974), асобныя вершы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі і іншых беларускіх пісьменнікаў. Выйшлі ў свет: «Ад зоркі да зоркі» (1957), «Лірыка» (1961), «Дзень за днём» (1963), «Здзяйсненне» (1966), «Птушыная трывога» (1968), «Пальмы і сосны» (1969), «Мой спадарожнік сонца» (1971), «Вясёлы поезд» (1977), «Зімовае сонца» (1979), «Вечнай песні галасы: Беларуская лірыка» (1980), «Працяг» (1981) і інш. Напісаў п'есы «Новая прыстань» (вершаваная), для лялечных тэатраў «Авось ды Нябось».

ВЕРА ВЯРБА

Беларуская савецкая паэтэса. Сапраўднае прозвішча Сакалова Гертруда Пятроўна. Нарадзілася 14.1.1942 г. ў в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна. Скончыла БДУ (1964). Працавала ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1972—1977), з 1980 г. ў часопісе «Беларусь». Друкуецца з 1958 г. Асноўныя матывы яе лірыкі — узлаўленне маладосці, дружбы, кахання, мацярынства, роздум над складанымі праблемамі часу, пераемнасцю людскіх пакаленняў (зборнікі вершаў і паэм «Вочы вясны», 1962, «Белыя пісьмы», 1967, «Высакосны год», 1969, «Сіняя бухта», 1975, «Альфа», 1978). У сваёй паэзіі творча выкарыстоўвае матывы і вобразы фальклору. Аўтар ліра-эпічнай паэмы «Каліна» (1968), прысвечанай гераічнаму подзвігу В. Харужай і яе паплечнікаў, верша «Ручнікі», які стаў папулярнай песняй (муз. М. Пятрэнкі), твораў для дзяцей (зборнік «Пралеска», 1968). Выйшлі кнігі «Выбранае» (1976), «Мая маленькая планета» (1982), «Яраслаўна» (1986), «Белыя пісьмы» (1987). Творы В. Вярбы выдаваліся ў перакладзе на рускую мову, перакладаліся на іншыя мовы.

ВАСІЛЬ ВАСІЛЕВІЧ ГАЛУБОВІЧ

Савецкі тэатральны мастак. Нарадзіўся 28.12.1909 г. ў г. п. Коханава Талачынскага раёна. Заслужаны дзеяч мастацтва Казахскай ССР (1955). Скончыў Кіеўскі мастацкі інстытут (1932). Удзельнічае ў мастацкіх выстаўках з 1960 г. У 1933—1958 гг. працаваў у тэатрах Дняпрапятроўска, Саратава, Алма-Аты. У 1959—1965 гг. выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. У 1958—1962 гг. галоўны мастак Беларускага тэатра імя Я. Купалы. Афарміў спектаклі «Дні нашага нараджэння» І. Мележа (1958), «Каб людзі не журыліся» А. Макаёнка, «Смерць ваяводы» Ю. Славацкага (абодва 1959), «Уваскрэсенне» паводле Л. Талстога (1960), «Любоў, Надзея, Вера» П. Васілеўскага (1961) і іншыя. У 1963—1973 гг. галоўны мастак Рускага драматычнага тэатра БССР. Стварыў дэкарацыі да спектакляў «Узнятая цаліна» паводле М. Шолахава (1963), «Антоній і Клеапатра» У. Шэкспіра (1964), «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча (1965), «Маскарад» М. Лермантава (1966), «Варшаўская мелодыя» Л. Зорына (1968), «Марыя» А. Салынскага (1970), «Птушкі нашай маладосці» І. Друцэ (1972). Афарміў таксама спектаклі ў Брэсцкім абласным драматычным тэатры «Дні нашага жыцця» Л. Андрэева (1976), «Варвары» М. Горкага (1979). Імкненне Галубовіча да стварэння абагульненага вобраза спектакля выявілася ў гармоніі каларыту і форм дэкарацый, лаканізме кампазіцыі, падкрэсліванні выяўленчымі сродкамі найбольш адметных сюжэтных калізій драматычнага твора. Дзяржаўная прэмія СССР 1952 г.

В. В. Галубовіч.

У. В. Гарбачоў.

УЛАДЗІМІР ВАСІЛЕВІЧ ГАРБАЧОЎ

Беларускі савецкі вучоны ў галіне ўнутранай медыцыны. Нарадзіўся 10.1.1926 г. ў Талачыне. Бацька працаваў у міліцыі, маці — настаўніцай. Потым быў пераезд у Мінск, скончана васьмігодка. Мары-надзеі на будучае перарвала вайна. 24 чэрвеня ў час бамбёжкі пакінуў Уладзімір палаючы Мінск. Шлях хлопца ляжаў на Лепельшчыну, у вёску Аношкі. Тут у маі 1943 г. ён стаў партызанам Чашніцкай брыгады «Дубава», з ліпеня 1943 г.— Лепельскай брыгады імя І. В. Сталіна. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалём «Пар-

тызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені.

Пасля вайны хлопец зноў сеў за школьную парту. У 1952 г. скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут. У тым жа годзе стаў членам КПСС. З 1952 да 1954 г. У. В. Гарбачоў працаваў у Полацку, з 1954 да 1958 г. ў Талачыне: галоўны ўрач раённай санэпідэмстанцыі, загадчык раённага аддзела аховы здароўя, галоўны ўрач раённай бальніцы. Гэта былі гады напружаных намаганняў па ўздыму медыцынскага абслугоўвання насельніцтва ў Талачынскім раёне. Большасць участковых бальніц, фельчарска-акушэрскіх пунктаў (ФАПаў) размяшчаліся ў прыстасаваных памяшканнях. Не хапала высокакваліфікаваных кадраў, асабліва работнікаў сярэдняга медперсаналу. Таму адной з першачарговых задач загадчык раённага аддзела аховы здароўя У. В. Гарбачоў лічыў стварэнне надзейнай вучэбнай базы для паўнакроўнай работы медыцынскіх устаноў раёна. Былі адкрыты курсы Чырвонага Крыжа па падрыхтоўцы медсясцёр. Праблема была вырашана. Шмат душэўных сіл, энергіі, мэтанакіраванасці і цвёрдасці праявіў член райкома партыі, дэпутат раённага Савета У. В. Гарбачоў. Як дэпутату яму даводзілася вырашаць бытавыя і іншыя пытанні, далёкія ад медыцыны.

З 1958 г. У. В. Гарбачоў працуе ў Мінску. У 1970 г. абараніў доктарскую дысертацыю, яму прысвоена званне прафесара (1972). З 1970 г. загадчык кафедры тэрапіі ў Беларускім інстытуце ўдасканалення ўрачоў, адначасова (з 1973) прарэктар па навуковай рабоце. Асноўнае месца ў навуковай дзейнасці прафесара Гарбачова займаюць працы па даследаванню патагенезу, лячэнню каранарнага атэрасклерозу.

Для У. В. Гарбачова Талачыншчына не проста біяграфічны момант у жыцці, а нешта большае. Таму, відаць, і застаўся ў землякоў самы светлы ўспамін пра доктара Гарбачова, які не парывае сувязі з бацькаўшчынай і цяпер.

ПЁТР АЗАРАВІЧ ДУБАВЕЦ

Беларускі вучоны ў галіне юрыспрудэнцыі П. А. Дубавец нарадзіўся 19 студзеня 1931 г. ў вёсцы Прудзец Талачынскага сельсавета ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1959 г. У 1955—1958 гг. пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна працаваў у органах пракуратуры Гомельскай вобласці. З 1963 г. дацэнт БДУ імя У. І. Леніна. Кандыдат юрыдычных навук (1962). Займаецца даследаваннем праблем крымінальнага і працоўнага права. Аўтар кніг «Адказнасць за цялесныя пашкоджанні паводле савецкага крымінальнага права» (на рус. мове, М. 1964), «Прававыя меры барацьбы супраць п'янства і алкагалізму» (на рус. мове, Мн., 1975), выступіў як сааўтар у 6 выданнях.

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ

Сапраўднае прозвішча Касянкоў Міхаіл Яўхімавіч. Беларускі савецкі пісьменнік. Нарадзіўся 20.11.1901 г. ў в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна. Скончыў Аршанскае духоўнае вучылішча, вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі (пакінуў у пачатку рэвалюцыі). Быў перапісчыкам у паўвайсковай часці, настаўнічаў на Магілёўшчыне, узначальваў валасное аб'яднанне настаўнікаў, валасны аддзел працаўнікоў асветы. У 1920—1926 гг. палітработнік Чырвонай Арміі. Творчую дзейнасць пачаў у 1922 г. (апавяданне «У Саўках»). Актыўны ўдзельнік літаратурна-грамадскага руху 20-х гадоў. Адзін з найбольш яркіх прадстаўнікоў рамантычнага кірунку ў беларускай савецкай прозе ранняй пары. Асноўны пафас яго творчасці — сцвярджэнне рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Заўважаў і паказваў нават самыя нязначныя праявы гэтых пераўтварэнняў (апавяданні «У віры жыцця», «Чаплюк», «Спакуса», «Бацькаў сын»). Глыбока цікавіўся псіхалогіяй чалавека на пераломе гістарычных эпох жыцця (апавяданне «Ворагі», «Бель», «Кветка пажоўклая»). Адсюль яго рамантызм — эмацыянальнасць, узнёсласць, кантрастнасць, нечаканасць сюжэтнай пабудовы твораў, вастрыня іх канфліктнай асновы; з цягам часу ў яго творчасці ўзмацняюцца рэалістычныя тэндэнцыі. У 1925 выйшлі зборнікі апавяданняў «У віры жыцця» і «Пела вясна». У аповесці «Голы звер» (1926) зрабіў важную ў беларускай прозе спробу развянчаць індывідуалістычныя памкненні чалавека ва ўмовах яго паслярэвалюцыйнага быцця. Раман «Сцежкі-дарожкі» (1927, 3 выд. 1959) пра лёс інтэлігенцыі ў эпоху рэвалюцыйных бур і ўзрушэнняў, пра ўдзел лепшай часткі інтэлігенцыі ў барацьбе за інтарэсы народа. Раман «Вязьмо» (1932, 3 выд. 1962) прысвечаны калектывізацыі вёскі. Праз вострае сутыкненне характараў аўтар раскрыў падзеі грамадскага жыцця ў час «вялікага пералому» ў вёсцы. У «Вязьме» выяўлена глыбокая вера ў чалавека-творца, чалавека-будаўніка, Раманы Зарэцкага — творы вострадраматычныя, філасофска-заглыбленыя. Але для «Вязьма» ў большай ступені характэрна рэалістычнасць пісьма, вобразы яго больш канкрэтныя, паўнакроўныя. Нарысы пісьменніка («Цені крывавай мінуўшчыны», 1927, «Падарожжа на новую зямлю», 1929, «Вясна 1930 года», 1930, «Лісты да знаёмага», 1931), публіцыстычна-завостраныя, эмацыянальныя, як правіла, прысвечаны

П. А. Дубавец.

Міхась Зарэцкі.

І. М. Кардовіч.

Э. А. Карніловіч.

папярэдняй распрацоўцы той ці іншай тэмы, якую ён пасля шырока асвятляў у буйных мастацкіх творах. З празаічнымі творамі звязаны, часам абагульняюць іх тэматыку яго п'есы «Віхор на балоце» (1928), «Белыя ружы» (1928—29), «Сымон Карызна» (1935), «Ная» (1936) і іншыя. У розныя перыяды творчасці паспяхова выступаў як крытык [артыкул «Да пытання аб арганізацыі саюзу пісьменнікаў Беларусі» з М. Чаротам, 1926, «Два экзамены (Да пытання аб тэатральнай крытыцы)», 1928, «Размова незвычайнае шчырасці», 1932, і іншыя]. Напісаў кінасцэнарый «Пачатак шчасця». На беларускую мову пераклаў раманы «Цэмент» Ф. Гладкова (1930), «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка ў сусветную вайну» Я. Гашака (ч. 1, 1931). У часы культу асобы Сталіна Міхась Зарэцкі быў абылганы і рэпрэсіраваны. Загінуў 13.6.1941 г.

ІОСІФ МІТРАФАНАВІЧ КАРДОВІЧ

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, дзяржаўны дзеяч БССР. Нарадзіўся 24.3.1899 г. ў в. Друцк Талачынскага раёна. Генерал-маёр (1943). Член КПСС з 1928 г. У 1919—1922 гг. у Чырвонай Арміі. З 1925 г. на савецкай рабоце ў Талачынскім, Дубровенскім, Лельчыцкім, Мсціслаўскім, Горацкім раёнах. З 1939 г. намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкома. У ліпені 1941 г. ўдзельнічаў у абароне Магілёва, член абласнога штаба народнага апалчэння. У 1942 г. накіраваны ЦК КП(б) у Магілёўскую вобласць для кіраўніцтва партызанскім рухам; з жніўня сакратар падпольнага Бабруйскага міжраённага камітэта КП(б)Б; з кастрычніка ўпаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Магілёўскай вобласці. З красавіка 1943 г. член Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б. У 1943—1953 гг. старшыня Магілёўскага, Віцебскага аблвыканкомаў. З 1953 г. член калегіі Міністэрства харчовых тавараў, намеснік міністра прамысловасці мясных і малочных прадуктаў БССР, у Белкаапсаюзе. Кандыдат у члены ЦК з 1949 г., член ЦК КПБ у 1952—1954 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1946—1954 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1955 гг. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі. Памёр 27.12.1967 г.

ЭДУАРД АЛЯКСАНДРАВІЧ КАРНІЛОВІЧ

Беларускі савецкі гісторык, кандыдат гістарычных навук (1971). Нарадзіўся 5.4.1936 г. ў в. Любанічы Талачынскага раёна. Член КПСС с 1963 г. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна (1965). Працаваў рэдактарам, старшым рэдактарам маладзёжных праграм Беларускага тэлебачання (1962—1964), інструктарам Мінскага абкома ЛКСМБ (1964—1966), загадчыкам кабінета філасофіі і навуковага камунізма, выкладчыкам Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава (1966—1971). З 1971 г. старшы выкладчык, дацэнт кафедры навуковага камунізма Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава. Збірае і даследуе матэрыялы пра ўдзел ураджэнцаў Беларусі ў рэвалюцыйным руху ў Расіі. Аўтар кніг «Платон Галавач — публіцыст» (разам з Р. В. Булацкім, 1973), «Рэвалюцыяй прызваныя» (1980), «Людзі рэвалюцыйнага подзвігу» (1985), складальнік зборнікаў успамінаў ураджэнцаў Беларусі пра У. І. Леніна «Правадыр, настаўнік і сябра» (разам з Э. А. Забродскім, 1980; 2 выд. 1985), успамінаў ураджэнцаў Беларусі пра Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю «У жалезных батальёнах рэвалюцыі» (разам з Э. А. Забродскім, 1987).

Н. М. Літвінава.

Н. Е. Пашкевіч.

НІНА МІХАЙЛАЎНА ЛІТВІНАВА

Нарадзілася ў студзені 1922 г. ў в. Каральскі Талачынскага раёна. Член КПСС з 1948 г. 22 чэрвеня 1941 г. Літвінавай, выпускніцы Мінскага настаўніцкага інстытута імя Горкага, трэба было здаць апошні дзяржаўны экзамен. Але пачалася вайна. Пяць цяжкіх дзён дабіралася дзяўчына да Талачына, дзе жылі яе маці, брат і сястра. А праз некаторы час туды прыйшлі фашысцкія захопнікі. Людскому гору не было канца. Летам 1943 г. сям'я Літвінавых кінула хату, жывёлу, усю маёмасць і пайшла да партызан, у брыгаду Гудкова. У кастрычніку, выконваючы баявое заданне, загінуў брат Яўген. Ніна прымала ўдзел у дыверсіях на участку чыгункі Талачын — Коханава, знішчала лініі сувязі, вяла разведку. За бездакорнае выкананне баявых заданняў камандаванне заўсёды ставіла яе ў прыклад іншым, не раз выносіла падзякі.

Калі Талачыншчына была вызвалена ад акупантаў, дзяўчына ўсю сваю энергію, усе веды аддала аднаўленню народнай гаспадаркі. 1 верасня 1944 г. яна ўрачыста правяла першы пасляваенны ўрок па гісторыі ў талачынскай школе № 3. Ніна Міхайлаўна стала не толькі добрай настаўніцай, яна актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці раёна. У пачатку 1947 г. працоўныя горада аднадушна выбралі яе дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Ніна Міхайлаўна з уласцівай ёй энергіяй выконвала пачэсныя і ганаровыя дэпутацкія абавязкі. Цяжка было працаваць у тыя пасляваенныя гады. Не хапала хлеба, адзення, будаўнічых матэрыялаў. Некаторыя з выбаршчыкаў жылі яшчэ ў зямлянках. Ні адну просьбу, ні адну скаргу не пакідала яна без увагі. Здабывала матэрыял для адбудовы і рамонту жылля, уладкоўвала дзяцей у дзіцячыя дамы, дапамагала арганізоўваць новыя медыцынскія пункты. Вельмі памятны для яе 1949 год. Ніна Міхайлаўна на XVI з'ездзе камсамола Беларусі была выбрана членам ЦК ЛКСМБ, дэлегатам XI з'езда ВЛКСМ, на якім была выбрана членам ЦК ВЛКСМ. Першамайскае свята Літвінава сустракала ў Кітаі ў складзе дэлегацыі моладзі нашай краіны. Потым быў Будапешт, удзел у 2-м Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў і 2-м кангрэсе Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі.

Ніна Міхайлаўна ў розны час настаўнічала ў Слонімскім раёне, Хасанскім раёне Прыморскага краю. Н. М. Літвінаву неаднаразова выбіралі дэпутатам Талачынскага раённага і гарадскога Саветаў народных дэпутатаў, членам райкома КПБ і яго рэвізійнай камісіі. Няўрымслівая, руплівая, яна прывыкла жыць дзеля людзей. Зараз Ніна Міхайлаўна працуе ў дзіцячай раённай бібліятэцы ў Талачыне.

ІВАН АЛЯКСАНДРАВІЧ МАТЫЛЬ

Беларускі савецкі журналіст. Нарадзіўся 18.9.1914 г. ў вёсцы Дуброўскія Талачынскага раёна. Член КПСС з 1940 г. Скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя Кірава (1941). У 1932—1934 гг. настаўнічаў, у 1934—1936 гг. адказны сакратар талачынскай раённай газеты «Калгаснік Талачыншчыны», у 1939—1940 гг. загадчык аддзела вілейскай абласной газеты «Вілейская праўда». У Вялікую Айчынную вайну (з 1942) сакратар Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б. З сакавіка 1943 г. адказны рэдактар газеты «Чырвоная змена». З студзеня 1952 г. рэдактар газеты «Гомельская праўда». Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі. Памёр 27.6.1961 г.

КАНСТАНЦІН ВІКЕНЦЬЕВІЧ МАЦЮШЭЎСКІ

Дзяржаўны і партыйны дзеяч БССР. Нарадзіўся 22.8.1917 г. ў в. Новае Палюдава Талачынскага раёна, член Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1967—1985 гг. Член КПСС з 1940 г. Скончыў Аршанскі настаўніцкі інстытут (1939), завочную ВПШ пры ЦК КПСС (1957). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. на партыйнай рабоце. У 1946—1956 гг. лектар, намеснік загадчыка аддзела парторганаў Пінскага абкома, другі, першы сакратар Давыд-Гарадоцкага райкома КПБ. З 1956 г. 1-ы сакратар Пінскага ГК КПБ, з 1958 г. 1-ы сакратар Магілёўскага абкома КПБ, у 1964—1983 гг. старшыня Брэсцкага аблвыканкома. Член ЦК КПБ у 1952—1985 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1954—1966 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1955 гг. і ў 1967—1985 гг. З 1984 г. на пенсіі.

Жыве ў Мінску. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

НІЧЫПАР ЕЎДАКІМАВІЧ ПАШКЕВІЧ

Беларускі савецкі крытык і літаратуразнавец. Нарадзіўся 12.12.1924 г. ў в. Філістава Талачынскага раёна. Кандыдат філалагічных навук (1970). Заслужаны работнік культуры БССР (1974). Член КПСС з 1946 г. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б, Віцебскі педагагічны інстытут (1951), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1960). Перад Вялікай Айчыннай вайной скончыў два курсы Мінскага педвучылішча імя Н. К. Крупскай. Прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху: быў байцом, памочнікам камісара па камсамолу, камісарам атрада імя Катоўскага партызанскай брыгады «Граза», членам рэдкалегіі падпольнай газеты «Чырвоны хлебароб». У 1944—1945 гг.— рэдактар гэтай газеты. У 1945—1946 і 1948—1951 гг. супрацоўнік газеты «Віцебскі рабочы», а ў 1951—1956 гг.— газеты «Звязда». З 1961 г. галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», з 1969 г. рэдактар «Правды» па аддзеле прэсы, крытыкі і бібліяграфіі, з 1972 г. першы намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Литературное обозрение», з 1974 г. намеснік дырэктара Інстытута літаратуры АН БССР, з 1976 г.— рэктар Інстытута культуры, з 1979 г.— галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм». Друкуецца з 1943 г. Аўтар кніг пра пасляваенную беларускую прозу «На шырокіх шляхах жыцця» (1965, Дзяржаўная прэмія БССР імя Я. Коласа 1966 г.), «На эпічным напрамку» («На эпическом направлении», М., 1969), артыкулаў пра творчасць М. Лынькова, І. Мележа, П. Панчанкі, І. Шамякіна, І. Навуменкі, Я. Брыля, А. Адамовіча, А. Кулакоўскага, А. Асіпенкі, А. Чарнышэвіча і іншых. Даследуе творы беларускай прозы, прысвечаныя Айчыннай вайне, пытанні пісьменніцкага майстэрства, увасаблення ў мастацкіх творах жыццёвага матэрыялу.

АЛЯКСАНДР ЛЯВОНЦЬЕВІЧ ПЕТРАШКЕВІЧ

Беларускі савецкі драматург. Нарадзіўся 1.5.1930 г. ў в. Пярэвалачня Талачынскага раёна. Кандыдат гістарычных навук (1967). Заслужаны работнік культуры БССР (1975). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976). Член КПСС з 1952 г. Скончыў БДУ (1955).

А. Л. Петрашкевіч.

З 1954 г. працаваў у ЦК ЛКСМБ, з 1961 г. ў ЦК КПБ інструктарам, загадчыкам сектара (1963—1967), загадчыкам аддзела культуры (1976—1979), рэктар Мінскага інстытута культуры (1975—1976), з 1967 г. адказны сакратар, у 1973—1975 гг. і з 1979 г. намеснік галоўнага рэдактара БелСЭ. Друкуецца з 1956 г. Аўтар нарысаў, фельетонаў, памфлетаў. Першая камедыя «Адкуль грэх» пастаўлена ў 1969 Беларускім тэатрам імя Я. Купалы. Драма «Трывога» (пастаўлена Беларускім тэатрам імя Я. Коласа, 1974), сатырычныя камедыі «Злыдзень» (пастаўлена Магілёўскім абласным тэатрам драмы і камедыі, 1973) і «Укралі кодэкс!» (пастаўлена Гомельскім абласным драматычным тэатрам, 1976) пра раўнадушша, бюракратызм, абыякавыя адносіны да чалавека. П'еса «Напісанае застаецца» (1978, пастаўлена Беларускім тэатрам імя Я. Купалы, 1979) пра Ф. Скарыну. Паводле жанру гэта драма ідэй, дзе ўслаўляецца сіла духу, бескампраміснасць, вернасць сваім перакананням. Абароне прыроды і яе тварэнню — Чалавеку прысвечана драма «Соль» (пастаўлена Дзяржаўным рускім драматычным тэатрам БССР, 1981). Крымскі рускі драматычны тэатр паставіў яго п'есу «Русь Кіеўская» (1982) і гістарычную хроніку «Змова» (1983) — твор пра Кастрычнік, пра У. І. Леніна, дзе час і людзі паказаны праз дакументы. У трагедыі «Злавеснае рэха» (пастаўлена Магілёўскім абласным тэатрам драмы і камедыі, 1984) узнімаюцца праблемы сучаснасці, звязаныя з адраджэннем на Захадзе мілітарысцкіх і рэваншысцкіх настрояў. Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача паставіў у 1985 г. яго драму «У спадчыну — жыццё», якую аўтар прысвяціў сваім землякам (п'еса пастаўлена і Талачынскім народным тэатрам). Аўтар п'есы «Мой друг, вялікі Чалавек» (пастаўлена на Беларускім радыё В. Анісенкам у 1986). Творам Петрашкевіча ўласцівы дынамізм сюжэта, вострая інтрыга, дакладнасць

Алесь Рылько.

І. А. Талкачоў.

моўнай характарыстыкі вобразаў, публіцыстычная страснасць, спалучэнне народнага гумару са з'едлівай сатырай. Аўтар сцэнарыяў фільмаў «Уваскрэсная ноч» (1977), «Нас выбраў час» (1979, з У. Халіпам). Выступае і як празаік. Кандыдат у члены ЦК КПБ у 1976—81 гг.

Тв.: П'есы. Мн., 1976; Написанное остается: Пьесы. М., 1979; Соль // Полымя. 1981. № 9; Русь Киевская // Там жа. 1983. № 6; Славесная рэха // Там жа. 1984. № 8; Заговор // Неман. 1986. № 4; Мост упоперак ракі // Маладосць. 1986. № 12; Избранное. М., 1986; Куды ноч, туды сон // Полымя. 1987. № 1; Соль: П'есы. Мн., 1988.

АЛЕСЬ (АЛЯКСЕЙ ІВАНАВІЧ) РЫЛЬКО

Беларускі савецкі пісьменнік. Нарадзіўся 27.3.1923 г. ў в. Рыдамля Талачынскага раёна. Скончыў БДУ (1951). Член КПСС з 1949 г. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік партызанскага руху на Беларусі. У 1939—1941 гг. і 1944—1946 гг. настаўнічаў, пасля працаваў загадчыкам аддзела часопіса «Вожык» (1952), літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў БССР (1952—1967). Друкаваўся з 1946 г. Першы зборнік апавяданняў «Мае сустрэчы» (1952). Роздум пра жыццё і працу — галоўнае ў яго творчасці. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аднаактовых камедый «Цвіце чаромха» (1957), гумарыстычных апавяданняў «Стуканок у аблавушцы» (1959), апавяданняў і нарысаў «Ты прыгожая, Арынка» (1960), аднаактовай п'есы «Гром з яснага неба» (1953), аднаактовых камедый і сцэнак «Колькі вяровачку ні віць...» (1958), аповесці для дзяцей «Мядовыя краскі» (1959). Памёр 16.4.1967 г.

Тв.: Выбранае.— Мн., 1969; Напрадвесні.— Мн., 1984; Аўтабіяграфія // Вытокі песні. Мн., 1973.

МІКАЛАЙ КАЛІСТРАТАВІЧ СУШКОЎ

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся ў маі 1900 г. ў в. Воўкавічы Талачынскага раёна. Член КПСС з 1930 г. У 1919—1920 гг. у Чырвонай Арміі. З 1924 г. на савецкай, партыйнай і гаспадарчай рабоце ў Талачынскім раёне Віцебскай вобласці і ў Астравецкім раёне Вілейскай вобласці. У партызанах з красавіка 1942 г.: камісар атрада, з чэрвеня 1943 г. камісар 8-й Круглянскай партызанскай брыгады Магілёўскай вобласці, у верасні 1943 г.— ліпені 1944 г. намеснік камандзіра Круглянскай ваенна-аператыўнай групы. З 1944 г. на савецкай рабоце ў Круглянскім раёне, на гаспадарчай рабоце ў Шклове і Оршы. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Памёр 22.1.1964 г.

ІВАН АЛЯКСЕЕВІЧ ТАЛКАЧОЎ

Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР (1977). Нарадзіўся 30.8.1914 г. ў в. Вялікія Ляхі (зараз Лугавое) Талачынскага раёна. Працаваў у калгасе імя Горкага, стрэлачнікам на чыгунцы, вучыўся на раббфаку. У 1941 г. скончыў БДУ імя Леніна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Прымаў удзел у абароне Масквы. У 1942—1944 гг. на Варонежскім і 1-м Украінскім франтах. У лютым 1944 г.— кастрычніку 1945 г. парторг асобнага батальёна І. А. Талкачоў удзельнічаў у ліквідацыі нацыяналістычных бандаў у Заходняй Украіне. У 1945—1967 гг. жыў і працаваў у Львове: намеснік дырэктара рамеснага вучылішча, інструктар райкома КПУ, выкладчык і сакратар партыйнай арганізацыі Львоўскага інстытута прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва, старшы выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі КПСС, сакратар парткома Львоўскага сельскагаспадарчага інстытута. Выбіраўся дэпутатам у Львоўскі гарадскі Савет дэпутатаў працоўных. З 1967 г. ў Мінску — дацэнт кафедры гісторыі КПСС, у 1969—1978 гг. сакратар парткома Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя Куйбышава. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За доблесную працу» і іншымі.

ЮСІФ ПЯТРОВІЧ ХАЎРАТОВІЧ

Беларускі савецкі гісторык. Нарадзіўся 24 снежня 1929 г. ў в. Варгуцёва Круглянскага раёна; з 1933 г. жыў у Талачыне, вучыўся ў Талачынскай СШ № 2. Кандыдат гістарычных навук (1967). Заслужаны работнік культуры БССР (1983). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976). Член КПСС з 1952 г. Вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы (1947—1948). Скончыў БДУ (1955). З 1949 г. працаваў бібліятэкарам, дырэктарам Талачынскага раённага Дома культуры, інспектарам аддзела

культасветустаноў Талачынскага райвыканкома. З 1955 г. навуковы супрацоўнік, загадчык сектара, вучоны сакратар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. З 1967 г. загадчык рэдакцыі гісторыі СССР і БССР, гісторыі КПСС, адказны сакратар (з 1973), намеснік галоўнага рэдактара (з 1975) Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Яго даследаванні прысвечаны гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны і інш. Адзін з аўтараў манаграфіі «Рэвалюцыйны шлях Кампартыі Заходняй Беларусі» (1966). Аўтар нарысаў пра выдатных рэвалюцыянераў і барацьбітоў за ўладу Саветаў В. З. Харужую, А. Р. Салаўя, Л. І. Родзевіча, С. С. Пашкову, І. Пуліхава, П. М. Лепяшынскага, Я. Б. Гамарніка, У. М. Азіна, М. В. Фрунзе і іншых, гістарыяграфічных даследаванняў па гісторыі КПБ і КПЗБ. Удзельнічаў у складанні дакументальных зборнікаў, у т. л. пра Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю на Беларусі, пра рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі, пра партызанскі рух на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў на Беларусі, па гісторыі савецка-польскіх адносін, у распрацоўцы прынцыпаў стварэння універсальных, рэгіянальных і галіновых энцыклапедый.

І. П. Хаўратовіч.

Улюбёнасць у песню

Кастрычнік 1924 года. Закончыўся сход Навасельскай камсамольскай ячэйкі, на якім было вырашана арганізаваць драматычны і харавы гурткі. Настаўнік геаграфіі Дз. І. Касіндоў стаў кіраваць харавым гуртком, у які ўвайшлі Дар'я Баразна, Пётр Шведка, Максім Картавіцкі, Глікерыя Міцкевіч, Ганна Савіцкая, Іван Зайцаў і іншыя, усяго 16 чалавек. Першае выступленне хору ў 1924 г. прайшло з вялікім поспехам. З песнямі камсамольцы будавалі новае жыццё, удзельнічалі ў ліквідацыі непісьменнасці, вялі барацьбу з рэлігійнымі забабонамі. На вёсцы лічылі, што быць удзельнікам хору — значыць ісці ў першых радах змагароў за ўсё новае, перадавое. Самадзейныя артысты выступалі з канцэртамі ў райцэнтры, у суседніх вёсках. Аднак вайна парушыла мірныя справы савецкіх людзей. Многія ўдзельнікі хору пайшлі на фронт абараняць сваю Ра-

Навасельскі народны хор.

дзіму. Не ўсе яны вярнуліся з вайны. У мірны час у хор прыйшлі новыя ўдзельнікі, сярод якіх Дз. П. Картавіцкі, Т. А. Мальцава, М. М. Лосева, Н. С. Шашалевіч, Л. Ф. Рабцава, яе сын Леў Пятровіч і дачка Людміла Пятроўна. З 1950 г. на працягу 30 гадоў кіравала хорам М. М. Талошка, чалавек вельмі ўлюбёны ў сваю справу. У рэпертуары хору песні У. Алоўнікава «Беларусь — Радзіма», А. Шыдлоўскага «Прывітанне Маскве», песні савецкіх аўтараў «Радзіма», «Працоўныя рукі», «Квітней, зямля вясенняя» і іншыя, беларускія народныя песні «Ці свет, ці світае», «Туман, туман пры даліне», «У полі бяроза...». Хор увесь час папаўняецца новымі ўдзельнікамі, узбагачаецца і рэпертуар калектыву. З 1979 г. харавым калектывам кіруе Я. І. Главацкая, якая працягвае яго лепшыя традыцыі. Выступленні хору паспяхова праходзілі ў Мінску, Віцебску, Оршы, у в. Пачынкі Смаленскай вобласці, па радыё, тэлебачанні. Калектыў хору ўзнагароджаны ганаровымі граматамі Міністэрства культуры БССР, Віцебскага абкома КПБ, Талачынскага РК КПБ, з'яўляецца лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці працоўных, пераможцам рэспубліканскага аглядуконкурсу сельскіх калектываў мастацкай самадзейнасці. За актыўную работу па камуністычнаму выхаванню працоўных, высокі ідэйна-мастацкі ўзровень рэпертуару і выканальніцкае майстэрства ў 1976 г. хору прысвоена ганаровае званне народнага.

А. А. Шнэйдар.

Формула поспеху

Гісторыя тэатра Талачынскага раённага Дома культуры пачынаецца з 1920-х гадоў, калі мясцовыя аматары сцэны стварылі драмгурток. Яго ўдзельнікі выступалі ў хатах-чытальнях навакольных вёсак з агітспектаклямі на атэістычныя тэмы. Паступова рэпертуар гуртковцаў расшыраўся, у ім з'явіліся адна-актовыя п'есы Чэхава, інсцэніроўкі ўрыўкаў з твораў Астроўскага, Тургенева, Маякоўскага, Серафімовіча.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны тэатр як бы занава пачаў сваю творчую біяграфію. Ужо ў 1946 г. ў халодным напаўразбураным будынку сабралася група энтузіястаў. Зноў пачаліся рэпетыцыі, падрыхтоўка да новых выступленняў. Сапраўдны творчы поспех прыйшоў да калектыву пасля пастаноўкі ў 1947 г. рэжысёрам Цімафеем Паўлавічам Пляшко (кіраваў тэатрам у 1946—1966 гг.) спектакля «Казка аб праўдзе» М. Алігер. Першымі выканаўцамі роляў былі Л. І. Юрэвіч, А. І. Сінельнікаў, В. П. Арлоўская і іншыя. Акрамя іх, сярод заснавальнікаў тэатра былі Дж. П. Шыбека, І. Р. Кударэнка, З. К. Юрэвіч, А. Д. Арлоўскі, В. Ф. Каралько, В. Д. Анісенка (два апошнія сталі прафесіянальнымі акцёрамі і рэжысёрамі). Ц. П. Пляшко паставіў спектаклі «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка, «Каралеўскі гамбіт» Я. Васілёнка, «Барабаншчыца» А. Салынскага і іншыя. Акцёры-аматары настойліва вывучалі сакрэты сцэнічнага мастацтва, сур'ёзна працавалі над кожнай роляй. Паступова тэатральны калектыў заваёўваў аўтарытэт і любоў гледачоў, набываў вопыт, удасканальваў майстэрства.

Артысты Талачынскага народнага тэатра пасля прэм'еры спектакля І. Шамякіна «І змоўклі птушкі».

Новы этап у творчым развіцці пачаўся з прыходам у калектыў у 1968 г. Аляксея Іванавіча Савіка. Ён творча рэарганізаваў калектыў, зрабіў яго работу мэтанакіраванай, вялікую ўвагу аддаваў сістэматычнай вучобе самадзейных артыстаў. Сапраўднай падзеяй для Талачына была пастаноўка лірычнай камедыі А. Ларова «Спатканне каля чаромхі». Потым на сцэне ішлі «Блудны сын» Э. Ранета, «Мінулася каду масленіца» А. Астроўскага, «Ганка» У. Галубка і іншыя. Вялікі поспех у гледачоў меў спектакль «Трыбунал» па п'есе А. Макаёпка (рэжысёр і выканаўца галоўнай ролі А. І. Савік). Гэта работа тэатра была адзначана дыпломам 1-й ступені на рэспубліканскім конкурсе самадзейнай мастацкай творчасці «Тэатральная вясна» (1971—1973).

У 1971 г. талачынскаму тэатру было прысвоена званне народнага. З 1975 г. работай тэатра кіраваў В. Гурыновіч.

З 1979 г. рэжысёр тэатра Святлана Мікалаеўна Васільева, выпускніца Мінскага інстытута культуры. Калектыў бераліва захоўвае і прадаўжае традыцыі свайго тэатра. Вельмі ўважліва ставяцца тут да выбару рэпертуару. Адна з вядучых тэм — ваенна-патрыятычная. С. М. Васільева паставіла п'есы «І змоўклі птушкі...» І. Шамякіна, «Адна бяроза ведае» А. Ларчанкава, «У спадчыну — жыццё» А. Петрашкевіча (п'еса — прысвячэнне аўтара сваім землякам-талачынцам) і іншыя.

За 40-гадовы перыяд дзейнасці тэатрам паставлена каля 50 спектакляў, з якімі калектыў выступаў у Талачынскім і суседніх раёнах, у Оршы, Віцебску, фрагменты пастановак дэманстраваліся на абласным і рэспубліканскім тэлебачанні. Калектыў — дыпламант 1-га Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных (1975—1977), адзначаны дыпломам Вялікага тэатра СССР у час Усесаюзнага агляду самадзейнай мастацкай творчасці, прысвечанага 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. (1983—85). Мае калектыў-спадарожнік — драматычны гурток Высокагарадзецкага сельскага Дома культуры.

40 чалавек розных узростаў і прафесій аб'яднаны ўлюбёнасцю ў тэатральнае мастацтва. Пастомны творчы пошук, самааналіз, жаданне прыносіць радасць людзям — асноўныя састаўныя часткі формулы поспеху тэатра.

А. А. Шнэйдар.

Народная агітбрыгада

Талачынская народная агітбрыгада «Лянок» раённага Дома культуры створана ў 1962 г., з 1978 г. мае званне народнай. Кіраўнікі: Т. Пляшко (з 1962 г.), В. Гурыновіч (з 1975 г.), А. Мікульчык (з 1987 г.). Калектывам падрыхтавана каля 40 праграм. Лепшыя: «Паднімаем ветразі», «Талачынскі кірмаш», «Ветразі, напоўненыя ветрам», «Сонцам заручоныя», «Мы — маладыя гаспадары зямлі», «Алімпіяда-80 у Талачыне», «Мы і прырода», «У эфіры — АТ», «Песня над полем», «Поле памяці», «Забойца № 1». Калектыў — лаўрэат 1-га Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных (1975—1977), Рэспубліканскага агляду, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа (1982), дыпламант Усесаюзнага агляду самадзейнай мастацкай творчасці, прысвечанага 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. (1983—1985). Выступае ў рэспубліцы, мае калектывы-спадарожнікі — агітбрыгады «Мара» Коханаўскага гарпасялковага Дома культуры і «Полечка» цэнтральнага Дома культуры калгаса імя У. І. Леніна.

А. М. Бязвуглы.

Летапіс раёна вядзе кінастудыя

Кінастудыя «Летапіс» Талачынскага раённага Дома культуры дзейнічае з 1965 г. З таго часу ёю створана каля 50 агучаных дыктарскім тэкстам і музыкай фільмаў, пераважна хранікальна-дакументальных (у тым ліку фільмы-партрэты, відэафільмы, кінанарысы, кіназамалёўкі). За актыўную работу па камуністычнаму выхаванню працоўных, высокі ідэйна-мастацкі ўзровень кінастужак у 1983 г. студыі прысвоена званне народнай.

Фільмы кінастудыі расказваюць аб прыгажосці роднага краю і асноўным яго багацці — людзях, працаўніках заводаў, палёў і ферм («Бітва за хлеб», «Майстрыха»). Вядучая тэма — ваенна-патрыятычная (фільмы «Дарогамі подзвігу», «Па месцах былых баёў», «Ветэраны» і інш.). Шмат стужак прысвечана ўкараненню ў быт талачынцаў новай абраднасці.

На рэспубліканскіх аглядах-конкурсах адзначаны ўзнагародамі наступныя фільмы: «Родныя пейзажы» (1974), «Мы прыйдзем да цябе, поле» (1979), «Возера Касмачэўскае» (1980), «На мяжы Еўропы і Азіі» (1982), «Ляс-

Кадр з фільма «Бітва за хлеб».

ное возера» (1984), «Праз 40 гадоў» (1985). Калектыў адзначаны дыпломам саюзаў пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, кінематаграфістаў, журналістаў СССР за лепшае ўвасабленне ў самадзейнай мастацкай творчасці тэмы працы, саюзу рабочага класа і працоўнага сялянства. 15 фільмаў паказаны ў праграмах абласнога і Рэспубліканскага тэлебачання.

З 1965 г. работай студыі кіруе кінааматар Анатоль Антонавіч Шнэйдар, які быў удзельнікам 45-га сусветнага кангрэса і 48-га міжнароднага фестывалю саюзу непрафесійнага кіно УНІКА-86. Актыўны ўдзел у рабоце студыі прымаюць У. М. Гарлякоў, І. Да. Тухто, М. Л. Шмід і іншыя.

Вось ужо трэцяе дзесяцігоддзе з году ў год вядуцца кіназдымкі, ствараецца своеасаблівы кіналетапіс раёна. Кінематограф беражліва захоўвае для нашчадкаў вобразы роднага краю і людзей, якія праславілі яго сваімі справамі.

М. Пятровіч.

СПІС НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНА

ГОРАД ТАЛАЧЫН

АБОЛЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Абольцы, Гравы, Дабравольск, Данілкава, Жакі, Заазер'е, Замошша, Кісялёва, Клябань, Крывыя, Лемніца, Лукі, Маргі, Мікуліна, Мошава, Мурагова, Пішчаніна, Таранькава, Чачанёва, Чуватава, Шупені; пасёлкі Гай, Забалатка. Новае Росна ў 1939 г. сселены ў в. Чачанёва; пас. Крывая Вуліца тады ж уключаны ў в. Абольцы.

АЗЕРАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Азерцы, Букарава, Васкрасенская, Відэршчына, Вугалеўшчына, Галынка, Драздова, Дубы, Жураўлі, Забалацце, Задняя, Лунная, Міхайлаўшчына, Парэчча, Пімонт, Прудаец, Рыжычы, Свідэршчына, Скавышкі; пасёлак Касіярова ў 1939 г. сселены ў г. Талачын.

АЛЁНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Алёнавічы, Ваўкавічы, Відзінічы, Вялікае Гальцава, Вялікія і Малыя Міхінічы, Гарбачова, Гаршчэўшчына, Грачыхі, Засценкі, Казігорка, Козаўка, Лаўрэнаўка, Лешава, Межыёва, Прысмакі, Ржаўка, Станаўка, Фелістава; в. Барадзін у 1961 г. сселена ў в. Лешава, в. Папоўка ў 1964 г. перайменавана ў в. Знамя, а ў 1966 г. сселена ў в. Гарбачова, вёскі Баглаі і Камлі аліліся з в. Засценкі.

ВАЛОСАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Бук, Бутары, Валосава, Высокі і Нізкі Гарадзец, Галаны, Дубровіна (да 1964 г. Плюгаўкі), Загацце, Запруддзе, Лесіна (да 1964 г. Кулакі), Ліцвінкі, Лозы, Мешкава, Новае Сяло, Навасёлкі, Петрашы, Раздольная (да 1964 г. Бяздзелічы), Рафалава, Разаны, Сельцы, Стуканы, Сухачэва, Харлінцы, Хахлоўка, Чарнаручча, Шашалаўка; пасёлкі Граеўшчына, Заручча, Комлева ў 1939 г. сселены адпаведна ў вёскі Валосава, Харлінцы, Высокі Гарадзец; вёска Мазалы не адноўлена пасля Вялікай Айчыннай вайны; пасёлкі Каралькі і Масткі ў 1949 г. сселены адпаведна ў вёскі Слабодка Талачынскага і Замошша Серкавіцкага сельсаветаў.

ВОЎКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Багрынава, Башарова, Варанцэвічы (вёска і сяло), Воўкавічы, Гарэлікі, Замошша, Зарэчча (другая назва Зарэчнае Падбярэзае), Крывое, Лагаўшчына, Любанічы, Марыянполле, Новыя Варанцэвічы, Падбярэзае, Поўсціхава, Сіўдава; пас. Вішнёўка аліўся в. Друцк Талачынскага сельсавета, в. Кірпічны завод сселена ў 1939 г. ў в. Багрынава, пасёлкі Стаўкі, Сталяроўка ў 1939 г. сселены ў в. Высокі Гарадзец; пас. Тамашполле ў 1939 г. сселены ў в. Навасёлкі; пас. Рамічы не адноўлены пасля Вялікай Айчыннай вайны.

ЖУКНЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Баращы, Дуброўскія, Жукнева, Замосце, Клімава, Любатынь, Максімкава, Новае Заазер'е, Новае і Старое Палюдава, Новае і Старое Рцішчава, Рапава, Рэчкі, Свіране, Сіманава, Слабада, Хаценічы, Чотава; пас. Садоўшчына ў 1939 г. сселены ў в. Жукнева.

КОХАНАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ: г. п. Коханава: пасёлкі Байкал, Галошаўскі, Забайкал, Зялёны Бор, чыгуначнай станцыі Коханава, Чырвоны; вёскі Астрашанкі, Багданаўка, Балашова, Белаброддзе, Вялікае і Малое Высокае, Вялікія і Малыя Ліпнікі, Галошава, Галошаўка, Заазер'е, Замошша, Звянячы, Кісялі, Кругі, Круханавічы, Кувечына, Курапава, Кучына, Ласі, Ляўкова, Малое Гальцэва, Марцюхова, Масалкі, Нагаўка, Праровіна, Пуські, Пярэвалачня, Рамашкава, Рудня, Сальнікі, Сасняки, Старынкі, Шапчына, Шылаўка; в. Пеніна не адноўлена пасля Вялікай Айчыннай вайны.

ПЛОСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Букавіна, Валькі, Вялікія і Малыя Барсучыны, Габрылёва, Гастынічы, Дунавін, Ельнік (да 1964 г. Папоўка), Еўлахі, Калюгі, Клянкі, Козкі, Красілава, Крыніцы, Латышава, Навінка, Новая і Старая Будаўка, Плоскае, Прылессе (да 1964 г. Царковішча), Раманаўка, Сакалянка, Сані; в. Пратасаўка ў 1939 г. сселена ў в. Плоскае.

СЕРКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Аніеліна, Будзькі, Бушмін, Бызава, Гарадзішча, Дубавое, Замошша Заполле, Зыбалы, Лаўрэнавічы, Манастыр, Няклюдава, Прусінічы, Пукалава, Равяцічы, Раманаўка, Рыдамля, Серкавіцы, Увгоі, Узносное, Усвейка (Красінская, Курчэўская, Пазнякоўская), Ходатава, Шэпетава, Янава; пасёлкі Пухлаўка і Скрыншчына ў 1939 г. сселены ў вёскі Няклюдава і Аніеліна; в. Гранавешчанне ў 1949 г. сселена ў в. Усвейка Курчэўская.

СЛАЎНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ: вёскі Антонава, Аўхуты, Гаражоны, Глінікі, Губарэва, Гута, Загор'е, Залавае, Зарэчча, Зябліца, Ільяні, Каменка, Камяніца, Курчы, Лямішчына, Майдан, Маляўка, Нарцызава (ранейшая назва Шульцы), Новая Яблынька, Славені, Слаўнае, Трасцянка, Хімец, Яблынька; пасёлкі Літвінаўка і Шыронае сселены ў 1939 г. ў вёскі Нарцызава і Славені, пас. Хітроўка тады ж аб'яднаны з в. Гаражоны; в. Вечарэнка не адноўлена пасля Вялікай Айчыннай вайны.

ТАЛАЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ: пасёлкі Дубавое, Слабада, чыгуначнай станцыі Трацылава, Усвіж-Бук, Чырвоная Горка; вёскі Ганчароўка, Гірымшчына, Друцк, Жаўна, Загараддзе, Зарэчча, Зялёная (да 1964 Пляшыўцы), Ільінка, Канапельчыцы, Катужына, Кацэвічы, Коласава (да 1964 г. Халопнавічы), Крывое, Лісоўшчына, Лужная (да 1964 г. Вялікія Ляхі), Маціёва, Мураўнічы, Новае і Старое Саколіна, Новы Друцк, Палявая (да 1964 г. Манастыры), Панькавічы, Прудзец, Прудцы (да 1964 г. Малыя Ляхі), Равуча, Райцы, Сінчукі, Слабодка, Старынка, Стары Талачын, Сурнаўка, Сялец, Табараўшчына, Таласкаўшчына, Шляпіна, Шмідзельшчына, Яськаўшчына; пасёлкі Зялёная Ліпа, Прыдруцце, в. Саколка сселены ў 1939 г. адпаведна ў пас. Дубавое, вёскі Друцк і Маціёва; населены пункт Замак Друцк не адноўлены пасля Вялікай Айчыннай вайны; населены пункт Рагачоўка сселены ў 1949 г. ў в. Стары Талачын.

ЗМЕСТ

Да чытача 17

Зямля нашых продкаў 21

Старонкі мінулага (30). Горад на Друці (34). Помнік старажытнай пісьменнасці (41). Барысавы камяні (41). З архітэктурнага мінулага (43). Звесткі пра Друцк, Талачын, Абольцы, Коханава... (45). Выступленне супраць паншчыны (46). З ведамасці смаленскага губернскага пракурора... (47). Напалеон уцякаў праз Талачын (49). Паведамленне прадвадзіцеля дваранства... (52). Падзеі 1863 года ў народных паданнях (52). Звесткі аб станцыях Коханава, Талачын, вёсцы Галошаўка, мястэчках Абольцы, Друцк (54). Скарга сялян вёскі Нагаўкі... (55). Прашэнне сялян вёскі Таласкаўшчына... (56). Справа, якая цягнулася 35 гадоў (56). З данясення начальніка Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення... (59). Тэлеграма Сенненскага аддзела Магілёўскага саюза зямельных улацальнікаў... (59). За волю, за лепшую долю (60). Забастоўка ў 1905 (60). На шляху да Вялікага Кастрычніка (57). Тут працаваў Якуб Колас (61). Язюля — Тэрэза Гардзялкоўская (63).

За ўладу Саветаў 65

П. М. Лепяшынскі ў Слаўным (67). Шляху пачатак (68). Справаздача агітатара Аршанскаму раёкому... (69). Грамадзяне м. Коханава вітаюць уладу Саветаў (69). Пастанова Высокагарадзецкага валвыканкома... (69). Пастанова выканкома Коханаўскага валаснога Савета... (70). Са справаздачы Аршанскага павятовага выканкома... (71). З пратакола пасяджэння Смаленскага валвыканкома... (71). Паведамленне газеты «Набат»... (72). Паведамленне газеты «Известия Могилевского губернского революционного комитета»... (72). Пастанова камбеда мястэчка Коханава... (72). Пратакол сходу прадстаўнікоў камбедаў... (73). Паведамленне аб з'ездзе сельсаветаў... (73). Са ўводкі інфармацыйна-інструктарскага пададдзела Аршанскага павятовага рэўкома... (74). Справаздача Стараталачынскага валрэўкома... (75). Справаздача Сенненскага павятовага камітэта РКП(б)... (75). Рэвалюцыяй прызваныя (76). Слухач школы ў Ланжумо (76). Паэт рэвалюцыі (80). Рэвалюцыянер з Коханава (84). Матрос з Краштата (86). Старшыня губсавета (88). Як след бліскавіцы (91). Салдат нябачнага фронту (93). Яны змагаліся над сцягам Вялікага Кастрычніка... (94).

Гады сацыялістычнага будаўніцтва 105

Тэлеграма працоўных Коханаўскай воласці... У. І. Леніну (110). Лёгкай долі не шукалі (111). Як стваралі нчэйку (113). Ветэраны камсамольскай гвардыі (114). Першыя прафсаюзныя (115). Пастанова пленума Талачынскага райвыканкома (116). Калгасная партячэйка (117). Камсамол Талачыншчыны ў гады першай пяцігодкі (118). Гісторыя аднаго пасведчання (119). Пастанова агульнага сходу грамадзян вёскі Вялікае Галошава... (120). Пастанова прэзідыума Талачынскага райвыканкома... (120). Шляхі змагання (122). Пастанова пленума Талачынскага райвыканкома... (122). За газетным радком (124). Тэлеграма Талачынскага РК КП(б)Б і райвыканкома... (124). Інфармацыя аб выніках спаборніцтва сельскіх Саветаў... (125). Памяці селькора Змітра Васілевіча Крывіцкага (126). Рапарт з'езду (128). За газетным радком (128). Спіс воінаў-землякоў, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну 1939—1940 (129).

У гады суровых выпрабаванняў 133

З партыйным архівам у Маскву (142). Вяртанне ў юнацтва (144). Як ратавалі жывёлу (145). У імя жыцця (145). Гвардзейцы-масквічы (147). Герой-артылерыст (149). Сказ пра выратаваны сцяг (150). Выбіраю смерць (153). Фронт у тыле ворага (155). Перад сапраўднай барацьбой (165). З данясення сувязнога партызанскай брыгады «Дзядзькі Колі»... (166). Нараджэнне «Гразы» (167). Бой на станцыі Слаўнае (169). Дакументы і сведкі абвінавачваюць... (173). У пошуках партызан (176). Раёнка клікала ў бой (178). Газета паведамляла... (180). Дакладная запіска сакратара Талачынскага падпольнага райкома ЛКСМБ Л. М. Міхайлавай... (180). З данясення камандавання партызанскай брыгады М. П. Гудкова... (181). Са справаздачы камандавання аховы тылу 4-й нямецкай арміі... (182). З палітдонясення партызанскай брыгады «Граза»... (183). З загада № 55 камандавання партызанскай брыгады «Граза»... (183). З пратакола № 26 пасяджэння бюро Талачынскага падпольнага райкома ЛКСМБ... (183). Са справаздачы Талачынскага падпольнага райкома ЛКСМБ... (184). З палітдонясення сакратара Талачынскага падпольнага райкома КП(б)Б Віцебскай вобласці С. М. Нарчука... (184). Пастанова Талачынскага падпольнага райкома КП(б)Б... (186). Са справаздачы сакратара Талачынскага падпольнага райкома КП(б)Б А. П. Пахамовіча... (187). З гісторыі партызанскай брыгады «Граза»... (188). З дзённіка камандавання партызанскай брыгады «Граза»... (189). Са справаздачы камандавання партызанскай брыгады «Чэкіст» (194). Са справаздачы камандавання партызанскай брыгады М. П. Гудкова... (194). Са справаздачы начальніка аператыўнай групы БШПР на 3-м Беларускім фронце... (195). Гарэлі ў агні вёскі... (196). Тыдзень у «Пушніне» (200). Што мы ім зрабілі? (201). Усім смярцям назло (202). Гаворыць вязні Асвенціма (204). Каб можна было праклясці вайну (207). У фашысцкай няволі (208). Не даеля славы (209). Суджана жыць (211). У імя перамогі (212). Вытрымалі (213). Наш камбрыг (214). Да перамогі ішлі разам (215). Партызанскія камандзіры (216). Мамадалі Тапівалдыеў — беларускі партызан (217). Справы партызанскія (218). Насустрач сонцу (221). Былінскія. Успаміны праз сорак гадоў (224). Літасці вораг не ведаў (231). Лёс (232). Пастка (233). «Я з Беларусі, Дудкевіч М. У.»

(234). Імем земляка (235). Побач з Мінскам (236). Юнацтва маё баявое (237). Наша Вера (241). Народ быў упэўнены ў перамозе (241). Камсамолка вогненных гадоў (242). Юныя героі (243). Дзяцінства незабыўныя імгненні (245). Бясстрашны разведчык (246). Яго імем названы... (247). Маленькі патрыёт (248). Разведчык Алег Бераснеў (250). Праз усе выпрабаванні (251). Браты Мачахоўскія (253). Біяграфія пачыналася з вайны (256). У той час рана сталелі дзеці (257). У шпіталі — хірургі з Оршы (258). Адважная чацвёрка (259). З успамінаў разведчыка (260). Рукамі партызанскіх умельцаў (264). Самалёты з Вялікай зямлі (265). Малака мы тады і не напіліся... (266). Цяпер нават не верыцца (267). Сустрэліся на вайне (268). Радасць прыйшла (269). Пакет асаблівай важнасці (270). Подзвіг гвардзейцаў (271). Воіны-кацельнікаўцы (272). «Талачын гатоў да прыёму эшалонаў!» (273). З журнала баявых дзеянняў 3-й гвардзейскай танкавай брыгады (274). Атака з ходу (275). Лётчыкі — ганаровыя чыгуначнікі (276). Вуліца імя лётчыка-героя (276). Яны вызвалялі Талачыншчыну... (278). За мужнасць і гераізм (285). Цаной жыцця (285). Партызанскі генерал (286). Бацькаўшчыны светлы парог (289). Подзвіг артылерыста (294). Крылатае жыццё (295). Адважны камандзір (299). Дзесяты з сям'і Лузгіных (300). Дваццаць восем баявых гадоў (303). Разгневанае неба (308). Герой Дняпра (309). Танкавы пандынак (311). Арлінае крыніца (312). Слова пра сям'ю (315). З пленды адважных (318). Суровы і светлы лёс (319). На баявым пасту (320). Сваю задачу мы выканалі (321). Камандзірская сям'я (322). Бой на Нэйсе (323). Салдат двух войнаў (324). Удзельнікі Парада Перамогі (325). І вера і вернасць (326). Загінуўшыя ўдзельнікі камуністычнага падполля, партызаны, асобы, якія актыўна садзейнічалі партызанскаму руху і камуністычнаму падполлю, члены іх сем'яў, жыхары партызанскіх зон і раёнаў, што падверглісся фашысцкаму тэрору (333). Партызаны, ураджэнцы іншых раёнаў і абласцей, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі Талачынскага раёна (370). Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні Талачынскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі (373). Воіны-землякі, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў 1941—1945 гг. (385). Воіны Савецкай Арміі — ураджэнцы Талачыншчыны, якія загінулі ў Афганістане ў 1980—1986 гг. (575).

У мірнай працы 577

На вызваленай зямлі (584). Выратаванае дзяцінства (586). Школа жыцця (592). На шляху да ведаў (593). Жураўскія: патрыёты і працаўнікі (596). Бацька паэта (600). На роднай зямлі (601). Акрыленая праца (602). Трывалае валакно (603). Працоўны подзвіг (604). Чалавек самаадданай працы (605). Зорны час брыгадзіра (606). Незабыўнае (607). Старшыня калгаса (608). Жывыя парасткі (609). Школа Смірнова (610). Глыбокая баразна (611). Вызначыліся працай (613). Ёсць такая прафесія (621). На ахове грамадскага парадку (624). Сталелі рана... (624). Родам з Талачыншчыны (627). На быстрыні жыцця (627). Якасць сэрца чалавечага (628). Высокі талент (630). В. Д. Анісенка (638). Л. Ц. Баразна (638). Н. М. Бладыка (639). В. П. Буевіч (640). І. І. Васілеўскі (640). Вера Вярба (641). В. В. Гадубовіч (641). У. В. Гарбачоў (641). П. А. Дубавец (642). Міхась Зарэцкі (642). І. М. Кардовіч (643). Э. А. Карніловіч (643). Н. М. Літвінава (644). І. А. Матыль (644). К. В. Мацюшэўскі (644). Н. Е. Пашкевіч (645). А. Л. Петрашкевіч (645). Алесь Рылько (646). М. К. Сушкоў (646). І. А. Талкачоў (646). І. П. Хаўратовіч (646). Улюбёнасць у песню (647). Формула поспеху (648). Народная агітбрыгада (649). Летапіс раёна вядае кінастудыя (649). Спіс населеных пунктаў Талачынскага раёна (650).

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі «Памяць» прымалі ўдзел:

Прадстаўнікі грамадскасці Талачынскага раёна: К. С. Абяткоўскі, Н. Ф. Агеенка, Л. І. Антоненка, Г. С. Арашкевіч, В. І. Бладыка, Г. С. Блажэвіч, Л. І. Буевіч, В. І. Важанава, Я. І. Васільева, Г. Ф. Віхрова, В. В. Турына, П. П. Дзеньгуб, С. М. Дзівас, К. І. Дзядзечкіна, С. С. Жалдак, Т. А. Закрыжэўская, О. К. Закроўская, І. П. Звярковіч, Л. Р. Ігнаценка, С. І. Ігнаценка, Г. Г. Казлова, Л. А. Картавіцкая, А. М. Косінец, В. А. Кубарская, А. Р. Курак, Л. Да. Лемешава, П. К. Літвінка, Р. І. Лукашэвіч, Т. А. Міснік, К. Дз. Мяснікаў, Н. А. Назарава, М. А. Нарчук, А. С. Павадырова, Л. Ю. Пятроўская, Т. І. Радзькова, У. М. Раманкевіч, Б. Г. Рэцкі, А. І. Салаўёў, Р. І. Саўчанка, Л. А. Сямёнава, Р. У. Сяргеева, Л. П. Талкачоў, Р. П. Трубская, А. І. Турок, А. А. Усціновіч, Н. Н. Фралова, М. І. Хадасевіч, Г. У. Хадорык, В. К. Халецкая, Л. К. Цімашкоў, Н. Дз. Ціхановіч, Т. М. Шабрына, О. С. Шапіда, А. С. Шпілеўская, С. Я. Шышко, А. І. Шэвелеў, В. А. Ярэма.

Работнікі архіваў, бібліятэк і музеяў: А. І. Баркоўская, Я. Л. Бравер, А. Н. Кудзін, А. Г. Міхалёня, В. В. Сакалоўскі.

Фота: В. Грабянькова, С. Жукавень, П. Захаранні, А. Шнэйдара, з асабістых архіваў і архіва БелСЭ.

Над кнігай працавалі: рэдакцыя гісторыка-дакументальных хронік БелСЭ — Г. К. Кісялёў (загадчык), Л. М. Драбовіч, І. В. Камароў, З. І. Каршакова, Ф. І. Кітаева, Н. В. Шаўрук; **з іншых рэдакцый і службаў выдавецтва** — В. П. Астроўская, В. В. Гетаў, М. А. Маўзон, Л. І. Паўловіч, С. П. Самуэль (загадчыца рэдакцыі), Е. П. Фешчанка, М. К. Хадыка.

Массово-политическое издание

ПАМЯТЬ

Историко-документальная хроника Толочинского района

Минск, издательство «Белорусская Советская Энциклопедия» имени Петруся Бровки

На белорусском языке

Масава-палітычнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна

Мастацкія рэдактары: *Н. В. Андрасюк, В. Г. Загародні.* Тэхнічныя рэдактары: *М. І. Грыневіч, І. І. Цыцаня.* Карэктары: *В. І. Багдановіч, Р. Р. Блашко, Н. А. Дзянісава, Т. Я. Радзевіч, Л. В. Суцягіна, А. А. Федасеева.*

ИБ № 113

Здадзена ў набор 24.07.87. Падпісана да друку 22.09.88. АТ 14096. Фармат 70×90¹/₁₆. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Друк высокі. Ум.-друк. арк. 48,55. Ум. фарб.-адбіткаў 57,65. Ул.-выд. арк. 78,42. Тыраж 20 000 экз. Зак. № 686. Цана 3 р. 20 к.

Выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600. Мінск, Акадэмічная, 15а.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005. Мінск, Чырвоная, 23.

Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачын-
П 15 скага р-на /БелСЭ; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і
інш.; Маст. А. М. Хількевіч.— Мн.: БелСЭ, 1988.—654 с.,
[12] л. іл.: іл.

ISBN 5-85700-007-6.

Гэта выданне — жыццяпіс Талачынскага раёна. Асноўную частку выдання складаюць матэрыялы аб падзеях часоў Вялікай Айчыннай вайны. Тут побач з нарысамі і ўспамінамі змешчаны спісы і звесткі пра загінуўшых партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, пра воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі на тэрыторыі раёна, пра землякоў, што загінулі на франтах, абараняючы сваю Радзіму.

Кніга цікавая не толькі для жыхароў раёна, але і для ўсіх тых, чые блізкія і сябры ваявалі на яго тэрыторыі.

П $\frac{\text{0505040000—012}}{\text{М 318(03)—88}}$ 08—88 **ББК 63.3(2Б)**



Карціны М. Савіцкага:

Песня. 1957;

Партызаны Блакады. 1967;

Плач па загінуўшых героях. 1974;

Партызанская мадонна. (мінская) 1978;

Поле. 1974;

Ідзе ў ноч. 1980;

Куст руж. 1974. (Фрагмент);

У полі. 1972;

Хлябы. 1968. (Фрагмент);

Ураджай. 1966;

Хлеб новага ўраджаю. 1979.